CODEX
IURIS CANONICI

КОДЭКС
КАНАНІЧНАГА ПРАВА

Vilnae
A.D. MMXXII

Пераклад з лаціны
кс. Дзмітрыя Пухальскага, кс. Андрэя Зноскі

Рэдакцыйная рада выдання:
Арцыбіскуп Антэ Ёзіч, Апостальскі Нунцый — Старшыня
Анастасія Грышан
Алесь Жлутка
Кс. Андрэй Зноска
Кс. Дзмітрый Пухальскі
Алена Садоўская

Sancta Sedes omnia sibi vindicat iura. Nemini liceat, sine venia Sanctae Sedis, hunc Codicem denuo imprimere aut in aliam linguam vertere.

Усе правы пакідае за сабой Святая Сталіца. Без дазволу Святой Сталіцы не дазваляецца перавыданне гэтага Кодэкса, ані пераклад на іншыя мовы.

Nihil obstat, A.P.S.A.: Prot. N. 009893/2022
Ватыкан, 19 ліпеня 2022

© Libreria Editrice Vaticana, тэкст на лаціне, 2022
© Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі, пераклад на беларускую мову, 2022

Išleido Gintaro Kalibato jmonė «Vilporta», Naujoji Riovoniu 25C, Vilnius

ISBN 978-609-96338-0-0

CODEX
IURIS CANONICI

КОДЭКС
КАНАНІЧНАГА ПРАВА

Афіцыйны лацінскі тэкст
актуальны на 19 ліпеня 2022 года.

Пераклад на беларускую мову
зацверджаны касцёльнай уладай.

INDEX

CONSTITUTIO APOSTOLICA SACRAE DISCIPLINAE LEGES 32

CODEX IURIS CANONICI 45

LIBER I
DE NORMIS GENERALIBUS 47

TITULUS I DE LEGIBUS ECCLESIASTICIS 49
TITULUS II DE CONSUETUDINE 52
TITULUS III DE DECRETIS GENERALIBUS ET DE INSTRUCTIONIBUS 54
TITULUS IV DE ACTIBUS ADMINISTRATIVIS SINGULARIBUS 55
Caput I Normae communes 55
Caput II De decretis et praeceptis singularibus 58
Caput III De rescriptis 60
Caput IV De privilegiis 63
Caput V De dispensationibus 66
TITULUS V DE STATUTIS ET ORDINIBUS 68
TITULUS VI DE PERSONIS PHYSICIS ET IURIDICIS 68
Caput I De personarum physicarum condicione canonica ... 68
Caput II De personis iuridicis 73
TITULUS VII DE ACTIBUS IURIDICIS 77
TITULUS VIII DE POTESTATE REGIMINIS 79
TITULUS IX DE OFFICIIS ECCLESIASTICIS 84
Caput I De provisione officii ecclesiastici 85
Art. 1. *De libera collatione* 87
Art. 2. *De praesentatione* 87
Art. 3. *De electione* 89
Art. 4. *De postulatione* 93

ЗМЕСТ

Прадмова да першага перакладу Кодэкса
кананічнага права на беларускую мову 28

АПОСТАЛЬСКАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ SACRAE DISCIPLINAE LEGES 33

КОДЭКС КАНАНІЧНАГА ПРАВА 45

КНІГА I
АСНОЎНЫЯ НОРМЫ 47

ТЫТУЛ I КАСЦЁЛЬНЫЯ ЗАКОНЫ 49
ТЫТУЛ II ЗВЫЧАЙ 52
ТЫТУЛ III АГУЛЬНЫЯ ДЭКРЭТЫ І ІНСТРУКЦЫІ 54
ТЫТУЛ IV АСОБНЫЯ АДМІНІСТРАЦЫЙНЫЯ АКТЫ 55
Раздзел I Агульныя нормы 55
Раздзел II Асобныя дэкрэты і прадпісанні 58
Раздзел III Рэскрыпты 60
Раздзел IV Прывілеі 63
Раздзел V Дыспенсацыі 66
ТЫТУЛ V СТАТУТЫ І РЭГЛАМЕНТЫ 68
ТЫТУЛ VI ФІЗІЧНЫЯ І ЮРЫДЫЧНЫЯ АСОБЫ 68
Раздзел I Кананічнае становішча фізічных асобаў 68
Раздзел II Юрыдычныя асобы 73
ТЫТУЛ VII ЮРЫДЫЧНЫЯ ДЗЕЯННІ 77
ТЫТУЛ VIII УЛАДА КІРАВАННЯ 79
ТЫТУЛ IX КАСЦЁЛЬНЫЯ ПАСАДЫ 84
Раздзел I Прызначэнне на касцёльную пасаду 85
Артыкул 1. *Свабоднае прызначэнне* 87
Артыкул 2. *Прадстаўленне* 87
Артыкул 3. *Выбар* 89
Артыкул 4. *Хадайніцтва* 93

Caput II De amissione officii ecclesiastici 95
Art. 1. *De renuntiatione* 95
Art. 2. *De translatione* 96
Art. 3. *De amotione* 97
Art. 4. *De privatione* 98
TITULUS X DE PRAESCRIPTIONE 98
TITULUS XI DE TEMPORIS SUPPUTATIONE 99

LIBER II
DE POPULO DEI 101

PARS I
DE CHRISTIFIDELIBUS 101

TITULUS I DE OMNIUM CHRISTIFIDELIUM OBLIGATIONIBUS ET IURIBUS 102
TITULUS II DE OBLIGATIONIBUS ET IURIBUS CHRISTIFIDELIUM LAICORUM 105
TITULUS III DE MINISTRIS SACRIS SEU DE CLERICIS 109
Caput I De clericorum institutione 109
Caput II De clericorum adscriptione seu incardinatione 120
Caput III De clericorum obligationibus et iuribus 123
Caput IV De amissione status clericalis 129
TITULUS IV DE PRAELATURIS PERSONALIBUS 130
TITULUS V DE CHRISTIFIDELIUM CONSOCIATIONIBUS 131
Caput I Normae communes 131
Caput II De christifidelium consociationibus publicis 135
Caput III De christifidelium consociationibus privatis 138
Caput IV Normae speciales de laicorum consociationibus 140

PARS II
DE ECCLESIAE CONSTITUTIONE HIERARCHICA 140

SECTIO I DE SUPREMA ECCLESIAE AUCTORITATE 140

Раздзел II Страта касцёльнай пасады 95
Артыкул 1. *Адмова ад пасады* 95
Артыкул 2. *Перамяшчэнне* 96
Артыкул 3. *Звальненне* 97
Артыкул 4. *Пазбаўленне* 98
ТЫТУЛ X ДАЎНАСЦЬ 98
ТЫТУЛ XI ПАДЛІК ЧАСУ 99

КНІГА II
БОЖЫ НАРОД 101

ЧАСТКА I
ВЕРНІКІ 101

ТЫТУЛ I АБАВЯЗКІ І ПРАВЫ ЎСІХ ВЕРНІКАЎ 102
ТЫТУЛ II АБАВЯЗКІ І ПРАВЫ СВЕЦКІХ ВЕРНІКАЎ 105
ТЫТУЛ III СВЯТЫЯ СЛУЖЫЦЕЛІ, ІНШЫМІ СЛОВАМІ — ДУХОЎНЫЯ АСОБЫ 109
Раздзел I Падрыхтоўка духоўных асобаў 109
Раздзел II Прыналежнасць духоўных асобаў, іншымі словамі — інкардынацыя 120
Раздзел III Абавязкі і правы духоўных асобаў 123
Раздзел IV Страта духоўнага стану 129
ТЫТУЛ IV ПЕРСАНАЛЬНЫЯ ПРЭЛАТУРЫ 130
ТЫТУЛ V АБ'ЯДНАННІ ВЕРНІКАЎ 131
Раздзел I Агульныя нормы 131
Раздзел II Публічныя аб'яднанні вернікаў 135
Раздзел III Прыватныя аб'яднанні вернікаў 138
Раздзел IV Спецыяльныя нормы аб аб'яднаннях свецкіх вернікаў 140

ЧАСТКА II
ІЕРАРХІЧНАЯ СТРУКТУРА КАСЦЁЛА 140

СЕКЦЫЯ I ВЯРХОЎНАЯ ЎЛАДА КАСЦЁЛА 140

Caput I De Romano Pontifice deque Collegio Episcoporum 140
Art. 1. *De Romano Pontifice* 141
Art. 2. *De Collegio Episcoporum* 142
Caput II De synodo Episcoporum 144
Caput III De Sanctae Romanae Ecclesiae Cardinalibus 147
Caput IV De Curia Romana 151
Caput V De Romani Pontificis Legatis 152

SECTIO II DE ECCLESIIS PARTICULARIBUS DEQUE EARUNDEM COETIBUS 155
TITULUS I DE ECCLESIIS PARTICULARIBUS ET DE AUCTORITATE IN IISDEM CONSTITUTA 155
Caput I De Ecclesiis particularibus 155
Caput II De Episcopis 157
Art. 1. *De Episcopis in genere* 157
Art. 2. *De Episcopis dioecesanis* 159
Art. 3. *De Episcopis coadiutoribus et auxiliaribus* 167
Caput III De sede impedita et de sede vacante 170
Art. 1. *De sede impedita* 170
Art. 2. *De sede vacante* 171
TITULUS II DE ECCLESIARUM PARTICULARIUM COETIBUS 175
Caput I De provinciis ecclesiasticis et de regionibus ecclesiasticis 175
Caput II De Metropolitis 176
Caput III De conciliis particularibus 177
Caput IV De episcoporum conferentiis 181
TITULUS III DE INTERNA ORDINATIONE ECCLESIARUM PARTICULARIUM 185
Caput I De synodo dioecesana 185
Caput II De curia dioecesana 188
Art. 1. *De vicariis generalibus et episcopalibus* 190
Art. 2. *De cancellario aliisque notariis et de archivis* 192
Art. 3. *De consilio a rebus oeconomicis et de oeconomo* 195
Caput III De consilio presbyterali et de collegio consultorum 197

Раздзел I Рымскі Пантыфік і Калегія біскупаў 140
Артыкул 1. *Рымскі Пантыфік* 141
Артыкул 2. *Калегія біскупаў* 142
Раздзел II Сінод біскупаў 144
Раздзел III Кардыналы Святога Рымскага Касцёла 147
Раздзел IV Рымская курыя 151
Раздзел V Легаты Рымскага Пантыфікам 152

СЕКЦЫЯ II ПАРТЫКУЛЯРНЫЯ КАСЦЁЛЫ І ІХ АБ'ЯДНАННІ 155
ТЫТУЛ I ПАРТЫКУЛЯРНЫЯ КАСЦЁЛЫ І ЎСТАНОЎЛЕНАЯ Ў ІХ УЛАДА 155
Раздзел I Партыкулярныя Касцёлы 155
Раздзел II Біскупы 157
Артыкул 1. *Біскупы наогул* 157
Артыкул 2. *Дыяцэзіяльныя біскупы* 159
Артыкул 3. *Біскупы-каад'ютары і дапаможныя біскупы* 167
Раздзел III Перашкоды сталіцы і вакантная сталіца 170
Артыкул 1. *Перашкоды сталіцы* 170
Артыкул 2. *Вакантная сталіца* 171
ТЫТУЛ II АБ'ЯДНАННІ ПАРТЫКУЛЯРНЫХ КАСЦЁЛАЎ 175
Раздзел I Касцёльныя правінцыі і касцёльныя рэгіёны 175
Раздзел II Мітрапаліты 176
Раздзел III Партыкулярныя Сіноды 177
Раздзел IV Канферэнцыі Біскупаў 181
ТЫТУЛ III УНУТРАНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПАРТЫКУЛЯРНЫХ КАСЦЁЛАЎ 185
Раздзел I Дыяцэзіяльны Сінод 185
Раздзел II Дыяцэзіяльная Курыя 188
Артыкул 1. *Генеральныя і біскупскія вікарыі* 190
Артыкул 2. *Канцлер, іншыя натарыусы і архіў* 192
Артыкул 3. *Рада па эканамічных справах і эканом* 195
Раздзел III Святарская рада і калегія кансультантаў 197

Caput IV De canonicorum capitulis 200
Caput V De consilio pastorali 202
Caput VI De paroeciis, de parochis et de vicariis paroecialibus 203
Caput VII De vicariis foraneis 217
Caput VIII De ecclesiarum rectoribus et de cappellanis 219
Art. 1. *De ecclesiarum rectoribus* 219
Art. 2. *De cappellanis* 221

PARS III
DE INSTITUTIS VITAE CONSECRATAE ET DE SOCIETATIBUS VITAE APOSTOLICAE 223

SECTIO I DE INSTITUTIS VITAE CONSECRATAE 223
TITULUS I NORMAE COMMUNES OMNIBUS INSTITUTIS VITAE CONSECRATAE 223
TITULUS II DE INSTITUTIS RELIGIOSIS 231
Caput I De domibus religiosis earumque erectione et suppressione 232
Caput II De institutorum regimine 234
Art. 1. *De superioribus et consiliis* 234
Art. 2. *De capitulis* 238
Art. 3. *De bonis temporalibus eorumque administratione* 239
Caput III De candidatorum admissione et de sodalium institutione 242
Art. 1. *De admissione in novitiatum* 242
Art. 2. *De novitiatu et novitiorum institutione* 244
Art. 3. *De professione religiosa* 246
Art. 4. *De religiosorum institutione* 248
Caput IV De institutorum eorumque sodalium obligationibus et iuribus 249
Caput V De apostolatu institutorum 253
Caput VI De separatione sodalium ab instituto 256
Art. 1. *De transitu ad aliud institutum* 256
Art. 2. *De egressu ab instituto* 257
Art. 3. *De dimissione sodalium* 260
Caput VII De religiosis ad episcopatum evectis 264

Раздзел IV Капітулы канонікаў 200
Раздзел V Пастырская Рада 202
Раздзел VI Парафіі, пробашчы і парафіяльныя вікары 203
Раздзел VII Акруговыя вікары 217
Раздзел VIII Рэктары касцёлаў і капеланы 219
Артыкул 1. *Рэктары касцёлаў* 219
Артыкул 2. *Капеланы* 221

ЧАСТКА III
ІНСТЫТУТЫ КАНСЭКРАВАНАГА ЖЫЦЦЯ І ТАВАРЫСТВЫ АПОСТАЛЬСКАГА ЖЫЦЦЯ 223

СЕКЦЫЯ I ІНСТЫТУТЫ КАНСЭКРАВАНАГА ЖЫЦЦЯ 223
ТЫТУЛ I АГУЛЬНЫЯ НОРМЫ ДЛЯ ЎСІХ ІНСТЫТУТАЎ КАНСЭКРАВАНАГА ЖЫЦЦЯ 223
ТЫТУЛ II МАНАСКІЯ ІНСТЫТУТЫ 231
Раздзел I Манаскія дамы, іх заснаванне і ліквідацыя 232
Раздзел II Кіраванне інстытутамі 234
Артыкул 1. *Настаяцелі і рады* 234
Артыкул 2. *Капітулы* 238
Артыкул 3. *Маёмасць і адміністраванне ёю* 239
Раздзел III Прыём кандыдатаў і падрыхтоўка членаў інстытута 242
Артыкул 1. *Прыём у навіцыят* 242
Артыкул 2. *Навіцыят і падрыхтоўка навіцыяў* 244
Артыкул 3. *Складанне манаскіх абяцанняў* 246
Артыкул 4. *Падрыхтоўка манаскіх асобаў* 248
Раздзел IV Абавязкі і правы інстытутаў і іх членаў 249
Раздзел V Апостальства інстытутаў 253
Раздзел VI Выключэнне членаў з інстытута 256
Артыкул 1. *Пераход у іншы інстытут* 256
Артыкул 2. *Выхад з інстытута* 257
Артыкул 3. *Выдаленне з інстытута* 260
Раздзел VII Манаскія асобы, узведзеныя ў біскупы 264

Caput VIII De conferentiis superiorum maiorum 265
TITULUS III DE INSTITUTIS SAECULARIBUS 266

SECTIO II DE SOCIETATIBUS VITAE APOSTOLICAE 271

LIBER III
DE ECCLESIAE MUNERE DOCENDI 276

TITULUS I DE DIVINI VERBI MINISTERIO 279
Caput I De verbi Dei praedicatione 280
Caput II De catechetica institutione 283
TITULUS II DE ACTIONE ECCLESIAE MISSIONALI 285
TITULUS III DE EDUCATIONE CATHOLICA 288
Caput I De scholis 289
Caput II De catholicis universitatibus aliisque studiorum superiorum institutis 292
Caput III De universitatibus et facultatibus ecclesiasticis 294
TITULUS IV DE INSTRUMENTIS COMMUNICATIONIS SOCIALIS ET IN SPECIE DE LIBRIS 295
TITULUS V DE FIDEI PROFESSIONE 299

LIBER IV
DE ECCLESIAE MUNERE SANCTIFICANDI 301

PARS I
DE SACRAMENTIS 303

TITULUS I DE BAPTISMO 306
Caput I De baptismi celebratione 307
Caput II De baptismi ministro 309
Caput III De baptizandis 310
Caput IV De patrinis 312
Caput V De collati baptismi probatione et adnotatione 313
TITULUS II DE SACRAMENTO CONFIRMATIONIS 314

Раздзел VIII Канферэнцыі вышэйшых настаяцеляў 265
ТЫТУЛ III СЕКУЛЯРНЫЯ ІНСТЫТУТЫ 266

СЕКЦЫЯ II ТАВАРЫСТВЫ АПОСТАЛЬСКАГА ЖЫЦЦЯ 271

КНІГА III
НАСТАЎНІЦКАЕ ЗАДАННЕ КАСЦЁЛА 276

ТЫТУЛ I ПАСЛУГА БОЖАГА СЛОВА 279
Раздзел I Прапаведаванне Божага слова 280
Раздзел II Катэхетычная падрыхтоўка 283
ТЫТУЛ II МІСІЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КАСЦЁЛА 285
ТЫТУЛ III КАТАЛІЦКАЕ ВЫХАВАННЕ 288
Раздзел I Школы 289
Раздзел II Каталіцкія ўніверсітэты і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы 292
Раздзел III Касцёльныя ўніверсітэты і факультэты 294
ТЫТУЛ IV СРОДКІ САЦЫЯЛЬНАЙ КАМУНІКАЦЫІ І АСАБЛІВА КНІГІ 295
ТЫТУЛ V ВЫЗНАННЕ ВЕРЫ 299

КНІГА IV
АСВЯЧАЛЬНАЕ ЗАДАННЕ КАСЦЁЛА 301

ЧАСТКА I
САКРАМЭНТЫ 303

ТЫТУЛ I ХРОСТ 306
Раздзел I Цэлебрацыя хросту 307
Раздзел II Служыцель хросту 309
Раздзел III Прымаючыя хрост 310
Раздзел IV Хросныя 312
Раздзел V Пацвярджэнне і рэгістрацыя ўдзеленага хросту 313
ТЫТУЛ II КАНФІРМАЦЫЯ 314

Caput I De confirmationis celebratione ... 315
Caput II De confirmationis ministro ... 315
Caput III De confirmandis ... 317
Caput IV De patrinis ... 318
Caput V De collatae confirmationis probatione et adnotatione ... 318
TITULUS III DE SANCTISSIMA EUCHARISTIA ... 319
Caput I De eucharistica celebratione ... 319
Art. 1. *De sanctissimae Eucharistiae ministro* ... 320
Art. 2. *De sanctissima Eucharistia participanda* ... 322
Art. 3. *De ritibus et caeremoniis eucharisticae celebrationis* ... 325
Art. 4. *De tempore et loco celebrationis Eucharistiae* ... 326
Caput II De sanctissima Eucharistia asservanda et veneranda ... 327
Caput III De oblata ad Missae celebrationem stipe ... 330
TITULUS IV DE SACRAMENTO PAENITENTIAE ... 333
Caput I De celebratione sacramenti ... 333
Caput II De sacramenti paenitentiae ministro ... 335
Caput III De ipso paenitente ... 341
Caput IV De indulgentiis ... 341
TITULUS V DE SACRAMENTO UNCTIONIS INFIRMORUM ... 343
Caput I De sacramenti celebratione ... 343
Caput II De ministro unctionis infirmorum ... 344
Caput III De iis quibus unctio infirmorum conferenda sit ... 344
TITULUS VI DE ORDINE ... 345
Caput I De ordinationis celebratione et ministro ... 346
Caput II De ordinandis ... 348
Art. 1. *De requisitis in ordinandis* ... 349
Art. 2. *De praerequisitis ad ordinationem* ... 351
Art. 3. *De irregularitatibus aliisque impedimentis* ... 353
Art. 4. *De documentis requisitis et de scrutinio* ... 356
Caput III De adnotatione ac testimonio peractae ordinationis ... 358
TITULUS VII DE MATRIMONIO ... 359

Раздзел I Цэлебрацыя канфірмацыі 315
Раздзел II Служыцель канфірмацыі 315
Раздзел III Прымаючыя канфірмацыю 317
Раздзел IV Сведкі канфірмацыі 318
Раздзел V Пацвярджэнне і рэгістрацыя ўдзеленай канфірмацыі 318
ТЫТУЛ III НАЙСВЯЦЕЙШАЯ ЭЎХАРЫСТЫЯ 319
Раздзел I Эўхарыстычная цэлебрацыя 319
Артыкул 1. *Служыцель Найсвяцейшай Эўхарыстыі* 320
Артыкул 2. *Удзел у Найсвяцейшай Эўхарыстыі* 322
Артыкул 3. *Абрады і цырымоніі Эўхарыстычнай цэлебрацыі* 325
Артыкул 4. *Час і месца цэлебрацыі Эўхарыстыі* 326
Раздзел II Захоўванне і культ Найсвяцейшай Эўхарыстыі 327
Раздзел III Ахвяраванні, звязаныя з цэлебрацыяй Імшы 330
ТЫТУЛ IV САКРАМЭНТ ПАКАЯННЯ 333
Раздзел I Цэлебрацыя сакрамэнту 333
Раздзел II Служыцель сакрамэнту пакаяння 335
Раздзел III Пэнітэнт 341
Раздзел IV Адпусты 341
ТЫТУЛ V САКРАМЭНТ НАМАШЧЭННЯ ХВОРЫХ 343
Раздзел I Цэлебрацыя сакрамэнту 343
Раздзел II Служыцель намашчэння хворых 344
Раздзел III Тыя, каму павінна быць удзелена намашчэнне хворых 344
ТЫТУЛ VI ПАСВЯЧЭННІ 345
Раздзел I Цэлебрацыя і служыцель пасвячэння 346
Раздзел II Кандыдаты да пасвячэння 348
Артыкул 1. *Патрабаванні да кандыдатаў* 349
Артыкул 2. *Уступныя патрабаванні да пасвячэння* 351
Артыкул 3. *Ірэгулярнасці і іншыя перашкоды* 353
Артыкул 4. *Неабходныя дакументы і даследаванне* 356
Раздзел III Рэгістрацыя і пасведчанне здзейсненага пасвячэння 358
ТЫТУЛ VII СУЖЭНСТВА 359

Caput I De cura pastorali et de iis quae matrimonii celebrationi praemitti debent 361
Caput II De impedimentis dirimentibus in genere 364
Caput III De impedimentis dirimentibus in specie 366
Caput IV De consensu matrimoniali 369
Caput V De forma celebrationis matrimonii 372
Caput VI De matrimoniis mixtis 377
Caput VII De matrimonio secreto celebrando 379
Caput VIII De matrimonii effectibus 380
Caput IX De separatione coniugum 381
Art. 1. *De dissolutione vinculi* 381
Art. 2. *De separatione manente vinculo* 384
Caput X De matrimonii convalidatione 385
Art. 1. *De convalidatione simplici* 385
Art. 2. *De sanatione in radice* 387

PARS II
DE CETERIS ACTIBUS CULTUS DIVINI 388

TITULUS I DE SACRAMENTALIBUS 388
TITULUS II DE LITURGIA HORARUM 389
TITULUS III DE EXEQUIIS ECCLESIASTICIS 390
Caput I De exequiarum celebratione 391
Caput II De iis quibus exequiae ecclesiasticae concedendae sunt aut denegandae 392
TITULUS IV DE CULTU SANCTORUM, SACRARUM IMAGINUM ET RELIQUIARUM 393
TITULUS V DE VOTO ET IUREIURANDO 394
Caput I De voto 394
Caput II De iureiurando 396

PARS III
DE LOCIS ET TEMPORIBUS SACRIS 397

TITULUS I DE LOCIS SACRIS 397
Caput I De ecclesiis 399
Caput II De oratoriis et de sacellis privatis 401

Раздзел I Пастырская апека і дзеянні, якія павінны папярэднічаць заключэнню сужэнства 361
Раздзел II Перашкоды, якія выклікаюць нядзейснасць, наогул . 364
Раздзел III Асобныя перашкоды, якія выклікаюць нядзейснасць . 366
Раздзел IV Сужэнская згода 369
Раздзел V Форма цэлебрацыі сужэнства 372
Раздзел VI Змешаныя сужэнствы 377
Раздзел VII Сужэнства, якое цэлебруецца таемна 379
Раздзел VIII Наступствы сужэнства 380
Раздзел IX Раздзяленне сужэнцаў 381
Артыкул 1. *Скасаванне повязі* 381
Артыкул 2. *Сепарацыя з захаваннем повязі* 384
Раздзел X Канвалідацыя сужэнства 385
Артыкул 1. *Простая канвалідацыя* 385
Артыкул 2. *Санацыя ад пачатку* 387

ЧАСТКА II
ІНШЫЯ ДЗЕЯННІ БОЖАГА КУЛЬТУ 388

ТЫТУЛ I САКРАМЭНТАЛІІ 388
ТЫТУЛ II ЛІТУРГІЯ ГАДЗІНАЎ 389
ТЫТУЛ III КАСЦЁЛЬНАЕ ПАХАВАННЕ 390
Раздзел I Цэлебрацыя пахавання 391
Раздзел II Тыя, каму павінна быць удзелена каталіцкае пахаванне або ў ім адмоўлена 392
ТЫТУЛ IV КУЛЬТ СВЯТЫХ, СВЯТЫХ АБРАЗОЎ І РЭЛІКВІЙ 393
ТЫТУЛ V КЛЯТВА І ПРЫСЯГА 394
Раздзел I Клятва 394
Раздзел II Прысяга 396

ЧАСТКА III
СВЯТЫЯ МЕСЦЫ І ЧАСЫ 397

ТЫТУЛ I СВЯТЫЯ МЕСЦЫ 397
Раздзел I Касцёлы 399
Раздзел II Араторыі і прыватныя капліцы 401

Caput III De sanctuariis 402
Caput IV De altaribus 403
Caput V De coemeteriis 404
TITULUS II DE TEMPORIBUS SACRIS 405
Caput I De diebus festis 406
Caput II De diebus paenitentiae 407

LIBER V
DE BONIS ECCLESIAE TEMPORALIBUS 409

TITULUS I DE ACQUISITIONE BONORUM 410
TITULUS II DE ADMINISTRATIONE BONORUM 413
TITULUS III DE CONTRACTIBUS AC PRAESERTIM DE ALIENATIONE 419
TITULUS IV DE PIIS VOLUNTATIBUS IN GENERE ET DE PIIS FUNDATIONIBUS 422

LIBER VI
DE SANCTIONIBUS POENALIBUS IN ECCLESIA 427

PARS I
DE DELICTIS ET POENIS IN GENERE 427

TITULUS I DE DELICTORUM PUNITIONE GENERATIM 427
TITULUS II DE LEGE POENALI AC DE PRAECEPTO POENALI 428
TITULUS III DE SUBIECTO POENALIBUS SANCTIONIBUS OBNOXIO 430
TITULUS IV DE POENIS ALIISQUE PUNITIONIBUS 435
Caput I De censuris 435
Caput II De poenis expiatoriis 437
Caput III De remediis poenalibus et paenitentiis 440
TITULUS V DE POENARUM APPLICATIONE 441
TITULUS VI DE POENARUM REMISSIONE ET DE ACTIONUM PRAESCRIPTIONE 445

Раздзел III Санктуарыі 402
Раздзел IV Алтары 403
Раздзел V Могілкі 404
ТЫТУЛ II СВЯТЫЯ ЧАСЫ 405
Раздзел I Святочныя дні 406
Раздзел II Дні пакаяння 407

КНІГА V
МАЁМАСЦЬ КАСЦЁЛА 409

ТЫТУЛ I НАБЫЦЦЁ МАЁМАСЦІ 410
ТЫТУЛ II АДМІНІСТРАВАННЕ МАЁМАСЦЮ 413
ТЫТУЛ III ДАГАВОРЫ І ПЕРАДУСІМ — АДЧУЖЭННЕ 419
ТЫТУЛ IV ПАБОЖНЫЯ РАСПАРАДЖЭННІ НАОГУЛ І ПАБОЖНЫЯ ФОНДЫ 422

КНІГА VI
КАРНЫЯ САНКЦЫІ Ў КАСЦЁЛЕ 427

ЧАСТКА I
ЗЛАЧЫНСТВЫ І ПАКАРАННІ НАОГУЛ 427

ТЫТУЛ I КАРАННЕ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НАОГУЛ 427
ТЫТУЛ II КАРНЫ ЗАКОН І КАРНАЕ ПРАДПІСАННЕ 428
ТЫТУЛ III СУБ'ЕКТЫ, ЯКІЯ ПАДЛЯГАЮЦЬ КАРНЫМ САНКЦЫЯМ 430
ТЫТУЛ IV ПАКАРАННІ І ІНШЫЯ КАРНЫЯ СРОДКІ 435
Раздзел I Цэнзуры 435
Раздзел II Экспіяцыйныя пакаранні 437
Раздзел III Карныя сродкі і пакаянні 440
ТЫТУЛ V ПРЫЗНАЧЭННЕ ПАКАРАННЯЎ 441
ТЫТУЛ VI ВЫЗВАЛЕННЕ АД ПАКАРАННЯЎ І КАРНАЯ ДАЎНАСЦЬ 445

PARS II
DE SINGULIS DELICTIS DEQUE POENIS IN EADEM CONSTITUTIS 449

TITULUS I DE DELICTIS CONTRA FIDEM ET ECCLESIAE UNITATEM 449
TITULUS II DE DELICTIS CONTRA ECCLESIASTICAM AUCTORITATEM ET MUNERUM EXERCITIUM 450
TITULUS III DE DELICTIS CONTRA SACRAMENTA 454
TITULUS IV DE DELICTIS CONTRA BONAM FAMAM ET DE DELICTO FALSI 457
TITULUS V DE DELICTIS CONTRA SPECIALES OBLIGATIONES 458
TITULUS VI DE DELICTIS CONTRA HOMINIS VITAM, DIGNITATEM ET LIBERTATEM 460
TITULUS VII NORMA GENERALIS 461

LIBER VII
DE PROCESSIBUS 462

PARS I
DE IUDICIIS IN GENERE 462

TITULUS I DE FORO COMPETENTI 463
TITULUS II DE VARIIS TRIBUNALIUM GRADIBUS ET SPECIEBUS . 466
Caput I De tribunali primae instantiae 466
Art. 1. *De iudice* 466
Art. 2. *De auditoribus et relatoribus* 470
Art. 3. *De promotore iustitiae, vinculi defensore et notario* 470
Caput II De tribunali secundae instantiae 472
Caput III De apostolicae sedis tribunalibus 474
TITULUS III DE DISCIPLINA IN TRIBUNALIBUS SERVANDA 475
Caput I De disciplina iudicum et tribunalium ministrorum 475
Caput II De ordine cognitionum 479
Caput III De terminis et dilationibus 481

ЧАСТКА II
АСОБНЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ
І ЎСТАНОЎЛЕНЫЯ ЗА ІХ ПАКАРАННІ 449

ТЫТУЛ І ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ВЕРЫ
І ЕДНАСЦІ КАСЦЁЛА 449
ТЫТУЛ ІІ ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ КАСЦЁЛЬНАЙ УЛАДЫ
І АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ЗАДАННЯЎ 450
ТЫТУЛ ІІІ ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ САКРАМЭНТАЎ 454
ТЫТУЛ IV ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ДОБРАГА ІМЯ
І ЗЛАЧЫНСТВА ПАКЛЁПУ 457
ТЫТУЛ V ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ
СПЕЦЫЯЛЬНЫХ АБАВЯЗКАЎ 458
ТЫТУЛ VI ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ЖЫЦЦЯ,
ГОДНАСЦІ І СВАБОДЫ ЧАЛАВЕКА 460
ТЫТУЛ VII АГУЛЬНАЯ НОРМА 461

КНІГА VII
ПРАЦЭСЫ 462

ЧАСТКА І
СУДОВЫЯ ПРАЦЭСЫ НАОГУЛ 462

ТЫТУЛ І КАМПЕТЭНЦЫЯ СУДА 463
ТЫТУЛ ІІ РОЗНЫЯ СТУПЕНІ І ВІДЫ ТРЫБУНАЛАЎ 466
Раздзел І Трыбунал першай інстанцыі 466
Артыкул 1. *Суддзя* 466
Артыкул 2. *Аўдытары і рэлятары* 470
Артыкул 3. *Прамотар справядлівасці, абаронца повязі і натарыус* 470
Раздзел ІІ Трыбунал другой інстанцыі 472
Раздзел ІІІ Трыбуналы Апостальскай Сталіцы 474
ТЫТУЛ ІІІ ПАРАДАК, ЯКІ ПАВІНЕН ЗАХОЎВАЦЦА
Ў ТРЫБУНАЛАХ 475
Раздзел І Абавязкі суддзяў
і служачых трыбуналаў 475
Раздзел ІІ Парадак разгляду спраў 479
Раздзел ІІІ Тэрміны і адтэрміноўкі 481

Caput IV De loco iudicii 482
Caput V De personis in aulam admittendis et de modo conficiendi et conservandi acta 482
TITULUS IV DE PARTIBUS IN CAUSA 484
Caput I De actore et de parte conventa 484
Caput II De procuratoribus ad lites et advocatis 486
TITULUS V DE ACTIONIBUS ET EXCEPTIONIBUS 489
Caput I De actionibus et exceptionibus in genere 489
Caput II De actionibus et exceptionibus in specie 490

PARS II
DE IUDICIO CONTENTIOSO 491

SECTIO I DE IUDICIO CONTENTIOSO ORDINARIO 491
TITULUS I DE CAUSAE INTRODUCTIONE 491
Caput I De libello litis introductorio 491
Caput II De citatione et denuntiatione actorum iudicialium 493
TITULUS II DE LITIS CONTESTATIONE 495
TITULUS III DE LITIS INSTANTIA 496
TITULUS IV DE PROBATIONIBUS 498
Caput I De partium declarationibus 499
Caput II De probatione per documenta 501
Art. 1. *De natura et fide documentorum* 501
Art. 2. *De productione documentorum* 502
Caput III De testibus et attestationibus 502
Art. 1. *Qui testes esse possunt* 503
Art. 2. *De inducendis et excludendis testibus* 504
Art. 3. *De testium examine* 504
Art. 4. *De testimoniorum fide* 508
Caput IV De peritis 508
Caput V De accessu et de recognitione iudiciali 510
Caput VI De praesumptionibus 511
TITULUS V DE CAUSIS INCIDENTIBUS 511
Caput I De partibus non comparentibus 512
Caput II De interventu tertii in causa 514

Раздзел IV Месца судовага працэсу 482
Раздзел V Асобы, якія дапускаюцца ў залу, і парадак складання і захоўвання актаў 482
ТЫТУЛ IV БАКІ Ў СПРАВЕ 484
Раздзел I Пазоўнік і адказчык 484
Раздзел II Судовыя прадстаўнікі і адвакаты 486
ТЫТУЛ V ПОЗВЫ І ПЯРЭЧАННІ 489
Раздзел I Позвы і пярэчанні наогул 489
Раздзел II Асобныя позвы і пярэчанні 490

ЧАСТКА II
СПРЭЧНЫ СУДОВЫ ПРАЦЭС 491

СЕКЦЫЯ I ЗВЫЧАЙНЫ СПРЭЧНЫ СУДОВЫ ПРАЦЭС 491
ТЫТУЛ I УНЯСЕННЕ СПРАВЫ 491
Раздзел I Пазоўная заява, якой уносіцца спрэчная справа ... 491
Раздзел II Выклік у суд і паведамленні аб працэсуальных дзеяннях 493
ТЫТУЛ II ПАЧАТАК СУДОВАЙ СПРЭЧКІ 495
ТЫТУЛ III ІНСТАНЦЫЯ СУДОВАЙ СПРЭЧКІ 496
ТЫТУЛ IV ДОКАЗЫ 498
Раздзел I Паказанні бакоў 499
Раздзел II Даказванне на падставе дакументаў 501
Артыкул 1. *Прырода і верагоднасць дакументаў* 501
Артыкул 2. *Прадстаўленне дакументаў* 502
Раздзел III Сведкі і паказанні 502
Артыкул 1. *Хто можа быць сведкам* 503
Артыкул 2. *Выклік і выключэнне сведкаў* 504
Артыкул 3. *Допыт сведкаў* 504
Артыкул 4. *Верагоднасць паказанняў сведкаў* 508
Раздзел IV Спецыялісты 508
Раздзел V Агляд і судовае даследаванне 510
Раздзел VI Прэзумпцыі 511
ТЫТУЛ V ПАБОЧНЫЯ СПРАВЫ 511
Раздзел I Адсутнасць бакоў 512
Раздзел II Удзел трэціх асобаў у справе 514

TITULUS VI DE ACTORUM PUBLICATIONE, DE CONCLUSIONE IN CAUSA ET DE CAUSAE DISCUSSIONE 514
TITULUS VII DE IUDICIS PRONUNTIATIONIBUS 517
TITULUS VIII DE IMPUGNATIONE SENTENTIAE 521
Caput I De querela nullitatis contra sententiam 521
Caput II De appellatione 524
TITULUS IX DE RE IUDICATA ET DE RESTITUTIONE IN INTEGRUM 527
Caput I De re iudicata 527
Caput II De restitutione in integrum 528
TITULUS X DE EXPENSIS IUDICIALIBUS ET DE GRATUITO PATROCINIO 530
TITULUS XI DE EXSECUTIONE SENTENTIAE 530

SECTIO II DE PROCESSU CONTENTIOSO ORALI 533

PARS III
DE QUIBUSDAM PROCESSIBUS SPECIALIBUS 536

TITULUS I DE PROCESSIBUS MATRIMONIALIBUS 536
Caput I De causis ad matrimonii nullitatem declarandam 536
Art. 1. *De foro competenti et de tribunalibus* 536
Art. 2. *De iure impugnandi matrimonium* 538
Art. 3. *De causae introductione et instructione* 538
Art. 4. *De sententia, de eiusdem impugnationibus et exsecutione* 540
Art. 5. *De processu matrimoniali breviore coram Episcopo* 542
Art. 6. *De processu documentali* 544
Art. 7. *Normae generales* 544
Caput II De causis separationis coniugum 545
Caput III De processu ad dispensationem super matrimonio rato et non consummato 546
Caput IV De processu praesumptae mortis coniugis 549
TITULUS II DE CAUSIS AD SACRAE ORDINATIONIS NULLITATEM DECLARANDAM 550
TITULUS III DE MODIS EVITANDI IUDICIA 550

ТЫТУЛ VI ПУБЛІКАЦЫЯ АКТАЎ, ЗАВЯРШЭННЕ РАЗГЛЯДУ СУТНАСЦІ СПРАВЫ І СУДОВЫЯ ДЭБАТЫ 514
ТЫТУЛ VII ПАСТАНОВЫ СУДДЗІ 517
ТЫТУЛ VIII АСПРЭЧВАННЕ ПРЫСУДУ 521
Раздзел I Скарга аб нядзейснасці прысуду 521
Раздзел II Апеляцыя 524
ТЫТУЛ IX СТАН *RES IUDICATA* І ВЯРТАННЕ Ў ЗЫХОДНЫ СТАН 527
Раздзел I Стан *res iudicata* 527
Раздзел II Вяртанне ў зыходны стан 528
ТЫТУЛ X СУДОВЫЯ ВЫДАТКІ І БЯСПЛАТНАЯ СУДОВАЯ ДАПАМОГА 530
ТЫТУЛ XI ВЫКАНАННЕ СУДОВАГА РАШЭННЯ 530

СЕКЦЫЯ II ВУСНЫ СПРЭЧНЫ ПРАЦЭС 533

ЧАСТКА III
НЕКАТОРЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ ПРАЦЭСЫ 536

ТЫТУЛ I СУЖЭНСКІЯ ПРАЦЭСЫ 536
Раздзел I Справы аб сцвярджэнні нядзейснасці сужэнства 536
Артыкул 1. *Кампетэнцыя суда і трыбуналы* 536
Артыкул 2. *Права на аспрэчванне сужэнства* 538
Артыкул 3. *Унясенне і інструкцыя справы* 538
Артыкул 4. *Прысуд, яго аспрэчванне і выкананне* 540
Артыкул 5. *Скарочаны сужэнскі працэс перад біскупам* 542
Артыкул 6. *Дакументальны працэс* 544
Артыкул 7. *Агульныя нормы* 544
Раздзел II Справы аб сепарацыі сужэнцаў 545
Раздзел III Працэс аб дыспенсацыі ад заключанага, але нядзейсненага сужэнства 546
Раздзел IV Працэс аб меркаванай смерці сужэнца 549
ТЫТУЛ II СПРАВЫ АБ СЦВЯРДЖЭННІ НЯДЗЕЙСНАСЦІ СВЯТОГА ПАСВЯЧЭННЯ 550
ТЫТУЛ III СПОСАБЫ ПАЗБЕГНУЦЬ СУДОВЫХ ПРАЦЭСАЎ 550

PARS IV
DE PROCESSU POENALI 552

Caput I De praevia investigatione 552
Caput II De processus evolutione 553
Caput III De actione ad damna reparanda 556

PARS V
DE RATIONE PROCEDENDI IN RECURSIBUS ADMINISTRATIVIS ATQUE IN PAROCHIS AMOVENDIS VEL TRANSFERENDIS 557

SECTIO I DE RECURSU ADVERSUS DECRETA ADMINISTRATIVA 557

SECTIO II DE PROCEDURA IN PAROCHIS AMOVENDIS VEL TRANSFERENDIS 560

Caput I De modo procedendi in amotione parochorum 560
Caput II De modo procedendi in translatione parochorum 563

ЧАСТКА IV
КАРНЫ ПРАЦЭС 552

Раздзел I Папярэдняе расследаванне 552
Раздзел II Парадак працэсу 553
Раздзел III Позва аб выпраўленні шкоды 556

ЧАСТКА V
ПАРАДАК ДЗЕЯННЯЎ ПРЫ АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ РЭКУРСАХ, А ТАКСАМА ПРЫ ЗВАЛЬНЕННЯХ АБО ПЕРАМЯШЧЭННЯХ ПРОБАШЧАЎ 557

СЕКЦЫЯ I РЭКУРС СУПРАЦЬ АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ ДЭКРЭТАЎ 557

СЕКЦЫЯ II ПРАЦЭДУРА ЗВАЛЬНЕННЯ АБО ПЕРАМЯШЧЭННЯ ПРОБАШЧАЎ 560

Раздзел I Парадак дзеянняў пры звальненнях пробашчаў 560
Раздзел II Парадак дзеянняў пры перамяшчэннях пробашчаў 563

ІНДЭКС ПАНЯЦЦЯЎ 565

ПРАДМОВА ДА ПЕРШАГА ПЕРАКЛАДУ КОДЭКСА КАНАНІЧНАГА ПРАВА НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

Трыццацігоддзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Святым Пасадам і Рэспублікай Беларусь, якое адзначаецца ў 2022 годзе, з'яўляецца добрай нагодай для таго, каб думкамі і ўспамінамі вярнуцца да пачатку дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя, калі Ян Павел II, Рымскі Пантыфік, 11 лістапада 1992 года апостальскім лістом *Quantam tandem* заснаваў у Мінску Апостальскую Нунцыятуру, як знак сваёй блізкасці да народа і партыкулярнага Касцёла Беларусі. У той час вецер грамадска-палітычных перамен напаўняў свежым паветрам ветразі адноўленай беларускай дзяржаўнасці, а Каталіцкі Касцёл на беларускай зямлі, абяздолены дзесяцігоддзямі атэістычнага пераследу, але ніколі не зломлены, дачакаўся жыццядайнага подыху Духа Святога, што відавочна ўзмацняў адданасць і рашучасць вернікаў, перад якімі ўзнікла па людскіх мерках амаль невыканальнае заданне адраджэння Касцёла, бачныя структуры якога ў Беларусі былі адноўлены і ўтвораны папам Янам Паўлам II у 1991 годзе. Вернутая свабода веравызнання і выконвання Касцёлам збаўчай місіі, даверанай яму Панам нашым Езусам Хрыстом, першапачаткова патрабавала ахвярнай працы над выхаваннем у веры дзяцей і дарослых, стварэння парафіяльных супольнасцяў, адбудовы і пабудовы святыняў. З цягам часу, калі расла колькасць высокаадукаваных у рэлігійных дысцыплінах вернікаў і святароў, актывізавалася дзейнасць па падрыхтоўцы і выданні перакладаў на беларускую мову літургічных кніг, дакументаў Касцёла, урэшце — Святога Пісання.

Сёння мы з радасцю трымаем у руках асаблівую кнігу — першы ў гісторыі беларускі пераклад з паралельным лацінскім тэкстам дзеючага Кодэкса кананічнага права, які з'яўляецца галоўным заканадаўчым дакументам Касцёла, прамульгаваным Рымскім Пантыфікам Янам Паўлам II у 1983 годзе. Гэты Кодэкс, заснаваны на адвечнай спадчыне Аб'яўлення і Традыцыі, слушна лічыцца своеасаблівым пераказам на кананічную мову навучання

Другога Ватыканскага Сабору аб прыродзе Касцёла і яго пакліканні ў свеце, аб разнастайнасці служэнняў у Божым народзе і тым, на якіх каштоўнасцях павінны будавацца і як павінны дзейнічаць яго бачныя структуры.

Значэнне беларускага пераладу Кодэкса кананічнага права для партыкулярнага Касцёла ў Беларусі раскрываецца больш поўна праз усведамленне той істотнай ролі, якую гэты кадыфікаваны заканадаўчы акт мае для Паўсюднага Касцёла і — больш за тое — для самой паўсюднасці Касцёла. Дзеючы Кодэкс засноўваецца на прынцыпе, замацаваным у яго апошнім, 1752 каноне: *salus animarum suprema lex*, інакш кажучы — на тым, што ўся касцёльная заканатворчасць павінна быць накіравана на збаўленне чалавечай душы, дзеля чаго Пан наш Езус Хрыстус прыйшоў на свет, памёр на крыжы і ўваскрос. Менавіта евангельскае вучэнне Збаўцы, якое напаўняе хрысціянскую антрапалогію новым і ўзнёслым зместам, заснаваным на годнасці чалавека як Божага дзіцяці і пакліканні яго да вечнага жыцця, стварае падставу для існавання і еднасці Касцёла ў якасці зямной, складзенай і арганізаванай з асобных людзей рэчаіснасці, адкрытай у той жа час на трансцэндэнтнае вымярэнне быцця Містычным целам Хрыста.

Не выклікае сумненняў, што беларускі пераклад дзеючага Кодэкса, які Канферэнцыя Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі з задавальненнем перадае перадусім вернікам і святарам Каталіцкага Касцёла ў Беларусі, не толькі паслужыць больш дакладнаму і свядомаму выкананню яго ў правапрымяняльнай практыцы партыкулярнага Касцёла, але будзе таксама з зацікаўленасцю прыняты шырокім колам людзей добрай волі, якія пажадаюць даследаваць у першакрыніцы прававое ўпарадкаванне Каталіцкага Касцёла. Варта адзначыць, што прызнанне ўплыву, які ў гістарычнай рэтраспектыве кананічнае права Касцёла аказвала на станаўленне і развіццё беларускай дзяржавы і права, пачынаючы ад прывілеяў Ягайлы праз векапомныя Статуты Вялікага Княства Літоўскага, з'яўляецца агульным месцам у беларускай гістарычна-прававой навуцы. Спадзяёмся, што таксама і ў наш час выданне беларускага пераладу Кодэкса кананічнага права стане адметнай падзеяй у абшары прававой культуры Беларусі, якая бясспрэчна належыць да еўрапейскай цывілізацыі, пабудаванай у сваіх падставах на рымскім праве, грэцкай філасофіі і хрысціянскай маральнасці. Першы беларускі пераклад дзеючага Кодэкса канонаў Каталіцкага Касцёла несумненна ўзбагачае гэтую прававую культуру, перадусім тым, што змяшчае ў сабе распрацаваную і дастасаваную да асаблівасцяў беларускай мовы кананічную прававую тэрміналогію, пэўныя ўстойлівыя выразы і спосабы выражэння заканадаўчай думкі, якія дазваляюць у супастаўленні з паралельным лацінскім тэкстам больш поўна зразумець адметныя рысы касцёльнага праваўладкавання.

Пераклад і выданне такога фундаментальнага твора прававой думкі Касцёла, як Кодэкс кананічнага права, — гэта перадусім праца канкрэтных людзей, чые руплівасць, веды і працаздольнасць заслугоўваюць асабістага ўзгадвання. Першыя захады да ажыццяўлення гэтага перакладу Кодэкса на беларускую мову зрабіў ксёндз канонік Дзмітрый Пухальскі, спецыяліст у кананічным праве, канцлер Курыі Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі, у межах падрыхтоўкі да выкладання кананічнага права алюмнам духоўных семінарый у Гродне і Пінску. З цягам часу да яго далучыўся ксёндз канонік Андрэй Зноска, юрыст і спецыяліст у кананічным праве, кансультант Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі па прававых пытаннях. На працягу 2020–2022 гадоў у пастаянным цесным супрацоўніцтве, абмеркаваннях і дыскусіях яны выпрацоўвалі аднастайны і дакладны падыход да перакладу канонаў з лацінскай мовы, захоўваючы безумоўную павагу да арыгінальнага тэксту. Выкананая імі праца была тым больш складанай, што не магла абмяжоўвацца чыста тэхнічным перакладам, а патрабавала глыбокага разумення прававых нормаў, змешчаных у канонах, і акрэслення таго, у якіх выпадках і наколькі дапушчальнымі ў кананічным праве могуць быць пэўныя запазычанні з юрыдычнай тэрміналогіі, усталяванай у беларускім дзяржаўным праве. Выдатную дапамогу ў дапрацоўцы кананічнай тэрміналогіі і яе ўзгадненні з існуючымі беларускімі касцёльнымі выданнямі аказалі спецыялісты Секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў і афіцыйных дакументаў Касцёла Камісіі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі, а таксама суддзі касцёльных трыбуналаў, якія накіравалі свае пытанні і прапановы адносна перакладу Кодэкса. Важны ўнёсак у падрыхтоўку перакладу зрабілі філолагі Алесь Жлутка і Анастасія Грышан. Вялікі аб'ём працы па прывядзенні тэксту перакладу ў адпаведнасць з акадэмічнымі патрабаваннямі сучаснай беларускай мовы выканала кандыдат філалагічных навук Алена Садоўская. Уся гэта працяглая ў часе і складаная арганізацыйна праца стала магчымай і выканальнай выключна дзякуючы ініцыятыве, энергіі і асабістай упэўненасці ў яе неабходнасці для Каталіцкага Касцёла ў Беларусі арцыбіскупа Антэ Ёзіча, Апостальскага Нунцыя ў Рэспубліцы Беларусь.

Усім гэтым асобам, разам і паасобку, у тым ліку тым, хто падрыхтаваў Кодэкс да друку, выказваем глыбокую і шчырую ўдзячнасць, а таксама віншуем з завяршэннем адказнага задання, якое яны выконвалі як хрысціянскую паслугу і якое несумненна ўзбагаціла іх цікавым і плённым досведам асабістага дачынення да праваўладкавання Касцёла.

Выражаем надзею, што публікацыя дзеючага Кодэкса кананічнага права на беларускай мове будзе спрыяць умацаванню належнага правапарадку ў партыкулярным Касцёле ў Беларусі, а для шматлікіх людзей стане добрай магчымасцю лепшага пазнання Каталіцкага Касцёла.

Мінск, 2 ліпеня 2022 года,
ва ўрачыстасць Найсвяцейшай Панны Марыі Будслаўскай

✠ АЛЕГ БУТКЕВІЧ
Біскуп Віцебскі
Старшыня Канферэнцыі
Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі

CONSTITUTIO APOSTOLICA
SACRAE DISCIPLINAE LEGES

VENERABILIBUS FRATRIBUS CARDINALIBUS,
ARCHIEPISCOPIS, EPISCOPIS, PRESBYTERIS, DIACONIS
CETERISQUE POPULI DEI MEMBRIS
IOANNES PAULUS EPISCOPUS
SERVUS SERVORUM DEI
AD PERPETUAM REI MEMORIAM

Sacrae disciplinae leges Catholica Ecclesia, procedente tempore, reformare ac renovare Consuevit, ut, fidelitate erga Divinum Conditorem Semper servata, eaedem cum salvifica missione ipsi concredita apte congruerent. Non alio ducti proposito Nos, exspectationem totius catholici orbis tandem explentes, hac die XXV mensis Ianuarii, anno MCMLXXXIII, Codicem Iuris Canonici recognitum foras dari iubemus. Quod dum facimus, ad eandem diem anni MCMLIX cogitatio Nostra convolat, qua Decessor Noster fel. rec. Ioannes XXIII primum publice nuntiavit captum ab se Consilium reformandi vigens Corpus legum canonicarum, quod anno MCMXVII, in sollemnitate Pentecostes, fuerat promulgatum.

Quod quidem consilium Codicis renovandi una Cum duobus aliis initum est, de quibus ille Pontifex eadem die est locutus, quae spectant ad voluntatem Synodum dioecesis Romanae celebrandi et Concilium Oecumenicum convocandi Quorum eventuum, etsi prior non multum ad Codicis reformationem attineat, alter tamen, hoc est Concilium, maximi momenti est ad rem nostram quod spectat et cum eius substantia arcte coniungitur.

Quod si quaestio ponatur cur Ioannes XXIII necessitatem persenserit vigentis Codicis reformandi, responsio fortasse in eodem Codice, anno MCMXVII promulgato, invenitur. Attamen alia quoque responsio est, eademque praecipua: scilicet reformatio Codicis Iuris Canonici prorsus posci atque expeti videbatur ab ipso Concilio, quod in Ecclesiam maximopere considerationem suam converterat.

Ut omnino patet, cum primum de Codice recognoscendo nuntium datum est, Concilium negotium erat quod totum ad futurum tempus pertinebat. Accedit quod eius magisterii acta ac praesertim eius de Ecclesia doctrina annis MCMLXII-MCMLXV

АПОСТАЛЬСКАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ
SACRAE DISCIPLINAE LEGES

ВЯЛЕБНЫМ БРАТАМ КАРДЫНАЛАМ,
АРЦЫБІСКУПАМ, БІСКУПАМ, ПРЭЗБІТЭРАМ, ДЫЯКАНАМ
І ІНШЫМ ЧЛЕНАМ БОЖАГА НАРОДА
ЯН ПАВЕЛ, БІСКУП,
СЛУГА СЛУГАЎ БОЖЫХ,
НА ВЕЧНУЮ ПАМЯЦЬ АБ СПРАВЕ

Законы святой дысцыпліны Каталіцкі Касцёл звычайна з цягам часу пераглядае і абнаўляе, каб яны, будучы заўсёды вернымі ў адносінах да Боскага Заснавальніка, належна адпавядалі даручанай яму збаўчай місіі. Натхнёныя гэтай мэтай і спаўняючы чаканні ўсяго каталіцкага свету, у гэты дзень, 25 студзеня 1983 г., Мы наказваем абнародаваць перагледжаны Кодэкс кананічнага права. Калі Мы чынім гэта, Нашы думкі вяртаюцца да таго дня, калі Наш Папярэднік, святой памяці Ян XXIII, упершыню публічна абвясціў аб прынятым ім рашэнні рэфармаваць дзеючы Корпус кананічных законаў, які быў прамульгаваны ў 1917 г. на ўрачыстасць Пяцідзясятніцы.

Рашэнне абнавіць Кодэкс было прынята разам з двума іншымі, аб якіх Пантыфік казаў у той дзень і якія мелі на ўвазе правядзенне Сіноду Рымскай дыяцэзіі і скліканне Паўсюднага Сабору. І калі першая з гэтых падзей не мае нейкага істотнага дачынення да рэфармавання Кодэкса, то другая, гэта значыць Сабор, з'яўляецца надзвычай важнай для нашага прадмета і моцна злучана з самай яго сутнасцю.

Калі ставіцца пытанне, чаму Ян XXIII адчуў неабходнасць рэфармаваць дзеючы Кодэкс, то адказ на гэта, магчыма, знаходзіцца ў самім Кодэксе, прамульгаваным у 1917 г. Аднак ёсць і іншы адказ, прычым самы галоўны: рэфармаванне Кодэкса кананічнага права проста здавалася жаданым і запатрабаваным самім Саборам, які найбольшую сваю ўвагу звярнуў на Касцёл.

Як вядома, калі было зроблена першае паведамленне аб пераглядзе Кодэкса, Сабор быў яшчэ цалкам справай будучыні. Да таго ж, яго настаўніцкія дакументы, асабліва вучэнне аб Касцёле, павінны былі быць апрацаваны ў

perficienda erant; attamen animi perceptionem Ioannis XXIII fuisse verissimam nemo non videt, eiusque consilium iure merito dicendum est in longinquum Ecclesiae bono prospexisse.

Quapropter novus Codex, qui hodie in publicum prodit, praeviam Concilii operam necessario postulavit; et quamquam una cum Oecumenico illo coetu est praenuntiatus, tamen tempore eundem sequitur, quia labores, ad illum apparandum suscepti, cum in Concilio niti deberent, nonnisi post idem absolutum incipere potuerunt.

Mentem autem hodie convertentes ad exordium illius itineris, hoc est ad diem illam XXV Ianuarii anno MCMLIX, atque ad ipsum Ioannem XXIII, Codicis recognitionis initiatorem, fateri debemus hunc Codicem ab uno eodemque proposito profluxisse, rei christianae scilicet restaurandae; a quo quidem proposito totum Concilii opus suas normas suumque ductum praesertim accepit.

Quod si nunc considerationem intendimus ad naturam laborum, qui Codicis promulgationem praecesserunt, itemque ad modum quo iidem confecti sunt, praesertim inter Pontificatus Pauli VI et Ioannis Pauli I, ac deinceps usque ad praesentem diem, id claro in lumine ponatur omnino oportet, huiusmodi labores spiritu insigniter collegiali ad exitum esse perductos; idque non solum respicit externam operis compositionem, verum etiam ipsam conditarum legum substantiam penitus afficit.

Haec vero nota collegialitatis, qua processus originis huius Codicis eminenter distinguitur, cum magisterio et indole Concilii Vaticani II plane congruit. Quare Codex non modo ob ea quae continet, sed etiam iam in suo ortu prae se fert afflatum huius Concilii, in cuius documentis Ecclesia, universale sacramentum salutis, tamquam Populus Dei ostenditur eiusque hierarchica constitutio in Collegio Episcoporum una cum Capite suo nixa perhibetur.

Hac igitur de causa Episcopi et Episcopatus invitati sunt ad sociam operam praestandam in novo Codice apparando, ut per tam longum iter, ratione quantum fieri posset collegiali, paulatim formulae iuridicae maturescerent, quae, deinde, in usum universae Ecclesiae inservire deberent. Omnibus vero huius negotii temporibus labores participaverunt etiam periti, viri scilicet peculiari scientia praediti in theologica doctrina, in historia ac maxime in iure canonico, qui ex universis terrarum orbis regionibus sunt arcessiti.

Quibus singulis universis hodie gratissimi animi sensus ultro proferimus.

In primis ob oculos Nostros obversantur Cardinales vita functi, qui Commissioni praeparatoriae praefuerunt: Cardinalis Petrus Ciriaci, qui opus inchoavit, et Cardinalis Pericles Felici, qui complures per annos laborum iter moderatus est, fere usque ad metam. Cogitamus deinde Secretarios eiusdem Commissionis: Reverendissimum D. Iacobum Violardo, postmodum Cardinalem, ac P. Raimundum

1962–1965 г. Аднак кожнаму ясна, што задума Яна XXIII, як з поўным правам можна сказаць, сталася найбольш слушнай, а яго рашэнне паслужыла дабру Касцёла на доўгія гады наперад.

Таму новы Кодэкс, які выходзіць цяпер у свет, запатрабаваў папярэдняй працы Сабору; і хоць пра яго і пра Сабор было папярэдне абвешчана ў адзін і той жа час, аднак з'явіўся ён ужо пасля Сабору, паколькі праца, якая рабілася для яго падрыхтоўкі, павінна была засноўвацца на дакументах Сабору і магла пачацца толькі пасля яго завяршэння.

Звяртаючыся сёння ў думках да пачатку гэтага шляху, гэта значыць да таго дня 25 студзеня 1959 г., а таксама да самога Яна XXIII, ініцыятара перагляду Кодэкса, Мы павінны прызнаць, што гэты Кодэкс стаў вынікам адной і той самай задумы аб абнаўленні хрысціянскага жыцця; і перш за ўсё менавіта гэтая задума вызначыла ўсю працу Сабору, яго нормы і ўвесь яго ход.

Калі цяпер мы звернем увагу на характар працы, якая папярэднічала прамульгацыі Кодэкса, а таксама на тое, як яна была выканана, асабліва ў гады пантыфікатаў Паўла VI і Яна Паўла I, а таксама з таго часу аж да сённяшняга дня, то варта перадусім падкрэсліць, што гэтая праца была даведзена да канца ў цудоўным калегіяльным духу. Гэта датычыць не толькі знешняй будовы дакумента, але і самой сутнасці ўстаноўленых у ім законаў.

Гэтая адзнака калегіяльнасці, якая так выдатна адрознівае працэс стварэння Кодэкса, цалкам адпавядае вучэнню і сутнасці Другога Ватыканскага Сабору. Таму Кодэкс не толькі ў сваім змесце, але ўжо і ў самім сваім з'яўленні пазначаны натхняльным уздзеяннем гэтага Сабору, у дакументах якога Касцёл — Таямніца агульнага збаўлення — прадстаўлены як Божы народ, а яго іерархічная будова абапіраецца на Калегію Біскупаў разам з яе Галавой.

З гэтай прычыны біскупы і епіскапаты былі запрошаны да супрацоўніцтва ў падрыхтоўцы новага Кодэкса, каб на працягу такога доўгага шляху, у працы па магчымасці калегіяльнай, паступова выспявалі прававыя фармулёўкі, якія пасля павінны былі ўвайсці ва ўжытак ва ўсім Касцёле. На ўсіх этапах працы ў ёй прымалі ўдзел таксама спецыялісты, гэта значыць людзі, якія маюць спецыяльныя тэалагічныя і гістарычныя веды, а асабліва ў галіне кананічнага права; яны былі запрошаны з усіх рэгіёнаў свету.

Усім ім, разам і паасобку, мы сёння выказваем нашу сардэчную ўдзячнасць.

Найперш перад Нашымі вачамі паўстаюць памерлыя кардыналы, якія ўзначальвалі падрыхтоўчую камісію: кардынал П'етра Чырыячы, які пачаў гэтую справу, і кардынал Пэрыклес Фэлічы, які шмат гадоў кіраваў ходам працы, амаль да яе завяршэння. Таксама Мы думаем пра сакратароў гэтай камісіі: найдастойнейшага Якаба Віёлярда, пазней кардынала, і Айца Рай-

Bidagor, Societatis Iesu sodalem, qui ambo in hoc munere explendo doctrinae ac sapientiae suae dona profuderunt. Simul cum illis recolimus Cardinales, Archiepiscopos, Episcopos, quotquot illius Commissionis membra fuerunt, necnon Consultores singulorum Coetuum a studiis hisce annis ad tam strenuum opus adhibitos, quos Deus interim ad aeterna praemia vocavit. Pro his omnibus suffragans precatio Nostra ad Deum ascendit.

Sed placet etiam commemorare viventes, in primisque hodiernum Commissionis Pro-Praesidem, nempe Venerabilem Fratrem Rosalium Castillo Lara, qui diutissime tanto muneri operam navavit egregiam; ac, post illum, dilectum filium Villelmum Onclin, sacerdotem, qui assidua diligentique cura ad felicem operis exitum valde contulit, ceterosque qui in eadem Commissione sive ut Sodales Cardinales, sive ut Officiales, Consultores Cooperatoresque in Coetibus a studiis vel in aliis Officiis, suas maximi pretii partes contulerunt, ad tantae molis tantaeque implicationis opus elaborandum atque perficiendum.

Codicem itaque hodie promulgantes, Nos plane conscii sumus hunc actum a Nostra quidem Pontificis auctoritate proficisci, ac proinde induere naturam primatialem. Attamen pariter conscii sumus hunc Codicem, ad materiam quod attinet, in se referre collegialem sollicitudinem de Ecclesia omnium Nostrorum in Episcopatu Fratrum; quinimmo, quasi ex quadam similitudine ipsius Concilii, idem Codex habendus est veluti fructus collegialis cooperationis, quae orta est ex expertorum hominum institutorumque viribus per universam Ecclesiam in unum coalescentibus.

Altera oritur quaestio, quidnam sit Codex Iuris Canonici. Cui interrogationi ut rite respondeatur, mente repetenda est longinqua illa hereditas iuris, quae in libris Veteris et Novi Testamenti continetur, ex qua tota traditio iuridica et legifera Ecclesiae, tamquam a suo primo fonte, originem ducit.

Christus enim Dominus uberrimam hereditatem Legis et Prophetarum, quae ex historia et experientia Populi Dei in Vetere Testamento paulatim creverat, minime destruxit, sed implevit, ita ut ipsa novo et altiore modo ad hereditatem Novi Testamenti pertineret. Quamvis ergo Sanctus Paulus, mysterium paschale exponens, doceat iustificationem non ex legis operibus, sed ex fide dari, tamen nec vim obligantem Decalogi excludit, nec momentum disciplinae in Ecclesia Dei negat. Sic Novi Testamenti scripta sinunt, ut nos multo magis percipiamus hoc ipsum disciplinae momentum, utque melius intellegere valeamus vincula, quae illud arctiore modo coniungunt cum indole salvifica ipsius Evangelii doctrinae.

Quae cum ita sint, satis apparet finem Codicis minime illum esse, ut in vita Ecclesiae christifidelium fides, gratia, charismata ac praesertim caritas substituantur. Ex contrario, Codex eo potius spectat, ut talem gignat ordinem in ecclesiali societate, qui, praecipuas tribuens partes amori, gratiae atque charismati, eodem tempore

мунда Бідагора з Таварыства Езуса, якія абодва ў выкананне гэтага абавязку ўклалі дары сваёй вучонасці і мудрасці. Разам з імі Мы ўспамінаем кардыналаў, арцыбіскупаў, біскупаў, якія былі членамі гэтай камісіі, а таксама кансультантаў асобных працоўных груп, занятых на працягу гэтых гадоў такой напружанай працай, якіх Бог за гэты час паклікаў да вечнай узнагароды. За ўсіх іх мы ўзносім Нашы малітвы да Бога.

Але трэба ўспомніць таксама жывых, перадусім цяперашняга намесніка старшыні камісіі, вялебнага брата Расальё Кастыльё Ляра, які доўгі час рупліва выконваў свае важныя абавязкі; побач з ім умілаванага сына Вільгельма Онкліна, святара, які зрабіў вялікі ўнёсак у паспяховае завяршэнне працы, акружаючы яе сваім няспынным клопатам, і іншых, хто прыняў удзел у працы гэтай камісіі або як члены-кардыналы, або як служачыя, кансультанты і супрацоўнікі працоўных груп ці іншых структур, каб здзейсніць і завяршыць такую вялікую і адказную справу.

Такім чынам, прамульгуючы сёння Кодэкс, Мы вельмі добра ўсведамляем, што гэтае дзеянне зыходзіць ад Нашай улады Пантыфіка, а таму мае першасны характар. З іншага боку, Мы таксама добра ўсведамляем, што згодна са сваім зместам гэты Кодэкс перадае калегіяльны клопат аб Касцёле ўсіх Нашых братоў у біскупстве; больш за тое, нібы на падабенства Сабору гэты Кодэкс павінен разглядацца як плён калегіяльнага супрацоўніцтва, якое ўзнікла дзякуючы аб'яднаным намаганням дасведчаных людзей і ўстановаў усяго Касцёла.

Узнікае яшчэ адно пытанне: што ж такое Кодэкс кананічнага права? Каб належным чынам на яго адказаць, трэба думкаю звярнуцца да той старажытнай прававой спадчыны, якая змяшчаецца ў кнігах Старога і Новага Запавету, ад якой, як ад сваёй першакрыніцы, вядзе свой пачатак уся прававая і заканадаўчая традыцыя Касцёла.

Хрыстус Пан найбагацейшую спадчыну Закона і Прарокаў, якая павольна вырастала з гістарычнага досведу Божага народа ў Старым Запавеце, не адмяніў, а выканаў так, каб яна на новым і больш высокім узроўні належала да спадчыны Новага Запавету. Таму, хоць святы Павел, тлумачачы Велікодную таямніцу, навучае, што апраўданне даецца праз веру, а не праз учынкі закона, аднак ён не адмаўляе ні абавязваючай моцы Дэкалога, ні важнасці дысцыпліны ў Касцёле. Такім чынам, кнігі Новага Запавету дазваляюць нам глыбей усвядоміць важнасць дысцыпліны і лепш зразумець тыя сувязі, якія мацней звязваюць яе са збаўчай прыродай самога Евангельскага вучэння.

Калі гэта так, то цалкам відавочна, што мэта Кодэкса — зусім не замена веры, харызматаў і асабліва любові ў жыцці Касцёла і Хрыстовых верных. Наадварот, Кодэкс хутчэй мае на мэце тое, каб стварыць у касцёльнай супольнасці такі парадак, які, аддаючы галоўнае месца любові, ласцы і харызмам,

faciliorem reddat ordinatam eorum progressionem in vita sive ecclesialis societatis, sive etiam singulorum hominum, qui ad illam pertinent.

Codex, utpote quod sit primarium documentum legiferum Ecclesiae, innixum in hereditate iuridica et legifera Revelationis atque Traditionis, necessarium instrumentum censendum est, quo debitus servetur ordo tum in vita individuali atque sociali, tum in ipsa Ecclesiae navitate. Quare, praeter elementa fundamentalia structurae hierarchicae et organicae Ecclesiae a Divino Conditore statuta vel in apostolica aut ceteroqui in antiquissima traditione fundata, ac praeter praecipuas normas spectantes ad exercitium triplicis muneris ipsi Ecclesiae demandati, Codex quasdam etiam regulas atque agendi normas definiat oportet.

Instrumentum, quod Codex est, plane congruit cum natura Ecclesiae, qualis praesertim proponitur per magisterium Concilii Vaticani II in universum spectatum, peculiarique ratione per eius ecclesiologicam doctrinam. Immo, certo quodam modo, novus hic Codex concipi potest veluti magnus nisus transferendi in sermonem canonisticum hanc ipsam doctrinam, ecclesiologiam scilicet conciliarem. Quod si fieri nequit, ut imago Ecclesiae per doctrinam Concilii descripta perfecte in linguam canonisticam convertatur, nihilominus ad hanc ipsam imaginem semper Codex est referendus tamquam ad primarium exemplum, cuius lineamenta is in se, quantum fieri potest, suapte natura exprimere debet.

Inde nonnullae profluunt fundamentales normae, quibus totus regitur novus Codex, intra fines quidem materiae illi propriae, necnon ipsius linguae, quae cum ea materia cohaeret.

Quinimmo affirmari licet inde etiam proficisci notam illam, qua Codex habetur veluti complementum magisterii a Concilio Vaticano II propositi, peculiari modo quod attinet ad duas Constitutiones, dogmaticam nempe atque pastoralem.

Hinc sequitur, ut fundamentalis illa ratio novitatis, quae, a traditione legifera Ecclesiae numquam discedens, reperitur in Concilio Vaticano II, praesertim quod spectat ad eius ecclesiologicam doctrinam, efficiat etiam rationem novitatis in novo Codice.

Ex elementis autem, quae veram ac propriam Ecclesiae imaginem exprimunt, haec sunt praecipue recensenda: doctrina qua Ecclesia ut Populus Dei, et auctoritas hierarchica uti servitium proponitur; doctrina praeterea quae Ecclesiam uti communionem ostendit ac proinde mutuas statuit necessitudines quae inter Ecclesiam particularem et universalem, atque inter collegialitatem ac primatum intercedere debent; item doctrina qua omnia membra Populi Dei, modo sibi proprio, triplex Christi munus participant, sacerdotale scilicet propheticum atque regale, cui

у той жа час садзейнічаў бы іх упарадкаванаму ўзрастанню ў жыцці як касцёльнай супольнасці, так і належных да яе асобных людзей.

Кодэкс як галоўны заканадаўчы дакумент Касцёла, заснаваны на прававой і заканадаўчай спадчыне Аб'яўлення і Традыцыі, варта лічыць неабходным сродкам для захавання належнага парадку як у індывідуальным і грамадскім жыцці, так і ў самой дзейнасці Касцёла. Таму неабходна, каб, апрача асноўных элементаў іерархічнай і арганізацыйнай структуры Касцёла, устаноўленых Боскім Заснавальнікам або закладзеных у апостальскай і іншых найбольш старажытных Традыцыях, а таксама апрача галоўных нормаў, якія адносяцца да выконвання траякага абавязку, даручанага Касцёлу, Кодэкс вызначаў таксама некаторыя правілы ці нормы дзейнасці.

Той сродак, якім ёсць Кодэкс, цалкам адпавядае прыродзе Касцёла, як гэта прадстаўлена, у прыватнасці, навучаннем Другога Ватыканскага Сабору, узятым у яго цэласці, з асаблівай увагай да яго эклезіялагічнага вучэння. Такім чынам, у акрэсленым сэнсе гэты новы Кодэкс можна разглядаць як спробу перакласці на кананічную мову само гэтае вучэнне, гэта значыць саборную эклезіялогію. Хоць немагчыма дасканала перакласці на кананічную мову вобраз Касцёла, апісаны вучэннем Сабору, тым не менш варта заўсёды суадносіць Кодэкс з гэтым самым вобразам як з першаўзорам, рысы якога Кодэкс па самой сваёй прыродзе павінен, наколькі гэта магчыма, у сабе выявіць.

Адгэтуль паходзяць некаторыя асноватворныя нормы, якімі кіруецца ўвесь новы Кодэкс, але ў межах уласцівай для яго матэрыі і той мовы, якая адпавядае гэтай матэрыі.

Больш за тое, можна сцвярджаць, што адгэтуль паходзіць і тая асаблівасць, з увагі на якую Кодэкс лічыцца дапаўненнем вучэння, прадстаўленага Другім Ватыканскім Саборам, асабліва ў тым, што датычыць дзвюх Канстытуцый: дагматычнай і пастырскай.

Адгэтуль вынікае, што асноўная прычына навізны, якая ніколі не разыходзіцца з заканадаўчай традыцыяй Касцёла, знаходзіцца ў Другім Ватыканскім Саборы, асабліва ў тым, што тычыцца яго эклезіялагічнага вучэння, і з'яўляецца прычынай навізны ў новым Кодэксе.

З тых элементаў, якія выяўляюць сапраўдны і ўласцівы вобраз Касцёла, варта асабліва адзначыць наступныя: вучэнне, якое паказвае Касцёл як Божы народ, а іерархічную ўладу як служэнне; апрача таго, вучэнне, якое прадстаўляе Касцёл як супольнасць і таму ўстанаўлівае тыя ўзаемаадносіны, якія павінны складацца паміж мясцовым і паўсюдным Касцёлам, а таксама паміж калегіяльнасцю і прыматам; таксама вучэнне, згодна з якім усе члены Божага народа ўласцівым для іх спосабам удзельнічаюць у траякім служэнні Хрыста —

doctrinae ea etiam adnectitur, quae respicit officia ac iura christifidelium, ac nominatim laicorum; studium denique ab Ecclesia in oecumenismum impendendum.

Si igitur Concilium Vaticanum II ex Traditionis thesauro vetera et nova protulit, eiusque novitas hisce aliisque elementis continetur, manifesto patet Codicem eandem notam fidelitatis in novitate et novitatis in fidelitate in se recipere, eique conformari pro materia sibi propria suaque peculiari loquendi ratione.

Novus Codex Iuris Canonici eo tempore in lucem prodit, quo Episcopi totius Ecclesiae eius promulgationem non tantum postulant, verum etiam instanter vehementerque efflagitant.

Ac revera Codex Iuris Canonici Ecclesiae omnino necessarius est. Cum ad modum etiam socialis visibilisque compaginis sit constituta, ipsa normis indiget, ut eius hierarchica et organica structura adspectabilis fiat, ut exercitium munerum ipsi divinitus creditorum, sacrae praesertim potestatis et administrationis sacramentorum rite ordinetur, ut secundum iustitiam in caritate innixam mutuae christifidelium necessitudines componantur, singulorum iuribus in tuto positis atque definitis, ut denique communia incepta, quae ad christianam vitam perfectius usque vivendam suscipiuntur, per leges canonicas fulciantur, muniantur ac promoveantur.

Demum canonicae leges suapte natura observantiam exigunt; qua de causa quam maxima diligentia adhibita est, ut in diuturna Codicis praeparatione, accurata fieret normarum expressio eaedemque in solido iuridico, canonico ac theologico fundamento inniterentur.

Quibus omnibus consideratis, optandum sane est, ut nova canonica legislatio efficax instrumentum evadat, cuius ope Ecclesia valeat se ipsam perficere secundum Concilii Vaticani II spiritum, ac magis magisque parem se praebeat salutifero suo muneri in hoc mundo exsequendo.

Placet considerationes has Nostras fidenti animo omnibus committere, dum princeps legum ecclesiasticarum Corpus pro Ecclesia latina promulgamus.

Faxit ergo Deus, ut gaudium et pax cum iustitia et oboedientia hunc Codicem commendent, et quod iubetur a capite, servetur in corpore.

Itaque divinae gratiae auxilio freti, Beatorum Apostolorum Petri et Pauli auctoritate suffulti, certa scientia atque votis Episcoporum universi orbis adnuentes, qui nobiscum collegiali affectu adlaboraverunt, suprema qua pollemus auctoritate, Constitutione Nostra hac in posterum valitura, praesentem Codicem sic ut digestus et recognitus est, promulgamus, vim legis habere posthac pro universa Ecclesia latina iubemus ac omnium ad quos spectat custodiae ac vigilantiae tradimus

святарскім, прароцкім і валадарскім; з гэтым вучэннем злучана і ўсё тое, што датычыць абавязкаў і правоў вернікаў, асабліва свецкіх; нарэшце, клопат Касцёла аб экуменізме.

Таму, калі Другі Ватыканскі Сабор узяў старое і новае са скарбніцы Традыцыі, а навізна яго палягае ў гэтых і ў іншых элементах, то цалкам відавочна, што Кодэкс прымае гэты знак вернасці ў навізне і навізны ў вернасці і ўзгадняецца з ім ва ўласцівай яму матэрыі і ва ўласцівым яму спосабе выказвання.

Новы Кодэкс кананічнага права выходзіць у свет у той час, калі біскупы ўсяго Касцёла не толькі просяць прамульгаваць яго, але нават настойліва і рашуча патрабуюць гэтага.

І сапраўды, Кодэкс кананічнага права вельмі неабходны Касцёлу. Паколькі Касцёл уладкаваны як сацыяльная і бачная супольнасць, яму патрэбны нормы, каб была бачна яго іерархічная і арганічная структура, каб належным чынам было ўпарадкавана выкананне абавязкаў, даручаных яму звыш, асабліва святой улады ўдзялення сакрамэнтаў, каб у адпаведнасці са справядлівасцю, заснаванай на любові, складваліся ўзаемаадносіны паміж вернікамі, з забеспячэннем і ўстанаўленнем правоў кожнага з іх, і, нарэшце, каб супольныя намаганні, скіраваныя на тое, каб хрысціянскае жыццё станавілася больш дасканалым, атрымлівалі ў кананічных законах апору, абарону і падтрымку.

Нарэшце, кананічныя законы па самой сваёй прыродзе патрабуюць, каб іх захоўвалі. З гэтай прычыны найбольшая ўвага была нададзена таму, каб пры працяглай падрыхтоўцы Кодэкса атрымаць дакладны выклад нормаў, які абапіраецца на трывалую прававую, кананічную і тэалагічную аснову.

Улічваючы ўсё гэта, можна спадзявацца, што новае кананічнае заканадаўства стане выніковым сродкам, дзякуючы якому Касцёл зможа ўдасканальвацца ў духу Другога Ватыканскага Сабору і станавіцца ўсё больш і больш адпаведным да выканання свайго збаўчага задання ў гэтым свеце.

Мы вырашылі шчыра выказаць гэтыя Нашы думкі ў той момант, калі прамульгуем галоўны Корпус законаў для Лацінскага Касцёла.

Няхай жа Бог учыніць так, каб гэты Кодэкс нёс радасць і спакой, справядлівасць і пакору і каб тое, што загадвае галава, захоўвалася ўсім целам.

Спадзеючыся на дапамогу Божай ласкі, абапіраючыся на ўладу святых Апосталаў Пятра і Паўла, з пэўным усведамленнем згаджаючыся з пажаданнямі біскупаў усяго свету, якія супрацоўнічалі з Намі ў калегіяльным духу, той вярхоўнай уладай, якой Мы валодаем, гэтай Нашай канстытуцыяй, якая будзе надалей мець моц, Мы прамульгуем дадзены Кодэкс так, як ён складзены і разгледжаны, наказваем, каб з гэтага часу ён меў моц закона для ўсяго Лацінскага Касцёла, і перадаём яго для выканання пад наглядам і апекай усіх,

servandum. Quo autem fidentius haec praescripta omnes probe percontari atque perspecte cognoscere valeant, antequam ad effectum adducantur, edicimus ac iubemus, ut ea vim obligandi sortiantur a die prima Adventus anni MCMLXXXIII. Non obstantibus quibuslibet ordinationibus, constitutionibus, privilegiis etiam speciali vel individua mentione dignis necnon consuetudinibus contrariis.

Omnes ergo filios dilectos hortamur, ut significata praecepta animo sincero ac propensa voluntate exsolvant, spe confisi fore ut Ecclesiae studiosa disciplina revirescat ac propterea animarum quoque salus magis magisque, auxiliatrice Beatissima Virgine Maria, Ecclesiae Matre, promoveatur.

Datum Romae, die XXV Ianuarii, anno MCMLXXXIII,
apud Vaticanas aedes, Pontificatus Nostri quinto.

IOANNES PAULUS PP. II

каго гэта датычыць. А дзеля таго, каб усе маглі больш пэўна і лепш пазнаць і зразумець гэтыя прадпісанні, перш чым яны будуць уведзены ў жыццё, Мы пастанаўляем і загадваем, каб яны атрымалі абавязковую моц з першага дня Адвэнту 1983 г. Гэтаму не перашкаджаюць ні любыя іншыя распараджэнні, устанаўленні, прывілеі, нават вартыя спецыяльнага і асобнага згадвання, ні супярэчныя гэтаму звычаі.

Такім чынам, мы заклікаем усіх Нашых умілаваных сыноў выконваць указаныя прадпісанні шчыра і ахвотна, спадзеючыся на тое, што руплівая дысцыпліна Касцёла набудзе новую моц і будзе з дапамогай Найсвяцейшай Панны Марыі, Маці Касцёла, усё больш і больш спрыяць збаўленню душаў.

Дадзена ў Рыме, 25 студзеня 1983 года, у Ватыкане,
у пяты год Нашага Пантыфікату.

ЯН ПАВЕЛ II, ПАПА

CODEX
IURIS CANONICI

Auctoritate Ioannis Pauli PP. II promulgatus

КОДЭКС
КАНАНІЧНАГА ПРАВА

Прамульгаваны ўладай Папы Яна Паўла II

LIBER I

DE NORMIS GENERALIBUS

Can. 1 – Canones huius Codicis unam Ecclesiam latinam respiciunt.

Can. 2 – Codex plerumque non definit ritus, qui in actionibus liturgicis celebrandis sunt servandi; quare leges liturgicae hucusque vigentes vim suam retinent, nisi earum aliqua Codicis canonibus sit contraria.

Can. 3 – Codicis canones initas ab Apostolica Sede cum nationibus aliisve societatibus politicis conventiones non abrogant neque iis derogant; eaedem idcirco perinde ac in praesens vigere pergent, contrariis huius Codicis praescriptis minime obstantibus.

Can. 4 – Iura quaesita, itemque privilegia quae, ab Apostolica Sede ad haec usque tempora personis sive physicis sive iuridicis concessa, in usu sunt nec revocata, integra manent, nisi huius Codicis canonibus expresse revocentur.

Can. 5 – § 1. Vigentes in praesens contra horum praescripta canonum

КНІГА I

АСНОЎНЫЯ НОРМЫ

Кан. 1 – Каноны гэтага Кодэкса датычаць толькі Лацінскага Касцёла.

Кан. 2 – Пераважна Кодэкс не акрэслівае абрадаў, якія павінны захоўвацца пры выконванні літургічных цэлебрацый, таму літургічныя законы, якія абавязвалі да гэтага часу, захоўваюць сваю моц, акрамя тых, якія супярэчаць канонам Кодэкса.

Кан. 3 – Каноны гэтага Кодэкса не адмяняюць і не абмяжоўваюць дамовы, заключаныя Апостальскай Сталіцай з дзяржавамі або іншымі палітычнымі супольнасцямі; таму гэтыя дамовы працягваюць абавязваць, нават калі супярэчаць прадпісанням Кодэкса.

Кан. 4 – Набытыя правы, а таксама ўдзеленыя да гэтага часу Апостальскай Сталіцай як фізічным, так і юрыдычным асобам прывілеі, якія знаходзяцца ва ўжытку і не былі адкліканы, застаюцца непарушанымі, акрамя выпадкаў, калі каноны гэтага Кодэкса выразна іх адмяняюць.

Кан. 5 – § 1. Існуючыя дагэтуль звычаі, як паўсюдныя, так і партыкулярныя, якія дзей-

нічаюць насуперак прадпісанням дадзеных канонаў і якія былі адхілены канонамі гэтага Кодэкса, наогул скасоўваюцца і не могуць быць узноўлены ў будучыні. Іншыя таксама павінны лічыцца скасаванымі, за выключэннем выпадкаў, калі Кодэкс выразна прадугледжвае іншае або калі яны з'яўляюцца стагадовымі ці незапамятнымі, з такімі можна пагадзіцца, калі, на думку ардынарыя, з увагі на абставіны месцаў і асобаў яны не могуць быць знесены.

§ 2. Звычаі, якія існуюць дагэтуль па-за правам, як паўсюдныя, так і партыкулярныя, захоўваюцца.

Кан. 6 – § 1. З набыццём моцы гэтым Кодэксам, адмяняюцца:

1º Кодэкс кананічнага права, прамульгаваны ў 1917 годзе;

2º іншыя законы, як паўсюдныя, так і партыкулярныя, якія супярэчаць прадпісанням гэтага Кодэкса, акрамя выпадкаў, калі ў адносінах да партыкулярных законаў выразна не прадугледжана іншае;

3º любыя карныя законы, як паўсюдныя, так і партыкулярныя, выдадзеныя Апостальскай Сталіцай, акрамя тых, якія ўключаны ў гэты Кодэкс;

4º таксама іншыя дысцыплінарныя паўсюдныя законы, калі яны датычаць спраў, якія поўнасцю ўпарадкоўваюцца гэтым Кодэксам.

§ 2. Калі каноны гэтага Кодэкса перадаюць старажытнае права, іх трэба разумець, беручы пад увагу кананічную традыцыю.

consuetudines sive universales sive particulares, quae ipsis canonibus huius Codicis reprobantur, prorsus suppressae sunt, nec in posterum reviviscere sinantur; ceterae quoque suppressae habeantur, nisi expresse Codice aliud caveatur, aut centenariae sint vel immemorabiles, quae quidem, si de iudicio Ordinarii pro locorum ac personarum adiunctis submoveri nequeant, tolerari possunt.

§ 2. Consuetudines praeter ius hucusque vigentes, sive universales sive particulares, servantur.

Can. 6 – § 1. Hoc Codice vim obtinente, abrogantur:

1° Codex Iuris Canonici anno 1917 promulgatus;

2° aliae quoque leges, sive universales sive particulares, praescriptis huius Codicis contrariae, nisi de particularibus aliud expresse caveatur;

3° leges poenales quaelibet, sive universales sive particulares a Sede Apostolica latae, nisi in ipso hoc Codice recipiantur;

4° ceterae quoque leges disciplinares universales materiam respicientes, quae hoc Codice ex integro ordinatur.

§ 2. Canones huius Codicis, quatenus ius vetus referunt, aestimandi sunt ratione etiam canonicae traditionis habita.

TITULUS I

DE LEGIBUS ECCLESIASTICIS

Can. 7 – Lex instituitur cum promulgatur.

Can. 8 – § 1. Leges ecclesiasticae universales promulgantur per editionem in *Actorum Apostolicae Sedis commentario officiali*, nisi in casibus particularibus alius promulgandi modus fuerit praescriptus, et vim suam exserunt tantum expletis tribus mensibus a die qui *Actorum* numero appositus est, nisi ex natura rei illico ligent aut in ipsa lege brevior aut longior vacatio specialiter et expresse fuerit statuta.

§ 2. Leges particulares promulgantur modo a legislatore determinato et obligare incipiunt post mensem a die promulgationis, nisi alius terminus in ipsa lege statuatur.

Can. 9 – Leges respiciunt futura, non praeterita, nisi nominatim in eis de praeteritis caveatur.

Can. 10 – Irritantes aut inhabilitantes eae tantum leges habendae sunt, quibus actum esse nullum aut inhabilem esse personam expresse statuitur.

Can. 11 – Legibus mere ecclesiasticis tenentur baptizati in Ecclesia catholica vel in eandem recepti, quique sufficienti rationis usu gaudent et, nisi aliud iure expresse caveatur, septimum aetatis annum expleverunt.

Can. 12 – § 1. Legibus universalibus tenentur ubique terrarum omnes pro quibus latae sunt.

ТЫТУЛ I

КАСЦЁЛЬНЫЯ ЗАКОНЫ

Кан. 7 – Закон устанаўліваецца пры яго прамульгацыі.

Кан. 8 – § 1. Паўсюдныя касцёльныя законы прамульгуюцца праз апублікаванне ў *Actorum Apostolicae Sedis commentario officiali*, калі ў асобных выпадках не быў прадпісаны іншы спосаб прамульгацыі, і набываюць моц толькі праз тры месяцы ад дня, указанага ў адпаведным нумары *Actorum*, калі па самой сутнасці рэчаў не будуць абавязваць адразу або калі ў самім законе спецыяльна і выразна не ўстаноўлены іншы, карацейшы або даўжэйшы, тэрмін неабавязковасці.

§ 2. Партыкулярныя законы прамульгуюцца спосабам, акрэсленым заканадаўцам, і пачынаюць абавязваць праз месяц ад дня прамульгацыі, калі ў самім законе не акрэслены іншы тэрмін.

Кан. 9 – Законы адносяцца да будучыні, а не да мінулага, калі ў іх спецыяльна не прадугледжана аднясенне да мінулага.

Кан. 10 – Толькі тыя законы пазбаўляюць дзейснасці або дзеяздольнасці, у якіх выразна пастанаўляецца, што дзеянне з'яўляецца нядзейсным або асоба з'яўляецца недзеяздольнай.

Кан. 11 – Выконваць чыста касцёльныя законы абавязаны асобы, ахрышчаныя ў Каталіцкім Касцёле або прынятыя ў яго, якія ў дастатковай ступені з'яўляюцца здольнымі да карыстання розумам і якім, калі іншае выразна не прадугледжана правам, споўнілася сем гадоў.

Кан. 12 – § 1. Паўсюдныя законы павінны выконваць па ўсім свеце тыя, для каго яны выдадзены.

§ 2. Ад выконвання паўсюдных законаў, якія не абавязваюць на акрэсленай тэрыторыі, вызваляюцца ўсе, хто актуальна знаходзяцца на гэтай тэрыторыі.

§ 3. Законы, выдадзеныя для асаблівай тэрыторыі, абавязваюць тых, для каго яны былі выдадзены, хто мае на гэтай тэрыторыі пастаяннае або часовае месца жыхарства, а таксама тых, хто актуальна прабывае на дадзенай тэрыторыі, з захаваннем прадпісання кан. 13.

Кан. 13 – § 1. Партыкулярныя законы маюць не персанальны, а тэрытарыяльны характар, калі не ўстаноўлена іншае.

§ 2. Падарожныя не звязаны:

1° партыкулярнымі законамі сваёй тэрыторыі, пакуль знаходзяцца па-за яе межамі, калі парушэнне гэтых законаў не прычыніць шкоду на іх уласнай тэрыторыі або калі гэтыя законы не з'яўляюцца персанальнымі;

2° законамі тэрыторыі, на якой яны знаходзяцца, за выключэннем тых законаў, якія садзейнічаюць публічнаму парадку, або акрэсліваюць фармальнасці дзеянняў, або датычаць нерухомых рэчаў, якія знаходзяцца на дадзенай тэрыторыі.

§ 3. Бадзяжныя падпарадкаваны як паўсюдным, так і партыкулярным законам, якія абавязваюць у месцы іх знаходжання.

Кан. 14 – Пры наяўнасці юрыдычнага сумнення законы не абавязваюць, у тым ліку тыя, якія пазбаўляюць дзейснасці або дзеяздольнасці. У выпадку сумненняў адносна факта, ардынарыі могуць дыспенсаваць ад законаў, а ў выпадку дыспенсацыі, зарэзерваванай за акрэсленай уладай, — пры ўмове, што гэтая ўлада звычайна яе ўдзяляе.

§ 2. A legibus autem universalibus, quae in certo territorio non vigent, eximuntur omnes qui in eo territorio actu versantur.

§ 3. Legibus conditis pro peculiari territorio ii subiciuntur pro quibus latae sunt, quique ibidem domicilium vel quasi-domicilium habent et simul actu commorantur, firmo praescripto can. 13.

Can. 13 – § 1. Leges particulares non praesumuntur personales, sed territoriales, nisi aliud constet.

§ 2. Peregrini non adstringuntur:

1° legibus particularibus sui territorii quamdiu ab eo absunt, nisi aut earum transgressio in proprio territorio noceat, aut leges sint personales;

2° neque legibus territorii in quo versantur, iis exceptis quae ordini publico consulunt, aut actuum sollemnia determinant, aut res immobiles in territorio sitas respiciunt.

§ 3. Vagi obligantur legibus tam universalibus quam particularibus quae vigent in loco in quo versantur.

Can. 14 – Leges, etiam irritantes et inhabilitantes, in dubio iuris non urgent; in dubio autem facti Ordinarii ab eis dispensare possunt, dummodo, si agatur de dispensatione reservata, concedi soleat ab auctoritate cui reservatur.

Can. 15 – § 1. Ignorantia vel error circa leges irritantes vel inhabilitantes earundem effectum non impediunt, nisi aliud expresse statuatur.

Кан. 15 – § 1. Няведанне ці памылка адносна законаў, якія пазбаўляюць дзейснасці або дзеяздольнасці, не перашкаджаюць надыходу іх наступстваў, калі выразна не сцвярджаецца іншае.

§ 2. Ignorantia vel error circa legem aut poenam aut circa factum proprium aut circa factum alienum notorium non praesumitur; circa factum alienum non notorium praesumitur, donec contrarium probetur.

§2. Не мяркуецца аб наяўнасці няведання ці памылкі адносна закона, або пакарання, або адносна факта, які мае дачыненне да ўласнай асобы, ці адносна юрыдычна пацверджанага факта, які мае дачыненне да іншай асобы; затое мяркуецца наяўнасць няведання ці памылкі адносна юрыдычна не пацверджанага ўчынка іншай асобы, пакуль супрацьлеглае не будзе даказана.

Can. 16 – § 1. Leges authentice interpretatur legislator et is cui potestas authentice interpretandi fuerit ab eodem commissa.

Кан. 16 – § 1. Аўтэнтычна законы інтэрпрэтуе заканадаўца, а таксама той, каго ён надзяліў уладай аўтэнтычнай інтэрпрэтацыі законаў.

§ 2. Interpretatio authentica per modum legis exhibita eandem vim habet ac lex ipsa et promulgari debet; si verba legis in se certa declaret tantum, valet retrorsum; si legem coarctet vel extendat aut dubiam explicet, non retrotrahitur.

§ 2. Аўтэнтычная інтэрпрэтацыя, дадзеная ў форме закона, мае такую ж моц, што і закон, і павінна быць прамульгавана; калі гэтая інтэрпрэтацыя толькі высвятляе словы закона, зразумелыя самі па сабе, — то мае адваротную моц; калі ж яна абмяжоўвае ці пашырае закон або вырашае сумненні, — тады не мае адваротнай моцы.

§ 3. Interpretatio autem per modum sententiae iudicialis aut actus administrativi in re peculiari, vim legis non habet et ligat tantum personas atque afficit res pro quibus data est.

§ 3. Інтэрпрэтацыя, дадзеная ў форме судовага рашэння або адміністрацыйнага акта ў асобнай справе, не мае моцы закона і абавязвае толькі тых асобаў і датычыць толькі тых спраў, для якіх яна была дадзена.

Can. 17 – Leges ecclesiasticae intellegendae sunt secundum propriam verborum significationem in textu et contextu consideratam; quae si dubia et obscura manserit, ad locos parallelos, si qui sint, ad legis finem ac circumstantias et ad mentem legislatoris est recurrendum.

Кан. 17 – Касцёльныя законы трэба разумець паводле ўласнага значэння слоў, разгледжанага ў тэксце і кантэксце, калі ж яно застаецца сумніўным або незразумелым, трэба звярнуцца да паралельных месцаў, калі яны ёсць, да мэты закона, яго акалічнасцяў і думкі заканадаўцы.

Can. 18 – Leges quae poenam statuunt aut liberum iurium exercitium coarctant aut exceptionem a lege

Кан. 18 – У дачыненні да законаў, якія ўстанаўляюць пакаранне або абмяжоўваюць свабоднае выкарыстанне правоў ці змяш-

чаюць у сабе выключэнне з закона, прымяняецца вузкая інтэрпрэтацыя.

Кан. 19 – Калі ў акрэсленым выпадку адсутнічае выразнае прадпісанне паўсюднага ці партыкулярнага права або звычай, такая справа, калі яна не датычыць пакарання, павінна быць вырашана, беручы пад увагу законы, выдадзеныя ў падобных выпадках, а таксама асноўныя прынцыпы права, кананічную слушнасць, юрыспрудэнцыю і практыку Рымскай Курыі, а таксама агульныя і нязменныя погляды навукоўцаў.

Кан. 20 – Пазнейшы закон адмяняе папярэдні або ўносіць у яго змены тады, калі гэта выразна пастаноўлена, або калі новы закон супярэчыць папярэдняму, або калі ў поўным аб'ёме ўпарадкоўвае ўсю матэрыю ранейшага закона; пры гэтым паўсюдны закон не змяняе партыкулярнае ці спецыяльнае права, калі ў праве выразна не прадугледжана іншае.

Кан. 21 – Пры наяўнасці сумненняў не мяркуецца аб тым, што раней існуючыя законы адменены, але трэба супаставіць пазнейшыя законы з ранейшымі і, наколькі гэта магчыма, узгадніць іх паміж сабой.

Кан. 22 – Дзяржаўныя законы, да выканання якіх адсылае права Касцёла, павінны выклікаць наступствы таксама ў кананічным праве, калі яны не з'яўляюцца супраціўнымі Божаму праву і калі кананічнае права не прадугледжвае іншае.

continent, strictae subsunt interpretationi.

Can. 19 – Si certa de re desit expressum legis sive universalis sive particularis praescriptum aut consuetudo, causa, nisi sit poenalis, dirimenda est attentis legibus latis in similibus, generalibus iuris principiis cum aequitate canonica servatis, iurisprudentia et praxi Curiae Romanae, communi constantique doctorum sententia.

Can. 20 – Lex posterior abrogat priorem aut eidem derogat, si id expresse edicat aut illi sit directe contraria, aut totam de integro ordinet legis prioris materiam; sed lex universalis minime derogat iuri particulari aut speciali, nisi aliud in iure expresse caveatur.

Can. 21 – In dubio revocatio legis praeexsistentis non praesumitur, sed leges posteriores ad priores trahendae sunt et his, quantum fieri potest, conciliandae.

Can. 22 – Leges civiles ad quas ius Ecclesiae remittit, in iure canonico iisdem cum effectibus serventur, quatenus iuri divino non sint contrariae et nisi aliud iure canonico caveatur.

ТЫТУЛ II
ЗВЫЧАЙ

Кан. 23 – Моц закона мае толькі той звычай, які, уведзены супольнасцю вернікаў, быў зацверджаны заканадаўцам згодна з наступнымі канонамі.

TITULUS II
DE CONSUETUDINE

Can. 23 – Ea tantum consuetudo a communitate fidelium introducta vim legis habet, quae a legislatore approbata fuerit, ad normam canonum qui sequuntur.

Can. 24 – § 1. Nulla consuetudo vim legis obtinere potest, quae sit iuri divino contraria.

§ 2. Nec vim legis obtinere potest consuetudo contra aut praeter ius canonicum, nisi sit rationabilis; consuetudo autem quae in iure expresse reprobatur, non est rationabilis.

Кан. 24 – § 1. Ніякі звычай не можа набыць моц закона, калі ён супярэчыць Божаму праву.

§ 2. Не можа набыць моц закона таксама звычай, які супярэчыць кананічнаму праву, або звычай, які існуе па-за правам, калі ён не з'яўляецца разумным; звычай жа, выразна адхілены правам, не з'яўляецца разумным.

Can. 25 – Nulla consuetudo vim legis obtinet, nisi a communitate legis saltem recipiendae capaci cum animo iuris inducendi servata fuerit.

Кан. 25 – Не набывае моцы закона ніводзін звычай, калі яго не захоўвае з мэтай утварэння права супольнасць, здольная прынамсі да прыняцця права.

Can. 26 – Nisi a competenti legislatore specialiter fuerit probata, consuetudo vigenti iuri canonico contraria aut quae est praeter legem canonicam, vim legis obtinet tantum, si legitime per annos triginta continuos et completos servata fuerit; contra legem vero canonicam, quae clausulam contineat futuras consuetudines prohibentem, sola praevalere potest consuetudo centenaria aut immemorabilis.

Кан. 26 – Калі звычай, які супярэчыць дзеючаму кананічнаму праву, або той, які існуе па-за кананічным правам, не быў спецыяльна зацверджаны кампетэнтным заканадаўцам, ён набывае моц закона толькі тады, калі на легітымнай падставе бесперапынна выконваўся на працягу поўных трыццаці гадоў; аднак звычай, які супярэчыць такому кананічнаму закону, які змяшчае ў сабе кляўзулу з забаронай на ўвядзенне звычаяў у будучыні, можа пераважыць толькі тады, калі з'яўляецца стагадовым або незапамятным.

Can. 27 – Consuetudo est optima legum interpres.

Кан. 27 – Звычай — найлепшы інтэрпрэтатар законаў.

Can. 28 – Firmo praescripto can. 5, consuetudo, sive contra sive praeter legem, per contrariam consuetudinem aut legem revocatur; sed, nisi expressam de iis mentionem faciat, lex non revocat consuetudines centenarias aut immemorabiles, nec lex universalis consuetudines particulares.

Кан. 28 – Захоўваючы прадпісанне кан. 5, звычай, які супярэчыць закону, як і той, які існуе па-за законам, адмяняюцца супраціўным звычаем або законам; аднак калі гэта выразна не ўзгадваецца, закон не адмяняе стагадовых або незапамятных звычаяў; таксама паўсюдны закон не адмяняе партыкулярных звычаяў.

ТЫТУЛ III
АГУЛЬНЫЯ ДЭКРЭТЫ І ІНСТРУКЦЫІ

Кан. 29 – Агульныя дэкрэты, якія выдаюцца кампетэнтным заканадаўцам для супольнасці, здольнай да прыняцця права, і змяшчаюць агульныя прадпісанні, з'яўляюцца законамі ва ўласным сэнсе і кіруюцца прадпісаннямі канонаў аб законах.

Кан. 30 – Той, хто мае толькі выканаўчую ўладу, не можа выдаць агульны дэкрэт, аб якім гаворыцца ў кан. 29, калі ў асобных выпадках гэта не будзе даручана яму кампетэнтным заканадаўцам згодна з нормамі права, пры гэтым павінны быць захаваны ўмовы, акрэсленыя ў акце даручэння.

Кан. 31 – § 1. Агульныя выканаўчыя дэкрэты, якія дакладней вызначаюць спосабы прымянення закона або прымушаюць да выконвання закона, у межах сваёй кампетэнцыі могуць выдаваць тыя, хто мае выканаўчую ўладу.

§ 2. Што датычыць прамульгацыі і тэрміну неабавязковасці дэкрэтаў, аб якіх гаворыцца ў § 1, павінны захоўвацца прадпісанні кан. 8.

Кан. 32 – Агульныя выканаўчыя дэкрэты з'яўляюцца абавязковымі для тых, каго абавязваюць законы, спосабы прымянення якіх гэтыя дэкрэты вызначаюць ці да выконвання якіх яны прымушаюць.

Кан. 33 – § 1. Агульныя выканаўчыя дэкрэты, нават калі яны былі выдадзены ў форме дырэктываў або дакументаў з іншай назвай, не змяняюць законаў, а іх прадпісанні, якія супярэчаць законам, пазбаўлены ўсякай моцы.

§ 2. Гэтыя дэкрэты трацяць сваю моц праз выразную або апасродкаваную іх ад-

TITULUS III
DE DECRETIS GENERALIBUS ET DE INSTRUCTIONIBUS

Can. 29 – Decreta generalia, quibus a legislatore competenti pro communitate legis recipiendae capaci communia feruntur praescripta, proprie sunt leges et reguntur praescriptis canonum de legibus.

Can. 30 – Qui potestate exsecutiva tantum gaudet, decretum generale, de quo in can. 29, ferre non valet, nisi in casibus particularibus ad normam iuris id ipsi a legislatore competenti expresse fuerit concessum et servatis condicionibus in actu concessionis statutis.

Can. 31 – § 1. Decreta generalia exsecutoria, quibus nempe pressius determinantur modi in lege applicanda servandi aut legum observantia urgetur, ferre valent, intra fines suae competentiae, qui potestate gaudent exsecutiva.

§ 2. Ad decretorum promulgationem et vacationem quod attinet, de quibus in § 1, serventur praescripta can. 8.

Can. 32 – Decreta generalia exsecutoria eos obligant qui tenentur legibus, quarum eadem decreta modos applicationis determinant aut observantiam urgent.

Can. 33 – § 1. Decreta generalia exsecutoria, etiamsi edantur in directoriis aliusve nominis documentis, non derogant legibus, et eorum praescripta quae legibus sint contraria omni vi carent.

§ 2. Eadem vim habere desinunt revocatione explicita aut implicita

ab auctoritate competenti facta, necnon cessante lege ad cuius exsecutionem data sunt; non autem cessant resoluto iure statuentis, nisi contrarium expresse caveatur.

мену, здзейсненую кампетэнтнай уладай, а таксама пры спыненні дзеяння закона, для выканання якога яны былі выдадзены; аднак яны не трацяць моц са спыненнем улады таго, хто іх выдаў, калі выразна не пастаноўлена іншае.

Can. 34 – § 1. Instructiones, quae nempe legum praescripta declarant atque rationes in iisdem exsequendis servandas evolvunt et determinant, ad usum eorum dantur quorum est curare ut leges exsecutioni mandentur, eosque in legum exsecutione obligant; eas legitime edunt, intra fines suae competentiae, qui potestate exsecutiva gaudent.

Кан. 34 – § 1. Інструкцыі, якія менавіта высвятляюць прадпісанні законаў, а таксама акрэсліваюць і вызначаюць парадак, якога трэба прытрымлівацца пры іх выкананні, выдаюцца для выкарыстання тымі асобамі, якія павінны прымяняць законы, і абавязваюць гэтых асобаў пры выкананні імі законаў; легітымна выдаюць такія інструкцыі ў межах сваёй кампетэнцыі тыя, хто мае выканаўчую ўладу.

§ 2. Instructionum ordinationes legibus non derogant, et si quae cum legum praescriptis componi nequeant, omni vi carent.

§ 2. Законы не могуць быць зменены пастановамі інструкцый, а калі якія-небудзь з іх з'яўляюцца несумяшчальнымі з законамі, то інструкцыі пазбаўлены ўсякай моцы.

§ 3. Vim habere desinunt instructiones non tantum revocatione explicita aut implicita auctoritatis competentis, quae eas edidit, eiusve superioris, sed etiam cessante lege ad quam declarandam vel exsecutioni mandandam datae sunt.

§ 3. Інструкцыі трацяць моц не толькі пасля выразнай або апасродкаванай іх адмены той уладай, якая выдала інструкцыю, або вышэйшай, але і са спыненнем дзеяння закона, для высвятлення і прымянення якога інструкцыя была выдадзена.

TITULUS IV
DE ACTIBUS ADMINISTRATIVIS SINGULARIBUS

ТЫТУЛ IV
АСОБНЫЯ АДМІНІСТРАЦЫЙНЫЯ АКТЫ

Caput I
Normae communes

Раздзел I
Агульныя нормы

Can. 35 – Actus administrativus singularis, sive est decretum aut praeceptum sive est rescriptum, elici potest, intra fines suae competentiae, ab eo qui potestate exsecutiva gaudet, firmo praescripto can. 76, § 1.

Кан. 35 – Асобны адміністрацыйны акт — як дэкрэт, так і прадпісанне або рэскрыпт — можа выдаць у межах сваёй кампетэнцыі той, хто мае выканаўчую ўладу, з захаваннем прадпісання кан. 76 § 1.

Кан. 36 – § 1. Адміністрацыйны акт трэба разумець паводле ўласнага значэння слоў і агульнапрынятага спосабу выражэння; у выпадку сумнення акты, якія датычаць спрэчак, а таксама звязаныя з пагрозай пакараннем ці з яго прымяненнем, як і тыя, якія абмяжоўваюць правы асобы, або парушаюць нечыя набытыя правы, або супярэчаць закону на карысць прыватных асобаў, падлягаюць вузкай інтэрпрэтацыі; усе іншыя акты падлягаюць шырокай інтэрпрэтацыі.

Can. 36 – § 1. Actus administrativus intellegendus est secundum propriam verborum significationem et communem loquendi usum; in dubio, qui ad lites referuntur aut ad poenas comminandas infligendasve attinent aut personae iura coarctant aut iura aliis quaesita laedunt aut adversantur legi in commodum privatorum, strictae subsunt interpretationi; ceteri omnes, latae.

§ 2. Адміністрацыйны акт не павінен распаўсюджвацца на якія-небудзь іншыя выпадкі, акрамя выразна акрэсленых.

§ 2. Actus administrativus non debet ad alios casus praeter expressos extendi.

Кан. 37 – Адміністрацыйны акт, які датычыць *forum externum*, павінен быць выдадзены пісьмова; тое самае датычыць выканання гэтага акта, калі прадугледжана асоба выканаўцы.

Can. 37 – Actus administrativus, qui forum externum respicit, scripto est consignandus; item, si fit in forma commissoria, actus huius executionis.

Кан. 38 – Адміністрацыйны акт, нават ка лі гаворка ідзе пра рэскрыпт, выдадзены ў форме *motu proprio*, нядзейсны ў той частцы, якая парушае чыё-небудзь набытае права або супярэчыць закону ці зацверджанаму звычаю, калі кампетэнтная ўлада не далучыла выразна кляўзулу аб адмене.

Can. 38 – Actus administrativus, etiam si agatur de rescripto *Motu proprio* dato, effectu caret quatenus ius alteri quaesitum laedit aut legi consuetudinive probatae contrarius est, nisi auctoritas competens expresse clausulam derogatoriam addiderit.

Кан. 39 – Умовы, змешчаныя ў адміністрацыйным акце, толькі тады ўплываюць на дзейснасць, калі выражаны злучнікамі «калі», «калі не», «калі толькі».

Can. 39 – Condiciones in actu administrativo tunc tantum ad validitatem censentur adiectae, cum per particulas *si*, *nisi*, *dummodo* exprimuntur.

Кан. 40 – Выканаўца якога-небудзь адміністрацыйнага акта выконвае сваё заданне нядзейсна, пакуль не атрымае дакумент і не праверыць яго аўтэнтычнасць і цэласнасць, калі ўлада, выдаючы акт, не пераслала яму раней звесткі аб гэтым.

Can. 40 – Exsecutor alicuius actus administrativi invalide suo munere fungitur, antequam litteras receperit earumque authenticitatem et integritatem recognoverit, nisi praevia earundem notitia ad ipsum auctoritate eundem actum edentis transmissa fuerit.

Кан. 41 – Выканаўца, якому даручана толькі паслуга выканання адміністрацыйнага

Can. 41 – Exsecutor actus administrativi cui committitur merum exse-

cutionis ministerium, exsecutionem huius actus denegare non potest, nisi manifesto appareat eundem actum esse nullum aut alia ex gravi causa sustineri non posse aut condiciones in ipso actu administrativo appositas non esse adimpletas; si tamen actus administrativi exsecutio adiunctorum personae aut loci ratione videatur inopportuna, exsecutor exsecutionem intermittat; quibus in casibus statim certiorem faciat auctoritatem quae actum edidit.

акта, не можа адмовіцца ад выканання акта, калі не будзе відавочна, што гэты акт з'яўляецца нядзейсным, або не можа быць выкананы па іншай важкай прычыне, або не былі выкананы ўмовы, змешчаныя ў самім адміністрацыйным акце. Пры гэтым, калі выглядае, што выкананне адміністрацыйнага акта некарысна з увагі на акалічнасці асобы ці месца, выканаўца павінен спыніць выкананне. У такіх выпадках выканаўца павінен адразу паведаміць аб гэтым уладу, якая выдала акт.

Can. 42 – Exsecutor actus administrativi procedere debet ad mandati normam; si autem condiciones essentiales in litteris appositas non impleverit ac substantialem procedendi formam non servaverit, irrita est exsecutio.

Кан. 42 – Выканаўца адміністрацыйнага акта павінен дзейнічаць згодна са сваім упаўнаважаннем. Выкананне з'яўляецца нядзейсным, калі ён не выканаў істотныя ўмовы, указаныя ў дакуменце, або не прытрымліваўся істотнай працэсуальнай формы.

Can. 43 – Actus administrativi exsecutor potest alium pro suo prudenti arbitrio sibi substituere, nisi substitutio prohibita fuerit, aut electa industria personae, aut substituti persona praefinita; hisce autem in casibus exsecutori licet alteri committere actus praeparatorios.

Кан. 43 – Выканаўца адміністрацыйнага акта можа па сваім разважлівым суджэнні вызначыць замест сябе іншага выканаўцу, калі замена не была забаронена, або сам ён не быў выбраны з увагі на асабістыя якасці, або іншы выканаўца не быў вызначаны раней; аднак нават у такіх выпадках выканаўца можа даручыць іншай асобе выкананне падрыхтоўчых дзеянняў.

Can. 44 – Actus administrativus exsecutioni mandari potest etiam ab exsecutoris successore in officio, nisi fuerit electa industria personae.

Кан. 44 – Адміністрацыйны акт можа быць выкананы наступнікам выканаўцы на пасадзе, калі выканаўца не быў выбраны з увагі на асабістыя якасці.

Can. 45 – Exsecutori fas est, si quoquo modo in actus administrativi exsecutione erraverit, eundem actum iterum exsecutioni mandare.

Кан. 45 – Калі выкананне адміністрацыйнага акта было здзейснена выканаўцам з памылкай, яму дазваляецца зноў выканаць той жа акт.

Can. 46 – Actus administrativus non cessat resoluto iure statuentis, nisi aliud iure expresse caveatur.

Кан. 46 – Адміністрацыйны акт не траціць моц са спыненнем права таго, хто яго выдаў, калі права выразна не прадугледжвае іншае.

Кан. 47 – Адмена аднаго адміністрацыйнага акта іншым адміністрацыйным актам кампетэнтнай улады набывае моц з моментам, калі аб гэтым будзе легітымна паведамлены той, для каго гэты акт быў выдадзены.

Can. 47 – Revocatio actus administrativi per alium actum administrativum auctoritatis competentis effectum tantummodo obtinet a momento, quo legitime notificatur personae pro qua datus est.

Раздзел II
Асобныя дэкрэты і прадпісанні

Caput II
De decretis et praeceptis singularibus

Кан. 48 – Асобны дэкрэт — гэта адміністрацыйны акт, выдадзены кампетэнтнай выканаўчай уладай, у якім у адпаведнасці з нормамі права даецца такое рашэнне ў якой-небудзь асобнай справе або здзяйсняецца такое прызначэнне, якія самі па сабе не прадугледжваюць пададзенага кім-небудзь прашэння.

Can. 48 – Decretum singulare intellegitur actus administrativus a competenti auctoritate exsecutiva editus, quo secundum iuris normas pro casu particulari datur decisio aut fit provisio, quae natura sua petitionem ab aliquo factam non supponunt.

Кан. 49 – Асобнае прадпісанне — гэта дэкрэт, які прама і легітымна загадвае акрэсленай асобе або асобам здзейсніць што-небудзь або ўстрымацца ад чаго-небудзь, перадусім з мэтай абавязаць да выконвання закона.

Can. 49 – Praeceptum singulare est decretum quo personae aut personis determinatis aliquid faciendum aut omittendum directe et legitime imponitur, praesertim ad legis observantiam urgendam.

Кан. 50 – Перад выданнем асобнага дэкрэта адпаведная ўлада павінна сабраць неабходныя звесткі і доказы, а таксама, калі магчыма, выслухаць тых, чые правы могуць быць парушаны.

Can. 50 – Antequam decretum singulare ferat, auctoritas necessarias notitias et probationes exquirat, atque, quantum fieri potest, eos audiat quorum iura laedi possint.

Кан. 51 – Дэкрэт павінен быць выдадзены пісьмова, а калі прымаецца рашэнне, павінен змяшчаць прынамсі агульную матывацыю.

Can. 51 – Decretum scripto feratur expressis, saltem summarie, si agatur de decisione, motivis.

Кан. 52 – Асобны дэкрэт мае моц толькі ў дачыненні да тых спраў, якія вырашае, і тых асобаў, для якіх ён выдадзены; пры гэтым ён абавязвае іх паўсюдна, калі не сцверджана іншае.

Can. 52 – Decretum singulare vim habet tantum quoad res de quibus decernit et pro personis quibus datum est; eas vero ubique obligat, nisi aliud constet.

Кан. 53 – Калі дэкрэты супярэчаць адзін аднаму, то асаблівы мае перавагу над агуль-

Can. 53 – Si decreta inter se sint contraria, peculiare, in iis quae pe-

culiariter exprimuntur, praevalet generali; si aeque sint peculiaria aut generalia, posterius tempore obrogat priori, quatenus ei contrarium est.

ным у тых пытаннях, якія ў ім разглядаюцца асабліва; калі ж дэкрэты ў роўнай ступені з'яўляюцца асаблівымі ці агульнымі, то пазнейшы адмяняе ранейшы ў тым, у чым яму супярэчыць.

Can. 54 – § 1. Decretum singulare, cuius applicatio committitur exsecutori, effectum habet a momento exsecutionis; secus a momento quo personae auctoritate ipsius decernentis intimatur.

Кан. 54 – § 1. Асобны дэкрэт, выкананне якога даручана выканаўцу, асягае свае наступствы з момантам выканання; у іншых выпадках — з момантам, калі адпаведная асоба была паведамлена ўладай таго, хто прыняў рашэнне.

§ 2. Decretum singulare, ut urgeri possit, legitimo documento ad normam iuris intimandum est.

§ 2. Толькі тады можна патрабаваць выканання асобнага дэкрэта, калі ён у выглядзе легітымнага дакумента быў уручаны згодна з нормамі права.

Can. 55 – Firmo praescripto cann. 37 et 51, cum gravissima ratio obstet ne scriptus decreti textus tradatur, decretum intimatum habetur si ei, cui destinatur, coram notario vel duobus testibus legatur, actis redactis, ab omnibus praesentibus subscribendis.

Кан. 55 – Калі вельмі важкая прычына не дазваляе перадаць пісьмовы тэкст дэкрэта, дэкрэт лічыцца ўручаным, калі яго прачыталі ў прысутнасці натарыуса або двух сведкаў таму, для каго ён прызначаны, пры гэтым захоўваюцца прадпісанні кан. 37 і 51; акт аб гэтым павінен быць падпісаны ўсімі прысутнымі.

Can. 56 – Decretum pro intimato habetur, si is cui destinatur, rite vocatus ad decretum accipiendum vel audiendum, sine iusta causa non comparuerit vel subscribere recusaverit.

Кан. 56 – Лічыцца, што дэкрэт быў уручаны, калі тая асоба, для якой ён прызначаны, была належным чынам выклікана для таго, каб атрымаць або выслухаць дэкрэт, але не з'явілася без справядлівай прычыны або адмовілася паставіць свой подпіс.

Can. 57 – § 1. Quoties lex iubeat decretum ferri vel ab eo, cuius interest, petitio vel recursus ad decretum obtinendum legitime proponatur, auctoritas competens intra tres menses a recepta petitione vel recursu provideat, nisi alius terminus lege praescribatur.

Кан. 57 – § 1. Заўсёды, калі закон прадпісвае выдаць дэкрэт, або той, хто ў гэтым зацікаўлены, легітымна звяртаецца з просьбай ці рэкурсам, каб атрымаць дэкрэт, кампетэнтная ўлада павінна прыняць рашэнне на працягу трох месяцаў ад часу атрымання просьбы ці рэкурса, калі закон не прадугледжвае іншы тэрмін.

§ 2. Hoc termino transacto, si decretum nondum datum fuerit, responsum praesumitur negativum, ad propositionem ulterioris recursus quod attinet.

§ 2. Калі пасля заканчэння гэтага тэрміну дэкрэт яшчэ не быў выдадзены, мяркуецца аб адмоўным адказе на зварот з чарговым рэкурсам.

§ 3. Меркаваны адмоўны адказ не вызваляе кампетэнтную ўладу ад абавязку выдаць дэкрэт, а таксама, згодна з прадпісаннем кан. 128, выправіць шкоду, якую яна магла прычыніць.

Кан. 58 – § 1. Асобны дэкрэт траціць моц у выніку яго легітымнай адмены, здзейсненай кампетэнтнай уладай, а таксама са спыненнем дзеяння закона, для выканання якога ён быў выдадзены.

§ 2. Асобнае прадпісанне, не выдадзенае ў выглядзе легітымнага дакумента, траціць моц са спыненнем права таго, хто выдаў прадпісанне.

§ 3. Responsum negativum praesumptum non eximit competentem auctoritatem ab obligatione decretum ferendi, immo et damnum forte illatum, ad normam can. 128, reparandi.

Can. 58 – § 1. Decretum singulare vim habere desinit legitima revocatione ab auctoritate competenti facta necnon cessante lege ad cuius exsecutionem datum est.

§ 2. Praeceptum singulare, legitimo documento non impositum, cessat resoluto iure praecipientis.

Раздзел III
Рэскрыпты

Caput III
De rescriptis

Кан. 59 – § 1. Рэскрыпт — гэта адміністрацыйны акт, выдадзены пісьмова кампетэнтнай выканаўчай уладай, у якім, згодна з яго сутнасцю, па чыёй-небудзь просьбе ўдзяляецца прывілей, дыспенсацыя або іншая ласка.

§ 2. Прадпісанні, устаноўленыя адносна рэскрыптаў, прымяняюцца таксама ў адносінах да дазволаў або ласкаў, якія ўдзяляюцца ў вуснай форме, калі не сцверджана іншае.

Кан. 60 – Любы рэскрыпт можа атрымаць кожны, каму гэта выразна не забаронена.

Кан. 61 – Калі не сцверджана іншае, рэскрыпт можна атрымаць для іншай асобы нават без яе згоды, і ён з'яўляецца ўжо дзейсным яшчэ да яго прыняцця гэтай асобай, захоўваючы пры гэтым кляўзулы аб супраціўным.

Кан. 62 – Рэскрыпт, у якім не ўказаны выканаўца, набывае моц з моманту выдання дакумента; іншыя — з моманту выканання.

Can. 59 – § 1. Rescriptum intellegitur actus administrativus a competenti auctoritate exsecutiva in scriptis elicitus, quo suapte natura, ad petitionem alicuius, conceditur privilegium, dispensatio aliave gratia.

§ 2. Quae de rescriptis statuuntur praescripta, etiam de licentiae concessione necnon de concessionibus gratiarum vivae vocis oraculo valent, nisi aliud constet.

Can. 60 – Rescriptum quodlibet impetrari potest ab omnibus qui expresse non prohibentur.

Can. 61 – Nisi aliud constet, rescriptum impetrari potest pro alio, etiam praeter eius assensum, et valet ante eiusdem acceptationem, salvis clausulis contrariis.

Can. 62 – Rescriptum in quo nullus datur exsecutor, effectum habet a momento quo datae sunt litterae; cetera, a momento exsecutionis.

Can. 63 – § 1. Validitati rescripti obstat subreptio seu reticentia veri, si in precibus expressa non fuerint quae secundum legem, stilum et praxim canonicam ad validitatem sunt exprimenda, nisi agatur de rescripto gratiae, quod *Motu proprio* datum sit.

§ 2. Item validitati rescripti obstat obreptio seu expositio falsi, si ne una quidem causa motiva proposita sit vera.

§ 3. Causa motiva in rescriptis quorum nullus est exsecutor, vera sit oportet tempore quo rescriptum datum est; in ceteris, tempore exsecutionis.

Can. 64 – Salvo iure Paenitentiariae pro foro interno, gratia a quovis dicasterio Romanae Curiae denegata, valide ab alio eiusdem Curiae dicasterio aliave competenti auctoritate infra Romanum Pontificem concedi nequit, sine assensu dicasterii quocum agi coeptum est.

Can. 65 – § 1. Salvis praescriptis §§ 2 et 3, nemo gratiam a proprio Ordinario denegatam ab alio Ordinario petat, nisi facta denegationis mentione; facta autem mentione, Ordinarius gratiam ne concedat, nisi habitis a priore Ordinario denegationis rationibus.

§ 2. Gratia a Vicario generali vel a Vicario episcopali denegata, ab alio Vicario eiusdem Episcopi, etiam habitis a Vicario denegante denegationis rationibus, valide concedi nequit.

Кан. 63 – § 1. Дзейснасці рэскрыпта перашкаджае субрэпцыя, іншымі словамі — затойванне праўды, калі ў просьбе не ўказана выразна тое, што павінна быць указана для дзейснасці згодна з законам, стылем і кананічнай практыкай, калі гаворка не ідзе пра рэскрыпт, выдадзены ў форме *motu proprio*, у якім удзяляецца акрэсленая ласка.

§ 2. Таксама дзейснасці рэскрыпта перашкаджае абрэпцыя, іншымі словамі — падман або прадстаўленне няпраўды, калі ні адна з прадстаўленых матывуючых прычын не з'яўляецца праўдзівай.

§ 3. У рэскрыптах, у якіх не ўказаны выканаўца, матывуючая прычына павінна быць праўдзівай у час выдавання рэскрыпта; у іншых рэскрыптах — у час іх выканання.

Кан. 64 – Пры тым, што правы Пэнітэнцыярыі на *forum internum* захоўваюцца, ласка, ва ўдзяленні якой адмовіла якая-небудзь дыкастэрыя Рымскай Курыі, не можа быць дзейсна ўдзелена іншай дыкастэрыяй той жа Курыі або іншай кампетэнтнай уладай, ніжэйшай, чым Рымскі Пантыфік, без згоды той дыкастэрыі, дзе пачаўся разгляд справы.

Кан. 65 – § 1. Захоўваючы прадпісанні §§ 2 і 3, ніхто не можа прасіць іншага ардынарыя аб ласцы, ва ўдзяленні якой адмовіў уласны ардынарый, не паведамляючы аб гэтай адмове; атрымаўшы такое паведамленне, ардынарый не павінен удзяляць ласку, пакуль не даведаецца ад папярэдняга ардынарыя аб прычынах адмовы.

§ 2. Ласку, ва ўдзяленні якой адмовіў генеральны або біскупскі вікарый, не можа дзейсна ўдзяліць іншы вікарый таго ж біскупа, нават калі даведаецца аб прычынах адмовы ў вікарыя, які адмовіў ва ўдзяленні ласкі.

§ 3. Дыяцэзіяльны біскуп нядзейсна ўдзяляе ласку, ва ўдзяленні якой адмовіў генеральны або біскупскі вікарый, калі не быў паведамлены аб адмове. Пры гэтым, калі ва ўдзяленні ласкі адмовіў дыяцэзіяльны біскуп, то генеральны або біскупскі вікарый не можа дзейсна ўдзяліць яе без згоды біскупа, нават калі быў паведамлены аб адмове.

Кан. 66 – Рэскрыпт не становіцца нядзейсным па прычыне памылкі ў асабістых дадзеных асобы, якой ён удзяляецца ці якая выдае рэскрыпт, або ў месцы жыхарства, або ў справе, пра якую ідзе гаворка, калі толькі, на думку ардынарыя, няма ніякага сумнення адносна самой асобы ці справы.

Кан. 67 – § 1. Калі здарыцца, што па адной і той жа справе атрыманы два рэскрыпты, супраціўныя адзін аднаму, то асаблівы мае перавагу над агульным у тым, што было вырашана асабліва.

§ 2. Калі яны з'яўляюцца аднолькава асаблівымі або агульнымі, то выдадзены раней мае перавагу над пазнейшым, калі ў пазнейшым выразна не зазначана аб ранейшым або той, хто раней атрымаў рэскрыпт, дагэтуль не карыстаўся ім па прычыне злога намеру ці яўнай уласнай нядбайнасці.

§ 3. У выпадку сумнення, з'яўляецца рэскрыпт дзейсным ці не, трэба звяртацца да таго, хто выдаў гэты рэскрыпт.

Кан. 68 – Рэскрыпт Апостальскай Сталіцы, у якім не ўказаны яго выканаўца, толькі тады павінен быць прадстаўлены ардынарыю таго, хто прасіў аб яго ўдзяленні, калі гэта прадпісана ў самім дакуменце, або калі гаворка ідзе пра публічныя справы, або калі трэба пацвердзіць некаторыя ўмовы.

Кан. 69 – Рэскрыпт, у якім не вызначаны канкрэтны тэрмін для яго прадстаўлення,

§ 3. Gratia a Vicario generali vel a Vicario episcopali denegata et postea, nulla facta huius denegationis mentione, ab Episcopo dioecesano impetrata, invalida est; gratia autem ab Episcopo dioecesano denegata nequit valide, etiam facta denegationis mentione, ab eius Vicario generali vel Vicario episcopali, non consentiente Episcopo, impetrari.

Can. 66 – Rescriptum non fit irritum ob errorem in nomine personae cui datur vel a qua editur, aut loci in quo ipsa residet, aut rei de qua agitur, dummodo iudicio Ordinarii nulla sit de ipsa persona vel de re dubitatio.

Can. 67 – § 1. Si contingat ut de una eademque re duo rescripta inter se contraria impetrentur, peculiare, in iis quae peculiariter exprimuntur, praevalet generali.

§ 2. Si sint aeque peculiaria aut generalia, prius tempore praevalet posteriori, nisi in altero fiat mentio expressa de priore, aut nisi prior impetrator dolo vel notabili neglegentia sua rescripto usus non fuerit.

§ 3. In dubio num rescriptum irritum sit necne, recurratur ad rescribentem.

Can. 68 – Rescriptum Sedis Apostolicae in quo nullus datur exsecutor, tunc tantum debet Ordinario impetrantis praesentari, cum id in iisdem litteris praecipitur, aut de rebus agitur publicis, aut comprobari condiciones oportet.

Can. 69 – Rescriptum, cuius praesentationi nullum est definitum

tempus, potest exsecutori exhiberi quovis tempore, modo absit fraus et dolus.

можа быць прад'яўлены выканаўцу ў любы час, пры гэтым не павінна быць падману або злога намеру.

Can. 70 – Si in rescripto ipsa concessio exsecutori committatur, ipsius est pro suo prudenti arbitrio et conscientia gratiam concedere vel denegare.

Кан. 70 – Калі ў рэскрыпце само ўдзяленне ласкі даручана выканаўцы, ён мае права ў адпаведнасці са сваім разважлівым суджэннем і сумленнем удзяліць гэтую ласку або адмовіць у ёй.

Can. 71 – Nemo uti tenetur rescripto in sui dumtaxat favorem concesso, nisi aliunde obligatione canonica ad hoc teneatur.

Кан. 71 – Ніхто не мае абавязку ўжываць рэскрыпт, выдадзены выключна на яго асабістую карысць, калі не павінен зрабіць гэта па прычыне якога-небудзь кананічнага абавязку.

Can. 72 – Rescripta ab Apostolica Sede concessa, quae exspiraverint, ab Episcopo dioecesano iusta de causa semel prorogari possunt, non tamen ultra tres menses.

Кан. 72 – Рэскрыпты, удзеленыя Апостальскай Сталіцай, тэрмін дзеяння якіх скончыўся, могуць быць адзін раз прадоўжаны дыяцэзіяльным біскупам па справядлівай прычыне, аднак не больш чым на тры месяцы.

Can. 73 – Per legem contrariam nulla rescripta revocantur, nisi aliud in ipsa lege caveatur.

Кан. 73 – Ніякі рэскрыпт не адмяняецца супраціўным яму законам, калі ў самім законе не будзе прадугледжана іншае.

Can. 74 – Quamvis gratia oretenus sibi concessa quis in foro interno uti possit, tenetur illam pro foro externo probare, quoties id legitime ab eo petatur.

Кан. 74 – Колькі б ні было дазволена каму-небудзь ужываць на *forum internum* ласку, удзеленую вусна, аднак на *forum externum* гэтая асоба мае абавязак даказаць яе ўдзяленне, калі хто-небудзь легітымна гэтага патрабуе.

Can. 75 – Si rescriptum contineat privilegium vel dispensationem, serventur insuper praescripta canonum qui sequuntur.

Кан. 75 – Калі ў рэскрыпце ёсць прывілей або дыспенсацыя, павінны, акрамя гэтага, выконвацца прадпісанні наступных канонаў.

Caput IV
De privilegiis

Раздзел IV
Прывілеі

Can. 76 – § 1. Privilegium, seu gratia in favorem certarum personarum sive physicarum sive iuridicarum

Кан. 76 – § 1. Прывілей, іншымі словамі — ласка, удзеленая асаблівым актам на карысць акрэсленых асобаў, фізічных або

юрыдычных, можа быць удзелены заканадаўцам, а таксама выканаўчай уладай, якой заканадаўца даў такія паўнамоцтвы.

§ 2. Стагадовае або незапамятнае валоданне дазваляе меркаваць аб удзяленні прывілея.

Кан. 77 – Прывілей павінен быць інтэрпрэтаваны згодна з прадпісаннем кан. 36 § 1; аднак заўсёды павінна прымяняцца такая інтэрпрэтацыя, у выніку якой асобы, якім прывілей быў удзелены, сапраўды атрымалі б акрэсленую ласку.

Кан. 78 – § 1. Мяркуецца, што прывілей з'яўляецца вечным, калі не будзе даказана супраціўнае.

§ 2. Персанальны прывілей, гэта значыць прывілей, звязаны з канкрэтнай асобай, спыняе сваё існаванне разам з гэтай асобай.

§ 3. Рэчавы прывілей спыняе сваё існаванне з поўным знішчэннем дадзенай рэчы або месца; аднак прывілей, звязаны з месцам, узнаўляецца, калі месца будзе адноўлена згодна са сваім прызначэннем на працягу пяцідзесяці гадоў.

Кан. 79 – Прывілей спыняе сваё існаванне праз адмену, здзейсненую кампетэнтнай уладай паводле прадпісання кан. 47, з захаваннем прадпісання кан. 81.

Кан. 80 – § 1. Ніякі прывілей не спыняе сваё існаванне праз адмову ад яго, калі гэтая адмова не была прынята кампетэнтнай уладай.

§ 2. Любая фізічная асоба можа адмовіцца ад прывілея, удзеленага выключна на яе карысць.

§ 3. Ад прывілея, удзеленага якой-небудзь юрыдычнай асобе, або з прычыны годнасці месца ці рэчы не могуць адмовіцца

per peculiarem actum facta, concedi potest a legislatore necnon ab auctoritate exsecutiva cui legislator hanc potestatem concesserit.

§ 2. Possessio centenaria vel immemorabilis praesumptionem inducit concessi privilegii.

Can. 77 – Privilegium interpretandum est ad normam can. 36, § 1; sed ea semper adhibenda est interpretatio, qua privilegio aucti aliquam revera gratiam consequantur.

Can. 78 – § 1. Privilegium praesumitur perpetuum, nisi contrarium probetur.

§ 2. Privilegium personale, quod scilicet personam sequitur, cum ipsa extinguitur.

§ 3. Privilegium reale cessat per absolutum rei vel loci interitum; privilegium vero locale, si locus intra quinquaginta annos restituatur, reviviscit.

Can. 79 – Privilegium cessat per revocationem competentis auctoritatis ad normam can. 47, firmo praescripto can. 81.

Can. 80 – § 1. Nullum privilegium per renuntiationem cessat, nisi haec a competenti auctoritate fuerit acceptata.

§ 2. Privilegio in sui dumtaxat favorem concesso quaevis persona physica renuntiare potest.

§ 3. Privilegio concesso alicui personae iuridicae, aut ratione dignitatis loci vel rei, singulae personae

renuntiare nequeunt; nec ipsi personae iuridicae integrum est privilegio sibi concesso renuntiare, si renuntiatio cedat in Ecclesiae aliorumve praeiudicium.

ца фізічныя асобы; таксама юрыдычная асоба сама па сабе не мае права адмовіцца ад удзеленага ёй прывілея, калі гэтая адмова прычыніць шкоду Касцёлу або іншым асобам.

Can. 81 – Resoluto iure concedentis, privilegium non extinguitur, nisi datum fuerit cum clausula *ad beneplacitum nostrum* vel alia aequipollenti.

Кан. 81 – Пасля спынення права асобы, якая ўдзяліла прывілей, ён не спыняе сваё існаванне, калі не быў удзелены з кляўзулай *ad beneplacitum nostrum* ці раўназначнай ёй.

Can. 82 – Per non usum vel per usum contrarium privilegium aliis haud onerosum non cessat; quod vero in aliorum gravamen cedit, amittitur, si accedat legitima praescriptio.

Кан. 82 – Прывілеі, якія не з'яўляюцца цяжарам для іншых, не спыняюць сваё існаванне па прычыне неўжывання або калі іх ужываюць супрацьлеглым чынам; пры гэтым прывілей, які абцяжарвае іншых, траціць сваю моц, калі наступае яго легітымная даўнасць.

Can. 83 – § 1. Cessat privilegium elapso tempore vel expleto numero casuum pro quibus concessum fuit, firmo praescripto can. 142, § 2.

§ 2. Cessat quoque, si temporis progressu rerum adiuncta ita iudicio auctoritatis competentis immutata sint, ut noxium evaserit aut eius usus illicitus fiat.

Кан. 83 – § 1. Прывілей спыняе сваё існаванне, калі мінае тэрмін яго дзеяння або калі скончацца выпадкі, для якіх ён быў удзелены, з захаваннем прадпісання кан. 142 § 2.

§ 2. Прывілей спыняецца і ў тым выпадку, калі з цягам часу, на думку кампетэнтнай улады, настолькі змяніліся акалічнасці, што гэты прывілей становіцца шкодным або яго выкарыстанне становіцца недазволеным.

Can. 84 – Qui abutitur potestate sibi ex privilegio data, privilegio ipso privari meretur; quare, Ordinarius, frustra monito privilegiario, graviter abutentem privet privilegio quod ipse concessit; quod si privilegium concessum fuerit ab Apostolica Sede, eandem Ordinarius certiorem facere tenetur.

Кан. 84 – Той, хто злоўжывае ўладай, дадзенай яму паводле прывілея, заслугоўвае на пазбаўленне гэтага прывілея; таму ардынарый, калі яго перасцярога, скіраваная да ўладальніка, які цяжка злоўжывае прывілеям, не прынесла выніку, павінен пазбавіць яго прывілея, які сам удзяліў, калі ж прывілей быў удзелены Апостальскай Сталіцай, то ардынарый павінен паведаміць аб гэтым Апостальскую Сталіцу.

Раздзел V
Дыспенсацыі

Кан. 85 – Дыспенсацыя, іншымі словамі — паслабленне чыста касцёльнага закона ў асобным выпадку, можа быць удзелена тымі, хто мае выканаўчую ўладу ў межах іх паўнамоцтваў, а таксама тымі, хто яўна або апасродкавана надзелены ўладай удзяляць дыспенсацыю або на моцы самога права, або на моцы дэлегацыі, дадзенай на легітымнай падставе.

Кан. 86 – Не падлягаюць дыспенсацыі законы, якія акрэсліваюць тое, што з'яўляецца істотным для ўстановаў або юрыдычных дзеянняў.

Кан. 87 – § 1. Заўсёды, калі дыяцэзіяльны біскуп палічыць, што гэта будзе спрыяць духоўнаму дабру вернікаў, ён можа ўдзяляць ім дыспенсацыю ад дысцыплінарных законаў, як паўсюдных, так і партыкулярных, выдадзеных вярхоўнай уладай Касцёла для яго тэрыторыі або для падуладных яму асобаў, аднак ён не можа дыспенсаваць ад працэсуальных або карных законаў, а таксама ад тых, дыспенсацыя ад якіх спецыяльным чынам зарэзервавана за Апостальскай Сталіцай або за іншай уладай.

§ 2. Калі маюцца цяжкасці ў тым, каб звярнуцца з рэкурсам да Святой Сталіцы, а разам з тым затрымка пагражае небяспекай цяжкай шкоды, кожны ардынарый можа ўдзяліць дыспенсацыю ад гэтых законаў, нават калі дыспенсацыя зарэзервавана за Святой Сталіцай, калі толькі гаворка ідзе пра дыспенсацыю, якую Святая Сталіца звычайна ўдзяляе пры такіх акалічнасцях, з захаваннем прадпісання кан. 291.

Кан. 88 – Ардынарый месца можа ўдзяліць дыспенсацыю ад дыяцэзіяльных законаў, а таксама ад законаў, выдадзеных пленар-

Caput V
De dispensationibus

Can. 85 – Dispensatio, seu legis mere ecclesiasticae in casu particulari relaxatio, concedi potest ab iis qui potestate gaudent exsecutiva intra limites suae competentiae, necnon ab illis quibus potestas dispensandi explicite vel implicite competit sive ipso iure sive vi legitimae delegationis.

Can. 86 – Dispensationi obnoxiae non sunt leges quatenus ea definiunt, quae institutorum aut actuum iuridicorum essentialiter sunt constitutiva.

Can. 87 – § 1. Episcopus dioecesanus fideles, quoties id ad eorundem spirituale bonum conferre iudicet, dispensare valet in legibus disciplinaribus tam universalibus quam particularibus pro suo territorio vel suis subditis a suprema Ecclesiae auctoritate latis, non tamen in legibus processualibus aut poenalibus, nec in iis quarum dispensatio Apostolicae Sedi aliive auctoritati specialiter reservatur.

§ 2. Si difficilis sit recursus ad Sanctam Sedem et simul in mora sit periculum gravis damni, Ordinarius quicumque dispensare valet in iisdem legibus, etiam si dispensatio reservatur Sanctae Sedi, dummodo agatur de dispensatione quam ipsa in iisdem adiunctis concedere solet, firmo praescripto can. 291.

Can. 88 – Ordinarius loci in legibus dioecesanis atque, quoties id ad fidelium bonum conferre iudicet,

in legibus a Concilio plenario vel provinciali aut ab Episcoporum conferentia latis dispensare valet.

ным Сінодам або Сінодам правінцыі ці Канферэнцыяй Біскупаў, у кожным выпадку, калі палічыць, што гэта будзе на карысць вернікам.

Can. 89 – Parochus aliique presbyteri aut diaconi a lege universali et particulari dispensare non valent, nisi haec potestas ipsis expresse concessa sit.

Кан. 89 – Пробашч і іншыя прэзбітэры або дыяканы не могуць удзяліць дыспенсацыю ад паўсюднага або партыкулярнага закона, калі такая ўлада не будзе ім выразна дадзена.

Can. 90 – § 1. A lege ecclesiastica ne dispensetur sine iusta et rationabili causa, habita ratione adiunctorum casus et gravitatis legis a qua dispensatur; alias dispensatio illicita est et, nisi ab ipso legislatore eiusve superiore data sit, etiam invalida.

Кан. 90 – § 1. Дыспенсацыя ад касцёльнага закона не павінна ўдзяляцца без наяўнасці справядлівай і разумнай прычыны, пры гэтым трэба браць пад увагу акалічнасці дадзенага выпадку і важкасць закона, ад якога ўдзяляецца дыспенсацыя; у іншым выпадку дыспенсацыя з'яўляецца недазволенай, а — калі яна не была ўдзелена заканадаўцам або яго настаяцелем — таксама нядзейснай.

§ 2. Dispensatio in dubio de sufficientia causae valide et licite conceditur.

§ 2. Пры наяўнасці сумнення ў дастатковасці прычыны дыспенсацыя ўдзяляецца дзейсна і дазволеным чынам.

Can. 91 – Qui gaudet potestate dispensandi eam exercere valet, etiam extra territorium exsistens, in subditos, licet e territorio absentes, atque, nisi contrarium expresse statuatur, in peregrinos quoque in territorio actu degentes, necnon erga seipsum.

Кан. 91 – Той, хто мае ўладу ўдзяляць дыспенсацыю, можа ажыццяўляць яе і ў выпадку знаходжання па-за сваёй тэрыторыяй у адносінах да сваіх падуладных, нават калі і яны знаходзяцца па-за яго тэрыторыяй, а таксама, калі выразна не пастаноўлена іншае, у адносінах да падарожных, якія актуальна пражываюць на яго тэрыторыі, і ў адносінах да самога сябе.

Can. 92 – Strictae subest interpretationi non solum dispensatio ad normam can. 36, § 1, sed ipsamet potestas dispensandi ad certum casum concessa.

Кан. 92 – Падлягае вузкай інтэрпрэтацыі не толькі дыспенсацыя паводле прадпісання кан. 36 § 1, але і сама ўлада ўдзялення дыспенсацыі ў канкрэтным выпадку.

Can. 93 – Dispensatio quae tractum habet successivum cessat iisdem modis quibus privilegium, necnon certa ac totali cessatione causae motivae.

Кан. 93 – Дыспенсацыя, якая прымяняецца неаднаразова, спыняе сваё існаванне такім самым чынам, як і прывілей, а таксама калі несумненна і поўнасцю перастае існаваць матывуючая прычына.

ТЫТУЛ V
СТАТУТЫ І РЭГЛАМЕНТЫ

Кан. 94 – § 1. Статуты ва ўласным сэнсе — гэта пастановы, якія прымаюцца згодна з прадпісаннямі права ў сукупнасцях асобаў або рэчаў і якія акрэсліваюць іх мэту, структуру, органы кіравання і спосабы дзейнасці.

§ 2. Статуты сукупнасцяў асобаў абавязваюць толькі тых асобаў, якія з'яўляюцца іх легітымнымі членамі; статуты сукупнасцяў рэчаў — тых, хто імі кіруе.

§ 3. Прадпісанні статутаў, прынятыя і прамульгаваныя на моцы заканадаўчай улады, кіруюцца прадпісаннямі канонаў аб законах.

Кан. 95 – § 1. Рэгламенты — гэта правілы, іншымі словамі — нормы, якія павінны захоўвацца падчас сходу асобаў, калі іх збірае касцёльная ўлада або свабодна скліканых самімі вернікамі, а таксама на іншых афіцыйных сустрэчах; рэгламенты акрэсліваюць тое, што адносіцца да іх складу, парадку кіравання і спосабу дзеяння.

§ 2. Прадпісанні рэгламенту з'яўляюцца абавязковымі на сустрэчах і сходах для ўсіх, хто прымае ў іх удзел.

TITULUS V
DE STATUTIS ET ORDINIBUS

Can. 94 – § 1. Statuta, sensu proprio, sunt ordinationes quae in universitatibus sive personarum sive rerum ad normam iuris conduntur, et quibus definiuntur earundem finis, constitutio, regimen atque agendi rationes.

§ 2. Statutis universitatis personarum obligantur solae personae quae legitime eiusdem membra sunt; statutis rerum universitatis, ii qui eiusdem moderamen curant.

§ 3. Quae statutorum praescripta vi potestatis legislativae condita et promulgata sunt, reguntur praescriptis canonum de legibus.

Can. 95 – § 1. Ordines sunt regulae seu normae quae servari debent in personarum conventibus, sive ab auctoritate ecclesiastica indictis sive a christifidelibus libere convocatis, necnon aliis in celebrationibus, et quibus definiuntur quae ad constitutionem, moderamen et rerum agendarum rationes pertinent.

§ 2. In conventibus celebrationibusve, ii regulis ordinis tenentur, qui in iisdem partem habent.

ТЫТУЛ VI
ФІЗІЧНЫЯ І ЮРЫДЫЧНЫЯ АСОБЫ

Раздзел I
Кананічнае становішча фізічных асобаў

Кан. 96 – Праз хрост чалавек далучаецца да Хрыстовага Касцёла і становіцца ў ім асобай з правамі і абавязкамі, уласцівымі — у залежнасці ад іх становішча — для хрыс-

TITULUS VI
DE PERSONIS PHYSICIS ET IURIDICIS

Caput I
De personarum physicarum condicione canonica

Can. 96 – Baptismo homo Ecclesiae Christi incorporatur et in eadem constituitur persona, cum officiis et iuribus quae christianis, attenta quidem eorum condicione, sunt pro-

pria, quatenus in ecclesiastica sunt communione et nisi obstet lata legitime sanctio.

Can. 97 – § 1. Persona quae duodevigesimum aetatis annum explevit, maior est; infra hanc aetatem, minor.

§ 2. Minor, ante plenum septennium, dicitur infans et censetur non sui compos, expleto autem septennio, usum rationis habere praesumitur.

Can. 98 – § 1. Persona maior plenum habet suorum iurium exercitium.

§ 2. Persona minor in exercitio suorum iurium potestati obnoxia manet parentum vel tutorum, iis exceptis in quibus minores lege divina aut iure canonico ab eorum potestate exempti sunt; ad constitutionem tutorum eorumque potestatem quod attinet, serventur praescripta iuris civilis, nisi iure canonico aliud caveatur, aut Episcopus dioecesanus in certis casibus iusta de causa per nominationem alius tutoris providendum aestimaverit.

Can. 99 – Quicumque usu rationis habitu caret, censetur non sui compos et infantibus assimilatur.

Can. 100 – Persona dicitur: *incola*, in loco ubi est eius domicilium; *advena*, in loco ubi quasi-domicilium habet; *peregrinus*, si versetur extra domicilium et quasi-domicilium quod adhuc retinet; *vagus*, si nullibi domicilium habeat vel quasi-domicilium.

ціян, калі яны знаходзяцца ў касцёльнай супольнасці і калі гэтаму не перашкаджае легітымна наложаная санкцыя.

Кан. 97 – § 1. Асоба, якой споўнілася васямнаццаць гадоў, з'яўляецца паўналетняй; тая, якая не дасягнула гэтага ўзросту, з'яўляецца непаўналетняй.

§ 2. Непаўналетні, які не дасягнуў сямі гадоў, называецца дзіцём і не нясе адказнасць за свае дзеянні; пасля дасягнення ім сямі гадоў лічыцца здольным карыстацца розумам.

Кан. 98 – § 1. Паўналетняя асоба можа ў поўнай меры карыстацца сваімі правамі.

§ 2. Непаўналетняя асоба пры ажыццяўленні сваіх правоў падлягае ўладзе бацькоў або апекуноў, за выключэннем выпадкаў, у якіх непаўналетнія выключаны з-пад іх улады паводле Божага закону або кананічнага права. Што датычыць устанаўлення апекуноў і іх улады, павінны захоўвацца прадпісанні дзяржаўнага заканадаўства, калі ў кананічным праве не прадугледжана іншае або калі дыяцэзіяльны біскуп па справядлівай прычыне не палічыць, што справа павінна быць вырашана прызначэннем іншага апекуна.

Кан. 99 – Асоба, пастаянна няздольная карыстацца розумам, не нясе адказнасць за свае дзеянні і прыраўноўваецца да дзяцей.

Кан. 100 – Асоба называецца жыхаром у тым месцы, дзе яна мае пастаяннае месца жыхарства; прыезджым — у тым месцы, дзе мае часовае месца жыхарства; падарожным — калі знаходзіцца па-за пастаянным або часовым месцам жыхарства, якое захоўваецца за ёю; бадзяжным — калі нідзе не мае пастаяннага або часовага месца жыхарства.

Кан. 101 – § 1. Месцам нараджэння дзіцяці, таксама новаахрышчанага, лічыцца тое, у якім яго бацькі мелі пастаяннае або — калі такога не было — часовае месца жыхарства пры яго нараджэнні; калі бацькі не мелі сумеснага пастаяннага або часовага месца жыхарства, лічыцца тое, якое мела маці.

§ 2. Калі гаворка ідзе пра дзіця бадзяжных, то месцам яго нараджэння лічыцца тое месца, дзе яно нарадзілася; калі ж гаворка ідзе пра пакінутае дзіця — месца, дзе яго знайшлі.

Кан. 102 – § 1. Пастаяннае месца жыхарства набываецца праз такое прабыванне на тэрыторыі той ці іншай парафіі або прынамсі дыяцэзіі, якое было звязана з намерам заставацца там пастаянна, калі нішто адтуль не адкліча, або працягвалася поўных пяць гадоў.

§ 2. Часовае месца жыхарства набываецца праз такое прабыванне на тэрыторыі той ці іншай парафіі або прынамсі дыяцэзіі, якое было звязана з намерам застацца там па меншай меры на тры месяцы, калі нішто адтуль не адкліча, або фактычна працягвалася тры месяцы.

§ 3. Пастаяннае або часовае месца жыхарства на тэрыторыі парафіі называецца парафіяльным; на тэрыторыі дыяцэзіі — нават і не ў парафіі — дыяцэзіяльным.

Кан. 103 – Члены манаскіх інстытутаў і таварыстваў апостальскага жыцця набываюць пастаяннае месца жыхарства ў тым месцы, дзе знаходзіцца дом, да якога яны належаць; часовае месца жыхарства — у доме, дзе яны прабываюць згодна з кан. 102 § 2.

Кан. 104 – Сужэнцы павінны мець сумеснае пастаяннае або часовае месца жыхарства; у выпадку легітымнай сепарацыі сужэнцаў ці па іншай справядлівай прычыне кожны

Can. 101 – § 1. Locus originis filii, etiam neophyti, est ille in quo cum filius natus est, domicilium, aut, eo deficiente, quasi-domicilium habuerunt parentes vel, si parentes non habuerint idem domicilium vel quasi-domicilium, mater.

§ 2. Si agatur de filio vagorum, locus originis est ipsemet nativitatis locus; si de exposito, est locus in quo inventus est.

Can. 102 – § 1. Domicilium acquiritur ea in territorio alicuius paroeciae aut saltem dioecesis commoratione, quae aut coniuncta sit cum animo ibi perpetuo manendi si nihil inde avocet, aut ad quinquennium completum sit protracta.

§ 2. Quasi-domicilium acquiritur ea commoratione in territorio alicuius paroeciae aut saltem dioecesis, quae aut coniuncta sit cum animo ibi manendi saltem per tres menses si nihil inde avocet, aut ad tres menses reapse sit protracta.

§ 3. Domicilium vel quasi-domicilium in territorio paroeciae dicitur paroeciale; in territorio dioecesis, etsi non in paroecia, dioecesanum.

Can. 103 – Sodales institutorum religiosorum et societatum vitae apostolicae domicilium acquirunt in loco ubi sita est domus cui adscribuntur; quasi-domicilium in domo ubi, ad normam can. 102, § 2, commorantur.

Can. 104 – Coniuges commune habeant domicilium vel quasi-domicilium; legitimae separationis ratione vel alia iusta de causa, uterque habe-

re potest proprium domicilium vel quasi-domicilium.

Can. 105 – § 1. Minor necessario retinet domicilium et quasi-domicilium illius, cuius potestati subicitur. Infantia egressus potest etiam quasi-domicilium proprium acquirere; atque legitime ad normam iuris civilis emancipatus, etiam proprium domicilium.

§ 2. Quicumque alia ratione quam minoritate, in tutelam vel curatelam legitime traditus est alterius, domicilium et quasi-domicilium habet tutoris vel curatoris.

Can. 106 – Domicilium et quasi-domicilium amittitur discessione a loco cum animo non revertendi, salvo praescripto can. 105.

Can. 107 – § 1. Tum per domicilium tum per quasi-domicilium suum quisque parochum et Ordinarium sortitur.

§ 2. Proprius vagi parochus vel Ordinarius est parochus vel Ordinarius loci in quo vagus actu commoratur.

§ 3. Illius quoque qui non habet nisi domicilium vel quasi-domicilium dioecesanum, parochus proprius est parochus loci in quo actu commoratur.

Can. 108 – § 1. Consanguinitas computatur per lineas et gradus.

§ 2. In linea recta tot sunt gradus quot generationes, seu quot personae, stipite dempto.

§ 3. In linea obliqua tot sunt gradus quot personae in utraque simul linea, stipite dempto.

з іх можа мець уласнае пастаяннае або часовае месца жыхарства.

Кан. 105 – § 1. Непаўналетні па неабходнасці захоўвае пастаяннае або часовае месца жыхарства той асобы, уладзе якой ён падлягае. Выходзячы з дзяцінства, ён можа набыць таксама ўласнае часовае месца жыхарства; а, атрымаўшы легітымную эмансіпацыю згодна з дзяржаўным правам, — таксама і ўласнае пастаяннае месца жыхарства.

§ 2. Тыя, хто з іншай прычыны, а не з прычыны непаўналецця легітымна аддадзены пад апеку ці папячыцельства, маюць пастаяннае або часовае месца жыхарства апекуна або папячыцеля.

Кан. 106 – Пастаяннае або часовае месца жыхарства траціцца праз адыход з дадзенага месца з намерам не вяртацца, з захаваннем прадпісання кан. 105.

Кан. 107 – § 1. Як праз пастаяннае, так і праз часовае месца жыхарства кожны атрымлівае ўласнага пробашча і ардынарыя.

§ 2. Уласным пробашчам або ардынарыем бадзяжнага з'яўляецца пробашч або ардынарый таго месца, дзе бадзяжны актуальна прабывае.

§ 3. Уласным пробашчам таго, хто мае толькі дыяцэзіяльнае пастаяннае або часовае месца жыхарства, з'яўляецца пробашч таго месца, дзе асоба актуальна прабывае.

Кан. 108 – § 1. Роднасць лічыцца па лініях і ступенях.

§ 2. Па прамой лініі столькі ступеняў, колькі пакаленняў або асобаў, не ўлічваючы пачынальніка роду.

§ 3. Па бакавой лініі столькі ступеняў, колькі пакаленняў або асобаў у абедзвюх лініях разам, не ўлічваючы пачынальніка роду.

Кан. 109 – § 1. Сваяцтва ўзнікае з дзейснага сужэнства, нават няздзейсненага, і існуе паміж мужам і роднымі жонкі, а таксама паміж жонкай і роднымі мужа.

§ 2. Яно падлічваецца такім чынам: родныя мужа з'яўляюцца сваякамі жонкі ў той самай лініі і ў той самай ступені і наадварот.

Кан. 110 – Дзеці, усыноўленыя згодна з нормамі дзяржаўнага заканадаўства, лічацца дзецьмі таго або тых, хто іх усынавіў.

Кан. 111 – § 1. Праз прыняцце хросту да Лацінскага Касцёла далучаецца дзіця тых бацькоў, якія да яго належаць; або — калі адзін з бацькоў да яго не належыць — тых бацькоў, якія згодна жадаюць, каб іх дзіця было ахрышчана ў Лацінскім Касцёле; калі ж згода паміж бацькамі адсутнічае, то дзіця далучаецца да таго Касцёла *sui iuris*, да якога належыць яго бацька.

§ 2. Калі толькі адзін з бацькоў з'яўляецца католікам, дзіця належыць да таго Касцёла, да якога належыць каталіцкі бок.

§ 3. Кожны, хто павінен быць ахрышчаны і каму споўнілася чатырнаццаць гадоў, можа свабодна выбраць хрост у Лацінскім Касцёле або ў іншым абрадавым Касцёле *sui iuris*; у такім выпадку ён належыць да выбранага Касцёла.

Кан. 112 – § 1. Пасля прыняцця хросту да іншага абрадавага Касцёла *sui iuris* далучаюцца:

1° тыя, хто атрымаў дазвол Апостальскай Сталіцы;

2° сужэнец, які пры заключэнні сужэнства або ў час яго трывання заявіць, што жадае перайсці ў абрадавы Касцёл *sui iuris* другога сужэнца; пасля таго, як сужэнства перастане існаваць, ён можа свабодна вярнуцца ў Лацінскі Касцёл;

Can. 109 – § 1. Affinitas oritur ex matrimonio valido, etsi non consummato, atque viget inter virum et mulieris consanguineos, itemque mulierem inter et viri consanguineos.

§ 2. Ita computatur ut qui sunt consanguinei viri, iidem in eadem linea et gradu sint affines mulieris, et vice versa.

Can. 110 – Filii, qui ad normam legis civilis adoptati sint, habentur ut filii eius vel eorum qui eos adoptaverint.

Can. 111 – § 1. Ecclesiae latinae per receptum baptismum adscribitur filius parentum, qui ad eam pertinent vel, si alteruter ad eam non pertineat, ambo concordi voluntate optaverint ut proles in Ecclesia latina baptizaretur; quodsi concors voluntas desit, Ecclesiae sui iuris ad quam pater pertinet adscribitur.

§ 2. Si vero unus tantum ex parentibus sit catholicus, Ecclesiae ad quam hic parens catholicus pertinet adscribitur.

§ 3. Quilibet baptizandus qui quartum decimum aetatis annum expleverit, libere potest eligere ut in Ecclesia latina vel in alia Ecclesia sui iuris baptizetur; quo in casu, ipse ad eam Ecclesiam pertinet quam elegerit.

Can. 112 – § 1. Post receptum baptismum, alii Ecclesiae sui iuris adscribuntur:

1° qui licentiam ab Apostolica Sede obtinuerit;

2° coniux qui, in matrimonio ineundo vel eo durante, ad Ecclesiam sui iuris alterius coniugis se transire declaraverit; matrimonio autem soluto, libere potest ad latinam Ecclesiam redire;

3° filii eorum, de quibus in nn. 1 et 2, ante decimum quartum aetatis annum completum itemque, in matrimonio mixto, filii partis catholicae quae ad aliam Ecclesiam sui iuris legitime transierit; adepta vero hac aetate, iidem possunt ad latinam Ecclesiam redire.

§ 2. Mos, quamvis diuturnus, sacramenta secundum ritum alius Ecclesiae sui iuris recipiendi, non secumfert adscriptionem eidem Ecclesiae.

§ 3. Omnis transitus ad aliam Ecclesiam sui iuris vim habet a momento declarationis factae coram eiusdem Ecclesiae Ordinario loci vel parocho proprio aut sacerdote ab alterutro delegato et duobus testibus, nisi rescriptum Sedis Apostolicae aliud ferat; et in libro baptizatorum adnotetur.

3° дзеці тых, аб кім у 1° і 2°, якія не дасягнулі чатырнаццацігадовага ўзросту, а ў змешаным сужэнстве дзеці каталіцкага сужэнца, які легітымна перайшоў у іншы абрадавы Касцёл; пасля ж дасягнення пададзенага ўзросту могуць вярнуцца ў Лацінскі Касцёл.

§ 2. Прызвычаенасць, нават працяглая, да прыняцця сакрамэнтаў паводле абрадаў якога-небудзь Касцёла *sui iuris* не выклікае далучэння да гэтага Касцёла.

§ 3. Кожны пераход у іншы Касцёл *sui iuris* набывае моц з момантам, калі аб гэтым зроблена адпаведная заява ў прысутнасці ардынарыя месца гэтага Касцёла, або ўласнага пробашча, або іншага святара, дэлегаванага адным з іх, і двух сведкаў, калі рэскрыпт Апостальскай Сталіцы не пастанаўляе іншае; аб гэтым павінен быць зроблены запіс у кнізе хростаў.

Caput II
De personis iuridicis

Can. 113 – § 1. Catholica Ecclesia et Apostolica Sedes, moralis personae rationem habent ex ipsa ordinatione divina.

§ 2. Sunt etiam in Ecclesia, praeter personas physicas, personae iuridicae, subiecta scilicet in iure canonico obligationum et iurium quae ipsarum indoli congruunt.

Can. 114 – § 1. Personae iuridicae constituuntur aut ex ipso iuris praescripto aut ex speciali competentis auctoritatis concessione per decretum data, universitates sive personarum sive rerum in finem missioni Ecclesiae congruentem, qui singulorum finem transcendit, ordinatae.

Раздзел II
Юрыдычныя асобы

Кан. 113 – § 1. Каталіцкі Касцёл і Апостальская Сталіца з'яўляюцца маральнымі асобамі на моцы самога Божага ўстанаўлення.

§ 2. Акрамя фізічных асобаў, у Касцёле ёсць таксама юрыдычныя асобы, якія менавіта з'яўляюцца ў кананічным праве суб'ектамі правоў і абавязкаў, адпаведных іх характару.

Кан. 114 – § 1. Юрыдычныя асобы ўтвараюцца — або на моцы прадпісання самога права, або праз спецыяльнае зацверджанне кампетэнтнай уладай, выдадзенае ў форме дэкрэту, — як сукупнасці асобаў ці рэчаў, прызначаныя для дасягнення мэтаў, адпаведных місіі Касцёла, якія пры гэтым пераўзыходзяць мэты прыватных асобаў.

§ 2. У якасці мэтаў, якія згадваюцца ў § 1, трэба разумець тыя, якія адносяцца да спраў міласэрнасці, апостальства або любові — як у духоўным, так і ў матэрыяльным сэнсе.

§ 3. Кампетэнтная ўлада Касцёла павінна даваць правы юрыдычнай асобы толькі тым сукупнасцям асобаў ці рэчаў, якія рэалізуюць сапраўды карысную мэту і якія, калі ўзяць пад увагу ўсе акалічнасці, маюць сродкі, якія, як прадугледжваецца, будуць дастатковымі для дасягнення пастаўленай мэты.

Кан. 115 – § 1. Юрыдычнымі асобамі ў Касцёле з'яўляюцца або сукупнасці асобаў, або сукупнасці рэчаў.

§ 2. Сукупнасць асобаў, якая складаецца прынамсі з трох асобаў, з'яўляецца калегіяльнай, калі яе дзейнасць акрэсліваюць члены, якія прымаюць рашэнні разам — на роўных правах або не — згодна з прадпісаннямі права і статутаў; у іншым выпадку яна не з'яўляецца калегіяльнай.

§ 3. Сукупнасць рэчаў, іншымі словамі — самастойны фонд, складаецца з маёмасці або рэчаў — духоўных ці матэрыяльных — якімі, згодна з прадпісаннямі права і статутаў, кіруе адна ці некалькі фізічных асобаў або калегія.

Кан. 116 – § 1. Публічныя юрыдычныя асобы — гэта сукупнасці асобаў або рэчаў, утвораныя кампетэнтнай касцёльнай уладай для таго, каб, згодна з прадпісаннямі права, выконваць даручаныя ім уласныя заданні ад імя Касцёла ў вызначаных ім межах дзеля публічнага дабра; іншыя юрыдычныя асобы з'яўляюцца прыватнымі.

§ 2. Публічныя юрыдычныя асобы атрымліваюць правасуб'ектнасць або на моцы самога права, або на моцы спецыяльнага дэкрэта кампетэнтнай улады, які вы-

§ 2. Fines, de quibus in § 1, intelleguntur qui ad opera pietatis, apostolatus vel caritatis sive spiritualis sive temporalis attinent.

§ 3. Auctoritas Ecclesiae competens personalitatem iuridicam ne conferat nisi iis personarum aut rerum universitatibus, quae finem persequuntur reapse utilem atque, omnibus perpensis, mediis gaudent quae sufficere posse praevidentur ad finem praestitutum assequendum.

Can. 115 – § 1. Personae iuridicae in Ecclesia sunt aut universitates personarum aut universitates rerum.

§ 2. Universitas personarum, quae quidem nonnisi ex tribus saltem personis constitui potest, est collegialis, si eius actionem determinant membra, in decisionibus ferendis concurrentia, sive aequali iure sive non, ad normam iuris et statutorum; secus est non collegialis.

§ 3. Universitas rerum seu fundatio autonoma constat bonis seu rebus, sive spiritualibus sive materialibus, eamque, ad normam iuris et statutorum, moderantur sive una vel plures personae physicae sive collegium.

Can. 116 – § 1. Personae iuridicae publicae sunt universitates personarum aut rerum, quae ab ecclesiastica auctoritate competenti constituuntur ut intra fines sibi praestitutos nomine Ecclesiae, ad normam praescriptorum iuris, munus proprium intuitu boni publici ipsis commissum expleant; ceterae personae iuridicae sunt privatae.

§ 2. Personae iuridicae publicae hac personalitate donantur sive ipso iure sive speciali competentis auctoritatis decreto eandem expresse con-

cedenti; personae iuridicae privatae hac personalitate donantur tantum per speciale competentis auctoritatis decretum eandem personalitatem expresse concedens.

разна яе ўдзяляе; прыватныя юрыдычныя асобы атрымліваюць такую правасуб'ектнасць толькі праз спецыяльны дэкрэт кампетэнтнай улады, які выразна ўдзяляе гэтую правасуб'ектнасць.

Can. 117 – Nulla personarum vel rerum universitas personalitatem iuridicam obtinere intendens, eandem consequi valet nisi ipsius statuta a competenti auctoritate sint probata.

Кан. 117 – Ніякая сукупнасць асобаў або рэчаў, якая мае намер атрымаць правасуб'ектнасць, не можа яе атрымаць, калі статут гэтай сукупнасці не быў зацверджаны кампетэнтнай уладай.

Can. 118 – Personam iuridicam publicam repraesentant, eius nomine agentes, ii quibus iure universali vel particulari aut propriis statutis haec competentia agnoscitur; personam iuridicam privatam, ii quibus eadem competentia per statuta tribuitur.

Кан. 118 – Прадстаўнікамі, якія дзейнічаюць ад імя публічнай юрыдычнай асобы, з'яўляюцца тыя, каму такое права надаецца паўсюдным ці партыкулярным правам або ўласнымі статутамі; ад імя прыватнай юрыдычнай асобы — тыя, каму гэта дазваляецца статутамі.

Can. 119 – Ad actus collegiales quod attinet, nisi iure vel statutis aliud caveatur:

1° si agatur de electionibus, id vim habet iuris, quod, praesente quidem maiore parte eorum qui convocari debent, placuerit parti absolute maiori eorum qui sunt praesentes; post duo inefficacia scrutinia, suffragatio fiat super duobus candidatis qui maiorem suffragiorum partem obtinuerint, vel, si sunt plures, super duobus aetate senioribus; post tertium scrutinium, si paritas maneat, ille electus habeatur qui senior sit aetate;

2° si agatur de aliis negotiis, id vim habet iuris, quod, praesente quidem maiore parte eorum qui convocari debent, placuerit parti absolute maiori eorum qui sunt praesentes; quod si post duo scrutinia suffragia aequalia fuerint, praeses suo voto paritatem dirimere potest;

Кан. 119 – Што датычыць калегіяльных дзеянняў, то, калі права або статуты не прадугледжваюць іншае:

1° калі гаворка ідзе пра выбары, тое будзе мець моц права, што будзе прынята абсалютнай большасцю прысутных пры ўмове прысутнасці большасці тых, хто павінен быць скліканы; пасля двух безвыніковых галасаванняў павінен быць пастаўлены на галасаванне выбар з двух кандыдатураў, якія набралі большасць галасоў, або, калі іх будзе больш, з кандыдатураў двух старэйшых узростам; калі і пасля трэцяга галасавання захоўваецца раўнавага, то выбраным павінен лічыцца старэйшы ўзростам;

2° калі гаворка ідзе пра іншыя справы, тое будзе мець моц права, што будзе прынята абсалютнай большасцю прысутных пры ўмове прысутнасці большасці тых, хто павінен быць скліканы; калі пасля двух галасаванняў будзе раўнавага галасоў, то старшыня можа пераважыць роўнасць сваім голасам;

3° тое, што павінна адносіцца да ўсіх і да кожнага асабіста, павінна быць зацверджана ўсімі.

Кан. 120 – § 1. Юрыдычная асоба па сваёй прыродзе з'яўляецца пастаяннай; аднак яна спыняе сваё існаванне, калі кампетэнтная ўлада легітымна яе ліквідуе або калі юрыдычная асоба не дзейнічае на працягу ста гадоў; прыватная юрыдычная асоба, акрамя гэтага, спыняе сваё існаванне, калі згодна з нормамі статутаў будзе ліквідавана само аб'яднанне або калі, на думку кампетэнтнай улады, сам фонд згодна з нормамі статутаў перастане існаваць.

§ 2. Калі застаецца прынамсі адзін з членаў калегіяльнай юрыдычнай асобы, а сукупнасць асобаў згодна са статутамі не спыніла свайго існавання, то ён можа ажыццяўляць усе правы дадзенай сукупнасці.

Кан. 121 – Калі сукупнасці асобаў або рэчаў, якія з'яўляюцца публічнымі юрыдычнымі асобамі, аб'ядноўваюцца такім чынам, што з іх утвараецца адзіная сукупнасць, якая сама мае правасуб'ектнасць, то гэтая новая юрыдычная асоба атрымлівае маёмасць і правы, якія належалі папярэднім асобам, а таксама прымае на сябе іх абавязацельствы; што датычыць прызначэння таго, што было атрымана, перадусім маёмасці, і выконвання абавязацельстваў, павінна выконвацца воля заснавальнікаў і ахвярадаўцаў, а таксама набытыя правы.

Кан. 122 – Калі сукупнасць, якая мае публічную правасуб'ектнасць, раздзяляецца такім чынам, што або адна з яе частак аб'ядноўваецца з іншай юрыдычнай асобай, або з аддзеленай часткі засноўваецца асобная публічная юрыдычная асоба, то касцёльная ўлада, да кампетэнцыі якой належыць такое раздзяленне, павінна сама або праз

3° quod autem omnes uti singulos tangit, ab omnibus approbari debet.

Can. 120 – § 1. Persona iuridica natura sua perpetua est; extinguitur tamen si a competenti auctoritate legitime supprimatur aut per centum annorum spatium agere desierit; persona iuridica privata insuper extinguitur, si ipsa consociatio ad normam statutorum dissolvatur, aut si, de iudicio auctoritatis competentis, ipsa fundatio ad normam statutorum esse desierit.

§ 2. Si vel unum ex personae iuridicae collegialis membris supersit, et personarum universitas secundum statuta esse non desierit, exercitium omnium iurium universitatis illi membro competit.

Can. 121 – Si universitates sive personarum sive rerum, quae sunt personae iuridicae publicae, ita coniungantur ut ex iisdem una constituatur universitas personalitate iuridica et ipsa pollens, nova haec persona iuridica bona iuraque patrimonialia prioribus propria obtinet atque onera suscipit, quibus eaedem gravabantur; ad destinationem autem praesertim bonorum et ad onerum adimpletionem quod attinet, fundatorum oblatorumque voluntas atque iura quaesita salva esse debent.

Can. 122 – Si universitas, quae gaudet personalitate iuridica publica, ita dividatur ut aut illius pars alii personae iuridicae uniatur aut ex parte dismembrata distincta persona iuridica publica erigatur, auctoritas ecclesiastica, cui divisio competat, curare debet per se vel per exsecutorem, servatis quidem in primis tum fundatorum

ac oblatorum voluntate tum iuribus quaesitis tum probatis statutis:

1° ut communia, quae dividi possunt, bona atque iura patrimonialia necnon aes alienum aliaque onera dividantur inter personas iuridicas, de quibus agitur, debita cum proportione ex aequo et bono, ratione habita omnium adiunctorum et necessitatum utriusque;

2° ut usus et ususfructus communium bonorum, quae divisioni obnoxia non sunt, utrique personae iuridicae cedant, oneraque iisdem propria utrique imponantur, servata item debita proportione ex aequo et bono definienda.

выканаўцу, перадусім захоўваючы як волю заснавальнікаў і ахвярадаўцаў, так і набытыя правы, а таксама зацверджаныя статуты, паклапаціцца аб тым, каб:

1° агульныя рэчы, якія могуць быць падзелены, маёмасць, а таксама маёмасныя правы, пазыкі і іншыя абавязацельствы былі падзелены паводле дабра і адпаведнасці паміж юрыдычнымі асобамі, пра якія ідзе гаворка, захоўваючы належную прапорцыю і ўлічваючы ўсе акалічнасці і патрэбы кожнай з іх;

2° карыстанне сумеснай маёмасцю і даходы, якія могуць быць з яе атрыманы, якія немагчыма раздзяліць, перайшлі да абедзвюх юрыдычных асобаў, а звязаныя з ёй абавязацельствы таксама былі ўскладзены на абедзвюх, пры гэтым павінна захоўвацца належная прапорцыя, якая акрэсліваецца паводле дабра і адпаведнасці.

Can. 123 – Extincta persona iuridica publica, destinatio eiusdem bonorum iuriumque patrimonialium itemque onerum regitur iure et statutis, quae, si sileant, obveniunt personae iuridicae immediate superiori, salvis semper fundatorum vel oblatorum voluntate necnon iuribus quaesitis; extincta persona iuridica privata, eiusdem bonorum et onerum destinatio propriis statutis regitur.

Кан. 123 – Пасля таго, як публічная юрыдычная асоба спыніць сваё існаванне, лёс яе маёмасці і маёмасных правоў, а таксама абавязацельстваў рэгулюецца правам і статутамі. Калі ў іх нічога аб гэтым не гаворыцца, усё пераходзіць да юрыдычнай асобы вышэйшага чым яна ўзроўню. Пры гэтым заўсёды павінна захоўвацца воля заснавальнікаў або ахвярадаўцаў, а таксама набытыя правы. Калі спыніць сваё існаванне прыватная юрыдычная асоба, лёс яе маёмасці і абавязацельстваў рэгулюецца яе ўласнымі статутамі.

TITULUS VII
DE ACTIBUS IURIDICIS

ТЫТУЛ VII
ЮРЫДЫЧНЫЯ ДЗЕЯННІ

Can. 124 – § 1. Ad validitatem actus iuridici requiritur ut a persona habili sit positus, atque in eodem adsint

Кан. 124 – § 1. Для дзейснасці юрыдычнага дзеяння патрабуецца, каб яно было здзейснена дзеяздольнай асобай і каб у ім было

выканана тое, што з'яўляецца яго істотным элементам; акрамя таго, неабходна выканаць усе фармальнасці і ўмовы, якія права патрабуе для дзейснасці дзеяння.

§ 2. Мяркуецца, што юрыдычнае дзеянне з'яўляецца дзейсным, калі яго знешнія элементы былі выкананы належным чынам.

Кан. 125 – § 1. Дзеянне, якое было выканана асобай пад знешнім прымусам, супрацьстаяць якому гэтая асоба ніяк не магла, лічыцца нявыкананым.

§ 2. Дзеянне, якое было выканана пад уздзеяннем моцнага, несправядліва выкліканага страху або ў выніку падману, з'яўляецца дзейсным; аднак яно можа быць адменена рашэннем суддзі па позве пацярпелага боку ці яго праваперамнікаў або з уласнай ініцыятывы.

Кан. 126 – Дзеянне, якое было выканана па прычыне няведання ці памылкі, якая датычыла самой сутнасці дзеяння або неад'емнай умовы дзейснасці, з'яўляецца нядзейсным; у іншым выпадку яно дзейснае, калі права выразна не прадугледжвае іншае, аднак дзеянне, якое было выканана па прычыне няведання ці памылкі, можа стаць падставай для таго, каб яно было адменена згодна з нормамі права.

Кан. 127 – § 1. Калі права пастанаўляе, што для выканання дзеяння настаяцелю патрабуецца згода або парада якой-небудзь калегіі або групы асобаў, то ён павінен склікаць гэтую калегію або групу паводле прадпісання кан. 166, калі, у выпадку атрымання толькі парады, партыкулярным або ўласным правам не прадугледжана іншае; каб такія дзеянні былі дзейснымі, павінна быць атрымана згода абсалютнай большасці прысутных, а ў выпадку атрымання парады — параіцца з усімі.

quae actum ipsum essentialiter constituunt, necnon sollemnia et requisita iure ad validitatem actus imposita.

§ 2. Actus iuridicus quoad sua elementa externa rite positus praesumitur validus.

Can. 125 – § 1. Actus positus ex vi ab extrinseco personae illata, cui ipsa nequaquam resistere potuit, pro infecto habetur.

§ 2. Actus positus ex metu gravi, iniuste incusso, aut ex dolo, valet, nisi aliud iure caveatur; sed potest per sententiam iudicis rescindi, sive ad instantiam partis laesae eiusve in iure successorum sive ex officio.

Can. 126 – Actus positus ex ignorantia aut ex errore, qui versetur circa id quod eius substantiam constituit, aut qui recidit in condicionem sine qua non, irritus est; secus valet, nisi aliud iure caveatur, sed actus ex ignorantia aut ex errore initus locum dare potest actioni rescissoriae ad normam iuris.

Can. 127 – § 1. Cum iure statuatur ad actus ponendos Superiorem indigere consensu aut consilio alicuius collegii vel personarum coetus, convocari debet collegium vel coetus ad normam can. 166, nisi, cum agatur de consilio tantum exquirendo, aliter iure particulari aut proprio cautum sit; ut autem actus valeant requiritur ut obtineatur consensus partis absolute maioris eorum qui sunt praesentes aut omnium exquiratur consilium.

§ 2. Cum iure statuatur ad actus ponendos Superiorem indigere consensu aut consilio aliquarum personarum, uti singularum:

1° si consensus exigatur, invalidus est actus Superioris consensum earum personarum non exquirentis aut contra earum vel alicuius votum agentis;

2° si consilium exigatur, invalidus est actus Superioris easdem personas non audientis; Superior, licet nulla obligatione teneatur accedendi ad earundem votum, etsi concors, tamen sine praevalenti ratione, suo iudicio aestimanda, ab earundem voto, praesertim concordi, ne discedat.

§ 3. Omnes quorum consensus aut consilium requiritur, obligatione tenentur sententiam suam sincere proferendi atque, si negotiorum gravitas id postulat, secretum sedulo servandi; quae quidem obligatio a Superiore urgeri potest.

Can. 128 – Quicumque illegitime actu iuridico, immo quovis alio actu dolo vel culpa posito, alteri damnum infert, obligatione tenetur damnum illatum reparandi.

§ 2. Калі правам устаноўлена, што для выканання дзеяння настаяцелю патрабуецца згода або парада акрэсленых асобаў паасобку, то:

1° калі патрабуецца згода, то дзеянне настаяцеля, які не запытаўся аб згодзе ў гэтых асобаў або дзейнічаў насуперак меркаванням, выказаным імі ці кімнебудзь з іх, з'яўляецца нядзейсным;

2° калі патрабуецца парада, то дзеянне настаяцеля, які не выслухаў меркаванні гэтых асобаў, з'яўляецца нядзейсным; пры гэтым настаяцель не мае абавязку прымаць іх меркаванні, нават згодныя паміж сабой, тым не менш ён не павінен адступаць ад іх меркаванняў, асабліва згодных паміж сабой, без наяўнасці прычыны, якая, на яго погляд, з'яўляецца больш значнай.

§ 3. Усе тыя, ад каго патрабуецца згода або парада, абавязаны шчыра выказаць свае меркаванні, а таксама, калі гэтага патрабуе важкасць справы, строга захоўваць таямніцу; пры гэтым настаяцель можа патрабаваць выканання гэтага абавязку.

Кан. 128 – Кожны, хто нелегітымным юрыдычным дзеяннем, ці нават якім-небудзь іншым дзеяннем, здзейсненым наўмысна ці ненаўмысна, прычыняе шкоду іншай асобе, павінен выправіць прычыненую шкоду.

TITULUS VIII
DE POTESTATE REGIMINIS

Can. 129 – § 1. Potestatis regiminis, quae quidem ex divina institutione est in Ecclesia et etiam potestas iurisdictionis vocatur, ad normam praescriptorum iuris, habiles sunt qui ordine sacro sunt insigniti.

ТЫТУЛ VIII
УЛАДА КІРАВАННЯ

Кан. 129 – § 1. Уладу кіравання, якая існуе ў Касцёле з Божага ўстанаўлення і якая таксама называецца ўладай юрысдыкцыі, здольны ажыццяўляць згодна з нормамі права тыя, хто прыняў святое пасвячэнне.

§ 2. У ажыццяўленні гэтай улады могуць згодна з нормамі права прымаць удзел свецкія вернікі.

Кан. 130 – Улада кіравання звычайна ажыццяўляецца на *forum externum*, але часам — толькі на *forum internum*, пры гэтым такім чынам, што наступствы, да якіх яе ажыццяўленне магло б прывесці на *forum externum*, на ім не прызнаюцца, калі ў асобных выпадках гэта не прадугледжана правам.

Кан. 131 – § 1. Звычайная ўлада кіравання — гэта ўлада, якая на моцы самога права звязана з якой-небудзь пасадай; дэлегаваная — гэта тая ўлада, якая ўдзяляецца асобе самой па сабе, а не ў сувязі з займанай пасадай.

§ 2. Звычайная ўлада кіравання можа быць уласнай або замяшчальнай.

§ 3. Той, хто сцвярждае, што з'яўляецца дэлегаваным, мае абавязак даказаць сваё дэлегаванне.

Кан. 132 – § 1. Пастаянныя паўнамоцтвы кіруюцца прадпісаннямі аб дэлегаванай уладзе.

§ 2. Аднак калі пры іх удзяленні не было выразна прадугледжана іншае або калі выбар не быў зроблены менавіта з увагі на асобу, то пастаяннае паўнамоцтва, удзеленае ардынарыю, не перастае існаваць са спыненнем улады ардынарыя, якому яно было ўдзелена, нават калі ён ужо пачаў ажыццяўляць гэтае паўнамоцтва, а пераходзіць да кожнага ардынарыя, яго наступніка ў кіраванні.

Кан. 133 – § 1. Дэлегаваны дзейнічае нядзейсна, калі выходзіць за межы свайго ўпаўнаважання, якія датычаць прадметаў ці асобаў.

§ 2. Не лічыцца, што дэлегаваны выйшаў за межы свайго ўпаўнаважання, калі

§ 2. In exercitio eiusdem potestatis, christifideles laici ad normam iuris cooperari possunt.

Can. 130 – Potestas regiminis de se exercetur pro foro externo, quandoque tamen pro solo foro interno, ita quidem ut effectus quos eius exercitium natum est habere pro foro externo, in hoc foro non recognoscantur, nisi quatenus id determinatis pro casibus iure statuatur.

Can. 131 – § 1. Potestas regiminis ordinaria ea est, quae ipso iure alicui officio adnectitur; delegata, quae ipsi personae non mediante officio conceditur.

§ 2. Potestas regiminis ordinaria potest esse sive propria sive vicaria.

§ 3. Ei qui delegatum se asserit, onus probandae delegationis incumbit.

Can. 132 – § 1. Facultates habituales reguntur praescriptis de potestate delegata.

§ 2. Attamen nisi in eius concessione aliud expresse caveatur aut electa sit industria personae, facultas habitualis Ordinario concessa non perimitur resoluto iure Ordinarii cui concessa est, etiamsi ipse eam exsequi coeperit, sed transit ad quemvis Ordinarium qui ipsi in regimine succedit.

Can. 133 – § 1. Delegatus qui sive circa res sive circa personas mandati sui fines excedit, nihil agit.

§ 2. Fines sui mandati excedere non intellegitur delegatus qui alio

modo ac in mandato determinatur, ea peragit ad quae delegatus est, nisi modus ab ipso delegante ad validitatem fuerit praescriptus.

Can. 134 – § 1. Nomine Ordinarii in iure intelleguntur, praeter Romanum Pontificem, Episcopi dioecesani alique qui, etsi ad interim tantum, praepositi sunt alicui Ecclesiae particulari vel communitati eidem aequiparatae ad normam can. 368, necnon qui in iisdem generali gaudent potestate exsecutiva ordinaria, nempe Vicarii generales et episcopales; itemque, pro suis sodalibus, Superiores maiores clericalium institutorum religiosorum iuris pontificii et clericalium societatum vitae apostolicae iuris pontificii, qui ordinaria saltem potestate exsecutiva pollent.

§ 2. Nomine Ordinarii loci intelleguntur omnes qui in § 1 recensentur, exceptis Superioribus institutorum religiosorum et societatum vitae apostolicae.

§ 3. Quae in canonibus nominatim Episcopo dioecesano, in ambitu potestatis exsecutivae tribuuntur, intelleguntur competere dumtaxat Episcopo dioecesano aliisque ipsi in can. 381, § 2 aequiparatis, exclusis Vicario generali et episcopali, nisi de speciali mandato.

Can. 135 – § 1. Potestas regiminis distinguitur in legislativam, exsecutivam et iudicialem.

§ 2. Potestas legislativa exercenda est modo iure praescripto, et ea qua in Ecclesia gaudet legislator infra auctoritatem supremam, valide delegari nequit, nisi aliud iure explicite caveatur; a legislatore inferiore lex iuri superiori contraria valide ferri nequit.

ён выканаў сваё ўпаўнаважанне іншым спосабам, чым было прадпісана, калі той, хто дэлегаваў, не вызначыў акрэслены спосаб у якасці істотнага для дзейснасці.

Кан. 134 – § 1. Пад назвай «ардынарый» разумеюцца ў праве не толькі Рымскі Пантыфік, але і дыяцэзіяльныя біскупы, і ўсе тыя, хто прынамсі толькі часова быў пастаўлены на чале якога-небудзь партыкулярнага Касцёла або супольнасці, прыраўнаванай да яго паводле кан. 368, а таксама тыя, хто мае ў іх звычайную выканаўчую ўладу, а менавіта генеральныя і біскупскія вікарыі; а таксама — для сваіх уласных членаў — вышэйшыя настаяцелі святарскіх манаскіх інстытутаў папскага права і святарскіх таварыстваў апостальскага жыцця папскага права, якія маюць прынамсі звычайную выканаўчую ўладу.

§ 2. Пад назвай «ардынарый месца» разумеюцца ўсе, пералічаныя ў § 1, за выключэннем настаяцеляў манаскіх інстытутаў і таварыстваў апостальскага жыцця.

§ 3. Тое, што ў сферы выканаўчай улады ў канонах надаецца канкрэтна дыяцэзіяльнаму біскупу, трэба разумець як нададзенае толькі дыяцэзіяльнаму біскупу і іншым асобам, якія прыраўнаваны да яго паводле кан. 381 § 2, за выключэннем генеральнага і біскупскага вікарыя, калі яны не атрымалі спецыяльнае ўпаўнаважанне.

Кан. 135 – § 1. Улада кіравання дзеліцца на заканадаўчую, выканаўчую і судовую.

§ 2. Заканадаўчая ўлада павінна ажыццяўляцца спосабам, прадпісаным правам, а тая ўлада, якую ў Касцёле мае заканадаўца, ніжэйшы за вярхоўную ўладу, не можа быць дзейсна дэлегавана, калі права выразна не прадугледжвае іншае; ніжэйшы заканадаўца не можа дзейсна выдаць закон, які супярэчыць вышэйшаму праву.

§ 3. Судовая ўлада, якую маюць суддзі або судзейскія калегіі, павінна ажыццяўляцца спосабам, прадпісаным правам, і не можа быць дэлегавана, калі гаворка не ідзе пра выкананне падрыхтоўчых дзеянняў якога-небудзь дэкрэта або судовага рашэння.

§ 4. У тым, што датычыць ажыццяўлення выканаўчай улады, павінны выконвацца прадпісанні наступных канонаў.

Кан. 136 – Выканаўчую ўладу можна ажыццяўляць нават знаходзячыся па-за ўласнай тэрыторыяй у адносінах да сваіх падуладных, якія таксама знаходзяцца па-за тэрыторыяй, калі з сутнасці рэчы або з прадпісання права не вынікае іншае; у адносінах да падарожных, якія актуальна пражываюць на дадзенай тэрыторыі, выканаўчую ўладу можна ажыццяўляць тады, калі гаворка ідзе пра ўдзяленне акрэсленай ласкі ці пра выкананне таго, што прадпісваюць паўсюдныя або партыкулярныя законы, якім падарожныя падлягаюць паводле кан. 13 § 2, 2°.

Кан. 137 – § 1. Звычайная выканаўчая ўлада можа быць дэлегавана як для асобнага дзеяння, так і для шэрагу спраў, калі права выразна не прадугледжвае іншае.

§ 2. Выканаўчая ўлада, дэлегаваная Апостальскай Сталіцай, можа быць субдэлегавана або для асобнага дзеяння, або для шэрагу спраў, калі дэлегаванне не было зроблена з увагі на асабістыя якасці або субдэлегаванне не было выразна забаронена.

§ 3. Калі выканаўчая ўлада, дэлегаваная іншай уладай, якая мае звычайную ўладу, была дэлегавана для шэрагу спраў, можа быць субдэлегавана толькі для асобных дзеянняў; калі ж яна была дэлегавана толькі для асобнага дзеяння або для акрэсленых дзеянняў, яна не можа быць субдэлегавана, калі той, хто яе дэлегаваў, выразна не дазволіў гэта.

§ 3. Potestas iudicialis, qua gaudent iudices aut collegia iudicialia, exercenda est modo iure praescripto, et delegari nequit, nisi ad actus cuivis decreto aut sententiae praeparatorios perficiendos.

§ 4. Ad potestatis exsecutivae exercitium quod attinet, serventur praescripta canonum qui sequuntur.

Can. 136 – Potestatem exsecutivam aliquis, licet extra territorium exsistens, exercere valet in subditos, etiam a territorio absentes, nisi aliud ex rei natura aut ex iuris praescripto constet; in peregrinos in territorio actu degentes, si agatur de favoribus concedendis aut de exsecutioni mandandis sive legibus universalibus sive legibus particularibus, quibus ipsi ad normam can. 13, § 2, n. 2 tenentur.

Can. 137 – § 1. Potestas exsecutiva ordinaria delegari potest tum ad actum tum ad universitatem casuum, nisi aliud iure expresse caveatur.

§ 2. Potestas exsecutiva ab Apostolica Sede delegata subdelegari potest sive ad actum sive ad universitatem casuum, nisi electa fuerit industria personae aut subdelegatio fuerit expresse prohibita.

§ 3. Potestas exsecutiva delegata ab alia auctoritate potestatem ordinariam habente, si ad universitatem casuum delegata sit, in singulis tantum casibus subdelegari potest; si vero ad actum aut ad actus determinatos delegata sit, subdelegari nequit, nisi de expressa delegantis concessione.

§ 4. Nulla potestas subdelegata iterum subdelegari potest, nisi id expresse a delegante concessum fuerit.

Can. 138 – Potestas exsecutiva ordinaria necnon potestas ad universitatem casuum delegata, late interpretanda est, alia vero quaelibet stricte; cui tamen delegata potestas est, ea quoque intelleguntur concessa sine quibus eadem potestas exerceri nequit.

Can. 139 – § 1. Nisi aliud iure statuatur, eo quod quis aliquam auctoritatem, etiam superiorem, competentem adeat, non suspenditur alius auctoritatis competentis exsecutiva potestas, sive haec ordinaria est sive delegata.

§ 2. Causae tamen ad superiorem auctoritatem delatae ne se immisceat inferior, nisi ex gravi urgentique causa; quo in casu statim superiorem de re moneat.

Can. 140 – § 1. Pluribus in solidum ad idem negotium agendum delegatis, qui prius negotium tractare inchoaverit alios ab eodem agendo excludit, nisi postea impeditus fuerit aut in negotio peragendo ulterius procedere noluerit.

§ 2. Pluribus collegialiter ad negotium agendum delegatis, omnes procedere debent ad normam can. 119, nisi in mandato aliud cautum sit.

§ 3. Potestas exsecutiva pluribus delegata, praesumitur iisdem delegata in solidum.

Can. 141 – Pluribus successive delegatis, ille negotium expediat, cuius mandatum anterius est, nec postea revocatum fuit.

§ 4. Ніякая субдэлегаваная ўлада не можа быць зноў субдэлегавана, калі той, хто яе дэлегаваў, выразна не дазволіў гэта.

Кан. 138 – Звычайная выканаўчая ўлада, а таксама ўлада, дэлегаваная для шэрагу спраў, павінна быць інтэрпрэтавана шырока, а кожная іншая — вузка; аднак лічыцца, што асобе, якая атрымала дэлегаваную ўладу, удзелена ўсё, без чаго немагчыма ажыццяўляць дэлегаваную ўладу.

Кан. 139 – § 1. Калі правам не ўстаноўлена іншае, праз зварот каго-небудзь да якога-небудзь органа кампетэнтнай улады, нават вышэйшага ўзроўню, не прыпыняецца выканаўчая ўлада іншага органа кампетэнтнай улады, звычайная або дэлегаваная.

§ 2. У справы, якія былі перададзены на вырашэнне ўладзе вышэйшага ўзроўню, ніжэйшая ўлада не павінна ўмешвацца, калі на гэта не будзе важкай і неадкладнай прычыны; у такім выпадку яна павінна адразу паведаміць аб гэтым вышэйшую ўладу.

Кан. 140 – § 1. Калі для выканання адной і той самай справы былі дэлегаваны некалькі асобаў, тады той, хто першы пачаў выконваць гэтую справу, вызваляе іншых ад яе выконвання, калі потым не ўзнікнуць перашкоды або калі ён не адмовіцца ад далейшага выконвання справы.

§ 2. Дэлегаваныя для калегіяльнага выканання якой-небудзь справы павінны дзейнічаць разам паводле кан. 119, калі ва ўпаўнаважанні не прадугледжана іншае.

§ 3. Мяркуецца, што выканаўчая ўлада, дэлегаваная некалькім асобам, дэлегавана ім салідарна.

Кан. 141 – З некалькіх асобаў, дэлегаваных паслядоўна адна пасля другой, справу вырашае тая асоба, якая атрымала ўпаўнаважанне раней, і яно не было адклікана пазней.

Кан. 142 – § 1. Дэлегаваная ўлада спыняецца: з выкананнем упаўнаважання; з заканчэннем тэрміну або колькасці выпадкаў, на якія яно было дадзена; са знікненнем мэтавай прычыны дэлегавання; з адкліканнем тым, хто яе дэлегаваў, аб чым было непасрэдна паведамлена дэлегаванаму, а таксама ў выпадку падачы дэлегаваным заявы аб адмове ад дэлегацыі, калі той, хто дэлегаваў уладу, быў аб гэтым паведамлены і ён прыняў адмову; аднак яна не спыняецца са спыненнем улады таго, хто яе дэлегаваў, калі іншае не вынікае з далучаных кляўзулаў.

§ 2. Аднак дзеянне дэлегаванай улады, якое ажыццяўлялася толькі на *forum internum* і якое было праз няўвагу выканана пасля заканчэння тэрміну, на які гэтая ўлада была ўдзелена, з'яўляецца дзейсным.

Кан. 143 – § 1. Звычайная ўлада спыняецца са стратай пасады, з якой яна была звязана.

§ 2. Калі правам не прадугледжана іншае, звычайная ўлада прыпыняецца, калі легітымна пададзена апеляцыя або рэкурс на пазбаўленне пасады ці звальненне з яе.

Кан. 144 – § 1. У выпадку агульнай фактычнай або юрыдычнай памылкі, а таксама станоўчага і праўдападобнага фактычнага або юрыдычнага сумнення, Касцёл дапаўняе звычайную выканаўчую ўладу як на *forum externum*, так і на *forum internum*.

§ 2. Такая ж норма прымяняецца да паўнамоцтваў, аб якіх гаворыцца ў кан. 882, 883, 966 і 1111 § 1.

Can. 142 – § 1. Potestas delegata extinguitur: expleto mandato; elapso tempore vel exhausto numero casuum pro quibus concessa fuit; cessante causa finali delegationis; revocatione delegantis delegato directe intimata necnon renuntiatione delegati deleganti significata et ab eo acceptata; non autem resoluto iure delegantis, nisi id ex appositis clausulis appareat.

§ 2. Actus tamen ex potestate delegata, quae exercetur pro solo foro interno, per inadvertentiam positus, elapso concessionis tempore, validus est.

Can. 143 – § 1. Potestas ordinaria extinguitur amisso officio cui adnectitur.

§ 2. Nisi aliud iure caveatur, suspenditur potestas ordinaria, si contra privationem vel amotionem ab officio legitime appellatur vel recursus interponitur.

Can. 144 – § 1. In errore communi de facto aut de iure, itemque in dubio positivo et probabili sive iuris sive facti, supplet Ecclesia, pro foro tam externo quam interno, potestatem regiminis exsecutivam.

§ 2. Eadem norma applicatur facultatibus de quibus in cann. 882, 883, 966, et 1111, § 1.

ТЫТУЛ IX
КАСЦЁЛЬНЫЯ ПАСАДЫ

Кан. 145 – § 1. Касцёльная пасада — гэта любое заданне, Божага або касцёльнага паходжання, якое ўстаноўлена на пастаянна і ажыццяўляецца з духоўнай мэтай.

TITULUS IX
DE OFFICIIS ECCLESIASTICIS

Can. 145 – § 1. Officium ecclesiasticum est quodlibet munus ordinatione sive divina sive ecclesiastica stabiliter constitutum in finem spiritualem exercendum.

§ 2. Obligationes et iura singulis officiis ecclesiasticis propria definiuntur sive ipso iure quo officium constituitur, sive decreto auctoritatis competentis quo constituitur simul et confertur.

§ 2. Абавязкі і правы, уласцівыя кожнай з касцёльных пасадаў, вызначаюцца або самім правам, якое ўстанаўлівае дадзеную пасаду, або дэкрэтам кампетэнтнай улады, які адначасова яе ўстанаўлівае і на яе прызначае.

Caput I
De provisione officii ecclesiastici

Can. 146 – Officium ecclesiasticum sine provisione canonica valide obtineri nequit.

Can. 147 – Provisio officii ecclesiastici fit: per liberam collationem ab auctoritate ecclesiastica competenti; per institutionem ab eadem datam, si praecesserit praesentatio; per confirmationem vel admissionem ab eadem factam, si praecesserit electio vel postulatio; tandem per simplicem electionem et electi acceptationem, si electio non egeat confirmatione.

Can. 148 – Auctoritati, cuius est officia erigere, innovare et supprimere, eorundem provisio quoque competit, nisi aliud iure statuatur.

Can. 149 – § 1. Ut ad officium ecclesiasticum quis promoveatur, debet esse in Ecclesiae communione necnon idoneus, scilicet iis qualitatibus praeditus, quae iure universali vel particulari aut lege fundationis ad idem officium requiruntur.

§ 2. Provisio officii ecclesiastici facta illi qui caret qualitatibus requisitis, irrita tantum est, si qualitates iure universali vel particulari aut lege fundationis ad validitatem provisio-

Раздзел I
Прызначэнне на касцёльную пасаду

Кан. 146 – Касцёльная пасада не можа быць дзейсна атрымана без кананічнага прызначэння.

Кан. 147 – Прызначэнне на касцёльную пасаду адбываецца: праз свабоднае прызначэнне кампетэнтнай касцёльнай уладай; праз устанаўленне на пасаду, якое здзяйсняецца той жа ўладай, калі гэтаму папярэднічала прадстаўленне; праз адабрэнне або дапушчэнне на пасаду, калі гэтаму папярэднічаў выбар або хадайніцтва; нарэшце праз просты выбар, прыняты выбраным, калі выбар не патрабуе адабрэння.

Кан. 148 – Улада, якая мае права ўстанаўліваць, змяняць і ліквідаваць пасады, мае таксама паўнамоцтва прызначаць на іх, калі права не пастанаўляе іншае.

Кан. 149 – § 1. Для таго, каб быць прызначаным на касцёльную пасаду, кандыдат павінен знаходзіцца ў адзінстве з Касцёлам і быць прыдатным, гэта значыць мець тыя якасці, якія патрабуюцца для гэтай пасады паўсюдным ці партыкулярным правам або ўстаноўчым законам.

§ 2. Прызначэнне на касцёльную пасаду таго, хто не мае неабходных якасцяў, з'яўляецца нядзейсным толькі тады, калі гэтыя якасці выразна патрабуюцца для дзейснасці паўсюдным ці партыкулярным

правам або ўстаноўчым законам; у іншым выпадку яно з'яўляецца дзейсным, але можа быць адменена дэкрэтам кампетэнтнай улады або рашэннем адміністрацыйнага трыбунала.

§ 3. Прызначэнне на касцёльную пасаду праз сімонію з'яўляецца нядзейсным на моцы самога права.

nis expresse exigantur; secus valida est, sed rescindi potest per decretum auctoritatis competentis aut per sententiam tribunalis administrativi.

§ 3. Provisio officii simoniace facta ipso iure irrita est.

Кан. 150 – Той, хто яшчэ не атрымаў сакрамэнт пасвячэння, не можа быць дзейсна прызначаны на пасаду, звязаную з поўным душпастырствам, для выконвання якой патрабуецца ажыццяўленне святарскай улады.

Can. 150 – Officium secumferens plenam animarum curam, ad quam adimplendam ordinis sacerdotalis exercitium requiritur, ei qui sacerdotio nondum auctus est valide conferri nequit.

Кан. 151 – Прызначэнне на пасаду, звязаную з душпастырствам, не павінна адкладацца без важкай прычыны.

Can. 151 – Provisio officii animarum curam secumferentis, sine gravi causa ne differatur.

Кан. 152 – Ніхто не павінен прызначацца на дзве або больш несумяшчальныя паміж сабой пасады, гэта значыць такія, якія не могуць адначасова выконвацца адной асобай.

Can. 152 – Nemini conferantur duo vel plura officia incompatibilia, videlicet quae una simul ab eodem adimpleri nequeunt.

Кан. 153 – § 1. Прызначэнне на пасаду, якая згодна з правам не з'яўляецца вакантнай, з'яўляецца нядзейсным на моцы самога факта і не становіцца дзейсным тады, калі пасада стане вакантнай.

Can. 153 – § 1. Provisio officii de iure non vacantis est ipso facto irrita, nec subsequenti vacatione convalescit.

§ 2. Аднак калі гаворка ідзе пра пасаду, на якую згодна з правам прызначаюць на акрэслены тэрмін, то прызначэнне на яе можа адбыцца на працягу шасці месяцаў перад заканчэннем гэтага тэрміну і пачынае дзейнічаць з таго дня, калі пасада стане вакантнай.

§ 2. Si tamen agatur de officio quod de iure ad tempus determinatum confertur, provisio intra sex menses ante expletum hoc tempus fieri potest, et effectum habet a die officii vacationis.

§ 3. Абяцанне прызначэння на акрэсленую пасаду, кім бы ні было дадзена, не мае ніякіх прававых наступстваў.

§ 3. Promissio alicuius officii, a quocumque est facta, nullum parit iuridicum effectum.

Кан. 154 – На пасаду, якая згодна з правам з'яўляецца вакантнай, але якую хто-небудзь яшчэ нелегітымна займае, можна прызначыць, калі будзе належным чынам сцверджана яе нелегітымнае займанне і аб

Can. 154 – Officium de iure vacans, quod forte adhuc ab aliquo illegitime possidetur, conferri potest, dummodo rite declaratum fuerit eam possessionem non esse legitimam,

et de hac declaratione mentio fiat in litteris collationis.

гэтым будзе ўпамянута ў дакуменце, у якім здзяйсняецца прызначэнне на пасаду.

Can. 155 – Qui, vicem alterius neglegentis vel impediti supplens, officium confert, nullam inde potestatem acquirit in personam cui collatum est, sed huius condicio iuridica perinde constituitur, ac si provisio ad ordinariam iuris normam peracta fuisset.

Кан. 155 – Той, хто прызначае на акрэсленую пасаду, выконваючы гэтым абавязак іншай асобы, якая праяўляе нядбайнасць або мае перашкоду, не набывае ніякай улады над асобай, якую прызначыў, пры гэтым юрыдычнае становішча гэтай асобы будзе такім жа, як калі б прызначэнне было здзейснена згодна са звычайнымі прадпісаннямі права.

Can. 156 – Cuiuslibet officii provisio scripto consignetur.

Кан. 156 – Кожнае прызначэнне на пасаду павінна быць здзейснена пісьмова.

Art. 1. *De libera collatione*

Артыкул 1. *Свабоднае прызначэнне*

Can. 157 – Nisi aliud explicite iure statuatur, Episcopi dioecesani est libera collatione providere officiis ecclesiasticis in propria Ecclesia particulari.

Кан. 157 – Калі права яўна не пастанаўляе іншае, дыяцэзіяльны біскуп мае права свабодна прызначаць на касцёльныя пасады ва ўласным партыкулярным Касцёле.

Art. 2. *De praesentatione*

Артыкул 2. *Прадстаўленне*

Can. 158 – § 1. Praesentatio ad officium ecclesiasticum ab eo, cui ius praesentandi competit, fieri debet auctoritati cuius est ad officium de quo agitur institutionem dare, et quidem, nisi aliud legitime cautum sit, intra tres menses ab habita vacationis officii notitia.

Кан. 158 – § 1. Той, хто мае права прадстаўлення на касцёльную пасаду, павінен прадставіць кандыдата той уладзе, якой належыць права на прызначэнне на гэтую пасаду, і гэта павінна быць зроблена на працягу трох месяцаў ад атрымання паведамлення аб вызваленні пасады, калі іншае не прадугледжана легітымна.

§ 2. Si ius praesentationis cuidam collegio aut coetui personarum competat, praesentandus designetur servatis cann. 165-179 praescriptis.

§ 2. Калі права прадстаўлення належыць калегіі або групе асобаў, той, каго прадстаўляюць, павінен быць вызначаны, захоўваючы прадпісанні кан. 165–179.

Can. 159 – Nemo invitus praesentetur; quare qui praesentandus proponitur, mentem suam rogatus, nisi intra octiduum utile recuset, praesentari potest.

Кан. 159 – Ніхто не павінен быць прадстаўлены на касцёльную пасаду насуперак яго волі; таму можна прадстаўляць тую прапанаваную на гэту пасаду асобу, у якой запыталі аб згодзе і якая не адмовіцца на працягу васьмі карысных дзён.

Кан. 160 – § 1. Той, хто мае права прадстаўлення на пасаду, можа прадставіць аднаго або некалькі кандыдатаў як адначасова, так і паслядоўна.

§ 2. Ніхто не можа прадстаўляць самога сябе; аднак калегія або група асобаў можа прадставіць каго-небудзь са сваіх членаў.

Кан. 161 – § 1. Калі права не пастанаўляе іншае, той, хто прадставіў кандыдата, які аказаўся непрыдатным, можа толькі адзін раз прадставіць іншага кандыдата на працягу месяца.

§ 2. Калі перад прызначэннем на пасаду прадстаўлены адмовіўся ад яе або памёр, той, хто мае права прадстаўлення на пасаду, можа на працягу месяца ад атрымання паведамлення аб адмове або смерці зноў скарыстацца сваім правам.

Кан. 162 – Той, хто на працягу карыснага часу, паводле прадпісанняў кан. 158 § 1 і кан. 161, не здзейсніў прадстаўлення на пасаду, а таксама той, хто двойчы прадставіў кандыдата, які аказаўся непрыдатным, у гэтым выпадку траціць права прадстаўлення на пасаду, а ўлада, якая мае права ўстанаўлення на пасаду, можа свабодна прызначаць на вакантную пасаду, аднак са згоды ўласнага ардынарыя кандыдата.

Кан. 163 – Улада, якая, згодна з нормамі права, з'яўляецца кампетэнтнай для ўстанаўлення прадстаўленага на пасаду, павінна ўстанавіць на пасаду легітымна прадстаўленага кандыдата, які аказаўся прыдатным і выразіў сваю згоду; калі ж прыдатнымі акажуцца некалькі з легітымна прадстаўленых асобаў, улада павінна ўстанавіць на пасаду аднаго з іх.

Can. 160 – § 1. Qui iure praesentationis gaudet, unum aut etiam plures, et quidem tum una simul tum successive, praesentare potest.

§ 2. Nemo potest seipsum praesentare; potest autem collegium aut coetus personarum aliquem suum sodalem praesentare.

Can. 161 – § 1. Nisi aliud iure statuatur, potest qui aliquem praesentaverit non idoneum repertum, altera tantum vice, intra mensem, alium candidatum praesentare.

§ 2. Si praesentatus ante institutionem factam renuntiaverit aut de vita decesserit, potest qui iure praesentandi pollet, intra mensem ab habita renuntiationis aut mortis notitia, ius suum rursus exercere.

Can. 162 – Qui intra tempus utile, ad normam can. 158, § 1 et can. 161, praesentationem non fecerit, itemque qui bis praesentaverit non idoneum repertum, pro eo casu ius praesentationis amittit, atque auctoritati, cuius est institutionem dare, competit libere providere officio vacanti, assentiente tamen proprio provisi Ordinario.

Can. 163 – Auctoritas, cui ad normam iuris competit praesentatum instituere, instituat legitime praesentatum quem idoneum reppererit et qui acceptaverit; quod si plures legitime praesentati idonei reperti sint, eorundem unum instituere debet.

Art. 3. *De electione*

Can. 164 – Nisi aliud iure provisum fuerit, in electionibus canonicis serventur praescripta canonum qui sequuntur.

Can. 165 – Nisi aliud iure aut legitimis collegii vel coetus statutis cautum sit, si cui collegio aut coetui personarum sit ius eligendi ad officium, electio ne differatur ultra trimestre utile computandum ab habita notitia vacationis officii; quo termino inutiliter elapso, auctoritas ecclesiastica, cui ius confirmandae electionis vel ius providendi successive competit, officio vacanti libere provideat.

Can. 166 – § 1. Collegii aut coetus praeses convocet omnes ad collegium aut ad coetum pertinentes; convocatio autem, quando personalis esse debet, valet, si fiat in loco domicilii vel quasi-domicilii aut in loco commorationis.

§ 2. Si quis ex vocandis neglectus et ideo absens fuerit, electio valet; attamen ad eiusdem instantiam, probata quidem praeteritione et absentia, electio, etiam si confirmata fuerit, a competenti auctoritate rescindi debet, dummodo iuridice constet recursum saltem intra triduum ab habita notitia electionis fuisse transmissum.

§ 3. Quod si plures quam tertia pars electorum neglecti fuerint, electio est ipso iure nulla, nisi omnes neglecti reapse interfuerint.

Can. 167 – § 1. Convocatione legitime facta, suffragium ferendi ius ha-

Артыкул 3. *Выбар*

Кан. 164 – Калі ў праве не прадугледжана іншае, то пры кананічных выбарах павінны быць захаваны прадпісанні наступных канонаў.

Кан. 165 – Калі права ці легітымныя статуты калегіі або групы асобаў, якая мае права выбару на пасаду, не прадугледжваюць іншае, выбар не павінен адкладацца на тэрмін, большы чым тры карысныя месяцы, лічачы ад атрымання паведамлення аб вакансіі пасады; калі гэты тэрмін скончыцца безвынікова, касцёльная ўлада, якая мае права на адабрэнне выбару або на замяшчальнае прызначэнне на пасаду, павінна свабодна прызначыць на гэтую пасаду.

Кан. 166 – § 1. Старшыня калегіі або групы павінен склікаць усіх, хто належыць да гэтай калегіі або групы; калі ж выклік павінен быць асабістым, то ён з'яўляецца дзейсным, калі адбываўся ў месцы пастаяннага ці часовага жыхарства або ў месцы прабывання.

§ 2. Калі хто-небудзь з тых, хто павінен быць выкліканы, не быў выкліканы і таму адсутнічаў, выбар з'яўляецца дзейсным; аднак па хадайніцтве гэтай асобы, калі факт невыкліку і адсутнасці будзе даказаны, выбар, нават адобраны, павінен быць адменены кампетэнтнай уладай, калі толькі будзе юрыдычна сцверджана, што рэкурс быў пададзены на працягу трох дзён пасля атрымання паведамлення аб выбары.

§ 3. Калі больш чым трэцяя частка выбаршчыкаў не была выклікана, выбар з'яўляецца нядзейсным на моцы самога права, калі ўсе тыя, хто не атрымалі выклік, сапраўды не прынялі ўдзел у выбарах.

Кан. 167 – § 1. Пасля таго, як выбаршчыкі былі легітымна скліканы, права голасу ма-

юць толькі асобы, прысутныя ў той дзень і ў тым месцы, якія былі ўказаны ў выкліку, з выключэннем — калі статуты не прадугледжваюць легітымна іншае — магчымасці галасаваць пісьмова або праз прадстаўніка.

§ 2. Калі хто-небудзь з выбаршчыкаў знаходзіцца ў тым будынку, дзе адбываюцца выбары, але па прычыне хваробы не можа ў іх удзельнічаць, скрутатары павінны прыняць яго голас у пісьмовай форме.

Кан. 168 – Нават калі хто-небудзь мае некалькі прававых падставаў для галасавання ад уласнага імя, ён можа аддаць толькі адзін голас.

Кан. 169 – Для дзейснасці выбару патрабуецца, каб ніхто з тых, хто не належыць да калегіі або групы, не быў дапушчаны да галасавання.

Кан. 170 – Выбар, свабода якога была сапраўды парушана любым чынам, з'яўляецца нядзейсным на моцы самога права.

Кан. 171 – § 1. Няздольнымі да галасавання з'яўляюцца:

1° няздольныя да чалавечага дзеяння;

2° пазбаўленыя права голасу;

3° звязаныя пакараннем экскамунікі, наложаным судовым прысудам ці дэкрэтам, які накладвае або сцвярджае пакаранне;

4° тыя, хто юрыдычна пацверджаным чынам адышлі ад адзінства з Касцёлам.

§ 2. Калі хто-небудзь з пералічаных быў дапушчаны да галасавання, яго голас з'яўляецца нядзейсным, але выбар з'яўляецца дзейсным, калі не будзе сцверджана, што пасля адлічэння гэтага голаса выбраны не атрымаў патрэбнай колькасці галасоў.

Кан. 172 – § 1. Каб быць дзейсным, голас павінен быць:

bent praesentes die et loco in eadem convocatione determinatis, exclusa, nisi aliud statutis legitime caveatur, facultate ferendi suffragia sive per epistolam sive per procuratorem.

§ 2. Si quis ex electoribus praesens in ea domo sit, in qua fit electio, sed electioni ob infirmam valetudinem interesse nequeat, suffragium eius scriptum a scrutatoribus exquiratur.

Can. 168 – Etsi quis plures ob titulos ius habeat ferendi nomine proprio suffragii, non potest nisi unicum suffragium ferre.

Can. 169 – Ut valida sit electio, nemo ad suffragium admitti potest, qui ad collegium vel coetum non pertineat.

Can. 170 – Electio, cuius libertas quoquo modo reapse impedita fuerit, ipso iure invalida est.

Can. 171 – § 1. Inhabiles sunt ad suffragium ferendum:

1° incapax actus humani;

2° carens voce activa;

3° poena excommunicationis innodatus sive per sententiam iudicialem sive per decretum quo poena irrogatur vel declaratur;

4° qui ab Ecclesiae communione notorie defecit.

§ 2. Si quis ex praedictis admittatur, eius suffragium est nullum, sed electio valet, nisi constet, eo dempto, electum non rettulisse requisitum suffragiorum numerum.

Can. 172 – § 1. Suffragium, ut validum sit, esse debet:

1° liberum; ideoque invalidum est suffragium eius, qui metu gravi aut dolo, directe vel indirecte, adactus fuerit ad eligendam certam personam aut diversas personas disiunctive;

2° secretum, certum, absolutum, determinatum.

§ 2. Condiciones ante electionem suffragio appositae tamquam non adiectae habeantur.

Can. 173 – § 1. Antequam incipiat electio, deputentur e gremio collegii aut coetus duo saltem scrutatores.

§ 2. Scrutatores suffragia colligant et coram praeside electionis inspiciant an schedularum numerus respondeat numero electorum, suffragia ipsa scrutentur palamque faciant quot quisque rettulerit.

§ 3. Si numerus suffragiorum superet numerum eligentium, nihil est actum.

§ 4. Omnia electionis acta ab eo qui actuarii munere fungitur accurate describantur, et saltem ab eodem actuario, praeside ac scrutatoribus subscripta, in collegii tabulario diligenter asserventur.

Can. 174 – § 1. Electio, nisi aliud iure aut statutis caveatur, fieri etiam potest per compromissum, dummodo nempe electores, unanimi et scripto consensu, in unum vel plures idoneos sive de gremio sive extraneos ius eligendi pro ea vice transferant, qui nomine omnium ex recepta facultate eligant.

§ 2. Si agatur de collegio aut coetu ex solis clericis constanti, compro-

1° свабодным; таму нядзейсным з'яўляецца голас таго, хто пад уздзеяннем моцнага страху або падману непасрэдна або апасродкавана павінен быў абраць акрэсленую асобу або розных асобаў;

2° таемным, акрэсленым, безумоўным, адназначным.

§ 2. Умовы, далучаныя да голасу перад выбарам, павінны лічыцца недалучанымі.

Кан. 173 – § 1. Перад пачаткам выбараў са складу калегіі або групы павінны быць вызначаны прынамсі два скрутатары.

§ 2. Скрутатары павінны сабраць галасы і ў прысутнасці старшыні праверыць, ці адпавядае колькасць сабраных картак колькасці выбаршчыкаў, разгледзець адданыя галасы і абвясціць, колькі галасоў атрымаў кожны.

§ 3. Калі колькасць галасоў перавышае колькасць выбаршчыкаў, лічыцца, што выбары не адбыліся.

§ 4. Усе дзеянні, звязаныя з выбарамі, павінны быць дакладна занесены ў пратакол асобай, якая выконвае заданне вядзення пратакола, і ён павінен быць падпісаны прынамсі гэтай асобай, якая вядзе пратакол, старшынёй і скрутатарамі. Пратакол павінен старанна захоўвацца ў архіве калегіі.

Кан. 174 – § 1. Выбары, калі іншае не прадугледжана правам або статутамі, могуць адбывацца шляхам кампрамісу, у гэтым выпадку выбаршчыкі аднадушна і праз пісьмовую згоду перадаюць на гэты раз права выбару адной ці некалькім прыдатным асобам са свайго складу ці з па-за яго, якія ад імя ўсіх здзейсняць выбар на моцы атрыманага паўнамоцтва.

§ 2. Калі гаворка ідзе пра калегію або групу, якая складаецца толькі з духоўных асобаў, то і кампрамісарыі павінны мець

пасвячэнне, інакш выбар з'яўляецца нядзейсным.

§ 3. Кампрамісарыі павінны захоўваць прадпісанні права адносна выбараў, а таксама — для дзейснасці выбару — не супраціўныя праву ўмовы, далучаныя да кампрамісу; умовы ж, супраціўныя праву, павінны лічыцца недалучанымі.

Кан. 175 – Кампраміс перастае існаваць, а права галасавання вяртаецца да тых, хто заключыў кампраміс:

1° пры яго адкліканні, здзейсненым калегіяй або групай перад пачаткам галасавання;

2° пры невыкананні якой-небудзь умовы, далучанай да кампрамісу;

3° у выпадку здзяйснення нядзейснага выбару.

Кан. 176 – Калі права або статуты не прадугледжваюць іншае, павінен лічыцца выбраным і быць абвешчаны такім праз старшыню калегіі або групы той, хто атрымаў колькасць галасоў, патрэбную згодна з прадпісаннямі кан. 119, 1°.

Кан. 177 – § 1. Аб выбары адразу павінен быць паведамлены выбраны, які на працягу васьмі карысных дзён ад атрымання паведамлення павінен паведаміць старшыню калегіі або групы, ці прымае ён гэты выбар; інакш выбар не мае моцы.

§ 2. Калі выбраны не прыняў выбар, ён траціць усе правы, набытыя ў выніку выбару, і не атрымлівае іх назад праз пазнейшае выражэнне згоды, аднак ён можа быць выбраны зноў; калегія ж або група павінна распачаць новыя выбары на працягу месяца ад атрымання паведамлення аб непрыняцці выбару.

Кан. 178 – Выбраны, прыняўшы выбар, які не патрабуе адабрэння, адразу паўнапраўна

missarii in sacris debent esse constituti; secus electio est invalida.

§ 3. Compromissarii debent iuris praescripta de electione servare atque, ad validitatem electionis, condiciones compromisso appositas, iuri non contrarias, observare; condiciones autem iuri contrariae pro non appositis habeantur.

Can. 175 – Cessat compromissum et ius suffragium ferendi redit ad compromittentes:

1° revocatione a collegio aut coetu facta, re integra;

2° non impleta aliqua condicione compromisso apposita;

3° electione absoluta, si fuerit nulla.

Can. 176 – Nisi aliud iure aut statutis caveatur, is electus habeatur et a collegii aut coetus praeside proclametur, qui requisitum suffragiorum numerum rettulerit, ad normam can. 119, n. 1.

Can. 177 – § 1. Electio illico intimanda est electo, qui debet intra octiduum utile a recepta intimatione significare collegii aut coetus praesidi utrum electionem acceptet necne; secus electio effectum non habet.

§ 2. Si electus non acceptaverit, omne ius ex electione amittit nec subsequenti acceptatione convalescit, sed rursus eligi potest; collegium autem aut coetus intra mensem a cognita non-acceptatione ad novam electionem procedere debet.

Can. 178 – Electus, acceptata electione, quae confirmatione non egeat,

officium pleno iure statim obtinet; secus non acquirit nisi ius ad rem.

Can. 179 – § 1. Electus, si electio confirmatione indigeat, intra octiduum utile a die acceptatae electionis confirmationem ab auctoritate competenti petere per se vel per alium debet; secus omni iure privatur, nisi probaverit se a petenda confirmatione iusto impedimento detentum fuisse.

§ 2. Competens auctoritas, si electum reppererit idoneum ad normam can. 149, § 1, et electio ad normam iuris fuerit peracta, confirmationem denegare nequit.

§ 3. Confirmatio in scriptis dari debet.

§ 4. Ante intimatam confirmationem, electo non licet sese immiscere administrationi officii sive in spiritualibus sive in temporalibus, et actus ab eo forte positi nulli sunt.

§ 5. Intimata confirmatione, electus pleno iure officium obtinet, nisi aliud iure caveatur.

атрымлівае сваю пасаду, у іншым выпадку набывае толькі права на яе.

Кан. 179 – § 1. Калі выбар патрабуе адабрэння, то выбраны на працягу васьмі карысных дзён ад дня прыняцця выбару павінен асабіста або праз каго-небудзь іншага звярнуцца да кампетэнтнай улады з прашэннем аб адабрэнні; інакш ён пазбаўляецца ўсіх правоў, калі не дакажа, што меў справядлівую перашкоду ў тым, каб звярнуцца з прашэннем аб адабрэнні.

§ 2. Кампетэнтная ўлада не можа адмовіць у адабрэнні, калі прызнае выбранага прыдатным паводле прадпісання кан. 149 § 1 і выбар адбыўся згодна з прадпісаннямі права.

§ 3. Адабрэнне павінна быць здзейснена ў пісьмовай форме.

§ 4. Перад атрыманнем паведамлення аб адабрэнні выбранаму не дазваляецца ўмешвацца ў выконванне пасады ні ў справах духоўных, ні ў матэрыяльных; калі ж ён здзейсніў якія-небудзь дзеянні, яны з'яўляюцца нядзейснымі.

§ 5. Пасля атрымання паведамлення аб адабрэнні выбраны паўнапраўна атрымлівае сваю пасаду, калі права не прадугледжвае іншае.

Art. 4. *De postulatione*

Can. 180 – § 1. Si electioni illius quem electores aptiorem putent ac praeferant, impedimentum canonicum obstet, super quo dispensatio concedi possit ac soleat, suis ipsi suffragiis eum possunt, nisi aliud iure caveatur, a competenti auctoritate postulare.

§ 2. Compromissarii postulare nequeunt, nisi id in compromisso fuerit expressum.

Артыкул 4. *Хадайніцтва*

Кан. 180 – § 1. У выпадку, калі кананічная перашкода, ад якой можа быць удзелена і звычайна ўдзяляецца дыспенсацыя, не дазваляе выбраць таго, каго выбаршчыкі хочуць выбраць і лічаць найбольш прыдатным, то яны могуць сваімі галасамі хадайнічаць за яго перад кампетэнтнай уладай, калі права не прадугледжвае іншае.

§ 2. Кампрамісарыі не могуць хадайнічаць, калі гэта выразна не было прадугледжана ў кампрамісе.

Кан. 181 – § 1. Каб хадайніцтва мела моц, патрабуецца прынамсі дзве трэція галасоў.

§ 2. Голас на карысць хадайніцтва павінен выражацца словам «хадайнічаю» або эквівалентным яму; выраз «абіраю або хадайнічаю» ці эквівалентны яму азначае, што, калі няма перашкоды, — голас аддадзены за выбар, калі яна існуе — за хадайніцтва.

Кан. 182 – § 1. Старшыня павінен на працягу васьмі карысных дзён звярнуцца з хадайніцтвам да кампетэнтнай улады, якая мае права на адабрэнне выбару і ўдзяленне дыспенсацыі ад перашкоды або — калі такога паўнамоцтва не мае — можа прасіць аб гэтым вышэйшую ўладу; калі адабрэнне не патрабуецца, то трэба звярнуцца да кампетэнтнай улады з хадайніцтвам аб удзяленні дыспенсацыі.

§ 2. Калі ў прадпісаны тэрмін хадайніцтва не было пададзена, яно тым самым з'яўляецца нядзейсным, а калегія або група на гэты раз пазбаўляецца права выбіраць або хадайнічаць, калі не будзе даказана, што старшыня не звярнуўся з хадайніцтвам па прычыне справядлівай перашкоды або падману ці нядбайнасці.

§ 3. Асоба, за якую хадайнічаюць, не набывае ніякіх правоў з хадайніцтва, а кампетэнтная ўлада не мае абавязку задавольніць хадайніцтва.

§ 4. Выбаршчыкі не могуць адклікаць хадайніцтва, пададзенае кампетэнтнай уладзе, калі ўлада не выразіць на гэта згоды.

Кан. 183 – § 1. Калі кампетэнтная ўлада адхіліць хадайніцтва, права выбару вяртаецца да калегіі або групы.

§ 2. Калі хадайніцтва было задаволена, аб гэтым павінна быць паведамлена асоба, за якую яно было пададзена, і гэтая асоба павінна адказаць паводле прадпісання кан. 177 § 1.

Can. 181 – § 1. Ut postulatio vim habeat, requiruntur saltem duae tertiae partes suffragiorum.

§ 2. Suffragium pro postulatione exprimi debet per verbum: *postulo*, aut aequivalens; formula: *eligo vel postulo*, aut aequipollens, valet pro electione, si impedimentum non exsistat, secus pro postulatione.

Can. 182 – § 1. Postulatio a praeside intra octiduum utile mitti debet ad auctoritatem competentem ad quam pertinet electionem confirmare, cuius est dispensationem de impedimento concedere, aut, si hanc potestatem non habeat, eandem ab auctoritate superiore petere; si non requiritur confirmatio, postulatio mitti debet ad auctoritatem competentem ut dispensatio concedatur.

§ 2. Si intra praescriptum tempus postulatio missa non fuerit, ipso facto nulla est, et collegium vel coetus pro ea vice privatur iure eligendi aut postulandi, nisi probetur praesidem a mittenda postulatione iusto fuisse detentum impedimento aut dolo vel neglegentia ab eadem tempore opportuno mittenda abstinuisse.

§ 3. Postulato nullum ius acquiritur ex postulatione; eam admittendi auctoritas competens obligatione non tenetur.

§ 4. Factam auctoritati competenti postulationem electores revocare non possunt, nisi auctoritate consentiente.

Can. 183 – § 1. Non admissa ab auctoritate competenti postulatione, ius eligendi ad collegium vel coetum redit.

§ 2. Quod si postulatio admissa fuerit, id significetur postulato, qui respondere debet ad normam can. 177, § 1.

§ 3. Qui admissam postulationem acceptat, pleno iure statim officium obtinet.

§ 3. Той, хто згаджаецца з задаволеным хадайніцтвам, адразу паўнапраўна атрымлівае пасаду.

Caput II

De amissione officii ecclesiastici

Can. 184 – § 1. Amittitur officium ecclesiasticum lapsu temporis praefiniti, expleta aetate iure definita, renuntiatione, translatione, amotione necnon privatione.

§ 2. Resoluto quovis modo iure auctoritatis a qua fuit collatum, officium ecclesiasticum non amittitur, nisi aliud iure caveatur.

§ 3. Officii amissio, quae effectum sortita est, quam primum omnibus nota fiat, quibus aliquod ius in officii provisionem competit.

Can. 185 – Ei, qui ob impletam aetatem aut renuntiationem acceptatam officium amittit, titulus emeriti conferri potest.

Can. 186 – Lapsu temporis praefiniti vel adimpleta aetate, amissio officii effectum habet tantum a momento, quo a competenti auctoritate scripto intimatur.

Раздзел II

Страта касцёльнай пасады

Кан. 184 – § 1. Касцёльная пасада траціцца з заканчэннем устаноўленага тэрміну, з дасягненнем устаноўленага правам узросту, а таксама ў выніку адмовы ад пасады, перамяшчэння, звальнення і пазбаўлення.

§ 2. Касцёльная пасада не траціцца са спыненнем якім-небудзь чынам права ўлады, якая прызначыла на пасаду, калі права не прадугледжвае іншае.

§ 3. Калі адбылася страта пасады, трэба як мага хутчэй паведаміць аб гэтым усіх, хто мае якое-небудзь права прызначаць на гэтую пасаду.

Кан. 185 – Той, хто страціў пасаду з дасягненнем устаноўленага ўзросту або ў выніку адмовы ад пасады, якая была прынята, можа ўжываць тытул «эмэрыт».

Кан. 186 – Страта пасады з заканчэннем прадугледжанага тэрміну або з дасягненнем устаноўленага ўзросту набывае моц толькі з таго моманту, калі кампетэнтная ўлада паведаміць аб гэтым пісьмова.

Art. 1. *De renuntiatione*

Can. 187 – Quisquis sui compos potest officio ecclesiastico iusta de causa renuntiare.

Can. 188 – Renuntiatio ex metu gravi, iniuste incusso, dolo vel errore substantiali aut simoniace facta, ipso iure irrita est.

Артыкул 1. *Адмова ад пасады*

Кан. 187 – Кожны, хто мае карыстанне розумам, можа па справядлівай прычыне адмовіцца ад касцёльнай пасады.

Кан. 188 – Адмова ад пасады, зробленая пад уздзеяннем моцнага, несправядлівa выкліканага страху ці ў выніку падману, істотнай памылкі або сімоніі, з'яўляецца нядзейснай на моцы самога права.

Кан. 189 – § 1. Адмова ад пасады — незалежна ад таго, патрабуе яна прыняцця ці не, — каб была дзейснай, павінна быць пададзена таму, хто прызначае на гэтую пасаду, і гэта павінна быць зроблена пісьмова, а калі вусна, то ў прысутнасці двух сведкаў.

§ 2. Улада не павінна прымаць адмову ад пасады без абгрунтавання справядлівай і прапарцыянальнай прычынай.

§ 3. Адмова ад пасады, якая патрабуе прыняцця, траціць усялякую моц, калі не будзе прынята на працягу трох месяцаў; адмова ад пасады, якая не патрабуе прыняцця, асягае вынік пасля таго, як асоба, якая адмаўляецца ад пасады, паведаміць аб гэтым згодна з правам.

§ 4. Пакуль адмова ад пасады не асягнула выніку, яна можа быць адклікана тым, хто адмаўляецца; пасля ж таго, як асягне вынік, яна не можа быць адклікана, аднак асоба, якая адмовілася ад пасады, можа атрымаць гэтую пасаду зноў на іншай падставе.

Can. 189 – § 1. Renuntiatio, ut valeat, sive acceptatione eget sive non, auctoritati fieri debet cui provisio ad officium de quo agitur pertinet, et quidem scripto vel oretenus coram duobus testibus.

§ 2. Auctoritas renuntiationem iusta et proportionata causa non inixam ne acceptet.

§ 3. Renuntiatio quae acceptatione indiget, nisi intra tres menses acceptetur, omni vi caret; quae acceptatione non indiget effectum sortitur communicatione renuntiantis ad normam iuris facta.

§ 4. Renuntiatio, quamdiu effectum sortita non fuerit, a renuntiante revocari potest; effectu secuto revocari nequit, sed qui renuntiavit, officium alio ex titulo consequi potest.

Артыкул 2. *Перамяшчэнне*

Кан. 190 – § 1. Перамяшчэнне можа ажыццявіць толькі той, хто мае права прызначаць як на пасаду, якая траціцца, так і на пасаду, якая атрымліваецца.

§ 2. Калі перамяшчэнне ажыццяўляецца супраць волі асобы, якая займае пасаду, патрабуецца важкая прычына, пры гэтым павінен захоўвацца парадак дзеянняў, прадпісаны правам, захоўваючы права прыводзіць супраціўныя аргументы.

§ 3. Для таго, каб перамяшчэнне асягнула вынік, паведамленне аб ім павінна быць уручана ў пісьмовай форме.

Art. 2. *De translatione*

Can. 190 – § 1. Translatio ab eo tantum fieri potest, qui ius habet providendi officio quod amittitur et simul officio quod committitur.

§ 2. Si translatio fiat invito officii titulari, gravis requiritur causa et, firmo semper iure rationes contrarias exponendi, servetur modus procedendi iure praescriptus.

§ 3. Translatio, ut effectum sortiatur, scripto intimanda est.

Кан. 191 – § 1. Пры перамяшчэнні папярэдняя пасада становіцца вакантнай праз кананічнае ўступленне на новую пасаду, калі

Can. 191 – § 1. In translatione, prius officium vacat per possessionem alterius officii canonice habitam, nisi

aliud iure cautum aut a competenti auctoritate praescriptum fuerit.

§ 2. Remunerationem cum priore officio conexam translatus percipit, donec alterius possessionem canonice obtinuerit.

права не прадугледжвае іншае або кампетэнтная ўлада не распарадзіцца інакш.

§ 2. Перамешчаны атрымлівае ўзнагароджанне, звязанае з папярэдняй пасадай, пакуль кананічна не ўступіць на новую пасаду.

Art. 3. *De amotione*

Can. 192 – Ab officio quis amovetur sive decreto ab auctoritate competenti legitime edito, servatis quidem iuribus forte ex contractu quaesitis, sive ipso iure ad normam can. 194.

Артыкул 3. *Звальненне*

Кан. 192 – Звальненне з пасады адбываецца або легітымна выдадзеным дэкрэтам кампетэнтнай улады, захоўваючы пры гэтым правы, набытыя згодна з дагаворам, або на моцы самога права згодна з прадпісаннем кан. 194.

Can. 193 – § 1. Ab officio quod alicui confertur ad tempus indefinitum, non potest quis amoveri nisi ob graves causas atque servato procedendi modo iure definito.

§ 2. Idem valet, ut quis ab officio, quod alicui ad tempus determinatum confertur, ante hoc tempus elapsum amoveri possit, firmo praescripto can. 624, § 3.

§ 3. Ab officio quod, secundum iuris praescripta, alicui confertur ad prudentem discretionem auctoritatis competentis, potest quis iusta ex causa, de iudicio eiusdem auctoritatis, amoveri.

§ 4. Decretum amotionis, ut effectum sortiatur, scripto intimandum est.

Кан. 193 – § 1. З пасады, на якую хто-небудзь быў прызначаны на неакрэслены тэрмін, ён не можа быць звольнены, калі не па важкай прычыне, захоўваючы пры гэтым парадак дзеянняў, акрэслены правам.

§ 2. Такім жа чынам адбываецца звальненне з пасады, на якую хто-небудзь быў прызначаны на акрэслены тэрмін, але перад заканчэннем гэтага тэрміну, захоўваючы прадпісанні кан. 624 § 3.

§ 3. З пасады, на якую, паводле прадпісанняў права, хто-небудзь быў прызначаны ў адпаведнасці з разважлівым суджэннем кампетэнтнай улады, можна звольніць па справядлівай прычыне, разважанай гэтай жа ўладай.

§ 4. Каб дэкрэт аб звальненні асягнуў вынік, ён павінен быць уручаны ў пісьмовай форме.

Can. 194 – § 1. Ipso iure ab officio ecclesiastico amovetur:

1° qui statum clericalem amiserit;

2° qui a fide catholica aut a communione Ecclesiae publice defecerit;

Кан. 194 – § 1. На моцы самога права з касцёльнай пасады звольнены:

1° той, хто страціў духоўны стан;

2° той, хто публічна адступіў ад каталіцкай веры або ад адзінства з Касцёлам;

3° духоўная асоба, якая спрабавала заключыць сужэнства, нават толькі грамадзянскае.

§ 2. Звальненне, пра якое ідзе гаворка ў пунктах 2° і 3°, адбываецца толькі тады, калі аб гэтым стала вядома праз сцвярджанне, здзейсненае кампетэнтнай уладай.

Кан. 195 – Калі хто-небудзь не на моцы самога права, а дэкрэтам кампетэнтнай улады быў звольнены з пасады, якая была падставай яго ўтрымання, тады гэтая ж улада павінна забяспечыць звольненаму ўтрыманне на адпаведны час, калі гэта не было вырашана іншым спосабам.

3° clericus qui matrimonium etiam civile tantum attentaverit.

§ 2. Amotio, de qua in nn. 2 et 3, urgeri tantum potest, si de eadem auctoritatis competentis declaratione constet.

Can. 195 – Si quis, non quidem ipso iure, sed per decretum auctoritatis competentis ab officio amoveatur quo eiusdem subsistentiae providetur, eadem auctoritas curet ut ipsius subsistentiae per congruum tempus prospiciatur, nisi aliter provisum sit.

Артыкул 4. *Пазбаўленне*

Кан. 196 – § 1. Пазбаўленне пасады ў якасці пакарання за злачынства можа адбывацца толькі згодна з нормамі права.

§ 2. Пазбаўленне пасады асягае вынік згодна з прадпісаннямі канонаў карнага права.

Art. 4. *De privatione*

Can. 196 – § 1. Privatio ab officio, in poenam scilicet delicti, ad normam iuris tantummodo fieri potest.

§ 2. Privatio effectum sortitur secundum praescripta canonum de iure poenali.

ТЫТУЛ X
ДАЎНАСЦЬ

Кан. 197 – Касцёл прымае даўнасць у якасці падставы да набыцця або страты суб'ектыўнага права, а таксама вызвалення ад абавязкаў так, як гэта прадугледжана ў дзяржаўным заканадаўстве дадзенай краіны, захоўваючы выключэнні, устаноўленыя ў канонах гэтага Кодэкса.

Кан. 198 – Даўнасць не з'яўляецца дзейснай, калі не засноўваецца на добрасумленнасці не толькі на пачатку, але і на працягу ўсяго часу, які патрабуецца для наступлення даўнасці, з захаваннем прадпісання кан. 1362.

TITULUS X
DE PRAESCRIPTIONE

Can. 197 – Praescriptionem, tamquam modum iuris subiectivi acquirendi vel amittendi necnon ab obligationibus sese liberandi, Ecclesia recipit prout est in legislatione civili respectivae nationis, salvis exceptionibus quae in canonibus huius Codicis statuuntur.

Can. 198 – Nulla valet praescriptio, nisi bona fide nitatur, non solum initio, sed toto decursu temporis ad praescriptionem requisiti, salvo praescripto can. 1362.

Can. 199 – Praescriptioni obnoxia non sunt:

1° iura et obligationes quae sunt legis divinae naturalis aut positivae;

2° iura quae obtineri possunt ex solo privilegio apostolico;

3° iura et obligationes quae spiritualem christifidelium vitam directe respiciunt;

4° fines certi et indubii circumscriptionum ecclesiasticarum;

5° stipes et onera Missarum;

6° provisio officii ecclesiastici quod ad normam iuris exercitium ordinis sacri requirit;

7° ius visitationis et obligatio oboedientiae, ita ut christifideles a nulla auctoritate ecclesiastica visitari possint et nulli auctoritati iam subsint.

Кан. 199 – Не падлягаюць даўнасці:

1° правы і абавязкі, якія вынікаюць з Божага права — натуральнага ці пазітыўнага;

2° правы, якія можна атрымаць толькі на моцы апостальскага прывілея;

3° правы і абавязкі, якія непасрэдна датычаць духоўнага жыцця вернікаў;

4° дакладныя і несумненныя межы касцёльных акругаў;

5° ахвяраванні і абавязацельствы, звязаныя з Імшамі;

6° прызначэнне на касцёльную пасаду, для выконвання якой, згодна з прадпісаннямі права, патрабуецца пасвячэнне;

7° права візітацыі і абавязак паслухмянасці, каб не здарылася так, што ніякая касцёльная ўлада не будзе мець магчымасці здзяйсняць візітацыю вернікаў і яны ўжо не будуць падпарадкаваны ніякай уладзе.

TITULUS XI
DE TEMPORIS SUPPUTATIONE

ТЫТУЛ XI
ПАДЛІК ЧАСУ

Can. 200 – Nisi aliud expresse iure caveatur, tempus supputetur ad normam canonum qui sequuntur.

Кан. 200 – Калі права выразна не прадугледжвае іншае, час павінен лічыцца згодна з нормамі наступных канонаў.

Can. 201 – § 1. Tempus continuum intellegitur quod nullam patitur interruptionem.

§ 2. Tempus utile intellegitur quod ita ius suum exercenti aut persequenti competit, ut ignoranti aut agere non valenti non currat.

Кан. 201 – § 1. У якасці бесперапыннага трэба разумець такі час, у якім не дапускаецца ніякіх перапынкаў.

§ 2. У якасці карыснага трэба разумець такі час, які не ідзе для асобы, якая ажыццяўляе сваё права або дабіваецца яго, пакуль яна знаходзіцца ў няведанні або не можа дзейнічаць.

Can. 202 – § 1. In iure, dies intellegitur spatium constans 24 horis con-

Кан. 202 – § 1. У праве пад назвай дзень разумеецца перыяд часу, які складаецца

з 24 гадзін, якія падлічваюцца бесперапынна, і пачынаецца з поўначы, калі права не прадугледжвае іншае. Тыдзень — гэта перыяд 7 дзён, месяц — перыяд 30 дзён, а год — перыяд 365 дзён, калі не ўказваецца, што месяц і год павінен прымацца згодна з календаром.

§ 2. Калі час з'яўляецца бесперапынным, то месяц і год заўсёды павінен лічыцца згодна з календаром.

Кан. 203 – § 1. Першы дзень не ўлічваецца ў тэрмін, калі яго пачатак не супадае з пачаткам сутак або права выразна не прадугледжвае іншае.

§ 2. Калі іншае не прадугледжана, то апошні дзень улічваецца ў тэрмін, які — калі ён складаецца з аднаго ці некалькіх месяцаў або гадоў, з аднаго ці некалькіх тыдняў — завяршаецца пасля заканчэння апошняга дня гэтага перыяду; калі ж у месяцы няма дня з такой датай, тэрмін завяршаецца пасля заканчэння апошняга дня месяца.

tinuo supputandis, et incipit a media nocte, nisi aliud expresse caveatur; hebdomada spatium 7 dierum; mensis spatium 30 et annus spatium 365 dierum, nisi mensis et annus dicantur sumendi prout sunt in calendario.

§ 2. Prout sunt in calendario semper sumendi sunt mensis et annus, si tempus est continuum.

Can. 203 – § 1. Dies a quo non computatur in termino, nisi huius initium coincidat cum initio diei aut aliud expresse in iure caveatur.

§ 2. Nisi contrarium statuatur, dies ad quem computatur in termino, qui, si tempus constet uno vel pluribus mensibus aut annis, una vel pluribus hebdomadis, finitur expleto ultimo die eiusdem numeri aut, si mensis die eiusdem numeri careat, expleto ultimo die mensis.

LIBER II
DE POPULO DEI

PARS I
DE CHRISTIFIDELIBUS

Can. 204 – § 1. Christifideles sunt qui, utpote per baptismum Christo incorporati, in populum Dei sunt constituti, atque hac ratione muneris Christi sacerdotalis, prophetici et regalis suo modo participes facti, secundum propriam cuiusque condicionem, ad missionem exercendam vocantur, quam Deus Ecclesiae in mundo adimplendam concredidit.

§ 2. Haec Ecclesia, in hoc mundo ut societas constituta et ordinata, subsistit in Ecclesia catholica, a successore Petri et Episcopis in eius communione gubernata.

Can. 205 – Plene in communione Ecclesiae catholicae his in terris sunt illi baptizati, qui in eius compage visibili cum Christo iunguntur, vinculis nempe professionis fidei, sacramentorum et ecclesiastici regiminis.

Can. 206 – § 1. Speciali ratione cum Ecclesia conectuntur catechumeni, qui nempe, Spiritu Sancto movente,

КНІГА II
БОЖЫ НАРОД

ЧАСТКА I
ВЕРНІКІ

Кан. 204 – § 1. Вернікі — гэта тыя, хто, уключаныя праз хрост у Хрыста, складаюць Божы народ, і, дзякуючы гэтаму, па-свойму становяцца ўдзельнікамі святарскага, прароцкага і каралеўскага задання Хрыста, і пакліканы, згодна са становішчам кожнага з іх, да выконвання місіі, якую Бог даручыў Касцёлу здзяйсняць у свеце.

§ 2. Гэты Касцёл, устаноўлены і ўпарадкаваны ў гэтым свеце як супольнасць, трывае ў Каталіцкім Касцёле, якім кіруе наступнік Пятра і біскупы ў адзінстве з ім.

Кан. 205 – На гэтай зямлі ў поўным адзінстве з Каталіцкім Касцёлам знаходзяцца тыя ахрышчаныя, якія ў яго бачнай структуры злучаюцца з Хрыстом праз повязі вызнавання веры, сакрамэнтаў і касцёльнага кіравання.

Кан. 206 – § 1. Асобным чынам з Касцёлам злучаны катэхумэны, а менавіта тыя, хто пад натхненнем Духа Святога знешнім во-

левыяўленнем просяць аб уключэнні ў Касцёл, а таму гэтым жаданнем, як і жыццём у веры, надзеі і любові, якое практыкуюць, злучаюцца з Касцёлам, які апякуецца імі ўжо як сваімі членамі.

§ 2. Касцёл праяўляе асобы клопат аб катэхумэнах, запрашаючы іх весці евангельскае жыццё, якое ўводзіць іх у цэлебрацыю святых абрадаў, і ўжо надзяляе рознымі прэрагатывамі, уласцівымі хрысціянскаму жыццю.

Кан. 207 – § 1. З Божага ўстанаўлення сярод вернікаў у Касцёле ёсць святыя служыцелі, якія ў праве называюцца духоўнымі асобамі; іншыя называюцца свецкімі асобамі.

§ 2. У абедзвюх частках ёсць вернікі, якія прыняццем евангельскіх парадаў праз абяцанні або іншыя святыя повязі, прызнаныя і зацверджаныя Касцёлам, асаблівым чынам кансэкруюцца Богу і садзейнічаюць збаўчай місіі Касцёла; іх стан, хоць і не адносіцца да іерархічнай структуры Касцёла, усё ж належыць да яго жыцця і святасці.

explicita voluntate ut eidem incorporentur expetunt, ideoque hoc ipso voto, sicut et vita fidei, spei et caritatis quam agunt, coniunguntur cum Ecclesia, quae eos iam ut suos fovet.

§ 2. Catechumenorum specialem curam habet Ecclesia quae, dum eos ad vitam ducendam evangelicam invitat eosque ad sacros ritus celebrandos introducit, eisdem varias iam largitur praerogativas, quae christianorum sunt propriae.

Can. 207 – § 1. Ex divina institutione, inter christifideles sunt in Ecclesia ministri sacri, qui in iure et clerici vocantur; ceteri autem et laici nuncupantur.

§ 2. Ex utraque hac parte habentur christifideles, qui professione consiliorum evangelicorum per vota aut alia sacra ligamina, ab Ecclesia agnita et sancita, suo peculiari modo Deo consecrantur et Ecclesiae missioni salvificae prosunt; quorum status, licet ad hierarchicam Ecclesiae structuram non spectet, ad eius tamen vitam et sanctitatem pertinet.

ТЫТУЛ I
АБАВЯЗКІ І ПРАВЫ ЎСІХ ВЕРНІКАЎ

Кан. 208 – Паміж усімі вернікамі, з прычыны іх адраджэння ў Хрысце, існуе сапраўдная роўнасць у адносінах да іх годнасці і дзейнасці, дзякуючы якой усе яны, згодна са становішчам і заданнем кожнага, супрацоўнічаюць дзеля будавання Хрыстовага цела.

Кан. 209 – § 1. Вернікі — кожны праз уласны спосаб дзеянняў — абавязаны заўсёды захоўваць адзінства з Касцёлам.

TITULUS I
DE OMNIUM CHRISTIFIDELIUM OBLIGATIONIBUS ET IURIBUS

Can. 208 – Inter christifideles omnes, ex eorum quidem in Christo regeneratione, vera viget quoad dignitatem et actionem aequalitas, qua cuncti, secundum propriam cuiusque condicionem et munus, ad aedificationem Corporis Christi cooperantur.

Can. 209 – § 1. Christifideles obligatione adstringuntur, sua quoque ipsorum agendi ratione, ad communionem semper servandam cum Ecclesia.

§ 2. Magna cum diligentia officia adimpleant, quibus tenentur erga Ecclesiam tum universam, tum particularem ad quam, secundum iuris praescripta, pertinent.

§ 2. З вялікай пільнасцю вернікі павінны выконваць свае абавязкі ў адносінах да Касцёла, як паўсюднага, так і партыкулярнага, да якога належаць згодна з прадпісаннямі права.

Can. 210 – Omnes christifideles, secundum propriam condicionem, ad sanctam vitam ducendam atque ad Ecclesiae incrementum eiusque iugem sanctificationem promovendam vires suas conferre debent.

Кан. 210 – Усе вернікі, адпаведна ўласнаму становішчу, павінны старацца весці святое жыццё і садзейнічаць узрастанню і няспыннаму асвячэнню Касцёла.

Can. 211 – Omnes christifideles officium habent et ius allaborandi ut divinum salutis nuntium ad universos homines omnium temporum ac totius orbis magis magisque perveniat.

Кан. 211 – Усе вернікі маюць абавязак і права садзейнічаць таму, каб Божая навіна аб збаўленні ўсё больш і больш распаўсюджвалася на ўсіх людзей усіх часоў і ўсяго свету.

Can. 212 – § 1. Quae sacri Pastores, utpote Christum repraesentantes, tamquam fidei magistri declarant aut tamquam Ecclesiae rectores statuunt, christifideles, propriae responsabilitatis conscii, christiana oboedientia prosequi tenentur.

Кан. 212 – § 1. Вернікі, усведамляючы сваю адказнасць, павінны выконваць з хрысціянскай паслухмянасцю тое, што святыя пастыры, якія прадстаўляюць Хрыста, абвяшчаюць як настаўнікі веры або пастанаўляюць як тыя, хто кіруе Касцёлам.

§ 2. Christifidelibus integrum est, ut necessitates suas, praesertim spirituales, suaque optata Ecclesiae Pastoribus patefaciant.

§ 2. Вернікі маюць поўнае права прадстаўляць пастырам Касцёла свае патрэбы, асабліва духоўныя, і пажаданні.

§ 3. Pro scientia, competentia et praestantia quibus pollent, ipsis ius est, immo et aliquando officium, ut sententiam suam de his quae ad bonum Ecclesiae pertinent sacris Pastoribus manifestent eamque, salva fidei morumque integritate ac reverentia erga Pastores, attentisque communi utilitate et personarum dignitate, ceteris christifidelibus notam faciant.

§ 3. Па меры сваіх ведаў, кампетэнтнасці і здольнасці вернікі маюць права, а часам і прамы абавязак, выказваць святым пастырам сваё меркаванне аб тым, што адносіцца да дабра Касцёла, і паведамляць аб гэтым іншых вернікаў, захоўваючы бездакорнасць веры і нораваў і павагу да пастыраў, а таксама беручы пад увагу агульную карысць і асабістую годнасць кожнага.

Can. 213 – Ius est christifidelibus ut ex spiritualibus Ecclesiae bonis, praesertim ex verbo Dei et sacramentis, adiumenta a sacris Pastoribus accipiant.

Кан. 213 – Вернікі маюць права прымаць ад святых пастыраў дапамогу з духоўных дабротаў Касцёла, а асабліва з Божага слова і сакрамэнтаў.

Can. 214 – Ius est christifidelibus, ut cultum Deo persolvant iuxta prae-

Кан. 214 – Вернікі маюць права ажыццяўляць Божы культ паводле прадпісанняў

уласнага абраду, зацверджанага легітымнымі пастырамі Касцёла, а таксама наследваць свой лад духоўнага жыцця, згоднага, аднак, з вучэннем Касцёла.

Кан. 215 – Вернікі маюць поўнае права свабодна засноўваць і ўзначальваць аб'яднанні, скіраваныя на мэты любові і міласэрнасці або на садзейнічанне хрысціянскаму пакліканню ў свеце, а таксама збірацца разам для дасягнення гэтых мэтаў.

Кан. 216 – Усе вернікі, паколькі ўдзельнічаюць у місіі Касцёла, маюць права згодна са станам і становішчам кожнага садзейнічаць апостальскай дзейнасці або падтрымліваць яе сваімі пачынаннямі; аднак ніякае з гэтых пачынанняў не можа называць сябе «каталіцкім», калі на гэта не будзе згоды кампетэнтнай касцёльнай улады.

Кан. 217 – Вернікі, якія менавіта праз хрост пакліканы жыць згодна з евангельскім вучэннем, маюць права на хрысціянскае выхаванне, праз якое павінны адпаведна падрыхтавацца да дасягнення сталасці чалавечай асобы, а разам з тым да пазнання таямніцы збаўлення і да жыцця, згоднага з ёй.

Кан. 218 – Тыя, хто займаюцца святымі навукамі, карыстаюцца справядлівай свабодай даследавання і маюць права разважліва выказваць сваё меркаванне ў справах, знаўцамі якіх з'яўляюцца, захоўваючы пры гэтым належную пашану да Магістэрыя Касцёла.

Кан. 219 – Усе вернікі карыстаюцца правам быць вольнымі ад усялякага прымусу ў выбары свайго жыццёвага стану.

Кан. 220 – Нікому не дазваляецца нелегітымна парушаць добрае імя таго, хто ім валодае, і права кожнай асобы на ахову яе прыватнага ўласнага жыцця.

scripta proprii ritus a legitimis Ecclesiae Pastoribus approbati, utque propriam vitae spiritualis formam sequantur, doctrinae quidem Ecclesiae consentaneam.

Can. 215 – Integrum est christifidelibus, ut libere condant atque moderentur consociationes ad fines caritatis vel pietatis, aut ad vocationem christianam in mundo fovendam, utque conventus habeant ad eosdem fines in communi persequendos.

Can. 216 – Christifideles cuncti, quippe qui Ecclesiae missionem participent, ius habent ut propriis quoque inceptis, secundum suum quisque statum et condicionem, apostolicam actionem promoveant vel sustineant; nullum tamen inceptum nomen catholicum sibi vindicet, nisi consensus accesserit competentis auctoritatis ecclesiasticae.

Can. 217 – Christifideles, quippe qui baptismo ad vitam doctrinae evangelicae congruentem ducendam vocentur, ius habent ad educationem christianam, qua ad maturitatem humanae personae prosequendam atque simul ad mysterium salutis cognoscendum et vivendum rite instruantur.

Can. 218 – Qui disciplinis sacris incumbunt iusta libertate fruuntur inquirendi necnon mentem suam prudenter in iis aperiendi, in quibus peritia gaudent, servato debito erga Ecclesiae magisterium obsequio.

Can. 219 – Christifideles omnes iure gaudent ut a quacumque coactione sint immunes in statu vitae eligendo.

Can. 220 – Nemini licet bonam famam, qua quis gaudet, illegitime laedere, nec ius cuiusque personae ad propriam intimitatem tuendam violare.

Can. 221 – § 1. Christifidelibus competit ut iura, quibus in Ecclesia gaudent, legitime vindicent atque defendant in foro competenti ecclesiastico ad normam iuris.

§ 2. Christifidelibus ius quoque est ut, si ad iudicium ab auctoritate competenti vocentur, iudicentur servatis iuris praescriptis, cum aequitate applicandis.

§ 3. Christifidelibus ius est, ne poenis canonicis nisi ad normam legis plectantur.

Can. 222 – § 1. Christifideles obligatione tenentur necessitatibus subveniendi Ecclesiae, ut eidem praesto sint quae ad cultum divinum, ad opera apostolatus et caritatis atque ad honestam ministrorum sustentationem necessaria sunt.

§ 2. Obligatione quoque tenentur iustitiam socialem promovendi necnon, praecepti Domini memores, ex propriis reditibus pauperibus subveniendi.

Can. 223 – § 1. In iuribus suis exercendis christifideles tum singuli tum in consociationibus adunati rationem habere debent boni communis Ecclesiae necnon iurium aliorum atque suorum erga alios officiorum.

§ 2. Ecclesiasticae auctoritati competit, intuitu boni communis, exercitium iurium, quae christifidelibus sunt propria, moderari.

Кан. 221 – § 1. Вернікі могуць легітымна адстойваць і згодна з правам абараняць у кампетэнтным касцёльным судзе тыя правы, якімі карыстаюцца ў Касцёле.

§ 2. Вернікі, калі кампетэнтная ўлада пакліча іх у суд, маюць таксама права, каб іх судзілі згодна з прадпісаннямі права, якія ўжываюцца згодна з прынцыпам адпаведнасці.

§ 3. Вернікі маюць права, каб на іх не накладаліся кананічныя пакаранні, акрамя выпадкаў, прадугледжаных правам.

Кан. 222 – § 1. Вернікі маюць абавязак дапамагаць Касцёлу ў яго патрэбах, каб ён меў тое, што патрэбна для ажыццяўлення Божага культу, для выконвання спраў апостальства і міласэрнасці, а таксама для годнага ўтрымання служыцеляў.

§ 2. Яны таксама абвязаны садзейнічаць грамадскай справядлівасці і, памятаючы наказ Пана, дапамагаць бедным з уласных сродкаў.

Кан. 223 – § 1. У ажыццяўленні сваіх правоў, як індывідуальна, так і аб'яднаўшыся ў супольнасці, вернікі павінны мець на ўвазе агульнае дабро Касцёла, а таксама правы іншых людзей і свае абавязкі перад імі.

§ 2. Касцёльная ўлада мае права кіраваць ажыццяўленнем правоў, якія належаць вернікам, беручы пад увагу агульнае дабро.

TITULUS II

DE OBLIGATIONIBUS ET IURIBUS CHRISTIFIDELIUM LAICORUM

ТЫТУЛ II

АБАВЯЗКІ І ПРАВЫ СВЕЦКІХ ВЕРНІКАЎ

Can. 224 – Christifideles laici, praeter eas obligationes et iura, quae cunctis christifidelibus sunt communia et ea quae in aliis canonibus statuun-

Кан. 224 – Апрача абавязкаў і правоў, якія з'яўляюцца агульнымі для ўсіх вернікаў, а таксама тых, якія ўстаноўлены ў іншых ка-

нонах, свецкія вернікі маюць абавязкі і правы, пералічаныя ў канонах гэтага тытула.

Кан. 225 – § 1. Свецкія асобы, як і ўсе вернікі, праз хрост і канфірмацыю прадвызначаныя Богам да апостальства, маюць агульны абавязак і права супрацоўнічаць, як індывідуальна, так і аб'ядноўваючыся, дзеля таго, каб Божую навіну аб збаўленні пазналі і прынялі ўсе людзі на ўсёй зямлі; гэты абавязак становіцца яшчэ большым у тых акалічнасцях, калі толькі дзякуючы свецкім асобам людзі могуць пачуць Евангелле і даведацца аб Хрысце.

§ 2. Кожны з іх, згодна са сваім становішчам, мае таксама асаблівы абавязак насычаць і ўдасканальваць евангельскім духам парадак спраў гэтага свету, каб такім выдатным чынам сведчыць аб Хрысце, асабліва праз ажыццяўленне гэтых спраў, а таксама праз выкананне сваіх непасрэдных абавязкаў.

Кан. 226 – § 1. Тыя, хто жыве ў сужэнскім стане, маюць асаблівы абавязак — яны павінны супрацоўнічаць у будаванні Божага народа праз сужэнства і сям'ю згодна са сваім пакліканнем.

§ 2. Бацькі, паколькі далі сваім дзецям жыццё, маюць вельмі важкі абавязак і права іх выхавання; таму бацькі-хрысціяне павінны ў першую чаргу дбаць аб тым, каб іх дзеці былі выхаваны згодна з вучэннем, якое перадае Касцёл.

Кан. 227 – Свецкія вернікі маюць права на тое, каб у зямных грамадскіх справах ім пакідалася тая ж свабода, што і іншым грамадзянам; аднак, карыстаючыся гэтай свабодай, яны павінны дбаць аб тым, каб іх дзейнасць была прасякнута евангельскім духам, а яны самі прытрымліваліся вучэнтur, obligationibus tenentur et iuribus gaudent quae in canonibus huius tituli recensentur.

Can. 225 – § 1. Laici, quippe qui uti omnes christifideles ad apostolatum a Deo per baptismum et confirmationem deputentur, generali obligatione tenentur et iure gaudent, sive singuli sive in consociationibus coniuncti, allaborandi ut divinum salutis nuntium ab universis hominibus ubique terrarum cognoscatur et accipiatur; quae obligatio eo vel magis urget iis in adiunctis, in quibus nonnisi per ipsos Evangelium audire et Christum cognoscere homines possunt.

§ 2. Hoc etiam peculiari adstringuntur officio, unusquisque quidem secundum propriam condicionem, ut rerum temporalium ordinem spiritu evangelico imbuant atque perficiant, et ita specialiter in iisdem rebus gerendis atque in muneribus saecularibus exercendis Christi testimonium reddant.

Can. 226 – § 1. Qui in statu coniugali vivunt, iuxta propriam vocationem, peculiari officio tenentur per matrimonium et familiam ad aedificationem populi Dei allaborandi.

§ 2. Parentes, cum vitam filiis contulerint, gravissima obligatione tenentur et iure gaudent eos educandi; ideo parentum christianorum imprimis est christianam filiorum educationem secundum doctrinam ab Ecclesia traditam curare.

Can. 227 – Ius est christifidelibus laicis, ut ipsis agnoscatur ea in rebus civitatis terrenae libertas, quae omnibus civibus competit; eadem tamen libertate utentes, curent ut suae actiones spiritu evangelico imbuantur, et ad doctrinam attendant ab Ecclesiae magisterio propositam, caventes

tamen ne in quaestionibus opinabilibus propriam sententiam uti doctrinam Ecclesiae proponant.

Can. 228 – § 1. Laici qui idonei reperiantur, sunt habiles ut a sacris Pastoribus ad illa officia ecclesiastica et munera assumantur, quibus ipsi secundum iuris praescripta fungi valent.

§ 2. Laici debita scientia, prudentia et honestate praestantes, habiles sunt tamquam periti aut consiliarii, etiam in consiliis ad normam iuris, ad Ecclesiae Pastoribus adiutorium praebendum.

Can. 229 – § 1. Laici, ut secundum doctrinam christianam vivere valeant, eandemque et ipsi enuntiare atque, si opus sit, defendere possint, utque in apostolatu exercendo partem suam habere queant, obligatione tenentur et iure gaudent acquirendi eiusdem doctrinae cognitionem, propriae uniuscuiusque capacitati et condicioni aptatam.

§ 2. Iure quoque gaudent pleniorem illam in scientiis sacris acquirendi cognitionem, quae in ecclesiasticis universitatibus facultatibusve aut in institutis scientiarum religiosarum traduntur, ibidem lectiones frequentando et gradus academicos consequendo.

§ 3. Item, servatis praescriptis quoad idoneitatem requisitam statutis, habiles sunt ad mandatum docendi scientias sacras a legitima auctoritate ecclesiastica recipiendum.

Can. 230 – § 1. Laici, qui aetate dotibusque pollent Episcoporum conferentiae decreto statutis, per ritum liturgicum praescriptum ad ministeria lectoris et acolythi stabiliter assu-

ня, якое абвяшчае Магістэрый Касцёла, асцерагаючыся, аднак, у адкрытых пытаннях выдаваць сваё меркаванне за вучэнне Касцёла.

Кан. 228 – § 1. Свецкія вернікі, прызнаныя прыдатнымі, з'яўляюцца здольнымі прымаць ад святых пастыраў тыя касцёльныя пасады і заданні, якія могуць выконваць згодна з прадпісаннямі права.

§ 2. Свецкія асобы, якія адзначаюцца адпаведнымі ведамі, разумнасцю і сумленнасцю, з'яўляюцца здольнымі аказваць пастырам Касцёла дапамогу як спецыялісты і дарадчыкі, у тым ліку ў складзе радаў згодна з правам.

Кан. 229 – § 1. Для таго, каб свецкія асобы маглі жыць згодна з хрысціянскім вучэннем, прапаведаваць яго і пры неабходнасці бараніць, а таксама быць здольнымі да ўдзелу ў ажыццяўленні апостальства, яны маюць абавязак і права набываць веды аб гэтым вучэнні, кожны ў адпаведнасці з уласнымі здольнасцямі і становішчам.

§ 2. Яны таксама маюць права набываць больш глыбокія веды ў святых навуках, якія выкладаюцца ва ўніверсітэтах, на факультэтах і ў інстытутах рэлігійных навук, наведваючы ў іх лекцыі і атрымліваючы навуковыя ступені.

§ 3. Захоўваючы прадпісанні, якія датычаць патрабаванняў, неабходных да прыдатнасці, свецкія асобы таксама могуць атрымаць ад легітымнай касцёльнай улады ўпаўнаважанне на навучанне святых навук.

Кан. 230 – § 1. Свецкія вернікі, якія дасягнулі таго ўзросту і валодаюць тымі якасцямі, якія былі акрэслены дэкрэтам Канферэнцыі Біскупаў, пасля здзяйснення прадпісанага літургічнага абраду могуць

быць прызначаны да пастаянных паслугаў лектара або акаліта; аднак удзяленне гэтых паслугаў не дае ім права на ўтрыманне або ўзнагароджанне з боку Касцёла.

§ 2. Свецкія вернікі могуць быць часова вызначаны для выконвання падчас літургічных дзеянняў задання лектара; таксама ўсе вернікі згодна з прадпісаннямі права могуць выконваць заданні каментатара, кантара і іншых.

§ 3. Там, дзе да гэтага схіляе патрэба Касцёла, пры недахопе служыцеляў свецкія вернікі, нават не будучы лектарамі і акалітамі, могуць выконваць некаторыя іх абавязкі: ажыццяўляць паслугу слова, праводзіць літургічныя малітвы, удзяляць хрост і святую Камунію згодна з прадпісаннямі права.

Кан. 231 – § 1. Свецкія асобы, якія пастаянна або часова прысвячаюць сябе спецыяльнаму служэнню Касцёлу, павінны набываць належную падрыхтоўку, неабходную для якаснага выконвання свайго задання, і выконваць сваё заданне свядома, уважліва і пільна.

§ 2. Захоўваючы прадпісанні кан. 230 § 1, свецкія асобы маюць права на годнае ўзнагароджанне, адпаведнае іх становішчу, каб дзякуючы яму, пры захаванні таксама прадпісанняў дзяржаўнага права, яны маглі годна задавольваць свае патрэбы і патрэбы сваёй сям'і; таксама яны маюць права на тое, каб быў праяўлены адпаведны клопат аб іх пенсійным забеспячэнні, сацыяльным і медыцынскім страхаванні.

mi possunt; quae tamen ministeriorum collatio eisdem ius non confert ad sustentationem remunerationemve ab Ecclesia praestandam.

§ 2. Laici ex temporanea deputatione in actionibus liturgicis munus lectoris implere possunt; item omnes laici muneribus commentatoris, cantoris aliisve ad normam iuris fungi possunt.

§ 3. Ubi Ecclesiae necessitas id suadeat, deficientibus ministris, possunt etiam laici, etsi non sint lectores vel acolythi, quaedam eorundem officia supplere, videlicet ministerium verbi exercere, precibus liturgicis praeesse, baptismum conferre atque sacram Communionem distribuere, iuxta iuris praescripta.

Can. 231 – § 1. Laici, qui permanenter aut ad tempus speciali Ecclesiae servitio addicuntur, obligatione tenentur ut aptam acquirant formationem ad munus suum debite implendum requisitam, utque hoc munus conscie, impense et diligenter adimpleant.

§ 2. Firmo praescripto can. 230, § 1, ius habent ad honestam remunerationem suae condicioni aptatam, qua decenter, servatis quoque iuris civilis praescriptis, necessitatibus propriis ac familiae providere valeant; itemque iis ius competit ut ipsorum praevidentiae et securitati sociali et assistentiae sanitariae, quam dicunt, debite prospiciatur.

TITULUS III

DE MINISTRIS SACRIS SEU DE CLERICIS

Caput I

De clericorum institutione

Can. 232 – Ecclesiae officium est atque ius proprium et exclusivum eos instituendi, qui ad ministeria sacra deputantur.

Can. 233 – § 1. Universae communitati christianae officium incumbit fovendarum vocationum, ut necessitatibus ministerii sacri in tota Ecclesia sufficienter provideatur; speciatim hoc officio tenentur familiae christianae, educatores atque peculiari ratione sacerdotes, praesertim parochi. Episcopi dioecesani, quorum maxime est de vocationibus provehendis curam habere, populum sibi commissum de momento ministerii sacri deque ministrorum in Ecclesia necessitate edoceant, atque incepta ad vocationes fovendas, operibus praesertim ad hoc institutis, suscitent ac sustentent.

§ 2. Solliciti sint insuper sacerdotes, praesertim vero Episcopi dioecesani, ut qui maturioris aetatis viri ad ministeria sacra sese vocatos aestiment, prudenter verbo opereque adiuventur ac debite praeparentur.

Can. 234 – § 1. Serventur, ubi exsistunt, atque foveantur seminaria minora aliave instituta id genus, in quibus nempe, vocationum fovendarum gratia, provideatur ut peculiaris formatio religiosa una cum institutione humanistica et scientifica tradatur; immo, ubi id expedire iudicaverit

ТЫТУЛ III

СВЯТЫЯ СЛУЖЫЦЕЛІ, ІНШЫМІ СЛОВАМІ — ДУХОЎНЫЯ АСОБЫ

Раздзел I

Падрыхтоўка духоўных асобаў

Кан. 232 – Абавязкам, а таксама ўласным і выключным правам Касцёла з'яўляецца падрыхтоўка тых, хто прызначаецца да святых паслугаў.

Кан. 233 – § 1. На ўсю хрысціянскую супольнасць ускладзены абавязак спрыяць духоўным пакліканням, каб у дастатковай меры задаволіць патрэбы ўсяго Касцёла ў святых паслугах; гэты абавязак ускладаецца ў першую чаргу на хрысціянскія сем'і, на выхавацеляў і асабліва на святароў, перадусім на пробашчаў. Дыяцэзіяльныя біскупы, якім належыць найбольш клапаціцца аб адкрыцці пакліканняў, павінны вучыць даручаны ім народ аб важнасці святых паслугаў і аб неабходнасці святых служыцеляў у Касцёле, а таксама заахвочваць і падтрымліваць пачынанні, якія садзейнічаюць пакліканням, асабліва праз установы, заснаваныя для гэтых мэтаў.

§ 2. Акрамя гэтага, святары, а перадусім дыяцэзіяльныя біскупы, павінны клапаціцца аб тым, каб мужчыны, якія дасягнулі сталага ўзросту і лічаць сябе пакліканымі да святых паслугаў, атрымлівалі мудрую дапамогу словам і справай, а таксама адпаведную падрыхтоўку.

Кан. 234 – § 1. Трэба захоўваць і падтрымліваць ніжэйшыя семінарыі і іншыя ўстановы такога тыпу, дзе яны існуюць, у якіх, дзеля падтрымкі пакліканняў, прапануецца асаблівая рэлігійная фармацыя разам з гуманітарнай і навуковай адукацыяй; больш за тое, там, дзе дыяцэзіяльны біс-

куп палічыць гэта патрэбным, ён павінен паклапаціцца аб заснаванні ніжэйшай семінарыі або іншай падобнай установы.

§ 2. Калі ў акрэсленых выпадках акалічнасці не патрабуюць іншага, юнакі, якія маюць намер прыняць святарства, павінны атрымаць такую гуманітарную і навуковую падрыхтоўку, якую атрымлівае моладзь гэтага рэгіёна, якая рыхтуецца да атрымання адукацыі ў вышэйшай школе.

Кан. 235 – § 1. Юнакі, якія маюць намер прыняць святарства, павінны для атрымання адпаведнага духоўнага выхавання і падрыхтоўкі да выконвання ўласцівых ім абавязкаў прайсці падрыхтоўку ў вышэйшай семінарыі на працягу поўнага тэрміну фармацыі або, калі гэтага, на думку дыяцэзіяльнага біскупа, патрабуюць акалічнасці, — прынамсі на працягу чатырох гадоў.

§ 2. Тых, хто легітымна знаходзіцца паза семінарыяй, дыяцэзіяльны біскуп павінен даручыць апецы пабожнага і прыдатнага святара, які будзе сачыць за тым, каб яны атрымлівалі старанную падрыхтоўку да духоўнага жыцця і захоўвання дысцыпліны.

Кан. 236 – Кандыдаты да прыняцця пастаяннага дыяканату павінны згодна з прадпісаннямі Канферэнцыі Біскупаў атрымаць выхаванне, якое павінна садзейнічаць іх духоўнаму жыццю, і адпаведным чынам падрыхтавацца да выконвання абавязкаў, звязаных з гэтым пасвячэннем:

1° юнакі павінны пражываць не менш чым тры гады ў якім-небудзь асобным доме, калі дыяцэзіяльны біскуп па важкай прычыне не пастановіць іначай;

2° старэйшыя мужчыны, цэлібатарыі або жанатыя, павінны прайсці падрыхтоўку згодна з трохгадовай пра-

Episcopus dioecesanus, seminarii minoris similisve instituti erectioni prospiciat.

§ 2. Nisi certis in casibus adiuncta aliud suadeant, iuvenes quibus animus est ad sacerdotium ascendere, ea ornentur humanistica et scientifica formatione, qua iuvenes in sua quisque regione ad studia superiora peragenda praeparantur.

Can. 235 – § 1. Iuvenes, qui ad sacerdotium accedere intendunt, ad formationem spiritualem convenientem et ad officia propria instituantur in seminario maiore per totum formationis tempus, aut, si adiuncta de iudicio Episcopi dioecesani id postulent, per quattuor saltem annos.

§ 2. Qui extra seminarium legitime morantur, ab Episcopo dioecesano commendentur pio et idoneo sacerdoti, qui invigilet ut ad vitam spiritualem et ad disciplinam sedulo efformentur.

Can. 236 – Aspirantes ad diaconatum permanentem secundum Episcoporum conferentiae praescripta ad vitam spiritualem alendam informentur atque ad officia eidem ordini propria rite adimplenda instruantur:

1° iuvenes per tres saltem annos in aliqua domo peculiari degentes, nisi graves ob rationes Episcopus dioecesanus aliter statuerit;

2° maturioris aetatis viri, sive caelibes sive coniugati, ratione ad

tres annos protracta et ab eadem Episcoporum conferentia definita.

Can. 237 – § 1. In singulis dioecesibus sit seminarium maius, ubi id fieri possit atque expediat; secus concredantur alumni, qui ad sacra ministeria sese praeparent, alieno seminario aut erigatur seminarium interdioecesanum.

§ 2. Seminarium interdioecesanum ne erigatur nisi prius confirmatio Apostolicae Sedis, tum ipsius seminarii erectionis tum eiusdem statutorum, obtenta fuerit, et quidem ab Episcoporum conferentia, si agatur de seminario pro universo eius territorio, secus ab Episcopis quorum interest.

Can. 238 – § 1. Seminaria legitime erecta ipso iure personalitate iuridica in Ecclesia gaudent.

§ 2. In omnibus negotiis pertractandis personam seminarii gerit eius rector, nisi de certis negotiis auctoritas competens aliud statuerit.

Can. 239 – § 1. In quolibet seminario habeantur rector, qui ei praesit, et si casus ferat vice-rector, oeconomus, atque si alumni in ipso seminario studiis se dedant, etiam magistri, qui varias disciplinas tradant apta ratione inter se compositas.

§ 2. In quolibet seminario unus saltem adsit spiritus director, relicta libertate alumnis adeundi alios sacerdotes, qui ad hoc munus ab Episcopo deputati sint.

§ 3. Seminarii statutis provideantur rationes, quibus curam rectoris, in disciplina praesertim servanda, participent ceteri moderatores, magistri, immo et ipsi alumni.

грамай, зацверджанай Канферэнцыяй Біскупаў.

Кан. 237 – § 1. У кожнай дыяцэзіі, дзе гэта магчыма і мэтазгодна, павінна быць вышэйшая семінарыя; у іншым выпадку алюмнаў, якія рыхтуюцца да святых паслугаў, трэба даверыць семінарыі іншай дыяцэзіі або заснаваць міждыяцэзіяльную семінарыю.

§ 2. Міждыяцэзіяльная семінарыя не можа быць заснавана без папярэдняга адабрэння Апостальскай Сталіцай як самога заснавання семінарыі, так і яе статутаў, атрыманага — калі гаворка ідзе пра семінарыю для ўсёй тэрыторыі дадзенай Канферэнцыі — Канферэнцыяй Біскупаў або ў іншым выпадку — зацікаўленымі біскупамі.

Кан. 238 – § 1. Легітымна заснаваныя семінарыі маюць у Касцёле правасуб'ектнасць на моцы самога права.

§ 2. У вырашэнні ўсіх спраў семінарыю прадстаўляе яе рэктар, калі ў адносінах да акрэсленых спраў кампетэнтная ўлада не пастанавіла іншае.

Кан. 239 – § 1. У кожнай семінарыі павінен быць рэктар, які яе ўзначальвае, а пры неабходнасці і віцэ-рэктар, эканом, а таксама — калі навучанне алюмнаў адбываецца ў самой семінарыі — выкладчыкі, якія навучаюць розным навукам, адпаведным чынам узгодненым паміж сабой.

§ 2. У кожнай семінарыі павінен быць прынамсі адзін духоўны кіраўнік, пры гэтым алюмны могуць свабодна звяртацца да іншых святароў, якіх біскуп прызначыў для гэтага задання.

§ 3. У статутах семінарыі павінен быць прадугледжаны парадак, згодна з якім іншыя яе мадэратары, выкладчыкі, а нават самі алюмны будуць раздзяляць клопат рэктара, перадусім у справе захоўвання дысцыпліны.

Кан. 240 – § 1. Апрача звычайных спаведнікаў, у семінарыю павінны рэгулярна прыходзіць іншыя спаведнікі; акрамя гэтага, захоўваючы семінарыйную дысцыпліну, алюмны заўсёды павінны мець поўнае права звяртацца да іншага спаведніка ў самой семінарыі або па-за ёй.

§ 2. Калі прымаецца рашэнне аб дапушчэнні алюмнаў да пасвячэнняў ці аб выключэнні з семінарыі, ніколі не можа патрабавацца выказванне меркавання ад духоўнага кіраўніка і спаведнікаў.

Кан. 241 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп павінен прымаць у вышэйшую семінарыю толькі тых, хто здаецца здольным да прысвячэння сябе святым паслугам назаўсёды, беручы пад увагу іх чалавечыя і маральныя, духоўныя і інтэлектуальныя якасці, фізічнае і псіхічнае здароўе, а таксама шчырую волю.

§ 2. Перад прыёмам яны павінны прадставіць дакументы аб хросце і канфірмацыі, а таксама іншыя дакументы паводле прадпісанняў Плана падрыхтоўкі святароў.

§ 3. Калі гаворка ідзе пра асобаў, выдаленых з іншай семінарыі або манаскага інстытута, патрабуецца, акрамя таго, пасведчанне адпаведнага настаяцеля, асабліва адносна прычыны выдалення або сыходу.

Кан. 242 – § 1. У кожнай краіне павінен існаваць План падрыхтоўкі святароў, прыняты Канферэнцыяй Біскупаў з захаваннем нормаў, выдадзеных вярхоўнай уладай Касцёла, і адобраны Святой Сталіцай; пры змене абставінаў ён павінен быць дастасаваны да новых умоваў кожны раз з адабрэннем Святой Сталіцай; План павінен акрэсліваць найбольш важныя прынцыпы, а таксама агульныя нормы семінарыйнай падрыхтоўкі, дастасаваныя да пастырскіх патрэбаў кожнага рэгіёну або правінцыі.

Can. 240 – § 1. Praeter confessarios ordinarios, alii regulariter ad seminarium accedant confessarii, atque, salva quidem seminarii disciplina, integrum semper sit alumnis quemlibet confessarium sive in seminario sive extra illud adire.

§ 2. In decisionibus ferendis de alumnis ad ordines admittendis aut e seminario dimittendis, numquam directoris spiritus et confessariorum votum exquiri potest.

Can. 241 – § 1. Ad seminarium maius ab Episcopo dioecesano admittantur tantummodo ii qui, attentis eorum dotibus humanis et moralibus, spiritualibus et intellectualibus, eorum valetudine physica et psychica necnon recta voluntate, habiles aestimantur qui ministeriis sacris perpetuo sese dedicent.

§ 2. Antequam recipiantur, documenta exhibere debent de susceptis baptismo et confirmatione aliaque quae secundum praescripta institutionis sacerdotalis Rationis requiruntur.

§ 3. Si agatur de iis admittendis, qui ex alieno seminario vel instituto religioso dimissi fuerint, requiritur insuper testimonium respectivi superioris praesertim de causa eorum dimissionis vel discessus.

Can. 242 – § 1. In singulis nationibus habeatur institutionis sacerdotalis Ratio, ab Episcoporum conferentia, attentis quidem normis a suprema Ecclesiae auctoritate latis, statuenda et a Sancta Sede confirmanda, novis quoque adiunctis, confirmante item Sancta Sede, accommodanda, qua institutionis in seminario tradendae definiantur summa principia atque normae generales necessitatibus pastoralibus uniuscuiusque regionis vel provinciae, aptatae.

§ 2. Normae Rationis, de qua in § 1, serventur in omnibus seminariis, tum dioecesanis tum interdioecesanis.

Can. 243 – Habeat insuper unumquodque seminarium ordinationem propriam, ab Episcopo dioecesano aut, si de seminario interdioecesano agatur, ab Episcopis quorum interest, probatam, qua normae institutionis sacerdotalis Rationis adiunctis particularibus accommodentur, ac pressius determinentur praesertim disciplinae capita quae ad alumnorum cotidianam vitam et totius seminarii ordinem spectant.

Can. 244 – Alumnorum in seminario formatio spiritualis et institutio doctrinalis harmonice componantur, atque ad id ordinentur, ut iidem iuxta uniuscuiusque indolem una cum debita maturitate humana spiritum Evangelii et arctam cum Christo necessitudinem acquirant.

Can. 245 – § 1. Per formationem spiritualem alumni idonei fiant ad ministerium pastorale fructuose exercendum et ad spiritum missionalem efformentur, discentes ministerium expletum semper in fide viva et in caritate ad propriam sanctificationem conferre; itemque illas excolere discant virtutes quae in hominum consortione pluris fiunt, ita quidem ut ad aptam conciliationem inter bona humana et supernaturalia pervenire valeant.

§ 2. Ita formentur alumni ut, amore Ecclesiae Christi imbuti, Pontifici Romano Petri successori humili et filiali caritate devinciantur, proprio Episcopo tamquam fidi cooperatores adhaereant et sociam cum fratribus

§ 2. Нормы Плана, аб якім гаворыцца ў § 1, павінны захоўвацца ва ўсіх семінарыях, як дыяцэзіяльных, так і міждыяцэзіяльных.

Кан. 243 – Акрамя гэтага, кожная семінарыя павінна мець уласны распарадак, зацверджаны дыяцэзіяльным біскупам або — калі гаворка ідзе пра міждыяцэзіяльную семінарыю — зацікаўленымі біскупамі; гэты распарадак павінен дастасоўваць нормы Плана падрыхтоўкі святароў у адпаведнасці з канкрэтнымі абставінамі і больш падрабязна акрэсліваць перадусім тыя дысцыплінарныя правілы, якія датычаць штодзённага жыцця алюмнаў і парадку ва ўсёй семінарыі.

Кан. 244 – Духоўная фармацыя алюмнаў у семінарыі і навуковая падрыхтоўка павінны гарманічна спалучацца і скіроўвацца для таго, каб алюмны, кожны згодна з уласнымі здольнасцямі, разам з адпаведнай чалавечай сталасцю набывалі таксама дух Евангелля і цесную сувязь з Хрыстом.

Кан. 245 – § 1. Праз духоўную фармацыю алюмны павінны стаць здольнымі да плённага выконвання пастырскай паслугі і настаўленымі ў місійным духу, разумеючы, што паслуга, якая выконваецца заўсёды з жывой верай і любоўю, спрыяе іх уласнаму асвячэнню; няхай яны таксама вучацца выпрацоўваць тыя цноты, якія маюць вялікае значэнне ў чалавечым грамадстве, такім чынам, каб дасягнуць належнай гармоніі паміж чалавечымі і звышпрыроднымі каштоўнасцямі.

§ 2. Алюмны павінны атрымаць такую фармацыю, каб, прасякнутыя любоўю да Хрыстовага Касцёла, былі звязаны пакорнай і сыноўняй любоўю з Рымскім Пантыфікам, наступнікам святога Пятра, былі прыхільныя ўласнаму біскупу ў якасці яго

верных супрацоўнікаў і працавалі ў згодзе са сваімі братамі; праз сумеснае жыццё ў семінарыі, будуючы сяброўства і лучнасць з іншымі, яны павінны падрыхтавацца да братэрскай еднасці з дыяцэзіяльным прэзбітэрыем, удзельнікамі якога яны будуць у служэнні Касцёла.

Кан. 246 – § 1. Цэлебрацыя Эўхарыстыі павінна быць цэнтрам усяго жыцця семінарыі, каб алюмны, штодзённа прымаючы ўдзел у самой любові Хрыста, чэрпалі перадусім з гэтай найглыбейшай крыніцы моц духу для апостальскай працы і свайго духоўнага жыцця.

§ 2. Алюмны павінны быць падрыхтаваны да цэлебрацыі Літургіі гадзінаў, праз якую Божыя слугі ад імя Касцёла моляцца Богу не толькі за ўвесь даверaны ім народ, але і за цэлы свет.

§ 3. Трэба ажыўляць культ Найсвяцейшай Панны Марыі, між іншым праз марыйны Ружанец, духоўнае разважанне і іншыя пабожныя практыкаванні, з дапамогай якіх алюмны набываюць дух малітвы і атрымліваюць узмацненне ва ўласным пакліканні.

§ 4. Алюмны павінны быць прызвычаены да частага карыстання з сакрамэнту пакаяння і рэкамендуецца, каб кожны меў кіраўніка свайго духоўнага жыцця, пры гэтым выбранага свабодна, перад якім мог бы з поўным даверам адкрываць сваё сумленне.

§ 5. Алюмны павінны кожны год удзельнічаць у духоўных практыкаваннях.

Кан. 247 – § 1. Праз адпаведнае выхаванне яны павінны быць падрыхтаваны да захоўвання стану цэлібату і павінны навучыцца цаніць яго як асаблівы Божы дар.

§ 2. Трэба адпаведным чынам паведамляць алюмнаў аб абавязках і клопатах,

operam praestent; per vitam in seminario communem atque per amicitiae coniunctionisque necessitudinem cum aliis excultam praeparentur ad fraternam unionem cum dioecesano presbyterio, cuius in Ecclesiae servitio erunt consortes.

Can. 246 – § 1. Celebratio Eucharistica centrum sit totius vitae seminarii, ita ut cotidie alumni, ipsam Christi caritatem participantes, animi robur pro apostolico labore et pro vita sua spirituali praesertim ex hoc ditissimo fonte hauriant.

§ 2. Efformentur ad celebrationem liturgiae horarum, qua Dei ministri, nomine Ecclesiae pro toto populo sibi commisso, immo pro universo mundo, Deum deprecantur.

§ 3. Foveantur cultus Beatae Mariae Virginis etiam per mariale rosarium, oratio mentalis aliaque pietatis exercitia, quibus alumni spiritum orationis acquirant atque vocationis suae robur consequantur.

§ 4. Ad sacramentum paenitentiae frequenter accedere assuescant alumni, et commendatur ut unusquisque habeat moderatorem suae vitae spiritualis libere quidem electum, cui confidenter conscientiam aperire possit.

§ 5. Singulis annis alumni exercitiis spiritualibus vacent.

Can. 247 – § 1. Ad servandum statum caelibatus congrua educatione praeparentur, eumque ut peculiare Dei donum in honore habere discant.

§ 2. De officiis et oneribus quae ministris sacris Ecclesiae propria sunt,

alumni debite reddantur certiores, nulla vitae sacerdotalis difficultate reticita.

Can. 248 – Institutio doctrinalis tradenda eo spectat, ut alumni, una cum cultura generali necessitatibus loci ac temporis consentanea, amplam atque solidam acquirant in disciplinis sacris doctrinam, ita ut, propria fide ibi fundata et inde nutrita, Evangelii doctrinam hominibus sui temporis apte, ratione eorundem ingenio accommodata, nuntiare valeant.

Can. 249 – Institutionis sacerdotalis Ratione provideatur ut alumni non tantum accurate linguam patriam edoceantur, sed etiam linguam latinam bene calleant necnon congruam habeant cognitionem alienarum linguarum, quarum scientia ad eorum formationem aut ad ministerium pastorale exercendum necessaria vel utilis videatur.

Can. 250 – Quae in ipso seminario philosophica et theologica studia ordinantur, aut successive aut coniuncte peragi possunt, iuxta institutionis sacerdotalis Rationem; eadem completum saltem sexennium complectantur, ita quidem ut tempus philosophicis disciplinis dedicandum integrum biennium, studiis vero theologicis integrum quadriennium adaequet.

Can. 251 – Philosophica institutio, quae innixa sit oportet patrimonio philosophico perenniter valido, et rationem etiam habeat philosophicae investigationis progredientis aetatis, ita tradatur, ut alumnorum formationem humanam perficiat, mentis aciem provehat, eosque ad studia theologica peragenda aptiores reddat.

Can. 252 – § 1. Institutio theologica, in lumine fidei, sub Magisterii ductu,

уласцівых для святых служыцеляў Касцёла, не хаваючы ніякіх цяжкасцяў святарскага жыцця.

Кан. 248 – Навуковая падрыхтоўка павінна адбывацца такім чынам, каб алюмны разам з агульнай культурай, адпаведнай патрабаванням месца і часу, набывалі такія шырокія і грунтоўныя веды ў святых навуках, каб, абапіраючыся на іх і ўмацоўваючы імі сваю веру, маглі абвяшчаць вучэнне Евангелля сучасным людзям адпаведным і дастасаваным да іх спосабу мыслення чынам.

Кан. 249 – У Плане падрыхтоўкі святароў павінна быць прадугледжана, каб алюмны не толькі дакладна вывучылі родную мову, але таксама добра ведалі лацінскую мову і ў дастатковай ступені валодалі замежнымі мовамі, якія могуць быць неабходнымі або карыснымі для іх падрыхтоўкі ці ажыццяўлення пастырскай паслугі.

Кан. 250 – Філасофскія і тэалагічныя навукі, якія вывучаюцца ў самой семінарыі, могуць выкладацца як паслядоўна, так і адначасова, згодна з прадпісаннямі Плана падрыхтоўкі святароў; яны павінны займаць прынамсі шэсць поўных гадоў, каб пры гэтым на вывучэнне філасофскіх навук былі прысвечаны поўныя два гады, а на вывучэнне тэалагічных — поўныя чатыры.

Кан. 251 – Філасофская адукацыя, якая павінна засноўвацца на вечнай філасофскай спадчыне, а таксама браць пад увагу сучасныя філасофскія даследаванні, павінна быць арганізавана такім чынам, каб яна ўдасканальвала гуманітарную фармацыю алюмнаў, развівала розум і рыхтавала іх да вывучэння тэалагічных навук.

Кан. 252 – § 1. Тэалагічная адукацыя павінна быць арганізавана ў святле веры пад

кіраваннем Магістэрыя такім чынам, каб алюмны пазналі поўную каталіцкую навуку, заснаваную на Божым Аб'яўленні, знаходзілі ў ёй крыніцу для ўласнага духоўнага жыцця і, выконваючы сваю паслугу, умелі адпаведным чынам яе абвяшчаць і абараняць.

§ 2. З асаблівай стараннасцю трэба навучаць алюмнаў Святому Пісанню такім чынам, каб яны набылі дакладныя веды аб усім Святым Пісанні.

§ 3. Трэба праводзіць лекцыі па дагматычнай тэалогіі, заўсёды заснаваныя на запісаным Божым слове ў лучнасці са Святой Традыцыяй, дзякуючы чаму алюмны павінны навучыцца глыбей спасцігаць таямніцу збаўлення, асабліва беручы за прыклад настаўніка — св. Тамаша; таксама павінны праводзіцца лекцыі па маральнай і пастырскай тэалогіі, кананічным праве, літургіцы, гісторыі Касцёла і іншых навуках, дапаможных і спецыяльных, згодна з Планам падрыхтоўкі святароў.

Кан. 253 – § 1. Да задання выкладчыка філасофскіх, тэалагічных або юрыдычных навук біскуп ці зацікаўленыя біскупы павінны прызначаць толькі тых, хто адзначаецца цнотамі і атрымаў ступень доктара або ліцэнзіята ва ўніверсітэце або на факультэце, прызнаных Святой Сталіцай.

§ 2. Трэба паклапаціцца аб тым, каб было прызначана столькі асобных выкладчыкаў, колькі патрэбна для навучання Святому Пісанню, дагматычнай тэалогіі, маральнай тэалогіі, літургіцы, філасофіі, кананічнаму праву, гісторыі Касцёла і іншым навукам, якія выкладаюцца згодна з уласнымі метадамі.

§ 3. Выкладчык, які цяжка занядбаў сваё заданне, павінен быць звольнены з пасады той уладай, аб якой гаворыцца ў § 1.

ita impertiatur, ut alumni integram doctrinam catholicam, divina Revelatione innixam, cognoscant, propriae vitae spiritualis reddant alimentum eamque, in ministerio exercendo, rite annuntiare ac tueri valeant.

§ 2. In sacra Scriptura peculiari diligentia erudiantur alumni, ita ut totius sacrae Scripturae conspectum acquirant.

§ 3. Lectiones habeantur theologiae dogmaticae, verbo Dei scripto una cum sacra Traditione semper innixae, quarum ope alumni mysteria salutis, s. Thoma praesertim magistro, intimius penetrare addiscant, itemque lectiones theologiae moralis et pastoralis, iuris canonici, liturgiae, historiae ecclesiasticae, necnon aliarum disciplinarum, auxiliarium atque specialium, ad normam praescriptorum institutionis sacerdotalis Rationis.

Can. 253 – § 1. Ad magistri munus in disciplinis philosophicis, theologicis et iuridicis, ab Episcopo aut ab Episcopis, quorum interest, ii tantum nominentur qui, virtutibus praestantes, laurea doctorali aut licentia potiti sunt in universitate studiorum aut facultate a Sancta Sede recognita.

§ 2. Curetur ut distincti totidem nominentur magistri qui doceant sacram Scripturam, theologiam dogmaticam, theologiam moralem, liturgiam, philosophiam, ius canonicum, historiam ecclesiasticam, aliasque, quae propria methodo tradendae sunt, disciplinas.

§ 3. Magister qui a munere suo graviter deficiat, ab auctoritate, de qua in § 1, amoveatur.

Can. 254 – § 1. Magistri in disciplinis tradendis de intima universae doctrinae fidei unitate et harmonia iugiter solliciti sint, ut unam scientiam alumni se discere experiantur; quo aptius id obtineatur, adsit in seminario qui integram studiorum ordinationem moderetur.

§ 2. Ita alumni edoceantur, ut et ipsi habiles fiant ad quaestiones aptis investigationibus propriis et scientifica methodo examinandas; habeantur igitur exercitationes, in quibus, sub moderamine magistrorum, alumni proprio labore studia quaedam persolvere discant.

Кан. 254 – § 1. Выкладаючы свае прадметы, выкладчыкі павінны клапаціцца аб унутранай еднасці і гармоніі ўсёй навукі веры, каб алюмны разумелі, што набываюць адзіныя веды; каб гэтага было лягчэй дасягнуць, у семінарыі павінна быць асоба, якая кіруе агульнай праграмай навучання.

§ 2. Алюмнаў трэба вучыць так, каб яны былі здольныя самастойна даследаваць розныя пытанні шляхам уласных пошукаў, выкарыстоўваючы навуковы метад; таму трэба прадугледзець такія заняткі, на якіх алюмны пад кіраваннем выкладчыкаў вучыліся б самастойна праводзіць акрэсленыя даследаванні.

Can. 255 – Licet universa alumnorum in seminario formatio pastoralem finem persequatur, institutio stricte pastoralis in eodem ordinetur, qua alumni principia et artes addiscant quae, attentis quoque loci ac temporis necessitatibus, ad ministerium Dei populum docendi, sanctificandi et regendi exercendum pertineant.

Кан. 255 – Пры тым, што ўся фармацыя алюмнаў у семінарыі мае пастырскую скіраванасць, у ёй павінна быць арганізавана асобная пастырская падрыхтоўка, дзякуючы якой алюмны маглі б навучыцца — з улікам патрэбаў месца і часу — прынцыпам і навыкам, неабходным у выкананні паслугі навучання, асвячэння і кіравання Божым народам.

Can. 256 – § 1. Diligenter instruantur alumni in iis quae peculiari ratione ad sacrum ministerium spectant, praesertim in arte catechetica et homiletica exercenda, in cultu divino peculiarique modo in sacramentis celebrandis, in commercio cum hominibus, etiam non catholicis vel non credentibus, habendo, in paroecia administranda atque in ceteris muneribus adimplendis.

§ 2. Edoceantur alumni de universae Ecclesiae necessitatibus, ita ut sollicitudinem habeant de vocationibus promovendis, de quaestionibus missionalibus, oecumenicis necnon de aliis, socialibus quoque, urgentioribus.

Кан. 256 – § 1. Трэба старанна настаўляць алюмнаў у тым, што асаблівым чынам датычыць святой паслугі, перадусім ва ўменні катэхізаваць і прамаўляць гамілііі, у Божым кульце і асабліва ў цэлебрацыі сакрамэнтаў, у адносінах з людзьмі, у тым ліку з некатолікамі або няверуючымі, у кіраванні парафіяй і ў выкананні іншых заданняў.

§ 2. Алюмнаў трэба знаёміць з патрэбамі паўсюднага Касцёла, каб яны клапаціліся аб пакліканнях, аб місійных справах, экуменічных і іншых, таксама і аб грамадскіх справах.

Can. 257 – § 1. Alumnorum institutioni ita provideatur, ut non tantum

Кан. 257 – § 1. Падрыхтоўка алюмнаў павінна адбывацца такім чынам, каб яны

клапаціліся не толькі аб партыкулярным Касцёле, для служэння ў якім яны будуць інкардынаваны, але таксама аб усім Касцёле і былі гатовыя прысвяціць сябе партыкулярным Касцёлам, якія знаходзяцца ў цяжкай і неадкладнай патрэбе.

§ 2. Дыяцэзіяльны біскуп павінен паклапаціцца аб тым, каб духоўныя асобы, якія маюць намер перавесціся са свайго партыкулярнага Касцёла ў партыкулярны Касцёл іншага рэгіёна, атрымалі адпаведную падрыхтоўку для ажыццяўлення там святой паслугі, гэта значыць, каб вывучалі мову дадзенага рэгіёна, знаёміліся з яго ўстановамі, сацыяльнымі ўмовамі, правіламі і звычаямі.

Кан. 258 – Для таго, каб алюмны маглі набыць досвед у ажыццяўленні апостальства, падчас навучання, а асабліва на канікулах, яны павінны быць уведзены ў пастырскую дзейнасць праз практыку, якую заўсёды павінен праводзіць дасведчаны святар, акрэсленую ардынарыем і дастасаваную да ўзросту алюмнаў і мясцовых умоваў.

Кан. 259 – § 1. Вырашэнне пытанняў, якія датычаць вышэйшых органаў кіравання і адміністрацыі семінарыі, належыць да кампетэнцыі дыяцэзіяльнага біскупа або — калі гаворка ідзе пра міждыяцэзіяльную семінарыю — усіх зацікаўленых біскупаў.

§ 2. Дыяцэзіяльны біскуп або — калі гаворка ідзе пра міждыяцэзіяльную семінарыю — усе зацікаўленыя біскупы павінны часта асабіста наведваць семінарыю, сачыць за падрыхтоўкай сваіх алюмнаў, а таксама за філасофскім і тэалагічным навучаннем, якое адбываецца ў семінарыі, і складаць асабісты погляд на пакліканне, здольнасці, пабожнасць і поспехі алюмнаў, перадусім маючы на ўвазе іх будучае пасвячэнне.

Ecclesiae particularis in cuius servitio incardinentur, sed universae quoque Ecclesiae sollicitudinem habeant, atque paratos se exhibeant Ecclesiis particularibus, quarum gravis urgeat necessitas, sese devovere.

§ 2. Curet Episcopus dioecesanus ut clerici, a propria Ecclesia particulari ad Ecclesiam particularem alterius regionis transmigrare intendentes, apte praeparentur ad ibidem sacrum ministerium exercendum, ut scilicet et linguam regionis addiscant, et eiusdem institutorum, condicionum socialium, usuum et consuetudinum intellegentiam habeant.

Can. 258 – Ut apostolatus exercendi artem in opere ipso etiam addiscant, alumni, studiorum curriculo decurrente, praesertim vero feriarum tempore, praxi pastorali initientur per opportunas, sub moderamine semper sacerdotis periti, exercitationes, alumnorum aetati et locorum condicioni aptatas, de iudicio Ordinarii determinandas.

Can. 259 – § 1. Episcopo dioecesano aut, si de seminario interdioecesano agatur, Episcopis quorum interest, competit, quae ad seminarii superius regimen et administrationem spectant, decernere.

§ 2. Episcopus dioecesanus aut, si de seminario interdioecesano agatur, Episcopi quorum interest, frequenter seminarium ipsi visitent, in formationem suorum alumnorum necnon in institutionem, quae in eodem tradatur, philosophicam et theologicam invigilent, et de alumnorum vocatione, indole, pietate ac profectu cognitionem sibi comparent, maxime intuitu sacrarum ordinationum conferendarum.

Can. 260 – Rectori, cuius est cotidianum moderamen curare seminarii, ad normam quidem institutionis sacerdotalis Rationis ac seminarii ordinationis, omnes in propriis muneribus adimplendis obtemperare debent.

Кан. 260 – У выкананні сваіх заданняў усе павінны быць паслухмянымі рэктару, які павінен клапаціцца аб кіраванні штодзённым жыццём семінарыі паводле нормаў Плана падрыхтоўкі святароў і распарадку семінарыі.

Can. 261 – § 1. Seminarii rector itemque, sub eiusdem auctoritate, moderatores et magistri pro parte sua curent ut alumni normas Ratione institutionis sacerdotalis necnon seminarii ordinatione praescriptas adamussim servent.

Кан. 261 – § 1. Рэктар семінарыі, а таксама падначаленыя яму мадэратары і выкладчыкі павінны ва ўласных межах клапаціцца аб тым, каб алюмны дакладна захоўвалі нормы Плана падрыхтоўкі святароў і распарадку семінарыі.

§ 2. Sedulo provideant seminarii rector atque studiorum moderator ut magistri suo munere rite fungantur, secundum praescripta Rationis institutionis sacerdotalis ac seminarii ordinationis.

§ 2. Рэктар семінарыі і мадэратар навучання павінны сачыць за тым, каб выкладчыкі належным чынам выконвалі свае заданні згодна з прадпісаннямі Плана падрыхтоўкі святароў і распарадку семінарыі.

Can. 262 – Exemptum a regimine paroeciali seminarium esto: et pro omnibus qui in seminario sunt, parochi officium, excepta materia matrimoniali et firmo praescripto can. 985, obeat seminarii rector eiusve delegatus.

Кан. 262 – Семінарыя павінна быць выключана з парафіяльнага кіравання: у адносінах да ўсіх, хто ў ёй знаходзіцца, абавязкі пробашча павінен выконваць рэктар або яго дэлегат, за выключэннем сужэнскіх спраў і захоўваючы прадпісанне кан. 985.

Can. 263 – Episcopus dioecesanus vel, si de seminario interdioecesano agatur, Episcopi quorum interest, pro parte ab eis communi consilio determinata, curare debent ut provideatur seminarii constitutioni et conservationi, alumnorum sustentationi necnon magistrorum remunerationi aliisque seminarii necessitatibus.

Кан. 263 – Дыяцэзіяльны біскуп або — калі гаворка ідзе пра міждыяцэзіяльную семінарыю — зацікаўленыя біскупы ў долях, супольна імі акрэсленых, павінны клапаціцца аб паступленні сродкаў, патрэбных для заснавання і захоўвання семінарыі, утрымання алюмнаў, а таксама для ўзнагароджвання выкладчыкаў і іншых патрэбаў семінарыі.

Can. 264 – § 1. Ut seminarii necessitatibus provideatur, praeter stipem de qua in can. 1266, potest Episcopus in dioecesi tributum imponere.

Кан. 264 – § 1. Для таго, каб забяспечыць патрэбы семінарыі, апрача збірання ахвяраванняў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1266, біскуп можа ўстанавіць у дыяцэзіі падатак.

§ 2. Tributo pro seminario obnoxiae sunt cunctae personae iuridicae ecclesiasticae etiam privatae, quae sedem in dioecesi habeant, nisi solis

§ 2. Падаткам на карысць семінарыі абкладаюцца ўсе касцёльныя юрыдычныя асобы, у тым ліку прыватныя, якія маюць сядзібу ў дыяцэзіі, калі яны не ўтрымліва-

юцца выключна з міласціны або ў іх не знаходзіцца актуальна калегія навучэнцаў ці выкладчыкаў, якая служыць агульнаму дабру Касцёла; гэты падатак павінен быць паўсюдны і прапарцыянальны да даходаў тых, на каго распаўсюджваецца, а таксама суразмерны патрэбам семінарыі.

eleemosynis sustententur aut in eis collegium discentium vel docentium ad commune Ecclesiae bonum promovendum actu habeatur; huiusmodi tributum debet esse generale, reditibus eorum qui eidem obnoxii sunt proportionatum, atque iuxta necessitates seminarii determinatum.

Раздзел II
Прыналежнасць духоўных асобаў, іншымі словамі — інкардынацыя

Caput II
De clericorum adscriptione seu incardinatione

Кан. 265 – Кожная духоўная асоба павінна быць інкардынавана або ў адзін з партыкулярных Касцёлаў ці ў персанальную прэлатуру, або ў адзін з інстытутаў кансэкраванага жыцця ці ў таварыства, якія маюць такое паўнамоцтва, або ў святарскае публічнае аб'яднанне, якое атрымала такое паўнамоцтва ад Апостальскай Сталіцы, такім чынам, каб ні ў якім выпадку не было духоўных асобаў нікому не падначаленых, іншымі словамі — бадзяжных.

Can. 265 – Quemlibet clericum oportet esse incardinatum aut alicui Ecclesiae particulari vel praelaturae personali, aut alicui instituto vitae consecratae vel societati hac facultate praeditis, aut etiam alicui Consociationi publicae clericali quae eandem faculatem ab Apostolica Sede obtinuerit, ita ut clerici acephali seu vagi minime admittantur.

Кан. 266 – § 1. Той, хто прымае дыяканскае пасвячэнне, становіцца духоўнай асобай і інкардынуецца ў партыкулярны Касцёл ці персанальную прэлатуру, для служэння ў якіх быў вылучаны.

§ 2. Член манаскага інстытута, які склаў вечныя абяцанні, або член святарскага таварыства апостальскага жыцця, канчаткова ў яго ўключаны, праз прыняцце дыяканскага пасвячэння інкардынуецца ў якасці духоўнай асобы ў гэты інстытут або таварыства, калі ў адносінах да таварыстваў іх канстытуцыі не прадугледжваюць іншае.

§ 3. Член секулярнага інстытута праз прыняцце дыяканскага пасвячэння інкардынуецца ў партыкулярны Касцёл, для служэння ў якім быў вылучаны, калі з даз-

Can. 266 – § 1. Per receptum diaconatum aliquis fit clericus et incardinatur Ecclesiae particulari vel praelaturae personali pro cuius servitio promotus est.

§ 2. Sodalis in instituto religioso a votis perpetuis professus aut societati clericali vitae apostolicae definitive incorporatus, per receptum diaconatum incardinatur tamquam clericus eidem instituto aut societati, nisi ad societates quod attinet aliter ferant constitutiones.

§ 3. Sodalis instituti saecularis per receptum diaconatum incardinatur Ecclesiae particulari pro cuius servitio promotus est, nisi vi concessionis

Sedis Apostolicae ipsi instituto incardinetur.

Can. 267 – § 1. Ut clericus iam incardinatus alii Ecclesiae particulari valide incardinetur, ab Episcopo dioecesano obtinere debet litteras ab eodem subscriptas excardinationis; et pariter ab Episcopo dioecesano Ecclesiae particularis cui se incardinari desiderat, litteras ab eodem subscriptas incardinationis.

§ 2. Excardinatio ita concessa effectum non sortitur nisi incardinatione obtenta in alia Ecclesia particulari.

Can. 268 – § 1. Clericus qui a propria Ecclesia particulari in aliam legitime transmigraverit, huic Ecclesiae particulari, transacto quinquennio, ipso iure incardinatur, si talem voluntatem in scriptis manifestaverit tum Episcopo dioecesano Ecclesiae hospitis tum Episcopo dioecesano proprio, neque horum alteruter ipsi contrariam scripto mentem intra quattuor menses a receptis litteris significaverit.

§ 2. Per admissionem perpetuam aut definitivam in institutum vitae consecratae aut in societatem vitae apostolicae, clericus qui, ad normam can. 266, § 2, eidem instituto aut societati incardinatur, a propria Ecclesia particulari excardinatur.

Can. 269 – Ad incardinationem clerici Episcopus dioecesanus ne deveniat nisi:

1° necessitas aut utilitas suae Ecclesiae particularis id exigat, et salvis iuris praescriptis honestam sustentationem clericorum respicientibus;

волу Апостальскай Сталіцы ён не інкардынуецца ў сам інстытут.

Кан. 267 – § 1. Для таго, каб ужо інкардынаваная духоўная асоба магла быць дзейсна інкардынавана ў іншы партыкулярны Касцёл, яна павінна адначасова атрымаць экскардынацыйны ліст, падпісаны дыяцэзіяльным біскупам, і інкардынацыйны ліст, падпісаны дыяцэзіяльным біскупам партыкулярнага Касцёла, у якім яна жадае быць інкардынавана.

§ 2. Удзеленая ў такім парадку экскардынацыя не выклікае наступстваў, пакуль не адбудзецца інкардынацыя ў іншы партыкулярны Касцёл.

Кан. 268 – § 1. Духоўная асоба, якая легітымна перавялася з уласнага партыкулярнага Касцёла ў іншы, праз пяць гадоў на моцы самога права інкардынуецца ў гэты партыкулярны Касцёл, калі пісьмова выявіць такую волю як дыяцэзіяльнаму біскупу прымаючага Касцёла, так і ўласнаму дыяцэзіяльнаму біскупу, і пры гэтым ніводзін з іх на працягу чатырох месяцаў пасля атрымання прашэння не адкажа пісьмовай адмовай.

§ 2. Праз вечнае або канчатковае прыняцце ў інстытут кансэкраванага жыцця або ў таварыства апостальскага жыцця духоўная асоба, якая інкардынуецца ў гэты інстытут або таварыства згодна з нормай кан. 266 § 2, экскардынуецца з уласнага партыкулярнага Касцёла.

Кан. 269 – Дыяцэзіяльны біскуп не павінен здзяйсняць інкардынацыю, акрамя выпадку, калі:

1° гэтага патрабуе неабходнасць або карысць яго партыкулярнага Касцёла і будуць захаваны прадпісанні права, якія датычаць годнага ўтрымання духоўных асобаў;

2° на падставе легітымнага дакумента ўпэўніцца, што экскардынацыя была ўдзелена і, акрамя гэтага, атрымае — з захаваннем, калі трэба, таямніцы — ад біскупа, які экскардынуе, адпаведнае пасведчанне аб жыцці, паводзінах і ўзроўні адукацыі духоўнай асобы;

3° духоўная асоба звернецца да гэтага дыяцэзіяльнага біскупа з пісьмовым прашэннем аб прысвячэнні сябе служэнню ў новым партыкулярным Касцёле згодна з прадпісаннямі права.

2° ex legitimo documento sibi constiterit de concessa excardinatione, et habuerit praeterea ab Episcopo dioecesano excardinanti, sub secreto si opus sit, de clerici vita, moribus ac studiis opportuna testimonia;

3° clericus eidem Episcopo dioecesano scripto declaraverit se novae Ecclesiae particularis servitio velle addici ad normam iuris.

Кан. 270 – Экскардынацыя можа быць удзелена дазволеным чынам толькі па прычыне, якой з'яўляецца карысць Касцёла або дабро самой духоўнай асобы; аднак не можа быць адмоўлена ў экскардынацыі, калі не існуюць важкія прычыны; пры гэтым духоўнай асобе, якая лічыць сябе пакрыўджанай і знойдзе біскупа, гатовага яе прыняць, дазваляецца звярнуцца з рэкурсам супраць такога рашэння.

Can. 270 – Excardinatio licite concedi potest iustis tantum de causis, quales sunt Ecclesiae utilitas aut bonum ipsius clerici; denegari autem non potest nisi exstantibus gravibus causis; licet tamen clerico, qui se gravatum censuerit et Episcopum receptorem invenerit, contra decisionem recurrere.

Кан. 271 – § 1. Акрамя выпадку, калі ва ўласным партыкулярным Касцёле існуе сапраўдная патрэба, дыяцэзіяльны біскуп не павінен адмаўляць у дазволе на перавод тым духоўным асобам, аб якіх ведае, што яны здольныя і падрыхтаваныя і імкнуцца ў рэгіёны, дзе адчуваецца вялікі недахоп духавенства, каб ажыццяўляць там святую паслугу; аднак ён павінен паклапаціцца аб тым, каб праз пісьмовае пагадненне з дыяцэзіяльным біскупам таго месца, куды скіроўваюцца гэтыя духоўныя асобы, вызначыць іх правы і абавязкі.

Can. 271 – § 1. Extra casum verae necessitatis Ecclesiae particularis propriae, Episcopus dioecesanus ne deneget licentiam transmigrandi clericis, quos paratos sciat atque aptos aestimet qui regiones petant gravi cleri inopia laborantes, ibidem sacrum ministerium peracturi; prospiciat vero ut per conventionem scriptam cum Episcopo dioecesano loci, quem petunt, iura et officia eorundem clericorum stabiliantur.

§ 2. Дыяцэзіяльны біскуп можа ўдзяліць сваім духоўным асобам дазвол на перавод у іншы партыкулярны Касцёл на вызначаны тэрмін, які можна шмат разоў працягваць, аднак з умовай, што гэтыя духоўныя асобы застануцца інкардынаванымі ва

§ 2. Episcopus dioecesanus licentiam ad aliam Ecclesiam particularem transmigrandi concedere potest suis clericis ad tempus praefinitum, etiam pluries renovandum, ita tamen ut iidem clerici propriae Ecclesiae par-

ticulari incardinati maneant, atque in eandem redeuntes omnibus gaudeant iuribus, quae haberent si in ea sacro ministerio addicti fuissent.

§ 3. Clericus qui legitime in aliam Ecclesiam particularem transierit propriae Ecclesiae manens incardinatus, a proprio Episcopo dioecesano iusta de causa revocari potest, dummodo serventur conventiones cum altero Episcopo initae atque naturalis aequitas; pariter, iisdem condicionibus servatis, Episcopus dioecesanus alterius Ecclesiae particularis iusta de causa poterit eidem clerico licentiam ulterioris commorationis in suo territorio denegare.

Can. 272 – Excardinationem et incardinationem, itemque licentiam ad aliam Ecclesiam particularem transmigrandi concedere nequit Administrator dioecesanus, nisi post annum a vacatione sedis episcopalis, et cum consensu collegii consultorum.

ўласны Касцёл і пасля вяртання ў яго будуць карыстацца ўсімі правамі, якія мелі б у тым выпадку, калі б прысвяцілі сябе святой паслузе ў гэтым Касцёле.

§ 3. Духоўная асоба, якая легітымна перамясцілася ў іншы партыкулярны Касцёл і пры гэтым засталася інкардынаванай ва ўласны Касцёл, па справядлівай прычыне можа быць адклікана ўласным дыяцэзіяльным біскупам, калі толькі пры гэтым будуць захоўвацца пагадненні з іншым біскупам і належная адпаведнасць; таксама дыяцэзіяльны біскуп іншага партыкулярнага Касцёла па справядлівай прычыне можа адмовіць гэтай духоўнай асобе ў дазволе на далейшае прабыванне на сваёй тэрыторыі.

Кан. 272 – На экскардынацыю і інкардынацыю, а таксама на перавод у іншы партыкулярны Касцёл не можа даць дазвол дыяцэзіяльны адміністратар, калі не пасля таго, як біскупская сталіца заставалася вакантнай на працягу года і са згоды Калегіі Кансультантаў.

Caput III
De clericorum obligationibus et iuribus

Can. 273 – Clerici speciali obligatione tenentur Summo Pontifici et suo quisque Ordinario reverentiam et oboedientiam exhibendi.

Can. 274 – § 1. Soli clerici obtinere possunt officia ad quorum exercitium requiritur potestas ordinis aut potestas regiminis ecclesiastici.

§ 2. Clerici, nisi legitimo impedimento excusentur, munus, quod ipsis a suo Ordinario commissum fuerit, suscipere ac fideliter adimplere tenentur.

Раздзел III
Абавязкі і правы духоўных асобаў

Кан. 273 – Духоўныя асобы маюць асобы абавязак аказваць пашану і паслухмянасць Найвышэйшаму Пантыфіку і кожная з іх свайму ардынарыю.

Кан. 274 – § 1. Толькі духоўныя асобы могуць займаць пасады, для выконвання якіх патрабуецца ўлада пасвячэння або ўлада касцёльнага кіравання.

§ 2. Духоўныя асобы маюць абавязак прыняць і верна выконваць заданні, ускладзеныя на іх ардынарыем, калі іх не апраўдвае наяўнасць легітымнай перашкоды.

Кан. 275 – § 1. Духоўныя асобы, выконваючы адну і тую ж справу, а менавіта будаванне Хрыстовага цела, павінны быць з'яднаныя паміж сабой повязямі братэрства і малітвы і супрацоўнічаць паміж сабой згодна з прадпісаннямі партыкулярнага права.

§ 2. Духоўныя асобы павінны прызнаваць і падтрымліваць тую місію, якую свецкія асобы, кожная з іх паводле сваіх сіл і магчымасцяў, выконваюць у Касцёле і свеце.

Кан. 276 – § 1. У сваім жыцці духоўныя асобы асабліва абавязаны імкнуцца да святасці, паколькі яны — на новай падставе кансэкраваныя Богу праз прыняцце пасвячэння — становяцца распарадчыкамі Божых таямніц для служэння Яго народу.

§ 2. Каб дасягнуць гэтай дасканаласці:

1° яны павінны перадусім верна і нястомна выконваць абавязкі пастырскай паслугі;

2° павінны насычаць сваё духоўнае жыццё з двух сталоў — Святога Пісання і Эўхарыстыі; таму святары вельмі заахвочваюцца да штодзённага складання эўхарыстычнай Ахвяры, а дыяканы — да штодзённага ўдзелу ў гэтай Ахвяры;

3° на святароў, а таксама на дыяканаў, якія імкнуцца да прэзбітэрату, ускладаецца абавязак штодзённа здзяйсняць Літургію гадзінаў па ўласных зацверджаных літургічных кнігах; пастаянныя дыяканы павінны здзяйсняць тую частку Літургіі гадзінаў, якая вызначана Канферэнцыяй Біскупаў;

4° таксама яны павінны прымаць удзел у духоўным засяроджванні, згодна з прадпісаннямі партыкулярнага права;

5° яны заахвочваюцца да рэгулярнага прысвячэння часу на разважанне, частага карыстання з сакрамэнту пака-

Can. 275 – § 1. Clerici, quippe qui omnes ad unum conspirent opus, ad aedificationem nempe Corporis Christi, vinculo fraternitatis et orationis inter se uniti sint, et cooperationem inter se prosequantur, iuxta iuris particularis praescripta.

§ 2. Clerici missionem agnoscant et promoveant, quam pro sua quisque parte laici in Ecclesia et in mundo exercent.

Can. 276 – § 1. In vita sua ducenda ad sanctitatem persequendam peculiari ratione tenentur clerici, quippe qui, Deo in ordinis receptione novo titulo consecrati, dispensatores sint mysteriorum Dei in servitium Eius populi.

§ 2. Ut hanc perfectionem persequi valeant:

1° imprimis ministerii pastoralis officia fideliter et indefesse adimpleant;

2° duplici mensa sacrae Scripturae et Eucharistiae vitam suam spiritualem nutriant; enixe igitur sacerdotes invitantur ut cotidie Sacrificium eucharisticum offerant, diaconi vero ut eiusdem oblationem cotidie participent;

3° obligatione tenentur sacerdotes necnon diaconi ad presbyteratum aspirantes cotidie liturgiam horarum persolvendi secundum proprios et probatos liturgicos libros; diaconi autem permanentes eandem persolvant pro parte ab Episcoporum conferentia definita;

4° pariter tenentur ad vacandum recessibus spiritualibus, iuxta iuris particularis praescripta;

5° sollicitantur ut orationi mentali regulariter incumbant, frequenter ad paenitentiae sacramen-

tum accedant, Deiparam Virginem peculiari veneratione colant, aliisque mediis sanctificationis utantur communibus et particularibus.

яння, аддавання асаблівай пашаны Багародзіцы Панне і карыстання з іншых сродкаў асвячэння — як паўсюдных, так і мясцовых.

Can. 277 – § 1. Clerici obligatione tenentur servandi perfectam perpetuamque propter Regnum coelorum continentiam, ideoque ad coelibatum adstringuntur, quod est peculiare Dei donum, quo quidem sacri ministri indiviso corde Christo facilius adhaerere possunt atque Dei hominumque servitio liberius sese dedicare valent.

Кан. 277 – § 1. Духоўныя асобы абавязаны захоўваць дасканалае і пастаяннае ўстрыманне дзеля Нябеснага Валадарства, таму яны звязаны цэлібатам, які з'яўляецца асаблівым Божым дарам, дзякуючы якому святыя служыцелі могуць непадзеленым сэрцам лягчэй трымацца Хрыста і больш свабодна прысвячаць сябе служэнню Богу і людзям.

§ 2. Debita cum prudentia clerici se gerant cum personis, quarum frequentatio ipsorum obligationem ad continentiam servandam in discrimen vocare aut in fidelium scandalum vertere possit.

§ 2. Духоўныя асобы павінны з належнай развагай паводзіць сябе ў адносінах з тымі людзьмі, кантакты з якімі маглі б паражаць іх абавязку захоўваць устрыманне або стварацьспакусу для вернікаў.

§ 3. Competit Episcopo dioecesano ut hac de re normas statuat magis determinatas utque de huius obligationis observantia in casibus particularibus iudicium ferat.

§ 3. Дыяцэзіяльны біскуп можа ўстанаўліваць больш акрэсленыя нормы ў гэтай справе, а ў асобных выпадках — ацэньваць захаванне гэтага абавязку.

Can. 278 – § 1. Ius est clericis saecularibus sese consociandi cum aliis ad fines statui clericali congruentes prosequendos.

Кан. 278 – § 1. Секулярныя духоўныя асобы маюць права аб'ядноўвацца з іншымі для дасягнення мэтаў, адпаведных духоўнаму стану.

§ 2. Magni habeant clerici saeculares praesertim illas consociationes quae, statutis a competenti auctoritate recognitis, per aptam et convenienter approbatam vitae ordinationem et fraternum iuvamen, sanctitatem suam in ministerii exercitio fovent, quaeque clericorum inter se et cum proprio Episcopo unioni favent.

§ 2. Секулярныя духоўныя асобы павінны асабліва цаніць перадусім тыя аб'яднанні, якія — маючы праваныя кампетэнтнай уладай статуты — праз годны і належным чынам зацверджаны спосаб жыцця і братэрскую дапамогу садзейнічаюць дасягненню імі святасці ў ажыццяўленні паслугі, а таксама спрыяюць паглыбленню адзінства духоўных асобаў паміж сабой і з уласным біскупам.

§ 3. Clerici abstineant a constituendis aut participandis consociationibus, quarum finis aut actio cum obligationibus statui clericali propriis componi nequeunt vel diligentem muneris ipsis ab auctoritate ecclesia-

§ 3. Духоўныя асобы павінны ўстрымлівацца ад утварэння або ўдзелу ў такіх аб'яднаннях, мэты і дзейнасць якіх не сумяшчаюцца з абавязкамі духоўнага стану або могуць перашкодзіць у сумленным

выконванні заданняў, даручаных ім кампетэнтнай касцёльнай уладай.

Кан. 279 – § 1. Духоўныя асобы нават пасля прыняцця святарства павінны працягваць вывучэнне святых навук, трымаючыся вучэння, заснаванага на Святым Пісанні, перададзенага продкамі і паўсюдна прынятага ў Касцёле, перадусім так, як яно акрэсліваецца ў дакументах Сабораў і Рымскіх Пантыфікаў, пазбягаючы пры гэтым пустых навінак і фальшывых ведаў.

§ 2. Святары, паводле прадпісанняў права, пасля прыняцця прэзбітэрскага пасвячэння павінны ўдзельнічаць у пастырскіх занятках, а таксама ў тэрміны, вызначаныя тым жа правам, удзельнічаць у занятках, тэалагічных лекцыях або канферэнцыях, якія даюць ім магчымасць набыць больш поўныя веды ў святых навуках і пастырскіх метадах.

§ 3. Яны павінны таксама знаёміцца з іншымі навукамі, перадусім з тымі, якія звязаны са святымі навукамі, асабліва калі гэта дапамагае ажыццяўленню пастырскай паслугі.

Кан. 280 – Духоўныя асобы вельмі заахвочваюцца да вядзення якой-небудзь формы сумеснага жыцця; а там, дзе яна існуе, яе трэба па магчымасці захоўваць.

Кан. 281 – § 1. Духоўныя асобы, якія прысвячаюць сябе касцёльнай паслузе, заслугоўваюць на такое ўзнагароджанне, якое адпавядае іх становішчу, узяўшы пад увагу і сутнасць іх задання, і акалічнасці месца і часу, у такой меры, каб дазваляла ім заспакойваць свае жыццёвыя патрэбы і справядліва аплачваць працу тых асобаў, служэння якіх патрабуюць.

§ 2. Трэба таксама паклапаціцца аб тым, каб яны мелі такое сацыяльнае забеспячэнне, якое належным чынам задаволіць іх пастіса competenti commissi adimpletionem praepedire possunt.

Can. 279 – § 1. Clerici studia sacra, recepto etiam sacerdotio, prosequantur, et solidam illam doctrinam, in sacra Scriptura fundatam, a maioribus traditam et communiter ab Ecclesia receptam sectentur, uti documentis praesertim Conciliorum ac Romanorum Pontificum determinatur, devitantes profanas vocum novitates et falsi nominis scientiam.

§ 2. Sacerdotes, iuxta iuris particularis praescripta, praelectiones pastorales post ordinationem sacerdotalem instituendas frequentent atque, statutis eodem iure temporibus, aliis quoque intersint praelectionibus, conventibus theologicis aut conferentiis, quibus ipsis praebeatur occasio pleniorem scientiarum sacrarum et methodorum pastoralium cognitionem acquirendi.

§ 3. Aliarum quoque scientiarum, earum praesertim quae cum sacris conectuntur, cognitionem prosequantur, quatenus praecipue ad ministerium pastorale exercendum confert.

Can. 280 – Clericis valde commendatur quaedam vitae communis consuetudo; quae quidem, ubi viget, quantum fieri potest, servanda est.

Can. 281 – § 1. Clerici, cum ministerio ecclesiastico se dedicant, remunerationem merentur quae suae condicioni congruat, ratione habita tum ipsius muneris naturae, tum locorum temporumque condicionum, quaque ipsi possint necessitatibus vitae suae necnon aequae retributioni eorum, quorum servitio egent, providere.

§ 2. Item providendum est ut gaudeant illa sociali assistentia, qua eorum necessitatibus, si infirmitate, in-

validitate vel senectute laborent, apte prospiciatur.

§ 3. Diaconi uxorati, qui plene ministerio ecclesiastico sese devovent, remunerationem merentur qua sui suaeque familiae sustentationi providere valeant; qui vero ratione professionis civilis, quam exercent aut exercuerunt, remunerationem obtineant, ex perceptis inde reditibus sibi suaeque familiae necessitatibus consulant.

Can. 282 – § 1. Clerici vitae simplicitatem colant et ab omnibus quae vanitatem sapiunt se abstineant.

§ 2. Bona, quae occasione exercitii ecclesiastici officii ipsis obveniunt, quaeque supersunt, provisa ex eis honesta sustentatione et omnium officiorum proprii status adimpletione, ad bonum Ecclesiae operaque caritatis impendere velint.

Can. 283 – § 1. Clerici, licet officium residentiale non habeant, a sua tamen dioecesi per notabile tempus, iure particulari determinandum, sine licentia saltem praesumpta Ordinarii proprii, ne discedant.

§ 2. Ipsis autem competit ut debito et sufficienti quotannis gaudeant feriarum tempore, iure universali vel particulari determinato.

Can. 284 – Clerici decentem habitum ecclesiasticum, iuxta normas ab Episcoporum conferentia editas atque legitimas locorum consuetudines, deferant.

Can. 285 – § 1. Clerici ab iis omnibus, quae statum suum dedecent, prorsus abstineant, iuxta iuris particularis praescripta.

трэбы ў выпадку хваробы, непрацаздольнасці або старасці.

§ 3. Жанатыя дыяканы, якія поўнасцю прысвяцілі сябе касцёльнай паслузе, заслугоўваюць на ўзнагароджанне, якое магло б забяспечыць утрыманне іх саміх і іх сем'яў; аднак тыя, хто атрымлівае ўзнагароджанне па грамадзянскай прафесіі, якую выконваюць цяпер або выконвалі раней, павінны задавольваць патрэбы свае і сваёй сям'і за кошт даходаў, якія ад гэтага атрымліваюць.

Кан. 282 – § 1. Духоўныя асобы павінны весці простае жыццё і ўстрымлівацца ад усяго, што аддае марнасцю.

§ 2. Варта, каб сродкі, атрыманыя на падставе выконвання касцёльнай пасады, якія застаюцца ў духоўных асоб пасля забеспячэння сабе годнага ўтрымання і выканання ўсіх абавязкаў, звязаных з іх станам, былі прызначаны для дабра Касцёла і на справы міласэрнасці.

Кан. 283 – § 1. Духоўныя асобы, нават калі не маюць рэзідэнцыйнай пасады, усё ж не павінны пакідаць сваю дыяцэзію на значны тэрмін, акрэслены партыкулярным правам, без дазволу, прынамсі меркаванага, уласнага ардынарыя.

§ 2. Аднак яны маюць права кожны год карыстацца з неабходнага і дастатковага адпачынку, акрэсленага паўсюдным або партыкулярным правам.

Кан. 284 – Духоўныя асобы павінны насіць належнае касцёльнае адзенне згодна з нормамі, выдадзенымі Канферэнцыяй Біскупаў, а таксама адпаведна легітымным мясцовым звычаям.

Кан. 285 – § 1. Духоўныя асобы павінны рашуча ўстрымлівацца ад усяго, што не прыстала іх стану, згодна з прадпісаннямі партыкулярнага права.

§ 2. Духоўныя асобы павінны пазбягаць усяго, што само па сабе не з'яўляецца непрыстойным, аднак з'яўляецца неўласцівым духоўнаму стану.

§ 3. Духоўным асобам забараняецца займаць публічныя пасады, якія звязаны з удзелам у выкананні дзяржаўнай улады.

§ 4. Без дазволу свайго ардынарыя яны не павінны ўваходзіць у распараджэнне маёмасцю, якая належыць свецкім асобам, або ў выкананне свецкіх пасадаў, з якімі звязаны абавязак складання фінансавых справаздач. Ім забараняецца ажыццяўляць паручыцельства нават з уласнай маёмасці без кансультацыі з уласным ардынарыем; яны таксама павінны ўстрымлівацца ад падпісання абавязацельстваў, праз якія менавіта прымаецца абавязак выплаты грошай без разгляду справы.

Кан. 286 – Духоўным асобам забараняецца займацца гандлем або прадпрымальніцтвам, асабіста ці праз іншых, для ўласнай карысці ці на карысць іншых, калі на гэта няма дазволу легітымнай касцёльнай улады.

Кан. 287 – § 1. Духоўныя асобы павінны заўсёды як мага больш спрыяць таму, каб паміж людзьмі захоўваліся супакой і згода, заснаваныя на справядлівасці.

§ 2. Яны не павінны прымаць чынны ўдзел у палітычных партыях і ў кіраванні прафесійнымі саюзамі, калі, на думку кампетэнтнай касцёльнай улады, гэтага не патрабуе абарона правоў Касцёла або імкненне да агульнага дабра.

Кан. 288 – Пастаянныя дыяканы не звязаны прадпісаннямі кан. 284, 285 §§ 3 і 4, 286, 287 § 2, калі партыкулярнае права не пастанаўляе іначай.

Кан. 289 – § 1. Паколькі вайсковая служба не адпавядае духоўнаму стану, духоўныя

§ 2. Ea quae, licet non indecora, a clericali tamen statu aliena sunt, clerici vitent.

§ 3. Officia publica, quae participationem in exercitio civilis potestatis secumferunt, clerici assumere vetantur.

§ 4. Sine licentia sui Ordinarii, ne ineant gestiones bonorum ad laicos pertinentium aut officia saecularia, quae secumferunt onus reddendarum rationum; a fideiubendo, etiam de bonis propriis, inconsulto proprio Ordinario, prohibentur; item a subscribendis syngraphis, quibus nempe obligatio solvendae pecuniae, nulla definita causa, suscipitur, abstineant.

Can. 286 – Prohibentur clerici per se vel per alios, sive in propriam sive in aliorum utilitatem, negotiationem aut mercaturam exercere, nisi de licentia legitimae auctoritatis ecclesiasticae.

Can. 287 – § 1. Clerici pacem et concordiam iustitia innixam inter homines servandam quam maxime semper foveant.

§ 2. In factionibus politicis atque in regendis consociationibus syndicalibus activam partem ne habeant, nisi iudicio competentis auctoritatis ecclesiasticae, Ecclesiae iura tuenda aut bonum commune promovendum id requirant.

Can. 288 – Diaconi permanentes praescriptis canonum 284, 285, §§ 3 et 4, 286, 287, § 2 non tenentur, nisi ius particulare aliud statuat.

Can. 289 – § 1. Cum servitium militare statui clericali minus congruat,

clerici itemque candidati ad sacros ordines militiam ne capessant voluntarii, nisi de sui Ordinarii licentia.

§ 2. Clerici utantur exemptionibus, quas ab exercendis muneribus et publicis civilibus officiis a statu clericali alienis, in eorum favorem leges et conventiones vel consuetudines concedunt, nisi in casibus particularibus aliter Ordinarius proprius decreverit.

асобы і кандыдаты да пасвячэння не павінны ісці на яе добраахвотна, калі не з дазволу свайго ардынарыя.

§ 2. Духоўныя асобы павінны карыстацца вызваленнем ад выконвання заданняў і займання публічных свецкіх пасадаў, неўласцівых духоўнаму стану, дадзеным на іх карысць законамі, пагадненнямі або звычаямі, калі ў асобных выпадках уласны ардынарый не пастановіць іначай.

Caput IV
De amissione status clericalis

Can. 290 – Sacra ordinatio, semel valide recepta, numquam irrita fit. Clericus tamen statum clericalem amittit:

1° sententia iudiciali aut decreto administrativo, quo invaliditas sacrae ordinationis declaratur;

2° poena dimissionis legitime irrogata;

3° rescripto Apostolicae Sedis; quod vero rescriptum diaconis ob graves tantum causas, presbyteris ob gravissimas causas ab Apostolica Sede conceditur.

Can. 291 – Praeter casus de quibus in can. 290, n. 1, amissio status clericalis non secumfert dispensationem ab obligatione caelibatus, quae ab uno tantum Romano Pontifice conceditur.

Can. 292 – Clericus qui statum clericalem ad normam iuris amittit, cum eo amittit iura statui clericali propria, nec ullis iam adstringitur obligationibus status clericalis, firmo praescripto can. 291; potestatem ordinis exercere prohibetur, salvo praescripto can. 976; eo ipso privatur omnibus of-

Раздзел IV
Страта духоўнага стану

Кан. 290 – Святое пасвячэнне, аднойчы дзейсна прынятае, ніколі не становіцца нядзейсным. Аднак духоўная асоба траціць свой стан:

1° праз судовы прысуд або адміністрацыйны дэкрэт, якія сцвярджаюць нядзейснасць пасвячэння;

2° праз легітымна наложанае пакаранне выдалення з духоўнага стану;

3° праз рэскрыпт Апостальскай Сталіцы; у адносінах да дыяканаў ён выдаецца Апостальскай Сталіцай толькі па важкіх прычынах, а ў адносінах да прэзбітэраў — па асабліва важкіх.

Кан. 291 – Акрамя выпадкаў, аб якіх гаворыцца ў кан. 290, 1°, страта духоўнага стану не нясе з сабой дыспенсацыю ад абавязку цэлібату, якую ўдзяляе толькі сам Рымскі Пантыфік.

Кан. 292 – Духоўная асоба, якая страціла духоўны стан, згодна з нормамі права, разам з ім траціць і правы, уласцівыя духоўнаму стану, а таксама не звязана ніякімі абавязкамі духоўнага стану, захоўваючы прадпісанні кан. 291; ёй забараняецца ажыццяўляць уладу пасвячэння, захоўва-

ючы прадпісанні кан. 976; тым самым яна пазбаўляецца ўсіх пасадаў, заданняў і дэлегаванай ёй улады.

Кан. 293 – Духоўная асоба, якая страціла духоўны стан, не можа быць зноў залічана да духоўных асобаў, калі не праз рэскрыпт Апостальскай Сталіцы.

ficiis, muneribus et potestate qualibet delegata.

Can. 293 – Clericus qui statum clericalem amisit, nequit denuo inter clericos adscribi, nisi per Apostolicae Sedis rescriptum.

ТЫТУЛ IV
ПЕРСАНАЛЬНЫЯ ПРЭЛАТУРЫ

TITULUS IV
DE PRAELATURIS PERSONALIBUS

Кан. 294 – Для садзейнічання адпаведнаму размеркаванню прэзбітэраў або для здзяйснення асаблівых пастырскіх ці місійных спраў у розных рэгіёнах ці на карысць розных сацыяльных груп Апостальская Сталіца, пасля таго, як выслухае зацікаўленыя Канферэнцыі Біскупаў, можа заснаваць персанальныя прэлатуры, складзеныя з прэзбітэраў і дыяканаў секулярнага духавенства.

Can. 294 – Ad aptam presbyterorum distributionem promovendam aut ad peculiaria opera pastoralia vel missionalia pro variis regionibus aut diversis coetibus socialibus perficienda, praelaturae personales quae presbyteris et diaconis cleri saecularis constent, ab Apostolica Sede, auditis quarum interest Episcoporum conferentiis, erigi possunt.

Кан. 295 – § 1. Персанальная прэлатура кіруецца статутамі, выдадзенымі Апостальскай Сталіцай, на чале прэлатуры знаходзіцца прэлат у якасці яе ўласнага ардынарыя, які мае права засноўваць нацыянальную або міжнародную семінарыю, а таксама інкардынаваць алюмнаў і вылучаць іх да пасвячэння з мэтай служэння ў прэлатуры.

Can. 295 – § 1. Praelatura personalis regitur statutis ab Apostolica Sede conditis, eique praeficitur Praelatus ut Ordinarius proprius, cui ius est nationale vel internationale seminarium erigere necnon alumnos incardinare, eosque titulo servitii praelaturae ad ordines promovere.

§ 2. Прэлат павінен клапаціцца як аб духоўнай фармацыі тых, каго вылучыў з гэтай мэтай, так і аб іх годным утрыманні.

§ 2. Praelatus prospicere debet sive spirituali institutioni illorum, quos titulo praedicto promoverit, sive eorundem decorae sustentationi.

Кан. 296 – На падставе заключаных з прэлатурай пагадненняў свецкія асобы могуць прысвячаць сябе апостальскім справам у персанальнай прэлатуры; аднак форма гэтага арганічнага супрацоўніцтва, а таксама галоўныя абавязкі і правы, з ім звязаныя, павінны быць адпаведным чынам акрэслены ў статутах.

Can. 296 – Conventionibus cum praelatura initis, laici operibus apostolicis praelaturae personalis sese dedicare possunt; modus vero huius organicae cooperationis atque praecipua officia et iura cum illa coniuncta in statutis apte determinentur.

Can. 297 – Statuta pariter definiant rationes praelaturae personalis cum Ordinariis locorum, in quorum Ecclesiis particularibus ipsa praelatura sua opera pastoralia vel missionalia, praevio consensu Episcopi dioecesani, exercet vel exercere desiderat.

Кан. 297 – Статуты павінны таксама акрэсліваць адносіны паміж персанальнай прэлатурай і ардынарыямі месца тых партыкулярных Касцёлаў, у якіх персанальная прэлатура ажыццяўляе або мае намер ажыццяўляць свае пастырскія ці місійныя справы, з папярэдняй згоды дыяцэзіяльнага біскупа.

TITULUS V
DE CHRISTIFIDELIUM CONSOCIATIONIBUS

ТЫТУЛ V
АБ'ЯДНАННІ ВЕРНІКАЎ

Caput I
Normae communes

Раздзел I
Агульныя нормы

Can. 298 – § 1. In Ecclesia habentur consociationes distinctae ab institutis vitae consecratae et societatibus vitae apostolicae, in quibus christifideles, sive clerici sive laici sive clerici et laici simul, communi opera contendunt ad perfectiorem vitam fovendam, aut ad cultum publicum vel doctrinam christianam promovendam, aut ad alia apostolatus opera, scilicet ad evangelizationis incepta, ad pietatis vel caritatis opera exercenda et ad ordinem temporalem christiano spiritu animandum.

§ 2. Christifideles sua nomina dent iis praesertim consociationibus, quae a competenti auctoritate ecclesiastica aut erectae aut laudatae vel commendatae sint.

Кан. 298 – § 1. У Касцёле існуюць аб'яднанні, якія адрозніваюцца ад інстытутаў кансэкраванага жыцця і таварыстваў апостальскага жыцця, у якіх вернікі — духоўныя, ці свецкія, ці духоўныя і свецкія разам — імкнуцца агульнымі намаганнямі да дасягнення больш дасканалага жыцця, да развіцця публічнага культу або хрысціянскага вучэння ці да іншых апостальскіх спраў, а менавіта да пачынанняў, звязаных з евангелізацыяй, да выконвання спраў міласэрнасці і любові ці да ажыўлення гэтага свету хрысціянскім духам.

§ 2. Вернікі павінны належаць перадусім да тых аб'яднанняў, якія былі або заснаваны, або адобраны ці падтрыманы кампетэнтнай касцёльнай уладай.

Can. 299 – § 1. Integrum est christifidelibus, privata inter se conventione inita, consociationes constituere ad fines de quibus in can. 298, § 1 persequendos, firmo praescripto can. 301, § 1.

§ 2. Huiusmodi consociationes, etiamsi ab auctoritate ecclesiastica laudentur vel commendentur, consociationes privatae vocantur.

Кан. 299 – § 1. Вернікі маюць права шляхам заключэння паміж сабой прыватных пагадненняў засноўваць аб'яднанні, якія маюць мэты, аб якіх гаворыцца ў кан. 298 § 1, захоўваючы прадпісанні кан. 301 § 1.

§ 2. Такія аб'яднанні, нават калі яны адобраны або падтрыманы касцёльнай уладай, называюцца прыватнымі аб'яднаннямі.

§ 3. Ніякае прыватнае аб'яднанне вернікаў не можа быць прызнана ў Касцёле, калі яго статуты не былі праверaны кампетэнтнай уладай.

Кан. 300 – Ніякае аб'яднанне не можа называцца «каталіцкае», калі не атрымала згоды кампетэнтнай касцёльнай улады згодна з нормай кан. 312.

Кан. 301 – § 1. Толькі кампетэнтная касцёльная ўлада можа заснаваць аб'яднанні вернікаў, якія маюць намер выкладаць хрысціянскае вучэнне ад імя Касцёла ці развіваць публічны культ або імкнуцца да іншых мэтаў, ажыццяўленне якіх па сваёй прыродзе зарэзервавана за касцёльнай уладай.

§ 2. Кампетэнтная касцёльная ўлада, калі палічыць гэта патрэбным, можа заснаваць аб'яднанні вернікаў, якія непасрэдна або апасродкавана маюць таксама іншыя духоўныя мэты, для дасягнення якіх недастаткова адных толькі прыватных пачынанняў.

§ 3. Аб'яднанні вернікаў, заснаваныя кампетэнтнай касцёльнай уладай, называюцца публічнымі аб'яднаннямі.

Кан. 302 – Святарскімі аб'яднаннямі вернікаў называюцца такія аб'яднанні, якімі кіруюць духоўныя асобы і якія маюць сваім прызначэннем ажыццяўленне святога пасвячэння і ў якасці такіх прызнаюцца кампетэнтнай уладай.

Кан. 303 – Аб'яднанні, члены якіх, жывучы ў свеце, удзельнічаюць у духоўнасці якога-небудзь манаскага інстытута, вядуць пад вышэйшым кіраваннем гэтага інстытута апостальскае жыццё і імкнуцца да хрысціянскай дасканаласці, называюцца трэцімі ордэнамі або атрымліваюць іншую адпаведную назву.

§ 3. Nulla christifidelium consociatio privata in Ecclesia agnoscitur, nisi eius statuta ab auctoritate competenti recognoscantur.

Can. 300 – Nulla consociatio nomen «catholicae» sibi assumat, nisi de consensu competentis auctoritatis ecclesiasticae, ad normam can. 312.

Can. 301 – § 1. Unius auctoritatis ecclesiasticae competentis est erigere christifidelium consociationes, quae sibi proponant doctrinam christianam nomine Ecclesiae tradere aut cultum publicum promovere, vel quae alios intendant fines, quorum prosecutio natura sua eidem auctoritati ecclesiasticae reservatur.

§ 2. Auctoritas ecclesiastica competens, si id expedire iudicaverit, christifidelium consociationes quoque erigere potest ad alios fines spirituales directe vel indirecte prosequendos, quorum consecutioni per privatorum incepta non satis provisum sit.

§ 3. Christifidelium consociationes quae a competenti auctoritate ecclesiastica eriguntur, consociationes publicae vocantur.

Can. 302 – Christifidelium consociationes clericales eae dicuntur, quae sub moderamine sunt clericorum, exercitium ordinis sacri assumunt atque uti tales a competenti auctoritate agnoscuntur.

Can. 303 – Consociationes, quarum sodales, in saeculo spiritum alicuius instituti religiosi participantes, sub altiore eiusdem instituti moderamine, vitam apostolicam ducunt et ad perfectionem christianam contendunt, tertii ordines dicuntur aliove congruenti nomine vocantur.

Can. 304 – § 1. Omnes christifidelium consociationes, sive publicae sive privatae, quocumque titulo seu nomine vocantur, sua habeant statuta, quibus definiantur consociationis finis seu obiectum sociale, sedes, regimen et condiciones ad partem in iisdem habendam requisitae, quibusque determinentur agendi rationes, attentis quidem temporis et loci necessitate vel utilitate.

§ 2. Titulum seu nomen sibi eligant, temporis et loci usibus accommodatum, maxime ab ipso fine, quem intendunt, selectum.

Кан. 304 – § 1. Усе аб'яднанні вернікаў, як публічныя, так і прыватныя, якія б тытулы, іншымі словамі — назвы, яны не насілі, павінны мець свае статуты, у якіх павінна быць акрэслена мэта, іншымі словамі — грамадскае прызначэнне аб'яднання, сядзіба, органы кіравання, умовы, патрэбныя для ўдзелу ў іх, а таксама формы іх дзейнасці з улікам неабходнасці або карысці, звязаных з месцам і часам.

§ 2. Яны павінны выбраць сабе тытул, іншымі словамі — назву, дастасаваны да патрэбаў часу і месца, выбіраючы яго пераважна з улікам той мэты, да якой яны імкнуцца.

Can. 305 – § 1. Omnes christifidelium consociationes subsunt vigilantiae auctoritatis ecclesiasticae competentis, cuius est curare ut in iisdem integritas fidei ac morum servetur, et invigilare ne in disciplinam ecclesiasticam abusus irrepant, cui itaque officium et ius competunt ad normam iuris et statutorum easdem invisendi; subsunt etiam eiusdem auctoritatis regimini secundum praescripta canonum, qui sequuntur.

§ 2. Vigilantiae Sanctae Sedis subsunt consociationes cuiuslibet generis; vigilantiae Ordinarii loci subsunt consociationes dioecesanae necnon aliae consociationes, quatenus in dioecesi operam exercent.

Кан. 305 – § 1. Усе аб'яднанні вернікаў падлягаюць нагляду з боку кампетэнтнай касцёльнай улады, якая павінна клапаціцца аб тым, каб у іх была захавана чысціня веры і нораваў, а таксама сачыць за тым, каб у касцёльнай дысцыпліне не было дапушчана злоўжыванняў. Яна мае права і абавязак праводзіць у іх праверку згодна з нормамі права і іх статутаў; яны ж, у сваю чаргу, падпарадкаваны кіраванню гэтай улады згодна з прадпісаннямі наступных канонаў.

§ 2. Нагляду з боку Святой Сталіцы падлягаюць аб'яднанні любой формы; нагляду з боку ардынарыя месца падлягаюць дыяцэзіяльныя аб'яднанні, а таксама іншыя аб'яднанні, якія ажыццяўляюць дзейнасць у дыяцэзіі.

Can. 306 – Ut quis consociationis iuribus atque privilegiis, indulgentiis aliisque gratiis spiritualibus eidem consociationi concessis fruatur, necesse est et sufficit ut secundum iuris praescripta et propria consociationis statuta, in eandem valide receptus sit et ab eadem non sit legitime dimissus.

Кан. 306 – Для таго, каб якая-небудзь асоба магла карыстацца правамі і прывілеямі аб'яднання, адпустамі і іншымі духоўнымі ласкамі, удзеленымі аб'яднанню, неабходна і дастаткова, каб згодна з прадпісаннямі права і ўласнымі статутамі аб'яднання гэтая асоба была ў яго дзейсна прынята і не была з яго легітымна выдалена.

Кан. 307 – § 1. Прыём членаў павінен ажыццяўляцца згодна з нормамі права і статутамі кожнага аб'яднання.

§ 2. Адна і тая ж асоба можа ўваходзіць у некалькі аб'яднанняў.

§ 3. Члены манаскіх інстытутаў могуць уступаць у аб'яднанні згодна з нормамі ўласнага права і са згоды свайго настаяцеля.

Кан. 308 – Той, хто быў легітымна прыняты ў аб'яднанне, не можа быць выключаны з яго, калі не па справядлівай прычыне, згодна з нормамі права і статутаў.

Кан. 309 – Легітымна заснаваныя аб'яднанні маюць права згодна з нормамі права і статутаў выдаваць асаблівыя нормы, якія адносяцца да гэтага аб'яднання, праводзіць сходы, прызначаць кіраўнікоў, афіцыйных асобаў, служачых і адміністратараў маёмасці.

Кан. 310 – Прыватнае аб'яднанне, якое не было заснавана ў якасці юрыдычнай асобы, не можа быць само па сабе носьбітам абавязкаў і правоў; аднак аб'яднаныя ў ім вернікі могуць сумесна прымаць на сябе абавязкі, а таксама набываць правы і маёмасць і валодаць імі ў якасці сумесных уласнікаў і саўладальнікаў; гэтыя правы і абавязкі яны могуць ажыццяўляць праз упаўнаважаную асобу, іншымі словамі — прадстаўніка.

Кан. 311 – Члены інстытутаў кансэкраванага жыцця, якія ўзначальваюць аб'яднанні, звязаныя якім-небудзь чынам з іх інстытутам, або выконваюць у іх функцыю асістэнта, павінны клапаціцца аб тым, каб гэтыя аб'яднанні аказвалі дапамогу ў справах апостальства, якія ажыццяўляюцца ў дыяцэзіі, перадусім праз супрацоўніцтва пад кіраваннем ардынарыя месца з тымі аб'яднаннямі, якія скіраваны на ажыццяўленне апостальства ў дыяцэзіі.

Can. 307 – § 1. Membrorum receptio fiat ad normam iuris ac statutorum uniuscuiusque consociationis.

§ 2. Eadem persona adscribi potest pluribus consociationibus.

§ 3. Sodales institutorum religiosorum possunt consociationibus, ad normam iuris proprii, de consensu sui Superioris nomen dare.

Can. 308 – Nemo legitime adscriptus a consociatione dimittatur, nisi iusta de causa ad normam iuris et statutorum.

Can. 309 – Consociationibus legitime constitutis ius est, ad normam iuris et statutorum, edendi peculiares normas ipsam consociationem respicientes, celebrandi comitia, designandi moderatores, officiales, ministros atque bonorum administratores.

Can. 310 – Consociatio privata quae uti persona iuridica non fuerit constituta, qua talis subiectum esse non potest obligationum et iurium; christifideles tamen in ea consociati coniunctim obligationes contrahere atque uti condomini et compossessores iura et bona acquirere et possidere possunt; quae iura et obligationes per mandatarium seu procuratorem exercere valent.

Can. 311 – Sodales institutorum vitae consecratae qui consociationibus suo instituto aliquo modo unitis praesunt aut assistunt, curent ut eaedem consociationes operibus apostolatus in dioecesi exsistentibus adiutorium praebeant, cooperantes praesertim, sub directione Ordinarii loci, cum consociationibus quae ad apostolatum in dioecesi exercendum ordinantur.

Caput II

De christifidelium consociationibus publicis

Can. 312 – § 1. Ad erigendas consociationes publicas auctoritas competens est:

1° pro consociationibus universalibus atque internationalibus, Sancta Sedes;

2° pro consociationibus nationalibus, quae scilicet ex ipsa erectione destinantur ad actionem in tota natione exercendam, Episcoporum conferentia in suo territorio;

3° pro consociationibus dioecesanis, Episcopus dioecesanus in suo cuiusque territorio, non vero Administrator dioecesanus, iis tamen consociationibus exceptis quarum erigendarum ius ex apostolico privilegio aliis reservatum est.

§ 2. Ad validam erectionem consociationis aut sectionis consociationis in dioecesi, etiamsi id vi privilegii apostolici fiat, requiritur consensus Episcopi dioecesani scripto datus; consensus tamen ab Episcopo dioecesano praestitus pro erectione domus instituti religiosi valet etiam ad erigendam in eadem domo vel ecclesia ei adnexa consociationem quae illius instituti sit propria.

Can. 313 – Consociatio publica itemque consociationum publicarum confoederatio, ipso decreto quo ab auctoritate ecclesiastica ad normam can. 312 competenti erigitur, persona iuridica constituitur et missionem recipit, quatenus requiritur, ad fines quos ipsa sibi nomine Ecclesiae persequendos proponit.

Can. 314 – Cuiuslibet consociationis publicae statuta, eorumque recogni-

Раздзел II

Публічныя аб'яднанні вернікаў

Кан. 312 – § 1. Уладай, кампетэнтнай для заснавання публічных аб'яднанняў, з'яўляецца:

1° для сусветных і міжнародных аб'яднанняў — Святая Сталіца;

2° для нацыянальных аб'яднанняў, якія праз само заснаванне прызначаны для дзейнасці ва ўсёй краіне, — Канферэнцыя Біскупаў на сваёй тэрыторыі;

3° для дыяцэзіяльных аб'яднанняў, за выключэннем тых, права на заснаванне якіх зарэзервавана за іншымі на моцы апостальскага прывілея, — дыяцэзіяльны біскуп на сваёй тэрыторыі, але не дыяцэзіяльны адміністратар.

§ 2. Каб дзейсна заснаваць у дыяцэзіі якое-небудзь аб'яднанне або яго аддзяленне, нават калі гэта адбываецца на моцы апостальскага прывілея, патрабуецца пісьмовы дазвол дыяцэзіяльнага біскупа; пры гэтым дазвол, які дыяцэзіяльны біскуп удзяліў на заснаванне дома манаскага інстытута, з'яўляецца дзейсным для заснавання пры гэтым доме або касцёле аб'яднання, якое з'яўляецца ўласцівым для гэтага інстытута.

Кан. 313 – Публічнае аб'яднанне, як і канфедэрацыя публічных аб'яднанняў, на падставе таго дэкрэта, якім яго заснавала кампетэнтная касцёльная ўлада згодна з нормай кан. 312, становіцца юрыдычнай асобай і, калі гэта патрэбна, атрымлівае місію дзеля дасягнення тых мэтаў, якія ставіць перад сабой ад імя Касцёла.

Кан. 314 – Статуты любога публічнага аб'яднання, а таксама іх перагляд або змя-

ненне павінна зацвердзіць тая касцёльная ўлада, якая мае права заснаваць аб'яднанне згодна з нормай кан. 312 § 1.

tio vel mutatio, approbatione indigent auctoritatis ecclesiasticae cui competit consociationis erectio ad normam can. 312, § 1.

Кан. 315 – Публічныя аб'яднанні могуць свабодна ажыццяўляць пачынанні, адпаведныя характару іх дзейнасці, а таксама кіраваць імі згодна з прадпісаннямі статутаў, застаючыся, аднак, пад вышэйшым кіраваннем касцёльнай улады, аб якой гаворыцца ў кан. 312 § 1.

Can. 315 – Consociationes publicae incepta propriae indoli congrua sua sponte suscipere valent, eaedemque reguntur ad normam statutorum, sub altiore tamen directione auctoritatis ecclesiasticae, de qua in can. 312, § 1.

Кан. 316 – § 1. Той, хто публічна выракся каталіцкай веры, або адступіў ад касцёльнага адзінства, або звязаны экскамунікай, наложанай ці сцверджанай, не можа быць дзейсна прыняты ў публічнае аб'яднанне.

§ 2. Той, хто быў легітымна прыняты ў аб'яднанне і апынуўся ў становішчы, аб якім гаворыцца ў § 1, пасля папярэджання павінен быць выдалены з аб'яднання, пры гэтым павінны быць захаваны статуты аб'яднання і захавана права на зварот з рэкурсам да касцёльнай улады, аб якой гаворыцца ў кан. 312 § 1.

Can. 316 – § 1. Qui publice fidem catholicam abiecerit vel a communione ecclesiastica defecerit vel excommunicatione irrogata aut declarata irretitus sit, valide in consociationes publicas recipi nequit.

§ 2. Qui legitime adscripti in casum inciderint de quo in § 1, praemissa monitione, a consociatione dimittantur, servatis eius statutis et salvo iure recursus ad auctoritatem ecclesiasticam, de qua in can. 312, § 1.

Кан. 317 – § 1. Калі ў статутах не прадугледжана іншае, касцёльная ўлада, аб якой гаворыцца ў кан. 312 § 1, мае права на адабрэнне кіраўніка публічнага аб'яднання, выбранага самім аб'яднаннем, або на ўстанаўленне прадстаўленага кандыдата, або на прызначэнне яго на моцы ўласнага права. Капелана, іншымі словамі — касцёльнага асістэнта, прызначае тая ж касцёльная ўлада пасля таго, як выслухае, калі гэта будзе патрэбна, вышэйшых афіцыйных асобаў аб'яднання.

Can. 317 – § 1. Nisi aliud in statutis praevideatur, auctoritatis ecclesiasticae, de qua in can. 312, § 1, est consociationis publicae moderatorem ab ipsa consociatione publica electum confirmare aut praesentatum instituere aut iure proprio nominare; cappellanum vero seu assistentem ecclesiasticum, auditis ubi id expediat consociationis officialibus maioribus, nominat eadem auctoritas ecclesiastica.

§ 2. Норма, устаноўленая ў § 1, з'яўляецца дзейснай таксама для аб'яднанняў, заснаваных на моцы апостальскага прывілея членамі манаскіх інстытутаў па-за сваімі дамамі або касцёламі; аднак у аб'яднаннях,

§ 2. Norma in § 1 statuta valet etiam pro consociationibus a sodalibus institutorum religiosorum vi apostolici privilegii extra proprias ecclesias vel domos erectis; in consociationibus vero a sodalibus institutorum religio-

sorum in propria ecclesia vel domo erectis, nominatio aut confirmatio moderatoris et cappellani pertinet ad Superiorem instituti, ad normam statutorum.

§ 3. In consociationibus quae non sunt clericales, laici exercere valent munus moderatoris; cappellanus seu assistens ecclesiasticus ad illud munus ne assumatur, nisi aliud in statutis caveatur.

§ 4. In publicis christifidelium consociationibus quae directe ad apostolatum exercendum ordinantur, moderatores ne ii sint, qui in factionibus politicis officium directionis adimplent.

Can. 318 – § 1. In specialibus adiunctis, ubi graves rationes id requirant, potest ecclesiastica auctoritas, de qua in can. 312, § 1, designare commissarium, qui eius nomine consociationem ad tempus moderetur.

§ 2. Moderatorem consociationis publicae iusta de causa removere potest qui eum nominavit aut confirmavit, auditis tamen tum ipso moderatore tum consociationis officialibus maioribus ad normam statutorum; cappellanum vero removere potest, ad normam cann. 192-195, qui eum nominavit.

Can. 319 – § 1. Consociatio publica legitime erecta, nisi aliud cautum sit, bona quae possidet ad normam statutorum administrat sub superiore directione auctoritatis ecclesiasticae de qua in can. 312, § 1, cui quotannis administrationis rationem reddere debet.

заснаваных членамі манаскіх інстытутаў пры сваім касцёле або доме, прызначэнне або адабрэнне кіраўніка і капелана з'яўляецца правам настаяцеля інстытута згодна з нормамі статутаў.

§ 3. У аб'яднаннях, якія не з'яўляюцца святарскімі, свецкія асобы могуць ажыццяўляць заданне кіраўніка; гэтае заданне не павінен прымаць капелан, іншымі словамі — касцёльны асістэнт, калі ў статутах не прадугледжана іншае.

§ 4. У публічных аб'яднаннях вернікаў, якія непасрэдна скіраваны на ажыццяўленне апостальства, не павінны быць кіраўнікамі тыя, хто з'яўляецца кіруючымі афіцыйнымі асобамі ў палітычных партыях.

Кан. 318 – § 1. У асобых абставінах, калі гэтага патрабуюць важкія прычыны, касцёльная ўлада, аб якой гаворыцца ў кан. 312 § 1, можа прызначыць упаўнаважанага, які часова будзе кіраваць аб'яднаннем ад яе імя.

§ 2. Кіраўніка публічнага аб'яднання можа па справядлівай прычыне вызваліць ад пасады той, хто яго прызначыў або адобрыў, аднак пры гэтым неабходна выслухаць як самога кіраўніка, так і вышэйшых афіцыйных асобаў аб'яднання згодна з нормамі статутаў; капелана, у сваю чаргу, можа вызваліць ад пасады згодна з нормамі кан. 192–195 той, хто яго прызначыў.

Кан. 319 – § 1. Калі не прадугледжана іншае, легітымна заснаванае публічнае аб'яднанне адмініструе маёмасцю, якой валодае, згодна з нормамі статутаў пад вышэйшым кіраваннем касцёльнай улады, аб якой гаворыцца ў кан. 312 § 1 і якой аб'яднанне павінна прадстаўляць штогадовую справаздачу аб адміністраванні маёмасцю.

§ 2. Яно павінна таксама складаць дакладную справаздачу гэтай жа касцёльнай уладзе аб сабраных ахвяраваннях, міласціне і распараджэнні імі.

Кан. 320 – § 1. Аб'яднанні, заснаваныя Святой Сталіцай, могуць быць ліквідаваны толькі ёй самой.

§ 2. Па важкіх прычынах Канферэнцыя Біскупаў можа ліквідаваць заснаваныя ёю аб'яднанні; дыяцэзіяльны біскуп — заснаваныя ім аб'яднанні, а таксама тыя аб'яднанні, якія былі заснаваны на моцы апостальскага прывілея членамі манаскіх інстытутаў з дазволу дыяцэзіяльнага біскупа.

§ 3. Кампетэнтная ўлада не павінна ліквідаваць публічнае аб'яднанне, калі не выслухае яго кіраўніка і іншых вышэйшых афіцыйных асобаў.

§ 2. Oblationum quoque et eleemosynarum, quas collegerit, eidem auctoritati fidelem erogationis rationem reddere debet.

Can. 320 – § 1. Consociationes a Sancta Sede erectae nonnisi ab eadem supprimi possunt.

§ 2. Ob graves causas ab Episcoporum conferentia supprimi possunt consociationes ab eadem erectae; ab Episcopo dioecesano consociationes a se erectae, et etiam consociationes ex apostolico indulto a sodalibus institutorum religiosorum de consensu Episcopi dioecesani erectae.

§ 3. Consociatio publica ab auctoritate competenti ne supprimatur, nisi auditis eius moderatore aliisque officialibus maioribus.

Раздзел III

Прыватныя аб'яднанні вернікаў

Кан. 321 – Вернікі кіруюць прыватнымі аб'яднаннямі паводле прадпісанняў статутаў.

Кан. 322 – § 1. Прыватнае аб'яднанне вернікаў можа набыць правасуб'ектнасць праз фармальны дэкрэт кампетэнтнай касцёльнай улады, аб якой гаворыцца ў кан. 312.

§ 2. Ніякае прыватнае аб'яднанне вернікаў не можа набыць правасуб'ектнасць, калі яго статуты не былі зацверджаны касцёльнай уладай, аб якой гаворыцца ў кан. 312 § 1; аднак зацвярджэнне статутаў не змяняе прыватнай прыроды аб'яднання.

Кан. 323 – § 1. Пры тым, што прыватныя аб'яднанні вернікаў з'яўляюцца самастойнымі згодна з нормай кан. 321, яны падлягаюць нагляду з боку касцёльнай улады

Caput III

De christifidelium consociationibus privatis

Can. 321 – Consociationes privatas christifideles secundum statutorum praescripta dirigunt et moderantur.

Can. 322 – § 1. Consociatio christifidelium privata personalitatem iuridicam acquirere potest per decretum formale auctoritatis ecclesiasticae competentis, de qua in can. 312.

§ 2. Nulla christifidelium consociatio privata personalitatem iuridicam acquirere potest, nisi eius statuta ab auctoritate ecclesiastica, de qua in can. 312, § 1, sint probata; statutorum vero probatio consociationis naturam privatam non immutat.

Can. 323 – § 1. Licet christifidelium consociationes privatae autonomia gaudeant ad normam can. 321, subsunt vigilantiae auctoritatis ecclesia-

sticae ad normam can. 305, itemque eiusdem auctoritatis regimini.

§ 2. Ad auctoritatem ecclesiasticam etiam spectat, servata quidem autonomia consociationibus privatis propria, invigilare et curare ut virium dispersio vitetur, earumque apostolatus exercitium ad bonum commune ordinetur.

Can. 324 – § 1. Christifidelium consociatio privata libere sibi moderatorem et officiales designat, ad normam statutorum.

§ 2. Christifidelium consociatio privata consiliarium spiritualem, si quemdam exoptet, libere sibi eligere potest inter sacerdotes ministerium legitime in dioecesi exercentes; qui tamen indiget confirmatione Ordinarii loci.

Can. 325 – § 1. Christifidelium consociatio privata ea bona quae possidet libere administrat, iuxta statutorum praescripta, salvo iure auctoritatis ecclesiasticae competentis vigilandi ut bona in fines associationis adhibeantur.

§ 2. Eadem subest loci Ordinarii auctoritati ad normam can. 1301 quod attinet ad administrationem erogationemque bonorum, quae ipsi ad pias causas donata aut relicta sint.

Can. 326 – § 1. Extinguitur christifidelium consociatio privata ad normam statutorum; supprimi etiam potest a competenti auctoritate, si eius actio in grave damnum cedit doctrinae vel disciplinae ecclesiasticae, aut scandalo est fidelium.

§ 2. Destinatio bonorum consociationis extinctae ad normam statutorum determinanda est, salvis iuribus quaesitis atque oblatorum voluntate.

згодна з нормай кан. 305, а таксама кіраванню гэтай улады.

§ 2. Касцёльная ўлада таксама павінна, захоўваючы ўласную самастойнасць прыватных аб'яднанняў, сачыць і клапаціцца аб тым, каб пазбягаць марнавання сіл, а іх апостальства скіроўваць да агульнага дабра.

Кан. 324 – § 1. Прыватнае аб'яднанне вернікаў свабодна вызначае сабе кіраўніка і афіцыйных асобаў згодна з нормамі статутаў.

§ 2. Калі прыватнае аб'яднанне вернікаў палічыць гэта патрэбным, можа свабодна выбраць сабе духоўнага дарадчыка сярод святароў, якія легітымна ажыццяўляюць паслугу ў дыяцэзіі; аднак гэты дарадчык павінен быць адобраны ардынарыем месца.

Кан. 325 – § 1. Прыватнае аб'яднанне вернікаў свабодна адмініструе маёмасцю, якая яму належыць, згодна з прадпісаннямі статутаў, але за кампетэнтнай касцёльнай уладай захоўваецца права нагляду за тым, каб гэтая маёмасць выкарыстоўвалася для мэтаў аб'яднання.

§ 2. Яно падпарадкоўваецца ўладзе ардынарыя месца згодна з нормай кан. 1301 у тым, што датычыць адміністравання маёмасцю, якая была падорана або пакінута яму для добрых спраў, а таксама расходавання гэтай маёмасці.

Кан. 326 – § 1. Прыватнае аб'яднанне вернікаў спыняе сваё існаванне згодна з нормамі статутаў; яно таксама можа быць ліквідавана кампетэнтнай уладай, калі яго дзейнасць прычыняе вялікую шкоду вучэнню або касцёльнай дысцыпліне ці з'яўляецца спакусай для вернікаў.

§ 2. Лёс маёмасці аб'яднання, якое спыніла сваё існаванне, павінен быць вызначаны згодна са статутамі, з захаваннем набытых правоў і волі ахвярадаўцаў.

Раздзел IV

Спецыяльныя нормы аб аб'яднаннях свецкіх вернікаў

Кан. 327 – Свецкія вернікі павінны высока цаніць аб'яднанні, скіраваныя на дасягненне духоўных мэтаў, аб якіх гаворыцца ў кан. 298, асабліва тыя, якія маюць ажыўляць лад гэтага свету хрысціянскім духам, і такім чынам садзейнічаюць больш цеснай еднасці паміж верай і жыццём.

Кан. 328 – Тыя, хто ўзначальвае аб'яднанні свецкіх вернікаў, таксама і заснаваныя на моцы апостальскага прывілею, павінны клапаціцца аб тым, каб іх аб'яднанні там, дзе гэта з'яўляецца мэтазгодным, супрацоўнічалі з іншымі аб'яднаннямі вернікаў і ахвотна аказвалі дапамогу розным хрысціянскім справам, асабліва тым, якія існуюць на гэтай жа тэрыторыі.

Кан. 329 – Кіраўнікі аб'яднанняў свецкіх вернікаў павінны клапаціцца аб тым, каб члены аб'яднання мелі належную фармацыю для ажыццяўлення апостальства, уласцівага свецкім вернікам.

Caput IV

Normae speciales de laicorum consociationibus

Can. 327 – Christifideles laici magni faciant consociationes ad spirituales fines, de quibus in can. 298, constitutas, eas speciatim quae rerum temporalium ordinem spiritu christiano animare sibi proponunt atque hoc modo intimam inter fidem et vitam magnopere fovent unionem.

Can. 328 – Qui praesunt consociationibus laicorum, iis etiam quae vi privilegii apostolici erectae sunt, curent ut suae cum aliis christifidelium consociationibus, ubi id expediat, cooperentur, utque variis operibus christianis, praesertim in eodem territorio exsistentibus, libenter auxilio sint.

Can. 329 – Moderatores consociationum laicorum curent, ut sodales consociationis ad apostolatum laicis proprium exercendum debite efformentur.

ЧАСТКА II

ІЕРАРХІЧНАЯ СТРУКТУРА КАСЦЁЛА

PARS II

DE ECCLESIAE CONSTITUTIONE HIERARCHICA

СЕКЦЫЯ I

ВЯРХОЎНАЯ ЎЛАДА КАСЦЁЛА

SECTIO I

DE SUPREMA ECCLESIAE AUCTORITATE

Раздзел I

Рымскі Пантыфік і Калегія біскупаў

Caput I

De Romano Pontifice deque Collegio Episcoporum

Кан. 330 – Як з Божага ўстанаўлення святы Пётр і іншыя Апосталы складаюць адну Ка-

Can. 330 – Sicut, statuente Domino, sanctus Petrus et ceteri Apostoli

unum Collegium constituunt, pari ratione Romanus Pontifex, successor Petri, et Episcopi, successores Apostolorum, inter se coniunguntur.

легію, падобным чынам злучаны паміж сабой Рымскі Пантыфік — наступнік Пятра, і біскупы — наступнікі Апосталаў.

Art. 1. *De Romano Pontifice*

Can. 331 – Ecclesiae Romanae Episcopus, in quo permanet munus a Domino singulariter Petro, primo Apostolorum, concessum et successoribus eius transmittendum, Collegii Episcoporum est caput, Vicarius Christi atque universae Ecclesiae his in terris Pastor; qui ideo vi muneris sui suprema, plena, immediata et universali in Ecclesia gaudet ordinaria potestate, quam semper libere exercere valet.

Артыкул 1. *Рымскі Пантыфік*

Кан. 331 – Біскуп Рымскага Касцёла, у якім трывае заданне, асаблівым чынам даручанае Панам аднаму толькі Пятру, першаму сярод Апосталаў, і якое перадаецца яго наступнікам, з'яўляецца галавой Калегіі Біскупаў, Вікарыем Хрыста і Пастырам паўсюднага Касцёла на ўсёй зямлі; таму ён, на моцы свайго задання, мае ў Касцёле вярхоўную, поўную, непасрэдную і паўсюдную звычайную ўладу, якую заўсёды можа свабодна ажыццяўляць.

Can. 332 – § 1. Plenam et supremam in Ecclesia potestatem Romanus Pontifex obtinet legitima electione ab ipso acceptata una cum episcopali consecratione. Quare, eandem potestatem obtinet a momento acceptationis electus ad summum pontificatum, qui episcopali charactere insignitus est. Quod si charactere episcopali electus careat, statim ordinetur Episcopus.

Кан. 332 – § 1. Рымскі Пантыфік атрымлівае поўную і вярхоўную ўладу ў Касцёле праз легітымны і прыняты ім самім выбар разам з біскупскай кансэкрацыяй. Таму выбраны на гэтую пасаду, які ўжо з'яўляецца адзначаным біскупскай годнасцю, набывае гэтую ўладу з моманту прыняцця ім выбару на Найвышэйшага Пантыфіка. Калі б выбраны не меў біскупскай годнасці, ён павінен быць неадкладна пасвячаны ў біскупы.

§ 2. Si contingat ut Romanus Pontifex muneri suo renuntiet, ad validitatem requiritur ut renuntiatio libere fiat et rite manifestetur, non vero ut a quopiam acceptetur.

§ 2. Калі здарыцца так, што Рымскі Пантыфік адмовіцца ад свайго задання, то для дзейснасці адмовы патрабуецца толькі тое, каб яна была здзейснена дабравольна і абвешчана належным чынам; не патрабуецца, каб хто-небудзь прымаў гэтую адмову.

Can. 333 – § 1. Romanus Pontifex, vi sui muneris, non modo in universam Ecclesiam potestate gaudet, sed et super omnes Ecclesias particulares earumque coetus ordinariae potestatis obtinet principatum, quo quidem insimul roboratur atque vindicatur potestas propria, ordinaria et immediata,

Кан. 333 – § 1. Рымскі Пантыфік на моцы свайго задання не толькі мае ўладу над усім Касцёлам, але таксама атрымлівае першынство звычайнай улады над усімі партыкулярнымі Касцёламі і іх аб'яднаннямі, праз якое, аднак, у той жа час пацвярджаецца і ўмацоўваецца ўласная, звычайная і непа-

срэдная ўлада, якую маюць біскупы ў партыкулярных Касцёлах, даручаных іх апецы.

§ 2. Рымскі Пантыфік у выкананні задання вярхоўнага Пастыра Касцёла заўсёды злучаны ў адзінстве як з іншымі біскупамі, так і з усім Касцёлам; аднак ён мае права адпаведна патрэбам Касцёла акрэсліваць асабісты або калегіяльны спосаб выканання гэтага задання.

§ 3. Супраць рашэння або дэкрэта Рымскага Пантыфіка не можа быць пададзена ні апеляцыя, ні рэкурс.

Кан. 334 – У ажыццяўленні яго задання Рымскаму Пантыфіку садзейнічаюць біскупы, якія могуць аказваць яму дапамогу рознымі спосабамі, між іншымі — праз Сінод Біскупаў. Акрамя гэтага, яму дапамагаюць айцы кардыналы і іншыя асобы, а таксама розныя ўстановы ў залежнасці ад патрабаванняў часу; усе гэтыя асобы і ўстановы выконваюць даручанае ім заданне ад яго імя і яго ўладай для дабра ўсіх Касцёлаў паводле нормаў, акрэсленых правам.

Кан. 335 – Калі Рымская Сталіца застаецца вакантнай або ў яе дзейнасці існуюць перашкоды, у кіраванні паўсюдным Касцёлам нічога не павінна змяняцца; павінны выконвацца спецыяльныя законы, выдадзеныя для такіх абставінаў.

qua in Ecclesias particulares suae curae commissas Episcopi pollent.

§ 2. Romanus Pontifex, in munere supremi Ecclesiae Pastoris explendo, communione cum ceteris Episcopis immo et universa Ecclesia semper est coniunctus; ipsi ius tamen est, iuxta Ecclesiae necessitates, determinare modum, sive personalem sive collegialem, huius muneris exercendi.

§ 3. Contra sententiam vel decretum Romani Pontificis non datur appellatio neque recursus.

Can. 334 – In eius munere exercendo, Romano Pontifici praesto sunt Episcopi, qui eidem cooperatricem operam navare valent variis rationibus, inter quas est synodus Episcoporum. Auxilio praeterea ei sunt Patres Cardinales, necnon aliae personae itemque varia secundum temporum necessitates instituta; quae personae omnes et instituta, nomine et auctoritate ipsius, munus sibi commissum explent in bonum omnium Ecclesiarum, iuxta normas iure definitas.

Can. 335 – Sede romana vacante aut prorsus impedita, nihil innovetur in Ecclesiae universae regimine; serventur autem leges speciales pro iisdem adiunctis latae.

Артыкул 2. *Калегія біскупаў*

Кан. 336 – Калегія Біскупаў, галавой якой з'яўляецца Найвышэйшы Пантыфік, а членамі — біскупы на моцы сакрамэнтальнай кансэкрацыі і іерархічнага адзінства з галавой і членамі Калегіі, і ў якой бесперапынна трывае супольнасць Апосталаў, разам са сваім галавой і ніколі без свайго галавы таксама з'яўляецца носьбітам вярхоўнай і поўнай улады ў паўсюдным Касцёле.

Art. 2. *De Collegio Episcoporum*

Can. 336 – Collegium Episcoporum, cuius caput est Summus Pontifex cuiusque membra sunt Episcopi vi sacramentalis consecrationis et hierarchica communione cum Collegii capite et membris, et in quo corpus apostolicum continuo perseverat, una cum capite suo, et numquam sine hoc capite, subiectum quoque supremae et plenae potestatis in universam Ecclesiam exsistit.

Can. 337 – § 1. Potestatem in universam Ecclesiam Collegium Episcoporum sollemni modo exercet in Concilio Oecumenico.

§ 2. Eandem potestatem exercet per unitam Episcoporum in mundo dispersorum actionem, quae uti talis a Romano Pontifice sit indicta aut libere recepta, ita ut verus actus collegialis efficiatur.

§ 3. Romani Pontificis est secundum necessitates Ecclesiae seligere et promovere modos, quibus Episcoporum Collegium munus suum quoad universam Ecclesiam collegialiter exerceat.

Can. 338 – § 1. Unius Romani Pontificis est Concilium Oecumenicum convocare, eidem per se vel per alios praesidere, item Concilium transferre, suspendere vel dissolvere, eiusque decreta approbare.

§ 2. Eiusdem Romani Pontificis est res in Concilio tractandas determinare atque ordinem in Concilio servandum constituere; propositis a Romano Pontifice quaestionibus Patres Concilii alias addere possunt, ab eodem Romano Pontifice probandas.

Can. 339 – § 1. Ius est et officium omnibus et solis Episcopis qui membra sint Collegii Episcoporum, ut Concilio Oecumenico cum suffragio deliberativo intersint.

§ 2. Ad Concilium Oecumenicum insuper alii aliqui, qui episcopali dignitate non sint insigniti, vocari possunt a suprema Ecclesiae auctoritate, cuius est eorum partes in Concilio determinare.

Can. 340 – Si contingat Apostolicam Sedem durante Concilii celebratione vacare, ipso iure hoc intermittitur,

Кан. 337 – § 1. Калегія Біскупаў урачыста ажыццяўляе ўладу ў паўсюдным Касцёле на Сусветным Саборы.

§ 2. Тую ж уладу яна ажыццяўляе праз сумеснае дзеянне біскупаў, рассеяных па ўсім свеце, якое ў гэтай якасці было пачынаннем Рымскага Пантыфіка або было свабодна ім прынята, каб такім чынам стала сапраўды калегіяльным дзеяннем.

§ 3. Рымскі Пантыфік мае права — адпаведна патрэбам Касцёла — выбіраць і падтрымліваць спосабы, якімі Калегія Біскупаў павінна калегіяльна выконваць сваё заданне ў паўсюдным Касцёле.

Кан. 338 – § 1. Толькі Рымскі Пантыфік мае права склікаць Сусветны Сабор, узначальваць яго асабіста або праз іншых, а таксама пераносіць, прыпыняць або распускаць Сабор і зацвярджаць яго дэкрэты.

§ 2. Рымскі Пантыфік мае таксама права акрэсліваць справы, якія павінны быць абмеркаваны на Саборы, і ўстанаўліваць парадак, які павінен захоўвацца на Саборы; да пытанняў, якія прапанаваў Рымскі Пантыфік, айцы Сабору могуць дадаваць іншыя, якія павінны быць зацверджаны Рымскім Пантыфікам.

Кан. 339 – § 1. Усе біскупы, якія з'яўляюцца членамі Калегіі Біскупаў, і толькі яны, маюць права і абавязак удзельнічаць у Сусветным Саборы з правам вырашальнага голасу.

§ 2. Вярхоўная ўлада Касцёла можа паклікаць на Сусветны Сабор таксама некаторых іншых асобаў, не адзначаных біскупскай годнасцю; гэтая ж улада мае права акрэсліць іх удзел у Саборы.

Кан. 340 – Калі здарыцца так, што падчас працы Сабору Апостальская Сталіца стане вакантнай, на моцы самога права Сабор

прыпыняецца, пакуль новы Найвышэйшы Пантыфік не вырашыць працягнуць яго або распусціць.

Кан. 341 – § 1. Дэкрэты Сусветнага Сабору не маюць абавязковай моцы, калі яны, зацверджаныя Рымскім Пантыфікам разам з айцамі Сабору, не былі адобраны Рымскім Пантыфікам і па яго волі прамульгаваны.

§ 2. Каб мець абавязковую моц, такога ж адабрэння і прамульгацыі патрабуюць і дэкрэты, выдадзеныя Калегіяй Біскупаў, якая выканала ўласнае калегіяльнае дзеянне іншым спосабам, указаным Рымскім Пантыфікам або свабодна ім прынятым у гэтай якасці.

donec novus Summus Pontifex illud continuari iusserit aut dissolverit.

Can. 341 – § 1. Concilii Oecumenici decreta vim obligandi non habent nisi una cum Concilii Patribus a Romano Pontifice approbata, ab eodem fuerint confirmata et eius iussu promulgata.

§ 2. Eadem confirmatione et promulgatione, vim obligandi ut habeant, egent decreta quae ferat Collegium Episcoporum, cum actionem proprie collegialem ponit iuxta alium a Romano Pontifice inductum vel libere receptum modum.

Раздзел II
Сінод біскупаў

Кан. 342 – Сінод Біскупаў з'яўляецца сходам біскупаў, выбраных з розных рэгіёнаў свету, якія збіраюцца ў вызначаны час, каб садзейнічаць цеснаму адзінству паміж Рымскім Пантыфікам і біскупамі, дапамагаць Рымскаму Пантыфіку сваімі парадамі з мэтай захоўвання і памнажэння веры і добрых нораваў, выконвання і ўмацоўвання касцёльнай дысцыпліны, а таксама для таго, каб разглядаць пытанні, якія датычаць дзейнасці Касцёла ў свеце.

Кан. 343 – Заданнем Сінода Біскупаў з'яўляецца тое, каб абмяркоўваць пастаўленыя яму пытанні і выказваць свае прапановы, але не тое, каб вырашаць гэтыя пытанні і выдаваць у гэтых справах дэкрэты, калі ў акрэсленых выпадках Рымскі Пантыфік не надзеліць яго вырашальнай уладай; у гэтым выпадку Рымскі Пантыфік мае права зацвердзіць рашэнні Сінода.

Caput II
De synodo Episcoporum

Can. 342 – Synodus Episcoporum coetus est Episcoporum qui, ex diversis orbis regionibus selecti, statutis temporibus una conveniunt ut arctam coniunctionem inter Romanum Pontificem et Episcopos foveant, utque eidem Romano Pontifici ad incolumitatem incrementumque fidei et morum, ad disciplinam ecclesiasticam servandam et firmandam consiliis adiutricem operam praestent, necnon quaestiones ad actionem Ecclesiae in mundo spectantes perpendant.

Can. 343 – Synodi Episcoporum est de quaestionibus pertractandis disceptare atque expromere optata, non vero easdem dirimere de iisque ferre decreta, nisi certis in casibus potestate deliberativa eandem instruxerit Romanus Pontifex, cuius est in hoc casu decisiones synodi ratas habere.

Can. 344 – Synodus Episcoporum directe subest auctoritati Romani Pontificis, cuius quidem est:

1° synodum convocare, quotiescumque id ipsi opportunum videatur, locumque designare ubi coetus habendi sint;

2° sodalium, qui ad normam iuris peculiaris eligendi sunt, electionem ratam habere aliosque sodales designare et nominare;

3° argumenta quaestionum pertractandarum statuere opportuno tempore ad normam iuris peculiaris ante synodi celebrationem;

4° rerum agendarum ordinem definire;

5° synodo per se aut per alios praeesse;

6° synodum ipsam concludere, transferre, suspendere et dissolvere.

Can. 345 – Synodus Episcoporum congregari potest aut in coetum generalem, in quo scilicet res tractantur ad bonum Ecclesiae universae directe spectantes, qui quidem coetus est sive ordinarius sive extraordinarius, aut etiam in coetum specialem, in quo nempe aguntur negotia quae directe ad determinatam determinatasve regiones attinent.

Can. 346 – § 1. Synodus Episcoporum quae in coetum generalem ordinarium congregatur, constat sodalibus quorum plerique sunt Episcopi, electi pro singulis coetibus ab Episcoporum conferentiis secundum rationem iure peculiari synodi determinatam; alii vi eiusdem iuris deputantur; alii a Romano Pontifice directe nominantur; quibus accedunt aliqui sodales institutorum religiosorum clericalium, qui ad normam eiusdem iuris peculiaris eliguntur.

Кан. 344 – Сінод Біскупаў непасрэдна падпарадкоўваецца ўладзе Рымскага Пантыфіка, які мае права:

1° склікаць Сінод, калі палічыць гэта патрэбным, і вызначаць месца правядзення пасяджэнняў;

2° зацвярджаць выбар членаў Сіноду, выбраных згодна з нормамі асаблівага права, а таксама вылучаць і прызначаць іншых яго членаў;

3° акрэсліваць пытанні, якія павінны быць абмеркаваны, згодна з нормамі асаблівага права, у зручны час перад правядзеннем Сіноду;

4° акрэсліваць парадак працы Сіноду;

5° узначальваць Сінод — асабіста або праз іншых;

6° завяршаць Сінод, пераносіць, прыпыняць і распускаць яго.

Кан. 345 – Сінод Біскупаў можа збірацца або на генеральнае пасяджэнне, на якім менавіта абмяркоўваюцца пытанні, якія непасрэдна датычаць дабра паўсюднага Касцёла, гэтае пасяджэнне можа быць звычайнае або надзвычайнае, або на спецыяльнае пасяджэнне, на якім абмяркоўваюцца справы, якія непасрэдна датычаць аднаго або некалькіх рэгіёнаў.

Кан. 346 – § 1. Сінод Біскупаў, які збіраецца на звычайнае генеральнае пасяджэнне, складаецца з членаў, большую частку якіх утвараюць біскупы, выбраныя на кожнае асобнае пасяджэнне Канферэнцыямі Біскупаў згодна з парадкам, акрэсленым асаблівым правам Сіноду; іншыя скіраваны туды на моцы таго ж права; яшчэ іншыя прызначаны непасрэдна Рымскім Пантыфікам. Да іх далучаюцца некаторыя члены святарскіх манаскіх інстытутаў, выбраныя згодна з нормамі таго ж асаблівага права.

§ 2. Сінод Біскупаў, сабраны на надзвычайнае генеральнае пасяджэнне для разгляду спраў, якія патрабуюць тэрміновага вырашэння, складаецца з членаў, большую частку якіх утвараюць біскупы, вызначаныя згодна з асаблівым правам Сіноду на падставе пасады, якую займаюць; іншыя прызначаюцца непасрэдна Рымскім Пантыфікам; да іх далучаюцца некаторыя члены святарскіх манаскіх інстытутаў, выбраныя згодна з тым жа правам.

§ 3. Сінод Біскупаў, які збіраецца на спецыяльнае пасяджэнне, складаецца з членаў, выбраных пераважна з тых рэгіёнаў, дзеля якіх ён быў скліканы, згодна з нормамі асаблівага права, якім кіруецца Сінод.

Кан. 347 – § 1. Пасля таго, як Рымскі Пантыфік завяршае пасяджэнне Сіноду Біскупаў, спыняюцца заданні, ускладзеныя на біскупаў і іншых членаў на час пасяджэння.

§ 2. Калі пасля склікання Сіноду або падчас яго правядзення Апостальская Сталіца стане вакантнай, на моцы самога права прыпыняецца пасяджэнне Сіноду, а таксама заданні, ускладзеныя на яго членаў, пакуль новы Пантыфік не вырашыць або распусціць пасяджэнне, або працягваць яго.

Кан. 348 – § 1. У Сінодзе Біскупаў дзейнічае пастаянны Генеральны Сакратарыят, які ўзначальвае генеральны сакратар, прызначаны Рымскім Пантыфікам. Генеральнаму сакратару садзейнічае Рада Сакратарыята, якая складаецца з біскупаў, частку якіх выбірае сам Сінод Біскупаў згодна з нормамі асаблівага права, а частку прызначае Рымскі Пантыфік; пры гэтым заданні кожнага з іх спыняюцца з пачаткам новага генеральнага пасяджэння.

§ 2. Апрача гэтага, для кожнага пасяджэння Сіноду Біскупаў устанаўліваецца адзін або некалькі спецыяльных сакрата-

§ 2. Synodus Episcoporum in coetum generalem extraordinarium congregata ad negotia tractanda quae expeditam requirant definitionem, constat sodalibus quorum plerique, Episcopi, a iure peculiari synodi deputantur ratione officii quod adimplent, alii vero a Romano Pontifice directe nominantur; quibus accedunt aliqui sodales institutorum religiosorum clericalium ad normam eiusdem iuris electi.

§ 3. Synodus Episcoporum, quae in coetum specialem congregatur, constat sodalibus delectis praecipue ex iis regionibus pro quibus convocata est, ad normam iuris peculiaris, quo synodus regitur.

Can. 347 – § 1. Cum synodi Episcoporum coetus a Romano Pontifice concluditur, explicit munus in eadem Episcopis aliisque sodalibus commissum.

§ 2. Sede Apostolica post convocatam synodum aut inter eius celebrationem vacante, ipso iure suspenditur synodi coetus, itemque munus sodalibus in eodem commissum, donec novus Pontifex coetum aut dissolvendum aut continuandum decreverit.

Can. 348 – § 1. Synodi Episcoporum habetur secretaria generalis permanens, cui praeest Secretarius generalis, a Romano Pontifice nominatus, cuique praesto est consilium secretariae, constans Episcopis, quorum alii, ad normam iuris peculiaris, ab ipsa synodo Episcoporum eliguntur, alii a Romano Pontifice nominantur, quorum vero omnium munus explicit, ineunte novo coetu generali.

§ 2. Pro quolibet synodi Episcoporum coetu praeterea unus aut plures secretarii speciales constituuntur qui

a Romano Pontifice nominantur, atque in officio ipsis commisso permanent solum usque ad expletum synodi coetum.

Caput III

De Sanctae Romanae Ecclesiae Cardinalibus

Can. 349 – S. R. E. Cardinales peculiare Collegium constituunt, cui competit ut electioni Romani Pontificis provideat ad normam iuris peculiaris; Cardinales item Romano Pontifici adsunt sive collegialiter agendo, cum ad quaestiones maioris momenti tractandas in unum convocantur, sive ut singuli, scilicet variis officiis, quibus funguntur, eidem Romano Pontifici operam praestando in cura praesertim cotidiana universae Ecclesiae.

Can. 350 – § 1. Cardinalium Collegium in tres ordines distribuitur: episcopalem, ad quem pertinent Cardinales quibus a Romano Pontifice titulus assignatur Ecclesiae suburbicariae, necnon Patriarchae orientales qui in Cardinalium Collegium relati sunt; presbyteralem et diaconalem.

§ 2. Cardinalibus ordinis presbyteralis ac diaconalis suus cuique titulus aut diaconia in Urbe assignatur a Romano Pontifice.

§ 3. Patriarchae orientales in Cardinalium Collegium assumpti in titulum habent suam patriarchalem sedem.

§ 4. Cardinalis Decanus in titulum habet dioecesim Ostiensem, una cum alia Ecclesia quam in titulum iam habebat.

§ 5. Per optionem in Consistorio factam et a Summo Pontifice approbatam, possunt, servata prioritate

роў, прызначаных Рымскім Пантыфікам, якія застаюцца на даручанай ім пасадзе толькі да завяршэння пасяджэння Сіноду.

Раздзел III

Кардыналы Святога Рымскага Касцёла

Кан. 349 – Кардыналы Святога Рымскага Касцёла складаюць асаблівую Калегію, якая мае права выбіраць Рымскага Пантыфіка згодна з нормамі асаблівага права. Акрамя гэтага, кардыналы садзейнічаюць Рымскаму Пантыфіку як праз калегіяльныя дзеянні, калі яны бываюць скліканы разам для абмеркавання важных пытанняў, так і паасобку, калі яны менавіта займаюць розныя пасады і гэтым дапамагаюць Рымскаму Пантыфіку, асабліва ў яго штодзённым клопаце аб паўсюдным Касцёле.

Кан. 350 – § 1. Калегія Кардыналаў мае падзел на тры ступені: біскупскую, да якой належаць кардыналы, надзеленыя Рымскім Пантыфікам тытулам аднаго з прыгарадных рымскіх касцёлаў, і ўсходнія Патрыярхі, уключаныя ў Калегію Кардыналаў, прэзбітэрскую і дыяканскую.

§ 2. Кожнага кардынала прэзбітэрскай або дыяканскай ступені Рымскі Пантыфік надзяляе тытулам або дыяканіяй у Рыме.

§ 3. Усходнія Патрыярхі, уключаныя ў Калегію Кардыналаў, маюць у якасці тытула сталіцу свайго патрыярхату.

§ 4. Тытулам кардынала дэкана з'яўляецца дыяцэзія Осціі разам з другім касцёлам, які ўжо быў яго тытулам раней.

§ 5. Па прапанове, прынятай на кансісторыі і зацверджанай Найвышэйшым Пантыфікам, кардыналы могуць, захоўва-

ючы старшынства ступені і вылучэння, будучы ў прэзбітэрскай ступені пераходзіць на іншы тытул, а ў дыяканскай ступені — на іншую дыяканію, а калі яны прабылі ў дыяканскай ступені поўныя дзесяць гадоў, таксама і ў прэзбітэрскую ступень.

§ 6. Кардынал, які па прапанове пераходзіць з дыяканскай ступені ў прэзбітэрскую ступень, займае месца перад усімі кардыналамі прэзбітэрамі, узведзенымі ў кардынальскую годнасць пазней за яго.

Кан. 351 – § 1. Рымскі Пантыфік свабодна вызначае тых, каго ўзводзіць у кардынальскую годнасць, сярод мужчын, якія маюць прынамсі прэзбітэрскае пасвячэнне і асабліва адзначаюцца вучэннем, добрымі норавамі, пабожнасцю і разважлівасцю ў вырашэнні спраў; тыя, хто яшчэ не з'яўляюцца біскупамі, павінны прыняць біскупскую кансэкрацыю.

§ 2. Кардыналамі становяцца праз дэкрэт Рымскага Пантыфіка, абвешчаны перад Калегіяй Кардыналаў; пасля абвяшчэння дэкрэта яны звязаны абавязкамі і карыстаюцца правамі, акрэсленымі законам.

§ 3. Той, хто быў узведзены ў кардынальскую годнасць, аб чым Рымскі Пантыфік абвясціў, аднак, пры гэтым, зарэзерваваў сабе яго імя *in pectore*, часова не звязаны ніякімі кардынальскімі абавязкамі і не карыстаецца іх правамі; аднак, пасля таго, як Рымскі Пантыфік абвесціць яго імя, на яго ўскладаюцца гэтыя абавязкі і ён атрымлівае гэтыя правы, пры гэтым права старшынства належыць яму ад таго дня, калі адбылася рэзервацыя *in pectore*.

Кан. 352 – § 1. Калегію Кардыналаў узначальвае дэкан; на выпадак перашкоды яго замяшчае субдэкан; дэкан або субдэкан не маюць ніякай улады кіравання над іншымі кардыналамі, але лічацца першымі сярод роўных.

ordinis et promotionis, Cardinales ex ordine presbyterali transire ad alium titulum et Cardinales ex ordine diaconali ad aliam diaconiam et, si per integrum decennium in ordine diaconali permanserint, etiam ad ordinem presbyteralem.

§ 6. Cardinalis ex ordine diaconali transiens per optionem ad ordinem presbyteralem, locum obtinet ante omnes illos Cardinales presbyteros, qui post ipsum ad Cardinalatum assumpti sunt.

Can. 351 – § 1. Qui Cardinales promoveantur, libere a Romano Pontifice seliguntur viri, saltem in ordine presbyteratus constituti, doctrina, moribus, pietate necnon rerum agendarum prudentia egregie praestantes; qui nondum sunt Episcopi, consecrationem episcopalem recipere debent.

§ 2. Cardinales creantur Romani Pontificis decreto, quod quidem coram Cardinalium Collegio publicatur; inde a publicatione facta officiis tenentur atque iuribus gaudent lege definitis.

§ 3. Promotus ad cardinalitiam dignitatem, cuius creationem Romanus Pontifex annuntiaverit, nomen autem in pectore sibi reservans, nullis interim tenetur Cardinalium officiis nullisque eorum gaudet iuribus; postquam autem a Romano Pontifice eius nomen publicatum fuerit, iisdem tenetur officiis fruiturque iuribus, sed iure praecedentiae gaudet a die reservationis in pectore.

Can. 352 – § 1. Cardinalium Collegio praeest Decanus, eiusque impediti vices sustinet Subdecanus; Decanus, vel Subdecanus, nulla in ceteros Cardinales gaudet potestate regiminis, sed ut primus inter pares habetur.

§ 2. Officio Decani vacante, Cardinales titulo Ecclesiae suburbicariae decorati, iique soli, praesidente Subdecano si adsit, aut antiquiore ex ipsis, e coetus sui gremio unum eligant qui Decanum Collegii agat; eius nomen ad Romanum Pontificem deferant, cui competit electum probare.

§ 3. Eadem ratione de qua in § 2, praesidente ipso Decano, eligitur Subdecanus; Subdecani quoque electionem probare Romano Pontifici competit.

§ 4. Decanus et Subdecanus, si in Urbe domicilium non habeant, illud ibidem acquirant.

Can. 353 – § 1. Cardinales collegiali actione supremo Ecclesiae Pastori praecipue auxilio sunt in Consistoriis, in quibus iussu Romani Pontificis eoque praesidente congregantur; Consistoria habentur ordinaria aut extraordinaria.

§ 2. In Consistorium ordinarium, convocantur omnes Cardinales, saltem in Urbe versantes, ad consultationem de quibusdam negotiis gravibus, communius tamen contingentibus, aut ad actus quosdam maxime sollemnes peragendos.

§ 3. In Consistorium extraordinarium, quod celebratur cum peculiares Ecclesiae necessitates vel graviora negotia tractanda id suadeant, convocantur omnes Cardinales.

§ 4. Solum Consistorium ordinarium, in quo aliquae sollemnitates celebrantur, potest esse publicum, cum scilicet praeter Cardinales admittuntur Praelati, legati societatum civilium aliive ad illud invitati.

§ 2. Калі пасада дэкана становіцца вакантнай, кардыналы, якія атрымалі тытул прыгараднага касцёла, і толькі яны, пад старшынствам субдэкана, калі ён прысутнічае, або найстарэйшага з іх, выбіраюць сярод сябе таго, хто будзе дэканам Калегіі; яны паведамляюць аб яго імені Рымскага Пантыфіка, які мае права зацвердзіць выбар.

§ 3. Такім жа чынам, аб якім гаворыцца ў § 2, пад старшынствам самога дэкана адбываецца выбар субдэкана; зацвярджэнне выбару субдэкана таксама з'яўляецца правам Рымскага Пантыфіка.

§ 4. Калі дэкан і субдэкан не мелі пастаяннага месца жыхарства ў Рыме, павінны яго там атрымаць.

Кан. 353 – § 1. Кардыналы аказваюць дапамогу вярхоўнаму Пастыру Касцёла праз калегіяльнае дзеянне, асабліва на кансісторыях, на якія яны збіраюцца па волі Рымскага Пантыфіка і пад яго старшынствам; кансісторыі бываюць звычайныя і надзвычайныя.

§ 2. На звычайны кансісторый склікаюцца ўсе кардыналы, прынамсі тыя, якія прысутнічаюць у Рыме, для кансультацыі па асабліва важных справах і тых, якія здараюцца даволі часта, або для здзяйснення некаторых найбольш урачыстых дзеянняў.

§ 3. На надзвычайны кансісторый, які праводзіцца, калі да гэтага схіляюць асаблівыя патрэбы Касцёла або неабходнасць разгляду асабліва важных пытанняў, склікаюцца ўсе кардыналы.

§ 4. Толькі звычайны кансісторый, падчас якога адбываюцца якія-небудзь урачыстасці, можа быць публічным, гэта значыць такім, што на яго, акрамя кардыналаў, дапускаюцца таксама прэлаты, прадстаўнікі грамадзянскіх супольнасцяў і іншыя запрошаныя.

Кан. 354 – Айцы кардыналы, якія ўзначальваюць дыкастэрыі і іншыя пастаянныя ўстановы Рымскай Курыі і Дзяржавы Ватыкан і якім споўнілася семдзесят пяць гадоў, запрошаны падаць адмову ад пасады Рымскаму Пантыфіку, які, разгледзеўшы ўсе абставіны, прыме сваё рашэнне.

Кан. 355 – § 1. Кардыналу дэкану належыць права на пасвячэнне ў біскупы новаабранага Рымскага Пантыфіка, калі ён не мае гэтага пасвячэння; калі дэкан мае перашкоду, гэтае права належыць субдэкану; калі і ён мае перашкоду, гэтае права пераходзіць да найстарэйшага кардынала біскупскай ступені.

§ 2. Кардынал протадыякан абвяшчае народу імя новаабранага Найвышэйшага Пантыфіка; ён таксама ўскладае на мітрапалітаў паліі або перадае паліі іх прадстаўнікам, калі трэба зрабіць гэта замест Рымскага Пантыфіка.

Кан. 356 – На кардыналаў ускладзены абавязак старанна супрацоўнічаць з Рымскім Пантыфікам; таму кардыналы, якія займаюць якую-небудзь пасаду ў Курыі і не з'яўляюцца дыяцэзіяльнымі біскупамі, маюць абавязак рэзідаваць у Рыме; кардыналы, якія апякуюцца якой-небудзь дыяцэзіяй у якасці дыяцэзіяльнага біскупа, павінны прыбыць у Рым кожны раз, калі іх кліча Рымскі Пантыфік.

Кан. 357 – § 1. Кардыналы, якім у якасці тытула быў прызначаны касцёл у прыгарадзе або ў самім Рыме, пасля таго, як прымуць яго ў валоданне, павінны дзейнічаць на карысць гэтых дыяцэзій і касцёлаў праз удзяленне парадаў і апеку; аднак, пры гэтым, яны не маюць ніякай улады кіравання над імі і не павінны ніякім чынам умешвацца ў тое, што датычыць адміністраван-

Can. 354 – Patres Cardinales dicasteriis aliisve institutis permanentibus Romanae Curiae et Civitatis Vaticanae praepositi, qui septuagesimum quintum aetatis annum expleverint, rogantur ut renuntiationem ab officio exhibeant Romano Pontifici qui, omnibus perpensis, providebit.

Can. 355 – § 1. Cardinali Decano competit electum Romanum Pontificem in Episcopum ordinare, si electus ordinatione indigeat; impedito Decano, idem ius competit Subdecano, eoque impedito, antiquiori Cardinali ex ordine episcopali.

§ 2. Cardinalis Proto-diaconus nomen novi electi Summi Pontificis populo annuntiat; item pallia Metropolitis imponit eorumve procuratoribus tradit, vice Romani Pontificis.

Can. 356 – Cardinales obligatione tenentur cum Romano Pontifice sedulo cooperandi; Cardinales itaque quovis officio in Curia fungentes, qui non sint Episcopi dioecesani, obligatione tenentur residendi in Urbe; Cardinales qui alicuius dioecesis curam habent ut Episcopi dioecesani, Urbem petant quoties a Romano Pontifice convocentur.

Can. 357 – § 1. Cardinales, quibus Ecclesia suburbicaria aut ecclesia in Urbe in titulum est assignata, postquam in eiusdem venerunt possessionem, earundem dioecesium et ecclesiarum bonum consilio et patrocinio promoveant, nulla tamen in easdem potestate regiminis pollentes, ac nulla ratione sese in iis interponentes, quae ad earum bonorum administratio-

nem, ad disciplinam aut ecclesiarum servitium spectant.

§ 2. Cardinales extra Urbem et extra propriam dioecesim degentes, in iis quae ad sui personam pertinent exempti sunt a potestate regiminis Episcopi dioecesis in qua commorantur.

Can. 358 – Cardinali, cui a Romano Pontifice hoc munus committitur ut in aliqua sollemni celebratione vel personarum coetu eius personam sustineat, uti *Legatus a latere*, scilicet tamquam eius alter ego, sicuti et illi cui adimplendum concreditur tamquam ipsius *misso speciali* certum munus pastorale, ea tantum competunt quae ab ipso Romano Pontifice eidem demandantur.

Can. 359 – Sede Apostolica vacante, Cardinalium Collegium ea tantum in Ecclesia gaudet potestate, quae in peculiari lege eidem tribuitur.

ня маёмасцю, дысцыпліны або касцёльнага служэння.

§ 2. Кардыналы, якія пражываюць па-за Рымам і па-за сваёй дыяцэзіяй, у тым, што датычыць іх асобы, выключаны з-пад улады кіравання біскупа той дыяцэзіі, у якой яны прабываюць.

Кан. 358 – Кардынал, якому Рымскім Пантыфікам даручана заданне прадстаўляць яго асобу на якой-небудзь урачыстасці або сходзе ў якасці легата *a latere*, гэта значыць у якасці яго «другога я», а таксама кардынал, якому Рымскім Пантыфікам даверана выканаць акрэсленае пастырскае заданне ў якасці спецыяльнага пасланніка, мае толькі тыя паўнамоцтвы, якія даручаны яму самім Рымскім Пантыфікам.

Кан. 359 – У той час, калі Апостальская Сталіца застаецца вакантнай, Калегія Кардыналаў мае ў Касцёле толькі тую ўладу, якая дадзена ёй у асаблівым законе.

Caput IV
De Curia Romana

Can. 360 – Curia Romana, qua negotia Ecclesiae universae Summus Pontifex expedire solet et quae nomine et auctoritate ipsius munus explet in bonum et in servitium Ecclesiarum, constat Secretaria Status seu Papali, Consilio pro publicis Ecclesiae negotiis, Congregationibus, Tribunalibus, aliisque Institutis, quorum omnium constitutio et competentia lege peculiari definiuntur.

Can. 361 – Nomine Sedis Apostolicae vel Sanctae Sedis in hoc Codice veniunt non solum Romanus Pontifex, sed etiam, nisi ex rei natura vel ser-

Раздзел IV
Рымская курыя

Кан. 360 – Рымская Курыя, з дапамогай якой Найвышэйшы Пантыфік звычайна вырашае справы паўсюднага Касцёла і якая ад яго імя і яго ўладай выконвае сваё заданне для дабра Касцёлаў і для служэння ім, складаецца з Дзяржаўнага, іншымі словамі — Папскага Сакратарыята, Рады па публічных справах Касцёла, кангрэгацый, трыбуналаў і іншых устаноў, структура і паўнамоцтвы якіх акрэсліваюцца асаблівымі законамі.

Кан. 361 – Пад выразамі «Апостальская Сталіца» або «Святая Сталіца» ў гэтым Кодэксе маецца на ўвазе не толькі Рымскі Пантыфік, але таксама Дзяржаўны Сакра-

тарыят, Рада па публічных справах Касцёла і іншыя ўстановы Рымскай Курыі, калі з сутнасці рэчы або з кантэксту не вынікае іншае.

monis contextu aliud appareat, Secretaria Status, Consilium pro publicis Ecclesiae negotiis, aliaque Romanae Curiae Instituta.

Раздзел V
Легаты Рымскага Пантыфіка

Caput V
De Romani Pontificis Legatis

Кан. 362 – Рымскі Пантыфік мае прыроджанае і незалежнае права прызначаць і кіраваць сваіх легатаў як да партыкулярных Касцёлаў у розных краінах і рэгіёнах, так і разам з тым да дзяржаў і публічных уладаў, а таксама пераносіць і адклікаць іх, захоўваючы нормы міжнароднага права адносна скіравання і адклікання легатаў, устаноўленых пры дзяржавах.

Can. 362 – Romano Pontifici ius est nativum et independens Legatos suos nominandi ac mittendi sive ad Ecclesias particulares in variis nationibus vel regionibus, sive simul ad Civitates et ad publicas Auctoritates, itemque eos transferendi et revocandi, servatis quidem normis iuris internationalis, quod attinet ad missionem et revocationem Legatorum apud Res Publicas constitutorum.

Кан. 363 – § 1. Легатам Рымскага Пантыфіка даручаны абавязак пастаяннага прадстаўлення асобы Рымскага Пантыфіка пры партыкулярных Касцёлах або таксама пры дзяржавах ці публічных уладах, да якіх яны былі скіраваны.

Can. 363 – § 1. Legatis Romani Pontificis officium committitur ipsius Romani Pontificis stabili modo gerendi personam apud Ecclesias particulares aut etiam apud Civitates et publicas Auctoritates, ad quas missi sunt.

§ 2. Апостальскую Сталіцу прадстаўляюць таксама тыя, хто быў скіраваны з папскай місіяй у якасці дэлегатаў ці назіральнікаў пры міжнародных арганізацыях або на канферэнцыі і сходы.

§ 2. Personam gerunt Apostolicae Sedis ii quoque, qui in pontificiam Missionem ut Delegati aut Observatores deputantur apud Consilia internationalia aut apud Conferentias et Conventus.

Кан. 364 – Галоўным заданнем папскага легата з'яўляецца тое, каб повязі еднасці, якія існуюць паміж Апостальскай Сталіцай і партыкулярнымі Касцёламі, пастаянна ўмацоўваліся і станавіліся больш выніковымі. Такім чынам, у сваёй акрузе папскі легат павінен:

Can. 364 – Praecipuum munus Legati pontificii est ut firmiora et efficaciora in dies reddantur unitatis vincula, quae inter Apostolicam Sedem et Ecclesias particulares intercedunt. Ad pontificium ergo Legatum pertinet pro sua dicione:

1° паведамляць Апостальскую Сталіцу аб умовах, у якіх знаходзяцца партыкулярныя Касцёлы, і аб усім, што датычыць самога жыцця Касцёла і дабра душ;

1° ad Apostolicam Sedem notitias mittere de condicionibus in quibus versantur Ecclesiae particulares, deque omnibus quae ipsam vitam Ecclesiae et bonum animarum attingant;

2° Episcopis actione et consilio adesse, integro quidem manente eorundem legitimae potestatis exercitio;

3° crebras fovere relationes cum Episcoporum conferentia, eidem omnimodam operam praebendo;

4° ad nominationem Episcoporum quod attinet, nomina candidatorum Apostolicae Sedi transmittere vel proponere necnon processum informativum de promovendis instruere, secundum normas ab Apostolica Sede datas;

5° anniti ut promoveantur res quae ad pacem, ad progressum et consociatam populorum operam spectant;

6° operam conferre cum Episcopis, ut opportuna foveantur commercia inter Ecclesiam catholicam et alias Ecclesias vel communitates ecclesiales, immo et religiones non christianas;

7° ea quae pertinent ad Ecclesiae et Apostolicae Sedis missionem, consociata cum Episcopis actione, apud moderatores Civitatis tueri;

8° exercere praeterea facultates et cetera explere mandata quae ipsi ab Apostolica Sede committantur.

Can. 365 – § 1. Legati pontificii, qui simul legationem apud Civitates iuxta iuris internationalis normas exercet, munus quoque peculiare est:

1° promovere et fovere necessitudines inter Apostolicam Sedem et Auctoritates Rei Publicae;

2° quaestiones pertractare quae ad relationes inter Ecclesiam et Civitatem pertinent; et peculiari

2° садзейнічаць біскупам дзеяннямі і парадамі, захоўваючы непарушным ажыццяўленне імі сваёй легітымнай улады;

3° падтрымліваць цесныя сувязі з Канферэнцыяй Біскупаў, аказваючы ёй усялякую дапамогу;

4° у тым, што датычыць прызначэння біскупаў, перасылаць або прапаноўваць Апостальскай Сталіцы імёны кандыдатаў, а таксама праводзіць інфармацыйны працэс у дачыненні да кандыдатаў згодна з нормамі, выдадзенымі Апостальскай Сталіцай;

5° усімі сіламі падтрымліваць справы, якія служаць прагрэсу і міжнароднаму супрацоўніцтву;

6° разам з біскупамі прыкладаць намаганні да таго, каб падтрымліваліся адпаведныя адносіны паміж Каталіцкім Касцёлам і іншымі Касцёламі або касцёльнымі супольнасцямі, а нават з нехрысціянскімі рэлігіямі;

7° у супрацоўніцтве з біскупамі абараняць перад кіраўнікамі дзяржавы тое, што датычыць місіі Касцёла і Апостальскай Сталіцы;

8° акрамя гэтага, ажыццяўляць паўнамоцтвы і выконваць іншыя ўпаўнаважанні, даверaныя Апостальскай Сталіцай.

Кан. 365 – § 1. На папскага легата, які, згодна з нормамі міжнароднага права, ажыццяўляе разам з тым місію пры дзяржаве, ускладаецца таксама асаблівае заданне:

1° падтрымліваць і развіваць сувязі паміж Апостальскай Сталіцай і дзяржаўнымі ўладамі;

2° праводзіць перамовы па пытаннях, якія датычаць адносін паміж Касцёлам і дзяржавай, і асаблівым чынам

прыкладаць намаганні да заключэння канкардату і іншых дамоваў такога роду, а таксама да іх выконвання.

§ 2. Пры вырашэнні спраў, аб якіх гаворыцца ў § 1, калі гэтага патрабуюць абставіны, папскі легат не павінен занядбоўваць тое, каб даведацца аб меркаваннях і парадах біскупаў касцёльнай акругі і паведамляць іх аб ходзе спраў.

Кан. 366 – Беручы пад увагу асаблівы характар задання легата:

1° сядзіба папскага легата выключана з-пад улады кіравання ардынарыя месца, калі гаворка не ідзе пра заключэнне сужэнстваў;

2° папскі легат мае права здзяйсняць літургічныя цэлебрацыі ва ўсіх касцёлах на тэрыторыі свайго прадстаўніцтва, таксама ў пантыфікаліях, па магчымасці папярэдзіўшы аб гэтым ардынарыя месца.

Кан. 367 – Калі Апостальская Сталіца становіцца вакантнай, заданне папскага легата не спыняецца, калі іншае не ўстаноўлена ў лісце Пантыфіка; аднак ён вызваляецца ад задання пасля выканання ўпаўнаважання, а таксама праз адкліканне, аб якім ён быў паведамлены, і праз адмову ад пасады, прынятую Рымскім Пантыфікам.

modo agere de concordatis aliisque huiusmodi conventionibus conficiendis et ad effectum deducendis.

§ 2. In negotiis, de quibus in § 1, expediendis, prout adiuncta suadeant, Legatus pontificius sententiam et consilium Episcoporum dicionis ecclesiasticae exquirere ne omittat, eosque de negotiorum cursu certiores faciat.

Can. 366 – Attenta peculiari Legati muneris indole:

1° sedes Legationis pontificiae a potestate regiminis Ordinarii loci exempta est, nisi agatur de matrimoniis celebrandis;

2° Legato pontificio fas est, praemonitis, quantum fieri potest, locorum Ordinariis, in omnibus ecclesiis suae legationis liturgicas celebrationes, etiam in pontificalibus, peragere.

Can. 367 – Pontificii Legati munus non exspirat vacante Sede Apostolica, nisi aliud in litteris pontificiis statuatur; cessat autem expleto mandato, revocatione eidem intimata, renuntiatione a Romano Pontifice acceptata.

SECTIO II

DE ECCLESIIS PARTICULARIBUS DEQUE EARUNDEM COETIBUS

TITULUS I

DE ECCLESIIS PARTICULARIBUS ET DE AUCTORITATE IN IISDEM CONSTITUTA

Caput I

De Ecclesiis particularibus

Can. 368 – Ecclesiae particulares, in quibus et ex quibus una et unica Ecclesia catholica exsistit, sunt imprimis dioeceses, quibus, nisi aliud constet, assimilantur praelatura territorialis et abbatia territorialis, vicariatus apostolicus et praefectura apostolica necnon administratio apostolica stabiliter erecta.

Can. 369 – Dioecesis est populi Dei portio, quae Episcopo cum cooperatione presbyterii pascenda concreditur, ita ut, pastori suo adhaerens ab eoque per Evangelium et Eucharistiam in Spiritu Sancto congregata, Ecclesiam particularem constituat, in qua vere inest et operatur una sancta catholica et apostolica Christi Ecclesia.

Can. 370 – Praelatura territorialis aut abbatia territorialis est certa populi Dei portio, territorialiter quidem circumscripta, cuius cura, specialia ob adiuncta, committitur alicui Praelato aut Abbati, qui eam, ad instar Episcopi dioecesani, tamquam proprius eius pastor regat.

Can. 371 – § 1. Vicariatus apostolicus vel praefectura apostolica est certa populi Dei portio quae, ob peculiaria

СЕКЦЫЯ II

ПАРТЫКУЛЯРНЫЯ КАСЦЁЛЫ І ІХ АБ'ЯДНАННІ

ТЫТУЛ I

ПАРТЫКУЛЯРНЫЯ КАСЦЁЛЫ І ЎСТАНОЎЛЕНАЯ Ў ІХ УЛАДА

Раздзел I

Партыкулярныя Касцёлы

Кан. 368 – Партыкулярныя Касцёлы, у якіх і з якіх існуе адзін і адзіны Каталіцкі Касцёл, — гэта перадусім дыяцэзіі, да якіх, калі не ўстаноўлена іншае, прыраўноўваюцца тэрытарыяльная прэлатура і тэрытарыяльнае абацтва, апостальскі вікарыят і апостальская прэфектура, а таксама апостальская адміністратура, заснаваная на пастаянна.

Кан. 369 – Дыяцэзія — гэта частка Божага народа, даверaная пастырскай апецы біскупа ў супрацоўніцтве з прэзбітэрыем такім чынам, каб, трымаючыся свайго пастыра і сабраная ім у Святым Духу праз Евангелле і Эўхарыстыю, утварала партыкулярны Касцёл, у якім сапраўды існуе і дзейнічае адзіны святы каталіцкі і апостальскі Касцёл Хрыстовы.

Кан. 370 – Тэрытарыяльная прэлатура або тэрытарыяльнае абацтва — гэта акрэсленая частка Божага народа, абмежаваная тэрытарыяльна, апека над якой, з увагі на асобыя абставіны, даручаецца акрэсленаму прэлату або абату, каб ён кіраваў ёю ў якасці яе ўласнага пастыра на ўзор дыяцэзіяльнага біскупа.

Кан. 371 – § 1. Апостальскі вікарыят або апостальская прэфектура — гэта акрэсленая частка Божага народа, якая з увагі

на асаблівыя абставіны яшчэ не ўтворана ў якасці дыяцэзіі і даручана пастырскай апецы апостальскага вікарыя або апостальскага прэфекта, якія кіруюць ёю ад імя Найвышэйшага Пантыфіка.

§ 2. Апостальская адміністратура — гэта акрэсленая частка Божага народа, якая з увагі на асобыя і вельмі важкія прычыны не заснавана Найвышэйшым Пантыфікам у якасці дыяцэзіі і даручана пастырскай апецы апостальскага адміністратара, які кіруе ёю ад імя Найвышэйшага Пантыфіка.

adiuncta, in dioecesim nondum est constituta, quaeque pascenda committitur Vicario apostolico aut Praefecto apostolico, qui eam nomine Summi Pontificis regant.

§ 2. Administratio apostolica est certa populi Dei portio, quae ob speciales et graves omnino rationes a Summo Pontifice in dioecesim non erigitur, et cuius cura pastoralis committitur Administratori apostolico, qui eam nomine Summi Pontificis regat.

Кан. 372 – § 1. Павінна лічыцца правілам, што частка Божага народа, якая ўтварае дыяцэзію або іншы партыкулярны Касцёл, павінна абмяжоўвацца акрэсленай тэрыторыяй такім чынам, каб ахоплівaць усіх вернікаў, якія пражываюць на гэтай тэрыторыі.

Can. 372 – § 1. Pro regula habeatur ut portio populi Dei quae dioecesim aliamve Ecclesiam particularem constituat, certo territorio circumscribatur, ita ut omnes comprehendat fideles in territorio habitantes.

§ 2. Аднак там, дзе, згодна з суджэннем вярхоўнай улады Касцёла, якая выслухала зацікаўленыя Канферэнцыі Біскупаў, гэта будзе карысна, на той самай тэрыторыі могуць быць заснаваны партыкулярныя Касцёлы, якія адрозніваюцца адзін ад аднаго абрадам вернікаў ці па іншым падобным крытэрыі.

§ 2. Attamen, ubi de iudicio supremae Ecclesiae auctoritatis, auditis Episcoporum conferentiis quarum interest, utilitas id suadeat, in eodem territorio erigi possunt Ecclesiae particulares ritu fidelium aliave simili ratione distinctae.

Кан. 373 – Толькі вярхоўная ўлада мае права на заснаванне партыкулярных Касцёлаў, якія, будучы легітымна заснаванымі, маюць правасуб'ектнасць на моцы самога права.

Can. 373 – Unius supremae auctoritatis est Ecclesias particulares erigere; quae legitime erectae, ipso iure personalitate iuridica gaudent.

Кан. 374 – § 1. Кожная дыяцэзія або іншы партыкулярны Касцёл павінны дзяліцца на асобныя часткі, іншымі словамі — парафіі.

Can. 374 – § 1. Quaelibet dioecesis aliave Ecclesia particularis dividatur in distinctas partes seu paroecias.

§ 2. Для садзейнічання пастырскай апецы праз сумесную дзейнасць некалькі суседніх парафій могуць быць аб'яднаны ў асаблівыя групы, якімі з'яўляюцца акруговыя вікарыяты.

§ 2. Ad curam pastoralem per communem actionem fovendam plures paroeciae viciniores coniungi possunt in peculiares coetus, uti sunt vicariatus foranei.

Caput II

De Episcopis

Раздзел II

Біскупы

Art. 1. *De Episcopis in genere*

Артыкул 1. *Біскупы наогул*

Can. 375 – § 1. Episcopi, qui ex divina institutione in Apostolorum locum succedunt per Spiritum Sanctum qui datus est eis, in Ecclesia Pastores constituuntur, ut sint et ipsi doctrinae magistri, sacri cultus sacerdotes et gubernationis ministri.

Кан. 375 – § 1. Біскупы, якія з Божага ўстанаўлення з'яўляюцца наступнікамі Апосталаў праз дадзенага ім Святога Духа, устаноўлены ў Касцёле пастырамі, каб яны былі настаўнікамі вучэння, святарамі святога культу і тымі, хто выконвае паслугу кіравання.

§ 2. Episcopi ipsa consecratione episcopali recipiunt cum munere sanctificandi munera quoque docendi et regendi, quae tamen natura sua nonnisi in hierarchica communione cum Collegii capite et membris exercere possunt.

§ 2. На моцы самой біскупскай кансэкрацыі біскупы атрымліваюць разам з заданнем асвячэння таксама заданне навучання і кіравання, якія з увагі на сваю прыроду могуць ажыццяўляцца толькі ў іерархічным адзінстве з галавой Калегіі і яе членамі.

Can. 376 – Episcopi vocantur *dioecesani*, quibus scilicet alicuius dioecesis cura commissa est; ceteri *titulares* appellantur.

Кан. 376 – Біскупы называюцца дыяцэзіяльнымі, калі ім даручана апека над якой-небудзь дыяцэзіяй; іншыя біскупы называюцца тытулярнымі.

Can. 377 – § 1. Episcopos libere Summus Pontifex nominat, aut legitime electos confirmat.

Кан. 377 – § 1. Найвышэйшы Пантыфік свабодна прызначае біскупаў або адабрае легітымна выбраных.

§ 2. Singulis saltem trienniis Episcopi provinciae ecclesiasticae vel, ubi adiuncta id suadeant, Episcoporum conferentiae, communi consilio et secreto elenchum componant presbyterorum etiam sodalium institutorum vitae consecratae, ad episcopatum aptiorum, eumque Apostolicae Sedi transmittant, firmo manente iure uniuscuiusque Episcopi Apostolicae Sedi nomina presbyterorum, quos episcopali munere dignos et idoneos putet, seorsim patefaciendi.

§ 2. Прынамсі адзін раз на тры гады біскупы касцёльнай правінцыі або — калі гэтага патрабуюць абставіны — Канферэнцыі Біскупаў, пасля супольнай нарады і захоўваючы таямніцу, павінны скласці спіс святароў, у тым ліку членаў інстытутаў кансэкраванага жыцця, прыдатных да біскупства, і пераслаць яго Апостальскай Сталіцы, аднак кожны біскуп захоўвае права асобна падаваць Апостальскай Сталіцы імёны святароў, якіх ён лічыць годнымі і прыдатнымі да ажыццяўлення біскупскага задання.

§ 3. Nisi aliter legitime statutum fuerit, quoties nominandus est Epi-

§ 3. Калі не будзе легітымна пастаноўлена іначай, заўсёды, калі павінен быць

прызначаны дыяцэзіяльны біскуп або біскуп-каад'ютар, для прадстаўлення Апостальскай Сталіцы так званай «тройкі» кандыдатаў папскі легат павінен паасобку сабраць звесткі і разам са сваім меркаваннем прадставіць Апостальскай Сталіцы прапановы, зробленыя мітрапалітам і суфраганамі правінцыі, да якой належыць або да якой далучана дыяцэзія, куды трэба прызначыць біскупа, а таксама меркаванне старшыні Канферэнцыі Біскупаў; акрамя гэтага, папскі легат павінен выслухаць некаторых членаў Калегіі Кансультантаў і катэдральнага Капітула і, калі палічыць гэта патрэбным, паасобку і з захоўваннем таямніцы даведацца аб меркаваннях іншых духоўных асобаў, секулярных і манаскіх, а таксама свецкіх асобаў, якія адзначаюцца мудрасцю.

§ 4. Калі не будзе легітымна пастаноўлена іначай, дыяцэзіяльны біскуп, які лічыць, што яго дыяцэзіі неабходны дапаможны біскуп, павінен прапанаваць Апостальскай Сталіцы спіс прынамсі з трох святароў, найбольш прыдатных да гэтай пасады.

§ 5. На будучыню дзяржаўным уладам не пакідаюцца ніякія правы і прывілеі на выбар, прадстаўленне або вылучэнне біскупаў.

Кан. 378 – § 1. Для прыдатнасці кандыдата ў біскупы патрабуецца, каб ён:

1° адзначаўся моцнай верай, добрымі норавамі, пабожнасцю, клопатам аб душах, мудрасцю, разважнасцю і чалавечымі цнотамі, а таксама быў надзелены іншымі якасцямі, якія робяць яго прыдатным да выконвання гэтай пасады;

2° меў добрую рэпутацыю;

3° дасягнуў прынамсі трыццаціпяцігадовага ўзросту;

scopus dioecesanus aut Episcopus coadiutor, ad ternos, qui dicuntur, Apostolicae Sedi proponendos, pontificii Legati est singillatim requirere et cum ipsa Apostolica Sede communicare, una cum suo voto, quid suggerant Metropolita et Suffraganei provinciae, ad quam providenda dioecesis pertinet vel quacum in coetum convenit, necnon conferentiae Episcoporum praeses; pontificius Legatus, insuper, quosdam e collegio consultorum et capitulo cathedrali audiat et, si id expedire iudicaverit, sententiam quoque aliorum ex utroque clero necnon laicorum sapientia praestantium singillatim et secreto exquirat.

§ 4. Nisi aliter legitime provisum fuerit, Episcopus dioecesanus, qui auxiliarem suae dioecesi dandum aestimet, elenchum trium saltem presbyterorum ad hoc officium aptiorum Apostolicae Sedi proponat.

§ 5. Nulla in posterum iura et privilegia electionis, nominationis, praesentationis vel designationis Episcoporum civilibus auctoritatibus conceduntur.

Can. 378 – § 1. Ad idoneitatem candidatorum Episcopatus requiritur ut quis sit:

1° firma fide, bonis moribus, pietate, animarum zelo, sapientia, prudentia et virtutibus humanis excellens, ceterisque dotibus praeditus quae ipsum aptum efficiant ad officium de quo agitur explendum;

2° bona exsistimatione gaudens;

3° annos natus saltem triginta quinque;

4° a quinquennio saltem in presbyteratus ordine constitutus;

5° laurea doctoris vel saltem licentia in sacra Scriptura, theologia aut iure canonico potitus in instituto studiorum superiorum a Sede Apostolica probato, vel saltem in iisdem disciplinis vere peritus.

§ 2. Iudicium definitivum de promovendi idoneitate ad Apostolicam Sedem pertinet.

Can. 379 – Nisi legitimo detineatur impedimento, quicumque ad Episcopatum promotus debet intra tres menses ab acceptis apostolicis litteris consecrationem episcopalem recipere, et quidem antequam officii sui possessionem capiat.

Can. 380 – Antequam canonicam possessionem sui officii capiat, promotus fidei professionem emittat atque iusiurandum fidelitatis erga Apostolicam Sedem praestet secundum formulam ab eadem Apostolica Sede probatam.

4° меў прынамсі пяць гадоў прэзбітэрскага служэння;

5° атрымаў ступень доктара або прынамсі ліцэнзіята Святога Пісання, тэалогіі або кананічнага права ў адной з вышэйшых навучальных устаноў, зацверджаных Апостальскай Сталіцай, ці прынамсі быў сапраўдным спецыялістам у гэтых навуках.

§ 2. Канчатковае суджэнне аб прыдатнасці кандыдата належыць Апостальскай Сталіцы.

Кан. 379 – Калі не існуе легітымнай перашкоды, той, хто быў вылучаны ў біскупы, павінен на працягу трох месяцаў ад атрымання апостальскага ліста прыняць біскупскую кансэкрацыю, гэта павінна адбыцца перад прыняццем пасады ў валоданне.

Кан. 380 – Перад кананічным прыняццем сваёй пасады ў валоданне вылучаны павінен прамовіць вызнанне веры і скласці прысягу на вернасць Апостальскай Сталіцы згодна з формулай, зацверджанай Апостальскай Сталіцай.

Art. 2. *De Episcopis dioecesanis*

Can. 381 – § 1. Episcopo dioecesano in dioecesi ipsi commissa omnis competit potestas ordinaria, propria et immediata, quae ad exercitium eius muneris pastoralis requiritur, exceptis causis quae iure aut Summi Pontificis decreto supremae aut alii auctoritati ecclesiasticae reserventur.

§ 2. Qui praesunt aliis communitatibus fidelium, de quibus in can. 368, Episcopo dioecesano in iure aequiparantur, nisi ex rei natura aut iuris praescripto aliud appareat.

Артыкул 2. *Дыяцэзіяльныя біскупы*

Кан. 381 – § 1. Дыяцэзіяльнаму біскупу ў даручанай яму дыяцэзіі належыць уся звычайная, уласная і непасрэдная ўлада, якая патрабуецца для ажыццяўлення яго пастырскага задання, за выключэннем тых спраў, якія на моцы права або дэкрэта Найвышэйшага Пантыфіка зарэзерваваны за вярхоўнай або іншай касцёльнай уладай.

§ 2. Тыя, хто ўзначальвае іншыя супольнасці вернікаў, аб якіх гаворыцца ў кан. 368, прыраўноўваюцца ў праве да дыяцэзіяльнага біскупа, калі з сутнасці рэчы або прадпісання права не вынікае іншае.

Кан. 382 – § 1. Вылучаны біскуп не можа прыступіць да выконвання даручанай яму пасады, пакуль не прыме дыяцэзію ў кананічнае валоданне; аднак ён можа выконваць пасады, якія займаў у дыяцэзіі ў час вылучэння, захоўваючы прадпісанні кан. 409 § 2.

§ 2. Калі не стрымлівае легітымная перашкода, вылучаны на пасаду дыяцэзіяльнага біскупа павінен прыняць у кананічнае валоданне сваю дыяцэзію: калі ён яшчэ не з'яўляецца кансэкраваным біскупам — на працягу чатырох месяцаў ад атрымання апостальскага ліста, калі ж ужо з'яўляецца кансэкраваным біскупам — на працягу двух месяцаў ад атрымання апостальскага ліста.

§ 3. Біскуп прымае дыяцэзію ў кананічнае валоданне адразу пасля таго, як у гэтай дыяцэзіі асабіста або праз прадстаўніка прадставіць Калегіі Кансультантаў апостальскі ліст у прысутнасці канцлера Курыі, які павінен скласці аб гэтым акт, або ў новазаснаваных дыяцэзіях адразу пасля таго, як абвесціць гэты ліст у катэдральным касцёле ў прысутнасці духавенства і вернікаў, пры гэтым старэйшы сярод прысутных прэзбітэраў павінен скласці акт аб гэтым.

§ 4. Вельмі рэкамендуецца, каб прыняцце ў кананічнае валоданне адбывалася падчас літургічнага дзеяння ў катэдральным касцёле ў прысутнасці духавенства і вернікаў.

Кан. 383 – § 1. Ажыццяўляючы пастырскае заданне, дыяцэзіяльны біскуп павінен клапаціцца аб усіх верніках, даручаных яго апецы, незалежна ад узросту, становішча і нацыянальнасці — як аб тых, хто пражывае на яго тэрыторыі, так і аб тых, хто на ёй знаходзіцца часова, — праяўляючы

Can. 382 – § 1. Episcopus promotus in exercitium officii sibi commissi sese ingerere nequit, ante captam dioecesis canonicam possessionem; exercere tamen valet officia, quae in eadem dioecesi tempore promotionis iam retinebat, firmo praescripto can. 409, § 2.

§ 2. Nisi legitimo detineatur impedimento, promotus ad officium Episcopi dioecesani debet canonicam suae dioecesis possessionem capere, si iam non sit consecratus Episcopus, intra quattuor menses a receptis apostolicis litteris; si iam sit consecratus, intra duos menses ab iisdem receptis.

§ 3. Canonicam dioecesis possessionem capit Episcopus simul ac in ipsa dioecesi, per se vel per procuratorem, apostolicas litteras collegio consultorum ostenderit, praesente curiae cancellario, qui rem in acta referat, aut, in dioecesibus noviter erectis, simul ac clero populoque in ecclesia cathedrali praesenti earundem litterarum communicationem procuraverit, presbytero inter praesentes seniore in acta referente.

§ 4. Valde commendatur ut captio canonicae possessionis cum actu liturgico in ecclesia cathedrali fiat, clero et populo adstantibus.

Can. 383 – § 1. In exercendo munere pastoris, Episcopus dioecesanus sollicitum se praebeat erga omnes christifideles qui suae curae committuntur, cuiusvis sint aetatis, condicionis vel nationis, tum in territorio habitantes tum in eodem ad tempus versantes, animum intendens apostolicum

ad eos etiam qui ob vitae suae condicionem ordinaria cura pastorali non satis frui valeant necnon ad eos qui a religionis praxi defecerint.

§ 2. Fideles diversi ritus in sua dioecesi si habeat, eorum spiritualibus necessitatibus provideat sive per sacerdotes aut paroecias eiusdem ritus, sive per Vicarium episcopalem.

§ 3. Erga fratres, qui in plena communione cum Ecclesia catholica non sint, cum humanitate et caritate se gerat, oecumenismum quoque fovens prout ab Ecclesia intellegitur.

§ 4. Commendatos sibi in Domino habeat non baptizatos, ut et ipsis caritas eluceat Christi, cuius testis coram omnibus Episcopus esse debet.

Can. 384 – Episcopus dioecesanus peculiari sollicitudine prosequatur presbyteros, quos tamquam adiutores et consiliarios audiat, eorum iura tutetur et curet ut ipsi obligationes suo statui proprias rite adimpleant iisdemque praesto sint media et institutiones, quibus ad vitam spiritualem et intellectualem fovendam egeant; item curet ut eorum honestae sustentationi atque assistentiae sociali, ad normam iuris, prospiciatur.

Can. 385 – Episcopus dioecesanus vocationes ad diversa ministeria et ad vitam consecratam quam maxime foveat, speciali cura vocationibus sacerdotalibus et missionalibus adhibita.

Can. 386 – § 1. Veritates fidei credendas et moribus applicandas Episcopus dioecesanus fidelibus proponere et illustrare tenetur, per se ipse frequenter praedicans; curet etiam

апостальскі клопат таксама аб тых, хто па прычыне ўмоваў свайго жыцця не можа ў дастатковай меры карыстацца звычайнай пастырскай апекай, і тых, хто адышоў ад рэлігійнага жыцця.

§ 2. Калі ў яго дыяцэзіі ёсць вернікі розных абрадаў, ён павінен задаволіць іх духоўныя патрэбы праз святароў ці парафіі дадзенага абраду або праз біскупскага вікарыя.

§ 3. Да братоў, якія не знаходзяцца ў поўным адзінстве з Каталіцкім Касцёлам, ён павінен адносіцца з чалавечнасцю і любоўю, а таксама садзейнічаць экуменізму адпаведна разуменню Касцёла.

§ 4. Ён павінен лічыць даручанымі яму ў Пану таксама неахрышчаных, каб і іх асвяціла любоў Хрыста, сведкам якой перад усімі павінен быць біскуп.

Кан. 384 – Дыяцэзіяльны біскуп павінен з асаблівым клопатам адносіцца да прэзбітэраў, якіх ён павінен выслухоўваць як памочнікаў і дарадчыкаў, абараняць іх правы і сачыць за тым, каб яны належным чынам выконвалі абавязкі свайго стану, а таксама за тым, каб яны мелі сродкі і ўстановы, патрэбныя для развіцця свайго духоўнага і інтэлектуальнага жыцця; таксама ён павінен, згодна з нормамі права, клапаціцца аб іх годным утрыманні і сацыяльным забеспячэнні.

Кан. 385 – Дыяцэзіяльны біскуп павінен як мага больш клапаціцца аб пакліканнях да розных паслугаў і да кансэкраванага жыцця, праяўляючы асобы клопат аб святарскіх і місійных пакліканнях.

Кан. 386 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп павінен, часта прапаведуючы асабіста, выкладаць і тлумачыць вернікам праўды веры, у якія трэба верыць і прымяняць іх у нора-

вах; ён таксама павінен клапаціцца аб тым, каб захоўваліся прадпісанні канонаў аб паслузе слова, асабліва аб гаміліі і катэхізацыі, з тым, каб усім абвяшчалася ўсё хрысціянскае вучэнне.

§ 2. Выкарыстоўваючы адпаведныя сродкі, ён павінен абараняць непарушнасць і еднасць праўдаў веры, у якія трэба верыць, застаўляючы пры гэтым справядлівую свабоду ў далейшым даследаванні праўдаў.

Кан. 387 – Дыяцэзіяльны біскуп, памятаючы аб сваім абавязку даваць прыклад святасці ў любові, пакоры і простасці жыцця, павінен усімі сродкамі садзейнічаць узрастанню вернікаў у святасці згодна з пакліканнем кожнага з іх, а таксама, будучы галоўным распарадчыкам Божых таямніц, павінен пастаянна імкнуцца, каб вернікі, даручаныя яго апецы, праз цэлебрацыю сакрамэнтаў узрасталі ў ласцы, пазнавалі Пасхальную таямніцу і жылі ёю.

Кан. 388 – § 1. Пасля прыняцця дыяцэзіі ў валоданне, дыяцэзіяльны біскуп павінен у кожную нядзелю і ў іншыя святочныя дні, абавязковыя ў яго рэгіёне, прысвячаць Імшу за даручаны яму народ.

§ 2. Біскуп павінен асабіста цэлебраваць і прысвячаць Імшу за народ у тыя дні, аб якіх гаворыцца ў § 1; аднак, калі існуе легітымная перашкода ў гэтай цэлебрацыі, ён павінен выканаць гэты абавязак у той самы дзень з дапамогай іншай асобы або ў іншы дзень асабіста.

§ 3. Біскуп, якому, акрамя яго ўласнай, даручаны іншыя дыяцэзіі, нават толькі ў якасці адміністратара, выконвае свой абавязак, калі прысвячае адну Імшу за ўвесь даручаны яму народ.

§ 4. Біскуп, які не выканаў абавязак, аб якім гаворыцца ў §§ 1–3, павінен як мага

ut praescripta canonum de ministerio verbi, de homilia praesertim et catechetica institutione sedulo serventur, ita ut universa doctrina christiana omnibus tradatur.

§ 2. Integritatem et unitatem fidei credendae mediis, quae aptiora videantur, firmiter tueatur, iustam tamen libertatem agnoscens in veritatibus ulterius perscrutandis.

Can. 387 – Episcopus dioecesanus, cum memor sit se obligatione teneri exemplum sanctitatis praebendi in caritate, humilitate et vitae simplicitate, omni ope promovere studeat sanctitatem christifidelium secundum uniuscuiusque propriam vocationem atque, cum sit praecipuus mysteriorum Dei dispensator, iugiter annitatur ut christifideles suae curae commissi sacramentorum celebratione in gratia crescant utque paschale mysterium cognoscant et vivant.

Can. 388 – § 1. Episcopus dioecesanus, post captam dioecesis possessionem, debet singulis diebus dominicis aliisque diebus festis de praecepto in sua regione Missam pro populo sibi commisso applicare.

§ 2. Episcopus Missam pro populo diebus, de quibus in § 1, per se ipse celebrare et applicare debet; si vero ab hac celebratione legitime impediatur, iisdem diebus per alium, vel aliis diebus per se ipse applicet.

§ 3. Episcopus cui praeter propriam dioecesim aliae, titulo etiam administrationis, sunt commissae, obligationi satisfacit unam Missam pro universo populo sibi commisso applicando.

§ 4. Episcopus qui obligationi, de qua in §§ 1-3, non satisfecerit,

quam primum pro populo tot Missas applicet quot omiserit.

Can. 389 – Frequenter praesit in ecclesia cathedrali aliave ecclesia suae dioecesis sanctissimae Eucharistiae celebrationi, in festis praesertim de praecepto aliisque sollemnitatibus.

Can. 390 – Episcopus dioecesanus in universa sua dioecesi pontificalia exercere potest; non vero extra propriam dioecesim sine expresso vel saltem rationabiliter praesumpto Ordinarii loci consensu.

Can. 391 – § 1. Episcopi dioecesani est Ecclesiam particularem sibi commissam cum potestate legislativa, exsecutiva et iudiciali regere, ad normam iuris.

§ 2. Potestatem legislativam exercet ipse Episcopus; potestatem exsecutivam exercet sive per se sive per Vicarios generales aut episcopales ad normam iuris; potestatem iudicialem sive per se sive per Vicarium iudicialem et iudices ad normam iuris.

Can. 392 – § 1. Ecclesiae universae unitatem cum tueri debeat, Episcopus disciplinam cunctae Ecclesiae communem promovere et ideo observantiam omnium legum ecclesiasticarum urgere tenetur.

§ 2. Advigilet ne abusus in ecclesiasticam disciplinam irrepant, praesertim circa ministerium verbi, celebrationem sacramentorum et sacramentalium, cultum Dei et Sanctorum, necnon bonorum administrationem.

Can. 393 – In omnibus negotiis iuridicis dioecesis, Episcopus dioecesanus eiusdem personam gerit.

хутчэй прысвяціць столькі Імшаў за народ, колькі было прапушчана.

Кан. 389 – Ён павінен часта ўзначальваць цэлебрацыю Найсвяцейшай Эўхарыстыі ў катэдральным або іншым касцёле сваёй дыяцэзіі, асабліва ў абавязковыя святы і іншыя ўрачыстасці.

Кан. 390 – Дыяцэзіяльны біскуп можа ўжываць пантыфікаліі ва ўсёй сваёй дыяцэзіі, аднак не можа іх ужываць па-за межамі сваёй дыяцэзіі без выразнага або прынамсі разумна меркаванага дазволу ардынарыя месца.

Кан. 391 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп павінен кіраваць даручаным яму партыкулярным Касцёлам, маючы заканадаўчую, выканаўчую і судовую ўладу, згодна з нормамі права.

§ 2. Заканадаўчую ўладу біскуп ажыццяўляе асабіста; выканаўчую ўладу ажыццяўляе або асабіста, або праз генеральных і біскупскіх вікарыяў, згодна з нормамі права; судовую — або асабіста, або праз судовага вікарыя і суддзяў, згодна з нормамі права.

Кан. 392 – § 1. Паколькі біскуп павінен спрыяць адзінству паўсюднага Касцёла, ён павінен забяспечваць дысцыпліну, агульную для ўсяго Касцёла, а таму павінен абавязваць усіх да выконвання касцёльных законаў.

§ 2. Ён павінен сачыць, каб у касцёльнай дысцыпліне не было злоўжыванняў, асабліва ў тым, што датычыць паслугі слова, цэлебрацыі сакрамэнтаў і сакрамэнталій, культу Бога і святых, а таксама адміністравання маёмасцю.

Кан. 393 – Ва ўсіх юрыдычных справах дыяцэзіі яе асобу прадстаўляе дыяцэзіяльны біскуп.

Кан. 394 – § 1. Біскуп павінен спрыяць розным формам апостальства ў дыяцэзіі, а таксама клапаціцца аб тым, каб ва ўсёй дыяцэзіі або ў асобных яе частках пад яго кіраваннем ажыццяўлялася каардынацыя ўсіх спраў апостальства, захоўваючы характар, уласцівы кожнай з іх.

§ 2. Ён павінен нагадваць аб абавязку апостальства, ускладзеным на ўсіх вернікаў у залежнасці ад іх становішча і магчымасцяў, а таксама заахвочваць іх да ўдзелу ў справах апостальства і іх падтрымкі згодна з патрэбамі часу і месца.

Кан. 395 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп, нават калі мае каад'ютара або дапаможнага біскупа, павінен, згодна з законам, асабіста рэзідаваць у дыяцэзіі.

§ 2. За выключэннем візіту *ad limina,* або ўдзелу ў Саборах, Сінодах біскупаў і Канферэнцыях Біскупаў, дзе дыяцэзіяльны біскуп павінен прысутнічаць, або выконвання іншых легітымна даручаных яму абавязкаў, ён можа па слушнай прычыне знаходзіцца па-за дыяцэзіяй — пастаянна ці з перапынкамі — не больш чым месяц, калі толькі будзе ўпэўнены, што па прычыне яго адсутнасці не будзе ніякай шкоды для дыяцэзіі.

§ 3. Ён не павінен адсутнічаць у дыяцэзіі ў дні Божага Нараджэння, Вялікага тыдня і Уваскрасення Пана, Пяцідзясятніцы і ўрачыстасці Цела і Крыві Хрыста, калі на гэта не будзе важкай і неадкладнай прычыны.

§ 4. Калі б здарылася, што біскуп нелегітымна адсутнічаў у дыяцэзіі больш чым шэсць месяцаў, мітрапаліт павінен паведаміць Апостальскую Сталіцу аб яго адсутнасці; калі б справа датычыла мітрапаліта, гэта павінен зрабіць старэйшы суфраган.

Кан. 396 – § 1. На біскупа ўскладзены абавязак штогадова здзяйсняць або поўную,

Can. 394 – § 1. Varias apostolatus rationes in dioecesi foveat Episcopus, atque curet ut in universa dioecesi, vel in eiusdem particularibus districtibus, omnia apostolatus opera, servata uniuscuiusque propria indole, sub suo moderamine coordinentur.

§ 2. Urgeat officium, quo tenentur fideles ad apostolatum pro sua cuiusque condicione et aptitudine exercendum, atque ipsos adhortetur ut varia opera apostolatus, secundum necessitates loci et temporis, participent et iuvent.

Can. 395 – § 1. Episcopus dioecesanus, etiamsi coadiutorem aut auxiliarem habeat, tenetur lege personalis in dioecesi residentiae.

§ 2. Praeterquam causa visitationis Sacrorum Liminum, vel Conciliorum, Episcoporum synodi, Episcoporum conferentiae, quibus interesse debet, aliusve officii sibi legitime commissi, a dioecesi aequa de causa abesse potest non ultra mensem, sive continuum sive intermissum, dummodo cautum sit ne ex eius absentia dioecesis quidquam detrimenti capiat.

§ 3. A dioecesi ne absit diebus Nativitatis, Hebdomadae Sanctae et Resurrectionis Domini, Pentecostes et Corporis et Sanguinis Christi, nisi ex gravi urgentique causa.

§ 4. Si ultra sex menses Episcopus a dioecesi illegitime abfuerit, de eius absentia Metropolita Sedem Apostolicam certiorem faciat; quod si agatur de Metropolita, idem faciat antiquior suffraganeus.

Can. 396 – § 1. Tenetur Episcopus obligatione dioecesis vel ex toto vel ex

parte quotannis visitandae, ita ut singulis saltem quinquenniis universam dioecesim, ipse per se vel, si legitime fuerit impeditus, per Episcopum coadiutorem, aut per auxiliarem, aut per Vicarium generalem vel episcopalem, aut per alium presbyterum visitet.

§ 2. Fas est Episcopo sibi eligere quos maluerit clericos in visitatione comites atque adiutores, reprobato quocumque contrario privilegio vel consuetudine.

Can. 397 – § 1. Ordinariae episcopali visitationi obnoxiae sunt personae, instituta catholica, res et loca sacra, quae intra dioecesis ambitum continentur.

§ 2. Sodales institutorum religiosorum iuris pontificii eorumque domos Episcopus visitare potest in casibus tantum iure expressis.

Can. 398 – Studeat Episcopus debita cum diligentia pastoralem visitationem absolvere; caveat ne superfluis sumptibus cuiquam gravis onerosusve sit.

Can. 399 – § 1. Episcopus dioecesanus tenetur singulis quinquenniis relationem Summo Pontifici exhibere super statu dioecesis sibi commissae, secundum formam et tempus ab Apostolica Sede definita.

§ 2. Si annus pro exhibenda relatione determinatus ex toto vel ex parte inciderit in primum biennium ab inito dioecesis regimine, Episcopus pro ea vice a conficienda et exhibenda relatione abstinere potest.

або частковую візітацыю сваёй дыяцэзіі такім чынам, каб прынамсі раз на працягу пяці гадоў ён здзейсніў візітацыю ўсёй дыяцэзіі. Гэты абавязак ён можа выканаць або асабіста, або, пры наяўнасці легітымнай перашкоды, з дапамогай біскупа-каад'ютара ці дапаможнага біскупа, або з дапамогай генеральнага ці біскупскага вікарыя, або з дапамогай іншага прэзбітэра.

§ 2. Біскуп можа вызначыць сваімі спадарожнікамі і памочнікамі падчас візітацыі любых духоўных асобаў, пры гэтым усялякія супярэчныя з гэтым прывілеі або звычаі адмяняюцца.

Кан. 397 – § 1. Звычайнай біскупскай візітацыі падлягаюць асобы, каталіцкія ўстановы, святыя рэчы і месцы, якія знаходзяцца ў межах дыяцэзіі.

§ 2. Біскуп можа здзяйсняць візітацыю членаў манаскіх інстытутаў папскага права і іх дамоў толькі ў выпадках, акрэсленых у праве.

Кан. 398 – Біскуп павінен імкнуцца здзяйсняць пастырскую візітацыю з належнай пільнасцю; пры гэтым ён павінен клапаціцца аб тым, каб не абцяжарваць нікога празмернымі выдаткамі.

Кан. 399 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп мае абавязак раз на пяць гадоў складаць Найвышэйшаму Пантыфіку справаздачу аб стане даручанай яму дыяцэзіі паводле формы і ў тэрміне, устаноўленым Апостальскай Сталіцай.

§ 2. Калі год, вызначаны для складання справаздачы, поўнасцю або часткова прыйшоўся на першыя два гады ад пачатку кіравання дыяцэзіяй, біскуп можа на гэты раз устрымацца ад складання і прадстаўлення справаздачы.

Кан. 400 – § 1. Калі Апостальская Сталіца не пастановіць іначай, дыяцэзіяльны біскуп у той год, калі трэба прадставіць справаздачу Найвышэйшаму Пантыфіку, павінен прыбыць у Рым, каб пакланіцца магілам святых Апосталаў Пятра і Паўла і сустрэцца з Рымскім Пантыфікам.

§ 2. Біскуп павінен выканаць гэты абавязак асабіста, калі не будзе мець легітымнай перашкоды; у такім выпадку ён павінен зрабіць гэта з дапамогай каад'ютара, калі ён ёсць, або з дапамогай дапаможнага біскупа, або з дапамогай прыдатнага святара са свайго прэзбітэрыя, які рэзідуе ў яго дыяцэзіі.

§ 3. Апостальскі вікарый можа выканаць гэты абавязак з дапамогай прадстаўніка, нават такога, які пражывае ў Рыме; апостальскі прэфект не мае гэтага абавязку.

Кан. 401 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп, якому споўнілася семдзесят пяць гадоў, запрошаны скіраваць Найвышэйшаму Пантыфіку адмову ад пасады, каб той, разгледзеўшы ўсе абставіны, прыняў сваё рашэнне.

§ 2. Дыяцэзіяльны біскуп, які па прычыне хваробы або па іншай важкай прычыне не можа належным чынам выконваць свае абавязкі, вельмі запрошаны падаць адмову ад пасады.

Кан. 402 – § 1. Біскуп, адмова ад пасады якога была прынята, захоўвае за сабой тытул эмэрыта сваёй дыяцэзіі, а таксама, калі захоча, можа захаваць месца пражывання ў гэтай дыяцэзіі, калі ў акрэсленых выпадках, з увагі на асобыя акалічнасці, Апостальская Сталіца не пастановіць іначай.

§ 2. Канферэнцыя Біскупаў павінна паклапаціцца аб тым, каб біскуп, які адмовіўся ад пасады, меў адпаведнае і годнае ўтрыманне, маючы на ўвазе, што ў першую чаргу гэты абавязак ускладзены на дыяцэзію, якой ён служыў.

Can. 400 – § 1. Episcopus dioecesanus, eo anno quo relationem Summo Pontifici exhibere tenetur, nisi aliter ab Apostolica Sede statutum fuerit, ad Urbem, Beatorum Apostolorum Petri et Pauli sepulcra veneraturus, accedat et Romano Pontifici se sistat.

§ 2. Episcopus praedictae obligationi per se ipse satisfaciat, nisi legitime sit impeditus; quo in casu eidem satisfaciat per coadiutorem, si quem habeat, vel auxiliarem, aut per idoneum sacerdotem sui presbyterii, qui in sua dioecesi resideat.

§ 3. Vicarius apostolicus huic obligationi satisfacere potest per procuratorem etiam in Urbe degentem; Praefectus apostolicus hac obligatione non tenetur.

Can. 401 – § 1. Episcopus dioecesanus, qui septuagesimum quintum aetatis annum expleverit, rogatur ut renuntiationem ab officio exhibeat Summo Pontifici, qui omnibus inspectis adiunctis providebit.

§ 2. Enixe rogatur Episcopus dioecesanus, qui ob infirmam valetudinem aliamve gravem causam officio suo adimplendo minus aptus evaserit, ut renuntiationem ab officio exhibeat.

Can. 402 – § 1. Episcopus, cuius renuntiatio ab officio acceptata fuerit, titulum emeriti suae dioecesis retinet, atque habitationis sedem, si id exoptet, in ipsa dioecesi servare potest, nisi certis in casibus ob specialia adiuncta ab Apostolica Sede aliter provideatur.

§ 2. Episcoporum conferentia curare debet ut congruae et dignae Episcopi renuntiantis sustentationi provideatur, attenta quidem primaria obligatione, qua tenetur dioecesis cui ipse inservivit.

Art. 3. *De Episcopis coadiutoribus et auxiliaribus*

Can. 403 – § 1. Cum pastorales dioecesis necessitates id suadeant, unus vel plures Episcopi auxiliares, petente Episcopo dioecesano, constituantur; Episcopus auxiliaris iure successionis non gaudet.

§ 2. Gravioribus in adiunctis, etiam indolis personalis, Episcopo dioecesano dari potest Episcopus auxiliaris specialibus instructus facultatibus.

§ 3. Sancta Sedes, si magis opportunum id ipsi videatur, ex officio constituere potest Episcopum coadiutorem, qui et ipse specialibus instruitur facultatibus; Episcopus coadiutor iure successionis gaudet.

Can. 404 – § 1. Episcopus coadiutor officii sui possessionem capit, cum litteras apostolicas nominationis, per se vel per procuratorem, ostenderit Episcopo dioecesano atque collegio consultorum, praesente curiae cancellario, qui rem in acta referat.

§ 2. Episcopus auxiliaris officii sui possessionem capit, cum litteras apostolicas nominationis ostenderit Episcopo dioecesano, praesente curiae cancellario, qui rem in acta referat.

§ 3. Quod si Episcopus dioecesanus plene sit impeditus, sufficit ut tum Episcopus coadiutor, tum Episcopus auxiliaris litteras apostolicas nominationis ostendant collegio consultorum, praesente curiae cancellario.

Can. 405 – § 1. Episcopus coadiutor, itemque Episcopus auxiliaris, obligationes et iura habent quae determinantur praescriptis canonum qui sequuntur, atque in litteris suae nominationis definiuntur.

Артыкул 3. *Біскупы-каад'ютары і дапаможныя біскупы*

Кан. 403 – § 1. Калі да гэтага схіляюць пастырскія патрэбы дыяцэзіі, па просьбе дыяцэзіяльнага біскупа можа быць прызначаны адзін або некалькі дапаможных біскупаў; дапаможны біскуп не мае права наступства.

§ 2. Пры наяўнасці больш важкіх абставін, у тым ліку асабістага характару, дыяцэзіяльнаму біскупу можа быць дадзены дапаможны біскуп, надзелены спецыяльнымі паўнамоцтвамі.

§ 3. Калі Святая Сталіца палічыць гэта больш карысным, яна можа сваёй уладай устанавіць біскупа-каад'ютара, надзеленага спецыяльнымі паўнамоцтвамі; біскуп-каад'ютар мае права наступства.

Кан. 404 – § 1. Біскуп-каад'ютар уступае ў валоданне сваёй пасадай пасля таго, як асабіста або праз пасрэдніка прадставіць апостальскі ліст аб сваёй намінацыі дыяцэзіяльнаму біскупу і Калегіі Кансультантаў у прысутнасці канцлера Курыі, які павінен скласці аб гэтым акт.

§ 2. Дапаможны біскуп уступае ў валоданне сваёй пасадай пасля таго, як прадставіць дыяцэзіяльнаму біскупу апостальскі ліст аб сваёй намінацыі ў прысутнасці канцлера Курыі, які павінен скласці аб гэтым акт.

§ 3. Калі б дыяцэзіяльны біскуп меў непераадольную перашкоду, дастаткова, каб як біскуп-каад'ютар, так і дапаможны біскуп прадставілі апостальскі ліст аб сваім прызначэнні Калегіі Кансультантаў у прысутнасці канцлера Курыі.

Кан. 405 – § 1. Біскуп-каад'ютар, як і дапаможны біскуп, маюць правы і абавязкі, акрэсленыя прадпісаннямі наступных канонаў і ўдакладненыя ў лісце аб прызначэнні.

§ 2. Біскуп-каад'ютар і дапаможны біскуп, аб якім гаворыцца ў кан. 403 § 2, дапамагаюць дыяцэзіяльнаму біскупу ва ўсім кіраванні дыяцэзіяй, а таксама замяшчаюць яго падчас адсутнасці або пры наяўнасці перашкодаў.

Кан. 406 – § 1. Біскупа-каад'ютара, як і дапаможнага біскупа, аб якім гаворыцца ў кан. 403 § 2, дыяцэзіяльны біскуп павінен прызначыць генеральным вікарыем; ім таксама, перад іншымі, дыяцэзіяльны біскуп павінен даручыць тое, што згодна з правам патрабуе спецыяльнага ўпаўнаважання.

§ 2. Калі ў апостальскім лісце не будзе прадугледжана іншае і захоўваючы прадпісанне § 1, дыяцэзіяльны біскуп павінен прызначыць свайго дапаможнага біскупа або дапаможных біскупаў генеральнымі вікарыямі ці прынамсі біскупскімі вікарыямі, падначаленымі толькі яго ўладзе, або ўладзе біскупа-каад'ютара, або дапаможнага біскупа, аб якім гаворыцца ў кан. 403 § 2.

Кан. 407 – § 1. Маючы на ўвазе як мага большае дабро дыяцэзіі цяпер і ў будучыні, дыяцэзіяльны біскуп, біскуп-каад'ютар і дапаможны біскуп, аб якім гаворыцца ў кан. 403 § 2, павінны кансультавацца адны з аднымі ў найбольш важных пытаннях.

§ 2. Дыяцэзіяльнаму біскупу пры разглядзе найбольш важных пытанняў, асабліва пастырскага характару, варта раіцца найперш з дапаможнымі біскупамі.

§ 3. Біскуп-каад'ютар і дапаможны біскуп, з увагі на сваё пакліканне да ўдзелу ў клопатах дыяцэзіяльнага біскупа, павінны выконваць свае заданні такім чынам, каб у сваіх дзеяннях і намерах дзейнічаць з ім у згодзе.

Кан. 408 – § 1. Біскуп-каад'ютар і дапаможны біскуп, калі не маюць справядлівай перашкоды, павінны кожны раз, калі дыяцэ-

§ 2. Episcopus coadiutor et Episcopus auxiliaris, de quo in can. 403, § 2, Episcopo dioecesano in universo dioecesis regimine adstant atque eiusdem absentis vel impediti vices supplent.

Can. 406 – § 1. Episcopus coadiutor, itemque Episcopus auxiliaris, de quo in can. 403, § 2, ab Episcopo dioecesano Vicarius generalis constituatur; insuper ipsi prae ceteris Episcopus dioecesanus committat quae ex iure mandatum speciale requirant.

§ 2. Nisi in litteris apostolicis aliud provisum fuerit et firmo praescripto § 1, Episcopus dioecesanus auxiliarem vel auxiliares suos constituat Vicarios generales vel saltem Vicarios episcopales, ab auctoritate sua, aut Episcopi coadiutoris vel Episcopi auxiliaris de quo in can. 403, § 2, dumtaxat dependentes.

Can. 407 – § 1. Ut quam maxime praesenti et futuro dioecesis bono faveatur, Episcopus dioecesanus, coadiutor atque Episcopus auxiliaris de quo in can. 403, § 2, in rebus maioris momenti sese invicem consulant.

§ 2. Episcopus dioecesanus in perpendendis causis maioris momenti, praesertim indolis pastoralis, Episcopos auxiliares prae ceteris consulere velit.

§ 3. Episcopus coadiutor et Episcopus auxiliaris, quippe qui in partem sollicitudinis Episcopi dioecesani vocati sint, munia sua ita exerceant, ut concordi cum ipso opera et animo procedant.

Can. 408 – § 1. Episcopus coadiutor et Episcopus auxiliaris, iusto impedimento non detenti, obligantur

ut, quoties Episcopus dioecesanus id requirat, pontificalia et alias functiones obeant, ad quas Episcopus dioecesanus tenetur.

§ 2. Quae episcopalia iura et functiones Episcopus coadiutor aut auxiliaris potest exercere, Episcopus dioecesanus habitualiter alii ne committat.

Can. 409 – § 1. Vacante sede episcopali, Episcopus coadiutor statim fit Episcopus dioecesis pro qua fuerat constitutus, dummodo possessionem legitime ceperit.

§ 2. Vacante sede episcopali, nisi aliud a competenti auctoritate statutum fuerit, Episcopus auxiliaris, donec novus Episcopus possessionem sedis ceperit, omnes et solas servat potestates et facultates quibus sede plena, tamquam Vicarius generalis vel tamquam Vicarius episcopalis, gaudebat; quod si ad munus Administratoris dioecesani non fuerit designatus, eandem suam potestatem, a iure quidem collatam, exerceat sub auctoritate Administratoris dioecesani, qui regimini dioecesis praeest.

Can. 410 – Episcopus coadiutor et Episcopus auxiliaris obligatione tenentur, sicut et ipse Episcopus dioecesanus, residendi in dioecesi; a qua, praeterquam ratione alicuius officii extra dioecesim implendi aut feriarum causa, quae ultra mensem ne protrahantur, nonnisi ad breve tempus discedant.

Can. 411 – Episcopo coadiutori et auxiliari, ad renuntiationem ab officio quod attinet, applicantur praescripta cann. 401 et 402, § 2.

зіяльны біскуп будзе гэтага патрабаваць, выконваць пантыфікальныя дзеянні і іншыя функцыі, ускладзеныя на дыяцэзіяльнага біскупа.

§ 2. Тыя біскупскія правы і функцыі, якія могуць выконваць біскуп-каад'ютар або дапаможны біскуп, дыяцэзіяльны біскуп не павінен даручаць іншым асобам на пастаянна.

Кан. 409 – § 1. Калі біскупская сталіца становіцца вакантнай, біскуп-каад'ютар адразу становіцца біскупам той дыяцэзіі, у якую быў прызначаны, калі толькі адбылося легітымнае прыняцце яе ў валоданне.

§ 2. Калі біскупская сталіца становіцца вакантнай, пакуль новы біскуп не прыме сталіцу ў валоданне, дапаможны біскуп захоўвае, калі кампетэнтная ўлада не пастановіць іначай, усю і толькі тую ўладу і паўнамоцтвы, якія ён меў у якасці генеральнага або біскупскага вікарыя пры занятай сталіцы. Калі ён не быў вызначаны для выканання задання дыяцэзіяльнага адміністратара, павінен сваю ўладу, удзеленую яму на моцы права, ажыццяўляць пад уладай дыяцэзіяльнага адміністратара, які кіруе дыяцэзіяй.

Кан. 410 – На біскупа-каад'ютара і дапаможнага біскупа, як і на самога дыяцэзіяльнага біскупа, ускладаецца абавязак рэзідаваць у дыяцэзіі, якую яны — калі толькі не на кароткі час — не павінны пакідаць, за выключэннем выпадкаў, калі гаворка ідзе пра выкананне якой-небудзь пасады па-за межамі дыяцэзіі або часу адпачынку, які не павінен працягвацца больш чым адзін месяц.

Кан. 411 – На біскупа-каад'ютара і дапаможнага біскупа ў тым, што датычыць адмовы ад пасады, якую яны займаюць, распаўсюджваюцца прадпісанні кан. 401 і 402 § 2.

Раздзел III

Перашкоды сталіцы і вакантная сталіца

Артыкул 1. *Перашкоды сталіцы*

Кан. 412 – Лічыцца, што біскупская сталіца мае перашкоду, калі дыяцэзіяльны біскуп поўнасцю пазбаўлены магчымасці ажыццяўляць пастырскае заданне ў дыяцэзіі па прычыне зняволення, адхілення, выгнання або недзеяздольнасці і пры гэтым нават пісьмова не можа мець зносіны з вернікамі сваёй дыяцэзіі.

Кан. 413 – § 1. Калі Святая Сталіца не прадугледзіць іншага, пры наяўнасці перашкоды сталіцы кіраваць дыяцэзіяй павінен біскуп-каад'ютар, калі ён ёсць; калі яго няма або мае перашкоду, кіраванне пераходзіць да дапаможнага біскупа, генеральнага або біскупскага вікарыя ці іншага святара, пры гэтым захоўваецца парадак асобаў, складзены дыяцэзіяльным біскупам у спісе, які ён павінен скласці як мага хутчэй пасля прыняцця дыяцэзіі ў валоданне; гэты спіс павінен быць прадстаўлены мітрапаліту, павінен аднаўляцца прынамсі раз на тры гады і захоўвацца канцлерам у таямніцы.

§ 2. Калі біскупа-каад'ютара няма або ён мае перашкоду, а спіса, аб якім гаворыцца ў § 1, не існуе, Калегія Кансультантаў павінна выбраць святара, які будзе кіраваць дыяцэзіяй.

§ 3. Той, хто згодна з нормамі §§ 1 або 2 прыняў кіраванне дыяцэзіяй, павінен як мага хутчэй паведаміць Святую Сталіцу аб перашкодзе сталіцы і прынятым ім заданні.

Кан. 414 – Кожны, хто, згодна з нормамі кан. 413, быў пакліканы да часовага ажыццяўлення пастырскай апекі над дыяцэзіяй у той час, пакуль існуе перашкода сталіцы, мае тыя абавязкі і карыстаецца той уладай

Caput III

De sede impedita et de sede vacante

Art. 1. *De sede impedita*

Can. 412 – Sedes episcopalis impedita intellegitur, si captivitate, relegatione, exsilio aut inhabilitate Episcopus dioecesanus plane a munere pastorali in dioecesi procurando praepediatur, ne per litteras quidem valens cum dioecesanis communicare.

Can. 413 – § 1. Sede impedita, regimen dioecesis, nisi aliter Sancta Sedes providerit, competit Episcopo coadiutori, si adsit; eo deficiente aut impedito, alicui Episcopo auxiliari aut Vicario generali vel episcopali aliive sacerdoti, servato personarum ordine statuto in elencho ab Episcopo dioecesano quam primum a capta dioecesis possessione componendo; qui elenchus cum Metropolita communicandus singulis saltem trienniis renovetur atque a cancellario sub secreto servetur.

§ 2. Si deficiat aut impediatur Episcopus coadiutor atque elenchus, de quo in § 1, non suppetat, collegii consultorum est sacerdotem eligere, qui dioecesim regat.

§ 3. Qui dioecesis regimen, ad normam §§ 1 vel 2, susceperit, quam primum Sanctam Sedem moneat de sede impedita ac de suscepto munere.

Can. 414 – Quilibet ad normam can. 413 vocatus ut ad interim dioecesis curam pastoralem gerat pro tempore quo sedes impeditur tantum, in cura pastorali dioecesis exercenda

tenetur obligationibus atque potestate gaudet, quae iure Administratori dioecesano competunt.

Can. 415 – Si Episcopus dioecesanus poena ecclesiastica a munere exercendo prohibeatur, Metropolita aut, si is deficiat vel de eodem agatur, suffraganeus antiquior promotione ad Sanctam Sedem statim recurrat, ut ipsa provideat.

у ажыццяўленні пастырскай апекі над дыяцэзіяй, якія, згодна з правам, належаць дыяцэзіяльнаму адміністратару.

Кан. 415 – Калі па прычыне касцёльнага пакарання дыяцэзіяльнаму біскупу будзе забаронена выконваць яго заданне, мітрапаліт або, калі яго няма ці справа датычыць яго самога, старэйшы вылучэннем суфраган павінен неадкладна звярнуцца да Святой Сталіцы, каб яна сама прыняла адпаведныя меры.

Art. 2. *De sede vacante*

Can. 416 – Sedes episcopalis vacat Episcopi dioecesani morte, renuntiatione a Romano Pontifice acceptata, translatione ac privatione Episcopo intimata.

Артыкул 2. *Вакантная сталіца*

Кан. 416 – Біскупская сталіца становіцца вакантнай са смерцю дыяцэзіяльнага біскупа, а таксама праз яго адмову ад пасады, прынятую Рымскім Пантыфікам, праз перамяшчэнне або пазбаўленне пасады, аб чым біскуп быў паведамлены.

Can. 417 – Vim habent omnia quae gesta sunt a Vicario generali aut Vicario episcopali, donec certam de obitu Episcopi dioecesani notitiam iidem acceperint, itemque quae ab Episcopo dioecesano aut a Vicario generali vel episcopali gesta sunt, donec certam de memoratis actibus pontificiis notitiam receperint.

Кан. 417 – Захоўвае моц усё, што было здзейснена генеральным вікарыем або біскупскім вікарыем перад атрыманнем імі пэўнага паведамлення аб смерці дыяцэзіяльнага біскупа, як і тое, што было здзейснена дыяцэзіяльным біскупам або генеральным ці біскупскім вікарыем перад атрыманнем імі пэўнага паведамлення аб вышэйзгаданых дзеяннях Пантыфіка.

Can. 418 – § 1. A certa translationis notitia, Episcopus intra duos menses debet dioecesim *ad quam* petere eiusque canonicam possessionem capere; die autem captae possessionis dioecesis novae, dioecesis *a qua* vacat.

Кан. 418 – § 1. На працягу двух месяцаў пасля атрымання пэўнага паведамлення аб перамяшчэнні біскуп павінен адбыць у дыяцэзію, у якую быў перамешчаны, і прыняць яе ў кананічнае валоданне; ад дня прыняцця ім новай дыяцэзіі ў валоданне папярэдняя становіцца вакантнай.

§ 2. A certa translationis notitia usque ad canonicam novae dioecesis possessionem, Episcopus translatus in dioecesi *a qua*:

§ 2. Ад дня атрымання пэўнага паведамлення аб перамяшчэнні і да прыняцця новай дыяцэзіі ў кананічнае валоданне перамешчаны біскуп у дыяцэзіі, якую пакідае:

1° атрымлівае ўладу і абавязкі дыяцэзіяльнага адміністратара; пры гэтым спыняецца ўсякая ўлада генеральнага вікарыя і біскупскага вікарыя, захоўваючы прадпісанні кан. 409 § 2;

2° атрымлівае поўнае ўзнагароджанне, належнае яму на гэтай пасадзе.

Кан. 419 – Калі сталіца з'яўляецца вакантнай, пакуль не будзе вызначаны дыяцэзіяльны адміністратар, кіраванне дыяцэзіяй пераходзіць да дапаможнага біскупа або, калі іх некалькі, да старэйшага вылучэннем; калі дапаможнага біскупа няма, кіраванне пераходзіць да Калегіі Кансультантаў, калі Святая Сталіца не пастановіць іначай. Той, хто такім чынам прыняў кіраванне дыяцэзіяй, павінен неадкладна склікаць Калегію, якая мае права вызначыць дыяцэзіяльнага адміністратара.

Кан. 420 – Калі сталіца становіцца вакантнай у апостальскім вікарыяце або прэфектуры, кіраванне прымае правікарый ці прапрэфект, якіх выключна для гэтага прызначаюць адпаведна вікарый ці прэфект адразу пасля ўступлення ў валоданне, калі Святая Сталіца не пастановіць іначай.

Кан. 421 – § 1. На працягу васьмі дзён пасля атрымання паведамлення аб тым, што біскупская сталіца стала вакантнай, Калегія Кансультантаў, захоўваючы прадпісанні кан. 502 § 3, павінна выбраць дыяцэзіяльнага адміністратара, які будзе часова кіраваць дыяцэзіяй.

§ 2. Калі на працягу прадпісанага часу дыяцэзіяльны адміністратар, незалежна ад прычыны, не быў легітымна выбраны, права на яго вызначэнне пераходзіць да мітрапаліта, а калі вакантным стаў сам мітрапалітальны Касцёл, або і мітрапалітальны, і суфраганны, то яно пераходзіць да біскупа-суфрагана, старэйшага вылучэннем.

1° Administratoris dioecesani potestatem obtinet eiusdemque obligationibus tenetur, cessante qualibet Vicarii generalis et Vicarii episcopalis potestate, salvo tamen can. 409, § 2;

2° integram percipit remunerationem officio propriam.

Can. 419 – Sede vacante, regimen dioecesis, usque ad constitutionem Administratoris dioecesani, ad Episcopum auxiliarem, et si plures sint, ad eum qui promotione sit antiquior devolvitur; deficiente autem Episcopo auxiliari, ad collegium consultorum, nisi a Sancta Sede aliter provisum fuerit. Qui ita regimen dioecesis assumit, sine mora convocet collegium competens ad deputandum Administratorem dioecesanum.

Can. 420 – In vicariatu vel praefectura apostolica, sede vacante, regimen assumit Pro-Vicarius vel Pro-Praefectus ad hunc tantum effectum a Vicario vel a Praefecto immediate post captam possessionem nominatus, nisi aliter a Sancta Sede statutum fuerit.

Can. 421 – § 1. Intra octo dies ab accepta vacationis sedis episcopalis notitia, Administrator dioecesanus, qui nempe dioecesim ad interim regat, eligendus est a collegio consultorum, firmo praescripto can. 502, § 3.

§ 2. Si intra praescriptum tempus Administrator dioecesanus, quavis de causa, non fuerit legitime electus, eiusdem deputatio devolvitur ad Metropolitam, et si vacans sit ipsa Ecclesia metropolitana aut metropolitana simul et suffraganea, ad Episcopum suffraganeum promotione antiquiorem.

Can. 422 – Episcopus auxiliaris et, si is deficiat, collegium consultorum quantocius de morte Episcopi, itemque electus in Administratorem dioecesanum de sua electione Sedem Apostolicam certiorem faciant.

Кан. 422 – Дапаможны біскуп, а калі яго няма — Калегія Кансультантаў, павінны як мага хутчэй паведаміць Апостальскую Сталіцу аб смерці біскупа; а той, каго выбралі дыяцэзіяльным адміністратарам, — аб сваім абранні.

Can. 423 – § 1. Unus deputetur Administrator dioecesanus, reprobata contraria consuetudine; secus electio irrita est.

§ 2. Administrator dioecesanus ne simul sit oeconomus; quare si oeconomus dioecesis in Administratorem electus fuerit, alium pro tempore oeconomum eligat consilium a rebus oeconomicis.

Кан. 423 – § 1. Павінен быць вызначаны толькі адзін дыяцэзіяльны адміністратар, пры гэтым супраціўны звычай адхіляецца; інакш выбар з'яўляецца нядзейсным.

§ 2. Дыяцэзіяльны адміністратар не павінен адначасова быць эканомам; таму, калі дыяцэзіяльны эканом будзе выбраны на пасаду дыяцэзіяльнага адміністратара, Рада па эканамічных справах павінна на гэты час выбраць іншага эканома.

Can. 424 – Administrator dioecesanus eligatur ad normam cann. 165-178.

Кан. 424 – Дыяцэзіяльны адміністратар павінен быць выбраны згодна з нормамі кан. 165–178.

Can. 425 – § 1. Valide ad munus Administratoris dioecesani deputari tantum potest sacerdos qui trigesimum quintum aetatis annum expleverit et ad eandem vacantem sedem non fuerit iam electus, nominatus vel praesentatus.

§ 2. In Administratorem dioecesanum eligatur sacerdos, qui sit doctrina et prudentia praestans.

§ 3. Si praescriptae in § 1 condiciones posthabitae fuerint, Metropolita aut, si ipsa Ecclesia metropolitana vacans fuerit, Episcopus suffraganeus promotione antiquior, agnita rei veritate, Administratorem pro ea vice deputet; actus autem illius qui contra praescripta § 1 sit electus, sunt ipso iure nulli.

Кан. 425 – § 1. Заданне дыяцэзіяльнага адміністратара можа быць дзейсна даручана толькі святару, які дасягнуў трыццаціпяцігадовага ўзросту і не быў ужо выбраны, прызначаны або прадстаўлены на гэтую вакантную сталіцу.

§ 2. На пасаду дыяцэзіяльнага адміністратара павінен быць выбраны святар, які адзначаецца ведамі і разважлівасцю.

§ 3. Калі ўмовы, прадпісаныя ў § 1, не былі захаваны, мітрапаліт або — калі вакантным з'яўляецца сам мітрапалітальны Касцёл — старэйшы вылучэннем біскуп-суфраган, даведаўшыся аб сапраўдным становішчы спраў, павінен у такім выпадку вызначыць дыяцэзіяльнага адміністратара; пры гэтым дзеянні таго, хто быў выбраны з парушэннем прадпісанняў § 1, на моцы самога права з'яўляюцца нядзейснымі.

Can. 426 – Qui, sede vacante, ante deputationem Administratoris dioe-

Кан. 426 – Той, хто пры вакантнай сталіцы кіруе дыяцэзіяй перад вызначэннем дыя-

цэзіяльнага адміністратара, карыстаецца ўладай, якой права надзяляе генеральнага вікарыя.

Кан. 427 – § 1. Дыяцэзіяльны адміністратар выконвае абавязкі і карыстаецца ўладай дыяцэзіяльнага біскупа, за выключэннем тых спраў, якія з увагі на сутнасць справы або на моцы права выключаны з яго кампетэнцыі.

§ 2. Дыяцэзіяльны адміністратар набывае ўладу праз прыняцце выбару, пры гэтым ніякае адабрэнне не патрабуецца, захоўваючы абавязак, аб якім гаворыцца ў кан. 833, 4°.

Кан. 428 – § 1. Калі сталіца з'яўляецца вакантнай, нічога новага не павінна ўводзіцца.

§ 2. Тым, хто часова кіруе дыяцэзіяй, забараняецца рабіць тое, што можа прычыніць шкоду дыяцэзіі або біскупскім правам; у прыватнасці, ім, як і ўсім іншым, забараняецца асабіста або праз іншых выносіць ці знішчаць якія-небудзь дакументы з дыяцэзіяльнай Курыі або ўносіць у іх якія-небудзь змяненні.

Кан. 429 – Дыяцэзіяльны адміністратар мае абавязак рэзідаваць у дыяцэзіі і прысвячаць Імшы за народ згодна з нормай кан. 388.

Кан. 430 – § 1. Заданне дыяцэзіяльнага адміністратара спыняецца праз прыняцце новым біскупам дыяцэзіі ў валоданне.

§ 2. Права зняць дыяцэзіяльнага адміністратара з пасады зарэзервавана за Святой Сталіцай; у выпадку магчымай адмовы ад пасады, яна павінна быць пададзена ў аўтэнтычнай форме Калегіі, правамоцнай здзяйсняць выбар, і не патрабуе прыняцця; калі дыяцэзіяльны адміністратар быў зняты з пасады або адмовіўся ад пасады, а таксама ў выпадку яго смерці, павінен быць выбраны іншы дыяцэзіяльны адміністратар згодна з нормамі кан. 421.

cesani, dioecesim regat, potestate gaudet quam ius Vicario generali agnoscit.

Can. 427 – § 1. Administrator dioecesanus tenetur obligationibus et gaudet potestate Episcopi dioecesani, iis exclusis quae ex rei natura aut ipso iure excipiuntur.

§ 2. Administrator dioecesanus, acceptata electione, potestatem obtinet, quin requiratur ullius confirmatio, firma obligatione de qua in can. 833, n. 4.

Can. 428 – § 1. Sede vacante, nihil innovetur.

§ 2. Illi qui ad interim dioecesis regimen curant, vetantur quidpiam agere quod vel dioecesi vel episcopalibus iuribus praeiudicium aliquod afferre possit; speciatim prohibentur ipsi, ac proinde alii quicumque, quominus sive per se sive per alium curiae dioecesanae documenta quaelibet subtrahant vel destruant, aut in iis quidquam immutent.

Can. 429 – Administrator dioecesanus obligatione tenetur residendi in dioecesi et applicandi Missam pro populo ad normam can. 388.

Can. 430 – § 1. Munus Administratoris dioecesani cessat per captam a novo Episcopo dioecesis possessionem.

§ 2. Administratoris dioecesani remotio Sanctae Sedi reservatur; renuntiatio quae forte ab ipso fiat, authentica forma exhibenda est collegio ad electionem competenti, neque acceptatione eget; remoto aut renuntiante Administratore dioecesano, aut eodem defuncto, alius eligatur Administrator dioecesanus ad normam can. 421.

TITULUS II

DE ECCLESIARUM P ARTICULARIUM COETIBUS

Caput I

De provinciis ecclesiasticis et de regionibus ecclesiasticis

Can. 431 – § 1. Ut communis diversarum dioecesium vicinarum, iuxta personarum et locorum adiuncta, actio pastoralis promoveatur, utque Episcoporum dioecesanorum inter se relationes aptius foveantur, Ecclesiae particulares viciniores componantur in provincias ecclesiasticas certo territorio circumscriptas.

§ 2. Dioeceses exemptae deinceps pro regula ne habeantur; itaque singulae dioeceses aliaeque Ecclesiae particulares intra territorium alicuius provinciae ecclesiasticae exsistentes huic provinciae ecclesiasticae adscribi debent.

§ 3. Unius supremae Ecclesiae auctoritatis est, auditis quorum interest Episcopis, provincias ecclesiasticas constituere, supprimere aut innovare.

Can. 432 – § 1. In provincia ecclesiastica auctoritate, ad normam iuris, gaudent concilium provinciale atque Metropolita.

§ 2. Provincia ecclesiastica ipso iure personalitate iuridica gaudet.

Can. 433 – § 1. Si utilitas id suadeat, praesertim in nationibus ubi numerosiores adsunt Ecclesiae particulares, provinciae ecclesiasticae viciniores, proponente Episcoporum conferentia, a Sancta Sede in regiones ecclesiasticas coniungi possunt.

§ 2. Regio ecclesiastica in personam iuridicam erigi potest.

ТЫТУЛ II

АБ'ЯДНАННІ ПАРТЫКУЛЯРНЫХ КАСЦЁЛАЎ

Раздзел I

Касцёльныя правінцыі і касцёльныя рэгіёны

Кан. 431 – § 1. Для сумеснай пастырскай дзейнасці суседніх дыяцэзій, адпаведна да абставін асобаў і месцаў, а таксама для больш паспяховага падтрымання ўзаемаадносін паміж дыяцэзіяльнымі біскупамі, партыкулярныя Касцёлы, якія суседнічаюць адны з аднымі, павінны аб'ядноўвацца ў касцёльныя правінцыі, абмежаваныя акрэсленай тэрыторыяй.

§ 2. У будучыні, як правіла, не павінны існаваць выключаныя дыяцэзіі; таму асобныя дыяцэзіі і іншыя партыкулярныя Касцёлы, якія існуюць на тэрыторыі той ці іншай касцёльнай правінцыі, павінны належаць да гэтай касцёльнай правінцыі.

§ 3. Толькі вярхоўная ўлада Касцёла, выслухаўшы зацікаўленых біскупаў, можа засноўваць, ліквідаваць і змяняць касцёльныя правінцыі.

Кан. 432 – § 1. Уладу ў касцёльнай правінцыі маюць, згодна з нормамі права, Сінод правінцыі і мітрапаліт.

§ 2. Касцёльная правінцыя мае правасуб'ектнасць на моцы самога права.

Кан. 433 – § 1. Калі будзе палічана карысным, асабліва ў тых краінах, дзе існуе шмат партыкулярных Касцёлаў, Святая Сталіца можа па прапанове Канферэнцыі Біскупаў аб'ядноўваць касцёльныя правінцыі, якія суседнічаюць адна з адной, у касцёльныя рэгіёны.

§ 2. Касцёльны рэгіён можа быць заснаваны ў якасці юрыдычнай асобы.

Кан. 434 – Сход біскупаў касцёльнага рэгіёна павінен садзейнічаць супрацоўніцтву і сумеснай пастырскай дзейнасці ў рэгіёне; аднак гэтаму сходу не належыць улада, якой у канонах гэтага Кодэкса надзелены Канферэнцыі Біскупаў, калі акрэсленая частка гэтай улады не будзе спецыяльным чынам удзелена гэтаму сходу Святой Сталіцай.

Can. 434 – Ad conventum Episcoporum regionis ecclesiasticae pertinet cooperationem et actionem pastoralem communem in regione fovere; quae tamen in canonibus huius Codicis conferentiae Episcoporum tribuuntur potestates, eidem conventui non competunt, nisi quaedam specialiter a Sancta Sede ei concessa fuerint.

Раздзел II
Мітрапаліты

Caput II
De Metropolitis

Кан. 435 – Касцёльную правінцыю ўзначальвае мітрапаліт, які з'яўляецца арцыбіскупам дыяцэзіі, якой ён кіруе; гэтая пасада звязана з біскупскай сталіцай, вызначанай або зацверджанай Рымскім Пантыфікам.

Can. 435 – Provinciae ecclesiasticae praeest Metropolita, qui est Archiepiscopus dioecesis cui praeficitur; quod officium cum sede episcopali, a Romano Pontifice determinata aut probata, coniunctum est.

Кан. 436 – § 1. У суфраганных дыяцэзіях мітрапаліт мае права:

1° наглядаць за тым, каб дакладна захоўваліся вера і касцёльная дысцыпліна, і паведамляць аб злоўжываннях, калі яны існуюць, Рымскага Пантыфіка;

2° здзяйсняць кананічную візітацыю, атрымаўшы папярэдняе зацвярджэнне ад Апостальскай Сталіцы, калі суфраган занядбаў выкананне гэтага абавязку;

3° вызначаць дыяцэзіяльнага адміністратара згодна з нормамі кан. 421 § 2 і 425 § 3.

§ 2. Там, дзе гэтага патрабуюць абставіны, Апостальская Сталіца можа даручыць мітрапаліту асаблівыя заданні і надзяліць уладай, якая павінна быць акрэслена ў партыкулярным праве.

§ 3. Ніякай іншай улады ў суфраганных дыяцэзіях мітрапаліт не мае; аднак ён можа здзяйсняць святое служэнне як біскуп ва ўласнай дыяцэзіі, ва ўсіх касцёлах, а калі касцёл з'яўляецца катэдральным, — па-

Can. 436 – § 1. In dioecesibus suffraganeis Metropolitae competit:

1° vigilare ut fides et disciplina ecclesiastica accurate serventur, et de abusibus, si qui habeantur, Romanum Pontificem certiorem facere;

2° canonicam visitationem peragere, causa prius ab Apostolica Sede probata, si eam suffraganeus neglexerit;

3° deputare Administratorem dioecesanum, ad normam cann. 421, § 2 et 425, § 3.

§ 2. Ubi adiuncta id postulent, Metropolita ab Apostolica Sede instrui potest peculiaribus muneribus et potestate in iure particulari determinandis.

§ 3. Nulla alia in dioecesibus suffraganeis competit Metropolitis potestas regiminis; potest vero in omnibus ecclesiis, Episcopo dioecesano praemonito, si ecclesia sit cathedralis, sacras

exercere functiones, uti Episcopus in propria dioecesi.

пярэдзіўшы перад гэтым дыяцэзіяльнага біскупа.

Can. 437 – § 1. Metropolita obligatione tenetur, intra tres menses a recepta consecratione episcopali, aut, si iam consecratus fuerit, a provisione canonica, per se aut per procuratorem a Romano Pontifice petendi pallium, quo quidem significatur potestas qua, in communione cum Ecclesia Romana, Metropolita in propria provincia iure instruitur.

Кан. 437 – § 1. На мітрапаліта ўскладзены абавязак на працягу трох месяцаў пасля атрымання біскупскай кансэкрацыі або, калі ён ужо быў кансэкраваны, пасля атрымання кананічнага прызначэння асабіста ці праз прадстаўніка прасіць у Рымскага Пантыфіка палій, які з'яўляецца знакам улады, якой у адзінстве з Рымскім Касцёлам мітрапаліт надзяляецца ў сваёй правінцыі згодна з правам.

§ 2. Metropolita, ad normam legum liturgicarum, pallio uti potest intra quamlibet ecclesiam provinciae ecclesiasticae cui praeest, minime vero extra eandem, ne accedente quidem Episcopi dioecesani assensu.

§ 2. Мітрапаліт, згодна з нормамі літургічных прадпісанняў, можа ўжываць палій у кожным касцёле касцёльнай правінцыі, якую ўзначальвае; аднак, ніколі па-за яе межамі, нават са згоды дыяцэзіяльнага біскупа.

§ 3. Metropolita, si ad aliam sedem metropolitanam transferatur, novo indiget pallio.

§ 3. Калі мітрапаліт быў пераведзены на іншую мітрапалітальную сталіцу, ён павінен атрымаць новы палій.

Can. 438 – Patriarchae et Primatis titulus, praeter praerogativam honoris, nullam in Ecclesia latina secumfert regiminis potestatem, nisi de aliquibus ex privilegio apostolico aut probata consuetudine aliud constet.

Кан. 438 – Тытул Патрыярха і Прымаса, акрамя ганаровага першынства, не нясе з сабой у Лацінскім Касцёле ніякай улады кіравання, калі адносна некаторых з гэтых асобаў не вядома іншае з апостальскага прывілея або зацверджанага звычаю.

Caput III
De conciliis particularibus

Раздзел III
Партыкулярныя Сіноды

Can. 439 – § 1. Concilium plenarium, pro omnibus scilicet Ecclesiis particularibus eiusdem conferentiae Episcoporum, celebretur quoties id ipsi Episcoporum conferentiae, approbante Apostolica Sede, necessarium aut utile videatur.

Кан. 439 – § 1. Пленарны Сінод, прызначаны для ўсіх партыкулярных Касцёлаў той самай Канферэнцыі Біскупаў, праводзіцца тады, калі Канферэнцыя Біскупаў — атрымаўшы зацвярджэнне Апостальскай Сталіцы — палічыць гэта неабходным або карысным.

§ 2. Norma in § 1 statuta valet etiam de concilio provinciali celebrando

§ 2. Норма, устаноўленая ў § 1, прымяняецца таксама да правядзення Сіноду

правінцыі ў касцёльнай правінцыі, межы якой супадаюць з межамі краіны.

Кан. 440 – § 1. Сінод правінцыі для розных партыкулярных Касцёлаў адной касцёльнай правінцыі праводзіцца тады, калі на думку большай часткі дыяцэзіяльных біскупаў правінцыі гэта будзе адпаведным, захоўваючы кан. 439 § 2.

§ 2. Калі мітрапалітальная сталіца з'яўляецца вакантнай, Сінод правінцыі не склікаецца.

Кан. 441 – Канферэнцыя Біскупаў мае права:

1° склікаць пленарны Сінод;

2° вызначаць месца правядзення Сіноду на тэрыторыі Канферэнцыі Біскупаў;

3° выбіраць сярод дыяцэзіяльных біскупаў старшыню пленарнага Сіноду, пры гэтым яго павінна зацвердзіць Апостальская Сталіца;

4° акрэсліваць парадак працы і пытанні, якія павінны быць разгледжаны на Сінодзе; вызначаць пачатак і працягласць працы пленарнага Сіноду, пераносіць яго, працягваць і закончваць.

Кан. 442 – § 1. Мітрапаліт, са згоды большай часткі біскупаў-суфраганаў, мае права:

1° склікаць Сінод правінцыі;

2° вызначаць месца правядзення Сіноду правінцыі на тэрыторыі правінцыі;

3° акрэсліваць парадак працы і пытанні, якія павінны быць разгледжаны на Сінодзе; вызначаць пачатак і працягласць працы Сіноду правінцыі, пераносіць яго, працягваць і закончваць.

in provincia ecclesiastica, cuius termini cum territorio nationis coincidunt.

Can. 440 – § 1. Concilium provinciale, pro diversis Ecclesiis particularibus eiusdem provinciae ecclesiasticae, celebretur quoties id, de iudicio maioris partis Episcoporum dioecesanorum provinciae, opportunum videatur, salvo can. 439, § 2.

§ 2. Sede metropolitana vacante, concilium provinciale ne convocetur.

Can. 441 – Episcoporum conferentiae est:

1° convocare concilium plenarium;

2° locum ad celebrandum concilium intra territorium conferentiae Episcoporum eligere;

3° inter Episcopos dioecesanos concilii plenarii eligere praesidem, ab Apostolica Sede approbandum;

4° ordinem agendi et quaestiones tractandas determinare, concilii plenarii initium ac periodum indicere, illud transferre, prorogare et absolvere.

Can. 442 – § 1. Metropolitae, de consensu maioris partis Episcoporum suffraganeorum, est:

1° convocare concilium provinciale;

2° locum ad celebrandum concilium provinciale intra provinciae territorium eligere;

3° ordinem agendi et quaestiones tractandas determinare, concilii provincialis initium et periodum indicere, illud transferre, prorogare et absolvere.

§ 2. Metropolitae, eoque legitime impedito, Episcopi suffraganei ab aliis Episcopis suffraganeis electi est concilio provinciali praeesse.

Can. 443 – § 1. Ad concilia particularia convocandi sunt atque in eisdem ius habent suffragii deliberativi:

1° Episcopi dioecesani;

2° Episcopi coadiutores et auxiliares;

3° alii Episcopi titulares qui peculiari munere sibi ab Apostolica Sede aut ab Episcoporum conferentia demandato in territorio funguntur.

§ 2. Ad concilia particularia vocari possunt alii Episcopi titulares etiam emeriti in territorio degentes; qui quidem ius habent suffragii deliberativi.

§ 3. Ad concilia particularia vocandi sunt cum suffragio tantum consultivo:

1° Vicarii generales et Vicarii episcopales omnium in territorio Ecclesiarum particularium;

2° Superiores maiores institutorum religiosorum et societatum vitae apostolicae numero tum pro viris tum pro mulieribus ab Episcoporum conferentia aut a provinciae Episcopis determinando, respective electi ab omnibus Superioribus maioribus institutorum et societatum, quae in territorio sedem habent;

3° Rectores universitatum ecclesiasticarum et catholicarum atque decani facultatum theologiae et iuris canonici, quae in territorio sedem habent;

§ 2. Сінод правінцыі ўзначальвае мітрапаліт, а калі ён мае легітымную перашкоду, — біскуп-суфраган, выбраны іншымі біскупамі-суфраганамі.

Кан. 443 – § 1. На партыкулярныя Сіноды павінны быць скліканы і маюць права вырашальнага голасу:

1° дыяцэзіяльныя біскупы;

2° біскупы-каад'ютары і дапаможныя біскупы;

3° іншыя тытулярныя біскупы, якія на дадзенай тэрыторыі выконваюць асаблівае заданне, даручанае ім Апостальскай Сталіцай або Канферэнцыяй Біскупаў.

§ 2. На партыкулярныя Сіноды могуць быць пакліканы іншыя тытулярныя біскупы, а таксама эмэрыты, якія пражываюць на дадзенай тэрыторыі; яны маюць права вырашальнага голасу.

§ 3. На партыкулярныя Сіноды павінны быць пакліканы з правам толькі кансультатыўнага голасу:

1° генеральныя вікарыі і біскупскія вікарыі ўсіх партыкулярных Касцёлаў на дадзенай тэрыторыі;

2° вышэйшыя настаяцелі манаскіх інстытутаў і таварыстваў апостальскага жыцця, лічба якіх — як для мужчын, так і для жанчын — павінна быць акрэслена Канферэнцыяй Біскупаў або біскупамі правінцыі, выбраныя адпаведна ўсімі вышэйшымі настаяцелямі інстытутаў і таварыстваў, якія маюць сядзібу на дадзенай тэрыторыі;

3° рэктары касцёльных і каталіцкіх універсітэтаў, а таксама дэканы тэалагічных факультэтаў і факультэтаў кананічнага права, якія маюць сядзібу на дадзенай тэрыторыі;

4° рэктары некаторых вышэйшых семінарый, лічба якіх павінна быць акрэслена такім самым чынам, як у 2°, выбраныя рэктарамі семінарый, якія знаходзяцца на дадзенай тэрыторыі.

§ 4. На партыкулярныя Сіноды могуць быць пакліканы з правам толькі кансультатыўнага голасу таксама прэзбітэры і іншыя вернікі, аднак пры гэтым іх лічба не павінна перавышаць паловы тых, аб якіх гаворыцца ў §§ 1–3.

§ 5. Акрамя таго, на Сіноды правінцый павінны быць запрошаны катэдральныя Капітулы, а таксама Святарскія Рады і Пастырскія Рады кожнага партыкулярнага Касцёла такім чынам, каб кожная з іх скіравала двух сваіх членаў, вызначаных імі калегіяльна; аднак яны маюць толькі кансультатыўны голас.

§ 6. На партыкулярныя Сіноды могуць быць запрошаны таксама іншыя асобы ў якасці гасцей, калі гэта будзе палічана мэтазгодным: у выпадку партыкулярнага Сіноду — на думку Канферэнцыі Біскупаў, а ў выпадку Сіноду правінцыі — на думку мітрапаліта разам з біскупамі-суфраганамі.

Кан. 444 – § 1. Усе, хто скліканы на партыкулярныя Сіноды, павінны прысутнічаць на іх, калі іх не стрымлівае справядліва абгрунтаваная перашкода, аб якой яны павінны паведаміць старшыню Сіноду.

§ 2. Тыя, хто скліканы на партыкулярныя Сіноды і маюць на іх вырашальны голас, пры наяўнасці справядліва абгрунтаванай перашкоды могуць выслаць свайго прадстаўніка; такі прадстаўнік мае толькі кансультатыўны голас.

Кан. 445 – Партыкулярны Сінод павінен клапаціцца аб тым, каб на яго тэрыторыі былі задаволены пастырскія патрэбы Божага народа; партыкулярны Сінод мае

4° Rectores aliqui seminariorum maiorum, numero ut in n. 2 determinando, electi a rectoribus seminariorum quae in territorio sita sunt.

§ 4. Ad concilia particularia vocari etiam possunt, cum suffragio tantum consultivo, presbyteri aliique christifideles, ita tamen ut eorum numerus non excedat dimidiam partem eorum de quibus in §§ 1-3.

§ 5. Ad concilia provincialia praeterea invitentur capitula cathedralia, itemque consilium presbyterale et consilium pastorale uniuscuiusque Ecclesiae particularis, ita quidem ut eorum singula duos ex suis membris mittant, collegialiter ab iisdem designatos; qui tamen votum habent tantum consultivum.

§ 6. Ad concilia particularia, si id iudicio Episcoporum conferentiae pro concilio plenario aut Metropolitae una cum Episcopis suffraganeis pro concilio provinciali expediat, etiam alii ut hospites invitari poterunt.

Can. 444 – § 1. Omnes qui ad concilia particularia convocantur, eisdem interesse debent, nisi iusto detineantur impedimento, de quo concilii praesidem certiorem facere tenentur.

§ 2. Qui ad concilia particularia convocantur et in eis suffragium habent deliberativum, si iusto detineantur impedimento, procuratorem mittere possunt; qui procurator votum habet tantum consultivum.

Can. 445 – Concilium particulare pro suo territorio curat ut necessitatibus pastoralibus populi Dei provideatur atque potestate gaudet regi-

minis, praesertim legislativa, ita ut, salvo semper iure universali Ecclesiae, decernere valeat quae ad fidei incrementum, ad actionem pastoralem communem ordinandam et ad moderandos mores et disciplinam ecclesiasticam communem servandam, inducendam aut tuendam opportuna videantur.

Can. 446 – Absoluto concilio particulari, praeses curet ut omnia acta concilii ad Apostolicam Sedem transmittantur; decreta a concilio edicta ne promulgentur, nisi postquam ab Apostolica Sede recognita fuerint; ipsius concilii est definire modum promulgationis decretorum et tempus quo decreta promulgata obligare incipiant.

ўладу кіравання, перадусім заканадаўчую, каб — заўсёды захоўваючы паўсюднае права Касцёла — ён мог прымаць рашэнні адносна таго, што будзе карысным для ўзрастання веры, для арганізацыі агульнай пастырскай дзейнасці, для выпраўлення нораваў і для таго, каб захоўваць, уводзіць ці абараняць агульную касцёльную дысцыпліну.

Кан. 446 – Пасля заканчэння партыкулярнага Сіноду старшыня павінен паклапаціцца аб тым, каб усе акты Сіноду былі перададзены Апостальскай Сталіцы; дэкрэты, прынятыя Сінодам, не павінны быць прамульгаваны раней, чым будуць праверaны Апостальскай Сталіцай; сам Сінод павінен акрэсліць спосаб прамульгацыі дэкрэтаў і час, з якога прамульгаваныя дэкрэты набываюць абавязковую моц.

Caput IV
De episcoporum conferentiis

Раздзел IV
Канферэнцыі Біскупаў

Can. 447 – Episcoporum conferentia, institutum quidem permanens, est coetus Episcoporum alicuius nationis vel certi territorii, munera quaedam pastoralia coniunctim pro christifidelibus sui territorii exercentium, ad maius bonum provehendum, quod hominibus praebet Ecclesia, praesertim per apostolatus formas et rationes temporis et loci adiunctis apte accommodatas, ad normam iuris.

Кан. 447 – Канферэнцыя Біскупаў, будучы пастаянным інстытутам, з'яўляецца сходам біскупаў якой-небудзь краіны або акрэсленай тэрыторыі, якія сумесна ажыццяўляюць пастырскае заданне ў адносінах да вернікаў, якія пражываюць на яе тэрыторыі, з мэтай большага садзейнічання дабру, якое Касцёл нясе людзям, асабліва праз розныя формы і спосабы апостальства, дастасаваныя да абставінаў месца і часу, згодна з нормамі права.

Can. 448 – § 1. Episcoporum conferentia regula generali comprehendit praesules omnium Ecclesiarum particularium eiusdem nationis, ad normam can. 450.

§ 2. Si vero, de iudicio Apostolicae Sedis, auditis quorum interest Epi-

Кан. 448 – § 1. Наогул, Канферэнцыя Біскупаў уключае ў сябе тых, хто ўзначальвае ўсе партыкулярныя Касцёлы дадзенай краіны, згодна з нормай кан. 450.

§ 2. Аднак, калі, на думку Апостальскай Сталіцы, якая выслухала зацікаўленых ды-

яцэзіяльных біскупаў, да гэтага схіляюць акалічнасці асобаў або рэчаў, Канферэнцыя Біскупаў можа быць заснавана на большай ці меншай тэрыторыі такім чынам, каб уключала ў сябе толькі біскупаў некаторых партыкулярных Касцёлаў, заснаваных на акрэсленай тэрыторыі, або тых, хто ўзначальвае партыкулярныя Касцёлы, якія існуюць у розных краінах; таксама Апостальская Сталіца мае права ўстанаўліваць асаблівыя нормы для кожнай такой Канферэнцыі.

scopis dioecesanis, personarum aut rerum adiuncta id suadeant, Episcoporum conferentia erigi potest pro territorio minoris aut maioris amplitudinis, ita ut vel tantum comprehendat Episcopos aliquarum Ecclesiarum particularium in certo territorio constitutarum vel praesules Ecclesiarum particularium in diversis nationibus exstantium; eiusdem Apostolicae Sedis est pro earundem singulis peculiares normas statuere.

Кан. 449 – § 1. Толькі вярхоўная ўлада Касцёла, выслухаўшы зацікаўленых біскупаў, мае права на заснаванне, ліквідацыю або змяненне Канферэнцыі Біскупаў.

§ 2. Легітымна заснаваная Канферэнцыя Біскупаў мае правасуб'ектнасць на моцы самога права.

Can. 449 – § 1. Unius supremae Ecclesiae auctoritatis est, auditis quorum interest Episcopis, Episcoporum conferentias erigere, supprimere aut innovare.

§ 2. Episcoporum conferentia legitime erecta ipso iure personalitate iuridica gaudet.

Кан. 450 – § 1. У Канферэнцыю Біскупаў на моцы самога права ўваходзяць усе дыяцэзіяльныя біскупы дадзенай тэрыторыі і тыя, хто ў праве да іх прыраўноўваецца, а таксама біскупы-каад'ютары, дапаможныя біскупы і іншыя тытулярныя біскупы, якія на дадзенай тэрыторыі выконваюць асаблівае заданне, даручанае ім Апостальскай Сталіцай або Канферэнцыяй Біскупаў; могуць быць запрошаны таксама ардынарыі іншых абрадаў, але з правам толькі кансультатыўнага голасу, калі статуты Канферэнцыі Біскупаў не прадугледжваюць іншае.

Can. 450 – § 1. Ad Episcoporum conferentiam ipso iure pertinent omnes in territorio Episcopi dioecesani eisque iure aequiparati, itemque Episcopi coadiutores, Episcopi auxiliares atque ceteri Episcopi titulares peculiari munere, sibi ab Apostolica Sede vel ab Episcoporum conferentia demandato, in eodem territorio fungentes; invitari quoque possunt Ordinarii alterius ritus, ita tamen ut votum tantum consultivum habeant, nisi Episcoporum conferentiae statuta aliud decernant.

§ 2. Іншыя тытулярныя біскупы, а таксама легат Рымскага Пантыфіка не з'яўляюцца на моцы права членамі Канферэнцыі Біскупаў.

§ 2. Ceteri Episcopi titulares necnon Legatus Romani Pontificis non sunt de iure membra Episcoporum conferentiae.

Кан. 451 – Кожная Канферэнцыя Біскупаў павінна выпрацаваць свае статуты, якія павінны быць праверaны Апостальскай

Can. 451 – Quaelibet Episcoporum conferentia sua conficiat statuta, ab Apostolica Sede recognoscenda,

in quibus, praeter alia, ordinentur conferentiae conventus plenarii habendi, et provideantur consilium Episcoporum permanens et secretaria generalis conferentiae, atque alia etiam officia et commissiones quae iudicio conferentiae fini consequendo efficacius consulant.

скай Сталіцай; у гэтых статутах, між іншым, павінны быць прадугледжаны парадак правядзення пленарных пасяджэнняў, Пастаянная Рада Біскупаў і Генеральны Сакратарыят Канферэнцыі, а таксама іншыя пасады і камісіі, якія, згодна з суджэннем Канферэнцыі, будуць садзейнічаць больш паспяховаму дасягненню яе мэтаў.

Can. 452 – § 1. Quaelibet Episcoporum conferentia sibi eligat praesidem, determinet quisnam, praeside legitime impedito, munere pro-praesidis fungatur, atque secretarium generalem designet, ad normam statutorum.

Кан. 452 – § 1. Кожная Канферэнцыя Біскупаў павінна выбраць сабе старшыню і акрэсліць, хто будзе выконваць заданне намесніка старшыні, калі старшыня будзе мець легітымную перашкоду, а таксама павінна прызначыць генеральнага сакратара згодна з нормамі статутаў.

§ 2. Praeses conferentiae, atque eo legitime impedito pro-praeses, non tantum Episcoporum conferentiae conventibus generalibus, sed etiam consilio permanenti praeest.

§ 2. Старшыня Канферэнцыі, а калі ён мае легітымную перашкоду, то яго намеснік, узначальвае не толькі агульныя пасяджэнні Канферэнцыі Біскупаў, але і Пастаянную Раду.

Can. 453 – Conventus plenarii Episcoporum conferentiae habeantur semel saltem singulis annis, et praeterea quoties id postulent peculiaria adiuncta, secundum statutorum praescripta.

Кан. 453 – Пленарныя пасяджэнні Канферэнцыі Біскупаў павінны адбывацца прынамсі раз на год, і, апрача гэтага, — кожны раз, калі гэтага патрабуюць асаблівыя абставіны, згодна з прадпісаннямі статутаў.

Can. 454 – § 1. Suffragium deliberativum in conventibus plenariis Episcoporum conferentiae ipso iure competit Episcopis dioecesanis eisque qui iure ipsis aequiparantur, necnon Episcopis coadiutoribus.

Кан. 454 – § 1. На пленарных пасяджэннях Канферэнцыі Біскупаў права вырашальнага голасу на моцы самога права маюць дыяцэзіяльныя біскупы і тыя, хто ў праве да іх прыраўноўваецца, а таксама біскупы-каад'ютары.

§ 2. Episcopis auxiliaribus ceterisque Episcopis titularibus qui ad Episcoporum conferentiam pertinent, suffragium competit deliberativum aut consultivum, iuxta statutorum conferentiae praescripta; firmum tamen sit eis solis, de quibus in § 1, competere suffragium deliberativum, cum agitur de statutis conficiendis aut immutandis.

§ 2. Дапаможныя біскупы і іншыя тытулярныя біскупы, якія ўваходзяць у Канферэнцыю Біскупаў, маюць права вырашальнага або кансультатыўнага голасу адпаведна прадпісанням статутаў Канферэнцыі; аднак, калі гаворка ідзе пра выпрацоўку або змяненне статутаў, права вырашальнага голасу нязменна належыць толькі тым, аб якіх гаворыцца ў § 1.

Кан. 455 – § 1. Канферэнцыя Біскупаў можа выдаваць агульныя дэкрэты толькі ў тых справах, у якіх гэта прадпісана паўсюдным правам ці асаблівым упаўнаважаннем Апостальскай Сталіцы, выдадзеным ёй або з уласнай ініцыятывы, або па просьбе самой Канферэнцыі.

§ 2. Для таго, каб дэкрэты, аб якіх гаворыцца ў § 1, былі прыняты на пленарным пасяджэнні дзейсным чынам, яны павінны атрымаць прынамсі дзве трэція галасоў тых, хто мае права вырашальнага голасу і ўваходзіць у склад Канферэнцыі; яны атрымліваюць абавязковую моц пасля таго, як іх праверыць Апостальская Сталіца і яны будуць легітымна прамульгаваны.

§ 3. Парадак прамульгацыі і час, ад якога дэкрэты атрымліваюць сваю моц, акрэсліваюцца самой Канферэнцыяй Біскупаў.

§ 4. У справах, у якіх ні паўсюднае права, ні асаблівае ўпаўнаважанне Апостальскай Сталіцы не надзялілі Канферэнцыю Біскупаў уладай, аб якой гаворыцца ў § 1, непарушнымі застаюцца паўнамоцтвы кожнага асобнага дыяцэзіяльнага біскупа, і ні Канферэнцыя, ні яе старшыня не маюць права дзейнічаць ад імя ўсіх біскупаў, калі ўсе біскупы і кожны з іх паасобку не дадуць на гэта згоды.

Кан. 456 – Пасля заканчэння пленарнага пасяджэння Канферэнцыі Біскупаў старшыня павінен перадаць Апостальскай Сталіцы справаздачу аб дзейнасці Канферэнцыі і яе дэкрэты як для таго, каб паведаміць аб дзейнасці Канферэнцыі, так і для таго, каб дэкрэты, калі яны былі выдадзены, былі праверaны Апостальскай Сталіцай.

Кан. 457 – Пастаянная Рада Біскупаў павінна клапаціцца аб тым, каб былі падрыхтаваны справы, якія павінны быць абмеркаваны на пленарным пасяджэнні Канферэн-

Can. 455 – § 1. Episcoporum conferentia decreta generalia ferre tantummodo potest in causis, in quibus ius universale id praescripserit aut peculiare Apostolicae Sedis mandatum sive motu proprio sive ad petitionem ipsius conferentiae id statuerit.

§ 2. Decreta de quibus in § 1, ut valide ferantur in plenario conventu, per duas saltem ex tribus partibus suffragiorum Praesulum, qui voto deliberativo fruentes ad conferentiam pertinent, proferri debent, atque vim obligandi non obtinent, nisi ab Apostolica Sede recognita, legitime promulgata fuerint.

§ 3. Modus promulgationis et tempus a quo decreta vim suam exserunt, ab ipsa Episcoporum conferentia determinantur.

§ 4. In casibus in quibus nec ius universale nec peculiare Apostolicae Sedis mandatum potestatem, de qua in § 1, Episcoporum conferentiae concessit, singuli Episcopi dioecesani competentia integra manet, nec conferentia eiusve praeses nomine omnium Episcoporum agere valet, nisi omnes et singuli Episcopi consensum dederint.

Can. 456 – Absoluto conventu plenario Episcoporum conferentiae, relatio de actis conferentiae necnon eius decreta a praeside ad Apostolicam Sedem transmittantur, tum ut in eiusdem notitiam acta perferantur, tum ut decreta, si quae sint, ab eadem recognosci possint.

Can. 457 – Consilii Episcoporum permanentis est curare, ut res in plenario conventu conferentiae agendae praeparentur et decisiones in conven-

tu plenario statutae debite exsecutioni mandentur; eiusdem etiam est alia negotia peragere, quae ipsi ad normam statutorum committuntur.

Can. 458 – Secretariae generalis est:

1° relationem componere actorum et decretorum conventus plenarii conferentiae necnon actorum consilii Episcoporum permanentis, et eadem cum omnibus conferentiae membris communicare itemque alia acta conscribere, quae ipsi a conferentiae praeside aut a consilio permanenti componenda committuntur;

2° communicare cum Episcoporum conferentiis finitimis acta et documenta quae a conferentia in plenario conventu aut a consilio Episcoporum permanenti ipsis transmitti statuuntur.

Can. 459 – § 1. Foveantur relationes inter Episcoporum conferentias, praesertim viciniores, ad maius bonum promovendum ac tuendum.

§ 2. Quoties vero actiones aut rationes a conferentiis ineuntur formam internationalem praeseferentes, Apostolica Sedes audiatur oportet.

цыі, і сачыць за тым, каб рашэнні, прынятыя на пленарным пасяджэнні выконваліся належным чынам; Рада павінна займацца таксама іншымі пытаннямі, якія ёй даручаны згодна з нормамі статутаў.

Кан. 458 – Генеральны Сакратарыят павінен:

1° складаць справаздачы аб дзейнасці і дэкрэтах пленарнага пасяджэння Канферэнцыі, а таксама аб дзейнасці Пастаяннай Рады Біскупаў і паведамляць аб іх усіх членаў Канферэнцыі, а таксама складаць іншыя акты па даручэнні старшыні Канферэнцыі або Пастаяннай Рады;

2° паведамляць суседнія Канферэнцыі Біскупаў аб дзейнасці і дакументах, якія, згодна з рашэннем пленарнага пасяджэння Канферэнцыі або Пастаяннай Рады Біскупаў, павінны быць ім перададзены.

Кан. 459 – § 1. Трэба падтрымліваць адносіны паміж Канферэнцыямі Біскупаў, асабліва паміж суседнімі, для спрыяння большаму дабру і яго захоўванню.

§ 2. Кожны раз, калі дзейнасць або спосаб дзеянняў Канферэнцый набываюць міжнародны характар, неабходна выслухаць Апостальскую Сталіцу.

TITULUS III

DE INTERNA ORDINATIONE ECCLESIARUM PARTICULARIUM

Caput I

De synodo dioecesana

Can. 460 – Synodus dioecesana est coetus delectorum sacerdotum aliorumque christifidelium Ecclesiae par-

ТЫТУЛ III

УНУТРАНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПАРТЫКУЛЯРНЫХ КАСЦЁЛАЎ

Раздзел I

Дыяцэзіяльны Сінод

Кан. 460 – Дыяцэзіяльны Сінод — гэта сход выбраных святароў і іншых вернікаў партыкулярнага Касцёла, якія для дабра

ўсёй дыяцэзіяльнай супольнасці аказваюць дапамогу дыяцэзіяльнаму біскупу згодна з нормамі наступных канонаў.

Кан. 461 – § 1. Дыяцэзіяльны Сінод у асобным партыкулярным Касцёле праводзіцца кожны раз, калі, на думку дыяцэзіяльнага біскупа, які выслухаў Святарскую Раду, да гэтага схіляюць абставіны.

§ 2. Калі біскуп мае апеку над некалькімі дыяцэзіямі або над адной у якасці ўласнага біскупа, а над другой — у якасці адміністратара, ён можа склікаць адзін дыяцэзіяльны Сінод з усіх даверaных яму дыяцэзій.

Кан. 462 – § 1. Дыяцэзіяльны Сінод склікае толькі дыяцэзіяльны біскуп, але не той, хто часова ўзначальвае дыяцэзію.

§ 2. Дыяцэзіяльны Сінод узначальвае дыяцэзіяльны біскуп, які, аднак, можа дэлегаваць для выконвання гэтага абавязку на асобныя пасяджэнні Сіноду генеральнага або біскупскага вікарыя.

Кан. 463 – § 1. На дыяцэзіяльны Сінод павінны быць скліканы ў якасці членаў Сіноду і маюць абавязак прымаць у ім удзел:

1° біскуп-каад'ютар і дапаможныя біскупы;

2° генеральныя вікарыі і біскупскія вікарыі, а таксама судовы вікарый;

3° канонікі катэдральнага касцёла;

4° члены Святарскай Рады;

5° свецкія вернікі, а таксама члены інстытутаў кансэкраванага жыцця, выбраныя Пастырскай Радай такім спосабам і ў такой лічбе, як гэта акрэсліў дыяцэзіяльны біскуп, або — там, дзе такая Рада не існуе, — выбраныя спосабам, які акрэсліў дыяцэзіяльны біскуп;

6° рэктар вышэйшай духоўнай семінарыі;

ticularis, qui in bonum totius communitatis dioecesanae Episcopo dioecesano adiutricem operam praestant, ad normam canonum qui sequuntur.

Can. 461 – § 1. Synodus dioecesana in singulis Ecclesiis particularibus celebretur cum, iudicio Episcopi dioecesani et audito consilio presbyterali, adiuncta id suadeant.

§ 2. Si Episcopus plurium dioecesium curam habet, aut unius curam habet uti Episcopus proprius, alterius vero uti Administrator, unam synodum dioecesanam ex omnibus dioecesibus sibi commissis convocare potest.

Can. 462 – § 1. Synodum dioecesanam convocat solus Episcopus dioecesanus, non autem qui ad interim dioecesi praeest.

§ 2. Synodo dioecesanae praeest Episcopus dioecesanus, qui tamen Vicarium generalem aut Vicarium episcopalem pro singulis sessionibus synodi ad hoc officium implendum delegare potest.

Can. 463 – § 1. Ad synodum dioecesanam vocandi sunt uti synodi sodales eamque participandi obligatione tenentur:

1° Episcopus coadiutor atque Episcopi auxiliares;

2° Vicarii generales et Vicarii episcopales, necnon Vicarius iudicialis;

3° canonici ecclesiae cathedralis;

4° membra consilii presbyteralis;

5° christifideles laici, etiam sodales institutorum vitae consecratae, a consilio pastorali eligendi, modo et numero ab Episcopo dioecesano determinandis, aut, ubi hoc consilium non exstet, ratione ab Episcopo dioecesano determinata;

6° rector seminarii dioecesani maioris;

7° vicarii foranei;

8° unus saltem presbyter ex unoquoque vicariatu foraneo eligendus ab omnibus qui curam animarum inibi habeant; item eligendus est alius presbyter qui, eodem impedito, in eius locum substituatur;

9° aliqui Superiores institutorum religiosorum et societatum vitae apostolicae, quae in dioecesi domum habent, eligendi numero et modo ab Episcopo dioecesano determinatis.

§ 2. Ad synodum dioecesanam ab Episcopo dioecesano vocari uti synodi sodales possunt alii quoque, sive clerici, sive institutorum vitae consecratae sodales, sive christifideles laici.

§ 3. Ad synodum dioecesanam Episcopus dioecesanus, si id opportunum duxerit, invitare potest uti observatores aliquos ministros aut sodales Ecclesiarum vel communitatum ecclesialium, quae non sunt in plena cum Ecclesia catholica communione.

Can. 464 – Synodi sodalis, si legitimo detineatur impedimento, non potest mittere procuratorem qui ipsius nomine eidem intersit; Episcopum vero dioecesanum de hoc impedimento certiorem faciat.

Can. 465 – Propositae quaestiones omnes liberae sodalium disceptationi in synodi sessionibus subiciantur.

Can. 466 – Unus in synodo dioecesana legislator est Episcopus dioecesanus, aliis synodi sodalibus voto tantummodo consultivo gaudentibus; unus ipse synodalibus declarationibus et decretis subscribit, quae eius

7° акруговыя вікарыі;

8° прынамсі адзін прэзбітэр з кожнага акруговага вікарыяту, выбраны тымі, хто ажыццяўляе там душпастырства; павінен быць выбраны таксама іншы прэзбітэр, які будзе яго замяшчаць, калі той будзе мець перашкоду;

9° некаторыя настаяцелі манаскіх інстытутаў і таварыстваў апостальскага жыцця, якія маюць сядзібу ў дыяцэзіі, выбраныя такім спосабам і ў такой лічбе, як гэта акрэсліў дыяцэзіяльны біскуп.

§ 2. Дыяцэзіяльны біскуп можа паклікаць на дыяцэзіяльны Сінод у якасці яго членаў некаторых іншых асобаў — духоўных, або членаў інстытутаў кансэкраванага жыцця, або свецкіх вернікаў.

§ 3. Калі дыяцэзіяльны біскуп палічыць гэта дарэчным, можа запрасіць на дыяцэзіяльны Сінод у якасці назіральнікаў некаторых служыцеляў або членаў Касцёлаў ці касцёльных супольнасцяў, якія не знаходзяцца ў поўным адзінстве з Каталіцкім Касцёлам.

Кан. 464 – Член Сіноду, які мае легітымную перашкоду, не можа скіраваць прадстаўніка, які ад яго імя будзе ўдзельнічаць у працы Сіноду; але ён павінен паведаміць дыяцэзіяльнага біскупа аб наяўнасці перашкоды.

Кан. 465 – Усе прапанаваныя пытанні павінны быць свабодна абмеркаваны членамі Сіноду на яго пасяджэннях.

Кан. 466 – Адзіным заканадаўцам на дыяцэзіяльным Сінодзе з'яўляецца дыяцэзіяльны біскуп, іншыя члены Сіноду маюць права толькі кансультатыўнага голасу; толькі дыяцэзіяльны біскуп асабіста падпісвае ўсе дэкларацыі і дэкрэты Сіноду,

і толькі яго ўладай яны могуць атрымаць моц права.

Кан. 467 – Дыяцэзіяльны біскуп павінен прадставіць тэксты сінадальных дэкларацый і дэкрэтаў мітрапаліту і Канферэнцыі Біскупаў.

Кан. 468 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп мае права, згодна са сваім разважлівым суджэннем, прыпыніць або распусціць дыяцэзіяльны Сінод.

§ 2. Калі біскупская сталіца становіцца вакантнай або мае перашкоду, дыяцэзіяльны Сінод перарываецца на моцы самога права, пакуль наступны дыяцэзіяльны біскуп не вырашыць працягваць яго працу або не паведаміць аб яго спыненні.

auctoritate tantum publici iuris fieri possunt.

Can. 467 – Episcopus dioecesanus textus declarationum ac decretorum synodalium communicet cum Metropolita necnon cum Episcoporum conferentia.

Can. 468 – § 1. Episcopo dioecesano competit pro suo prudenti iudicio synodum dioecesanam suspendere necnon dissolvere.

§ 2. Vacante vel impedita sede episcopali, synodus dioecesana ipso iure intermittitur, donec Episcopus dioecesanus, qui succedit, ipsam continuari decreverit aut eandem extinctam declaraverit.

Раздзел II
Дыяцэзіяльная Курыя

Caput II
De curia dioecesana

Кан. 469 – Дыяцэзіяльная Курыя складаецца з тых устаноў і асобаў, якія аказваюць дапамогу біскупу ў кіраванні ўсёй дыяцэзіяй, асабліва ў кіраванні пастырскай дзейнасцю, у адміністраванні дыяцэзіяй, а таксама ў ажыццяўленні судовай улады.

Кан. 470 – Прызначэнне тых, хто займае пасады ў дыяцэзіяльнай Курыі, знаходзіцца ў кампетэнцыі дыяцэзіяльнага біскупа.

Кан. 471 – Усе, прынятыя на пасады ў Курыю, павінны:

1° скласці прысягу верна выконваць сваё заданне такім чынам, які акрэслівае права або дыяцэзіяльны біскуп;

2° захоўваць таямніцу ў межах і парадку, якія акрэслены правам або дыяцэзіяльным біскупам.

Кан. 472 – У тым, што датычыць спраў і асобаў, якія ў Курыі маюць дачыненне да

Can. 469 – Curia dioecesana constat illis institutis et personis, quae Episcopo operam praestant in regimine universae dioecesis, praesertim in actione pastorali dirigenda, in administratione dioecesis curanda, necnon in potestate iudiciali exercenda.

Can. 470 – Nominatio eorum, qui officia in curia dioecesana exercent, spectat ad Episcopum dioecesanum.

Can. 471 – Omnes qui ad officia in curia admittuntur debent:

1° promissionem emittere de munere fideliter adimplendo, secundum rationem iure vel ab Episcopo determinatam;

2° secretum servare intra fines et secundum modum iure aut ab Episcopo determinatos.

Can. 472 – Circa causas atque personas quae in curia ad exercitium pote-

statis iudicialis pertinent, serventur praescripta Libri VII *De processibus*; de iis autem quae ad administrationem dioecesis spectant, serventur praescripta canonum qui sequuntur.

Can. 473 – § 1. Episcopus dioecesanus curare debet ut omnia negotia quae ad universae dioecesis administrationem pertinent, debite coordinentur et ad bonum portionis populi Dei sibi commissae aptius procurandum ordinentur.

§ 2. Ipsius Episcopi dioecesani est coordinare actionem pastoralem Vicariorum sive generalium sive episcopalium; ubi id expediat, nominari potest Moderator curiae, qui sacerdos sit oportet, cuius est sub Episcopi auctoritate ea coordinare quae ad negotia administrativa tractanda attinent, itemque curare ut ceteri curiae addicti officium sibi commissum rite adimpleant.

§ 3. Nisi locorum adiuncta iudicio Episcopi aliud suadeant, Moderator curiae nominetur Vicarius generalis aut, si plures sint, unus ex Vicariis generalibus.

§ 4. Ubi id expedire iudicaverit, Episcopus, ad actionem pastoralem aptius fovendam, constituere potest consilium episcopale, constans scilicet Vicariis generalibus et Vicariis episcopalibus.

Can. 474 – Acta curiae quae effectum iuridicum habere nata sunt, subscribi debent ab Ordinario a quo emanant, et quidem ad validitatem, ac simul a curiae cancellario vel notario; cancellarius vero Moderatorem curiae de actis certiorem facere tenetur.

ажыццяўлення судовай улады, трэба захоўваць прадпісанні Кнігі VII «Працэсы»; а ў тым, што адносіцца да адміністравання дыяцэзіяй, трэба захоўваць прадпісанні наступных канонаў.

Кан. 473 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп павінен клапаціцца аб тым, каб усе справы, якія адносяцца да адміністравання ўсёй дыяцэзіяй, былі каардынаваны і адпаведным чынам скіраваны да большага дабра даручанай яму часткі Божага народа.

§ 2. Дыяцэзіяльны біскуп павінен асабіста каардынаваць пастырскую дзейнасць генеральных і біскупскіх вікарыяў. Там, дзе гэта будзе карысным, можа быць прызначаны мадэратар Курыі, які павінен быць святаром і пад уладай біскупа каардынаваць тое, што датычыць адміністрацыйных пытанняў, якія падлягаюць разгляду, а таксама клапаціцца аб тым, каб іншыя супрацоўнікі Курыі належным чынам выконвалі даручаныя ім абавязкі.

§ 3. Калі, на думку біскупа, мясцовыя акалічнасці не схіляюць да іншага, мадэратарам Курыі павінен быць прызначаны генеральны вікарый або — калі іх некалькі — адзін з генеральных вікарыяў.

§ 4. Там, дзе біскуп палічыць гэта карысным для больш паспяховага ажыццяўлення пастырскай дзейнасці, ён можа заснаваць Біскупскую Раду, якая складаецца з генеральных і біскупскіх вікарыяў.

Кан. 474 – Акты Курыі, якія складаюцца з мэтай наступлення юрыдычных наступстваў, для іх дзейснасці павінны быць падпісаны ардынарыем, які іх выдае, а таксама канцлерам або натарыусам Курыі; пры гэтым канцлер Курыі павінен паведаміць мадэратара Курыі аб гэтых актах.

Артыкул 1. *Генеральныя і біскупскія вікарыі*

Кан. 475 – § 1. У кожнай дыяцэзіі дыяцэзіяльны біскуп павінен прызначыць генеральнага вікарыя, які, надзелены звычайнай уладай згодна з нормамі наступных канонаў, павінен дапамагаць яму ў кіраванні ўсёй дыяцэзіяй.

§ 2. Павінна быць прынята ў якасці агульнага правіла, што прызначаецца толькі адзін генеральны вікарый, калі велічыня дыяцэзіі, або лічба жыхароў, або іншыя пастырскія прычыны не схіляюць да іншага.

Кан. 476 – Заўсёды, калі гэтага патрабуе належнае кіраванне дыяцэзіяй, дыяцэзіяльны біскуп можа прызначыць аднаго або некалькіх біскупскіх вікарыяў, якія або ў абмежаванай частцы дыяцэзіі, або ў акрэсленых справах, або ў адносінах да вернікаў акрэсленага абраду, або ў адносінах да акрэсленай групы асобаў маюць тую ж звычайную ўладу, якая на моцы паўсюднага права належыць генеральнаму вікарыю згодна з нормамі наступных канонаў.

Кан. 477 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп свабодна прызначае генеральнага і біскупскага вікарыяў, і яны могуць быць свабодна вызвалены ім ад пасады, захоўваючы прадпісанні кан. 406; біскупскі вікарый, які не з'яўляецца дапаможным біскупам, павінен быць прызначаны толькі на час, акрэслены ў самім акце прызначэння.

§ 2. Калі генеральны вікарый адсутнічае або мае легітымную перашкоду, дыяцэзіяльны біскуп можа прызначыць іншага, які будзе яго замяшчаць; гэтая ж норма прымяняецца ў дачыненні да біскупскага вікарыя.

Кан. 478 – § 1. Генеральнымі і біскупскімі вікарыямі павінны быць святары, не ма-

Art. 1. *De vicariis generalibus et episcopalibus*

Can. 475 – § 1. In unaquaque dioecesi constituendus est ab Episcopo dioecesano Vicarius generalis, qui potestate ordinaria ad normam canonum qui sequuntur instructus, ipsum in universae dioecesis regimine adiuvet.

§ 2. Pro regula generali habeatur ut unus constituatur Vicarius generalis, nisi dioecesis amplitudo vel incolarum numerus aut aliae rationes pastorales aliud suadeant.

Can. 476 – Quoties rectum dioecesis regimen id requirat, constitui etiam possunt ab Episcopo dioecesano unus vel plures Vicarii episcopales, qui nempe aut in determinata dioecesis parte aut in certo negotiorum genere aut quoad fideles determinati ritus vel certi personarum coetus, eadem gaudent potestate ordinaria, quae iure universali Vicario generali competit, ad normam canonum qui sequuntur.

Can. 477 – § 1. Vicarius generalis et episcopalis libere ab Episcopo dioecesano nominantur et ab ipso libere removeri possunt, firmo praescripto can. 406; Vicarius episcopalis, qui non sit Episcopus auxiliaris, nominetur tantum ad tempus, in ipso constitutionis actu determinandum.

§ 2. Vicario generali absente vel legitime impedito, Episcopus dioecesanus alium nominare potest, qui eius vices suppleat; eadem norma applicatur pro Vicario episcopali.

Can. 478 – § 1. Vicarius generalis et episcopalis sint sacerdotes annos

nati non minus triginta, in iure canonico aut theologia doctores vel licentiati vel saltem in iisdem disciplinis vere periti, sana doctrina, probitate, prudentia ac rerum gerendarum experientia commendati.

ладзейшыя за трыццаць гадоў, якія маюць ступень доктара або ліцэнзіята кананічнага права ці тэалогіі або, прынамсі, з'яўляюцца сапраўднымі спецыялістамі ў гэтых навуках, адзначаюцца здаровым вучэннем, сумленнасцю, разважлівасцю і досведам у вядзенні спраў.

§ 2. Vicarii generalis et episcopalis munus componi non potest cum munere canonici paenitentiarii, neque committi consanguineis Episcopi usque ad quartum gradum.

§ 2. Заданне генеральнага і біскупскага вікарыя не можа сумяшчацца з заданнем каноніка-пэнітэнцыярыя, а таксама не можа быць даручана родным біскупа аж да чацвёртай ступені.

Can. 479 – § 1. Vicario generali, vi officii, in universa dioecesi competit potestas exsecutiva quae ad Episcopum dioecesanum iure pertinet, ad ponendos scilicet omnes actus administrativos, iis tamen exceptis quos Episcopus sibi reservaverit vel qui ex iure requirant speciale Episcopi mandatum.

Кан. 479 – § 1. Генеральны вікарый на моцы самой пасады мае ва ўсёй дыяцэзіі выканаўчую ўладу, якая, згодна з правам, належыць дыяцэзіяльнаму біскупу, а менавіта ўладу здзяйсняць усе адміністрацыйныя дзеянні, за выключэннем тых, якія біскуп зарэзерваваў за сабой, або тых, якія, згодна з правам, патрабуюць спецыяльнага ўпаўнаважання біскупа.

§ 2. Vicario episcopali ipso iure eadem competit potestas de qua in § 1, sed quoad determinatam territorii partem aut negotiorum genus aut fideles determinati ritus vel coetus tantum pro quibus constitutus est, iis causis exceptis quas Episcopus sibi aut Vicario generali reservaverit, aut quae ex iure requirunt speciale Episcopi mandatum.

§ 2. Біскупскі вікарый на моцы самога права мае тую ж уладу, аб якой гаворыцца ў § 1, але толькі ў адносінах да абмежаванай часткі тэрыторыі, або ў акрэсленых справах, або ў адносінах да вернікаў акрэсленага абраду, або ў адносінах да акрэсленай групы асобаў, дзеля чаго быў прызначаны, за выключэннем тых спраў, якія біскуп зарэзерваваў за сабой ці за генеральным вікарыем, або тых, якія, згодна з правам, патрабуюць спецыяльнага ўпаўнаважання біскупа.

§ 3. Ad Vicarium generalem atque ad Vicarium episcopalem, intra ambitum eorum competentiae, pertinent etiam facultates habituales ab Apostolica Sede Episcopo concessae, necnon rescriptorum exsecutio, nisi aliud expresse cautum fuerit aut electa fuerit industria personae Episcopi dioecesani.

§ 3. Генеральны вікарый і біскупскі вікарый у межах сваёй кампетэнцыі валодаюць таксама пастаяннымі паўнамоцтвамі, удзеленымі біскупу Апостальскай Сталіцай, а таксама правам выконвання рэскрыптаў, калі выразна не прадугледжана іншае або калі яны не былі ўдзелены з увагі на асабістыя якасці дыяцэзіяльнага біскупа.

Кан. 480 – Генеральны вікарый і біскупскі вікарый павінны паведамляць дыяцэзіяльнага біскупа аб больш важных справах, як запланаваных, так і ўжо выкананых; яны ніколі не павінны дзейнічаць супраць волі і задумаў дыяцэзіяльнага біскупа.

Кан. 481 – § 1. Улада генеральнага вікарыя і біскупскага вікарыя спыняецца з заканчэннем тэрміну ўпаўнаважання, праз адмову ад пасады, а таксама — захоўваючы кан. 406 і 409 – праз зняцце з пасады, абвешчанае ім дыяцэзіяльным біскупам, і па прычыне таго, што біскупская сталіца стала вакантнай.

§ 2. З моманту прыпынення задання дыяцэзіяльнага біскупа прыпыняецца ўлада генеральнага вікарыя і біскупскага вікарыя, калі яны не маюць годнасці біскупа.

Can. 480 – Vicarius generalis et Vicarius episcopalis de praecipuis negotiis et gerendis et gestis Episcopo dioecesano referre debent, nec umquam contra voluntatem et mentem Episcopi dioecesani agant.

Can. 481 – § 1. Expirat potestas Vicarii generalis et Vicarii episcopalis expleto tempore mandati, renuntiatione, itemque, salvis cann. 406 et 409, remotione eisdem ab Episcopo dioecesano intimata, atque sedis episcopalis vacatione.

§ 2. Suspenso munere Episcopi dioecesani, suspenditur potestas Vicarii generalis et Vicarii episcopalis, nisi episcopali dignitate aucti sint.

Артыкул 2. *Канцлер, іншыя натарыусы і архіў*

Кан. 482 – § 1. У кожнай Курыі павінен быць прызначаны канцлер, галоўным заданнем якога, калі ў партыкулярным праве не пастаноўлена іншае, з'яўляецца клопат аб складанні і высыланні актаў Курыі, а таксама аб захоўванні іх у архіве Курыі.

§ 2. Калі ёсць патрэба, канцлеру можа быць дадзены памочнік, які называецца віцэ-канцлерам.

§ 3. Канцлер і віцэ-канцлер з'яўляюцца тым самым натарыусамі і сакратарамі Курыі.

Кан. 483 – § 1. Акрамя канцлера, могуць быць прызначаны іншыя натарыусы; дакумент, складзены або падпісаны імі, становіцца афіцыйным. Яны могуць быць прызначаны або да ўсіх дзеянняў, або толькі да судовых дзеянняў, або толькі да дзеянняў, якія маюць дачыненне да акрэсленай справы або працэсу.

Art. 2. *De cancellario aliisque notariis et de archivis*

Can. 482 – § 1. In qualibet curia constituatur cancellarius, cuius praecipuum munus, nisi aliter iure particulari statuatur, est curare ut acta curiae redigantur et expediantur, atque eadem in curiae archivo custodiantur.

§ 2. Si necesse videatur, cancellario dari potest adiutor, cui nomen sit vice-cancellarii.

§ 3. Cancellarius necnon vice-cancellarius sunt eo ipso notarii et secretarii curiae.

Can. 483 – § 1. Praeter cancellarium, constitui possunt alii notarii, quorum quidem scriptura seu subscriptio publicam fidem facit quod attinet sive ad quaelibet acta, sive ad acta iudicialia dumtaxat, sive ad acta certae causae aut negotii tantum.

§ 2. Cancellarius et notarii debent esse integrae famae et omni suspicione maiores; in causis quibus fama sacerdotis in discrimen vocari possit, notarius debet esse sacerdos.

Can. 484 – Officium notariorum est:

1° conscribere acta et instrumenta circa decreta, dispositiones, obligationes vel alia quae eorum operam requirunt;

2° in scriptis fideliter redigere quae geruntur, eaque cum significatione loci, diei, mensis et anni subsignare;

3° acta vel instrumenta legitime petenti ex regesto, servatis servandis, exhibere et eorum exempla cum autographo conformia declarare.

Can. 485 – Cancellarius aliique notarii libere ab officio removeri possunt ab Episcopo dioecesano, non autem ab Administratore dioecesano, nisi de consensu collegii consultorum.

Can. 486 – § 1. Documenta omnia, quae dioecesim vel paroecias respiciunt, maxima cura custodiri debent.

§ 2. In unaquaque curia erigatur, in loco tuto, archivum seu tabularium dioecesanum, in quo instrumenta et scripturae quae ad negotia dioecesana tum spiritualia tum temporalia spectant, certo ordine disposita et diligenter clausa custodiantur.

§ 3. Documentorum, quae in archivo continentur, conficiatur inventarium seu catalogus, cum brevi singularum scripturarum synopsi.

Can. 487 – § 1. Archivum clausum sit oportet eiusque clavem habeant so-

§ 2. Канцлер і натарыусы павінны быць асобамі з бездакорнай рэпутацыяй, якія знаходзяцца па-за любымі падазрэннямі; у справах, у якіх можа быць пастаўлена пад пагрозу добрае імя якога-небудзь святара, натарыусам павінен быць святар.

Кан. 484 – Абавязкам натарыусаў з'яўляецца:

1° складанне актаў і падрыхтоўка дакументаў, якія датычаць дэкрэтаў, прадпісанняў, абавязацельстваў або іншага, што патрабуе іх удзелу;

2° верны пісьмовы запіс таго, што адбываецца, з дадаткам подпісу і ўказаннем месца, дня, месяца і года;

3° выдаванне актаў або дакументаў з рэестра асобам, якія звяртаюцца з легітымнай просьбай, захоўваючы адпаведныя нормы, а таксама выдача засведчання аб адпаведнасці копій арыгіналу.

Кан. 485 – Канцлер і іншыя натарыусы могуць быць свабодна зняты з пасады дыяцэзіяльным біскупам, але не дыяцэзіяльным адміністратарам, калі не са згоды Калегіі Кансультантаў.

Кан. 486 – § 1. Усе дакументы, якія маюць дачыненне да дыяцэзіі або парафіі, павінны захоўвацца з самым вялікім клопатам.

§ 2. У кожнай Курыі ў надзейным месцы павінен быць заведзены дыяцэзіяльны архіў, іншымі словамі — сховішча, дзе павінны захоўвацца дакументы і матэрыялы, якія датычаць як духоўных, так і матэрыяльных спраў дыяцэзіі, размешчаныя ў адпаведным парадку і пад стараннай аховай.

§ 3. Павінен быць складзены інвентар, іншымі словамі — каталог дакументаў, якія знаходзяцца ў архіве, з кароткім апісаннем кожнага дакумента.

Кан. 487 – § 1. Архіў павінен быць зачынены, а ключ ад яго павінен быць толькі

ў біскупа і канцлера; нікому не дазваляецца ўваходзіць у архіў без дазволу біскупа або адначасова мадэратара Курыі і канцлера.

§ 2. Зацікаўленыя асобы маюць права асабіста або праз прадстаўніка атрымаць сапраўдную пісьмовую або фатаграфічную копію дакументаў, якія па сваёй сутнасці з'яўляюцца публічнымі і маюць дачыненне да гэтай асобы.

Кан. 488 – Не дазваляецца выносіць дакументы з архіва, калі не на кароткі час і не са згоды біскупа або адначасова мадэратара Курыі і канцлера.

Кан. 489 – § 1. У Курыі павінен быць таксама тайны архіў або, прынамсі, у звычайным архіве павінен знаходзіцца сейф, іншымі словамі — шафа, поўнасцю закрытая і ўмацаваная, якую немагчыма вынесці і ў якой павінны з вялікай асцярожнасцю захоўвацца дакументы, якія павінны быць захаваны ў таямніцы.

§ 2. Раз на год трэба знішчаць дакументы спраў аб пакараннях за злачынствы, якія датычаць нораваў, дзе асобы, супраць якіх вяліся гэтыя справы, памерлі, а таксама тых спраў, абвінаваўчы прысуд па якіх быў вынесены дзесяць гадоў таму, пры гэтым павінен быць захаваны кароткі змест справы з тэкстам канчатковага прысуду.

Кан. 490 – § 1. Ключ ад тайнага архіва павінен знаходзіцца толькі ў біскупа.

§ 2. Калі сталіца становіцца вакантнай, тайны архіў або сейф не павінен адчыняцца, калі ў выпадку сапраўднай неабходнасці гэта не зробіць сам дыяцэзіяльны адміністратар.

§ 3. Дакументы з тайнага архіва або сейфа не павінны выносіцца.

Кан. 491 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп павінен паклапаціцца аб тым, каб таксама акты

lum Episcopus et cancellarius; nemini licet illud ingredi nisi de Episcopi aut Moderatoris curiae simul et cancellarii licentia.

§ 2. Ius est iis quorum interest, documentorum, quae natura sua sunt publica quaeque ad statum suae personae pertinent, documentum authenticum scriptum vel photostaticum per se vel per procuratorem recipere.

Can. 488 – Ex archivo non licet efferre documenta, nisi ad breve tempus tantum atque de Episcopi aut insimul Moderatoris curiae et cancellarii consensu.

Can. 489 – § 1. Sit in curia dioecesana archivum quoque secretum, aut saltem in communi archivo armarium seu scrinium, omnino clausum et obseratum, quod de loco amoveri nequeat, in quo scilicet documenta secreto servanda cautissime custodiantur.

§ 2. Singulis annis destruantur documenta causarum criminalium in materia morum, quarum rei vita cesserunt aut quae a decennio sententia condemnatoria absolutae sunt, retento facti brevi summario cum textu sententiae definitivae.

Can. 490 – § 1. Archivi secreti clavem habeat tantummodo Episcopus.

§ 2. Sede vacante, archivum vel armarium secretum ne aperiatur, nisi in casu verae necessitatis, ab ipso Administratore dioecesano.

§ 3. Ex archivo vel armario secreto documenta ne efferantur.

Can. 491 – § 1. Curet Episcopus dioecesanus ut acta et documenta

archivorum quoque ecclesiarum cathedralium, collegiatarum, paroecialium, aliarumque in suo territorio exstantium diligenter serventur, atque inventaria seu catalogi conficiantur duobus exemplaribus, quorum alterum in proprio archivo, alterum in archivo dioecesano serventur.

§ 2. Curet etiam Episcopus dioecesanus ut in dioecesi habeatur archivum historicum atque documenta valorem historicum habentia in eodem diligenter custodiantur et systematice ordinentur.

§ 3. Acta et documenta, de quibus in §§ 1 et 2, ut inspiciantur aut efferantur, serventur normae ab Episcopo dioecesano statutae.

і дакументы архіваў катэдральных, калегіяльных, парафіяльных і іншых касцёлаў, якія знаходзяцца на яго тэрыторыі, старанна захоўваліся, і аб тым, каб складаліся іх інвентары, іншымі словамі — каталогі ў двух асобніках, адзін з якіх павінен захоўвацца ва ўласным архіве, а другі — у дыяцэзіяльным архіве.

§ 2. Дыяцэзіяльны біскуп павінен паклапаціцца таксама аб тым, каб у дыяцэзіі быў гістарычны архіў, у якім павінны дакладна і сістэматычна захоўвацца дакументы, якія маюць гістарычную каштоўнасць.

§ 3. Пры карыстанні актамі і дакументамі, аб якіх гаворыцца ў §§ 1 і 2, або запазычванні іх з архіва павінны захоўвацца нормы, устаноўленыя дыяцэзіяльным біскупам.

Art. 3. *De consilio a rebus oeconomicis et de oeconomo*

Can. 492 – § 1. In singulis dioecesibus constituatur consilium a rebus oeconomicis, cui praesidet ipse Episcopus dioecesanus eiusve delegatus, et quod constat tribus saltem christifidelibus, in re oeconomica necnon in iure civili vere peritis et integritate praestantibus, ab Episcopo nominatis.

§ 2. Membra consilii a rebus oeconomicis ad quinquennium nominentur, sed expleto hoc tempore ad alia quinquennia assumi possunt.

§ 3. A consilio a rebus oeconomicis excluduntur personae quae cum Episcopo usque ad quartum gradum consanguinitatis vel affinitatis coniunctae sunt.

Артыкул 3. *Рада па эканамічных справах і эканом*

Кан. 492 – § 1. У кожнай дыяцэзіі павінна быць заснавана Рада па эканамічных справах, старшынёй якой павінен быць сам дыяцэзіяльны біскуп або яго дэлегат і якая павінна складацца з, прынамсі, трох прызначаных дыяцэзіяльным біскупам вернікаў, якія з'яўляюцца сапраўднымі спецыялістамі ў эканамічных справах і дзяржаўным праве і адзначаюцца добрасумленнасцю.

§ 2. Члены Рады па эканамічных справах павінны быць прызначаны на пяць гадоў, але пасля заканчэння гэтага тэрміну могуць быць прызначаны на наступныя пяцігадовыя тэрміны.

§ 3. У склад Рады па эканамічных справах не могуць уваходзіць асобы, звязаныя з біскупам роднасцю або сваяцтвам аж да чацвёртай ступені.

Кан. 493 – Апрача заданняў, даручаных ёй у Кнізе V «Маёмасць Касцёла», Рада па эканамічных справах павінна штогод, згодна з указаннямі дыяцэзіяльнага біскупа, падрыхтоўваць на наступны год план даходаў і выдаткаў, звязаных з кіраваннем усёй дыяцэзіяй, а ў канцы года зацвярджаць справаздачу аб даходах і выдатках.

Кан. 494 – § 1. У кожнай дыяцэзіі біскуп пасля таго, як выслухае меркаванне Калегіі Кансультантаў і Рады па эканамічных пытаннях, павінен прызначыць эканома, які павінен быць сапраўдным спецыялістам у эканамічных справах і адзначацца бездакорнай сумленнасцю.

§ 2. Эканом павінен быць прызначаны на пяць гадоў, але пасля заканчэння гэтага тэрміну можа быць прызначаны на наступныя пяцігадовыя тэрміны; ён не можа быць зняты з пасады, пакуль не скончыўся тэрмін выконвання задання, калі не па важкай прычыне, зважанай дыяцэзіяльным біскупам пасля таго, як выслухае меркаванне Калегіі Кансультантаў і Рады па эканамічных справах.

§ 3. Эканом павінен адміністраваць маёмасцю дыяцэзіі пад уладай біскупа згодна з планам, падрыхтаваным Радай па эканамічных справах, а таксама здзяйсняць коштам даходу дыяцэзіі выплаты, легітымна зацверджаныя біскупам або іншымі прызначанымі ім асобамі.

§ 4. У канцы года эканом павінен скласці Радзе па эканамічных справах справаздачу аб даходах і выдатках.

Can. 493 – Praeter munera ipsi commissa in Libro V *De bonis Ecclesiae temporalibus*, consilii a rebus oeconomicis est quotannis, iuxta Episcopi dioecesani indicationes, rationem apparare quaestuum et erogationum quae pro universo dioecesis regimine anno venturo praevidentur, necnon, anno exeunte, rationem accepti et expensi probare.

Can. 494 – § 1. In singulis dioecesibus ab Episcopo, auditis collegio consultorum atque consilio a rebus oeconomicis, nominetur oeconomus, qui sit in re oeconomica vere peritus et probitate prorsus praestans.

§ 2. Oeconomus nominetur ad quinquennium, sed expleto hoc tempore ad alia quinquennia nominari potest; durante munere, ne amoveatur nisi ob gravem causam ab Episcopo aestimandam, auditis collegio consultorum atque consilio a rebus oeconomicis.

§ 3. Oeconomi est, secundum rationem a consilio a rebus oeconomicis definitam, bona dioecesis sub auctoritate Episcopi administrare atque ex quaestu dioecesis constituto expensas facere, quas Episcopus aliive ab ipso deputati legitime ordinaverint.

§ 4. Anno vertente, oeconomus consilio a rebus oeconomicis rationem accepti et expensi reddere debet.

Caput III

De consilio presbyterali et de collegio consultorum

Can. 495 – § 1. In unaquaque dioecesi constituatur consilium presbyterale, coetus scilicet sacerdotum, qui tamquam senatus sit Episcopi, presbyterium repraesentans, cuius est Episcopum in regimine dioecesis ad normam iuris adiuvare, ut bonum pastorale portionis populi Dei ipsi commissae quam maxime provehatur.

§ 2. In vicariatibus et praefecturis apostolicis Vicarius vel Praefectus constituant consilium ex tribus saltem presbyteris missionariis, quorum sententiam, etiam per epistolam, audiant in gravioribus negotiis.

Can. 496 – Consilium presbyterale habeat propria statuta ab Episcopo dioecesano approbata, attentis normis ab Episcoporum conferentia prolatis.

Can. 497 – Ad designationem quod attinet sodalium consilii presbyteralis:

1° dimidia circiter pars libere eligatur a sacerdotibus ipsis, ad normam canonum qui sequuntur, necnon statutorum;

2° aliqui sacerdotes, ad normam statutorum, esse debent membra nata, qui scilicet ratione officii ipsis demandati ad consilium pertineant;

3° Episcopo dioecesano integrum est aliquos libere nominare.

Can. 498 – § 1. Ius electionis tum activum tum passivum ad consilium presbyterale constituendum habent:

1° omnes sacerdotes saeculares in dioecesi incardinati;

Раздзел III

Святарская рада і калегія кансультантаў

Кан. 495 – § 1. У кожнай дыяцэзіі павінна быць заснавана Святарская Рада, гэта значыць група святароў, якая з'яўляецца нібыта сенатам біскупа і прадстаўляе прэзбітэрый; гэтая Рада павінна дапамагаць біскупу ў кіраванні дыяцэзіяй згодна з нормамі права, каб як мага больш паспяхова садзейнічаць пастырскаму дабру даручанай яму часткі Божага народа.

§ 2. У апостальскіх вікарыятах і прэфектурах вікарый або прэфект павінны заснаваць Раду, якая складаецца, прынамсі, з трох прэзбітэраў-місіянераў, меркаванне якіх, нават у форме ліста, павінна быць выслухана ў асабліва важкіх справах.

Кан. 496 – Святарская Рада павінна мець уласныя статуты, зацверджаныя дыяцэзіяльным біскупам і складзеныя з улікам нормаў, прынятых Канферэнцыяй Біскупаў.

Кан. 497 – Што датычыць прызначэння членаў Святарскай Рады, то:

1° каля паловы з іх павінны быць свабодна выбраны самімі святарамі згодна з нормамі наступных канонаў, а таксама статутаў;

2° некаторыя святары, згодна з нормамі статутаў, павінны быць пастаяннымі членамі, гэта значыць уваходзіць у Раду на моцы пасады, якую займаюць;

3° дыяцэзіяльны біскуп мае права свабодна прызначыць некаторых членаў Рады.

Кан. 498 – § 1. Права выбару ў Святарскую Раду, як актыўнае, так і пасіўнае, маюць:

1° усе секулярныя святары, інкардынаваныя ў дыяцэзію;

2° секулярныя святары, не інкардынаваныя ў дыяцэзію, а таксама святары — члены якога-небудзь манаскага інстытута або таварыства апостальскага жыцця, якія прабываюць у дыяцэзіі і на яе карысць займаюць акрэсленую пасаду.

§ 2. Калі гэта будзе прадугледжана статутамі, тое ж права выбару можа быць нададзена іншым святарам, якія маюць у гэтай дыяцэзіі пастаяннае або часовае месца жыхарства.

2° sacerdotes saeculares in dioecesi non incardinati, necnon sacerdotes sodales alicuius instituti religiosi aut societatis vitae apostolicae, qui in dioecesi commorantes, in eiusdem bonum aliquod officium exercent.

§ 2. Quatenus statuta id provideant, idem ius electionis conferri potest aliis sacerdotibus, qui domicilium aut quasi-domicilium in dioecesi habent.

Кан. 499 – Спосаб выбару членаў Святарскай Рады павінен быць акрэслены ў статутах такім чынам, каб, наколькі гэта магчыма, святары, якія складаюць прэзбітэрый, былі прадстаўлены з улікам перадусім разнастайных паслугаў і розных рэгіёнаў дыяцэзіі.

Can. 499 – Modus eligendi membra consilii presbyteralis statutis determinandus est, ita quidem ut, quatenus id fieri possit, sacerdotes presbyterii repraesententur, ratione habita maxime diversorum ministeriorum variarumque dioecesis regionum.

Кан. 500 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп мае права склікаць Святарскую Раду, узначальваць яе, акрэсліваць, якія пытанні павінны быць на ёй абмеркаваны, або прымаць пытанні, якія прапаноўваць члены Рады.

§ 2. Святарская Рада мае права толькі кансультатыўнага голасу. Дыяцэзіяльны біскуп павінен выслухаць меркаванне Рады па больш важных справах, аднак згода Рады патрабуецца толькі ў выпадках, выразна акрэсленых у праве.

§ 3. Святарская Рада ніколі не можа дзейнічаць без дыяцэзіяльнага біскупа, і толькі ён можа абвясціць аб тым, што было пастаноўлена згодна з нормай § 2.

Can. 500 – § 1. Episcopi dioecesani est consilium presbyterale convocare, eidem praesidere atque quaestiones in eodem tractandas determinare aut a membris propositas recipere.

§ 2. Consilium presbyterale gaudet voto tantum consultivo; Episcopus dioecesanus illud audiat in negotiis maioris momenti, eius autem consensu eget solummodo in casibus iure expresse definitis.

§ 3. Consilium presbyterale numquam agere valet sine Episcopo dioecesano, ad quem solum etiam cura spectat ea divulgandi quae ad normam § 2 statuta sunt.

Кан. 501 – § 1. Члены Святарскай Рады прызначаюцца на тэрмін, акрэслены статутамі, аднак такім чынам, каб уся Рада або некаторая яе частка абнаўляліся на працягу пяці гадоў.

Can. 501 – § 1. Membra consilii presbyteralis designentur ad tempus, in statutis determinatum, ita tamen ut integrum consilium vel aliqua eius pars intra quinquennium renovetur.

§ 2. Vacante sede, consilium presbyterale cessat eiusque munera implentur a collegio consultorum; intra annum a capta possessione Episcopus debet consilium presbyterale noviter constituere.

§ 3. Si consilium presbyterale munus sibi in bonum dioecesis commissum non adimpleat aut eodem graviter abutatur, Episcopus dioecesanus, facta consultatione cum Metropolita, aut si de ipsa sede metropolitana agatur cum Episcopo suffraganeo promotione antiquiore, illud dissolvere potest, sed intra annum debet noviter constituere.

Can. 502 – § 1. Inter membra consilii presbyteralis ab Episcopo dioecesano libere nominantur aliqui sacerdotes, numero non minore quam sex nec maiore quam duodecim, qui collegium consultorum ad quinquennium constituant, cui competunt munera iure determinata; expleto tamen quinquennio munera sua propria exercere pergit usquedum novum collegium constituatur.

§ 2. Collegio consultorum praeest Episcopus dioecesanus; sede autem impedita aut vacante, is qui ad interim Episcopi locum tenet aut, si constitutus nondum fuerit, sacerdos ordinatione antiquior in collegio consultorum.

§ 3. Episcoporum conferentia statuere potest ut munera collegii consultorum capitulo cathedrali committantur.

§ 4. In vicariatu et praefectura apostolica munera collegii consultorum competunt consilio missionis, de quo in can. 495, § 2, nisi aliud iure statuatur.

§ 2. Калі сталіца становіцца вакантнай, Святарская Рада спыняе сваю дзейнасць, а яе заданні выконвае Калегія Кансультантаў; на працягу года пасля прыняцця ў валоданне біскуп павінен нанова заснаваць Святарскую Раду.

§ 3. Калі Святарская Рада не выконвае свайго задання, даручанага ёй для дабра дыяцэзіі, або цяжка ім злоўжывае, дыяцэзіяльны біскуп мае права яе распусціць пасля кансультацыі з мітрапалітам або — калі гаворка ідзе пра саму мітрапалітальную сталіцу — з біскупам-суфраганам, найстарэйшым вылучэннем, пры гэтым на працягу года ён павінен нанова заснаваць яе.

Кан. 502 – § 1. З членаў Святарскай Рады дыяцэзіяльны біскуп свабодна прызначае некалькіх святароў, не менш шасці і не больш чым дванаццаць, якія павінны на працягу пяці гадоў складаць Калегію Кансультантаў, на якую ўскладаюцца заданні, акрэсленыя правам; пры гэтым, пасля заканчэння пяцігадовага тэрміну, яна працягвае выконваць свае ўласныя заданні, пакуль не будзе заснавана новая Калегія.

§ 2. Калегію Кансультантаў узначальвае дыяцэзіяльны біскуп; калі сталіца мае перашкоду або становіцца вакантнай, Калегію ўзначальвае асоба, якая часова займае месца біскупа, або, калі яна яшчэ не была вызначана, найстарэйшы пасвячэннем святар з Калегіі Кансультантаў.

§ 3. Канферэнцыя Біскупаў можа пастанавіць, каб заданні Калегіі Кансультантаў былі даручаны катэдральнаму Капітулу.

§ 4. У апостальскім вікарыяце і прэфектуры заданні Калегіі Кансультантаў выконвае Рада місіі, аб якой гаворыцца ў кан. 495 § 2, калі права не прадугледжвае іншае.

Раздзел IV

Капітулы канонікаў

Кан. 503 – Капітул канонікаў, катэдральны або калегіяльны, — гэта калегія святароў, заданнем якой з'яўляецца здзяйсненне больш урачыстых літургічных дзеянняў у катэдральным або калегіяльным касцёле; акрамя гэтага, катэдральны Капітул павінен выконваць заданні, даручаныя яму правам або дыяцэзіяльным біскупам.

Кан. 504 – Заснаванне, змяненне і ліквідацыя катэдральнага Капітула зарэзервавана за Апостальскай Сталіцай.

Кан. 505 – Кожны Капітул, катэдральны або калегіяльны, павінен мець свае статуты, складзеныя легітымным дзеяннем Капітула і зацверджаныя дыяцэзіяльным біскупам; гэтыя статуты не павінны ні змяняцца, ні адмяняцца без зацвярджэння дыяцэзіяльным біскупам.

Кан. 506 – § 1. Статуты Капітула, заўсёды захоўваючы ўстаноўчыя законы, павінны акрэсліваць структуру Капітула і лічбу канонікаў; удакладняць, што павінны выконваць Капітул і асобныя канонікі для Божага культу і паслугі; устанаўліваць парадак сходаў, на якіх абмяркоўваюцца справы Капітула, а таксама, захоўваючы прадпісанні паўсюднага права, вызначаць умовы, якія патрабуюцца для дзейснасці і дазволенасці дзеянняў.

§ 2. У статутах таксама павінны быць акрэслены даходы, як пастаянныя, так і тыя, якія могуць быць атрыманы з нагоды выконвання якога-небудзь задання, а таксама — захоўваючы нормы, выдадзеныя Святой Сталіцай, — якімі будуць знешнія адзначэнні канонікаў.

Кан. 507 – § 1. Адзін з канонікаў павінен узначальваць Капітул, таксама трэба ўста-

Caput IV

De canonicorum capitulis

Can. 503 – Capitulum canonicorum, sive cathedrale sive collegiale, est sacerdotum collegium, cuius est functiones liturgicas sollemniores in ecclesia cathedrali aut collegiali persolvere; capituli cathedralis praeterea est munera adimplere, quae iure aut ab Episcopo dioecesano ei committuntur.

Can. 504 – Capituli cathedralis erectio, innovatio aut suppressio Sedi Apostolicae reservantur.

Can. 505 – Unumquodque capitulum, sive cathedrale sive collegiale, sua habeat statuta, per legitimum actum capitularem condita atque ab Episcopo dioecesano probata; quae statuta ne immutentur neve abrogentur, nisi approbante eodem Episcopo dioecesano.

Can. 506 – § 1. Statuta capituli, salvis semper fundationis legibus, ipsam capituli constitutionem et numerum canonicorum determinent; definiant quaenam a capitulo et a singulis canonicis ad cultum divinum necnon ad ministerium persolvendum sint peragenda; decernant conventus in quibus capituli negotia agantur atque, salvis quidem iuris universalis praescriptis, condiciones statuant ad validitatem liceitatemque negotiorum requisitas.

§ 2. In statutis etiam definiantur emolumenta, tum stabilia tum occasione perfuncti muneris solvenda necnon, attentis normis a Sancta Sede latis, quaenam sint canonicorum insignia.

Can. 507 – § 1. Inter canonicos habeatur qui capitulo praesit, atque alia

etiam constituantur officia ad normam statutorum, ratione quoque habita usus in regione vigentis.

§ 2. Clericis ad capitulum non pertinentibus, committi possunt alia officia, quibus ipsi, ad normam statutorum, canonicis auxilium praebeant.

навіць іншыя пасады, згодна з нормамі статутаў, захоўваючы звычай, які існуе ў дадзеным рэгіёне.

§ 2. Духоўным асобам, якія не належаць да Капітула, могуць быць даручаны іншыя пасады, праз выкананне якіх, згодна з нормамі статутаў, яны будуць аказваць дапамогу канонікам.

Can. 508 – § 1. Paenitentiarius canonicus tum ecclesiae cathedralis tum ecclesiae collegialis vi officii habet facultatem ordinariam, quam tamen aliis delegare non potest, absolvendi in foro sacramentali a censuris latae sententiae non declaratis, Apostolicae Sedi non reservatis, in dioecesi extraneos quoque, dioecesanos autem etiam extra territorium dioecesis.

Кан. 508 – § 1. Канонік-пэнітэнцыярый, як катэдральнага, так і капітульнага касцёла, на моцы сваёй пасады мае звычайнае паўнамоцтва, якое, аднак, не можа дэлегаваць іншым, на тое, каб у сакрамэнтальнай сферы вызваляць ад цэнзур *latae sententiae*, якія не былі сцверджаны і не былі зарэзерваваны за Апостальскай Сталіцай; на тэрыторыі дыяцэзіі ён можа вызваляць ад цэнзур таксама асобаў, якія не належаць да гэтай дыяцэзіі, а асобаў, якія належаць да дыяцэзіі, — таксама па-за яе межамі.

§ 2. Ubi deficit capitulum, Episcopus dioecesanus sacerdotem constituat ad idem munus implendum.

§ 2. Там, дзе няма Капітула, дыяцэзіяльны біскуп павінен прызначыць святара для выконвання гэтага задання.

Can. 509 – § 1. Episcopi dioecesani, audito capitulo, non autem Administratoris dioecesani, est omnes et singulos conferre canonicatus, tum in ecclesia cathedrali tum in ecclesia collegiali, revocato quolibet contrario privilegio; eiusdem Episcopi est confirmare electum ab ipso capitulo, qui eidem praesit.

Кан. 509 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп, але не дыяцэзіяльны адміністратар, выслухаўшы Капітул, мае права надзяляць усімі і паасобнымі кананіцкімі годнасцямі ў катэдральным і капітульным касцёлах; кожны прывілей, супраціўны гэтаму, адмяняецца; біскуп мае таксама права на адабрэнне таго, хто быў выбраны самім Капітулам, каб яго ўзначальваць.

§ 2. Canonicatus Episcopus dioecesanus conferat tantum sacerdotibus doctrina vitaeque integritate praestantibus, qui laudabiliter ministerium exercuerunt.

§ 2. Дыяцэзіяльны біскуп павінен надзяляць годнасцю каноніка толькі тых святароў, якія адзначаюцца бездакорным вучэннем і жыццём, а таксама пахвальна выконваюць сваю паслугу.

Can. 510 – § 1. Capitulo canonicorum ne amplius uniantur paroeciae; quae unitae alicui capitulo exstent, ab

Кан. 510 – § 1. Капітул канонікаў больш не павінен быць злучаны з парафіяй; калі ж некаторыя парафіі засталіся злучанымі

з Капітулам, дыяцэзіяльны біскуп павінен аддзяліць іх ад Капітула.

§ 2. У касцёле, які адначасова з'яўляецца і парафіяльным, і капітульным, павінен быць прызначаны пробашч, які павінен быць выбраны або з членаў Капітула, або іншым спосабам; на гэтага пробашча ўскладаюцца ўсе абавязкі, і яму даюцца правы і паўнамоцтвы, якія, згодна з нормамі права, належаць пробашчу.

§ 3. Дыяцэзіяльны біскуп мае права ўстанавіць акрэсленыя нормы, якія дазволілі б адпаведным чынам спалучыць пастырскія абавязкі пробашча і ўласныя заданні Капітула так, каб ні пробашч не быў перашкодай у дзейнасці Капітула, ні Капітул — у дзейнасці пробашча; пры ўзнікненні канфліктаў вырашаць іх павінен дыяцэзіяльны біскуп, якому ў першую чаргу трэба клапаціцца аб тым, каб пастырскія патрэбы вернікаў забяспечваліся належным чынам.

§ 4. Мяркуецца, што ахвяраванні, якія складаюцца ў касцёле, які адначасова з'яўляецца і парафіяльным, і капітульным, прызначаны для парафіі, калі не вынікае іншае.

Episcopo dioecesano a capitulo separentur.

§ 2. In ecclesia, quae simul sit paroecialis et capitularis, designetur parochus, sive inter capitulares delectus, sive non; qui parochus omnibus obstringitur officiis atque gaudet iuribus et facultatibus quae ad normam iuris propria sunt parochi.

§ 3. Episcopi dioecesani est certas statuere normas, quibus officia pastoralia parochi atque munera capitulo propria debite componantur, cavendo ne parochus capitularibus nec capitulum paroecialibus functionibus impedimento sit; conflictus, si quidam habeantur, dirimat Episcopus dioecesanus, qui imprimis curet ut fidelium necessitatibus pastoralibus apte prospiciatur.

§ 4. Quae ecclesiae, paroeciali simul et capitulari, conferantur eleemosynae, praesumuntur datae paroeciae, nisi aliud constet.

Раздзел V
Пастырская Рада

Caput V
De consilio pastorali

Кан. 511 – У кожнай дыяцэзіі, дзе да гэтага схіляюць пастырскія абставіны, павінна быць заснавана Пастырская Рада, якая пад кіраваннем біскупа павінна даследаваць і разважаць тое, што датычыць пастырскай дзейнасці ў дыяцэзіі, а таксама ўносіць практычныя прапановы.

Кан. 512 – § 1. Пастырская Рада складаецца з вернікаў, якія знаходзяцца ў поўным

Can. 511 – In singulis dioecesibus, quatenus pastoralia adiuncta id suadeant, constituatur consilium pastorale, cuius est sub auctoritate Episcopi ea quae opera pastoralia in dioecesi spectant investigare, perpendere atque de eis conclusiones practicas proponere.

Can. 512 – § 1. Consilium pastorale constat christifidelibus qui in plena

communione sint cum Ecclesia catholica, tum clericis, tum membris institutorum vitae consecratae, tum praesertim laicis, quique designantur modo ab Episcopo dioecesano determinato.

§ 2. Christifideles, qui deputantur ad consilium pastorale, ita seligantur ut per eos universa populi Dei portio, quae dioecesim constituat, revera configuretur, ratione habita diversarum dioecesis regionum, condicionum socialium et professionum, necnon partis quam sive singuli sive cum aliis coniuncti in apostolatu habent.

§ 3. Ad consilium pastorale ne deputentur nisi christifideles certa fide, bonis moribus et prudentia praestantes.

Can. 513 – § 1. Consilium pastorale constituitur ad tempus, iuxta praescripta statutorum, quae ab Episcopo dantur.

§ 2. Sede vacante, consilium pastorale cessat.

Can. 514 – § 1. Consilium pastorale, quod voto gaudet tantum consultivo, iuxta necessitates apostolatus convocare eique praeesse ad solum Episcopum dioecesanum pertinet; ad quem etiam unice spectat, quae in consilio pertractata sunt publici iuris facere.

§ 2. Saltem semel in anno convocetur.

адзінстве з Каталіцкім Касцёлам, як з духоўных асобаў і членаў інстытутаў кансэкраванага жыцця, так і, перадусім, са свецкіх вернікаў, якія павінны быць вызначаны спосабам, акрэсленым дыяцэзіяльным біскупам.

§ 2. Вернікі, скіраваныя ў Пастырскую Раду, павінны быць выбраны такім чынам, каб праз іх сапраўды адлюстроўвалася ўся частка Божага народа, якая складае дыяцэзію, з улікам разнастайнасці рэгіёнаў дыяцэзіі, сацыяльных і працоўных умоваў, а таксама ўдзелу, які адзінкавыя або аб'яднаныя асобы маюць у апостальстве.

§ 3. У Пастырскую Раду павінны быць скіраваны толькі тыя вернікі, якія адзначаюцца моцнай верай, добрымі норавамі і разважлівасцю.

Кан. 513 – § 1. Пастырская Рада засноўваецца на час, акрэслены згодна з прадпісаннямі статутаў, выдадзеных біскупам.

§ 2. Калі сталіца становіцца вакантнай, Пастырская Рада спыняе сваё існаванне.

Кан. 514 – § 1. Пастырскую Раду, якая мае толькі кансультатыўны голас, можа склікаць — адпаведна патрэбам апостальства — і ўзначальваць толькі дыяцэзіяльны біскуп; і толькі ён вырашае, што будзе абвешчана з таго, што абмяркоўвалася на Радзе.

§ 2. Рада павінна быць склікана прынамсі раз на год.

Caput VI

De paroeciis, de parochis et de vicariis paroecialibus

Can. 515 – § 1. Paroecia est certa communitas christifidelium in Ecclesia particulari stabiliter constituta, cuius cura pastoralis, sub auctoritate

Раздзел VI

Парафіі, пробашчы і парафіяльныя вікарыі

Кан. 515 – § 1. Парафія — гэта акрэсленая супольнасць вернікаў, заснаваная на пастаянна ў партыкулярным Касцёле, пастырская апека над якой, пад кіраваннем дыя-

цэзіяльнага біскупа, даручаецца пробашчу, як яе ўласнаму пастыру.

§ 2. Толькі дыяцэзіяльны біскуп мае права на заснаванне і ліквідацыю парафіі або здзяйсненне ў ёй змяненняў. Ён не павінен ні засноўваць, ні ліквідаваць парафіі, ні значна змяняць іх, не выслухаўшы меркаванне Святарскай Рады.

§ 3. Легітымна заснаваная парафія мае правасуб'ектнасць на моцы самога права.

Кан. 516 – § 1. Калі права не прадугледжвае іншае, да парафіі прыраўноўваецца квазіпарафія, якая з'яўляецца акрэсленай супольнасцю вернікаў у партыкулярным Касцёле, даручанай святару, як яе ўласнаму пастыру, але па прычыне асаблівых абставін яшчэ не заснаванай у якасці парафіі.

§ 2. Там, дзе якія-небудзь супольнасці не могуць быць заснаваны ў якасці парафіі або квазіпарафіі, дыяцэзіяльны біскуп павінен іншым чынам забяспечыць ім пастырскую апеку.

Кан. 517 – § 1. Там, дзе гэтага патрабуюць абставіны, пастырская апека над парафіяй або над некалькімі парафіямі можа быць даручана адразу некалькім святарам, аднак такім чынам, каб адзін з іх быў мадэратарам у ажыццяўленні пастырскай апекі, гэта значыць кіраваў іх сумеснай пастырскай дзейнасцю і адказваў за яе перад біскупам.

§ 2. Калі па прычыне недахопу святароў дыяцэзіяльны біскуп палічыць неабходным даверыць удзел у ажыццяўленні пастырскай апекі над парафіяй дыякану або іншай асобе, якая не адзначана святарскай годнасцю, або супольнасці асобаў, ён павінен вызначыць якога-небудзь святара, які, надзелены ўладай і паўнамоцтвамі пробашча, будзе кіраваць пастырскай апекай.

Episcopi dioecesani, committitur parocho, qua proprio eiusdem pastori.

§ 2. Paroecias erigere, supprimere aut eas innovare unius est Episcopi dioecesani, qui paroecias ne erigat aut supprimat, neve eas notabiliter innovet, nisi audito consilio presbyterali.

§ 3. Paroecia legitime erecta personalitate iuridica ipso iure gaudet.

Can. 516 – § 1. Nisi aliud iure caveatur, paroeciae aequiparatur quasi-paroecia, quae est certa in Ecclesia particulari communitas christifidelium, sacerdoti uti pastori proprio commissa, ob peculiaria adiuncta in paroeciam nondum erecta.

§ 2. Ubi quaedam communitates in paroeciam vel quasi-paroeciam erigi non possint, Episcopus dioecesanus alio modo earundem pastorali curae prospiciat.

Can. 517 – § 1. Ubi adiuncta id requirant, paroeciae aut diversarum simul paroeciarum cura pastoralis committi potest pluribus in solidum sacerdotibus, ea tamen lege, ut eorundem unus curae pastoralis exercendae sit moderator, qui nempe actionem coniunctam dirigat atque de eadem coram Episcopo respondeat.

§ 2. Si ob sacerdotum penuriam Episcopus dioecesanus aestimaverit participationem in exercitio curae pastoralis paroeciae concredendam esse diacono aliive personae sacerdotali charactere non insignitae aut personarum communitati, sacerdotem constituat aliquem qui, potestatibus et facultatibus parochi instructus, curam pastoralem moderetur.

Can. 518 – Paroecia regula generali sit territorialis, quae scilicet omnes complectatur christifideles certi territorii; ubi vero id expediat, constituantur paroeciae personales, ratione ritus, linguae, nationis christifidelium alicuius territorii atque alia etiam ratione determinatae.

Кан. 518 – Парафія, як правіла, павінна быць тэрытарыяльнай, гэта значыць ахопліваць усіх вернікаў, якія пражываюць на акрэсленай тэрыторыі; аднак там, дзе гэта будзе карысна, могуць быць заснаваны і персанальныя парафіі, акрэсленыя на падставе абраду, мовы, нацыянальнасці вернікаў якой-небудзь тэрыторыі, а таксама на іншых падставах.

Can. 519 – Parochus est pastor proprius paroeciae sibi commissae, cura pastorali communitatis sibi concreditae fungens sub auctoritate Episcopi dioecesani, cuius in partem ministerii Christi vocatus est, ut pro eadem communitate munera exsequatur docendi, sanctificandi et regendi, cooperantibus etiam aliis presbyteris vel diaconis atque operam conferentibus christifidelibus laicis, ad normam iuris.

Кан. 519 – Пробашч з'яўляецца ўласным пастырам даручанай яму парафіі, які ажыццяўляе пастырскую апеку над даверанай яму супольнасцю пад уладай дыяцэзіяльнага біскупа, разам з якім ён пакліканы да ўдзелу ў паслузе Хрыста, каб выконваць для гэтай супольнасці заданне навучання, асвячэння і кіравання ў супрацоўніцтве з іншымі святарамі ці дыяканамі і з дапамогай свецкіх вернікаў, згодна з нормамі права.

Can. 520 – § 1. Persona iuridica ne sit parochus; Episcopus autem dioecesanus, non vero Administrator dioecesanus, de consensu competentis Superioris, potest paroeciam committere instituto religioso clericali vel societati clericali vitae apostolicae, eam erigendo etiam in ecclesia instituti aut societatis, hac tamen lege ut unus presbyter sit paroeciae parochus, aut, si cura pastoralis pluribus in solidum committatur, moderator, de quo in can. 517, § 1.

Кан. 520 – § 1. Юрыдычная асоба не можа быць пробашчам; аднак дыяцэзіяльны біскуп, але не дыяцэзіяльны адміністратар, са згоды кампетэнтнага настаяцеля, можа даручыць парафію святарскаму манаскаму інстытуту або святарскаму таварыству апостальскага жыцця, нават можа заснаваць яе пры касцёле інстытута або таварыства, пры гэтым такім чынам, каб пробашчам парафіі ці — калі пастырская апека даручана некалькім асобам — мадэратарам, аб якім гаворыцца ў кан. 517 § 1, быў адзін прэзбітэр.

§ 2. Paroeciae commissio, de qua in § 1, fieri potest sive in perpetuum sive ad certum praefinitum tempus; in utroque casu fiat mediante conventione scripta inter Episcopum dioecesanum et competentem Superiorem instituti vel societatis inita, qua inter alia expresse et accurate definiantur, quae ad opus explendum, ad perso-

§ 2. Даручэнне парафіі, аб якім гаворыцца ў § 1, можа адбыцца або назаўсёды, або на акрэслены абмежаваны час; у абодвух выпадках яно павінна быць здзейснена на падставе пісьмовага пагаднення паміж дыяцэзіяльным біскупам і кампетэнтным настаяцелем інстытута або таварыства. У гэтым пагадненні, між іншым, павінна быць

выразна і дакладна акрэслена тое, што датычыць гэтай справы, прызначаных для яе выконвання асобаў, а таксама эканамічных пытанняў.

Кан. 521 – § 1. Для таго, каб хто-небудзь мог дзейсна стаць пробашчам, павінен мець святое прэзбітэрскае пасвячэнне.

§ 2. Апрача гэтага, павінен адзначацца здаровым вучэннем і добрымі норавамі, клопатам аб душах і іншымі цнотамі, і, акрамя гэтага, мець тыя якасці, якія патрабуе як паўсюднае, так і партыкулярнае права для кіравання парафіяй.

§ 3. Перад тым, як прызначыць каго-небудзь на пасаду пробашча, трэба пераканацца ў яго прыдатнасці спосабам, акрэсленым дыяцэзіяльным біскупам, у тым ліку з дапамогай экзамену.

Кан. 522 – Пасада пробашча павінна быць пастаяннай, таму ён прызначаецца на неакрэслены тэрмін; дыяцэзіяльны біскуп можа прызначыць пробашча на акрэслены тэрмін толькі тады, калі гэта будзе дапушчана дэкрэтам Канферэнцыі Біскупаў.

Кан. 523 – Захоўваючы прадпісанне кан. 682 § 1, дыяцэзіяльны біскуп мае права прызначаць на пасаду пробашча, і ажыццяўляе гэта свабодным чынам, калі хто-небудзь іншы не мае права прадстаўлення або выбару.

Кан. 524 – Дыяцэзіяльны біскуп даручае вакантную парафію таму, каго, разважыўшы ўсе абставіны, палічыць прыдатным для ажыццяўлення ў ёй парафіяльнай апекі, выключаючы ўсялякую перавагу з увагі на асобу; для таго, каб пераканацца аб прыдатнасці, біскуп павінен выслухаць акруговага вікарыя і сабраць адпаведныя звесткі, пры неабходнасці выслухаўшы некаторых прэзбітэраў, а таксама свецкіх вернікаў.

nas eidem addicendas et ad res oeconomicas spectent.

Can. 521 – § 1. Ut quis valide in parochum assumatur, oportet sit in sacro presbyteratus ordine constitutus.

§ 2. Sit praeterea sana doctrina et morum probitate praestans, animarum zelo aliisque virtutibus praeditus, atque insuper qualitatibus gaudeat quae ad paroeciam, de qua agitur, curandam iure sive universali sive particulari requiruntur.

§ 3. Ad officium parochi alicui conferendum, oportet de eius idoneitate, modo ab Episcopo dioecesano determinato, etiam per examen, certo constet.

Can. 522 – Parochus stabilitate gaudeat oportet ideoque ad tempus indefinitum nominetur; ad certum tempus tantum ab Episcopo dioecesano nominari potest, si id ab Episcoporum conferentia per decretum admissum fuerit.

Can. 523 – Firmo praescripto can. 682, § 1, parochi officii provisio Episcopo dioecesano competit et quidem libera collatione, nisi cuidam sit ius praesentationis aut electionis.

Can. 524 – Vacantem paroeciam Episcopus dioecesanus conferat illi quem, omnibus perpensis adiunctis, aestimet idoneum ad paroecialem curam in eadem implendam, omni personarum acceptione remota; ut iudicium de idoneitate ferat, audiat vicarium foraneum aptasque investigationes peragat, auditis, si casus ferat, certis presbyteris necnon christifidelibus laicis.

Can. 525 – Sede vacante aut impedita, ad Administratorem dioecesanum aliumve dioecesim ad interim regentem pertinet:

1° institutionem vel confirmationem concedere presbyteris, qui ad paroeciam legitime praesentati aut electi fuerint;

2° parochos nominare, si sedes ab anno vacaverit aut impedita sit.

Can. 526 – § 1. Parochus unius paroeciae tantum curam paroecialem habeat; ob penuriam tamen sacerdotum aut alia adiuncta, plurium vicinarum paroeciarum cura eidem parocho concredi potest.

§ 2. In eadem paroecia unus tantum habeatur parochus aut moderator ad normam can. 517, § 1, reprobata contraria consuetudine et revocato quolibet contrario privilegio.

Can. 527 – § 1. Qui ad curam pastoralem paroeciae gerendam promotus est, eandem obtinet et exercere tenetur a momento captae possessionis.

§ 2. Parochum in possessionem mittit loci Ordinarius aut sacerdos ab eodem delegatus, servato modo lege particulari aut legitima consuetudine recepto; iusta tamen de causa potest idem Ordinarius ab eo modo dispensare; quo in casu dispensatio paroeciae notificata locum tenet captae possessionis.

§ 3. Loci Ordinarius praefiniat tempus intra quod paroeciae possessio capi debeat; quo inutiliter praeterlapso, nisi iustum obstiterit impedimentum, paroeciam vacare declarare potest.

Кан. 525 – Калі сталіца з'яўляецца вакантнай або мае перашкоду, дыяцэзіяльны адміністратар ці іншая асоба, якая кіруе дыяцэзіяй, мае права на:

1° устанаўленне або адабрэнне прэзбітэраў, якія былі легітымна прадстаўлены або выбраны ў парафію;

2° прызначэнне пробашчаў, калі сталіца застаецца вакантнай або мае перашкоду больш чым год.

Кан. 526 – § 1. Пробашч павінен мець пастырскую апеку толькі над адной парафіяй; аднак па прычыне недахопу святароў або з увагі на іншыя абставіны апека над некалькімі суседнімі парафіямі можа быць даручана аднаму пробашчу.

§ 2. У асобнай парафіі павінен быць толькі адзін пробашч або мадэратар у адпаведнасці з нормай кан. 517 § 1, пры гэтым супраціўны звычай адхіляецца і кожны супраціўны гэтаму прывілей адклікаецца.

Кан. 527 – § 1. Вылучаны да ажыццяўлення пастырскай апекі над парафіяй прымае яе і пачынае выконваць свае абавязкі з моманту прыняцця яе ў валоданне.

§ 2. Пробашча ўводзіць у валоданне ардынарый месца або дэлегаваны ім святар, захоўваючы парадак, прыняты партыкулярным законам або легітымным звычаем; аднак па справядлівай прычыне той жа ардынарый мае права ўдзяліць дыспенсацыю ад гэтага парадку; у такім выпадку дыспенсацыя, абвешчаная ў парафіі, замяняе прыняцце ў валоданне.

§ 3. Ардынарый месца павінен вызначыць тэрмін, на працягу якога належыць прыняць парафію ў валоданне; у выпадку невыкарыстання гэтага тэрміну ён можа аб'явіць парафію вакантнай, калі не было справядлівай перашкоды.

Кан. 528 – § 1. Пробашч павінен клапаціцца аб тым, каб Божае слова ва ўсёй паўнаце абвяшчалася тым, хто пражывае ў парафіі; таму ён павінен клапаціцца, каб свецкія вернікі атрымлівалі навучанне аб праўдах веры, асабліва праз гаміліі ў нядзелі і ў абавязковыя святы, а таксама праз катэхізацыю. Ён павінен таксама развіваць дзейнасць, якая спрыяе зацвярджэнню евангельскага духу, у тым ліку ў сферы грамадскай справядлівасці; асаблівую апеку ён павінен праяўляць над каталіцкім выхаваннем дзяцей і моладзі; ён павінен любымі спосабамі, у тым ліку ў супрацоўніцтве з вернікамі, імкнуцца, каб евангельская навіна дайшла і да тых, хто адышоў ад рэлігійнага жыцця або не вызнае сапраўднай веры.

§ 2. Пробашч павінен клапаціцца аб тым, каб Найсвяцейшая Эўхарыстыя была цэнтрам парафіяльнай супольнасці вернікаў; павінен прыкладаць намаганні, каб вернікі ўмацоўваліся праз годную цэлебрацыю сакрамэнтаў і, асаблівым чынам, праз часты ўдзел у сакрамэнтах Найсвяцейшай Эўхарыстыі і пакаяння; ён павінен заахвочваць да таго, каб вернікі маліліся, таксама ў сем'ях, свядома і чынна ўдзельнічалі ў святой літургіі. Пробашч, пад уладай дыяцэзіяльнага біскупа, павінен кіраваць літургіяй у сваёй парафіі і сачыць за тым, каб у літургію не закрадваліся злоўжыванні.

Кан. 529 – § 1. Для таго, каб старанна выконваць абавязак пастыра, пробашч павінен імкнуцца пазнаёміцца з вернікамі, даручанымі яго апецы; таму ён павінен наведваць сем'і, удзельнічаць у клопатах вернікаў, асабліва ў іх смутках і турботах, умацоўваць іх у Пану, а таксама, калі яны маюць недахопы, разважліва іх папраўляць. Хворых, асабліва тых, якія знаходзяцца пры смерці, ён павінен падтрымліваць сапраўднай лю-

Can. 528 – § 1. Parochus obligatione tenetur providendi ut Dei verbum integre in paroecia degentibus annuntietur; quare curet ut christifideles laici in fidei veritatibus edoceantur, praesertim homilia diebus dominicis et festis de praecepto habenda necnon catechetica institutione tradenda, atque foveat opera quibus spiritus evangelicus, etiam ad iustitiam socialem quod attinet, promoveatur; peculiarem curam habeat de puerorum iuvenumque educatione catholica; omni ope satagat, associata etiam sibi christifidelium opera, ut nuntius evangelicus ad eos quoque perveniat, qui a religione colenda recesserint aut veram fidem non profiteantur.

§ 2. Consulat parochus ut sanctissima Eucharistia centrum sit congregationis fidelium paroecialis; allaboret ut christifideles, per devotam sacramentorum celebrationem, pascantur, peculiarique modo ut frequenter ad sanctissimae Eucharistiae et paenitentiae sacramenta accedant; annitatur item ut iidem ad orationem etiam in familiis peragendam ducantur atque conscie et actuose partem habeant in sacra liturgia, quam quidem, sub auctoritate Episcopi dioecesani, parochus in sua paroecia moderari debet et, ne abusus irrepant, invigilare tenetur.

Can. 529 – § 1. Officium pastoris sedulo ut adimpleat, parochus fideles suae curae commissos cognoscere satagat; ideo familias visitet, fidelium sollicitudines, angores et luctus praesertim participans eosque in Domino confortans necnon, si in quibusdam defecerint, prudenter corrigens; aegrotos, praesertim morti proximos, effusa caritate adiuvet, eos sollicite sacramentis reficiendo eorumque

animas Deo commendando; peculiari diligentia prosequatur pauperes, afflictos, solitarios, e patria exsules itemque peculiaribus difficultatibus gravatos; allaboret etiam ut coniuges et parentes ad officia propria implenda sustineantur et in familia vitae christianae incrementum foveat.

§ 2. Partem quam christifideles laici in missione Ecclesiae propriam habent, parochus agnoscat et promoveat, consociationes eorundem ad fines religionis fovendo. Cum proprio Episcopo et cum dioecesis presbyterio cooperetur, allaborans etiam ut fideles communionis paroecialis curam habeant, iidemque tum dioecesis tum Ecclesiae universae membra se sentiant operaque ad eandem communionem promovendam participent vel sustineant.

Can. 530 – Functiones specialiter parocho commissae sunt quae sequuntur:

1° administratio baptismi;

2° administratio sacramenti confirmationis iis qui in periculo mortis versantur, ad normam can. 883, n. 3;

3° administratio Viatici necnon unctionis infirmorum, firmo praescripto can. 1003, §§ 2 et 3, atque apostolicae benedictionis impertitio;

4° assistentia matrimoniis et benedictio nuptiarum;

5° persolutio funerum;

6° fontis baptismalis tempore paschali benedictio, ductus processionum extra ecclesiam, necnon benedictiones extra ecclesiam sollemnes;

7° celebratio eucharistica sollemnior diebus dominicis et festis de praecepto.

боўю, клапатліва ўмацоўваць іх сакрамэнтамі і даручаць іх душы Богу; асаблівую ўвагу пробашч павінен удзяляць бедным, пакутуючым, адзінокім, бежанцам і тым, хто знаходзіцца ў асаблівых цяжкасцях; ён таксама павінен прыкладаць намаганні, каб сужэнцам і бацькам аказвалася дапамога ў выкананні іх абавязкаў, і спрыяць узрастанню хрысціянскага жыцця ў сям'і.

§ 2. Пробашч павінен прызнаваць і падтрымліваць уласны ўдзел свецкіх вернікаў у місіі Касцёла і аказваць падтрымку іх аб'яднанням, якія маюць рэлігійныя мэты. Ён павінен супрацоўнічаць са сваім біскупам і дыяцэзіяльным прэзбітэрыем, прыкладаючы намаганні да таго, каб вернікі клапаціліся аб парафіяльнай супольнасці, адчувалі сябе членамі як дыяцэзіі, так і паўсюднага Касцёла, удзельнічалі ў развіцці гэтай супольнасці і падтрымлівалі яе.

Кан. 530 – Наступныя функцыі асобым чынам даручаны пробашчу:

1° удзялянне хросту;

2° удзялянне сакрамэнту канфірмацыі тым, хто знаходзіцца ў небяспецы смерці, згодна з нормай кан. 883, 3°;

3° удзялянне Віятыку, а таксама намашчэнне хворых, захоўваючы прадпісанне кан. 1003 § 2 і 3, і ўдзялянне апостальскага благаслаўлення;

4° асіставанне пры заключэнні сужэнстваў і благаслаўленне сужэнцаў;

5° правядзенне пахаванняў;

6° благаслаўленне купелі хросту ў Велікодны час, правядзенне працэсій па-за касцёлам, а таксама правядзенне ўрачыстых благаслаўленняў па-за касцёлам;

7° больш урачыстая цэлебрацыя Эўхарыстыі ў нядзелі і абавязковыя святы.

Кан. 531 – Нават калі хто-небудзь іншы выконваў якое-небудзь парафіяльнае заданне, тым не менш павінен перадаць ахвяраванні, атрыманыя з гэтай нагоды ад вернікаў, у супольную парафіяльную касу, калі не будзе іншай волі ахвярадаўцы адносна дабравольных ахвяраванняў; дыяцэзіяльны біскуп, выслухаўшы Святарскую Раду, можа ўстанавіць прадпісанні, згодна з якімі будзе вырашацца прызначэнне гэтых ахвяраванняў, а таксама ўзнагароджанне духоўных асобаў, якія выконваюць гэтыя заданні.

Can. 531 – Licet paroeciale quoddam munus alius expleverit, oblationes quas hac occasione a christifidelibus recipit ad massam paroecialem deferat, nisi de contraria offerentis voluntate constet quoad oblationes voluntarias; Episcopo dioecesano, audito consilio presbyterali, competit statuere praescripta, quibus destinationi harum oblationum necnon remunerationi clericorum idem munus implentium provideatur.

Кан. 532 – Ва ўсіх юрыдычных справах пробашч выступае ад імя парафіі згодна з нормамі права; ён павінен клапаціцца аб тым, каб адміністраванне маёмасцю парафіі ажыццяўлялася згодна з нормамі кан. 1281–1288.

Can. 532 – In omnibus negotiis iuridicis parochus personam gerit paroeciae, ad normam iuris; curet ut bona paroeciae administrentur ad normam cann. 1281-1288.

Кан. 533 – § 1. Пробашч павінен рэзідаваць у парафіяльным доме паблізу касцёла; аднак, у асаблівых выпадках, пры наяўнасці справядлівай прычыны, ардынарый месца можа дазволіць пражываць у іншым месцы, асабліва ў агульным доме для некалькіх святароў, калі толькі будзе забяспечана належнае і адпаведнае выкананне парафіяльных заданняў.

Can. 533 – § 1. Parochus obligatione tenetur residendi in domo paroeciali prope ecclesiam; in casibus tamen particularibus, si iusta adsit causa, loci Ordinarius permittere potest ut alibi commoretur, praesertim in domo pluribus presbyteris communi, dummodo paroecialium perfunctioni munerum rite apteque sit provisum.

§ 2. Калі гэтаму не перашкаджае важкая прычына, пробашчу дазваляецца, карыстаючыся адпачынкам, штогод знаходзіцца па-за парафіяй на працягу месяца без перапынку ці з перапынкамі; у час адпачынку не залічваюцца тыя дні, калі пробашч раз на год удзельнічае ў духоўных практыкаваннях; аднак, калі пробашч будзе знаходзіцца па-за парафіяй больш чым тыдзень, ён павінен папярэдзіць аб гэтым ардынарыя месца.

§ 2. Nisi gravis obstet ratio, parocho, feriarum gratia, licet quotannis a paroecia abesse ad summum per unum mensem continuum aut intermissum; quo in feriarum tempore dies non computantur, quibus semel in anno parochus spirituali recessui vacat; parochus autem, ut ultra hebdomadam a paroecia absit, tenetur de hoc loci Ordinarium monere.

§ 3. Дыяцэзіяльны біскуп мае права ўстанаўліваць нормы, згодна з якімі, пры адсутнасці пробашча, апека над парафіяй

§ 3. Episcopi dioecesani est normas statuere quibus prospiciatur ut, parochi absentia durante, curae providea-

tur paroeciae per sacerdotem debitis facultatibus instructum.

Can. 534 – § 1. Parochus, post captam paroeciae possessionem, obligatione tenetur singulis diebus dominicis atque festis in sua dioecesi de praecepto Missam pro populo sibi commisso applicandi; qui vero ab hac celebratione legitime impediatur, iisdem diebus per alium aut aliis diebus per se ipse applicet.

§ 2. Parochus, qui plurium paroeciarum curam habet, diebus de quibus in § 1, unam tantum Missam pro universo sibi commisso populo applicare tenetur.

§ 3. Parochus qui obligationi de qua in §§ 1 et 2 non satisfecerit, quam primum pro populo tot Missas applicet, quot omiserit.

Can. 535 – § 1. In unaquaque paroecia habeantur libri paroeciales, liber scilicet baptizatorum, matrimoniorum, defunctorum, aliique secundum Episcoporum conferentiae aut Episcopi dioecesani praescripta; prospiciat parochus ut iidem libri accurate conscribantur atque diligenter asserventur.

§ 2. In libro baptizatorum adnotentur quoque adscriptio Ecclesiae sui iuris vel ad aliam transitus, necnon confirmatio, item quae pertinent ad statum canonicum christifidelium, ratione matrimonii, salvo quidem praescripto can. 1133, ratione adoptionis, ratione suscepti ordinis sacri, necnon professionis perpetuae in instituto religioso emissae; eaeque adnotationes in documento accepti baptismi semper referantur.

§ 3. Unicuique paroeciae sit proprium sigillum; testimonia quae de statu canonico christifidelium dan-

будзе забяспечана святаром, надзеленым неабходнымі паўнамоцтвамі.

Кан. 534 – § 1. На пробашча пасля прыняцця парафіі ў валоданне ўскладаецца абавязак у кожную нядзелю і ў святы, абавязковыя ў яго дыяцэзіі, прысвячаць Імшу за даручаны яму народ; аднак, калі б ён меў у гэтым легітымную перашкоду, павінен прысвяціць гэтую Імшу ў той самы дзень з дапамогай іншай асобы або ў іншы дзень асабіста.

§ 2. Пробашч, які мае апеку над некалькімі парафіямі, у тыя дні, аб якіх гаворыцца ў § 1, мае абавязак прысвячаць толькі адну Імшу за ўвесь даручаны яму народ.

§ 3. Пробашч, які не выканаў абавязак, аб якім гаворыцца ў § 1 і 2, павінен як мага хутчэй прысвяціць столькі Імшаў за народ, колькі прапусціў.

Кан. 535 – § 1. У кожнай парафіі павінны быць парафіяльныя кнігі, гэта значыць кнігі ахрышчаных, сужэнстваў, памерлых і іншыя, паводле прадпісанняў Канферэнцыі Біскупаў або дыяцэзіяльнага біскупа; пробашч павінен сачыць за тым, каб гэтыя кнігі беражліва захоўваліся і ў іх вяліся дакладныя запісы.

§ 2. У кнізе ахрышчаных павінны быць зроблены запісы аб прыналежнасці да Касцёла *sui iuris* або аб пераходзе ў іншы Касцёл, а таксама аб канфірмацыі і аб усім, што датычыць кананічнага стану вернікаў: аб сужэнстве, захоўваючы пры гэтым прадпісанне кан. 1133, аб усынаўленні, аб прыняцці пасвячэння, аб складанні вечных абяцанняў у манаскім інстытуце; гэтыя запісы павінны быць заўсёды ўнесены і ў дакумент аб прыняцці хросту.

§ 3. Кожная парафія павінна мець уласную пячатку; пасведчанні, якія выдаюцца аб кананічным стане вернікаў, як і ўсе акты,

якія могуць мець юрыдычнае значэнне, павінны быць падпісаны самім пробашчам або ўпаўнаважанай ім асобай і пацверджаны парафіяльнай пячаткай.

§ 4. У кожнай парафіі павінна быць сховішча, іншымі словамі — архіў, у якім павінны захоўвацца парафіяльныя кнігі разам з лістамі біскупа і іншымі дакументамі, калі існуе неабходнасць або карыснасць іх захоўвання; біскуп або ўпаўнаважаная ім асоба падчас візітацыі ці пры іншых адпаведных абставінах павінны ўсе іх праверыць; пробашч павінен сачыць за тым, каб яны не трапілі ў рукі пабочных асобаў.

§ 5. Старыя парафіяльныя кнігі таксама павінны старанна захоўвацца, згодна з прадпісаннямі партыкулярнага права.

Кан. 536 – § 1. Калі дыяцэзіяльны біскуп, выслухаўшы Святарскую Раду, палічыць гэта карысным, у кожнай парафіі можа быць заснавана Пастырская Рада, якую ўзначальвае пробашч і ў якой вернікі разам з тымі, хто на моцы сваёй пасады ўдзельнічае ў пастырскай апецы над парафіяй, аказваюць дапамогу ў ажыццяўленні пастырскай дзейнасці.

§ 2. Пастырская Рада мае толькі кансультатыўны голас і кіруецца нормамі, устаноўленымі дыяцэзіяльным біскупам.

Кан. 537 – У кожнай парафіі павінна існаваць Рада па эканамічных пытаннях, якая кіруецца паўсюдным правам, а таксама нормамі, выдадзенымі дыяцэзіяльным біскупам, у якой вернікі, выбраныя паводле гэтых нормаў, аказваюць пробашчу дапамогу ў адміністраванні маёмасцю парафіі, захоўваючы прадпісанні кан. 532.

Кан. 538 – § 1. Пробашч траціць сваю пасаду праз звальненне або перамяшчэнне, здзейсненыя дыяцэзіяльным біскупам

tur, sicut et acta omnia quae momentum iuridicum habere possunt, ab ipso parocho eiusve delegato subscribantur et sigillo paroeciali muniantur.

§ 4. In unaquaque paroecia habeatur tabularium seu archivum, in quo libri paroeciales custodiantur, una cum Episcoporum epistulis aliisque documentis, necessitatis utilitatisve causa servandis; quae omnia, ab Episcopo dioecesano eiusve delegato, visitationis vel alio opportuno tempore inspicienda, parochus caveat ne ad extraneorum manus perveniant.

§ 5. Libri paroeciales antiquiores quoque diligenter custodiantur, secundum praescripta iuris particularis.

Can. 536 – § 1. Si, de iudicio Episcopi dioecesani, audito consilio presbyterali, opportunum sit, in unaquaque paroecia constituatur consilium pastorale, cui parochus praeest et in quo christifideles una cum illis qui curam pastoralem vi officii sui in paroecia participant, ad actionem pastoralem fovendam suum adiutorium praestent.

§ 2. Consilium pastorale voto gaudet tantum consultivo et regitur normis ab Episcopo dioecesano statutis.

Can. 537 – In unaquaque paroecia habeatur consilium a rebus oeconomicis, quod praeterquam iure universali, regitur normis ab Episcopo dioecesano latis et in quo christifideles, secundum easdem normas selecti, parocho in administratione bonorum paroeciae adiutorio sint, firmo praescripto can. 532.

Can. 538 – § 1. Parochus ab officio cessat amotione aut translatione ab Episcopo dioecesano ad normam

iuris peracta, renuntiatione iusta de causa ab ipso parocho facta et, ut valeat, ab eodem Episcopo acceptata, necnon lapsu temporis si, iuxta iuris particularis de quo in can. 522 praescripta, ad tempus determinatum constitutus fuerit.

§ 2. Parochus, qui est sodalis instituti religiosi aut in societate vitae apostolicae incardinatus, ad normam can. 682, § 2 amovetur.

§ 3. Parochus, expleto septuagesimo quinto aetatis anno, rogatur ut renuntiationem ab officio exhibeat Episcopo dioecesano, qui, omnibus personae et loci inspectis adiunctis, de eadem acceptanda aut differenda decernat; renuntiantis congruae sustentationi et habitationi ab Episcopo dioecesano providendum est, attentis normis ab Episcoporum conferentia statutis.

Can. 539 – Cum vacat paroecia aut cum parochus ratione captivitatis, exsilii vel relegationis, inhabilitatis vel infirmae valetudinis aliusve causae a munere pastorali in paroecia exercendo praepeditur, ab Episcopo dioecesano quam primum deputetur administrator paroecialis, sacerdos scilicet qui parochi vicem suppleat ad normam can. 540.

Can. 540 – § 1. Administrator paroecialis iisdem adstringitur officiis iisdemque gaudet iuribus ac parochus, nisi ab Episcopo dioecesano aliter statuatur.

§ 2. Administratori paroeciali nihil agere licet, quod praeiudicium afferat iuribus parochi aut damno esse possit bonis paroecialibus.

згодна з нормамі права, праз адмову ад пасады, зробленую самім пробашчам па справядлівай прычыне і прынятую — для яе дзейснасці — тым жа біскупам, а таксама з заканчэннем тэрміну, калі пробашч згодна з прадпісаннямі партыкулярнага права, аб якім гаворыцца ў кан. 522, быў прызначаны на акрэслены тэрмін.

§ 2. Звальненне з пасады пробашча, які з'яўляецца членам манаскага інстытута або інкардынаваны ў таварыства апостальскага жыцця, адбываецца згодна з нормай кан. 682 § 2.

§ 3. Пробашч, які дасягнуў сямідзесяціпяцігадовага ўзросту, запрошаны падаць адмову ад пасады дыяцэзіяльнаму біскупу, які, разгледзеўшы ўсе абставіны асобы і месца, прымае рашэнне аб прыняцці або адхіленні адмовы; дыяцэзіяльны біскуп павінен паклапаціцца аб годным утрыманні і месцы пражывання для таго, хто адмовіўся ад пасады, беручы пад увагу нормы, прынятыя Канферэнцыяй Біскупаў.

Кан. 539 – Калі парафія становіцца вакантнай, а таксама калі зняволенне, выгнанне або адхіленне, недзеяздольнасць, хвароба ці іншыя прычыны перашкаджаюць пробашчу ажыццяўляць пастырскае заданне ў парафіі, дыяцэзіяльны біскуп павінен як мага хутчэй прызначыць парафіяльнага адміністратара, гэта значыць святара, які будзе замяшчаць пробашча ў адпаведнасці з нормай кан. 540.

Кан. 540 – § 1. Парафіяльны адміністратар мае тыя самыя абавязкі і карыстаецца тымі самымі правамі, што і пробашч, калі дыяцэзіяльны біскуп не пастановіць іначай.

§ 2. Парафіяльнаму адміністратару не дазваляецца рабіць нічога, што можа парушыць правы пробашча або прычыніць шкоду парафіяльнай маёмасці.

§ 3. Пасля заканчэння выконвання задання парафіяльны адміністратар павінен прадставіць пробашчу справаздачу.

Кан. 541 – § 1. Калі парафія становіцца вакантнай, а таксама ў выпадку, калі пробашч мае перашкоду ў ажыццяўленні пастырскага задання, да моманту прызначэння парафіяльнага адміністратара кіраванне парафіяй часова прымае парафіяльны вікарый; калі іх некалькі, кіраванне пераходзіць да старэйшага прызначэннем, а калі вікарыя няма — да пробашча, акрэсленага партыкулярным правам.

§ 2. Той, хто прыняў кіраванне парафіяй у адпаведнасці з нормай § 1, павінен адразу паведаміць ардынарыя месца аб тым, што парафія вакантная.

Кан. 542 – Святары, якім у адпаведнасці з нормай кан. 517 § 1 даручаецца сумесная пастырская апека над якой-небудзь парафіяй або адначасова над некалькімі парафіямі:

1° павінны мець якасці, аб якіх гаворыцца ў кан. 521;

2° прызначаюцца або ўстанаўліваюцца на пасаду згодна з прадпісаннямі кан. 522 і 524;

3° прымаюць пастырскую апеку толькі з моманту прыняцця ў валоданне; іх мадэратар уводзіцца ў валоданне згодна з нормай, прадпісанай у кан. 527 § 2; для іншых святароў легітымна прамоўленае вызнанне веры замяняе прыняцце ў валоданне.

Кан. 543 – § 1. Калі сумесная пастырская апека над якой-небудзь парафіяй або адначасова над некалькімі парафіямі даручаецца некалькім святарам, кожны з іх, адпаведна з вызначаным імі самімі парадкам, павінен выконваць заданні і функцыі пробашча, аб якіх гаворыцца ў кан. 528,

§ 3. Administrator paroecialis post expletum munus parocho rationem reddat.

Can. 541 – § 1. Vacante paroecia itemque parocho a munere pastorali exercendo impedito, ante administratoris paroecialis constitutionem, paroeciae regimen interim assumat vicarius paroecialis; si plures sint, is qui sit nominatione antiquior, et si vicarii desint, parochus iure particulari definitus.

§ 2. Qui paroeciae regimen ad normam § 1 assumpserit, loci Ordinarium de paroeciae vacatione statim certiorem faciat.

Can. 542 – Sacerdotes quibus in solidum, ad normam can. 517, § 1, alicuius paroeciae aut diversarum simul paroeciarum cura pastoralis committitur:

1° praediti sint oportet qualitatibus, de quibus in can. 521;

2° nominentur vel instituantur ad normam praescriptorum cann. 522 et 524;

3° curam pastoralem obtinent tantum a momento captae possessionis; eorundem moderator in possessionem mittitur ad normam praescriptorum can. 527, § 2; pro ceteris vero sacerdotibus fidei professio legitime facta locum tenet captae possessionis.

Can. 543 – § 1. Si sacerdotibus in solidum cura pastoralis alicuius paroeciae aut diversarum simul paroeciarum committatur, singuli eorum, iuxta ordinationem ab iisdem statutam, obligatione tenentur munera et functiones parochi persolvendi de quibus

in cann. 528, 529 et 530; facultas matrimoniis assistendi, sicuti et potestates omnes dispensandi ipso iure parocho concessae, omnibus competunt, exercendae tamen sunt sub directione moderatoris.

§ 2. Sacerdotes omnes qui ad coetum pertinent:

1° obligatione tenentur residentiae;

2° communi consilio ordinationem statuant, qua eorum unus Missam pro populo celebret, ad normam can. 534;

3° solus moderator in negotiis iuridicis personam gerit paroeciae aut paroeciarum coetui commissarum.

Can. 544 – Cum cesset ab officio aliquis sacerdos e coetu, de quo in can. 517, § 1, vel coetus moderator, itemque cum eorundem aliquis inhabilis fiat ad munus pastorale exercendum, non vacat paroecia vel paroeciae, quarum cura coetui committitur; Episcopi autem dioecesani est alium nominare moderatorem; antequam vero ab Episcopo alius nominetur, hoc munus adimpleat sacerdos eiusdem coetus nominatione antiquior.

Can. 545 – § 1. Quoties ad pastoralem paroeciae curam debite adimplendam necesse aut opportunum sit, parocho adiungi possunt unus aut plures vicarii paroeciales, qui, tamquam parochi cooperatores eiusque sollicitudinis participes, communi cum parocho consilio et studio, atque sub eiusdem auctoritate operam in ministerio pastorali praestent.

§ 2. Vicarius paroecialis constitui potest sive ut opem ferat in universo ministerio pastorali explendo,

529 і 530; паўнамоцтва асіставаць пры заключэнні сужэнства, як і ўсе паўнамоцтвы, звязаныя з удзяляннем дыспенсацый, нададзеныя на моцы самога права пробашчу, належаць ім усім, аднак мадэратар павінен акрэсліваць парадак іх ажыццяўлення.

§ 2. Усе святары, якія належаць да гэтай групы:

1° маюць абавязак рэзідэнцыі;

2° павінны сумесным рашэннем устанавіць парадак, згодна з якім кожны з іх па чарзе будзе цэлебраваць Імшу за народ у адпаведнасці з нормай кан. 534;

3° у юрыдычных справах толькі мадэратар прадстаўляе парафію або парафіі, даручаныя групе святароў.

Кан. 544 – Калі які-небудзь святар з групы, аб якой гаворыцца ў кан. 517 § 1, або яе мадэратар трацяць сваю пасаду, а таксама калі адзін з іх становіцца няздольным ажыццяўляць пастырскае заданне, парафія або парафіі, апека над якімі даручана гэтай групе, не становяцца вакантнымі; аднак дыяцэзіяльны біскуп павінен прызначыць іншага мадэратара, а перад тым, як біскуп прызначыць іншага мадэратара, яго заданне павінен выконваць святар з гэтай групы, старэйшы прызначэннем.

Кан. 545 – § 1. Заўсёды, калі гэта будзе неабходным або карысным для належнага ажыццяўлення пастырскай апекі над парафіяй, пробашчу можа быць прыдадзены адзін або некалькі парафіяльных вікарыяў, якія, будучы супрацоўнікамі пробашча і падзяляючы яго клопаты, праз адзінства ў парадах і пільнасці з пробашчам, пад яго ўладай удзельнічаюць у пастырскай паслузе.

§ 2. Парафіяльны вікарый можа быць устаноўлены як для таго, каб дапамагаць у ажыццяўленні ўсёй пастырскай паслугі

для ўсёй парафіі, або для асобнай яе часткі, або для акрэсленай парафіяльнай групы вернікаў, так і для таго, каб ажыццяўляць акрэсленую паслугу адразу ў некалькіх парафіях.

Кан. 546 – Для таго, каб хто-небудзь мог быць дзейсна прызначаны на пасаду парафіяльнага вікарыя, неабходна, каб ён меў святое пасвячэнне прэзбітэрату.

Кан. 547 – Парафіяльнага вікарыя свабодна прызначае дыяцэзіяльны біскуп, выслухаўшы, калі палічыць гэта патрэбным, пробашча або пробашчаў тых парафій, для якіх ён устанаўліваецца, а таксама акруговага вікарыя, захоўваючы прадпісанне кан. 682 § 1.

Кан. 548 – § 1. Абавязкі і правы парафіяльнага вікарыя акрэсліваюцца, апрача канонаў гэтага раздзела, дыяцэзіяльнымі статутамі, а таксама лістом дыяцэзіяльнага біскупа; больш канкрэтна яны акрэсліваюцца ўпаўнаважаннем пробашча.

§ 2. Калі ў лісце дыяцэзіяльнага біскупа выразна не прадугледжана іншае, парафіяльны вікарый на моцы сваёй пасады мае абавязак дапамагаць пробашчу ва ўсёй парафіяльнай паслузе, за выключэннем прысвячэння Імшы за народ, а таксама мае абавязак згодна з правам замяшчаць пробашча, калі гэтага патрабуюць абставіны.

§ 3. Парафіяльны вікарый павінен рэгулярна паведамляць пробашча аб запланаваных і здзейсненых пастырскіх пачынаннях, каб пробашч і вікарый ці вікарыі маглі сумеснымі намаганнямі ажыццяўляць пастырскую апеку над парафіяй, за якую яны сумесна нясуць адказнасць.

Кан. 549 – Калі дыяцэзіяльны біскуп не прадугледзеў у адпаведнасці з нормай кан. 533 § 3 іншае і калі не быў прызначаны

et quidem aut pro tota paroecia aut pro determinata paroeciae parte aut pro certo paroeciae christifidelium coetu, sive etiam ut operam impendat in certum ministerium in diversis simul paroeciis persolvendum.

Can. 546 – Ut quis valide vicarius paroecialis nominetur, oportet sit in sacro presbyteratus ordine constitutus.

Can. 547 – Vicarium paroecialem libere nominat Episcopus dioecesanus, auditis, si opportunum id iudicaverit, parocho aut parochis paroeciarum pro quibus constituitur, necnon vicario foraneo, firmo praescripto can. 682, § 1.

Can. 548 – § 1. Vicarii paroecialis obligationes et iura, praeterquam canonibus huius capitis, statutis dioecesanis necnon litteris Episcopi dioecesani definiuntur, specialius autem mandato parochi determinantur.

§ 2. Nisi aliud expresse litteris Episcopi dioecesani caveatur, vicarius paroecialis ratione officii obligatione tenetur parochum in universo paroeciali ministerio adiuvandi, excepta quidem applicatione Missae pro populo, itemque, si res ferat ad normam iuris, parochi vicem supplendi.

§ 3. Vicarius paroecialis regulariter de inceptis pastoralibus prospectis et susceptis ad parochum referat, ita ut parochus et vicarius aut vicarii, coniunctis viribus, pastorali curae providere valeant paroeciae, cuius simul sunt sponsores.

Can. 549 – Absente parocho, nisi aliter Episcopus dioecesanus providerit ad normam can. 533, § 3, et nisi

Administrator paroecialis constitutus fuerit, serventur praescripta can. 541, § 1; vicarius hoc in casu omnibus etiam obligationibus tenetur parochi, excepta obligatione applicandi Missam pro populo.

парафіяльны адміністратар, пры адсутнасці пробашча павінны выконвацца прадпісанні кан. 541 § 1. У гэтым выпадку на вікарыя ўскладаюцца ўсе абавязкі пробашча, за выключэннем абавязку прысвячэння Імшы за народ.

Can. 550 – § 1. Vicarius paroecialis obligatione tenetur residendi in paroecia aut, si pro diversis simul paroeciis constitutus est, in earum aliqua; loci tamen Ordinarius, iusta de causa, permittere potest ut alibi resideat, praesertim in domo pluribus presbyteris communi, dummodo pastoralium perfunctio munerum nullum exinde detrimentum capiat.

Кан. 550 – § 1. Парафіяльны вікарый мае абавязак рэзідаваць у парафіі або, калі ён устаноўлены адразу для некалькіх парафій, у адной з іх; аднак ардынарый месца па справядлівай прычыне можа дазволіць яму пражываць у іншым месцы, асабліва ў агульным доме для некалькіх святароў, калі толькі па гэтай прычыне не будзе ніякай шкоды для выконвання пастырскіх заданняў.

§ 2. Curet loci Ordinarius ut inter parochum et vicarios aliqua vitae communis consuetudo in domo paroeciali, ubi id fieri possit, provehatur.

§ 2. Ардынарый месца павінен клапаціцца аб тым, каб паміж пробашчам і вікарыем падтрымліваўся акрэслены звычай сумеснага жыцця ў парафіяльным доме там, дзе гэта магчыма.

§ 3. Ad tempus feriarum quod attinet, vicarius paroecialis eodem gaudet iure ac parochus.

§ 3. Што датычыць часу адпачынку, парафіяльны вікарый карыстаецца тымі самымі правамі, што і пробашч.

Can. 551 – Ad oblationes quod attinet, quas occasione perfuncti ministerii pastoralis christifideles vicario faciunt, serventur praescripta can. 531.

Кан. 551 – Што датычыць ахвяраванняў, якія вернікі складаюць вікарыю пры ажыццяўленні пастырскай паслугі, павінны захоўвацца прадпісанні кан. 531.

Can. 552 – Vicarius paroecialis ab Episcopo dioecesano aut ab Administratore dioecesano amoveri potest, iusta de causa, firmo praescripto can. 682, § 2.

Кан. 552 – Дыяцэзіяльны біскуп або дыяцэзіяльны адміністратар можа па справядлівай прычыне зняць парафіяльнага вікарыя з пасады, захоўваючы прадпісанні кан. 682 § 2.

Caput VII
De vicariis foraneis

Раздзел VII
Акруговыя вікарыі

Can. 553 – § 1. Vicarius foraneus, qui etiam decanus vel archipresbyter vel alio nomine vocatur, est sacerdos qui vicariatui foraneo praeficitur.

Кан. 553 – § 1. Акруговы вікарый, які таксама называецца дэканам, або арцыпрэзбітэрам, або як-небудзь іначай, — гэта святар, які ўзначальвае акруговы вікарыят.

§ 2. Калі партыкулярным правам не ўстаноўлена іншае, акруговага вікарыя прызначае дыяцэзіяльны біскуп, выслухаўшы ў адпаведнасці са сваім разважлівым суджэннем святароў, якія ажыццяўляюць паслугу ў гэтым вікарыяце.

Кан. 554 – § 1. На пасаду акруговага вікарыя, якая не звязана з займаннем пасады пробашча акрэсленай парафіі, біскуп павінен вызначыць святара, якога, улічваючы абставіны месца і часу, палічыць прыдатным.

§ 2. Акруговы вікарый павінен быць прызначаны на акрэслены тэрмін, акрэслены партыкулярным правам.

§ 3. Дыяцэзіяльны біскуп можа па справядлівай прычыне ў адпаведнасці са сваім разважлівым суджэннем свабодна зняць акруговага вікарыя з пасады.

Кан. 555 – § 1. Акруговы вікарый, апрача паўнамоцтваў, легітымна дадзеных яму партыкулярным правам, мае абавязак і права:

1° падтрымліваць і каардынаваць сумесную пастырскую дзейнасць у вікарыяце;

2° сачыць за тым, каб духоўныя асобы з яго акругі вялі жыццё, адпаведнае іх стану, і старанна выконвалі свае абавязкі;

3° наглядаць за тым, каб святыя дзеянні цэлебраваліся паводле літургічных прадпісанняў, каб належным чынам падтрымліваліся прыгажосць і ахайнасць касцёлаў і святых начыння, асабліва ў тым, што датычыць цэлебрацыі Эўхарыстыі і захоўвання Найсвяцейшага Сакрамэнту, каб запіс у парафіяльных кнігах вёўся правільна і яны захоўваліся належным чынам, каб адміністраванне касцёльнай маёмасцю здзяйснялася беражліва і, нарэшце, каб з належнай стараннасцю праяўляўся клопат аб парафіяльным доме.

§ 2. Nisi aliud iure particulari statuatur, vicarius foraneus nominatur ab Episcopo dioecesano, auditis pro suo prudenti iudicio sacerdotibus qui in vicariatu de quo agitur ministerium exercent.

Can. 554 – § 1. Ad officium vicarii foranei, quod cum officio parochi certae paroeciae non ligatur, Episcopus seligat sacerdotem quem, inspectis loci ac temporis adiunctis, idoneum iudicaverit.

§ 2. Vicarius foraneus nominetur ad certum tempus, iure particulari determinatum.

§ 3. Vicarium foraneum iusta de causa, pro suo prudenti arbitrio, Episcopus dioecesanus ab officio libere amovere potest.

Can. 555 – § 1. Vicario foraneo, praeter facultates iure particulari ei legitime tributas, officium et ius est:

1° actionem pastoralem in vicariatu communem promovendi et coordinandi;

2° prospiciendi ut clerici sui districtus vitam ducant proprio statui congruam atque officiis suis diligenter satisfaciant;

3° providendi ut religiosae functiones secundum sacrae liturgiae praescripta celebrentur, ut decor et nitor ecclesiarum sacraeque supellectilis, maxime in celebratione eucharistica et custodia sanctissimi Sacramenti, accurate serventur, ut recte conscribantur et debite custodiantur libri paroeciales, ut bona ecclesiastica sedulo administrentur; denique ut domus paroecialis debita diligentia curetur.

§ 2. In vicariatu sibi concredito vicarius foraneus:

1° operam det ut clerici, iuxta iuris particularis praescripta, statutis temporibus intersint praelectionibus, conventibus theologicis aut conferentiis, ad normam can. 279, § 2;

2° curet ut presbyteris sui districtus subsidia spiritualia praesto sint, itemque maxime sollicitus sit de iis, qui in difficilioribus versantur circumstantiis aut problematibus anguntur.

§ 3. Curet vicarius foraneus ut parochi sui districtus, quos graviter aegrotantes noverit, spiritualibus ac materialibus auxiliis ne careant, utque eorum qui decesserint, funera digne celebrentur; provideat quoque ne, occasione aegrotationis vel mortis, libri, documenta, sacra supellex aliaque, quae ad Ecclesiam pertinent, depereant aut asportentur.

§ 4. Vicarius foraneus obligatione tenetur secundum determinationem ab Episcopo dioecesano factam, sui districtus paroecias visitare.

§ 2. У давераным яму вікарыяце акруговы вікарый павінен:

1° прыкладаць намаганні, каб духоўныя асобы ва ўстаноўленым тэрміне паводле прадпісанняў партыкулярнага права ўдзельнічалі ў лекцыях, тэалагічных сходах ці канферэнцыях, згодна з нормай кан. 279 § 2;

2° клапаціцца аб тым, каб прэзбітэры яго акругі мелі духоўныя дапаможныя сродкі, і, перадусім, праяўляць клопат аб тых, хто знаходзіцца ў цяжкіх абставінах або абцяжараны праблемамі.

§ 3. Акруговы вікарый павінен паклапаціцца аб тым, каб пробашчы яго акругі, аб якіх яму стала вядома, што яны цяжка захварэлі, не былі пазбаўлены духоўнай і матэрыяльнай дапамогі, а ў выпадку смерці было праведзена годнае пахаванне; ён таксама павінен наглядаць за тым, каб па прычыне хваробы або смерці не былі забраны ці страчаны кнігі, дакументы, святыя начынні і іншыя рэчы, якія належаць касцёлу.

§ 4. Акруговы вікарый мае абавязак здзяйсняць кананічную візітацыю парафій сваёй акругі згодна з пастановамі дыяцэзіяльнага біскупа.

Caput VIII
De ecclesiarum rectoribus et de cappellanis

Art. 1. *De ecclesiarum rectoribus*

Can. 556 – Ecclesiarum rectores hic intelleguntur sacerdotes, quibus cura demandatur alicuius ecclesiae, quae nec sit paroecialis nec capitularis, nec adnexa domui communitatis religiosae aut societatis vitae apostolicae, quae in eadem officia celebret.

Раздзел VIII
Рэктары касцёлаў і капеланы

Артыкул 1. *Рэктары касцёлаў*

Кан. 556 – Пад назвай «рэктары касцёлаў» тут маюцца на ўвазе святары, якім даручана апека над якім-небудзь касцёлам, які не з'яўляецца ні парафіяльным, ні капітульным, ні злучаным з домам манаскай супольнасці ці таварыства апостальскага жыцця, якія ў іх цэлебруюць набажэнствы.

Кан. 557 – § 1. Рэктара касцёла свабодна прызначае дыяцэзіяльны біскуп, захоўваючы права выбару або прадстаўлення, калі яно каму-небудзь легітымна належыць; у такім выпадку дыяцэзіяльны біскуп мае права на адабрэнне ці ўстанаўленне рэктара.

§ 2. Нават тады, калі касцёл належыць якому-небудзь святарскаму манаскаму інстытуту папскага права, дыяцэзіяльны біскуп мае права на ўстанаўленне рэктара, прадстаўленага настаяцелем.

§ 3. Рэктарам касцёла, злучанага з семінарыяй ці іншай навучальнай калегіяй, якой кіруюць духоўныя асобы, з'яўляецца рэктар семінарыі ці калегіі, калі дыяцэзіяльны біскуп не пастановіць іншае.

Кан. 558 – Захоўваючы прадпісанне кан. 262, рэктару ў даручаным яму касцёле не дазваляецца выконваць парафіяльныя дзеянні, аб якіх гаворыцца ў кан. 530, 1°—6°, без згоды або, калі патрэбна, дэлегацыі пробашча.

Кан. 559 – У даручаным яму касцёле рэктар можа здзяйсняць літургічныя цэлебрацыі, таксама ўрачыстыя, захоўваючы легітымныя ўстаноўчыя законы, калі толькі, на думку ардынарыя месца, гэта ніякім чынам не пашкодзіць парафіяльнай паслузе.

Кан. 560 – Ардынарый месца, дзе палічыць гэта карысным, можа распарадзіцца, каб рэктар у сваім касцёле цэлебраваў для людзей некаторыя функцыі, нават парафіяльныя, а таксама каб касцёл быў даступны для акрэсленых груп вернікаў з мэтай здзяйснення ў ім літургічных цэлебрацый.

Кан. 561 – Без дазволу рэктара або іншага легітымнага настаяцеля нікому не дазваляецца цэлебраваць у касцёле Эўхарыстыю, удзяляць сакрамэнты або здзяйсняць іншыя святыя дзеянні; удзялянне гэтага да-

Can. 557 – § 1. Ecclesiae rector libere nominatur ab Episcopo dioecesano, salvo iure eligendi aut praesentandi, si cui legitime competat; quo in casu Episcopi dioecesani est rectorem confirmare vel instituere.

§ 2. Etiam si ecclesia pertineat ad aliquod clericale institutum religiosum iuris pontificii, Episcopo dioecesano competit rectorem a Superiore praesentatum instituere.

§ 3. Rector ecclesiae, quae coniuncta sit cum seminario aliove collegio quod a clericis regitur, est rector seminarii vel collegii, nisi aliter Episcopus dioecesanus constituerit.

Can. 558 – Salvo praescripto can. 262, rectori non licet functiones paroeciales de quibus in can. 530, nn. 1-6, in ecclesia sibi commissa peragere, nisi consentiente aut, si res ferat, delegante parocho.

Can. 559 – Potest rector in ecclesia sibi commissa liturgicas celebrationes etiam sollemnes peragere, salvis legitimis fundationis legibus, atque dummodo de iudicio loci Ordinarii nullo modo ministerio paroeciali noceant.

Can. 560 – Loci Ordinarius, ubi id opportunum censeat, potest rectori praecipere ut determinatas in ecclesia sua pro populo celebret functiones etiam paroeciales, necnon ut ecclesia pateat certis christifidelium coetibus ibidem liturgicas celebrationes peracturis.

Can. 561 – Sine rectoris aliusve legitimi superioris licentia, nemini licet in ecclesia Eucharistiam celebrare, sacramenta administrare aliasve sacras functiones peragere; quae licentia

danda aut deneganda est ad normam iuris.

Can. 562 – Ecclesiae rector, sub auctoritate loci Ordinarii servatisque legitimis statutis et iuribus quaesitis, obligatione tenetur prospiciendi ut sacrae functiones secundum normas liturgicas et canonum praescripta digne in ecclesia celebrentur, onera fideliter adimpleantur, bona diligenter administrentur, sacrae supellectilis atque aedium sacrarum conservationi et decori provideatur, neve quidpiam fiat quod sanctitati loci ac reverentiae domui Dei debitae quoquo modo non congruat.

Can. 563 – Rectorem ecclesiae, etsi ab aliis electum aut praesentatum, loci Ordinarius ex iusta causa, pro suo prudenti arbitrio ab officio amovere potest, firmo praescripto can. 682, § 2.

зволу або адмова ў ім павінны здзяйсняцца згодна з нормамі права.

Кан. 562 – Рэктар касцёла, пад уладай ардынарыя месца і захоўваючы легітымныя статуты і набытыя правы, павінен дбаць аб тым, каб святыя дзеянні цэлебраваліся ў касцёле годным чынам паводле літургічных нормаў і прадпісанняў канонаў, каб абавязацельствы верна выконваліся, каб старанна выконвалася адміністраванне маёмасцю, каб святыя начынні і святыя будынкі былі захаваны і ўпрыгожаны і каб не адбывалася нічога, што якім-небудзь чынам не адпавядае святасці месца і належнай пашане да Божага дома.

Кан. 563 – Ардынарый месца можа па справядлівай прычыне згодна са сваім разважлівым суджэннем зняць рэктара касцёла з пасады, нават калі ён быў выбраны або прадстаўлены на пасаду іншымі асобамі, захоўваючы прадпісанне кан. 682 § 2.

Art. 2. *De cappellanis*

Can. 564 – Cappellanus est sacerdos, cui stabili modo committitur cura pastoralis, saltem ex parte, alicuius communitatis aut peculiaris coetus christifidelium, ad normam iuris universalis et particularis exercenda.

Can. 565 – Nisi iure aliud caveatur aut cuidam specialia iura legitime competant, cappellanus nominatur ab Ordinario loci, cui etiam pertinet praesentatum instituere aut electum confirmare.

Can. 566 – § 1. Cappellanus omnibus facultatibus instructus sit oportet quas recta cura pastoralis requirit. Praeter eas quae iure particulari aut

Артыкул 2. *Капеланы*

Кан. 564 – Капелан — гэта святар, якому на пастаянна даручаецца пастырская апека, нават частковая, над якой-небудзь супольнасцю або асаблівай групай вернікаў. Гэтая апека павінна ажыццяўляцца згодна з нормамі паўсюднага і партыкулярнага права.

Кан. 565 – Калі права не прадугледжвае іншае або калі каму-небудзь на легітымнай падставе не належаць спецыяльныя правы, капелана прызначае ардынарый месца, якому таксама належыць устанаўленне прадстаўленага або адабрэнне выбранага.

Кан. 566 – § 1. Капелан павінен быць надзелены ўсімі паўнамоцтвамі, якія патрабуюцца для належнай пастырскай апекі. Апрача паўнамоцтваў, дадзеных партыкулярным

правам або праз спецыяльнае дэлегаванне, капелан на моцы сваёй пасады мае паўнамоцтва слухаць споведзі вернікаў, даручаных яго апецы, абвяшчаць ім Божае слова, удзяляць Віятык і намашчэнне хворых, а таксама ўдзяляць сакрамэнт канфірмацыі тым, хто знаходзіцца ў небяспецы смерці.

§ 2. У шпіталях, турмах і падчас марскіх падарожжаў капелан, апрача гэтага, мае паўнамоцтва, якое можа ажыццяўляць толькі ў гэтых месцах і якое дазваляе яму вызваляць ад незарэзерваваных і нясцвярджаных цэнзур *latae sententiae*, захоўваючы пры гэтым прадпісанні кан. 976.

Кан. 567 – § 1. Ардынарый месца не павінен прызначаць капелана дому свецкага манаскага інстытута без кансультацыі з настаяцелем, які мае права, выслухаўшы супольнасць, прапанаваць таго ці іншага святара.

§ 2. Капелан павінен цэлебраваць літургічныя дзеянні або кіраваць імі; аднак яму не дазваляецца ўмешвацца ва ўнутранае кіраванне інстытутам.

Кан. 568 – Калі гэта магчыма, павінен быць устаноўлены капелан для тых, хто па прычыне ўмоваў свайго жыцця не можа карыстацца звычайнай апекай пробашча, гэта значыць для мігрантаў, выгнаннікаў, бежанцаў, качэўнікаў, для тых, хто падарожнічае па моры.

Кан. 569 – Капеланы вайскоўцаў кіруюцца спецыяльнымі законамі.

Кан. 570 – Калі з сядзібай якой-небудзь супольнасці або групы злучаны касцёл, які не з'яўляецца парафіяльным, капеланам павінен быць рэктар гэтага касцёла, калі клопат аб супольнасці або касцёле не патрабуе іншага.

speciali delegatione conceduntur, cappellanus vi officii facultate gaudet audiendi confessiones fidelium suae curae commissorum, verbi Dei eis praedicandi, Viaticum et unctionem infirmorum administrandi necnon sacramentum confirmationis eis conferendi, qui in periculo mortis versentur.

§ 2. In valetudinariis, carceribus et itineribus maritimis, cappellanus praeterea facultatem habet, his tantum in locis exercendam, a censuris latae sententiae non reservatis neque declaratis absolvendi, firmo tamen praescripto can. 976.

Can. 567 – § 1. Ad nominationem cappellani domus instituti religiosi laicalis, Ordinarius loci ne procedat, nisi consulto Superiore, cui ius est, audita communitate, quemdam sacerdotem proponere.

§ 2. Cappellani est liturgicas functiones celebrare aut moderari; ipsi tamen non licet in regimine interno instituti sese immiscere.

Can. 568 – Pro iis qui ob vitae condicionem ordinaria parochorum cura frui non valent, uti sunt migrantes, exsules, profugi, nomades, navigantes, constituantur, quatenus fieri possit, cappellani.

Can. 569 – Cappellani militum legibus specialibus reguntur.

Can. 570 – Si communitatis aut coetus sedi adnexa est ecclesia non paroecialis, cappellanus sit rector ipsius ecclesiae, nisi cura communitatis aut ecclesiae aliud exigat.

Can. 571 – In exercitio sui pastoralis muneris, cappellanus debitam cum parocho servet coniunctionem.

Can. 572 – Quod attinet ad amotionem cappellani, servetur praescriptum can. 563.

Кан. 571 – У ажыццяўленні свайго пастырскага задання капелан павінен падтрымліваць належную сувязь з пробашчам.

Кан. 572 – Што датычыць зняцця капелана з пасады, павінны захоўвацца прадпісанні кан. 563.

PARS III

DE INSTITUTIS VITAE CONSECRATAE ET DE SOCIETATIBUS VITAE APOSTOLICAE

ЧАСТКА III

ІНСТЫТУТЫ КАНСЭКРАВАНАГА ЖЫЦЦЯ І ТАВАРЫСТВЫ АПОСТАЛЬСКАГА ЖЫЦЦЯ

SECTIO I

DE INSTITUTIS VITAE CONSECRATAE

СЕКЦЫЯ I

ІНСТЫТУТЫ КАНСЭКРАВАНАГА ЖЫЦЦЯ

TITULUS I

NORMAE COMMUNES OMNIBUS INSTITUTIS VITAE CONSECRATAE

ТЫТУЛ I

АГУЛЬНЫЯ НОРМЫ ДЛЯ ЎСІХ ІНСТЫТУТАЎ КАНСЭКРАВАНАГА ЖЫЦЦЯ

Can. 573 – § 1. Vita consecrata per consiliorum evangelicorum professionem est stabilis vivendi forma qua fideles, Christum sub actione Spiritus Sancti pressius sequentes, Deo summe dilecto totaliter dedicantur, ut, in Eius honorem atque Ecclesiae aedificationem mundique salutem novo et peculiari titulo dediti, caritatis perfectionem in servitio Regni Dei consequantur et, praeclarum in Ecclesia signum effecti, caelestem gloriam praenuntient.

Кан. 573 – § 1. Жыццё, кансэкраванае праз прыняцце евангельскіх парадаў, — гэта пастаянная форма жыцця, у якой вернікі, пад уздзеяннем Святога Духа дакладней наследуючы Хрыста, поўнасцю прысвячаюць сябе Найвышэйшаму Богу, якога любяць больш за ўсё, каб, будучы ў новай і асаблівай якасці прысвечанымі Яго праслаўленню, а таксама справе будавання Касцёла і збаўлення свету, дасягнуць дасканаласці любові ў служэнні Божаму Валадарству і, стаўшы ў Касцёле выразным знакам, абвяшчаць нябесную хвалу.

§ 2. Quam vivendi formam in institutis vitae consecratae, a competenti Ecclesiae auctoritate canonice erectis, libere assumunt christifideles, qui per vota aut alia sacra ligamina iuxta proprias institutorum leges, consilia evangelica castitatis, paupertatis et oboedientiae profitentur et per

§ 2. Гэтую форму жыцця ў інстытутах кансэкраванага жыцця, кананічна заснаваных кампетэнтнай уладай Касцёла, свабодна прымаюць вернікі, якія праз абяцанні або іншыя святыя повязі згодна з уласнымі законамі інстытутаў прымаюць евангельскія парады чыстасці, убоства і паслухмя-

насці, а праз любоў, да якой вядуць гэтыя парады, асобым чынам злучаюцца з Касцёлам і яго таямніцай.

Кан. 574 – § 1. Стан тых, хто прымае евангельскія парады ў інстытутах такога тыпу, належыць да жыцця і святасці Касцёла, таму ўсе ў Касцёле павінны яго падтрымліваць і яму спрыяць.

§ 2. Некаторыя вернікі асобым чынам пакліканы Богам да гэтага стану, каб у жыцці Касцёла карысталі з асаблівага дару і — паводле мэты і духу інстытута — садзейнічалі збаўчай місіі Касцёла.

Кан. 575 – Евангельскія парады, заснаваныя на вучэнні і прыкладзе Хрыста-Настаўніка, з'яўляюцца дарам Божым, які Касцёл прыняў ад Пана і заўсёды захоўвае, дзякуючы Яго ласцы.

Кан. 576 – Кампетэнтная ўлада Касцёла мае права інтэрпрэтаваць евангельскія парады, з дапамогай законаў кіраваць іх захоўваннем і праз кананічнае зацвярджэнне ўстанаўліваць пастаянныя формы гэтага жыцця, а таксама клапаціцца — у тым, што ад яе залежыць — аб тым, каб інстытуты развіваліся і квітнелі згодна з духам заснавальнікаў і здаровымі традыцыямі.

Кан. 577 – У Касцёле існуюць шматлікія інстытуты кансэкраванага жыцця, якія маюць розныя дары паводле ўдзеленай ім ласкі: яны дакладней наследуюць Хрыста, які або моліцца, або абвяшчае Божае Валадарства, або робіць людзям дабро, або дзеліць з імі жыццё ў свеце, але заўсёды выконвае волю Айца.

Кан. 578 – Усе павінны верна захоўваць думку і намеры заснавальнікаў, зацверджаныя кампетэнтнай касцёльнай уладай, адносна прыроды, мэты, духу і характару інстытута, а таксама яго здаровыя традыcaritatem, ad quam ducunt, Ecclesiae eiusque mysterio speciali modo coniunguntur.

Can. 574 – § 1. Status eorum, qui in huiusmodi institutis consilia evangelica profitentur, ad vitam et sanctitatem Ecclesiae pertinet, et ideo ab omnibus in Ecclesia fovendus et promovendus est.

§ 2. Ad hunc statum quidam christifideles specialiter a Deo vocantur, ut in vita Ecclesiae peculiari dono fruantur et, secundum finem et spiritum instituti, eiusdem missioni salvificae prosint.

Can. 575 – Consilia evangelica in Christi Magistri doctrina et exemplis fundata, donum sunt divinum, quod Ecclesia a Domino accepit Eiusque gratia semper conservat.

Can. 576 – Competentis Ecclesiae auctoritatis est consilia evangelica interpretari, eorundem praxim legibus moderari atque stabiles inde vivendi formas canonica approbatione constituere itemque, pro parte sua, curare ut instituta secundum spiritum fundatorum et sanas traditiones crescant et floreant.

Can. 577 – Permulta in Ecclesia sunt instituta vitae consecratae, quae donationes habent differentes secundum gratiam quae data est eis: Christum, enim, pressius sequuntur sive orantem, sive Regnum Dei annuntiantem, sive hominibus benefacientem, sive cum eis in saeculo conversantem, semper autem voluntatem Patris facientem.

Can. 578 – Fundatorum mens atque proposita a competenti auctoritate ecclesiastica sancita circa naturam, finem, spiritum et indolem instituti, necnon eius sanae traditiones, quae omnia patrimonium eiusdem insti-

tuti constituunt, ab omnibus fideliter servanda sunt.

цыі — тое, што разам складае спадчыну інстытута.

Can. 579 – Episcopi dioecesani, in suo quisque territorio, instituta vitae consecratae formali decreto valide erigere possunt, praevia licentia Sedis Apostolicae scripto data.

Кан. 579 – Дыяцэзіяльныя біскупы, кожны на сваёй тэрыторыі, могуць фармальным дэкрэтам засноўваць інстытуты кансэкраванага жыцця, калі толькі перад гэтым адбылася кансультацыя з Апостальскай Сталіцай.

Can. 580 – Aggregatio alicuius instituti vitae consecratae ad aliud reservatur competenti auctoritati instituti aggregantis, salva semper canonica autonomia instituti aggregati.

Кан. 580 – Прылучэнне аднаго інстытута кансэкраванага жыцця да другога зарэзервавана за кампетэнтнай уладай інстытута, прылучэнне да якога адбываецца, заўсёды з захаваннем кананічнай аўтаноміі інстытута, які прылучаецца.

Can. 581 – Dividere institutum in partes, quocumque nomine veniant, novas erigere, erectas coniungere vel aliter circumscribere ad competentem instituti auctoritatem pertinet, ad normam constitutionum.

Кан. 581 – Права на падзел інстытута на часткі, якую б назву яны ні атрымалі, засноўванне новых, аб'ядноўванне заснаваных або іншая іх рэарганізацыя належыць да кампетэнтнай улады інстытута, згодна з нормамі канстытуцый.

Can. 582 – Fusiones et uniones institutorum vitae consecratae uni Sedi Apostolicae reservantur; eidem quoque reservantur confoederationes et foederationes.

Кан. 582 – Права на злучэнне інстытутаў кансэкраванага жыцця і іх унію зарэзервавана выключна за Апостальскай Сталіцай; за ёй таксама зарэзервавана права на ўтварэнне канфедэрацый і федэрацый.

Can. 583 – Immutationes in institutis vitae consecratae ea afficientes, quae a Sede Apostolica approbata fuerunt, absque eiusdem licentia fieri nequeunt.

Кан. 583 – Змяненні ў інстытутах кансэкраванага жыцця, якія закранаюць тое, што было зацверджана Апостальскай Сталіцай, не могуць адбывацца без яе дазволу.

Can. 584 – Institutum supprimere ad unam Sedem Apostolicam spectat, cui etiam reservatur de eius bonis temporalibus statuere.

Кан. 584 – Толькі Апостальская Сталіца мае права ліквідаваць інстытут, за ім таксама зарэзервавана права на прыняцце рашэння адносна яго маёмасці.

Can. 585 – Instituti partes supprimere ad auctoritatem competentem eiusdem instituti pertinet.

Кан. 585 – Права ліквідаваць часткі інстытута належыць да кампетэнтнай улады гэтага інстытута.

Can. 586 – § 1. Singulis institutis iusta autonomia vitae, praesertim regiminis, agnoscitur, qua gaudeant

Кан. 586 – § 1. За кожным інстытутам прызнаецца справядлівая аўтаномія жыцця, асабліва ў тым, што датычыць кіравання,

каб такім чынам ён карыстаўся ў Касцёле ўласнай дысцыплінай і мог цалкам захоўваць сваю спадчыну, аб якой гаворыцца ў кан. 578.

§ 2. Ардынарый месца павінен захоўваць гэтую аўтаномію і аберагаць яе.

Кан. 587 – § 1. Для таго, каб больш верна захоўваць пакліканне, уласцівае кожнаму інстытуту, і яго тоеснасць, у асноўным кодэксе, іншымі словамі — у канстытуцыях кожнага інстытута, павінны быць змешчаны — апрача таго, што пастанаўляе захоўваць кан. 578, — таксама фундаментальныя нормы адносна кіравання інстытутам і дысцыпліны яго членаў, іх прыёму і станаўлення, а таксама прадмета святых абяцанняў, якія складаюцца.

§ 2. Гэты кодэкс зацвярджаецца кампетэнтнай уладай Касцёла і можа быць зменены толькі з яе згоды.

§ 3. У гэтым кодэксе павінны належным чынам спалучацца духоўныя і юрыдычныя элементы; пры гэтым колькасць нормаў не павінна памнажацца без неабходнасці.

§ 4. Іншыя нормы, пастаноўленыя кампетэнтнай уладай інстытута, павінны быць сабраны ў іншых кодэксах, пры тым, што яны могуць быць адпаведна перагледжаны і дастасаваны згодна з патрабаваннямі месца і часу.

Кан. 588 – § 1. Стан кансэкраванага жыцця па сваёй прыродзе не з'яўляецца ні духоўным, ні свецкім.

§ 2. Святарскім інстытутам называецца той, які, з увагі на мэту, іншымі словамі — намер яго заснавальніка, або на моцы легітымнай традыцыі, знаходзіцца пад кіраваннем духоўных асобаў, прымае на сябе ажыццяўленне ўлады пасвячэння і ў такой якасці прызнаны ўладай Касцёла.

in Ecclesia propria disciplina atque integrum servare valeant suum patrimonium, de quo in can. 578.

§ 2. Ordinariorum locorum est hanc autonomiam servare ac tueri.

Can. 587 – § 1. Ad propriam singulorum institutorum vocationem et identitatem fidelius tuendam, in cuiusvis instituti codice fundamentali seu constitutionibus contineri debent, praeter ea quae in can. 578 servanda statuuntur, normae fundamentales circa instituti regimen et sodalium disciplinam, membrorum incorporationem atque institutionem, necnon proprium sacrorum ligaminum obiectum.

§ 2. Codex huiusmodi a competenti auctoritate Ecclesiae approbatur et tantummodo cum eiusdem consensu mutari potest.

§ 3. In hoc codice elementa spiritualia et iuridica apte componantur; normae tamen absque necessitate ne multiplicentur.

§ 4. Ceterae normae a competenti instituti auctoritate statutae apte in aliis codicibus colligantur, quae tamen iuxta exigentias locorum et temporum congrue recognosci et aptari possunt.

Can. 588 – § 1. Status vitae consecratae, suapte natura, non est nec clericalis nec laicalis.

§ 2. Institutum clericale illud dicitur quod, ratione finis seu propositi a fundatore intenti vel vi legitimae traditionis, sub moderamine est clericorum, exercitium ordinis sacri assumit, et qua tale ab Ecclesiae auctoritate agnoscitur.

§ 3. Institutum vero laicale illud appellatur quod, ab Ecclesiae auctoritate qua tale agnitum, vi eius naturae, indolis et finis munus habet proprium, a fundatore vel legitima traditione definitum, exercitium ordinis sacri non includens.

Can. 589 – Institutum vitae consecratae dicitur iuris pontificii, si a Sede Apostolica erectum aut per eiusdem formale decretum approbatum est; iuris vero dioecesani, si ab Episcopo dioecesano erectum, approbationis decretum a Sede Apostolica non est consecutum.

Can. 590 – § 1. Instituta vitae consecratae, utpote ad Dei totiusque Ecclesiae servitium speciali modo dicata, supremae eiusdem auctoritati peculiari ratione subduntur.

§ 2. Singuli sodales Summo Pontifici, tamquam supremo eorum Superiori, etiam ratione sacri vinculi oboedientiae parere tenentur.

Can. 591 – Quo melius institutorum bono atque apostolatus necessitatibus provideatur, Summus Pontifex, ratione sui in universam Ecclesiam primatus, intuitu utilitatis communis, instituta vitae consecratae ab Ordinariorum loci regimine eximere potest sibique soli vel alii ecclesiasticae auctoritati subicere.

Can. 592 – § 1. Quo melius institutorum communio cum Sede Apostolica foveatur, modo et tempore ab eadem statutis, quilibet supremus Moderator brevem conspectum status et vitae instituti eidem Apostolicae Sedi mittat.

§ 3. Інстытутам свецкіх асобаў называецца той, які, будучы прызнаным у такой якасці ўладай Касцёла, на моцы сваёй прыроды, характару і мэты мае ўласнае заданне, акрэсленае заснавальнікам або легітымнай традыцыяй, якое не ўключае ў сябе ажыццяўленне ўлады пасвячэння.

Кан. 589 – Інстытут кансэкраванага жыцця называецца інстытутам папскага права, калі быў заснаваны Апостальскай Сталіцай або зацверджаны яе фармальным дэкрэтам; дыяцэзіяльнага права — калі быў заснаваны дыяцэзіяльным біскупам і не атрымліваў ад Апостальскай Сталіцы дэкрэта аб зацвярджэнні.

Кан. 590 – § 1. Інстытуты кансэкраванага жыцця, будучы асобым чынам прызначанымі да служэння Богу і ўсяму Касцёлу, з асаблівай прычыны падпарадкаваны яго вярхоўнай уладзе.

§ 2. Усе іх члены абавязаны падпарадкоўвацца Найвышэйшаму Пантыфіку як свайму вярхоўнаму настаяцелю, таксама на падставе святой повязі паслухмянасці.

Кан. 591 – Маючы на ўвазе большае дабро інстытутаў і ў клопаце аб забеспячэнні патрэбаў апостальства, Найвышэйшы Пантыфік, на моцы свайго прымату ў паўсюдным Касцёле, можа дзеля агульнай карысці выключаць інстытуты кансэкраванага жыцця з-пад кіравання ардынарыя месца і падначальваць іх толькі сабе або іншай касцёльнай уладзе.

Кан. 592 – § 1. З мэтай умацавання адзінства паміж інстытутамі і Апостальскай Сталіцай кожны вярхоўны кіраўнік павінен у тэрміне і ў парадку, акрэсленых Апостальскай Сталіцай, складаць ёй кароткую справаздачу аб стане і жыцці інстытута.

§ 2. Кіраўнікі кожнага інстытута павінны спрыяць веданню дакументаў Святой Сталіцы, якія датычаць даручаных ім членаў інстытута, і клапаціцца аб іх выкананні.

§ 2. Cuiuslibet instituti Moderatores promoveant notitiam documentorum Sanctae Sedis, quae sodales sibi concreditos respiciunt, eorumque observantiam curent.

Кан. 593 – Захоўваючы прадпісанне кан. 586, інстытуты папскага права падпарадкоўваюцца непасрэдна і выключна ўладзе Апостальскай Сталіцы ў тым, што датычыць унутранага кіравання і дысцыпліны.

Can. 593 – Firmo praescripto can. 586, instituta iuris pontificii quoad regimen internum et disciplinam immediate et exclusive potestati Sedis Apostolicae subiciuntur.

Кан. 594 – Інстытут дыяцэзіяльнага права знаходзіцца — захоўваючы кан. 586 — пад асаблівай апекай дыяцэзіяльнага біскупа.

Can. 594 – Institutum iuris dioecesani, firmo can. 586, permanet sub speciali cura Episcopi dioecesani.

Кан. 595 – § 1. Біскуп таго месца, дзе знаходзіцца галоўная сядзіба інстытута, мае права зацвярджаць канстытуцыі і адабраць здзейсненыя ў іх легітымна змяненні, захоўваючы, аднак, тое, да чаго прыклала руку Апостальская Сталіца, а таксама разглядаць больш важныя справы, якія датычаць усяго інстытута і выходзяць за межы паўнамоцтваў унутранай улады, параіўшыся пры гэтым з іншымі дыяцэзіяльнымі біскупамі, калі інстытут дзейнічае ў некалькіх дыяцэзіях.

Can. 595 – § 1. Episcopi sedis principis est constitutiones approbare et immutationes in eas legitime introductas confirmare, salvis iis in quibus Apostolica Sedes manus apposuerit, necnon negotia maiora totum institutum respicientia tractare, quae potestatem internae auctoritatis superent, consultis tamen ceteris Episcopis dioecesanis, si institutum ad plures dioeceses propagatum fuerit.

§ 2. У асобных выпадках дыяцэзіяльны біскуп можа ўдзяляць дыспенсацыю ад захоўвання канстытуцый.

§ 2. Episcopus dioecesanus potest dispensationes a constitutionibus concedere in casibus particularibus.

Кан. 596 – § 1. Настаяцелі інстытутаў і капітулы маюць у адносінах да іх членаў уладу, акрэсленую паўсюдным правам і канстытуцыямі.

Can. 596 – § 1. Institutorum Superiores et capitula in sodales ea gaudent potestate, quae iure universali et constitutionibus definitur.

§ 2. У святарскіх манаскіх інстытутах папскага права яны надзелены, апрача гэтага, і касцёльнай уладай кіравання як на *forum internum*, так і на *forum externum*.

§ 2. In institutis autem religiosis clericalibus iuris pontificii pollent insuper potestate ecclesiastica regiminis pro foro tam externo quam interno.

§ 3. Да ўлады, аб якой гаворыцца ў § 1, прымяняюцца прадпісанні кан. 131, 133 і 137–144.

§ 3. Potestati de qua in § 1 applicantur praescripta cann. 131, 133 et 137-144.

Кан. 597 – § 1. У інстытут кансэкраванага жыцця можа быць прыняты кожны ка-

Can. 597 – § 1. In vitae consecratae institutum admitti potest quilibet ca-

tholicus, recta intentione praeditus, qui qualitates habeat iure universali et proprio requisitas nulloque detineatur impedimento.

§ 2. Nemo admitti potest sine congrua praeparatione.

Can. 598 – § 1. Unumquodque institutum, attentis indole et finibus propriis, in suis constitutionibus definiat modum quo consilia evangelica castitatis, paupertatis et oboedientiae, pro sua vivendi ratione, servanda sunt.

§ 2. Sodales vero omnes debent non solum consilia evangelica fideliter integreque servare, sed etiam secundum ius proprium instituti vitam componere atque ita ad perfectionem sui status contendere.

Can. 599 – Evangelicum castitatis consilium propter Regnum coelorum assumptum, quod signum est mundi futuri et fons uberioris fecunditatis in indiviso corde, obligationem secumfert continentiae perfectae in caelibatu.

Can. 600 – Evangelicum consilium paupertatis ad imitationem Christi, qui propter nos egenus factus est cum esset dives, praeter vitam re et spiritu pauperem, operose in sobrietate ducendam et a terrenis divitiis alienam, secumfert dependentiam et limitationem in usu et dispositione bonorum ad normam iuris proprii singulorum institutorum.

Can. 601 – Evangelicum oboedientiae consilium, spiritu fidei et amoris in sequela Christi usque ad mortem oboedientis susceptum, obligat ad submissionem voluntatis erga legitimos Superiores, vices Dei gerentes, cum secundum proprias constitutiones praecipiunt.

толік, які кіруецца слушным намерам, мае якасці, якія патрабуюцца паўсюдным і ўласным правам, і не стрыманы ніякай перашкодай.

§ 2. Ніхто не можа быць прыняты без адпаведнай падрыхтоўкі.

Кан. 598 – § 1. Кожны інстытут, беручы пад увагу ўласцівыя яму характар і мэты, павінен у сваіх канстытуцыях акрэсліць спосаб захоўвання евангельскіх парадаў чыстасці, убоства і паслухмянасці, у адпаведнасці з яго ладам жыцця.

§ 2. Усе члены інстытута павінны не толькі верна і цалкам захоўваць евангельскія парады, але і ўзгадняць сваё жыццё з уласным правам інстытута і, такім чынам, імкнуцца да дасягнення дасканаласці свайго стану.

Кан. 599 – Евангельская парада чыстасці, прынятая дзеля Нябеснага Валадарства, якая з'яўляецца знакам будучага свету і крыніцай багатай плённасці ў непадзеленым сэрцы, нясе з сабой абавязак дасканалага ўстрымання ў цэлібаце.

Кан. 600 – Евангельская парада ўбоства ў наследаванні Хрыста, які, будучы багатым, дзеля нас стаўся ўбогім, апрача ўбогага ў рэчах і ў духу жыцця, якое праводзіцца працавіта ў цвярозасці і далёка ад зямных багаццяў, нясе з сабой таксама залежнасць і абмежаванні ва ўжыванні і распараджэнні маёмасцю, згодна з нормамі ўласнага права кожнага інстытута.

Кан. 601 – Евангельская парада паслухмянасці, прынятая ў духу веры і любові ў наследаванні Хрыста, які быў паслухмяны аж да смерці, абавязвае да падпарадкавання волі легітымным настаяцелям, якія выступаюць у якасці намеснікаў Бога, калі выдаюць загады паводле ўласных канстытуцый.

Кан. 602 – Братэрскае жыццё, уласцівае кожнаму інстытуту, праз якое ўсе яго члены ўтвараюць у Хрысце нібыта асаблівую сям'ю, павінна быць акрэслена такім чынам, каб для ўсіх служыла ўзаемнай падтрымкай у ажыццяўленні паклікання кожнага з іх. Праз братэрскае адзінства, умацаванае і заснаванае на любові, члены інстытута павінны стаць прыкладам аб'яднання ўсіх у Хрысце.

Кан. 603 – § 1. Акрамя інстытутаў кансэкраванага жыцця, Касцёл прызнае жыццё эрэмітаў, іншымі словамі — пустэльнікаў, у якім вернікі, праз больш строгае аддаленне ад свету, маўчанне ў адзіноце, палымяную малітву і пакаянне, прысвячаюць сваё жыццё на хвалу Бога і для збаўлення свету.

§ 2. Права прызнае эрэмітам таго, хто прысвяціў сябе Богу ў кансэкраваным жыцці, калі праз абяцанні ці іншыя святыя повязі ён публічна прыняў тры евангельскія парады перад дыяцэзіяльным біскупам і пад яго кіраваннем захоўвае адпаведны лад жыцця.

Кан. 604 – § 1. Да гэтых формаў кансэкраванага жыцця далучаецца стан дзеваў, якія — прыняўшы святы намер дакладней наследваць Хрыста — былі дыяцэзіяльным біскупам кансэкраваны Богу згодна з зацверджаным літургічным абрадам, каб містычна заручыцца з Хрыстом, Сынам Божым, і прысвяціць сябе служэнню Касцёлу.

§ 2. Дзевы могуць аб'ядноўвацца для больш вернага захоўвання свайго намеру і згоднага з іх станам служэння Касцёлу, якое ажыццяўляецца пры ўзаемнай падтрымцы.

§ 3. Прызнанне і заснаванне такіх аб'яднанняў у выпадку, калі яны з'яўляюцца дыяцэзіяльнымі, належыць дыяцэзіяльнаму біскупу ў межах яго тэрыторыі, а ў выпад-

Can. 602 – Vita fraterna, unicuique instituto propria, qua sodales omnes in peculiarem veluti familiam in Christo coadunantur, ita definiatur ut cunctis mutuo adiutorio evadat ad suam cuiusque vocationem adimplendam. Fraterna autem communione, in caritate radicata et fundata, sodales exemplo sint universalis in Christo reconciliationis.

Can. 603 – § 1. Praeter vitae consecratae instituta, Ecclesia agnoscit vitam eremiticam seu anachoreticam, qua christifideles arctiore a mundo secessu, solitudinis silentio, assidua prece et paenitentia, suam in laudem Dei et mundi salutem vitam devovent.

§ 2. Eremita, uti Deo deditus in vita consecrata, iure agnoscitur si tria evangelica consilia, voto vel alio sacro ligamine firmata, publice profiteatur in manu Episcopi dioecesani et propriam vivendi rationem sub ductu eiusdem servet.

Can. 604 – § 1. Hisce vitae consecratae formis accedit ordo virginum quae, sanctum propositum emittentes Christum pressius sequendi, ab Episcopo dioecesano iuxta probatum ritum liturgicum Deo consecrantur, Christo Dei Filio mystice desponsantur et Ecclesiae servitio dedicantur.

§ 2. Ad suum propositum fidelius servandum et ad servitium Ecclesiae, proprio statui consonum, mutuo adiutorio perficiendum, virgines consociari possunt.

§ 3. Has consociationes recognoscere atque erigere est, pro consociationibus dioecesanis, Episcopi dioecesani, intra fines sui territorii, et, pro

consociationibus nationalibus, Conferentiae Episcoporum, intra fines sui territorii.

Can. 605 – Novas formas vitae consecratae approbare uni Sedi Apostolicae reservatur. Episcopi dioecesani autem nova vitae consecratae dona a Spiritu Sancto Ecclesiae concredita discernere satagant iidemque adiuvent promotores ut proposita meliore quo fieri potest modo exprimant aptisque statutis protegant, adhibitis praesertim generalibus normis in hac parte contentis.

Can. 606 – Quae de institutis vitae consecratae eorumque sodalibus statuuntur, pari iure de utroque sexu valent, nisi ex contextu sermonis vel ex rei natura aliud constet.

ку, калі яны з'яўляюцца нацыянальнымі — Канферэнцыі Біскупаў у межах яе тэрыторыі.

Кан. 605 – Права на зацвярджэнне новых формаў кансэкраванага жыцця зарэзервавана толькі за Апостальскай Сталіцай. Дыяцэзіяльныя біскупы павінны імкнуцца распазнаваць новыя дары кансэкраванага жыцця, якія Дух Святы давярае Касцёлу, і дапамагаць іх заснавальнікам, каб яны маглі як мага лепш выразіць свае намеры і забяспечыць іх адпаведнымі статутамі, карыстаючыся перадусім агульнымі нормамі, якія знаходзяцца ў гэтай частцы.

Кан. 606 – Тое, што пастаноўлена адносна інстытутаў кансэкраванага жыцця і іх членаў, аднолькавым чынам мае моц у адносінах да абодвух палоў, калі з кантэксту або сутнасці рэчаў не вынікае іншае.

TITULUS II
DE INSTITUTIS RELIGIOSIS

Can. 607 – § 1. Vita religiosa, utpote totius personae consecratio, mirabile in Ecclesia manifestat conubium a Deo conditum, futuri saeculi signum. Ita religiosus plenam suam consummat donationem veluti sacrificium Deo oblatum, quo tota ipsius exsistentia fit continuus Dei cultus in caritate.

§ 2. Institutum religiosum est societas in qua sodales secundum ius proprium vota publica perpetua vel temporaria, elapso tamen tempore renovanda, nuncupant atque vitam fraternam in communi ducunt.

§ 3. Testimonium publicum a religiosis Christo et Ecclesiae reddendum illam secumfert a mundo separationem, quae indoli et fini uniuscuiusque instituti est propria.

ТЫТУЛ II
МАНАСКІЯ ІНСТЫТУТЫ

Кан. 607 – § 1. Манаскае жыццё, будучы кансэкрацыяй усёй чалавечай асобы, з'яўляецца ў Касцёле аб'яўленнем цудоўнага сужэнства, заключанага Богам, якое ёсць знакам будучага веку. У ім манаская асоба поўнасцю складае саму сябе ў дар, як ахвяру Богу, праз якую ўсё яе існаванне становіцца пастаянным культам Бога ў любові.

§ 2. Манаскі інстытут — гэта супольнасць, члены якой паводле ўласнага права складаюць публічныя абяцанні — вечныя або часовыя, якія, аднак, павінны быць адноўлены пасля заканчэння іх тэрміну, і вядуць братэрскае жыццё ў супольнасці.

§ 3. Публічнае сведчанне, якое манаскія асобы павінны даваць Хрысту і Касцёлу, нясе з сабой аддзяленне ад свету, уласцівае характару і мэце кожнага інстытута.

Раздзел I

Манаскія дамы,
іх заснаванне і ліквідацыя

Кан. 608 – Манаская супольнасць павінна пражываць у легітымна заснаваным доме пад уладай настаяцеля, прызначанага згодна з нормамі права; у кожным доме павінен быць прынамсі араторый, дзе павінна цэлебравацца і захоўвацца Эўхарыстыя, каб гэтае месца было сапраўдным цэнтрам супольнасці.

Кан. 609 – § 1. Дамы манаскай супольнасці павінны быць заснаваны кампетэнтнай уладай паводле канстытуцый пасля атрымання згоды дыяцэзіяльнага біскупа, дадзенай пісьмова.

§ 2. Для заснавання кляштара манахінь патрабуецца, акрамя таго, дазвол Апостальскай Сталіцы.

Кан. 610 – § 1. Пры заснаванні дамоў трэба браць пад увагу карысць Касцёла і інстытута, а таксама забяспечыць тое, што патрэбна для належнага вядзення манаскага жыцця членамі інстытута, адпаведна ўласцівым мэтам і духу інстытута.

§ 2. Дом не павінен быць заснаваны, калі не будзе магчымым разумнае суджэнне аб тым, што патрэбы членаў інстытута будуць задаволены адпаведным чынам.

Кан. 611 – Згода дыяцэзіяльнага біскупа на заснаванне манаскага дома якога-небудзь інстытута змяшчае ў сабе права:

1° на вядзенне жыцця паводле характару і мэтаў, уласцівых інстытуту;

2° на ажыццяўленне, згодна з нормамі права, дзейнасці, уласцівай інстытуту, захоўваючы ўмовы, далучаныя да згоды;

3° для святарскіх інстытутаў — мець касцёл, захоўваючы прадпісанне кан. 1215 § 3, і ажыццяўляць святыя

Caput I

De domibus religiosis earumque erectione et suppressione

Can. 608 – Communitas religiosa habitare debet in domo legitime constituta sub auctoritate Superioris ad normam iuris designati; singulae domus habeant saltem oratorium, in quo Eucharistia celebretur et asservetur ut vere sit centrum communitatis.

Can. 609 – § 1. Instituti religiosi domus eriguntur ab auctoritate competenti iuxta constitutiones, praevio Episcopi dioecesani consensu in scriptis dato.

§ 2. Ad erigendum monasterium monialium requiritur insuper licentia Apostolicae Sedis.

Can. 610 – § 1. Domorum erectio fit prae oculis habita utilitate Ecclesiae et instituti atque in tuto positis iis quae ad vitam religiosam sodalium rite agendam requiruntur, iuxta proprios instituti fines et spiritum.

§ 2. Nulla domus erigatur nisi iudicari prudenter possit fore ut congrue sodalium necessitatibus provideatur.

Can. 611 – Consensus Episcopi dioecesani ad erigendam domum religiosam alicuius instituti secumfert ius:

1° vitam ducendi secundum indolem et fines proprios instituti;

2° opera instituto propria exercendi ad normam iuris, salvis condicionibus in consensu appositis;

3° pro institutis clericalibus habendi ecclesiam, salvo praescripto can. 1215, § 3, et sacra ministeria

peragendi, servatis de iure servandis.

Can. 612 – Ut domus religiosa ad opera apostolica destinetur diversa ab illis pro quibus constituta est, requiritur consensus Episcopi dioecesani; non vero, si agatur de conversione, quae, salvis fundationis legibus, ad internum regimen et disciplinam dumtaxat referatur.

Can. 613 – § 1. Domus religiosa canonicorum regularium et monachorum sub proprii Moderatoris regimine et cura sui iuris est, nisi constitutiones aliter ferant.

§ 2. Moderator domus sui iuris est de iure Superior maior.

Can. 614 – Monasteria monialium cuidam virorum instituto consociata propriam vitae rationem et regimen iuxta constitutiones obtinent. Mutua iura et obligationes ita definiantur ut ex consociatione spirituale bonum proficere possit.

Can. 615 – Monasterium sui iuris, quod praeter proprium Moderatorem alium Superiorem maiorem non habet, neque alicui religiosorum instituto ita consociatum est ut eiusdem Superior vera potestate constitutionibus determinata in tale monasterium gaudeat, ad normam iuris peculiari vigilantiae Episcopi dioecesani committitur.

Can. 616 – § 1. Domus religiosa legitime erecta supprimi potest a supremo Moderatore ad normam constitutionum, consulto Episcopo dioecesano. De bonis domus suppressae provideat ius proprium instituti, salvis fundapаслугі, захоўваючы тое, што павінна быць захавана згодна з правам.

Кан. 612 – Для таго, каб манаскі дом мог быць прызначаны для выконвання апостальскіх спраў, якія адрозніваюцца ад тых, дзеля якіх ён быў заснаваны, патрабуецца згода дыяцэзіяльнага біскупа; аднак, яна не патрабуецца, калі гаворка ідзе аб такой рэарганізацыі, якая, захоўваючы ўстаноўчыя законы, адносіцца толькі да ўнутранага кіравання і дысцыпліны.

Кан. 613 – § 1. Манаскі дом рэгулярных канонікаў і манахаў пад кіраваннем і апекай уласнага кіраўніка з'яўляецца домам *sui iuris*, калі канстытуцыі не пастанаўляюць іншае.

§ 2. Кіраўнік дома *sui iuris* з'яўляецца згодна з правам вышэйшым настаяцелем.

Кан. 614 – Кляштары манахінь, далучаныя да якога-небудзь мужчынскага інстытута, захоўваюць уласны лад жыцця і кіраванне згодна з канстытуцыямі. Узаемныя правы і абавязкі павінны быць акрэслены такім чынам, каб гэтае далучэнне магло спрыяць духоўнаму дабру.

Кан. 615 – Кляштар *sui iuris*, які не мае іншага вышэйшага настаяцеля, акрамя ўласнага кіраўніка, і не далучаны да якога-небудзь манаскага інстытута такім чынам, каб яго настаяцель меў у адносінах да гэтага кляштара сапраўдную ўладу, акрэсленую канстытуцыямі, даручаецца нагляду дыяцэзіяльнага біскупа, згодна з нормамі асаблівага права.

Кан. 616 – § 1. Легітымна заснаваны манаскі дом можа быць ліквідаваны вярхоўным кіраўніком згодна з нормамі канстытуцый пасля кансультацыі з дыяцэзіяльным біскупам. Уласнае права інстытута павінна вызначаць лёс маёмасці ліквідаванага

дома, захоўваючы волю заснавальнікаў або ахвярадаўцаў, а таксама легітымна набытыя правы.

§ 2. Права на ліквідацыю адзінага дома інстытута належыць Святой Сталіцы, за якой таксама ў такім выпадку зарэзервавана прыняцце рашэння адносна маёмасці.

§ 3. Ліквідаваць дом *sui iuris*, аб якім гаворыцца ў кан. 613, мае права Генеральны Капітул, калі канстытуцыі не пастанаўляюць іншае.

§ 4. Права на ліквідацыю кляштара манахінь *sui iuris* належыць Апостальскай Сталіцы, захоўваючы змешчаныя ў канстытуцыях прадпісанні, якія датычаць маёмасці.

torum vel offerentium voluntatibus et iuribus legitime quaesitis.

§ 2. Suppressio unicae domus instituti ad Sanctam Sedem pertinet, cui etiam reservatur de bonis in casu statuere.

§ 3. Supprimere domum sui iuris, de qua in can. 613, est capituli generalis, nisi constitutiones aliter ferant.

§ 4. Monialium monasterium sui iuris supprimere ad Sedem Apostolicam pertinet, servatis ad bona quod attinet praescriptis constitutionum.

Раздзел II
Кіраванне інстытутамі

Артыкул 1. *Настаяцелі і рады*

Кан. 617 – Настаяцелі павінны выконваць сваё заданне і ажыццяўляць сваю ўладу згодна з нормамі паўсюднага і ўласнага права.

Кан. 618 – Сваю ўладу, атрыманую ад Бога праз паслугу Касцёла, настаяцелі павінны ажыццяўляць у духу служэння. Таму яны павінны быць паслухмяныя Божай волі ў выкананні сваіх заданняў, кіраваць падуладнымі як дзецьмі Божымі і, маючы пашану да чалавечай асобы, заахвочваць іх да дабравольнай паслухмянасці. Павінны таксама ахвотна іх выслухоўваць і спрыяць іх супольнай скіраванасці да дабра інстытута і Касцёла; пры гэтым захоўваецца нязменнай іх улада прыняцця рашэнняў і вызначэння таго, што павінна быць выканана.

Кан. 619 – Настаяцелі павінны старанна выконваць сваю пасаду і разам з даручанымі ім членамі інстытута імкнуцца да бу-

Caput II
De institutorum regimine

Art. 1. *De superioribus et consiliis*

Can. 617 – Superiores suum munus adimpleant suamque potestatem exerceant ad normam iuris universalis et proprii.

Can. 618 – Superiores in spiritu servitii suam potestatem a Deo per ministerium Ecclesiae receptam exerceant. Voluntati igitur Dei in munere explendo dociles, ipsi subditos regant uti filios Dei, ac promoventes cum reverentia personae humanae illorum voluntariam oboedientiam, libenter eos audiant necnon eorum conspirationem in bonum instituti et Ecclesiae foveant, firma tamen ipsorum auctoritate decernendi et praecipiendi quae agenda sunt.

Can. 619 – Superiores suo officio sedulo incumbant et una cum sodalibus sibi commissis studeant aedificare

fraternam in Christo communitatem, in qua Deus ante omnia quaeratur et diligatur. Ipsi igitur nutriant sodales frequenti verbi Dei pabulo eosque adducant ad sacrae liturgiae celebrationem. Eis exemplo sint in virtutibus colendis et in observantia legum et traditionum proprii instituti; eorum necessitatibus personalibus convenienter subveniant, infirmos sollicite curent ac visitent, corripiant inquietos, consolentur pusillanimes, patientes sint erga omnes.

Can. 620 – Superiores maiores sunt, qui totum regunt institutum, vel eius provinciam, vel partem eidem aequiparatam, vel domum sui iuris, itemque eorum vicarii. His accedunt Abbas Primas et Superior congregationis monasticae, qui tamen non habent omnem potestatem, quam ius universale Superioribus maioribus tribuit.

Can. 621 – Plurium domorum coniunctio quae sub eodem Superiore partem immediatam eiusdem instituti constituat et ab auctoritate legitima canonice erecta sit, nomine venit provinciae.

Can. 622 – Supremus Moderator potestatem obtinet in omnes instituti provincias, domos et sodales, exercendam secundum ius proprium; ceteri Superiores ea gaudent intra fines sui muneris.

Can. 623 – Ut sodales ad munus Superioris valide nominentur aut eligantur, requiritur congruum tempus post professionem perpetuam vel definitivam, a iure proprio vel, si agatur de Superioribus maioribus, a constitutionibus determinandum.

давання братэрскай супольнасці ў Хрысце, у якой трэба перадусім шукаць і любіць Бога. Таму яны павінны часта сілкаваць членаў інстытута Божым словам і заахвочваць іх да цэлебрацыі святой літургіі. Настаяцелі павінны быць для іх прыкладам у развіцці цнотаў і захоўванні законаў і традыцый свайго інстытута; яны павінны адпаведным чынам забяспечваць іх асабістыя патрэбы, клапатліва апекавацца хворымі і іх наведваць, утаймоўваць неспакойных, падбадзёрваць маладушных і быць да ўсіх цярплівымі.

Кан. 620 – Вышэйшымі з'яўляюцца тыя настаяцелі, якія кіруюць усім інстытутам, або яго правінцыяй ці прыраўнаванай да яе часткай, або домам *sui iuris*, а таксама іх намеснікі. Акрамя таго, да іх лічбы належаць абат прымас і настаяцель манаскай кангрэгацыі, якія, аднак, не маюць усёй улады, якой у паўсюдным праве надзелены вышэйшыя настаяцелі.

Кан. 621 – Правінцыяй называецца аб'яднанне некалькіх дамоў пад кіраваннем іх настаяцеля, якое з'яўляецца непасрэднай часткай акрэсленага інстытута і было кананічна заснавана легітымнай уладай.

Кан. 622 – Вярхоўны кіраўнік мае ўладу над усімі правінцыямі, дамамі і членамі інстытута, якую ажыццяўляе паводле ўласнага права; іншыя настаяцелі маюць уладу ў межах свайго задання.

Кан. 623 – Для таго, каб члены інстытута маглі быць дзейсна прызначаны або выбраны для выконвання задання настаяцеля, патрабуецца, каб прайшоў адпаведны час пасля складання імі вечных або канчатковых абяцанняў, працягласць якога акрэсліваецца ўласным правам або — калі гаворка ідзе пра вышэйшых настаяцеляў — канстытуцыямі.

Кан. 624 – § 1. Настаяцелі павінны быць устаноўлены на акрэслены і належны тэрмін адпаведна прыродзе і патрэбам інстытута, калі — у адносінах да вярхоўнага кіраўніка і настаяцеля дома *sui iuris* — канстытуцыі не пастанаўляюць іншае.

§ 2. Уласнае права павінна праз адпаведныя нормы прадугледжваць, каб настаяцелі, якія ўстанаўліваюцца на акрэслены тэрмін, не займалі кіруючай пасады бесперапынна на працягу доўгага часу.

§ 3. Аднак яны могуць быць зняты з пасады ў час выконвання задання або перамешчаны на іншую пасаду па прычынах, устаноўленых уласным правам.

Can. 624 – § 1. Superiores ad certum et conveniens temporis spatium iuxta naturam et necessitatem instituti constituantur, nisi pro supremo Moderatore et pro Superioribus domus sui iuris constitutiones aliter ferant.

§ 2. Ius proprium aptis normis provideat, ne Superiores, ad tempus definitum constituti, diutius sine intermissione in regiminis officiis versentur.

§ 3. Possunt tamen durante munere ab officio amoveri vel in aliud transferri ob causas iure proprio statutas.

Кан. 625 – § 1. Вярхоўны кіраўнік інстытута павінен быць вызначаны праз кананічны выбар, згодна з нормамі канстытуцый.

§ 2. Выбары настаяцеля кляштара *sui iuris*, аб якім гаворыцца ў кан. 615, і вярхоўнага кіраўніка інстытута дыяцэзіяльнага права ўзначальвае біскуп месца, дзе знаходзіцца галоўная сядзіба.

§ 3. Іншыя настаяцелі павінны быць устаноўлены згодна з нормамі канстытуцый; аднак такім чынам, каб у выпадку, калі іх выбіраюць, ім было патрэбна адабрэнне кампетэнтнага вышэйшага настаяцеля; калі ж іх прызначае настаяцель, перад гэтым павінна адбыцца адпаведная кансультацыя.

Can. 625 – § 1. Supremus instituti Moderator electione canonica designetur ad normam constitutionum.

§ 2. Electionibus Superioris monasterii sui iuris, de quo in can. 615, et supremi Moderatoris instituti iuris dioecesani praeest Episcopus sedis principis.

§ 3. Ceteri Superiores ad normam constitutionum constituantur; ita tamen ut, si eligantur, confirmatione Superioris maioris competentis indigeant; si vero a Superiore nominentur, apta consultatio praecedat.

Кан. 626 – Калі настаяцелі здзяйсняюць прызначэнне на пасады, а члены інстытута ўдзельнічаюць у выбарах, яны павінны пры гэтым захоўваць нормы паўсюднага і ўласнага права, устрымлівацца ад любых злоўжыванняў і асабістых пераваг. Не маючы на ўвазе нічога іншага, апрача Бога і дабра інстытута, павінны прызначаць або выбіраць тых, каго перад Панам ведаюць як сапраўды годных і прыдатных. Акрамя

Can. 626 – Superiores in collatione officiorum et sodales in electionibus normas iuris universalis et proprii servent, abstineant a quovis abusu et acceptione personarum, et, nihil praeter Deum et bonum instituti prae oculis habentes, nominent aut eligant quos in Domino vere dignos et aptos sciant. Caveant praeterea in electionibus a suffragiorum procuratione sive

directe sive indirecte, tam pro seipsis quam pro aliis.

Can. 627 – § 1. Ad normam constitutionum, Superiores proprium habeant consilium, cuius opera in munere exercendo utantur oportet.

§ 2. Praeter casus in iure universali praescriptos, ius proprium determinet casus in quibus consensus vel consilium ad valide agendum requiratur ad normam can. 127 exquirendum.

Can. 628 – § 1. Superiores qui iure proprio instituti ad hoc munus designantur, statis temporibus domos et sodales sibi commissos iuxta normas eiusdem iuris proprii visitent.

§ 2. Episcopi dioecesani ius et officium est visitare etiam quoad disciplinam religiosam:

1° monasteria sui iuris de quibus in can. 615;

2° singulas domos instituti iuris dioecesani in proprio territorio sitas.

§ 3. Sodales fiducialiter agant cum visitatore, cui legitime interroganti respondere tenentur secundum veritatem in caritate; nemini vero fas est quoquo modo sodales ab hac obligatione avertere, aut visitationis scopum aliter impedire.

Can. 629 – In sua quisque domo Superiores commorentur, nec ab eadem discedant, nisi ad normam iuris proprii.

Can. 630 – § 1. Superiores sodalibus debitam agnoscant libertatem circa

гэтага, пры выбарах яны павінны пазбягаць непасрэднага ці апасродкаванага набыцця галасоў як для сябе, так і для іншых.

Кан. 627 – § 1. Згодна з нормамі канстытуцый настаяцелі павінны мець уласную Раду і карыстацца яе дапамогай у выкананні свайго задання.

§ 2. Апрача выпадкаў, прадугледжаных у паўсюдным праве, уласнае права павінна акрэсліць выпадкі, у якіх для дзейснасці дзеянняў патрабуецца згода або парада, згодна з нормай кан. 127.

Кан. 628 – § 1. Настаяцелі, вызначаныя да гэтага задання ўласным правам інстытута, павінны ў акрэсленым тэрміне здзяйсняць візітацыю даручаных ім дамоў і членаў інстытута паводле нормаў таго ж уласнага права.

§ 2. Дыяцэзіяльны біскуп мае права і абавязак здзяйсняць візітацыю, таксама ў тым, што датычыць манаскай дысцыпліны:

1° кляштараў *sui iuris*, аб якіх гаворыцца ў кан. 615;

2° кожнага з дамоў інстытута дыяцэзіяльнага права, якія знаходзяцца на яго тэрыторыі.

§ 3. Члены інстытута павінны адносіцца з даверам да таго, хто здзяйсняе візітацыю, адказваць на легітымна пастаўленыя пытанні паводле праўды ў любові; пры гэтым нікому нельга якім-небудзь чынам утрымліваць членаў інстытута ад гэтага абавязку або іншым спосабам перашкаджаць дасягненню мэты візітацыі.

Кан. 629 – Настаяцелі павінны пражываць кожны ў сваім доме і не павінны яго пакідаць, калі не згодна з нормамі ўласнага права.

Кан. 630 – § 1. Настаяцелі павінны прызнаваць за членамі інстытута свабоду адносна

сакрамэнту пакаяння і духоўнага кіраўніцтва, захоўваючы пры гэтым дысцыпліну інстытута.

§ 2. Настаяцелі павінны згодна з нормамі ўласнага права клапаціцца аб тым, каб члены інстытута мелі на выбар адпаведных спаведнікаў, у якіх можна было б часта спавядацца.

§ 3. У кляштарах манахінь, фармацыйных дамах і вялікіх супольнасцях свецкіх асобаў павінны быць звычайныя спаведнікі, зацверджаныя ардынарыем месца па ўзгадненні з супольнасцю, аднак без налажэння абавязку карыстання з іх паслугі.

§ 4. Настаяцелі не павінны спавядаць сваіх падуладных, калі члены інстытута самі дабравольна не папросяць аб гэтым.

§ 5. Члены інстытутаў павінны з даверам звяртацца да настаяцеляў, якім могуць свабодна і дабравольна адкрыць сваю душу. Аднак настаяцелям забараняецца любым чынам схіляць членаў інстытута да адкрывання перад імі свайго сумлення.

paenitentiae sacramentum et conscientiae moderamen, salva tamen instituti disciplina.

§ 2. Solliciti sint Superiores ad normam iuris proprii, ut sodalibus idonei confessarii praesto sint, apud quos frequenter confiteri possint.

§ 3. In monasteriis monialium, in domibus formationis et in communitatibus numerosioribus laicalibus habeantur confessarii ordinarii ab Ordinario loci probati, collatis consiliis cum communitate, nulla tamen facta obligatione ad illos accedendi.

§ 4. Subditorum confessiones Superiores ne audiant, nisi sponte sua sodales id petant.

§ 5. Sodales cum fiducia Superiores adeant, quibus animum suum libere ac sponte aperire possunt. Vetantur autem Superiores eos quoquo modo inducere ad conscientiae manifestationem sibi peragendam.

Артыкул 2. *Капітулы*

Кан. 631 – § 1. Генеральны Капітул, які згодна з нормамі канстытуцый мае вярхоўную ўладу ў інстытуце, павінен быць утвораны такім чынам, каб, прадстаўляючы ўвесь інстытут, быў сапраўдным знакам яго адзінства ў любові. Яго галоўным прызначэннем з'яўляецца зберажэнне спадчыны інстытута, аб якой гаворыцца ў кан. 578, і спрыянне прыстасаванаму абнаўленню, адпаведнаму гэтай спадчыне, выбар вярхоўнага кіраўніка, разгляд больш важных спраў і выдаванне нормаў, якім усе павінны падпарадкоўвацца.

§ 2. У канстытуцыях павінен быць вызначаны склад Капітула і аб'ём улады; уласнае права павінна больш падрабязна акрэс-

Art. 2. *De capitulis*

Can. 631 – § 1. Capitulum generale, quod supremam auctoritatem ad normam constitutionum in instituto obtinet, ita efformetur ut totum institutum repraesentans, verum signum eiusdem unitatis in caritate evadat. Eius praecipue est: patrimonium instituti, de quo in can. 578, tueri et accommodatam renovationem iuxta ipsum promovere, Moderatorem supremum eligere, maiora negotia tractare, necnon normas edicere, quibus omnes parere tenentur.

§ 2. Compositio et ambitus potestatis capituli definiantur in constitutionibus; ius proprium ulterius determinet

ordinem servandum in celebratione capituli, praesertim quod ad electiones et rerum agendarum rationes attinet.

§ 3. Iuxta normas in iure proprio determinatas, non modo provinciae et communitates locales, sed etiam quilibet sodalis optata sua et suggestiones capitulo generali libere mittere potest.

ліць парадак, які трэба захоўваць пры правядзенні Капітула, перадусім у тым, што датычыць выбараў і парадку разгляду спраў.

§ 3. У адпаведнасці з нормамі, акрэсленымі ва ўласным праве, не толькі правінцыі і мясцовыя супольнасці, але таксама кожны член інстытута можа свабодна пераслаць Генеральнаму Капітулу свае пажаданні і прапановы.

Can. 632 – Ius proprium accurate determinet quae pertineant ad alia instituti capitula et ad alias similes coadunationes, nempe ad eorum naturam, auctoritatem, compositionem, modum procedendi et tempus celebrationis.

Кан. 632 – Уласнае права павінна дакладна акрэсліваць тое, што датычыць іншых капітулаў інстытута і другіх падобных сходаў, а менавіта іх прыроду, уладу, склад, парадак дзеянняў і час правядзення.

Can. 633 – § 1. Organa participationis vel consultationis munus sibi commissum fideliter expleant ad normam iuris universalis et proprii, eademque suo modo curam et participationem omnium sodalium pro bono totius instituti vel communitatis exprimant.

Кан. 633 – § 1. Дапаможныя або кансультатыўныя органы павінны верна выконваць даручанае ім заданне згодна з нормамі паўсюднага і ўласнага права і ўласцівым для іх спосабам выражаць клопат і ўдзел усіх членаў інстытута, скіраваныя на дабро ўсяго інстытута ці супольнасці.

§ 2. In his mediis participationis et consultationis instituendis et adhibendis sapiens servetur discretio, atque modus eorum agendi indoli et fini instituti sit conformis.

§ 2. Пры заснаванні і ў дзейнасці гэтых дапаможных і кансультатыўных органаў павінна быць захавана мудрая абачлівасць, а спосаб іх дзеяння павінен быць згодны з характарам і мэтай інстытута.

Art. 3. *De bonis temporalibus eorumque administratione*

Артыкул 3. *Маёмасць і адміністраванне ёю*

Can. 634 – § 1. Instituta, provinciae et domus, utpote personae iuridicae ipso iure, capaces sunt acquirendi, possidendi, administrandi et alienandi bona temporalia, nisi haec capacitas in constitutionibus excludatur vel coarctetur.

Кан. 634 – § 1. Інстытуты, правінцыі і дамы, якія на моцы самога права з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, маюць здольнасць да набывання маёмасці, валодання ёю, адміністравання і адчужэння яе, калі гэтая здольнасць не выключана або не абмежавана ў канстытуцыях.

§ 2. Vitent tamen quamlibet speciem luxus, immoderati lucri et bonorum cumulationis.

§ 2. Пры гэтым яны павінны пазбягаць любога праяўлення раскошы, неўмеркаванай нажывы і назапашвання маёмасці.

Кан. 635 – § 1. Маёмасць манаскіх інстытутаў, якая з'яўляецца касцёльнай, кіруецца прадпісаннямі Кнігі V «Маёмасць Касцёла», калі выразна не прадугледжана іншае.

§ 2. Пры гэтым кожны інстытут павінен устанавіць адпаведныя нормы адносна карыстання і адміністравання маёмасцю, якія павінны спрыяць уласціваму яму ўбоству, сцераглі яго і служылі яму выразам.

Кан. 636 – § 1. У кожным інстытуце, а таксама ў кожнай правінцыі, якая кіруецца вышэйшым настаяцелем, павінен быць эканом, адрозны ад вышэйшага настаяцеля і ўстаноўлены згодна з нормамі ўласнага права, які пад кіраваннем адпаведнага настаяцеля павінен ажыццяўляць адміністраванне маёмасцю. Таксама ў мясцовых супольнасцях, калі гэта магчыма, павінен быць устаноўлены эканом, адрозны ад настаяцеля.

§ 2. У тэрміне і ў парадку, акрэсленых уласным правам, эканом і іншыя адміністратары павінны скласці кампетэнтнай уладзе справаздачу аб выкананым адміністраванні.

Кан. 637 – Кляштары *sui iuris*, аб якіх гаворыцца ў кан. 615, павінны раз на год складаць ардынарыю месца справаздачу аб адміністраванні маёмасцю; апрача гэтага, ардынарый месца мае права ведаць эканамічныя справы манаскага дома дыяцэзіяльнага права.

Кан. 638 – § 1. Застаючыся ў межах паўсюднага права, уласнае права павінна акрэсліваць, якія дзеянні выходзяць за межы мэты і парадку звычайнага адміністравання маёмасцю, а таксама ўстанаўліваць умовы, неабходныя для таго, каб дзеянне, якое адносіцца да надзвычайнага адміністравання маёмасцю, было дзейсным.

Can. 635 – § 1. Bona temporalia institutorum religiosorum, utpote ecclesiastica, reguntur praescriptis Libri V *De bonis Ecclesiae temporalibus*, nisi aliud expresse caveatur.

§ 2. Quodlibet tamen institutum aptas normas statuat de usu et administratione bonorum, quibus paupertas sibi propria foveatur, defendatur et exprimatur.

Can. 636 – § 1. In quolibet instituto et similiter in qualibet provincia quae a Superiore maiore regitur, habeatur oeconomus, a Superiore maiore distinctus et ad normam iuris proprii constitutus, qui administrationem bonorum gerat sub directione respectivi Superioris. Etiam in communitatibus localibus instituatur, quantum fieri potest, oeconomus a Superiore locali distinctus.

§ 2. Tempore et modo iure proprio statutis, oeconomi et alii administratores auctoritati competenti peractae administrationis rationem reddant.

Can. 637 – Monasteria sui iuris, de quibus in can. 615, Ordinario loci rationem administrationis reddere debent semel in anno; loci Ordinario insuper ius esto cognoscendi de rationibus oeconomicis domus religiosae iuris dioecesani.

Can. 638 – § 1. Ad ius proprium pertinet, intra ambitum iuris universalis, determinare actus qui finem et modum ordinariae administrationis excedant, atque ea statuere quae ad valide ponendum actum extraordinariae administrationis necessaria sunt.

§ 2. Expensas et actus iuridicos ordinariae administrationis valide, praeter Superiores, faciunt, intra fines sui muneris, officiales quoque, qui in iure proprio ad hoc designantur.

§ 3. Ad validitatem alienationis et cuiuslibet negotii in quo condicio patrimonialis personae iuridicae peior fieri potest, requiritur licentia in scripto data Superioris competentis cum consensu sui consilii. Si tamen agatur de negotio quod summam a Sancta Sede pro cuiusque regione definitam superet, itemque de rebus ex voto Ecclesiae donatis aut de rebus pretiosis artis vel historiae causa, requiritur insuper ipsius Sanctae Sedis licentia.

§ 4. Pro monasteriis sui iuris, de quibus in can. 615, et institutis iuris dioecesani accedat necesse est consensus Ordinarii loci in scriptis praestitus.

Can. 639 – § 1. Si persona iuridica debita et obligationes contraxerit etiam cum Superiorum licentia, ipsa tenetur de eisdem respondere.

§ 2. Si sodalis cum licentia Superioris contraxerit de suis bonis, ipse respondere debet, si vero de mandato Superioris negotium instituti gesserit, institutum respondere debet.

§ 3. Si contraxerit religiosus sine ulla Superiorum licentia, ipse respondere debet, non autem persona iuridica.

§ 4. Firmum tamen esto, contra eum, in cuius rem aliquid ex inito contractu versum est, semper posse actionem institui.

§ 2. Апрача настаяцеляў, таксама афіцыйныя асобы, якія былі вызначаны для гэтага ва ўласным праве, у межах сваіх заданняў дзейсна здзяйсняюць выдаткі і юрыдычныя дзеянні, якія адносяцца да звычайнага адміністравання маёмасцю.

§ 3. Для дзейснасці адчужэння і любой здзелкі, якія могуць прывесці да пагаршэння маёмаснага становішча юрыдычнай асобы, патрабуецца пісьмовы дазвол кампетэнтнага настаяцеля, выдадзены са згоды яго Рады. Аднак, калі гаворка ідзе пра здзелку, сума якой перавышае межы, устаноўленыя Святой Сталіцай для кожнага рэгіёна, а таксама пра рэчы, ахвяраваныя Касцёлу на моцы абяцання, або прадметы, якія маюць мастацкую або гістарычную каштоўнасць, патрабуецца, акрамя гэтага, дазвол самой Святой Сталіцы.

§ 4. Што датычыць кляштараў *sui iuris*, аб якіх гаворыцца ў кан. 615, а таксама інстытутаў дыяцэзіяльнага права, неабходна згода ардынарыя месца, дадзеная пісьмова.

Кан. 639 – § 1. Калі юрыдычная асоба ўваходзіць у пазыкі і прымае абавязацельствы, нават з дазволу настаяцеля, адказваць па іх абавязана сама гэтая асоба.

§ 2. Калі член інстытута з дазволу настаяцеля заключае дагавор, які датычыць яго маёмасці, ён сам павінен па ім адказваць; калі ж ён з упаўнаважання настаяцеля вёў справы інстытута, адказваць павінен інстытут.

§ 3. Калі манаская асоба заключыла дагавор без якога-небудзь дазволу настаяцеляў, адказваць павінна яна сама, а не юрыдычная асоба.

§ 4. Аднак пры гэтым заўсёды можна звяртацца з позвай супраць таго, хто дзякуючы заключанаму дагавору атрымаў якую-небудзь выгаду.

§ 5. Манаскія настаяцелі, праяўляючы асцярожнасць, не павінны даваць дазвол на прыняцце пазыковых абавязацельстваў, калі няма ўпэўненасці ў тым, што са звычайных даходаў могуць быць выплачаны працэнты па пазыцы, а асноўная сума можа быць вернута на працягу не вельмі доўгага часу праз легітымнае пагашэнне.

Кан. 640 – Улічваючы мясцовыя абставіны, інстытуты павінны імкнуцца даваць своеасаблівае супольнае сведчанне любові і ўбоства і па меры сваіх сіл рабіць унёсак з уласнай маёмасці, прыходзячы на дапамогу Касцёлу ў яго патрэбах і падтрымліваючы патрабуючых.

§ 5. Caveant Superiores religiosi ne debita contrahenda permittant, nisi certo constet ex consuetis reditibus posse debiti foenus solvi et intra tempus non nimis longum per legitimam amortizationem reddi summam capitalem.

Can. 640 – Instituta, ratione habita singulorum locorum, testimonium caritatis et paupertatis quasi collectivum reddere satagant et pro viribus ex propriis bonis aliquid conferant ad Ecclesiae necessitatibus et egenorum sustentationi subveniendum.

Раздзел III
Прыём кандыдатаў і падрыхтоўка членаў інстытута

Артыкул 1. *Прыём у навіцыят*

Кан. 641 – Права прымаць кандыдатаў у навіцыят належыць вышэйшым настаяцелям, згодна з нормамі ўласнага права.

Кан. 642 – Праяўляючы пільны клопат, настаяцелі павінны прымаць толькі тых, хто, акрамя неабходнага ўзросту, мае здароўе, адпаведны характар і дастатковую сталасць, неабходныя для таго, каб прыняць лад жыцця, уласцівы інстытуту; калі неабходна, здароўе, характар і сталасць могуць быць праверaны спецыялістамі, захоўваючы прадпісанне кан. 220.

Кан. 643 – § 1. Нядзейсна прымаецца ў навіцыят:

1° той, хто не дасягнуў сямнаццаігадовага ўзросту;

2° сужэнец у час трывання сужэнства;

Caput III
De candidatorum admissione et de sodalium institutione

Art. 1. *De admissione in novitiatum*

Can. 641 – Ius candidatos admittendi ad novitiatum pertinet ad Superiores maiores ad normam iuris proprii.

Can. 642 – Superiores vigilanti cura eos tantum admittant qui, praeter aetatem requisitam, habeant valetudinem, aptam indolem et sufficientes maturitatis qualitates ad vitam instituti propriam amplectendam; quae valetudo, indoles et maturitas comprobentur adhibitis etiam, si opus fuerit, peritis, firmo praescripto can. 220.

Can. 643 – § 1. Invalide ad novitiatum admittitur:

1° qui decimum septimum aetatis annum nondum compleverit;

2° coniux, durante matrimonio;

3° qui sacro vinculo cum aliquo instituto vitae consecratae actu obstringitur vel in aliqua societate vitae apostolicae incorporatus est, salvo praescripto can. 684;

4° qui institutum ingreditur vi, metu gravi aut dolo inductus, vel is quem Superior eodem modo inductus recipit;

5° qui celaverit suam incorporationem in aliquo instituto vitae consecratae aut in aliqua societate vitae apostolicae.

§ 2. Ius proprium potest alia impedimenta etiam ad validitatem admissionis constituere vel condiciones apponere.

Can. 644 – Superiores ad novitiatum ne admittant clericos saeculares inconsulto proprio ipsorum Ordinario, nec aere alieno gravatos qui ad solvendum pares non sint.

Can. 645 – § 1. Candidati, antequam ad novitiatum admittantur, testimonium baptismatis et confirmationis necnon status liberi exhibere debent.

§ 2. Si agatur de admittendis clericis iisve qui in aliud institutum vitae consecratae, in societatem vitae apostolicae vel in seminarium admissi fuerint, requiritur insuper testimonium respective Ordinarii loci vel Superioris maioris instituti, vel societatis, vel rectoris seminarii.

§ 3. Ius proprium exigere potest alia testimonia de requisita idoneitate candidatorum et de immunitate ab impedimentis.

§ 4. Superiores alias quoque informationes, etiam sub secreto, petere possunt, si ipsis necessarium visum fuerit.

3° той, хто звязаны святымі повязямі з якім-небудзь інстытутам кансэкраванага жыцця або з'яўляецца членам таварыства апостальскага жыцця, захоўваючы прадпісанне кан. 684;

4° той, хто ўступае ў інстытут пад уздзеяннем прымусу, моцнага страху ці падману, або той, хто быў прыняты настаяцелем, які дзейнічаў пад такім жа ўздзеяннем;

5° той, хто ўтаіў сваю прыналежнасць да якога-небудзь інстытута кансэкраванага жыцця або таварыства апостальскага жыцця.

§ 2. Уласнае права можа ўстанавіць таксама іншыя перашкоды, якія выклікаюць нядзейснасць прыёму, або далучыць іншыя ўмовы.

Кан. 644 – Настаяцелі не павінны прымаць у навіцыят секулярных духоўных асобаў без кансультацыі з іх уласным ардынарыем, а таксама тых, хто абцяжараны даўгамі і не можа з імі разлічыцца.

Кан. 645 – § 1. Перад прыёмам у навіцыят кандыдаты павінны прадставіць пасведчанне аб хросце і канфірмацыі, а таксама аб сваім вольным стане.

§ 2. Калі гаворка ідзе пра прыём духоўных асобаў або тых, хто быў раней прыняты ў іншы інстытут кансэкраванага жыцця, таварыства апостальскага жыцця ці семінарыю, патрабуецца, апрача гэтага, пасведчанне адпаведна ардынарыя месца, вышэйшага настаяцеля інстытута або таварыства ці рэктара семінарыі.

§ 3. Уласнае права можа патрабаваць прадстаўлення іншых пасведчанняў аб неабходнай прыдатнасці кандыдатаў і іх свабодзе ад перашкодаў.

§ 4. Настаяцелі, калі палічаць гэта неабходным, могуць збіраць таксама іншыя звесткі, нават з захоўваннем таямніцы.

Артыкул 2. *Навіцыят і падрыхтоўка навіцыяў*

Кан. 646 – Прызначэннем навіцыяту, з якога пачынаецца жыццё ў інстытуце, з'яўляецца тое, каб навіцыі лепш пазналі Божае пакліканне, пры гэтым уласцівае гэтаму інстытуту, каб дасведчылі лад жыцця інстытута, сфармавалі розум і сэрца ў духу інстытута, а таксама каб іх намер і прыдатнасць маглі быць выпрабаваны.

Кан. 647 – § 1. Заснаванне, перанос і ліквідацыя дома навіцыяту павінны адбывацца пісьмовым дэкрэтам вярхоўнага кіраўніка інстытута са згоды яго Рады.

§ 2. Для таго, каб навіцыят быў дзейсным, ён павінен праходзіць у доме, вызначаным для гэтага належным чынам. У асобных выпадках і ў якасці выключэння, з дазволу вярхоўнага кіраўніка, які атрымаў згоду яго Рады, кандыдат можа прайсці навіцыят у іншым доме інстытута пад кіраваннем акрэсленай выпрабаванай манаскай асобы, якая павінна выконваць абавязкі намесніка настаўніка навіцыяў.

§ 3. Вышэйшы настаяцель можа даць дазвол на тое, каб група навіцыяў на працягу некаторага часу пражывала ў іншым, вызначаным ім, доме інстытута.

Кан. 648 – § 1. Для таго, каб навіцыят быў дзейсным, ён павінен працягвацца дванаццаць месяцаў, праведзеных у самой супольнасці навіцыяту, захоўваючы прадпісанне кан. 647 § 3.

§ 2. Для паўнаты падрыхтоўкі навіцыяў, апрача часу, аб якім гаворыцца ў § 1, канстытуцыі могуць прадугледжваць адзін або некалькі тэрмінаў апостальскай практыкі, якія павінны праходзіць па-за супольнасцю навіцыяту.

§ 3. Навіцыят не павінен быць прадоўжаны больш чым на два гады.

Art. 2. *De novitiatu et novitiorum institutione*

Can. 646 – Novitiatus, quo vita in instituto incipitur, ad hoc ordinatur, ut novitii vocationem divinam, et quidem instituti propriam, melius agnoscant, vivendi modum instituti experiantur eiusque spiritu mentem et cor informent, atque ipsorum propositum et idoneitas comprobentur.

Can. 647 – § 1. Domus novitiatus erectio, translatio et suppressio fiant per decretum scripto datum supremi Moderatoris instituti de consensu sui consilii.

§ 2. Novitiatus, ut validus sit, peragi debet in domo ad hoc rite designata. In casibus particularibus et ad modum exceptionis, ex concessione Moderatoris supremi de consensu sui consilii, candidatus novitiatum peragere potest in alia instituti domo, sub moderamine alicuius probati religiosi, qui vices magistri novitiorum gerat.

§ 3. Superior maior permittere potest ut novitiorum coetus, per certa temporis spatia, in alia instituti domo, a se designata, commoretur.

Can. 648 – § 1. Novitiatus, ut validus sit, duodecim menses in ipsa novitiatus communitate peragendos complecti debet, firmo praescripto can. 647, § 3.

§ 2. Ad novitiorum institutionem perficiendam, constitutiones, praeter tempus de quo in § 1, unum vel plura exercitationis apostolicae tempora extra novitiatus communitatem peragenda statuere possunt.

§ 3. Novitiatus ultra biennium ne extendatur.

Can. 649 – § 1. Salvis praescriptis can. 647, § 3 et can. 648, § 2, absentia a domo novitiatus quae tres menses, sive continuos sive intermissos, superet, novitiatum invalidum reddit. Absentia quae quindecim dies superet, suppleri debet.

§ 2. De venia competentis Superioris maioris, prima professio anticipari potest, non ultra quindecim dies.

Кан. 649 – § 1. Захоўваючы прадпісанні кан. 647 § 3 і кан. 648 § 2, адсутнасць у доме навіцыяту, якая працягвалася больш чым тры месяцы бесперапынна або з перапынкамі, выклікае нядзейснасць навіцыяту. Адсутнасць, якая працягвалася больш чым пятнаццаць дзён, павінна быць дапоўнена.

§ 2. З дазволу кампетэнтнага вышэйшага настаяцеля першыя абяцанні могуць быць складзены датэрмінова, але не больш, чым на пятнаццаць дзён.

Can. 650 – § 1. Scopus novitiatus exigit ut novitii sub directione magistri efformentur iuxta rationem institutionis iure proprio definiendam.

§ 2. Regimen novitiorum, sub auctoritate Superiorum maiorum, uni magistro reservatur.

Кан. 650 – § 1. Мэта навіцыяту патрабуе, каб навіцыі выхоўваліся пад кіраваннем настаўніка паводле плана падрыхтоўкі, акрэсленага ўласным правам.

§ 2. Кіраванне навіцыямі, пад уладай вышэйшых настаяцеляў, зарэзервавана толькі за настаўнікам.

Can. 651 – § 1. Novitiorum magister sit sodalis instituti qui vota perpetua professus sit et legitime designatus.

§ 2. Magistro, si opus fuerit, cooperatores dari possunt, qui ei subsint quoad moderamen novitiatus et institutionis rationem.

Кан. 651 – § 1. Настаўнік навіцыяў павінен быць членам інстытута, які склаў вечныя абяцанні і быў легітымна вызначаны.

§ 2. Пры неабходнасці, настаўніку могуць быць дадзены супрацоўнікі, якія павінны быць падначалены яму ў тым, што датычыць кіравання навіцыятам і плана падрыхтоўкі.

§ 3. Novitiorum institutioni praeficiantur sodales sedulo praeparati qui, aliis oneribus non impediti, munus suum fructuose et stabili modo absolvere possint.

§ 3. Выхаванне навіцыяў павінна быць даручана добра падрыхтаваным членам інстытута, якім не перашкаджаюць іншыя абавязкі і якія могуць плённа і пастаянна выконваць сваё заданне.

Can. 652 – § 1. Magistri eiusque cooperatorum est novitiorum vocationem discernere et comprobare, eosque gradatim ad vitam perfectionis instituti propriam rite ducendam efformare.

§ 2. Novitii ad virtutes humanas et christianas excolendas adducantur; per orationem et sui abnegationem in pleniorem perfectionis viam introducantur; ad mysterium salutis

Кан. 652 – § 1. Настаўнік і яго супрацоўнікі павінны распазнаваць і выпрабоўваць пакліканне навіцыяў, а таксама паступова фармаваць іх да дасканалага ладу жыцця, уласцівага інстытуту.

§ 2. Навіцыяў трэба скіроўваць да выпрацоўкі чалавечых і хрысціянскіх цнотаў; праз малітву і адрачэнне ад сябе весці іх на шлях большай дасканаласці; настаўляць да

сузірання таямніцы збаўлення, да чытання Святога Пісання і разважання над ім; падрыхтоўваць да Божага культу, які здзяйсняецца ў святой літургіі; вучыць весці лад жыцця, кансэкраванага праз евангельскія парады Богу і людзям у Хрысце; навучаць аб характары і духу, мэце і дысцыпліне, гісторыі і жыцці інстытута, а таксама наталяць любоўю да Касцёла і яго святых пастыраў.

§ 3. Навіцыі, свядомыя сваёй адказнасці, павінны так чынна супрацоўнічаць са сваім настаўнікам, каб верна адказваць на ласку Божага паклікання.

§ 4. Члены інстытута павінны клапаціцца аб тым, каб па меры сваіх магчымасцяў удзельнічаць у справе падрыхтоўкі навіцыяў прыкладам жыцця і малітвай.

§ 5. Час навіцыяту, аб якім гаворыцца ў кан. 648 § 1, павінен быць выкарыстаны менавіта на справу фармацыі, таму навіцыі не павінны быць заняты атрыманнем адукацыі і заданнямі, якія непасрэдна не служаць гэтаму выхаванню.

Кан. 653 – § 1. Навіцый можа свабодна пакінуць інстытут; у сваю чаргу, кампетэнтная ўлада інстытута можа яго выдаліць.

§ 2. Калі пасля заканчэння навіцыяту навіцый будзе прызнаны прыдатным, ён павінен быць дапушчаны да складання часовых абяцанняў, у супраціўным выпадку — выдалены; калі ж застаюцца сумненні ў яго прыдатнасці, вышэйшы настаяцель можа згодна з нормамі ўласнага права прадоўжыць тэрмін выпрабоўвання, але не больш чым на шэсць месяцаў.

contemplandum et sacras Scripturas legendas et meditandas instruantur; ad Dei cultum in sacra liturgia excolendum praeparentur; rationem addiscant vitam ducendi Deo hominibusque in Christo per consilia evangelica consecratam; de instituti indole et spiritu, fine et disciplina, historia et vita edoceantur atque amore erga Ecclesiam eiusque sacros Pastores imbuantur.

§ 3. Novitii, propriae responsabilitatis conscii, ita cum magistro suo active collaborent ut gratiae divinae vocationis fideliter respondeant.

§ 4. Curent instituti sodales, ut in opere institutionis novitiorum pro parte sua cooperentur vitae exemplo et oratione.

§ 5. Tempus novitiatus, de quo in can. 648, § 1, in opus formationis proprie impendatur, ideoque novitii ne occupentur in studiis et muniis, quae huic formationi non directe inserviunt.

Can. 653 – § 1. Novitius institutum libere deserere potest; competens autem instituti auctoritas potest eum dimittere.

§ 2. Exacto novitiatu, si idoneus iudicetur, novitius ad professionem temporariam admittatur, secus dimittatur; si dubium supersit de eius idoneitate, potest probationis tempus a Superiore maiore ad normam iuris proprii, non tamen ultra sex menses prorogari.

Артыкул 3. *Складанне манаскіх абяцанняў*

Кан. 654 – Складаючы манаскія абяцанні, члены інстытута праз публічнае абяцанне

Art. 3. *De professione religiosa*

Can. 654 – Professione religiosa sodales tria consilia evangelica obser-

vanda voto publico assumunt, Deo per Ecclesiae ministerium consecrantur et instituto incorporantur cum iuribus et officiis iure definitis.

Can. 655 – Professio temporaria ad tempus iure proprio definitum emittatur, quod neque triennio brevius neque sexennio longius sit.

Can. 656 – Ad validitatem professionis temporariae requiritur ut:

1° qui eam emissurus est, decimum saltem octavum aetatis annum compleverit;

2° novitiatus valide peractus sit;

3° habeatur admissio a competenti Superiore cum voto sui consilii ad normam iuris libere facta;

4° sit expressa et absque vi, metu gravi aut dolo emissa;

5° a legitimo Superiore per se vel per alium recipiatur.

Can. 657 – § 1. Expleto tempore ad quod professio emissa fuerit, religiosus, qui sponte petat et idoneus iudicetur, ad renovationem professionis vel ad professionem perpetuam admittatur, secus discedat.

§ 2. Si opportunum vero videatur, periodus professionis temporariae a competenti Superiore, iuxta ius proprium, prorogari potest, ita tamen ut totum tempus, quo sodalis votis temporariis adstringitur, non superet novennium.

§ 3. Professio perpetua anticipari potest ex iusta causa, non tamen ultra trimestre.

абавязваюцца выконваць тры евангельскія парады, кансэкруюцца Богу праз паслугу Касцёла і ўключаюцца ў інстытут з правамі і абавязкамі, акрэсленымі правам.

Кан. 655 – Складанне часовых абяцанняў павінна адбывацца на тэрмін, акрэслены ўласным правам, які не павінен быць меншым за тры і большым за шэсць гадоў.

Кан. 656 – Для дзейснасці часовых абяцанняў патрабуецца, каб:

1° той, хто будзе іх складаць, дасягнуў прынамсі васямнаццацігадовага ўзросту;

2° навіцыят быў пройдзены дзейсна;

3° быў свабодна дапушчаны кампетэнтным настаяцелем, які выслухаў меркаванне сваёй Рады, згодна з нормамі права;

4° яны былі выразнымі і не былі складзены пад уздзеяннем прымусу, моцнага страху або падману;

5° яны былі прыняты легітымным настаяцелем асабіста або праз каго-небудзь іншага.

Кан. 657 – § 1. Пасля заканчэння тэрміну, на які былі складзены абяцанні, манаская асоба, якая дабравольна просіць аб гэтым і будзе прызнана прыдатнай, павінна быць дапушчана да іх узнаўлення або да складання вечных абяцанняў; у супраціўным выпадку яна павінна адысці.

§ 2. Калі гэта будзе палічана дарэчным, кампетэнтны настаяцель можа ў адпаведнасці з уласным правам прадоўжваць тэрмін часовых абяцанняў, але такім чынам, каб сукупны час, на працягу якога член інстытута з'яўляецца звязаным часовымі абяцаннямі, не перавышаў дзевяці гадоў.

§ 3. Вечныя абяцанні могуць быць па справядлівай прычыне складзены датэрмінова, але не больш чым на тры месяцы.

Кан. 658 – Апрача ўмоваў, аб якіх гаворыцца ў кан. 656, 2°, 4° і 5°, а таксама іншых, дададзеных уласным правам, для дзейснасці вечных абяцанняў патрабуецца:

1° дасягненне прынамсі дваццаці аднаго года;

2° папярэдняе складанне часовых абяцанняў прынамсі на тры гады, захоўваючы прадпісанне кан. 657 § 3.

Can. 658 – Praeter condiciones de quibus in can. 656, nn. 3, 4 et 5 aliasque iure proprio appositas, ad validitatem professionis perpetuae requiritur:

1° vigesimus primus saltem aetatis annus completus;

2° praevia professio temporaria saltem per triennium, salvo praescripto can. 657, § 3.

Артыкул 4. *Падрыхтоўка манаскіх асобаў*

Art. 4. *De religiosorum institutione*

Кан. 659 – § 1. У кожным інстытуце пасля складання першых абяцанняў павінна працягвацца падрыхтоўка ўсіх яго членаў, скіраваная на больш поўнае вядзенне жыцця, уласцівага інстытуту, і больш паспяховае ажыццяўленне яго місіі.

§ 2. Таму ўласнае права павінна акрэсліць парадак гэтай падрыхтоўкі і яе працягласць, улічваючы патрэбы Касцёла, а таксама абставіны, звязаныя з асобамі і часам, адпаведна мэтам і характару інстытута.

§ 3. Падрыхтоўка членаў інстытута, якія рыхтуюцца прыняць прэзбітэрскае пасвячэнне, кіруецца паўсюдным правам і ўласным парадкам атрымання адукацыі ў інстытуце.

Can. 659 – § 1. In singulis institutis, post primam professionem omnium sodalium institutio perficiatur ad vitam instituti propriam plenius ducendam et ad eius missionem aptius prosequendam.

§ 2. Quapropter ius proprium rationem definire debet huius institutionis eiusdemque durationis, attentis Ecclesiae necessitatibus atque hominum temporumque condicionibus, prout a fine et indole instituti exigitur.

§ 3. Institutio sodalium, qui ad sacros ordines suscipiendos praeparantur, iure universali regitur et propria instituti ratione studiorum.

Кан. 660 – § 1. Падрыхтоўка павінна быць сістэматычнай, дастасаванай да здольнасцяў, духоўнай і апостальскай, навуковай і практычнай; акрамя таго, у выпадку патрэбы, гэтая падрыхтоўка павінна даваць магчымасць атрымаць адпаведныя кваліфікацыі, як касцёльныя, так і свецкія.

§ 2. На працягу часу гэтай падрыхтоўкі членам інстытута не павінны даручацца абавязкі і справы, якія маглі б ёй перашкаджаць.

Can. 660 – § 1. Institutio sit systematica, captui sodalium accommodata, spiritualis et apostolica, doctrinalis simul ac practica, titulis etiam congruentibus, tam ecclesiasticis quam civilibus, pro opportunitate obtentis.

§ 2. Perdurante tempore huius institutionis, sodalibus officia et opera ne committantur, quae eam impediant.

Кан. 661 – Праз усё жыццё манаскія асобы павінны рупліва працягваць сваю ду-

Can. 661 – Per totam vitam religiosi formationem suam spiritualem,

doctrinalem et practicam sedulo prosequantur; Superiores autem eis adiumenta et tempus ad hoc procurent.

хоўную, навуковую і практычную фармацыю, а настаяцелі павінны забяспечыць ім патрэбныя для гэтага сродкі і час.

Caput IV

De institutorum eorumque sodalium obligationibus et iuribus

Раздзел IV

Абавязкі і правы інстытутаў і іх членаў

Can. 662 – Religiosi sequelam Christi in Evangelio propositam et in constitutionibus proprii instituti expressam tamquam supremam vitae regulam habeant.

Кан. 662 – Манаскія асобы павінны прымаць у якасці вярхоўнага правіла свайго жыцця наследаванне Хрыста, прадстаўленае ў Евангеллі і выражанае ў канстытуцыях іх інстытута.

Can. 663 – § 1. Rerum divinarum contemplatio et assidua cum Deo in oratione unio omnium religiosorum primum et praecipuum sit officium.

Кан. 663 – § 1. Першым і асноўным абавязкам усіх манаскіх асобаў павінна быць сузіранне Божых спраў і пастаяннае яднанне з Богам у малітве.

§ 2. Sodales cotidie pro viribus Sacrificium eucharisticum participent, sanctissimum Corpus Christi recipiant et ipsum Dominum in Sacramento praesentem adorent.

§ 2. Члены інстытутаў павінны па магчымасці штодзённа ўдзельнічаць у эўхарыстычнай Ахвяры, прымаць Найсвяцейшае Цела Хрыста і адараваць самога Пана, прысутнага ў Сакрамэнце.

§ 3. Lectioni sacrae Scripturae et orationi mentali vacent, iuxta iuris proprii praescripta liturgiam horarum digne celebrent, firma pro clericis obligatione de qua in can. 276, § 2, n. 3, et alia pietatis exercitia peragant.

§ 3. Яны павінны чытаць Святое Пісанне і разважаць над ім, паводле прадпісанняў уласнага права годна цэлебраваць Літургію гадзінаў, захоўваючы ў выпадку духоўных асобаў абавязак, аб якім гаворыцца ў кан. 276 § 3, 3°, а таксама ажыццяўляць іншыя пабожныя практыкаванні.

§ 4. Speciali cultu Virginem Deiparam, omnis vitae consecratae exemplum et tutamen, etiam per mariale rosarium prosequantur.

§ 4. Яны павінны мець — асабліва праз святы Ружанец — асобы культ Багародзіцы Панны, якая з'яўляецца прыкладам і апорай усялякага кансэкраванага жыцця.

§ 5. Annua sacri recessus tempora fideliter servent.

§ 5. Яны павінны штогод верна захоўваць час святога засяроджвання.

Can. 664 – In animi erga Deum conversione insistant religiosi, conscientiam etiam cotidie examinent et ad paenitentiae sacramentum frequenter accedant.

Кан. 664 – Манаскія асобы павінны імкнуцца звяртаць сваю душу да Бога, штодзённа рабіць рахунак сумлення і часта прыступаць да сакрамэнту пакаяння.

Кан. 665 – § 1. Манаскія асобы павінны пражываць ва ўласным манаскім доме, весці супольнае жыццё і не пакідаць яго без дазволу свайго настаяцеля. Што датычыць працяглай адсутнасці ў доме, вышэйшы настаяцель са згоды сваёй Рады і па справядлівай прычыне можа дазволіць члену інстытута пражываць па-за домам, аднак не больш чым на працягу аднаго года, калі прычынай не з'яўляецца лячэнне хваробы, атрыманне адукацыі або ажыццяўленне апостальства ад імя інстытута.

§ 2. Настаяцелі павінны старанна шукаць членаў інстытута, якія нелегітымна адсутнічаюць у манаскім доме з намерам вызвалення сябе з-пад улады настаяцеляў, і аказваць ім дапамогу, каб яны вярнуліся і трывалі ў сваім пакліканні.

Кан. 666 – У карыстанні сродкамі сацыяльнай камунікацыі трэба захоўваць неабходную абачлівасць і пазбягаць усяго таго, што можа пашкодзіць уласнаму пакліканню і аказацца небяспечным для чыстасці кансэкраванай асобы.

Кан. 667 – § 1. Ва ўсіх дамах павінна быць захавана кляўзура, дастасаваная паводле акрэсленняў уласнага права да характару і місіі інстытута такім чынам, каб акрэсленая частка манаскага дома заўсёды была зарэзервавана толькі для членаў інстытута.

§ 2. Больш строгая дысцыпліна кляўзуры павінна быць захавана ў кляштарах, якія прызначаны для сузіральнага жыцця.

§ 3. Кляштары манахінь, цалкам прызначаных для сузіральнага жыцця, павінны захоўваць папскую кляўзуру паводле нормаў, дадзеных Апостальскай Сталіцай. У іншых кляштарах манахінь павінна быць захавана кляўзура, дастасаваная да іх характару і акрэсленая ў канстытуцыях.

Can. 665 – § 1. Religiosi in propria domo religiosa habitent vitam communem servantes, nec ab ea discedant nisi de licentia sui Superioris. Si autem agatur de diuturna a domo absentia, Superior maior, de consensu sui consilii atque iusta de causa, sodali concedere potest ut extra domum instituti degere possit, non tamen ultra annum, nisi causa infirmitatis curandae, ratione studiorum aut apostolatus exercendi nomine instituti.

§ 2. Sodalis, qui e domo religiosa illegitime abest cum animo sese subducendi a potestate Superiorum, sollicite ab eisdem quaeratur et adiuvetur ut redeat et in sua vocatione perseveret.

Can. 666 – In usu mediorum communicationis socialis servetur necessaria discretio atque vitentur quae sunt vocationi propriae nociva et castitati personae consecratae periculosa.

Can. 667 – § 1. In omnibus domibus clausura indoli et missioni instituti accommodata servetur secundum determinationes proprii iuris, aliqua parte domus religiosae solis sodalibus semper reservata.

§ 2. Strictior disciplina clausurae in monasteriis ad vitam contemplativam ordinatis servanda est.

§ 3. Monasteria monialium, quae integre ad vitam contemplativam ordinantur, clausuram *papalem*, iuxta normas scilicet ab Apostolica Sede datas, observare debent. Cetera monialium monasteria clausuram propriae indoli accommodatam et in constitutionibus definitam servent.

§ 4. Episcopus dioecesanus facultatem habet ingrediendi, iusta de causa, intra clausuram monasteriorum monialium, quae sita sunt in sua dioecesi, atque permittendi, gravi de causa et assentiente Antistita, ut alii in clausuram admittantur, ac moniales ex ipsa egrediantur ad tempus vere necessarium.

§ 4. Дыяцэзіяльны біскуп можа па справядлівай прычыне ўваходзіць у кляўзуру кляштараў манахінь, якія знаходзяцца ў яго дыяцэзіі, можа таксама па важкай прычыне і са згоды настаяцельніцы дазволіць, каб у кляўзуру ўвайшлі іншыя асобы, а таксама, каб манахіні маглі выйсці з яе на сапраўды неабходны час.

Can. 668 – § 1. Sodales ante primam professionem suorum bonorum administrationem cedant cui maluerint et, nisi constitutiones aliud ferant, de eorum usu et usufructu libere disponant. Testamentum autem, quod etiam in iure civili sit validum, saltem ante professionem perpetuam condant.

Кан. 668 – § 1. Перад тым, як скласці першыя абяцанні, члены інстытутаў павінны перадаць адміністраванне сваёй маёмасцю таму, каму пажадаюць, і, калі канстытуцыі не пастанаўляюць іншае, могуць свабодна распарадзіцца карыстаннем сваёй маёмасцю і даходамі, якія могуць быць з яе атрыманы. Пры гэтым яны павінны падрыхтаваць самае позняе перад складаннем вечных абяцанняў завяшчанне, якое павінна быць дзейсным таксама ў адпаведнасці з нормамі дзяржаўнага заканадаўства.

§ 2. Ad has dispositiones iusta de causa mutandas et ad quemlibet actum ponendum circa bona temporalia, licentia Superioris competentis ad normam iuris proprii indigent.

§ 2. Для таго, каб па справядлівай прычыне ўнесці змяненні ў гэтыя распараджэнні і здзейсніць якое-небудзь дзеянне з маёмасцю, патрэбны дазвол кампетэнтнага настаяцеля, згодна з нормамі ўласнага права.

§ 3. Quidquid religiosus propria acquirit industria vel ratione instituti, acquirit instituto. Quae ei ratione pensionis, subventionis vel assecurationis quoquo modo obveniunt, instituto acquiruntur, nisi aliud iure proprio statuatur.

§ 3. Усё, што манаская асоба набывае праз уласную руплівасць або з нагоды дзейнасці ў інстытуце, яна набывае для інстытута. Усё, што любым спосабам дастаецца ёй у якасці заработнай платы, дапамогі ці страхавых выплат, набываецца для інстытута, калі ўласнае права не прадугледжвае іншае.

§ 4. Qui ex instituti natura plene bonis suis renuntiare debet, illam renuntiationem, forma, quantum fieri potest, etiam iure civili valida, ante professionem perpetuam faciat a die emissae professionis valituram. Idem faciat professus a votis perpetuis, qui

§ 4. Той, хто з увагі на прыроду інстытута павінен поўнасцю адрачыся ад сваёй маёмасці, павінен перад складаннем вечных абяцанняў здзейсніць адрачэнне, якое будзе дзейсным ад дня складання абяцанняў, пры гэтым павінен зрабіць гэта такім чынам, каб, наколькі гэта магчыма, адрачэн-

не было дзейсным і ў адпаведнасці з дзяржаўным заканадаўствам. Тое самае павінен зрабіць член інстытута, які ўжо склаў вечныя абяцанні і з дазволу вярхоўнага кіраўніка жадае згодна з нормамі ўласнага права часткова або поўнасцю адрачыся ад сваёй маёмасці.

§ 5. Член інстытута, які склаў абяцанні і з увагі на прыроду інстытута поўнасцю адрокся ад сваёй маёмасці, траціць здольнасць да набывання і валодання, таму яго дзеянні, супраціўныя абяцанню ўбоства, з'яўляюцца нядзейснымі. Усё, што дастаецца яму пасля адрачэння, пераходзіць інстытуту.

Кан. 669 – § 1. Манаскія асобы павінны насіць адзенне інстытута, выраблены згодна з нормамі ўласнага права, як знак сваёй кансэкрацыі і дзеля сведчання аб убостве.

§ 2. Духоўныя манаскія асобы таго інстытута, які не мае ўласнага адзення, павінны насіць адзенне духоўных асобаў згодна з нормай кан. 284.

Кан. 670 – Інстытут павінен забяспечваць сваіх членаў усім, што згодна з нормамі канстытуцый з'яўляецца неабходным для дасягнення мэты іх паклікання.

Кан. 671 – Манаскія асобы не павінны прымаць заданні і пасады па-за ўласным інстытутам без дазволу легітымнага настаяцеля.

Кан. 672 – Манаскія асобы звязаны прадпісаннямі кан. 277, 285, 286, 287 і 289, а духоўныя манаскія асобы, апрача гэтага, — таксама прадпісаннямі кан. 279 § 2. У свецкіх інстытутах папскага права дазвол, аб якім гаворыцца ў кан. 285 § 4, можа ўдзяляць уласны вышэйшы настаяцель.

ad normam iuris proprii bonis suis pro parte vel totaliter de licentia supremi Moderatoris renuntiare velit.

§ 5. Professus, qui ob instituti naturam plene bonis suis renuntiaverit, capacitatem acquirendi et possidendi amittit, ideoque actus voto paupertatis contrarios invalide ponit. Quae autem ei post renuntiationem obveniunt, instituto cedunt ad normam iuris proprii.

Can. 669 – § 1. Religiosi habitum instituti deferant, ad normam iuris proprii confectum, in signum suae consecrationis et in testimonium paupertatis.

§ 2. Religiosi clerici instituti, quod proprium non habet habitum, vestem clericalem ad normam can. 284 assumant.

Can. 670 – Institutum debet sodalibus suppeditare omnia quae ad normam constitutionum necessaria sunt ad suae vocationis finem assequendum.

Can. 671 – Religiosus munera et officia extra proprium institutum ne recipiat absque licentia legitimi Superioris.

Can. 672 – Religiosi adstringuntur praescriptis cann. 277, 285, 286, 287 et 289, et religiosi clerici insuper praescriptis can. 279, § 2; in institutis laicalibus iuris pontificii, licentia de qua in can. 285, § 4, concedi potest a proprio Superiore maiore.

Caput V

De apostolatu institutorum

Can. 673 – Omnium religiosorum apostolatus primum in eorum vitae consecratae testimonio consistit, quod oratione et paenitentia fovere tenentur.

Can. 674 – Instituta, quae integre ad contemplationem ordinantur, in Corpore Christi mystico praeclaram semper partem obtinent: Deo enim eximium laudis sacrificium offerunt, populum Dei uberrimis sanctitatis fructibus collustrant eumque exemplo movent necnon arcana fecunditate apostolica dilatant. Qua de causa, quantumvis actuosi apostolatus urgeat necessitas, sodales horum institutorum advocari nequeunt ut in variis ministeriis pastoralibus operam adiutricem praestent.

Can. 675 – § 1. In institutis operibus apostolatus deditis, apostolica actio ad ipsam eorundem naturam pertinet. Proinde, tota vita sodalium spiritu apostolico imbuatur, tota vero actio apostolica spiritu religioso informetur.

§ 2. Actio apostolica ex intima cum Deo unione semper procedat eandemque confirmet et foveat.

§ 3. Actio apostolica, nomine et mandato Ecclesiae exercenda, in eius communione peragatur.

Can. 676 – Laicalia instituta, tum virorum tum mulierum, per misericordiae opera spiritualia et corporalia munus pastorale Ecclesiae participant hominibusque diversissima praestant servitia; quare in suae vocationis gratia fideliter permaneant.

Раздзел V

Апостальства інстытутаў

Кан. 673 – Апостальства ўсіх манаскіх асобаў заключаецца перадусім у сведчанні іх кансэкраванага жыцця, якое яны павінны ажыўляць праз малітву і пакаянне.

Кан. 674 – Інстытуты, цалкам прызначаныя для сузірання, заўсёды займаюць хвалебную частку ў містычным Хрыстовым целе: складаюць Богу дасканалую ахвяру праслаўлення, асвятляюць Божы народ багатым плёнам святасці і заахвочваюць яго сваім прыкладам, а таксама спрыяюць яго памнажэнню праз патаемную апостальскую плённасць. Таму, наколькі б вялікая ні была неабходнасць дзейнага апостальства, члены гэтых інстытутаў не могуць быць адкліканы для аказання дапамогі ў розных справах пастырскай паслугі.

Кан. 675 – § 1. У інстытутах, прысвечаных справам апостальства, апостальская дзейнасць належыць да самой іх прыроды. Таму ўсё жыццё іх членаў павінна быць прасякнута апостальскім духам, а ўся апостальская дзейнасць — сфармавана манаскім духам.

§ 2. Апостальская дзейнасць заўсёды павінна паходзіць з цеснай лучнасці з Богам, умацоўваць яе і паглыбляць.

§ 3. Апостальская дзейнасць, якая ажыццяўляецца ад імя і з упаўнаважання Касцёла, павінна здзяйсняцца ў адзінстве з ім.

Кан. 676 – Інстытуты свецкіх асобаў, як мужчынскія, так і жаночыя, праз справы міласэрнасці — духоўныя і матэрыяльныя — удзельнічаюць у пастырскім заданні Касцёла і рознымі спосабамі служаць людзям; таму яны павінны верна трываць у ласцы свайго паклікання.

Кан. 677 – § 1. Настаяцелі і члены інстытута павінны верна трымацца місіі і дзейнасці, уласцівых інстытуту; разам з тым, іх трэба разумна дастасоўваць да патрэбаў часу і месца, выкарыстоўваючы таксама новыя і адпаведныя сродкі.

§ 2. Калі інстытуты маюць якія-небудзь звязаныя з імі аб'яднанні вернікаў, яны павінны з асобым клопатам садзейнічаць таму, каб гэтыя аб'яднанні былі прасякнуты сапраўдным духам сваёй сям'і.

Кан. 678 – § 1. У тым, што датычыць душпастырства, ажыццяўлення публічнага Божага культу і іншых спраў апостальства, манаскія асобы падлягаюць уладзе біскупаў, якім яны абавязаны аказваць пабожную паслухмянасць і пашану.

§ 2. У ажыццяўленні знешняга апостальства манаскія асобы падпарадкаваны таксама сваім настаяцелям і павінны заставацца вернымі дысцыпліне інстытута, а, калі існуе патрэба, самі біскупы павінны настойваць на захоўванні гэтага абавязку.

§ 3. Кіруючы манаскіх асобаў да апостальскай дзейнасці, дыяцэзіяльныя біскупы і настаяцелі манаскіх асобаў павінны дзейнічаць у паразуменні адны з другімі.

Кан. 679 – Калі да гэтага схіляе вельмі важкая прычына, дыяцэзіяльны біскуп можа забараніць члену манаскага інстытута прабываць на тэрыторыі дыяцэзіі, калі яго вышэйшы настаяцель, папярэджаны аб сітуацыі, не вырашыць справу; аднак гэтая справа павінна быць адразу прадстаўлена Апостальскай Сталіцы.

Кан. 680 – Трэба спрыяць упарадкаванаму супрацоўніцтву паміж рознымі інстытутамі, а таксама паміж імі і секулярным духавенствам, а таксама каардынацыі ўсіх апостальскіх спраў і пачынанняў пад кіра-

Can. 677 – § 1. Superiores et sodales missionem et opera instituti propria fideliter retineant; ea tamen, attentis temporum et locorum necessitatibus, prudenter accommodent, novis etiam et opportunis mediis adhibitis.

§ 2. Instituta autem, si quas habeant associationes christifidelium sibi coniunctas, speciali cura adiuvent, ut genuino spiritu suae familiae imbuantur.

Can. 678 – § 1. Religiosi subsunt potestati Episcoporum, quos devoto obsequio ac reverentia prosequi tenentur, in iis quae curam animarum, exercitium publicum cultus divini et alia apostolatus opera respiciunt.

§ 2. In apostolatu externo exercendo religiosi propriis quoque Superioribus subsunt et disciplinae instituti fideles permanere debent; quam obligationem ipsi Episcopi, si casus ferat, urgere ne omittant.

§ 3. In operibus apostolatus religiosorum ordinandis Episcopi dioecesani et Superiores religiosi collatis consiliis procedant oportet.

Can. 679 – Episcopus dioecesanus, urgente gravissima causa, sodali instituti religiosi prohibere potest quominus in dioecesi commoretur, si eius Superior maior monitus prospicere neglexerit, re tamen ad Sanctam Sedem statim delata.

Can. 680 – Inter varia instituta, et etiam inter eadem et clerum saecularem, ordinata foveatur cooperatio necnon, sub moderamine Episcopi dioecesani, omnium operum et actio-

num apostolicarum coordinatio, salvis indole, fine singulorum institutorum et legibus fundationis.

ваннем дыяцэзіяльнага біскупа, захоўваючы пры гэтым характар і мэты кожнага інстытута, а таксама ўстаноўчыя законы.

Can. 681 – § 1. Opera quae ab Episcopo dioecesano committuntur religiosis, eiusdem Episcopi auctoritati et directioni subsunt, firmo iure Superiorum religiosorum ad normam can. 678, §§ 2 et 3.

Кан. 681 – § 1. Справы, якія дыяцэзіяльны біскуп даручае манаскім асобам, падлягаюць уладзе і кіраванню гэтага біскупа, захоўваючы права настаяцеляў манаскіх асобаў згодна з нормамі кан. 678 § 2 і 3.

§ 2. In his casibus ineatur conventio scripta inter Episcopum dioecesanum et competentem instituti Superiorem, qua, inter alia, expresse et accurate definiantur quae ad opus explendum, ad sodales eidem addicendos et ad res oeconomicas spectent.

§ 2. У такіх выпадках паміж дыяцэзіяльным біскупам і кампетэнтным настаяцелем інстытута павінна быць заключана пісьмовае пагадненне, у якім, між іншым, павінна быць выразна і дакладна акрэслена тое, што адносіцца да справы, якая павінна выконвацца, да прызначэння да яе членаў інстытута і да эканамічных спраў.

Can. 682 – § 1. Si de officio ecclesiastico in dioecesi alicui sodali religioso conferendo agatur, ab Episcopo dioecesano religiosus nominatur, praesentante vel saltem assentiente competenti Superiore.

Кан. 682 – § 1. Калі гаворка ідзе пра прызначэнне якога-небудзь члена манаскага інстытута на касцёльную пасаду ў дыяцэзіі, дыяцэзіяльны біскуп прызначае манаскую асобу, прадстаўленую кампетэнтным настаяцелем або, прынамсі, тую, якая атрымала яго згоду.

§ 2. Religiosus ab officio commisso amoveri potest ad nutum sive auctoritatis committentis, monito Superiore religioso, sive Superioris, monito committente, non requisito alterius consensu.

§ 2. Манаская асоба можа быць знята з даручанай ёй пасады або рашэннем улады, якая яе прызначыла, аб чым павінен быць папярэджаны настаяцель манаскай асобы, або рашэннем настаяцеля, аб чым павінен быць папярэджаны той, хто яе прызначыў; згода папярэджанай асобы не патрабуецца.

Can. 683 – § 1. Ecclesias et oratoria, quibus christifideles habitualiter accedunt, scholas aliaque opera religionis vel caritatis sive spiritualis sive temporalis religiosis commissa, Episcopus dioecesanus visitare potest, sive per se sive per alium, tempore visitationis pastoralis et etiam in casu necessitatis; non vero scholas, quae exclusive pateant propriis instituti alumnis.

Кан. 683 – § 1. Падчас пастырскай візітацыі, а таксама пры неабходнасці дыяцэзіяльны біскуп можа асабіста або праз прадстаўніка здзяйсняць візітацыю касцёлаў і араторыяў, якія вернікі наведваюць пастаянна, школ і іншых рэлігійных установаў, а таксама ўстановаў міласэрнасці — духоўнай або матэрыяльнай — даручаных манаскім асобам; аднак гэта не датычыць школ, прызначаных выключна для ўласных алюмнаў інстытута.

§ 2. Калі будуць выкрыты моцныя злоўжыванні, а папярэджванні, зробленыя настаяцелю манаскіх асобаў, застануцца дарэмнымі, біскуп можа прыняць меры асабіста і сваёй уладай.

§ 2. Quod si forte abusus deprehenderit, frustra Superiore religioso monito, propria auctoritate ipse per se providere potest.

Раздзел VI
Выключэнне членаў з інстытута

Caput VI
De separatione sodalium ab instituto

Артыкул 1. *Пераход у іншы інстытут*

Кан. 684 – § 1. Член інстытута пасля складання вечных абяцанняў не можа перайсці са свайго манаскага інстытута ў іншы, калі не з дазволу вярхоўных кіраўнікоў абодвух інстытутаў і са згоды іх радаў.

§ 2. Член інстытута можа быць дапушчаны да складання вечных абяцанняў у новым інстытуце пасля выпрабавання, якое павінна працягвацца не менш чым тры гады. Калі ж член інстытута адмовіцца скласці гэтыя абяцанні або не будзе дапушчаны да іх кампетэнтнымі настаяцелямі, ён павінен вярнуцца ў папярэдні інстытут, калі не атрымае індульт вяртання да стану свецкіх асобаў.

§ 3. Для таго, каб манаская асоба магла перайсці з кляштара *sui iuris* ў іншы кляштар гэтага ж інстытута, федэрацыі ці канфедэрацыі, ёй неабходна і дастаткова атрымаць згоду вышэйшых настаяцеляў абодвух кляштараў і капітула прымаючага кляштара, захоўваючы іншыя патрабаванні, устаноўленыя ўласным правам; не патрабуецца зноў складаць абяцанні.

§ 4. Уласнае права павінна акрэсліць тэрмін і парадак выпрабавання, якое павінна папярэднічаць складанню абяцанняў у новым інстытуце.

§ 5. На пераход у секулярны інстытут ці ў таварыства апостальскага жыцця або

Art. 1. *De transitu ad aliud institutum*

Can. 684 – § 1. Sodalis a votis perpetuis nequit a proprio ad aliud institutum religiosum transire, nisi ex concessione supremi Moderatoris utriusque instituti et de consensu sui cuiusque consilii.

§ 2. Sodalis, post peractam probationem quae ad tres saltem annos protrahenda est, ad professionem perpetuam in novo instituto admitti potest. Si autem sodalis hanc professionem emittere renuat vel ad eam emittendam a competentibus Superioribus non admittatur, ad pristinum institutum redeat, nisi indultum saecularizationis obtinuerit.

§ 3. Ut religiosus a monasterio sui iuris ad aliud eiusdem instituti vel foederationis aut confoederationis transire possit, requiritur et sufficit consensus Superioris maioris utriusque monasterii et capituli monasterii recipientis, salvis aliis requisitis iure proprio statutis; nova professio non requiritur.

§ 4. Ius proprium determinet tempus et modum probationis, quae professioni sodalis in novo instituto praemittenda est.

§ 5. Ut ad institutum saeculare aut ad societatem vitae apostolicae vel

ex illis ad institutum religiosum fiat transitus, requiritur licentia Sanctae Sedis, cuius mandatis standum est.

з іх у манаскі інстытут патрабуецца дазвол Святой Сталіцы, пастановаў якой трэба прытрымлівацца.

Can. 685 – § 1. Usque ad emissionem professionis in novo instituto, manentibus votis, iura et obligationes quae sodalis in priore instituto habebat, suspenduntur; ab incepta tamen probatione, ipse ad observantiam iuris proprii novi instituti tenetur.

Кан. 685 – § 1. Да складання абяцанняў у новым інстытуце, не зважаючы на тое, што раней складзеныя абяцанні захоўваюць моц, прыпыняюцца правы і абавязкі, якія член інстытута меў у папярэднім інстытуце; пры гэтым ад пачатку выпрабавання ён павінен захоўваць уласнае права новага інстытута.

§ 2. Per professionem in novo instituto sodalis eidem incorporatur, cessantibus votis, iuribus et obligationibus praecedentibus.

§ 2. Праз складанне абяцанняў у новым інстытуце член інстытута ўключаецца ў яго, пры гэтым страчваюць моц ранейшыя абяцанні, правы і абавязкі.

Art. 2. *De egressu ab instituto*

Артыкул 2. *Выхад з інстытута*

Can. 686 – § 1. Supremus Moderator, de consensu sui consilii, sodali a votis perpetuis professo, gravi de causa concedere potest indultum exclaustrationis, non tamen ultra quinquennium, praevio consensu Ordinarii loci in quo commorari debet, si agitur de clerico. Indultum prorogare vel illud ultra quinquennium concedere Sanctae Sedi vel, si de institutis iuris dioecesani agitur, Episcopo dioecesano reservatur.

Кан. 686 – § 1. Вярхоўны кіраўнік са згоды сваёй Рады па важкай прычыне можа ўдзяліць члену інстытута, які склаў вечныя абяцанні, індульт, які дазваляе экскляўстрацыю на тэрмін, не даўжэйшы чым пяць гадоў; калі гаворка ідзе пра духоўную асобу, патрабуецца папярэдняя згода ардынарыя месца, дзе яна будзе прабываць. Права на прадоўжванне тэрміну дзеяння такога індульта або на ўдзяленне яго на тэрмін, даўжэйшы чым пяць гадоў, зарэзервавана за Святой Сталіцай або, калі гаворка ідзе пра інстытуты дыяцэзіяльнага права, за дыяцэзіяльным біскупам.

§ 2. Pro monialibus indultum exclaustrationis concedere unius Apostolicae Sedis est.

§ 2. Удзяляць індульт на экскляўстрацыю манахінь мае права толькі Апостальская Сталіца.

§ 3. Petente supremo Moderatore de consensu sui consilii, exclaustratio imponi potest a Sancta Sede pro sodale instituti iuris pontificii vel ab Episcopo dioecesano pro sodale

§ 3. Па просьбе вярхоўнага кіраўніка, які дзейнічае са згоды сваёй Рады, па важкіх прычынах, захоўваючы адпаведнасць і любоў, налажыць абавязак экскляўстрацыі можа: на члена інстытута папскага права — Святая Сталіца, а на члена інсты-

тута дыяцэзіяльнага права — дыяцэзіяльны біскуп.

Кан. 687 – Член інстытута, які знаходзіцца ў экскляўстрацыі, з'яўляецца вызваленым ад абавязкаў, не сумяшчальных з новымі ўмовамі яго жыцця, пры гэтым ён застаецца залежным і знаходзіцца пад апекай сваіх настаяцеляў, а таксама ардынарыя месца, асабліва калі гаворка ідзе пра духоўную асобу. Ён можа насіць адзенне інстытута, калі індульт не пастанаўляе іншае. Аднак ён не мае ні актыўнага, ні пасіўнага права голасу.

Кан. 688 – § 1. Той, хто пасля заканчэння тэрміну часовых абяцанняў пажадае выйсці з інстытута, можа яго пакінуць.

§ 2. Той, хто на працягу тэрміну часовых абяцанняў па важкай прычыне папросіць дазволу пакінуць інстытут, можа атрымаць індульт на выхад ад вярхоўнага кіраўніка са згоды яго Рады; у кляштарах, аб якіх гаворыцца ў кан. 615, гэты індульт, для дзейснасці, павінен быць адобраны біскупам дома, да якога належаў.

Кан. 689 – § 1. Кампетэнтны вышэйшы настаяцель, выслухаўшы сваю Раду, калі існуюць справядлівыя прычыны, можа не дапусціць члена інстытута, тэрмін часовых абяцанняў якога закончыўся, да складання наступных абяцанняў.

§ 2. Фізічная або псіхічная хвароба, якая, згодна з заключэннем спецыялістаў, выклікае ў члена інстытута, аб якім гаворыцца ў § 1, непрыдатнасць да вядзення жыцця ў інстытуце, нават калі яна ўзнікла пасля складання абяцанняў, з'яўляецца прычынай, на падставе якой ён не дапускаецца да ўзнаўлення абяцанняў або да складання вечных абяцанняў, калі хвароба не ўзнікла па прычыне нядбайнасці інстытута або па прычыне працы, выкананай у інстытуце.

instituti iuris dioecesani, ob graves causas, servata aequitate et caritate.

Can. 687 – Sodalis exclaustratus exoneratus habetur ab obligationibus, quae cum nova suae vitae condicione componi nequeunt, itemque sub dependentia et cura manet suorum Superiorum et etiam Ordinarii loci, praesertim si de clerico agitur. Habitum instituti deferre potest, nisi aliud in indulto statuatur. Voce tamen activa et passiva caret.

Can. 688 – § 1. Qui expleto professionis tempore ab instituto egredi voluerit, illud derelinquere potest.

§ 2. Qui perdurante professione temporaria, gravi de causa, petit ut institutum derelinquat, indultum discedendi consequi potest a supremo Moderatore de consensu eius consilii; quoad monasterium sui iuris, de quo in can. 615, indultum, ut valeat, confirmari debet ab Episcopo domus assignationis.

Can. 689 – § 1. Sodalis, expleta professione temporaria, si iustae causae affuerint, a competenti Superiore maiore, audito suo consilio, a subsequenti professione emittenda excludi potest.

§ 2. Infirmitas physica vel psychica, etiam post professionem contracta, quae, de iudicio peritorum, sodalem, de quo in § 1, reddit ineptum ad vitam in instituto ducendam, causam constituit eum non admittendi ad professionem renovandam vel ad perpetuam emittendam, nisi ob neglegentiam instituti vel ob laborem in instituto peractum infirmitas contracta fuerit.

§ 3. Si vero religiosus, perdurantibus votis temporariis, amens evaserit, etsi novam professionem emittere non valeat, ab instituto tamen dimitti non potest.

Can. 690 – § 1. Qui, expleto novitiatu vel post professionem, legitime ab instituto egressus fuerit, a Moderatore supremo de consensu sui consilii rursus admitti potest sine onere repetendi novitiatum; eiusdem autem Moderatoris erit determinare congruam probationem praeviam professioni temporariae et tempus votorum ante professionem perpetuam praemittendum, ad normam cann. 655 et 657.

§ 2. Eadem facultate gaudet Superior monasterii sui iuris cum consensu sui consilii.

Can. 691 – § 1. Professus a votis perpetuis indultum discedendi ab instituto ne petat, nisi ob gravissimas causas coram Domino perpensas; petitionem suam deferat supremo instituti Moderatori, qui eam una cum voto suo suique consilii auctoritati competenti transmittat.

§ 2. Huiusmodi indultum in institutis iuris pontificii Sedi Apostolicae reservatur; in institutis vero iuris dioecesani, id etiam Episcopus dioecesis, in qua domus assignationis sita est, concedere potest.

Can. 692 – Indultum discedendi legitime concessum et sodali notificatum, nisi in actu notificationis ab ipso sodale reiectum fuerit, ipso iure secumfert dispensationem a votis necnon ab omnibus obligationibus ex professione ortis.

§ 3. Аднак, калі манаская асоба на працягу тэрміну часовых абяцанняў пачне пакутаваць на псіхічнае расстройства, яна не можа быць звольнена з інстытута, нават калі яна не будзе здольнай скласці новыя абяцанні.

Кан. 690 – § 1. Той, хто пасля заканчэння навіцыяту або пасля заканчэння тэрміну часовых абяцанняў легітымна выйшаў з інстытута, можа быць зноў прыняты ў яго вярхоўным кіраўніком са згоды яго Рады без абавязку паўтараць навіцыят, гэты ж кіраўнік павінен акрэсліць тэрмін належнага выпрабавання перад складаннем часовых абяцанняў і працягласць часовых абяцанняў перад складаннем вечных абяцанняў, згодна з нормамі кан. 655 і 657.

§ 2. Такое ж паўнамоцтва мае настаяцель кляштара *sui iuris* са згоды сваёй Рады.

Кан. 691 – § 1. Асоба, якая склала вечныя абяцанні, не павінна прасіць аб індульце на выхад з інстытута, калі не па вельмі важкіх прычынах, разважаных перад абліччам Пана; сваё прашэнне яна павінна падаць вярхоўнаму кіраўніку інстытута, які перадасць яго кампетэнтнай уладзе разам са сваім меркаваннем і меркаваннем сваёй Рады.

§ 2. У інстытутах папскага права такі індульт зарэзерваваны за Апостальскай Сталіцай, а ў інстытутах дыяцэзіяльнага права яго можа ўдзяліць таксама біскуп дыяцэзіі, дзе знаходзіцца дом, да якога належыць гэтая асоба.

Кан. 692 – Калі легітымна ўдзелены індульт на выхад, аб якім член інстытута быў паведамлены, не быў адхілены самім членам інстытута пры паведамленні, ён на моцы самога права нясе з сабой дыспенсацыю ад абяцанняў і ад усіх абавязкаў, якія вынікаюць са складання абяцанняў.

Кан. 693 – Калі член інстытута з'яўляецца духоўнай асобай, індульт не ўдзяляецца раней, чым ён знойдзе біскупа, які інкардынуе яго ў дыяцэзію або, прынамсі, прыме на выпрабаванне. Калі ён быў прыняты на выпрабаванне, то праз пяць гадоў на моцы самога права інкардынуецца ў дыяцэзію, калі біскуп не адмовіць яму ў гэтым.

Can. 693 – Si sodalis sit clericus, indultum non conceditur priusquam inveniat Episcopum qui eum in dioecesi incardinet vel saltem ad experimentum recipiat. Si ad experimentum recipiatur, transacto quinquennio, ipso iure dioecesi incardinatur, nisi Episcopus eum recusaverit.

Артыкул 3. *Выдаленне з інстытута*

Кан. 694 – § 1. Праз сам факт выдаленым з інстытута з'яўляецца яго член, які:

1° юрыдычна пацверджаным чынам выракся каталіцкай веры;

2° заключыў або спрабаваў заключыць сужэнства, прынамсі грамадзянскае;

3° бесперапынна на працягу дванаццаці месяцаў нелегітымна адсутнічаў у манаскім доме, у адпаведнасці з кан. 665 § 2, а яго месцазнаходжанне было невядомым для членаў інстытута.

§ 2. У гэтых выпадках вышэйшы настаяцель разам са сваёй Радай павінны неадкладна, сабраўшы доказы, сцвердзіць факт, які адбыўся, каб аб выдаленні стала юрыдычна вядома.

§ 3. У выпадку, аб якім гаворыцца ў § 1, 3°, каб гэтае сцверджанне стала юрыдычна вядомым, яно павінна быць адобрана Святой Сталіцай; у інстытутах дыяцэзіяльнага права такое адабрэнне належыць біскупу галоўнай сядзібы інстытута.

Art. 3. *De dimissione sodalium*

Can. 694 – § 1. Ipso facto dimissus ab instituto habendus est sodalis qui:

1° a fide catholica notorie defecerit;

2° matrimonium contraxerit vel, etiam civiliter tantum, attentaverit;

3° a domo religiosa illegitime absens fuerit, secundum can. 665 § 2, duodecim continuos menses, prae oculis habita eiusdem sodalis irreperibilitate.

§ 2. His in casibus Superior maior cum suo consilio, nulla mora interposita, collectis probationibus, declarationem facti emittat, ut iuridice constet de dimissione.

§ 3. In casu de quo in § 1 n. 3, talis declaratio ut iuridice constet, a Sancta Sede confirmari debet; quod ad instituta iuris dioecesani attinet, confirmatio ad principis Sedis Episcopum spectat.

Кан. 695 – § 1. Член інстытута павінен быць выдалены за злачынствы, аб якіх гаворыцца ў кан. 1395, 1397 і 1398, калі — у выпадку злачынстваў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1395 § 2 і 3 і кан. 1398 § 1, — вышэйшы настаяцель не палічыць, што выдаленне не з'яўляецца безумоўна неабходным і можна іншым спосабам у дастатковай

Can. 695 – § 1. Sodalis dimitti debet ob delicta de quibus in cann. 1395, 1397 et 1398, nisi in delictis, de quibus in cann. 1395 §§ 2-3, et 1398 § 1, Superior maior censeat dimissionem non esse omnino necessariam et emendationi sodalis atque restitu-

tioni iustitiae et reparationi scandali satis alio modo consuli posse.

§ 2. Hisce in casibus, Superior maior, collectis probationibus circa facta et imputabilitatem, sodali dimittendo accusationem atque probationes significet, data eidem facultate sese defendendi. Acta omnia a Superiore maiore et a notario subscripta, una cum responsionibus sodalis scripto redactis et ab ipso sodale subscriptis, supremo Moderatori transmittantur.

Can. 696 – § 1. Sodalis dimitti etiam potest ob alias causas, dummodo sint graves, externae, imputabiles et iuridice comprobatae, uti sunt: habitualis neglectus obligationum vitae consecratae; iteratae violationes sacrorum vinculorum; pertinax inoboedientia legitimis praescriptis Superiorum in materia gravi; grave scandalum ex culpabili modo agendi sodalis ortum; pertinax sustentatio vel diffusio doctrinarum ab Ecclesiae magisterio damnatarum; publica adhaesio ideologiis materialismo vel atheismo infectis; illegitima absentia, de qua in can. 665, § 2, per semestre protracta; aliae causae similis gravitatis iure proprio instituti forte determinatae.

§ 2. Ad dimissionem sodalis a votis temporariis, etiam causae minoris gravitatis in iure proprio statutae sufficiunt.

Can. 697 – In casibus de quibus in can. 696, si Superior maior, audito suo consilio, censuerit processum dimissionis esse inchoandum:

меры дасягнуць выпраўлення члена інстытута, а таксама аднаўлення справядлівасці і ўстаранення спакусы.

§ 2. У гэтых выпадках вышэйшы настаяцель павінен, сабраўшы доказы фактаў і стану свядомасці, паведаміць члена інстытута, які будзе выдалены, аб абвінавачванні і доказах, даючы яму магчымасць абараняцца. Усе акты, падпісаныя вышэйшым настаяцелем і натарыусам, разам з пісьмовымі адказамі члена інстытута, падпісанымі ім самім, павінны быць перададзены вярхоўнаму кіраўніку.

Кан. 696 – § 1. Член інстытута можа быць выдалены і па іншых прычынах, калі толькі яны будуць важкімі, знешнімі, здзейсненымі ў стане свядомасці і юрыдычна даказанымі. Такімі прычынамі з'яўляюцца: пастаяннае занядбанне абавязкаў кансэкраванага жыцця; неаднаразовае парушэнне святых повязяў; упартая непаслухмянасць легітымным прадпісанням настаяцеляў у важкіх справах; цяжкая спакуса, якая ўзнікла па прычыне вінаватых паводзін члена інстытута; упартая падтрымка або распаўсюджванне вучэнняў, асуджаных Магістэрыем Касцёла; публічнае прыняцце ідэалогій, заражаных матэрыялізмам ці атэізмам; нелегітымная адсутнасць, аб якой гаворыцца ў кан. 665 § 2, якая працягвалася шэсць месяцаў; іншыя прычыны падобнай важкасці, якія могуць быць акрэслены ўласным правам інстытута.

§ 2. Для выдалення члена інстытута, які склаў часовыя абяцанні, дастаткова і менш важкіх прычын, устаноўленых ва ўласным праве.

Кан. 697 – Калі ў выпадках, аб якіх гаворыцца ў кан. 696, вышэйшы настаяцель, выслухаўшы сваю Раду, палічыць неабходным пачаць працэс аб выдаленні, ён павінен:

1° сабраць або дапоўніць доказы;

2° пісьмова або ў прысутнасці двух сведкаў вынесці члену інстытута папярэджанне з яўнай пагрозай выдалення, якое будзе выканана, калі ён не выправіцца, выразна ўказваючы прычыну выдалення і даючы члену інстытута поўную магчымасць абараняцца. Калі гэтае папярэджанне акажацца дарэмным, настаяцель павінен вынесці другое папярэджанне, але не раней чым праз пятнаццаць дзён пасля першага;

3° калі і гэтае папярэджанне акажацца дарэмным і вышэйшы настаяцель са сваёй Радай палічаць, што адсутнасць выпраўлення з'яўляецца пэўнай, а абарона члена інстытута недастатковай, то пасля таго, як дарэмна пройдзе пятнаццаць дзён пасля апошняга папярэджання, усе акты, падпісаныя самім вышэйшым настаяцелем і натарыусам, разам з адказамі члена інстытута, падпісанымі ім самім, павінны быць перададзены вярхоўнаму кіраўніку.

1° probationes colligat vel compleat;

2° sodalem scripto vel coram duobus testibus moneat cum explicita comminatione subsecuturae dimissionis nisi resipiscat, clare significata causa dimissionis et data sodali plena facultate sese defendendi; quod si monitio incassum cedat, ad alteram monitionem, spatio saltem quindecim dierum interposito, procedat;

3° si haec quoque monitio incassum ceciderit et Superior maior cum suo consilio censuerit de incorrigibilitate satis constare et defensiones sodalis insufficientes esse, post quindecim dies ab ultima monitione frustra elapsos, acta omnia ab ipso Superiore maiore et a notario subscripta una cum responsionibus sodalis ab ipso sodale subscriptis supremo Moderatori transmittat.

Кан. 698 – Ва ўсіх выпадках, аб якіх гаворыцца ў кан. 695 і 696, заўсёды захоўваецца непарушнае права члена інстытута на сувязь з вярхоўным кіраўніком і непасрэднае прадстаўленне яму сваёй абароны.

Can. 698 – In omnibus casibus, de quibus in cann. 695 et 696, firmum semper manet ius sodalis cum supremo Moderatore communicandi et illi directe suas defensiones exhibendi.

Кан. 699 – § 1. Вярхоўны кіраўнік са сваёй Радай, якая для дзейснасці павінна складацца, прынамсі, з чатырох членаў, павінен калегіяльна прыступіць да дакладнага разгляду доказаў, аргументаў і абароны і калі, пасля тайнага галасавання, будзе прынята такое рашэнне, павінен выдаць дэкрэт аб выдаленні, які, для дзейснасці, павінен змяшчаць, прынамсі ў агульных рысах, юрыдычныя і фактычныя матывы гэтага рашэння.

§ 2. У кляштарах *sui iuris*, аб якіх гаворыцца ў кан. 615, права прымаць рашэнне

Can. 699 – § 1. Supremus Moderator cum suo consilio, quod ad validitatem saltem quattuor membris constare debet, collegialiter procedat ad probationes, argumenta et defensiones accurate perpendenda, et si per secretam suffragationem id decisum fuerit, decretum dimissionis ferat, expressis ad validitatem saltem summarie motivis in iure et in facto.

§ 2. In monasteriis sui iuris, de quibus in can. 615, dimissionem sodalis

professi decernere pertinet ad Superiorem Maiorem, de consensu eius Consilii.

Can. 700 – Decretum dimissionis in sodalem professum latum vim habet simul ac ei, cuius interest, notificatur. Decretum vero, ut valeat, indicare debet ius, quo dimissus gaudet, recurrendi, absque petitione de qua in can. 1734, § 1, intra triginta dies a recepta notificatione ad auctoritatem competentem. Recursus effectum habet suspensivum.

Can. 701 – Legitima dimissione ipso facto cessant vota necnon iura et obligationes ex professione promanantia. Si tamen sodalis sit clericus, sacros ordines exercere nequit, donec Episcopum inveniat qui eum post congruam probationem in dioecesi, ad normam can. 693, recipiat vel saltem exercitium sacrorum ordinum permittat.

Can. 702 – § 1. Qui ex instituto religioso legitime egrediantur vel ab eo legitime dimissi fuerint, nihil ab eodem repetere possunt ob quamlibet operam in eo praestitam.

§ 2. Institutum tamen aequitatem et evangelicam caritatem servet erga sodalem, qui ab eo separatur.

Can. 703 – In casu gravis scandali exterioris vel gravissimi nocumenti instituto imminentis, sodalis statim a Superiore maiore vel, si periculum sit in mora, a Superiore locali cum consensu sui consilii e domo religiosa eici potest. Superior maior, si opus sit, dimissionis processum ad normam iuris instituendum curet, aut rem Sedi Apostolicae deferat.

аб выдаленні належыць вышэйшаму настаяцелю са згоды яго Рады.

Кан. 700 – Дэкрэт аб выдаленні члена інстытута набывае моц ад моманту, калі зацікаўленая асоба была аб ім паведамлена. Для таго, каб дэкрэт быў дзейсным, павінен змяшчаць указанне на права выдаленага звяртацца без просьбы, аб якой гаворыцца ў кан. 1734 § 1, да кампетэнтнай улады з рэкурсам на працягу трыццаці дзён пасля атрымання паведамлення. Рэкурс мае прыпыняючае дзеянне.

Кан. 701 – Праз сам факт легітымнага выдалення спыняюцца абяцанні, а таксама правы і абавязкі, якія вынікалі з іх складання. Аднак, калі член інстытута з'яўляецца духоўнай асобай, ён не можа ажыццяўляць святое пасвячэнне, пакуль не знойдзе біскупа, які, пасля адпаведнага выпрабавання згодна з нормай кан. 693, прыме яго ў дыяцэзію або, прынамсі, дазволіць ажыццяўляць святое пасвячэнне.

Кан. 702 – § 1. Тыя, хто легітымна пакінуў манаскі інстытут або быў з яго легітымна выдалены, не могуць нічога патрабаваць ад інстытута за любую выкананую ў ім працу.

§ 2. Аднак інстытут павінен захоўваць адпаведнасць і евангельскую любоў у адносінах да свайго члена, які быў з яго выключаны.

Кан. 703 – У выпадку цяжкай знешняй спакусы або вельмі важкай шкоды, якая пагражае інстытуту, член інстытута можа быць неадкладна выгнаны з манаскага дома вышэйшым настаяцелем ці, калі затрымка становіцца небяспечнай, мясцовым настаяцелем са згоды яго Рады. Вышэйшы настаяцель, калі неабходна, павінен паклапаціцца аб тым, каб пачаць працэс аб выдаленні згодна з нормамі права або перадаць справу Апостальскай Сталіцы.

Кан. 704 – Пра членаў інстытута, якія любым чынам былі з яго выключаны, трэба ўзгадаць у справаздачы, якая складаецца Апостальскай Сталіцы, аб чым гаворыцца ў кан. 592 § 1.

Can. 704 – De sodalibus, qui ab instituto sunt quoquo modo separati, fiat mentio in relatione Sedi Apostolicae mittenda, de qua in can. 592, § 1.

Раздзел VII
Манаскія асобы, узведзеныя ў біскупы

Caput VII
De religiosis ad episcopatum evectis

Кан. 705 – Манаская асоба, узведзеная ў біскупскую годнасць, застаецца членам свайго інстытута, аднак на моцы абяцання паслухмянасці падпарадкавана толькі Рымскаму Пантыфіку і не звязана тымі абавязкамі, якія, па яе разважлівым суджэнні, з'яўляюцца несумяшчальнымі з яе становішчам.

Can. 705 – Religiosus ad episcopatum evectus instituti sui sodalis remanet, sed vi voti oboedientiae uni Romano Pontifici obnoxius est, et obligationibus non adstringitur, quas ipse prudenter iudicet cum sua condicione componi non posse.

Кан. 706 – Манаская асоба, пра якую гаворка вышэй:

1° у выпадку, калі праз складанне абяцанняў яна страціла права мець маёмасць ва ўласнасці, мае права карыстацца маёмасцю, якая ёй дастаецца, і даходамі, якія могуць быць з яе атрыманы, а таксама адміністраваць ёю. Дыяцэзіяльны біскуп і іншыя, аб якіх гаворыцца ў кан. 381 § 2, набываюць уласнасць для партыкулярнага Касцёла; іншыя — для інстытута або для Святой Сталіцы ў залежнасці ад таго, ці мае інстытут права мець уласнасць;

2° у выпадку, калі праз складанне абяцанняў яна не страціла права мець маёмасць ва ўласнасці, да яе вяртаецца права карыстацца маёмасцю, якая ёй належала, і даходамі, якія могуць быць з яе атрыманы, а таксама адміністраваць ёю; а ўсё, што дастанецца ёй у будучым, яна набывае для сябе;

Can. 706 – Religiosus de quo supra:

1° si per professionem dominium bonorum amiserit, bonorum quae ipsi obveniant habet usum, usumfructum et administrationem; proprietatem vero Episcopus dioecesanus aliique, de quibus in can. 381, § 2, acquirunt Ecclesiae particulari; ceteri, instituto vel Sanctae Sedi, prout institutum capax est possidendi vel minus;

2° si per professionem dominium bonorum non amiserit, bonorum, quae habebat, recuperat usum, usumfructum et administrationem; quae postea ipsi obveniant, sibi plene acquirit;

3° in utroque autem casu de bonis, quae ipsi obveniant non intuitu personae, disponere debet secundum offerentium voluntatem.

Can. 707 – § 1. Religiosus Episcopus emeritus habitationis sedem sibi eligere potest etiam extra domos sui instituti, nisi aliud a Sede Apostolica provisum fuerit.

§ 2. Quoad eius congruam et dignam sustentationem, si cuidam dioecesi inserviverit, servetur can. 402, § 2, nisi institutum proprium talem sustentationem providere voluerit; secus Sedes Apostolica aliter provideat.

3° аднак у абодвух выпадках маёмасцю, якую яна атрымлівае не з увагі на яе асобу, яна павінна распараджацца ў адпаведнасці з воляй ахвярадаўцаў.

Кан. 707 – § 1. Манаская асоба, якая стала біскупам-эмэрытам, можа выбраць для сябе месца жыхарства таксама і па-за дамамі свайго інстытута, калі Апостальская Сталіца не прадугледзела іншае.

§ 2. Што датычыць належнага і годнага ўтрымання гэтай асобы, то, калі яна служыла ў якой-небудзь дыяцэзіі, павінен быць захаваны кан. 402 § 2, калі ўласны інстытут не выразіць жаданне запэўніць ёй такое ўтрыманне; у іншых выпадках Апостальская Сталіца павінна вырашыць справу іншым спосабам.

Caput VIII
De conferentiis superiorum maiorum

Can. 708 – Superiores maiores utiliter in conferentiis seu consiliis consociari possunt ut, collatis viribus, allaborent sive ad finem singulorum institutorum plenius assequendum, salvis semper eorum autonomia, indole proprioque spiritu, sive ad communia negotia pertractanda, sive ad congruam coordinationem et cooperationem cum Episcoporum conferentiis et etiam cum singulis Episcopis instaurandam.

Can. 709 – Conferentiae Superiorum maiorum sua habeant statuta a Sancta Sede approbata, a qua unice, etiam in personam iuridicam, erigi possunt et sub cuius supremo moderamine manent.

Раздзел VIII
Канферэнцыі вышэйшых настаяцеляў

Кан. 708 – Вышэйшыя настаяцелі з карысцю для справы могуць аб'ядноўвацца ў канферэнцыі, іншымі словамі — рады, каб сумеснымі намаганнямі або працаваць над больш поўным дасягненнем мэтаў кожнага інстытута, заўсёды пры гэтым захоўваючы іх аўтаномію, уласцівы характар і дух, або разглядаць агульныя справы, або ўстанаўліваць належную каардынацыю і супрацоўніцтва з Канферэнцыямі Біскупаў, а таксама з асобнымі біскупамі.

Кан. 709 – Канферэнцыі вышэйшых настаяцеляў павінны мець свае статуты, зацверджаныя Святой Сталіцай; толькі Святая Сталіца можа засноўваць іх у якасці юрыдычных асобаў, і яны застаюцца пад яго вярхоўным кіраваннем.

ТЫТУЛ III
СЕКУЛЯРНЫЯ ІНСТЫТУТЫ

Кан. 710 – Секулярны інстытут — гэта інстытут кансэкраванага жыцця, у якім вернікі, жывучы ў свеце, імкнуцца да дасканаласці любові і стараюцца садзейнічаць асвячэнню свету, перадусім знутры.

Кан. 711 – Член секулярнага інстытута на моцы сваёй кансэкрацыі не змяняе ўласнага кананічнага стану ў Божым народзе, свецкага або духоўнага, пры гэтым захоўвае прадпісанні права, якія адносяцца да інстытутаў кансэкраванага жыцця.

Кан. 712 – Захоўваючы прадпісанні кан. 598–601, канстытуцыі павінны ўстанавіць святыя повязі, праз якія ў інстытуце прымаюцца евангельскія парады, і акрэсліць абавязкі, якія вынікаюць з гэтых повязяў, аднак заўсёды захоўваючы секулярны лад жыцця, уласцівы інстытуту.

Кан. 713 – § 1. Члены гэтых інстытутаў выражаюць і ажыццяўляюць уласную кансэкрацыю праз апостальскую дзейнасць і, як закваска, імкнуцца прасякнуць усё евангельскім духам дзеля ўмацавання і ўзрастання Хрыстовага цела.

§ 2. Члены інстытута, якія з'яўляюцца свецкімі асобамі, удзельнічаюць у евангелізацыйным заданні Касцёла ў свеце і са свету: або праз сведчанне хрысціянскага жыцця і вернасць сваёй кансэкрацыі, або праз удзел ва ўпарадкаванні спраў гэтага свету паводле Божай волі і змяненні свету моцай Евангелля. Яны ахвяруюць таксама сваё супрацоўніцтва ў служэнні касцёльнай супольнасці паводле ўласнага секулярнага ладу жыцця.

§ 3. Члены інстытута, якія з'яўляюцца духоўнымі асобамі, праз сведчанне кансэ-

TITULUS III
DE INSTITUTIS SAECULARIBUS

Can. 710 – Institutum saeculare est institutum vitae consecratae, in quo christifideles in saeculo viventes ad caritatis perfectionem contendunt atque ad mundi sanctificationem praesertim ab intus conferre student.

Can. 711 – Instituti saecularis sodalis vi suae consecrationis propriam in populo Dei canonicam condicionem, sive laicalem sive clericalem, non mutat, servatis iuris praescriptis quae instituta vitae consecratae respiciunt.

Can. 712 – Firmis praescriptis cann. 598-601, constitutiones statuant vincula sacra, quibus evangelica consilia in instituto assumuntur, et definiant obligationes quas eadem vincula inducunt, servata tamen in vitae ratione semper propria instituti saecularitate.

Can. 713 – § 1. Sodales horum institutorum propriam consecrationem in actuositate apostolica exprimunt et exercent, iidemque, ad instar fermenti, omnia spiritu evangelico imbuere satagunt ad robur et incrementum Corporis Christi.

§ 2. Sodales laici, munus Ecclesiae evangelizandi, in saeculo et ex saeculo, participant sive per testimonium vitae christianae et fidelitatis erga suam consecrationem, sive per adiutricem quam praebent operam ad ordinandas secundum Deum res temporales atque ad mundum virtute Evangelii informandum. Suam etiam cooperationem, iuxta propriam vitae rationem saecularem, in communitatis ecclesialis servitium offerunt.

§ 3. Sodales clerici per vitae consecratae testimonium, praesertim

in presbyterio, peculiari caritate apostolica confratribus adiutorio sunt, et in populo Dei mundi sanctificationem suo sacro ministerio perficiunt.

краванага жыцця, перадусім у прэзбітэрыі, дапамагаюць сабратам асаблівай апостальскай любоўю, а праз сваю святую паслугу здзяйсняюць у Божым народзе асвячэнне свету.

Can. 714 – Sodales vitam in ordinariis mundi condicionibus vel soli, vel in sua quisque familia, vel in vitae fraternae coetu, ad normam constitutionum ducant.

Кан. 714 – Члены секулярных інстытутаў павінны весці жыццё згодна з нормамі канстытуцый у звычайных умовах свету: або асобна, або кожны ў сваёй сям'і, або ў супольнасці братэрскага жыцця.

Can. 715 – § 1. Sodales clerici in dioecesi incardinati ab Episcopo dioecesano dependent, salvis iis quae vitam consecratam in proprio instituto respiciunt.

Кан. 715 – § 1. Члены інстытута, якія з'яўляюцца духоўнымі асобамі, будучы інкардынаванымі ў дыяцэзію, падпарадкаваны дыяцэзіяльнаму біскупу, захоўваючы тое, што адносіцца да кансэкраванага жыцця ва ўласным інстытуце.

§ 2. Qui vero ad normam can. 266, § 3 instituto incardinantur, si ad opera instituti propria vel ad regimen instituti destinentur, ad instar religiosorum ab Episcopo dependent.

§ 2. Тыя, хто, будучы інкардынаванымі ў інстытут згодна з нормай кан. 266 § 3, прызначаны да працы ва ўласным інстытуце або да кіравання інстытутам, падпарадкаваны біскупу такім чынам, як манаскія асобы.

Can. 716 – § 1. Sodales omnes vitam instituti, secundum ius proprium, actuose participent.

Кан. 716 – § 1. Усе члены інстытута павінны чынна ўдзельнічаць у яго жыцці, згодна з уласным правам.

§ 2. Eiusdem instituti sodales communionem inter se servent, sollicite curantes spiritus unitatem et genuinam fraternitatem.

§ 2. Члены аднаго інстытута павінны захоўваць адзінства паміж сабой, праяўляючы старанны клопат аб еднасці духа і сапраўдным братэрстве.

Can. 717 – § 1. Constitutiones proprium regiminis modum praescribant, tempus quo Moderatores suo officio fungantur et modum quo iidem designantur definiant.

Кан. 717 – § 1. Канстытуцыі павінны прадпісваць уласны спосаб кіравання і тэрмін, на працягу якога кіраўнікі выконваюць сваю пасаду, а таксама акрэсліваць парадак іх вызначэння.

§ 2. Nemo in Moderatorem supremum designetur, qui non sit definitive incorporatus.

§ 2. Не можа быць вызначаны на пасаду вярхоўнага кіраўніка той, хто яшчэ не ўключаны канчаткова ў інстытут.

§ 3. Qui regimini instituti praepositi sunt, curent ut eiusdem spiritus unitas servetur et actuosa sodalium participatio promoveatur.

§ 3. Той, хто ўзначальвае кіраванне інстытутам, павінен клапаціцца аб захоўванні еднасці яго духу і спрыянні дзейнаму ўдзелу членаў інстытута ў яго жыцці.

Кан. 718 – Адміністраванне маёмасцю інстытута, якое павінна выражаць і падтрымліваць евангельскае ўбоства, ажыццяўляецца згодна з нормамі Кнігі V «Маёмасць Касцёла» і ўласным правам інстытута. Уласнае права інстытута павінна таксама акрэсліваць абавязацельствы інстытута, перадусім эканамічныя, адносна яго членаў, які працуюць для яго.

Кан. 719 – § 1. Для таго, каб члены інстытута маглі верна адказваць на сваё пакліканне, а іх апостальская дзейнасць вынікала з еднасці з Хрыстом, яны павінны рупліва маліцца, адпаведным чынам чытаць Святое Пісанне, штогод захоўваць час засяроджвання і выконваць іншыя духоўныя практыкаванні паводле ўласнага права.

§ 2. Цэлебрацыя Эўхарыстыі, па магчымасці штодзённая, павінна быць крыніцай і сілай усяго іх кансэкраванага жыцця.

§ 3. Яны могуць свабодна прыступаць да сакрамэнту пакаяння і павінны часта ім карыстацца.

§ 4. Яны могуць свабодна выбіраць неабходнае духоўнае кіраўніцтва, а, калі пажадаюць, таксама прасіць парады ў такіх пытаннях у сваіх кіраўнікоў.

Кан. 720 – Права прымаць у інстытут, або на выпрабаванне, або для прыняцця святых повязяў, як часовых, так і канчатковых, належыць вышэйшым кіраўнікам і іх радам, згодна з нормамі канстытуцый.

Кан. 721 – § 1. Нядзейсна прымаецца на пачатковае выпрабаванне:

1° той, хто яшчэ не дасягнуў паўналецця;

2° той, хто актуальна звязаны святымі повязямі ў якім-небудзь інстытуце кансэкраванага жыцця або ўключаны ў таварыства апостальскага жыцця;

3° сужэнец у час трывання сужэнства.

Can. 718 – Administratio bonorum instituti, quae paupertatem evangelicam exprimere et fovere debet, regitur normis Libri V *De bonis Ecclesiae temporalibus* necnon iure proprio instituti. Item ius proprium definiat obligationes praesertim oeconomicas instituti erga sodales, qui pro ipso operam impendunt.

Can. 719 – § 1. Sodales, ut vocationi suae fideliter respondeant eorumque actio apostolica ex ipsa unione cum Christo procedat, sedulo orationi vacent, sacrarum Scripturarum lectioni apto modo incumbant, annua recessus tempora servent atque alia spiritualia exercitia iuxta ius proprium peragant.

§ 2. Eucharistiae celebratio, quantum fieri potest cotidiana, sit totius eorum vitae consecratae fons et robur.

§ 3. Libere ad sacramentum paenitentiae accedant, quod frequenter recipiant.

§ 4. Necessarium conscientiae moderamen libere obtineant atque huius generis consilia a suis etiam Moderatoribus, si velint, requirant.

Can. 720 – Ius admittendi in institutum, vel ad probationem vel ad sacra vincula sive temporaria sive perpetua aut definitiva assumenda, ad Moderatores maiores cum suo consilio ad normam constitutionum pertinet.

Can. 721 – § 1. Invalide admittitur ad initialem probationem:

1° qui maiorem aetatem nondum attigerit;

2° qui sacro vinculo in aliquo instituto vitae consecratae actu obstringitur, aut in societate vitae apostolicae incorporatus est;

3° coniux durante matrimonio.

§ 2. Constitutiones possunt alia admissionis impedimenta etiam ad validitatem statuere vel condiciones apponere.

§ 3. Praeterea, ut quis recipiatur, habeat oportet maturitatem, quae ad vitam instituti propriam recte ducendam est necessaria.

Can. 722 – § 1. Probatio initialis eo ordinetur, ut candidati suam divinam vocationem et quidem instituti propriam aptius cognoscant iidemque in spiritu et vivendi modo instituti exerceantur.

§ 2. Ad vitam secundum evangelica consilia ducendam candidati rite instituantur atque ad eandem integre in apostolatum convertendam edoceantur, eas adhibentes evangelizationis formas, quae instituti fini, spiritui et indoli magis respondeant.

§ 3. Huius probationis modus et tempus ante sacra vincula in instituto primum suscipienda, biennio non brevius, in constitutionibus definiantur.

Can. 723 – § 1. Elapso probationis initialis tempore, candidatus qui idoneus iudicetur, tria consilia evangelica, sacro vinculo firmata, assumat vel ab instituto discedat.

§ 2. Quae prima incorporatio, quinquennio non brevior, ad normam constitutionum temporaria sit.

§ 3. Huius incorporationis tempore elapso, sodalis, qui idoneus iudicetur, admittatur ad incorporationem perpetuam vel definitivam, vinculis scilicet temporariis semper renovandis.

§ 2. Канстытуцыі могуць устанаўліваць таксама іншыя перашкоды да прыняцця ў інстытут, нават для дзейснасці, або далучаць умовы.

§ 3. Апрача таго, для прыняцця патрабуецца, каб асоба мела адпаведную сталасць, неабходную для належнага вядзення жыцця, уласцівага інстытуту.

Кан. 722 – § 1. Пачатковае выпрабаванне прызначана для таго, каб кандыдаты лепш пазнавалі сваё Божае пакліканне, уласцівае інстытуту, і практыкаваліся ў духу і спосабе жыцця інстытута.

§ 2. Кандыдаты павінны быць належным чынам навучаны, як весці жыццё паводле евангельскіх парадаў і як яго поўнасцю перамяніць у апостальства, выкарыстоўваючы тыя формы евангелізацыі, якія найбольш адпавядаюць мэце, духу і характару інстытута.

§ 3. Парадак і працягласць гэтага выпрабавання перад першым прыняццем святых повязяў у інстытуце — не менш чым два гады — павінны быць акрэслены ў канстытуцыях.

Кан. 723 – § 1. Калі пасля заканчэння пачатковага выпрабавання кандыдат будзе прызнаны прыдатным, ён павінен прыняць тры евангельскія парады, змацоўваючы іх святымі повязямі, або пакінуць інстытут.

§ 2. Гэтае першае ўключэнне ў інстытут, працягласцю не менш чым пяць гадоў, згодна з нормамі канстытуцый павінна быць часовым.

§ 3. Пасля заканчэння тэрміну гэтага ўключэння член інстытута, які будзе прызнаны прыдатным, павінен быць дапушчаны да вечнага або канчатковага ўключэння, гэтае апошняе здзяйсняецца праз пастаяннае ўзнаўлянне часовых повязяў.

§ 4. У тым, што датычыць юрыдычных наступстваў, устаноўленых канстытуцыямі, канчатковае ўключэнне прыраўноўваецца да вечнага.

Кан. 724 – § 1. Неабходна, каб пасля першага прыняцця святых повязяў падрыхтоўка пастаянна працягвалася паводле канстытуцый.

§ 2. Члены інстытута павінны атрымліваць падрыхтоўку як у справах Божых, так і чалавечых, а кіраўнікі інстытута павінны праяўляць старанны клопат аб іх духоўнай фармацыі.

Кан. 725 – Інстытут можа прылучаць да сябе праз акрэсленыя повязі, вызначаныя ў канстытуцыях, іншых вернікаў, якія імкнуцца да евангельскай дасканаласці паводле духу інстытута і ўдзельнічаюць у яго місіі.

Кан. 726 – § 1. Пасля заканчэння тэрміну часовага ўключэння член інстытута мае права свабодна пакінуць інстытут, або вышэйшы кіраўнік, выслухаўшы сваю Раду, можа па справядлівай прычыне не дапусціць яго да ўзнаўлення святых повязяў.

§ 2. Падчас трывання часовага ўключэння член інстытута можа па ўласнай просьбе атрымаць ад вярхоўнага кіраўніка са згоды яго Рады, па важкай прычыне, індульт на выхад.

Кан. 727 – § 1. Калі інстытут з'яўляецца інстытутам папскага права, вечна ўключаны член інстытута, які жадае пакінуць інстытут, сур'ёзна разважыўшы гэтую справу перад Панам, павінен прасіць у Апостальскай Сталіцы праз вярхоўнага кіраўніка індульт на выхад; у іншым выпадку ён можа звяртацца таксама да дыяцэзіяльнага біскупа ў залежнасці ад таго, як акрэслена ў канстытуцыях.

§ 4. Incorporatio definitiva, quoad certos effectus iuridicos in constitutionibus statuendos, perpetuae aequiparatur.

Can. 724 – § 1. Institutio post vincula sacra primum assumpta iugiter secundum constitutiones est protrahenda.

§ 2. Sodales in rebus divinis et humanis pari gressu instituantur; de continua vero eorum spirituali formatione seriam habeant curam instituti Moderatores.

Can. 725 – Institutum sibi associare potest, aliquo vinculo in constitutionibus determinato, alios christifideles, qui ad evangelicam perfectionem secundum spiritum instituti contendant eiusdemque missionem participent.

Can. 726 – § 1. Elapso tempore incorporationis temporariae, sodalis institutum libere derelinquere valet vel a sacrorum vinculorum renovatione iusta de causa a Moderatore maiore, audito suo consilio, excludi potest.

§ 2. Sodalis temporariae incorporationis id sponte petens, indultum discedendi a supremo Moderatore de consensu sui consilii gravi de causa obtinere valet.

Can. 727 – § 1. Sodalis perpetue incorporatus, qui institutum derelinquere velit, indultum discedendi, re coram Domino serio perpensa, a Sede Apostolica per Moderatorem supremum petat, si institutum est iuris pontificii; secus etiam ab Episcopo dioecesano, prout in constitutionibus definitur.

§ 2. Si agatur de clerico instituto incardinato, servetur praescriptum can. 693.

§ 2. Калі гаворка ідзе пра духоўную асобу, інкардынаваную ў інстытут, трэба захоўваць прадпісанні кан. 693.

Can. 728 – Indulto discedendi legitime concesso, cessant omnia vincula necnon iura et obligationes ab incorporatione promanantia.

Кан. 728 – Пасля таго, як індульт на выхад быў легітымна ўдзелены, спыняюцца ўсе повязі, а таксама правы і абавязкі, якія вынікалі з уключэння.

Can. 729 – Sodalis ab instituto dimittitur ad normam cann. 694 § 1, 1 et 2 atque 695; constitutiones praeterea determinent alias causas dimissionis, dummodo sint proportionate graves, externae, imputabiles et iuridice comprobatae, atque modus procedendi servetur in cann. 697-700 statutus. Dimisso applicatur praescriptum can. 701.

Кан. 729 – Член інстытута можа быць выдалены з яго згодна з нормамі кан. 694 § 1, 1° і 2° і 695; апрача гэтага, канстытуцыі могуць акрэсліваць іншыя прычыны выдалення, калі толькі яны будуць прапарцыянальна важкімі, знешнімі, здзейсненымі ў стане свядомасці і юрыдычна даказанымі; павінен быць таксама захаваны парадак дзеянняў, устаноўлены ў кан. 697–700. У дачыненні да выдаленага прымяняецца прадпісанне кан. 701.

Can. 730 – Ut sodalis instituti saecularis ad aliud institutum saeculare transeat, serventur praescripta cann. 684, §§ 1, 2, 4 et 685; ut vero ad institutum religiosum vel ad societatem vitae apostolicae aut ex illis ad institutum saeculare fiat transitus, licentia requiritur Sedis Apostolicae, cuius mandatis standum est.

Кан. 730 – Для таго, каб член аднаго секулярнага інстытута мог перайсці ў іншы секулярны інстытут, трэба захоўваць прадпісанні кан. 684 § 1, 2, 4 і 685; аднак, каб здзейсніць пераход у манаскі інстытут або ў таварыства апостальскага жыцця ці з іх у секулярны інстытут, патрабуецца дазвол Апостальскай Сталіцы, пастановаў якой трэба прытрымлівацца.

SECTIO II

DE SOCIETATIBUS VITAE APOSTOLICAE

СЕКЦЫЯ II

ТАВАРЫСТВЫ АПОСТАЛЬСКАГА ЖЫЦЦЯ

Can. 731 – § 1. Institutis vitae consecratae accedunt societates vitae apostolicae, quarum sodales, sine votis religiosis, finem apostolicum societatis proprium prosequuntur et, vitam fraternam in communi ducentes, secundum propriam vitae rationem, per observantiam constitutionum ad perfectionem caritatis tendunt.

Кан. 731 – § 1. Да інстытутаў кансэкраванага жыцця падобны таварыствы апостальскага жыцця, члены якіх — не маючы манаскіх абяцанняў — ажыццяўляюць уласную апостальскую мэту таварыства, вядуць братэрскае жыццё ў супольнасці паводле ўласнага ладу жыцця і праз выкананне канстытуцый імкнуцца да дасканалай любові.

§ 2. Сярод іх ёсць таварыствы, члены якіх прымаюць евангельскія парады праз акрэсленыя повязі, вызначаныя ў канстытуцыях.

Кан. 732 – Тое, што пастаноўлена ў кан. 578–597 і 606, прымяняецца і да таварыстваў апостальскага жыцця, захоўваючы пры гэтым прыроду кожнага з іх; а да таварыстваў, аб якіх гаворыцца ў кан. 731 § 2, прымяняюцца кан. 598–602.

Кан. 733 – § 1. Заснаванне дома і ўстанаўленне мясцовай супольнасці належыць да кампетэнтнай улады таварыства, якая павінна атрымаць папярэднюю пісьмовую згоду дыяцэзіяльнага біскупа, з якім таксама трэба кансультавацца, калі справа датычыць іх ліквідацыі.

§ 2. Згода на заснаванне дома нясе з сабой права мець прынамсі араторый, у якім будзе цэлебравацца Эўхарыстыя і будзе захоўвацца Найсвяцейшы Сакрамэнт.

Кан. 734 – Кіраванне таварыствам акрэсліваецца канстытуцыямі, захоўваючы, адпаведна прыродзе кожнага таварыства, прадпісанні кан. 617–633.

Кан. 735 – § 1. Прыём, выпрабаванне, уключэнне і падрыхтоўка членаў таварыства акрэсліваюцца ўласным правам кожнага таварыства.

§ 2. У тым, што датычыць прыёму ў таварыства, павінны захоўвацца ўмовы, устаноўленыя ў кан. 624–645.

§ 3. Уласнае права павінна акрэсліваць парадак выпрабавання і падрыхтоўкі, дастасаваны да мэты і характару таварыства, перадусім у тым, што датычыць навучання, духоўнасці і апостальства, каб члены таварыства, распазнаўшы Божае пакліканне, належным чынам падрыхтаваліся да ўдзелу ў місіі і жыцці таварыства.

§ 2. Inter has sunt societates in quibus sodales, aliquo vinculo constitutionibus definito, consilia evangelica assumunt.

Can. 732 – Quae in cann. 578-597, et 606 statuuntur, societatibus vitae apostolicae applicantur, salva tamen uniuscuiusque societatis natura; societatibus vero, de quibus in can. 731, § 2, etiam cann. 598-602 applicantur.

Can. 733 – § 1. Domus erigitur et communitas localis constituitur a competenti auctoritate societatis, praevio consensu Episcopi dioecesani in scriptis dato, qui etiam consuli debet, cum agitur de eius suppressione.

§ 2. Consensus ad erigendam domum secumfert ius habendi saltem oratorium, in quo sanctissima Eucharistia celebretur et asservetur.

Can. 734 – Regimen societatis a constitutionibus determinatur, servatis, iuxta naturam uniuscuiusque societatis, cann. 617-633.

Can. 735 – § 1. Sodalium admissio, probatio, incorporatio et institutio determinantur iure proprio cuiusque societatis.

§ 2. Ad admissionem in societatem quod attinet, serventur condiciones in cann. 642-645 statutae.

§ 3. Ius proprium determinare debet rationem probationis et institutionis fini et indoli societatis accommodatam, praesertim doctrinalem, spiritualem et apostolicam, ita ut sodales vocationem divinam agnoscentes ad missionem et vitam societatis apte praeparentur.

Can. 736 – § 1. In societatibus clericalibus clerici ipsi societati incardinantur, nisi aliter ferant constitutiones.

§ 2. In iis quae ad rationem studiorum et ad ordines suscipiendos pertinent, serventur normae clericorum saecularium, firma tamen § 1.

Can. 737 – Incorporatio secumfert ex parte sodalium obligationes et iura in constitutionibus definita, ex parte autem societatis, curam sodales ad finem propriae vocationis perducendi, iuxta constitutiones.

Can. 738 – § 1. Sodales omnes subsunt propriis Moderatoribus ad normam constitutionum in iis quae vitam internam et disciplinam societatis respiciunt.

§ 2. Subsunt quoque Episcopo dioecesano in iis quae cultum publicum, curam animarum aliaque apostolatus opera respiciunt, attentis cann. 679-683.

§ 3. Relationes sodalis dioecesi incardinati cum Episcopo proprio constitutionibus vel particularibus conventionibus definiuntur.

Can. 739 – Sodales, praeter obligationes quibus, uti sodales, obnoxii sunt secundum constitutiones, communibus obligationibus clericorum adstringuntur, nisi ex natura rei vel ex contextu sermonis aliud constet.

Can. 740 – Sodales habitare debent in domo vel in communitate legitime constituta et servare vitam communem, ad normam iuris proprii, quo

Кан. 736 – § 1. У святарскіх таварыствах духоўныя асобы інкардынуюцца ў само таварыства, калі канстытуцыі не прадугледжваюць іншае.

§ 2. У тым, што датычыць плана падрыхтоўкі і прыняцця пасвячэння, павінны прымяняцца нормы, якія адносяцца да секулярных духоўных асобаў, захоўваючы пры гэтым § 1.

Кан. 737 – Для члена таварыства ўключэнне нясе з сабой абавязкі і правы, акрэсленыя ў канстытуцыях, а для таварыства — клопат аб тым, каб прывесці членаў таварыства да мэты ўласнага паклікання, згодна з канстытуцыямі.

Кан. 738 – § 1. Усе члены таварыства падпарадкаваны ўласным кіраўнікам згодна з нормамі канстытуцый у тым, што адносіцца да ўнутранага жыцця і дысцыпліны таварыства.

§ 2. Яны падпарадкаваны таксама дыяцэзіяльнаму біскупу ў тым, што адносіцца да публічнага культу, душпастырства і іншых спраў апостальства, беручы пад увагу кан. 679–683.

§ 3. Адносіны паміж інкардынаваным у дыяцэзію членам таварыства і біскупам акрэсліваюцца ўласнымі канстытуцыямі або партыкулярнымі пагадненнямі.

Кан. 739 – Члены таварыства, апрача абавязкаў, якія ўскладзены на іх як на членаў таварыства, згодна з канстытуцыямі, падлягаюць таксама агульным абавязкам духоўных асобаў, калі з сутнасці рэчаў або з кантэксту не вынікае іншае.

Кан. 740 – Члены таварыства павінны пражываць у доме або ў легітымна ўстаноўленай супольнасці і весці супольнае жыццё згодна з нормамі ўласнага права,

якое павінна парадкаваць таксама пытанне адсутнасці ў доме або супольнасці.

Кан. 741 – § 1. Таварыствы і — калі канстытуцыі не прадугледжваюць іншае — таксама іх часткі і дамы з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі і ў гэтай якасці маюць здольнасць да набывання маёмасці, валодання, адміністравання ёю і адчужэння яе згодна з нормамі прадпісанняў Кнігі V «Маёмасць Касцёла», кан. 636, 638 і 639, а таксама ўласнага права.

§ 2. Члены таварыства таксама маюць здольнасць — згодна з нормамі ўласнага права — да набывання маёмасці, валодання, адміністравання і распараджэння ёю, аднак усё, што яны атрымоўваюць з увагі на таварыства, набываецца для таварыства.

Кан. 742 – Выхад і выдаленне члена таварыства, які не быў яшчэ канчаткова ў яго ўключаны, кіруюцца канстытуцыямі кожнага таварыства.

Кан. 743 – Канчаткова ўключаны член таварыства можа атрымаць ад вярхоўнага кіраўніка са згоды яго Рады індульт на выхад з таварыства са спыненнем правоў і абавязкаў, якія вынікаюць з уключэння, захоўваючы прадпісанне кан. 693, калі паводле канстытуцыі гэтае паўнамоцтва не зарэзервавана за Святой Сталіцай.

Кан. 744 – § 1. За вярхоўным кіраўніком са згоды яго Рады зарэзервавана таксама права даваць канчаткова ўключанаму члену таварыства дазвол на пераход у іншае таварыства апостальскага жыцця; пры гэтым часова прыпыняюцца правы і абавязкі ва ўласным таварыстве, але захоўваецца права вярнуцца ў яго перад канчатковым уключэннем у новае таварыства.

§ 2. Для таго, каб мог адбыцца пераход у інстытут кансэкраванага жыцця або з яго

quidem etiam absentiae a domo vel communitate reguntur.

Can. 741 – § 1. Societates et, nisi aliter ferant constitutiones, earum partes et domus, personae sunt iuridicae et, qua tales, capaces bona temporalia acquirendi, possidendi, administrandi et alienandi, ad normam praescriptorum Libri V *De bonis Ecclesiae temporalibus*, cann. 636, 638 et 639, necnon iuris proprii.

§ 2. Sodales capaces quoque sunt, ad normam iuris proprii, bona temporalia acquirendi, possidendi, administrandi de iisque disponendi, sed quidquid ipsis intuitu societatis obveniat, societati acquiritur.

Can. 742 – Egressus et dimissio sodalis nondum definitive incorporati reguntur constitutionibus cuiusque societatis.

Can. 743 – Indultum discedendi a societate, cessantibus iuribus et obligationibus ex incorporatione promanantibus, firmo praescripto can. 693, sodalis definitive incorporatus a supremo Moderatore cum consensu eius consilii obtinere potest, nisi id iuxta constitutiones Sanctae Sedi reservetur.

Can. 744 – § 1. Supremo quoque Moderatori cum consensu sui consilii pariter reservatur licentiam concedere sodali definitive incorporato ad aliam societatem vitae apostolicae transeundi, suspensis interim iuribus et obligationibus propriae societatis, firmo tamen iure redeundi ante definitivam incorporationem in novam societatem.

§ 2. Ut transitus fiat ad institutum vitae consecratae vel ex eo ad socie-

tatem vitae apostolicae, licentia requiritur Sanctae Sedis, cuius mandatis standum est.

Can. 745 – Supremus Moderator cum consensu sui consilii sodali definitive incorporato concedere potest indultum vivendi extra societatem, non tamen ultra triennium, suspensis iuribus et obligationibus quae cum ipsius nova condicione componi non possunt; permanet tamen sub cura Moderatorum. Si agitur de clerico, requiritur praeterea consensus Ordinarii loci in quo commorari debet, sub cuius cura et dependentia etiam manet.

Can. 746 – Ad dimissionem sodalis definitive incorporati serventur, congrua congruis referendo, cann. 694-704.

ў таварыства апостальскага жыцця, патрабуецца дазвол Святой Сталіцы, пастановаў якой трэба прытрымлівацца.

Кан. 745 – Вярхоўны кіраўнік са згоды сваёй Рады можа ўдзяліць канчаткова ўключанаму члену таварыства індульт на пражыванне па-за таварыствам, аднак не больш чым на тры гады; пры гэтым спыняюцца правы і абавязкі, несумяшчальныя з яго новым становішчам; член таварыства застаецца, аднак, пад апекай кіраўнікоў. Калі гаворка ідзе пра духоўную асобу, апрача гэтага, патрабуецца згода ардынарыя месца, дзе яна павінна прабываць; духоўная асоба павінна заставацца пад яго апекай і ў залежнасці ад яго.

Кан. 746 – Пры выдаленні канчаткова ўключанага члена таварыства павінны быць захаваны з адпаведнымі папраўкамі кан. 694–704.

КНІГА III

НАСТАЎНІЦКАЕ ЗАДАННЕ КАСЦЁЛА

Кан. 747 – § 1. Касцёл, якому Хрыстус даручыў дэпазіт веры, каб з дапамогай Духа Святога ён свята захоўваў аб'яўленую праўду, глыбей яе пазнаваў, верна абвяшчаў і перадаваў, мае абавязак і прыроджанае права абвяшчаць Евангелле ўсім народам, незалежна ад любой чалавечай улады, выкарыстоўваючы пры гэтым свае ўласныя сродкі сацыяльнай камунікацыі.

§ 2. Касцёл мае права заўсёды і ўсюды абвяшчаць маральныя прынцыпы, у тым ліку тыя, якія адносяцца да грамадскага ладу, а таксама выносіць суджэнне ў любых чалавечых справах у той меры, у якой гэтага патрабуюць фундаментальныя правы чалавечай асобы або збаўленне душаў.

Кан. 748 – § 1. Усе людзі абавязаны шукаць праўду ў тым, што датычыць Бога і Яго Касцёла, і, пазнаўшы гэтую праўду, маюць абавязак і права прыняць і захоўваць яе на моцы Божага закона.

§ 2. Ніхто і ніколі не мае права прымушаць людзей да прыняцця каталіцкай веры супраць іх сумлення.

LIBER III

DE ECCLESIAE MUNERE DOCENDI

Can. 747 – § 1. Ecclesiae, cui Christus Dominus fidei depositum concredidit ut ipsa, Spiritu Sancto assistente, veritatem revelatam sancte custodiret, intimius perscrutaretur, fideliter annuntiaret atque exponeret, officium est et ius nativum, etiam mediis communicationis socialis sibi propriis adhibitis, a qualibet humana potestate independens, omnibus gentibus Evangelium praedicandi.

§ 2. Ecclesiae competit semper et ubique principia moralia etiam de ordine sociali annuntiare, necnon iudicium ferre de quibuslibet rebus humanis, quatenus personae humanae iura fundamentalia aut animarum salus id exigat.

Can. 748 – § 1. Omnes homines veritatem in iis, quae Deum eiusque Ecclesiam respiciunt, quaerere tenentur eamque cognitam amplectendi ac servandi obligatione vi legis divinae adstringuntur et iure gaudent.

§ 2. Homines ad amplectendam fidem catholicam contra ipsorum conscientiam per coactionem adducere nemini umquam fas est.

Can. 749 – § 1. Infallibilitate in magisterio, vi muneris sui gaudet Summus Pontifex quando ut supremus omnium christifidelium Pastor et Doctor, cuius est fratres suos in fide confirmare, doctrinam de fide vel de moribus tenendam definitivo actu proclamat.

§ 2. Infallibilitate in magisterio pollet quoque Collegium Episcoporum quando magisterium exercent Episcopi in Concilio Oecumenico coadunati, qui, ut fidei et morum doctores et iudices, pro universa Ecclesia doctrinam de fide vel de moribus definitive tenendam declarant; aut quando per orbem dispersi, communionis nexum inter se et cum Petri successore servantes, una cum eodem Romano Pontifice authentice res fidei vel morum docentes, in unam sententiam tamquam definitive tenendam conveniunt.

§ 3. Infallibiliter definita nulla intellegitur doctrina, nisi id manifesto constiterit.

Can. 750 – § 1. Fide divina et catholica ea omnia credenda sunt quae verbo Dei scripto vel tradito, uno scilicet fidei deposito Ecclesiae commisso, continentur, et insimul ut divinitus revelata proponuntur, sive ab Ecclesiae magisterio sollemni, sive ab eius magisterio ordinario et universali; quod quidem communi adhaesione christifidelium sub ductu sacri magisterii manifestatur; tenentur igitur omnes quascumque devitare doctrinas iisdem contrarias.

§ 2. Firmiter etiam amplectenda ac retinenda sunt omnia et singula quae circa doctrinam de fide vel moribus ab Ecclesiae magisterio definitive proponuntur, scilicet quae ad idem

Кан. 749 – § 1. Найвышэйшы Пантыфік мае на моцы свайго задання беспамылковасць у навучанні, калі ён, як вярхоўны Пастыр і Настаўнік усіх вернікаў, які мае абавязак умацоўваць сваіх братоў у веры, дэфінітыўным актам абвяшчае вучэнне аб веры або норавах, якога трэба прытрымлівацца.

§ 2. Беспамылковасць у навучанні мае таксама Калегія Біскупаў, калі біскупы ажыццяўляюць навучанне, аб'яднаныя на Сусветным Саборы, дзе як настаўнікі і суддзі ў пытаннях веры і нораваў дэфінітыўна абвяшчаюць усяму Касцёлу вучэнне аб веры і норавах, якога трэба прытрымлівацца, або калі яны, рассеяныя па свеце, але захоўваючы сувязь адзінства паміж сабой і з наступнікам Пятра, разам з гэтым самым Рымскім Пантыфікам ажыццяўляючы аўтэнтычнае навучанне ў справах веры і нораваў, прыходзяць да адзінага суджэння, якога трэба канчаткова прытрымлівацца.

§ 3. Ніякае вучэнне не павінна лічыцца акрэсленым беспамылкова, калі гэта не было сцверджана выразна.

Кан. 750 – § 1. Боскай і каталіцкай верай трэба верыць ва ўсё тое, што знаходзіцца ў запісаным або перададзеным Божым слове, гэта значыць у адзіным дэпазіце веры, перададзеным Касцёлу, і разам з гэтым выкладаецца як дадзенае ў Божым Аб'яўленні або ва ўрачыстым навучанні Касцёла, або ў яго звычайным і паўсюдным навучанні, а таксама праяўляецца ва ўсеагульнай прыхільнасці вернікаў пад кіраваннем Святога Магістэрыя; таму ўсе павінны пазбягаць вучэнняў, якія супрацьстаяць вышэйзгаданаму, якімі б яны ні былі.

§ 2. Трэба таксама цвёрда прымаць і захоўваць усё тое, што дэфінітыўна прапануецца Магістэрыем Касцёла адносна вучэння аб веры або норавах, гэта значыць

тое, што патрабуецца, каб свята захоўваць і верна абвяшчаць гэты дэпазіт веры; таму, хто адкідвае тое, чаго трэба дэфінітыўна прытрымлівацца, той супрацьпастаўляе сябе навучанню Касцёла.

Кан. 751 – Ерась — гэта ўпартае, пасля прыняцця хросту, адмаўленне якой-небудзь праўды, у якую трэба верыць верай боскай і каталіцкай, або ўпартае сумненне ў ёй; апастазія — гэта поўнае выратэнне каталіцкай веры; схізма — гэта адмова ад падпарадкавання Найвышэйшаму Пантыфіку або ад захоўвання адзінства з падуладнымі яму членамі Касцёла.

Кан. 752 – Трэба праяўляць калі і не згоду веры, то прынамсі рэлігійную паслухмянасць розуму і волі вучэнню, якое Найвышэйшы Пантыфік або Калегія Біскупаў абвяшчаюць аб веры або норавах, ажыццяўляючы аўтэнтычнае навучанне, нават калі яны не маюць намеру абвясціць яго дэфінітыўным актам; таму вернікі павінны імкнуцца пазбягаць усяго таго, што не згаджаецца з гэтым навучаннем.

Кан. 753 – Хоць біскупы, якія знаходзяцца ў адзінстве з галавой Калегіі і яе членамі, як паасобку, так і на Канферэнцыях Біскупаў або на партыкулярных Сінодах, не маюць беспамылковасці ў навучанні, аднак для вернікаў, якія даручаны іх апецы, яны з'яўляюцца аўтэнтычнымі настаўнікамі веры; гэтаму аўтэнтычнаму навучанню сваіх біскупаў вернікі абавязаны аказваць рэлігійную паслухмянасць.

Кан. 754 – Усе вернікі маюць абавязак захоўваць канстытуцыі і дэкрэты, якія выдае легітымная ўлада Касцёла для выкладання вучэння або для асуджэння памылковых меркаванняў; асобым жа чынам гэта адносіцца да дакументаў, якія выдае Рымскі Пантыфік або Калегія Біскупаў.

fidei depositum sancte custodiendum et fideliter exponendum requiruntur; ideoque doctrinae Ecclesiae catholicae adversatur qui easdem propositiones definitive tenendas recusat.

Can. 751 – Dicitur haeresis, pertinax, post receptum baptismum, alicuius veritatis fide divina et catholica credendae denegatio, aut de eadem pertinax dubitatio; apostasia, fidei christianae ex toto repudiatio; schisma, subiectionis Summo Pontifici aut communionis cum Ecclesiae membris eidem subditis detrectatio.

Can. 752 – Non quidem fidei assensus, religiosum tamen intellectus et voluntatis obsequium praestandum est doctrinae, quam sive Summus Pontifex sive Collegium Episcoporum de fide vel de moribus enuntiant, cum magisterium authenticum exercent, etsi definitivo actu eandem proclamare non intendant; christifideles ergo devitare curent quae cum eadem non congruant.

Can. 753 – Episcopi, qui sunt in communione cum Collegii capite et membris, sive singuli sive in conferentiis Episcoporum aut in conciliis particularibus congregati, licet infallibilitate in docendo non polleant, christifidelium suae curae commissorum authentici sunt fidei doctores et magistri; cui authentico magisterio suorum Episcoporum christifideles religioso animi obsequio adhaerere tenentur.

Can. 754 – Omnes christifideles obligatione tenentur servandi constitutiones et decreta, quae ad doctrinam proponendam et erroneas opiniones proscribendas fert legitima Ecclesiae auctoritas, speciali vero ratione, quae edit Romanus Pontifex vel Collegium Episcoporum.

Can. 755 – § 1. Totius Collegii Episcoporum et Sedis Apostolicae imprimis est fovere et dirigere motum oecumenicum apud catholicos, cuius finis est unitatis redintegratio inter universos christianos, ad quam promovendam Ecclesia ex voluntate Christi tenetur.

§ 2. Episcoporum item est, et, ad normam iuris, Episcoporum conferentiarum, eandem unitatem promovere atque pro variis adiunctorum necessitatibus vel opportunitatibus, normas practicas impertire, attentis praescriptis a suprema Ecclesiae auctoritate latis.

Кан. 755 – § 1. Уся Калегія Біскупаў і Апостальская Сталіца павінны перадусім садзейнічаць экуменічнаму руху сярод католікаў, мэтай якога з'яўляецца ўсталяванне нанова адзінства паміж усімі хрысціянамі, спрыяць якому Касцёл абавязаны па волі Хрыста, і кіраваць гэтым рухам.

§ 2. Таксама біскупы і — згодна з нормамі права — Канферэнцыі Біскупаў павінны падтрымліваць гэтае адзінства і, у залежнасці ад розных патрэбаў ці карыснасці, выдаваць практычныя нормы, беручы пад увагу прадпісанні, выдадзеныя вярхоўнай уладай Касцёла.

TITULUS I
DE DIVINI VERBI MINISTERIO

ТЫТУЛ I
ПАСЛУГА БОЖАГА СЛОВА

Can. 756 – § 1. Quoad universam Ecclesiam munus Evangelii annuntiandi praecipue Romano Pontifici et Collegio Episcoporum commissum est.

§ 2. Quoad Ecclesiam particularem sibi concreditam illud munus exercent singuli Episcopi, qui quidem totius ministerii verbi in eadem sunt moderatores; quandoque vero aliqui Episcopi coniunctim illud explent quoad diversas simul Ecclesias, ad normam iuris.

Кан. 756 – § 1. У адносінах да ўсяго Касцёла заданне абвяшчэння Евангелля даручана перадусім Рымскаму Пантыфіку і Калегіі Біскупаў.

§ 2. У адносінах да даверaных ім партыкулярных Касцёлаў гэтае заданне выконваюць паасобныя біскупы, якія таксама з'яўляюцца кіраўнікамі ўсёй паслугі слова; аднак часам некалькі біскупаў выконваюць гэтае заданне сумесна ў адносінах да некалькіх Касцёлаў адначасова, згодна з нормамі права.

Can. 757 – Presbyterorum, qui quidem Episcoporum cooperatores sunt, proprium est Evangelium Dei annuntiare; praesertim hoc officio tenentur, quoad populum sibi commissum, parochi aliique quibus cura animarum concreditur; diaconorum etiam est in ministerio verbi populo Dei, in communione cum Episcopo eiusque presbyterio, inservire.

Кан. 757 – Абвяшчэнне Божага Евангелля з'яўляецца ўласным заданнем прэзбітэраў, якія з'яўляюцца супрацоўнікамі біскупаў; перадусім гэты абавязак ускладаецца на пробашчаў у адносінах да даручанага ім народа, а таксама на іншых асобаў, якім даверана апека над душамі; заданнем дыяканаў таксама з'яўляецца служэнне Божаму народу ў паслузе слова ў адзінстве з біскупам і яго прэзбітэрыем.

Кан. 758 – Члены інстытутаў кансэкраванага жыцця на моцы ўласнай кансэкрацыі Богу асаблівым чынам даюць сведчанне аб Евангеллі і адпаведным чынам прыцягваюцца біскупам да дапамогі ў абвяшчэнні Евангелля.

Кан. 759 – Свецкія вернікі, на моцы хросту і канфірмацыі, з'яўляюцца сведкамі евангельскай навіны праз слова і прыклад хрысціянскага жыцця; яны таксама могуць быць пакліканы да супрацоўніцтва з біскупам і прэзбітэрамі ў ажыццяўленні паслугі слова.

Кан. 760 – У паслузе слова, якая павінна быць заснавана на Святым Пісанні, Традыцыі, літургіі, навучанні і жыцці Касцёла, павінна быць цалкам і верна прадстаўлена таямніца Хрыста.

Кан. 761 – У абвяшчэнні хрысціянскага вучэння павінны выкарыстоўвацца розныя даступныя сродкі, перадусім — прапаведаванне і катэхэтычная падрыхтоўка, якія заўсёды займаюць галоўнае месца; далей — выкладанне вучэння ў школах, акадэміях, на канферэнцыях і разнастайных сходах, распаўсюджванне яго праз публічныя заявы, якія робяцца легітымнай уладай з нагоды акрэсленых падзеяў, а таксама праз розныя сродкі сацыяльнай камунікацыі.

Can. 758 – Sodales institutorum vitae consecratae, vi propriae Deo consecrationis, peculiari modo Evangelii testimonium reddunt, iidemque in Evangelio annuntiando ab Episcopo in auxilium convenienter assumuntur.

Can. 759 – Christifideles laici, vi baptismatis et confirmationis, verbo et vitae christianae exemplo evangelici nuntii sunt testes; vocari etiam possunt ut in exercitio ministerii verbi cum Episcopo et presbyteris cooperentur.

Can. 760 – In ministerio verbi, quod sacra Scriptura, Traditione, liturgia, magisterio vitaque Ecclesiae innitatur oportet, Christi mysterium integre ac fideliter proponatur.

Can. 761 – Varia media ad doctrinam christianam annuntiandam adhibeantur quae praesto sunt, imprimis praedicatio atque catechetica institutio, quae quidem semper principem locum tenent, sed et propositio doctrinae in scholis, in academiis, conferentiis et coadunationibus omnis generis, necnon eiusdem diffusio per declarationes publicas a legitima auctoritate occasione quorundam eventuum factas, prelo aliisque instrumentis communicationis socialis.

Раздзел I
Прапаведаванне Божага слова

Caput I
De verbi Dei praedicatione

Кан. 762 – Паколькі Божы народ аб'ядноўваецца перадусім праз слова жывога Бога, якое можна з поўным правам патрабаваць з вуснаў святароў, святыя служыцелі павінны вельмі даражыць заданнем прапаведавання, таму што адным з іх галоўных абавязкаў з'яўляецца абвяшчэнне ўсім Божага Евангелля.

Can. 762 – Cum Dei populus primum coadunetur verbo Dei vivi, quod ex ore sacerdotum omnino fas est requirere, munus praedicationis magni habeant sacri ministri, inter quorum praecipua officia sit Evangelium Dei omnibus annuntiare.

Can. 763 – Episcopis ius est ubique, non exclusis ecclesiis et oratoriis institutorum religiosorum iuris pontificii, Dei verbum praedicare, nisi Episcopus loci in casibus particularibus expresse renuerit.

Кан. 763 – Біскупы маюць права прапаведаваць Божае слова ўсюды, не выключаючы касцёлаў і араторыяў манаскіх інстытутаў папскага права, калі біскуп месца ў асобных выпадках выразна не адмовіць у гэтым.

Can. 764 – Salvo praescripto can. 765, facultate ubique praedicandi, de consensu saltem praesumpto rectoris ecclesiae exercenda, gaudent presbyteri et diaconi, nisi ab Ordinario competenti eadem facultas restricta fuerit aut sublata, aut lege particulari licentia expressa requiratur.

Кан. 764 – Захоўваючы прадпісанне кан. 765, прэзбітэры і дыяканы ўсюды маюць паўнамоцтва на прапаведаванне, якое ажыццяўляецца са згоды — прынамсі меркаванай — рэктара касцёла, калі гэтае паўнамоцтва не было абмежавана ці адменена кампетэнтным ардынарыем або калі згодна з партыкулярным правам не патрабуецца выразны дазвол.

Can. 765 – Ad praedicandum religiosis in eorum ecclesiis vel oratoriis licentia requiritur Superioris ad normam constitutionum competentis.

Кан. 765 – На прапаведаванне манаскім асобам у іх касцёлах ці араторыях патрабуецца дазвол настаяцеля, кампетэнтнага згодна з нормамі канстытуцый.

Can. 766 – Ad praedicandum in ecclesia vel oratorio admitti possunt laici, si certis in adiunctis necessitas id requirat aut in casibus particularibus utilitas id suadeat, iuxta Episcoporum conferentiae praescripta, et salvo can. 767, § 1.

Кан. 766 – Да прапаведавання ў касцёле або араторыі могуць быць дапушчаны свецкія асобы, калі ў акрэсленых абставінах гэтага патрабуе неабходнасць або ў асобных выпадках гэта будзе карысна, паводле прадпісанняў Канферэнцыі Біскупаў і захоўваючы кан. 767 § 1.

Can. 767 – § 1. Inter praedicationis formas eminet homilia, quae est pars ipsius liturgiae et sacerdoti aut diacono reservatur; in eadem per anni liturgici cursum ex textu sacro fidei mysteria et normae vitae christianae exponantur.

Кан. 767 – § 1. Сярод формаў прапаведавання асаблівае месца займае гамілія, якая з'яўляецца часткай літургіі і зарэзервавана за святаром або дыяканам; у ёй, асноўваючыся на святых тэкстах, павінны на працягу літургічнага года выкладацца таямніцы веры і нормы хрысціянскага жыцця.

§ 2. In omnibus Missis diebus dominicis et festis de praecepto, quae concursu populi celebrantur, homilia habenda est nec omitti potest nisi gravi de causa.

§ 2. На ўсіх Імшах у нядзелі і абавязковыя святы, якія цэлебруюцца з удзелам народу, гамілія з'яўляецца абавязковай і яна не можа быць прапушчана, калі не па важкай прычыне.

§ 3. Valde commendatur ut, si sufficiens detur populi concursus, homilia habeatur etiam in Missis quae infra hebdomadam, praesertim tem-

§ 3. Вельмі заахвочваецца, каб, калі ўдзельнічае дастатковая колькасць народу, гамілія прамаўлялася таксама на Імшах

на працягу тыдня, асабліва ў час Адвэнту і Вялікага посту, а таксама з нагоды якога-небудзь свята або жалобнай падзеі.

§ 4. Пробашч або рэктар касцёла павінны сачыць за тым, каб гэтыя прадпісанні рупліва захоўваліся.

Кан. 768 – § 1. Прапаведнікі Божага слова павінны перадусім выкладаць вернікам тое, у што трэба верыць і што трэба рабіць дзеля Божай хвалы і збаўлення людзей.

§ 2. Няхай таксама перадаюць вернікам вучэнне, якое Магістэрый Касцёла выкладае аб годнасці і свабодзе чалавечай асобы, еднасці і пастаянстве сям'і і заданнях у ёй, аб абавязках, якія людзі маюць у грамадстве, а таксама аб уладкаванні спраў гэтага свету паводле парадку, устаноўленага Богам.

Кан. 769 – Хрысціянскае вучэнне трэба выкладаць, дастасоўваючы спосаб выкладання адпаведна ўзроўню слухачоў і згодна з патрэбамі часу.

Кан. 770 – У акрэсленыя тэрміны, паводле прадпісанняў дыяцэзіяльнага біскупа, пробашчы павінны арганізоўваць прапаведаванне, якое называецца духоўнымі практыкаваннямі і святымі місіямі, або ў іншых формах адпаведна патрэбам.

Кан. 771 – § 1. Душпастыры, асабліва біскупы і пробашчы, павінны клапаціцца аб тым, каб Божае слова абвяшчалася таксама тым вернікам, якія праз умовы свайго жыцця не могуць у дастатковай меры карыстацца агульнай і звычайнай пастырскай апекай або поўнасцю яе пазбаўлены.

§ 2. Яны павінны паклапаціцца і аб тым, каб евангельская навіна даходзіла да няверуючых, якія пражываюць на дадзенай тэрыторыі, паколькі таксама іх, не супрацьстаўляючы іх вернікам, яны павінны ахапіць душпастырствам.

pore adventus et quadragesimae aut occasione alicuius festi vel luctuosi eventus, celebrentur.

§ 4. Parochi aut ecclesiae rectoris est curare ut haec praescripta religiose serventur.

Can. 768 – § 1. Divini verbi praecones christifidelibus imprimis proponant, quae ad Dei gloriam hominumque salutem credere et facere oportet.

§ 2. Impertiant quoque fidelibus doctrinam, quam Ecclesiae magisterium proponit de personae humanae dignitate et libertate, de familiae unitate et stabilitate eiusque muniis, de obligationibus quae ad homines in societate coniunctos pertinent, necnon de rebus temporalibus iuxta ordinem a Deo statutum componendis.

Can. 769 – Doctrina christiana proponatur modo auditorum condicioni accommodato atque ratione temporum necessitatibus aptata.

Can. 770 – Parochi certis temporibus, iuxta Episcopi dioecesani praescripta, illas ordinent praedicationes, quas exercitia spiritualia et sacras missiones vocant, vel alias formas necessitatibus aptatas.

Can. 771 – § 1. Solliciti sint animarum pastores, praesertim Episcopi et parochi, ut Dei verbum iis quoque fidelibus nuntietur, qui ob vitae suae condicionem communi et ordinaria cura pastorali non satis fruantur aut eadem penitus careant.

§ 2. Provideant quoque, ut Evangelii nuntium perveniat ad non credentes in territorio degentes, quippe quos, non secus ac fideles, animarum cura complecti debeat.

Can. 772 – § 1. Ad exercitium praedicationis quod attinet, ab omnibus praeterea serventur normae ab Episcopo dioecesano latae.

§ 2. Ad sermonem de doctrina christiana faciendum via radiophonica aut televisifica, serventur praescripta ab Episcoporum conferentia statuta.

Кан. 772 – § 1. У тым, што датычыць ажыццяўлення прапаведавання, усе павінны захоўваць перадусім нормы, выдадзеныя дыяцэзіяльным біскупам.

§ 2. Пры правядзенні на радыё або тэлебачанні перадач, прысвечаных хрысціянскаму вучэнню, павінны быць захаваны прадпісанні, устаноўленыя Канферэнцыяй Біскупаў.

Caput II

De catechetica institutione

Раздзел II

Катэхетычная падрыхтоўка

Can. 773 – Proprium et grave officium pastorum praesertim animarum est catechesim populi christiani curare, ut fidelium fides, per doctrinae institutionem et vitae christianae experientiam, viva fiat explicita atque operosa.

Кан. 773 – Уласным і важкім абавязкам, перадусім — душпастыраў, з'яўляецца клопат аб катэхізацыі хрысціянскага народа, каб праз падрыхтоўку, якая датычыць вучэння, і праз досвед хрысціянскага жыцця вера вернікаў станавілася жывой, відавочнай і дзейнай.

Can. 774 – § 1. Sollicitudo catechesis, sub moderamine legitimae ecclesiasticae auctoritatis, ad omnia Ecclesiae membra pro sua cuiusque parte pertinet.

§ 2. Prae ceteris parentes obligatione tenentur verbo et exemplo filios in fide et vitae christianae praxi efformandi; pari obligatione adstringuntur, qui parentum locum tenent atque patrini.

Кан. 774 – § 1. Клопат аб катэхізацыі пад кіраваннем легітымнай касцёльнай улады ўскладаецца на ўсіх членаў Касцёла адпаведна з магчымасцямі кожнага.

§ 2. Перадусім бацькі маюць абавязак словам і прыкладам выхоўваць дзяцей у веры і практыцы хрысціянскага жыцця; падобным абавязкам звязаны тыя, хто замяшчае бацькоў, а таксама хросныя.

Can. 775 – § 1. Servatis praescriptis ab Apostolica Sede latis, Episcopi dioecesani est normas de re catechetica edicere itemque prospicere ut apta catechesis instrumenta praesto sint, catechismum etiam parando, si opportunum id videatur, necnon incepta catechetica fovere atque coordinare.

Кан. 775 – § 1. Пры тым, што прадпісанні, выдадзеныя Апостальскай Сталіцай, захоўваюцца, да заданняў дыяцэзіяльнага біскупа належыць: выдаваць нормы адносна катэхізацыі, сачыць за тым, каб былі ў наяўнасці адпаведныя сродкі катэхізацыі, падрыхтоўка — калі гэта будзе бачыцца дарэчным — катэхізісу, а таксама спрыянне катэхэтычным пачынанням і іх каардынацыя.

§ 2. Episcoporum conferentiae est, si utile videatur, curare ut catechismi

§ 2. Калі гэта будзе бачыцца карысным, да заданняў Канферэнцыі Біскупаў

належыць клопат аб выдаванні катэхізісаў для сваёй тэрыторыі пасля папярэдняга адабрэння іх Апостальскай Сталіцай.

§ 3. Пры Канферэнцыі Біскупаў можа быць заснавана катэхетычная служба, галоўным заданнем якой павінна быць дапамога асобным дыяцэзіям у справах катэхізацыі.

Кан. 776 – На моцы свайго задання пробашч павінен клапаціцца аб катэхетычнай падрыхтоўцы дарослых, моладзі і дзяцей; з гэтай мэтай ён павінен супрацоўнічаць з духоўнымі асобамі, прыдзеленымі да парафіі, з членамі інстытутаў кансэкраванага жыцця і таварыстваў апостальскага жыцця, беручы пад увагу характар кожнага інстытута, а таксама са свецкімі вернікамі, перадусім з катэхетамі; усе яны, калі няма легітымных перашкодаў, не павінны адмаўляць у ахвотным супрацоўніцтве. Пробашч павінен падтрымліваць і ўмацоўваць бацькоў у іх заданні сямейнай катэхізацыі, аб чым гаворыцца ў кан. 774 § 2.

Кан. 777 – Улічваючы нормы, выдадзеныя дыяцэзіяльным біскупам, пробашч павінен асаблівым чынам клапаціцца аб тым, каб:

1° праводзілася адпаведная катэхетычная падрыхтоўка перад цэлебрацыяй сакрамэнтаў;

2° дзеці праз катэхетычную падрыхтоўку, якая павінна ажыццяўляцца на працягу адпаведнага часу, былі належна падрыхтаваны да першага прыняцця сакрамэнту пакаяння і Найсвяцейшай Эўхарыстыі, а таксама да сакрамэнту канфірмацыі;

3° прыняўшы Першую Камунію, дзеці атрымлівалі пашыранае і паглыбленае катэхетычнае выхаванне;

4° катэхетычную падрыхтоўку атрымлівалі таксама асобы з фізічнымі або

pro suo territorio, praevia Sedis Apostolicae confirmatione, edantur.

§ 3. Apud Episcoporum conferentiam institui potest officium catecheticum, cuius praecipuum munus sit singulis dioecesibus in re catechetica auxilium praebere.

Can. 776 – Parochus, vi sui muneris, catecheticam efformationem adultorum, iuvenum et puerorum curare tenetur, quem in finem sociam sibi operam adhibeat clericorum paroeciae addictorum, sodalium institutorum vitae consecratae necnon societatum vitae apostolicae, habita ratione indolis uniuscuiusque instituti, necnon christifidelium laicorum, praesertim catechistarum; hi omnes, nisi legitime impediti, operam suam libenter praestare ne renuant. Munus parentum, in catechesi familiari, de quo in can. 774, § 2, promoveat et foveat.

Can. 777 – Peculiari modo parochus, attentis normis ab Episcopo dioecesano statutis, curet:

1° ut apta catechesis impertiatur pro sacramentorum celebratione;

2° ut pueri, ope catecheticae institutionis per congruum tempus impertitae, rite praeparentur ad primam receptionem sacramentorum paenitentiae et sanctissimae Eucharistiae necnon ad sacramentum confirmationis;

3° ut iidem, prima communione recepta, uberius ac profundius catechetica efformatione excolantur;

4° ut catechetica institutio iis etiam tradatur, quantum eorum

condicio sinat, qui corpore vel mente sint praepediti;

5° ut iuvenum et adultorum fides, variis formis et inceptis, muniatur, illuminetur atque evolvatur.

разумовымі абмежаваннямі ў той ступені, у якой гэта магчыма ў іх стане;

5° дзякуючы разнастайным формам дзейнасці і пачынанням вера моладзі і дарослых умацоўвалася, асвячалася і развівалася.

Can. 778 – Curent Superiores religiosi et societatum vitae apostolicae ut in suis ecclesiis, scholis aliisve operibus sibi quoquo modo concreditis, catechetica institutio sedulo impertiatur.

Кан. 778 – Настаяцелі манаскіх асобаў і таварыстваў апостальскага жыцця павінны клапаціцца аб тым, каб у іх касцёлах, школах і іншых установах, даверaных ім якім-небудзь чынам, праводзілася старанная катэхэтычная падрыхтоўка.

Can. 779 – Institutio catechetica tradatur omnibus adhibitis auxiliis, subsidiis didacticis et communicationis socialis instrumentis, quae efficaciora videantur ut fideles, ratione eorum indoli, facultatibus et aetati necnon vitae condicionibus aptata, plenius catholicam doctrinam ediscere eamque aptius in praxim deducere valeant.

Кан. 779 – Катэхетычная падрыхтоўка павінна праводзіцца з выкарыстаннем усіх сродкаў, дыдактычных дапаможнікаў і сродкаў сацыяльнай камунікацыі, якія бачацца найбольш эфектыўнымі для таго, каб вернікі, адпаведна да іх характару, магчымасцяў, узросту і ўмоваў жыцця, маглі найбольш поўна пазнаць каталіцкае вучэнне і больш паспяхова рэалізаваць яго ў жыцці.

Can. 780 – Curent locorum Ordinarii ut catechistae ad munus suum rite explendum debite praeparentur, ut nempe continua formatio ipsis praebeatur, iidemque Ecclesiae doctrinam apte cognoscant atque normas disciplinis paedagogicis proprias theoretice ac practice addiscant.

Кан. 780 – Ардынарыі месца павінны клапаціцца аб тым, каб катэхеты атрымлівалі адпаведную падрыхтоўку для належнага выконвання свайго задання, а менавіта неабходна забяспечыць ім пастаянную фармацыю, каб яны маглі належным чынам пазнаваць навучанне Касцёла, а таксама тэарэтычна і практычна засвойваць нормы педагагічных навук.

TITULUS II

DE ACTIONE ECCLESIAE MISSIONALI

ТЫТУЛ II

МІСІЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КАСЦЁЛА

Can. 781 – Cum tota Ecclesia natura sua sit missionaria et opus evangelizationis habendum sit fundamentale officium populi Dei, christifideles omnes, propriae responsabilitatis conscii, partem suam in opere missionali assumant.

Кан. 781 – Паколькі ўвесь Касцёл з'яўляецца па сваёй прыродзе місійным, а справу евангелізацыі трэба лічыць фундаментальным абавязкам Божага народа, таму ўсе вернікі, свядомыя сваёй адказнасці, павінны мець свой удзел у справе місій.

Кан. 782 – § 1. Вярхоўнае кіраванне і каардынацыя пачынаннямі і дзейнасцю, якія маюць дачыненне да справы місій і місійнага супрацоўніцтва, належаць да паўнамоцтваў Рымскага Пантыфіка і Калегіі Біскупаў.

§ 2. Паасобныя біскупы ў клопаце аб паўсюдным Касцёле і ўсіх Касцёлах павінны праяўляць асаблівы клопат аб місійнай дзейнасці, перадусім праз пабуджэнне, заахвочванне і падтрымку місійных пачынанняў у сваім партыкулярным Касцёле.

Кан. 783 – Члены інстытутаў кансэкраванага жыцця, якія на моцы самой кансэкрацыі прысвячаюць сябе служэнню Касцёлу, абавязаны асобым чынам аказваць падтрымку місійнай дзейнасці спосабам, уласцівым для іх інстытута.

Кан. 784 – Місіянеры, гэта значыць тыя, каго кампетэнтная касцёльная ўлада скіроўвае для ажыццяўлення місійнай дзейнасці, могуць быць выбраны з мясцовых ураджэнцаў ці з па-за іх, сярод секулярных духоўных асобаў, членаў інстытутаў кансэкраванага жыцця ці таварыстваў апостальскага жыцця або сярод іншых свецкіх вернікаў.

Кан. 785 – § 1. У ажыццяўленні місійнай дзейнасці павінны быць задзейнічаны катэхеты, а менавіта належна падрыхтаваныя свецкія вернікі, якія адзначаюцца хрысціянскім жыццём. Яны павінны, пад кіраваннем місіянера, займацца выкладаннем евангельскага вучэння, арганізацыяй літургіі і спраў міласэрнасці.

§ 2. Катэхеты павінны праходзіць фармацыю ў прызначаных для гэтага школах, а там, дзе іх няма, — пад кіраваннем місіянераў.

Can. 782 – § 1. Suprema directio et coordinatio inceptorum et actionum quae ad opus missionale atque ad cooperationem missionariam pertinent, competit Romano Pontifici et Collegio Episcoporum.

§ 2. Singuli Episcopi, utpote Ecclesiae universae atque omnium Ecclesiarum sponsores, operis missionalis peculiarem sollicitudinem habeant, praesertim incepta missionalia in propria Ecclesia particulari suscitando, fovendo ac sustinendo.

Can. 783 – Sodales institutorum vitae consecratae, cum vi ipsius consecrationis sese servitio Ecclesiae dedicent, obligatione tenentur ad operam, ratione suo instituto propria, speciali modo in actione missionali navandam.

Can. 784 – Missionarii, qui scilicet a competenti auctoritate ecclesiastica ad opus missionale explendum mittuntur, eligi possunt autochthoni vel non, sive clerici saeculares, sive institutorum vitae consecratae vel societatis vitae apostolicae sodales, sive alii christifideles laici.

Can. 785 – § 1. In opere missionali peragendo assumantur catechistae, christifideles nempe laici debite instructi et vita christiana praestantes, qui, sub moderamine missionarii, doctrinae evangelicae proponendae et liturgicis exercitiis caritatisque operibus ordinandis sese impendant.

§ 2. Catechistae efformentur in scholis ad hoc destinatis vel, ubi desint, sub moderamine missionariorum.

Can. 786 – Actio proprie missionalis, qua Ecclesia implantatur in populis vel coetibus ubi nondum radicata est, ab Ecclesia absolvitur praesertim mittendo Evangelii praecones donec novellae Ecclesiae plene constituantur, cum scilicet instructae sint propriis viribus et sufficientibus mediis, quibus opus evangelizandi per se ipsae peragere valeant.

Can. 787 – § 1. Missionarii, vitae ac verbi testimonio, dialogum sincerum cum non credentibus in Christum instituant, ut ipsis, ratione eorundem ingenio et culturae aptata, aperiantur viae quibus ad evangelicum nuntium cognoscendum adduci valeant.

§ 2. Curent ut quos ad evangelicum nuntium recipiendum aestiment paratos, veritates fidei edoceant, ita quidem ut ipsi ad baptismum recipiendum, libere id petentes, admitti possint.

Can. 788 – § 1. Qui voluntatem amplectendi fidem in Christum manifestaverint, expleto tempore praecatechumenatus, liturgicis caerimoniis admittantur ad catechumenatum, atque eorum nomina scribantur in libro ad hoc destinato.

§ 2. Catechumeni, per vitae christianae institutionem et tirocinium, apte initientur mysterio salutis atque introducantur in vitam fidei, liturgiae et caritatis populi Dei atque apostolatus.

§ 3. Conferentiae Episcoporum est statuta edere quibus catechumenatus ordinetur, determinando quaenam a catechumenis sint praestanda, atque definiendo quaenam eis agnoscantur praerogativae.

Кан. 786 – Уласна місійная дзейнасць, дзякуючы якой Касцёл прывіваецца ў тых народах і супольнасцях, дзе ён яшчэ не ўкараніўся, ажыццяўляецца Касцёлам перадусім праз скіраванне прапаведнікаў Евангелля, пакуль новыя Касцёлы не будуць заснаваны ва ўсёй паўнаце, гэта значыць, пакуль яны не будуць мець уласныя сілы і дастатковыя сродкі, якія дазволяць ім самім ажыццяўляць справу евангелізацыі.

Кан. 787 – § 1. Місіянеры павінны праз сведчанне жыцця і слова ўстанавіць дыялог з тымі, хто не верыць у Хрыста, каб гэтым людзям, адпаведна да складу іх розуму і культуры, былі адкрыты шляхі для пазнання евангельскай навіны.

§ 2. Яны павінны клапаціцца аб тым, каб тых, каго палічаць гатовымі да прыняцця евангельскай навіны, навучыць праўдам веры такім чынам, каб гэтыя людзі — па іх свабоднай просьбе — маглі быць дапушчаны да хросту.

Кан. 788 – § 1. Тыя, хто выявіў волю прыняць веру ў Хрыста, пасля заканчэння часу прэкатэхумэнату павінны быць праз літургічныя абрады прыняты ў катэхумэнат, а іх імёны павінны быць запісаны ў прызначаную для гэтага кнігу.

§ 2. Трэба, каб праз падрыхтоўку да хрысціянскага жыцця і яго практыкаванне катэхумэны былі адпаведным чынам уведзены ў таямніцу збаўлення і ў жыццё веры, літургіі і любові да Божага народа, а таксама ў апостальства.

§ 3. Канферэнцыя Біскупаў мае права выдаваць пастановы, якія павінны ўпарадкоўваць катэхумэнат, акрэсліваць патрабаванні да катэхумэнаў і ўказваць прызнаваныя ім правы.

Кан. 789 – Трэба праз адпаведную падрыхтоўку выхоўваць неафітаў да глыбейшага пазнавання евангельскай праўды і выконвання абавязкаў, прынятых імі падчас хросту; яны павінны быць прасякнуты сапраўднай любоўю да Хрыста і Яго Касцёла.

Кан. 790 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп на місійных тэрыторыях павінен:

1° падтрымліваць місійныя пачынанні і справы, кіраваць імі і каардынаваць іх;

2° клапаціцца аб тым, каб былі заключаны адпаведныя пагадненні з кіраўнікамі інстытутаў, прысвечаных місійнай дзейнасці, і каб адносіны з імі развіваліся на карысць місій.

§ 2. Прадпісанні, аб якіх гаворыцца ў § 1, 1°, выдадзеныя дыяцэзіяльным біскупам, абавязваюць усіх місіянераў, у тым ліку манаскіх асобаў, а таксама іх памочнікаў, якія пражываюць на тэрыторыі яго юрысдыкцыі.

Кан. 791 – У асобных дыяцэзіях з мэтай спрыяння місійнаму супрацоўніцтву трэба:

1° падтрымліваць місійныя пакліканні;

2° прызначыць святара для паспяховай падтрымкі місійных пачынанняў, асабліва «Папскай місійнай справы»;

3° штогадова арганізоўваць дзень, прысвечаны місіям;

4° штогадова прызначаць на карысць місій ахвяраванні, якія дасылаюцца праз пасрэдніцтва Святой Сталіцы.

Кан. 792 – Канферэнцыі Біскупаў павінны засноўваць і падтрымліваць арганізацыі, якія павінны па-братэрску прымаць і атуляць асаблівай пастырскай апекай тых, хто прыбывае на тэрыторыю дадзенай Канферэнцыі з місійных краін на працу або дзеля навучання.

Can. 789 – Neophyti, apta institutione ad veritatem evangelicam penitius cognoscendam et officia per baptismum suscepta implenda efformentur; sincero amore erga Christum eiusque Ecclesiam imbuantur.

Can. 790 – § 1. Episcopi dioecesani in territoriis missionis est:

1° promovere, moderari et coordinare incepta et opera, quae ad actionem missionalem spectant;

2° curare ut debitae ineantur conventiones cum Moderatoribus institutorum quae operi missionali se dedicant, utque relationes cum iisdem in bonum cedant missionis.

§ 2. Praescriptis ab Episcopo dioecesano de quibus in § 1, n. 1 editis, subsunt omnes missionarii, etiam religiosi eorumque auxiliares in eius dicione degentes.

Can. 791 – In singulis dioecesibus ad cooperationem missionalem fovendam:

1° promoveantur vocationes missionales;

2° sacerdos deputetur ad incepta pro missionibus efficaciter promovenda, praesertim *Pontificia Opera Missionalia*;

3° celebretur dies annualis pro missionibus;

4° solvatur quotannis congrua pro missionibus stips, Sanctae Sedi transmittenda.

Can. 792 – Episcoporum conferentiae opera instituant ac promoveant, quibus ii qui e terris missionum laboris aut studii causa ad earundem territorium accedant, fraterne recipiantur et congruenti pastorali cura adiuventur.

TITULUS III
DE EDUCATIONE CATHOLICA

Can. 793 – § 1. Parentes, necnon qui eorum locum tenent, obligatione adstringuntur et iure gaudent prolem educandi; parentes catholici officium quoque et ius habent ea eligendi media et instituta quibus, iuxta locorum adiuncta, catholicae filiorum educationi aptius prospicere queant.

§ 2. Parentibus ius est etiam iis fruendi auxiliis a societate civili praestandis, quibus in catholica educatione filiorum procuranda indigeant.

Can. 794 – § 1. Singulari ratione officium et ius educandi spectat ad Ecclesiam, cui divinitus missio concredita est homines adiuvandi, ut ad christianae vitae plenitudinem pervenire valeant.

§ 2. Animarum pastoribus officium est omnia disponendi, ut educatione catholica omnes fideles fruantur.

Can. 795 – Cum vera educatio integram persequi debeat personae humanae formationem, spectantem ad finem eius ultimum et simul ad bonum commune societatum, pueri et iuvenes ita excolantur ut suas dotes physicas, morales et intellectuales harmonice evolvere valeant, perfectiorem responsabilitatis sensum libertatisque rectum usum acquirant et ad vitam socialem active participandam conformentur.

Caput I
De scholis

Can. 796 – § 1. Inter media ad excolendam educationem christifideles magni faciant scholas, quae quidem parentibus, in munere educationis implendo, praecipuo auxilio sunt.

ТЫТУЛ III
КАТАЛІЦКАЕ ВЫХАВАННЕ

Кан. 793 – § 1. Бацькі, а таксама тыя, хто іх замяшчае, абавязаны і ў той жа час маюць права выхоўваць патомства. Апрача гэтага, каталіцкія бацькі маюць абавязак і права выбіраць такія сродкі і ўстановы, з дапамогай якіх яны, паводле мясцовых умоваў, маглі б лепш паклапаціцца аб каталіцкім выхаванні сваіх дзяцей.

§ 2. Бацькі маюць таксама права на атрыманне ад грамадзянскай супольнасці дапамогі, карыснай для каталіцкага выхавання дзяцей.

Кан. 794 – § 1. Асаблівым чынам абавязак і права выхавання належаць Касцёлу, якому ад Бога даверана місія дапамогі людзям, каб яны маглі дасягнуць паўнаты хрысціянскага жыцця.

§ 2. Душпастыры маюць абавязак рабіць усе неабходныя захады да таго, каб усе вернікі маглі атрымаць каталіцкае выхаванне.

Кан. 795 – Паколькі сапраўднае выхаванне павінна ва ўсёй паўнаце ахоплівать фармаванне чалавечай асобы, маючы на ўвазе і яе найвышэйшую мэту, і агульнае дабро грамадства, таму дзяцей і моладзь трэба выхоўваць такім чынам, каб яны маглі гарманічна развіваць свае фізічныя, маральныя і інтэлектуальныя здольнасці, удасканальваць пачуццё адказнасці, належным чынам карыстацца свабодай і рыхтавацца да дзейнага ўдзелу ў грамадскім жыцці.

Раздзел I
Школы

Кан. 796 – § 1. Сярод сродкаў выхавання вернікі павінны вельмі цаніць школы, якія аказваюць бацькам асаблівую дапамогу ў выкананні задання выхавання.

§ 2. Бацькі павінны цесна супрацоўнічаць са школьнымі настаўнікамі, якім яны даверылі выхаванне сваіх дзяцей; у сваю чаргу, настаўнікі пры выкананні сваіх абавязкаў павінны цесна супрацоўнічаць з бацькамі, уважліва іх выслухоўваючы; трэба таксама арганізоўваць і высока цаніць бацькоўскія аб'яднанні і сходы.

Кан. 797 – Бацькі павінны карыстацца сапраўднай свабодай пры выбары школы; таму вернікі павінны рупліва клапаціцца аб тым, каб грамадзянская супольнасць прызнавала гэтую свабоду за бацькамі і забяспечвала яе таксама праз матэрыяльную дапамогу, захоўваючы справядлівасць пры размеркаванні сродкаў.

Кан. 798 – Пажадана, каб бацькі аддавалі сваіх дзяцей у тыя школы, якія забяспечваюць каталіцкае выхаванне; калі ж яны не могуць зрабіць гэта, павінны паклапаціцца аб належным каталіцкім выхаванні дзяцей па-за школай.

Кан. 799 – Вернікі павінны імкнуцца да таго, каб законы грамадзянскай супольнасці, якія парадкуюць справы адукацыі моладзі, забяспечвалі ёй рэлігійнае і маральнае выхаванне таксама і ў школах, паводле сумлення бацькоў.

Кан. 800 – § 1. Касцёл мае права засноўваць школы любога профілю, віду і ўзроўню, а таксама кіраваць імі.

§ 2. Вернікі павінны падтрымліваць каталіцкія школы, па меры сваіх сіл аказваючы дапамогу ў іх заснаванні і ўтрыманні.

Кан. 801 – Манаскія інстытуты, для якіх місія выхавання з'яўляецца ўласцівай, застаючыся вернымі гэтай місіі, павінны імкнуцца займацца каталіцкім выхаваннем таксама праз свае школы, заснаваныя са згоды дыяцэзіяльнага біскупа.

§ 2. Cum magistris scholarum, quibus filios educandos concredant, parentes arcte cooperentur oportet; magistri vero in officio suo persolvendo intime collaborent cum parentibus, qui quidem libenter audiendi sunt eorumque consociationes vel conventus instaurentur atque magni existimentur.

Can. 797 – Parentes in scholis eligendis vera libertate gaudeant oportet; quare christifideles solliciti esse debent ut societas civilis hanc libertatem parentibus agnoscat atque, servata iustitia distributiva, etiam subsidiis tueatur.

Can. 798 – Parentes filios concredant illis scholis in quibus educationi catholicae provideatur; quod si facere non valeant, obligatione tenentur curandi, ut extra scholas debitae eorundem educationi catholicae prospiciatur.

Can. 799 – Christifideles enitantur ut in societate civili leges quae iuvenum formationem ordinant, educationi eorum religiosae et morali quoque, iuxta parentum conscientiam, in ipsis scholis prospiciant.

Can. 800 – § 1. Ecclesiae ius est scholas cuiusvis disciplinae, generis et gradus condendi ac moderandi.

§ 2. Christifideles scholas catholicas foveant, pro viribus adiutricem operam conferentes ad easdem condendas et sustentandas.

Can. 801 – Instituta religiosa quibus missio educationis propria est, fideliter hanc suam missionem retinentes, satagant educationi catholicae etiam per suas scholas, consentiente Episcopo dioecesano conditas, sese impendere.

Can. 802 – § 1. Si praesto non sint scholae in quibus educatio tradatur christiano spiritu imbuta, Episcopi dioecesani est curare ut condantur.

§ 2. Ubi id expediat, Episcopus dioecesanus provideat ut scholae quoque condantur professionales et technicae necnon aliae quae specialibus necessitatibus requirantur.

Can. 803 – § 1. Schola catholica ea intellegitur quam auctoritas ecclesiastica competens aut persona iuridica ecclesiastica publica moderatur, aut auctoritas ecclesiastica documento scripto uti talem agnoscit.

§ 2. Institutio et educatio in schola catholica principiis doctrinae catholicae nitatur oportet; magistri recta doctrina et vitae probitate praestent.

§ 3. Nulla schola, etsi reapse catholica, nomen *scholae catholicae* gerat, nisi de consensu competentis auctoritatis ecclesiasticae.

Can. 804 – § 1. Ecclesiae auctoritati subicitur institutio et educatio religiosa catholica quae in quibuslibet scholis impertitur aut variis communicationis socialis instrumentis procuratur; Episcoporum conferentiae est de hoc actionis campo normas generales edicere, atque Episcopi dioecesani est eundem ordinare et in eum invigilare.

§ 2. Loci Ordinarius sollicitus sit, ut qui ad religionis institutionem in scholis, etiam non catholicis, deputentur magistri recta doctrina, vitae christianae testimonio atque arte paedagogica sint praestantes.

Can. 805 – Loci Ordinario pro sua dioecesi ius est nominandi aut appro-

Кан. 802 – § 1. Калі няма школ, у якіх даецца выхаванне, прасякнутае хрысціянскім духам, то заданнем дыяцэзіяльнага біскупа з'яўляецца клопат аб тым, каб такія школы былі ўтвораны.

§ 2. Там, дзе гэта будзе дарэчным, дыяцэзіяльны біскуп павінен паклапаціцца аб тым, каб былі ўтвораны таксама прафесійныя і тэхнічныя школы, а таксама іншыя, якіх патрабуе асобая неабходнасць.

Кан. 803 – § 1. Школа лічыцца каталіцкай, калі ёй кіруе кампетэнтная касцёльная ўлада ці касцёльная публічная юрыдычная асоба або яна была прызнана ў такой якасці пісьмовым дакументам касцёльнай улады.

§ 2. Навучанне і выхаванне ў каталіцкай школе павінны засноўвацца на прынцыпах хрысціянскага вучэння; настаўнікі павінны адзначацца прыхільнасцю да гэтага вучэння і добрапрыстойнасцю жыцця.

§ 3. Ніякая школа, нават калі сапраўды з'яўляецца каталіцкай, не можа мець назву «каталіцкая школа» без згоды кампетэнтнай касцёльнай улады.

Кан. 804 – § 1. Рэлігійнае каталіцкае навучанне і выхаванне, якія даюцца ў любых школах або ажыццяўляюцца праз сродкі сацыяльнай камунікацыі, падпарадкаваны ўладзе Касцёла; Канферэнцыя Біскупаў мае права выдаць агульныя нормы для гэтай сферы дзейнасці, а дыяцэзіяльны біскуп — кіраваць ёю і сачыць за ёй.

§ 2. Ардынарый месца павінен клапаціцца аб тым, каб асобы, прызначаныя на пасаду настаўніка рэлігійнага выхавання ў школах, нават некаталіцкіх, адзначаліся здаровым вучэннем, сведчаннем хрысціянскага жыцця і педагагічнай умеласцю.

Кан. 805 – У сваёй дыяцэзіі ардынарый месца мае права прызначаць або зацвяр-

джаць на пасадзе настаўнікаў рэлігіі, а таксама знімаць іх з пасады або патрабаваць іх зняцця, калі гэтага патрабуюць прычыны, звязаныя з рэлігіяй або норавамі.

Кан. 806 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп мае права сачыць за каталіцкімі школамі, якія знаходзяцца на яго тэрыторыі, і здзяйсняць іх візітацыю, у тым ліку тых, якія былі заснаваны або кіруюцца членамі манаскіх інстытутаў; ён таксама мае права выдаваць прадпісанні, якія датычаць агульнага ўпарадкавання каталіцкіх школ, гэтыя прадпісанні абавязваюць таксама школы, якія кіруюцца членамі інстытутаў або таварыстваў, захоўваючы пры гэтым аўтаномію ў тым, што адносіцца да ўнутранага распарадку гэтых школ.

§ 2. Мадэратары каталіцкіх школ пад наглядам ардынарыя месца павінны клапаціцца аб тым, каб навучанне ў гэтых школах ажыццяўлялася прынамсі на тым жа ўзроўні з навуковага пункту гледжання, што і ў іншых школах дадзенага рэгіёна.

bandi magistros religionis, itemque, si religionis morumve ratio id requirat, amovendi aut exigendi ut amoveantur.

Can. 806 – § 1. Episcopo dioecesano competit ius invigilandi et invisendi scholas catholicas in suo territorio sitas, eas etiam quae ab institutorum religiosorum sodalibus conditae sint aut dirigantur; eidem item competit praescripta edere quae ad generalem attinent ordinationem scholarum catholicarum: quae praescripta valent de scholis quoque quae ab iisdem sodalibus diriguntur, salva quidem eorundem quoad internum earum scholarum moderamen autonomia.

§ 2. Curent scholarum catholicarum Moderatores, advigilante loci Ordinario, ut institutio quae in iisdem traditur pari saltem gradu ac in aliis scholis regionis, ratione scientifica sit praestans.

Раздзел II

Каталіцкія ўніверсітэты і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы

Кан. 807 – Касцёл мае права на заснаванне і кіраванне ўніверсітэтамі, якія садзейнічаюць павышэнню чалавечай культуры і больш поўнаму развіццю чалавечай асобы, а таксама ажыццяўленню настаўніцкага задання самога Касцёла.

Кан. 808 – Ніякі ўніверсітэт, нават калі ён сапраўды з'яўляецца каталіцкім, не можа мець тытул, іншымі словамі — назву, «каталіцкі ўніверсітэт» без згоды кампетэнтнай касцёльнай улады.

Caput II

De catholicis universitatibus aliisque studiorum superiorum institutis

Can. 807 – Ius est Ecclesiae erigendi et moderandi studiorum universitates, quae quidem ad altiorem hominum culturam et pleniorem personae humanae promotionem necnon ad ipsius Ecclesiae munus docendi implendum conferant.

Can. 808 – Nulla studiorum universitas, etsi reapse catholica, titulum seu nomen *universitatis catholicae* gerat, nisi de consensu competentis auctoritatis ecclesiasticae.

Can. 809 – Episcoporum conferentiae curent ut habeantur, si fieri possit et expediat, studiorum universitates aut saltem facultates, in ipsarum territorio apte distributae, in quibus variae disciplinae, servata quidem earum scientifica autonomia, investigentur et tradantur, doctrinae catholicae ratione habita.

Can. 810 – § 1. Auctoritati iuxta statuta competenti officium est providendi ut in universitatibus catholicis nominentur docentes qui, praeterquam idoneitate scientifica et paedagogica, doctrinae integritate et vitae probitate praestent utque, deficientibus his requisitis, servato modo procedendi in statutis definito, a munere removeantur.

§ 2. Episcoporum conferentiae et Episcopi dioecesani, quorum interest, officium habent et ius invigilandi, ut in iisdem universitatibus principia doctrinae catholicae fideliter serventur.

Can. 811 – § 1. Curet auctoritas ecclesiastica competens ut in universitatibus catholicis erigatur facultas aut institutum aut saltem cathedra theologiae, in qua lectiones laicis quoque studentibus tradantur.

§ 2. In singulis universitatibus catholicis lectiones habeantur, in quibus eae praecipue tractentur quaestiones theologicae, quae cum disciplinis earundem facultatum sunt conexae.

Can. 812 – Qui in studiorum superiorum institutis quibuslibet disciplinas tradunt theologicas, auctoritatis ecclesiasticae competentis mandatum habeant oportet.

Can. 813 – Episcopus dioecesanus impensam habeat curam pastoralem studentium, etiam per paroeciae

Кан. 809 – Калі гэта будзе магчыма і мэтазгодна, Канферэнцыі Біскупаў, павінны паклапаціцца аб тым, каб на іх тэрыторыі існавалі належным чынам размеркаваныя ўніверсітэты або прынамсі факультэты, у якіх, захоўваючы іх навуковую аўтаномію, павінны вывучаць і выкладаць розныя навукі, беручы пад увагу касцёльнае вучэнне.

Кан. 810 – § 1. Улада, кампетэнтная паводле статутаў, павінна паклапаціцца аб тым, каб выкладчыкамі ў каталіцкіх універсітэтах прызначаліся тыя, хто, акрамя сваёй навуковай і педагагічнай прыдатнасці, адзначаюцца бездакорнасцю вучэння і сумленнасцю жыцця; калі ж яны не адпавядаюць гэтым патрабаванням, павінны быць звольнены з задання, захоўваючы парадак дзеянняў, акрэслены ў статутах.

§ 2. Канферэнцыі Біскупаў і зацікаўленыя дыяцэзіяльныя біскупы маюць абавязак і права сачыць за тым, каб у гэтых універсітэтах верна захоўваліся прынцыпы каталіцкага вучэння.

Кан. 811 – § 1. Кампетэнтная касцёльная ўлада павінна паклапаціцца аб тым, каб у каталіцкіх універсітэтах быў заснаваны факультэт, інстытут або прынамсі катэдра тэалогіі, дзе ажыццяўлялася б выкладанне таксама для свецкіх студэнтаў.

§ 2. У кожным каталіцкім універсітэце павінны праводзіцца лекцыі, на якіх асвятляліся б перадусім тыя тэалагічныя пытанні, якія маюць сувязь з навукамі, якія выкладаюцца на яго факультэтах.

Кан. 812 – Выкладчыкі тэалагічных навук у любых вышэйшых навучальных установах павінны мець упаўнаважанне кампетэнтнай касцёльнай улады.

Кан. 813 – Дыяцэзіяльны біскуп павінен забяспечыць пастырскую апеку над студэнтамі, нават праз заснаванне парафіі або

прынамсі праз прызначэнне для гэтага святароў на пастаянна, а таксама павінен паклапаціцца аб тым, каб пры ўніверсітэтах, таксама і некаталіцкіх, існавалі каталіцкія ўніверсітэцкія цэнтры, якія павінны аказваць моладзі дапамогу, перадусім духоўную.

Кан. 814 – Прадпісанні, устаноўленыя адносна ўніверсітэтаў, прымяняюцца і да іншых вышэйшых навучальных установаў.

erectionem, vel saltem per sacerdotes ad hoc stabiliter deputatos, et provideat ut apud universitates, etiam non catholicas, centra habeantur universitaria catholica, quae iuventuti adiutorio sint, praesertim spirituali.

Can. 814 – Quae de universitatibus statuuntur praescripta, pari ratione applicantur aliis studiorum superiorum institutis.

Раздзел III
Касцёльныя ўніверсітэты і факультэты

Кан. 815 – На моцы свайго задання абвяшчэння аб'яўленай праўды ў Касцёла ёсць права мець уласныя касцёльныя ўніверсітэты і факультэты, прызначаныя для вывучэння святых навук або іншых навук, звязаных са святымі, а таксама для навуковай падрыхтоўкі студэнтаў у гэтых навуках.

Кан. 816 – § 1. Касцёльныя ўніверсітэты і факультэты могуць быць утвораны толькі праз заснаванне Святой Сталіцай або праз зацвярджэнне, якое яна ўдзяліла; яна таксама мае права вярхоўнага кіравання гэтымі навучальнымі ўстановамі.

§ 2. Кожны касцёльны ўніверсітэт і факультэт павінен мець свае статуты і праграму навучання, зацверджаныя Святой Сталіцай.

Кан. 817 – Толькі ўніверсітэт або факультэт, заснаваны ці зацверджаны Апостальскай Сталіцай, можа прызнаваць навуковыя ступені, якія маюць кананічнае значэнне ў Касцёле.

Кан. 818 – Прадпісанні, устаноўленыя ў кан. 810, 812 і 813 адносна каталіцкіх універсітэтаў, маюць моц таксама ў дачы-

Caput III
De universitatibus et facultatibus ecclesiasticis

Can. 815 – Ecclesiae, vi muneris sui veritatem revelatam nuntiandi, propriae sunt universitates vel facultates ecclesiasticae ad disciplinas sacras vel cum sacris conexas pervestigandas, atque studentes in iisdem disciplinis scientifice instituendos.

Can. 816 – § 1. Universitates et facultates ecclesiasticae constitui tantum possunt erectione ab Apostolica Sede facta aut approbatione ab eadem concessa; eidem competit etiam earundem superius moderamen.

§ 2. Singulae universitates et facultates ecclesiasticae sua habere debent statuta et studiorum rationem ab Apostolica Sede approbata.

Can. 817 – Gradus academicos, qui effectus canonicos in Ecclesia habeant, nulla universitas vel facultas conferre valet, quae non sit ab Apostolica Sede erecta vel approbata.

Can. 818 – Quae de universitatibus catholicis in cann. 810, 812 et 813 statuuntur praescripta, de universi-

tatibus facultatibusque ecclesiasticis quoque valent.

Can. 819 – Quatenus dioecesis aut instituti religiosi immo vel ipsius Ecclesiae universae bonum id requirat, debent Episcopi dioecesani aut institutorum Superiores competentes ad universitates vel facultates ecclesiasticas mittere iuvenes et clericos et sodales indole, virtute et ingenio praestantes.

Can. 820 – Curent universitatum et facultatum ecclesiasticarum Moderatores ac professores ut variae universitatis facultates mutuam sibi, prout obiectum siverit, praestent operam, utque inter propriam universitatem vel facultatem et alias universitates et facultates, etiam non ecclesiasticas, mutua habeatur cooperatio, qua nempe eaedem coniuncta opera, conventibus, investigationibus scientificis coordinatis aliisque mediis, ad maius scientiarum incrementum conspirent.

Can. 821 – Provideant Episcoporum conferentia atque Episcopus dioecesanus ut, ubi fieri possit, condantur instituta superiora scientiarum religiosarum, in quibus nempe edoceantur disciplinae theologicae aliaeque quae ad culturam christianam pertineant.

ненні да касцёльных універсітэтаў і факультэтаў.

Кан. 819 – Наколькі гэтага патрабуе дабро дыяцэзіі, манаскага інстытута або нават самога паўсюднага Касцёла, дыяцэзіяльныя біскупы або кампетэнтныя настаяцелі інстытутаў павінны кіраваць у касцёльныя ўніверсітэты і на факультэты моладзь, духоўных асобаў і членаў інстытутаў, якія адзначаюцца характарам, цнотамі і здольнасцямі.

Кан. 820 – Мадэратары і прафесары касцёльных універсітэтаў і факультэтаў павінны клапаціцца аб тым, каб розныя факультэты ўніверсітэта дапамагалі адны другім, наколькі гэта магчыма ў залежнасці ад іх прадметаў, а таксама каб ажыццяўлялася супрацоўніцтва паміж уласным універсітэтам ці факультэтам і іншымі ўніверсітэтамі і факультэтамі, нават некасцёльнымі, якое праз сумесную працу павінна садзейнічаць больш паспяховаму развіццю навукі праз правядзенне сустрэч, каардынацыю навуковых даследаванняў і іншыя сродкі.

Кан. 821 – Канферэнцыя Біскупаў і дыяцэзіяльны біскуп павінны паклапаціцца аб тым, каб там, дзе гэта магчыма, былі ўтвораны вышэйшыя навучальныя ўстановы рэлігійных навук, у якіх павінны выкладацца як тэалагічныя навукі, так і іншыя навукі, якія маюць дачыненне да хрысціянскай культуры.

TITULUS IV

DE INSTRUMENTIS COMMUNICATIONIS SOCIALIS ET IN SPECIE DE LIBRIS

Can. 822 – § 1. Ecclesiae pastores, in suo munere explendo iure Ecclesiae proprio utentes, instrumenta

ТЫТУЛ IV

СРОДКІ САЦЫЯЛЬНАЙ КАМУНІКАЦЫІ І АСАБЛІВА КНІГІ

Кан. 822 – § 1. Пастыры Касцёла, карыстаючыся пры ажыццяўленні свайго задання належным Касцёлу правам, павінны ім-

кнуцца выкарыстоўваць сродкі сацыяльнай камунікацыі.

§ 2. Гэтыя пастыры павінны настаўляць вернікаў у іх абавязку супрацоўніцтва, скіраванага на тое, каб ужыванне сродкаў сацыяльнай камунікацыі было прасякнута духам чалавечнасці і хрысціянства.

§ 3. Усе вернікі, а асабліва тыя, хто мае які-небудзь удзел у арганізоўванні сродкаў сацыяльнай камунікацыі або карыстанні імі, павінны імкнуцца дапамагаць у пастырскай дзейнасці такім чынам, каб Касцёл мог паспяхова выконваць сваё заданне з дапамогай таксама гэтых сродкаў.

Кан. 823 – § 1. Для таго, каб праўды веры і добрыя норавы захоўваліся бездакорна, пастыры Касцёла маюць абавязак і права сачыць за тым, каб друкаванае слова або выкарыстанне сродкаў сацыяльнай камунікацыі не прычынялі шкоды веры або норавам вернікаў; акрамя гэтага, яны маюць абавязак і права патрабаваць, каб на іх разгляд выносіліся друкаваныя вернікамі выданні, якія датычаць веры або нораваў, а таксама адхіляць творы, якія могуць прычыніць шкоду праўдзівай веры і добрым норавам.

§ 2. Абавязак і права, аб якіх гаворыцца ў § 1, належаць біскупам, як паасобку, так і сабраным на партыкулярных Сінодах або на Канферэнцыях Біскупаў, у адносінах да вернікаў, даручаных іх апецы, а вярхоўная ўлада Касцёла мае такое паўнамоцтва ў адносінах да ўсяго Божага народа.

Кан. 824 – § 1. Калі не пастаноўлена іншае, то ардынарыем месца, якога, згодна з канонамі гэтага тытула, трэба прасіць аб дазволе або зацвярджэнні на выданне кніг, з'яўляецца ўласны ардынарый месца аўтара або ардынарый таго месца, дзе будуць выдавацца кнігі.

communicationis socialis adhibere satagant.

§ 2. Iisdem pastoribus curae sit fideles edocere se officio teneri cooperandi ut instrumentorum communicationis socialis usus humano christianoque spiritu vivificetur.

§ 3. Omnes christifideles, ii praesertim qui quoquo modo in eorundem instrumentorum ordinatione aut usu partem habent, solliciti sint operam adiutricem actioni pastorali praestare, ita ut Ecclesia etiam his instrumentis munus suum efficaciter exerceat.

Can. 823 – § 1. Ut veritatum fidei morumque integritas servetur, officium et ius est Ecclesiae pastoribus invigilandi, ne scriptis aut usu instrumentorum communicationis socialis christifidelium fidei aut moribus detrimentum afferatur; item exigendi, ut quae scripta fidem moresve tangant a christifidelibus edenda suo iudicio subiciantur; necnon reprobandi scripta quae rectae fidei aut bonis moribus noceant.

§ 2. Officium et ius, de quibus in § 1, competunt Episcopis, tum singulis tum in conciliis particularibus vel Episcoporum conferentiis adunatis quoad christifideles suae curae commissos, supremae autem Ecclesiae auctoritati quoad universum Dei populum.

Can. 824 – § 1. Nisi aliud statuatur, loci Ordinarius, cuius licentia aut approbatio ad libros edendos iuxta canones huius tituli est petenda, est loci Ordinarius proprius auctoris aut Ordinarius loci in quo libri publici iuris fient.

§ 2. Quae in canonibus huius tituli statuuntur de libris, quibuslibet scriptis divulgationi publicae destinatis applicanda sunt, nisi aliud constet.

§ 2. Тое, што ў канонах гэтага тытула пастаноўлена аб кнігах, трэба прымяняць і ў дачыненні да любых пісьмовых твораў, якія прызначаюцца для публічнага распаўсюджвання, калі не сцверджана іншае.

Can. 825 – § 1. Libri sacrarum Scripturarum edi non possunt nisi ab Apostolica Sede aut ab Episcoporum conferentia approbati sint; itemque ut eorundem versiones in linguam vernaculam edi possint, requiritur ut ab eadem auctoritate sint approbatae atque insimul necessariis et sufficientibus explicationibus sint instructae.

Кан. 825 – § 1. Кнігі Святога Пісання не могуць выдавацца без зацвярджэння Апостальскай Сталіцай або Канферэнцыяй Біскупаў; таксама для выдавання іх перакладаў на сучасныя мовы патрабуецца зацвярджэнне той жа ўладай і далучэнне неабходных і дастатковых тлумачэнняў.

§ 2. Versiones sacrarum Scripturarum convenientibus explicationibus instructas, communi etiam cum fratribus seiunctis opera, parare atque edere possunt christifideles catholici de licentia Episcoporum conferentiae.

§ 2. Каталіцкія вернікі могуць з дазволу Канферэнцыі Біскупаў рыхтаваць і выдаваць пераклады Святога Пісання таксама сумесна з адлучанымі братамі, з далучэннем адпаведных тлумачэнняў.

Can. 826 – § 1. Ad libros liturgicos quod attinet, serventur praescripta can. 838.

Кан. 826 – § 1. Калі гаворка ідзе пра літургічныя кнігі, трэба захоўваць прадпісанні кан. 838.

§ 2. Ut iterum edantur libri liturgici necnon eorum versiones in linguam vernaculam eorumve partes, constare debet de concordantia cum editione approbata ex attestatione Ordinarii loci in quo publici iuris fiunt.

§ 2. Для перавыдання літургічных кніг або іх перакладаў на сучасныя мовы, а таксама частак гэтых кніг патрэбна пасведчанне ардынарыя месца выдання аб іх адпаведнасці зацверджанаму выданню.

§ 3. Libri precum pro publico vel privato fidelium usu ne edantur nisi de licentia loci Ordinarii.

§ 3. Кнігі, прызначаныя для публічнага або прыватнага ўжывання вернікамі, могуць выдавацца толькі з дазволу ардынарыя месца.

Can. 827 – § 1. Catechismi necnon alia scripta ad institutionem catecheticam pertinentia eorumve versiones, ut edantur, approbatione egent loci Ordinarii, firmo praescripto can. 775, § 2.

Кан. 827 – § 1. Выдаванне катэхізісаў і іншых друкаваных выданняў, якія адносяцца да катэхэтычнай падрыхтоўкі, а таксама іх перакладаў, патрабуе зацвярджэння ардынарыя месца, захоўваючы прадпісанне кан. 775 § 2.

§ 2. Nisi cum approbatione competentis auctoritatis ecclesiasticae editi sint aut ab ea postea approbati, in scholis, sive elementariis sive mediis sive superioribus, uti textus, quibus institutio nititur, adhiberi non

§ 2. Кнігі, якія закранаюць пытанні Святога Пісання, тэалогіі, кананічнага права, гісторыі Касцёла, тэалагічных або маральных навук, могуць выкарыстоўвацца ў якасці падручнікаў для выкладання

ў пачатковых, сярэдніх або вышэйшых школах толькі тады, калі яны былі выдадзены з зацвярджэннем кампетэнтнай касцёльнай улады або зацверджаны ёю пазней.

§ 3. Рэкамендуецца, каб кнігі, якія датычаць спраў, аб якіх гаворыцца ў § 2, нават калі яны не выкарыстоўваюцца ў якасці падручнікаў, а таксама творы, змест якіх асаблівым чынам звязаны з рэлігіяй або добрымі норавамі, былі падданы суджэнню ардынарыя месца.

§ 4. У касцёлах і араторыях можна выстаўляць, прадаваць і распаўсюджваць толькі тыя кнігі або іншыя выданні, прысвечаныя пытанням рэлігіі або нораваў, якія былі выдадзены з дазволу кампетэнтнай касцёльнай улады або зацверджаны ёю пазней.

Кан. 828 – Не дазваляецца перавыданне зборнікаў дэкрэтаў або актаў, выдадзеных якой-небудзь касцёльнай уладай, калі перад гэтым не будзе атрыманы дазвол гэтай улады і не будуць захаваны прадпісаныя ёю ўмовы.

Кан. 829 – Зацвярджэнне або дазвол на выданне якога-небудзь твора датычыць арыгінальнага тэксту, а не яго новых выданняў ці перакладаў.

Кан. 830 – § 1. Захоўваючы права кожнага ардынарыя месца даручаць суджэнне аб кнігах зацверджаным ім асобам, Канферэнцыя Біскупаў можа скласці спіс цэнзараў, якія адзначаюцца ведамі, праўдзівым вучэннем і належнай разважлівасцю, каб дыяцэзіяльныя курыі маглі карыстацца іх дапамогай, або можа заснаваць камісію цэнзараў, з якой могуць кансультавацца ардынарыі месца.

§ 2. Выконваючы свае абавязкі, цэнзар павінен, адкідваючы ўсялякую перавагу

possunt libri qui quaestiones respiciunt ad sacram Scripturam, ad theologiam, ius canonicum, historiam ecclesiasticam, et ad religiosas aut morales disciplinas pertinentes.

§ 3. Commendatur ut libri materias de quibus in § 2 tractantes, licet non adhibeantur uti textus in institutione tradenda, itemque scripta in quibus aliquid habetur quod religionis aut morum honestatis peculiariter intersit, iudicio subiciantur loci Ordinarii.

§ 4. In ecclesiis oratoriisve exponi, vendi aut dari non possunt libri vel alia scripta de quaestionibus religionis aut morum tractantia, nisi cum licentia competentis auctoritatis ecclesiasticae edita sint aut ab ea postea approbata.

Can. 828 – Collectiones decretorum aut actorum ab aliqua auctoritate ecclesiastica editas, iterum edere non licet, nisi impetrata prius eiusdem auctoritatis licentia et servatis condicionibus ab eadem praescriptis.

Can. 829 – Approbatio vel licentia alicuius operis edendi pro textu originali valet, non vero pro eiusdem novis editionibus vel translationibus.

Can. 830 – § 1. Integro manente iure uniuscuiusque loci Ordinarii committendi personis sibi probatis iudicium de libris, ab Episcoporum conferentia confici potest elenchus censorum, scientia, recta doctrina et prudentia praestantium, qui curiis dioecesanis praesto sint, aut constitui etiam potest commissio censorum, quam loci Ordinarii consulere possint.

§ 2. Censor, in suo obeundo officio, omni personarum acceptione sepo-

sita, prae oculis tantummodo habeat Ecclesiae de fide et moribus doctrinam, uti a magisterio ecclesiastico proponitur.

§ 3. Censor sententiam suam scripto dare debet; quae si faverit, Ordinarius pro suo prudenti iudicio licentiam concedat ut editio fiat, expresso suo nomine necnon tempore ac loco concessae licentiae; quod si eam non concedat, rationes denegationis cum operis scriptore Ordinarius communicet.

Can. 831 – § 1. In diariis, libellis aut foliis periodicis quae religionem catholicam aut bonos mores manifesto impetere solent, ne quidpiam conscribant christifideles, nisi iusta et rationabili de causa; clerici autem et institutorum religiosorum sodales, tantummodo de licentia loci Ordinarii.

§ 2. Episcoporum conferentiae est normas statuere de requisitis ut clericis atque sodalibus institutorum religiosorum partem habere liceat in tractandis via radiophonica aut televisifica quaestionibus, quae ad doctrinam catholicam aut mores attineant.

Can. 832 – Institutorum religiosorum sodales ut scripta quaestiones religionis morumve tractantia edere possint, licentia quoque egent sui Superioris maioris ad normam constitutionum.

з увагі на асобу, кіравацца толькі вучэннем Касцёла аб веры і норавах так, як яно выкладаецца Магістэрыем Касцёла.

§ 3. Цэнзар павінен прадставіць сваё заключэнне ў пісьмовай форме; калі яно з'яўляецца станоўчым, ардынарый, згодна са сваім разважлівым суджэннем, удзяляе дазвол на выданне, указаўшы сваё імя, дату і месца выдачы дазволу; калі ж дазвол не быў удзелены, ардынарый павінен паведаміць аўтара твора аб прычынах адмовы.

Кан. 831 – § 1. Калі на гэта няма справядлівай і разумнай прычыны, вернікі не павінны публікавацца ў газетах, часопісах або перыядычных выданнях, якія адкрыта атакуюць каталіцкую рэлігію або добрыя норавы; а духоўныя асобы і члены манаскіх інстытутаў могуць рабіць гэта толькі з дазволу ардынарыя месца.

§ 2. Канферэнцыі Біскупаў належыць права ўстанаўліваць нормы адносна патрабаванняў, неабходных для ўдзелу духоўных асобаў і членаў манаскіх інстытутаў у радыё– і тэлеперадачах, якія маюць дачыненне да каталіцкага вучэння або нораваў.

Кан. 832 – Для таго, каб члены манаскіх інстытутаў маглі выдаваць публікацыі, якія разглядаюць пытанні рэлігіі або нораваў, ім неабходны таксама дазвол іх вышэйшага настаяцеля згодна з нормамі канстытуцый.

TITULUS V
DE FIDEI PROFESSIONE

Can. 833 – Obligatione emittendi personaliter professionem fidei, secundum formulam a Sede Apostolica probatam, tenentur:

1° coram praeside eiusve delegato, omnes qui Concilio Oecumenico vel particulari, synodo Episco-

ТЫТУЛ V
ВЫЗНАННЕ ВЕРЫ

Кан. 833 – Асабіста прамаўляць вызнанне веры паводле формулы, зацверджанай Святой Сталіцай, павінны:

1° перад тым, хто ўзначальвае, або яго ўпаўнаважаным — усе тыя, хто ўдзельнічае ў Сусветным Саборы або

партыкулярным Сінодзе, Сінодзе Біскупаў або дыяцэзіяльным Сінодзе з правам рашаючага або кансультатыўнага голасу; а той, хто ўзначальвае, — перад Саборам або Сінодам;

2° вылучаныя да кардынальскай годнасці паводле статутаў Святой Калегіі;

3° перад дэлегатам Апостальскай Сталіцы — усе вылучаныя да біскупства, а таксама тыя, хто прыраўноўваецца да дыяцэзіяльнага біскупа;

4° перад Калегіяй Кансультантаў — дыяцэзіяльны адміністратар;

5° перад дыяцэзіяльным біскупам або яго дэлегатам — генеральныя, біскупскія і судовыя вікарыі;

6° перад ардынарыем месца або яго дэлегатам — пробашчы, рэктар, выкладчыкі тэалогіі і філасофіі, якія прыступаюць да выконвання задання ў семінарыях; вылучаныя да дыяканскага пасвячэння;

7° перад Вялікім Канцлерам, а калі яго няма, то перад ардынарыем месца, ці перад іх дэлегатамі — рэктар касцёльнага або каталіцкага ўніверсітэта, які прыступае да выконвання задання; перад рэктарам, калі ён святар, або перад ардынарыем месца ці іх дэлегатамі — выкладчыкі навук, якія датычаць веры або нораваў, якія прыступаюць да выконвання задання, у якіх бы ўніверсітэтах яны ні выкладалі;

8° настаяцелі ў святарскіх манаскіх інстытутах або таварыствах апостальскага жыцця згодна з нормамі канстытуцый.

porum atque synodo dioecesanae intersunt cum voto sive deliberativo sive consultivo; praeses autem coram Concilio aut synodo;

2° promoti ad cardinalitiam dignitatem iuxta sacri Collegii statuta;

3° coram delegato ab Apostolica Sede, omnes promoti ad episcopatum, itemque qui Episcopo dioecesano aequiparantur;

4° coram collegio consultorum, Administrator dioecesanus;

5° coram Episcopo dioecesano eiusve delegato, Vicarii generales et Vicarii episcopales necnon Vicarii iudiciales;

6° coram loci Ordinario eiusve delegato, parochi, rector, magistri theologiae et philosophiae in seminariis, initio suscepti muneris; promovendi ad ordinem diaconatus;

7° coram Magno Cancellario eoque deficiente coram Ordinario loci eorumve delegatis, rector universitatis ecclesiasticae vel catholicae, initio suscepti muneris; coram rectore, si sit sacerdos, vel coram loci Ordinario eorumve delegatis, docentes qui disciplinas ad fidem vel mores pertinentes in quibusvis universitatibus tradunt, initio suscepti muneris;

8° Superiores in institutis religiosis et societatibus vitae apostolicae clericalibus, ad normam constitutionum.

LIBER IV

DE ECCLESIAE MUNERE SANCTIFICANDI

Can. 834 – § 1. Munus sanctificandi Ecclesia peculiari modo adimplet per sacram liturgiam, quae quidem habetur ut Iesu Christi muneris sacerdotalis exercitatio, in qua hominum sanctificatio per signa sensibilia significatur ac modo singulis proprio efficitur, atque a mystico Iesu Christi Corpore, Capite nempe et membris, integer cultus Dei publicus exercetur.

§ 2. Huiusmodi cultus tunc habetur, cum defertur nomine Ecclesiae a personis legitime deputatis et per actus ab Ecclesiae auctoritate probatos.

Can. 835 – § 1. Munus sanctificandi exercent imprimis Episcopi, qui sunt magni sacerdotes, mysteriorum Dei praecipui dispensatores atque totius vitae liturgicae in Ecclesia sibi commissa moderatores, promotores atque custodes.

§ 2. Illud quoque exercent presbyteri, qui nempe, et ipsi Christi sacerdotii participes, ut eius ministri sub Episcopi auctoritate, ad cultum divinum celebrandum et populum sanctificandum consecrantur.

КНІГА IV

АСВЯЧАЛЬНАЕ ЗАДАННЕ КАСЦЁЛА

Кан. 834 – § 1. Касцёл асаблівым чынам выконвае заданне асвячэння праз святую Літургію, якая таксама з'яўляецца ажыццяўленнем святарскага задання Езуса Хрыста; у ёй асвячэнне людзей аб'яўляецца праз бачныя знакі і здзяйсняецца ўласцівым для кожнага спосабам, а праз містычнае цела Езуса Хрыста, гэта значыць Яго Галаву і членаў, ажыццяўляецца ўвесь публічны Божы культ.

§ 2. Гэты культ ажыццяўляецца тады, калі праз дзеянні, зацверджаныя ўладай Касцёла, яго здзяйсняюць ад імя Касцёла асобы, легітымна для гэтага прызначаныя.

Кан. 835 – § 1. Заданне асвячэння выконваюць перадусім біскупы, якія з'яўляюцца вышэйшымі святарамі, галоўнымі распарадчыкамі Божых таямніц, кіраўнікамі, пачынальнікамі і абаронцамі ўсяго літургічнага жыцця ў даручаным ім Касцёле.

§ 2. Выконваюць яго таксама прэзбітэры, якія, маючы ўдзел у святарстве Хрыста, у якасці яго служыцеляў пад уладай біскупа кансэкруюцца для цэлебрацыі Божага культу і асвячэння народа.

§ 3. Дыяканы маюць удзел у цэлебрацыі Божага культу згодна з нормамі прадпісанняў права.

§ 4. Уласны ўдзел у заданні асвячэння маюць таксама іншыя вернікі, якія дзейна, уласцівым сабе спосабам удзельнічаюць у літургічных цэлебрацыях, асабліва ў Эўхарыстыі; асаблівым чынам у гэтым заданні ўдзельнічаюць бацькі, калі вядуць сужэнскае жыццё ў хрысціянскім духу і забяспечваюць хрысціянскае выхаванне дзяцей.

Кан. 836 – Паколькі хрысціянскі культ, у якім ажыццяўляецца агульнае святарства вернікаў, з'яўляецца справай, якая вынікае з веры і на ёй засноўваецца, святыя служыцелі павінны старацца рупліва пабуджаць яе і высвятляць, перадусім праз паслугу слова, якая нараджае і сілкуе веру.

Кан. 837 – § 1. Літургічныя дзеянні — гэта не прыватныя дзеянні, але цэлебрацыі самога Касцёла, які з'яўляецца «сакрамэнтам еднасці», а менавіта святым народам, сабраным пад кіраваннем біскупаў; таму літургічныя дзеянні належаць усяму целу Касцёла, аб'яўляюць яго і будуюць; асобных жа яго членаў яны датычаць па-рознаму, у залежнасці ад разнастайнасці пасвячэнняў, заданняў і актуальнага ўдзелу.

§ 2. У тых выпадках, калі літургічныя дзеянні па сваёй сутнасці патрабуюць цэлебрацыі ў супольнасці, там, дзе гэта магчыма, яны павінны цэлебравацца з прысутнасцю і дзейным удзелам вернікаў.

Кан. 838 – § 1. Кіраванне святой Літургіяй залежыць выключна ад улады Касцёла, якую мае Апостальская Сталіца і дыяцэзіяльны біскуп згодна з нормамі права.

§ 2. Да Апостальскай Сталіцы належыць кіраванне святой Літургіяй ва ўсім Касцёле, выдаванне літургічных кніг, праверка дастасаванняў, якія былі згодна

§ 3. Diaconi in divino cultu celebrando partem habent, ad normam iuris praescriptorum.

§ 4. In munere sanctificandi propriam sibi partem habent ceteri quoque christifideles actuose liturgicas celebrationes, eucharisticam praesertim, suo modo participando; peculiari modo idem munus participant parentes vitam coniugalem spiritu christiano ducendo et educationem christianam filiorum procurando.

Can. 836 – Cum cultus christianus, in quo sacerdotium commune christifidelium exercetur, opus sit quod a fide procedit et eadem innititur, ministri sacri eandem excitare et illustrare sedulo curent, ministerio praesertim verbi, quo fides nascitur et nutritur.

Can. 837 – § 1. Actiones liturgicae non sunt actiones privatae, sed celebrationes Ecclesiae ipsius, quae est «unitatis sacramentum», scilicet plebs sancta sub Episcopis adunata et ordinata; quare ad universum corpus Ecclesiae pertinent illudque manifestant et afficiunt; singula vero membra ipsius attingunt diverso modo, pro diversitate ordinum, munerum et actualis participationis.

§ 2. Actiones liturgicae, quatenus suapte natura celebrationem communem secumferant, ubi id fieri potest, cum frequentia et actuosa participatione christifidelium celebrentur.

Can. 838 – § 1. Sacrae liturgiae moderatio ab Ecclesiae auctoritate unice pendet: quae quidem est penes Apostolicam Sedem et, ad normam iuris, penes Episcopum dioecesanum.

§ 2. Apostolicae Sedis est sacram liturgiam Ecclesiae universae ordinare, libros liturgicos edere, aptationes, ad normam iuris a Conferentia Epi-

scoporum approbatas, recognoscere, necnon advigilare ut ordinationes liturgicae ubique fideliter observentur.

§ 3. Ad Episcoporum Conferentias spectat versiones librorum liturgicorum in linguas vernaculas fideliter et convenienter intra limites definitos accommodatas parare et approbare atque libros liturgicos, pro regionibus ad quas pertinent, post confirmationem Apostolicae Sedis, edere.

§ 4. Ad Episcopum dioecesanum in Ecclesia sibi commissa pertinet, intra limites suae competentiae, normas de re liturgica dare, quibus omnes tenentur.

Can. 839 – § 1. Aliis quoque mediis munus sanctificationis peragit Ecclesia, sive orationibus, quibus Deum deprecatur ut christifideles sanctificati sint in veritate, sive paenitentiae et caritatis operibus, quae quidem magnopere ad Regnum Christi in animis radicandum et roborandum adiuvant et ad mundi salutem conferunt.

§ 2. Curent locorum Ordinarii ut orationes necnon pia et sacra exercitia populi christiani normis Ecclesiae plene congruant.

з правам зацверджаны Канферэнцыяй Біскупаў, а таксама нагляд за тым, каб літургічныя нормы паўсюдна верна захоўваліся.

§ 3. Да Канферэнцый Біскупаў належыць падрыхтоўка перакладаў на сучасныя мовы літургічных кніг, верна і адпаведным чынам дастасаваных у акрэсленых межах, зацвярджэнне іх і выдаванне літургічных кніг для рэгіёнаў, якія ўваходзяць у Канферэнцыі, пасля атрымання адабрэння Апостальскай Сталіцы.

§ 4. Да дыяцэзіяльнага біскупа ў даручаным яму Касцёле належыць прыняцце ў межах сваёй кампетэнцыі ў літургічных справах нормаў, якія з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх.

Кан. 839 – § 1. Касцёл выконвае заданне асвячэння таксама з дапамогай іншых сродкаў: або праз малітвы, у якіх ён просіць Бога аб асвячэнні вернікаў у праўдзе, або праз учынкі пакаяння і любові, якія вельмі спрыяюць укараненню і ўмацаванню Хрыстовага Валадарства ў душах і збаўленню свету.

§ 2. Ардынарыі месца павінны клапаціцца аб тым, каб малітвы, а таксама пабожныя і святыя практыкаванні хрысціянскага народа адбываліся ў поўнай адпаведнасці з нормамі Касцёла.

PARS I
DE SACRAMENTIS

Can. 840 – Sacramenta Novi Testamenti, a Christo Domino instituta et Ecclesiae concredita, utpote actiones Christi et Ecclesiae, signa exstant ac media quibus fides exprimitur et roboratur, cultus Deo redditur et hominum sanctificatio efficitur, atque ideo ad communionem eccle-

ЧАСТКА I
САКРАМЭНТЫ

Кан. 840 – Сакрамэнты Новага Запавету, устаноўленыя Хрыстом Панам і даверанымі Касцёлу, будучы дзеяннямі Хрыста і Касцёла, з'яўляюцца знакамі і сродкамі, праз якія выражаецца і ўмацоўваецца вера, аддаецца культ Богу і здзяйсняецца асвячэнне чалавека, таму яны ў найвышэйшай

ступені спрыяюць утварэнню, умацаванню і аб'яўленню касцёльнага адзінства; адсюль пры іх цэлебрацыі як святыя служыцелі, так і іншыя вернікі павінны праяўляць найбольшую пашану і належную стараннасць.

siasticam inducendam, firmandam et manifestandam summopere conferunt; quapropter in iis celebrandis summa veneratione debitaque diligentia uti debent tum sacri ministri tum ceteri christifideles.

Кан. 841 – Паколькі сакрамэнты з'яўляюцца аднымі для ўсяго Касцёла і належаць да Божага дэпазіту, толькі вярхоўная ўлада Касцёла можа зацвярджаць або акрэсліваць тое, што патрабуецца для іх дзейснасці; таксама ёй або іншай кампетэнтнай уладзе згодна з нормамі кан. 838 § 3 і 4 належыць права вырашаць пытанні, якія адносяцца да цэлебрацыі, удзялення і прыняцця сакрамэнтаў дазволеным чынам, а таксама да парадку, які павінен захоўвацца падчас іх цэлебрацыі.

Can. 841 – Cum sacramenta eadem sint pro universa Ecclesia et ad divinum depositum pertineant, unius supremae Ecclesiae auctoritatis est probare vel definire quae ad eorum validitatem sunt requisita, atque eiusdem aliusve auctoritatis competentis, ad normam can. 838, §§ 3 et 4, est decernere quae ad eorum celebrationem, administrationem et receptionem licitam necnon ad ordinem in eorum celebratione servandum spectant.

Кан. 842 – § 1. Не можа быць дзейсна дапушчаны да іншых сакрамэнтаў той, хто не прыняў хрост.

§ 2. Сакрамэнты хросту, канфірмацыі і Найсвяцейшай Эўхарыстыі настолькі цесна злучаны паміж сабой, што ўсе яны патрабуюцца для поўнага хрысціянскага ўтаямнічання.

Can. 842 – § 1. Ad cetera sacramenta valide admitti nequit, qui baptismum non recepit.

§ 2. Sacramenta baptismi, confirmationis et sanctissimae Eucharistiae ita inter se coalescunt, ut ad plenam initiationem christianam requirantur.

Кан. 843 – § 1. Святыя служыцелі не могуць адмовіць у сакрамэнтах тым, хто просіць аб іх належным чынам, адпаведна настроены і каму права не забараняе іх прымаць.

§ 2. Душпастыры і іншыя вернікі, кожны ў межах свайго касцёльнага задання, маюць абавязак клапаціцца аб тым, каб тыя, хто просяць аб удзяленні сакрамэнтаў, былі падрыхтаваны да іх прыняцця праз адпаведную евангелізацыю і катэхэтычную падрыхтоўку, беручы пад увагу нормы, выдадзеныя кампетэнтнай уладай.

Can. 843 – § 1. Ministri sacri denegare non possunt sacramenta iis qui opportune eadem petant, rite sint dispositi, nec iure ab iis recipiendis prohibeantur.

§ 2. Animarum pastores ceterique christifideles, pro suo quisque ecclesiastico munere, officium habent curandi ut qui sacramenta petunt debita evangelizatione necnon catechetica institutione ad eadem recipienda praeparentur, attentis normis a competenti auctoritate editis.

Кан. 844 – § 1. Каталіцкія служыцелі ўдзяляюць сакрамэнты дазволеным чынам толькі вернікам-католікам, якія ў сваю чар-

Can. 844 – § 1. Ministri catholici sacramenta licite administrant solis christifidelibus catholicis, qui pariter

eadem a solis ministris catholicis licite recipiunt, salvis huius canonis §§ 2, 3 et 4, atque can. 861, § 2 praescriptis.

§ 2. Quoties necessitas id postulet aut vera spiritualis utilitas id suadeat, et dummodo periculum vitetur erroris vel indifferentismi, licet christifidelibus quibus physice aut moraliter impossibile sit accedere ad ministrum catholicum, sacramenta paenitentiae, Eucharistiae et unctionis infirmorum recipere a ministris non catholicis, in quorum Ecclesia valida exsistunt praedicta sacramenta.

§ 3. Ministri catholici licite sacramenta paenitentiae, Eucharistiae et unctionis infirmorum administrant membris Ecclesiarum orientalium quae plenam cum Ecclesia catholica communionem non habent, si sponte id petant et rite sint dispositа; quod etiam valet quoad membra aliarum Ecclesiarum, quae iudicio Sedis Apostolicae, ad sacramenta quod attinet, in pari condicione ac praedictae Ecclesiae orientales versantur.

§ 4. Si adsit periculum mortis aut, iudicio Episcopi dioecesani aut Episcoporum conferentiae, alia urgeat gravis necessitas, ministri catholici licite eadem sacramenta administrant ceteris quoque christianis plenam communionem cum Ecclesia catholica non habentibus, qui ad suae communitatis ministrum accedere nequeant atque sponte id petant, dummodo quoad eadem sacramenta fidem catholicam manifestent et rite sint dispositi.

§ 5. Pro casibus de quibus in §§ 2, 3 et 4, Episcopus dioecesanus aut Episcoporum conferentia generales normas ne ferant, nisi post consultationem cum auctoritate competenti

гу прымаюць іх дазволеным чынам толькі ад служыцеляў-католікаў, захоўваючы прадпісанні § 2, 3 і 4 гэтага канона, а таксама кан. 861 § 2.

§ 2. Заўсёды, калі існуе неабходнасць ці да гэтага схіляе сапраўдная духоўная карысць і адсутнічае небяспека памылкі або абыякавасці, дазваляецца, каб вернікі, у якіх адсутнічае фізічная або маральная магчымасць звярнуцца да служыцеля-каталіка, прымалі сакрамэнты пакаяння, Эўхарыстыі і намашчэння хворых ад служыцеляў-некатолікаў, у Касцёле якіх згаданыя сакрамэнты з'яўляюцца дзейснымі.

§ 3. Служыцелі-католікі дазволеным чынам удзяляюць сакрамэнты пакаяння, Эўхарыстыі і намашчэння хворых членам Усходніх Касцёлаў, якія не маюць поўнага адзінства з Каталіцкім Касцёлам, калі яны самі аб гэтым просяць і адпаведна настроены; гэта прымяняецца таксама да членаў іншых Касцёлаў, якія згодна з суджэннем Апостальскай Сталіцы знаходзяцца ў роўных умовах са згаданымі Усходнімі Касцёламі ў тым, што датычыць сакрамэнтаў.

§ 4. Калі існуе небяспека смерці або на думку дыяцэзіяльнага біскупа ці Канферэнцыі Біскупаў да гэтага схіляе важкая неабходнасць, служыцелі-католікі дазволеным чынам удзяляюць гэтыя сакрамэнты таксама іншым хрысціянам, якія не маюць поўнага адзінства з Каталіцкім Касцёлам, калі яны не могуць звярнуцца да служыцеля сваёй супольнасці і самі аб гэтым просяць, калі толькі яны ў адносінах да гэтых сакрамэнтаў праяўляюць каталіцкую веру і адпаведна настроены.

§ 5. Дыяцэзіяльны біскуп або Канферэнцыя Біскупаў не павінны выдаваць агульных нормаў адносна выпадкаў, аб якіх гаворыцца ў § 2, 3 і 4, калі не было папярэд-

няй кансультацыі з кампетэнтнай уладай, прынамсі мясцовай, некаталіцкага Касцёла або супольнасці, якіх гэта датычыць.

Кан. 845 – § 1. Нельга паўторна ўдзяляць сакрамэнты хросту, канфірмацыі і пасвячэння, якія выціскаюць пячаць.

§ 2. Калі пасля старанна праведзенага даследавання яшчэ існуе разважлівае сумненне адносна таго, ці сакрамэнты, аб якіх гаворыцца ў § 1, былі на самай справе або ці былі ўдзелены дзейсна, то іх трэба ўдзяліць умоўна.

Кан. 846 – § 1. Пры цэлебрацыі сакрамэнтаў трэба верна прытрымлівацца літургічных кніг, зацверджаных кампетэнтнай уладай; таму нікому нельга па ўласнай волі нічога да іх дадаваць, прапускаць у іх або змяняць.

§ 2. Служыцель павінен цэлебраваць сакрамэнты паводле ўласнага абраду.

Кан. 847 – § 1. Пры ўдзяленні сакрамэнтаў, у якіх ужываецца святы алей, служыцель павінен карыстацца алеем, атрыманым з алівы або іншых раслін, які нядаўна быў кансэкраваны або благаслаўлены біскупам, захоўваючы прадпісанне кан. 999, 2°; старыя алеі не павінны ўжывацца, калі не ў выпадку неабходнасці.

§ 2. Пробашч павінен атрымліваць святыя алеі ад уласнага біскупа і старанна захоўваць іх у адпаведным месцы.

Кан. 848 – Служыцель не павінен нічога прасіць за ўдзяленне сакрамэнтаў, акрамя ахвяраванняў, акрэсленых кампетэнтнай уладай, праяўляючы пастаянны клопат аб тым, каб патрабуючыя не былі пазбаўлены сакрамэнтальнай дапамогі праз сваю беднасць.

saltem locali Ecclesiae vel communitatis non catholicae, cuius interest.

Can. 845 – § 1. Sacramenta baptismi, confirmationis et ordinis, quippe quae characterem imprimant, iterari nequeunt.

§ 2. Si, diligenti inquisitione peracta, prudens adhuc dubium supersit num sacramenta de quibus in § 1 revera aut valide collata fuerint, sub condicione conferantur.

Can. 846 – § 1. In sacramentis celebrandis fideliter serventur libri liturgici a competenti auctoritate probati; quapropter nemo in iisdem quidpiam proprio marte addat, demat aut mutet.

§ 2. Minister sacramenta celebret secundum proprium ritum.

Can. 847 – § 1. In administrandis sacramentis, in quibus sacra olea adhibenda sunt, minister uti debet oleis ex olivis aut aliis ex plantis expressis atque, salvo praescripto can. 999, n. 2, ab Episcopo consecratis vel benedictis, et quidem recenter; veteribus ne utatur, nisi adsit necessitas.

§ 2. Parochus olea sacra a proprio Episcopo impetret eaque decenti custodia diligenter asservet.

Can. 848 – Minister, praeter oblationes a competenti auctoritate definitas, pro sacramentorum administratione nihil petat, cauto semper ne egentes priventur auxilio sacramentorum ratione paupertatis.

TITULUS I

DE BAPTISMO

Can. 849 – Baptismus, ianua sacramentorum, in re vel saltem in voto ad salutem necessarius, quo homines a peccatis liberantur, in Dei filios regenerantur atque indelebili charactere Christo configurati Ecclesiae incorporantur, valide confertur tantummodo per lavacrum aquae verae cum debita verborum forma.

ТЫТУЛ I

ХРОСТ

Кан. 849 – Хрост, брама сакрамэнтаў, які з'яўляецца неабходным для збаўлення праз прыняцце на самай справе або прынамсі ў намеры, які вызваляе людзей ад грахоў, адраджае іх у якасці Божых дзяцей і, прыпадабняючы праз непазбыўную пячаць да Хрыста, далучае іх да Касцёла, дзейсна ўдзяляецца толькі праз абмыванне сапраўднай вадой з выкарыстаннем абавязковай слоўнай формы.

Caput I

De baptismi celebratione

Can. 850 – Baptismus ministratur secundum ordinem in probatis liturgicis libris praescriptum, excepto casu necessitatis urgentis, in quo ea tantum observari debent, quae ad validitatem sacramenti requiruntur.

Can. 851 – Baptismi celebratio debite praeparetur oportet; itaque:

1° adultus, qui baptismum recipere intendit, ad catechumenatum admittatur et, quatenus fieri potest, per varios gradus ad initiationem sacramentalem perducatur, secundum ordinem initiationis ab Episcoporum conferentia aptatum et peculiares normas ab eadem editas;

2° infantis baptizandi parentes, itemque qui munus patrini sunt suscepturi, de significatione huius sacramenti deque obligationibus cum eo cohaerentibus rite edoceantur; parochus per se vel per alios curet ut ita pastoralibus monitionibus, immo et communi precatione,

Раздзел I

Цэлебрацыя хросту

Кан. 850 – Хрост здзяйсняецца паводле парадку, прадпісанага ў зацверджаных літургічных кнігах, за выключэннем выпадкаў тэрміновай неабходнасці, калі павінна быць захавана толькі тое, што патрабуецца для дзейснасці сакрамэнту.

Кан. 851 – Цэлебрацыя хросту павінна быць належна падрыхтавана, таму:

1° дарослы, які мае намер прыняць хрост, павінен быць прыняты ў катэхумэнат і, па магчымасці, паступова прыведзены да хрысціянскага ўтаямнічання паводле парадку ўтаямнічання, дастасаванага Канферэнцыяй Біскупаў, і выдадзеных ёю асаблівых нормаў;

2° бацькі дзіцяці, якое будзе ахрышчана, а таксама тыя, хто прымае на сябе заданне хросных, павінны быць належным чынам павучаны аб значэнні сакрамэнту і тых абавязках, якія ён нясе з сабой; пробашч павінен асабіста або з дапамогай іншых паклапаціцца аб тым, каб даць бацькам належныя

настаўленні праз пастырскія парады і сумесныя малітвы, збіраючы разам некалькі сем'яў, а таксама, калі ёсць магчымасць, наведваючы іх.

debite parentes instruantur, plures adunando familias atque, ubi fieri possit, eas visitando.

Кан. 852 – § 1. Тое, што прадпісана ў канонах аб хросце дарослых, прымяняецца да ўсіх, хто выйшаў з дзіцячага ўзросту і здольны карыстацца розумам.

§ 2. Той, хто не ўсведамляе сваіх дзеянняў, прыраўноўваецца да дзіцяці таксама ў тым, што датычыць хросту.

Can. 852 – § 1. Quae in canonibus de baptismo adulti habentur praescripta, applicantur omnibus qui, infantia egressi, rationis usum assecuti sunt.

§ 2. Infanti assimilatur, etiam ad baptismum quod attinet, qui non est sui compos.

Кан. 853 – Вада, якая ўжываецца пры хрысце, апрача выпадку неабходнасці, павінна быць благаслаўлена паводле прадпісанняў літургічных кніг.

Can. 853 – Aqua in baptismo conferendo adhibenda, extra casum necessitatis, benedicta sit oportet, secundum librorum liturgicorum praescripta.

Кан. 854 – Хрост удзяляецца або праз акунанне ў ваду, або праз паліванне, захоўваючы прадпісанні Канферэнцыі Біскупаў.

Can. 854 – Baptismus conferatur sive per immersionem sive per infusionem, servatis Episcoporum conferentiae praescriptis.

Кан. 855 – Бацькі, хросныя і пробашч павінны паклапаціцца аб тым, каб не давалася імя, чужое хрысціянскаму духу.

Can. 855 – Curent parentes, patrini et parochus ne imponatur nomen a sensu christiano alienum.

Кан. 856 – Пры тым, што хрост можа цэлебравацца ў любы дзень, рэкамендуецца, каб звычайна ён цэлебраваўся ў нядзелю або, па магчымасці, у Пасхальную вігілію.

Can. 856 – Licet baptismus quolibet die celebrari possit, commendatur tamen ut ordinarie die dominica aut, si fieri possit, in vigilia Paschatis, celebretur.

Кан. 857 – § 1. Апрача выпадку неабходнасці, уласным месцам хросту з'яўляецца касцёл або араторый.

§ 2. Трэба прымаць за правіла, што дарослы павінен быць ахрышчаны ва ўласным парафіяльным касцёле, а дзіця — ва ўласным парафіяльным касцёле яго бацькоў, калі справядлівая прычына не схіляе да іншага.

Can. 857 – § 1. Extra casum necessitatis, proprius baptismi locus est ecclesia aut oratorium.

§ 2. Pro regula habeatur ut adultus baptizetur in propria ecclesia paroeciali, infans vero in ecclesia paroeciali parentum propria, nisi iusta causa aliud suadeat.

Кан. 858 – § 1. У кожным парафіяльным касцёле павінна быць купель хросту, пры тым, што сукупнае права, набытае раней іншымі касцёламі захоўваецца.

Can. 858 – § 1. Quaevis ecclesia paroecialis baptismalem fontem habeat, salvo iure cumulativo aliis ecclesiis iam quaesito.

§ 2. Loci Ordinarius, audito loci parocho, potest ad fidelium commoditatem permittere aut iubere, ut fons baptismalis habeatur etiam in alia ecclesia aut oratorio intra paroeciae fines.

§ 2. Ардынарый месца, выслухаўшы мясцовага пробашча, можа для карысці вернікаў дазволіць або загадаць, каб хрысцільная крыніца мелася таксама ў іншым касцёле або араторыі, якія знаходзяцца ў межах парафіі.

Can. 859 – Si ad ecclesiam paroecialem aut ad aliam ecclesiam vel oratorium, de quo in can. 858, § 2, baptizandus, propter locorum distantiam aliave adiuncta, sine gravi incommodo accedere vel transferri nequeat, baptismus conferri potest et debet in alia propinquiore ecclesia vel oratorio, aut etiam alio in loco decenti.

Кан. 859 – Калі той, хто павінен быць ахрышчаны, не можа з прычыны адлегласці або іншых абставін без вялікай нязручнасці прыбыць або быць дастаўлены ў парафіяльны касцёл або ў іншы касцёл ці араторый, аб якіх гаворыцца ў кан. 858 § 2, хрост можа і павінен быць удзелены ў якім-небудзь іншым касцёле ці араторыі, якія знаходзяцца бліжэй, або нават у якім-небудзь іншым адпаведным месцы.

Can. 860 – § 1. Praeter casum necessitatis, baptismus ne conferatur in domibus privatis, nisi loci Ordinarius gravi de causa id permiserit.

§ 2. In valetudinariis, nisi aliter Episcopus dioecesanus statuerit, baptismus ne celebretur, nisi in casu necessitatis vel alia ratione pastorali cogente.

Кан. 860 – § 1. Акрамя выпадку неабходнасці, хрост не павінен удзяляцца ў прыватных дамах, калі ардынарый месца па важкай прычыне гэта не дазволіць.

§ 2. Калі дыяцэзіяльны біскуп не пастановіць іначай, хрост не павінен цэлебравацца ў шпіталях, калі да гэтага не прымушае неабходнасць або якая-небудзь іншая пастырская прычына.

Caput II
De baptismi ministro

Раздзел II
Служыцель хросту

Can. 861 – § 1. Minister ordinarius baptismi est Episcopus, presbyter et diaconus, firmo praescripto can. 530, n. 1.

§ 2. Absente aut impedito ministro ordinario, licite baptismum confert catechista aliusve ad hoc munus ab Ordinario loci deputatus, immo, in casu necessitatis, quilibet homo debita intentione motus; solliciti sint animarum pastores, praesertim paro-

Кан. 861 – § 1. Звычайным служыцелем хросту з'яўляецца біскуп, прэзбітэр і дыякан, захоўваючы прадпісанне кан. 530, 1°.

§ 2. Калі звычайны служыцель адсутнічае або мае перашкоду, дазволеным чынам удзяляе хрост катэхет або іншая асоба, дэлегаваная да гэтага задання ардынарыем месца; больш за тое, у выпадку неабходнасці гэта можа зрабіць кожны чалавек, які

мае належны намер; душпастыры, а асабліва пробашчы, павінны клапаціцца аб тым, каб вернікі былі навучаны правільнаму парадку хросту.

chus, ut christifideles de recto baptizandi modo edoceantur.

Кан. 862 – Акрамя выпадку неабходнасці, нікому не дазваляецца ўдзяляць хрост на чужой тэрыторыі без належнага дазволу, нават сваім падуладным.

Can. 862 – Excepto casu necessitatis, nemini licet, sine debita licentia, in alieno territorio baptismum conferre, ne suis quidem subditis.

Кан. 863 – Трэба паведаміць дыяцэзіяльнага біскупа аб хросце дарослых, прынамсі тых, хто дасягнуў чатырнаццацігадовага ўзросту, каб ён, калі палічыць мэтазгодным, мог сам удзяліць хрост.

Can. 863 – Baptismus adultorum, saltem eorum qui aetatem quattuordecim annorum expleverunt, ad Episcopum dioecesanum deferatur ut, si id expedire iudicaverit, ab ipso administretur.

Раздзел III
Прымаючыя хрост

Caput III
De baptizandis

Кан. 864 – Кожны і толькі яшчэ неахрышчаны чалавек з'яўляецца здольным да прыняцця хросту.

Can. 864 – Baptismi capax est omnis et solus homo nondum baptizatus.

Кан. 865 – § 1. Для таго, каб дарослы мог быць ахрышчаны, неабходна, каб ён выявіў волю прыняцця хросту, быў дастаткова навучаны аб праўдах веры і хрысціянскіх абавязках, а таксама атрымаў досвед хрысціянскага жыцця ў катэхумэнаце; таксама ён павінен быць павучаны аб тым, што трэба мець жаль за свае грахі.

Can. 865 – § 1. Ut adultus baptizari possit, oportet voluntatem baptismum recipiendi manifestaverit, de fidei veritatibus obligationibusque christianis sufficienter sit instructus atque in vita christiana per catechumenatum sit probatus; admoneatur etiam ut de peccatis suis doleat.

§ 2. Дарослы, які знаходзіцца ў небяспецы смерці, можа быць ахрышчаны, калі, маючы якое-небудзь уяўленне аб галоўных праўдах веры, ён любым спосабам выявіць намер прыняцця хросту і паабяцае захоўваць запаведзі хрысціянскай рэлігіі.

§ 2. Adultus, qui in periculo mortis versatur, baptizari potest si, aliquam de praecipuis fidei veritatibus cognitionem habens, quovis modo intentionem suam baptismum recipiendi manifestaverit et promittat se christianae religionis mandata esse servaturum.

Кан. 866 – Калі няма важкай перашкоды, дарослы, які прымае хрост, павінен адразу пасля хросту прыняць канфірмацыю і ўдзельнічаць у эўхарыстычнай цэлебрацыі, прымаючы святую Камунію.

Can. 866 – Adultus qui baptizatur, nisi gravis obstet ratio, statim post baptismum confirmetur atque celebrationem eucharisticam, communionem etiam recipiendo, participet.

Can. 867 – § 1. Parentes obligatione tenentur curandi ut infantes intra priores hebdomadas baptizentur; quam primum post nativitatem, immo iam ante eam, parochum adeant ut sacramentum pro filio petant et debite ad illud praeparentur.

§ 2. Si infans in periculo mortis versetur, sine ulla mora baptizetur.

Кан. 867 – § 1. Бацькі павінны паклапаціцца аб тым, каб іх дзеці былі ахрышчаны ў першыя тыдні; як мага хутчэй пасля нараджэння, а нават перад нараджэннем бацькі павінны звярнуцца да пробашча, каб прасіць аб сакрамэнце для дзіцяці і належным чынам да яго падрыхтавацца.

§ 2. Калі дзіця знаходзіцца ў небяспецы смерці, яно павінна быць ахрышчана неадкладна.

Can. 868 – § 1. Ut infans licite baptizetur, oportet:

1° parentes, saltem eorum unus aut qui legitime eorundem locum tenet, consentiant;

2° spes habeatur fundata eum in religione catholica educatum iri, firma § 3; quae si prorsus deficiat, baptismus secundum praescripta iuris particularis differatur, monitis de ratione parentibus.

§ 2. Infans parentum catholicorum, immo et non catholicorum, in periculo mortis licite baptizatur, etiam invitis parentibus.

§ 3. Infans christianorum non catholicorum licite baptizatur, si parentes aut unus saltem eorum aut is, qui legitime eorundem locum tenet, id petunt et si eis physice aut moraliter impossibile sit accedere ad ministrum proprium.

Кан. 868 – § 1. Для таго, каб дзіця было ахрышчана дазволеным чынам, неабходна:

1° каб бацькі, або прынамсі адзін з іх, або асобы, якія легітымна іх замяшчаюць, былі згодныя на хрост;

2° каб існавала абгрунтаваная надзея, што дзіця будзе выхавана ў каталіцкай рэлігіі, захоўваючы § 3; калі такая надзея поўнасцю адсутнічае, то, паводле прадпісанняў партыкулярнага права, хрост павінен быць адкладзены, пры гэтым бацькі павінны быць паведамлены аб прычынах гэтага.

§ 2. У небяспецы смерці дзіцяці бацькоў-католікаў, а нават і некатолікаў, хрост удзяляецца дазволеным чынам нават насуперак волі бацькоў.

§ 3. Дзіця хрысціянаў-некатолікаў з'яўляецца ахрышчаным дазволеным чынам, калі бацькі, або прынамсі адзін з іх, або асобы, якія легітымна іх замяшчаюць, просяць аб гэтым і калі ў іх адсутнічае фізічная або маральная магчымасць звярнуцца да ўласнага служыцеля.

Can. 869 – § 1. Si dubitetur num quis baptizatus fuerit, aut baptismus valide collatus fuerit, dubio quidem post seriam investigationem permanente, baptismus eidem sub condicione conferatur.

Кан. 869 – § 1. Калі існуе сумненне адносна таго, што хто-небудзь быў ахрышчаны, або адносна таго, ці хрост быў удзелены дзейсна, прычым сумненне застаецца і пасля сур'ёзнага даследавання, такая асоба павінна быць ахрышчана ўмоўна.

§ 2. Няма абавязку хрысціць умоўна тых, хто быў ахрышчаны ў некаталіцкай касцёльнай супольнасці, калі пасля даследавання матэрыі і слоўнай формы, якія ўжываліся падчас удзялення хросту, а таксама ўзяўшы пад увагу намер ахрышчанага дарослага і служыцеля хросту, не застаецца сур'ёзнай падставы да сумнення ў дзейснасці хросту.

§ 3. Калі ў выпадках, аб якіх гаворыцца ў § 1 і 2, пад сумненнем застаецца сам факт удзялення хросту або яго дзейснасць, хрост можа быць удзелены толькі пасля таго, як таму, хто павінен быць ахрышчаны — калі ён дарослы — будзе выкладзена навука аб сакрамэнце хросту, і яму або — калі гаворка ідзе пра дзіця — яго бацькам будуць растлумачаны прычыны сумнення ў дзейснасці здзейсненага хросту.

Кан. 870 – Падкінутае або знойдзенае дзіця павінна быць ахрышчана, калі пасля стараннага даследавання не будзе ўстаноўлены факт яго хросту.

Кан. 871 – Неданошаны плод, калі ён жывы, трэба па магчымасці ахрысціць.

§ 2. Baptizati in communitate ecclesiali non catholica non sunt sub condicione baptizandi, nisi, inspecta materia et verborum forma in baptismo collato adhibitis necnon attenta intentione baptizati adulti et ministri baptizantis, seria ratio adsit de baptismi validitate dubitandi.

§ 3. Quod si, in casibus de quibus in §§ 1 et 2, dubia remaneat baptismi collatio aut validitas, baptismus ne conferatur nisi postquam baptizando, si sit adultus, doctrina de baptismi sacramento exponatur, atque eidem aut, si de infante agitur, eius parentibus rationes dubiae validitatis baptismi celebrati declarentur.

Can. 870 – Infans expositus aut inventus, nisi re diligenter investigata de eius baptismo constet, baptizetur.

Can. 871 – Fetus abortivi, si vivant, quatenus fieri potest, baptizentur.

Раздзел IV
Хросныя

Кан. 872 – Калі гэта магчыма, таму, хто прымае хрост, павінен быць дадзены хросны, які дарослага, які прымае хрост, павінен суправаджаць у хрысціянскім утаямніченні, а дзіця — разам з бацькамі павінен прадстаўляць да хросту, а таксама павінен дапамагаць ахрышчанаму весці хрысціянскае жыццё адпаведна прынятаму хросту і верна выконваць абавязкі, якія з яго вынікаюць.

Caput IV
De patrinis

Can. 872 – Baptizando, quantum fieri potest, detur patrinus, cuius est baptizando adulto in initiatione christiana adstare, et baptizandum infantem una cum parentibus ad baptismum praesentare itemque operam dare ut baptizatus vitam christianam baptismo congruam ducat obligationesque eidem inhaerentes fideliter adimpleat.

Can. 873 – Patrinus unus tantum vel matrina una vel etiam unus et una assumantur.

Can. 874 – § 1. Ut quis ad munus patrini suscipiendum admittatur, oportet:

1° ab ipso baptizando eiusve parentibus aut ab eo qui eorum locum tenet aut, his deficientibus, a parocho vel ministro sit designatus atque aptitudinem et intentionem habeat hoc munus gerendi;

2° decimum sextum aetatis annum expleverit, nisi alia aetas ab Episcopo dioecesano statuta fuerit vel exceptio iusta de causa parocho aut ministro admittenda videatur;

3° sit catholicus, confirmatus et sanctissimum Eucharistiae sacramentum iam receperit, idemque vitam ducat fidei et muneri suscipiendo congruam;

4° nulla poena canonica legitime irrogata vel declarata sit innodatus;

5° non sit pater aut mater baptizandi.

§ 2. Baptizatus ad communitatem ecclesialem non catholicam pertinens, nonnisi una cum patrino catholico, et quidem ut testis tantum baptismi, admittatur.

Кан. 873 – Дапускаецца, каб быў толькі адзін хросны, або адна хросная, або хросны і хросная разам.

Кан. 874 – § 1. Для таго, каб хто-небудзь мог быць дапушчаны да прыняцця задання хроснага, павінен:

1° быць вызначаным тым, хто прымае хрост, або яго бацькамі, або тымі, хто іх замяшчае, а калі іх няма — пробашчам або служыцелем; акрамя таго, ён павінен быць прыдатным да гэтага і мець намер выконваць гэтае заданне;

2° дасягнуць шаснаццацігадовага ўзросту, калі дыяцэзіяльны біскуп не ўстановіць іншы ўзрост або пробашч ці служыцель не палічаць, што па справядлівай прычыне можа быць зроблена выключэнне;

3° быць католікам, які ўжо прыняў канфірмацыю і Найсвяцейшую Эўхарыстыю, а таксама весці жыццё, згоднае з верай і тым заданнем, якое ён павінен выконваць;

4° не быць звязаным ніякім кананічным пакараннем, легітымна наложаным або сцверджаным;

5° не быць бацькам ці маці таго, хто прымае хрост.

§ 2. Ахрышчаны, які належыць да некаталіцкай касцёльнай супольнасці, можа быць дапушчаны толькі разам з хроснымкатолікам і толькі ў якасці сведкі хросту.

Caput V

De collati baptismi probatione et adnotatione

Раздзел V

Пацвярджэнне і рэгістрацыя ўдзеленага хросту

Can. 875 – Qui baptismum administrat curet ut, nisi adsit patrinus, habeatur saltem testis quo collatio baptismi probari possit.

Кан. 875 – Той, хто ўдзяляе хрост, павінен, калі няма хросных, паклапаціцца аб тым, каб быў прынамсі адзін сведка, які мог бы пацвердзіць факт удзялення хросту.

Кан. 876 – Для пацвярджэння ўдзялення хросту, калі гэта нікому не прычыняе шкоды, дастаткова заявы аднаго сведкі, які знаходзіцца па-за ўсялякімі падазрэннямі, або прысягі самога ахрышчанага, калі ён прыняў хрост, будучы дарослым.

Кан. 877 – § 1. Пробашч месца, дзе цэлебруецца хрост, павінен старанна і неадкладна запісаць у кнізе ахрышчаных імёны ахрышчаных, узгадваючы пра служыцеля, бацькоў, хросных ці пра сведкаў, калі яны былі, а таксама пра месца і дату ўдзялення хросту, указаўшы, апрача гэтага, дату і месца нараджэння.

§ 2. Калі гаворка ідзе пра дзіця, народжанае незамужняй маці, трэба ўнесці ў кнігу імя маці, калі публічна вядома аб яе мацярынстве або яна сама просіць аб гэтым у пісьмовай форме ці ў прысутнасці двух сведкаў; трэба ўпісаць таксама імя бацькі, калі яго бацькоўства пацвярджаецца якім-небудзь публічным дакументам або ён сам заяўляе аб гэтым у прысутнасці пробашча і двух сведкаў; у іншых выпадках ахрышчанага запісваюць без ніякага ўказання імя бацькі або бацькоў.

§ 3. Калі гаворка ідзе пра ўсыноўленае дзіця, трэба ўпісаць імёны прыёмных бацькоў, а таксама — прынамсі калі так робіцца ў актах грамадзянскага стану ў дадзеным рэгіёне — родных бацькоў згодна з нормамі § 1 і 2, з улікам прадпісанняў Канферэнцыі Біскупаў.

Кан. 878 – Калі хрост быў удзелены не пробашчам і не ў яго прысутнасці, то служыцель хросту, кім бы ён ні быў, павінен паведаміць пробашча парафіі, дзе быў удзелены хрост, каб той зарэгістраваў хрост згодна з нормай кан. 877 § 1.

Can. 876 – Ad collatum baptismum comprobandum, si nemini fiat praeiudicium, sufficit declaratio unius testis omni exceptione maioris, aut ipsius baptizati iusiurandum, si ipse in aetate adulta baptismum receperit.

Can. 877 – § 1. Parochus loci, in quo baptismus celebratur, debet nomina baptizatorum, mentione facta de ministro, parentibus, patrinis necnon, si adsint, testibus, de loco ac die collati baptismi, in baptizatorum libro sedulo et sine ulla mora referre, simul indicatis die et loco nativitatis.

§ 2. Si de filio agatur e matre non nupta nato, matris nomen inserendum est, si publice de eius maternitate constet aut ipsa sponte sua, scripto vel coram duobus testibus, id petat; item nomen patris inscribendum est, si eius paternitas probatur aliquo publico documento aut ipsius declaratione coram parocho et duobus testibus facta; in ceteris casibus, inscribatur baptizatus, nulla facta de patris aut parentum nomine indicatione.

§ 3. Si de filio adoptivo agitur, inscribantur nomina adoptantium necnon, saltem si ita fiat in actu civili regionis, parentum naturalium ad normam §§ 1 et 2, attentis Episcoporum conferentiae praescriptis.

Can. 878 – Si baptismus neque a parocho neque eo praesente administratus fuerit, minister baptismi, quicumque est, de collato baptismo certiorem facere debet parochum paroeciae in qua baptismus administratus est, ut baptismum adnotet ad normam can. 877, § 1.

TITULUS II

DE SACRAMENTO CONFIRMATIONIS

Can. 879 – Sacramentum confirmationis, quod characterem imprimit et quo baptizati, iter initiationis christianae prosequentes, Spiritus Sancti dono ditantur atque perfectius Ecclesiae vinculantur, eosdem roborat arctiusque obligat ut verbo et opere testes sint Christi fidemque diffundant et defendant.

ТЫТУЛ II

КАНФІРМАЦЫЯ

Кан. 879 – Сакрамэнт канфірмацыі, які выціскае пячаць і дзякуючы якому ахрышчаныя, ідучы шляхам хрысціянскага ўтаямнічання, атрымліваюць дары Духа Святога і больш дасканала злучаюцца з Касцёлам, умацоўвае іх і больш строга абавязвае да таго, каб яны словам і дзеяннем былі сведкамі Хрыста, распаўсюджвалі і абаранялі веру.

Caput I

De confirmationis celebratione

Can. 880 – § 1. Sacramentum confirmationis confertur per unctionem chrismatis in fronte, quae fit manus impositione atque per verba in probatis liturgicis libris praescripta.

§ 2. Chrisma in sacramento confirmationis adhibendum debet esse ab Episcopo consecratum, etiamsi sacramentum a presbytero ministretur.

Can. 881 – Expedit ut confirmationis sacramentum in ecclesia, et quidem intra Missam, celebretur; ex causa tamen iusta et rationabili, extra Missam et quolibet loco digno celebrari potest.

Раздзел I

Цэлебрацыя канфірмацыі

Кан. 880 – § 1. Сакрамэнт канфірмацыі ўдзяляецца праз намашчэнне чала хрызмам і здзяйсняецца праз ускладанне рукі і вымаўленне слоў, прадпісаных у зацверджаных літургічных кнігах.

§ 2. Хрызма, якое ўжываецца ў сакрамэнце канфірмацыі, павінна быць кансэкравана біскупам, нават калі служыцелем з'яўляецца прэзбітэр.

Кан. 881 – Варта, каб сакрамэнт канфірмацыі цэлебраваўся ў касцёле, пры тым падчас Імшы; аднак па справядлівай і разумнай прычыне ён можа цэлебравацца па-за Імшой і ў любым годным месцы.

Caput II

De confirmationis ministro

Can. 882 – Confirmationis minister ordinarius est Episcopus; valide hoc sacramentum confert presbyter quoque hac facultate vi iuris universalis

Раздзел II

Служыцель канфірмацыі

Кан. 882 – Звычайным служыцелем канфірмацыі з'яўляецца біскуп; дзейсна ўдзяляе гэты сакрамэнт таксама прэзбітэр, надзелены такім паўнамоцтвам на моцы

паўсюднага права або асаблівага даручэння кампетэнтнай улады.

Кан. 883 – На моцы самога права паўнамоцтва на ўдзяляне канфірмацыі маюць:

1° тыя, хто ў праве прыраўноўваюцца да дыяцэзіяльнага біскупа — у межах сваёй юрысдыкцыі;

2° у адносінах да акрэсленай вызначанай асобы — прэзбітэр, які на моцы пасады або на моцы ўпаўнаважання дыяцэзіяльнага біскупа хрысціць таго, хто выйшаў з дзіцячага ўзросту, або прымае ўжо ахрышчанага ў поўнае адзінства з Каталіцкім Касцёлам;

3° у адносінах да тых, хто знаходзіцца ў небяспецы смерці, — пробашч, а нават любы прэзбітэр.

Кан. 884 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп павінен удзяляць канфірмацыю асабіста або паклапаціцца аб тым, каб яе ўдзяліў іншы біскуп; калі гэтага патрабуе неабходнасць, ён можа ўдзяліць аднаму або некалькім акрэсленым прэзбітэрам паўнамоцтва да ўдзялення гэтага сакрамэнту.

§ 2. Па важкай прычыне біскуп або прэзбітэр, які на моцы права або асаблівага даручэння кампетэнтнай улады атрымаў паўнамоцтва ўдзяляць канфірмацыю, могуць у асобных выпадках скарыстацца з дапамогі іншых прэзбітэраў, каб і яны ўдзялялі гэты сакрамэнт.

Кан. 885 – § 1. Дыяцэзіяльны біскуп мае абавязак клапаціцца аб тым, каб сакрамэнт канфірмацыі ўдзяляўся яго падуладным, якія належным чынам і разумна аб гэтым просяць.

§ 2. Прэзбітэр, які мае такое паўнамоцтва, павінен яго ажыццяўляць у адносінах да тых асобаў, дзеля якіх яму было ўдзелена гэта паўнамоцтва.

aut peculiaris concessionis competentis auctoritatis instructus.

Can. 883 – Ipso iure facultate confirmationem ministrandi gaudent:

1° intra fines suae dicionis, qui iure Episcopo dioecesano aequiparantur;

2° quoad personam de qua agitur, presbyter qui, vi officii vel mandati Episcopi dioecesani, infantia egressum baptizat aut iam baptizatum in plenam Ecclesiae catholicae communionem admittit;

3° quoad eos qui in periculo mortis versantur, parochus, immo quilibet presbyter.

Can. 884 – § 1. Episcopus dioecesanus confirmationem administret per se ipse aut curet ut per alium Episcopum administretur; quod si necessitas id requirat, facultatem concedere potest uni vel pluribus determinatis presbyteris, qui hoc sacramentum administrent.

§ 2. Gravi de causa, Episcopus itemque presbyter, vi iuris aut peculiaris concessionis competentis auctoritatis facultate confirmandi donatus, possunt in singulis casibus presbyteros, ut et ipsi sacramentum administrent, sibi sociare.

Can. 885 – § 1. Episcopus dioecesanus obligatione tenetur curandi ut sacramentum confirmationis subditis rite et rationabiliter petentibus conferatur.

§ 2. Presbyter, qui hac facultate gaudet, eadem uti debet erga eos in quorum favorem facultas concessa est.

Can. 886 – § 1. Episcopus in sua dioecesi sacramentum confirmationis legitime administrat etiam fidelibus non subditis, nisi obstet expressa proprii ipsorum Ordinarii prohibitio.

§ 2. Ut in aliena dioecesi confirmationem licite administret, Episcopus indiget, nisi agatur de suis subditis, licentia saltem rationabiliter praesumpta Episcopi dioecesani.

Can. 887 – Presbyter facultate confirmationem ministrandi gaudens, in territorio sibi designato hoc sacramentum extraneis quoque licite confert, nisi obstet proprii eorum Ordinarii vetitum; illud vero in alieno territorio nemini valide confert, salvo praescripto can. 883, n. 3.

Can. 888 – Intra territorium in quo confirmationem conferre valent, ministri in locis quoque exemptis eam ministrare possunt.

Кан. 886 – § 1. Біскуп у сваёй дыяцэзіі легітымна ўдзяляе сакрамэнт канфірмацыі таксама непадуладным яму вернікам, калі гэтаму не перашкаджае выразная забарона іх уласнага ардынарыя.

§ 2. Для таго, каб біскуп мог дазволеным чынам удзяліць канфірмацыю ў іншай дыяцэзіі, калі гаворка не ідзе пра яго падуладных, яму патрабуецца прынамсі разумна меркаваны дазвол дыяцэзіяльнага біскупа.

Кан. 887 – Прэзбітэр, які мае паўнамоцтва ўдзяляць канфірмацыю, на вызначанай яму тэрыторыі ўдзяляе яе дазволеным чынам таксама пабочным асобам, калі гэтаму не перашкаджае выразная забарона іх уласнага ардынарыя; пры гэтым на чужой тэрыторыі ён не можа нікому дзейсна ўдзяліць гэты сакрамэнт, захоўваючы прадпісанне кан. 883, 3°.

Кан. 888 – Служыцелі могуць удзяляць канфірмацыю таксама ў месцах, выключаных з юрысдыкцыі, калі яны знаходзяцца ў межах тэрыторыі, на якой яны могуць яе ўдзяляць.

Caput III
De confirmandis

Can. 889 – § 1. Confirmationis recipiendae capax est omnis et solus baptizatus, nondum confirmatus.

§ 2. Extra periculum mortis, ut quis licite confirmationem recipiat, requiritur, si rationis usu polleat, ut sit apte institutus, rite dispositus et promissiones baptismales renovare valeat.

Раздзел III
Прымаючыя канфірмацыю

Кан. 889 – § 1. Здольным да прыняцця канфірмацыі з'яўляецца кожны і толькі той, хто быў ахрышчаны і яшчэ не прыняў канфірмацыю.

§ 2. Акрамя выпадку небяспекі смерці, для таго, каб хто-небудзь мог дазволеным чынам прыняць канфірмацыю, калі ён мае карыстанне розумам, патрабуецца, каб ён быў адпаведным чынам падрыхтаваны, належна настроены і мог аднавіць абяцанні хросту.

Кан. 890 – Вернікі маюць абавязак своечасова прыняць гэты сакрамэнт; бацькі і душпастыры, асабліва пробашчы, павінны клапаціцца аб тым, каб вернікі былі належным чынам падрыхтаваны да яго прыняцця і прыступалі да яго ў адпаведны час.

Кан. 891 – Сакрамэнт канфірмацыі павінен удзяляцца вернікам з набліжэннем узросту распазнавання, калі Канферэнцыя Біскупаў не акрэсліць іншы ўзрост, або калі не існуе небяспека смерці, або калі згодна з суджэннем служыцеля важкая прычына не схіляе да іншага.

Раздзел IV

Сведкі канфірмацыі

Кан. 892 – Калі магчыма, таго, хто прымае канфірмацыю, суправаджае сведка, які павінен клапаціцца аб тым, каб канфірмаваны быў сапраўдным сведкам Хрыста і верна выконваў абавязкі, якія вынікаюць з гэтага сакрамэнту.

Кан. 893 – § 1. Заданне сведкі можа выконваць той, хто адпавядае ўмовам, акрэсленым у кан. 874.

§ 2. Варта, каб сведкам канфірмацыі была асоба, якая была адным з хросных таго, хто прымае канфірмацыю.

Раздзел V

Пацвярджэнне і рэгістрацыя ўдзеленай канфірмацыі

Кан. 894 – Пры пацвярджэнні ўдзеленай канфірмацыі павінны захоўвацца прадпісанні кан. 876.

Кан. 895 – У кнізе канфірмаваных дыяцэзіяльнай Курыі або — калі так прадпісана Канферэнцыяй Біскупаў ці дыяцэзіяльным

Can. 890 – Fideles tenentur obligatione hoc sacramentum tempestive recipiendi; curent parentes, animarum pastores, praesertim parochi, ut fideles ad illud recipiendum rite instruantur et opportuno tempore accedant.

Can. 891 – Sacramentum confirmationis conferatur fidelibus circa aetatem discretionis, nisi Episcoporum conferentia aliam aetatem determinaverit, aut adsit periculum mortis vel, de iudicio ministri, gravis causa aliud suadeat.

Caput IV

De patrinis

Can. 892 – Confirmando, quantum id fieri potest, adsit patrinus, cuius est curare ut confirmatus tamquam verus Christi testis se gerat obligationesque eidem sacramento inhaerentes fideliter adimpleat.

Can. 893 – § 1. Ut quis patrini munere fungatur, condiciones adimpleat oportet, de quibus in can. 874.

§ 2. Expedit ut tamquam patrinus assumatur qui idem munus in baptismo suscepit.

Caput V

De collatae confirmationis probatione et adnotatione

Can. 894 – Ad collatam confirmationem probandam serventur praescripta can. 876.

Can. 895 – Nomina confirmatorum, facta mentione ministri, parentum et patrinorum, loci et diei collatae

confirmationis in librum confirmatorum Curiae dioecesanae adnotentur, vel, ubi id praescripserit Episcoporum conferentia aut Episcopus dioecesanus, in librum in archivo paroeciali conservandum; parochus debet de collata confirmatione monere parochum loci baptismi, ut adnotatio fiat in libro baptizatorum, ad normam can. 535, § 2.

Can. 896 – Si parochus loci praesens non fuerit, eundem de collata confirmatione minister per se vel per alium quam primum certiorem faciat.

біскупам — у кнізе, якая захоўваецца ў парафіяльным архіве, павінны быць запісаны імёны канфірмаваных, узгадваючы пра служыцеля, бацькоў і сведкаў, месца і дату ўдзялення канфірмацыі; пробашч павінен паведаміць пробашча месца хросту аб удзяленні канфірмацыі, каб той мог зрабіць запіс у кнізе ахрышчаных згодна з нормай кан. 535 § 2.

Кан. 896 – Калі мясцовы пробашч адсутнічаў, служыцель павінен асабіста або з дапамогай іншай асобы як мага хутчэй паведаміць яго аб удзяленні канфірмацыі.

TITULUS III
DE SANCTISSIMA EUCHARISTIA

Can. 897 – Augustissimum Sacramentum est sanctissima Eucharistia, in qua ipsemet Christus Dominus continetur, offertur ac sumitur, et qua continuo vivit et crescit Ecclesia. Sacrificium eucharisticum, memoriale mortis et resurrectionis Domini, in quo Sacrificium crucis in saecula perpetuatur, totius cultus et vitae christianae est culmen et fons, quo significatur et efficitur unitas populi Dei et corporis Christi aedificatio perficitur. Cetera enim sacramenta et omnia ecclesiastica apostolatus opera cum sanctissima Eucharistia cohaerent et ad eam ordinantur.

Can. 898 – Christifideles maximo in honore sanctissimam Eucharistiam habeant, actuosam in celebratione augustissimi Sacrificii partem habentes, devotissime et frequenter hoc sacramentum recipientes, atque summa cum adoratione idem colentes; animarum pastores doctrinam de hoc sacramento illustrantes, fideles hanc obligationem sedulo edoceant.

ТЫТУЛ III
НАЙСВЯЦЕЙШАЯ ЭЎХАРЫСТЫЯ

Кан. 897 – Найвялікшым сакрамэнтам з'яўляецца Найсвяцейшая Эўхарыстыя, у якой сам Хрыстус Пан прысутнічае, ахвяруецца і спажываецца і дзякуючы якой Касцёл пастаянна жыве і ўзрастае. Эўхарыстычная Ахвяра, успамін смерці і ўваскрасення Пана, у якой увекавечваецца ахвяра Крыжа, з'яўляецца кульмінацыяй і крыніцай усяго культу і хрысціянскага жыцця, у ёй выражаецца і ажыццяўляецца еднасць Божага народа і здзяйсняецца будаванне Хрыстовага цела. Усе ж іншыя сакрамэнты і ўсе касцёльныя апостальскія справы звязаны з Найсвяцейшай Эўхарыстыяй і скіраваны на яе.

Кан. 898 – Вернікі павінны адносіцца да Найсвяцейшай Эўхарыстыі з самай вялікай пашанай, беручы чынны ўдзел у цэлебрацыі найвялікшай Ахвяры, як мага больш пабожна і часта прымаючы гэты сакрамэнт і здзяйсняючы яго адарацыю з найглыбейшым ушанаваннем; душпастыры, высвятляючы вучэнне аб гэтым сакрамэнце, павінны старанна вучыць вернікаў выконваць гэты абавязак.

Раздзел I

Эўхарыстычная цэлебрацыя

Кан. 899 – § 1. Эўхарыстычная цэлебрацыя — гэта дзеянне самога Хрыста і Касцёла, у якім Хрыстус Пан праз паслугу святара складае самога Сябе, субстанцыяльна прысутнага пад постацямі хлеба і віна, у ахвяру Богу Айцу, а вернікам, злучаным з Ім у Яго ахвяры, дае Сябе ў якасці духоўнага спажытку.

§ 2. Падчас эўхарыстычнага сходу Божы народ збіраецца ў адно пад кіраваннем біскупа або падуладнага яму прэзбітэра, якія дзейнічаюць у асобе Хрыста, і ўсе прысутныя вернікі, як духоўныя, так і свецкія, саўдзельнічаюць кожны па-свойму — адпаведна да пасвячэння і літургічнага задання.

§ 3. Эўхарыстычная цэлебрацыя павінна быць арганізавана такім чынам, каб усе ўдзельнікі маглі атрымаць ад гэтага найбольшы плён, дзеля набыцця якога Хрыстус устанавіў эўхарыстычную Ахвяру.

Caput I

De eucharistica celebratione

Can. 899 – § 1. Eucharistica celebratio actio est ipsius Christi et Ecclesiae, in qua Christus Dominus, ministerio sacerdotis, semetipsum, sub speciebus panis et vini substantialiter praesentem, Deo Patri offert atque fidelibus in sua oblatione sociatis se praebet ut cibum spiritualem.

§ 2. In eucharistica Synaxi populus Dei in unum convocatur, Episcopo aut, sub eius auctoritate, presbytero praeside, personam Christi gerente, atque omnes qui intersunt fideles, sive clerici sive laici, suo quisque modo pro ordinum et liturgicorum munerum diversitate, participando concurrunt.

§ 3. Celebratio eucharistica ita ordinetur, ut omnes participantes exinde plurimos capiant fructus, ad quos obtinendos Christus Dominus Sacrificium eucharisticum instituit.

Артыкул 1. *Служыцель Найсвяцейшай Эўхарыстыі*

Кан. 900 – § 1. Служыцелем, які можа ў асобе Хрыста здзяйсняць сакрамэнт Эўхарыстыі, з'яўляецца толькі дзейсна пасвячаны святар.

§ 2. Дазволеным чынам цэлебруе Эўхарыстыю святар, які не мае перашкоды, заснаванай на кананічным законе, захоўваючы прадпісанні наступных канонаў.

Кан. 901 – Святар мае поўнае права прысвячаць Імшу за любых асобаў, як за жывых, так і за памерлых.

Кан. 902 – Калі карысць вернікаў не патрабуе або не схіляе да іншага, святары могуць

Art. 1. *De sanctissimae Eucharistiae ministro*

Can. 900 – § 1. Minister, qui in persona Christi sacramentum Eucharistiae conficere valet, est solus sacerdos valide ordinatus.

§ 2. Licite Eucharistiam celebrat sacerdos lege canonica non impeditus, servatis praescriptis canonum qui sequuntur.

Can. 901 – Integrum est sacerdoti Missam applicare pro quibusvis, tum vivis tum defunctis.

Can. 902 – Nisi utilitas christifidelium aliud requirat aut suadeat, sa-

cerdotes Eucharistiam concelebrare possunt, integra tamen pro singulis libertate manente Eucharistiam individuali modo celebrandi, non vero eo tempore, quo in eadem ecclesia aut oratorio concelebratio habetur.

канцэлебраваць Эўхарыстыю, пры гэтым у кожнага застаецца поўная свабода цэлебраваць Эўхарыстыю асобна, аднак не ў той самы час, калі ў тым жа касцёле або араторыі адбываецца канцэлебрацыя.

Can. 903 – Sacerdos ad celebrandum admittatur etiamsi rectori ecclesiae sit ignotus, dummodo aut litteras commendatitias sui Ordinarii vel sui Superioris, saltem intra annum datas, exhibeat, aut prudenter existimari possit eundem a celebratione non esse impeditum.

Кан. 903 – Святар, нават незнаёмы рэктару касцёла, павінен быць дапушчаны да цэлебрацыі, калі толькі прадставіць рэкамендацыйны ліст свайго ардынарыя або свайго настаяцеля, выдадзены не больш чым год таму, або калі можна будзе разважліва палічыць, што ён не мае перашкоды да цэлебрацыі.

Can. 904 – Sacerdotes, memoria semper tenentes in mysterio Sacrificii eucharistici opus redemptionis continuo exerceri, frequenter celebrent; immo enixe commendatur celebratio cotidiana, quae quidem, etiam si praesentia fidelium haberi non possit, actus est Christi et Ecclesiae, in quo peragendo munus suum praecipuum sacerdotes adimplent.

Кан. 904 – Святары, заўсёды памятаючы аб тым, што ў таямніцы эўхарыстычнай Ахвяры пастаянна ажыццяўляецца справа адкуплення, павінны часта яе цэлебраваць; больш за тое, ім вельмі рэкамендуецца штодзённая цэлебрацыя, якая нават у тым выпадку, калі немагчыма забяспечыць прысутнасць вернікаў, з'яўляецца дзеяннем Хрыста і Касцёла, здзяйсняючы якое святары выконваюць сваё галоўнае заданне.

Can. 905 – § 1. Exceptis casibus in quibus ad normam iuris licitum est pluries eadem die Eucharistiam celebrare aut concelebrare, non licet sacerdoti plus semel in die celebrare.

Кан. 905 – § 1. За выключэннем выпадкаў, у якіх згодна з нормамі права дазволена цэлебраваць або канцэлебраваць Эўхарыстыю некалькі разоў на дзень, святару не дазваляецца цэлебраваць яе больш чым адзін раз на дзень.

§ 2. Si sacerdotum penuria habeatur, concedere potest loci Ordinarius ut sacerdotes, iusta de causa, bis in die, immo, necessitate pastorali id postulante, etiam ter in diebus dominicis et festis de praecepto, celebrent.

§ 2. Калі не хапае святароў, ардынарый месца можа дазволіць, каб святар па справядлівай прычыне цэлебраваў Эўхарыстыю два разы на дзень, а калі існуе пастырская неабходнасць, у нядзелю і абавязковыя святы — нават тры разы.

Can. 906 – Nisi iusta et rationabili de causa, sacerdos Sacrificium eucharisticum ne celebret sine participatione alicuius saltem fidelis.

Кан. 906 – Без справядлівай і разумнай прычыны святар не павінен цэлебраваць эўхарыстычную Ахвяру без удзелу прынамсі аднаго верніка.

Кан. 907 – У эўхарыстычнай цэлебрацыі дыяканам і свецкім асобам не дазваляецца прамаўляць малітвы, асабліва эўхарыстычную малітву, або здзяйсняць дзеянні, уласцівыя святару, які здзяйсняе цэлебрацыю.

Кан. 908 – Каталіцкім святарам забаронена канцэлебраваць Эўхарыстыю са святарамі або служыцелямі касцёлаў ці касцёльных супольнасцяў, якія не маюць поўнага адзінства з Каталіцкім Касцёлам.

Кан. 909 – Святар не павінен занядбоўваць тое, каб належным чынам праз малітву рыхтавацца да цэлебрацыі эўхарыстычнай Ахвяры, а пасля яе здзяйснення аддаваць Богу падзяку.

Кан. 910 – § 1. Звычайным служыцелем святой Камуніі з'яўляецца біскуп, прэзбітэр і дыякан.

§ 2. Надзвычайным служыцелем святой Камуніі з'яўляецца акаліт, а таксама іншы вернік, вызначаны згодна з нормай кан. 230 § 3.

Кан. 911 – § 1. Абавязак і права заносіць Найсвяцейшую Эўхарыстыю хворым у якасці Віятыка маюць пробашч і парафіяльныя вікарыі, капеланы, а таксама настаяцель супольнасці ў святарскіх манаскіх інстытутах або таварыствах апостальскага жыцця ў адносінах да ўсіх, хто знаходзіцца ў іх доме.

§ 2. У выпадку неабходнасці або з дазволу, прынамсі меркаванага, пробашча, капелана ці настаяцеля, якіх пасля трэба аб гэтым паведаміць, гэта павінен зрабіць кожны святар ці іншы служыцель святой Камуніі.

Can. 907 – In celebratione eucharistica diaconis et laicis non licet orationes, speciatim precem eucharisticam, proferre vel actionibus fungi, quae sacerdotis celebrantis sunt propriae.

Can. 908 – Sacerdotibus catholicis vetitum est una cum sacerdotibus vel ministris Ecclesiarum communitatumve ecclesialium plenam communionem cum Ecclesia catholica non habentium, Eucharistiam concelebrare.

Can. 909 – Sacerdos ne omittat ad eucharistici Sacrificii celebrationem oratione debite se praeparare, eoque expleto Deo gratias agere.

Can. 910 – § 1. Minister ordinarius sacrae communionis est Episcopus, presbyter et diaconus.

§ 2. Extraordinarius sacrae communionis minister est acolythus necnon alius christifidelis ad normam can. 230, § 3 deputatus.

Can. 911 – § 1. Officium et ius sanctissimam Eucharistiam per modum Viatici ad infirmos deferendi habent parochus et vicarii paroeciales, cappellani, necnon Superior communitatis in clericalibus institutis religiosis aut societatibus vitae apostolicae quoad omnes in domo versantes.

§ 2. In casu necessitatis aut de licentia saltem praesumpta parochi, cappellani vel Superioris, cui postea notitiam dari oportet, hoc facere debet quilibet sacerdos vel alius sacrae communionis minister.

Art. 2. *De sanctissima Eucharistia participanda*

Can. 912 – Quilibet baptizatus, qui iure non prohibeatur, admitti potest et debet ad sacram communionem.

Can. 913 – § 1. Ut sanctissima Eucharistia ministrari possit pueris, requiritur ut ipsi sufficienti cognitione et accurata praeparatione gaudeant, ita ut mysterium Christi pro suo captu percipiant et Corpus Domini cum fide et devotione sumere valeant.

§ 2. Pueris tamen in periculo mortis versantibus sanctissima Eucharistia ministrari potest, si Corpus Christi a communi cibo discernere et communionem reverenter suscipere possint.

Can. 914 – Parentum imprimis atque eorum qui parentum locum tenent necnon parochi officium est curandi ut pueri usum rationis assecuti debite praeparentur et quam primum, praemissa sacramentali confessione, hoc divino cibo reficiantur; parochi etiam est advigilare ne ad sacram Synaxim accedant pueri, qui rationis usum non sint adepti aut quos non sufficienter dispositos iudicaverit.

Can. 915 – Ad sacram communionem ne admittantur excommunicati et interdicti post irrogationem vel declarationem poenae aliique in manifesto gravi peccato obstinate perseverantes.

Can. 916 – Qui conscius est peccati gravis, sine praemissa sacramentali confessione Missam ne celebret neve Corpori Domini communicet, nisi

Артыкул 2. *Удзел у Найсвяцейшай Эўхарыстыі*

Кан. 912 – Кожны ахрышчаны, якому гэта не забараняцца правам, можа і павінен быць дапушчаны да святой Камуніі.

Кан. 913 – § 1. Для таго, каб Найсвяцейшую Эўхарыстыю можна было ўдзяліць дзецям, патрабуецца, каб яны ў дастатковай ступені мелі здольнасць да пазнання і атрымалі дакладную падрыхтоўку такім чынам, каб адпаведна сваім здольнасцям разумелі таямніцу Хрыста і маглі з верай і пабожнасцю прыняць Цела Пана.

§ 2. Аднак тым дзецям, якія знаходзяцца ў небяспецы смерці, Найсвяцейшая Эўхарыстыя можа быць удзелена, калі яны могуць адрозніць Цела Хрыста ад звычайнай ежы і прыняць яго з пашанай.

Кан. 914 – Перадусім бацькі і тыя, хто іх замяшчаюць, а таксама пробашч маюць абавязак паклапаціцца аб тым, каб дзеці, якія дасягнулі карыстання розумам, былі належна падрыхтаваны і маглі як мага хутчэй падсілкавацца гэтым Божым спажыткам, прыступіўшы перад гэтым да сакрамэнтальнай споведзі; апрача гэтага, пробашч павінен сачыць за тым, каб да святога стала не былі дапушчаны дзеці, якія не дасягнулі карыстання розумам, або тыя, каго палічыць недастаткова настроенымі.

Кан. 915 – Да святой Камуніі не павінны быць дапушчаны тыя, хто звязаны экскамунікай і інтэрдыктам пасля налажэння або сцвярджэння пакарання, а таксама іншыя асобы, якія ўпарта трываюць у цяжкім граху.

Кан. 916 – Той, хто мае свядомасць наяўнасці цяжкага граху, не павінен без папярэдняй сакрамэнтальнай споведзі ні цэлебраваць Імшу, ні прымаць Цела Пана, калі не

па важкай прычыне і не ў выпадку адсутнасці магчымасці паспавядацца; у такім выпадку трэба памятаць аб абавязку ўзбудзіць дасканалы жаль за грахі, які змяшчае ў сабе пастанаўленне паспавядацца як мага хутчэй.

Кан. 917 – Той, хто ўжо прыняў Найсвяцейшую Эўхарыстыю, можа яшчэ раз прыняць яе ў гэты дзень, але толькі падчас эўхарыстычнай цэлебрацыі, у якой удзельнічае, захоўваючы прадпісанне кан. 921 § 2.

Кан. 918 – Вельмі рэкамендуецца, каб вернікі прымалі святую Камунію падчас самой эўхарыстычнай цэлебрацыі, аднак тым, хто па справядлівай прычыне просіць аб гэтым па-за Імшою, яна павінна быць удзелена, захоўваючы літургічныя абрады.

Кан. 919 – § 1. Той, хто мае намер прыняць Найсвяцейшую Эўхарыстыю, павінен прынамсі на працягу гадзіны перад святой Камуніяй устрымлівацца ад усялякай ежы і пітва, за выключэннем толькі вады і лекаў.

§ 2. Святар, які ў той жа дзень цэлебруе Найсвяцейшую Эўхарыстыю два або тры разы, можа што-небудзь з'есці перад другой і трэцяй цэлебрацыяй, нават калі б паміж імі не было гадзіннага перапынку.

§ 3. Састарэлыя і хворыя асобы, а таксама тыя, хто імі апякуецца, могуць прымаць Найсвяцейшую Эўхарыстыю нават тады, калі яны спажывалі якую-небудзь ежу на працягу папярэдняй гадзіны.

Кан. 920 – § 1. Кожны вернік пасля таго, як пачаў прымаць Найсвяцейшую Эўхарыстыю, павінен прымаць святую Камунію прынамсі раз на год.

§ 2. Гэтае прадпісанне павінна быць выканана ў Велікодны перыяд, калі па справядлівай прычыне не будзе выканана ў іншы час на працягу года.

adsit gravis ratio et deficiat opportunitas confitendi; quo in casu meminerit se obligatione teneri ad eliciendum actum perfectae contritionis, qui includit propositum quam primum confitendi.

Can. 917 – Qui sanctissimam Eucharistiam iam recepit, potest eam iterum eadem die suscipere solummodo intra eucharisticam celebrationem cui participat, salvo praescripto can. 921, § 2.

Can. 918 – Maxime commendatur ut fideles in ipsa eucharistica celebratione sacram communionem recipiant; ipsis tamen iusta de causa petentibus extra Missam ministretur, servatis liturgicis ritibus.

Can. 919 – § 1. Sanctissimam Eucharistiam recepturus per spatium saltem unius horae ante sacram communionem abstineat a quocumque cibo et potu, excepta tantummodo aqua atque medicina.

§ 2. Sacerdos, qui eadem die bis aut ter sanctissimam Eucharistiam celebrat, aliquid sumere potest ante secundam aut tertiam celebrationem, etiamsi non intercesserit spatium unius horae.

§ 3. Aetate provecti et infirmitate quadam laborantes necnon eorum curae addicti, sanctissimam Eucharistiam accipere possunt, etiamsi intra horam antecedentem aliquid sumpserint.

Can. 920 – § 1. Omnis fidelis, postquam ad sanctissimam Eucharistiam initiatus sit, obligatione tenetur semel saltem in anno, sacram communionem recipiendi.

§ 2. Hoc praeceptum impleri debet tempore paschali, nisi iusta de causa alio tempore intra annum adimpleatur.

Can. 921 – § 1. Christifideles qui versantur in periculo mortis, quavis ex causa procedenti, sacra communione per modum Viatici reficiantur.

§ 2. Etiamsi eadem die sacra communione refecti fuerint, valde tamen suadetur ut qui in vitae discrimen adducti sint, denuo communicent.

§ 3. Perdurante mortis periculo, commendatur ut sacra communio pluries, distinctis diebus, administretur.

Can. 922 – Sanctum Viaticum infirmis ne nimium differatur; qui animarum curam gerunt sedulo advigilent, ut eodem infirmi plene sui compotes reficiantur.

Can. 923 – Christifideles Sacrificium eucharisticum participare et sacram communionem suscipere possunt quolibet ritu catholico, firmo praescripto can. 844.

Кан. 921 – § 1. Вернікі, якія па якой-небудзь прычыне знаходзяцца ў небяспецы смерці, павінны быць узмоцнены святой Камуніяй у выглядзе Віятыку.

§ 2. Нават калі ў гэты дзень яны ўжо ўмацоўваліся святой Камуніяй, аднак вельмі заахвочваецца, каб тыя, чыё жыццё апынулася ў небяспецы, прынялі яе яшчэ раз.

§ 3. Пакуль небяспека смерці застаецца, рэкамендуецца, каб святая Камунія ўдзялялася шмат разоў у розныя дні.

Кан. 922 – Святы Віятык для хворых не павінен адкладвацца на доўгі час; душпастыры павінны старанна сачыць за тым, каб хворыя ўмацоўваліся ім, яшчэ знаходзячыся ў поўнай свядомасці.

Кан. 923 – Вернікі могуць удзельнічаць у эўхарыстычнай Ахвяры і прымаць святую Камунію ў любым каталіцкім абрадзе, захоўваючы прадпісанне кан. 844.

Art. 3. *De ritibus et caeremoniis eucharisticae celebrationis*

Can. 924 – § 1. Sacrosanctum eucharisticum Sacrificium offerri debet ex pane et vino, cui modica aqua miscenda est.

§ 2. Panis debet esse mere triticeus et recenter confectus, ita ut nullum sit periculum corruptionis.

§ 3. Vinum debet esse naturale de genimine vitis et non corruptum.

Can. 925 – Sacra communio conferatur sub sola specie panis aut, ad normam legum liturgicarum, sub utraque specie; in casu autem necessitatis, etiam sub sola specie vini.

Артыкул 3. *Абрады і цырымоніі Эўхарыстычнай цэлебрацыі*

Кан. 924 – § 1. Найсвяцейшая эўхарыстычная Ахвяра павінна здзяйсняцца на хлебе і віне, да якога павінна быць дададзена крыху вады.

§ 2. Хлеб павінен быць чыста пшанічным і нядаўна спечаным, каб усялякая небяспека яго сапсаванасці была выключана.

§ 3. Віно павінна быць натуральным, вінаградным і несапсаваным.

Кан. 925 – Святая Камунія павінна ўдзяляцца толькі пад постаццю хлеба або, згодна з нормамі літургічных законаў, пад дзвюма постацямі; а ў выпадку неабходнасці — таксама і толькі пад постаццю віна.

Кан. 926 – Паводле старажытнай традыцыі Лацінскага Касцёла, у эўхарыстычнай цэлебрацыі святар, дзе б ён ні знаходзіўся, павінен ужываць прэсны хлеб.

Кан. 927 – Нават у выпадку крайняй неабходнасці нельга кансэкраваць адну постаць без другой або абедзве постаці па-за эўхарыстычнай цэлебрацыяй.

Кан. 928 – Эўхарыстычная цэлебрацыя павінна здзяйсняцца на лацінскай мове або на іншай мове, калі толькі літургічныя тэксты былі легітымна зацверджаны.

Кан. 929 – Святары і дыяканы, якія цэлебруюць або служаць падчас Эўхарыстыі, павінны насіць святое адзенне, прадпісанае ў рубрыках.

Кан. 930 – § 1. Хворы або састарэлы святар, калі не можа стаяць, можа цэлебраваць эўхарыстычную Ахвяру седзячы, але не ў прысутнасці народу, калі гэта не дазволіць ардынарый месца, пры гэтым захоўваюцца літургічныя законы.

§ 2. Святар сляпы або абмежаваны праз іншую хваробу дазволеным чынам цэлебруе эўхарыстычную Ахвяру, карыстаючыся любым з тэкстаў Імшы з ліку зацверджаных; калі гэта будзе неабходна — у прысутнасці іншага святара ці дыякана або нават належна падрыхтаванага свецкага верніка, якія павінны яму дапамагаць.

Can. 926 – In eucharistica celebratione secundum antiquam Ecclesiae latinae traditionem sacerdos adhibeat panem azymum ubicumque litat.

Can. 927 – Nefas est, urgente etiam extrema necessitate, alteram materiam sine altera, aut etiam utramque extra eucharisticam celebrationem, consecrare.

Can. 928 – Eucharistica celebratio peragatur lingua latina aut alia lingua, dummodo textus liturgici legitime approbati fuerint.

Can. 929 – Sacerdotes et diaconi in Eucharistia celebranda et ministranda sacra ornamenta rubricis praescripta deferant.

Can. 930 – § 1. Sacerdos infirmus aut aetate provectus, si stare nequeat, Sacrificium eucharisticum celebrare potest sedens, servatis quidem legibus liturgicis, non tamen coram populo, nisi de licentia loci Ordinarii.

§ 2. Sacerdos caecus aliave infirmitate laborans licite eucharisticum Sacrificium celebrat, adhibendo textum quemlibet Missae ex probatis, adstante, si casus ferat, alio sacerdote vel diacono, aut etiam laico rite instructo, qui eundem adiuvet.

Артыкул 4. *Час і месца цэлебрацыі Эўхарыстыі*

Кан. 931 – Цэлебрацыя і ўдзяленне Эўхарыстыі можа адбывацца ў любы дзень і а любой гадзіне, акрамя тых, якія выключаны паводле літургічных нормаў.

Кан. 932 – § 1. Эўхарыстычная цэлебрацыя павінна адбывацца ў святым месцы, калі

Art. 4. *De tempore et loco celebrationis Eucharistiae*

Can. 931 – Eucharistiae celebratio et distributio fieri potest qualibet die et hora, iis exceptis, quae secundum liturgicas normas excluduntur.

Can. 932 – § 1. Celebratio eucharistica peragatur in loco sacro, nisi in casu

particulari necessitas aliud postulet; quo in casu, in loco honesto celebratio fieri debet.

§ 2. Sacrificium eucharisticum peragendum est super altare dedicatum vel benedictum; extra locum sacrum adhiberi potest mensa conveniens, retentis semper tobalea et corporali.

Can. 933 – Iusta de causa et de licentia expressa Ordinarii loci licet sacerdoti Eucharistiam celebrare in templo alicuius Ecclesiae aut communitatis ecclesialis plenam communionem cum Ecclesia catholica non habentium, remoto scandalo.

ў асобным выпадку неабходнасць не патрабуе іншага; у такім выпадку цэлебрацыя павінна адбывацца ў годным месцы.

§ 2. Эўхарыстычная Ахвяра павінна здзяйсняцца на пасвячаным або благаслаўленым алтары; па-за святым месцам можа выкарыстоўвацца адпаведны стол, але заўсёды з абрусам і карпаралам.

Кан. 933 – Па справядлівай прычыне і з выразнага дазволу ардынарыя месца святару дазваляецца цэлебраваць Эўхарыстыю ў святыні якога-небудзь Касцёла або касцёльнай супольнасці, якія не маюць поўнага адзінства з Каталіцкім Касцёлам, пазбягаючы спакусы.

Caput II
De sanctissima Eucharistia asservanda et veneranda

Раздзел II
Захоўванне і культ Найсвяцейшай Эўхарыстыі

Can. 934 – § 1. Sanctissima Eucharistia:

1° asservari debet in ecclesia cathedrali aut eidem aequiparata, in qualibet ecclesia paroeciali necnon in ecclesia vel oratorio domui instituti religiosi aut societatis vitae apostolicae adnexo;

2° asservari potest in sacello Episcopi et, de licentia Ordinarii loci, in aliis ecclesiis, oratoriis et sacellis.

§ 2. In locis sacris ubi sanctissima Eucharistia asservatur, adesse semper debet qui eius curam habeat et, quantum fieri potest, sacerdos saltem bis in mense Missam ibi celebret.

Can. 935 – Nemini licet sanctissimam Eucharistiam apud se retinere aut secum in itinere deferre, nisi ne-

Кан. 934 – § 1. Найсвяцейшая Эўхарыстыя:

1° павінна захоўвацца ў катэдральным або прыраўнаваным да яго касцёле, у кожным парафіяльным касцёле, а таксама ў касцёле ці ў араторыі, злучаным з домам манаскага інстытута або таварыства апостальскага жыцця;

2° можа захоўвацца ў капліцы біскупа, а таксама, з дазволу ардынарыя месца, у іншых касцёлах, араторыях і капліцах.

§ 2. У святых месцах, у якіх захоўваецца Найсвяцейшая Эўхарыстыя, заўсёды павінен быць той, хто аб ёй клапоціцца, а святар павінен цэлебраваць там Імшу, калі магчыма, прынамсі два разы на месяц.

Кан. 935 – Нікому не дазваляецца захоўваць Найсвяцейшую Эўхарыстыю пры сабе або браць яе з сабой у дарогу, калі не пры-

мушае пастырская неабходнасць і захоўваючы прадпісанні дыяцэзіяльнага біскупа.

Кан. 936 – У доме манаскага інстытута або ў іншай пабожнай установе Найсвяцейшая Эўхарыстыя павінна захоўвацца толькі ў касцёле або ў галоўным араторыі, злучаным з домам; аднак ардынарый можа па справядлівай прычыне дазволіць, каб яна захоўвалася таксама ў іншым араторыі таго ж дома.

Кан. 937 – Калі не перашкаджае важкая прычына, касцёл, у якім захоўваецца Найсвяцейшая Эўхарыстыя, павінен быць штодзённа прынамсі на некалькі гадзін адчынены для вернікаў, каб яны маглі маліцца перад Найсвяцейшым Сакрамэнтам.

Кан. 938 – § 1. Найсвяцейшая Эўхарыстыя павінна захоўвацца пастаянна толькі ў адным табэрнакулюме касцёла або араторыя.

§ 2. Табэрнакулюм, у якім захоўваецца Найсвяцейшая Эўхарыстыя, павінен быць размешчаны ў той частцы касцёла або араторыя, якая з'яўляецца годнай, бачнай, аздобленай і прыдатнай да малітвы.

§ 3. Табэрнакулюм, у якім Найсвяцейшая Эўхарыстыя захоўваецца пастаянна, павінен быць нерухомы, зроблены з трывалага непразрыстага матэрыялу і зачынены так, каб як мага больш надзейна выключыць небяспеку прафанацыі.

§ 4. Па важкай прычыне, асабліва ў начны час, дазваляецца захоўваць Найсвяцейшую Эўхарыстыю ў іншым, больш бяспечным, аздобленым месцы.

§ 5. Той, хто мае абавязак клапаціцца аб касцёле або араторыі, павінен сачыць за тым, каб ключ ад табэрнакулюма, у якім знаходзіцца Найсвяцейшая Эўхарыстыя, вельмі старанна засцерагаўся.

cessitate pastorali urgente et servatis Episcopi dioecesani praescriptis.

Can. 936 – In domo instituti religiosi aliave pia domo, sanctissima Eucharistia asservetur tantummodo in ecclesia aut in oratorio principali domui adnexo; potest tamen iusta de causa Ordinarius permittere, ut etiam in alio oratorio eiusdem domus asservetur.

Can. 937 – Nisi gravis obstet ratio, ecclesia in qua sanctissima Eucharistia asservatur, per aliquot saltem horas cotidie fidelibus pateat, ut coram sanctissimo Sacramento orationi vacare possint.

Can. 938 – § 1. Sanctissima Eucharistia habitualiter in uno tantum ecclesiae vel oratorii tabernaculo asservetur.

§ 2. Tabernaculum, in quo sanctissima Eucharistia asservatur, situm sit in aliqua ecclesiae vel oratorii parte insigni, conspicua, decore ornata, ad orationem apta.

§ 3. Tabernaculum, in quo habitualiter sanctissima Eucharistia asservatur, sit inamovibile, materia solida non transparenti confectum, et ita clausum ut quam maxime periculum profanationis vitetur.

§ 4. Gravi de causa, licet sanctissimam Eucharistiam, nocturno praesertim tempore, alio in loco tutiore et decoro asservare.

§ 5. Qui ecclesiae vel oratorii curam habet, prospiciat ut clavis tabernaculi, in quo sanctissima Eucharistia asservatur, diligentissime custodiatur.

Can. 939 – Hostiae consecratae quantitate fidelium necessitatibus sufficienti in pyxide seu vasculo serventur, et frequenter, veteribus rite consumptis, renoventur.

Кан. 939 – Кансэкраваныя гостыі павінны захоўвацца ў цыборыі, іншымі словамі — начынні, у колькасці, дастатковай для патрэб вернікаў, і часта абнаўляць іх пасля таго, як раней кансэкраваныя былі належным чынам спажыты.

Can. 940 – Coram tabernaculo, in quo sanctissima Eucharistia asservatur, peculiaris perenniter luceat lampas, qua indicetur et honoretur Christi praesentia.

Кан. 940 – Перад табэрнакулюмам, у якім захоўваецца Найсвяцейшая Эўхарыстыя, павінна заўсёды гарэць асаблівая лямпа, якая абазначае прысутнасць Хрыста і ўшаноўвае яе.

Can. 941 – § 1. In ecclesiis aut oratoriis quibus datum est asservare sanctissimam Eucharistiam, fieri possunt expositiones sive cum pyxide sive cum ostensorio, servatis normis in libris liturgicis praescriptis.

§ 2. Celebratione Missae durante, ne habeatur in eadem ecclesiae vel oratorii aula sanctissimi Sacramenti expositio.

Кан. 941 – § 1. У касцёлах або араторыях, у якіх дазволена захоўваць Найсвяцейшую Эўхарыстыю, можа адбывацца яе выстаўленне ў цыборыі або манстранцыі, захоўваючы нормы, прадпісаныя ў літургічных кнігах.

§ 2. Выстаўленне Найсвяцейшага Сакрамэнту не павінна адбывацца ў той жа частцы касцёла або араторыя, у якой у гэты час здзяйсняецца цэлебрацыя Імшы.

Can. 942 – Commendatur ut in iisdem ecclesiis et oratoriis quotannis fiat sollemnis sanctissimi Sacramenti expositio per congruum tempus, etsi non continuum, protracta, ut communitas localis eucharisticum mysterium impensius meditetur et adoret; huiusmodi tamen expositio fiat tantum si congruus praevideatur fidelium concursus et servatis normis statutis.

Кан. 942 – Рэкамендуецца, каб у гэтых касцёлах і араторыях штогод адбывалася ўрачыстае выстаўленне Найсвяцейшага Сакрамэнту на працягу адпаведнага часу, нават з перапынкамі, каб мясцовая супольнасць глыбей разважала і адаравала эўхарыстычную таямніцу; аднак такое выстаўленне павінна адбывацца толькі тады, калі можна спадзявацца ўдзелу адпаведнай колькасці вернікаў і захоўваючы ўстаноўленыя нормы.

Can. 943 – Minister expositionis sanctissimi Sacramenti et benedictionis eucharisticae est sacerdos vel diaconus; in peculiaribus adiunctis, solius expositionis et repositionis, sine tamen benedictione, est acolythus, minister extraordinarius sacrae communionis aliusve ab Ordinario loci deputatus, servatis Episcopi dioecesani praescriptis.

Кан. 943 – Служыцелем выстаўлення Найсвяцейшага Сакрамэнту і эўхарыстычнага благаслаўлення з'яўляецца святар або дыякан; у асаблівых абставінах акаліт, надзвычайны служыцель святой Камуніі ці іншая асоба, вызначаная ардынарыем месца, могуць здзейсніць толькі выстаўленне і заканчэнне выстаўлення, але без благаслаўлення, захоўваючы прадпісанні дыяцэзіяльнага біскупа.

Кан. 944 – § 1. Там, дзе згодна з суджэннем дыяцэзіяльнага біскупа гэта будзе магчыма, трэба для публічнага сведчання аб пашане да Найсвяцейшай Эўхарыстыі арганізаваць працэсію, перадусім ва ўрачыстасць Цела і Крыві Хрыста, якая павінна праходзіць па публічных дарогах.

§ 2. Дыяцэзіяльны біскуп можа выдаваць прадпісанні, якія павінны ўпарадкаваць годны ўдзел у такіх працэсіях.

Can. 944 – § 1. Ubi de iudicio Episcopi dioecesani fieri potest, in publicum erga sanctissimam Eucharistiam venerationis testimonium, habeatur, praesertim in sollemnitate Corporis et Sanguinis Christi, processio per vias publicas ducta.

§ 2. Episcopi dioecesani est de processionibus statuere ordinationes, quibus earum participationi et dignitati prospiciatur.

Раздзел III
Ахвяраванні, звязаныя з цэлебрацыяй Імшы

Caput III
De oblata ad Missae celebrationem stipe

Кан. 945 – § 1. Паводле выпрабаванага звычаю Касцёла, кожнаму святару, які цэлебруе або канцэлебруе Імшу, дазваляецца прымаць ахвяраванні, каб ён прысвяціў Імшу адпаведна з акрэсленай інтэнцыяй.

§ 2. Святарам вельмі рэкамендуецца, каб, нават не атрымаўшы ахвяравання, цэлебравалі святыя Імшы згодна з інтэнцыямі вернікаў, асабліва патрабуючых.

Can. 945 – § 1. Secundum probatum Ecclesiae morem, sacerdoti cuilibet Missam celebranti aut concelebranti licet stipem oblatam recipere, ut iuxta certam intentionem Missam applicet.

§ 2. Enixe commendatur sacerdotibus ut, etiam nulla recepta stipe, Missam ad intentionem christifidelium praecipue egentium celebrent.

Кан. 946 – Вернікі, якія складаюць ахвяраванні, каб Імша была прысвечана згодна з іх інтэнцыяй, садзейнічаюць дабру Касцёла і праз гэтае ахвяраванне ўдзельнічаюць у яго клопаце аб утрыманні святароў і спраў.

Can. 946 – Christifideles stipem offerentes, ut ad suam intentionem Missa applicetur, ad bonum conferunt Ecclesiae atque eius curam in ministris operibusque sustinendis ea oblatione participant.

Кан. 947 – Пры ахвяраваннях на Імшу трэба безумоўна пазбягаць нават выгляду здзелкі або гандлю.

Can. 947 – A stipe Missarum quaelibet etiam species negotiationis vel mercaturae omnino arceatur.

Кан. 948 – Павінны быць прысвечаны асобныя Імшы згодна з інтэнцыяй кожнага, хто склаў асобнае, нават сціплае ахвяраванне, і яно было прынята.

Can. 948 – Distinctae applicandae sunt Missae ad eorum intentiones pro quibus singulis stips, licet exigua, oblata et acceptata est.

Кан. 949 – Той, хто мае абавязак цэлебраваць і прысвяціць Імшу згодна з інтэнцыяй тых, хто склаў ахвяраванне, застаецца звя-

Can. 949 – Qui obligatione gravatur Missam celebrandi et applicandi ad intentionem eorum qui stipem

obtulerunt, eadem obligatione tenetur, etiamsi sine ipsius culpa stipes perceptae perierint.

Can. 950 – Si pecuniae summa offertur pro Missarum applicatione, non indicato Missarum celebrandarum numero, hic supputetur attenta stipe statuta in loco in quo oblator commoratur, nisi aliam fuisse eius intentionem legitime praesumi debeat.

Can. 951 – § 1. Sacerdos plures eadem die Missas celebrans, singulas applicare potest ad intentionem pro qua stips oblata est, ea tamen lege ut, praeterquam in die Nativitatis Domini, stipem pro una tantum Missa faciat suam, ceteras vero in fines ab Ordinario praescriptos concredat, admissa quidem aliqua retributione ex titulo extrinseco.

§ 2. Sacerdos alteram Missam eadem die concelebrans, nullo titulo pro ea stipem recipere potest.

Can. 952 – § 1. Concilii provincialis aut conventus Episcoporum provinciae est pro universa provincia per decretum definire quaenam pro celebratione et applicatione Missae sit offerenda stips, nec licet sacerdoti summam maiorem expetere; ipsi tamen fas est stipem sponte oblatam definita maiorem pro Missae applicatione accipere, et etiam minorem.

§ 2. Ubi desit tale decretum, servetur consuetudo in dioecesi vigens.

§ 3. Sodales quoque institutorum religiosorum quorumlibet stare debent eidem decreto aut consuetudini loci, de quibus in §§ 1 et 2.

заным гэтым абавязкам нават у тым выпадку, калі прынятыя ахвяраванні зніклі без яго віны.

Кан. 950 – Калі акрэсленая сума грошай была прызначана на прысвячэнне Імшаў, але лічба цэлебрацый не была абумоўлена, яна павінна быць вызначана, з улікам велічыні ахвяравання, устаноўленай у месцы, дзе прабывае ахвярадаўца, калі не можна будзе легітымна меркаваць аб тым, што яго намер быў іншы.

Кан. 951 – § 1. Святар, які цэлебруе некалькі Імшаў у той самы дзень, можа кожную з іх прысвяціць згодна з інтэнцыямі, дзеля якіх былі прызначаны ахвяраванні, аднак законам з'яўляецца тое, што, акрамя дня Нараджэння Пана, ён можа ўзяць сабе ахвяраванне толькі за адну Імшу, а іншыя павінен перадаць на мэты, прадпісаныя ардынарыем; пры гэтым дапускаецца акрэсленае ўзнагароджанне, заснаванае на знешняй падставе.

§ 2. Святар, які канцэлебруе другую Імшу ў той самы дзень, не можа ні на якой падставе прыняць за яе ахвяраванне.

Кан. 952 – § 1. Сінод правінцыі або сход біскупаў правінцыі мае права акрэсліць дэкрэтам для ўсёй правінцыі велічыню ахвяравання, якое павінна складацца за цэлебрацыю і прысвячэнне Імшы; святару не дазваляецца патрабаваць большай сумы, але ён можа прыняць як больш высокае, так і больш нізкае дабравольнае ахвяраванне за прысвячэнне Імшы.

§ 2. Там, дзе такога дэкрэта няма, павінен захоўвацца звычай, які існуе ў дыяцэзіі.

§ 3. Члены ўсіх манаскіх інстытутаў таксама павінны падпарадкоўвацца дэкрэту або мясцоваму звычаю, аб якіх гаворыцца ў § 1 і 2.

Кан. 953 – Нікому не дазваляецца прымаць такую колькасць ахвяраванняў на асабістае прысвячэнне Імшаў, што ён не зможа выканаць гэтыя абавязацельствы на працягу года.

Can. 953 – Nemini licet tot stipes Missarum per se applicandarum accipere, quibus intra annum satisfacere non potest.

Кан. 954 – Калі ў некаторых касцёлах або араторыях просяць аб цэлебрацыі большай колькасці Імшаў, чым там могуць цэлебраваць, то дазваляецца, каб яны цэлебраваліся ў іншым месцы, калі ахвярадаўцы выразна не выявяць супраціўную волю.

Can. 954 – Si certis in ecclesiis aut oratoriis Missae petuntur celebrandae numero plures quam ut ibidem celebrari possint, earundem celebratio alibi fieri licet, nisi contrariam voluntatem oblatores expresse manifestaverint.

Кан. 955 – § 1. Той, хто мае намер даручыць цэлебрацыю прысвечаных Імшаў іншым, павінен як мага хутчэй даручыць іх цэлебрацыю тым святарам, якіх сам вызначыць, калі толькі будзе перакананы, што яны вольныя ад падазрэнняў; ён павінен перадаць атрыманыя ахвяраванні поўнасцю, калі не будзе ўпэўнены, што перавышэнне над сумай ахвяравання, якая з'яўляецца абавязковай у дыяцэзіі, было дадзена з увагі на асобу; ён таксама мае абавязак клапаціцца аб цэлебрацыі Імшаў, пакуль не будзе атрымана пацвярджэнне як прыняцця абавязацельства, так і атрымання ахвяравання.

Can. 955 – § 1. Qui celebrationem Missarum applicandarum aliis committere intendat, earum celebrationem quam primum sacerdotibus sibi acceptis committat, dummodo ipsi constet eos esse omni exceptione maiores; integram stipem receptam transmittere debet, nisi certo constet excessum supra summam in dioecesi debitam datum esse intuitu personae; obligatione etiam tenetur Missarum celebrationem curandi, donec tum susceptae obligationis tum receptae stipis testimonium acceperit.

§ 2. Тэрмін, на працягу якога абавязак цэлебрацыі Імшаў павінен быць выкананы, вызначаецца з таго дня, калі святар, які павінен іх цэлебраваць, прыняў гэтае абавязацельства, калі не ўстаноўлена іншае.

§ 2. Tempus intra quod Missae celebrandae sunt, initium habet a die quo sacerdos easdem celebraturus recepit, nisi aliud constet.

§ 3. Тыя, хто даручаюць цэлебраваць Імшы іншым асобам, павінны неадкладна запісаць у кнізе як прынятыя імі Імшы, так і Імшы, перададзеныя іншым асобам, адзначаючы таксама велічыню ахвяраванняў.

§ 3. Qui aliis Missas celebrandas committunt, sine mora in librum referant tum Missas quas acceperunt, tum eas, quas aliis tradiderunt, notatis etiam earundem stipibus.

§ 4. Кожны святар павінен дакладна запісваць Імшы: тыя, якія абавязаўся цэлебраваць, і тыя, абавязацельствы па якіх выканаў.

§ 4. Quilibet sacerdos accurate notare debet Missas quas celebrandas acceperit, quibusque satisfecerit.

Can. 956 – Omnes et singuli administratores causarum piarum aut quoquo modo obligati ad Missarum celebrationem curandam, sive clerici sive laici, onera Missarum quibus intra annum non fuerit satisfactum suis Ordinariis tradant, secundum modum ab his definiendum.

Кан. 956 – Усе адміністратары пабожных фондаў або асобы — духоўныя ці свецкія, — якія любым чынам абавязаны клапаціцца аб цэлебрацыі Імшаў, павінны перадаваць сваім ардынарыям абавязацельствы па Імшах, якія не былі выкананы на працягу года, паводле парадку, акрэсленага ардынарыямі.

Can. 957 – Officium et ius advigilandi ut Missarum onera adimpleantur, in ecclesiis cleri saecularis pertinet ad loci Ordinarium, in ecclesiis institutorum religiosorum aut societatum vitae apostolicae ad eorum Superiores.

Кан. 957 – Абавязак і права сачыць за тым, каб абавязацельствы па Імшах выконваліся, у касцёлах секулярнага духавенства належыць ардынарыям месца, а ў касцёлах манаскіх інстытутаў або таварыстваў апостальскага жыцця — іх настаяцелям.

Can. 958 – § 1. Parochus necnon rector ecclesiae aliusve pii loci, in quibus stipes Missarum recipi solent, peculiarem habeant librum, in quo accurate adnotent Missarum celebrandarum numerum, intentionem, stipem oblatam, necnon celebrationem peractam.

Кан. 958 – § 1. Пробашч, а таксама рэктар касцёла ці іншага пабожнага месца, дзе звычайна прымаюцца ахвяраванні на Імшы, павінны мець асаблівую кнігу, у якой павінна дакладна запісвацца колькасць Імшаў, прынятых да цэлебрацыі, інтэнцыі, велічыня ахвяравання і пацвярджэнне аб выкананым прысвячэнні Імшы.

§ 2. Ordinarius obligatione tenetur singulis annis huiusmodi libros per se aut per alios recognoscendi.

§ 2. Ардынарый мае абавязак штогод асабіста або з дапамогай іншых асобаў правяраць гэтыя кнігі.

TITULUS IV
DE SACRAMENTO PAENITENTIAE

ТЫТУЛ IV
САКРАМЭНТ ПАКАЯННЯ

Can. 959 – In sacramento paenitentiae fideles peccata legitimo ministro confitentes, de iisdem contriti atque propositum sese emendandi habentes, per absolutionem ab eodem ministro impertitam, veniam peccatorum quae post baptismum commiserint a Deo obtinent, simulque reconciliantur cum Ecclesia, quam peccando vulneraverunt.

Кан. 959 – У сакрамэнце пакаяння вернікі, якія вызнаюць грахі легітымнаму служыцелю, шкадуюць за іх і маюць пастанаўленне выправіцца; праз адпушчэнне грахоў, удзеленае тым жа служыцелем, атрымліваюць ад Бога прабачэнне грахоў, здзейсненых пасля хросту, і адначасова нанова яднаюцца з Касцёлам, якому нанеслі рану сваімі грахамі.

Раздзел I

Цэлебрацыя сакрамэнту

Кан. 960 – Індывідуальная і поўная споведзь і адпушчэнне грахоў з'яўляюцца адзіным звычайным спосабам, праз які вернік, які ўсведамляе цяжкі грэх, нанова яднаецца з Богам і Касцёлам; толькі фізічная або маральная немагчымасць вызваляе ад такой споведзі, у гэтым выпадку паяднанне можа ажыццяўляцца іншымі спосабамі.

Кан. 961 – § 1. Адпушчэнне грахоў некалькім пэнітэнтам адначасова без папярэдняй індывідуальнай споведзі згодна з агульным правілам не ўдзяляецца, калі не:

1° пагражае небяспека смерці і час не дазваляе святару або святарам выслухаць споведзь кожнага пэнітэнта паасобку;

2° існуе важкая неабходнасць, а менавіта тады, калі, узяўшы пад увагу колькасць пэнітэнтаў, няма дастатковай колькасці спаведнікаў, каб належным чынам выслухаць споведзь кожнага пэнітэнта паасобку на працягу адпаведнага часу, праз што пэнітэнты без уласнай віны змушаны доўгі час заставацца без сакрамэнтальнай ласкі або святой Камуніі; аднак такая неабходнасць не лічыцца дастатковай, калі спаведнікаў не хапае толькі па прычыне вялікага наплыву пэнітэнтаў, які можа здарыцца ў сувязі з якім-небудзь вялікім святам або пілігрымкай.

§ 2. Права выносіць суджэнне аб тым, ці споўнены ўмовы, якія патрабуюцца ў § 1, 2°, належыць дыяцэзіяльнаму біскупу, які, узяўшы пад увагу крытэрыі, узгодненыя з іншымі членамі Канферэнцыі Біскупаў, можа акрэсліць сітуацыю, у якой такая неабходнасць існуе.

Caput I

De celebratione sacramenti

Can. 960 – Individualis et integra confessio atque absolutio unicum constituunt modum ordinarium, quo fidelis peccati gravis sibi conscius cum Deo et Ecclesia reconciliatur; solummodo impossibilitas physica vel moralis ab huiusmodi confessione excusat, quo in casu aliis quoque modis reconciliatio haberi potest.

Can. 961 – § 1. Absolutio pluribus insimul paenitentibus sine praevia individuali confessione, generali modo impertiri non potest, nisi:

1° immineat periculum mortis et tempus non suppetat sacerdoti vel sacerdotibus ad audiendas singulorum paenitentium confessiones;

2° adsit gravis necessitas, videlicet quando, attento paenitentium numero, confessariorum copia praesto non est ad rite audiendas singulorum confessiones intra congruum tempus, ita ut paenitentes, sine propria culpa, gratia sacramentali aut sacra communione diu carere cogantur; necessitas vero non censetur sufficiens, cum confessarii praesto esse non possunt, ratione solius magni concursus paenitentium, qualis haberi potest in magna aliqua festivitate aut peregrinatione.

§ 2. Iudicium ferre an dentur condiciones ad normam § 1, n. 2 requisitae, pertinet ad Episcopum dioecesanum, qui, attentis criteriis cum ceteris membris Episcoporum conferentiae concordatis, casus talis necessitatis determinare potest.

Can. 962 – § 1. Ut christifidelis sacramentali absolutione una simul pluribus data valide fruatur, requiritur non tantum ut sit apte dispositus, sed ut insimul sibi proponat singillatim debito tempore confiteri peccata gravia, quae in praesens ita confiteri nequit.

§ 2. Christifideles, quantum fieri potest etiam occasione absolutionis generalis recipiendae, de requisitis ad normam § 1 edoceantur et absolutioni generali, in casu quoque periculi mortis, si tempus suppetat, praemittatur exhortatio ut actum contritionis quisque elicere curet.

Can. 963 – Firma manente obligatione de qua in can. 989, is cui generali absolutione gravia peccata remittuntur, ad confessionem individualem quam primum, occasione data, accedat, antequam aliam recipiat absolutionem generalem, nisi iusta causa interveniat.

Can. 964 – § 1. Ad sacramentales confessiones excipiendas locus proprius est ecclesia aut oratorium.

§ 2. Ad sedem confessionalem quod attinet, normae ab Episcoporum conferentia statuantur, cauto tamen ut semper habeantur in loco patenti sedes confessionales crate fixa inter paenitentem et confessarium instructae, quibus libere uti possint fideles, qui id desiderent.

§ 3. Confessiones extra sedem confessionalem ne excipiantur, nisi iusta de causa.

Кан. 962 – § 1. Для таго, каб вернік мог дзейсна скарыстаць з сакрамэнтальнага адпушчэння грахоў, якое ўдзяляецца некалькім пэнітэнтам адначасова, патрабуецца, каб ён не толькі быў адпаведна настроены, але таксама меў намер у адпаведны час вызнаць індывідуальна тыя цяжкія грахі, якія цяпер не можа вызнаць такім спосабам.

§ 2. Трэба тлумачыць вернікам, калі гэта магчыма, нават з нагоды атрымання агульнага адпушчэння грахоў, патрабаванні, акрэсленыя ў § 1. Калі дазваляе час, агульнаму адпушчэнню грахоў, нават у выпадку небяспекі смерці, павінна папярэднічаць заахвочванне да таго, каб кожны ўзбудзіў жаль за грахі.

Кан. 963 – Захоўваючы абавязак, аб якім гаворыцца ў кан. 989, той, каму цяжкія грахі былі адпушчаны праз агульнае адпушчэнне грахоў, павінен як мага хутчэй пры першай магчымасці прыступіць да індывідуальнай споведзі, перш чым прыняць яшчэ адно агульнае адпушчэнне грахоў, калі ў гэтым не перашкодзіць справядлівая прычына.

Кан. 964 – § 1. Адпаведным месцам для здзяйснення сакрамэнтальнай споведзі з'яўляецца касцёл або араторый.

§ 2. Канферэнцыя Біскупаў павінна ўстанавіць адпаведныя нормы адносна месца, прызначанага для споведзі, але з такой умовай, каб у даступным месцы заўсёды меліся канфесіяналы з кратай, замацаванай паміж пэнітэнтам і спаведнікам, каб гэтымі канфесіяналамі маглі свабодна карыстацца вернікі, якія гэтага жадаюць.

§ 3. Без справядлівай прычыны споведзь не павінна здзяйсняцца па-за месцам, прызначаным для споведзі.

Раздзел II

Служыцель сакрамэнту пакаяння

Кан. 965 – Толькі святар з'яўляецца служыцелем сакрамэнту пакаяння.

Кан. 966 – § 1. Для дзейснага адпушчэння грахоў патрабуецца, каб служыцель, акрамя ўлады пасвячэння, меў таксама паўнамоцтва на яе ажыццяўленне ў адносінах да тых вернікаў, якім удзяляе адпушчэнне грахоў.

§ 2. Такое паўнамоцтва святар можа атрымаць або на моцы самога права, або праз удзяленне кампетэнтнай уладай, здзейсненае згодна з нормай кан. 969.

Кан. 967 – § 1. Акрамя Рымскага Пантыфіка, паўнамоцтвам прымаць споведзі вернікаў ва ўсім свеце на моцы самога права валодаюць кардыналы, а таксама біскупы, якія карыстаюцца ім дазволеным чынам і паўсюдна, калі ў асаблівым выпадку гэтаму не запрацівіцца дыяцэзіяльны біскуп.

§ 2. Тыя, хто валодае пастаянным паўнамоцтвам прымаць споведзі або на моцы пасады, або на моцы ўдзялення ардынарыем месца інкардынацыі ці пастаяннага месца жыхарства, могуць ажыццяўляць гэтае паўнамоцтва ўсюды, калі ў асаблівым выпадку гэтаму не запрацівіцца ардынарый месца, захоўваючы прадпісанні кан. 974 § 2 і 3.

§ 3. У адносінах да членаў інстытута ці таварыства і іншых асобаў, якія днём і ноччу пражываюць у доме, на моцы самога права такім самым паўнамоцтвам валодаюць паўсюдна тыя, хто на моцы сваёй пасады або праз удзяленне кампетэнтным настаяцелем згодна з нормамі кан. 968 § 2 і 969 § 2 былі надзелены паўнамоцтвам прымаць споведзі; яны карыстаюцца ім дазволеным чынам, калі ў асаблівым выпадку гэтаму не запрацівіцца які-небудзь вышэйшы настаяцель у дачыненні да яго падуладных.

Caput II

De sacramenti paenitentiae ministro

Can. 965 – Minister sacramenti paenitentiae est solus sacerdos.

Can. 966 – § 1. Ad validam peccatorum absolutionem requiritur ut minister, praeterquam potestate ordinis, facultate gaudeat eandem in fideles, quibus absolutionem impertitur, exercendi.

§ 2. Hac facultate donari potest sacerdos, sive ipso iure sive concessione ab auctoritate competenti facta ad normam can. 969.

Can. 967 – § 1. Praeter Romanum Pontificem, facultate christifidelium ubique terrarum confessiones excipiendi ipso iure gaudent Cardinales; itemque Episcopi, qui eadem et licite ubique utuntur, nisi Episcopus dioecesanus in casu particulari renuerit.

§ 2. Qui facultate confessiones habitualiter excipiendi gaudent sive vi officii sive vi concessionis Ordinarii loci incardinationis aut loci in quo domicilium habent, eandem facultatem ubique exercere possunt, nisi loci Ordinarius in casu particulari renuerit, firmis praescriptis can. 974, §§ 2 et 3.

§ 3. Ipso iure eadem facultate ubique potiuntur erga sodales aliosque in domo instituti aut societatis diu noctuque degentes, qui vi officii aut concessionis Superioris competentis ad normam cann. 968, § 2 et 969, § 2 facultate confessiones excipiendi sunt instructi; qui quidem eadem et licite utuntur, nisi aliquis Superior maior quoad proprios subditos in casu particulari renuerit.

Can. 968 – § 1. Vi officii pro sua quisque dicione facultate ad confessiones excipiendas gaudent loci Ordinarius, canonicus paenitentiarius, itemque parochus aliique qui loco parochi sunt.

§ 2. Vi officii facultate gaudent confessiones excipiendi suorum subditorum aliorumque, in domo diu noctuque degentium, Superiores instituti religiosi aut societatis vitae apostolicae, si sint clericales iuris pontificii, ad normam constitutionum potestate regiminis exsecutiva fruentes, firmo tamen praescripto can. 630, § 4.

Can. 969 – § 1. Solus loci Ordinarius competens est qui facultatem ad confessiones quorumlibet fidelium excipiendas conferat presbyteris quibuslibet; presbyteri autem qui sodales sunt institutorum religiosorum, eadem ne utantur sine licentia saltem praesumpta sui Superioris.

§ 2. Superior instituti religiosi aut societatis vitae apostolicae, de quo in can. 968, § 2, competens est qui facultatem ad excipiendas confessiones suorum subditorum aliorumque in domo diu noctuque degentium presbyteris quibuslibet conferat.

Can. 970 – Facultas ad confessiones excipiendas ne concedatur nisi presbyteris qui idonei per examen reperti fuerint, aut de eorum idoneitate aliunde constet.

Can. 971 – Facultatem ad excipiendas habitualiter confessiones loci Ordinarius presbytero, etsi domicilium vel quasi-domicilium in sua dicione habenti, ne concedat, nisi prius, quantum fieri potest, audito eiusdem presbyteri Ordinario.

Кан. 968 – § 1. На моцы пасады, кожны на тэрыторыі сваёй юрысдыкцыі, паўнамоцтвам прымаць споведзі валодаюць ардынарый месца, канонік-пэнітэнцыярый, а таксама пробашч і іншыя асобы, якія замяняюць пробашча.

§ 2. На моцы пасады паўнамоцтвам прымаць споведзь у сваіх падуладных, а таксама ў іншых асобаў, якія днём і ноччу пражываюць у доме, валодаюць настаяцелі манаскіх інстытутаў або таварыстваў апостальскага жыцця, калі яны з'яўляюцца святарскімі і папскага права, якія згодна з нормамі канстытуцый маюць выканаўчую ўладу кіравання, захоўваючы прадпісанне кан. 630 § 4.

Кан. 969 – § 1. Толькі ардынарый месца мае права ўдзяляць любым прэзбітэрам паўнамоцтва прымаць споведзі любых вернікаў; аднак прэзбітэры, якія з'яўляюцца членамі манаскіх інстытутаў, не могуць карыстацца гэтым паўнамоцтвам без дазволу, прынамсі меркаванага, свайго настаяцеля.

§ 2. Настаяцель манаскага інстытута або таварыства апостальскага жыцця, аб якім гаворыцца ў кан. 968 § 2, мае права ўдзяляць любым прэзбітэрам паўнамоцтва прымаць споведзі сваіх падуладных, а таксама іншых асобаў, якія днём і ноччу пражываюць у доме.

Кан. 970 – Паўнамоцтва прымаць споведзі павінна ўдзяляцца толькі тым святарам, здатнасць якіх да гэтага была сцверджана па выніках экзамену або калі аб іх здатнасці стала вядома іншым спосабам.

Кан. 971 – Ардынарый месца не павінен удзяляць прэзбітэру пастаяннае паўнамоцтва прымаць споведзі, нават калі гэты прэзбітэр мае пастаяннае або часовае месца жыхарства на яго тэрыторыі, калі перад гэтым не выслухае — калі гэта магчыма — ардынарыя гэтага прэзбітэра.

Кан. 972 – Кампетэнтная ўлада, аб якой гаворыцца ў кан. 969, можа ўдзяліць паўнамоцтва прымаць споведзь на неакрэслены або акрэслены час.

Кан. 973 – Пастаяннае паўнамоцтва прымаць споведзі павінна быць удзелена пісьмова.

Кан. 974 – § 1. Ардынарый месца, а таксама кампетэнтны настаяцель не павінны адклікаць удзеленае пастаяннае паўнамоцтва прымаць споведзі, калі не па важкай прычыне.

§ 2. Калі паўнамоцтва прымаць споведзі адклікае ардынарый месца, які ўдзяліў паўнамоцтва і аб якім гаворыцца ў кан. 967 § 2, то прэзбітэр траціць гэтае паўнамоцтва ўсюды; калі ж яго адклікае іншы ардынарый месца, то прэзбітэр траціць яго толькі на тэрыторыі ардынарыя месца, які яго адклікаў.

§ 3. Кожны ардынарый месца, які адклікаў паўнамоцтва якога-небудзь святара прымаць споведзі, павінен паведаміць аб гэтым ардынарыя, які на падставе інкардынацыі з'яўляецца ўласным для гэтага прэзбітэра, або — калі гаворка ідзе пра члена манаскага інстытута — яго кампетэнтнага настаяцеля.

§ 4. Калі паўнамоцтва прымаць споведзі адклікае ўласны вышэйшы настаяцель, то прэзбітэр траціць паўнамоцтва прымаць споведзі членаў інстытута ўсюды; калі ж яго адклікае іншы кампетэнтны настаяцель, то прэзбітэр траціць гэтае паўнамоцтва толькі ў дачыненні да падуладных юрысдыкцыі гэтага настаяцеля.

Кан. 975 – Акрамя выпадку адклікання, паўнамоцтва, аб якім гаворыцца ў кан. 967 § 2, спыняецца праз страту пасады, экскардынацыю або страту пастаяннага месца жыхарства.

Can. 972 – Facultas ad confessiones excipiendas a competenti auctoritate, de qua in can. 969, concedi potest ad tempus sive indeterminatum sive determinatum.

Can. 973 – Facultas ad confessiones habitualiter excipiendas scripto concedatur.

Can. 974 – § 1. Loci Ordinarius, itemque Superior competens, facultatem ad confessiones excipiendas habitualiter concessam ne revocet nisi gravem ob causam.

§ 2. Revocata facultate ad confessiones excipiendas a loci Ordinario qui eam concessit, de quo in can. 967, § 2, presbyter eandem facultatem ubique amittit; revocata eadem facultate ab alio loci Ordinario, eandem amittit tantum in territorio revocantis.

§ 3. Quilibet loci Ordinarius qui alicui presbytero revocaverit facultatem ad confessiones excipiendas, certiorem reddat Ordinarium qui ratione incardinationis est presbyteri proprius, aut, si agatur de sodali instituti religiosi, eiusdem competentem Superiorem.

§ 4. Revocata facultate ad confessiones excipiendas a proprio Superiore maiore, facultatem ad excipiendas confessiones ubique erga sodales instituti amittit presbyter; revocata autem eadem facultate ab alio Superiore competenti, eandem amittit erga solos in eiusdem dicione subditos.

Can. 975 – Praeterquam revocatione, facultas de qua in can. 967, § 2 cessat amissione officii vel excardinatione aut amissione domicilii.

Can. 976 – Quilibet sacerdos, licet ad confessiones excipiendas facultate careat, quoslibet paenitentes in periculo mortis versantes valide et licite absolvit a quibusvis censuris et peccatis, etiamsi praesens sit sacerdos approbatus.

Кан. 976 – Кожны святар, нават калі б не валодаў паўнамоцтвам прымаць споведзі, дзейсна і дазволеным чынам удзяляе адпушчэнне любых цэнзур і грахоў любым пэнітэнтам, якія знаходзяцца ў небяспецы смерці, нават калі прысутнічае зацверджаны святар.

Can. 977 – Absolutio complicis in peccato contra sextum Decalogi praeceptum invalida est, praeterquam in periculo mortis.

Кан. 977 – Адпушчэнне грахоў, удзеленае саўдзельніку ў граху супраць шостай запаведзі Дэкалога, з'яўляецца нядзейсным, акрамя выпадку небяспекі смерці.

Can. 978 – § 1. Meminerit sacerdos in audiendis confessionibus se iudicis pariter et medici personam sustinere ac divinae iustitiae simul et misericordiae ministrum a Deo constitutum esse, ut honori divino et animarum saluti consulat.

Кан. 978 – § 1. Слухаючы споведзі, святар павінен памятаць аб тым, што ён павінен выступаць у якасці суддзі і адначасова лекара, а таксама аб тым, што ён пастаўлены Богам, каб быць служыцелем Божай справядлівасці і разам з тым міласэрнасці і каб дзейнічаць дзеля шанавання Бога і збаўлення душаў.

§ 2. Confessarius, utpote minister Ecclesiae, in administrando sacramento, doctrinae Magisterii et normis a competenti auctoritate latis fideliter adhaereat.

§ 2. Споведнік, будучы служыцелем Касцёла, павінен пры здзяйсненні сакрамэнту верна трымацца вучэння Магістэрыя і нормаў, выдадзеных кампетэнтнай уладай.

Can. 979 – Sacerdos in quaestionibus ponendis cum prudentia et discretione procedat, attenta quidem condicione et aetate paenitentis, abstineatque a nomine complicis inquirendo.

Кан. 979 – Задаючы пытанні, святар павінен рабіць гэта з разважлівасцю і разборлівасцю, беручы пад увагу становішча і ўзрост пэнітэнта і ўстрымліваючыся ад пытання пра імя саўдзельніка ў граху.

Can. 980 – Si confessario dubium non est de paenitentis dispositione et hic absolutionem petat, absolutio ne denegetur nec differatur.

Кан. 980 – Калі ў споведніка няма сумнення адносна настроенасці пэнітэнта, а той просіць аб адпушчэнні грахоў, нельга ні адмаўляць у адпушчэнні грахоў, ні яго адкладваць.

Can. 981 – Pro qualitate et numero peccatorum, habita tamen ratione paenitentis condicionis, salutares et convenientes satisfactiones confessarius iniungat; quas paenitens per se ipse implendi obligatione tenetur.

Кан. 981 – У залежнасці ад цяжкасці і колькасці грахоў, беручы пры гэтым пад увагу становішча пэнітэнта, споведнік павінен накласці на яго збавенныя і адпаведныя пакуты, якія пэнітэнт мае абавязак выканаць асабіста.

Кан. 982 – Таму, хто вызнае на споведзі, што ілжыва абвінаваціў невінаватага спаведніка перад касцёльнай уладай у злачынстве намаўлення да граху супраць шостай запаведзі Дэкалога, не павінны быць адпушчаны грахі, калі ён перад гэтым не адмовіцца фармальным чынам ад ілжывага абвінавачання і не будзе гатовы направіць шкоду, калі яна была прычынена.

Кан. 983 – § 1. Сакрамэнтальная таямніца з'яўляецца непарушнай; таму спаведніку нельга словамі або якім-небудзь іншым спосабам і па якой бы то ні было прычыне здрадзіць пэнітэнта.

§ 2. Абавязак захоўвання таямніцы мае таксама перакладчык, калі ён прысутнічаў, а таксама ўсе іншыя асобы, якія якімнебудзь чынам даведаліся аб грахах з таго, што было на споведзі.

Кан. 984 – § 1. Спаведніку безумоўна забараняецца карыстацца атрыманымі са споведзі звесткамі, якія абцяжарваюць пэнітэнта, нават калі ўсякая небяспека іх адкрыцця выключана.

§ 2. Той, хто мае ўладу, не можа ніякім чынам карыстацца ў знешнім кіраванні звесткамі аб грахах, атрыманымі ў любы час на споведзі.

Кан. 985 – Настаўнік навіцыяў і яго памочнік, а таксама рэктар семінарыі або іншай навучальнай установы не павінны слухаць сакрамэнтальныя споведзі сваіх алюмнаў, якія прабываюць у тым жа доме, калі ў асобных выпадках алюмны самі аб гэтым не папросяць.

Кан. 986 – § 1. Кожны, каму на моцы яго задання даручана апека над душамі, мае абавязак дбаць аб тым, каб былі выслуханы споведзі даручаных яму вернікаў, якія

Can. 982 – Qui confitetur se falso confessarium innocentem apud auctoritatem ecclesiasticam denuntiasse de crimine sollicitationis ad peccatum contra sextum Decalogi praeceptum, ne absolvatur nisi prius falsam denuntiationem formaliter retractaverit et paratus sit ad damna, si quae habeantur, reparanda.

Can. 983 – § 1. Sacramentale sigillum inviolabile est; quare nefas est confessario verbis vel alio quovis modo et quavis de causa aliquatenus prodere paenitentem.

§ 2. Obligatione secretum servandi tenentur quoque interpres, si detur, necnon omnes alii ad quos ex confessione notitia peccatorum quoquo modo pervenerit.

Can. 984 – § 1. Omnino confessario prohibetur scientiae ex confessione acquisitae usus cum paenitentis gravamine, etiam quovis revelationis periculo excluso.

§ 2. Qui in auctoritate est constitutus, notitia quam de peccatis in confessione quovis tempore excepta habuerit, ad exteriorem gubernationem nullo modo uti potest.

Can. 985 – Magister novitiorum eiusque socius, rector seminarii aliusve instituti educationis sacramentales confessiones suorum alumnorum in eadem domo commorantium ne audiant, nisi alumni in casibus particularibus sponte id petant.

Can. 986 – § 1. Omnis cui animarum cura vi muneris est demandata, obligatione tenetur providendi ut audiantur confessiones fidelium sibi commissorum, qui rationabiliter

audiri petant, utque iisdem opportunitas praebeatur ad confessionem individualem, diebus ac horis in eorum commodum statutis, accedendi.

§ 2. Urgente necessitate, quilibet confessarius obligatione tenetur confessiones christifidelium excipiendi, et in periculo mortis quilibet sacerdos.

разумна просяць аб гэтым, а таксама каб ім была дадзена магчымасць прыступіць да індывідуальнай споведзі ва ўстаноўленыя і зручныя для іх дні і гадзіны.

§ 2. Калі прымушае неабходнасць, кожны спаведнік мае абавязак прыняць споведзь вернікаў, а ў небяспецы смерці — кожны святар.

Caput III
De ipso paenitente

Can. 987 – Christifidelis, ut sacramenti paenitentiae remedium percipiat salutiferum, ita dispositus sit oportet ut, peccata quae commiserit repudians et propositum sese emendandi habens, ad Deum convertatur.

Can. 988 – § 1. Christifidelis obligatione tenetur in specie et numero confitendi omnia peccata gravia post baptismum perpetrata et nondum per claves Ecclesiae directe remissa neque in confessione individuali accusata, quorum post diligentem sui discussionem conscientiam habeat.

§ 2. Commendatur christifidelibus ut etiam peccata venialia confiteantur.

Can. 989 – Omnis fidelis, postquam ad annos discretionis pervenerit, obligatione tenetur peccata sua gravia, saltem semel in anno, fideliter confitendi.

Can. 990 – Nemo prohibetur quominus per interpretem confiteatur, vitatis quidem abusibus et scandalis atque firmo praescripto can. 983, § 2.

Can. 991 – Cuivis christifideli integrum est confessario legitime approbato etiam alius ritus, cui maluerit, peccata confiteri.

Раздзел III
Пэнітэнт

Кан. 987 – Вернік, для таго каб атрымаць збавенны лек сакрамэнту пакаяння, павінен быць настроены да таго, каб, адкідваючы здзейсненыя грахі і маючы пастанаўленне выправіцца, навярнуцца да Бога.

Кан. 988 – § 1. Вернік мае абавязак спавядацца з усіх цяжкіх грахоў паводле іх відаў і колькасці, здзейсненых пасля хросту, яшчэ не дараваных беспасрэдна ўладай ключоў, якая належыць Касцёлу, і не вызнаных на індывідуальнай споведзі, якія ён усведамляе пасля стараннага рахунку сумлення.

§ 2. Рэкамендуецца, каб вернікі спавядаліся таксама і са штодзённых грахоў.

Кан. 989 – Кожны вернік пасля дасягнення ўзросту распазнавання мае абавязак прынамсі раз на год верна спавядацца са сваіх цяжкіх грахоў.

Кан. 990 – Нікому не забараняецца спавядацца з дапамогай перакладчыка, пазбягаючы пры гэтым злоўжыванняў і спакусы, а таксама захоўваючы прадпісанне кан. 983 § 2.

Кан. 991 – Кожны вернік мае поўнае права спавядацца са сваіх грахоў перад тым легітымна зацверджаным спаведнікам, якому аддае перавагу, нават калі ён належыць да іншага абраду.

Раздзел IV
Адпусты

Кан. 992 – Адпуст — гэта дараванне перад Богам часовага пакарання за грахі, ужо адпушчаныя ў тым, што датычыць віны, якое адпаведна настроены вернік, які выканаў акрэсленыя і вызначаныя ўмовы, атрымлівае праз дзеянне Касцёла, які, будучы служыцелем адкуплення, уладна распараджаецца скарбніцай заслуг Хрыста і святых і яе прысвячае.

Кан. 993 – Адпуст бывае частковы і поўны, у залежнасці ад таго, наколькі ён вызваляе ад часовага пакарання, належнага за грахі, — часткова або поўнасцю.

Кан. 994 – Кожны вернік можа атрымліваць або часовыя, або поўныя адпусты для сябе самога ці прысвячаць іх памерлым заступніцкім спосабам.

Кан. 995 – § 1. Апрача вярхоўнай улады Касцёла, удзяляць адпусты могуць толькі тыя, каму гэтая ўлада нададзена правам або ўдзелена Рымскім Пантыфікам.

§ 2. Ніякая ўлада, акрамя Рымскага Пантыфіка, не можа перадаваць іншым уладу ўдзялення адпустаў, калі гэта ёй не было выразна дазволена Апостальскай Сталіцай.

Кан. 996 – § 1. Для таго, каб хто-небудзь быў здольны атрымаць адпуст, ён павінен быць ахрышчаным, не звязаным экскамунікай і знаходзіцца ў стане ласкі, прынамсі пры завяршэнні прадпісаных дзеянняў.

§ 2. Пры гэтым для таго, каб адпусты былі атрыманы тым, хто з'яўляецца здольным іх атрымаць, ён павінен мець прынамсі агульны намер іх атрымання, а таксама ва ўстаноўленым тэрміне і належным чынам выканаць наказаныя дзеянні ў адпаведнасці з тым, што змешчана ва ўдзяленні.

Caput IV
De indulgentiis

Can. 992 – Indulgentia est remissio coram Deo poenae temporalis pro peccatis, ad culpam quod attinet iam deletis, quam christifidelis, apte dispositus et certis ac definitis condicionibus, consequitur ope Ecclesiae quae, ut ministra redemptionis, thesaurum satisfactionum Christi et Sanctorum auctoritative dispensat et applicat.

Can. 993 – Indulgentia est partialis aut plenaria, prout a poena temporali pro peccatis debita liberat ex parte aut ex toto.

Can. 994 – Quivis fidelis potest indulgentias sive partiales sive plenarias, aut sibi ipsi lucrari, aut defunctis applicare ad modum suffragii.

Can. 995 – § 1. Praeter supremam Ecclesiae auctoritatem ii tantum possunt indulgentias elargiri, quibus haec potestas iure agnoscitur aut a Romano Pontifice conceditur.

§ 2. Nulla auctoritas infra Romanum Pontificem potest potestatem concedendi indulgentias aliis committere, nisi id ei a Sede Apostolica expresse fuerit indultum.

Can. 996 – § 1. Ut quis capax sit lucrandi indulgentias debet esse baptizatus, non excommunicatus, in statu gratiae saltem in fine operum praescriptorum.

§ 2. Ut vero subiectum capax eas lucretur, habere debet intentionem saltem generalem eas acquirendi et opera iniuncta implere statuto tempore ac debito modo, secundum concessionis tenorem.

Can. 997 – Ad indulgentiarum concessionem et usum quod attinet, servanda sunt insuper cetera praescripta quae in peculiaribus Ecclesiae legibus continentur.

Кан. 997 – У тым, што датычыць удзялення адпустаў і карыстання імі, трэба, акрамя гэтага, захоўваць іншыя прадпісанні, змешчаныя ў асаблівых законах Касцёла.

TITULUS V

DE SACRAMENTO UNCTIONIS INFIRMORUM

ТЫТУЛ V

САКРАМЭНТ НАМАШЧЭННЯ ХВОРЫХ

Can. 998 – Unctio infirmorum, qua Ecclesia fideles periculose aegrotantes Domino patienti et glorificato, ut eos allevet et salvet, commendat, confertur eos liniendo oleo atque verba proferendo in liturgicis libris praescripta.

Кан. 998 – Намашчэнне хворых, праз якое Касцёл даручае небяспечна хворых вернікаў пакутуючаму і праслаўленаму Пану, каб Ён іх падтрымаў і збавіў, удзяляецца праз памазанне іх алеем і вымаўленне слоў, прадпісаных у літургічных кнігах.

Caput I

De sacramenti celebratione

Раздзел I

Цэлебрацыя сакрамэнту

Can. 999 – Praeter Episcopum, oleum in unctione infirmorum adhibendum benedicere possunt:

1° qui iure Episcopo dioecesano aequiparantur;

2° in casu necessitatis, quilibet presbyter in ipsa tamen celebratione sacramenti.

Кан. 999 – Апрача біскупа, алей, які ўжываецца пры намашчэнні хворых, могуць благаслаўляць:

1° тыя, хто прыраўноўваюцца ў праве да дыяцэзіяльнага біскупа;

2° у выпадку неабходнасці — кожны прэзбітэр, аднак толькі падчас цэлебрацыі сакрамэнту.

Can. 1000 – § 1. Unctiones verbis, ordine et modo praescriptis in liturgicis libris, accurate peragantur; in casu tamen necessitatis, sufficit unctio unica in fronte vel etiam in alia corporis parte, integra formula prolata.

Кан. 1000 – § 1. Намашчэнні павінны здзяйсняцца дакладна, з выкарыстаннем слоў, парадку і спосабу, прадпісаных у літургічных кнігах; аднак у выпадку неабходнасці дастаткова намасціць толькі чало або нават іншую частку цела з вымаўленнем поўнай формулы.

§ 2. Unctiones peragat minister propria manu, nisi gravis ratio usum instrumenti suadeat.

§ 2. Намашчэнні павінен здзяйсняць служыцель уласнай рукой, калі важкая прычына не схіліць да выкарыстання прылады.

Кан. 1001 – Душпастыры і блізкія хворых павінны клапаціцца аб тым, каб хворыя атрымлівалі ўмацаванне гэтым сакрамэнтам у адпаведны час.

Кан. 1002 – Агульная цэлебрацыя намашчэння хворых адначасова для некалькіх хворых, адпаведна падрыхтаваных і належна настроеных, можа быць здзейснена паводле прадпісанняў дыяцэзіяльнага біскупа.

Can. 1001 – Curent animarum pastores et infirmorum propinqui, ut tempore opportuno infirmi hoc sacramento subleventur.

Can. 1002 – Celebratio communis unctionis infirmorum, pro pluribus infirmis simul, qui apte sint praeparati et rite dispositi, iuxta Episcopi dioecesani praescripta peragi potest.

Раздзел II
Служыцель намашчэння хворых

Кан. 1003 – § 1. Намашчэнне хворых дзейсна ўдзяляе кожны святар і толькі святар.

§ 2. Абавязак і права ўдзяляць намашчэнне хворых маюць усе святары, якім даручана душпастырства, у адносінах да вернікаў, даручаных іх пастырскай апецы; па разумнай прычыне кожны іншы святар можа ўдзяліць гэты сакрамэнт са згоды, прынамсі меркаванай, вышэйзгаданага святара.

§ 3. Кожнаму святару дазваляецца насіць з сабой благаслаўлены алей, каб у выпадку неабходнасці ён мог удзяліць сакрамэнт намашчэння хворых.

Caput II
De ministro unctionis infirmorum

Can. 1003 – § 1. Unctionem infirmorum valide administrat omnis et solus sacerdos.

§ 2. Officium et ius unctionis infirmorum ministrandi habent omnes sacerdotes, quibus demandata est cura animarum, erga fideles suo pastorali officio commissos; ex rationabili causa, quilibet alius sacerdos hoc sacramentum ministrare potest de consensu saltem praesumpto sacerdotis de quo supra.

§ 3. Cuilibet sacerdoti licet oleum benedictum secumferre ut, in casu necessitatis, sacramentum unctionis infirmorum ministrare valeat.

Раздзел III
Тыя, каму павінна быць удзелена намашчэнне хворых

Кан. 1004 – § 1. Намашчэнне хворых можа быць удзелена верніку, які, дасягнуўшы карыстання розумам, апынуўся ў небяспецы смерці па прычыне хваробы або пажылога ўзросту.

Caput III
De iis quibus unctio infirmorum conferenda sit

Can. 1004 – § 1. Unctio infirmorum ministrari potest fideli qui, adepto rationis usu, ob infirmitatem vel senium in periculo incipit versari.

§ 2. Hoc sacramentum iterari potest, si infirmus, postquam convaluerit, denuo in gravem infirmitatem inciderit aut si, eadem infirmitate perdurante, discrimen factum gravius sit.

Can. 1005 – In dubio utrum infirmus rationis usum attigerit, an periculose aegrotet vel mortuus sit, hoc sacramentum ministretur.

Can. 1006 – Infirmis qui, cum suae mentis compotes essent, hoc sacramentum implicite saltem petierint, conferatur.

Can. 1007 – Unctio infirmorum ne conferatur illis, qui in manifesto gravi peccato obstinate perseverent.

§ 2. Гэты сакрамэнт можа быць паўтораны, калі хворы пасля таго, як папраўіцца, зноў будзе пакутаваць на цяжкую хваробу або калі падчас трывання той жа хваробы небяспека стане больш сур'ёзнай.

Кан. 1005 – У выпадку сумнення, якое датычыць таго, ці мае хворы карыстанне розумам, а таксама таго, знаходзіцца ён у небяспецы смерці ці памёр, сакрамэнт павінен быць удзелены.

Кан. 1006 – Гэты сакрамэнт павінен удзяляцца хворым, якія, будучы ў прытомнасці, прынамсі апасродкавана прасілі аб яго дзяленні.

Кан. 1007 – Намашчэнне хворых не павінна ўдзяляцца тым, хто ўпарта працягвае трываць у яўным цяжкім граху.

TITULUS VI
DE ORDINE

Can. 1008 – Sacramento ordinis ex divina institutione inter christifideles quidam, charactere indelebili quo signantur, constituuntur sacri ministri, qui nempe consecrantur et deputantur ut, pro suo quisque gradu, novo et peculiari titulo Dei populo inserviant.

Can. 1009 – § 1. Ordines sunt episcopatus, presbyteratus et diaconatus.

§ 2. Conferuntur manuum impositione et precatione consecratoria, quam pro singulis gradibus libri liturgici praescribunt.

§ 3. Qui constituti sunt in ordine episcopatus aut presbyteratus missionem et facultatem agendi in persona Christi Capitis accipiunt, diaconi vero vim populo Dei serviendi in diaconia liturgiae, verbi et caritatis.

ТЫТУЛ VI
ПАСВЯЧЭННІ

Кан. 1008 – З Божага ўстанаўлення праз сакрамэнт пасвячэння, які выціскае непазбыўную пячаць, некаторыя з вернікаў устанаўліваюцца святымі служыцелямі, а менавіта кансэкруюцца і прызначаюцца для таго, каб кожны адпаведна сваёй ступені на новай і асаблівай падставе служыў Божаму народу.

Кан. 1009 – § 1. Пасвячэнні — гэта біскупства, прэзбітэрат і дыяканат.

§ 2. Пасвячэнні ўдзяляюцца праз ускладанне рук і кансэкрацыйную малітву, якая прадпісана для кожнай ступені ў літургічных кнігах.

§ 3. Тыя, хто былі пасвячаны ў біскупства або прэзбітэрат, атрымліваюць місію і паўнамоцтва дзейнічаць у асобе Хрыста-Галавы, а дыяканы — моц служэння Божаму народу ў дыяканіі літургіі, слова і любові.

Раздзел I

Цэлебрацыя
і служыцель пасвячэння

Кан. 1010 – Пасвячэнне павінна цэлебравацца падчас урачыстай святой Імшы ў нядзелю або прадпісанае свята, але з увагі на пастырскія прычыны можа адбывацца таксама ў іншыя дні, не выключаючы будняў.

Кан. 1011 – § 1. Наогул пасвячэнне павінна цэлебравацца ў катэдральным касцёле, аднак з увагі на пастырскія прычыны можа адбывацца ў іншым касцёле або араторыі.

§ 2. На пасвячэнне запрашаюцца духоўныя асобы і іншыя вернікі, каб быў як мага большы ўдзел у цэлебрацыі.

Кан. 1012 – Служыцелем святога пасвячэння з'яўляецца кансэкраваны біскуп.

Кан. 1013 – Ніякаму біскупу не дазваляецца кансэкраваць каго-небудзь на біскупа, калі перад гэтым ён не ўпэўніцца ў наяўнасці папскага ўпаўнаважання.

Кан. 1014 – Калі Апостальская Сталіца не ўдзяліла дыспенсацыю, то пры біскупскай кансэкрацыі біскуп, які з'яўляецца галоўным кансэкратарам, павінен далучыць да сабе прынамсі двух біскупаў-кансэкратараў; аднак вельмі пажадана, каб разам з імі абранага кансэкравалі ўсе прысутныя біскупы.

Кан. 1015 – § 1. Кожны павінен быць пасвячаны ў прэзбітэрат або дыяканат уласным біскупам або на падставе яго легітымнага дымісарыйнага ліста.

§ 2. Уласны біскуп, калі не мае справядлівай перашкоды, павінен асабіста пасвячаць сваіх падуладных; аднак ён не можа без апостальскага індульта дазволеным чынам пасвяціць падуладнага, які належыць да ўсходняга абраду.

Caput I

De ordinationis celebratione et ministro

Can. 1010 – Ordinatio intra Missarum sollemnia celebretur, die dominico vel festo de praecepto, sed ob rationes pastorales aliis etiam diebus, ferialibus non exceptis, fieri potest.

Can. 1011 – § 1. Ordinatio generaliter in cathedrali ecclesia celebretur; ob rationes tamen pastorales in alia ecclesia aut oratorio celebrari potest.

§ 2. Ad ordinationem invitandi sunt clerici aliique christifideles, ut quam maxima frequentia celebrationi intersint.

Can. 1012 – Sacrae ordinationis minister est Episcopus consecratus.

Can. 1013 – Nulli Episcopo licet quemquam consecrare in Episcopum, nisi prius constet de pontificio mandato.

Can. 1014 – Nisi Sedis Apostolicae dispensatio intercesserit, Episcopus consecrator principalis in consecratione episcopali duos saltem Episcopos consecrantes sibi adiungat; valde convenit autem, ut una cum iisdem omnes Episcopi praesentes electum consecrent.

Can. 1015 – § 1. Unusquisque ad presbyteratum et ad diaconatum a proprio Episcopo ordinetur aut cum legitimis eiusdem litteris dimissoriis.

§ 2. Episcopus proprius, iusta de causa non impeditus, per se ipse suos subditos ordinet; sed subditum orientalis ritus, sine apostolico indulto, licite ordinare non potest.

§ 3. Qui potest litteras dimissorias ad ordines recipiendos dare, potest quoque eosdem ordines per se ipse conferre, si charactere episcopali polleat.

Can. 1016 – Episcopus proprius, quod attinet ad ordinationem diaconalem eorum qui clero saeculari se adscribi intendant, est Episcopus dioecesis, in qua promovendus habet domicilium, aut dioecesis cui promovendus sese devovere statuit; quod attinet ad ordinationem presbyteralem clericorum saecularium, est Episcopus dioecesis, cui promovendus per diaconatum est incardinatus.

Can. 1017 – Episcopus extra propriam dicionem nonnisi cum licentia Episcopi dioecesani ordines conferre potest.

Can. 1018 – § 1. Litteras dimissorias pro saecularibus dare possunt:

1° Episcopus proprius, de quo in can. 1016;

2° Administrator apostolicus atque, de consensu collegii consultorum, Administrator dioecesanus; de consensu consilii, de quo in can. 495, § 2, Pro-vicarius et Pro-praefectus apostolicus.

§ 2. Administrator dioecesanus, Pro-vicarius et Pro-praefectus apostolicus litteras dimissorias ne iis concedant, quibus ab Episcopo dioecesano aut a Vicario vel Praefecto apostolico accessus ad ordines denegatus fuerit.

Can. 1019 – § 1. Superiori maiori instituti religiosi clericalis iuris pontificii aut societatis clericalis vitae apostolicae iuris pontificii competit ut suis subditis, iuxta constitutiones

§ 3. Той, хто можа выдаць дымісарыйны ліст на прыняцце пасвячэння, можа таксама ўдзяліць пасвячэнне асабіста, калі мае біскупскую годнасць.

Кан. 1016 – У тым, што датычыць дыяканскага пасвячэння тых, хто жадае быць далучаны да секулярнага духавенства, іх уласным біскупам з'яўляецца біскуп дыяцэзіі, дзе вылучаны мае пастаяннае месца жыхарства, або той дыяцэзіі, служэнню ў якой вылучаны вырашыў сябе прысвяціць; што датычыць прэзбітэрскага пасвячэння секулярных духоўных асобаў, іх уласным біскупам з'яўляецца біскуп дыяцэзіі, у якую кандыдат быў інкардынаваны праз дыяканат.

Кан. 1017 – Па-за тэрыторыяй сваёй юрысдыкцыі біскуп можа ўдзяляць пасвячэнні толькі з дазволу дыяцэзіяльнага біскупа.

Кан. 1018 – § 1. Дымісарыйны ліст для секулярных духоўных асобаў могуць выдаць:

1° уласны біскуп, аб якім гаворыцца ў кан. 1016;

2° апостальскі адміністратар, а са згоды Калегіі Кансультантаў — дыяцэзіяльны адміністратар; са згоды Рады, аб якой гаворыцца ў кан. 495 § 2, — апостальскія правікарый і прапрэфект.

§ 2. Дыяцэзіяльны адміністратар, апостальскі правікарый і прапрэфект не павінны выдаваць дымісарыйныя лісты тым, каго дыяцэзіяльны біскуп, апостальскі вікарый або прэфект не дапусцілі да пасвячэння.

Кан. 1019 – § 1. Вышэйшы настаяцель святарскага манаскага інстытута папскага права або святарскага таварыства апостальскага жыцця папскага права мае права выдаць дымісарыйны ліст на дыякан-

скае або прэзбітэрскае пасвячэнне сваім падуладным, якія паводле канстытуцый вечна або канчаткова ўключаны ў інстытут або таварыства.

§ 2. Пасвячэнне ўсіх іншых алюмнаў якога-небудзь інстытута або супольнасці кіруецца правам, якое абавязвае секулярных духоўных асобаў, пры гэтым адклікаецца любы індульт, удзелены настаяцелям.

Кан. 1020 – Дымісарыйныя лісты не павінны выдавацца, калі не будуць сабраны ўсе пасведчанні і дакументы, якія патрабуюцца правам згодна з нормамі кан. 1050 і 1051.

Кан. 1021 – Дымісарыйныя лісты могуць быць скіраваны любому біскупу, які знаходзіцца ў адзінстве з Апостальскай Сталіцай, за выключэннем — калі няма апостальскага індульта — біскупа іншага абраду, чым абрад вылучанага.

Кан. 1022 – Біскуп, які ўдзяляе пасвячэнне, не павінен, атрымаўшы легітымны дымісарыйны ліст, прыступаць да пасвячэння, калі не будзе поўнасцю перакананы ў тым, што ліст з'яўляецца сапраўдным.

Кан. 1023 – Той, хто выдаў дымісарыйны ліст, або яго наступнік можа абмежаваць яго ўмовамі ці адклікаць; аднак, аднойчы выдадзены, ён не траціць дзейснасць са спыненнем права асобы, якая яго выдала.

perpetuo vel definitive instituto aut societati adscriptis, concedat litteras dimissorias ad diaconatum et ad presbyteratum.

§ 2. Ordinatio ceterorum omnium alumnorum cuiusvis instituti aut societatis regitur iure clericorum saecularium, revocato quolibet indulto Superioribus concesso.

Can. 1020 – Litterae dimissoriae ne concedantur, nisi habitis antea omnibus testimoniis et documentis, quae iure exiguntur ad normam cann. 1050 et 1051.

Can. 1021 – Litterae dimissoriae mitti possunt ad quemlibet Episcopum communionem cum Sede Apostolica habentem, excepto tantum, citra apostolicum indultum, Episcopo ritus diversi a ritu promovendi.

Can. 1022 – Episcopus ordinans, acceptis legitimis litteris dimissoriis, ad ordinationem ne procedat, nisi de germana litterarum fide plane constet.

Can. 1023 – Litterae dimissoriae possunt ab ipso concedente aut ab eius successore limitibus circumscribi aut revocari, sed semel concessae non extinguuntur resoluto iure concedentis.

Раздзел II
Кандыдаты да пасвячэння

Caput II
De ordinandis

Кан. 1024 – Святое пасвячэнне дзейсна прымае толькі ахрышчаны мужчына.

Кан. 1025 – § 1. Для таго, каб удзяленне прэзбітэрскага або дыяканскага пасвячэння было дазволеным, патрабуецца, каб кандыдат, які прайшоў выпрабаванне згодна

Can. 1024 – Sacram ordinationem valide recipit solus vir baptizatus.

Can. 1025 – § 1. Ad licite ordines presbyteratus vel diaconatus conferendos requiritur ut candidatus, probatione ad normam iuris peracta, debitis

qualitatibus, iudicio proprii Episcopi aut Superioris maioris competentis, praeditus sit, nulla detineatur irregularitate nulloque impedimento, atque praerequisita, ad normam cann. 1033-1039 adimpleverit; praeterea documenta habeantur, de quibus in can. 1050, atque scrutinium peractum sit, de quo in can. 1051.

з нормамі права, паводле суджэння ўласнага біскупа або кампетэнтнага вышэйшага настаяцеля меў належныя якасці, не быў стрыманы ніякай ірэгулярнасцю і ніякай перашкодай, а таксама задавальняў патрабаванням, адпаведным нормам кан. 1033–1039; акрамя гэтага, павінны быць сабраны дакументы, аб якіх гаворыцца ў кан. 1050, і павінна быць праведзена даследаванне, аб якім гаворыцца ў кан. 1051.

§ 2. Insuper requiritur ut, iudicio eiusdem legitimi Superioris, ad Ecclesiae ministerium utilis habeatur.

§ 2. Акрамя таго, патрабуецца, каб, згодна з суджэннем таго ж легітымнага настаяцеля, ён лічыўся прыдатным для паслугі Касцёла.

§ 3. Episcopo ordinanti proprium subditum, qui servitio alius dioecesis destinetur, constare debet ordinandum huic dioecesi addictum iri.

§ 3. Біскуп, які пасвячае ўласнага падуладнага, прызначанага для служэння ў іншай дыяцэзіі, павінен быць упэўнены ў тым, што той, хто прымае пасвячэнне, будзе прыняты ў гэтую дыяцэзію.

Art. 1. *De requisitis in ordinandis*

Артыкул 1. *Патрабаванні да кандыдатаў*

Can. 1026 – Ut quis ordinetur debita libertate gaudeat oportet; nefas est quemquam, quovis modo, ob quamlibet causam ad ordines recipiendos cogere, vel canonice idoneum ab iisdem recipiendis avertere.

Кан. 1026 – Для таго, каб хто-небудзь мог быць пасвячаны, трэба, каб гэтая асоба мела належную свабоду; нельга нікога любым спосабам і па любой прычыне прымушаць да прыняцця пасвячэння або адводзіць кананічна прыдатнага ад прыняцця пасвячэння.

Can. 1027 – Aspirantes ad diaconatum et presbyteratum accurata praeparatione efformentur, ad normam iuris.

Кан. 1027 – Тыя, хто імкнецца да дыяканату і прэзбітэрату, павінны прайсці фармацыю праз грунтоўную падрыхтоўку згодна з нормамі права.

Can. 1028 – Curet Episcopus dioecesanus aut Superior competens ut candidati, antequam ad ordinem aliquem promoveantur, rite edoceantur de iis, quae ad ordinem eiusque obligationes pertinent.

Кан. 1028 – Дыяцэзіяльны біскуп або кампетэнтны вышэйшы настаяцель павінны паклапаціцца аб тым, каб перад тым, як кандыдаты будуць вылучаны да якога-небудзь пасвячэння, яны былі адпаведна настаўлены ў тым, што датычыць пасвячэння і абавязкаў, якія з яго вынікаюць.

Кан. 1029 – Да пасвячэння павінны быць вылучаны толькі тыя, хто згодна з разважлівым суджэннем уласнага біскупа або кампетэнтнага вышэйшага настаяцеля, якія зважылі ўсе абставіны, маюць праўдзівую веру, кіруюцца адпаведным намерам, маюць належныя веды, карыстаюцца добрай рэпутацыяй, маюць бездакорныя норавы, выпрабаваныя цноты, а таксама іншыя фізічныя і псіхічныя якасці, адпаведныя пасвячэнню, якое яны прымаюць.

Кан. 1030 – Толькі па кананічнай прычыне, не выключаючы таемную, уласны біскуп або кампетэнтны вышэйшы настаяцель могуць забараніць прыняцце пасвячэння ў прэзбітэрат падуладным ім дыяканам, якія прызначаны да прэзбітэрату, пры гэтым захоўваецца магчымасць падачы рэкурсу згодна з нормамі права.

Кан. 1031 – § 1. Прэзбітэрат павінен удзяляцца толькі тым асобам, якія дасягнулі дваццаціпяцігадовага ўзросту і маюць дастатковую сталасць, акрамя таго, павінен захоўвацца шасцімесячны інтэрвал паміж дыяканатам і прэзбітэратам; тыя, хто прызначаны да прэзбітэрату, могуць быць дапушчаны да дыяканату толькі пасля дасягнення дваццацітрохгадовага ўзросту.

§ 2. Нежанатага кандыдата да пастаяннага дыяканату можна дапусціць да яго не раней, чым дасягне дваццаціпяцігадовага ўзросту, а жанатага — не раней, чым яму споўніцца трыццаць пяць гадоў, і са згоды жонкі.

§ 3. Канферэнцыі Біскупаў маюць поўнае права ўстанавіць норму, згодна з якой патрабуецца яшчэ большы ўзрост для прэзбітэрату і пастаяннага дыяканату.

Can. 1029 – Ad ordines ii soli promoveantur qui, prudenti iudicio Episcopi proprii aut Superioris maioris competentis, omnibus perpensis, integram habent fidem, recta moventur intentione, debita pollent scientia, bona gaudent existimatione, integris moribus probatisque virtutibus atque aliis qualitatibus physicis et psychicis ordini recipiendo congruentibus sunt praediti.

Can. 1030 – Nonnisi ex causa canonica, licet occulta, proprius Episcopus vel Superior maior competens diaconis ad presbyteratum destinatis, sibi subditis, ascensum ad presbyteratum interdicere potest, salvo recursu ad normam iuris.

Can. 1031 – § 1. Presbyteratus ne conferatur nisi iis qui aetatis annum vigesimum quintum expleverint et sufficienti gaudeant maturitate, servato insuper intervallo sex saltem mensium inter diaconatum et presbyteratum; qui ad presbyteratum destinantur, ad diaconatus ordinem tantummodo post expletum aetatis annum vigesimum tertium admittantur.

§ 2. Candidatus ad diaconatum permanentem qui non sit uxoratus ad eundem diaconatum ne admittatur, nisi post expletum vigesimum quintum saltem aetatis annum; qui matrimonio coniunctus est, nonnisi post expletum trigesimum quintum saltem aetatis annum, atque de uxoris consensu.

§ 3. Integrum est Episcoporum conferentiis normam statuere, qua provectior ad presbyteratum et ad diaconatum permanentem requiratur aetas.

§ 4. Dispensatio ultra annum super aetate requisita ad normam §§ 1 et 2, Apostolicae Sedi reservatur.

Can. 1032 – § 1. Aspirantes ad presbyteratum promoveri possunt ad diaconatum solummodo post expletum quintum curriculi studiorum philosophico-theologicorum annum.

§ 2. Post expletum studiorum curriculum, diaconus per tempus congruum, ab Episcopo vel a Superiore maiore competenti definiendum, in cura pastorali partem habeat, diaconalem exercens ordinem, antequam ad presbyteratum promoveatur.

§ 3. Aspirans ad diaconatum permanentem, ad hunc ordinem ne promoveatur nisi post expletum formationis tempus.

§ 4. Дыспенсацыя на больш чым адзін год ад узросту, аб якім гаворыцца ў § 1 і 2, зарэзервавана за Апостальскай Сталіцай.

Кан. 1032 – § 1. Тыя, хто імкнецца да прэзбітэрату, могуць быць вылучаны да дыяканату толькі пасля заканчэння пятага года філасофска-тэалагічнага курса навучання.

§ 2. Пасля заканчэння курса навучання, дыякан перад вылучэннем да прэзбітэрату павінен на працягу адпаведнага тэрміну, акрэсленага біскупам або кампетэнтным вышэйшым настаяцелем, браць удзел у душпастырстве, ажыццяўляючы дыяканскае пасвячэнне.

§ 3. Той, хто імкнецца да пастаяннага дыяканату, не павінен вылучацца да гэтага пасвячэння, пакуль не скончыць час фармацыі.

Art. 2. *De praerequisitis ad ordinationem*

Can. 1033 – Licite ad ordines promovetur tantum qui recepit sacrae confirmationis sacramentum.

Can. 1034 – § 1. Ad diaconatum vel presbyteratum aspirans ne ordinetur, nisi prius per liturgicum admissionis ritum ab auctoritate, de qua in cann. 1016 et 1019, adscriptionem inter candidatos obtinuerit post praeviam suam petitionem propria manu exaratam et subscriptam, atque ab eadem auctoritate in scriptis acceptatam.

§ 2. Ad eandem admissionem obtinendam non tenetur, qui per vota in clericale institutum cooptatus est.

Can. 1035 – § 1. Antequam quis ad diaconatum sive permanentem sive transeuntem promoveatur, requi-

Артыкул 2. *Уступныя патрабаванні да пасвячэння*

Кан. 1033 – Толькі той дазволеным чынам вылучаецца да пасвячэння, хто прыняў сакрамэнт святой канфірмацыі.

Кан. 1034 – § 1. Той, хто імкнецца да дыяканату або прэзбітэрату, не павінен быць пасвячаны, калі раней не быў уключаны ўладай, аб якой гаворыцца ў кан. 1016 і 1019, у лік кандыдатаў праз літургічны абрад дапушчэння пасля папярэдняй падачы ўласнаручна напісанага і падпісанага прашэння, а таксама пісьмовага прыняцця гэтай просьбы той жа ўладай.

§ 2. Не абавязаны атрымліваць такое дапушчэнне тыя, хто праз абяцанні былі прыняты ў святарскі інстытут.

Кан. 1035 – § 1. Перад тым, як хто-небудзь будзе вылучаны да пастаяннага або пераходнага дыяканату, патрабуецца, каб

ён прыняў літургічныя паслугі лектара і акаліта і ажыццяўляў іх на працягу адпаведнага часу.

§ 2. Паміж удзяленнем акалітату і дыяканату павінен быць захаваны прынамсі шасцімесячны інтэрвал.

Кан. 1036 – Для таго, каб кандыдат мог быць вылучаны да дыяканату або прэзбітэрату, ён павінен падаць уласнаму біскупу або кампетэнтнаму вышэйшаму настаяцелю заяву, уласнаручна напісаную і падпісаную, у якой засведчыць аб тым, што дабравольна і свабодна хоча прыняць святое пасвячэнне, а таксама аб тым, што назаўсёды аддае сябе касцёльнай паслузе, просячы адначасова аб дапушчэнні яго да прыняцця пасвячэння.

Кан. 1037 – Нежанаты вылучаны да пастаяннага дыяканату, а таксама вылучаны да прэзбітэрату не павінны быць дапушчаны да пасвячэння дыяканату, калі паводле прадпісанага абраду не прымуць публічна перад Богам і Касцёлам абавязак цэлібату або не складуць вечныя абяцанні ў манаскім інстытуце.

Кан. 1038 – Дыякану, які адмаўляецца ад вылучэння да прэзбітэрату, не можа быць забаронена ажыццяўленне прынятага пасвячэння, калі яго не стрымлівае кананічная перашкода або іншая важкая прычына, згодна з суджэннем дыяцэзіяльнага біскупа або кампетэнтнага вышэйшага настаяцеля.

Кан. 1039 – Усе вылучаныя да якога-небудзь пасвячэння абавязаны прыняць удзел у духоўных практыкаваннях на працягу прынамсі пяці дзён, у месцы і паводле парадку, акрэсленага ардынарыем; перад тым, як прыступіць да пасвячэння, біскуп павінен упэўніцца, што кандыдаты належным чынам удзельнічалі ў гэтых практыкаваннях.

ritur ut ministeria lectoris et acolythi receperit et per congruum tempus exercuerit.

§ 2. Inter acolythatus et diaconatus collationem intervallum intercedat sex saltem mensium.

Can. 1036 – Candidatus, ut ad ordinem diaconatus aut presbyteratus promoveri possit, Episcopo proprio aut Superiori maiori competenti declarationem tradat propria manu exaratam et subscriptam, qua testificetur se sponte ac libere sacrum ordinem suscepturum atque se ministerio ecclesiastico perpetuo mancipaturum esse, insimul petens ut ad ordinem recipiendum admittatur.

Can. 1037 – Promovendus ad diaconatum permanentem qui non sit uxoratus, itemque promovendus ad presbyteratum, ad ordinem diaconatus ne admittantur, nisi ritu praescripto publice coram Deo et Ecclesia obligationem caelibatus assumpserint, aut vota perpetua in instituto religioso emiserint.

Can. 1038 – Diaconus, qui ad presbyteratum promoveri renuat, ab ordinis recepti exercitio prohiberi non potest, nisi impedimento detineatur canonico aliave gravi causa, de iudicio Episcopi dioecesani aut Superioris maioris competentis aestimanda.

Can. 1039 – Omnes, qui ad aliquem ordinem promovendi sunt, exercitiis spiritualibus vacent per quinque saltem dies, loco et modo ab Ordinario determinatis; Episcopus, antequam ad ordinationem procedat, certior factus sit oportet candidatos rite iisdem exercitiis vacasse.

Art. 3. *De irregularitatibus aliisque impedimentis*

Can. 1040 – A recipiendis ordinibus arcentur qui quovis impedimento afficiuntur sive perpetuo, quod venit nomine irregularitatis, sive simplici; nullum autem impedimentum contrahitur, quod in canonibus qui sequuntur non contineatur.

Can. 1041 – Ad recipiendos ordines sunt irregulares:

1° qui aliqua forma laborat amentiae aliusve psychicae infirmitatis, qua, consultis peritis, inhabilis iudicatur ad ministerium rite implendum;

2° qui delictum apostasiae, haeresis aut schismatis commiserit;

3° qui matrimonium etiam civile tantum attentaverit, vel ipsemet vinculo matrimoniali aut ordine sacro aut voto publico perpetuo castitatis a matrimonio ineundo impeditus, vel cum muliere matrimonio valido coniuncta aut eodem voto adstricta;

4° qui voluntarium homicidium perpetraverit aut abortum procuraverit, effectu secuto, omnesque positive cooperantes;

5° qui seipsum vel alium graviter et dolose mutilaverit vel sibi vitam adimere tentaverit;

6° qui actum ordinis posuerit constitutis in ordine episcopatus vel presbyteratus reservatum, vel eodem carens, vel ab eius exercitio poena aliqua canonica declarata vel irrogata prohibitus.

Артыкул 3. *Ірэгулярнасці і іншыя перашкоды*

Кан. 1040 – Ад прыняцця пасвячэнняў адхілены тыя, каго стрымлівае любая перашкода: або пастаянная, якая называецца ірэгулярнасцю, або простая; пры гэтым не выклікае наступстваў ніякая перашкода, акрамя змешчаных у наступных канонах.

Кан. 1041 – Ірэгулярнымі да прыняцця пасвячэнняў з'яўляюцца:

1° тыя, хто пакутуюць на любую форму псіхічнага расстройства або іншую псіхічную хваробу, у выніку якой, апіраючыся на заключэнне спецыялістаў, яны лічацца няздольнымі да належнага выконвання паслугі;

2° тыя, хто здзейснілі злачынства апастазіі, ерасі або схізмы;

3° тыя, хто спрабавалі заключыць сужэнства, нават толькі грамадзянскае, пры гэтым або самі маючы перашкоду да заключэння сужэнства па прычыне сужэнскай повязі, ці святога пасвячэння, ці вечнага публічнага абяцання чыстасці або з жанчынай, якая звязана заключэннем дзейснага сужэнства ці такім самым абяцаннем;

4° тыя, хто здзейснілі наўмыснае забойства ці прычыніліся да перарывання цяжарнасці, калі вынік наступіў, а таксама ўсе, хто станоўча ў гэтых дзеяннях саўдзельнічалі;

5° тыя, хто нанеслі сабе або іншай асобе цяжкае і наўмыснае пашкоджанне ці спрабавалі пазбавіць сябе жыцця;

6° тыя, хто выканалі дзеянне ўлады пасвячэння, права на якое зарэзервавана за тымі, хто мае біскупскае ці прэзбітэрскае пасвячэнне, або не маючы пасвячэнняў, або маючы забарону на іх ажыццяўленне па прычыне якога-небудзь сцверджанага ці наложанага пакарання.

Кан. 1042 – Простую перашкоду да прыняцця пасвячэнняў маюць:

1° мужчына, які мае жонку, калі ён не прызначаецца легітымна да пастаяннага дыяканату;

2° той, хто займае пасаду ці ажыццяўляе адміністраванне, з якіх ён павінен складаць справаздачу, забароненыя духоўным асобам згодна з нормамі кан. 285 і 286, пакуль не вызваліцца ад іх, пакінуўшы пасаду і адміністраванне, а таксама здаўшы справаздачу;

3° неафіт, калі, згодна з суджэннем ардынарыя, ён не быў дастаткова выпрабаваны.

Кан. 1043 – Перад удзяленнем пасвячэнняў вернікі маюць абавязак паведаміць ардынарыя або пробашча аб вядомых ім перашкодах да святых пасвячэнняў.

Кан. 1044 – § 1. Ірэгулярнымі да ажыццяўлення прынятых пасвячэнняў з'яўляюцца:

1° тыя, хто ўсё яшчэ будучы пад дзеяннем ірэгулярнасці да прыняцця пасвячэнняў, нелегітымна прынялі пасвячэнні;

2° тыя, хто здзейснілі злачынства, аб якім гаворыцца ў кан. 1041, 2°, калі злачынства з'яўляецца публічным;

3° тыя, хто здзейснілі злачынства, аб якім гаворыцца ў кан. 1041, 3°, 4°, 5°, 6°.

§ 2. Перашкоду ў ажыццяўленні пасвячэнняў маюць:

1° тыя, хто будучы стрыманымі ад прыняцця пасвячэнняў па прычыне перашкоды, нелегітымна прынялі пасвячэнні;

2° тыя, хто пачалі пакутаваць на псіхічнае расстройства або іншую псіхічную хваробу, аб якіх гаворыцца ў кан. 1041, 1°, да таго часу, пакуль ардынарый, апіраючыся на заключэнне спецыялістаў, не дазволіць ажыццяўляць пасвячэнні.

Can. 1042 – Sunt a recipiendis ordinibus simpliciter impediti:

1° vir uxorem habens, nisi ad diaconatum permanentem legitime destinetur;

2° qui officium vel administrationem gerit clericis ad normam cann. 285 et 286 vetitam cuius rationem reddere debet, donec, depositis officio et administratione atque rationibus redditis, liber factus sit;

3° neophytus, nisi, iudicio Ordinarii, sufficienter probatus fuerit.

Can. 1043 – Christifideles obligatione tenentur impedimenta ad sacros ordines, si qua norint, Ordinario vel parocho ante ordinationem revelandi.

Can. 1044 – § 1. Ad exercendos ordines receptos sunt irregulares:

1° qui irregularitate ad ordines recipiendos dum afficiebatur, illegitime ordines recepit;

2° qui delictum commisit, de quo in can. 1041, n. 2, si delictum est publicum;

3° qui delictum commisit, de quibus in can. 1041, nn. 3, 4, 5, 6.

§ 2. Ab ordinibus exercendis impediuntur:

1° qui impedimento ad ordines recipiendos detentus, illegitime ordines recepit;

2° qui amentia aliave infirmitate psychica de qua in can. 1041, n. 1 afficitur, donec Ordinarius, consulto perito, eiusdem ordinis exercitium permiserit.

Can. 1045 – Ignorantia irregularitatum atque impedimentorum ab eisdem non eximit.

Кан. 1045 – Няведанне ірэгулярнасцяў і перашкодаў не вызваляе ад іх.

Can. 1046 – Irregularitates et impedimenta multiplicantur ex diversis eorundem causis, non autem ex repetita eadem causa, nisi agatur de irregularitate ex homicidio voluntario aut ex procurato abortu, effectu secuto.

Кан. 1046 – Ірэгулярнасці і перашкоды памнажаюцца праз разнастайнасць іх прычын, але не праз паўтарэнне той жа прычыны, калі гаворка не ідзе пра ірэгулярнасць, якая з'яўляецца наступствам наўмыснага забойства ці прычынення да перарывання цяжарнасці, калі вынік наступіў.

Can. 1047 – § 1. Uni Apostolicae Sedi reservatur dispensatio ab omnibus irregularitatibus, si factum quo innituntur ad forum iudiciale deductum fuerit.

Кан. 1047 – § 1. За адной толькі Апостальскай Сталіцай зарэзервавана дыспенсацыя ад усіх ірэгулярнасцяў, калі факт, на якім яны засноўваюцца, быў вынесены на судовы разгляд.

§ 2. Eidem etiam reservatur dispensatio ab irregularitatibus et impedimentis ad ordines recipiendos, quae sequuntur:

1° ab irregularitatibus ex delictis publicis, de quibus in can. 1041, nn. 2 et 3;

2° ab irregularitate ex delicto sive publico sive occulto, de quo in can. 1041, n. 4;

3° ab impedimento, de quo in can. 1042, n. 1.

§ 2. За ёй таксама зарэзервавана дыспенсацыя ад наступных ірэгулярнасцяў і перашкодаў да прыняцця пасвячэнняў:

1° ад ірэгулярнасцяў, якія з'яўляецца наступствам публічных злачынстваў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1041, 2° і 3°;

2° ад ірэгулярнасці, якая з'яўляецца наступствам публічнага або таемнага злачынства, аб якім гаворыцца ў кан. 1041, 4°;

3° ад ірэгулярнасці, аб якой гаворыцца ў кан. 1042, 1°.

§ 3. Apostolicae Sedi etiam reservatur dispensatio ab irregularitatibus ad exercitium ordinis suscepti, de quibus in can. 1041, n. 3, in casibus publicis tantum, atque in eodem canone, n. 4, etiam in casibus occultis.

§ 3. За Апостальскай Сталіцай зарэзервавана таксама дыспенсацыя ад ірэгулярнасці да ажыццяўлення прынятага пасвячэння, аб якой гаворыцца ў кан. 1041, 3°, але толькі ў публічных выпадках, і ад той, аб якой гаворыцца ў кан. 1041, 4°, таксама ў таемных выпадках.

§ 4. Ab irregularitatibus et impedimentis Sanctae Sedi non reservatis dispensare valet Ordinarius.

§ 4. Ад ірэгулярнасцяў і перашкодаў, дыспенсацыя ад якіх не зарэзервавана за Апостальскай Сталіцай, можа дыспенсаваць ардынарый.

Can. 1048 – In casibus occultis urgentioribus, si adiri nequeat Ordinarius aut cum de irregularitatibus

Кан. 1048 – У неадкладных таемных выпадках, калі няма магчымасці звярнуцца да ардынарыя або ў Пэнітэнцыярыю, калі

гаворка ідзе пра ірэгулярнасці, аб якіх гаворыцца ў кан. 1041, 3° і 4°, і калі пагражае небяспека цяжкай шкоды або ганьбы, той, хто па прычыне ірэгулярнасці мае перашкоду да ажыццяўлення пасвячэння, можа яго ажыццяўляць, аднак з захаваннем абавязку як мага хутчэй звярнуцца да ардынарыя або ў Пэнітэнцыярыю, не ўказваючы свайго імя і праз спаведніка.

Кан. 1049 – § 1. У прашэнні аб удзяленні дыспенсацыі ад ірэгулярнасцяў і перашкодаў павінны быць указаны ўсе ірэгулярнасці і перашкоды; аднак агульная дыспенсацыя з'яўляецца дзейснай таксама ў адносінах да ненаўмысна не ўказаных, выключаючы тыя, аб якіх гаворыцца ў кан. 1041, 4°, а таксама тыя, якія былі скіраваны на судовы разгляд; аднак такая дыспенсацыя не ахоплівае ірэгулярнасці і перашкоды, не ўказаныя наўмысна.

§ 2. Калі гаворка ідзе пра ірэгулярнасць, якая з'яўляецца наступствам наўмыснага забойства ці прычынення да перарывання цяжарнасці, калі вынік наступіў, для дзейснасці дыспенсацыі патрабуецца ўказаць таксама лічбу злачынстваў.

§ 3. Агульная дыспенсацыя ад ірэгулярнасцяў і перашкодаў да прыняцця пасвячэнняў, з'яўляецца дзейснай у адносінах да ўсіх пасвячэнняў.

agatur de quibus in can. 1041, nn. 3 et 4, Paenitentiaria, et si periculum immineat gravis damni aut infamiae, potest qui irregularitate ab ordine exercendo impeditur eundem exercere, firmo tamen manente onere quam primum recurrendi ad Ordinarium aut Paenitentiariam, reticito nomine et per confessarium.

Can. 1049 – § 1. In precibus ad obtinendam irregularitatum et impedimentorum dispensationem, omnes irregularitates et impedimenta indicanda sunt; attamen, dispensatio generalis valet etiam pro reticitis bona fide, exceptis irregularitatibus de quibus in can. 1041, n. 4, aliisve ad forum iudiciale deductis, non autem pro reticitis mala fide.

§ 2. Si agatur de irregularitate ex voluntario homicidio aut ex procurato abortu, etiam numerus delictorum ad validitatem dispensationis exprimendus est.

§ 3. Dispensatio generalis ab irregularitatibus et impedimentis ad ordines recipiendos valet pro omnibus ordinibus.

Артыкул 4. *Неабходныя дакументы і даследаванне*

Кан. 1050 – Для таго, каб хто-небудзь мог быць вылучаны да святога пасвячэння, патрабуюцца наступныя дакументы:

1° пасведчанне аб навучанні, закончаным належным чынам згодна з нормай кан. 1032;

Art. 4. *De documentis requisitis et de scrutinio*

Can. 1050 – Ut quis ad sacros ordines promoveri possit, sequentia requiruntur documenta:

1° testimonium de studiis rite peractis ad normam can. 1032;

2° si agatur de ordinandis ad presbyteratum, testimonium recepti diaconatus;

3° si agatur de promovendis ad diaconatum, testimonium recepti baptismi et confirmationis, atque receptorum ministeriorum de quibus in can. 1035; item testimonium factae declarationis de qua in can. 1036, necnon, si ordinandus qui promovendus est ad diaconatum permanentem sit uxoratus, testimonia celebrati matrimonii et consensus uxoris.

2° калі гаворка ідзе пра пасвячэнне ў прэзбітэрат — пасведчанне аб прыняцці дыяканату;

3° калі гаворка ідзе пра вылучаных да дыяканату — пасведчанне аб прыняцці хросту і канфірмацыі, а таксама аб прыняцці літургічных паслугаў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1035; таксама патрабуецца пасведчанне аб падачы заявы, аб якой гаворыцца ў кан. 1036; калі ж пасвячэнне будзе ўдзяляцца жанатаму вылучанаму да пастаяннага дыяканату, патрабуецца, акрамя гэтага, пасведчанне аб заключэнні сужэнства і згода жонкі.

Can. 1051 – Ad scrutinium de qualitatibus in ordinando requisitis quod attinet, serventur praescripta quae sequuntur:

1° habeatur testimonium rectoris seminarii vel domus formationis de qualitatibus ad ordinem recipiendum requisitis, scilicet de candidati recta doctrina, genuina pietate, bonis moribus, aptitudine ad ministerium exercendum; itemque, rite peracta inquisitione, de eius statu valetudinis physicae et psychicae;

2° Episcopus dioecesanus aut Superior maior, ut scrutinium rite peragatur, potest alia adhibere media quae sibi, pro temporis et loci adiunctis, utilia videantur, uti sunt litterae testimoniales, publicationes vel aliae informationes.

Кан. 1051 – Што датычыць даследавання якасцяў, якія патрабуюцца ад таго, хто павінен прыняць пасвячэнне, павінны захоўвацца наступныя прадпісанні:

1° павінна быць пасведчанне рэктара семінарыі або фармацыйнага дома аб якасцях, якія патрабуюцца для прыняцця пасвячэння, а менавіта: аб бездакорным вучэнні кандыдата, шчырай пабожнасці, добрых норавах і адпаведнасці да ажыццяўлення паслугі; акрамя таго, павінна быць пасведчанне аб стане яго фізічнага і псіхічнага здароўя, выдадзенае пасля правядзення належнага абследавання;

2° з мэтай належнага правядзення даследавання дыяцэзіяльны біскуп або вышэйшы настаяцель могуць выкарыстаць таксама іншыя сродкі, якія палічаць карыснымі ў залежнасці ад акалічнасцяў часу і месца, напрыклад: пісьмовыя сведчанні, абвяшчэнні або іншыя крыніцы інфармацыі.

Can. 1052 – § 1. Ut Episcopus ordinationem iure proprio conferens ad eam procedere possit, ipsi constare debet

Кан. 1052 – § 1. Для таго, каб біскуп, які на падставе ўласнага права ўдзяляе пасвячэнне, мог прыступіць да яго ўдзялення, ён

павінен упэўніцца ў тым, што былі сабраны тыя дакументы, аб якіх гаворыцца ў кан. 1050, а таксама ў тым, што пасля даследавання, праведзенага згодна з нормамі права, прыдатнасць кандыдата была даказана станоўчымі аргументамі.

§ 2. Для таго, каб біскуп мог прыступіць да пасвячэння чужога падуладнага, дастаткова, каб у дымісарыйным лісце паведамлялася, што гэтыя дакументы былі сабраны, што даследаванне было праведзена згодна з нормамі права і што існуе ўпэўненасць адносна прыдатнасці кандыдата; калі ж вылучаны з'яўляецца членам манаскага інстытута або таварыства апостальскага жыцця, дымісарыйны ліст, апрача гэтага, павінен пасведчыць тое, што кандыдат быў канчаткова ўключаны ў інстытут або таварыства і з'яўляецца падуладным настаяцеля, які выдаў гэты ліст.

§ 3. Калі, нягледзячы на ўсё гэта, з увагі на акрэсленыя прычыны біскуп мае сумненні адносна таго, ці з'яўляецца кандыдат прыдатным да прыняцця пасвячэння, не павінен яго пасвячаць.

documenta, de quibus in can. 1050, praesto esse atque, scrutinio ad normam iuris peracto, idoneitatem candidati positivis argumentis esse probatam.

§ 2. Ut Episcopus ad ordinationem procedat alieni subditi, sufficit ut litterae dimissoriae referant eadem documenta praesto esse, scrutinium ad normam iuris esse peractum atque de idoneitate candidati constare; quod si promovendus sit sodalis instituti religiosi aut societatis vitae apostolicae, eaedem litterae insuper testari debent ipsum in institutum vel societatem definitive cooptatum fuisse et esse subditum Superioris qui dat litteras.

§ 3. Si, his omnibus non obstantibus, ob certas rationes Episcopus dubitat num candidatus sit idoneus ad ordines recipiendos, eundem ne promoveat.

Раздзел III

Рэгістрацыя і пасведчанне здзейсненага пасвячэння

Кан. 1053 – § 1. Пасля здзейсненага пасвячэння, у асаблівай кнізе, якая павінна старанна зберагацца ў Курыі месца пасвячэння, павінны быць запісаны імёны кожнага пасвячанага і служыцеля пасвячэння, месца і дзень пасвячэння; таксама павінны дбайна захоўвацца ўсе дакументы, якія адносяцца да кожнага пасвячэння.

§ 2. Біскуп, які ўдзяліў пасвячэнне, павінен выдаць кожнаму пасвячанаму аўтэнтычнае пасведчанне аб прынятым па-

Caput III

De adnotatione ac testimonio peractae ordinationis

Can. 1053 – § 1. Expleta ordinatione, nomina singulorum ordinatorum ac ministri ordinantis, locus et dies ordinationis notentur in peculiari libro apud curiam loci ordinationis diligenter custodiendo, et omnia singularum ordinationum documenta accurate serventur.

§ 2. Singulis ordinatis det Episcopus ordinans authenticum ordinationis receptae testimonium; qui,

si ab Episcopo extraneo cum litteris dimissoriis promoti fuerint, illud proprio Ordinario exhibeant pro ordinationis adnotatione in speciali libro in archivo servando.

свячэнні; тыя, хто былі пасвячаны чужым біскупам на падставе дымісарыйнага ліста, павінны прадставіць гэтае пасведчанне ўласнаму ардынарыю для таго, каб у спецыяльнай кнізе, якая захоўваецца ў архіве, мог быць зроблены запіс аб пасвячэнні.

Can. 1054 – Loci Ordinarius, si agatur de saecularibus, aut Superior maior competens, si agatur de ipsius subditis, notitiam uniuscuiusque celebratae ordinationis transmittat ad parochum loci baptismi, qui id adnotet in suo baptizatorum libro, ad normam can. 535, § 2.

Кан. 1054 – Ардынарый месца — калі гаворка ідзе пра секулярных духоўных асобаў, або кампетэнтны вышэйшы настаяцель — калі гаворка ідзе пра яго падуладных, павінны пераслаць паведамленне аб кожным пасвячэнні, якое цэлебравалася, пробашчу месца хросту, які павінен зрабіць запіс аб гэтым у сваёй кнізе ахрышчаных, згодна з нормай кан. 535 § 2.

TITULUS VII
DE MATRIMONIO

ТЫТУЛ VII
СУЖЭНСТВА

Can. 1055 – § 1. Matrimoniale foedus, quo vir et mulier inter se totius vitae consortium constituunt, indole sua naturali ad bonum coniugum atque ad prolis generationem et educationem ordinatum, a Christo Domino ad sacramenti dignitatem inter baptizatos evectum est.

Кан. 1055 – § 1. Сужэнскі саюз, праз які мужчына і жанчына ўтвараюць паміж сабой супольнасць усяго жыцця, скіраваную па сваёй прыродзе да дабра сужэнцаў, а таксама да нараджэння і выхавання патомства, паміж ахрышчанымі быў Хрыстом Панам узведзены ў годнасць сакрамэнту.

§ 2. Quare inter baptizatos nequit matrimonialis contractus validus consistere, quin sit eo ipso sacramentum.

§ 2. Таму паміж ахрышчанымі не можа існаваць дзейсны сужэнскі дагавор, які тым самым не быў бы сакрамэнтам.

Can. 1056 – Essentiales matrimonii proprietates sunt unitas et indissolubilitas, quae in matrimonio christiano ratione sacramenti peculiarem obtinent firmitatem.

Кан. 1056 – Істотнымі ўласцівасцямі сужэнства з'яўляюцца яго еднасць і нескасавальнасць, якія ў хрысціянскім сужэнстве набываюць асаблівую моц з увагі на сакрамэнт.

Can. 1057 – § 1. Matrimonium facit partium consensus inter personas iure habiles legitime manifestatus, qui nulla humana potestate suppleri valet.

Кан. 1057 – § 1. Сужэнства ўтвараецца паміж асобамі, дзеяздольнымі згодна з правам, згодай бакоў, якая была легітымна выяўлена, і гэтую згоду не можа дапоўніць ніякая чалавечая ўлада.

§ 2. Consensus matrimonialis est actus voluntatis, quo vir et mulier foe-

§ 2. Сужэнская згода — гэта дзеянне волі, праз якое мужчына і жанчына ў не-

адклікальным саюзе ўзаемна аддаюцца адно аднаму і прымаюць адно аднаго для ўтварэння сужэнства.

Кан. 1058 – Заключыць сужэнства могуць усе, каму гэта не забараняецца правам.

Кан. 1059 – Сужэнства католікаў, нават калі толькі адзін з бакоў з'яўляецца каталіцкім, кіруецца не толькі Божым правам, але таксама кананічным, захоўваючы кампетэнцыі дзяржаўнай улады адносна чыста грамадзянскіх наступстваў гэтага сужэнства.

Кан. 1060 – Сужэнства карыстаецца прыхільнасцю права; таму ў выпадку сумнення сужэнства павінна лічыцца дзейсным, пакуль не будзе даказана адваротнае.

Кан. 1061 – § 1. Дзейснае сужэнства паміж ахрышчанымі называецца толькі заключаным, калі яно яшчэ не было здзейснена; заключаным і здзейсненым — калі сужэнцы па-чалавечы здзейснілі паміж сабой сужэнскае дзеянне, прыдатнае само па сабе для нараджэння патомства; сужэнства па сваёй прыродзе скіравана да гэтага дзеяння, праз якое сужэнцы становяцца адным целам.

§ 2. Калі пасля заключэння сужэнства сужэнцы жылі разам, мяркуецца, што сужэнства было здзейснена, пакуль не будзе даказана адваротнае.

§ 3. Нядзейснае сужэнства называецца такім, якое лічыцца дзейсным, калі прынамсі адзін з бакоў заключаў яго добрасумленна, і з'яўляецца такім, пакуль абодва бакі не ўпэўняцца ў яго нядзейснасці.

Кан. 1062 – § 1. Абяцанне заключыць сужэнства, аднабаковае ці двухбаковае, якое называюць заручынамі, кіруецца партыкулярным правам, устаноўленым Канферэнцыяй Біскупаў з улікам звычаяў і дзяржаўных законаў, калі такія існуюць.

dere irrevocabili sese mutuo tradunt et accipiunt ad constituendum matrimonium.

Can. 1058 – Omnes possunt matrimonium contrahere, qui iure non prohibentur.

Can. 1059 – Matrimonium catholicorum, etsi una tantum pars sit catholica, regitur iure non solum divino, sed etiam canonico, salva competentia civilis potestatis circa mere civiles eiusdem matrimonii effectus.

Can. 1060 – Matrimonium gaudet favore iuris; quare in dubio standum est pro valore matrimonii, donec contrarium probetur.

Can. 1061 – § 1. Matrimonium inter baptizatos validum dicitur ratum tantum, si non est consummatum; ratum et consummatum, si coniuges inter se humano modo posuerunt coniugalem actum per se aptum ad prolis generationem, ad quem natura sua ordinatur matrimonium, et quo coniuges fiunt una caro.

§ 2. Celebrato matrimonio, si coniuges cohabitaverint, praesumitur consummatio, donec contrarium probetur.

§ 3. Matrimonium invalidum dicitur putativum, si bona fide ab una saltem parte celebratum fuerit, donec utraque pars de eiusdem nullitate certa evadat.

Can. 1062 – § 1. Matrimonii promissio sive unilateralis sive bilateralis, quam sponsalia vocant, regitur iure particulari, quod ab Episcoporum conferentia, habita ratione consuetudinum et legum civilium, si quae sint, statutum fuit.

§ 2. Ex matrimonii promissione non datur actio ad petendam matrimonii celebrationem; datur tamen ad reparationem damnorum, si qua debeatur.

§ 2. Абяцанне заключыць сужэнства не дае права на зварот з позвай аб заключэнні сужэнства; аднак дае права на позву аб пакрыцці шкоды, калі гэта патрабуецца.

Caput I

De cura pastorali et de iis quae matrimonii celebrationi praemitti debent

Раздзел I

Пастырская апека і дзеянні, якія павінны папярэднічаць заключэнню сужэнства

Can. 1063 – Pastores animarum obligatione tenentur curandi ut propria ecclesiastica communitas christifidelibus assistentiam praebeat, qua status matrimonialis in spiritu christiano servetur et in perfectione progrediatur. Haec assistentia imprimis praebenda est:

1° praedicatione, catechesi minoribus, iuvenibus et adultis aptata, immo usu instrumentorum communicationis socialis, quibus christifideles de significatione matrimonii christiani deque munere coniugum ac parentum christianorum instituantur;

2° praeparatione personali ad matrimonium ineundum, qua spon-si ad novi sui status sanctitatem et officia disponantur;

3° fructuosa liturgica matrimonii celebratione, qua eluceat coniuges mysterium unitatis et fecundi amoris inter Christum et Ecclesiam significare atque participare;

4° auxilio coniugatis praestito, ut ipsi foedus coniugale fideliter servantes atque tuentes, ad sanctiorem in dies plenioremque in familia vitam ducendam perveniant.

Кан. 1063 – Душпастыры маюць абавязак клапаціцца аб тым, каб уласная касцёльная супольнасць аказвала вернікам падтрымку, дзякуючы якой сужэнскі стан будзе захоўвацца ў хрысціянскім духу і развівацца да дасканаласці. Перадусім гэтая падтрымка павінна быць аказана:

1° праз прапаведаванне, катэхізацыю, дастасаваную да дзяцей, падлеткаў і дарослых, у тым ліку праз сродкі сацыяльнай камунікацыі, дзякуючы чаму вернікі павінны быць павучаны аб значэнні хрысціянскага сужэнства і заданнях хрысціянскіх сужэнцаў і бацькоў;

2° праз асабістую падрыхтоўку да заключэння сужэнства, у якой нарачоныя рыхтуюцца да святасці і абавязкаў свайго новага стану;

3° праз плённую літургічную цэлебрацыю сужэнства, якая паказвае, што сужэнцы з'яўляюцца знакам і прымаюць удзел у таямніцы еднасці і плоднай любові Хрыста і Касцёла;

4° праз дапамогу, якая аказваецца сужэнцам, каб яны, верна захоўваючы і аберагаючы сужэнскі саюз, імкнуліся да вядзення ўсё больш святога і дасканалага жыцця ў штодзённасці сям'і.

Can. 1064 – Ordinarii loci est curare ut debite ordinetur eadem assistentia,

Кан. 1064 – Абавязкам ардынарыя месца з'яўляецца клопат аб тым, каб гэтая пад-

трымка была арганізавана належным чынам, выслухаўшы, калі гэта будзе бачыцца дарэчным, таксама мужчын і жанчын з выпрабаваным досведам і ведамі.

Кан. 1065 – § 1. Католікі, якія яшчэ не прынялі сакрамэнт канфірмацыі, павінны прыняць яго перад дапушчэннем да сужэнства, калі гэта магчыма зрабіць без сур'ёзных цяжкасцяў.

§ 2. Для таго, каб сакрамэнт сужэнства быў прыняты плённа, вельмі рэкамендуецца, каб нарачоныя прыступілі да сакрамэнтаў пакаяння і Найсвяцейшай Эўхарыстыі.

Кан. 1066 – Перад цэлебрацыяй сужэнства трэба ўпэўніцца ў тым, што нічога не перашкаджае яго дзейснай і дазволенай цэлебрацыі.

Кан. 1067 – Канферэнцыя Біскупаў павінна ўстанавіць нормы адносна апытання нарачоных, а таксама адносна сужэнскіх абвяшчэнняў або іншых сродкаў, прыдатных для правядзення даследавання перад сужэнствам, неабходнага, каб пробашч, старанна захоўваючы гэтыя нормы, мог прыступіць да асіставання пры сужэнстве.

Кан. 1068 – У небяспецы смерці, калі немагчыма заручыцца іншымі доказамі, дастаткова — калі няма падазрэнняў у супраціўным — сведчання нарачоных, зробленага, калі трэба, пад прысягай, аб тым, што яны з'яўляюцца ахрышчанымі і не стрыманы ніякай перашкодай.

Кан. 1069 – Усе вернікі маюць абавязак паведаміць пробашча або ардынарыя месца перад заключэннем сужэнства аб перашкодах, калі яны ім вядомыя.

Кан. 1070 – Калі даследаванне праводзіў не пробашч, які мае права асіставаць пры сужэнстве, а іншая асоба, яна павінна як мага

auditis etiam, si opportunum videatur, viris et mulieribus experientia et peritia probatis.

Can. 1065 – § 1. Catholici qui sacramentum confirmationis nondum receperint, illud, antequam ad matrimonium admittantur, recipiant, si id fieri possit sine gravi incommodo.

§ 2. Ut fructuose sacramentum matrimonii recipiatur, enixe sponsis commendatur, ut ad sacramenta paenitentiae et sanctissimae Eucharistiae accedant.

Can. 1066 – Antequam matrimonium celebretur, constare debet nihil eius validae ac licitae celebrationi obsistere.

Can. 1067 – Episcoporum conferentia statuat normas de examine sponsorum, necnon de publicationibus matrimonialibus aliisve opportunis mediis ad investigationes peragendas, quae ante matrimonium necessaria sunt, quibus diligenter observatis, parochus procedere possit ad matrimonio assistendum.

Can. 1068 – In periculo mortis, si aliae probationes haberi nequeant, sufficit, nisi contraria adsint indicia, affirmatio contrahentium, si casus ferat etiam iurata, se baptizatos esse et nullo detineri impedimento.

Can. 1069 – Omnes fideles obligatione tenentur impedimenta, si quae norint, parocho aut loci Ordinario, ante matrimonii celebrationem, revelandi.

Can. 1070 – Si alius quam parochus, cuius est assistere matrimonio, investigationes peregerit, de harum exitu

quam primum per authenticum documentum eundem parochum certiorem reddat.

Can. 1071 – § 1. Excepto casu necessitatis, sine licentia Ordinarii loci ne quis assistat:

1° matrimonio vagorum;

2° matrimonio quod ad normam legis civilis agnosci vel celebrari nequeat;

3° matrimonio eius qui obligationibus teneatur naturalibus erga aliam partem filiosve ex praecedenti unione ortis;

4° matrimonio eius qui notorie catholicam fidem abiecerit;

5° matrimonio eius qui censura innodatus sit;

6° matrimonio filii familias minoris, insciis aut rationabiliter invitis parentibus;

7° matrimonio per procuratorem ineundo, de quo in can. 1105.

§ 2. Ordinarius loci licentiam assistendi matrimonio eius qui notorie catholicam fidem abiecerit ne concedat, nisi servatis normis de quibus in can. 1125, congrua congruis referendo.

Can. 1072 – Curent animarum pastores a matrimonii celebratione avertere iuvenes ante aetatem, qua secundum regionis receptos mores matrimonium iniri solet.

хутчэй аўтэнтычным дакументам паведаміць пробашча аб выніках гэтага даследавання.

Кан. 1071 – § 1. За выключэннем выпадку неабходнасці, нельга без дазволу ардынарыя месца асіставаць:

1° пры сужэнстве бадзяжных;

2° пры сужэнстве, якое не можа быць прызнана або заключана згодна з нормамі дзяржаўнага права;

3° пры сужэнстве таго, хто ў адносінах да іншага боку ці да дзяцей мае натуральныя абавязкі, якія вынікаюць з папярэдняга саюзу;

4° пры сужэнстве таго, хто юрыдычна пацверджаным чынам выракся каталіцкай веры;

5° пры сужэнстве таго, хто звязаны цэнзурай;

6° пры сужэнстве непаўналетняга, калі бацькі аб гэтым не ведаюць або маюць разумны супраціў адносна заключэння гэтага сужэнства;

7° пры сужэнстве, якое заключаецца праз прадстаўніка, аб якім гаворыцца ў кан. 1105.

§ 2. Ардынарый месца не павінен удзяляць дазвол на асіставанне пры сужэнстве таго, хто юрыдычна пацверджаным чынам выракся каталіцкай веры, калі не з захаваннем з адпаведнымі папраўкамі нормаў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1125.

Кан. 1072 – Душпастыры павінны клапаціцца аб тым, каб адводзіць ад заключэння сужэнства моладзь, якая яшчэ не дасягнула таго ўзросту, у якім заключаюць сужэнства ў адпаведнасці з норавамі, прынятымі ў дадзеным рэгіёне.

Раздзел II

ПЕРАШКОДЫ, ЯКІЯ ВЫКЛІКАЮЦЬ НЯДЗЕЙСНАСЦЬ, НАОГУЛ

Кан. 1073 – Перашкода, якая выклікае нядзейснасць, робіць асобу няздольнай да заключэння дзейснага сужэнства.

Кан. 1074 – Перашкода лічыцца публічнай, калі можа быць даказана на *forum externum*; у іншым выпадку перашкода з'яўляецца таемнай.

Кан. 1075 – § 1. Толькі вярхоўная ўлада Касцёла мае права на аўтэнтычнае высвятленне таго, калі менавіта Божае права забараняе сужэнства або робіць яго нядзейсным.

§ 2. Таксама толькі вярхоўная ўлада мае права ўстанаўліваць іншыя перашкоды ў адносінах да ахрышчаных.

Кан. 1076 – Звычай, які ўводзіць новую перашкоду або супярэчыць існуючым перашкодам, адхіляецца.

Кан. 1077 – § 1. Ардынарый месца можа ў асаблівых выпадках забараніць заключэнне сужэнства сваім падуладным, дзе б яны ні прабывалі, а таксама ўсім, хто актуальна пражывае на яго тэрыторыі, аднак толькі на акрэслены час і па важкай прычыне, пакуль яна трывае.

§ 2. Толькі вярхоўная ўлада Касцёла можа дадаваць кляўзулу, якая выклікае нядзейснасць сужэнства.

Кан. 1078 – § 1. Ардынарый месца можа ўдзяляць дыспенсацыю сваім падуладным, дзе б яны ні прабывалі, а таксама ўсім, хто актуальна пражывае на яго тэрыторыі, ад усіх перашкодаў, прадугледжаных касцёльным правам, за выключэннем тых, дыспенсацыя ад якіх зарэзервавана за Апостальскай Сталіцай.

Caput II

DE IMPEDIMENTIS DIRIMENTIBUS IN GENERE

Can. 1073 – Impedimentum dirimens personam inhabilem reddit ad matrimonium valide contrahendum.

Can. 1074 – Publicum censetur impedimentum, quod probari in foro externo potest; secus est occultum.

Can. 1075 – § 1. Supremae tantum Ecclesiae auctoritatis est authentice declarare quandonam ius divinum matrimonium prohibeat vel dirimat.

§ 2. Uni quoque supremae auctoritati ius est alia impedimenta pro baptizatis constituere.

Can. 1076 – Consuetudo novum impedimentum inducens aut impedimentis exsistentibus contraria reprobatur.

Can. 1077 – § 1. Ordinarius loci propriis subditis ubique commorantibus et omnibus in proprio territorio actu degentibus vetare potest matrimonium in casu peculiari, sed ad tempus tantum, gravi de causa eaque perdurante.

§ 2. Vetito clausulam dirimentem una suprema Ecclesiae auctoritas addere potest.

Can. 1078 – § 1. Ordinarius loci proprios subditos ubique commorantes et omnes in proprio territorio actu degentes ab omnibus impedimentis iuris ecclesiastici dispensare potest, exceptis iis, quorum dispensatio Sedi Apostolicae reservatur.

§ 2. Impedimenta quorum dispensatio Sedi Apostolicae reservatur sunt:

1° impedimentum ortum ex sacris ordinibus aut ex voto publico perpetuo castitatis in instituto religioso iuris pontificii;

2° impedimentum criminis de quo in can. 1090.

§ 3. Numquam datur dispensatio ab impedimento consanguinitatis in linea recta aut in secundo gradu lineae collateralis.

Can. 1079 – § 1. Urgente mortis periculo, loci Ordinarius potest tum super forma in matrimonii celebratione servanda, tum super omnibus et singulis impedimentis iuris ecclesiastici sive publicis sive occultis, dispensare proprios subditos ubique commorantes et omnes in proprio territorio actu degentes, excepto impedimento orto ex sacro ordine presbyteratus.

§ 2. In eisdem rerum adiunctis, de quibus in § 1, sed solum pro casibus in quibus ne loci quidem Ordinarius adiri possit, eadem dispensandi potestate pollet tum parochus, tum minister sacer rite delegatus, tum sacerdos vel diaconus qui matrimonio, ad normam can. 1116, § 2, assistit.

§ 3. In periculo mortis confessarius gaudet potestate dispensandi ab impedimentis occultis pro foro interno sive intra sive extra actum sacramentalis confessionis.

§ 4. In casu de quo in § 2, loci Ordinarius censetur adiri non posse, si tantum per telegraphum vel telephonum id fieri possit.

Can. 1080 – § 1. Quoties impedimentum detegatur cum iam omnia sunt

§ 2. Перашкодамі, дыспенсацыя ад якіх зарэзервавана за Апостальскай Сталіцай, з'яўляюцца:

1° перашкода, якая вынікае са святога пасвячэння або вечнага публічнага абяцання чыстасці, складзенага ў манаскім інстытуце папскага права;

2° перашкода злачынства, аб якім гаворыцца ў кан. 1090.

§ 3. Ніколі не ўдзяляецца дыспенсацыя ад перашкоды роднасці ў прамой лініі або ў другой ступені бакавой лініі.

Кан. 1079 – § 1. У небяспецы смерці ардынарый месца сваім падуладным, дзе б яны ні прабывалі, а таксама ўсім, хто актуальна пражывае на яго тэрыторыі, можа ўдзяліць дыспенсацыю як ад формы, якая павінна быць захавана пры цэлебрацыі сужэнства, так і ад усіх і кожнай з перашкодаў, прадугледжаных касцёльным правам, публічных або таемных, за выключэннем перашкоды, якая вынікае з прыняцця пасвячэння прэзбітэрату.

§ 2. У такіх жа абставінах, аб якіх гаворыцца ў § 1, але толькі ў выпадках, калі немагчыма звярнуцца да ардынарыя месца, такую ж уладу ўдзялення дыспенсацыі маюць як пробашч, так і належным чынам дэлегаваны святы служыцель, а таксама святар або дыякан, які асістуе пры заключэнні сужэнства згодна з нормай кан. 1116 § 2.

§ 3. У небяспецы смерці спаведнік мае ўладу ўдзялення дыспенсацыі ад таемных перашкодаў на *forum internum*, як падчас сакрамэнтальнай споведзі, так і па-за ёй.

§ 4. У выпадку, аб якім гаворыцца ў § 2, лічыцца, што немагчыма звярнуцца да ардынарыя месца, калі гэта можна зрабіць толькі праз тэлеграф або тэлефон.

Кан. 1080 – § 1. Заўсёды, калі перашкода выкрываецца тады, калі ўжо ўсё падрыхта-

вана да вяселля і сужэнства не можа быць адкладзена да часу атрымання дыспенсацыі ад кампетэнтнай улады без абгрунтаванай небяспекі вялікага зла, дыспенсацыю ад усіх перашкодаў, за выключэннем тых, аб якіх гаворыцца ў кан. 1078 § 2, 1°, можа ўдзяліць ардынарый месца і, калі выпадак з'яўляецца таемным, усе, аб кім гаворыцца ў кан. 1079 § 2–3, захоўваючы прадпісаныя там умовы.

§ 2. Гэтая ўлада распаўсюджваецца таксама на канвалідацыю сужэнства, калі затрымка пагражае той жа небяспекай і час не дазваляе звярнуцца да Апостальскай Сталіцы або да ардынарыя месца, калі гаворка ідзе пра перашкоды, ад якіх ён мае права дыспенсаваць.

Кан. 1081 – Пробашч, святар або дыякан, аб якіх гаворыцца ў кан. 1079 § 2, павінны неадкладна паведаміць ардынарыя месца аб дыспенсацыі, удзеленай на *forum externum*; аб гэтым павінен быць зроблены запіс у кнізе сужэнстваў.

Кан. 1082 – Калі ў рэскрыпце Пэнітэнцыярыі не пастанаўляецца іншае, то запіс аб дыспенсацыі, удзеленай на несакрамэнтальным *forum internum* ад таемнай перашкоды, павінен быць зроблены ў кнізе, якая павінна захоўвацца ў тайным архіве Курыі; калі потым таемная перашкода стане публічнай, ніякая іншая дыспенсацыя на *forum externum* не будзе патрэбна.

parata ad nuptias, nec matrimonium sine probabili gravis mali periculo differri possit usquedum a competenti auctoritate dispensatio obtineatur, potestate gaudent dispensandi ab omnibus impedimentis, iis exceptis de quibus in can. 1078, § 2, n. 1, loci Ordinarius et, dummodo casus sit occultus, omnes de quibus in can. 1079, §§ 2-3, servatis condicionibus ibidem praescriptis.

§ 2. Haec potestas valet etiam ad matrimonium convalidandum, si idem periculum sit in mora nec tempus suppetat recurrendi ad Sedem Apostolicam vel ad loci Ordinarium, quod attinet ad impedimenta a quibus dispensare valet.

Can. 1081 – Parochus aut sacerdos vel diaconus, de quibus in can. 1079, § 2, de concessa dispensatione pro foro externo Ordinarium loci statim certiorem faciat; eaque adnotetur in libro matrimoniorum.

Can. 1082 – Nisi aliud ferat Paenitentiariae rescriptum, dispensatio in foro interno non sacramentali concessa super impedimento occulto, adnotetur in libro, qui in secreto curiae archivo asservandus est, nec alia dispensatio pro foro externo est necessaria, si postea occultum impedimentum publicum evaserit.

Раздзел III
Асобныя перашкоды, якія выклікаюць нядзейснасць

Caput III
De impedimentis dirimentibus in specie

Кан. 1083 – § 1. Не могуць заключыць дзейснае сужэнства мужчына да заканчэння шаснаццатага года жыцця і жанчына да заканчэння чатырнаццатага года жыцця.

Can. 1083 – § 1. Vir ante decimum sextum aetatis annum completum, mulier ante decimum quartum item completum, matrimonium validum inire non possunt.

§ 2. Integrum est Episcoporum conferentiae aetatem superiorem ad licitam matrimonii celebrationem statuere.

Can. 1084 – § 1. Impotentia coeundi antecedens et perpetua, sive ex parte viri sive ex parte mulieris, sive absoluta sive relativa, matrimonium ex ipsa eius natura dirimit.

§ 2. Si impedimentum impotentiae dubium sit, sive dubio iuris sive dubio facti, matrimonium non est impediendum nec, stante dubio, nullum declarandum.

§ 3. Sterilitas matrimonium nec prohibet nec dirimit, firmo praescripto can. 1098.

Can. 1085 – § 1. Invalide matrimonium attentat qui vinculo tenetur prioris matrimonii, quamquam non consummati.

§ 2. Quamvis prius matrimonium sit irritum aut solutum qualibet ex causa, non ideo licet aliud contrahere, antequam de prioris nullitate aut solutione legitime et certo constiterit.

Can. 1086 – § 1. Matrimonium inter duas personas, quarum altera sit baptizata in Ecclesia catholica vel in eandem recepta, et altera non baptizata, invalidum est.

§ 2. Ab hoc impedimento ne dispensetur, nisi impletis condicionibus de quibus in cann. 1125 et 1126.

§ 3. Si pars tempore contracti matrimonii tamquam baptizata communiter habebatur aut eius baptismus erat dubius, praesumenda est, ad nor-

§ 2. Канферэнцыя Біскупаў мае поўнае права павысіць узрост для дазволенай цэлебрацыі сужэнства.

Кан. 1084 – § 1. Няздольнасць да савакуплення, папярэдняя і пастаянная, як з боку мужчыны, так і з боку жанчыны, абсалютная або адносная, выклікае нядзейснасць сужэнства з увагі на саму яго прыроду.

§ 2. Калі перашкода няздольнасці з'яўляецца сумнеўнай, то — і ў выпадку юрыдычнага сумнення, і ў выпадку сумнення адносна факта, — перашкоды да сужэнства няма, і пакуль сумненне існуе, сцвярджаць нядзейснасць сужэнства нельга.

§ 3. Бясплоднасць не забараняе заключаць сужэнства і не выклікае яго нядзейснасць, захоўваючы прадпісанне кан. 1098.

Кан. 1085 – § 1. Нядзейсна спрабуе заключыць сужэнства той, каго ўтрымлівае повязь папярэдняга сужэнства, нават няздзейсненага.

§ 2. Нават, калі папярэдняе сужэнства было нядзейсным або было скасавана па любой прычыне, не дазваляецца заключаць новае сужэнства да таго часу, пакуль нядзейснасць або скасаванне папярэдняга не будзе легітымна і дакладна сцверджана.

Кан. 1086 – § 1. Сужэнства паміж дзвюма асобамі, адна з якіх была ахрышчана ў Каталіцкім Касцёле або прынята ў яго, а другая не была ахрышчана, з'яўляецца нядзейсным.

§ 2. Дыспенсацыя ад гэтай перашкоды можа быць удзелена толькі пасля выканання ўмоваў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1125 і 1126.

§ 3. Калі адзін з бакоў падчас заключэння сужэнства ўсімі лічыўся ахрышчаным або яго хрост быў пад сумненнем, то, згодна з нормай кан. 1060, трэба меркаваць аб

дзейснасці сужэнства, пакуль не будзе пэўна даказана, што адзін з бакоў быў ахрышчаны, а другі — неахрышчаны.

mam can. 1060, validitas matrimonii, donec certo probetur alteram partem baptizatam esse, alteram vero non baptizatam.

Кан. 1087 – Нядзейсна спрабуюць заключыць сужэнства тыя, хто атрымалі святое пасвячэнне.

Can. 1087 – Invalide matrimonium attentant, qui in sacris ordinibus sunt constituti.

Кан. 1088 – Нядзейсна спрабуюць заключыць сужэнства тыя, каго ў манаскім інстытуце звязвае публічнае вечнае абяцанне чыстасці.

Can. 1088 – Invalide matrimonium attentant, qui voto publico perpetuo castitatis in instituto religioso adstricti sunt.

Кан. 1089 – Не можа быць заключана дзейснае сужэнства паміж мужчынам і жанчынай, якая была выкрадзена або прынамсі ўтрымліваецца з намерам заключыць з ёй сужэнства, калі пазней жанчына, вызваленая ад выкрадальніка і знаходзячыся ў надзейным месцы на свабодзе, не згодзіцца дабравольна на гэтае сужэнства.

Can. 1089 – Inter virum et mulierem abductam vel saltem retentam intuitu matrimonii cum ea contrahendi, nullum matrimonium consistere potest, nisi postea mulier a raptore separata et in loco tuto ac libero constituta, matrimonium sponte eligat.

Кан. 1090 – § 1. Нядзейсна спрабуе заключыць сужэнства той, хто, маючы намер заключыць сужэнства з акрэсленай асобай, прычыніць смерць сужэнцу гэтай асобы ці ўласнаму сужэнцу.

Can. 1090 – § 1. Qui intuitu matrimonii cum certa persona ineundi, huius coniugi vel proprio coniugi mortem intulerit, invalide hoc matrimonium attentat.

§ 2. Таксама нядзейсным чынам спрабуюць заключыць паміж сабой сужэнства тыя, хто праз фізічны або маральны саўдзел прычынілі смерць сужэнцу.

§ 2. Invalide quoque matrimonium inter se attentant qui mutua opera physica vel morali mortem coniugi intulerunt.

Кан. 1091 – § 1. У прамой лініі роднасці сужэнства з'яўляецца нядзейсным паміж усімі роднымі як па ўзыходнай, так і па сыходнай лініі, як паміж легітымнымі роднымі, так і натуральнымі.

Can. 1091 – § 1. In linea recta consanguinitatis matrimonium irritum est inter omnes ascendentes et descendentes tum legitimos tum naturales.

§ 2. У бакавой лініі роднасці сужэнства з'яўляецца нядзейсным да чацвёртай ступені ўключна.

§ 2. In linea collaterali irritum est usque ad quartum gradum inclusive.

§ 3. Перашкода роднасці не памнажаецца.

§ 3. Impedimentum consanguinitatis non multiplicatur.

§ 4. Ніколі не дазваляецца сужэнства, калі існуе якое-небудзь сумненне адносна

§ 4. Numquam matrimonium permittatur, si quod subest dubium num

partes sint consanguineae in aliquo gradu lineae rectae aut in secundo gradu lineae collateralis.

таго, ці не з'яўляюцца бакі роднымі ў любой ступені прамой лініі або ў другой ступені бакавой лініі.

Can. 1092 – Affinitas in linea recta dirimit matrimonium in quolibet gradu.

Кан. 1092 – Свояцтва ў любой ступені прамой лініі выклікае нядзейснасць сужэнства.

Can. 1093 – Impedimentum publicae honestatis oritur ex matrimonio invalido post instauratam vitam communem aut ex notorio vel publico concubinatu; et nuptias dirimit in primo gradu lineae rectae inter virum et consanguineas mulieris, ac vice versa.

Кан. 1093 – Перашкода публічнай прыстойнасці вынікае з нядзейснага сужэнства пасля таго, як сужэнцы пачалі жыць разам, або з юрыдычна пацверджанага ці публічнага сужыцця; гэтая перашкода выклікае нядзейснасць сужэнства ў першай ступені прамой лініі паміж мужчынам і роднымі жанчыны і наадварот.

Can. 1094 – Matrimonium inter se valide contrahere nequeunt qui cognatione legali ex adoptione orta, in linea recta aut in secundo gradu lineae collateralis, coniuncti sunt.

Кан. 1094 – Не могуць дзейсным чынам заключыць паміж сабой сужэнства ў прамой лініі або ў другой ступені бакавой лініі тыя, каго злучае юрыдычная роднасць, якая вынікае з усынаўлення.

Caput IV
De consensu matrimoniali

Раздзел IV
Сужэнская згода

Can. 1095 – Sunt incapaces matrimonii contrahendi:

1° qui sufficienti rationis usu carent;

2° qui laborant gravi defectu discretionis iudicii circa iura et officia matrimonialia essentialia mutuo tradenda et acceptanda;

3° qui ob causas naturae psychicae obligationes matrimonii essentiales assumere non valent.

Кан. 1095 – Няздольнымі да заключэння сужэнства з'яўляюцца:

1° тыя, хто пазбаўлены дастатковага карыстання розумам;

2° тыя, хто маюць цяжкую загану распазнавальнага суджэння адносна істотных сужэнскіх правоў і абавязкаў, якія ўзаемна даюцца і прымаюцца;

3° тыя, хто па прычынах псіхічнай прыроды не здольны прыняць на сябе істотныя абавязкі сужэнства.

Can. 1096 – § 1. Ut consensus matrimonialis haberi possit, necesse est ut contrahentes saltem non ignorent matrimonium esse consortium permanens inter virum et mulierem or-

Кан. 1096 – § 1. Для таго, каб магла заіснаваць сужэнская згода, неабходна, каб нарачоныя ведалі прынамсі тое, што сужэнства з'яўляецца пастаянным саюзам паміж мужчынам і жанчынай, скіраваным да на-

раджэння патомства праз акрэсленае сексуальнае сумеснае дзеянне.

§ 2. Не мяркуецца аб няведанні гэтага пасля дасягнення палавой сталасці.

Кан. 1097 – § 1. Памылка, якая датычыць асобы, робіць сужэнства нядзейсным.

§ 2. Памылка, якая датычыць якасці асобы, нават такой якасці, якая стала прычынай заключэння сужэнства, не робіць сужэнства нядзейсным, калі намер не быў непасрэдна і прынцыпова скіраваны на гэтую якасць.

Кан. 1098 – Той, хто заключае сужэнства, будучы ўведзеным у зман, здзейснены для дасягнення згоды, які датычыў акрэсленай якасці другога боку, якая па сваёй сутнасці можа значна разладзіць супольнасць сужэнскага жыцця, заключае яго нядзейсна.

Кан. 1099 – Памылка, якая датычыць еднасці або нескасавальнасці ці сакрамэнтальнай годнасці сужэнства не парушае сужэнскай згоды, калі толькі гэтая памылка не акрэслівае волю.

Кан. 1100 – Веды або меркаванне адносна нядзейснасці сужэнства неабавязкова выключаюць сужэнскую згоду.

Кан. 1101 – § 1. Мяркуецца, што ўнутраная згода волі з'яўляецца адпаведнай словам або знакам, якія былі выкарыстаны падчас цэлебрацыі сужэнства.

§ 2. Аднак калі адзін з бакоў ці абодва бакі станоўчым дзеяннем волі выключаюць само сужэнства, або які-небудзь істотны элемент сужэнства, або якую-небудзь істотную ўласцівасць, сужэнства заключаецца нядзейсна.

Кан. 1102 – § 1. Не можа быць дзейсна заключана сужэнства пад умовай, якая датычыць будучыні.

dinatum ad prolem, cooperatione aliqua sexuali, procreandam.

§ 2. Haec ignorantia post pubertatem non praesumitur.

Can. 1097 – § 1. Error in persona invalidum reddit matrimonium.

§ 2. Error in qualitate personae, etsi det causam contractui, matrimonium irritum non reddit, nisi haec qualitas directe et principaliter intendatur.

Can. 1098 – Qui matrimonium init deceptus dolo, ad obtinendum consensum patrato, circa aliquam alterius partis qualitatem, quae suapte natura consortium vitae coniugalis graviter perturbare potest, invalide contrahit.

Can. 1099 – Error circa matrimonii unitatem vel indissolubilitatem aut sacramentalem dignitatem, dummodo non determinet voluntatem, non vitiat consensum matrimonialem.

Can. 1100 – Scientia aut opinio nullitatis matrimonii consensum matrimonialem non necessario excludit.

Can. 1101 – § 1. Internus animi consensus praesumitur conformis verbis vel signis in celebrando matrimonio adhibitis.

§ 2. At si alterutra vel utraque pars positivo voluntatis actu excludat matrimonium ipsum vel matrimonii essentiale aliquod elementum, vel essentialem aliquam proprietatem, invalide contrahit.

Can. 1102 – § 1. Matrimonium sub condicione de futuro valide contrahi nequit.

§ 2. Matrimonium sub condicione de praeterito vel de praesenti initum est validum vel non, prout id quod condicioni subest, exsistit vel non.

§ 3. Condicio autem, de qua in § 2, licite apponi nequit, nisi cum licentia Ordinarii loci scripto data.

Can. 1103 – Invalidum est matrimonium initum ob vim vel metum gravem ab extrinseco, etiam haud consulto incussum, a quo ut quis se liberet, eligere cogatur matrimonium.

Can. 1104 – § 1. Ad matrimonium valide contrahendum necesse est ut contrahentes sint praesentes una simul sive per se ipsi, sive per procuratorem.

§ 2. Sponsi consensum matrimonialem verbis exprimant; si vero loqui non possunt, signis aequipollentibus.

Can. 1105 – § 1. Ad matrimonium per procuratorem valide ineundum requiritur:

1° ut adsit mandatum speciale ad contrahendum cum certa persona;

2° ut procurator ab ipso mandante designetur, et munere suo per se ipse fungatur.

§ 2. Mandatum, ut valeat, subscribendum est a mandante et praeterea a parocho vel Ordinario loci in quo mandatum datur, aut a sacerdote ab alterutro delegato, aut a duobus saltem testibus; aut confici debet per documentum ad normam iuris civilis authenticum.

§ 3. Si mandans scribere nequeat, id in ipso mandato adnotetur et alius

§ 2. Сужэнства, заключанае пад умовай, якая датычыць мінулага або цяперашняга, з'яўляецца дзейсным або не ў залежнасці ад таго, існуе тое, што стаіць за ўмовай, ці не.

§ 3. Умова, аб якой гаворыцца ў § 2, не можа быць дададзена дазволеным чынам, калі не з пісьмовага дазволу ардынарыя месца.

Кан. 1103 – Нядзейсным з'яўляецца сужэнства, заключанае пад прымусам або пад уздзеяннем моцнага страху знешняга паходжання, нават выкліканых ненаўмысна, калі хто-небудзь, жадаючы вызваліцца ад іх, вырашае заключыць сужэнства.

Кан. 1104 – § 1. Для дзейснага заключэння сужэнства неабходна, каб нарачоныя прысутнічалі адначасова — асабіста або праз прадстаўніка.

§ 2. Нарачоныя павінны выявіць сужэнскую згоду словамі, а калі не могуць гаварыць — раўназначнымі знакамі.

Кан. 1105 – § 1. Для дзейснага заключэння сужэнства праз прадстаўніка патрабуецца:

1° каб было спецыяльнае ўпаўнаважанне на заключэнне сужэнства з акрэсленай асобай;

2° каб прадстаўнік быў вызначаны самім упаўнаважваючым і асабіста выконваў сваё заданне.

§ 2. Для таго, каб упаўнаважанне было дзейсным, яно павінна быць падпісана самім упаўнаважваючым і, апрача гэтага, пробашчам ці ардынарыем месца, дзе выдаецца гэтае ўпаўнаважанне, або святаром, дэлегаваным адным з іх, або прынамсі двума сведкамі; або яно павінна быць складзена ў форме аўтэнтычнага дакумента, згодна з нормамі дзяржаўнага права.

§ 3. Калі той, хто ўпаўнаважвае, не можа пісаць, аб гэтым павінен быць зроблены

запіс у самім упаўнаважанні, пры гэтым павінен быць далучаны яшчэ адзін сведка, які павінен падпісаць дакумент; у іншым выпадку ўпаўнаважанне з'яўляецца нядзейсным.

§ 4. Калі той, хто ўпаўнаважвае, перад тым, як прадстаўнік заключыць сужэнства ад яго імя, адкліча сваё ўпаўнаважанне або захварэе псіхічным расстройствам, сужэнства з'яўляецца нядзейсным, нават калі прадстаўнік або другі бок не ведалі аб гэтым заключаючы сужэнства.

Кан. 1106 – Сужэнства можа быць заключана праз перакладчыка; аднак пробашч не павінен асіставаць, калі не ўпэўнены ў добрасумленнасці перакладчыка.

Кан. 1107 – Нават калі сужэнства было заключана нядзейсна па прычыне перашкоды або заганы формы, мяркуецца, што выяўленая раней згода трывае, пакуль не будзе ўпэўненасці адносна яе адклікання.

testis addatur qui scripturam ipse quoque subsignet; secus mandatum irritum est.

§ 4. Si mandans, antequam procurator eius nomine contrahat, mandatum revocaverit aut in amentiam inciderit, invalidum est matrimonium, licet sive procurator sive altera pars contrahens haec ignoraverit.

Can. 1106 – Matrimonium per interpretem contrahi potest; cui tamen parochus ne assistat, nisi de interpretis fide sibi constet.

Can. 1107 – Etsi matrimonium invalide ratione impedimenti vel defectus formae initum fuerit, consensus praestitus praesumitur perseverare, donec de eius revocatione constiterit.

Раздзел V
Форма цэлебрацыі сужэнства

Кан. 1108 – § 1. Толькі тыя сужэнствы з'яўляюцца дзейснымі, якія былі заключаны ў прысутнасці ардынарыя месца або пробашча ці дэлегаванага адным з іх святара або дыякана, якія асіставалі, і разам з тым у прысутнасці двух сведкаў у адпаведнасці з правіламі, змешчанымі ў наступных канонах, і захоўваючы выключэнні, аб якіх гаворыцца ў кан. 144, 1112 § 1, 1116 і 1127 § 2–3.

§ 2. У якасці таго, хто асістуе пры сужэнстве, разумеецца толькі той, хто, будучы прысутным, задае тым, хто заключае сужэнства, пытанні аб выяўленні імі згоды і прымае яе ад імя Касцёла.

Caput V
De forma celebrationis matrimonii

Can. 1108 – § 1. Ea tantum matrimonia valida sunt, quae contrahuntur coram loci Ordinario aut parocho aut sacerdote vel diacono ab alterutro delegato qui assistant, necnon coram duobus testibus, secundum tamen regulas expressas in canonibus qui sequuntur, et salvis exceptionibus de quibus in cann. 144, 1112, § 1, 1116 et 1127, §§ 1-2.

§ 2. Assistens matrimonio intellegitur tantum qui praesens exquirit manifestationem contrahentium consensus eamque nomine Ecclesiae recipit.

§ 3. Solus sacerdos valide assistit matrimonio inter partes orientales vel inter partem latinam et partem orientalem sive catholicam sive non catholicam.

Can. 1109 – Loci Ordinarius et parochus, nisi per sententiam vel per decretum fuerint excommunicati vel interdicti vel suspensi ab officio aut tales declarati, vi officii, intra fines sui territorii, valide matrimoniis assistunt non tantum subditorum sed etiam, dummodo alterutra saltem pars sit adscripta Ecclesiae latinae, non subditorum.

Can. 1110 – Ordinarius et parochus personalis vi officii matrimonio solummodo eorum valide assistunt, quorum saltem alteruter subditus sit intra fines suae dicionis.

Can. 1111 – § 1. Loci Ordinarius et parochus, quamdiu valide officio funguntur, possunt facultatem intra fines sui territorii matrimoniis assistendi, etiam generalem, sacerdotibus et diaconis delegare, firmo tamen eo quod praescribit can. 1108 § 3.

§ 2. Ut valida sit delegatio facultatis assistendi matrimoniis, determinatis personis expresse dari debet; si agitur de delegatione speciali, ad determinatum matrimonium danda est; si vero agitur de delegatione generali, scripto est concedenda.

Can. 1112 – § 1. Ubi desunt sacerdotes et diaconi, potest Episcopus dioecesanus, praevio voto favorabili Episcoporum conferentiae et obtenta licentia Sanctae Sedis, delegare laicos, qui matrimoniis assistant, firmo praescripto can. 1108 § 3.

§ 3. Толькі святар дзейсна асістуе пры сужэнстве паміж двума ўсходнімі бакамі або паміж лацінскім бокам і ўсходнім бокам — каталіцкім ці некаталіцкім.

Кан. 1109 – Ардынарый месца і пробашч, калі яны не былі прысудам або дэкрэтам пакараны экскамунікай, інтэрдыктам ці суспенсай ад пасады, або калі гэта не было сцверджана, на моцы сваёй пасады ў межах сваёй тэрыторыі дзейсна асістуюць пры сужэнствах не толькі падуладных, але і непадуладных, калі толькі прынамсі адзін з іх належыць да Лацінскага Касцёла.

Кан. 1110 – Ардынарый і персанальны пробашч на моцы сваёй пасады дзейсна асістуюць пры сужэнствах толькі тых асобаў, з якіх прынамсі адна з'яўляецца падуладнай у межах іх юрысдыкцыі.

Кан. 1111 – § 1. Пакуль ардынарый месца і пробашч дзейсна выконваюць сваю пасаду, яны могуць дэлегаваць святарам і дыяканам паўнамоцтва — таксама агульнае — на асіставанне пры сужэнствах у межах сваёй тэрыторыі, захоўваючы прадпісанне кан. 1108 § 3.

§ 2. Для таго, каб дэлегаванне паўнамоцтва на асіставанне пры сужэнствах было дзейсным, яно павінна быць выразна ўдзелена акрэсленым асобам; калі гаворка ідзе пра спецыяльнае дэлегаванне, яно ўдзяляцца ў дачыненні да акрэсленага сужэнства; калі ж гаворка ідзе пра агульнае дэлегаванне, яно павінна быць удзелена пісьмова.

Кан. 1112 – § 1. Там, дзе не хапае святароў і дыяканаў, дыяцэзіяльны біскуп можа, атрымаўшы — пасля папярэдняга станоўчага меркавання Канферэнцыі Біскупаў — дазвол Святой Сталіцы, дэлегаваць свецкіх асобаў да асіставання пры сужэнствах, захоўваючы прадпісанне кан. 1108 § 3.

§ 2. Павінна быць вызначана адпаведная свецкая асоба, здольная даць настаўленні нарачоным і належным чынам правесці літургію сужэнства.

Кан. 1113 – Перад удзяленнем спецыяльнага дэлегавання неабходна паклапаціцца аб усім, што права пастанаўляе адносна сцвярджэння вольнага стану нарачоных.

Кан. 1114 – Той, хто асістуе пры сужэнстве, дзейнічае недазволеным чынам, калі асабіста не ўпэўніўся ў вольным стане нарачоных згодна з нормамі права, а таксама не ўпэўніўся — калі гэта магчыма — у дазволе пробашча, кожны раз, калі асістуе на моцы агульнага дэлегавання.

Кан. 1115 – Сужэнствы павінны цэлебравацца ў парафіі, дзе адзін з нарачоных мае пастаяннае ці часовае месца жыхарства або прабывае там на працягу месяца, або, калі гаворка ідзе пра бадзяжных, — там, дзе яны актуальна прабываюць; з дазволу ўласнага ардынарыя або ўласнага пробашча сужэнствы могуць цэлебравацца ў іншым месцы.

Кан. 1116 – § 1. Калі асоба, якая згодна з нормамі права з'яўляецца кампетэнтнай да асіставання, недаступная або да яе нельга звярнуцца без сур'ёзных цяжкасцяў, той, хто хоча заключыць дзейснае сужэнства, можа яго дзейсна і дазволеным чынам заключыць у прысутнасці адных толькі сведкаў:

1° у небяспецы смерці;

2° па-за небяспекай смерці, калі толькі разважліва прадугледжваецца, што такое становішча рэчаў будзе трываць на працягу месяца.

§ 2. У абодвух выпадках, калі знойдзецца іншы святар або дыякан, які можа прысутнічаць, ён павінен быць пакліканы і павінен прысутнічаць разам са сведкамі

§ 2. Laicus seligatur idoneus, ad institutionem nupturientibus tradendam capax et qui liturgiae matrimoniali rite peragendae aptus sit.

Can. 1113 – Antequam delegatio concedatur specialis, omnia provideantur, quae ius statuit ad libertatem status comprobandam.

Can. 1114 – Assistens matrimonio illicite agit, nisi ipsi constiterit de libero statu contrahentium ad normam iuris atque, si fieri potest, de licentia parochi, quoties vi delegationis generalis assistit.

Can. 1115 – Matrimonia celebrentur in paroecia ubi alterutra pars contrahentium habet domicilium vel quasi-domicilium vel menstruam commorationem, aut, si de vagis agitur, in paroecia ubi actu commorantur; cum licentia proprii Ordinarii aut parochi proprii, alibi celebrari possunt.

Can. 1116 – § 1. Si haberi vel adiri nequeat sine gravi incommodo assistens ad normam iuris competens, qui intendunt verum matrimonium inire, illud valide ac licite coram solis testibus contrahere possunt:

1° in mortis periculo;

2° extra mortis periculum, dummodo prudenter praevideatur earum rerum condicionem esse per mensem duraturam.

§ 2. In utroque casu, si praesto sit alius sacerdos vel diaconus qui adesse possit, vocari et, una cum testibus, matrimonii celebrationi adesse debet,

salva coniugii validitate coram solis testibus.

§ 3. In iisdem rerum adiunctis, de quibus in § 1, nn. 1 et 2, Ordinarius loci cuilibet sacerdoti catholico facultatem conferre potest matrimonium benedicendi christifidelium Ecclesiarum orientalium quae plenam cum Ecclesia catholica communionem non habeant si sponte id petant, et dummodo nihil validae vel licitae celebrationi matrimonii obstet. Sacerdos ipse, si id prudenter fieri possit, auctoritatem competentem Ecclesiae non catholicae, cuius interest, de re certiorem faciat.

пры цэлебрацыі сужэнства, захоўваючы ў моцы тое, што сужэнства, заключанае ў прысутнасці адных толькі сведкаў, будзе дзейсным.

§ 3. У дадатак да таго, што ўстаноўлена ў § 1, 1° і 2°, ардынарый месца можа ўдзяліць любому каталіцкаму святару паўнамоцтва благаслаўляць сужэнствы вернікаў усходніх Касцёлаў, якія не маюць поўнага адзінства з Каталіцкім Касцёлам, калі вернікі самі аб гэтым просяць і калі толькі нічога не перашкаджае дзейснай ці дазволенай цэлебрацыі сужэнства. Гэты святар павінен паведаміць аб справе зацікаўленую кампетэнтную ўладу некаталіцкага Касцёла, калі гэта можа быць зроблена з разважлівасцю.

Can. 1117 – Statuta superius forma servanda est, si saltem alterutra pars matrimonium contrahentium in Ecclesia catholica baptizata vel in eandem recepta sit, salvis praescriptis can. 1127, § 2.

Кан. 1117 – Устаноўленая вышэй форма павінна захоўвацца, калі прынамсі адзін з бакоў, якія заключаюць сужэнства, быў ахрышчаны ў Каталіцкім Касцёле або быў у яго прыняты, пры гэтым захоўваюцца прадпісанні кан. 1127 § 2.

Can. 1118 – § 1. Matrimonium inter catholicos vel inter partem catholicam et partem non catholicam baptizatam celebretur in ecclesia paroeciali; in alia ecclesia aut oratorio celebrari poterit de licentia Ordinarii loci vel parochi.

§ 2. Matrimonium in alio convenienti loco celebrari Ordinarius loci permittere potest.

§ 3. Matrimonium inter partem catholicam et partem non baptizatam in ecclesia vel in alio convenienti loco celebrari poterit.

Кан. 1118 – § 1. Сужэнства паміж католікамі або паміж каталіцкім бокам і ахрышчаным некаталіцкім бокам павінна цэлебравацца ў парафіяльным касцёле; яго можна цэлебраваць у іншым касцёле або араторыі з дазволу ардынарыя месца або пробашча.

§ 2. Ардынарый месца можа дазволіць цэлебраваць сужэнства ў іншым адпаведным месцы.

§ 3. Сужэнства паміж каталіцкім бокам і неахрышчаным бокам можа цэлебравацца ў касцёле або іншым адпаведным месцы.

Can. 1119 – Extra casum necessitatis, in matrimonii celebratione serventur ritus in libris liturgicis, ab Ecclesia probatis, praescripti aut legitimis consuetudinibus recepti.

Кан. 1119 – Па-за выпадкам неабходнасці падчас цэлебрацыі сужэнства павінны захоўвацца абрады, прадпісаныя ў літургічных кнігах, зацверджаных Касцёлам, або прынятыя легітымнымі звычаямі.

Кан. 1120 – Канферэнцыя Біскупаў можа распрацаваць уласны абрад сужэнства, які павінен быць праверaны Святой Сталіцай, згодны з мясцовымі і народнымі звычаямі, дастасаванымі да хрысціянскага духу, захоўваючы пры гэтым у якасці закону тое, што той, хто асістуе, будучы асабіста прысутным пры заключэнні сужэнства, павінен задаць пытанні адносна выяўлення згоды нарачоных і прыняць яе.

Can. 1120 – Episcoporum conferentia exarare potest ritum proprium matrimonii, a Sancta Sede recognoscendum, congruentem locorum et populorum usibus ad spiritum christianum aptatis, firma tamen lege ut assistens matrimonio praesens requirat manifestationem consensus contrahentium eamque recipiat.

Кан. 1121 – § 1. Пасля цэлебрацыі сужэнства пробашч месца цэлебрацыі або той, хто яго замяняе, нават калі ніхто з іх не асіставаў, павінен як мага хутчэй запісаць у кнізе сужэнстваў імёны сужэнцаў, таго, хто асіставаў, сведкаў, месца і дату цэлебрацыі сужэнства, паводле парадку, прадпісанага Канферэнцыяй Біскупаў або дыяцэзіяльным біскупам.

§ 2. Заўсёды, калі сужэнства заключаецца згодна з нормай кан. 1116, святар або дыякан, калі яны прысутнічалі на цэлебрацыі, а ў іншым выпадку — сведкі разам з сужэнцамі павінны як мага хутчэй паведаміць пробашча або ардынарыя месца аб заключэнні сужэнства.

§ 3. У тым, што датычыць сужэнства, якое было заключана з дыспенсацыяй ад кананічнай формы, ардынарый месца, які ўдзяліў гэтую дыспенсацыю, павінен паклапаціцца аб тым, каб быў зроблены запіс аб дыспенсацыі і сужэнстве ў кнізе сужэнстваў як у Курыі, так і ва ўласнай парафіі каталіцкага боку, пробашч якой даследаваў вольны стан нарачоных; сужэнец-католік павінен як мага хутчэй паведаміць ардынарыя месца і пробашча аб заключаным сужэнстве, указваючы таксама месца цэлебрацыі і захаваную пры гэтым публічную форму.

Can. 1121 – § 1. Celebrato matrimonio, parochus loci celebrationis vel qui eius vices gerit, etsi neuter eidem astiterit, quam primum adnotet in matrimoniorum regestis nomina coniugum, assistentis ac testium, locum et diem celebrationis matrimonii, iuxta modum ab Episcoporum conferentia aut ab Episcopo dioecesano praescriptum.

§ 2. Quoties matrimonium ad normam can. 1116 contrahitur, sacerdos vel diaconus, si celebrationi adfuerit, secus testes tenentur in solidum cum contrahentibus parochum aut Ordinarium loci de inito coniugio quam primum certiorem reddere.

§ 3. Ad matrimonium quod attinet cum dispensatione a forma canonica contractum, loci Ordinarius, qui dispensationem concessit, curet ut inscribatur dispensatio et celebratio in libro matrimoniorum tum curiae tum paroeciae propriae partis catholicae, cuius parochus inquisitiones de statu libero peregit; de celebrato matrimonio eundem Ordinarium et parochum quam primum certiorem reddere tenetur coniux catholicus, indicans etiam locum celebrationis necnon formam publicam servatam.

Can. 1122 – § 1. Matrimonium contractum adnotetur etiam in regestis baptizatorum, in quibus baptismus coniugum inscriptus est.

§ 2. Si coniux matrimonium contraxerit non in paroecia in qua baptizatus est, parochus loci celebrationis notitiam initi coniugii ad parochum loci collati baptismi quam primum transmittat.

Can. 1123 – Quoties matrimonium vel convalidatur pro foro externo, vel nullum declaratur, vel legitime praeterquam morte solvitur, parochus loci celebrationis matrimonii certior fieri debet, ut adnotatio in regestis matrimoniorum et baptizatorum rite fiat.

Кан. 1122 – § 1. Запіс аб заключаным сужэнстве павінен быць зроблены таксама ў кнізе ахрышчаных, у якой запісаны хрост сужэнцаў.

§ 2. Калі сужэнец заключыў сужэнства не ў той парафіі, дзе быў ахрышчаны, пробашч месца цэлебрацыі павінен як мага хутчэй пераслаць пробашчу таго месца, дзе быў удзелены хрост, паведамленне аб заключэнні сужэнства.

Кан. 1123 – Заўсёды, калі сужэнства было канвалідавана на *forum externum*, або была сцверджана яго нядзейснасць, або яно было легітымна скасавана — па-за выпадкам смерці, — аб гэтым павінен быць паведамлены пробашч месца цэлебрацыі сужэнства, каб у кнігах сужэнстваў і ахрышчаных былі зроблены адпаведныя запісы.

Caput VI
De matrimoniis mixtis

Can. 1124 – Matrimonium inter duas personas baptizatas, quarum altera sit in Ecclesia catholica baptizata vel in eandem post baptismum recepta, altera vero Ecclesiae vel communitati ecclesiali plenam communionem cum Ecclesia catholica non habenti adscripta, sine expressa auctoritatis competentis licentia prohibitum est.

Can. 1125 – Huiusmodi licentiam concedere potest Ordinarius loci, si iusta et rationabilis causa habeatur; eam ne concedat, nisi impletis condicionibus quae sequuntur:

1° pars catholica declaret se paratam esse pericula a fide deficiendi removere atque sinceram promissionem praestet se omnia pro viribus facturam esse, ut universa

Раздзел VI
Змешаныя сужэнствы

Кан. 1124 – Без выразнага дазволу кампетэнтнай улады забаронена сужэнства паміж дзвюма ахрышчанымі асобамі, адна з якіх была ахрышчана ў Каталіцкім Касцёле або прынята ў яго пасля хросту, а другая належыць да Касцёла або касцёльнай супольнасці, якія не знаходзяцца ў поўным адзінстве з Каталіцкім Касцёлам.

Кан. 1125 – Такі дазвол можа ўдзяліць ардынарый месца, калі на гэта будзе справядлівая і разумная прычына; ён не павінен удзяляць такі дазвол, калі не будуць выкананы наступныя ўмовы:

1° каталіцкі бок павінен засведчыць, што гатовы аддаліць ад сябе небяспеку адыходу ад веры, і скласці шчырае абяцанне, што зробіць усё, што ў яго сілах,

каб усё патомства было ахрышчана і выхавана ў Каталіцкім Касцёле;

2° другі бок павінен быць своечасова паведамлены аб гэтых абяцаннях, складзеных каталіцкім бокам, такім чынам, каб была ўпэўненасць у тым, што ён сапраўды ўсведамляе абяцанні і абавязкі каталіцкага боку;

3° абодва бакі павінны быць павучаны аб мэтах і істотных уласцівасцях сужэнства, якія ніводзін з нарачоных не павінен выключаць.

proles in Ecclesia catholica baptizetur et educetur;

2° de his promissionibus a parte catholica faciendis altera pars tempestive certior fiat, adeo ut constet ipsam vere consciam esse promissionis et obligationis partis catholicae;

3° ambae partes edoceantur de finibus et proprietatibus essentialibus matrimonii, a neutro contrahente excludendis.

Кан. 1126 – Канферэнцыя Біскупаў мае права ўстанаўліваць парадак, згодна з якім павінны складацца гэтыя засведчанні і абяцанні, якія патрабуюцца ў кожным выпадку, а таксама акрэсліваць, якім чынам яны сцвярджаюцца на *forum externum* і якім чынам павінен быць паведамлены некаталіцкі бок.

Can. 1126 – Episcoporum conferentiae est tum modum statuere, quo hae declarationes et promissiones, quae semper requiruntur, faciendae sint, tum rationem definire, qua de ipsis et in foro externo constet et pars non catholica certior reddatur.

Кан. 1127 – § 1. У тым, што датычыць формы, якой трэба прытрымлівацца пры змешаным сужэнстве, павінны захоўвацца прадпісанні кан. 1108; аднак, калі каталіцкі бок заключае сужэнства з некаталіцкім бокам усходняга абраду, кананічная форма цэлебрацыі павінна быць захавана толькі для дазволенасці; для дзейснасці ж патрабуецца ўдзел святога служыцеля, захоўваючы іншыя патрабаванні права.

§ 2. Калі сур'ёзныя цяжкасці перашкаджаюць у захоўванні кананічнай формы, ардынарый месца каталіцкага боку мае права ўдзяліць ад яе дыспенсацыю ў асобных выпадках, параіўшыся пры гэтым з ардынарыем месца, дзе цэлебруецца сужэнства, пры гэтым для дзейснасці павінна захоўвацца якая-небудзь публічная форма цэлебрацыі; Канферэнцыя Біскупаў мае права ўстанавіць нормы, згодна з якімі дыспенсацыя будзе ўдзяляцца па аднолькавых прычынах.

Can. 1127 – § 1. Ad formam quod attinet in matrimonio mixto adhibendam, serventur praescripta can. 1108; si tamen pars catholica matrimonium contrahit cum parte non catholica ritus orientalis, forma canonica celebrationis servanda est ad liceitatem tantum; ad validitatem autem requiritur interventus sacerdotis, servatis aliis de iure servandis.

§ 2. Si graves difficultates formae canonicae servandae obstent, Ordinario loci partis catholicae ius est ab eadem in singulis casibus dispensandi, consulto tamen Ordinario loci in quo matrimonium celebratur, et salva ad validitatem aliqua publica forma celebrationis; Episcoporum conferentiae est normas statuere, quibus praedicta dispensatio concordi ratione concedatur.

§ 3. Vetatur ne, ante vel post canonicam celebrationem ad normam § 1, alia habeatur eiusdem matrimonii celebratio religiosa ad matrimonialem consensum praestandum vel renovandum; item ne fiat celebratio religiosa, in qua assistens catholicus et minister non catholicus insimul, suum quisque ritum peragens, partium consensum exquirant.

Can. 1128 – Locorum Ordinarii aliique animarum pastores curent, ne coniugi catholico et filiis e matrimonio mixto natis auxilium spirituale desit ad eorum obligationes adimplendas atque coniuges adiuvent ad vitae coniugalis et familiaris fovendam unitatem.

Can. 1129 – Praescripta cann. 1127 et 1128 applicanda sunt quoque matrimoniis, quibus obstat impedimentum disparitatis cultus, de quo in can. 1086, § 1.

§ 3. Забараняецца, каб перад або пасля кананічнай цэлебрацыі, згоднай з нормай § 1, адбывалася іншая рэлігійная цэлебрацыя таго самага сужэнства для выяўлення або аднаўлення сужэнскай згоды; таксама не павінна адбывацца рэлігійная цэлебрацыя, падчас якой католік, які асістуе, і служыцель-некатолік, кожны здзяйсняючы свой абрад, разам задаюць пытанні аб згодзе.

Кан. 1128 – Ардынарыі месца і іншыя душпастыры павінны клапаціцца аб тым, каб у сужэнца-католіка і дзяцей, народжаных у змешаным сужэнстве, не было недахопу ў духоўнай дапамозе для выканання іх абавязкаў, а таксама яны павінны падтрымліваць сужэнцаў у захаванні сужэнскага жыцця і сямейнай еднасці.

Кан. 1129 – Прадпісанні кан. 1127 і 1128 павінны прымяняцца таксама да сужэнстваў, якія маюць перашкоду розніцы рэлігій, аб якой гаворыцца ў кан. 1086 § 1.

Caput VII
De matrimonio secreto celebrando

Can. 1130 – Ex gravi et urgenti causa loci Ordinarius permittere potest, ut matrimonium secreto celebretur.

Can. 1131 – Permissio matrimonium secreto celebrandi secumfert:

1° ut secreto fiant investigationes quae ante matrimonium peragendae sunt;

2° ut secretum de matrimonio celebrato servetur ab Ordinario loci, assistente, testibus, coniugibus.

Раздзел VII
Сужэнства, якое цэлебруецца таемна

Кан. 1130 – Ардынарый месца па важкай і неадкладнай прычыне можа дазволіць, каб сужэнства цэлебравалася таемна.

Кан. 1131 – Дазвол на таемную цэлебрацыю сужэнства нясе з сабой наступнае:

1° даследаванні, якія павінны праводзіцца перад сужэнствам, павінны адбывацца таемна;

2° ардынарый месца, а таксама той, хто асістуе, сведкі і сужэнцы павінны захоўваць таямніцу аб цэлебраваным сужэнстве.

Кан. 1132 – З ардынарыя месца здымаецца абавязак захоўвання таямніцы, аб якой гаворыцца ў кан. 1131, 2°, калі захоўванне таямніцы пагражае цяжкай спакусай або вялікай абразай святасці сужэнства; аб гэтым трэба паведаміць абодва бакі перад цэлебрацыяй сужэнства.

Кан. 1133 – Запіс аб сужэнстве, якое цэлебравалася таемна, павінен быць зроблены толькі ў асаблівай кнізе, якая павінна захоўвацца ў тайным архіве Курыі.

Can. 1132 – Obligatio secretum servandi, de qua in can. 1131, n. 2, ex parte Ordinarii loci cessat si grave scandalum aut gravis erga matrimonii sanctitatem iniuria ex secreti observantia immineat, idque notum fiat partibus ante matrimonii celebrationem.

Can. 1133 – Matrimonium secreto celebratum in peculiari tantummodo regesto, servando in secreto curiae archivo, adnotetur.

Раздзел VIII
Наступствы сужэнства

Caput VIII
De matrimonii effectibus

Кан. 1134 – У выніку дзейснага сужэнства паміж сужэнцамі ўтвараецца повязь, якая па сваёй прыродзе з'яўляецца вечнай і выключнай; апрача гэтага, у хрысціянскім сужэнстве праз асаблівы сакрамэнт сужэнцы ўмацоўваюцца і акрэсленым чынам кансэкруюцца для абавязкаў і годнасці свайго стану.

Can. 1134 – Ex valido matrimonio enascitur inter coniuges vinculum natura sua perpetuum et exclusivum; in matrimonio praeterea christiano coniuges ad sui status officia et dignitatem peculiari sacramento roborantur et veluti consecrantur.

Кан. 1135 – Абое сужэнцы маюць аднолькавыя абавязкі і правы ў тым, што датычыць супольнасці сужэнскага жыцця.

Can. 1135 – Utrique coniugi aequum officium et ius est ad ea quae pertinent ad consortium vitae coniugalis.

Кан. 1136 – Найбольш важным абавязкам і першым правам бацькоў з'яўляецца тое, каб па меры сваіх сіл клапаціцца аб выхаванні патомства, як фізічным, грамадскім і культурным, так маральным і рэлігійным.

Can. 1136 – Parentes officium gravissimum et ius primarium habent prolis educationem tum physicam, socialem et culturalem, tum moralem et religiosam pro viribus curandi.

Кан. 1137 – Легітымнымі з'яўляюцца дзеці, зачатыя ці народжаныя ў дзейсным сужэнстве або такім, якое лічылася дзейсным.

Can. 1137 – Legitimi sunt filii concepti aut nati ex matrimonio valido vel putativo.

Кан. 1138 – § 1. Бацькам з'яўляецца той, на каго справядліва ўказвае сужэнства, калі відавочныя аргументы не даказваюць адваротнае.

Can. 1138 – § 1. Pater is est, quem iustae nuptiae demonstrant, nisi evidentibus argumentis contrarium probetur.

§ 2. Legitimi praesumuntur filii, qui nati sunt saltem post dies 180 a die celebrati matrimonii, vel infra dies 300 a die dissolutae vitae coniugalis.

Can. 1139 – Filii illegitimi legitimantur per subsequens matrimonium parentum sive validum sive putativum, vel per rescriptum Sanctae Sedis.

Can. 1140 – Filii legitimati, ad effectus canonicos quod attinet, in omnibus aequiparantur legitimis, nisi aliud expresse iure cautum fuerit.

§ 2. Мяркуецца аб легітымнасці дзяцей, народжаных прынамсі праз 180 дзён пасля цэлебрацыі сужэнства або на працягу 300 дзён пасля спынення сужэнскага жыцця.

Кан. 1139 – Нелегітымныя дзеці становяцца легітымнымі праз пазнейшае сужэнства бацькоў, дзейснае або такое, якое лічылася дзейсным, ці праз рэскрыпт Святой Сталіцы.

Кан. 1140 – У тым, што датычыць кананічных наступстваў, дзеці, якія сталі легітымнымі, ва ўсім прыраўноўваюцца да легітымных, калі права выразна не прадугледжвае іншае.

Caput IX
De separatione coniugum

Art. 1. *De dissolutione vinculi*

Can. 1141 – Matrimonium ratum et consummatum nulla humana potestate nullaque causa, praeterquam morte, dissolvi potest.

Can. 1142 – Matrimonium non consummatum inter baptizatos vel inter partem baptizatam et partem non baptizatam a Romano Pontifice dissolvi potest iusta de causa, utraque parte rogante vel alterutra, etsi altera pars sit invita.

Can. 1143 – § 1. Matrimonium initum a duobus non baptizatis solvitur ex privilegio paulino in favorem fidei partis quae baptismum recepit, ipso facto quo novum matrimonium ab eadem parte contrahitur, dummodo pars non baptizata discedat.

§ 2. Discedere censetur pars non baptizata, si nolit cum parte baptizata

Раздзел IX
Раздзяленне сужэнцаў

Артыкул 1. *Скасаванне повязі*

Кан. 1141 – Заключанае і здзейсненае сужэнства не можа быць скасавана ніякай чалавечай уладай і ні па якой прычыне, акрамя смерці.

Кан. 1142 – Няздзейсненае сужэнства паміж ахрышчанымі або паміж ахрышчаным бокам і неахрышчаным бокам можа быць скасавана Рымскім Пантыфікам па справядлівай прычыне па просьбе абодвух бакоў або аднаго боку, нават калі другі бок будзе супраць.

Кан. 1143 – § 1. Сужэнства, заключанае паміж двума неахрышчанымі, скасоўваецца на моцы прывілея Паўла на карысць веры таго боку, які прыняў хрост, самім фактам таго, што гэты бок заключае новае сужэнства, калі толькі неахрышчаны бок пакіне ахрышчанага.

§ 2. Лічыцца, што неахрышчаны бок пакідае ахрышчанага, калі ён не жадае

жыць разам з ахрышчаным бокам або не жадае жыць без абразы Стварыцеля, калі ахрышчаны бок пасля прыняцця хросту не дасць справядлівую падставу для адыходу.

Кан. 1144 – § 1. Для таго, каб ахрышчаны бок мог дзейсна заключыць новае сужэнства, неахрышчанаму боку заўсёды павінен быць зроблены запыт аб наступным:

1° ці жадае ён таксама прыняць хрост;

2° ці жадае ён прынамсі мірна жыць разам з ахрышчаным бокам без абразы Стварыцеля.

§ 2. Гэты запыт павінен быць зроблены пасля хросту; аднак ардынарый месца па важкай прычыне можа дазволіць, каб запыт быў зроблены перад хростам, а нават можа ўдзяліць дыспенсацыю ад запыту — перад хростам, або пасля — калі толькі з працэсу, нават скарочанага ці пазасудовага, будзе вядома, што такі запыт не можа быць зроблены ці не прынясе карысці.

Кан. 1145 – § 1. Як правіла, запыт павінен быць зроблены ўладай ардынарыя месца боку, які навярнуўся; гэты ардынарый павінен даць другому сужэнцу — калі ён аб гэтым папросіць — час на роздум над адказам, пры гэтым папярэдзіўшы аб тым, што, калі гэты час міне дарэмна, яго маўчанне будзе лічыцца адмоўным адказам.

§ 2. Запыт, зроблены нават прыватна самім бокам, які навярнуўся, з'яўляецца дзейсным; запыт з'яўляецца таксама дазволеным, калі немагчыма захаваць прадпісаную вышэй форму.

§ 3. У абодвух выпадках зроблены запыт і яго вынік павінны быць легітымна сцверджаны на *forum externum*.

Кан. 1146 – Ахрышчаны бок мае права заключыць новае сужэнства з каталіцкім бокам:

cohabitare vel cohabitare pacifice sine contumelia Creatoris, nisi haec post baptismum receptum iustam illi dederit discedendi causam.

Can. 1144 – § 1. Ut pars baptizata novum matrimonium valide contrahat, pars non baptizata semper interpellari debet an:

1° velit et ipsa baptismum recipere;

2° saltem velit cum parte baptizata pacifice cohabitare, sine contumelia Creatoris.

§ 2. Haec interpellatio post baptismum fieri debet; at loci Ordinarius, gravi de causa, permittere potest ut interpellatio ante baptismum fiat, immo et ab interpellatione dispensare, sive ante sive post baptismum, dummodo constet modo procedendi saltem summario et extraiudiciali eam fieri non posse aut fore inutilem.

Can. 1145 – § 1. Interpellatio fiat regulariter de auctoritate loci Ordinarii partis conversae; a quo Ordinario concedendae sunt alteri coniugi, si quidem eas petierit, induciae ad respondendum, eodem tamen monito ut, si induciae inutiliter praeterlabantur, eius silentium pro responsione negativa habeatur.

§ 2. Interpellatio etiam privatim facta ab ipsa parte conversa valet, immo est licita, si forma superius praescripta servari nequeat.

§ 3. In utroque casu de interpellatione facta deque eiusdem exitu in foro externo legitime constare debet.

Can. 1146 – Pars baptizata ius habet novas nuptias contrahendi cum parte catholica:

1° si altera pars negative interpellationi responderit, aut si interpellatio legitime omissa fuerit;

2° si pars non baptizata, sive iam interpellata sive non, prius perseverans in pacifica cohabitatione sine contumelia Creatoris, postea sine iusta causa discesserit, firmis praescriptis cann. 1144 et 1145.

1° калі другі бок адмоўна адкажа на запыт або калі запыт быў легітымна прапушчаны;

2° калі неахрышчаны бок, якому ўжо быў зроблены запыт або не, спачатку працягваў мірнае жыццё разам без абразы Стварыцеля, а пасля без справядлівай прычыны пакінуў ахрышчаны бок, захоўваючы прадпісанні кан. 1144 і 1145.

Can. 1147 – Ordinarius loci tamen, gravi de causa, concedere potest ut pars baptizata, utens privilegio paulino, contrahat matrimonium cum parte non catholica sive baptizata sive non baptizata, servatis etiam praescriptis canonum de matrimoniis mixtis.

Кан. 1147 – Аднак ардынарый месца па важкай прычыне можа дазволіць, каб ахрышчаны бок, карыстаючыся Паўлавым прывілеем, заключыў сужэнства з некаталіцкім бокам, ахрышчаным ці неахрышчаным, захоўваючы прадпісанні канонаў аб змешаных сужэнствах.

Can. 1148 – § 1. Non baptizatus, qui plures uxores non baptizatas simul habeat, recepto in Ecclesia catholica baptismo, si durum ei sit cum earum prima permanere, unam ex illis, ceteris dimissis, retinere potest. Idem valet de muliere non baptizata, quae plures maritos non baptizatos simul habeat.

Кан. 1148 – § 1. Неахрышчаны, які перад хростам меў адначасова некалькі неахрышчаных жонак, пасля прыняцця хросту ў Каталіцкім Касцёле, калі яму цяжка застацца з першай жонкай, можа затрымаць адну з іх, пакінуўшы іншых. Тое ж прымяняецца ў выпадку неахрышчанай жанчыны, у якой было адначасова некалькі неахрышчаных мужоў.

§ 2. In casibus de quibus in § 1, matrimonium, recepto baptismo, forma legitima contrahendum est, servatis etiam, si opus sit, praescriptis de matrimoniis mixtis et aliis de iure servandis.

§ 2. У выпадках, аб якіх гаворыцца ў § 1, пасля прыняцця хросту павінна быць заключана сужэнства паводле легітымнай формы, захоўваючы таксама, калі будзе патрэбна, прадпісанні аб змешаных сужэнствах і іншыя патрабаванні права.

§ 3. Ordinarius loci, prae oculis habita condicione morali, sociali, oeconomica locorum et personarum, curet ut primae uxoris ceterarumque dimissarum necessitatibus satis provisum sit, iuxta normas iustitiae, christianae caritatis et naturalis aequitatis.

§ 3. Ардынарый месца, маючы на ўвазе маральныя, грамадскія і эканамічныя ўмовы месцаў і асобаў, павінен паклапаціцца аб дастатковым забеспячэнні патрэбаў першай жонкі, а таксама іншых пакінутых, згодна з патрабаваннямі справядлівасці, хрысціянскай любові і натуральнай сувымернасці.

Кан. 1149 – Неахрышчаны, які пасля прыняцця хросту ў Каталіцкім Касцёле не зможа аднавіць сумеснае жыццё з неахрышчаным сужэнцам па прычыне зняволення або пераследу, можа заключыць новае сужэнства, нават калі другі бок у гэты час прыме хрост, пры гэтым захоўваецца прадпісанне кан. 1141.

Кан. 1150 – У выпадку сумнення прывілей веры карыстаецца прыхільнасцю права.

Can. 1149 – Non baptizatus qui, recepto in Ecclesia catholica baptismo, cum coniuge non baptizato ratione captivitatis vel persecutionis cohabitationem restaurare nequeat, aliud matrimonium contrahere potest, etiamsi altera pars baptismum interea receperit, firmo praescripto can. 1141.

Can. 1150 – In re dubia privilegium fidei gaudet favore iuris.

Артыкул 2. *Сепарацыя з захаваннем повязі*

Кан. 1151 – Сужэнцы маюць абавязак і права захоўваць сумеснае сужэнскае жыццё, калі іх не апраўдвае легітымная прычына.

Кан. 1152 – § 1. Пры тым, што вельмі рэкамендуецца, каб сужэнец, кіруючыся хрысціянскай любоўю і клапоцячыся аб дабры сям'і, не адмаўляў чужаложнаму боку ў прабачэнні і не разрываў сужэнскага жыцця, аднак, калі ён выразна або моўчкі не прабачыць гэтую віну, ён мае права спыніць сумеснае сужэнскае жыццё, калі не згадзіўся на чужалоства, або не даў для яго падставу, або сам таксама не здзейсніў чужалоства.

§ 2. Маўклівае прабачэнне адбылося тады, калі невінаваты сужэнец, будучы ўпэўненым у здзейсненым чужалостве, дабравольна працягвае жыць у сужэнскіх пачуццях сумесна з другім сужэнцам; аб гэтым мяркуецца, калі на працягу шасці месяцаў ён захоўваў сумеснае сужэнскае жыццё і не звяртаўся да касцёльнай ці дзяржаўнай улады.

§ 3. Калі невінаваты сужэнец дабравольна спыніць сумеснае сужэнскае жыццё, ён павінен на працягу шасці месяцаў звярнуцца ў справе сепарацыі да кампетэнтнай кас-

Art. 2. *De separatione manente vinculo*

Can. 1151 – Coniuges habent officium et ius servandi convictum coniugalem, nisi legitima causa eos excuset.

Can. 1152 – § 1. Licet enixe commendetur ut coniux, caritate christiana motus et boni familiae sollicitus, veniam non abnuat comparti adulterae atque vitam coniugalem non disrumpat, si tamen eiusdem culpam expresse aut tacite non condonaverit, ius ipsi est solvendi coniugalem convictum, nisi in adulterium consenserit aut eidem causam dederit aut ipse quoque adulterium commiserit.

§ 2. Tacita condonatio habetur si coniux innocens, postquam de adulterio certior factus est, sponte cum altero coniuge maritali affectu conversatus fuerit; praesumitur vero, si per sex menses coniugalem convictum servaverit, neque recursum apud auctoritatem ecclesiasticam vel civilem fecerit.

§ 3. Si coniux innocens sponte convictum coniugalem solverit, intra sex menses causam separationis deferat ad competentem auctoritatem eccle-

siasticam, quae, omnibus inspectis adiunctis, perpendat si coniux innocens adduci possit ad culpam condonandam et ad separationem in perpetuum non protrahendam.

цёльнай улады, якая павінна, узяўшы пад увагу ўсе абставіны, разважыць, ці можа невінаваты сужэнец быць прыведзены да таго, каб прабачыў гэтую віну і не працягваў сепарацыю на пастаянна.

Can. 1153 – § 1. Si alteruter coniugum grave seu animi seu corporis periculum alteri aut proli facessat, vel aliter vitam communem nimis duram reddat, alteri legitimam praebet causam discedendi, decreto Ordinarii loci et, si periculum sit in mora, etiam propria auctoritate.

Кан. 1153 – § 1. Калі адзін з сужэнцаў уяўляе сабой сур'ёзную небяспеку для душы або цела другога сужэнца ці патомства або якім-небудзь іншым чынам робіць сумеснае жыццё празмерна цяжкім, ён дае другому сужэнцу легітымную падставу для адыходу на моцы дэкрэта ардынарыя месца або нават паводле ўласнага рашэння, калі затрымка пагражае небяспекай.

§ 2. In omnibus casibus, causa separationis cessante, coniugalis convictus restaurandus est, nisi ab auctoritate ecclesiastica aliter statuatur.

§ 2. У кожным выпадку, калі падстава для сепарацыі перастане існаваць, сумеснае сужэнскае жыццё павінна быць адноўлена, калі касцёльная ўлада не пастановіць інакчай.

Can. 1154 – Instituta separatione coniugum, opportune semper cavendum est debitae filiorum sustentationi et educationi.

Кан. 1154 – Калі сепарацыя адбылася, заўсёды трэба адпаведным чынам паклапаціцца аб належным утрыманні і выхаванні дзяцей.

Can. 1155 – Coniux innocens laudabiliter alterum coniugem ad vitam coniugalem rursus admittere potest, quo in casu iuri separationis renuntiat.

Кан. 1155 – Невінаваты сужэнец можа пахвальным чынам зноў дапусціць другога сужэнца да сужэнскага жыцця; у гэтым выпадку ён адмаўляецца ад права на сепарацыю.

Caput X
De matrimonii convalidatione

Раздзел X
Канвалідацыя сужэнства

Art. 1. *De convalidatione simplici*

Артыкул 1. *Простая канвалідацыя*

Can. 1156 – § 1. Ad convalidandum matrimonium irritum ob impedimentum dirimens, requiritur ut cesset impedimentum vel ab eodem dispensetur, et consensum renovet saltem pars impedimenti conscia.

Кан. 1156 – § 1. Для канвалідацыі сужэнства, нядзейснага па прычыне перашкоды, якая выклікае нядзейснасць, патрабуецца, каб гэтая перашкода перастала існаваць або ад яе была ўдзелена дыспенсацыя, а згода была адноўлена прынамсі тым бокам, які ведаў аб перашкодзе.

§ 2. Гэтае аднаўленне патрабуецца касцёльным правам для дзейснасці канвалідацыі, нават калі абодва бакі першапачаткова выявілі згоду і яна не была адклікана пасля.

Кан. 1157 – Аднаўленне згоды павінна быць новым дзеяннем волі адносна сужэнства, аб якім той бок, які аднаўляе згоду, ведае або мяркуе, што яно ад пачатку было нядзейсным.

Кан. 1158 – § 1. Калі перашкода з'яўляецца публічнай, то згода павінна быць адноўлена абодвума бакамі ў адпаведнасці з кананічнай формай, захоўваючы прадпісанні кан. 1127 § 2.

§ 2. Калі перашкода не можа быць даказана, дастаткова, каб згода была адноўлена прыватна і таемна, і пры гэтым тым бокам, які ведаў аб перашкодзе, калі толькі другі бок трывае ў раней выяўленай згодзе, або двума бакамі, калі ім абодвум было вядома аб перашкодзе.

Кан. 1159 – § 1. Сужэнства, нядзейснае па прычыне заганы згоды, канвалідуецца, калі бок, які не выяўляў згоду, цяпер выявіць згоду, калі толькі трывае згода, выяўленая раней другім бокам.

§ 2. Калі загана згоды не можа быць даказана, дастаткова, каб бок, які не выяўляў згоду, цяпер выявіў яе прыватна і таемна.

§ 3. Калі загана згоды можа быць даказана, неабходна, каб згода была выяўлена ў адпаведнасці з кананічнай формай.

Кан. 1160 – Для таго, каб сужэнства, нядзейснае па прычыне заганы формы, магло стаць дзейсным, яно павінна быць заключана нанова ў адпаведнасці з кананічнай формай, захоўваючы прадпісанні кан. 1127 § 2.

§ 2. Haec renovatio iure ecclesiastico requiritur ad validitatem convalidationis, etiamsi initio utraque pars consensum praestiterit nec postea revocaverit.

Can. 1157 – Renovatio consensus debet esse novus voluntatis actus in matrimonium, quod pars renovans scit aut opinatur ab initio nullum fuisse.

Can. 1158 – § 1. Si impedimentum sit publicum, consensus ab utraque parte renovandus est forma canonica, salvo praescripto can. 1127, § 2.

§ 2. Si impedimentum probari nequeat, satis est ut consensus renovetur privatim et secreto, et quidem a parte impedimenti conscia, dummodo altera in consensu praestito perseveret, aut ab utraque parte, si impedimentum sit utrique parti notum.

Can. 1159 – § 1. Matrimonium irritum ob defectum consensus convalidatur, si pars quae non consenserat, iam consentiat, dummodo consensus ab altera parte praestitus perseveret.

§ 2. Si defectus consensus probari nequeat, satis est ut pars, quae non consenserat, privatim et secreto consensum praestet.

§ 3. Si defectus consensus probari potest, necesse est ut consensus forma canonica praestetur.

Can. 1160 – Matrimonium nullum ob defectum formae, ut validum fiat, contrahi denuo debet forma canonica, salvo praescripto can. 1127, § 2.

Art. 2. *De sanatione in radice*

Can. 1161 – § 1. Matrimonii irriti sanatio in radice est eiusdem, sine renovatione consensus, convalidatio, a competenti auctoritate concessa, secumferens dispensationem ab impedimento, si adsit, atque a forma canonica, si servata non fuerit, necnon retrotractionem effectuum canonicorum ad praeteritum.

§ 2. Convalidatio fit a momento concessionis gratiae; retrotractio vero intellegitur facta ad momentum celebrationis matrimonii, nisi aliud expresse caveatur.

§ 3. Sanatio in radice ne concedatur, nisi probabile sit partes in vita coniugali perseverare velle.

Can. 1162 – § 1. Si in utraque vel alterutra parte deficiat consensus, matrimonium nequit sanari in radice, sive consensus ab initio defuerit, sive ab initio praestitus, postea fuerit revocatus.

§ 2. Quod si consensus ab initio quidem defuerat, sed postea praestitus est, sanatio concedi potest a momento praestiti consensus.

Can. 1163 – § 1. Matrimonium irritum ob impedimentum vel ob defectum legitimae formae sanari potest, dummodo consensus utriusque partis perseveret.

§ 2. Matrimonium irritum ob impedimentum iuris naturalis aut divini positivi sanari potest solummodo postquam impedimentum cessavit.

Can. 1164 – Sanatio valide concedi potest etiam alterutra vel utraque parte inscia; ne autem concedatur nisi ob gravem causam.

Артыкул 2. *Санацыя ад пачатку*

Кан. 1161 – § 1. Санацыя ад пачатку — гэта ўдзеленая кампетэнтнай уладай без аднаўлення згоды канвалідацыя нядзейснага сужэнства, якая нясе з сабой дыспенсацыю ад перашкоды, калі б яна існавала, і ад кананічнай формы, калі яна не была захавана, а таксама прыдае зваротную сілу кананічным наступствам.

§ 2. Канвалідацыя наступае ад моманту ўдзялення ласкі, пры гэтым разумеецца, што дзеянне зваротнай сілы распаўсюджваецца да моманту заключэння сужэнства, калі не будзе выразна прадугледжана іншае.

§ 3. Санацыя ад пачатку не павінна ўдзяляцца, калі не будзе праўдападобна, што бакі жадаюць працягваць сужэнскае жыццё.

Кан. 1162 – § 1. Калі адсутнічае згода з абодвух бакоў або з аднаго боку, сужэнства не можа атрымаць санацыю ад пачатку незалежна ад таго, ці згода адсутнічала ад пачатку, ці спачатку яна была выяўлена, а затым адклікана.

§ 2. Калі згода спачатку адсутнічала, але пасля была выяўлена, санацыя можа быць удзелена ад моманту выяўлення згоды.

Кан. 1163 – § 1. Сужэнства, нядзейснае па прычыне перашкоды або заганы легітымнай формы, можа атрымаць санацыю, калі толькі трывае згода абодвух бакоў.

§ 2. Сужэнства, нядзейснае па прычыне перашкоды, якая паходзіць з натуральнага або пазітыўнага Божага права, можа атрымаць санацыю толькі пасля таго, як перашкода перастане існаваць.

Кан. 1164 – Санацыя можа быць удзелена дзейсна нават у тым выпадку, калі аб гэтым не ведае адзін з бакоў ці абодва бакі; аднак яна не павінна быць удзелена, калі не па важкай прычыне.

Кан. 1165 – § 1. Санацыя ад пачатку можа быць удзелена Апостальскай Сталіцай.

§ 2. У асобных выпадках яе можа ўдзяліць дыяцэзіяльны біскуп, нават тады, калі ў адным сужэнстве існуе некалькі падстаў нядзейснасці; пры гэтым для санацыі змешанага сужэнства павінны быць выкананы ўмовы, аб якіх гаворыцца ў кан. 1125; аднак дыяцэзіяльны біскуп не можа ўдзяліць санацыю, калі існуе перашкода, дыспенсацыя ад якой зарэзервавана за Апостальскай Сталіцай згодна з нормай кан. 1078 § 2, або калі гаворка ідзе пра перашкоду, якая паходзіць з натуральнага або пазітыўнага Божага права, якая перастала існаваць.

Can. 1165 – § 1. Sanatio in radice concedi potest ab Apostolica Sede.

§ 2. Concedi potest ab Episcopo dioecesano in singulis casibus, etiam si plures nullitatis rationes in eodem matrimonio concurrant, impletis condicionibus, de quibus in can. 1125, pro sanatione matrimonii mixti; concedi autem ab eodem nequit, si adsit impedimentum cuius dispensatio Sedi Apostolicae reservatur ad normam can. 1078, § 2, aut agatur de impedimento iuris naturalis aut divini positivi quod iam cessavit.

ЧАСТКА II
ІНШЫЯ ДЗЕЯННІ БОЖАГА КУЛЬТУ

ТЫТУЛ I
САКРАМЭНТАЛІІ

Кан. 1166 – Сакрамэнталіі — гэта святыя знакі, якія, маючы акрэсленае падабенства да сакрамэнтаў, указваюць на даброты, перадусім духоўныя, якія атрымліваюцца праз заступніцтва Касцёла.

Кан. 1167 – § 1. Толькі Апостальская Сталіца можа ўстанаўліваць новыя сакрамэнталіі, аўтэнтычна інтэрпрэтаваць існуючыя, ліквідаваць або змяняць некаторыя з іх.

§ 2. Падчас цэлебрацыі, іншымі словамі — удзялення сакрамэнталіяў, павінны дакладна захоўвацца абрады і формулы, зацверджаныя ўладай Касцёла.

Кан. 1168 – Служыцелем сакрамэнталіяў з'яўляецца духоўная асоба, надзеленая належнай уладай; згодна з нормамі літургічных кніг, паводле суджэння ардынарыя

PARS II
DE CETERIS ACTIBUS CULTUS DIVINI

TITULUS I
DE SACRAMENTALIBUS

Can. 1166 – Sacramentalia sunt signa sacra, quibus, ad aliquam sacramentorum imitationem, effectus praesertim spirituales significantur et ex Ecclesiae impetratione obtinentur.

Can. 1167 – § 1. Nova sacramentalia constituere aut recepta authentice interpretari, ex eis aliqua abolere aut mutare, sola potest Sedes Apostolica.

§ 2. In sacramentalibus conficiendis seu administrandis accurate serventur ritus et formulae ab Ecclesiae auctoritate probata.

Can. 1168 – Sacramentalium minister est clericus debita potestate instructus; quaedam sacramentalia, ad normam librorum liturgicorum, de iudicio loci Ordinarii, a laicis quo-

que, congruis qualitatibus praeditis, administrari possunt.

месца, некаторыя сакрамэнталіі могуць удзяляць таксама свецкія асобы, якія маюць адпаведныя якасці.

Can. 1169 – § 1. Consecrationes et dedicationes valide peragere possunt qui charactere episcopali insigniti sunt, necnon presbyteri quibus iure vel legitima concessione id permittitur.

Кан. 1169 – § 1. Кансэкрацыі і пасвячэнні могуць здзяйсняць дзейсным чынам тыя, хто маюць біскупскую годнасць, а таксама прэзбітэры, якім гэта дазволена правам або легітымным даручэннем.

§ 2. Benedictiones, exceptis iis quae Romano Pontifici aut Episcopis reservantur, impertire potest quilibet presbyter.

§ 2. Благаслаўленні, за выключэннем тых, якія зарэзерваваны за Рымскім Пантыфікам або біскупамі, можа ўдзяляць кожны прэзбітэр.

§ 3. Diaconus illas tantum benedictiones impertire potest, quae ipsi expresse iure permittuntur.

§ 3. Дыякан можа ўдзяляць толькі тыя благаслаўленні, якія яму выразна дазволены правам.

Can. 1170 – Benedictiones, imprimis impertiendae catholicis, dari possunt catechumenis quoque, immo, nisi obstet Ecclesiae prohibitio, etiam non catholicis.

Кан. 1170 – Благаслаўленні, якія перадусім павінны ўдзяляцца католікам, могуць быць удзелены таксама катэхумэнам, а нават — калі Касцёл не забараняе — некатолікам.

Can. 1171 – Res sacrae, quae dedicatione vel benedictione ad divinum cultum destinatae sunt, reverenter tractentur nec ad usum profanum vel non proprium adhibeantur, etiamsi in dominio sint privatorum.

Кан. 1171 – Са святымі рэчамі, прызначанымі праз пасвячэнне або благаслаўленне для Божага культу, трэба абыходзіцца з пашанай, яны не павінны ўжывацца для свецкіх або неўласцівых ім мэтаў, нават калі знаходзяцца ў прыватнай уласнасці.

Can. 1172 – § 1. Nemo exorcismos in obsessos proferre legitime potest, nisi ab Ordinario loci peculiarem et expressam licentiam obtinuerit.

Кан. 1172 – § 1. Ніхто не можа легітымна здзяйсняць экзарцызмы над апантанымі, калі не атрымаў асаблівы і выразны дазвол ад ардынарыя месца.

§ 2. Haec licentia ab Ordinario loci concedatur tantummodo presbytero pietate, scientia, prudentia ac vitae integritate praedito.

§ 2. Гэты дазвол павінен удзяляцца ардынарыем месца толькі такому прэзбітэру, які адзначаецца пабожнасцю, ведамі, разважлівасцю і бездакорнасцю жыцця.

TITULUS II
DE LITURGIA HORARUM

ТЫТУЛ II
ЛІТУРГІЯ ГАДЗІНАЎ

Can. 1173 – Ecclesia, sacerdotale munus Christi adimplens, liturgiam horarum celebrat, qua Deum ad po-

Кан. 1173 – Касцёл, выконваючы святарскае заданне Хрыста, цэлебруе Літургію гадзінаў, у якой, слухаючы Бога, які прамаўляе

да свайго народа, і ўспамінаючы таямніцу збаўлення, бесперапынна праслаўляе Бога спевам і малітвай, а таксама просіць аб збаўленні ўсяго свету.

Кан. 1174 – § 1. Духоўныя асобы звязаны абавязкам здзяйсняць Літургію гадзінаў згодна з нормай кан. 276 § 2, 3°, а члены інстытутаў кансэкраванага жыцця і таварыстваў апостальскага жыцця — згодна з нормамі ўласных канстытуцый.

§ 2. Таксама іншыя вернікі — у залежнасці ад абставінаў — вельмі заахвочваюцца да таго, каб прымалі ўдзел у Літургіі гадзінаў, як дзеянні Касцёла.

Кан. 1175 – Пры здзяйсненні Літургіі гадзінаў трэба — наколькі гэта магчыма — прытрымлівацца перыяду часу, які з'яўляецца адпаведным для кожнай гадзіны.

pulum suum loquentem audiens et memoriam mysterii salutis agens, Ipsum sine intermissione, cantu et oratione, laudat atque interpellat pro totius mundi salute.

Can. 1174 – § 1. Obligatione liturgiae horarum persolvendae adstringuntur clerici, ad normam can. 276, § 2, n. 3; sodales vero institutorum vitae consecratae necnon societatum vitae apostolicae, ad normam suarum constitutionum.

§ 2. Ad participandam liturgiam horarum, utpote actionem Ecclesiae, etiam ceteri christifideles, pro adiunctis, enixe invitantur.

Can. 1175 – In liturgia horarum persolvenda, quantum fieri potest, verum tempus servetur uniuscuiusque horae.

ТЫТУЛ III
КАСЦЁЛЬНАЕ ПАХАВАННЕ

Кан. 1176 – § 1. Памерлыя вернікі павінны мець касцёльнае пахаванне згодна з нормамі права.

§ 2. Касцёльнае пахаванне, праз якое Касцёл выпрошвае духоўную дапамогу для памерлых, аказвае пашану іх целам і разам з тым дае жывым суцяшэнне надзеі, павінна цэлебравацца згодна з нормамі літургічных законаў.

§ 3. Касцёл вельмі заахвочвае захоўваць пабожны звычай пахавання целаў памерлых; пры гэтым не забараняе крэмацыю, калі яна не была выбрана па прычынах, супраціўных хрысціянскаму вучэнню.

TITULUS III
DE EXEQUIIS ECCLESIASTICIS

Can. 1176 – § 1. Christifideles defuncti exequiis ecclesiasticis ad normam iuris donandi sunt.

§ 2. Exequiae ecclesiasticae, quibus Ecclesia defunctis spiritualem opem impetrat eorumque corpora honorat ac simul vivis spei solacium affert, celebrandae sunt ad normam legum liturgicarum.

§ 3. Enixe commendat Ecclesia, ut pia consuetudo defunctorum corpora sepeliendi servetur; non tamen prohibet cremationem, nisi ob rationes christianae doctrinae contrarias electa fuerit.

Caput I

De exequiarum celebratione

Can. 1177 – § 1. Exequiae pro quolibet fideli defuncto generatim in propriae paroeciae ecclesia celebrari debent.

§ 2. Fas est autem cuilibet fideli, vel iis quibus fidelis defuncti exequias curare competit, aliam ecclesiam funeris eligere de consensu eius, qui eam regit, et monito defuncti parocho proprio.

§ 3. Si extra propriam paroeciam mors acciderit, neque cadaver ad eam translatum fuerit, neque aliqua ecclesia funeris legitime electa, exequiae celebrentur in ecclesia paroeciae ubi mors accidit, nisi alia iure particulari designata sit.

Can. 1178 – Exequiae Episcopi dioecesani in propria ecclesia cathedrali celebrentur, nisi ipse aliam ecclesiam elegerit.

Can. 1179 – Exequiae religiosorum aut sodalium societatis vitae apostolicae generatim celebrentur in propria ecclesia aut oratorio a Superiore, si institutum aut societas sint clericalia, secus a cappellano.

Can. 1180 – § 1. Si paroecia proprium habeat coemeterium, in eo tumulandi sunt fideles defuncti, nisi aliud coemeterium legitime electum fuerit ab ipso defuncto vel ab iis quibus defuncti sepulturam curare competit.

§ 2. Omnibus autem licet, nisi iure prohibeantur, eligere coemeterium sepulturae.

Раздзел I

Цэлебрацыя пахавання

Кан. 1177 – § 1. Пахаванне кожнага памерлага верніка павінна, як правіла, цэлебравацца ва ўласным парафіяльным касцёле.

§ 2. Аднак кожнаму верніку або тым асобам, якім належыць клопат аб пахаванні памерлага верніка, дазваляецца выбраць для пахавання іншы касцёл са згоды таго, хто ім кіруе, паведаміўшы аб гэтым уласнага пробашча памерлага.

§ 3. Калі смерць наступіла па-за ўласнай парафіяй і цела не будзе туды перавезена, а іншы касцёл для пахавання не быў легітымна выбраны, пахаванне павінна цэлебравацца ў касцёле парафіі, дзе наступіла смерць, калі партыкулярнае права не вызначае іншы касцёл.

Кан. 1178 – Пахаванне дыяцэзіяльнага біскупа павінна цэлебравацца ва ўласным катэдральным касцёле, калі ён сам не выбраў іншы касцёл.

Кан. 1179 – Пахаванне членаў манаскіх інстытутаў або таварыстваў апостальскага жыцця павінна, як правіла, цэлебравацца ва ўласным касцёле або араторыі настаяцелем — калі інстытут або таварыства з'яўляюцца святарскімі, або капеланам — у іншых выпадках.

Кан. 1180 – § 1. Калі парафія мае ўласныя могілкі, то памерлыя вернікі павінны быць пахаваны на іх, калі сам памерлы або тыя асобы, якім належыць клопат аб пахаванні памерлага, не выбралі легітымна іншыя могілкі.

§ 2. Кожнаму дазваляецца выбраць могілкі для свайго пахавання, калі права гэтага не забараняе.

Кан. 1181 – Што датычыць ахвяраванняў з нагоды пахавання, павінны быць захаваны прадпісанні кан. 1264, аднак такім чынам, каб ніякай асобе не аддавалася перавага пры пахаванні і каб бедныя не былі пазбаўлены належнага пахавання.

Кан. 1182 – Пасля пахавання павінен быць зроблены запіс у кнізе памерлых згодна з нормамі партыкулярнага права.

Can. 1181 – Ad oblationes occasione funerum quod attinet, serventur praescripta can. 1264, cauto tamen ne ulla fiat in exequiis personarum acceptio neve pauperes debitis exequiis priventur.

Can. 1182 – Expleta tumulatione, inscriptio in librum defunctorum fiat ad normam iuris particularis.

Раздзел II
Тыя, каму павінна быць удзелена каталіцкае пахаванне або ў ім адмоўлена

Caput II
De iis quibus exequiae ecclesiasticae concedendae sunt aut denegandae

Кан. 1183 – § 1. У тым, што датычыць пахавання, катэхумэны прыраўноўваюцца да вернікаў.

§ 2. Ардынарый месца можа дазволіць на касцёльнае пахаванне дзяцей, якіх бацькі мелі намер ахрысціць, але якія памерлі да хросту.

§ 3. Ахрышчаным, якія належаць да якога-небудзь некаталіцкага Касцёла або касцёльнай супольнасці, можа быць удзелена касцёльнае пахаванне паводле разважлівага суджэння ардынарыя месца, калі не будзе вядома, што іх воля была супраціўнай, і калі толькі будзе немагчыма звярнуцца да іх уласнага служыцеля.

Can. 1183 – § 1. Ad exequias quod attinet, christifidelibus catechumeni accensendi sunt.

§ 2. Ordinarius loci permittere potest ut parvuli, quos parentes baptizare intendebant quique autem ante baptismum mortui sunt, exequiis ecclesiasticis donentur.

§ 3. Baptizatis alicui Ecclesiae aut communitati ecclesiali non catholicae adscriptis, exequiae ecclesiasticae concedi possunt de prudenti Ordinarii loci iudicio, nisi constet de contraria eorum voluntate et dummodo minister proprius haberi nequeat.

Кан. 1184 – § 1. Калі перад смерцю не дадуць якіх-небудзь знакаў пакаяння, каталіцкага пахавання павінны быць пазбаўлены:

1° юрыдычна пацверджаныя апастаты, ерэтыкі і схізматыкі;

2° тыя, хто выбралі крэмацыю ўласнага цела па прычынах, супраціўных хрысціянскай веры;

3° іншыя яўныя грэшнікі, якім каталіцкае пахаванне не можа быць удзе-

Can. 1184 – § 1. Exequiis ecclesiasticis privandi sunt, nisi ante mortem aliqua dederint paenitentiae signa:

1° notorii apostatae, haeretici et schismatici;

2° qui proprii corporis crematione elegerint ob rationes fidei christianae adversas;

3° alii peccatores manifesti, quibus exequiae ecclesiasticae non

sine publico fidelium scandalo concedi possunt.

§ 2. Occurrente aliquo dubio, consulatur loci Ordinarius, cuius iudicio standum est.

Can. 1185 – Excluso ab ecclesiasticis exequiis deneganda quoque est quaelibet Missa exequialis.

лена без публічнай спакусы для вернікаў.

§ 2. Пры наяўнасці якога-небудзь сумнення трэба параіцца з ардынарыем месца, рашэнню якога трэба падпарадкавацца.

Кан. 1185 – Пазбаўленаму касцёльнага пахавання павінна быць адмоўлена таксама ў любой пахавальнай Імшы.

TITULUS IV

DE CULTU SANCTORUM, SACRARUM IMAGINUM ET RELIQUIARUM

ТЫТУЛ IV

КУЛЬТ СВЯТЫХ, СВЯТЫХ АБРАЗОЎ І РЭЛІКВІЙ

Can. 1186 – Ad sanctificationem populi Dei fovendam, Ecclesia peculiari et filiali christifidelium venerationi commendat Beatam Mariam semper Virginem, Dei Matrem, quam Christus hominum omnium Matrem constituit, atque verum et authenticum promovet cultum aliorum Sanctorum, quorum quidem exemplo christifideles aedificantur et intercessione sustentantur.

Кан. 1186 – Для спрыяння асвячэнню Божага народа Касцёл заахвочвае вернікаў да асаблівага і сыноўняга ўшаноўвання Найсвяцейшай Багародзіцы Марыі, заўсёды Панны, якую Хрыстус устанавіў Маці ўсіх людзей, а таксама падтрымлівае сапраўдны і аўтэнтычны культ іншых святых, прыклад якіх настаўляе вернікаў, якія ўмацоўваюцца іх заступніцтвам.

Can. 1187 – Cultu publico eos tantum Dei servos venerari licet, qui auctoritate Ecclesiae in album Sanctorum vel Beatorum relati sint.

Кан. 1187 – Аддаваць пашану праз публічны культ дазваляецца толькі тым слугам Божым, якія аўтарытэтам Касцёла былі залічаны да ліку святых або благаслаўлёных.

Can. 1188 – Firma maneat praxis in ecclesiis sacras imagines fidelium venerationi proponendi; attamen moderato numero et congruo ordine exponantur, ne populi christiani admiratio excitetur, neve devotioni minus rectae ansa praebeatur.

Кан. 1188 – Павінна захоўвацца практыка размяшчэння святых абразоў у касцёлах для ўшаноўвання іх вернікамі; аднак яны павінны выстаўляцца ва ўмеранай колькасці і ў адпаведным парадку, каб гэта не выклікала здзіўлення ў хрысціянскага народа і не стварала падставу для неўласцівай пабожнасці.

Can. 1189 – Imagines pretiosae, idest vetustate, arte, aut cultu praestantes, in ecclesiis vel oratoriis fidelium venerationi expositae, si quando repara-

Кан. 1189 – Калі каштоўныя абразы, гэта значыць такія, якія вылучаюцца старажытнасцю, мастацтвам або культам, які ім аддаецца, выстаўленыя ў касцёлах або арато-

рыях для ўшаноўвання іх вернікамі, патрабуюць рэстаўрацыі, яны ніколі не могуць рэстаўравацца без пісьмовай згоды ардынарыя, які перад удзяленнем згоды павінен параіцца са спецыялістамі.

Кан. 1190 – § 1. Продаж святых рэліквій забаронены.

§ 2. Значныя рэліквіі, а таксама іншыя, якія з вялікай пашанай ушаноўваюцца народам, не могуць быць дзейсна адчужаны любым спосабам або перанесены на пастаянна без дазволу Апостальскай Сталіцы.

§ 3. Прадпісанне § 2 прымяняецца таксама да абразоў, якія ў якім-небудзь касцёле ўшаноўваюцца народам з вялікай пашанай.

tione indigeant, numquam restaurentur sine data scripto licentia ab Ordinario; qui, antequam eam concedat, peritos consulat.

Can. 1190 – § 1. Sacras reliquias vendere nefas est.

§ 2. Insignes reliquiae itemque aliae, quae magna populi veneratione honorantur, nequeunt quoquo modo valide alienari neque perpetuo transferri sine Apostolicae Sedis licentia.

§ 3. Praescriptum § 2 valet etiam pro imaginibus, quae in aliqua ecclesia magna populi veneratione honorantur.

ТЫТУЛ V
КЛЯТВА І ПРЫСЯГА

Раздзел I
Клятва

Кан. 1191 – § 1. Клятва — гэта дадзенае Богу свядомае і дабравольнае абяцанне, прадметам якога з'яўляецца магчымае і большае дабро; клятва павінна быць выканана з увагі на цноту рэлігійнасці.

§ 2. Калі права не забараняе, кожны, хто мае адпаведнае карыстанне розумам, з'яўляецца здольным да давання клятвы.

§ 3. Клятва, дадзеная пад уздзеяннем моцнага і несправядлівага страху або ў выніку падману, з'яўляецца нядзейснай на моцы самога права.

Кан. 1192 – § 1. Клятва з'яўляецца публічнай, калі прымаецца легітымным настаяцелем ад імя Касцёла; у іншых выпадках яна з'яўляецца прыватнай.

§ 2. Клятва з'яўляецца ўрачыстай, калі ў такой якасці прызнаецца Касцёлам; у іншых выпадках яна з'яўляецца простай.

TITULUS V
DE VOTO ET IUREIURANDO

Caput I
De voto

Can. 1191 – § 1. Votum, idest promissio deliberata ac libera Deo facta de bono possibili et meliore, ex virtute religionis impleri debet.

§ 2. Nisi iure prohibeantur, omnes congruenti rationis usu pollentes, sunt voti capaces.

§ 3. Votum metu gravi et iniusto vel dolo emissum ipso iure nullum est.

Can. 1192 – § 1. Votum est *publicum*, si nomine Ecclesiae a legitimo Superiore acceptetur; secus *privatum*.

§ 2. *Sollemne*, si ab Ecclesia uti tale fuerit agnitum; secus *simplex*.

§ 3. *Personale*, quo actio voventis promittitur; *reale*, quo promittitur res aliqua; *mixtum*, quod personalis et realis naturam participat.

Can. 1193 – Votum non obligat, ratione sui, nisi emittentem.

Can. 1194 – Cessat votum lapsu temporis ad finiendam obligationem appositi, mutatione substantiali materiae promissae, deficiente condicione a qua votum pendet aut eiusdem causa finali, dispensatione, commutatione.

Can. 1195 – Qui potestatem in voti materiam habet, potest voti obligationem tamdiu suspendere, quamdiu voti adimpletio sibi praeiudicium afferat.

Can. 1196 – Praeter Romanum Pontificem, vota privata possunt iusta de causa dispensare, dummodo dispensatio ne laedat ius aliis quaesitum:

1° loci Ordinarius et parochus, quod attinet ad omnes ipsorum subditos atque etiam peregrinos;

2° Superior instituti religiosi aut societatis vitae apostolicae, si sint clericalia iuris pontificii, quod attinet ad sodales, novitios atque personas, quae diu noctuque in domo instituti aut societatis degunt;

3° ii quibus ab Apostolica Sede vel ab Ordinario loci delegata fuerit dispensandi potestas.

Can. 1197 – Opus voto privato promissum potest in maius vel in aequale bonum ab ipso vovente commutari; in minus vero bonum, ab illo cui

§ 3. Клятва з'яўляецца асабістай, калі той, хто дае клятву, абяцае выканаць дзеянне; рэчавай — калі паабяцана якая-небудзь рэч; змешанай — калі па сваёй сутнасці з'яўляецца і асабістай, і рэчавай.

Кан. 1193 – З увагі на яе сутнасць, клятва абавязвае толькі таго, хто яе даў.

Кан. 1194 – Клятва спыняецца з заканчэннем часу, вызначанага для выканання абавязку, праз істотнае змяненне паабяцанага прадмета, у выпадку невыканання ўмовы, у залежнасць ад якой клятва была пастаўлена, або знікнення яе мэтавай прычыны, а таксама праз дыспенсацыю або замену.

Кан. 1195 – Той, хто мае ўладу ў адносінах да прадмета клятвы, можа прыпыніць абавязак, які з яе вынікае, на час, пакуль выкананне клятвы прычыняе яму шкоду.

Кан. 1196 – Акрамя Рымскага Пантыфіка, калі толькі дыспенсацыя не парушае правоў, набытых іншымі, дыспенсацыю ад прыватных клятваў могуць удзяляць па справядлівай прычыне:

1° ардынарый месца і пробашч — калі гаворка ідзе пра ўсіх іх падуладных, а таксама падарожных;

2° настаяцель манаскага інстытута або таварыства апостальскага жыцця, калі яны з'яўляюцца святарскімі папскага права, — калі гаворка ідзе пра членаў інстытута, навіцыяў, а таксама тых, хто днём і ноччу пражывае ў доме інстытута або таварыства;

3° тыя, каму Апостальскай Сталіцай або ардынарыем месца была дэлегавана ўлада ўдзялення дыспенсацыі.

Кан. 1197 – Прадмет, паабяцаны прыватнай клятвай, можа быць заменены на большае або роўнае дабро самой асобай, якая дала клятву; замяніць жа на меншае дабро

можа той, хто мае ўладу ўдзялення дыспенсацыі згодна з нормай кан. 1196.

Кан. 1198 – Клятвы, дадзеныя перад манаскімі абяцаннямі, прыпыняюцца на час, пакуль асоба, якая дала клятву, застаецца ў манаскім інстытуце.

potestas est dispensandi ad normam can. 1196.

Can. 1198 – Vota ante professionem religiosam emissa suspenduntur, donec vovens in instituto religioso permanserit.

Раздзел II
Прысяга

Caput II
De iureiurando

Кан. 1199 – § 1. Прысяга, якая азначае заклікання Божага Імя ў якасці сведкі праўды, не можа складацца іначай, як толькі праўдзіва, абдумана і справядліва.

§ 2. Прысяга, якая патрабуецца або дапускаецца канонамі, не можа быць дзейсна складзена праз прадстаўніка.

Can. 1199 – § 1. Iusiurandum, idest invocatio Nominis divini in testem veritatis, praestari nequit, nisi in veritate, in iudicio et in iustitia.

§ 2. Iusiurandum quod canones exigunt vel admittunt, per procuratorem praestari valide nequit.

Кан. 1200 – § 1. Асоба, якая дабравольна прысягае, што зробіць што-небудзь, звязана асаблівым рэлігійным абавязкам выканаць тое, што змацавала прысягай.

§ 2. Прысяга, вымушаная падманам, прымусам або моцным страхам, з'яўляецца нядзейснай на моцы самога права.

Can. 1200 – § 1. Qui libere iurat se aliquid facturum, peculiari religionis obligatione tenetur implendi, quod iureiurando firmaverit.

§ 2. Iusiurandum dolo, vi aut metu gravi extortum, ipso iure nullum est.

Кан. 1201 – § 1. Прысяга, прадметам якой з'яўляецца абяцанне, залежыць ад сутнасці і ўмоваў таго дзеяння, да якога далучана.

§ 2. Калі прысяга далучана да дзеяння, якое прама прычыняе шкоду іншым асобам або пагражае публічнаму дабру ці вечнаму збаўленню, то гэтае дзеянне не атрымлівае ад прысягі ніякага ўмацавання.

Can. 1201 – § 1. Iusiurandum promissorium sequitur naturam et condiciones actus cui adicitur.

§ 2. Si actui directe vergenti in damnum aliorum aut in praeiudicium boni publici vel salutis aeternae iusiurandum adiciatur, nullam exinde actus consequitur firmitatem.

Кан. 1202 – Абавязак, які вынікае з прысягі, прадметам якой з'яўляецца абяцанне, спыняецца:

1° калі ад яго вызваліць той, на чыю карысць прысяга была складзена;

2° калі прадмет прысягі істотна зменіцца, а таксама калі па прычыне змя-

Can. 1202 – Obligatio iureiurando promissorio inducta desinit:

1° si remittatur ab eo in cuius commodum iusiurandum emissum fuerat;

2° si res iurata substantialiter mutetur, aut, mutatis adiunctis, fiat

vel mala vel omnino indifferens, vel denique maius bonum impediat;

3° deficiente causa finali aut condicione sub qua forte iusiurandum datum est;

4° dispensatione, commutatione, ad normam can. 1203.

нення абставінаў ён або зробіцца дрэнным ці поўнасцю без значэння, або будзе перашкаджаць дасягненню большага дабра;

3° у выпадку знікнення мэтавай прычыны або невыканання ўмовы, ад якой залежала складанне прысягі;

4° праз дыспенсацыю або замену згодна з нормай кан. 1203.

Can. 1203 – Qui suspendere, dispensare, commutare possunt votum, eandem potestatem eademque ratione habent circa iusiurandum promissorium; sed si iurisiurandi dispensatio vergat in praeiudicium aliorum qui obligationem remittere recusent, una Apostolica Sedes potest iusiurandum dispensare.

Кан. 1203 – Тыя, хто могуць прыпыняць клятву, дыспенсаваць ад яе і змяняць яе, маюць такую ж уладу і на такой жа падставе ў адносінах да прысягі, прадметам якой з'яўляецца абяцанне; аднак калі б дыспенсацыя ад прысягі прычыняла шкоду іншым асобам, якія адмаўляюцца вызваліць ад абавязку, то дыспенсацыю можа ўдзяліць толькі Апостальская Сталіца.

Can. 1204 – Iusiurandum stricte est interpretandum secundum ius et secundum intentionem iurantis aut, si hic dolo agat, secundum intentionem illius cui iusiurandum praestatur.

Кан. 1204 – Прысяга павінна быць інтэрпрэтавана вузка, паводле права і паводле намеру таго, хто яе склаў, або, калі гэтая асоба дзейнічала з падманам, — паводле намеру асобы, якая прымала прысягу.

PARS III
DE LOCIS ET TEMPORIBUS SACRIS

ЧАСТКА III
СВЯТЫЯ МЕСЦЫ І ЧАСЫ

TITULUS I
DE LOCIS SACRIS

ТЫТУЛ І
СВЯТЫЯ МЕСЦЫ

Can. 1205 – Loca sacra ea sunt quae divino cultui fideliumve sepulturae deputantur dedicatione vel benedictione, quam liturgici libri ad hoc praescribunt.

Кан. 1205 – Святымі месцамі з'яўляюцца тыя месцы, якія прызначаюцца для Божага культу або пахавання вернікаў праз пасвячэнне або благаслаўленне, прадпісаныя для гэтага ў літургічных кнігах.

Can. 1206 – Dedicatio alicuius loci spectat ad Episcopum dioecesanum et ad eos qui ipsi iure aequiparantur; iidem possunt cuilibet Episcopo vel,

Кан. 1206 – Права на пасвячэнне якога-небудзь месца належыць дыяцэзіяльнаму біскупу, а таксама тым, хто прыраўноўваецца да яго ў праве; яны могуць любому біску-

пу або, у выключных выпадках, прэзбітэру даручыць заданне здзяйснення пасвячэння на сваёй тэрыторыі.

in casibus exceptionalibus, presbytero munus committere dedicationem peragendi in suo territorio.

Кан. 1207 – Святыя месцы павінны быць благаслаўлены ардынарыем, аднак благаслаўленне касцёлаў зарэзервавана за дыяцэзіяльным біскупам; кожны з іх можа дэлегаваць для гэтага іншага святара.

Can. 1207 – Loca sacra benedicuntur ab Ordinario; benedictio tamen ecclesiarum reservatur Episcopo dioecesano; uterque vero potest alium sacerdotem ad hoc delegare.

Кан. 1208 – Павінен быць складзены дакумент для пацвярджэння здзейсненага пасвячэння або благаслаўлення касцёла, а таксама благаслаўлення могілак, адзін асобнік якога захоўваецца ў дыяцэзіяльнай Курыі, а другі — у архіве касцёла.

Can. 1208 – De peracta dedicatione vel benedictione ecclesiae, itemque de benedictione coemeterii redigatur documentum, cuius alterum exemplar in curia dioecesana, alterum in ecclesiae archivo servetur.

Кан. 1209 – Калі гэта не прычыніць каму-небудзь шкоды, то дастатковым доказам пасвячэння або благаслаўлення якога-небудзь месца з'яўляецца сведчанне адной асобы, якая знаходзіцца па-за ўсялякімі падазрэннямі.

Can. 1209 – Dedicatio vel benedictio alicuius loci, modo nemini damnum fiat, satis probatur etiam per unum testem omni exceptione maiorem.

Кан. 1210 – У святым месцы дапускаецца толькі тое, што служыць ажыццяўленню і падтрыманню культу, пабожнасці і рэлігіі, а забараняецца ўсё, што з'яўляецца неспалучальным са святасцю месца. Аднак у асобных выпадках ардынарый можа дазволіць выкарыстанне яго для іншых дзеянняў, якія не супярэчаць святасці месца.

Can. 1210 – In loco sacro ea tantum admittantur quae cultui, pietati, religioni exercendis vel promovendis inserviunt, ac vetatur quidquid a loci sanctitate absonum sit. Ordinarius vero per modum actus alios usus, sanctitati tamen loci non contrarios, permittere potest.

Кан. 1211 – Святыя месцы апаганьваюцца праз цяжка шкадлівыя дзеянні, злучаныя са спакусай для вернікаў, якія згодна з суджэннем ардынарыя месца з'яўляюцца настолькі цяжкімі і супярэчнымі святасці месца, што ў іх нельга ажыццяўляць культ да таго часу, пакуль шкода не будзе выпраўлена абрадам пакаяння згодна з нормамі літургічных кніг.

Can. 1211 – Loca sacra violantur per actiones graviter iniuriosas cum scandalo fidelium ibi positas, quae, de iudicio Ordinarii loci, ita graves et sanctitati loci contrariae sunt ut non liceat in eis cultum exercere, donec ritu paenitentiali ad normam librorum liturgicorum iniuria reparetur.

Кан. 1212 – Святыя месцы трацяць пасвячэнне або благаслаўленне, калі большая

Can. 1212 – Dedicationem vel benedictionem amittunt loca sacra,

si magna ex parte destructa fuerint, vel ad usus profanos permanenter decreto competentis Ordinarii vel de facto reducta.

Can. 1213 – Potestates suas et munera auctoritas ecclesiastica in locis sacris libere exercet.

іх частка была знішчана або яны перайдуць у пастаянны свецкі ўжытак дэкрэтам кампетэнтнага ардынарыя ці фактычна.

Кан. 1213 – У святых месцах касцёльная ўлада свабодна ажыццяўляе свае паўнамоцтвы і заданні.

Caput I
De ecclesiis

Раздзел I
Касцёлы

Can. 1214 – Ecclesiae nomine intellegitur aedes sacra divino cultui destinata, ad quam fidelibus ius est adeundi ad divinum cultum praesertim publice exercendum.

Кан. 1214 – Касцёлам называецца святы будынак, прызначаны для Божага культу, куды вернікі маюць права ўваходзіць для ажыццяўлення Божага культу, асабліва публічнага.

Can. 1215 – § 1. Nulla ecclesia aedificetur sine expresso Episcopi dioecesani consensu scriptis dato.

§ 2. Episcopus dioecesanus consensum ne praebeat nisi, audito consilio presbyterali et vicinarum ecclesiarum rectoribus, censeat novam ecclesiam bono animarum inservire posse, et media ad ecclesiae aedificationem et ad cultum divinum necessaria non esse defutura.

§ 3. Etiam instituta religiosa, licet consensum constituendae novae domus in dioecesi vel civitate ab Episcopo dioecesano rettulerint, antequam tamen ecclesiam in certo ac determinato loco aedificent, eiusdem licentiam obtinere debent.

Кан. 1215 – § 1. Ніякі касцёл не павінен будавацца без выразнай згоды дыяцэзіяльнага біскупа, дадзенай пісьмова.

§ 2. Дыяцэзіяльны біскуп не павінен удзяляць згоду, калі, выслухаўшы Святарскую Раду і рэктараў суседніх касцёлаў, не палічыць, што новы касцёл можа служыць для дабра душаў і што не будзе недахопу ў сродках, неабходных для пабудовы касцёла і Божага культу.

§ 3. Таксама манаскія інстытуты, нават атрымаўшы ад дыяцэзіяльнага біскупа згоду на заснаванне новага дома ў дыяцэзіі або горадзе, перад тым, як будаваць касцёл у акрэсленым і вызначаным месцы, павінны, аднак, атрымаць на гэта дазвол дыяцэзіяльнага біскупа.

Can. 1216 – In ecclesiarum aedificatione et refectione, adhibito peritorum consilio, serventur principia et normae liturgiae et artis sacrae.

Кан. 1216 – Пры будаўніцтве і рэстаўрацыі касцёлаў трэба, беручы пад увагу парады спецыялістаў, захоўваць прынцыпы і нормы літургіі і святога мастацтва.

Can. 1217 – § 1. Aedificatione rite peracta, nova ecclesia quam primum

Кан. 1217 – § 1. Калі будоўля будзе належным чынам скончана, новы касцёл павінен быць як мага хутчэй пасвячаны або

прынамсі благаслаўлены, захоўваючы законы святой літургіі.

§ 2. Касцёлы, асабліва катэдральныя і парафіяльныя, павінны быць пасвячаны ўрачыстым чынам.

Кан. 1218 – Кожны касцёл павінен мець свой тытул, які не можа быць зменены пасля здзяйснення пасвячэння.

Кан. 1219 – У касцёле, які быў легітымна пасвячаны або благаслаўлены, могуць здзяйсняцца ўсе дзеянні Божага культу, захоўваючы парафіяльныя правы.

Кан. 1220 – § 1. Усе, каго гэта датычыць, павінны клапаціцца аб тым, каб у касцёлах захоўваліся парадак і прыгажосць, адпаведныя дому Бога, і каб не дапускалася нічога, што было б несумяшчальным са святасцю месца.

§ 2. Для аховы святых рэчаў і каштоўнасцей трэба праяўляць уласцівы клопат аб іх захоўванні і выкарыстоўваць адпаведныя сродкі бяспекі.

Кан. 1221 – Уваход у касцёл падчас святых цэлебрацый павінен быць свабодны і бясплатны.

Кан. 1222 – § 1. Калі які-небудзь касцёл не можа ніякім чынам выкарыстоўвацца для Божага культу і адсутнічае магчымасць яго рэстаўрацыі, дыяцэзіяльны біскуп можа перадаць яго на свецкі, але не нікчэмны ўжытак.

§ 2. Калі іншыя важкія прычыны схіляюць да таго, каб больш не выкарыстоўваць які-небудзь касцёл для Божага культу, дыяцэзіяльны біскуп, выслухаўшы Святарскую Раду, можа перадаць яго на свецкі, але не нікчэмны ўжытак са згоды тых асобаў, якія легітымна набылі правы ў адносінах да гэтага касцёла, і калі толькі гэта не прычыніць ніякай шкоды дабру душаў.

dedicetur aut saltem benedicatur, sacrae liturgiae legibus servatis.

§ 2. Sollemni ritu dedicentur ecclesiae, praesertim cathedrales et paroeciales.

Can. 1218 – Unaquaeque ecclesia suum habeat titulum qui, peracta ecclesiae dedicatione, mutari nequit.

Can. 1219 – In ecclesia legitime dedicata vel benedicta omnes actus cultus divini perfici possunt, salvis iuribus paroecialibus.

Can. 1220 – § 1. Curent omnes ad quos res pertinet, ut in ecclesiis illa munditia ac decor serventur, quae domum Dei addeceant, et ab iisdem arceatur quidquid a sanctitate loci absonum sit.

§ 2. Ad bona sacra et pretiosa tuenda ordinaria conservationis cura et opportuna securitatis media adhibeantur.

Can. 1221 – Ingressus in ecclesiam tempore sacrarum celebrationum sit liber et gratuitus.

Can. 1222 – § 1. Si qua ecclesia nullo modo ad cultum divinum adhiberi queat et possibilitas non detur eam reficiendi, in usum profanum non sordidum ab Episcopo dioecesano redigi potest.

§ 2. Ubi aliae graves causae suadeant ut aliqua ecclesia ad divinum cultum amplius non adhibeatur, eam Episcopus dioecesanus, audito consilio presbyterali, in usum profanum non sordidum redigere potest, de consensu eorum qui iura in eadem sibi legitime vindicent, et dummodo animarum bonum nullum inde detrimentum capiat.

Caput II

De oratoriis
et de sacellis privatis

Can. 1223 – Oratorii nomine intellegitur locus divino cultui, in commodum alicuius communitatis vel coetus fidelium eo convenientium de licentia Ordinarii destinatus, ad quem etiam alii fideles de consensu Superioris competentis accedere possunt.

Can. 1224 – § 1. Ordinarius licentiam ad constituendum oratorium requisitam ne concedat, nisi prius per se vel per alium locum ad oratorium destinatum visitaverit et decenter instructum reppererit.

§ 2. Data autem licentia, oratorium ad usus profanos converti nequit sine eiusdem Ordinarii auctoritate.

Can. 1225 – In oratoriis legitime constitutis omnes celebrationes sacrae peragi possunt, nisi quae iure aut Ordinarii loci praescripto excipiantur, aut obstent normae liturgicae.

Can. 1226 – Nomine sacelli privati intellegitur locus divino cultui, in commodum unius vel plurium personarum physicarum, de licentia Ordinarii loci destinatus.

Can. 1227 – Episcopi sacellum privatum sibi constituere possunt, quod iisdem iuribus ac oratorium gaudet.

Can. 1228 – Firmo praescripto can. 1227, ad Missam aliasve sacras celebrationes in aliquo sacello privato peragendas requiritur Ordinarii loci licentia.

Can. 1229 – Oratoria et sacella privata benedici convenit secundum ritum

Раздзел II

Араторы
і прыватныя капліцы

Кан. 1223 – Араторыем называецца месца, прызначанае з дазволу ардынарыя для Божага культу з увагі на зручнасць акрэсленай супольнасці або групы вернікаў, якія там збіраюцца, куды са згоды кампетэнтнага настаяцеля могуць прыходзіць таксама іншыя вернікі.

Кан. 1224 – § 1. Ардынарый не павінен удзяляць дазвол, які патрабуецца на ўстанаўленне араторыя, калі перад гэтым асабіста або з дапамогай іншай асобы не здзейсніць візітацыю месца, прызначанага на араторый, і не ўпэўніцца ў тым, што яно ўладкавана належным чынам.

§ 2. Пасля ўдзялення дазволу араторый не можа быць прызначаны на свецкі ўжытак без улады гэтага ардынарыя.

Кан. 1225 – У легітымна заснаваных араторыях могуць здзяйсняцца ўсе святыя цэлебрацыі, акрамя тых, якія выключаны правам або прадпісаннем ардынарыя месца ці забараняюцца літургічнымі нормамі.

Кан. 1226 – Прыватнай капліцай называецца месца, прызначанае з дазволу ардынарыя месца для Божага культу з увагі на зручнасць адной або некалькіх фізічных асобаў.

Кан. 1227 – Біскупы могуць устанаўліваць для сябе прыватную капліцу, якая мае такія самыя правы, як араторый.

Кан. 1228 – Захоўваючы прадпісанне кан. 1227, на здзяйсненне Імшы і іншых святых цэлебрацый у якой-небудзь прыватнай капліцы патрабуецца дазвол ардынарыя месца.

Кан. 1229 – Араторыі і прыватныя капліцы варта благаслаўляць паводле абраду, прад-

пісанага ў літургічных кнігах; яны павінны быць зарэзерваваны толькі для Божага культу і вольныя ад усялякага хатняга ўжытку.

in libris liturgicis praescriptum; debent autem esse divino tantum cultui reservata et ab omnibus domesticis usibus libera.

Раздзел III
Санктуарыі

Caput III
De sanctuariis

Кан. 1230 – Санктуарыем называецца касцёл або іншае святое месца, да якога — з зацвярджэння ардынарыя месца — пілігрымуюць шматлікія вернікі, кіруючыся асаблівай пабожнасцю.

Can. 1230 – Sanctuarii nomine intelleguntur ecclesia vel alius locus sacer ad quos, ob peculiarem pietatis causam, fideles frequentes, approbante Ordinario loci, peregrinantur.

Кан. 1231 – Для таго, каб санктуарый мог называцца нацыянальным, павінна быць атрымана зацвярджэнне Канферэнцыі Біскупаў, а каб ён мог называцца міжнародным, патрабуецца зацвярджэнне Святой Сталіцы.

Can. 1231 – Ut sanctuarium dici possit nationale, accedere debet approbatio Episcoporum conferentiae; ut dici possit internationale, requiritur approbatio Sanctae Sedis.

Кан. 1232 – § 1. Паўнамоцтва зацвярджэння статутаў дыяцэзіяльнага санктуарыя належыць ардынарыю месца, статутаў нацыянальнага санктуарыя — Канферэнцыі Біскупаў, статутаў міжнароднага санктуарыя — толькі Святой Сталіцы.

Can. 1232 – § 1. Ad approbanda statuta sanctuarii dioecesani, competens est Ordinarius loci; ad statuta sanctuarii nationalis, Episcoporum conferentia; ad statuta sanctuarii internationalis, sola Sancta Sedes.

§ 2. У статутах павінны быць акрэслены перадусім мэта, улада рэктара, права ўласнасці і адміністраванне маёмасцю.

§ 2. In statutis determinentur praesertim finis, auctoritas rectoris, dominium et administratio bonorum.

Кан. 1233 – Санктуарыям могуць быць удзелены некаторыя прывілеі, калі акажацца, што да гэтага схіляюць мясцовыя абставіны, вялікая колькасць пілігрымаў і асабліва дабро вернікаў.

Can. 1233 – Sanctuariis quaedam privilegia concedi poterunt, quoties locorum circumstantiae, peregrinantium frequentia et praesertim fidelium bonum id suadere videantur.

Кан. 1234 – § 1. У санктуарыях вернікі павінны быць у дастатковай колькасці забяспечаны сродкамі збаўлення праз руплівае абвяшчанне Божага слова, праз адпаведнае спрыянне літургічнаму жыццю, перадусім праз цэлебрацыю Эўхарыстыі

Can. 1234 – § 1. In sanctuariis abundantius fidelibus suppeditentur media salutis, verbum Dei sedulo annuntiando, vitam liturgicam praesertim per Eucharistiae et paenitentiae celebrationem apte fovendo, necnon

probatas pietatis popularis formas colendo.

§ 2. Votiva artis popularis et pietatis documenta in sanctuariis aut locis adiacentibus spectabilia serventur atque secure custodiantur.

і пакаяння, а таксама праз развіццё зацверджаных формаў народнай пабожнасці.

§ 2. Ахвяраваныя на падставе клятвы творы мастацтва і сведчанні народнай пабожнасці павінны захоўвацца ў санктуарыях або сумежных месцах такім чынам, каб іх можна было бачыць і каб была забяспечана іх старанная ахова.

Caput IV
De altaribus

Can. 1235 – § 1. Altare, seu mensa super quam Sacrificium eucharisticum celebratur, *fixum* dicitur, si ita exstruatur ut cum pavimento cohaereat ideoque amoveri nequeat; *mobile* vero, si transferri possit.

§ 2. Expedit in omni ecclesia altare fixum inesse; ceteris vero in locis, sacris celebrationibus destinatis, altare fixum vel mobile.

Can. 1236 – § 1. Iuxta traditum Ecclesiae morem mensa altaris fixi sit lapidea, et quidem ex unico lapide naturali; attamen etiam alia materia digna et solida, de iudicio Episcoporum conferentiae, adhiberi potest. Stipites vero seu basis ex qualibet materia confici possunt.

§ 2. Altare mobile ex qualibet materia solida, usui liturgico congruenti, extrui potest.

Can. 1237 – § 1. Altaria fixa dedicanda sunt, mobilia vero dedicanda aut benedicenda, iuxta ritus in liturgicis libris praescriptos.

Раздзел IV
Алтары

Кан. 1235 – § 1. Алтар, іншымі словамі — мэнса, на якім цэлебруецца эўхарыстычная Ахвяра, называецца пастаянным, калі ён зроблены такім чынам, што з'яўляецца злучаным з падлогай і таму не можа быць зрушаны з месца; рухомым — калі можа быць перамешчаны.

§ 2. Варта, каб у кожным касцёле быў пастаянны алтар, а ў іншых месцах, якія прызначаны для святых цэлебрацый, — пастаянны або рухомы.

Кан. 1236 – § 1. Паводле традыцыйнага звычаю Касцёла, мэнса пастаяннага алтара павінна быць каменнай і пры гэтым зробленай з аднаго прыроднага каменю; аднак, згодна з суджэннем Канферэнцыі Біскупаў, дапускаецца выкарыстанне таксама іншага годнага і трывалага матэрыялу. Падстава алтара, іншымі словамі — яго аснова, можа быць зроблена з любога матэрыялу.

§ 2. Рухомы алтар можа быць зроблены з любога трывалага матэрыялу, адпаведнага для літургічнага выкарыстання.

Кан. 1237 – § 1. Пастаянныя алтары павінны быць пасвячаны, а рухомыя — пасвячаны або благаслаўлены паводле абрадаў, прадпісаных у літургічных кнігах.

§ 2. Старажытная традыцыя размяшчэння рэліквій мучанікаў або іншых святых пад пастаянным алтаром павінна быць захавана паводле нормаў, пададзеных у літургічных кнігах.

Кан. 1238 – § 1. Алтар траціць пасвячэнне або благаслаўленне згодна з нормай кан. 1212.

§ 2. Праз перадачу касцёла ці іншага святога месца на свецкі ўжытак ні пастаянныя, ні рухомыя алтары не трацяць свайго пасвячэння або благаслаўлення.

Кан. 1239 – § 1. Алтары, як пастаянныя, так і рухомыя, павінны быць зарэзерваваны толькі для Божага культу, з поўным выключэннем магчымасці іх свецкага ўжытку.

§ 2. Нельга змяшчаць цела памерлага пад алтаром; у супраціўным выпадку на ім нельга цэлебраваць Імшу.

§ 2. Antiqua traditio Martyrum aliorumve Sanctorum reliquias sub altari fixo condendi servetur, iuxta normas in libris liturgicis traditas.

Can. 1238 – § 1. Altare dedicationem vel benedictionem amittit ad normam can. 1212.

§ 2. Per reductionem ecclesiae vel alius loci sacri ad usus profanos, altaria sive fixa sive mobilia non amittunt dedicationem vel benedictionem.

Can. 1239 – § 1. Altare tum fixum tum mobile divino dumtaxat cultui reservandum est, quolibet profano usu prorsus excluso.

§ 2. Subtus altare nullum sit reconditum cadaver; secus Missam super illud celebrare non licet.

Раздзел V
Могілкі

Кан. 1240 – § 1. Там, дзе гэта магчыма, Касцёл павінен мець уласныя могілкі або прынамсі належна благаслаўленыя ўчасткі на свецкіх могілках, прызначаныя для пахавання памерлых вернікаў.

§ 2. Калі гэта немагчыма, трэба кожны раз належным чынам благаслаўляць кожную магілу.

Кан. 1241 – § 1. Парафіі і манаскія інстытуты могуць мець уласныя могілкі.

§ 2. Таксама іншыя юрыдычныя асобы або сем'і могуць мець асаблівыя могілкі або склеп, якія благаслаўляюцца згодна з суджэннем ардынарыя месца.

Кан. 1242 – Касцёлы не павінны выкарыстоўвацца для пахавання целаў памерлых,

Caput V
De coemeteriis

Can. 1240 – § 1. Coemeteria Ecclesiae propria, ubi fieri potest, habeantur, vel saltem spatia in coemeteriis civilibus fidelibus defunctis destinata, rite benedicenda.

§ 2. Si vero hoc obtineri nequeat, toties quoties singuli tumuli rite benedicantur.

Can. 1241 – § 1. Paroeciae et instituta religiosa coemeterium proprium habere possunt.

§ 2. Etiam aliae personae iuridicae vel familiae habere possunt peculiare coemeterium seu sepulcrum, de iudicio Ordinarii loci benedicendum.

Can. 1242 – In ecclesiis cadavera ne sepeliantur, nisi agatur de Romano

Pontifice aut Cardinalibus vel Episcopis dioecesanis etiam emeritis in propria ecclesia sepeliendis.

калі гаворка не ідзе пра Рымскага Пантыфіка, кардыналаў або дыяцэзіяльных біскупаў, таксама і эмэрытаў, якія павінны быць пахаваны ва ўласным касцёле.

Can. 1243 – Opportunae normae de disciplina in coemeteriis servanda, praesertim ad eorum indolem sacram tuendam et fovendam quod attinet, iure particulari statuantur.

Кан. 1243 – Адпаведныя нормы, якія датычаць парадку, які павінен захоўвацца на могілках, асабліва адносна захоўвання іх сакральнага характару і спрыяння яму, павінны быць устаноўлены партыкулярным правам.

TITULUS II
DE TEMPORIBUS SACRIS

ТЫТУЛ II
СВЯТЫЯ ЧАСЫ

Can. 1244 – § 1. Dies festos itemque dies paenitentiae, universae Ecclesiae communes, constituere, transferre, abolere, unius est supremae ecclesiasticae auctoritatis, firmo praescripto can. 1246, § 2.

§ 2. Episcopi dioecesani peculiares suis dioecesibus seu locis dies festos aut dies paenitentiae possunt, per modum tantum actus, indicere.

Кан. 1244 – § 1. Права ўстанаўліваць, пераносіць і адмяняць святочныя дні, а таксама дні пакаяння, агульныя для ўсяго Касцёла, мае толькі вярхоўная касцёльная ўлада, захоўваючы прадпісанне кан. 1246 § 2.

§ 2. Дыяцэзіяльныя біскупы могуць вызначаць асаблівыя святочныя дні і дні пакаяння для сваіх дыяцэзій або месцаў, але толькі ў асобных выпадках.

Can. 1245 – Firmo iure Episcoporum dioecesanorum de quo in can. 87, parochus, iusta de causa et secundum Episcopi dioecesani praescripta, singulis in casibus concedere potest dispensationem ab obligatione servandi diem festum vel diem paenitentiae aut commutationem eiusdem in alia pia opera; idque potest etiam Superior instituti religiosi aut societatis vitae apostolicae, si sint clericalia iuris pontificii, quoad proprios subditos aliosque in domo diu noctuque degentes.

Кан. 1245 – Захоўваючы права дыяцэзіяльных біскупаў, аб якім гаворыцца ў кан. 87, пробашч па справядлівай прычыне і паводле прадпісанняў дыяцэзіяльнага біскупа можа ў асобных выпадках удзяляць дыспенсацыю ад абавязку захоўвання святочнага дня або дня пакаяння ці замяніць гэты абавязак на іншыя пабожныя ўчынкі; тое самае можа зрабіць таксама настаяцель манаскага інстытута або таварыства апостальскага жыцця, калі яны з'яўляюцца святарскімі папскага права, — у адносінах да ўласных падуладных, а таксама іншых асобаў, якія днём і ноччу пражываюць у доме.

Раздзел I
Святочныя дні

Кан. 1246 – § 1. Нядзеля, у якую цэлебруецца Пасхальная таямніца, згодна з Апостальскай Традыцыяй павінна захоўвацца ва ўсім Касцёле як найбольш старажытны абавязковы святочны дзень. Акрамя гэтага, павінны захоўвацца дні Нараджэння Пана нашага Езуса Хрыста, Аб'яўлення, Унебаўшэсця, а таксама Найсвяцейшага Цела і Крыві Хрыста, Святой Багародзіцы Марыі, Яе Беззаганнага Зачацця і Унебаўзяцця, святога Юзафа, святых апосталаў Пятра і Паўла і, нарэшце, Усіх Святых.

§ 2. Аднак Канферэнцыя Біскупаў, атрымаўшы зацвярджэнне Апостальскай Сталіцы, можа адмяніць некаторыя з абавязковых святаў або перанесці іх на нядзелю.

Кан. 1247 – У нядзелю, а таксама ў іншыя абавязковыя святы вернікі маюць абавязак удзелу ў Імшы; акрамя гэтага, яны павінны ўстрымлівацца ад выконвання прац і заняткаў, якія могуць перашкодзіць ажыццяўленню Божага культу, радасці, уласцівай дню Пана, або належнаму адпачынку душы і цела.

Кан. 1248 – § 1. Абавязак удзелу ў Імшы выконвае той, хто прысутнічае на ёй у любым месцы, дзе яна цэлебруецца ў каталіцкім абрадзе, або ў сам святочны дзень, або напярэдадні вечарам.

§ 2. Калі па прычыне адсутнасці святога служыцеля або па іншай важкай прычыне ўдзел у эўхарыстычнай цэлебрацыі аказваецца немагчымым, вельмі рэкамендуецца, каб вернікі прымалі ўдзел у Літургіі слова, калі, паводле прадпісанняў дыяцэзіяльнага біскупа, яна адбываецца ў парафіяльным

Caput I
De diebus festis

Can. 1246 – § 1. Dies dominica in qua mysterium paschale celebratur, ex apostolica traditione, in universa Ecclesia uti primordialis dies festus de praecepto servanda est. Itemque servari debent dies Nativitatis Domini Nostri Iesu Christi, Epiphaniae, Ascensionis et sanctissimi Corporis et Sanguinis Christi, Sanctae Dei Genetricis Mariae, eiusdem Immaculatae Conceptionis et Assumptionis, sancti Ioseph, sanctorum Petri et Pauli Apostolorum, omnium denique Sanctorum.

§ 2. Episcoporum conferentia tamen potest, praevia Apostolicae Sedis approbatione, quosdam ex diebus festis de praecepto abolere vel ad diem dominicam transferre.

Can. 1247 – Die dominica aliisque diebus festis de praecepto fideles obligatione tenentur Missam participandi; abstineant insuper ab illis operibus et negotiis quae cultum Deo reddendum, laetitiam diei Domini propriam, aut debitam mentis ac corporis relaxationem impediant.

Can. 1248 – § 1. Praecepto de Missa participanda satisfacit qui Missae assistit ubicumque celebratur ritu catholico vel ipso die festo vel vespere diei praecedentis.

§ 2. Si deficiente ministro sacro aliave gravi de causa participatio eucharisticae celebrationis impossibilis evadat, valde commendatur ut fideles in liturgia Verbi, si quae sit in ecclesia paroeciali aliove sacro loco, iuxta Episcopi dioecesani praescripta celebrata, partem habeant, aut orationi

per debitum tempus personaliter aut in familia vel pro opportunitate in familiarum coetibus vacent.

касцёле ці іншым святым месцы, або каб праводзілі належны час на малітве — асабіста, у сям'і ці, калі гэта будзе магчыма, у групе сем'яў.

Caput II

De diebus paenitentiae

Раздзел II

Дні пакаяння

Can. 1249 – Omnes christifideles, suo quisque modo, paenitentiam agere ex lege divina tenentur; ut vero cuncti communi quadam paenitentiae observatione inter se coniungantur, dies paenitentiales praescribuntur, in quibus christifideles speciali modo orationi vacent, opera pietatis et caritatis exerceant, se ipsos abnegent, proprias obligationes fidelius adimplendo et praesertim ieiunium et abstinentiam, ad normam canonum qui sequuntur, observando.

Кан. 1249 – Усе вернікі, кожны па-свойму, на моцы Божага закона маюць абавязак пакаяння; але для таго, каб усе маглі з'яднацца паміж сабой праз акрэсленае сумеснае здзяйсненне пакаяння, прадпісваюцца дні пакаяння, калі вернікі павінны асобым чынам праводзіць час на малітве, здзяйсняць пабожныя ўчынкі і справы міласэрнасці, выракацца саміх сябе, больш верна выконваючы ўласныя абавязкі, але перадусім захоўваючы пост і ўстрыманне згодна з нормамі наступных канонаў.

Can. 1250 – Dies et tempora paenitentialia in universa Ecclesia sunt singulae feriae sextae totius anni et tempus quadragesimae.

Кан. 1250 – Днямі і часам пакаяння ва ўсім Касцёле з'яўляюцца ўсе пятніцы на працягу ўсяго года, а таксама час Вялікага посту.

Can. 1251 – Abstinentia a carnis comestione vel ab alio cibo iuxta conferentiae Episcoporum praescripta, servetur singulis anni sextis feriis, nisi cum aliquo die inter sollemnitates recensito occurrant; abstinentia vero et ieiunium, feria quarta Cinerum et feria sexta in Passione et Morte Domini Nostri Iesu Christi.

Кан. 1251 – Устрыманне ад спажывання мяса або іншых страваў, згодна з прадпісаннямі Канферэнцыі Біскупаў, павінна быць захавана ва ўсе пятніцы года, калі ў некаторыя з іх не прыпадаюць урачыстасці; устрыманне і пост абавязваюць у Папяльцовую сераду, а таксама ў Вялікую пятніцу Мукі і Смерці Пана нашага Езуса Хрыста.

Can. 1252 – Lege abstinentiae tenentur qui decimum quartum aetatis annum expleverint; lege vero ieiunii adstringuntur omnes aetate maiores usque ad annum inceptum sexagesimum. Curent tamen animarum pastores et parentes ut etiam ii qui, ratione minoris aetatis ad legem

Кан. 1252 – Закон аб устрыманні абавязвае тых, каму споўнілася чатырнаццаць гадоў, а законам аб посце звязаны ўсе паўналетнія да пачатку шасцідзясятага года жыцця. Аднак душпастыры і бацькі павінны паклапаціцца, каб таксама тыя, каго па прычыне меншага ўзросту не абавязваюць законы аб

посце і ўстрыманні, уводзіліся ў сапраўднае разуменне пакаяння.

Кан. 1253 – Канферэнцыя Біскупаў можа больш дакладна акрэсліць парадак захоўвання посту і ўстрымання, а таксама поўнасцю або часткова замяніць пост і ўстрыманне на іншыя формы пакаяння, асабліва на ўчынкі міласэрнасці і пабожныя практыкаванні.

ieiunii et abstinentiae non tenentur, ad genuinum paenitentiae sensum informentur.

Can. 1253 – Episcoporum conferentia potest pressius determinare observantiam ieiunii et abstinentiae, necnon alias formas paenitentiae, praesertim opera caritatis et exercitationes pietatis, ex toto vel ex parte pro abstinentia et ieiunio substituere.

LIBER V

DE BONIS ECCLESIAE TEMPORALIBUS

Can. 1254 – § 1. Ecclesia catholica bona temporalia iure nativo, independenter a civili potestate, acquirere, retinere, administrare et alienare valet ad fines sibi proprios prosequendos.

§ 2. Fines vero proprii praecipue sunt: cultus divinus ordinandus, honesta cleri aliorumque ministrorum sustentatio procuranda, opera sacri apostolatus et caritatis, praesertim erga egenos, exercenda.

Can. 1255 – Ecclesia universa atque Apostolica Sedes, Ecclesiae particulares necnon alia quaevis persona iuridica, sive publica sive privata, subiecta sunt capacia bona temporalia acquirendi, retinendi, administrandi et alienandi ad normam iuris.

Can. 1256 – Dominium bonorum, sub suprema auctoritate Romani Pontificis, ad eam pertinet iuridicam personam, quae eadem bona legitime acquisiverit.

Can. 1257 – § 1. Bona temporalia omnia quae ad Ecclesiam universam, Apostolicam Sedem aliasve in Eccle-

КНІГА V

МАЁМАСЦЬ КАСЦЁЛА

Кан. 1254 – § 1. На падставе прыроджанага права, незалежна ад дзяржаўнай улады, Каталіцкі Касцёл можа для дасягнення ўласцівых яму мэтаў набываць маёмасць, валодаць, адміністраваць і адчужаць яе.

§ 2. Уласцівымі яму мэтамі пераважна з'яўляюцца: уладкаванне Божага культу, клопат аб годным утрыманні духавенства і іншых служыцеляў, ажыццяўленне спраў святога апостальства і любові, асабліва ў адносінах да патрабуючых.

Кан. 1255 – Паўсюдны Касцёл і Апостальская Сталіца, партыкулярныя Касцёлы, а таксама любыя іншыя юрыдычныя асобы, публічныя ці прыватныя, з'яўляюцца суб'ектамі, здольнымі да набыцця маёмасці, валодання, адміністравання і адчужэння яе згодна з нормамі права.

Кан. 1256 – Права ўласнасці на маёмасць, пад вярхоўнай уладай Рымскага Пантыфіка, належыць тым юрыдычным асобам, якія легітымна набылі гэтую маёмасць.

Кан. 1257 – § 1. Уся маёмасць, якая належыць Паўсюднаму Касцёлу, Апостальскай Сталіцы і іншым публічным юрыдычным

асобам у Касцёле, з'яўляецца касцёльнай маёмасцю і кіруецца наступнымі канонамі, а таксама ўласнымі статутамі.

§ 2. Маёмасць прыватнай юрыдычнай асобы кіруецца ўласнымі статутамі, а не дадзенымі канонамі, калі выразна не прадугледжана іншае.

Кан. 1258 – У наступных канонах пад назвай «Касцёл» разумеецца не толькі Паўсюдны Касцёл ці Апостальская Сталіца, але таксама любая публічная юрыдычная асоба ў Касцёле, калі з кантэксту або сутнасці справы не вынікае іншае.

sia personas iuridicas publicas pertinent, sunt bona ecclesiastica et reguntur canonibus qui sequuntur, necnon propriis statutis.

§ 2. Bona temporalia personae iuridicae privatae reguntur propriis statutis, non autem hisce canonibus, nisi expresse aliud caveatur.

Can. 1258 – In canonibus qui sequuntur nomine Ecclesiae significatur non solum Ecclesia universa aut Sedes Apostolica, sed etiam quaelibet persona iuridica publica in Ecclesia, nisi ex contextu sermonis vel ex natura rei aliud appareat.

ТЫТУЛ I
НАБЫЦЦЁ МАЁМАСЦІ

Кан. 1259 – Касцёл можа набываць маёмасць усімі справядлівымі спосабамі натуральнага ці пазітыўнага права, якімі дазваляецца набываць іншым.

Кан. 1260 – Касцёл мае прыроджанае права патрабавання ад вернікаў таго, што з'яўляецца неабходным для ўласцівых яму мэтаў.

Кан. 1261 – § 1. Вернікі маюць поўнае права перадаваць маёмасць на карысць Касцёла.

§ 2. Дыяцэзіяльны біскуп павінен нагадваць вернікам пра абавязак, аб якім гаворыцца ў кан. 222 § 1, і адпаведным чынам абавязваць да яго выконвання.

Кан. 1262 – Вернікі павінны аказваць Касцёлу падтрымку праз складанне ахвяраванняў у адказ на яго просьбы і паводле нормаў, выдадзеных Канферэнцыяй Біскупаў.

Кан. 1263 – Для забеспячэння патрэбаў дыяцэзіі дыяцэзіяльны біскуп мае права, выслухаўшы Раду па эканамічных пытаннях і Святарскую Раду, налажыць на падуладныя яму публічныя юрыдычныя асобы ўмераны падатак, прапарцыянальны да

TITULUS I
DE ACQUISITIONE BONORUM

Can. 1259 – Ecclesia acquirere bona temporalia potest omnibus iustis modis iuris sive naturalis sive positivi, quibus aliis licet.

Can. 1260 – Ecclesiae nativum ius est exigendi a christifidelibus, quae ad fines sibi proprios sint necessaria.

Can. 1261 – § 1. Integrum est christifidelibus bona temporalia in favorem Ecclesiae conferre.

§ 2. Episcopus dioecesanus fideles de obligatione, de qua in can. 222, § 1, monere tenetur et opportuno modo eam urgere.

Can. 1262 – Fideles subsidia Ecclesiae conferant per subventiones rogatas et iuxta normas ab Episcoporum conferentia latas.

Can. 1263 – Ius est Episcopo dioecesano, auditis consilio a rebus oeconomicis et consilio presbyterali, pro dioecesis necessitatibus, personis iuridicis publicis suo regimini subiectis moderatum tributum, earum reddi-

tibus proportionatum, imponendi; ceteris personis physicis et iuridicis ipsi licet tantum, in casu gravis necessitatis et sub iisdem condicionibus, extraordinariam et moderatam exactionem imponere, salvis legibus et consuetudinibus particularibus quae eidem potiora iura tribuant.

Can. 1264 – Nisi aliud iure cautum sit, conventus Episcoporum provinciae est:

1° praefinire taxas pro actibus potestatis exsecutivae gratiosae vel pro exsecutione rescriptorum Sedis Apostolicae, ab ipsa Sede Apostolica approbandas;

2° definire oblationes occasione ministrationis sacramentorum et sacramentalium.

Can. 1265 – § 1. Salvo iure religiosorum mendicantium, vetatur persona quaevis privata, sive physica sive iuridica, sine proprii Ordinarii et Ordinarii loci licentia, in scriptis data, stipem cogere pro quolibet pio aut ecclesiastico instituto vel fine.

§ 2. Episcoporum conferentia potest normas de stipe quaeritanda statuere, quae ab omnibus servari debent, iis non exclusis, qui ex institutione mendicantes vocantur et sunt.

Can. 1266 – In omnibus ecclesiis et oratoriis, etiam ad instituta religiosa pertinentibus, quae de facto habitualiter christifidelibus pateant, Ordinarius loci praecipere potest ut specialis stips colligatur pro determinatis inceptis paroecialibus, dioecesanis, nationalibus vel universalibus, ad curiam dioecesanam postea sedulo mittenda.

іх даходаў; у адносінах да іншых фізічных і юрыдычных асобаў яму дазваляецца ўстанаўліваць толькі надзвычайны і ўмераны збор у выпадку цяжкай неабходнасці і на тых жа ўмовах, захоўваючы законы і партыкулярныя звычаі, якія даюць яму больш шырокія правы.

Кан. 1264 – Калі права не прадугледжвае іншае, да сходу біскупаў правінцыі належыць:

1° вызначэнне ставак за дзеянні выканаўчай улады, якая ўдзяляе ласкі, або за выкананне рэскрыптаў Апостальскай Сталіцы — гэтыя стаўкі павінны быць зацверджаны самой Апостальскай Сталіцай;

2° акрэсленне ахвяраванняў, якія складаюцца з нагоды ўдзялення сакрамэнтаў і сакрамэнталіяў.

Кан. 1265 – § 1. Пры тым, што права жабрачых манаскіх асобаў захоўваецца, любой прыватнай асобе, фізічнай ці юрыдычнай, забараняецца збіраць ахвяраванні на якія-небудзь пабожныя або касцёльныя справы або мэты без пісьмовага дазволу ўласнага ардынарыя і ардынарыя месца.

§ 2. Канферэнцыя Біскупаў можа ўстанавіць нормы адносна збірання ахвяраванняў, якія павінны захоўвацца ўсімі, не выключаючы тых, хто на моцы заснавання называюцца і з'яўляюцца жабрачымі.

Кан. 1266 – Ардынарый месца можа распарадзіцца, каб ва ўсіх касцёлах і араторыях, таксама ў тых, якія належаць манаскім інстытутам, але фактычна з'яўляюцца пастаянна даступнымі для вернікаў, збіраліся асобыя ахвяраванні на акрэсленыя пачынанні — парафіяльныя, дыяцэзіяльныя, нацыянальныя або паўсюдныя, якія пасля павінны быць рупліва перададзены ў дыяцэзіяльную Курыю.

Кан. 1267 – § 1. Калі не сцверджана іншае, мяркуецца, што ахвяраванні, зробленыя настаяцелям або адміністратарам якой-небудзь касцёльнай юрыдычнай асобы, у тым ліку прыватнай, зроблены гэтай юрыдычнай асобе.

§ 2. Ахвяраванні, аб якіх гаворыцца ў § 1, не могуць быць адхілены, калі не па справядлівай прычыне, а ў справах большай важнасці, калі гаворка ідзе пра публічную юрыдычную асобу — з дазволу ардынарыя; такі самы дазвол ардынарыя патрабуецца для прыняцця ахвяраванняў, абцяжараных абавязацельствамі, у якіх акрэсліваецца парадак выкарыстання або ўмовы іх прыняцця, захоўваючы прадпісанне кан. 1295.

§ 3. Ахвяраванні, зробленыя вернікамі на вызначаную мэту, могуць быць прызначаны толькі на гэтую мэту.

Кан. 1268 – Даўнасць, як у дачыненні да набыцця маёмасці, так і да пазбаўлення ад яе, прымаецца Касцёлам згодна з нормамі кан. 197–199.

Кан. 1269 – Святыя рэчы, якія знаходзяцца ва ўласнасці прыватных асобаў, могуць быць набыты прыватнымі асобамі на падставе даўнасці, аднак іх выкарыстанне ў свецкіх мэтах забараняецца, калі яны не страцілі пасвячэнне або благаслаўленне; калі ж яны належаць касцёльнай публічнай юрыдычнай асобе, то яны могуць быць набыты толькі іншай касцёльнай публічнай юрыдычнай асобай.

Кан. 1270 – Нерухомыя рэчы, рухомыя каштоўнасці, правы і правы патрабавання, як асабістыя, так і рэчавыя, якія належаць Апостальскай Сталіцы, маюць тэрмін даўнасці сто гадоў; а тое, што належыць іншай касцёльнай публічнай юрыдычнай асобе, — трыццаць гадоў.

Can. 1267 – § 1. Nisi contrarium constet, oblationes quae fiunt Superioribus vel administratoribus cuiusvis personae iuridicae ecclesiasticae, etiam privatae, praesumuntur ipsi personae iuridicae factae.

§ 2. Oblationes, de quibus in § 1, repudiari nequeunt nisi iusta de causa et, in rebus maioris momenti, de licentia Ordinarii, si agitur de persona iuridica publica; eiusdem Ordinarii licentia requiritur ut acceptentur quae onere modali vel condicione gravantur, firmo praescripto can. 1295.

§ 3. Oblationes a fidelibus ad certum finem factae, nonnisi ad eundem finem destinari possunt.

Can. 1268 – Praescriptionem, tamquam acquirendi et se liberandi modum, Ecclesia pro bonis temporalibus recipit, ad normam cann. 197-199.

Can. 1269 – Res sacrae, si in dominio privatorum sunt, praescriptione acquiri a privatis personis possunt, sed eas adhibere ad usus profanos non licet, nisi dedicationem vel benedictionem amiserint; si vero ad personam iuridicam ecclesiasticam publicam pertinent, tantum ab alia persona iuridica ecclesiastica publica acquiri possunt.

Can. 1270 – Res immobiles, mobiles pretiosae, iura et actiones sive personales sive reales, quae pertinent ad Sedem Apostolicam, spatio centum annorum praescribuntur; quae ad aliam personam iuridicam publicam ecclesiasticam pertinent, spatio triginta annorum.

Can. 1271 – Episcopi, ratione vinculi unitatis et caritatis, pro suae dioecesis facultatibus, conferant ad media procuranda, quibus Sedes Apostolica secundum temporum condiciones indiget, ut servitium erga Ecclesiam universam rite praestare valeat.

Кан. 1271 – З увагі на повязі еднасці і любові, біскупы, у адпаведнасці з магчымасцямі сваіх дыяцэзій, павінны рабіць свой унёсак у забеспячэнне Апостальскай Сталіцы тымі сродкамі, у якіх яна, згодна з умовамі часу, мае неабходнасць, каб магла належным чынам ажыццяўляць сваё служэнне ў Паўсюдным Касцёле.

Can. 1272 – In regionibus ubi beneficia proprie dicta adhuc exsistunt, Episcoporum conferentiae est, opportunis normis cum Apostolica Sede concordatis et ab ea approbatis, huiusmodi beneficiorum regimen moderari, ita ut reditus, immo quatenus possibile sit ipsa dos beneficiorum ad institutum, de quo in can. 1274, § 1, paulatim deferatur.

Кан. 1272 – У рэгіёнах, дзе да сённяшняга дня існуюць бэнэфіцыі ва ўласным значэнні слова, да Канферэнцыі Біскупаў належыць упарадкаванне кіравання гэтымі бэнэфіцыямі праз адпаведныя нормы, узгодненыя з Апостальскай Сталіцай і ёю зацверджаныя, такім чынам, каб даходы, а, калі магчыма, і само забеспячэнне бэнэфіцый, паступова пераходзілі да ўстановаў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1274 § 1.

TITULUS II
DE ADMINISTRATIONE BONORUM

ТЫТУЛ II
АДМІНІСТРАВАННЕ МАЁМАСЦЮ

Can. 1273 – Romanus Pontifex, vi primatus regiminis, est omnium bonorum ecclesiasticorum supremus administrator et dispensator.

Кан. 1273 – Рымскі Пантыфік, на моцы прымату кіравання, з'яўляецца вярхоўным адміністратарам і распарадчыкам усёй касцёльнай маёмасці.

Can. 1274 – § 1. Habeatur in singulis dioecesibus speciale institutum, quod bona vel oblationes colligat eum in finem ut sustentationi clericorum, qui in favorem dioecesis servitium praestant, ad normam can. 281 provideatur, nisi aliter eisdem provisum sit.

Кан. 1274 – § 1. У кожнай асобнай дыяцэзіі павінна існаваць спецыяльная ўстанова, якая збірае разам маёмасць і ахвяраванні, прызначаныя паводле кан. 281 на ўтрыманне духоўных асобаў, якія ажыццяўляюць служэнне на карысць дыяцэзіі, калі гэта не было арганізавана іншым спосабам.

§ 2. Ubi praevidentia socialis in favorem cleri nondum apte ordinata est, curet Episcoporum conferentia ut habeatur institutum, quo securitati sociali clericorum satis provideatur.

§ 2. Там, дзе сацыяльнае забеспячэнне духавенства яшчэ не было адпаведна ўпарадкавана, Канферэнцыя Біскупаў павінна паклапаціцца аб тым, каб існавала ўстанова, якая павінна ў дастатковай меры забяспечваць сацыяльнае страхаванне духоўных асобаў.

§ 3. Калі гэта неабходна, у кожнай асобнай дыяцэзіі павінен быць заснаваны агульны фонд, дзякуючы якому біскуп будзе мець магчымасць выконваць свае абавязацельствы ў адносінах да іншых асобаў, які служаць Касцёлу, і задавальняць розныя патрэбы дыяцэзіі, а таксама дзякуючы якому больш багатыя дыяцэзіі маглі б дапамагаць бяднейшым.

§ 4. У залежнасці ад розных мясцовых умоваў мэты, аб якіх гаворыцца ў § 2 і 3, могуць быць лягчэй дасягнуты праз дыяцэзіяльныя ўстановы, з'яднаныя паміж сабой або праз супрацоўніцтва, або нават праз адпаведнае аб'яднанне, утворанае для розных дыяцэзій, а нават і для ўсёй тэрыторыі дадзенай Канферэнцыі Біскупаў.

§ 5. Па магчымасці, гэтыя ўстановы павінны быць утвораны такім чынам, каб яны мелі дзеяздольнасць таксама ў дзяржаўным праве.

Кан. 1275 – Адміністраванне фондам маёмасці, якая паходзіць з розных дыяцэзій, ажыццяўляецца паводле нормаў, адпаведна ўзгодненых зацікаўленымі біскупамі.

Кан. 1276 – § 1. Да ардынарыя належыць пільны нагляд за адміністраваннем усёй маёмасцю, якая належыць падуладным яму публічным юрыдычным асобам, захоўваючы легітымныя падставы, згодна з якімі гэтаму ардынарыю надаюцца больш шырокія правы.

§ 2. Улічваючы правы, легітымныя звычаі і абставіны, ардынарыі павінны клапаціцца аб упарадкаванні ўсяго адміністравання касцёльнай маёмасцю праз выдаванне асаблівых інструкцый у межах паўсюднага і партыкулярнага права.

Кан. 1277 – У тым, што датычыць здзяйснення дзеянняў, якія адносяцца да ад-

§ 3. In singulis dioecesibus constituatur, quatenus opus sit, massa communis qua valeant Episcopi obligationibus erga alias personas Ecclesiae deservientes satisfacere variisque dioecesis necessitatibus occurrere, quaque etiam dioeceses divitiores possint pauperioribus subvenire.

§ 4. Pro diversis locorum adiunctis, fines de quibus in §§ 2 et 3 aptius obtineri possunt per instituta dioecesana inter se foederata, vel per cooperationem aut etiam per convenientem consociationem pro variis dioecesibus, immo et pro toto territorio ipsius Episcoporum conferentiae constitutam.

§ 5. Haec instituta, si fieri possit, ita constituenda sunt, ut efficaciam quoque in iure civili obtineant.

Can. 1275 – Massa bonorum ex diversis dioecesibus provenientium administratur secundum normas ab Episcopis, quorum interest, opportune concordatas.

Can. 1276 – § 1. Ordinarii est sedulo advigilare administrationi omnium bonorum, quae ad personas iuridicas publicas sibi subiectas pertinent, salvis legitimis titulis quibus eidem Ordinario potiora iura tribuantur.

§ 2. Habita ratione iurium, legitimarum consuetudinum et circumstantiarum, Ordinarii, editis peculiaribus instructionibus intra fines iuris universalis et particularis, universum administrationis bonorum ecclesiasticorum negotium ordinandum curent.

Can. 1277 – Episcopus dioecesanus quod attinet ad actus administra-

tionis ponendos, qui, attento statu oeconomico dioecesis, sunt maioris momenti, consilium a rebus oeconomicis et collegium consultorum audire debet; eiusdem tamen consilii atque etiam collegii consultorum consensu eget, praeterquam in casibus iure universali vel tabulis fundationis specialiter expressis, ad ponendos actus extraordinariae administrationis. Conferentiae autem Episcoporum est definire quinam actus habendi sint extraordinariae administrationis.

Can. 1278 – Praeter munera de quibus in can. 494, §§ 3 et 4, oeconomo committi possunt ab Episcopo dioecesano munera de quibus in cann. 1276, § 1 et 1279, § 2.

Can. 1279 – § 1. Administratio bonorum ecclesiasticorum ei competit, qui immediate regit personam ad quam eadem bona pertinent, nisi aliud ferant ius particulare, statuta aut legitima consuetudo, et salvo iure Ordinarii interveniendi in casu neglegentiae administratoris.

§ 2. In administratione bonorum personae iuridicae publicae, quae ex iure vel tabulis fundationis aut propriis statutis suos non habeat administratores, Ordinarius, cui eadem subiecta est, personas idoneas ad triennium assumat; eaedem ab Ordinario iterum nominari possunt.

Can. 1280 – Quaevis persona iuridica suum habeat consilium a rebus oeconomicis vel saltem duos consiliarios, qui administratorem, ad normam statutorum, in munere adimplendo adiuvent.

міністравання і якія з улікам эканамічнага стану дыяцэзіі маюць большую важнасць, дыяцэзіяльны біскуп павінен выслухаць меркаванне Рады па эканамічных справах і Калегіі Кансультантаў; аднак яму патрэбна згода гэтай Рады і Калегіі Кансультантаў для здзяйснення дзеянняў, якія адносяцца да надзвычайнага адміністравання, за выключэннем выпадкаў, спецыяльным чынам агавораных у паўсюдным праве або ўстаноўчых дакументах. Канферэнцыя Біскупаў павінна акрэсліць, якія дзеянні адносяцца да надзвычайнага адміністравання.

Кан. 1278 – Акрамя заданняў, аб якіх гаворыцца ў кан. 494 § 3 і 4, дыяцэзіяльны біскуп можа даручыць эканому заданні, аб якіх гаворыцца ў кан. 1276 § 1 і 1279 § 2.

Кан. 1279 – § 1. Адміністраванне касцёльнай маёмасцю належыць да кампетэнцыі таго, хто непасрэдна кіруе асобай, якой належыць гэтая маёмасць, калі партыкулярнае права, статуты або легітымны звычай не пастанаўляюць іншае, пры гэтым захоўваецца права ардынарыя ўмешвацца ў выпадку нядбайнага адміністравання.

§ 2. Для адміністравання маёмасцю публічнай юрыдычнай асобы, якая згодна з правам, устаноўчымі дакументамі або ўласнымі статутамі не мае сваіх адміністратараў, ардынарый, якому падпарадкавана гэтая асоба, павінен вызначыць прыдатных асобаў на тэрмін трох гадоў; яны могуць быць зноў вызначаны ардынарыем на чарговыя тэрміны.

Кан. 1280 – Кожная юрыдычная асоба павінна мець сваю Раду па эканамічных справах або прынамсі двух дарадчыкаў, якія павінны дапамагаць адміністратару ў выкананні яго задання згодна з нормамі статутаў.

Кан. 1281 – § 1. Захоўваючы прадпісанні статутаў, адміністратары нядзейсна здзяйсняюць дзеянні, якія выходзяць за межы і парадак звычайнага адміністравання, калі перад гэтым яны не атрымалі ад ардынарыя пісьмовага паўнамоцтва.

§ 2. У статутах павінны быць акрэслены дзеянні, якія выходзяць за межы і парадак звычайнага адміністравання; калі ж статуты пра гэта не гавораць, да кампетэнцыі дыяцэзіяльнага біскупа, які выслухаў Раду па эканамічных справах, належыць вызначэнне ў адносінах да падпарадкаваных яму асобаў таго, якія дзеянні павінны лічыцца такімі.

§ 3. Юрыдычная асоба не нясе адказнасць за нядзейсныя дзеянні, здзейсненыя адміністратарамі, калі не тады і не ў той меры, калі гэтыя дзеянні вышлі ёй на карысць; аднак за дзеянні, здзейсненыя адміністратарамі нелегітымна, але дзейсна, будзе адказваць сама юрыдычная асоба, з захаваннем яе права патрабавання, іншымі словамі — права на рэкурс, у адносінах да адміністратараў, якія прычынілі ёй шкоду.

Кан. 1282 – Усе, як духоўныя, так і свецкія асобы, якія легітымна ўдзельнічаюць у адміністраванні касцёльнай маёмасцю, павінны выконваць свае заданні ад імя Касцёла згодна з нормамі права.

Кан. 1283 – Перад тым, як адміністратары прыступяць да выканання свайго задання:

1° яны павінны ў прысутнасці ардынарыя або яго дэлегата скласці прысягу ў тым, што будуць адміністраваць добра і верна;

2° павінен быць складзены дакладны і падрабязны, падпісаны імі самымі інвентар нерухомай маёмасці, рухомай маёмасці — як каштоўных рэчаў, так

Can. 1281 – § 1. Firmis statutorum praescriptis, administratores invalide ponunt actus qui fines modumque ordinariae administrationis excedunt, nisi prius ab Ordinario facultatem scripto datam obtinuerint.

§ 2. In statutis definiantur actus qui finem et modum ordinariae administrationis excedunt; si vero de hac re sileant statuta, competit Episcopo dioecesano, audito consilio a rebus oeconomicis, huiusmodi actus pro personis sibi subiectis determinare.

§ 3. Nisi quando et quatenus in rem suam versum sit, persona iuridica non tenetur respondere de actibus ab administratoribus invalide positis; de actibus autem ab administratoribus illegitime sed valide positis respondebit ipsa persona iuridica, salva eius actione seu recursu adversus administratores qui damna eidem intulerint.

Can. 1282 – Omnes, sive clerici sive laici, qui legitimo titulo partes habent in administratione bonorum ecclesiasticorum, munera sua adimplere tenentur nomine Ecclesiae, ad normam iuris.

Can. 1283 – Antequam administratores suum munus ineant:

1° debent se bene et fideliter administraturos coram Ordinario vel eius delegato iureiurando spondere;

2° accuratum ac distinctum inventarium, ab ipsis subscribendum, rerum immobilium, rerum mobilium sive pretiosarum sive utcumque ad bona culturalia per-

tinentium aliarumve cum descriptione atque aestimatione earundem redigatur, redactumque recognoscatur;

3° huius inventarii alterum exemplar conservetur in tabulario administrationis, alterum in archivo curiae; et in utroque quaelibet immutatio adnotetur, quam patrimonium subire contingat.

Can. 1284 – § 1. Omnes administratores diligentia boni patrisfamilias suum munus implere tenentur.

§ 2. Exinde debent:

1° vigilare ne bona suae curae concredita quoquo modo pereant aut detrimentum capiant, initis in hunc finem, quatenus opus sit, contractibus assecurationis;

2° curare ut proprietas bonorum ecclesiasticorum modis civiliter validis in tuto ponatur;

3° praescripta servare iuris tam canonici quam civilis, aut quae a fundatore vel donatore vel legitima auctoritate imposita sint, ac praesertim cavere ne ex legum civilium inobservantia damnum Ecclesiae obveniat;

4° reditus bonorum ac proventus accurate et iusto tempore exigere exactosque tuto servare et secundum fundatoris mentem aut legitimas normas impendere;

5° foenus vel mutui vel hypothecae causa solvendum, statuto tempore solvere, ipsamque debiti summam capitalem opportune reddendam curare;

і тых, якія належаць да культурнай спадчыны, а таксама іншых, з апісаннем і ацэнкай іх вартасці; складзены інвентар павінен быць праверaны;

3° адзін асобнік гэтага інвентару павінен захоўвацца ў архіве адміністрацыі, другі — у архіве Курыі; у абодва асобнікі павінны ўносіцца запісы аб усіх змяненнях, якія адбываюцца ў складзе маёмасці.

Кан. 1284 – § 1. Усе адміністратары павінны выконваць сваё заданне старанна, як добры гаспадар дома.

§ 2. Таму яны павінны:

1° сачыць за тым, каб маёмасць, даверaная іх апецы, не была якім-небудзь чынам знішчана або пашкоджана, і з гэтай мэтай, калі неабходна, заключаць дагаворы страхавання;

2° клапаціцца аб тым, каб права ўласнасці на касцёльную маёмасць было замацавана сродкамі, дзейснымі з пункту гледжання дзяржаўнага права;

3° захоўваць прадпісанні як кананічнага, так і дзяржаўнага права, а таксама тыя прадпісанні, якія былі ўскладзены заснавальнікам, ахвярадаўцам або легітымнай уладай, і асабліва асцерагацца таго, каб Касцёл не панёс шкоды па прычыне невыконвання дзяржаўных законаў;

4° дакладна і ў справядлівым тэрміне збіраць маёмасць і даходы, а сабранае надзейна захоўваць і расходаваць у адпаведнасці з воляй заснавальніка або легітымнымі нормамі;

5° ва ўстаноўленым тэрміне выплачваць працэнты, належныя на падставе пазыкі ці залогу маёмасці, а таксама клапаціцца аб тым, каб своечасова вярнуць і асноўную суму пазыкі;

6° са згоды ардынарыя ўкладваць дзеля карысці юрыдычнай асобы грошы, якія застаюцца пасля расходавання і могуць быць укладзены з прыбыткам;

7° весці ў належным парадку кнігі прыходаў і расходаў;

8° у канцы кожнага года складаць справаздачу аб адміністраванні;

9° належным чынам упарадкоўваць і зберагаць у адпаведным архіве дакументы і сродкі, якія з'яўляюцца падставай правоў Касцёла або ўстановы на маёмасць; там, дзе гэта можа быць зручна зроблена, аўтэнтычныя іх асобнікі павінны быць змешчаны ў архіве Курыі.

§ 3. Вельмі рэкамендуецца, каб адміністратары штогадова складалі каштарысы прыходаў і расходаў, але партыкулярнае права можа абавязаць да гэтага і больш дакладна акрэсліць спосаб іх прадстаўлення.

Кан. 1285 – Толькі ў межах, вызначаных для звычайнага адміністравання, адміністратарам дазваляецца рабіць ахвяраванні з рухомай маёмасці, якая не належыць да пастаяннага складу маёмасці, з прызначэннем на пабожныя мэты або мэты хрысціянскай міласэрнасці.

Кан. 1286 – Адміністратары маёмасці:

1° у тым, што датычыць працоўных адносін, павінны дакладна захоўваць таксама дзяржаўныя законы аб працы і грамадскім жыцці, у адпаведнасці з прынцыпамі, якім навучае Касцёл;

2° павінны справядліва і годна аплачваць працу наёмных працаўнікоў, каб яны маглі адпаведным чынам забяспечваць уласныя патрэбы і патрэбы сваіх сем'яў.

Кан. 1287 – § 1. Адміністратары — як духоўныя асобы, так і свецкія — любой касцёльнай маёмасці, не выключанай легітым-

6° pecuniam, quae de expensis supersit et utiliter collocari possit, de consensu Ordinarii in fines personae iuridicae occupare;

7° accepti et expensi libros bene ordinatos habere;

8° rationem administrationis singulis exeuntibus annis componere;

9° documenta et instrumenta, quibus Ecclesiae aut instituti iura in bona nituntur, rite ordinare et in archivo convenienti et apto custodire; authentica vero eorum exemplaria, ubi commode fieri potest, in archivo curiae deponere.

§ 3. Provisiones accepti et expensi, ut ab administratoribus quotannis componantur, enixe commendatur; iuri autem particulari relinquitur eas praecipere et pressius determinare modos quibus exhibendae sint.

Can. 1285 – Intra limites dumtaxat ordinariae administrationis fas est administratoribus de bonis mobilibus, quae ad patrimonium stabile non pertinent, donationes ad fines pietatis aut christianae caritatis facere.

Can. 1286 – Administratores bonorum:

1° in operarum locatione leges etiam civiles, quae ad laborem et vitam socialem attinent, adamussim servent, iuxta principia ab Ecclesia tradita;

2° iis, qui operam ex condicto praestant, iustam et honestam mercedem tribuant, ita ut iidem suis et suorum necessitatibus convenienter providere valeant.

Can. 1287 – § 1. Reprobata contraria consuetudine, administratores tam clerici quam laici quorumvis bono-

rum ecclesiasticorum, quae ab Episcopi dioecesani potestate regiminis non sint legitime subducta, singulis annis officio tenentur rationes Ordinario loci exhibendi, qui eas consilio a rebus oeconomicis examinandas committat.

§ 2. De bonis, quae a fidelibus Ecclesiae offeruntur, administratores rationes fidelibus reddant iuxta normas iure particulari statuendas.

на з-пад улады кіравання дыяцэзіяльнага біскупа, маюць абавязак кожны год прадстаўляць справаздачу ардынарыю месца, які павінен перадаць яе з мэтай праверкі Радзе па эканамічных справах. Усякі супраціўны звычай адхіляецца.

§ 2. Адміністратары павінны прадстаўляць вернікам справаздачу аб маёмасці, ахвяраванай імі Касцёлу, паводле нормаў, якія ўстанаўліваюцца партыкулярным правам.

Can. 1288 – Administratores litem nomine personae iuridicae publicae ne inchoent neve contestentur in foro civili, nisi licentiam scripto datam Ordinarii proprii obtinuerint.

Кан. 1288 – Адміністратары не павінны ад імя публічнай юрыдычнай асобы ні падаваць позву ў дзяржаўны суд, ні адказваць пярэчаннем на позву, калі не атрымаюць на гэта пісьмовы дазвол уласнага ардынарыя.

Can. 1289 – Quamvis ad administrationem non teneantur titulo officii ecclesiastici, administratores munus susceptum arbitratu suo dimittere nequeunt; quod si ex arbitraria dimissione damnum Ecclesiae obveniat, ad restitutionem tenentur.

Кан. 1289 – Нават калі адміністратары на падставе касцёльнай пасады, якую займаюць, не маюць абавязку адміністравання, аднак яны не могуць самавольна пакідаць прынятае заданне; калі б ад такога самавольнага пакідання Касцёл панёс шкоду, адміністратары павінны яе выправіць.

TITULUS III

DE CONTRACTIBUS AC PRAESERTIM DE ALIENATIONE

ТЫТУЛ III

ДАГАВОРЫ І ПЕРАДУСІМ — АДЧУЖЭННЕ

Can. 1290 – Quae ius civile in territorio statuit de contractibus tam in genere, quam in specie et de solutionibus, eadem iure canonico quoad res potestati regiminis Ecclesiae subiectas iisdem cum effectibus serventur, nisi iuri divino contraria sint aut aliud iure canonico caveatur, et firmo praescripto can. 1547.

Кан. 1290 – Тое, што ў дзяржаўным праве дадзенай тэрыторыі пастанаўляцца адносна дагавораў, як наогул, так і асабліва, а таксама адносна аплаты, павінна захоўвацца з такімі самымі наступствамі і ў кананічным праве адносна спраў, на якія распаўсюджваецца ўлада кіравання Касцёла, калі гэта не супярэчыць Божаму праву або кананічнае права не прадугледжвае іншае, пры гэтым захоўваецца прадпісанне кан. 1547.

Can. 1291 – Ad valide alienanda bona, quae personae iuridicae publicae ex legitima assignatione patrimo-

Кан. 1291 – Для дзейснага адчужэння маёмасці, якая належыць да легітымна набытага пастаяннага складу маёмасці публічнай

юрыдычнай асобы і вартасць якой перавышае вызначаную ў праве суму, патрабуецца дазвол улады, кампетэнтнай згодна з нормамі права.

Кан. 1292 – § 1. Захоўваючы прадпісанне кан. 638 § 3, калі вартасць маёмасці, прызначанай для адчужэння, знаходзіцца паміж мінімальнай і максімальнай сумай, вызначанай Канферэнцыяй Біскупаў для дадзенага рэгіёна, то, калі гаворка ідзе пра юрыдычных асобаў, непадпарадкаваных дыяцэзіяльнаму біскупу, — кампетэнтная ўлада акрэсліваецца ўласнымі статутамі; у іншым выпадку — кампетэнтнай уладай з'яўляецца дыяцэзіяльны біскуп са згоды Рады па эканамічных справах і Калегіі Кансультантаў, а таксама зацікаўленых асобаў. Таксама іх згода патрабуецца і самому дыяцэзіяльнаму біскупу для адчужэння дыяцэзіяльнай маёмасці.

§ 2. Аднак, калі гаворка ідзе пра рэчы, вартасць якіх перавышае максімальную суму, а таксама пра рэчы, ахвяраваныя Касцёлу на падставе клятвы, або пра рэчы, якія з'яўляюцца мастацкай ці гістарычнай каштоўнасцю, то для дзейснасці адчужэння патрабуецца, акрамя таго, дазвол Святой Сталіцы.

§ 3. Калі прызначаная для адчужэння рэч з'яўляецца падзельнай, то ў прашэнні аб дазволе на адчужэнне павінны быць указаны часткі, адчужаныя раней; у іншым выпадку дазвол з'яўляецца нядзейсным.

§ 4. Тыя, хто павінны прымаць удзел у адчужэнні маёмасці праз параду або згоду, не павінны даваць параду або выражаць згоду, калі не будуць дакладна азнаёмлены як з эканамічным станам юрыдычнай асобы, маёмасць якой прапануецца для адчужэння, так і з ужо здзейсненымі адчужэннямі.

nium stabile constituunt et quorum valor summam iure definitam excedit, requiritur licentia auctoritatis ad normam iuris competentis.

Can. 1292 – § 1. Salvo praescripto can. 638, § 3, cum valor bonorum, quorum alienatio proponitur, continetur intra summam minimam et summam maximam ab Episcoporum conferentia pro sua cuiusque regione definiendas, auctoritas competens, si agatur de personis iuridicis Episcopo dioecesano non subiectis, propriis determinatur statutis; secus, auctoritas competens est Episcopus dioecesanus cum consensu consilii a rebus oeconomicis et collegii consultorum necnon eorum quorum interest. Eorundem quoque consensu eget ipse Episcopus dioecesanus ad bona dioecesis alienanda.

§ 2. Si tamen agatur de rebus quarum valor summam maximam excedit, vel de rebus ex voto Ecclesiae donatis, vel de rebus pretiosis artis vel historiae causa, ad validitatem alienationis requiritur insuper licentia Sanctae Sedis.

§ 3. Si res alienanda sit divisibilis, in petenda licentia pro alienatione exprimi debent partes antea alienatae; secus licentia irrita est.

§ 4. Ii, qui in alienandis bonis consilio vel consensu partem habere debent, ne praebeant consilium vel consensum nisi prius exacte fuerint edocti tam de statu oeconomico personae iuridicae cuius bona alienanda proponuntur, quam de alienationibus iam peractis.

Can. 1293 – § 1. Ad alienanda bona, quorum valor summam minimam definitam excedit, requiritur insuper:

1° iusta causa, veluti urgens necessitas, evidens utilitas, pietas, caritas vel gravis alia ratio pastoralis;

2° aestimatio rei alienandae a peritis scripto facta.

§ 2. Aliae quoque cautelae a legitima auctoritate praescriptae serventur, ut Ecclesiae damnum vitetur.

Can. 1294 – § 1. Res alienari minore pretio ordinarie non debet, quam quod in aestimatione indicatur.

§ 2. Pecunia ex alienatione percepta vel in commodum Ecclesiae caute collocetur vel, iuxta alienationis fines, prudenter erogetur.

Can. 1295 – Requisita ad normam cann. 1291-1294, quibus etiam statuta personarum iuridicarum conformanda sunt, servari debent non solum in alienatione, sed etiam in quolibet negotio, quo condicio patrimonialis personae iuridicae peior fieri possit.

Can. 1296 – Si quando bona ecclesiastica sine debitis quidem sollemnitatibus canonicis alienata fuerint, sed alienatio sit civiliter valida, auctoritatis competentis est decernere, omnibus mature perpensis, an et qualis actio, personalis scilicet vel realis, a quonam et contra quemnam instituenda sit ad Ecclesiae iura vindicanda.

Can. 1297 – Conferentiae Episcoporum est, attentis locorum adiunctis, normas statuere de bonis Ecclе-

Кан. 1293 – § 1. Для адчужэння маёмасці, вартасць якой перавышае вызначаную мінімальную суму, акрамя таго патрабуецца:

1° справядлівая прычына, такая, як тэрміновая неабходнасць, відавочная карысць, пабожнасць, міласэрнасць або іншая важкая пастырская прычына;

2° ацэнка рэчы, прызначанай для адчужэння, выкананая спецыялістамі ў пісьмовай форме.

§ 2. Павінны захоўвацца таксама іншыя меры засцярогі, прадпісаныя легітымнай уладай, каб уберагчы Касцёл ад шкоды.

Кан. 1294 – § 1. Як правіла, рэчы не павінны адчужацца за кошт, ніжэйшы чым быў указаны ў ацэнцы.

§ 2. Грошы, атрыманыя ад адчужэння, павінны быць або бяспечна ўкладзены дзеля карысці Касцёла, або разважліва расходаваны адпаведна мэтам адчужэння.

Кан. 1295 – Патрабаванні кан. 1291–1294, да якіх павінны быць дастасаваны статуты юрыдычных асобаў, павінны захоўвацца не толькі пры адчужэнні, але таксама пры любой здзелцы, у выніку якой маёмаснае становішча юрыдычнай асобы можа пагоршыцца.

Кан. 1296 – Калі б касцёльная маёмасць была адчужана без захавання фармальных прадпісанняў кананічнага права, але дзейсна з пункту гледжання дзяржаўнага права, да кампетэнтнай улады, якая дакладна зважыла ўсе абставіны, належыць вырашэнне пытання аб тым, ці павінна быць скіравана позва, каб вярнуць правы Касцёла, і калі павінна, то — якая, хто павінен звяртацца і супраць каго.

Кан. 1297 – Улічваючы мясцовыя ўмовы, да Канферэнцыі Біскупаў належыць устанаўленне нормаў адносна арэнды маёмас-

ці Касцёла, перадусім адносна атрымання дазволу кампетэнтнай касцёльнай улады.

siae locandis, praesertim de licentia a competenti auctoritate ecclesiastica obtinenda.

Кан. 1298 – Калі справа не датычыць рэчаў вельмі нязначнай вартасці, касцёльную маёмасць нельга прадаваць або здаваць у арэнду тым, хто яе адмініструе, а таксама іх блізкім да чацвёртай ступені роднасці або сваяцтва, без спецыяльнага пісьмовага дазволу кампетэнтнай улады.

Can. 1298 – Nisi res sit minimi momenti, bona ecclesiastica propriis administratoribus eorumve propinquis usque ad quartum consanguinitatis vel affinitatis gradum non sunt vendenda aut locanda sine speciali competentis auctoritatis licentia scripto data.

ТЫТУЛ IV
ПАБОЖНЫЯ РАСПАРАДЖЭННІ НАОГУЛ І ПАБОЖНЫЯ ФОНДЫ

TITULUS IV
DE PIIS VOLUNTATIBUS IN GENERE ET DE PIIS FUNDATIONIBUS

Кан. 1299 – § 1. Той, хто ў адпаведнасці з натуральным і кананічным правам можа свабодна распараджацца сваёй маёмасцю, можа прызначыць маёмасць на пабожныя мэты: або праз дзеянне паміж жывымі, або праз дзеянне на выпадак смерці.

Can. 1299 – § 1. Qui ex iure naturae et canonico libere valet de suis bonis statuere, potest ad causas pias, sive per actum inter vivos sive per actum mortis causa, bona relinquere.

§ 2. Калі гэта магчыма, пры распараджэннях на выпадак смерці на карысць Касцёла павінны быць захаваны патрабаванні дзяржаўнага права; калі б яны не былі выкананы, неабходна нагадаць спадкаемцам аб ускладзеным на іх абавязку выканання волі спадчынадаўцы.

§ 2. In dispositionibus mortis causa in bonum Ecclesiae serventur, si fieri possit, sollemnitates iuris civilis; quae si omissae fuerint, heredes moneri debent de obligatione, qua tenentur, adimplendi testatoris voluntatem.

Кан. 1300 – Легітымна прынятыя распараджэнні вернікаў, якія ахвяруюць ці пакідаюць сваю маёмасць на пабожныя мэты або праз дзеянне паміж жывымі, або праз дзеянне на выпадак смерці, павінны выконвацца вельмі дакладна, таксама ў тым, што датычыць парадку адміністравання маёмасцю і яе расходавання, пры гэтым захоўваецца прадпісанне кан. 1301 § 3.

Can. 1300 – Voluntates fidelium facultates suas in pias causas donantium vel relinquentium, sive per actum inter vivos sive per actum mortis causa, legitime acceptatae, diligentissime impleantur etiam circa modum administrationis et erogationis bonorum, firmo praescripto can. 1301, § 3.

Кан. 1301 – § 1. Ардынарый з'яўляецца выканаўцам усіх пабожных распараджэнняў, як на выпадак смерці, так і паміж жывымі.

Can. 1301 – § 1. Ordinarius omnium piarum voluntatum tam mortis causa quam inter vivos exsecutor est.

§ 2. Hoc ex iure Ordinarius vigilare potest ac debet, etiam per visitationem, ut piae voluntates impleantur, eique ceteri exsecutores, perfuncti munere, reddere rationem tenentur.

§ 2. На моцы самога права ардынарый можа і павінен сачыць, таксама з дапамогай візітацыі, за тым, каб пабожныя распараджэнні былі выкананы, а іншыя выканаўцы маюць абавязак прадставіць яму справаздачу пасля завяршэння свайго задання.

§ 3. Clausulae huic Ordinarii iuri contrariae, ultimis voluntatibus adiectae, tamquam non appositae habeantur.

§ 3. Супраціўныя гэтаму праву ардынарыя кляўзулы, далучаныя да выяўлення апошняй волі, павінны лічыцца недалучанымі.

Can. 1302 – § 1. Qui bona ad pias causas sive per actum inter vivos sive ex testamento fiduciarie accepit, debet de sua fiducia Ordinarium certiorem reddere, eique omnia istiusmodi bona mobilia vel immobilia cum oneribus adiunctis indicare; quod si donator id expresse et omnino prohibuerit, fiduciam ne acceptet.

Кан. 1302 – § 1. Той, хто прыняў у давернае кіраванне маёмасць, прызначаную на пабожныя мэты або праз дзеянне паміж жывымі, або на падставе завяшчання, павінен паведаміць аб гэтым ардынарыя і скласці яму пералік усёй гэтай маёмасці, рухомай і нерухомай, разам з абавязацельствамі, якія з ёй звязаны; калі ж ахвярадаўца гэта выразна і безумоўна забароніць, ён не павінен прымаць даверанасць.

§ 2. Ordinarius debet exigere ut bona fiduciaria in tuto collocentur, itemque vigilare pro exsecutione piae voluntatis ad normam can. 1301.

§ 2. Ардынарый павінен патрабаваць, каб даверaная маёмасць была надзейна ўкладзена, а таксама сачыць за выкананнем пабожнага распараджэння згодна з нормай кан. 1301.

§ 3. Bonis fiduciariis alicui sodali instituti religiosi aut societatis vitae apostolicae commissis, si quidem bona sint attributa loco seu dioecesi eorumve incolis aut piis causis iuvandis, Ordinarius, de quo in §§ 1 et 2, est loci Ordinarius; secus est Superior maior in instituto clericali iuris pontificii et in clericalibus societatibus vitae apostolicae iuris pontificii, aut Ordinarius eiusdem sodalis proprius in aliis institutis religiosis.

§ 3. Калі даверaная маёмасць давяраецца якому-небудзь члену манаскага інстытута або таварыства апостальскага жыцця і пры гэтым яна прызначана для акрэсленай мясцовасці або дыяцэзіі ці для іх жыхароў або на падтрымку пабожных спраў, то ардынарыем, аб якім гаворыцца ў § 1 і 2, з'яўляецца ардынарый месца; у іншым выпадку ім з'яўляецца вышэйшы настаяцель святарскага інстытута папскага права і святарскага таварыства апостальскага жыцця папскага права або ўласны ардынарый гэтага члена інстытута ў іншых манаскіх інстытутах.

Can. 1303 – § 1. Nomine piarum fundationum in iure veniunt:

Кан. 1303 – § 1. Пад назвай пабожных фондаў у праве прадугледжаны:

1° самастойныя пабожныя фонды, гэта значыць сукупнасці рэчаў, прызначаныя для мэтаў, аб якіх гаворыцца ў кан. 114 § 2, і заснаваныя кампетэнтнай касцёльнай уладай у якасці юрыдычных асобаў;

2° несамастойныя пабожныя фонды, гэта значыць маёмасць, перададзеная любым спосабам якой-небудзь публічнай юрыдычнай асобе з доўгатэрміновым абавязкам, які акрэсліваецца партыкулярным правам, адносна цэлебрацыі Імшаў з гадавых даходаў, або выконвання іншых касцёльных функцый, або дасягнення іншымі спосабамі мэтаў, аб якіх гаворыцца ў кан. 114 § 2.

§ 2. Калі маёмасць несамастойных пабожных фондаў была даверана юрыдычнай асобе, падпарадкаванай дыяцэзіяльнаму біскупу, то пасля заканчэння вызначанага тэрміну яна павінна быць перададзена ўстанове, аб якой гаворыцца ў кан. 1274 § 1, калі не была выразна выяўлена іншая воля заснавальніка; у іншым выпадку яна пераходзіць да самой юрыдычнай асобы.

Кан. 1304 – § 1. Для таго, каб юрыдычная асоба магла дзейсна прыняць фонд, патрабуецца пісьмовы дазвол ардынарыя; ён не павінен даваць такога дазволу перад тым, як легітымна сцвердзіць, што юрыдычная асоба з'яўляецца здольнай як выконваць новы прыняты абавязак, так і задаваляць прынятыя раней; асабліва трэба ўпэўніцца ў тым, што даходы поўнасцю адпавядаюць абавязкам, якія прымаюцца, у адпаведнасці са звычаем месца або рэгіёна.

§ 2. Далейшыя ўмовы адносна ўтварэння і прыняцця фондаў павінны быць акрэслены ў партыкулярным праве.

Кан. 1305 – Грошы і рухомая маёмасць, перададзеныя на падставе дарэння, адразу ж

1° *piae fundationes autonomae*, scilicet universitates rerum ad fines de quibus in can. 114, § 2 destinatae et a competenti auctoritate ecclesiastica in personam iuridicam erectae;

2° *piae fundationes non autonomae*, scilicet bona temporalia alicui personae iuridicae publicae quoquo modo data cum onere in diuturnum tempus, iure particulari determinandum, ex reditibus annuis Missas celebrandi aliasque praefinitas functiones ecclesiasticas peragendi, aut fines de quibus in can. 114, § 2 aliter persequendi.

§ 2. Bona piae fundationis non autonomae, si concredita fuerint personae iuridicae Episcopo dioecesano subiectae, expleto tempore, ad institutum de quo in can. 1274, § 1 destinari debent, nisi alia fuerit fundatoris voluntas expresse manifestata; secus ipsi personae iuridicae cedunt.

Can. 1304 – § 1. Ut fundatio a persona iuridica valide acceptari possit, requiritur licentia Ordinarii in scriptis data; qui eam ne praebeat, antequam legitime compererit personam iuridicam tum novo oneri suscipiendo, tum iam susceptis satisfacere posse; maximeque caveat ut reditus omnino respondeant oneribus adiunctis, secundum cuiusque loci vel regionis morem.

§ 2. Ulteriores condiciones ad constitutionem et acceptationem fundationum quod attinet, iure particulari definiantur.

Can. 1305 – Pecunia et bona mobilia, dotationis nomine assignata, statim

in loco tuto ab Ordinario approbando deponantur eum in finem, ut eadem pecunia vel bonorum mobilium pretium custodiantur et quam primum caute et utiliter secundum prudens eiusdem Ordinarii iudicium, auditis et iis quorum interest et proprio a rebus oeconomicis consilio, collocentur in commodum eiusdem fundationis cum expressa et individua mentione oneris.

павінны быць змешчаны ў бяспечным месцы, зацверджаным ардынарыем, з той мэтай, каб беражліва захаваць гэтыя грошы або вартасць рухомай маёмасці і як мага хутчэй, надзейна і з карысцю, згодна з разважлівым суджэннем таго ж ардынарыя, які павінен выслухаць як зацікаўленых асобаў, так і ўласную Раду па эканамічных справах, укласці гэтыя грошы ці маёмасць на карысць фонду з выразным і дакладным узгадваннем абавязацельства.

Can. 1306 – § 1. Fundationes, etiam viva voce factae, scripto consignentur.

Кан. 1306 – § 1. Утварэнне фондаў, у тым ліку зробленае вусна, павінна быць пацверджана пісьмова.

§ 2. Alterum tabularum exemplar in curiae archivo, alterum in archivo personae iuridicae ad quam fundatio spectat, tuto asserventur.

§ 2. Адзін асобнік дакумента павінен бяспечна захоўвацца ў Курыі, а другі — у архіве юрыдычнай асобы, да якой адносіцца фонд.

Can. 1307 – § 1. Servatis praescriptis cann. 1300-1302, et 1287, onerum ex piis fundationibus incumbentium tabella conficiatur, quae in loco patenti exponatur, ne obligationes adimplendae in oblivionem cadant.

Кан. 1307 – § 1. Захоўваючы прадпісанні кан. 1300–1302 і 1287, павінен быць складзены пералік абавязацельстваў, якія вынікаюць з пабожных фондаў, і ён павінен быць змешчаны ў бачным месцы, каб абавязацельствы, якія павінны быць выкананы, не былі забыты.

§ 2. Praeter librum de quo in can. 958, § 1, alter liber retineatur et apud parochum vel rectorem servetur, in quo singula onera eorumque adimpletio et eleemosynae adnotentur.

§ 2. Апрача кнігі, аб якой гаворыцца ў кан. 958 § 1, павінна быць заведзена і захоўвацца ў пробашча або рэктара іншая кніга, у якой павінна быць запісана кожнае асобнае абавязацельства і яго выкананне, а таксама ахвяраванне.

Can. 1308 – § 1. Reductio onerum Missarum, ex iusta tantum et necessaria causa facienda, reservatur Episcopo dioecesano et supremo Moderatori instituti vitae consecratae vel societatis vitae apostolicae clericalium.

Кан. 1308 – § 1. Рэдукцыя абавязацельстваў, якія датычаць Імшаў, якая можа быць здзейснена толькі па справядлівай прычыне ў выпадку неабходнасці, зарэзервавана за дыяцэзіяльным біскупам і вярхоўным кіраўніком святарскага інстытута кансэкраванага жыцця або таварыства апостальскага жыцця.

§ 2. Episcopo dioecesano competit facultas reducendi ob deminutionem

§ 2. Пакуль існуе гэтая прычына, да кампетэнцыі дыяцэзіяльнага біскупа нале-

жыць паўнамоцтва рэдукавання па прычыне памяншэння даходаў тых Імшаў, якія звязаны з запісаным выяўленнем апошняй волі, якое было здзейснена самадастатковым распараджэннем, да велічыні ахвяравання, якая легітымна абавязвае ў дыяцэзіі, калі толькі няма нікога, на каго ўскладзены абавязак і хто мог бы быць вынікова заахвочаны да павелічэння ахвяраванняў.

§ 3. Таксама да яго кампетэнцыі належыць улада рэдукавання абавязацельстваў, іншымі словамі — Імшаў, звязаных з запісаным выяўленнем апошняй волі, якія абцяжарваюць касцёльную ўстанову, калі даходы сталі недастатковымі для адпаведнага дасягнення ўласнай мэты гэтай установы.

§ 4. Такую самую ўладу, аб якой гаворыцца ў § 2 і 3, мае вярхоўны кіраўнік святарскага інстытута кансэкраванага жыцця або інстытута апостальскага жыцця.

Кан. 1309 – Апрача таго, улады, аб якіх гаворыцца ў кан. 1308, маюць права па адпаведнай прычыне пераносіць абавязацельствы, звязаныя з Імшамі, на дні, касцёлы ці алтары, розныя ад тых, якія былі вызначаны пры ўтварэнні фонду.

Кан. 1310 – § 1. Рэдукцыя, абмежаванне і змяненне распараджэнняў, зробленых вернікамі з прызначэннем на пабожныя мэты, могуць быць здзейснены ардынарыем толькі па справядлівай прычыне ў выпадку неабходнасці, выслухаўшы зацікаўленых асобаў і ўласную Раду па эканамічных справах і захоўваючы як мага больш верна волю ахвярадаўцы.

§ 2. У іншых выпадках трэба звяртацца да Апостальскай Сталіцы.

redituum, quamdiu causa perduret ad rationem eleemosynae in dioecesi legitime vigentis, Missas legatorum, quae sint per se stantia, dummodo nemo sit qui obligatione teneatur et utiliter cogi possit ad eleemosynae augmentum faciendum.

§ 3. Eidem competit facultas reducendi onera seu legata Missarum gravantia institutum ecclesiasticum, si reditus insufficientes evaserint ad finem proprium eiusdem instituti congruenter consequendum.

§ 4. Iisdem facultatibus, de quibus in §§ 2 et 3, gaudet supremus Moderator instituti vitae consecratae vel societatis vitae apostolicae clericalium.

Can. 1309 – Iisdem auctoritatibus, de quibus in can. 1308, potestas insuper competit transferendi, congrua de causa, onera Missarum in dies, ecclesias vel altaria diversa ab illis, quae in fundationibus sunt statuta.

Can. 1310 – § 1. Fidelium voluntatum pro piis causis reductio, moderatio et commutatio possunt ab Ordinario fieri ex iusta tantum et necessaria causa, auditis iis, quorum interest, et proprio consilio a rebus oeconomicis atque servata, meliore quo fieri potest modo, fundatoris voluntate.

§ 2. In ceteris casibus recurrendum est ad Sedem Apostolicam.

LIBER VI

DE SANCTIONIBUS POENALIBUS IN ECCLESIA

PARS I

DE DELICTIS ET POENIS IN GENERE

TITULUS I

DE DELICTORUM PUNITIONE GENERATIM

Can. 1311 – § 1. Nativum et proprium Ecclesiae ius est christifideles poenalibus sanctionibus coercendi qui delicta commiserint.

§ 2. Qui Ecclesiae praeest bonum ipsius communitatis singulorumque christifidelium tueri ac promovere debet caritate pastorali, exemplo vitae, consilio et adhortatione et, si opus sit, etiam poenarum irrogatione vel declaratione, iuxta legis praecepta semper cum aequitate canonica applicanda, prae oculis habens iustitiae restitutionem, rei emendationem et scandali reparationem.

Can. 1312 – § 1. Sanctiones poenales in Ecclesia sunt:

КНІГА VI

КАРНЫЯ САНКЦЫІ Ў КАСЦЁЛЕ

ЧАСТКА I

ЗЛАЧЫНСТВЫ І ПАКАРАННІ НАОГУЛ

ТЫТУЛ I

КАРАННЕ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НАОГУЛ

Кан. 1311 – Касцёл мае прыроджанае і ўласнае права накладаць карныя санкцыі на вернікаў, якія здзейснілі злачынствы.

§ 2. Той, хто ўзначальвае Касцёл, павінен захоўваць і развіваць дабро гэтай супольнасці і асобных вернікаў праз пастырскую любоў, прыклад жыцця, параду і напамін, а таксама, калі гэта будзе неабходна, праз накладанне або сцвярджэнне пакаранняў, якія павінны прызначацца паводле прадпісанняў закона, заўсёды з кананічнай адпаведнасцю і маючы на ўвазе аднаўленне справядлівасці, выпраўленне злачынцы і ўстараненне спакусы.

Кан. 1312 – § 1. Карнымі санкцыямі ў Касцёле з'яўляюцца:

1° папраўчыя пакаранні, іншымі словамі — цэнзуры, пералічаныя ў кан. 1331–1333;

2° экспіяцыйныя пакаранні, аб якіх гаворыцца ў кан. 1336.

§ 2. Закон можа ўстанаўліваць іншыя экспіяцыйныя пакаранні, якія пазбаўляюць верніка якіх-небудзь духоўных або матэрыяльных дабротаў і адпавядаюць звышнатуральнай мэце Касцёла.

§ 3. Акрамя таго, прымяняюцца карныя сродкі і пакаянні, аб якіх гаворыцца ў кан. 1339 і 1340, першыя — галоўным чынам для прадухілення злачынстваў, другія — па большай частцы для замены пакарання або яго ўзмацнення.

1° poenae medicinales seu censurae, quae in cann. 1331-1333 recensentur;

2° poenae expiatoriae, de quibus in can. 1336.

§ 2. Lex alias poenas expiatorias constituere potest, quae christifidelem aliquo bono spirituali vel temporali privent et supernaturali Ecclesiae fini sint consentaneae.

§ 3. Praeterea adhibentur remedia poenalia et paenitentiae de quibus in cann. 1339 et 1340, illa quidem praesertim ad delicta praecavenda, hae potius ad poenam substituendam vel augendam.

ТЫТУЛ II

КАРНЫ ЗАКОН І КАРНАЕ ПРАДПІСАННЕ

TITULUS II

DE LEGE POENALI AC DE PRAECEPTO POENALI

Кан. 1313 – § 1. Калі пасля здзяйснення злачынства змяняецца закон, павінен прымяняцца закон, больш спрыяльны для злачынцы.

§ 2. Калі пазнейшы закон адмяняе ранейшы закон або прынамсі пакаранне, яно адразу спыняецца.

Can. 1313 – § 1. Si post delictum commissum lex mutetur, applicanda est lex reo favorabilior.

§ 2. Quod si lex posterior tollat legem vel saltem poenam, haec statim cessat.

Кан. 1314 – Звычайна пакаранне з'яўляецца *ferendae sententiae* — гэта значыць такім, якое не звязвае злачынцу, пакуль не будзе наложана; у сваю чаргу пакаранне з'яўляецца *latae sententiae*, калі закон або прадпісанне выразна ўстанаўліваюць, што гэтаму пакаранню падвяргаюцца праз сам факт здзяйснення злачынства.

Can. 1314 – Poena ordinarie est ferendae sententiae, ita ut reum non teneat, nisi postquam irrogata sit; est autem latae sententiae si lex vel praeceptum id expresse statuat, ita ut in eam incurratur ipso facto commissi delicti.

Кан. 1315 – § 1. Той, хто мае ўладу выдаваць карныя законы, можа таксама абараняць Божае права з дапамогай адпаведнага пакарання.

§ 2. Апрача гэтага, беручы пад увагу кан. 1317, ніжэйшы заканадаўца можа:

Can. 1315 – § 1. Qui potestatem habet leges poenales ferendi, potest etiam legem divinam congrua poena munire.

§ 2. Legislator inferior, attento can. 1317, potest insuper:

1° legem a superiore auctoritate latam congrua poena munire, servatis competentiae limitibus ratione territorii vel personarum;

2° poenis lege universali in aliquod delictum constitutis alias poenas addere;

3° poenam lege universali constitutam ut indeterminatam vel facultativam determinare aut obligatoriam reddere.

§ 3. Lex ipsa potest poenam determinare vel prudenti iudicis aestimationi determinandam relinquere.

Can. 1316 – Curent Episcopi dioecesani ut, quatenus fieri potest, in eadem civitate vel regione uniformes ferantur poenales leges.

Can. 1317 – Poenae eatenus constituantur, quatenus vere necessariae sint ad aptius providendum ecclesiasticae disciplinae. A legislatore autem inferiore dimissio e statu clericali constitui nequit.

Can. 1318 – Latae sententiae poenae ne constituantur, nisi forte in singularia quaedam delicta dolosa, quae vel graviori esse possint scandalo vel efficaciter puniri poenis ferendae sententiae non possint; censurae autem, praesertim excommunicatio, ne constituantur, nisi maxima cum moderatione et in sola delicta specialis gravitatis.

Can. 1319 – § 1. Quatenus quis potest vi potestatis regiminis in foro externo praecepta imponere iuxta praescripta cann. 48-58, eatenus potest etiam poenas determinatas, exceptis expiatoriis perpetuis, per praeceptum comminari.

1° абараняць закон, выдадзены вышэйшай уладай, з дапамогай адпаведнага пакарання, захоўваючы абмежаванні кампетэнцыі адносна тэрыторыі і асобаў;

2° дадаваць іншыя пакаранні да пакаранняў, устаноўленых паўсюдным законам за якія-небудзь злачынствы;

3° акрэсліваць або рабіць абавязковым пакаранне, якое паўсюдны закон устанаўлівае як неакрэсленае або факультатыўнае.

§ 3. Закон можа сам вызначаць пакаранне або пакідаць яго вызначэнне разважліваму вырашэнню суддзі.

Кан. 1316 – Дыяцэзіяльныя біскупы павінны клапаціцца аб тым, каб — калі гэта будзе магчыма — карныя законы былі аднолькавымі ў адной дзяржаве або рэгіёне.

Кан. 1317 – Пакаранні павінны ўстанаўлівацца тады, калі яны з'яўляюцца сапраўды неабходнымі для больш адпаведнага забеспячэння касцёльнай дысцыпліны. Ніжэйшы заканадаўца не можа ўстанаўліваць пакаранне выдалення з духоўнага стану.

Кан. 1318 – Не павінны ўстанаўлівацца пакаранні *latae sententiae*, калі не на выпадак асобных зламысных злачынстваў, якія могуць выклікаць сур'ёзную спакусу або не могуць быць паспяхова пакараны пакараннем *ferendae sententiae*; не павінны ўстанаўлівацца таксама цэнзуры, асабліва экскамуніка, калі не з найбольшай умеранасцю і толькі за асабліва цяжкія злачынствы.

Кан. 1319 – § 1. Наколькі хто-небудзь на моцы ўлады кіравання можа выдаваць прадпісанні на *forum externum* паводле прадпісанняў кан. 48–58, настолькі ён можа таксама накладаць праз прадпісанне акрэсленыя пакаранні, за выключэннем пастаянных экспіяцыйных пакаранняў.

§ 2. Калі, пасля дакладнага разгляду пытання, карнае прадпісанне абавязкова павінна быць наложана, павінна захоўвацца тое, аб чым гаворыцца ў кан. 1317 і 1318.

Кан. 1320 – Ва ўсіх справах, у якіх манаскія асобы падпарадкаваны ардынарыю месца, яны могуць быць падвергнуты ім пакаранню.

§ 2. Si praeceptum poenale, re mature perpensa, imponendum sit, serventur quae statuuntur in cann. 1317 et 1318.

Can. 1320 – In omnibus in quibus religiosi subsunt Ordinario loci, possunt ab eodem poenis coerceri.

ТЫТУЛ III
СУБ'ЕКТЫ, ЯКІЯ ПАДЛЯГАЮЦЬ КАРНЫМ САНКЦЫЯМ

TITULUS III
DE SUBIECTO POENALIBUS SANCTIONIBUS OBNOXIO

Кан. 1321 – § 1. Кожны павінен лічыцца невінаватым, пакуль супраціўнае не будзе даказана.

§ 2. Ніхто не павінен быць пакараны, калі здзейсненае ім знешняе парушэнне закона або прадпісання не з'яўляецца цяжка пастаўленым яму ў віну па прычыне зламыснасці або неасцярожнасці.

§ 3. Пакаранню, устаноўленаму законам або прадпісаннем, падвяргаецца той, хто наўмысна парушыў закон або прадпісанне; той жа, хто здзейсніў гэта па прычыне занядбання належнай стараннасці, не павінен быць пакараны, калі закон або прадпісанне не прадугледжваюць іншае.

§ 4. Калі здзейснена знешняе парушэнне, мяркуецца аб наяўнасці стаўлення ў віну, калі не вынікае іншае.

Can. 1321 – § 1. Quilibet innocens censetur donec contrarium probetur.

§ 2. Nemo punitur, nisi externa legis vel praecepti violatio, ab eo commissa, sit graviter imputabilis ex dolo vel ex culpa.

§ 3. Poena lege vel praecepto statuta is tenetur, qui legem vel praeceptum deliberate violavit; qui vero id egit ex omissione debitae diligentiae, non punitur, nisi lex vel praeceptum aliter caveat.

§ 4. Posita externa violatione, imputabilitas praesumitur, nisi aliud appareat.

Кан. 1322 – Тыя, хто звычайна пазбаўлены карыстання розумам, лічацца няздольнымі да здзяйснення злачынства, нават калі, парушаючы закон або прадпісанне, яны выдаваліся здаровымі.

Can. 1322 – Qui habitualiter rationis usu carent, etsi legem vel praeceptum violaverint dum sani videbantur, delicti incapaces habentur.

Кан. 1323 – Ніякаму пакаранню не падлягае той, хто, парушаючы закон або прадпісанне:

1° яшчэ не дасягнуў шаснаццацігадовага ўзросту;

Can. 1323 – Nulli poenae est obnoxius qui, cum legem vel praeceptum violavit:

1° sextum decimum aetatis annum nondum explevit;

2° sine culpa ignoravit se legem vel praeceptum violare; ignorantiae autem inadvertentia et error aequiparantur;

3° egit ex vi physica vel ex casu fortuito, quem praevidere vel cui praeviso occurrere non potuit;

4° metu gravi, quamvis relative tantum, coactus egit, aut ex necessitate vel gravi incommodo, nisi tamen actus sit intrinsece malus aut vergat in animarum damnum;

5° legitimae tutelae causa contra iniustum sui vel alterius aggressorem egit, debitum servans moderamen;

6° rationis usu carebat, firmis praescriptis cann. 1324, § 1, n. 2, et 1326, § 1, n. 4;

7° sine culpa putavit aliquam adesse ex circumstantiis, de quibus in nn. 4 vel 5.

Can. 1324 – § 1. Violationis auctor non eximitur a poena, sed poena lege vel praecepto statuta temperari debet vel in eius locum paenitentia adhiberi, si delictum patratum sit:

1° ab eo, qui rationis usum imperfectum tantum habuerit;

2° ab eo qui rationis usu carebat propter ebrietatem aliamve similem mentis perturbationem, quae culpabilis fuerit, firmo praescripto can. 1326, § 1, n. 4;

3° ex gravi passionis aestu, qui non omnem tamen mentis deliberationem et voluntatis consensum praecesserit et impedierit, et dummodo passio ipsa ne fuerit voluntarie excitata vel nutrita;

2° без віны не ведаў аб тым, што парушае закон або прадпісанне; да няведання прыраўноўваюцца таксама няўважлівасць і памылка;

3° дзейнічаў пад фізічным прымусам або ў сітуацыі, якая склалася выпадкова і якой не мог прадбачыць, а калі мог прадбачыць — не мог пазбегнуць;

4° дзейнічаў пад уздзеяннем моцнага страху, нават толькі адносна моцнага, або з прычыны неабходнасці ці важкай нязручнасці, калі пры гэтым здзейсненае дзеянне не было злым па сваёй сутнасці або не прычыняла шкоду душам;

5° дзейнічаў у легітымнай абароне сябе або іншай асобы ад несправядлівага агрэсара, захоўваючы належную ўмеранасць;

6° быў пазбаўлены карыстання розумам, захоўваючы прадпісанні кан. 1324 § 1, 2° і 1326 § 1, 4°;

7° без віны лічыў, што існуюць абставіны, аб якіх гаворыцца ў 4° і 5°.

Кан. 1324 – § 1. Той, хто здзейсніў парушэнне, не вызваляецца ад пакарання, але пакаранне, устаноўленае законам або прадпісаннем, павінна быць паменшана або заменена пакаяннем, калі злачынства было здзейснена:

1° тым, хто меў абмежаванае карыстанне розумам;

2° тым, хто быў пазбаўлены карыстання розумам па прычыне вінаватага знаходжання ў стане ап'янення ці іншым падобным стане, захоўваючы прадпісанне кан. 1326 § 1, 4°;

3° пад уздзеяннем асаблівага псіхічнага стану, які пры гэтым не акрэсліваў і не стрымліваў цалкам намер свядомасці і згоду волі, калі толькі сам псіхічны стан не быў выкліканы або падтрыманы па ўласнай волі;

4° непаўналетнім, які дасягнуў шаснаццацігадовага ўзросту;

5° тым, хто дзейнічаў пад уздзеяннем моцнага страху, нават толькі адносна моцнага, або з прычыны неабходнасці ці важкай нязручнасці, калі злачынства было злым па сваёй сутнасці або прычыняла шкоду душам;

6° тым, хто дзейнічаў у легітымнай абароне сябе або іншай асобы ад несправядлівага агрэсара, але не захаваў належную ўмеранасць;

7° тым, хто дзейнічаў супраць асобы, якая яго цяжка і несправядліва правакавала;

8° тым, хто праз памылку, але па сваёй віне, лічыў, што існуюць абставіны, аб якіх гаворыцца ў кан. 1323, 4° і 5°;

9° тым, хто без віны не ведаў, што да закона або прадпісання далучана пакаранне;

10° тым, хто дзейнічаў без поўнага стаўлення ў віну, калі толькі яно заставалася цяжкім.

§ 2. Тое самае можа зрабіць суддзя, калі існуюць якія-небудзь іншыя абставіны, якія памяншаюць цяжкасць злачынства.

§ 3. У абставінах, аб якіх гаворыцца ў § 1, злачынца не падлягае пакаранню *latae sententiae*, але, з увагі на выяўленую скруху ці выпраўленне шкоды, на яго можа быць наложана больш лёгкае пакаранне або прызначана пакаянне.

Кан. 1325 – Грубае няведанне або тое, якое было выклікана бяздзейнасцю ці афектам, ніколі не можа ўлічвацца пры прымяненні прадпісанняў кан. 1323 і 1324.

Кан. 1326 – § 1. Суддзя павінен пакараць больш строга, чым устаноўлена ў законе або прадпісанні:

4° a minore, qui aetatem sedecim annorum explevit;

5° ab eo, qui metu gravi, quamvis relative tantum, coactus est, aut ex necessitate vel gravi incommodo egit, si delictum sit intrinsece malum vel in animarum damnum vergat;

6° ab eo, qui legitimae tutelae causa contra iniustum sui vel alterius aggressorem egit, nec tamen debitum servavit moderamen;

7° adversus aliquem graviter et iniuste provocantem;

8° ab eo, qui per errorem, ex sua tamen culpa, putavit aliquam adesse ex circumstantiis, de quibus in can. 1323, nn. 4 vel 5;

9° ab eo, qui sine culpa ignoravit poenam legi vel praecepto esse adnexam;

10° ab eo, qui egit sine plena imputabilitate, dummodo haec gravis permanserit.

§ 2. Idem potest iudex facere, si qua alia adsit circumstantia, quae delicti gravitatem deminuat.

§ 3. In circumstantiis, de quibus in § 1, reus poena latae sententiae non tenetur, attamen ad resipiscentiam vel ad scandali reparationem, ipsi poenae mitiores irrogari vel poenitentiae applicari possunt.

Can. 1325 – Ignorantia crassa vel supina vel affectata numquam considerari potest in applicandis praescriptis cann. 1323 et 1324.

Can. 1326 – § 1. Iudex gravius punire debet quam lex vel praeceptum statuit:

1° eum, qui post condemnationem vel poenae declarationem ita delinquere pergit, ut ex adiunctis prudenter eius pertinacia in mala voluntate conici possit;

2° eum, qui in dignitate aliqua constitutus est, vel qui auctoritate aut officio abusus est ad delictum patrandum;

3° eum, qui, cum poena in delictum culposum constituta sit, eventum praevidit et nihilominus cautiones ad eum vitandum omisit, quas diligens quilibet adhibuisset;

4° eum, qui deliquerit in statu ebrietatis aliusve mentis perturbationis, quae sint de industria ad delictum patrandum vel excusandum quaesitae, aut ob passionem voluntarie excitatam vel nutritam.

§ 2. In casibus, de quibus in § 1, si poena constituta sit latae sententiae, alia poena addi potest vel paenitentia.

§ 3. In iisdem casibus, si poena constituta sit ut facultativa, fit obligatoria.

Can. 1327 – Lex particularis potest alias circumstantias eximentes, attenuantes vel aggravantes, praeter casus de quibus in cann. 1323–1326, statuere, sive generali norma, sive pro singulis delictis. Item in praecepto possunt circumstantiae statui, quae a poena praecepto constituta eximant, vel eam attenuent vel aggravent.

1° таго, хто пасля асуджэння або пасля сцвярджэння пакарання здзяйсняе злачынства такім чынам, што, беручы пад увагу абставіны, можна разважліва рабіць выснову аб яго ўпартасці ў злой волі;

2° таго, хто быў узведзены ў якую-небудзь годнасць, або таго, хто злоўжываў сваёй уладай ці пасадай для здзяйснення злачынства;

3° таго, хто ў выпадку, калі пакаранне было ўстаноўлена за неасцярожнае злачынства, прадбачыў наступленне наступстваў, але не прыняў ніякіх мер для іх прадухілення, якія, стараючыся, прыняў бы кожны;

4° таго, хто здзейсніў злачынства, знаходзячыся ў стане ап'янення або іншым падобным стане, калі яны былі наўмысна выкліканы для здзяйснення злачынства ці яго апраўдання, а таксама пад уздзеяннем псіхічнага стану, выкліканага і падтрыманага па ўласнай волі**.**

§ 2. Калі ў выпадках, аб якіх гаворыцца ў § 1, устаноўлена пакаранне *latae sententiae*, да яго можа быць дададзена іншае пакаранне або пакаянне.

§ 3. У тых выпадках, калі пакаранне ўстаноўлена як факультатыўнае, яно становіцца абавязковым.

Кан. 1327 – Апрача выпадкаў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1323–1326, партыкулярны закон можа вызначаць — у якасці агульнай нормы або ў дачыненні да асобных злачынстваў — іншыя абставіны, якія выключаюць, змякчаюць ці абцяжваюць адказнасць. Падобным чынам і ў прадпісанні могуць быць вызначаны абставіны, якія вызваляюць ад пакарання, устаноўленага ў прадпісанні, змякчаюць ці абцяжваюць яго.

Кан. 1328 – § 1. Той, хто з мэтай здзяйснення злачынства выканаў якое-небудзь дзеянне або ад чаго-небудзь устрымаўся, аднак без уласнай волі не здзейсніў самога злачынства, не падлягае пакаранню, устаноўленаму за здзейсненае злачынства, калі закон або прадпісанне не прадугледжваюць іншае.

§ 2. Калі дзеянне або бяздзейнасць па сваёй сутнасці скіраваны да здзяйснення злачынства, той, хто дзейнічае або бяздзейнічае, можа быць падвергнуты пакаянню або карным сродкам, калі па сваёй волі не ўстрымаецца ад здзяйснення пачатага злачынства. Калі ж узнікне спакуса або якая-небудзь цяжкая шкода ці небяспека, у такім выпадку той, хто дзейнічае або бяздзейнічае, нават калі ён устрымаўся па сваёй волі, можа быць пакараны справядлівым пакараннем, аднак больш лёгкім, чым устаноўлена за здзейсненае злачынства.

Can. 1328 – § 1. Qui aliquid ad delictum patrandum egit vel omisit, nec tamen, praeter suam voluntatem, delictum consummavit, non tenetur poena in delictum consummatum statuta, nisi lex vel praeceptum aliter caveat.

§ 2. Quod si actus vel omissiones natura sua ad delicti exsecutionem conducant, auctor potest paenitentiae vel remedio poenali subici, nisi sponte ab incepta delicti exsecutione destiterit. Si autem scandalum aliudve grave damnum vel periculum evenerit, auctor, etsi sponte destiterit, iusta potest poena puniri, leviore tamen quam quae in delictum consummatum constituta est.

Кан. 1329 – § 1. Калі для галоўнага выканаўцы злачынства прадугледжаны пакаранні *ferendae sententiae*, то тыя асобы, якія па сумесным згаворы саўдзельнічаюць у злачынстве, але не названы выразна ў законе або прадпісанні, падвяргаюцца тым самым пакараннем або іншым — такой самай ці меншай суровасці.

§ 2. Пакаранню *latae sententiae*, звязанаму са злачынствам, падвяргаюцца саўдзельнікі, не названыя ў законе або прадпісанні, калі без іх удзелу злачынства не было б здзейснена, а пакаранне па сваёй сутнасці можа быць да іх прыменена; у іншым выпадку яны могуць быць пакараны пакараннем *ferendae sententiae*.

Can. 1329 – § 1. Qui communi delinquendi consilio in delictum concurrunt, neque in lege vel praecepto expresse nominantur, si poenae ferendae sententiae in auctorem principalem constitutae sint, iisdem poenis subiciuntur vel aliis eiusdem vel minoris gravitatis.

§ 2. In poenam latae sententiae delicto adnexam incurrunt complices, qui in lege vel praecepto non nominantur, si sine eorum opera delictum patratum non esset, et poena sit talis naturae, ut ipsos afficere possit; secus poenis ferendae sententiae puniri possunt.

Кан. 1330 – Злачынства, якое ўяўляе сабой акрэсленую заяву або іншае выяўленне волі, або вучэння, або ведаў, павінна лічыцца няздзейсненым, калі ніхто не ўспрыняў гэтую заяву або выяўленне.

Can. 1330 – Delictum quod in declaratione consistat vel in alia voluntatis vel doctrinae vel scientiae manifestatione, tamquam non consummatum censendum est, si nemo eam declarationem vel manifestationem percipiat.

TITULUS IV

DE POENIS ALIISQUE PUNITIONIBUS

Caput I

De censuris

Can. 1331 – § 1. Excommunicatus prohibetur:

1° Eucharistiae Sacrificium et reliqua sacramenta celebrare;

2° sacramenta recipere;

3° sacramentalia administrare et reliquas cultus liturgici caeremonias celebrare;

4° in celebrationibus antea recensitis ullam partem activam habere;

5° ecclesiastica officia, munera, ministeria et functiones exercere;

6° actus regiminis ponere.

§ 2. Quod si excommunicatio ferendae sententiae irrogata vel latae sententiae declarata sit, reus:

1° si agere velit contra praescriptum § 1, nn. 1-4, est arcendus aut a liturgica actione est cessandum, nisi gravis obstet causa;

2° invalide ponit actus regiminis, qui ad normam § 1, n. 6, sunt illiciti;

3° prohibetur frui privilegiis antea concessis;

4° retributiones, quae [quas] ob titulum mere ecclesiasticum habeat, non acquirit;

5° inhabilis est ad consequenda officia, munera, ministeria, functiones, iura, privilegia et titulos honorificos.

ТЫТУЛ IV

ПАКАРАННІ І ІНШЫЯ КАРНЫЯ СРОДКІ

Раздзел I

Цэнзуры

Кан. 1331 – § 1. Асобе, звязанай экскамунікай, забараняецца:

1° цэлебраваць эўхарыстычную Ахвяру і іншыя сакрамэнты;

2° прымаць сакрамэнты;

3° удзяляць сакрамэнталіі і цэлебраваць іншыя цырымоніі літургічнага культу;

4° прымаць любы чынны ўдзел у вышэйзгаданых цэлебрацыях;

5° займаць касцёльныя пасады, ажыццяўляць заданні, паслугі і функцыі;

6° здзяйсняць дзеянні кіравання.

§ 2. Калі была наложана экскамуніка *ferendae sententiae* або сцверджана экскамуніка *latae sententiae*, то злачынца:

1° калі пажадае дзейнічаць насуперак прадпісанню § 1, 1° – 4°, павінен быць выдалены або літургічнае дзеянне павінна быць спынена, калі гэтаму не перашкаджае важкая прычына;

2° нядзейсна здзяйсняе дзеянні кіравання, якія згодна з нормай § 1, 6° з'яўляюцца недазволенымі;

3° мае забарону карыстацца прывілеямі, якія раней былі яму ўдзелены;

4° не атрымлівае даходаў, якія заснаваны на чыста касцёльнай падставе;

5° з'яўляецца няздольным да атрымання пасады, задання, паслугі, функцыі, права, прывілею і ганаровага тытула.

Кан. 1332 – § 1. Асобе, звязанай інтэрдыктам, забаронена тое, аб чым гаворыцца ў кан. 1331 § 1, 1° – 4°.

§ 2. Аднак закон або прадпісанне могуць акрэсліць інтэрдыкт такім чынам, што злачынцу будуць забаронены толькі некаторыя асобныя дзеянні, аб якіх гаворыцца ў кан. 1331 § 1, 1° – 4°, або некаторыя іншыя асобныя правы.

§ 3. Таксама ў дачыненні да інтэрдыкту павінна быць захавана прадпісанне кан. 1331 § 2, 1°.

Кан. 1333 – § 1. Суспенса забараняе:

1° усе або некаторыя дзеянні ўлады пасвячэння;

2° усе або некаторыя дзеянні ўлады кіравання;

3° ажыццяўленне ўсіх або некаторых правоў і заданняў, звязаных з пасадай.

§ 2. У законе або прадпісанні можа быць устаноўлена, што пасля прысуду або дэкрэта, якія накладаюць або сцвярджаюць пакаранне, асоба, звязаная суспенсай, не можа дзейсна здзяйсняць дзеянні кіравання.

§ 3. Забарона ніколі не датычыць:

1° пасадаў або ўлады кіравання, якія не знаходзяцца пад уладай настаяцеля, які ўстанавіў пакаранне;

2° права на пражыванне, калі злачынца мае яго на падставе пасады;

3° права на адміністраванне маёмасцю, якая можа належаць да пасады, якую займае асоба, звязаная суспенсай, калі пакаранне з'яўляецца *latae sententiae*.

§ 4. Суспенса, якая забараняе атрымліваць даходы, ахвяраванні, платы і іншае, падобнае да гэтага, нясе з сабой абавязак вярнуць усё, што было атрымана нелегітымна, нават калі гэта было зроблена добрасумленна.

Can. 1332 – § 1. Interdictus tenetur prohibitionibus, de quibus in can. 1331, § 1, nn. 1-4.

§ 2. Lex tamen vel praeceptum interdictum definire eo modo potest, ut tantum quaedam singulares actiones, de quibus in can. 1331, § 1, nn. 1-4, vel alia quaedam singularia iura reo prohibeantur.

§ 3. Etiam in casu interdicti praescriptum can. 1331, § 2, n. 1, servandum est.

Can. 1333 – § 1. Suspensio prohibet:

1° omnes vel aliquos actus potestatis ordinis;

2° omnes vel aliquos actus potestatis regiminis;

3° exercitium omnium vel aliquorum iurium vel munerum officio inhaerentium.

§ 2. In lege vel praecepto statui potest, ut post sententiam vel decretum, quae poenam irrogant vel declarant, actus regiminis suspensus valide ponere nequeat.

§ 3. Prohibitio numquam afficit:

1° officia vel regiminis potestatem, quae non sint sub potestate Superioris poenam constituentis;

2° ius habitandi, si quod reus ratione officii habeat;

3° ius administrandi bona, quae ad ipsius suspensi officium forte pertineant, si poena sit latae sententiae.

§ 4. Suspensio prohibens fructus, stipendium, pensiones aliave eiusmodi percipere, obligationem secumfert restituendi quidquid illegitime, quamvis bona fide, perceptum sit.

Can. 1334 – § 1. Suspensionis ambitus, intra limites in canone praecedenti statutos, aut ipsa lege vel praecepto definitur, aut sententia vel decreto quo poena irrogatur.

§ 2. Lex, non autem praeceptum, potest latae sententiae suspensionem, nulla addita determinatione vel limitatione, constituere; eiusmodi autem poena omnes effectus habet, qui in can. 1333, § 1 recensentur.

Can. 1335 – § 1. Si censuram infligat vel declaret in processu iudiciali aut per decretum extra iudicium, auctoritas competens potest quoque eas poenas expiatorias imponere, quas ad iustitiam restituendam vel ad scandalum reparandum necessarias censeat.

§ 2. Si censura prohibeat celebrare sacramenta vel sacramentalia vel ponere actum potestatis regiminis, prohibitio suspenditur, quoties id necessarium sit ad consulendum fidelibus in mortis periculo constitutis; quod si censura latae sententiae non sit declarata, prohibitio praeterea suspenditur, quoties fidelis petit sacramentum vel sacramentale vel actum potestatis regiminis; id autem petere ex qualibet iusta causa licet.

Кан. 1334 – § 1. Аб'ём суспенсы ў межах, вызначаных у папярэднім каноне, акрэсліваецца або ў самім законе ці прадпісанні, або ў прысудзе ці дэкрэце, якімі накладаецца пакаранне.

§ 2. Закон, у адрозненне ад прадпісання, можа ўстанавіць суспенсу *latae sententiae* без дадавання да яе якога-небудзь акрэслення ці абмежавання; такое пакаранне выклікае ўсе наступствы, пералічаныя ў кан. 1333 § 1.

Кан. 1335 – § 1. Калі цэнзура накладаецца або сцвярджаецца ў судовым працэсе або праз пазасудовы дэкрэт, кампетэнтная ўлада можа таксама налажыць экспіяцыйныя пакаранні, якія палічыць неабходнымі для аднаўлення справядлівасці або ўстаранення спакусы**.**

§ 2. Калі цэнзура забараняе цэлебраваць сакрамэнты ці сакрамэнталіі або здзяйсняць дзеянні ўлады кіравання, то заўсёды, калі гэта будзе неабходна для дапамогі вернікам, якія знаходзяцца ў небяспецы смерці, гэтая забарона прыпыняецца; калі ж цэнзура *latae sententiae* не была сцверджана, то забарона, апрача гэтага, прыпыняецца заўсёды, калі які-небудзь вернік папросіць аб сакрамэнце, сакрамэнталіі або дзеянні ўлады кіравання; прасіць аб гэтым дазваляецца па любой справядлівай прычыне.

Caput II
De poenis expiatoriis

Can. 1336 – § 1. Poenae expiatoriae, quae delinquentem afficere possunt aut in perpetuum aut in tempus praefinitum aut in tempus indeterminatum, praeter alias, quas forte lex constituerit, sunt quae in §§ 2-5 recensentur.

Раздзел II
Экспіяцыйныя пакаранні

Кан. 1336 – § 1. Акрамя іншых экспіяцыйных пакаранняў, якія могуць быць устаноўлены законам, экспіяцыйныя пакаранні, якія могуць звязваць злачынцу або пастаянна, або на акрэслены ці неакрэслены тэрмін, пералічаны ў § 2–5.

§ 2. Прадпісанне:

1° прабываць у акрэсленым месцы або на акрэсленай тэрыторыі;

2° заплаціць штраф, іншымі словамі — грашовую суму на касцёльныя мэты, паводле парадку, акрэсленага Канферэнцыяй Біскупаў.

§ 3. Забарона:

1° прабываць у акрэсленым месцы або на акрэсленай тэрыторыі;

2° усюды, або ў акрэсленым месцы ці на акрэсленай тэрыторыі, або па-за імі — займаць усе або некаторыя пасады, ажыццяўляць заданні, паслугі або функцыі ці толькі некаторыя дзеянні, звязаныя з гэтымі пасадамі або заданнямі;

3° здзяйсняць усе або некаторыя дзеянні ўлады пасвячэння;

4° здзяйсняць усе або некаторыя дзеянні ўлады кіравання;

5° ажыццяўляць якое-небудзь права ці прывілей або ўжываць знешняе адзначэнне ці тытул;

6° мець актыўны ці пасіўны голас у кананічных выбарах або прымаць удзел з правам голасу ў касцёльных радах і калегіях;

7° насіць духоўнае або манаскае адзенне.

§ 4. Пазбаўленне:

1° усіх або некаторых пасадаў, заданняў, паслугаў ці функцый або толькі некаторых дзеянняў, звязаных з пасадамі ці заданнямі;

2° паўнамоцтва на спавяданне або прапаведаванне;

3° дэлегаванай улады кіравання;

4° некаторых правоў ці прывілеяў, адзначэнняў ці тытулаў;

§ 2. Praescriptio:

1° commorandi in certo loco vel territorio;

2° solvendi mulctam pecuniariam seu summam pecuniae in fines Ecclesiae, iuxta rationes ab Episcoporum conferentia definitas.

§ 3. Prohibitio:

1° commorandi in certo loco vel territorio;

2° exercendi, ubique aut in certo loco vel territorio aut extra illa, omnia vel aliqua officia, munera, ministeria aut functiones vel aliqua tantum opera officiis aut muneribus inhaerentia;

3° ponendi omnes vel aliquos actus potestatis ordinis;

4° ponendi omnes vel aliquos actus potestatis regiminis;

5° exercendi aliquod ius vel privilegium aut utendi insignibus vel titulis;

6° fruendi voce activa vel passiva in electionibus canonicis vel partem habendi cum iure ferendi suffragium in consiliis vel collegiis ecclesialibus;

7° deferendi habitum ecclesiasticum vel religiosum.

§ 4. Privatio:

1° omnium vel aliquorum officiorum, munerum, ministeriorum aut functionum vel aliquorum tantum operum officiis aut muneribus inhaerentium;

2° facultatis confessiones excipiendi vel praedicandi;

3° potestatis regiminis delegatae;

4° alicuius iuris vel privilegii aut insignium vel tituli;

5° totius vel partis remunerationis ecclesiasticae, iuxta rationes ab Episcoporum conferentia statutas, salvo quoque praescripto can. 1350, § 1.

§ 5. Dimissio e statu clericali.

Can. 1337 – § 1. Prohibitio commorandi in certo loco vel territorio sive clericos sive religiosos afficere potest; praescriptio autem commorandi, clericos saeculares et, intra limites constitutionum, religiosos.

§ 2. Ut praescriptio commorandi in certo loco vel territorio irrogetur, accedat oportet consensus Ordinarii illius loci, nisi agatur de domo extradioecesanis quoque clericis paenitentibus vel emendandis destinata.

Can. 1338 – § 1. Poenae expiatoriae, quae in can. 1336 recensentur, numquam afficiunt potestates, officia, munera, iura, privilegia, facultates, gratias, titulos, insignia, quae non sint sub potestate Superioris poenam constituentis.

§ 2. Potestatis ordinis privatio dari nequit, sed tantum prohibitio eam vel aliquos eius actus exercendi; item dari nequit privatio graduum academicorum.

§ 3. De prohibitionibus, quae in can. 1336, § 3, indicantur, norma servanda est, quae de censuris datur in can. 1335, § 2.

§ 4. Latae sententiae eae tantum poenae expiatoriae esse possunt, quae ut prohibitiones in can. 1336, § 3, recensentur vel aliae quae forte lege aut praecepto constitutae sint.

§ 5. Prohibitiones de quibus in can. 1336, § 3, numquam sunt sub poena nullitatis.

5° касцёльнага ўзнагароджання, поўнасцю ці часткова, паводле парадку, устаноўленага Канферэнцыяй Біскупаў, захоўваючы пры гэтым прадпісанне кан. 1350 § 1.

§ 5. Выдаленне з духоўнага стану.

Кан. 1337 – § 1. Забарона прабываць у акрэсленым месцы або на акрэсленай тэрыторыі можа быць прыменена і да духоўных, і да манаскіх асобаў; у сваю чаргу, прадпісанне прабываць — да секулярных духоўных асобаў, а да манаскіх асобаў — у межах канстытуцый.

§ 2. Для таго, каб налажыць прадпісанне прабываць у акрэсленым месцы або на акрэсленай тэрыторыі, патрабуецца згода ардынарыя гэтага месца, калі гаворка не ідзе пра дом, прызначаны для духоўных асобаў, таксама і не з гэтай дыяцэзіі, у якасці месца пакаяння і выпраўлення.

Кан. 1338 – § 1. Экспіяцыйныя пакаранні, пералічаныя ў кан. 1336, ніколі не датычаць улады, пасадаў, заданняў, правоў, прывілеяў, паўнамоцтваў, ласкаў, тытулаў, знешніх адзначэнняў, якія не падлягаюць уладзе настаяцеля, які ўстанаўлівае пакаранне.

§ 2. Нельга пазбавіць улады пасвячэння, можна толькі забараніць ажыццяўляць яе ўсю або некаторыя яе дзеянні; нельга таксама пазбавіць навуковых ступеняў.

§ 3. У адносінах да забаронаў, акрэсленых у кан. 1336 § 3, павінна захоўвацца норма, устаноўленая для цэнзур у кан. 1335 § 2.

§ 4. Толькі тыя экспіяцыйныя пакаранні могуць быць пакараннямі *latae sententiae*, якія пералічаны ў якасці забаронаў у кан. 1336 § 3, або іншыя, якія могуць быць устаноўлены законам або прадпісаннем.

§ 5. Забароны, аб якіх гаворыцца ў кан. 1336 § 3, ніколі не знаходзяцца пад пагрозай нядзейснасці.

Раздзел III

Карныя сродкі і пакаянні

Кан. 1339 – § 1. Ардынарый можа асабіста або праз іншую асобу папярэдзіць таго, хто знаходзіцца блізка да здзяйснення злачынства, а таксама таго, на каго пасля правядзення даследавання падае сур'ёзнае падазрэнне ў здзяйсненні злачынства.

§ 2. Таму, чые паводзіны выклікаюць спакусу або важкае парушэнне публічнага парадку, ардынарый можа вынесці вымову, дастасаваную да асаблівасцей асобы і факту.

§ 3. Аб папярэджанні або вымове заўсёды павінен быць зроблены запіс у якім-небудзь дакуменце, які павінен захоўвацца ў тайным архіве Курыі.

§ 4. Калі папярэджанне або вымова, зробленыя адзін ці некалькі разоў, не прынеслі ніякай карысці або калі нельга спадзявацца ні на які вынік, ардынарый павінен выдаць карнае прадпісанне, у якім павінен дакладна акрэсліць, што трэба зрабіць або ад чаго трэба ўстрымацца.

§ 5. Калі гэтага патрабуе важкасць справы, а асабліва калі хто-небудзь знаходзіцца ў небяспецы паўтарэння злачынства, ардынарый, апрача пакаранняў, накладзеных або сцверджаных згодна з нормамі права прысудам або дэкрэтам, падвяргае яго таксама нагляду, акрэсленаму асобным дэкрэтам.

Кан. 1340 – § 1. Пакаянне, якое можа быць наложана ў межах *forum externum*, уяўляе сабой якую-небудзь рэлігійную, пабожную або міласэрную справу, якая павінна быць выканана.

§ 2. За таемнае парушэнне ніколі не павінна накладацца публічнае пакаянне.

Caput III

De remediis poenalibus et paenitentiis

Can. 1339 – § 1. Eum, qui versatur in proxima delinquendi occasione, vel in quem, ex investigatione peracta, gravis cadit suspicio delicti commissi, Ordinarius per se vel per alium monere potest.

§ 2. Eum ex cuius conversatione scandalum vel gravis ordinis perturbatio oriatur, Ordinarius corripere potest, modo peculiaribus personae et facti condicionibus accommodato.

§ 3. De monitione et correptione constare semper debet saltem ex aliquo documento, quod in secreto curiae archivo servetur.

§ 4. Si, semel vel pluries, monitiones vel correptiones inutiliter alicui factae sint, vel si ex iis effectus exspectare non liceat, Ordinarius det praeceptum poenale, in quo accurate praescribat quid agendum vel vitandum sit.

§ 5. Si casus gravitas ferat, ac praesertim si quis versetur in periculo relabendi in delictum, eum Ordinarius, etiam praeter poenas ad normam iuris irrogatas vel declaratas per sententiam vel decretum, submittat vigilantiae modo per decretum singulare determinato.

Can. 1340 – § 1. Paenitentia, quae imponi potest in foro externo, est aliquod religionis vel pietatis vel caritatis opus peragendum.

§ 2. Ob transgressionem occultam numquam publica imponatur paenitentia.

§ 3. Paenitentias Ordinarius pro sua prudentia addere potest poenali remedio monitionis vel correptionis.

§ 3. У адпаведнасці са сваім разважлівым суджэннем ардынарый можа дадаваць пакаянне да карных сродкаў папярэджання і вымовы.

TITULUS V
DE POENARUM APPLICATIONE

Can. 1341 – Ordinarius proceduram iudicialem vel administrativam ad poenas irrogandas vel declarandas promovere debet cum perspexerit neque pastoralis sollicitudinis viis, praesertim fraterna correctione, neque monitione neque correptione satis posse iustitiam restitui, reum emendari, scandalum reparari.

Can. 1342 – § 1. Quoties iustae obstent causae ne iudicialis processus fiat, poena irrogari vel declarari potest per decretum extra iudicium, servato can. 1720, praesertim quod attinet ad ius defensionis atque ad moralem certitudinem in animo eius qui decretum fert ad normam can. 1608. Remedia poenalia et paenitentiae applicari possunt per decretum in quolibet casu.

§ 2. Per decretum irrogari vel declarari non possunt poenae perpetuae, neque poenae quas lex vel praeceptum eas constituens vetet per decretum applicare.

§ 3. Quae in lege vel praecepto dicuntur de iudice, quod attinet ad poenam irrogandam vel declarandam in iudicio, applicanda sunt ad Superiorem, qui per decretum extra iudicium poenam irroget vel declaret, nisi aliter constet neque agatur de praescriptis quae ad procedendi tantum rationem attineant.

ТЫТУЛ V
ПРЫЗНАЧЭННЕ ПАКАРАННЯЎ

Кан. 1341 – Ардынарый павінен пачынаць судовую або адміністрацыйную працэдуру з мэтай налажэння ці сцвярджэння пакарання тады, калі палічыць, што ні сродкамі пастырскага клопату, асабліва братэрскай заўвагай, ні папярэджаннем, ні вымовай не можа быць адноўлена справядлівасць, выпраўлены злачынца, устаронена спакуса.

Кан. 1342 – § 1. Калі справядлівыя прычыны перашкаджаюць правядзенню судовага працэсу, пакаранне можа быць наложана ці сцверджана пазасудовым дэкрэтам з захаваннем кан. 1720, асабліва адносна таго, што датычыць права на абарону і маральнага пераканання ў душы асобы, якая выдае дэкрэт згодна з нормай кан. 1608. Карныя сродкі і пакаянні могуць быць прызначаны дэкрэтам у любым выпадку.

§ 2. Не могуць быць наложаны ці сцверджаны дэкрэтам пакаранні, якія з'яўляюцца пастаяннымі, а таксама тыя пакаранні, якія закон або прадпісанне, якія іх устанаўліваюць, забараняюць прызначаць дэкрэтам.

§ 3. Тое, што ў законе або прадпісанні гаворыцца пра суддзю ў дачыненні да накладання ці сцвярджэння пакарання ў судовым працэсе, павінна прымяняцца да настаяцеля, які пазасудовым дэкрэтам накладае ці сцвярджае пакаранне, калі не прадугледжана іншае і гаворка не ідзе пра прадпісанні, якія датычаць толькі працэсуальнага парадку.

Кан. 1343 – Калі закон або прадпісанне надзяляе суддзю паўнамоцтвам прызначаць або не прызначаць пакаранне, то суддзя, захоўваючы прадпісанне кан. 1326 § 3, на падставе свайго сумлення і разважлівасці, павінен вырашыць справу згодна з тым, што неабходна для аднаўлення справядлівасці, выпраўлення злачынцы і ўстаранення спакусы. У гэтым выпадку суддзя можа таксама, калі гэта будзе дарэчным, паменшыць пакаранне або налажыць замест яго пакаянне.

Can. 1343 – Si lex aut praeceptum iudici facultatem concedat applicandi vel non applicandi poenam, iste, salvo praescripto can. 1326, § 3, rem definiat, pro sua conscientia et prudentia, iuxta id quod expostulant iustitiae restitutio, rei emendatio et scandali reparatio; iudex autem his in casibus potest etiam, si res ferat, poenam temperare vel in eius locum paenitentiam imponere.

Кан. 1344 – Нават калі закон выкарыстоўвае прадпісваючыя словы, суддзя, згодна са сваім сумленнем і разважлівасцю, можа:

1° перанесці налажэнне пакарання на больш адпаведны час, калі прадбачыцца, што заўчаснае пакаранне злачынцы можа прывесці да большага зла і калі няма тэрміновай неабходнасці ўстаранення спакусы;

2° устрымацца ад накладання пакарання або налажыць меншае пакаранне ці прымяніць пакаянне, калі злачынца выправіўся і ўстараніў спакусу і выкліканую ёй шкоду або быў ужо дастаткова пакараны дзяржаўнай уладай ці прадбачыцца, што ён будзе ёю пакараны;

3° прыпыніць абавязак несці экспіяцыйнае пакаранне, калі злачынца здзейсніў злачынства першы раз на працягу пахвальна пражытага жыцця і няма тэрміновай неабходнасці ўстаранення спакусы, аднак такім чынам, што, калі злачынца на працягу тэрміну, устаноўленага суддзёй, зноў здзейсніць злачынства, будзе пакараны за абодва злачынствы, калі да гэтага моманту не міне тэрмін даўнасці карнага праследавання, прадпісаны адносна першага злачынства.

Can. 1344 – Etiamsi lex utatur verbis praeceptivis, iudex pro sua conscientia et prudentia potest:

1° poenae irrogationem in tempus magis opportunum differre, si ex praepropera rei punitione maiora mala eventura praevideantur, nisi necessitas urgeat scandalum reparandi;

2° a poena irroganda abstinere vel poenam mitiorem irrogare aut paenitentiam adhibere, si reus emendatus sit, necnon scandalum et damnum forte illatum repararit, aut si ipse satis a civili auctoritate punitus sit vel punitum iri praevideatur;

3° obligationem servandi poenam expiatoriam suspendere, si reus primum post vitam laudabiliter peractam deliquerit neque necessitas urgeat reparandi scandalum, ita tamen ut, si reus intra tempus ab ipso iudice determinatum rursus deliquerit, poenam utrique delicto debitam luat, nisi interim tempus decurrerit ad actionis poenalis pro priore delicto praescriptionem.

Can. 1345 – Quoties delinquens vel usum rationis imperfectum tantum habuerit, vel delictum ex necessitate vel gravi metu aut passionis aestu vel, salvo praescripto can. 1326, § 1, n. 4, in ebrietate aliave simili mentis perturbatione patraverit, iudex potest etiam a qualibet punitione irroganda abstinere, si censeat aliter posse melius consuli eius emendationi; reus tamen puniri debet si aliter ad iustitiam restituendam, et scandalum forte illatum reparandum provideri non possit.

Кан. 1345 – Калі злачынца або меў толькі абмежаванае карыстанне розумам, або здзейсніў злачынства з прычыны неабходнасці, ці моцнага страху, ці асаблівага псіхічнага стану, ці — захоўваючы прадпісанне кан. 1326 § 1, 4° у стане ап'янення ці іншым падобным стане, суддзя таксама можа ўстрымацца ад накладання якога-небудзь пакарання, калі палічыць, што можна іншым спосабам больш паспяхова паклапаціцца аб выпраўленні злачынцы. Аднак злачынца павінен быць пакараны, калі немагчыма іншым спосабам дасягнуць аднаўлення справядлівасці і ўстаранення існуючай спакусы.

Can. 1346 – § 1. Ordinarie tot poenae quot delicta.

§ 2. Quoties vero reus plura delicta patraverit, si nimius videatur poenarum ferendae sententiae cumulus, prudenti iudicis arbitrio relinquitur poenas intra aequos terminos moderari, et eum vigilantiae subicere.

Кан. 1346 – § 1. Звычайна прызначаецца столькі пакаранняў, колькі злачынстваў было здзейснена.

§ 2. Аднак, калі злачынца здзейсніў некалькі злачынстваў і сукупнасць пакаранняў *ferendae sententiae* уяўляецца празмернай, разважліваму суджэнню суддзі пакідаецца магчымасць прызначэння суразмерна абмежаванага пакарання і забеспячэння яго выканання.

Can. 1347 – § 1. Censura irrogari valide nequit, nisi antea reus semel saltem monitus sit ut a contumacia recedat, dato congruo ad resipiscentiam tempore.

§ 2. A contumacia recessisse dicendus est reus, quem delicti vere paenituerit, quique praeterea congruam scandali et damni reparationem dederit vel saltem id praestare serio promiserit.

Кан. 1347 – § 1. Цэнзура не можа быць дзейсна наложана, калі перад гэтым злачынца прынамсі адзін раз не быў папярэджаны аб тым, што павінен адмовіцца ад упартасці, пры гэтым павінен быць дадзены адпаведны час на выпраўленне.

§ 2. Павінна лічыцца, што злачынца адмовіўся ад упартасці, калі ён сапраўды раскаяўся ў злачынстве і, апрача таго, адпаведным чынам устараніў спакусу і шкоду або прынамсі сур'ёзна паабяцаў гэта.

Can. 1348 – Cum reus ab accusatione absolvitur vel nulla poena ei irrogatur, Ordinarius potest opportunis monitis aliisque pastoralis sollicitudinis viis,

Кан. 1348 – Калі злачынца быў вызвалены ад абвінавачвання або на яго не было наложана ніякае пакаранне, ардынарый можа паклапаціцца аб яго карысці і агульным

дабры праз адпаведныя папярэджанні ці іншыя сродкі пастырскага клопату, а пры неабходнасці — праз карныя сродкі.

Кан. 1349 – Калі пакаранне з'яўляецца неакрэсленым і закон не прадугледжвае іншае, пры вызначэнні пакарання суддзя павінен выбраць тое, якое з'яўляецца прапарцыянальным выкліканай спакусе і цяжкасці шкоды, пры гэтым нельга накладаць больш цяжкія пакаранні, калі да гэтага не схіляе важкасць справы; не могуць быць накладзены пастаянныя пакаранні.

Кан. 1350 – § 1. Пры накладанні пакаранняў на духоўных асобаў заўсёды трэба мець на ўвазе тое, каб яны не былі пазбаўлены таго, што з'яўляецца неабходным для годнага ўтрымання, калі гаворка не ідзе пра выдаленне з духоўнага стану.

§ 2. Ардынарый павінен паклапаціцца аб тым, каб як мага лепш дапамагчы таму, хто, выдалены з духоўнага стану, апынуўся праз гэтае пакаранне ў сапраўднай нястачы, выключаючы прызначэнне яго на пасады, паслугі ці заданні.

Кан. 1351 – Пакаранне абавязвае злачынцу ўсюды, нават са спыненнем права таго, хто ўстанавіў, налажыў або сцвердзіў гэтае пакаранне, калі іншае не было выразна прадугледжана.

Кан. 1352 – § 1. Калі пакаранне забараняе прымаць сакрамэнты або сакрамэнталіі, гэтая забарона прыпыняецца, пакуль злачынца знаходзіцца ў небяспецы смерці.

§ 2. Абавязак нясення пакарання *latae sententiae*, якое не было ні сцверджана, ні юрыдычна пацверджана ў месцы, дзе знаходзіцца злачынца, прыпыняецца поўнасцю або часткова ў той меры, у якой злачынца не можа яго несці без небяспекі цяжкай спакусы ці ганьбы.

vel etiam, si res ferat, poenalibus remediis eius utilitati et publico bono consulere.

Can. 1349 – Si poena sit indeterminata neque aliud lex caveat, iudex in poenis determinandis eas eligat quae inducto scandalo et damni gravitati proportionatae sint; poenas tamen graviores ne irroget, nisi casus gravitas id omnino postulet; perpetuas autem poenas irrogare non potest.

Can. 1350 – § 1. In poenis clerico irrogandis semper cavendum est, ne iis quae ad honestam sustentationem sunt necessaria ipse careat, nisi agatur de dimissione e statu clericali.

§ 2. Dimisso autem e statu clericali, qui propter poenam vere indigeat, Ordinarius meliore quo fieri potest modo providere curet, exclusa vero collatione officii, ministerii vel muneris.

Can. 1351 – Poena reum ubique tenet, etiam resoluto iure eius qui poenam constituit, irrogavit vel declaravit, nisi aliud expresse caveatur.

Can. 1352 – § 1. Si poena prohibeat recipere sacramenta vel sacramentalia, prohibitio suspenditur, quamdiu reus in mortis periculo versatur.

§ 2. Obligatio servandi poenam latae sententiae, quae neque declarata sit neque sit notoria in loco ubi delinquens versatur, eatenus ex toto vel ex parte suspenditur, quatenus reus eam servare nequeat sine periculo gravis scandali vel infamiae.

Can. 1353 – Appellatio vel recursus a sententiis iudicialibus vel a decretis, quae poenam quamlibet irrogent vel declarent, habent effectum suspensivum.

Кан. 1353 – Апеляцыя або рэкурс на судовыя прысуды ці дэкрэты, якія накладаюць ці сцвярджаюць любое пакаранне, мае прыпыняючае дзеянне.

TITULUS VI

DE POENARUM REMISSIONE ET DE ACTIONUM PRAESCRIPTIONE

ТЫТУЛ VI

ВЫЗВАЛЕННЕ АД ПАКАРАННЯЎ І КАРНАЯ ДАЎНАСЦЬ

Can. 1354 – § 1. Praeter eos, qui in cann. 1355-1356 recensentur, omnes, qui a lege, quae poena munita est, dispensare possunt vel a praecepto poenam comminanti eximere, possunt etiam eam poenam remittere.

§ 2. Potest praeterea lex vel praeceptum, poenam constituens, aliis quoque potestatem facere remittendi.

§ 3. Si Apostolica Sedes poenae remissionem sibi vel aliis reservaverit, reservatio stricte est interpretanda.

Кан. 1354 – § 1. Апрача тых, хто пералічаны ў кан. 1355–1356, усе, хто могуць дыспенсаваць ад закона, з якім звязана пакаранне, і выключаць з дзеяння прадпісання, якое пагражае пакараннем, могуць таксама вызваляць ад гэтых пакаранняў.

§ 2. Акрамя гэтага, закон або прадпісанне, якім устанаўліваецца пакаранне, можа ўдзяляць уладу вызвалення ад яго іншым асобам.

§ 3. Калі Апостальская Сталіца зарэзервавала вызваленне ад пакарання за сабой або за іншымі, гэтае рэзерваванне падлягае вузкай інтэрпрэтацыі.

Can. 1355 – § 1. Poenam lege constitutam, quae sit ferendae sententiae irrogata vel latae sententiae declarata, dummodo non sit Apostolicae Sedi reservata, remittere possunt:

1° Ordinarius, qui iudicium ad poenam irrogandam vel declarandam promovit vel decreto eam per se vel per alium irrogavit vel declaravit;

2° Ordinarius loci in quo delinquens versatur, consulto tamen, nisi propter extraordinarias circumstantias impossibile sit, Ordinario, de quo sub n. 1.

§ 2. Poenam lege constitutam, quae sit latae sententiae nondum declarata

Кан. 1355 – § 1. Ад пакарання, устаноўленага законам, калі яно з'яўляецца наложаным пакараннем *ferendae sententiae* або сцверджаным пакараннем *latae sententiae* і калі толькі яно не зарэзервавана за Апостальскай Сталіцай, могуць вызваляць:

1° ардынарый, які пачаў судовы працэс для налажэння ці сцвярджэння пакарання або асабіста ці з дапамогай іншай асобы налажыў ці сцвердзіў яго дэкрэтам;

2° ардынарый месца, дзе знаходзіцца злачынца, параіўшыся, аднак, з ардынарыем, аб якім гаворыцца ў 1°, калі гэта не будзе немагчымым па прычыне надзвычайных абставінаў.

§ 2. Ад пакарання, устаноўленага законам, калі яно з'яўляецца яшчэ не сцверджа-

ным пакараннем *latae sententiae* і калі толькі яно не зарэзервавана за Апостальскай Сталіцай, могуць вызваляць:

1° ардынарый — сваіх падуладных;

2° ардынарый месца — таксама тых, хто знаходзіцца на яго тэрыторыі або здзейсніў там злачынства;

3° кожны біскуп, але толькі падчас сакрамэнтальнай споведзі.

Кан. 1356 – § 1. Ад пакарання *ferendae sententiae* або *latae sententiae*, устаноўленага прадпісаннем, якое не было выдадзена Апостальскай Сталіцай, могуць вызваляць:

1° асоба, якая выдала прадпісанне;

2° ардынарый, які пачаў судовы працэс для налажэння ці сцвярджэння пакарання або асабіста ці з дапамогай іншай асобы налажыў ці сцвердзіў яго дэкрэтам;

3° ардынарый месца, дзе знаходзіцца злачынца.

§ 2. Перад тым, як адбудзецца вызваленне, трэба параіцца з асобай, якая выдала прадпісанне або якая налажыла ці сцвердзіла пакаранне, калі гэта не будзе немагчымым па прычыне надзвычайных абставінаў.

Кан. 1357 – § 1. Захоўваючы прадпісанні кан. 508 і 976, ад цэнзуры экскамунікі або інтэрдыкту *latae sententiae*, якая не была сцверджана, можа вызваляць споведнік на сакрамэнтальным *forum internum*, калі пэнітэнту будзе цяжка заставацца ў стане цяжкага граху на працягу часу, неабходнага для таго, каб аб гэтым паклапаціўся кампетэнтны настаяцель.

§ 2. Удзяляючы вызваленне, споведнік павінен абавязаць пэнітэнта пад пагрозай таго, што пэнітэнт зноў будзе падвержаны пакаранню, каб на працягу месяца ён звярнуўся да кампетэнтнага настаяцеля або да

et dummodo non sit Apostolicae Sedi reservata, remittere possunt:

1° Ordinarius suis subditis;

2° Ordinarius loci etiam iis qui in ipsius territorio versantur vel ibi deliquerint;

3° quilibet Episcopus in actu tamen sacramentalis confessionis.

Can. 1356 – § 1. Poenam ferendae vel latae sententiae constitutam praecepto quod non sit ab Apostolica Sede latum, remittere possunt:

1° praecepti auctor;

2° Ordinarius qui iudicium ad poenam irrogandam vel declarandam promovit vel decreto eam per se vel per alium irrogavit vel declaravit;

3° Ordinarius loci, in quo delinquens versatur.

§ 2. Antequam remissio fiat, consulendus est, nisi propter extraordinarias circumstantias impossibile sit, praecepti auctor, vel qui poenam irrogavit vel declaravit.

Can. 1357 – § 1. Firmis praescriptis cann. 508 et 976, censuram latae sententiae excommunicationis vel interdicti non declaratam confessarius remittere potest in foro interno sacramentali, si paenitenti durum sit in statu gravis peccati permanere per tempus necessarium ut Superior competens provideat.

§ 2. In remissione concedenda confessarius paenitenti onus iniungat recurrendi intra mensem sub poena reincidentiae ad Superiorem competentem vel ad sacerdotem facultate

praeditum, et standi huius mandatis; interim imponat congruam paenitentiam et, quatenus urgeat, scandali et damni reparationem; recursus autem fieri potest etiam per confessarium, sine nominis mentione.

§ 3. Eodem onere recurrendi tenentur, cessante periculo, ii quibus ad normam can. 976 remissa est censura irrogata vel declarata vel Sedi Apostolicae reservata.

Can. 1358 – § 1. Remissio censurae dari non potest nisi delinquenti qui a contumacia, ad normam can. 1347, § 2, recesserit; recedenti autem denegari nequit, salvo praescripto can. 1361, § 4.

§ 2. Qui censuram remittit, potest ad normam can. 1348 providere vel etiam paenitentiam imponere.

Can. 1359 – Si quis pluribus poenis detineatur, remissio valet tantummodo pro poenis in ipsa expressis; generalis autem remissio omnes aufert poenas, iis exceptis quas in petitione delinquens mala fide reticuerit.

Can. 1360 – Remissio poenae vi aut metu gravi aut dolo extorta ipso iure irrita est.

Can. 1361 – § 1. Remissio dari potest etiam absenti vel sub condicione.

§ 2. Remissio in foro externo detur scripto, nisi gravis causa aliud suadeat.

§ 3. Remissionis petitio vel ipsa remissio ne divulgetur, nisi quatenus

святара, надзеленага адпаведным паўнамоцтвам, і падпарадкаваўся яго распараджэнням; тым часам спаведнік павінен налажыць адпаведнае пакаянне і, пры неабходнасці, абавязаць да ўстаранення спакусы і шкоды; гэты зварот можа быць здзейснены таксама самім спаведнікам без узгадвання імя пэнітэнта.

§ 3. Такі ж абавязак звароту ўскладаецца пасля таго, як небяспека скончылася, на тых, хто згодна з нормай кан. 976 быў вызвалены ад цэнзуры — наложанай, сцверджанай або зарэзерваванай за Апостальскай Сталіцай.

Кан. 1358 – § 1. Вызваленне ад цэнзуры не можа быць удзелена, калі не злачынцу, які адмовіўся ад упартасці згодна з нормай кан. 1347 § 2; таму ж, хто гэта ўчыніў, нельга адмовіць у вызваленні, захоўваючы прадпісанне кан. 1361 § 4.

§ 2. Той, хто вызваляе ад цэнзуры, можа дзейнічаць згодна з нормай кан. 1348 або налажыць пакаянне.

Кан. 1359 – Калі хто-небудзь падвержаны некалькім пакаранням, то вызваленне з'яўляецца дзейсным толькі ў дачыненні да пакаранняў, якія ў ім указаны; у сваю чаргу, агульнае вызваленне ахоплівае ўсе пакаранні, за выключэннем тых, якія злачынца зламысна затаіў у сваім прашэнні.

Кан. 1360 – Вызваленне ад пакарання, вымушанае прымусам, ці моцным страхам, ці падманам з'яўляецца нядзейсным на моцы самога права.

Кан. 1361 – § 1. Вызваленне можа быць удзелена адсутнаму, а таксама ўмоўна.

§ 2. На *forum externum* вызваленне павінна быць удзелена пісьмова, калі важкая прычына не схіляе да іншага.

§ 3. Нельга абвяшчаць аб прашэнні аб вызваленні або самім вызваленні, калі гэта

не будзе карысным для абароны добрага імя злачынцы або неабходным для ўстаранення спакусы.

§ 4. Вызваленне не павінна быць удзелена да таго часу, пакуль, згодна з разважлівым суджэннем ардынарыя, злачынца не ўстароніць прычыненую шкоду; злачынца можа быць абавязаны да ўстаранення шкоды ці яе выпраўлення на моцы аднаго з пакаранняў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1336 § 2–4; тое самае прымяняецца, калі злачынцы ўдзяляецца вызваленне ад цэнзуры згодна з нормай кан. 1358 § 1.

id vel utile sit ad rei famam tuendam vel necessarium ad scandalum reparandum.

§ 4. Remissio dari non debet donec, prudenti arbitrio Ordinarii, damnum forte illatum reus reparaverit; qui ad hanc reparationem vel restitutionem urgeri potest per unam ex poenis de quibus in can. 1336, §§ 2-4, quod valet etiam cum illi censura remittitur ad normam can. 1358, § 1.

Кан. 1362 – § 1. Крымінальнае праследаванне спыняецца ў выніку наступлення даўнасці, якая складае тры гады, калі гаворка не ідзе пра:

1° злачынствы, зарэзерваваныя за Кангрэгацыяй Веравучэння, якія падпарадкаваны спецыяльным нормам;

2° праследаванне злачынстваў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1376, 1377, 1378, 1393 § 1, 1394, 1395, 1397, 1398 § 2, у дачыненні да якіх тэрмін даўнасці складае дваццаць гадоў, з захаваннем прадпісання 1°;

3° злачынствы, якія не караюцца агульным правам, калі партыкулярны закон устанавіў іншы тэрмін даўнасці.

§ 2. Калі іншае не ўстаноўлена ў законе, даўнасць лічыцца ад дня здзяйснення злачынства або — калі злачынства з'яўляецца цяглым ці ўвайшло ў звычку — ад дня яго заканчэння.

§ 3. Пасля таго, як злачынца будзе выкліканы згодна з нормай кан. 1723 або паведамлены аб прад'яўленні абвінавачвання паводле кан. 1721 § 1 у адпаведнасці з парадкам, прадугледжаным у кан. 1507 § 3, наступленне даўнасці крымінальнага праслед

Can. 1362 – § 1. Actio criminalis praescriptione extinguitur triennio, nisi agatur:

1° de delictis Congregationi pro Doctrina Fidei reservatis, quae normis specialibus subiciuntur;

2° firmo praescripto n. 1, de actione ob delicta de quibus in cann. 1376, 1377, 1378, 1393, § 1, 1394, 1395, 1397, 1398, § 2, quae septennio praescribitur, vel de ea ob delicta de quibus in can. 1398, § 1, quae viginti annorum spatio praescribitur;

3° de delictis quae non sunt iure communi punita, si lex particularis alium praescriptionis terminum statuerit.

§ 2. Praescriptio, nisi aliud in lege statuatur, decurrit ex die quo delictum patratum est, vel, si delictum sit permanens vel habituale, ex die quo cessavit.

§ 3. Reo ad normam can. 1723 citato vel modo praeviso in can. 1507, § 3, certiore facto de exhibitione accusationis libelli iuxta can. 1721, § 1, praescriptio actionis criminalis suspenditur per tres annos, quo termi-

no elapso vel interrupta suspensione, cessationis processus poenalis causa, rursus currit tempus, quod adiungitur ad illud iam decursum pro praescriptione. Eadem suspensio pariter viget si, servato can. 1720, n. 1, ad poenam irrogandam vel declarandam per decretum extra iudicium procedatur.

давання прыпыняецца на тры гады. Пасля заканчэння гэтага тэрміну або адмены прыпынення па прычыне спынення карнага працэсу, час зноў лічыцца і дадаецца да таго часу, які ўжо мінуў для наступлення даўнасці. Тое ж прыпыненне прымяняецца ў выпадку, калі, захоўваючы кан. 1720, 1°, будзе пачата налажэнне або сцвярджэнне пакарання пазасудовым дэкрэтам.

Can. 1363 – § 1. Si intra terminos de quibus in can. 1362, ex die quo sententia condemnatoria in rem iudicatam transierit computandos, non sit reo notificatum exsecutorium iudicis decretum de quo in can. 1651, actio ad poenam exsequendam praescriptione extinguitur.

§ 2. Idem valet, servatis servandis, si poena per decretum extra iudicium irrogata sit.

Кан. 1363 – § 1. Калі ад дня, калі прысуд перайшоў у стан *res iudicata*, на працягу тэрмінаў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1362, злачынца не быў паведамлены аб выдадзеным суддзёй выканаўчым дэкрэце, аб якім гаворыцца ў кан. 1651, наступае даўнасць выканання пакарання.

§ 2. Пры ўмове захавання таго, што павінна быць захавана, тое самае павінна прымяняцца тады, калі пакаранне было наложана пазасудовым дэкрэтам.

PARS II

DE SINGULIS DELICTIS DEQUE POENIS IN EADEM CONSTITUTIS

TITULUS I

DE DELICTIS CONTRA FIDEM ET ECCLESIAE UNITATEM

ЧАСТКА II

АСОБНЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ І ЎСТАНОЎЛЕНЫЯ ЗА ІХ ПАКАРАННІ

ТЫТУЛ I

ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ВЕРЫ І ЕДНАСЦІ КАСЦЁЛА

Can. 1364 – § 1. Apostata a fide, haereticus vel schismaticus in excommunicationem latae sententiae incurrit, firmo praescripto can. 194, § 1, n. 2; praeterea poenis, de quibus in can. 1336, §§ 2-4, puniri potest.

§ 2. Si diuturna contumacia vel scandali gravitas id postulet, aliae poenae addi possunt, non excepta dimissione e statu clericali.

Кан. 1364 – § 1. Апастат, ерэтык або схізматык падвяргаюцца экскамуніцы *latae sententiae*, захоўваючы прадпісанне кан. 194 § 1, 2°; акрамя таго, могуць быць наложаны пакаранні, аб якіх гаворыцца ў кан. 1336 § 2–4.

§ 2. Калі да гэтага схіляе доўгатрывалая ўпартасць або цяжкасць спакусы, могуць быць дададзены іншыя пакаранні, не выключаючы выдалення з духоўнага стану.

Can. 1365 – Qui, praeter casum de quo in can. 1364, § 1, doctrinam

Кан. 1365 – Той, хто, акрамя выпадку, аб якім гаворыцца ў кан. 1364 § 1, навучае

вучэнню, асуджанаму Рымскім Пантыфікам ці Сусветным Саборам, або ўпарта пярэчыць вучэнню, аб якім гаворыцца ў кан. 750 § 2 ці ў кан. 752, і пасля папярэджання Апостальскай Сталіцы або ардынарыя не адмовіцца ад гэтага, павінен быць пакараны цэнзурай і пазбаўленнем пасады; да гэтых пакаранняў могуць быць дададзены іншыя, аб якіх гаворыцца ў кан. 1336 § 2–4.

a Romano Pontifice vel a Concilio Oecumenico damnatam docet vel doctrinam, de qua in can. 750, § 2, vel in can. 752, pertinaciter respuit, et ab Apostolica Sede vel ab Ordinario admonitus non retractat, censura puniatur et privatione officii; his sanctionibus aliae addi possunt de quibus in can. 1336, §§ 2-4.

Кан. 1366 – Той, хто звяртаецца да Сусветнага Сабору або Калегіі Біскупаў з рэкурсам на дзеянне Рымскага Пантыфіка, павінен быць пакараны цэнзурай.

Can. 1366 – Qui contra Romani Pontificis actum ad Concilium Oecumenicum vel ad Episcoporum collegium recurrit censura puniatur.

Кан. 1367 – Бацькі або тыя, хто іх замяшчаюць, якія аддаюць дзяцей для хросту або выхавання ў некаталіцкай рэлігіі, павінны быць пакараны цэнзурай або іншым справядлівым пакараннем.

Can. 1367 – Parentes vel parentum locum tenentes, qui liberos in religione acatholica baptizandos vel educandos tradunt, censura aliave iusta poena puniantur.

Кан. 1368 – Той, хто падчас публічнага мерапрыемства ці сходу, у публічным друкаваным выданні або іншым чынам выкарыстоўваючы сродкі сацыяльнай камунікацыі здзяйсняе блюзнерства, або цяжка шкодзіць добрым норавам, або абражае рэлігію ці Касцёл, або ўзбуджае нянавісць ці пагарду да іх, павінен быць пакараны справядлівым пакараннем.

Can. 1368 – Qui in publico spectaculo vel concione, vel in scripto publice evulgato, vel aliter instrumentis communicationis socialis utens, blasphemiam profert, aut bonos mores graviter laedit, aut in religionem vel Ecclesiam iniurias exprimit vel odium contemptumve excitat, iusta poena puniatur.

Кан. 1369 – Той, хто прафануе святую рэч, рухомую ці нерухомую, павінен быць пакараны справядлівым пакараннем.

Can. 1369 – Qui rem sacram, mobilem vel immobilem, profanat iusta poena puniatur.

ТЫТУЛ II
ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ КАСЦЁЛЬНАЙ УЛАДЫ І АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ЗАДАННЯЎ

TITULUS II
DE DELICTIS CONTRA ECCLESIASTICAM AUCTORITATEM ET MUNERUM EXERCITIUM

Кан. 1370 – § 1. Той, хто прымяняе фізічную сілу супраць Рымскага Пантыфіка, падвяргаецца зарэзерваванай за Апостальскай Сталіцай экскамуніцы *latae sententiae*, да

Can. 1370 – § 1. Qui vim physicam in Romanum Pontificem adhibet, in excommunicationem latae sententiae Sedi Apostolicae reservatam in-

currit, cui, si clericus sit, alia poena, non exclusa dimissione e statu clericali, pro delicti gravitate addi potest.

§ 2. Qui id agit in eum qui episcopali charactere pollet, in interdictum latae sententiae et, si sit clericus, etiam in suspensionem latae sententiae incurrit.

§ 3. Qui vim physicam in clericum vel religiosum vel alium christifidelem adhibet in fidei vel Ecclesiae vel ecclesiasticae potestatis vel ministerii contemptum, iusta poena puniatur.

Can. 1371 – § 1. Qui Sedi Apostolicae, Ordinario vel Superiori legitime praecipienti vel prohibenti non obtemperat, et post monitionem in inoboedientia persistit, pro casus gravitate puniatur censura vel privatione officii vel aliis poenis de quibus in can. 1336, §§ 2-4.

§ 2. Qui obligationes sibi ex poena impositas violat, poenis de quibus in can. 1336, §§ 2-4, puniatur.

§ 3. Si quis, asserens vel promittens aliquid coram ecclesiastica auctoritate, periurium committit, iusta poena puniatur.

§ 4. Qui obligationem secreti pontificii servandi violat poenis de quibus in can. 1336, §§ 2-4, puniatur.

§ 5. Qui non servaverit officium exsequendi sententiam exsecutivam vel decretum poenale exsecutivum iusta poena puniatur, non exclusa censura.

якой — калі гаворка ідзе пра духоўную асобу — можа быць дададзена іншае пакаранне ў залежнасці ад цяжкасці злачынства, не выключаючы выдалення з духоўнага стану.

§ 2. Той, хто здзейсніць такое ж злачынства супраць таго, хто мае біскупскую годнасць, падвяргаецца інтэрдыкту *latae sententiae*, а калі гаворка ідзе пра духоўную асобу — таксама суспенсе *latae sententiae*.

§ 3. Той, хто прымяняе фізічную сілу супраць духоўнай ці манаскай асобы або іншага верніка па прычыне пагарды да веры, або Касцёла, або касцёльнай улады, або паслугі, — павінен быць пакараны справядлівым пакараннем.

Кан. 1371 – § 1. Той, хто не падпарадкоўваецца легітымным распараджэнням або забаронам Апостальскай Сталіцы, ардынарыя ці настаяцеля і пасля папярэджання трывае ў непаслухмянасці, у залежнасці ад цяжкасці справы павінен быць пакараны цэнзурай, або пазбаўленнем пасады, або іншым пакараннем, аб якім гаворыцца ў кан. 1336 § 2–4.

§ 2. Той, хто парушае абавязкі, ускладзеныя на яго на моцы пакарання, павінен быць пакараны пакараннямі, аб якіх гаворыцца ў кан. 1336 § 2–4.

§ 3. Калі хто-небудзь, сцвярджаючы ці абяцаючы што-небудзь перад касцёльнай уладай, здзейсніць ілжэсведчанне, павінен быць пакараны справядлівым пакараннем.

§ 4. Той, хто парушае абавязак захоўвання папскай таямніцы, павінен быць пакараны пакараннямі, аб якіх гаворыцца ў кан. 1336 § 2–4.

§ 5. Той, хто не захоўвае абавязак выканання выканаўчага прысуду або выканаўчага карнага дэкрэта, павінен быць пакараны справядлівым пакараннем, не выключаючы цэнзуры.

§ 6. Той, хто не выконвае ўскладзены на яго кананічным законам абавязак паведамлення аб злачынстве, павінен быць пакараны згодна з кан. 1336 § 2–4, з дадаваннем таксама іншых пакаранняў паводле цяжкасці злачынства.

Кан. 1372 – Павінны быць пакараны згодна з нормамі кан. 1336 § 2–4:

1° тыя, хто перашкаджаюць свабодзе паслугі, або ажыццяўленню касцёльнай улады, або легітымнаму ўжыванню святых рэчаў ці касцёльнай маёмасці, або пагражаюць тым, хто ажыццяўляе касцёльную ўладу ці паслугу;

2° тыя, хто перашкаджаюць свабодзе выбараў або пагражаюць выбаршчыкам ці выбранаму.

Кан. 1373 – Той, хто публічна ўзбуджае варожасць або нянавісць да Апостальскай Сталіцы ці ардынарыя па прычыне якога-небудзь дзеяння ўлады ці касцёльнага задання або правакуе да непаслухмянасці супраць іх, павінен быць пакараны інтэрдыктам або іншым справядлівым пакараннем.

Кан. 1374 – Той, хто ўступае ў аб'яднанне, якое дзейнічае супраць Касцёла, павінен быць пакараны справядлівым пакараннем; той жа, хто спрыяе такому аб'яднанню або ім кіруе, павінен быць пакараны інтэрдыктам.

Кан. 1375 – § 1. Кожны, хто ўзурпуе касцёльную пасаду, павінен быць пакараны справядлівым пакараннем.

§ 2. Да ўзурпацыі прыраўноўваецца нелегітымнае затрыманне пасады пасля пазбаўлення яе або скасавання гэтага задання.

Кан. 1376 – § 1. Павінен быць пакараны пакараннямі, аб якіх гаворыцца ў кан. 1336 § 2–4, з захаваннем абавязку выпраўлення шкоды:

§ 6. Qui communicare neglegit notitiam de delicto, cum ad id exsequendum lege canonica teneatur, puniatur ad normam can. 1336, §§ 2-4, adiunctis quoque aliis poenis pro delicti gravitate.

Can. 1372 – Puniantur ad normam can. 1336, §§ 2-4:

1° qui impediunt libertatem ministerii vel exercitium potestatis ecclesiasticae aut legitimum rerum sacrarum vel bonorum ecclesiasticorum usum, aut perterrent eum qui potestatem vel ministerium ecclesiasticum exercuit;

2° qui impediunt libertatem electionis aut perterrent electorem vel electum.

Can. 1373 – Qui publice simultates vel odia adversus Sedem Apostolicam vel Ordinarium excitat propter aliquem officii vel muneris ecclesiastici actum, aut ad inoboedientiam in eos provocat, interdicto vel aliis iustis poenis puniatur.

Can. 1374 – Qui nomen dat consociationi, quae contra Ecclesiam machinatur, iusta poena puniatur; qui autem eiusmodi consociationem promovet vel moderatur, interdicto puniatur.

Can. 1375 – § 1. Quicumque officium ecclesiasticum usurpat, iusta poena puniatur.

§ 2. Usurpationi aequiparatur illegitima, post privationem vel cessationem a munere, eiusdem retentio.

Can. 1376 – § 1. Poenis de quibus in can. 1336, §§ 2-4, puniatur, firma damnum reparandi obligatione:

1° qui bona ecclesiastica subtrahit vel impedit ne eorundem fructus percipiantur;

2° qui sine praescripta consultatione, consensu vel licentia aut sine alio requisito iure ad validitatem vel ad liceitatem imposito bona ecclesiastica alienat vel in ea actus administrationis exsequitur.

§ 2. Iusta poena puniatur, non exclusa officii privatione, firma damnum reparandi obligatione:

1° qui delictum de quo in § 1, n. 2, ex sua gravi culpa committit;

2° qui aliter graviter neglegens in bonis ecclesiasticis administrandis repertus fuerit.

Can. 1377 – § 1. Qui quidvis donat vel pollicetur ut aliquis officium vel munus in Ecclesia exercens, illegitime quid agat vel omittat, iusta poena puniatur ad normam can. 1336, §§ 2-4; item qui ea dona vel pollicitationes acceptat pro delicti gravitate puniatur, non exclusa officii privatione, firma damnum reparandi obligatione.

§ 2. Qui in officio vel munere exercendo stipem ultra definitam aut summas adiunctivas aut aliquid in sui utilitatem requirit, congruenti mulcta pecuniaria vel aliis poenis, non exclusa officii privatione, puniatur, firma damnum reparandi obligatione.

1° той, хто прысвойвае касцёльную маёмасць або перашкаджае ў карыстанні ёю;

2° той, хто без атрымання прадпісанай парады, згоды ці дазволу або без чаго-небудзь іншага, што патрабуецца правам для дзейснасці або дазволенасці, адчужае касцёльную маёмасць або выконвае дзеянні, звязаныя з яе адміністраваннем.

§ 2. Павінен быць пакараны справядлівым пакараннем, не выключаючы пазбаўлення пасады, з захаваннем абавязку выпраўлення шкоды:

1° той, хто здзейсніў злачынства, аб якім гаворыцца ў § 1, 2°, па сваёй цяжкай віне;

2° той, у дзеяннях якога пры адміністраванні касцёльнай маёмасцю была выкрыта іншая цяжкая нядбайнасць.

Кан. 1377 – § 1. Той, хто дорыць ці абяцае што-небудзь з той мэтай, каб якая-небудзь асоба, якая займае пасаду ці ажыццяўляе заданне ў Касцёле, нелегітымна зрабіла што-небудзь або ўстрымалася ад чаго-небудзь, павінен быць пакараны справядлівым пакараннем згодна з нормамі кан. 1336 § 2–4; асоба, якая прыняла гэтыя падарункі ці абяцанні, таксама павінна быць пакарана ў залежнасці ад цяжкасці злачынства, не выключаючы пазбаўлення пасады, з захаваннем абавязку выпраўлення шкоды.

§ 2. Той, хто пры ажыццяўленні пасады ці задання патрабуе ахвяравання, большага чым акрэсленае, або дадатковай сумы, або чаго-небудзь іншага для ўласнай карысці, павінен быць пакараны адпаведным грашовым штрафам або іншым пакараннем, не выключаючы пазбаўлення пасады, з захаваннем абавязку выпраўлення шкоды.

Кан. 1378 – § 1. Той, хто, акрамя выпадкаў, прадугледжаных у праве, злоўжывае касцёльнай уладай, пасадай або заданнем, павінен быць пакараны ў залежнасці ад цяжкасці дзеяння ці занядбання, не выключаючы іх пазбаўлення, з захаваннем абавязку выпраўлення шкоды.

§ 2. Той, хто праз вінаватую нядбайнасць нелегітымна выканаў са шкодай для іншых ці спакусай дзеянне касцёльнай улады, пасады ці задання або занядбаў яго выкананне, павінен быць пакараны справядлівым пакараннем згодна з нормамі кан. 1336 § 2–4, з захаваннем абавязку выпраўлення шкоды.

Can. 1378 – § 1. Qui, praeter casus iure iam praevisos, ecclesiastica potestate, officio vel munere abutitur, pro actus vel omissionis gravitate puniatur, non exclusa eorundem privatione, firma damnum reparandi obligatione.

§ 2. Qui vero, ex culpabili neglegentia, ecclesiasticae potestatis vel officii vel muneris actum illegitime cum damno alieno vel scandalo ponit vel omittit, iusta poena puniatur ad normam can. 1336, §§ 2-4, firma damnum reparandi obligatione.

ТЫТУЛ III
ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ САКРАМЭНТАЎ

TITULUS III
DE DELICTIS CONTRA SACRAMENTA

Кан. 1379 – § 1. Падвяргаецца пакаранню інтэрдыкту *latae sententiae* або, калі з'яўляецца духоўнай асобай, таксама суспенсе:

1° той, хто, не маючы святарскага пасвячэння, спрабуе выканаць дзеянне, якое адносіцца да літургічнай эўхарыстычнай Ахвяры;

2° той, хто, акрамя выпадку, аб якім гаворыцца ў кан. 1384, не маючы магчымасці дзейсна ўдзяліць адпушчэнне грахоў, спрабуе гэта зрабіць або выслухоўвае сакрамэнтальную споведзь.

§ 2. У выпадках, аб якіх гаворыцца ў § 1, у залежнасці ад цяжкасці злачынства могуць быць дададзены іншыя пакаранні, не выключаючы экскамунікі.

§ 3. Як той, хто спрабаваў удзяліць святое пасвячэнне жанчыне, так і жанчына, якая спрабавала атрымаць святое пасвячэнне, падвяргаюцца экскамуніцы *latae sententiae,* зарэзерваванай за Апостальскай

Can. 1379 – § 1. In poenam latae sententiae interdicti vel, si clericus sit, etiam suspensionis incurrit:

1° qui ad ordinem sacerdotalem non promotus liturgicam eucharistici Sacrificii actionem attentat;

2° qui, praeter casum de quo in can. 1384, cum sacramentalem absolutionem dare valide nequeat, eam impertire attentat, vel sacramentalem confessionem audit.

§ 2. In casibus de quibus in § 1, pro delicti gravitate, aliae poenae, non exclusa excommunicatione, addi possunt.

§ 3. Tum qui sacrum ordinem mulieri conferre attentaverit, tum mulier quae sacrum ordinem recipere attentaverit, in excommunicationem latae sententiae Sedi Apostolicae re-

servatam incurrit; clericus praeterea dimissione e statu clericali puniri potest.

§ 4. Qui deliberate sacramentum administrat illis qui recipere prohibentur, puniatur suspensione, cui aliae poenae ex can. 1336, §§ 2-4, addi possunt.

§ 5. Qui, praeter casus de quibus in §§ 1-4 et in can. 1384, sacramentum se administrare simulat, iusta poena puniatur.

Can. 1380 – Qui per simoniam sacramentum celebrat vel recipit, interdicto vel suspensione vel poenis de quibus in can. 1336, §§ 2-4, puniatur.

Can. 1381 – Reus vetitae communicationis in sacris iusta poena puniatur.

Can. 1382 – § 1. Qui species consecratas abicit aut in sacrilegum finem abducit vel retinet, in excommunicationem latae sententiae Sedi Apostolicae reservatam incurrit; clericus praeterea alia poena, non exclusa dimissione e statu clericali, puniri potest.

§ 2. Reus consecrationis in sacrilegum finem unius materiae vel utriusque in eucharistica celebratione aut extra eam pro gravitate delicti puniatur non exclusa dimissione e statu clericali.

Can. 1383 – Qui quaestum illegitime facit ex Missae stipe, censura vel poenis de quibus in can. 1336, §§ 2-4, puniatur.

Can. 1384 – Sacerdos qui contra praescriptum can. 977 agit, in excom-

Сталіцай; духоўная асоба, апрача таго, можа быць пакарана выдаленнем з духоўнага стану.

§ 4. Той, хто свядома ўдзяляе сакрамэнт асобе, якой забаронена яго прымаць, павінен быць пакараны суспенсай, да якой могуць быць дададзены іншыя пакаранні з кан. 1336 § 2–4.

§ 5. Той, хто, акрамя выпадкаў, аб якіх гаворыцца ў § 1–4, а таксама ў кан. 1384, сімулюе, што ён удзяліў сакрамэнт, павінен быць пакараны справядлівым пакараннем.

Кан. 1380 – Той, хто праз сімонію цэлебруе сакрамэнт або яго прымае, павінен быць пакараны інтэрдыктам, або суспенсай, або пакараннямі, аб якіх гаворыцца ў кан. 1336 § 2–4.

Кан. 1381 – Злачынца, які прыняў забаронены ўдзел у святых цэлебрацыях, павінен быць пакараны справядлівым пакараннем.

Кан. 1382 – § 1. Той, хто выкідае кансэкраваныя постаці або ў святатацкіх мэтах забірае іх ці захоўвае, падвяргаецца экскамуніцы *latae sententiae,* зарэзерваванай за Апостальскай Сталіцай; духоўная асоба, акрамя гэтага, можа быць пакарана іншым пакараннем, не выключаючы выдалення з духоўнага стану.

§ 2. Злачынца, які са святатацкімі мэтамі кансэкраваў адну або абедзве матэрыі падчас эўхарыстычнай цэлебрацыі або паза ёю, павінен быць пакараны ў залежнасці ад цяжкасці злачынства, не выключаючы выдалення з духоўнага стану.

Кан. 1383 – Той, хто атрымлівае нелегітымную выгаду з ахвяраванняў на Імшы, павінен быць пакараны цэнзурай або пакараннямі, аб якіх гаворыцца ў кан. 1336 § 2–4.

Кан. 1384 – Святар, які дзейнічае насуперак прадпісанню кан. 977, падвяргаецца

экскамуніцы *latae sententiae*, зарэзерваванай за Апостальскай Сталіцай.

Кан. 1385 – Святар, які падчас споведзі, з яе нагоды або на яе падставе намаўляе пэнітэнта да граху супраць шостай запаведзі Дэкалога, у залежнасці ад цяжкасці злачынства павінен быць пакараны суспенсай, забаронамі або пазбаўленнямі, а ў асабліва цяжкіх выпадках — выдаленнем з духоўнага стану.

Кан. 1386 – § 1. Спаведнік, які непасрэдна парушае сакрамэнтальную таямніцу, падвяргаецца экскамуніцы *latae sententiae*, зарэзерваванай за Апостальскай Сталіцай; калі ж ён парушае яе толькі апасродкавана, павінен быць пакараны ў залежнасці ад цяжкасці злачынства.

§ 2. Калі перакладчык або іншыя, аб якіх гаворыцца ў кан. 983 § 2, парушаюць таямніцу, павінны быць пакараны справядлівым пакараннем, не выключаючы экскамунікі.

§ 3. Захоўваючы прадпісанні § 1 і 2, кожны, хто, карыстаючыся якімі-небудзь тэхнічнымі сродкамі, запісвае або зламысна распаўсюджвае праз сродкі сацыяльнай камунікацыі тое, што было гаворана — на самой справе ці не — спаведнікам ці пэнітэнтам падчас сакрамэнтальнай споведзі, павінен быць пакараны ў залежнасці ад цяжкасці злачынства, не выключаючы — калі гаворка ідзе пра духоўную асобу — выдалення з духоўнага стану.

Кан. 1387 – Біскуп, які без папскага ўпаўнаважання кансэкраваў каго-небудзь на біскупа, а таксама той, хто прыняў ад яго кансэкрацыю, падвяргаюцца экскамуніцы *latae sententiae*, зарэзерваванай за Апостальскай Сталіцай.

Кан. 1388 – § 1. Біскупу, які насуперак прадпісанню кан. 1015 пасвяціў чужога па-

municationem latae sententiae Sedi Apostolicae reservatam incurrit.

Can. 1385 – Sacerdos, qui in actu vel occasione vel praetextu confessionis paenitentem ad peccatum contra sextum Decalogi praeceptum sollicitat, pro delicti gravitate, suspensione, prohibitionibus, privationibus puniatur, et in casibus gravioribus dimittatur e statu clericali.

Can. 1386 – § 1. Confessarius, qui sacramentale sigillum directe violat, in excommunicationem latae sententiae Sedi Apostolicae reservatam incurrit; qui vero indirecte tantum, pro delicti gravitate puniatur.

§ 2. Interpres aliique, de quibus in can. 983, § 2, qui secretum violant, iusta poena puniantur, non exclusa excommunicatione.

§ 3. Firmis praescriptis §§ 1 et 2, quicumque quovis technico instrumento captat aut in communicationis socialis mediis malitiose evulgat quae in sacramentali confessione, vera vel ficta, a confessario vel a paenitente dicuntur, pro gravitate delicti puniatur, non exclusa, si de clerico agatur, dimissione e statu clericali.

Can. 1387 – Episcopus qui sine pontificio mandato aliquem consecrat in Episcopum, itemque qui ab eo consecrationem recipit, in excommunicationem latae sententiae Sedi Apostolicae reservatam incurrunt.

Can. 1388 – § 1. Episcopus qui, contra praescriptum can. 1015, alienum

subditum sine legitimis litteris dimissoriis ordinavit, prohibetur per annum ordinem conferre. Qui vero ordinationem recepit, est ipso facto a recepto ordine suspensus.

§ 2. Qui ad sacros ordines accedit innodatus quadam censura vel irregularitate, voluntarie reticita, praeter id quod statuitur in can. 1044, § 2, n. 1, est ipso facto a recepto ordine suspensus.

Can. 1389 – Qui, praeter casus, de quibus in cann. 1379-1388, sacerdotale munus vel aliud sacrum ministerium illegitime exsequitur, iusta poena puniatur, non exclusa censura.

дуладнага без легітымнага дымісарыйнага ліста, забараняецца ўдзяляць пасвячэнні на працягу аднаго года. Той жа, хто прыняў пасвячэнне, на моцы самога факта падвяргаецца суспенсе ад прынятага пасвячэння.

§ 2. Той, хто прыступае да святога пасвячэння, будучы звязаным якой-небудзь цэнзурай ці ірэгулярнасцю, наўмысна затоенымі, апрача таго, што ўстаноўлена ў кан. 1044 § 2, 1°, на моцы самога факта падвяргаецца суспенсе ад прынятага пасвячэння.

Кан. 1389 – Той, хто, апрача выпадкаў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1379–1388, нелегітымна выконвае заданне святара або іншую святую паслугу, павінен быць пакараны справядлівым пакараннем, не выключаючы цэнзуры.

TITULUS IV

DE DELICTIS CONTRA BONAM FAMAM ET DE DELICTO FALSI

Can. 1390 – § 1. Qui confessarium de delicto, de quo in can. 1385, apud ecclesiasticum Superiorem falso denuntiat, in interdictum latae sententiae incurrit et, si clericus sit, etiam in suspensionem.

§ 2. Qui aliam ecclesiastico Superiori calumniosam praebet delicti denuntiationem, vel aliter alterius bonam famam illegitime laedit, iusta poena puniatur ad normam can. 1336, §§ 2-4, cui praeterea censura addi potest.

§ 3. Calumniator cogi debet etiam ad congruam satisfactionem praestandam.

ТЫТУЛ IV

ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ДОБРАГА ІМЯ І ЗЛАЧЫНСТВА ПАКЛЁПУ

Кан. 1390 – § 1. Той, хто перад касцёльным настаяцелем ілжыва абвінавачвае спаведніка ў злачынстве, аб якім гаворыцца ў кан. 1385, падвяргаецца інтэрдыкту *latae sententiae*, а калі з'яўляецца духоўнай асобай — таксама суспенсе.

§ 2. Той, хто прадстаўляе касцёльнаму настаяцелю іншыя паклёпніцкія звесткі аб злачынстве або іншым спосабам нелегітымна парушае добрае імя іншай асобы, павінен быць пакараны справядлівым пакараннем згодна з нормамі кан. 1336 § 2–4, да якога, апрача гэтага, можа быць дададзена цэнзура.

§ 3. Паклёпнік павінен быць таксама прымушаны да адпаведнага выпраўлення шкоды.

Кан. 1391 – У залежнасці ад цяжкасці злачынства пакараннямі, аб якіх гаворыцца ў кан. 1336 § 2–4, павінен быць пакараны той, хто:

1° складае фальшывы публічны касцёльны дакумент, а таксама той, хто здзяйсняе падлог, знішчае, затойвае сапраўдны або карыстаецца фальшывым ці падложным;

2° карыстаецца іншым фальшывым ці падложным дакументам у касцёльных справах;

3° ілжыва сцвярджае што-небудзь у публічным касцёльным дакуменце.

Can. 1391 – Poenis de quibus in can. 1336, §§ 2-4, pro delicti gravitate puniatur:

1° qui ecclesiasticum documentum publicum falsum conficit, vel verum mutat, destruit, occultat, vel falso vel mutato utitur;

2° qui alio falso vel mutato documento utitur in re ecclesiastica;

3° qui in publico ecclesiastico documento falsum asserit.

ТЫТУЛ V
ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ АБАВЯЗКАЎ

TITULUS V
DE DELICTIS CONTRA SPECIALES OBLIGATIONES

Кан. 1392 – Духоўная асоба, якая дабравольна і нелегітымна пакінула святую паслугу на тэрмін шасці месяцаў бесперапынна з намерам вызвалення сябе ад кампетэнтнай улады Касцёла, павінна быць пакарана ў залежнасці ад цяжкасці злачынства суспенсай або таксама пакараннямі, устаноўленымі ў кан. 1336 § 2–4, а ў асабліва цяжкіх выпадках можа быць выдалена з духоўнага стану.

Can. 1392 – Clericus qui sacrum ministerium voluntarie et illegitime relinquit, per sex menses continuos, cum animo sese subducendi a competenti Ecclesiae auctoritate, pro delicti gravitate, suspensione vel etiam poenis in can. 1336, §§ 2-4, statutis puniatur, et in casibus gravioribus dimitti potest e statu clericali.

Кан. 1393 – § 1. Духоўная ці манаская асоба, якая займаецца гандлем або прадпрымальніцтвам насуперак прадпісанням канонаў, павінна быць пакарана ў залежнасці ад цяжкасці злачынства пакараннямі, аб якіх гаворыцца ў кан. 1336 § 2–4.

§ 2. Духоўная ці манаская асоба, якая, акрамя выпадкаў, ужо прадугледжаных у праве, здзяйсняе злачынства ў эканамічных справах або цяжка парушае прадпісанні, якія змешчаны ў кан. 285 § 4, павінна быць пакарана пакараннем, аб якім гаво-

Can. 1393 – § 1. Clericus vel religiosus mercaturam vel negotiationem contra canonum praescripta exercens pro delicti gravitate puniatur poenis de quibus in can. 1336, §§ 2-4.

§ 2. Clericus vel religiosus qui, praeter casus iure iam praevisos, in re oeconomica delictum committit, vel graviter violat praescriptiones, quae in can. 285, § 4, recensentur, poenis de quibus in can. 1336, §§ 2-4, punia-

tur, firma damnum reparandi obligatione.

Can. 1394 – § 1. Clericus matrimonium, etiam civiliter tantum, attentans, in suspensionem latae sententiae incurrit, firmis praescriptis cann. 194, § 1, n. 3, et 694, § 1, n. 2; quod si monitus non resipuerit vel scandalum dare perrexerit, gradatim privationibus vel etiam dimissione e statu clericali puniri debet.

§ 2. Religiosus a votis perpetuis, qui non sit clericus, matrimonium etiam civiliter tantum attentans, in interdictum latae sententiae incurrit, firmo praescripto can. 694, § 1, n. 2.

Can. 1395 – § 1. Clericus concubinarius, praeter casum de quo in can. 1394, et clericus in alio peccato externo contra sextum Decalogi praeceptum cum scandalo permanens, suspensione puniantur, cui, persistente post monitionem delicto, aliae poenae gradatim addi possunt usque ad dimissionem e statu clericali.

§ 2. Clericus qui aliter contra sextum Decalogi praeceptum deliquerit, si quidem delictum publice patratum sit, iustis poenis puniatur, non exclusa, si casus ferat, dimissione e statu clericali.

§ 3. Eadem poena de qua in § 2 puniatur clericus qui vi, minis vel abusu suae auctoritatis delictum committit contra sextum Decalogi praeceptum aut aliquem cogit ad actus sexuales exsequendos vel subeundos.

рыцца ў кан. 1336 § 2–4, з захаваннем абавязку выпраўлення шкоды.

Кан. 1394 – § 1. Духоўная асоба, якая спрабуе заключыць сужэнства, нават толькі грамадзянскае, падвяргаецца суспенсе *latae sententiae*, захоўваючы прадпісанне кан. 194 § 1, 3°, і 694 § 1, 2°; калі ж пасля папярэджання яна не выправіцца або будзе працягваць ствараць спакусу, павінна быць паступова пакарана рознымі пазбаўленнямі, а нават выдаленнем з духоўнага стану.

§ 2. Калі пасля складання вечных абяцанняў манаская асоба, якая не з'яўляецца духоўнай асобай, паспрабуе заключыць сужэнства, нават толькі грамадзянскае, падвяргаецца інтэрдыкту *latae sententiae*, пры гэтым захоўваецца прадпісанне кан. 694 § 1, 2°.

Кан. 1395 – § 1. Духоўная асоба, якая жыве ў сужыцці, апрача выпадку, аб якім гаворыцца ў кан. 1394, а таксама духоўная асоба, якая, ствараючы спакусу, трывае ў іншым знешнім граху супраць шостай запаведзі Дэкалога, павінна быць пакарана суспенсай, а калі пасля папярэджання будзе працягваць здзяйсняць злачынства — могуць быць паступова дададзены іншыя пакаранні, аж да выдалення з духоўнага стану.

§ 2. Духоўная асоба, якая іншым спосабам здзейсніла злачынства супраць шостай запаведзі Дэкалога, калі гэтае злачынства было здзейснена публічна, павінна быць пакарана справядлівым пакараннем, не выключаючы — калі гэтага будзе патрабаваць сітуацыя — выдалення з духоўнага стану.

§ 3. Такім жа пакараннем, аб якім гаворыцца ў § 2, павінна быць пакарана духоўная асоба, якая з дапамогай сілы, пагрозы ці злоўжывання сваёй уладай здзейсніла злачынства супраць шостай запаведзі Дэкалога або прымусіла каго-небудзь здзейсніць сексуальныя дзеянні або ім паддацца.

Кан. 1396 – Той, хто цяжка парушае абавязак рэзідавання, які ўскладаецца на падставе касцёльнай пасады, павінен быць пакараны справядлівым пакараннем, не выключаючы — пасля папярэджання — пазбаўлення пасады.

Can. 1396 – Qui graviter violat residentiae obligationem cui ratione ecclesiastici officii tenetur, iusta poena puniatur, non exclusa, post monitionem, officii privatione.

ТЫТУЛ VI
ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ЖЫЦЦЯ, ГОДНАСЦІ І СВАБОДЫ ЧАЛАВЕКА

TITULUS VI
DE DELICTIS CONTRA HOMINIS VITAM, DIGNITATEM ET LIBERTATEM

Кан. 1397 – § 1. Той, хто здзяйсняе забойства, або сілай ці падманам выкрадае ці пазбаўляе чалавека свабоды, або калечыць яго, або прычыняе яму цяжкія цялесныя пашкоджанні, павінен быць пакараны ў залежнасці ад цяжкасці злачынства пакараннямі, аб якіх гаворыцца ў кан. 1336 § 2–4; забойствы жа асобаў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1370, павінны карацца пакараннямі, якія ўстаноўлены ў згаданым каноне, а таксама ў § 3 гэтага канона.

Can. 1397 – § 1. Qui homicidium patrat, vel hominem vi aut fraude rapit vel detinet vel mutilat vel graviter vulnerat, poenis, de quibus in can. 1336, §§ 2-4, pro delicti gravitate puniatur; homicidium autem in personas de quibus in can. 1370, poenis ibi et etiam in § 3 huius canonis statutis punitur.

§ 2. Той, хто прычыніў перарыванне цяжарнасці, калі вынік наступіў, падвяргаецца экскамуніцы *latae sententiae*.

§ 2. Qui abortum procurat, effectu secuto, in excommunicationem latae sententiae incurrit.

§ 3. Калі ў злачынствах, пра якія ідзе гаворка ў гэтым каноне, злачынцам з'яўляецца духоўная асоба, у асабліва цяжкіх выпадках яна павінна быць выдалена з духоўнага стану.

§ 3. Si de delictis agatur de quibus in hoc canone, in casibus gravioribus clericus reus dimittatur e statu clericali.

Кан. 1398 – § 1. Пазбаўленнем пасады і іншымі справядлівымі пакараннямі, не выключаючы — калі гэтага будзе патрабаваць сітуацыя — выдалення з духоўнага стану, павінна быць пакарана духоўная асоба, якая:

Can. 1398 – § 1. Privatione officii et aliis iustis poenis, non exclusa dimissione e statu clericali, si casus id secumferat, puniatur clericus:

1° здзейсніла злачынства супраць шостай запаведзі Дэкалога з непаўналетняй асобай, або з асобай, якая пастаянна мае абмежаванае карыстанне ро-

1° qui delictum committit contra sextum Decalogi praeceptum cum minore vel cum persona quae habitualiter usum imperfectum ra-

tionis habet vel cui ius parem tutelam agnoscit;

2° qui sibi devincit aut inducit minorem aut personam quae habitualiter usum imperfectum rationis habet aut eam cui ius parem tutelam agnoscit, ut pornographice sese ostendat vel exhibitiones pornographicas, sive veras sive simulatas, participet;

3° qui contra bonos mores sibi comparat, detinet, exhibet vel divulgat, quovis modo et quolibet instrumento, imagines pornographicas minorum vel personarum quae habitualiter usum imperfectum rationis habent.

§ 2. Sodalis instituti vitae consecratae vel societatis vitae apostolicae, et fidelis quilibet aliqua dignitate gaudens aut officio vel functione in Ecclesia fungens, si delictum committat de quo in § 1 vel in can. 1395, § 3, puniatur ad normam can. 1336, §§ 2-4, adiunctis quoque aliis poenis pro delicti gravitate.

зумам, або з асобай, якой закон надае такую самую ахову;

2° схіляе або прымушае непаўналетнюю асобу, або асобу, якая пастаянна мае абмежаванае карыстанне розумам, або асобу, якой закон надае такую самую ахову, да парнаграфічнага паказвання сябе або да прыняцця ўдзелу ў парнаграфічных дзеяннях, сапраўдных ці сімуляваных;

3° насуперак добрым норавам набывае, захоўвае, паказвае або распаўсюджвае любым спосабам і пры ўжыванні любых сродкаў парнаграфічныя выявы непаўналетніх асобаў або асобаў, якія пастаянна маюць абмежаванае карыстанне розумам.

§ 2. Калі член інстытута кансэкраванага жыцця або таварыства апостальскага жыцця, а таксама любы вернік, адзначаны якой-небудзь годнасцю, або той, які займае пасаду ці выконвае функцыю ў Касцёле, здзейсніць злачынства, аб якім гаворыцца ў § 1 або ў кан. 1395 § 3, павінен быць пакараны згодна з нормай кан. 1336 § 2–4, з дадаваннем таксама іншых пакаранняў у залежнасці ад цяжкасці злачынства.

TITULUS VII
NORMA GENERALIS

Can. 1399 – Praeter casus hac vel aliis legibus statutos, divinae vel canonicae legis externa violatio tunc tantum potest iusta quidem poena puniri, cum specialis violationis gravitas punitionem postulat, et necessitas urget scandala praeveniendi vel reparandi.

ТЫТУЛ VII
АГУЛЬНАЯ НОРМА

Кан. 1399 – Акрамя выпадкаў, прадугледжаных гэтым або іншымі законамі, знешняе парушэнне Божага або кананічнага закона толькі тады можа быць пакарана якім-небудзь справядлівым пакараннем, калі карання патрабуе асаблівая цяжкасць парушэння і да гэтага ж схіляе неабходнасць прадухілення або ўстаранення спакусы.

КНІГА VII
ПРАЦЭСЫ

ЧАСТКА I
СУДОВЫЯ ПРАЦЭСЫ НАОГУЛ

Кан. 1400 – § 1. Прадметамі судовых працэсаў з'яўляюцца:

1° адстойванне або абарона правоў фізічных ці юрыдычных асобаў або сцверджанне юрыдычных фактаў;

2° злачынствы — у тым, што датычыць накладання ці сцверджання пакарання.

§ 2. Пры гэтым спрэчкі, якія ўзніклі ў выніку дзеяння адміністрацыйнай улады, могуць быць скіраваны толькі настаяцелю або адміністрацыйнаму трыбуналу.

Кан. 1401 – На моцы ўласнага і выключнага права Касцёл разглядае:

1° справы, якія маюць дачыненне да духоўных рэчаў і тыя, якія звязаны з духоўнымі рэчамі;

2° парушэнні касцёльных законаў, а таксама ўсе іншыя справы, звязаныя з грахамі, — у тым, што датычыць акрэслення вінаватасці і накладання касцёльных пакаранняў.

LIBER VII
DE PROCESSIBUS

PARS I
DE IUDICIIS IN GENERE

Can. 1400 – § 1. Obiectum iudicii sunt:

1° personarum physicarum vel iuridicarum iura persequenda aut vindicanda, vel facta iuridica declaranda;

2° delicta, quod spectat ad poenam irrogandam vel declarandam.

§ 2. Attamen controversiae ortae ex actu potestatis administrativae deferri possunt solummodo ad Superiorem vel ad tribunal administrativum.

Can. 1401 – Ecclesia iure proprio et exclusivo cognoscit:

1° de causis quae respiciunt res spirituales et spiritualibus adnexas;

2° de violatione legum ecclesiasticarum deque omnibus in quibus inest ratio peccati, quod attinet ad culpae definitionem et poenarum ecclesiasticarum irrogationem.

Can. 1402 – Omnia Ecclesiae tribunalia reguntur canonibus qui sequuntur, salvis normis tribunalium Apostolicae Sedis.

Кан. 1402 – Усе трыбуналы Касцёла кіруюцца наступнымі канонамі, пры гэтым захоўваюцца нормы трыбуналаў Апостальскай Сталіцы.

Can. 1403 – § 1. Causae canonizationis Servorum Dei reguntur peculiari lege pontificia.

§ 2. Iisdem causis applicantur praeterea praescripta huius Codicis, quoties in eadem lege ad ius universale remissio fit vel de normis agitur quae, ex ipsa rei natura, easdem quoque causas afficiunt.

Кан. 1403 – § 1. Справы кананізацыі Слугаў Божых кіруюцца асаблівым папскім законам.

§ 2. Акрамя таго, прадпісанні дадзенага Кодэкса прымяняюцца да гэтых спраў заўсёды, калі гэты закон адсылае да паўсюднага права або гаворка ідзе пра тыя нормы, якія па самой сутнасці рэчы маюць дачыненне таксама да гэтых спраў.

TITULUS I
DE FORO COMPETENTI

ТЫТУЛ I
КАМПЕТЭНЦЫЯ СУДА

Can. 1404 – Prima Sedes a nemine iudicatur.

Кан. 1404 – Першая Сталіца не падсудная нікому.

Can. 1405 – § 1. Ipsius Romani Pontificis dumtaxat ius est iudicandi in causis de quibus in can. 1401:

1° eos qui supremum tenent civitatis magistratum;

2° Patres Cardinales;

3° Legatos Sedis Apostolicae, et in causis poenalibus Episcopos;

4° alias causas quas ipse ad suum advocaverit iudicium.

§ 2. Iudex de actu vel instrumento a Romano Pontifice in forma specifica confirmato videre non potest, nisi ipsius praecesserit mandatum.

§ 3. Rotae Romanae reservatur iudicare:

1° Episcopos in contentiosis, firmo praescripto can. 1419, § 2;

2° Abbatem primatem, vel Abbatem superiorem congregationis

Кан. 1405 – § 1. У справах, аб якіх гаворыцца ў кан. 1401, толькі сам Рымскі Пантыфік мае права судзіць:

1° тых, хто мае вярхоўную ўладу ў дзяржавах;

2° айцоў кардыналаў;

3° легатаў Апостальскай Сталіцы і — у карных справах — біскупаў;

4° іншыя справы, якія Рымскі Пантыфік запатрабуе на свой судовы працэс.

§ 2. Суддзя не можа разглядаць справы, якія датычаць дзеяння або дакумента, выразным чынам адобраных Рымскім Пантыфікам, калі не атрымае ад яго папярэдняга ўпаўнаважання.

§ 3. За Рымскай Ротай зарэзервавана права судзіць:

1° біскупаў — у спрэчных справах, захоўваючы прадпісанне кан. 1419 § 2;

2° абата-прымаса ці абата-настаяцеля манаскай кангрэгацыі, а таксама вяр-

хоўнага кіраўніка манаскага інстытута папскага права;

3° дыяцэзіі і іншыя касцёльныя асобы, як фізічныя, так і юрыдычныя, якія не маюць кіраўніка, ніжэйшага чым Рымскі Пантыфік.

Кан. 1406 – § 1. У выпадку парушэння прадпісання кан. 1404 лічыцца, што дзеянні і рашэнні не былі здзейснены.

§ 2. У справах, аб якіх гаворыцца ў кан. 1405, адсутнасць кампетэнцыі ў іншых суддзяў з'яўляецца абсалютнай.

Кан. 1407 – § 1. Ніхто не можа быць выкліканы ў першую інстанцыю, калі не да касцёльнага суддзі, кампетэнтнага на адной з падстаў, акрэсленых у кан. 1408–1414.

§ 2. Адсутнасць у суддзі кампетэнцыі, заснаванай на адной з гэтых падстаў, называецца адноснай.

§ 3. Пазоўнік павінен звяртацца ў трыбунал адказчыка; калі ж для адказчыка ўласцівымі з'яўляюцца некалькі трыбуналаў, пазоўнік мае права выбраць адзін з іх.

Кан. 1408 – Кожны можа быць выкліканы ў трыбунал свайго пастаяннага ці часовага месца жыхарства.

Кан. 1409 – § 1. Для бадзяжнага ўласцівым з'яўляецца трыбунал таго месца, дзе ён актуальна прабывае.

§ 2. Той, чыё пастаяннае ці часовае месца жыхарства або месца прабывання невядомыя, можа быць выкліканы ў трыбунал пазоўніка, калі толькі легітымна для яго не з'яўляецца ўласцівым іншы трыбунал.

Кан. 1410 – Бок заўсёды можа быць выкліканы на падставе месца знаходжання рэчы ў трыбунал месца, дзе знаходзіцца спрэчная рэч, калі позва непасрэдна датычыць гэтай рэчы або калі гаворка ідзе пра яе бяспраўнае пазбаўленне.

monasticae, et supremum Moderatorem institutorum religiosorum iuris pontificii;

3° dioeceses aliasve personas ecclesiasticas, sive physicas sive iuridicas, quae Superiorem infra Romanum Pontificem non habent.

Can. 1406 – § 1. Violato praescripto can. 1404, acta et decisiones pro infectis habentur.

§ 2. In causis, de quibus in can. 1405, aliorum iudicum incompetentia est absoluta.

Can. 1407 – § 1. Nemo in prima instantia conveniri potest, nisi coram iudice ecclesiastico qui competens sit ob unum ex titulis qui in cann. 1408-1414 determinantur.

§ 2. Incompetentia iudicis, cui nullus ex his titulis suffragatur, dicitur relativa.

§ 3. Actor sequitur forum partis conventae; quod si pars conventa multiplex forum habet, optio fori actori conceditur.

Can. 1408 – Quilibet conveniri potest coram tribunali domicilii vel quasi-domicilii.

Can. 1409 – § 1. Vagus forum habet in loco ubi actu commoratur.

§ 2. Is, cuius neque domicilium aut quasi-domicilium neque locus commorationis nota sint, conveniri potest in foro actoris, dummodo aliud forum legitimum non suppetat.

Can. 1410 – Ratione rei sitae, pars conveniri potest coram tribunali loci, ubi res litigiosa sita est, quoties actio in rem directa sit, aut de spolio agatur.

Can. 1411 – § 1. Ratione contractus pars conveniri potest coram tribunali loci in quo contractus initus est vel adimpleri debet, nisi partes concorditer aliud tribunal elegerint.

§ 2. Si causa versetur circa obligationes quae ex alio titulo proveniant, pars conveniri potest coram tribunali loci, in quo obligatio vel orta est vel est adimplenda.

Кан. 1411 – § 1. Бок можа быць выкліканы на падставе дагавора ў трыбунал месца, дзе дагавор быў заключаны або дзе ён павінен быць выкананы, калі бакамі не быў згодна выбраны іншы трыбунал.

§ 2. Калі справа датычыць абавязацельстваў, якія заснаваны на іншых падставах, бок можа быць выкліканы ў трыбунал месца, дзе абавязацельства ўзнікла або дзе яно павінна быць выканана.

Can. 1412 – In causis poenalibus accusatus, licet absens, conveniri potest coram tribunali loci, in quo delictum patratum est.

Кан. 1412 – У карных справах абвінавачаны, нават калі ён адсутнічае, можа быць выкліканы ў трыбунал месца, дзе злачынства было здзейснена.

Can. 1413 – Pars conveniri potest:

1° in causis quae circa administrationem versantur, coram tribunali loci ubi administratio gesta est;

2° in causis quae respiciunt hereditates vel legata pia, coram tribunali ultimi domicilii vel quasi-domicilii vel commorationis, ad normam cann. 1408-1409, illius de cuius hereditate vel legato pio agitur, nisi agatur de mera exsecutione legati, quae videnda est secundum ordinarias competentiae normas.

Кан. 1413 – Бок можа быць выкліканы:

1° у справах, якія датычаць адміністравання маёмасцю, — у трыбунал месца, дзе гэтае адміністраванне ажыццяўлялася;

2° у справах, якія датычаць спадчыны або пабожных запісаных выяўленняў апошняй волі, — згодна з нормамі кан. 1408–1409 у трыбунал апошняга пастаяннага ці часовага месца жыхарства або месца прабывання той асобы, пра спадчыну або пабожнае запісанае выяўленне апошняй волі якой ідзе гаворка, калі справа не датычыць звычайнага выканання пабожнага запісанага выяўлення апошняй волі, якое павінна быць разгледжана ў адпаведнасці са звычайнымі нормамі кампетэнцыі.

Can. 1414 – Ratione conexionis, ab uno eodemque tribunali et in eodem processu cognoscendae sunt causae inter se conexae, nisi legis praescriptum obstet.

Кан. 1414 – Звязаныя паміж сабой справы павінен разглядаць на падставе ўзаемасувязі адзін і той жа трыбунал у тым жа працэсе, калі гэтаму не пярэчыць прадпісанне права.

Can. 1415 – Ratione praeventionis, si duo vel plura tribunalia aeque competentia sunt, ei ius est causam cognoscendi, quod prius partem conventam legitime citaverit.

Кан. 1415 – Калі два або некалькі трыбуналаў з'яўляюцца аднолькава кампетэнтнымі, права на разгляд справы належыць на падставе першынства таму, хто першы легітымна выклікаў адказчыка.

Кан. 1416 – Канфлікт кампетэнцый паміж трыбуналамі, падпарадкаванымі аднаму апеляцыйнаму трыбуналу, вырашаецца гэтым трыбуналам; калі ж яны не падпарадкаваны аднаму апеляцыйнаму трыбуналу — Апостальскай Сігнатурай.

Can. 1416 – Conflictus competentiae inter tribunalia eidem tribunali appellationis subiecta, ab hoc tribunali solvuntur; a Signatura Apostolica, si eidem tribunali appellationis non subsunt.

ТЫТУЛ II
РОЗНЫЯ СТУПЕНІ І ВІДЫ ТРЫБУНАЛАЎ

TITULUS II
DE VARIIS TRIBUNALIUM GRADIBUS ET SPECIEBUS

Кан. 1417 – § 1. На моцы прымату Рымскага Пантыфіка кожны вернік мае поўнае права перадаць на разгляд Святой Сталіцы сваю справу, як спрэчную, так і карную, на кожнай ступені судовых працэсаў і на кожнай стадыі спрэчкі, або адразу звяртацца да Святой Сталіцы.

§ 2. Пры гэтым, за выключэннем выпадку апеляцыі, зварот да Апостальскай Сталіцы не прыпыняе юрысдыкцыю суддзі, які ўжо прыступіў да разгляду справы; таму ён можа працягваць судовы працэс аж да вынясення канчатковага рашэння, калі Апостальская Сталіца не паведаміць суддзю аб тым, што запатрабавала справу на свой разгляд.

Can. 1417 – § 1. Ob primatum Romani Pontificis integrum est cuilibet fideli causam suam sive contentiosam sive poenalem, in quovis iudicii gradu et in quovis litis statu, cognoscendam ad Sanctam Sedem deferre vel apud eandem introducere.

§ 2. Provocatio tamen ad Sedem Apostolicam interposita non suspendit, praeter casum appellationis, exercitium iurisdictionis in iudice qui causam iam cognoscere coepit; quique idcirco poterit iudicium prosequi usque ad definitivam sententiam, nisi Sedes Apostolica iudici significaverit se causam advocasse.

Кан. 1418 – Кожны трыбунал мае права звярнуцца да іншага трыбунала за дапамогай у выкананні інструкцыі справы або ў паведамленні аб дзеяннях.

Can. 1418 – Quodlibet tribunal ius habet in auxilium vocandi aliud tribunal ad causam instruendam vel ad actus intimandos.

Раздзел I
Трыбунал першай інстанцыі

Caput I
De tribunali primae instantiae

Артыкул 1. *Суддзя*

Кан. 1419 – § 1. У кожнай дыяцэзіі і ва ўсіх справах, якія выразна не выключаны правам, суддзёй першай інстанцыі з'яўляецца дыяцэзіяльны біскуп, які можа ажыццяў-

Art. 1. *De iudice*

Can. 1419 – § 1. In unaquaque dioecesi et pro omnibus causis iure expresse non exceptis, iudex primae instantiae est Episcopus dioecesanus,

qui iudicialem potestatem exercere potest per se ipse vel per alios, secundum canones qui sequuntur.

§ 2. Si vero agatur de iuribus aut bonis temporalibus personae iuridicae ab Episcopo repraesentatae, iudicat in primo gradu tribunal appellationis.

Can. 1420 – § 1. Quilibet Episcopus dioecesanus tenetur Vicarium iudicialem seu Officialem constituere cum potestate ordinaria iudicandi, a Vicario generali distinctum, nisi parvitas dioecesis aut paucitas causarum aliud suadeat.

§ 2. Vicarius iudicialis unum constituit tribunal cum Episcopo, sed nequit iudicare causas quas Episcopus sibi reservat.

§ 3. Vicario iudiciali dari possunt adiutores, quibus nomen est Vicariorum iudicialium adiunctorum seu Vice-officialium.

§ 4. Tum Vicarius iudicialis tum Vicarii iudiciales adiuncti esse debent sacerdotes, integrae famae, in iure canonico doctores vel saltem licentiati, annos nati non minus triginta.

§ 5. Ipsi, sede vacante, a munere non cessant nec ab Administratore dioecesano amoveri possunt; adveniente autem novo Episcopo, indigent confirmatione.

Can. 1421 – § 1. In dioecesi constituantur ab Episcopo iudices dioecesani, qui sint clerici.

§ 2. Episcoporum conferentia permittere potest ut etiam laici iudices constituantur, e quibus, suadente necessitate, unus assumi potest ad collegium efformandum.

ляць судовую ўладу асабіста або праз іншых, у адпаведнасці з наступнымі канонамі.

§ 2. Калі гаворка ідзе пра правы або маёмасць юрыдычнай асобы, якую прадстаўляе біскуп, то ў якасці першай ступені павінен судзіць апеляцыйны трыбунал.

Кан. 1420 – § 1. Кожны дыяцэзіяльны біскуп павінен прызначыць судовага вікарыя, іншымі словамі — афіцыяла, надзеленага звычайнай судовай уладай, адрознага ад генеральнага вікарыя, калі малы памер дыяцэзіі або малая колькасць спраў не схіляюць да іншага.

§ 2. Судовы вікарый утварае адзіны трыбунал з біскупам, але не можа судзіць справы, якія біскуп зарэзерваваў за сабой.

§ 3. Судоваму вікарыю могуць быць дадзены памочнікі, якія называюцца дапаможнымі судовымі вікарыямі, іншымі словамі — віцэ-афіцыяламі.

§ 4. Як судовы вікарый, так і дапаможныя судовыя вікарыі павінны быць святарамі, мець бездакорную рэпутацыю, мець ступень доктара або прынамсі ліцэнзіята кананічнага права, не маладзейшымі за трыццаць гадоў.

§ 5. Калі біскупская сталіца становіцца вакантнай, іх заданне не скасоўваецца, і яны не могуць быць звольнены дыяцэзіяльным адміністратарам; аднак, пасля прыходу новага біскупа, патрабуюць яго адабрэння.

Кан. 1421 – § 1. У дыяцэзіі біскуп павінен прызначыць дыяцэзіяльных суддзяў, якія павінны быць духоўнымі асобамі.

§ 2. Канферэнцыя Біскупаў можа дазволіць, каб суддзямі прызначаліся таксама свецкія асобы, адна з якіх — пры неабходнасці — можа быць паклікана для ўтварэння калегіі.

§ 3. Суддзі павінны мець бездакорную рэпутацыю і мець ступень доктара або прынамсі ліцэнзіята кананічнага права.

Кан. 1422 – Судовы вікарый, дапаможныя судовыя вікарыі і іншыя суддзі прызначаюцца на акрэслены тэрмін, захоўваючы прадпісанне кан. 1420 § 5, і не могуць быць звольнены, калі не па легітымнай і важкай прычыне.

Кан. 1423 – § 1. Некалькі дыяцэзіяльных біскупаў могуць з зацвярджэння Апостальскай Сталіцы замест дыяцэзіяльных трыбуналаў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1419–1421, сумесна заснаваць адзін трыбунал першай інстанцыі для сваіх дыяцэзій; у такім выпадку гэтай групе біскупаў або вызначанаму імі біскупу належаць усе паўнамоцтвы, якія дыяцэзіяльны біскуп мае ў дачыненні да свайго трыбунала.

§ 2. Трыбуналы, аб якіх гаворыцца ў § 1, могуць быць заснаваны або для ўсіх спраў, або толькі для некаторых відаў спраў.

Кан. 1424 – У любым судовым працэсе аднаасобны суддзя можа далучыць да сябе ў якасці дарадчыкаў двух асэсараў — духоўных або свецкіх асобаў бездакорнага жыцця.

Кан. 1425 – § 1. Адхіляючы супраціўны звычай, за калегіяльным трыбуналам трох суддзяў зарэзерваваны:

1° спрэчныя справы: а) аб повязі святога пасвячэння; б) аб сужэнскай повязі, захоўваючы прадпісанні кан. 1686 [1688] і 1688 [1690];

2° карныя справы: а) аб злачынствах, пакараннем за якія можа быць выдаленне з духоўнага стану; б) аб налажэнні ці сцвярджэнні экскамунікі.

§ 2. Біскуп можа даручыць асабліва складаныя ці важкія справы калегіі з трох або пяці суддзяў.

§ 3. Iudices sint integrae famae et in iure canonico doctores vel saltem licentiati.

Can. 1422 – Vicarius iudicialis, Vicarii iudiciales adiuncti et ceteri iudices nominantur ad definitum tempus, firmo praescripto can. 1420, § 5, nec removeri possunt nisi ex legitima gravique causa.

Can. 1423 – § 1. Plures dioecesani Episcopi, probante Sede Apostolica, possunt concordes, in locum tribunalium dioecesanorum de quibus in cann. 1419-1421, unicum constituere in suis dioecesibus tribunal primae instantiae; quo in casu ipsorum Episcoporum coetui vel Episcopo ab eisdem designato omnes competunt potestates, quas Episcopus dioecesanus habet circa suum tribunal.

§ 2. Tribunalia, de quibus in § 1, constitui possunt vel ad causas quaslibet vel ad aliqua tantum causarum genera.

Can. 1424 – Unicus iudex in quolibet iudicio duos assessores, clericos vel laicos probatae vitae, sibi consulentes asciscere potest.

Can. 1425 – § 1. Reprobata contraria consuetudine, tribunali collegiali trium iudicum reservantur:

1° causae contentiosae: *a*) de vinculo sacrae ordinationis; *b*) de vinculo matrimonii, firmis praescriptis cann. 1686 [1688] et 1688 [1690];

2° causae poenales: *a*) de delictis quae poenam dimissionis e statu clericali secumferre possunt; *b*) de irroganda vel declaranda excommunicatione.

§ 2. Episcopus causas difficiliores vel maioris momenti committere potest iudicio trium vel quinque iudicum.

§ 3. Vicarius iudicialis ad singulas causas cognoscendas iudices ex ordine per turnum advocet, nisi Episcopus in singulis casibus aliter statuerit.

§ 4. In primo iudicii gradu, si forte collegium constitui nequeat, Episcoporum conferentia, quamdiu huiusmodi impossibilitas perduret, permittere potest ut Episcopus causas unico iudici clerico committat, qui, ubi fieri possit, assessorem et auditorem sibi asciscat.

§ 5. Iudices semel designatos ne subroget Vicarius iudicialis, nisi ex gravissima causa in decreto exprimenda.

Can. 1426 – § 1. Tribunal collegiale collegialiter procedere debet, et per maiorem suffragiorum partem sententias ferre.

§ 2. Eidem praeesse debet, quatenus fieri potest, Vicarius iudicialis vel Vicarius iudicialis adiunctus.

Can. 1427 – § 1. Si controversia sit inter religiosos vel domos eiusdem instituti religiosi clericalis iuris pontificii, iudex primae instantiae, nisi aliud in constitutionibus caveatur, est Superior provincialis, aut, si monasterium sit sui iuris, Abbas localis.

§ 2. Salvo diverso constitutionum praescripto, si res contentiosa agatur inter duas provincias, in prima instantia iudicabit per se ipse vel per delegatum supremus Moderator; si inter duo monasteria, Abbas superior congregationis monasticae.

§ 3. Si demum controversia enascatur inter religiosas personas physicas vel iuridicas diversorum institutorum

§ 3. Для разгляду кожнай асобнай справы судовы вікарый павінен вызначаць суддзяў па чарзе, згодна з устаноўленым парадкам, калі ў асобных выпадках біскуп не пастановіць іначай.

§ 4. Калі на першай ступені судовага працэсу не ўдаецца ўтварыць калегію, Канферэнцыя Біскупаў — пакуль гэтая немагчымасць трывае — можа дазволіць, каб біскуп даручыў справу аднаасобнаму суддзі — духоўнай асобе, які павінен — калі гэта будзе магчыма — прыцягнуць сабе на дапамогу асэсара і аўдытара.

§ 5. Судовы вікарый не павінен адклікаць раз вызначаных суддзяў, калі не па вельмі важкай прычыне, якая павінна быць указана ў дэкрэце.

Кан. 1426 – § 1. Калегіяльны трыбунал павінен дзейнічаць калегіяльна і выносіць прысуды большасцю галасоў.

§ 2. Калі гэта магчыма, узначальваць яго павінен судовы вікарый або дапаможны судовы вікарый.

Кан. 1427 – § 1. Калі ўзнікае спрэчка паміж манаскімі асобамі або дамамі аднаго святарскага манаскага інстытута папскага права, суддзёй першай інстанцыі — калі іншае не прадугледжана ў канстытуцыях — з'яўляецца настаяцель правінцыі, а ў кляштары *sui iuris* — мясцовы абат.

§ 2. Калі спрэчная справа вядзецца паміж дзвюма правінцыямі, судовы разгляд у першай інстанцыі належыць — асабіста або праз дэлегата — вярхоўнаму кіраўніку, а калі спрэчная справа вядзецца паміж двума кляштарамі — абату-настаяцелю манаскай кангрэгацыі, пры гэтым адрозныя прадпісанні канстытуцый захоўваюцца.

§ 3. Нарэшце, калі спрэчка ўзнікае паміж фізічнымі або юрыдычнымі манаскімі асобамі, якія належаць да розных

манаскіх інстытутаў або нават да аднаго святарскага інстытута дыяцэзіяльнага права ці свецкага інстытута, або паміж манаскай асобай і секулярнай духоўнай асобай, ці свецкай асобай, ці юрыдычнай асобай, якая не з'яўляецца манаскай, то ў першай інстанцыі судзіць дыяцэзіяльны трыбунал.

religiosorum, aut etiam eiusdem instituti clericalis iuris dioecesani vel laicalis, aut inter personam religiosam et clericum saecularem vel laicum vel personam iuridicam non religiosam, iudicat in prima instantia tribunal dioecesanum.

Артыкул 2. *Аўдытары і рэлятары*

Кан. 1428 – § 1. Суддзя або старшыня калегіяльнага трыбунала могуць вызначыць аўдытара для правядзення інструкцыі справы, выбіраючы яго або сярод суддзяў трыбунала, або з асобаў, зацверджаных біскупам для выконвання гэтага задання.

§ 2. Для выконвання задання аўдытара біскуп можа зацвердзіць духоўных або свецкіх асобаў, якія адзначаюцца добрымі норавамі, разважлівасцю і вучэннем.

§ 3. Заданнем аўдытара — згодна з упаўнаважаннем суддзі — з'яўляецца толькі збор доказаў, якія затым павінны быць перададзены суддзі; пры гэтым, калі ўпаўнаважанне суддзі не будзе гэтаму пярэчыць, ён можа часова вырашыць, якія доказы і якім чынам павінны быць сабраны, калі ў той час, калі ён будзе выконваць сваё заданне, аб гэтым узнікне пытанне.

Art. 2. *De auditoribus et relatoribus*

Can. 1428 – § 1. Iudex vel tribunalis collegialis praeses possunt auditorem designare ad causae instructionem peragendam, eum seligentes aut ex tribunalis iudicibus aut ex personis ab Episcopo ad hoc munus approbatis.

§ 2. Episcopus potest ad auditoris munus approbare clericos vel laicos, qui bonis moribus, prudentia et doctrina fulgeant.

§ 3. Auditoris est, secundum iudicis mandatum, probationes tantum colligere easque collectas iudici tradere; potest autem, nisi iudicis mandatum obstet, interim decidere quae et quomodo probationes colligendae sint, si forte de hac re quaestio oriatur, dum ipse munus suum exercet.

Кан. 1429 – Старшыня калегіяльнага трыбунала павінен вызначыць аднаго з суддзяў калегіі ў якасці дакладчыка, іншымі словамі — рэлятара, які павінен прадставіць справу на пасяджэнні суддзяў і пісьмова скласці прысуд; па справядлівай прычыне старшыня можа вызначыць іншую асобу на яго месца.

Can. 1429 – Tribunalis collegialis praeses debet unum ex iudicibus collegii ponentem seu relatorem designare, qui in coetu iudicum de causa referat et sententias in scriptis redigat; in ipsius locum idem praeses alium ex iusta causa substituere potest.

Артыкул 3. *Прамотар справядлівасці, абаронца повязі і натарыус*

Кан. 1430 – Для ўдзелу ў спрэчных справах, у якіх публічнае дабро можа быць пастаўле-

Art. 3. *De promotore iustitiae, vinculi defensore et notario*

Can. 1430 – Ad causas contentiosas, in quibus bonum publicum in discri-

men vocari potest, et ad causas poenales constituatur in dioecesi promotor iustitiae, qui officio tenetur providendi bono publico.

Can. 1431 – § 1. In causis contentiosis, Episcopi dioecesani est iudicare utrum bonum publicum in discrimen vocari possit necne, nisi interventus promotoris iustitiae lege praecipiatur vel ex natura rei evidenter necessarius sit.

§ 2. Si in praecedenti instantia intervenerit promotor iustitiae, in ulteriore gradu huius interventus praesumitur necessarius.

Can. 1432 – Ad causas, in quibus agitur de nullitate sacrae ordinationis aut de nullitate vel solutione matrimonii, constituatur in dioecesi defensor vinculi, qui officio tenetur proponendi et exponendi omnia quae rationabiliter adduci possint adversus nullitatem vel solutionem.

Can. 1433 – In causis in quibus promotoris iustitiae aut defensoris vinculi praesentia requiritur, iis non citatis, acta irrita sunt, nisi ipsi, etsi non citati, revera interfuerint, aut saltem ante sententiam, actis inspectis, munere suo fungi potuerint.

Can. 1434 – Nisi aliud expresse caveatur:

1° quoties lex praecipit ut iudex partes earumve alteram audiat, etiam promotor iustitiae et vinculi defensor, si iudicio intersint, audiendi sunt;

2° quoties instantia partis requiritur ut iudex aliquid decernere

на пад пагрозу, а таксама ў карных справах, у дыяцэзіі павінен быць прызначаны прамотар справядлівасці, які мае абавязак клапаціцца аб публічным дабры.

Кан. 1431 – § 1. Калі ўдзел прамотара справядлівасці не прадпісаны законам або не з'яўляецца відавочна неабходным па сутнасці справы, дыяцэзіяльны біскуп мае права вырашаць: пастаўлена ў спрэчных справах публічнае дабро пад пагрозу ці не.

§ 2. Калі прамотар справядлівасці ўдзельнічаў у папярэдняй інстанцыі, мяркуецца, што яго ўдзел неабходны і ў наступнай.

Кан. 1432 – Для ўдзелу ў справах, якія датычаць нядзейснасці святога пасвячэння або нядзейснасці ці скасавання сужэнства, у дыяцэзіі павінен быць прызначаны абаронца повязі, які мае абавязак прапанаваць і прадстаўляць усё, што можа быць разумным чынам прыведзена супраць нядзейснасці ці скасавання.

Кан. 1433 – Калі ў справах, у якіх патрабуецца ўдзел прамотара справядлівасці або абаронцы повязі, яны не былі выкліканы, то дзеянні з'яўляюцца нядзейснымі, акрамя выпадкаў, калі гэтыя асобы, нават не будучы выкліканымі, на самай справе ўдзельнічалі або калі яны, прынамсі перад вынясеннем прысуду, мелі магчымасць выканаць сваё заданне, азнаёміўшыся з актамі.

Кан. 1434 – Калі іншае выразна не прадугледжана, то:

1° заўсёды, калі закон прадпісвае суддзі выслухаць бакі або адзін з бакоў, ён павінен выслухаць таксама прамотара справядлівасці і абаронцу повязі, калі яны ўдзельнічаюць у судовым працэсе;

2° заўсёды, калі хадайніцтва боку патрабуецца для таго, каб суддзя мог

прыняць акрэсленую пастанову, тую ж моц мае хадайніцтва прамотара справядлівасці і абаронцы повязі, якія ўдзельнічаюць у судовым працэсе.

possit, instantia promotoris iustitiae vel vinculi defensoris, qui iudicio intersint, eandem vim habet.

Кан. 1435 – Біскуп мае права на прызначэнне прамотара справядлівасці і абаронцы повязі, якія павінны быць духоўнымі або свецкімі асобамі з бездакорнай рэпутацыяй, мець ступень доктара або ліцэнзіята кананічнага права, быць дасведчанымі ў разважлівасці і клопаце аб справядлівасці.

Can. 1435 – Episcopi est promotorem iustitiae et vinculi defensorem nominare, qui sint clerici vel laici, integrae famae, in iure canonico doctores vel licentiati, ac prudentia et iustitiae zelo probati.

Кан. 1436 – § 1. Адна і тая ж асоба, але не ў той жа справе, можа выконваць заданне прамотара справядлівасці і абаронцы повязі.

§ 2. Прамотар справядлівасці і абаронца повязі могуць прызначацца як для ўсіх спраў, так і для асобных спраў; яны могуць быць звольнены біскупам па справядлівай прычыне.

Can. 1436 – § 1. Eadem persona, non autem in eadem causa, officium promotoris iustitiae et defensoris vinculi gerere potest.

§ 2. Promotor et defensor constitui possunt tum ad universitatem causarum tum ad singulas causas; possunt autem ab Episcopo, iusta de causa, removeri.

Кан. 1437 – § 1. Натарыус павінен удзельнічаць у кожным працэсе такім чынам, што акты, якія не былі ім падпісаны, павінны лічыцца нядзейснымі.

§ 2. Акты, складзеныя натарыусамі, атрымоўваюць публічную верагоднасць.

Can. 1437 – § 1. Cuilibet processui intersit notarius, adeo ut nulla habeantur acta, si non fuerint ab eo subscripta.

§ 2. Acta, quae notarii conficiunt, publicam fidem faciunt.

Раздзел II
Трыбунал другой інстанцыі

Caput II
De tribunali secundae instantiae

Кан. 1438 – Захоўваючы прадпісанне кан. 1444 § 1, 1°:

1° апеляцыя на трыбунал біскупа-суфрагана падаецца ў трыбунал мітрапаліта ў адпаведнасці з прадпісаннямі кан. 1439;

2° у справах, разгледжаных у першай інстанцыі перад мітрапалітам, апеля-

Can. 1438 – Firmo praescripto can. 1444, § 1, n. 1:

1° a tribunali Episcopi suffraganei appellatur ad tribunal Metropolitae, salvo praescripto can. 1439;

2° in causis in prima instantia pertractatis coram Metropolita fit

appellatio ad tribunal quod ipse, probante Sede Apostolica, stabiliter designaverit;

3° pro causis coram Superiore provinciali actis tribunal secundae instantiae est penes supremum Moderatorem; pro causis actis coram Abbate locali, penes Abbatem superiorem congregationis monasticae.

Can. 1439 – § 1. Si quod tribunal primae instantiae unicum pro pluribus dioecesibus, ad normam can. 1423, constitutum sit, Episcoporum conferentia debet tribunal secundae instantiae, probante Sede Apostolica, constituere, nisi dioeceses sint omnes eiusdem archidioecesis suffraganeae.

§ 2. Episcoporum conferentia potest, probante Sede Apostolica, unum vel plura tribunalia secundae instantiae constituere, etiam praeter casus de quibus in § 1.

§ 3. Quod attinet ad tribunalia secundae instantiae, de quibus in §§ 1-2, Episcoporum conferentia vel Episcopus ab ea designatus omnes habent potestates, quae Episcopo dioecesano competunt circa suum tribunal.

Can. 1440 – Si competentia ratione gradus, ad normam cann. 1438 et 1439 non servetur, incompetentia iudicis est absoluta.

Can. 1441 – Tribunal secundae instantiae eodem modo quo tribunal primae instantiae constitui debet. Si tamen in primo iudicii gradu, secundum can. 1425, § 4, iudex unicus sententiam tulit, tribunal secundae instantiae collegialiter procedat.

цыя падаецца ў трыбунал, вызначаны на пастаянна самім мітрапалітам з зацвярджэннем Апостальскай Сталіцы;

3° для спраў, разгледжаных перад настаяцелем правінцыі, трыбуналам другой інстанцыі з'яўляецца вярхоўны кіраўнік, а для спраў, разгледжаных перад мясцовым абатам, — абат-настаяцель манаскай кангрэгацыі.

Кан. 1439 – § 1. Калі, згодна з нормай кан. 1423, быў заснаваны адзін трыбунал першай інстанцыі для некалькіх дыяцэзій, Канферэнцыя Біскупаў павінна заснаваць з зацвярджэннем Апостальскай Сталіцы трыбунал другой інстанцыі, калі ўсе гэтыя дыяцэзіі не з'яўляюцца суфраганнымі ў адной і той жа архідыяцэзіі.

§ 2. Канферэнцыя Біскупаў можа заснаваць з зацвярджэннем Апостальскай Сталіцы адзін або некалькі трыбуналаў другой інстанцыі, нават апрача тых выпадкаў, аб якіх гаворыцца ў § 1.

§ 3. Што датычыць трыбуналаў другой інстанцыі, аб якіх гаворыцца ў § 1–2, Канферэнцыя Біскупаў або вызначаны ёю біскуп маюць усе паўнамоцтвы, якія дыяцэзіяльны біскуп мае ў адносінах да свайго трыбунала.

Кан. 1440 – Калі не будзе захавана кампетэнцыя на падставе ступені згодна з нормамі кан. 1438 і 1439, адсутнасць кампетэнцыі ў суддзі будзе абсалютнай.

Кан. 1441 – Трыбунал другой інстанцыі павінен быць заснаваны такім самым чынам, як і трыбунал першай інстанцыі. Аднак, калі ў адпаведнасці з кан. 1425 § 4 на першай ступені судовага працэсу прысуд быў вынесены аднаасобным суддзёй, трыбунал другой інстанцыі павінен дзейнічаць калегіяльна.

Раздзел III
Трыбуналы Апостальскай Сталіцы

Кан. 1442 – Для ўсяго каталіцкага свету Рымскі Пантыфік з'яўляецца вярхоўным суддзёй, які здзяйсняе правасуддзе або асабіста, або праз звычайныя трыбуналы Апостальскай Сталіцы, або праз дэлегаваных ім суддзяў.

Кан. 1443 – Звычайным трыбуналам, заснаваным Рымскім Пантыфікам для прыняцця апеляцый, з'яўляецца Рымская Рота.

Кан. 1444 – § 1. Рымская Рота судзіць:

1° у другой інстанцыі — справы, якія былі вырашаны ў першай інстанцыі звычайнымі трыбуналамі і перададзены Апостальскай Сталіцы ў парадку легітымнай апеляцыі;

2° у трэцяй і іншых інстанцыях — справы, разгледжаныя самой Рымскай Ротай і якімі-небудзь іншымі трыбуналамі, калі справа не перайшла ў стан *res iudicata*.

§ 2. Таксама гэты трыбунал разглядае ў першай інстанцыі справы, аб якіх гаворыцца ў кан. 1405 § 3, і іншыя, якія Рымскі Пантыфік або з уласнай ініцыятывы, або ў адказ на хадайніцтва бакоў запатрабаваў у свой трыбунал і даручыў Рымскай Роце; калі ў рэскрыпце, якім даручаецца гэтае заданне, не прадугледжана іншае, Рымская Рота разглядае гэтыя справы таксама ў другой і ў наступных інстанцыях.

Кан. 1445 – § 1. Вярхоўны Трыбунал Апостальскай Сігнатуры разглядае:

1° скаргі, якія датычаць нядзейснасці, і просьбы аб вяртанні ў зыходны стан, а таксама іншыя рэкурсы супраць прысудаў Рымскай Роты;

Caput III
De apostolicae sedis tribunalibus

Can. 1442 – Romanus Pontifex pro toto orbe catholico iudex est supremus, qui vel per se ipse ius dicit, vel per ordinaria Sedis Apostolicae tribunalia, vel per iudices a se delegatos.

Can. 1443 – Tribunal ordinarium a Romano Pontifice constitutum appellationibus recipiendis est Rota Romana.

Can. 1444 – § 1. Rota Romana iudicat:

1° in secunda instantia, causas quae ab ordinariis tribunalibus primae instantiae diiudicatae fuerint et ad Sanctam Sedem per appellationem legitimam deferantur;

2° in tertia vel ulteriore instantia, causas ab ipsa Rota Romana et ab aliis quibusvis tribunalibus iam cognitas, nisi res iudicata habeatur.

§ 2. Hoc tribunal iudicat etiam in prima instantia causas de quibus in can. 1405, § 3, aliasve quas Romanus Pontifex sive motu proprio, sive ad instantiam partium ad suum tribunal advocaverit et Rotae Romanae commiserit; easque, nisi aliud cautum sit in commissi muneris rescripto, ipsa Rota iudicat etiam in secunda et ulteriore instantia.

Can. 1445 – § 1. Supremum Signaturae Apostolicae Tribunal cognoscit:

1° querelas nullitatis et petitiones restitutionis in integrum et alios recursus contra sententias rotales;

2° recursus in causis de statu personarum, quas ad novum examen Rota Romana admittere renuit;

3° exceptiones suspicionis aliasque causas contra Auditores Rotae Romanae propter acta in exercitio ipsorum muneris;

4° conflictus competentiae de quibus in can. 1416.

§ 2. Ipsum Tribunal videt de contentionibus ortis ex actu potestatis administrativae ecclesiasticae ad eam legitime delatis, de aliis controversiis administrativis quae a Romano Pontifice vel a Romanae Curiae dicasteriis ipsi deferantur, et de conflictu competentiae inter eadem dicasteria.

§ 3. Supremi huius Tribunalis praeterea est:

1° rectae administrationi iustitiae invigilare et in advocatos vel procuratores, si opus sit, animadvertere;

2° tribunalium competentiam prorogare;

3° promovere et approbare erectionem tribunalium, de quibus in cann. 1423 et 1439.

2° рэкурсы ў справах аб стане асобаў, якія Рымская Рота адмовілася прыняць на новы разгляд;

3° закіды, а таксама іншыя справы супраць аўдытараў Рымскай Роты, звязаныя з дзеяннямі, якія яны выконваюць пры ажыццяўленні свайго задання;

4° канфлікты кампетэнцый, аб якіх гаворыцца ў кан. 1416.

§ 2. Гэты ж трыбунал разглядае спрэчкі, якія ўзніклі ў выніку дзеяння касцёльнай адміністрацыйнай улады, перададзеныя яму легітымна, а таксама іншыя адміністрацыйныя спрэчкі, перададзеныя яму Рымскім Пантыфікам або дыкастэрыямі Рымскай Курыі, і канфлікты кампетэнцый паміж гэтымі дыкастэрыямі.

§ 3. Акрамя таго, да паўнамоцтваў гэтага Вярхоўнага Трыбунала належыць:

1° сачыць за адпаведным ажыццяўленнем правасуддзя і — пры неабходнасці — прымаць меры ў адносінах да адвакатаў або прадстаўнікоў;

2° пашыраць кампетэнцыю трыбуналаў;

3° садзейнічаць заснаванню і зацвярджаць трыбуналы, аб якіх гаворыцца ў кан. 1423 і 1439.

TITULUS III
DE DISCIPLINA IN TRIBUNALIBUS SERVANDA

Caput I
De disciplina iudicum et tribunalium ministrorum

Can. 1446 – § 1. Christifideles omnes, in primis autem Episcopi, sedulo annitantur ut, salva iustitia, lites in populo Dei, quantum fieri possit, vi-

ТЫТУЛ III
ПАРАДАК, ЯКІ ПАВІНЕН ЗАХОЎВАЦЦА Ў ТРЫБУНАЛАХ

Раздзел I
Абавязкі суддзяў і служачых трыбуналаў

Кан. 1446 – § 1. Усе вернікі, а ў першую чаргу — біскупы, павінны старанна імкнуцца да таго, каб, захоўваючы справядлівасць, выключыць — наколькі гэта магчыма —

спрэчкі ў Божым народзе і як мага хутчэй мірна іх вырашаць.

§ 2. На пачатку спрэчкі і ў любы іншы момант, калі суддзя заўважыць якую-небудзь надзею на добры вынік, ён павінен заахвоціць бакі і дапамагчы ім у пошуку адпаведнага вырашэння спрэчкі праз сумеснае абмеркаванне, а таксама ўказаць належныя шляхі да гэтага, карыстаючыся таксама пасрэдніцтвам паважаных асобаў.

§ 3. Калі спрэчка датычыць прыватнага дабра бакоў, суддзя павінен разважыць тое, ці існуе магчымасць карысна завяршыць спрэчку праз здзелку або арбітральны разгляд згодна з нормамі кан. 1713–1716.

Кан. 1447 – Той, хто прымаў удзел у якой-небудзь справе ў якасці суддзі, прамотара справядлівасці, абаронцы повязі, прадстаўніка, адваката, сведкі або спецыяліста, не можа пазней дзейсна разглядаць гэтую справу ў другой інстанцыі ў якасці суддзі або выконваць у ёй заданне асэсара.

Кан. 1448 – § 1. Суддзя не павінен прымаць на разгляд справы, у якіх ён можа быць зацікаўлены на падставе роднасці ці сваяцтва ў любой ступені прамой лініі і аж да чацвёртай ступені бакавой лініі або на падставе апекі ці папячыцельства, блізкага сяброўства, моцнай варожасці, магчымасці атрымаць выгаду ці пазбегнуць шкоды.

§ 2. Пры наяўнасці такіх жа абставін ад выконвання сваёй пасады павінны ўстрымацца прамотар справядлівасці, абаронца повязі, асэсар і аўдытар.

Кан. 1449 – § 1. У выпадках, аб якіх гаворыцца ў кан. 1448, калі суддзя сам не ўстрымаецца, бок можа заявіць яму адвод.

§ 2. Адвод разглядае судовы вікарый, а калі адвод заяўлены яму самому — біскуп, які ўзначальвае трыбунал.

tentur et pacifice quam primum componantur.

§ 2. Iudex in limine litis, et etiam quolibet alio momento, quotiescumque spem aliquam boni exitus perspicit, partes hortari et adiuvare ne omittat, ut de aequa controversiae solutione quaerenda communi consilio curent, viasque ad hoc propositum idoneas ipsis indicet, gravibus quoque hominibus ad mediationem adhibitis.

§ 3. Quod si circa privatum partium bonum lis versetur, dispiciat iudex num transactione vel arbitrorum iudicio, ad normam cann. 1713-1716, controversia finem habere utiliter possit.

Can. 1447 – Qui causae interfuit tamquam iudex, promotor iustitiae, defensor vinculi, procurator, advocatus, testis aut peritus, nequit postea valide eandem causam in alia instantia tamquam iudex definire aut in eadem munus assessoris sustinere.

Can. 1448 – § 1. Iudex cognoscendam ne suscipiat causam, in qua ratione consanguinitatis vel affinitatis in quolibet gradu lineae rectae et usque ad quartum gradum lineae collateralis, vel ratione tutelae et curatelae, intimae vitae consuetudinis, magnae simultatis, vel lucri faciendi aut damni vitandi, aliquid ipsius intersit.

§ 2. In iisdem adiunctis ab officio suo abstinere debent iustitiae promotor, defensor vinculi, assessor et auditor.

Can. 1449 – § 1. In casibus, de quibus in can. 1448, nisi iudex ipse abstineat, pars potest eum recusare.

§ 2. De recusatione videt Vicarius iudicialis; si ipse recusetur, videt Episcopus qui tribunali praeest.

§ 3. Si Episcopus sit iudex et contra eum recusatio opponatur, ipse abstineat a iudicando.

§ 4. Si recusatio opponatur contra promotorem iustitiae, defensorem vinculi aut alios tribunalis administros, de hac exceptione videt praeses in tribunali collegiali vel ipse iudex, si unicus sit.

Can. 1450 – Recusatione admissa, personae mutari debent, non vero iudicii gradus.

Can. 1451 – § 1. Quaestio de recusatione expeditissime definienda est, auditis partibus, promotore iustitiae vel vinculi defensore, si intersint, neque ipsi recusati sint.

§ 2. Actus positi a iudice antequam recusetur, validi sunt; qui autem positi sunt post propositam recusationem, rescindi debent, si pars petat intra decem dies ab admissa recusatione.

Can. 1452 – § 1. In negotio quod privatorum solummodo interest, iudex procedere potest dumtaxat ad instantiam partis. Causa autem legitime introducta, iudex procedere potest et debet etiam ex officio in causis poenalibus aliisque, quae publicum Ecclesiae bonum aut animarum salutem respiciunt.

§ 2. Potest autem praeterea iudex partium neglegentiam in probationibus afferendis vel in exceptionibus opponendis supplere, quoties id necessarium censeat ad vitandam graviter iniustam sententiam, firmis praescriptis can. 1600.

§ 3. Калі суддзёй з'яўляецца біскуп і яму заяўлены адвод, ён павінен устрымацца ад судовага разгляду.

§ 4. Калі адвод заяўлены прамотару справядлівасці, абаронцу повязі або іншым служачым трыбунала, гэты закід разглядае старшыня калегіяльнага трыбунала або сам суддзя, калі з'яўляецца аднаасобным.

Кан. 1450 – Калі адвод дапушчаны, павінны быць заменены асобы, а не ступень судовага працэсу.

Кан. 1451 – § 1. Адвод павінен быць разгледжаны як мага хутчэй пасля таго, як будуць выслуханы бакі, прамотар справядлівасці або абаронца повязі, калі яны ўдзельнічаюць і калі адвод не быў заяўлены ім самім.

§ 2. Дзеянні, выкананыя суддзёй перад тым, як адвод быў заяўлены, з'яўляюцца дзейснымі; дзеянні ж, выкананыя пасля таго, як адвод быў заяўлены, павінны быць адменены, калі бок папросіць аб гэтым на працягу дзесяці дзён пасля дапушчэння адводу.

Кан. 1452 – § 1. У справах, якія з'яўляюцца толькі прыватнымі, суддзя можа выконваць працэсуальныя дзеянні толькі ў адказ на хадайніцтва боку. Але ў карных справах і ў іншых справах, якія датычаць публічнага дабра Касцёла або збаўлення душаў, калі справа была легітымна пачата, суддзя можа і павінен выконваць працэсуальныя дзеянні таксама на моцы сваёй пасады.

§ 2. Акрамя таго, суддзя можа дапоўніць нядбайнасць бакоў у прадстаўленні доказаў або заяўленні закідаў заўсёды, калі палічыць гэта неабходным для таго, каб пазбегнуць асабліва несправядлівага прысуду, пры гэтым захоўваецца прадпісанне кан. 1600.

Кан. 1453 – Суддзі і трыбуналы павінны клапаціцца аб тым, каб усе справы былі закончаны — захоўваючы справядлівасць — як мага хутчэй, так менавіта, каб у трыбунале першай інстанцыі яны не зацягваліся на даўжэй чым адзін год, а ў трыбунале другой інстанцыі — на даўжэй чым шэсць месяцаў.

Can. 1453 – Iudices et tribunalia curent ut quam primum, salva iustitia, causae omnes terminentur, utque in tribunali primae instantiae ultra annum ne protrahantur, in tribunali vero secundae instantiae, ultra sex menses.

Кан. 1454 – Усе, хто ўтвараюць трыбунал або аказваюць яму дапамогу, павінны скласці прысягу ў тым, што сваё заданне будуць выконваць належным чынам і верна.

Can. 1454 – Omnes qui tribunal constituunt aut eidem opem ferunt, iusiurandum de munere rite et fideliter implendo praestare debent.

Кан. 1455 – § 1. У карным судовым працэсе — заўсёды, а ў спрэчным — калі раскрыццё якога-небудзь працэсуальнага дзеяння можа прычыніць шкоду для бакоў, суддзі і служачыя трыбуналаў павінны захоўваць службовую таямніцу.

Can. 1455 – § 1. In iudicio poenali semper, in contentioso autem si ex revelatione alicuius actus processualis praeiudicium partibus obvenire possit, iudices et tribunalis adiutores tenentur ad secretum officii servandum.

§ 2. Акрамя таго, яны маюць абавязак заўсёды захоўваць таямніцу адносна дыскусіі, якая адбываецца паміж суддзямі ў калегіяльным трыбунале перад вынясеннем прысуду, а таксама адносна розных галасоў і меркаванняў, якія там былі выяўлены, пры гэтым захоўваецца прадпісанне кан. 1609 § 4.

§ 2. Tenentur etiam semper ad secretum servandum de discussione quae inter iudices in tribunali collegiali ante ferendam sententiam habetur, tum etiam de variis suffragiis et opinionibus ibidem prolatis, firmo praescripto can. 1609, § 4.

§ 3. Больш за тое, заўсёды, калі сутнасць справы або доказаў такая, што з публічнага распаўсюджвання звестак аб дзеяннях ці доказах будзе вынікаць пагроза для рэпутацыі іншых асобаў або будзе ўзнікаць падстава для разладу, ці спакуса, ці іншыя падобныя нязручнасці, суддзя можа абавязаць сведкаў, спецыялістаў, бакі, а таксама іх адвакатаў або прадстаўнікоў да складання прысягі ў тым, што яны будуць захоўваць таямніцу.

§ 3. Immo, quoties natura causae vel probationum talis sit ut ex actorum vel probationum evulgatione aliorum fama periclitetur, vel praebeatur ansa dissidiis, aut scandalum aliudve id genus incommodum oriatur, iudex poterit testes, peritos, partes earumque advocatos vel procuratores iureiurando astringere ad secretum servandum.

Кан. 1456 – Суддзям і ўсім служачым трыбунала забараняецца прымаць любыя падарункі ў сувязі з ажыццяўленнем правасуддзя.

Can. 1456 – Iudex et omnes tribunalis administri, occasione agendi iudicii, dona quaevis acceptare prohibentur.

Can. 1457 – § 1. Iudices qui, cum certe et evidenter competentes sint, ius reddere recusent, vel nullo suffragante iuris praescripto se competentes declarent atque causas cognoscant ac definiant, vel secreti legem violent, vel ex dolo aut gravi neglegentia aliud litigantibus damnum inferant, congruis poenis a competenti auctoritate puniri possunt, non exclusa officii privatione.

§ 2. Iisdem sanctionibus subsunt tribunalis ministri et adiutores, si officio suo, ut supra, defuerint; quos omnes etiam iudex punire potest.

Кан. 1457 – § 1. Суддзі, якія, будучы несумненна і відавочна кампетэнтнымі, адмаўляюцца ажыццяўляць правасуддзе, або разглядаюць і вырашаюць справы, сцвярджаючы сваю кампетэнтнасць без ніякай падставы, заснаванай на прадпісанні права, або парушаюць закон аб таямніцы, або праз падман ці цяжкую нядбайнасць прычыняюць шкоду бакам спрэчкі, могуць быць пакараны кампетэнтнай уладай адпаведнымі пакараннямі, не выключаючы пазбаўлення пасады.

§ 2. Такім жа санкцыям падвержаны ўсе служачыя і памочнікі трыбунала, калі парушаюць свае абавязкі такім чынам, як указана вышэй; усе яны таксама могуць быць пакараны суддзёй.

Caput II
De ordine cognitionum

Раздзел II
Парадак разгляду спраў

Can. 1458 – Causae cognoscendae sunt eo ordine quo fuerunt propositae et in albo inscriptae, nisi ex iis aliqua celerem prae ceteris expeditionem exigat, quod quidem peculiari decreto, rationibus suffulto, statuendum est.

Кан. 1458 – Справы павінны разглядацца ў тым парадку, у якім яны паступілі і былі ўнесены ў спіс, калі якая-небудзь з іх не з'яўляецца больш тэрміновай у параўнанні з іншымі, аднак гэта павінна быць пастаноўлена асаблівым дэкрэтам, у якім павінна быць змешчана абгрунтаванне.

Can. 1459 – § 1. Vitia, quibus sententiae nullitas haberi potest, in quolibet iudicii statu vel gradu excipi possunt itemque a iudice ex officio declarari.

§ 2. Praeter casus de quibus in § 1, exceptiones dilatoriae, eae praesertim quae respiciunt personas et modum iudicii, proponendae sunt ante contestationem litis, nisi contestata iam lite emerserint, et quam primum definiendae.

Кан. 1459 – § 1. Аб заганах, якія могуць выклікаць нядзейснасць прысуду, можа быць заяўлена на любой стадыі або ступені судовага працэсу, іх таксама можа сцвердзіць суддзя на моцы сваёй пасады.

§ 2. Апрача выпадкаў, аб якіх гаворыцца ў § 1, закіды, якія адкладаюць судовы працэс, асабліва тыя, якія датычаць асобаў і парадку судовага працэсу, павінны быць заяўлены перад пачаткам судовай спрэчкі, калі яны не ўзнікнуць пасля таго, як судовая спрэчка ўжо будзе пачата, і павінны быць вырашаны як мага хутчэй.

Кан. 1460 – § 1. Калі заяўлены закід, які датычыць кампетэнцыі суддзі, гэтае пытанне павінен разглядзець сам суддзя.

§ 2. У выпадку закіду, які датычыць адноснай адсутнасці кампетэнцыі, калі суддзя сцвердзіць сябе кампетэнтным, на яго рашэнне не можа быць пададзена апеляцыя; пры гэтым не забараняецца скарга, якая датычыць нядзейснасці з просьбай аб вяртанні ў зыходны стан.

§ 3. Калі суддзя сцвердзіць у сябе адсутнасць кампетэнцыі, бок, які лічыць сябе пацярпелым, можа на працягу пятнаццаці карысных дзён звярнуцца ў апеляцыйны трыбунал.

Кан. 1461 – Калі на любой стадыі справы суддзя даведаецца аб сваёй абсалютнай адсутнасці кампетэнцыі, ён павінен сцвердзіць гэтую адсутнасць у сябе кампетэнцыі.

Кан. 1462 – § 1. Закіды, якія датычаць стану *res iudicata*, пагадненні і іншыя спыняючыя закіды, якія называюцца "завяршаючымі спрэчкі", павінны быць заяўлены і разгледжаны перад пачаткам судовай спрэчкі; той, хто заявіць іх пазней, не можа быць адхілены, але павінен аплаціць выдаткі, калі не дакажа, што спазненне не было зламысным.

§ 2. Іншыя спыняючыя закіды павінны быць заяўлены пры пачатку судовай спрэчкі і разгледжаны ў адпаведным тэрміне паводле правілаў, якія датычаць пабочных пытанняў.

Кан. 1463 – § 1. Сустрэчныя позвы не могуць быць дзейсна скіраваны, калі не на працягу трыццаці дзён ад пачатку судовай спрэчкі.

§ 2. Яны павінны быць разгледжаны разам з асноўнай позвай, гэта значыць на адной ступені з ёй, калі іх асобны раз-

Can. 1460 – § 1. Si exceptio proponatur contra iudicis competentiam, hac de re ipse iudex videre debet.

§ 2. In casu exceptionis de incompetentia relativa, si iudex se competentem pronuntiet, eius decisio non admittit appellationem, at non prohibentur querela nullitatis et restitutio in integrum.

§ 3. Quod si iudex se incompetentem declaret, pars quae se gravatam reputat, potest intra quindecim dies utiles provocare ad tribunal appellationis.

Can. 1461 – Iudex in quovis stadio causae se absolute incompetentem agnoscens, suam incompetentiam declarare debet.

Can. 1462 – § 1. Exceptiones rei iudicatae, transactionis et aliae peremptoriae quae dicuntur *litis finitae*, proponi et cognosci debent ante contestationem litis; qui serius eas opposuerit, non est reiciendus, sed condemnetur ad expensas, nisi probet se oppositionem malitiose non distulisse.

§ 2. Aliae exceptiones peremptoriae proponantur in contestatione litis, et suo tempore tractandae sunt secundum regulas circa quaestiones incidentes.

Can. 1463 – § 1. Actiones reconventionales proponi valide nequeunt, nisi intra triginta dies a lite contestata.

§ 2. Eaedem autem cognoscantur simul cum conventionali actione, hoc est pari gradu cum ea, nisi eas sepa-

ratim cognoscere necessarium sit aut iudex id opportunius existimaverit.

Can. 1464 – Quaestiones de cautione pro expensis iudicialibus praestanda aut de concessione gratuiti patrocinii, quod statim ab initio postulatum fuerit, et aliae huiusmodi regulariter videndae sunt ante litis contestationem.

гляд не будзе неабходны ці калі суддзя не палічыць асобны разгляд больш дарэчным.

Кан. 1464 – Пытанні аб забеспячэнні аплаты судовых выдаткаў або аб удзяленні бясплатнай судовай дапамогі, якія былі заяўлены на самым пачатку, а таксама іншыя падобныя пытанні павінны быць разгледжаны, як правіла, перад пачаткам судовай спрэчкі.

Caput III
De terminis et dilationibus

Can. 1465 – § 1. Fatalia legis quae dicuntur, id est termini perimendis iuribus lege constituti, prorogari non possunt, neque valide, nisi petentibus partibus, coarctari.

§ 2. Termini autem iudiciales et conventionales, ante eorum lapsum, poterunt, iusta intercedente causa, a iudice, auditis vel petentibus partibus, prorogari, numquam autem, nisi partibus consentientibus, valide coarctari.

§ 3. Caveat tamen iudex ne nimis diuturna lis fiat ex prorogatione.

Can. 1466 – Ubi lex terminos haud statuat ad actus processuales peragendos, iudex illos praefinire debet, habita ratione naturae uniuscuiusque actus.

Can. 1467 – Si die ad actum iudicialem indicto vacaverit tribunal, terminus intellegitur prorogatus ad primum sequentem diem non feriatum.

Раздзел III
Тэрміны і адтэрміноўкі

Кан. 1465 – § 1. Неаднаўляльныя тэрміны — гэта ўстаноўленыя законам тэрміны, з заканчэннем якіх спыняюцца правамоцтвы. Неаднаўляльныя тэрміны не могуць быць прадоўжаны, а таксама не могуць быць дзейсна скарочаны, калі не па просьбе бакоў.

§ 2. Што датычыць судовых і ўзгодненых тэрмінаў, то перад тым, як яны мінуць, і пры наяўнасці справядлівай прычыны суддзя можа іх прадоўжыць, выслухаўшы бакі або па іх просьбе, але яны ніколі не могуць быць дзейсна скарочаны без згоды бакоў.

§ 3. Аднак суддзя павінен клапаціцца аб тым, каб з прычыны прадоўжвання спрэчка не зацягвалася празмерна.

Кан. 1466 – Калі закон не ўстанаўлівае тэрмінаў для выканання працэсуальных дзеянняў, суддзя павінен іх устанавіць, беручы пад увагу сутнасць кожнага з гэтых дзеянняў.

Кан. 1467 – Калі дзень, вызначаны для судовага дзеяння, з'яўляецца непрацоўным днём трыбунала, тэрмін павінен лічыцца прадоўжаным да першага наступнага працоўнага дня.

Раздзел IV

Месца судовага працэсу

Кан. 1468 – Кожны трыбунал павінен мець сядзібу, калі магчыма — сталую, і ўстаноўленыя гадзіны працы.

Кан. 1469 – § 1. Суддзя, які быў сілай выгнаны са сваёй тэрыторыі, або той, які мае перашкоду ў ажыццяўленні на ёй юрысдыкцыі, можа ажыццяўляць сваю юрысдыкцыю і выдаваць прысуды па-за сваёй тэрыторыяй, аднак паведаміўшы аб гэтым дыяцэзіяльнага біскупа.

§ 2. Апрача выпадку, аб якім гаворыцца ў § 1, суддзя, па справядлівай прычыне і выслухаўшы бакі, можа з мэтай збірання доказаў скіравацца нават за межы сваёй тэрыторыі, але толькі з дазволу дыяцэзіяльнага біскупа таго месца, куды кіруецца, і ў вызначаную біскупам сядзібу.

Caput IV

De loco iudicii

Can. 1468 – Uniuscuiusque tribunalis sedes sit, quantum fieri potest, stabilis, quae statutis horis pateat.

Can. 1469 – § 1. Iudex e territorio suo vi expulsus vel a iurisdictione ibi exercenda impeditus, potest extra territorium iurisdictionem suam exercere et sententiam ferre, certiore tamen hac de re facto Episcopo dioecesano.

§ 2. Praeter casum de quo in § 1, iudex, ex iusta causa et auditis partibus, potest ad probationes acquirendas etiam extra proprium territorium se conferre, de licentia tamen Episcopi dioecesani loci adeundi et in sede ab eodem designata.

Раздзел V

Асобы, якія дапускаюцца ў залу, і парадак складання і захоўвання актаў

Кан. 1470 – § 1. Калі партыкулярны закон не прадугледжвае іншае, то ў зале падчас разгляду справы трыбуналам могуць прысутнічаць толькі тыя, хто ў адпаведнасці з законам або пастанаўленнем суддзі з'яўляюцца неабходнымі для вядзення працэсу.

§ 2. Суддзя можа праз адпаведныя пакаранні прывесці да парадку ўсіх прысутных на судовым разглядзе, хто цяжка парушае належную павагу і паслухмянасць у адносінах да трыбунала, а адвакатаў і прадстаўнікоў ён можа таксама адхіліць ад выконвання імі заданняў у касцёльных трыбуналах.

Caput V

De personis in aulam admittendis et de modo conficiendi et conservandi acta

Can. 1470 – § 1. Nisi aliter lex particularis caveat, dum causae coram tribunali aguntur, ii tantummodo adsint in aula quos lex aut iudex ad processum expediendum necessarios esse statuerit.

§ 2. Omnes iudicio assistentes, qui reverentiae et oboedientiae tribunali debitae graviter defuerint, iudex potest congruis poenis ad officium reducere, advocatos praeterea et procuratores etiam a munere apud tribunalia ecclesiastica exercendo suspendere.

Can. 1471 – Si qua persona interroganda utatur lingua iudici vel partibus ignota, adhibeatur interpres iuratus a iudice designatus. Declarationes tamen scripto redigantur lingua originaria et translatio addatur. Interpres etiam adhibeatur si surdus vel mutus interrogari debet, nisi forte malit iudex quaestionibus a se datis scripto respondeatur.

Кан. 1471 – Калі якая-небудзь асоба, якая павінна даваць паказанні, ужывае мову, невядомую суддзі або бакам, павінен быць прыцягнуты да дапамогі прысяжны перакладчык, вызначаны суддзёй. Пры гэтым паказанні павінны быць запісаны на той мове, якую ўжывала асоба, якая іх складала, з дадаткам перакладу. Перакладчык павінен быць прыцягнуты да дапамогі таксама тады, калі паказанні павінен даваць глухі або нямы, калі суддзя не палічыць за лепшае, каб яны пісьмова адказвалі на пытанні, якія ён ім задасць.

Can. 1472 – § 1. Acta iudicialia, tum quae meritum quaestionis respiciunt, seu acta causae, tum quae ad formam procedendi pertinent, seu acta processus, scripto redacta esse debent.

Кан. 1472 – § 1. Акты, якія адносяцца да судовага разгляду, павінны быць запісаны пісьмова, як тыя, якія датычаць сутнасці справы, іншымі словамі — акты справы, так і тыя, якія датычаць працэсуальнай формы, іншымі словамі — акты працэсу.

§ 2. Singula folia actorum numerentur et authenticitatis signo muniantur.

§ 2. Кожная старонка актаў павінна быць пранумаравана і пасведчана спосабам, які запэўнівае аўтэнтычнасць.

Can. 1473 – Quoties in actis iudicialibus partium aut testium subscriptio requiritur, si pars aut testis subscribere nequeat vel nolit, id in ipsis actis adnotetur, simulque iudex et notarius fidem faciant actum ipsum de verbo ad verbum parti aut testi perlectum fuisse, et partem aut testem vel non potuisse vel noluisse subscribere.

Кан. 1473 – Заўсёды, калі ў судовых актах патрабуецца подпіс бакоў ці сведкаў, а бок ці сведка не можа або не жадае ставіць подпіс, аб гэтым павінен быць зроблены запіс у самім акце; разам з тым суддзя і натарыус павінны пацвердзіць, што гэты акт быў даслоўна прачытаны боку ці сведку, а бок ці сведка не мог або не жадаў яго падпісаць.

Can. 1474 – § 1. In casu appellationis, actorum exemplar, fide facta a notario de eius authenticitate, ad tribunal superius mittatur.

Кан. 1474 – § 1. У выпадку апеляцыі ў вышэйшы трыбунал павінна быць пераслана копія актаў, згоднасць якой з арыгіналам пацверджана натарыусам.

§ 2. Si acta exarata fuerint lingua tribunali superiori ignota, transferantur in aliam eidem tribunali cognitam, cautelis adhibitis, ut de fideli translatione constet.

§ 2. Калі акты былі складзены на мове, невядомай вышэйшаму трыбуналу, яны павінны быць перакладзены на іншую мову, вядомую гэтаму трыбуналу, паклапаціўшыся аб тым, каб была ўпэўненасць у дакладнасці перакладу.

Кан. 1475 – § 1. Пасля заканчэння судовага працэсу дакументы, якія знаходзяцца ў прыватнай уласнасці, павінны быць вернуты, пры гэтым павінны быць захаваны іх копіі.

§ 2. Натарыусам і канцлеру забараняецца выдаваць копіі судовых актаў і дакументаў, сабраных падчас працэсу, без упаўнаважання суддзі.

Can. 1475 – § 1. Iudicio expleto, documenta quae in privatorum dominio sunt, restitui debent, retento tamen eorum exemplari.

§ 2. Notarii et cancellarius sine iudicis mandato tradere prohibentur exemplar actorum iudicialium et documentorum, quae sunt processui acquisita.

ТЫТУЛ IV
БАКІ Ў СПРАВЕ

Раздзел I
Пазоўнік і адказчык

Кан. 1476 – Кожны, ахрышчаны ці неахрышчаны, можа звяртацца ў суд у якасці пазоўніка, а той, хто быў легітымна выкліканы ў якасці адказчыка, павінен адказваць.

Кан. 1477 – Пры тым, што пазоўнік ці адказчык могуць устанавіць прадстаўніка або адваката, яны заўсёды маюць абавязак асабіста прысутнічаць у судзе згодна з прадпісаннем права ці суддзі.

Кан. 1478 – § 1. Непаўналетнія і тыя, хто пазбаўлены карыстання розумам, могуць выступаць у судзе ў якасці боку толькі праз сваіх бацькоў, апекуноў ці папячыцеляў, захоўваючы прадпісанне § 3.

§ 2. Калі суддзя палічыць, што правы непаўналетніх знаходзяцца ў супярэчнасці з правамі бацькоў, апекуноў ці папячыцеляў або яны не могуць у дастатковай меры абараняць іх правы, тады непаўналетнія павінны выступаць у судзе ў якасці боку праз апекуна ці папячыцеля, вызначаных суддзёй.

TITULUS IV
DE PARTIBUS IN CAUSA

Caput I
De actore et de parte conventa

Can. 1476 – Quilibet, sive baptizatus sive non baptizatus, potest in iudicio agere; pars autem legitime conventa respondere debet.

Can. 1477 – Licet actor vel pars conventa procuratorem vel advocatum constituerit, semper tamen tenetur in iudicio ipsemet adesse ad praescriptum iuris vel iudicis.

Can. 1478 – § 1. Minores et ii, qui rationis usu destituti sunt, stare in iudicio tantummodo possunt per eorum parentes aut tutores vel curatores, salvo praescripto § 3.

§ 2. Si iudex existimet minorum iura esse in conflictu cum iuribus parentum vel tutorum vel curatorum, aut hos non satis tueri posse ipsorum iura, tunc stent in iudicio per tutorem vel curatorem a iudice datum.

§ 3. Sed in causis spiritualibus et cum spiritualibus conexis, si minores usum rationis assecuti sint, agere et respondere queunt sine parentum vel tutoris consensu, et quidem per se ipsi, si aetatem quattuordecim annorum expleverint; secus per curatorem a iudice constitutum.

§ 3. Аднак, у духоўных справах і ў справах, звязаных з духоўнымі, калі непаўналетнія ўжо дасягнулі карыстання розумам, могуць у якасці боку звяртацца ў суд і адказваць без згоды бацькоў ці апекуна, а калі ім споўнілася чатырнаццаць гадоў — асабіста; у супраціўным выпадку яны дзейнічаюць праз папячыцеля, вызначанага суддзёй.

§ 4. Bonis interdicti, et ii qui minus firmae mentis sunt, stare in iudicio per se ipsi possunt tantummodo ut de propriis delictis respondeant, aut ad praescriptum iudicis; in ceteris agere et respondere debent per suos curatores.

§ 4. Асобы, пазбаўленыя дзеяздольнасці ў кіраванні маёмасцю, а таксама тыя, хто пакутуюць на псіхічныя хваробы, могуць асабіста выступаць у судзе ў якасці боку толькі для таго, каб адказваць за ўласныя злачынствы, або згодна з прадпісаннем суддзі; у іншых справах яны павінны дзейнічаць і адказваць праз сваіх папячыцеляў.

Can. 1479 – Quoties adest tutor aut curator ab auctoritate civili constitutus, idem potest a iudice ecclesiastico admitti, audito, si fieri potest, Episcopo dioecesano eius cui datus est; quod si non adsit aut non videatur admittendus, ipse iudex tutorem aut curatorem pro causa designabit.

Кан. 1479 – У выпадку, калі ёсць апякун ці папячыцель, устаноўлены дзяржаўнай уладай, касцёльны суддзя можа дапусціць яго, выслухаўшы — калі гэта будзе магчыма — дыяцэзіяльнага біскупа таго, для каго гэты апякун ці папячыцель устаноўлены; калі ж іх няма або будзе палічана, што яны не могуць быць дапушчаны, суддзя сам вызначае апекуна ці папячыцеля ў гэтай справе.

Can. 1480 – § 1. Personae iuridicae in iudicio stant per suos legitimos repraesentantes.

Кан. 1480 – § 1. Юрыдычныя асобы выступаюць у судзе ў якасці боку праз сваіх легітымных прадстаўнікоў.

§ 2. In casu vero defectus vel neglegentiae repraesentantis, potest ipse Ordinarius per se vel per alium stare in iudicio nomine personarum iuridicarum, quae sub eius potestate sunt.

§ 2. У выпадку адсутнасці або нядбайнасці прадстаўніка, сам ардынарый можа асабіста або праз іншую асобу выступаць у судзе ў якасці боку ад імя юрыдычных асобаў, якія знаходзяцца пад яго ўладай.

Раздзел II
Судовыя прадстаўнікі і адвакаты

Кан. 1481 – § 1. Бок можа свабодна ўстанаўліваць сабе адваката ці прадстаўніка; але — апрача выпадкаў, аб якіх пастаноўлена ў § 2 і 3, — можа таксама выступаць і адказваць у якасці боку асабіста, калі суддзя не прызнае неабходнай паслугу прадстаўніка ці адваката.

§ 2. У карным судовым працэсе абвінавачаны заўсёды павінен мець адваката, якога сам устанавіў або вызначанага суддзёй.

§ 3. У спрэчным судовым працэсе, калі гаворка ідзе пра малалетніх або пра працэс, які датычыць публічнага дабра, за выключэннем сужэнскіх спраў, суддзя, на моцы сваёй пасады, павінен вызначыць абаронцу для боку, які яго не мае.

Кан. 1482 – § 1. Кожны можа ўстанавіць сабе толькі аднаго прадстаўніка, які не можа вызначаць каго-небудзь замест сябе, калі такое паўнамоцтва не было яму выразна дадзена.

§ 2. Аднак, калі б па справядлівай прычыне хто-небудзь устанавіў сабе некалькі прадстаўнікоў, яны павінны быць вызначаны такім чынам, каб сярод іх абавязваў прынцып першынства.

§ 3. Пры гэтым адначасова могуць быць устаноўлены некалькі адвакатаў.

Кан. 1483 – Прадстаўнік і адвакат павінны быць паўналетнімі і мець бездакорную рэпутацыю; акрамя гэтага, адвакат павінен быць католікам, калі дыяцэзіяльны біскуп не дазволіць іншае, павінен быць доктарам кананічнага права або — у іншым выпадку — сапраўдным спецыялістам і павінен быць зацверджаны тым жа біскупам.

Caput II
De procuratoribus ad lites et advocatis

Can. 1481 – § 1. Pars libere potest advocatum et procuratorem sibi constituere; sed praeter casus in §§ 2 et 3 statutos, potest etiam per se ipsa agere et respondere, nisi iudex procuratoris vel advocati ministerium necessarium existimaverit.

§ 2. In iudicio poenali accusatus aut a se constitutum aut a iudice datum semper habere debet advocatum.

§ 3. In iudicio contentioso, si agatur de minoribus aut de iudicio in quo bonum publicum vertitur, exceptis causis matrimonialibus, iudex parti carenti defensorem ex officio constituat.

Can. 1482 – § 1. Unicum sibi quisque potest constituere procuratorem, qui nequit alium sibimet substituere, nisi expressa facultas eidem facta fuerit.

§ 2. Quod si tamen, iusta causa suadente, plures ab eodem constituantur, hi ita designentur, ut detur inter ipsos locus praeventioni.

§ 3. Advocati autem plures simul constitui queunt.

Can. 1483 – Procurator et advocatus esse debent aetate maiores et bonae famae; advocatus debet praeterea esse catholicus, nisi Episcopus dioecesanus aliter permittat, et doctor in iure canonico, vel alioquin vere peritus et ab eodem Episcopo approbatus.

Can. 1484 – § 1. Procurator et advocatus antequam munus suscipiant, mandatum authenticum apud tribunal deponere debent.

§ 2. Ad iuris tamen extinctionem impediendam iudex potest procuratorem admittere etiam non exhibito mandato, praestita, si res ferat, idonea cautione; actus autem qualibet vi caret, si intra terminum peremptorium a iudice statuendum, procurator mandatum rite non exhibeat.

Кан. 1484 – § 1. Перад тым, як пачаць выконваць сваё заданне, прадстаўнік і адвакат павінны прадставіць у трыбунал арыгінал свайго ўпаўнаважання.

§ 2. Аднак, каб прадухіліць спыненне якога-небудзь правамоцтва, суддзя можа дапусціць прадстаўніка нават без прадстаўлення ўпаўнаважання, пасля ўнясення — пры неабходнасці — адпаведнага залогу; пры гэтым дзеянне будзе пазбаўлена ўсякай моцы, калі на працягу ўстаноўленага суддзёй неаднаўляльнага тэрміну прадстаўнік не прадставіць належным чынам сваё ўпаўнаважанне.

Can. 1485 – Nisi speciale mandatum habuerit, procurator non potest valide renuntiare actioni, instantiae vel actis iudicialibus, nec transigere, pacisci, compromittere in arbitros et generatim ea agere pro quibus ius requirit mandatum speciale.

Кан. 1485 – Без спецыяльнага ўпаўнаважання прадстаўнік не можа дзейсна адмаўляцца ад позвы, хадайніцтва або працэсуальнага дзеяння, а таксама не можа ісці на ўступку, заключаць дамоўленасць ці згаджацца на кампраміс праз пасрэдніцтва арбітраў і наогул выконваць дзеянні, для якіх права патрабуе спецыяльнага ўпаўнаважання.

Can. 1486 – § 1. Ut procuratoris vel advocati remotio effectum sortiatur, necesse est ipsis intimetur, et, si lis iam contestata fuerit, iudex et adversa pars certiores facti sint de remotione.

§ 2. Lata definitiva sententia, ius et officium appellandi, si mandans non renuat, procuratori manet.

Кан. 1486 – § 1. Для таго, каб звальненне прадстаўніка ці адваката было выніковым, яны павінны быць аб гэтым паведамлены, а калі судовая спрэчка ўжо была пачата, аб іх звальненні павінны быць таксама паведамлены суддзя і супраціўны бок.

§ 2. Пасля вынясення канчатковага прысуду права і абавязак падаваць апеляцыю належыць прадстаўніку, калі гэтаму не пярэчыць асоба, якая ўпаўнаважвае.

Can. 1487 – Tum procurator tum advocatus possunt a iudice, dato decreto, repelli sive ex officio sive ad instantiam partis, gravi tamen de causa.

Кан. 1487 – Як прадстаўнік, так і адвакат могуць быць адхілены дэкрэтам суддзі, выдадзеным або на моцы пасады, або згодна з хадайніцтвам боку, аднак толькі па важкай прычыне.

Can. 1488 – § 1. Vetatur uterque emere litem, aut sibi de immodico

Кан. 1488 – § 1. Абодвум забараняецца выкупаць спрэчку або дамаўляцца для

сябе аб празмерна высокай узнагародзе ці якой-небудзь частцы прадмета спрэчкі. Калі яны здзейсняць што-небудзь падобнае, дамоўленасць будзе нядзейснай, а суддзя можа налажыць на іх грашовую кару. Акрамя таго, адвакат можа быць адхілены ад выконвання задання, а нават — калі ён дапусціць рэцыдыў — біскуп, які ўзначальвае трыбунал, можа выдаліць яго з лічбы адвакатаў.

§ 2. Такім самым чынам могуць быць пакараны адвакаты і прадстаўнікі, якія ў абыход закона пераносяць справы з кампетэнтных трыбуналаў, каб яны былі з большай карысцю разгледжаны ў іншых трыбуналах.

Кан. 1489 – Адвакаты і прадстаўнікі, якія зганьбілі свае пасады дзеля падарункаў, абяцанняў або з якіх-небудзь іншых прычын, павінны быць адхілены ад задання абароны і пакараны грашовым штрафам або іншымі адпаведнымі пакараннямі.

Кан. 1490 – У кожным трыбунале — калі гэта будзе магчыма — павінны быць устаноўлены пастаянныя абаронцы, якія атрымліваюць узнагароджанне ад самога трыбунала, каб яны ажыццяўлялі заданне адваката ці прадстаўніка, перадусім у сужэнскіх справах, на карысць бакоў, якія пажадаюць іх вызначыць.

emolumento vel rei litigiosae parte vindicata pacisci. Quae si fecerint, nulla est pactio, et a iudice poterunt poena pecuniaria mulctari. Advocatus praeterea tum ab officio suspendi, tum etiam, si recidivus sit, ab Episcopo, qui tribunali praeest, ex albo advocatorum expungi potest.

§ 2. Eodem modo puniri possunt advocati et procuratores qui a competentibus tribunalibus causas, in fraudem legis, subtrahunt ut ab aliis favorabilius definiantur.

Can. 1489 – Advocati ac procuratores qui ob dona aut pollicitationes aut quamlibet aliam rationem suum officium prodiderint, a patrocinio exercendo suspendantur, et mulcta pecuniaria aliisve congruis poenis plectantur.

Can. 1490 – In unoquoque tribunali, quatenus fieri possit, stabiles patroni constituantur, ab ipso tribunali stipendium recipientes, qui munus advocati vel procuratoris in causis praesertim matrimonialibus pro partibus quae eos seligere malint, exerceant.

TITULUS V
DE ACTIONIBUS ET EXCEPTIONIBUS

Caput I
De actionibus et exceptionibus in genere

Can. 1491 – Quodlibet ius non solum actione munitur, nisi aliud expresse cautum sit, sed etiam exceptione.

Can. 1492 – § 1. Quaevis actio extinguitur praescriptione ad normam iuris aliove legitimo modo, exceptis actionibus de statu personarum, quae numquam extinguuntur.

§ 2. Exceptio, salvo praescripto can. 1462, semper competit et est suapte natura perpetua.

Can. 1493 – Actor pluribus simul actionibus, quae tamen inter se non confligant, sive de eadem re sive de diversis, aliquem convenire potest, si aditi tribunalis competentiam non egrediantur.

Can. 1494 – § 1. Pars conventa potest coram eodem iudice in eodem iudicio contra actorem vel propter causae nexum cum actione principali vel ad submovendam vel ad minuendam actoris petitionem, actionem reconventionalem instituere.

§ 2. Reconventio reconventionis non admittitur.

Can. 1495 – Actio reconventionalis proponenda est iudici coram quo actio prior instituta est, licet ad unam causam dumtaxat delegato vel alioquin relative incompetenti.

ТЫТУЛ V
ПОЗВЫ І ПЯРЭЧАННІ

Раздзел I
Позвы і пярэчанні наогул

Кан. 1491 – Кожнае права можа быць абаронена не толькі позвай, але і пярэчаннем, калі іншае не прадугледжана выразна.

Кан. 1492 – § 1. Кожная позва траціць моц на падставе наступлення даўнасці згодна з нормамі права або іншым легітымным спосабам, за выключэннем позваў, якія датычаць стану асобаў, такія позвы ніколі не трацяць моц.

§ 2. Захоўваючы прадпісанне кан. 1462, права на пярэчанне існуе заўсёды і па сваёй прыродзе з'яўляецца пастаянным.

Кан. 1493 – Пазоўнік можа адначасова выклікаць каго-небудзь некалькімі позвамі, несупярэчнымі паміж сабой, якія датычаць адной і той самай справы або розных спраў, калі яны не выходзяць за межы кампетэнцыі трыбунала, да якога ён звяртаецца.

Кан. 1494 – § 1. Адказчык можа звярнуцца да таго самага суддзі ў тым самым судовым працэсе з сустрэчнай позвай супраць пазоўніка — або на падставе сувязі справы з асноўнай позвай, або з мэтай адхілення ці памяншэння патрабаванняў пазоўніка.

§ 2. Сустрэчная позва супраць сустрэчнай позвы не дапускаецца.

Кан. 1495 – Сустрэчная позва павінна быць скіравана таму суддзі, якому была скіравана першая позва, нават калі ён дэлегаваны толькі для адной справы або на іншай падставе мае адносную адсутнасць кампетэнцыі.

Раздзел II

Асобныя позвы і пярэчанні

Caput II

De actionibus et exceptionibus in specie

Кан. 1496 – § 1. Той, хто прынамсі праўдападобнымі аргументамі дакажа, што мае права на акрэсленую рэч, якая знаходзіцца ў іншай асобы, і што яму можа быць прычынена шкода, калі гэтая рэч не будзе перададзена на захоўванне, мае права на налажэнне суддзёй арышту на гэтую рэч.

§ 2. У падобных абставінах можа быць атрымана забарона, каб якая-небудзь асоба не магла ажыццяўляць акрэсленае правамоцтва.

Can. 1496 – § 1. Qui probabilibus saltem argumentis ostenderit super aliqua re ab alio detenta ius se habere, sibique damnum imminere nisi res ipsa custodienda tradatur, ius habet obtinendi a iudice eiusdem rei sequestrationem.

§ 2. In similibus rerum adiunctis obtinere potest, ut iuris exercitium alicui inhibeatur.

Кан. 1497 – § 1. Налажэнне арышту на рэчы дапускаецца таксама для забеспячэння пазыкі, калі толькі існуе дастатковая ўпэўненасць у праве асобы, якая дала пазыку.

§ 2. Арышт можа быць наложаны таксама на рэчы даўжніка, якія на любой падставе знаходзяцца ў іншых асобаў, і на тое, што даўжнік пазычыў іншым асобам.

Can. 1497 – § 1. Ad crediti quoque securitatem sequestratio rei admittitur, dummodo de creditoris iure satis constet.

§ 2. Sequestratio extendi potest etiam ad res debitoris quae quolibet titulo apud alias personas reperiantur, et ad debitoris credita.

Кан. 1498 – Ніколі нельга накладаць арышт на рэчы і забараняць ажыццяўленне правамоцтва, калі шкода, якая пагражае, можа быць устаронена іншым чынам і прапануецца адпаведны залог для магчымага выпраўлення.

Can. 1498 – Sequestratio rei et inhibitio exercitii iuris decerni nullatenus possunt, si damnum quod timetur possit aliter reparari et idonea cautio de eo reparando offeratur.

Кан. 1499 – Ад асобы, на карысць якой быў наложаны арышт на рэчы або забаронена ажыццяўленне правамоцтва, суддзя можа запатрабаваць унясення папярэдняга залогу на выпадак прычынення шкоды, калі гэтая асоба не дакажа сваё права.

Can. 1499 – Iudex potest ei, cui sequestrationem rei vel inhibitionem exercitii iuris concedit, praeviam imponere cautionem de damnis, si ius suum non probaverit, resarciendis.

Кан. 1500 – У тым, што адносіцца да сутнасці і моцы позвы, якая датычыць валодання, павінны быць захаваны прадпісанні дзяржаўнага права таго месца, дзе знаходзіцца рэч, пра валоданне якой ідзе гаворка.

Can. 1500 – Ad naturam et vim actionis possessoriae quod attinet, serventur praescripta iuris civilis loci ubi sita est res de cuius possessione agitur.

PARS II

DE IUDICIO CONTENTIOSO

SECTIO I

DE IUDICIO CONTENTIOSO ORDINARIO

TITULUS I

DE CAUSAE INTRODUCTIONE

Caput I

De libello litis introductorio

Can. 1501 – Iudex nullam causam cognoscere potest, nisi petitio, ad normam canonum, proposita sit ab eo cuius interest, vel a promotore iustitiae.

Can. 1502 – Qui aliquem convenire vult, debet libellum competenti iudici exhibere, in quo controversiae obiectum proponatur, et ministerium iudicis expostuletur.

Can. 1503 – § 1. Petitionem oralem iudex admittere potest, quoties vel actor libellum exhibere impediatur vel causa sit facilis investigationis et minoris momenti.

§ 2. In utroque tamen casu iudex notarium iubeat scriptis actum redigere qui actori legendus est et ab eo probandus, quique locum tenet libelli ab actore scripti ad omnes iuris effectus.

Can. 1504 – Libellus, quo lis introducitur, debet:

1° exprimere coram quo iudice causa introducatur, quid petatur et a quo petatur;

ЧАСТКА II

СПРЭЧНЫ СУДОВЫ ПРАЦЭС

СЕКЦЫЯ I

ЗВЫЧАЙНЫ СПРЭЧНЫ СУДОВЫ ПРАЦЭС

ТЫТУЛ I

УНЯСЕННЕ СПРАВЫ

Раздзел I

Пазоўная заява, якой уносіцца спрэчная справа

Кан. 1501 – Суддзя не можа прыняць на разгляд ніякую справу, калі зацікаўленая асоба або прамотар справядлівасці не звернуцца да яго з просьбай згодна з нормамі канонаў.

Кан. 1502 – Той, хто жадае выклікаць каго-небудзь, павінен, просячы аб паслузе правасуддзя, звярнуцца да кампетэнтнага суддзі з пазоўнай заявай, у якой павінен быць прадстаўлены прадмет спрэчкі.

Кан. 1503 – § 1. Суддзя можа прыняць вусную просьбу, калі пазоўнік мае перашкоду ў звароце з пазоўнай заявай або справа не выклікае цяжкасці ў даследаванні і з'яўляецца менш значнай.

§ 2. Аднак у абодвух выпадках суддзя павінен распарадзіцца, каб натарыусам быў складзены пісьмовы акт, які павінен быць прачытаны пазоўніку і ім пацверджаны; гэты акт замяняе пазоўную заяву, напісаную пазоўнікам, ва ўсім, што датычыць прававых наступстваў.

Кан. 1504 – Пазоўная заява, якой уносіцца спрэчная справа, павінна:

1° удакладняць, якому суддзі ўносіцца справа, што і ад каго патрабуецца;

2° указваць права, на якім абапіраецца пазоўнік, і прынамсі агульна змяшчаць факты і доказы, на якіх грунтуюцца патрабаванні;

3° быць падпісана пазоўнікам ці яго прадстаўніком з указаннем дня, месяца і года, а таксама месца жыхарства пазоўніка ці яго прадстаўніка або месца знаходжання, указанае імі для атрымання актаў;

4° указваць пастаяннае або часовае месца жыхарства адказчыка.

Кан. 1505 – § 1. Пасля таго, як аднаасобны суддзя або старшыня калегіяльнага трыбунала высветліць, што справа знаходзіцца ў яго кампетэнцыі і пазоўнік не з'яўляецца асобай, легітымна пазбаўленай здольнасці выступаць у судзе ў якасці боку, павінен як мага хутчэй або прыняць пазоўную заяву сваім дэкрэтам, або яе адхіліць.

§ 2. Пазоўная заява можа быць адхілена толькі тады:

1° калі ў суддзі або трыбунала адсутнічае кампетэнцыя;

2° калі несумненна вядома, што пазоўнік з'яўляецца асобай, легітымна пазбаўленай здольнасці выступаць у судзе ў якасці боку;

3° калі не былі захаваны прадпісанні кан. 1504, 1°–3°;

4° калі з самой пазоўнай заявы ясна вынікае, што патрабаванні пазбаўлены ўсякай падставы і не можа здарыцца, што якая-небудзь падстава ўзнікне падчас працэсу.

§ 3. Калі пазоўная заява была адхілена з прычыны заган, якія могуць быць выпраўлены, пазоўнік можа зноў звярнуцца да таго самага суддзі з новай, напісанай належным чынам пазоўнай заявай.

2° indicare quo iure innitatur actor et generatim saltem quibus factis et probationibus ad evincenda ea quae asseruntur;

3° subscribi ab actore vel eius procuratore, appositis die, mense et anno, necnon loco in quo actor vel eius procurator habitant, aut residere se dixerint actorum recipiendorum gratia;

4° indicare domicilium vel quasi-domicilium partis conventae.

Can. 1505 – § 1. Iudex unicus vel tribunalis collegialis praeses, postquam viderint et rem esse suae competentiae et actori legitimam personam standi in iudicio non deesse, debent suo decreto quam primum libellum aut admittere aut reicere.

§ 2. Libellus reici potest tantum:

1° si iudex vel tribunal incompetens sit;

2° si sine dubio constet actori legitimam deesse personam standi in iudicio;

3° si non servata sint praescripta can. 1504, nn. 1-3;

4° si certo pateat ex ipso libello petitionem quolibet carere fundamento, neque fieri posse, ut aliquod ex processu fundamentum appareat.

§ 3. Si libellus reiectus fuerit ob vitia quae emendari possunt, actor novum libellum rite confectum potest eidem iudici denuo exhibere.

§ 4. Adversus libelli reiectionem integrum semper est parti intra tempus utile decem dierum recursum rationibus suffultum interponere vel ad tribunal appellationis vel ad collegium, si libellus reiectus fuerit a praeside; quaestio autem reiectionis expeditissime definienda est.

Can. 1506 – Si iudex intra mensem ab exhibito libello decretum non ediderit, quo libellum admittit vel reicit ad normam can. 1505, pars, cuius interest, instare potest ut iudex suo munere fungatur; quod si nihilominus iudex sileat, inutiliter lapsis decem diebus a facta instantia, libellus pro admisso habeatur.

§ 4. Бок заўсёды мае поўнае права скіраваць на працягу дзесяці карысных дзён абгрунтаваны рэкурс супраць адхілення пазоўнай заявы або ў апеляцыйны трыбунал, або ў калегію, калі пазоўная заява была адхілена старшынёй; пытанне адхілення павінна быць разгледжана як мага хутчэй.

Кан. 1506 – Калі на працягу месяца ад дня звароту з пазоўнай заявай суддзя не выдасць дэкрэта, якім або прымае, або адхіляе пазоўную заяву згодна з нормай кан. 1505, зацікаўлены бок можа хадайнічаць, каб суддзя выканаў сваё заданне; калі, нягледзячы на гэта, суддзя маўчыць, то пазоўная заява лічыцца прынятай пасля таго, як безвынікова міне дзесяць дзён ад дня скіравання хадайніцтва.

Caput II

De citatione et denuntiatione actorum iudicialium

Can. 1507 – § 1. In decreto, quo actoris libellus admittitur, debet iudex vel praeses ceteras partes in iudicium vocare seu citare ad litem contestandam, statuens utrum eae scripto respondere debeant an coram ipso se sistere ad dubia concordanda. Quod si ex scriptis responsionibus perspiciat necessitatem partes convocandi, id potest novo decreto statuere.

§ 2. Si libellus pro admisso habetur ad normam can. 1506, decretum citationis in iudicium fieri debet intra viginti dies a facta instantia, de qua in eo canone.

§ 3. Quod si partes litigantes de facto coram iudice se sistant

Раздзел II

Выклік у суд і паведамленні аб працэсуальных дзеяннях

Кан. 1507 – § 1. У дэкрэце, якім прымаецца пазоўная заява пазоўніка, суддзя або старшыня павінен запрасіць, іншымі словамі — выклікаць у суд іншыя бакі для пачатку судовай спрэчкі, вызначаючы: павінны яны адказаць пісьмова ці прыбыць да яго з мэтай вырашэння сумненняў. Калі з пісьмовых адказаў будзе вынікаць неабходнасць выклікаць бакі, гэта можа быць пастаноўлена новым дэкрэтам.

§ 2. Калі пазоўная заява лічыцца прынятай згодна з нормай кан. 1506, дэкрэт аб выкліку ў суд павінен быць выдадзены на працягу дваццаці дзён ад дня скіравання хадайніцтва, аб якім гаворыцца ў гэтым каноне.

§ 3. Калі працэсуальныя бакі фактычна прыбылі да суддзі для ўдзелу ў працэсе,

няма патрэбы іх выклікаць, але натарыус павінен зрабіць у актах запіс аб тым, што бакі былі на судовым працэсе.

Кан. 1508 – § 1. Аб дэкрэце, якім здзяйсняецца выклік у суд, павінен быць неадкладна паведамлены адказчык, а таксама ўсе іншыя асобы, якія павінны з'явіцца.

§ 2. Да выкліку ў суд павінна быць далучана пазоўная заява, калі суддзя па важкіх прычынах не вырашыць, што пазоўная заява не павінна перадавацца боку, пакуль ён не дасць паказанні ў судзе.

§ 3. Калі адказчыкам у спрэчцы з'яўляецца асоба, пазбаўленая свабоднага карыстання сваімі правамоцтвамі або свабоднага адміністравання рэчамі, якіх датычыць спрэчка, то выклік у суд павінен быць скіраваны — у залежнасці ад абставінаў — апекуну, папячыцелю, спецыяльнаму прадстаўніку, іншымі словамі — таму, хто, згодна з нормамі права, павінен ад яго імя ўзяць на сябе ўдзел у судовым працэсе.

Кан. 1509 – § 1. Паведамленні аб выкліку ў суд, дэкрэтах, прысудах і іншых працэсуальных дзеяннях павінны быць здзейснены з дапамогай пошты або іншым надзейным спосабам, захоўваючы нормы, устаноўленыя партыкулярным правам.

§ 2. Аб факце паведамлення і аб тым, якім спосабам яно было зроблена, павінен быць зроблены запіс у актах.

Кан. 1510 – Адказчык, які адмаўляецца прыняць пісьмовае паведамленне аб выкліку ў суд або перашкаджае таму, каб выклік у суд мог да яго дайсці, лічыцца легітымна выкліканым.

Кан. 1511 – Калі аб выкліку ў суд не было легітымна паведамлена, акты працэсу з'яўляюцца нядзейснымі, захоўваючы прадпісанне кан. 1507 § 3.

ad causam agendam, opus non est citatione, sed actuarius significet in actis partes iudicio adfuisse.

Can. 1508 – § 1. Decretum citationis in iudicium debet statim parti conventae notificari, et simul ceteris, qui comparere debent, notum fieri.

§ 2. Citationi libellus litis introductorius adiungatur, nisi iudex propter graves causas censeat libellum significandum non esse parti, antequam haec deposuerit in iudicio.

§ 3. Si lis moveatur adversus eum qui non habet liberum exercitium suorum iurium, vel liberam administrationem rerum de quibus disceptatur, citatio denuntianda est, prout casus ferat, tutori, curatori, procuratori speciali, seu ei qui ipsius nomine iudicium suscipere tenetur ad normam iuris.

Can. 1509 – § 1. Citationum, decretorum, sententiarum aliorumque iudicialium actorum notificatio facienda est per publicos tabellarios vel alio modo qui tutissimus sit, servatis normis lege particulari statutis.

§ 2. De facto notificationis et de eius modo constare debet in actis.

Can. 1510 – Conventus, qui citatoriam schedam recipere recuset, vel qui impedit quominus citatio ad se perveniat, legitime citatus habeatur.

Can. 1511 – Si citatio non fuerit legitime notificata, nulla sunt acta processus, salvo praescripto can. 1507, § 3.

Can. 1512 – Cum citatio legitime notificata fuerit aut partes coram iudice steterint ad causam agendam:

1° res desinit esse integra;

2° causa fit propria illius iudicis aut tribunalis ceteroquin competentis, coram quo actio instituta est;

3° in iudice delegato firma redditur iurisdictio, ita ut non expiret resoluto iure delegantis;

4° interrumpitur praescriptio, nisi aliud cautum sit;

5° lis pendere incipit; et ideo statim locum habet principium «lite pendente, nihil innovetur».

Кан. 1512 – Калі адбылося легітымнае паведамленне аб выкліку або бакі прыбылі да суддзі для ўдзелу ў працэсе:

1° рэч перастае быць бясспрэчнай;

2° справа пачынае належаць таму суддзі або трыбуналу, кампетэнтнаму на якой-небудзь падставе, якому позва была скіравана;

3° юрысдыкцыя дэлегаванага суддзі ўмацоўваецца такім чынам, што не спыняецца са спыненнем права таго, хто дэлегаваў;

4° перарываецца даўнасць, калі не прадугледжана іншае;

5° пачынаецца судовая спрэчка, таму адразу пачынае абавязваць правіла, што падчас спрэчкі не могуць быць здзейснены ніякія змены.

TITULUS II
DE LITIS CONTESTATIONE

ТЫТУЛ II
ПАЧАТАК СУДОВАЙ СПРЭЧКІ

Can. 1513 – § 1. Contestatio litis habetur cum per iudicis decretum controversiae termini, ex partium petitionibus et responsionibus desumpti, definiuntur.

§ 2. Partium petitiones responsionesque, praeterquam in libello litis introductorio, possunt vel in responsione ad citationem exprimi vel in declarationibus ore coram iudice factis; in causis autem difficilioribus partes convocandae sunt a iudice ad dubium vel dubia concordanda, quibus in sententia respondendum sit.

§ 3. Decretum iudicis partibus notificandum est; quae nisi iam consenserint, possunt intra decem dies ad ipsum iudicem recurrere, ut mu-

Кан. 1513 – § 1. Пачатак судовай спрэчкі адбываецца тады, калі дэкрэтам суддзі вызначаюцца межы спрэчкі, акрэсленыя на падставе патрабаванняў і пярэчанняў бакоў.

§ 2. Патрабаванні і пярэчанні бакоў, акрамя таго, што могуць быць змешчаны ў пазоўнай заяве, могуць таксама быць змешчаны або ў адказе на выклік у суд, альбо ў вусных паказаннях, дадзеных перад суддзёй; у больш складаных справах бакі павінны быць выкліканы суддзёй для ўзгаднення аднаго ці некалькіх спрэчных пытанняў, якія павінны быць вырашаны ў прысудзе.

§ 3. Бакі павінны быць паведамлены аб дэкрэце суддзі; калі яны не згадзіліся з дэкрэтам раней, могуць на працягу дзесяці дзён звярнуцца да таго самага суддзі

з просьбай аб унясенні змяненняў; гэтае пытанне павінна быць вырашана як мага хутчэй дэкрэтам таго ж суддзі.

Кан. 1514 – Межы спрэчкі, адзін раз устаноўленыя, не могуць быць дзейсна зменены, калі не новым дэкрэтам па важкай прычыне па хадайніцтве боку і пасля таго, як іншыя бакі будуць выслуханы, а іх довады — узважаны.

Кан. 1515 – Пасля пачатку судовай спрэчкі асоба, якая валодае чужой рэччу, перастае быць добрасумленнай; таму, калі будзе прысуджана вяртанне рэчы, павінны быць вернуты таксама даходы, атрыманыя ад дня пачатку судовай спрэчкі, і выпраўлена шкода.

Кан. 1516 – Пасля пачатку судовай спрэчкі суддзя павінен вызначыць бакам адпаведны тэрмін на прадстаўленне і збіранне доказаў.

tetur; quaestio autem expeditissime ipsius iudicis decreto dirimenda est.

Can. 1514 – Controversiae termini semel statuti mutari valide nequeunt, nisi novo decreto, ex gravi causa, ad instantiam partis et auditis reliquis partibus earumque rationibus perpensis.

Can. 1515 – Lite contestata, possessor rei alienae desinit esse bonae fidei; ideoque, si damnatur ut rem restituat, fructus quoque a contestationis die reddere debet et damna sarcire.

Can. 1516 – Lite contestata, iudex congruum tempus partibus praestituat probationibus proponendis et explendis.

ТЫТУЛ III
ІНСТАНЦЫЯ СУДОВАЙ СПРЭЧКІ

Кан. 1517 – Інстанцыя судовай спрэчкі пачынаецца выклікам у суд, а заканчваецца не толькі вынясеннем канчатковага прысуду, але таксама іншымі спосабамі, акрэсленымі правам.

Кан. 1518 – Калі адзін з працэсуальных бакоў памрэ, або зменіць стан, або страціць пасаду, на падставе якой удзельнічаў у якасці боку, то:

1° калі разгляд сутнасці справы яшчэ не быў завершаны, інстанцыя прыпыняецца, пакуль спадкаемца памерлай асобы, або наступнік, або зацікаўленая асоба не ўзновяць спрэчку;

2° калі разгляд сутнасці справы быў завершаны, суддзя павінен праводзіць

TITULUS III
DE LITIS INSTANTIA

Can. 1517 – Instantiae initium fit citatione; finis autem non solum pronuntiatione sententiae definitivae, sed etiam aliis modis iure praefinitis.

Can. 1518 – Si pars litigans moriatur aut statum mutet aut cesset ab officio cuius ratione agit:

1° causa nondum conclusa, instantia suspenditur donec heres defuncti aut successor aut is, cuius intersit, litem resumat;

2° causa conclusa, iudex procedere debet ad ulteriora, citato pro-

curatore, si adsit, secus defuncti herede vel successore.

разгляд справы да канца, выклікаўшы — калі ён ёсць — прадстаўніка, а калі яго няма — спадкаемцу памерлай асобы або наступніка.

Can. 1519 – § 1. Si a munere cesset tutor vel curator vel procurator, qui sit ad normam can. 1481, §§ 1 et 3 necessarius, instantia interim suspenditur.

Кан. 1519 – § 1. Калі скасоўваецца заданне апекуна, папячыцеля ці прадстаўніка, якое згодна з нормамі кан. 1481 § 1 і 3 з'яўляецца неабходным, інстанцыя часова прыпыняецца.

§ 2. Alium autem tutorem vel curatorem iudex quam primum constituat; procuratorem vero ad litem constituere potest, si pars neglexerit intra brevem terminum ab ipso iudice statutum.

§ 2. Суддзя павінен як мага хутчэй вызначыць іншага апекуна або папячыцеля, а працэсуальны прадстаўнік можа быць вызначаны ў тым выпадку, калі бок не паклапаціўся зрабіць гэта на працягу кароткага тэрміну, устаноўленага тым жа суддзёй.

Can. 1520 – Si nullus actus processualis, nullo obstante impedimento, ponatur a partibus per sex menses, instantia perimitur. Lex particularis alios peremptionis terminos statuere potest.

Кан. 1520 – Інстанцыя спыняецца, калі, пры поўнай адсутнасці перашкодаў, бакі на працягу шасці месяцаў не выканаюць ніякага працэсуальнага дзеяння. Партыкулярны закон можа ўстанаўліваць іншыя тэрміны для яе спынення.

Can. 1521 – Peremptio obtinet ipso iure et adversus omnes, minores quoque aliosve minoribus aequiparatos, atque etiam ex officio declarari debet, salvo iure petendi indemnitatem adversus tutores, curatores, administratores, procuratores, qui culpa se caruisse non probaverint.

Кан. 1521 – Спыненне адбываецца на моцы самога права і прымяняецца да ўсіх, у тым ліку непаўналетніх, і тых, хто да іх прыраўнаваны; гэта таксама павінна быць сцверджана на моцы пасады, захоўваючы права на патрабаванне кампенсацыі ад апекуноў, папячыцеляў, адміністратараў і прадстаўнікоў, якія не змогуць даказаць сваёй невінаватасці.

Can. 1522 – Peremptio exstinguit acta processus, non vero acta causae; immo haec vim habere possunt etiam in alia instantia, dummodo causa inter easdem personas et super eadem re intercedat; sed ad extraneos quod attinet, non aliam vim obtinent nisi documentorum.

Кан. 1522 – Спыненне касуе акты працэсу, але не акты справы; больш за тое, яны могуць мець моц у іншай інстанцыі, калі толькі працэс будзе адбывацца паміж тымі самымі асобамі і ў дачыненні да таго самага прадмета; але для іншых асобаў гэтыя акты маюць моц толькі ў якасці дакументаў.

Кан. 1523 – Панесеныя кожным з бакоў выдаткі, звязаныя з судовым працэсам, які быў спынены, павінны быць аднесены на кошт самога боку.

Кан. 1524 – § 1. На любой стадыі або ступені судовага працэсу пазоўнік можа адмовіцца ад інстанцыі; падобным чынам, як пазоўнік, так і адказчык могуць адмовіцца ад актаў працэсу — ад усіх або ад некаторых.

§ 2. Для таго, каб апекуны і адміністратары юрыдычных асобаў маглі адмовіцца ад інстанцыі, ім неабходны парада або згода тых асобаў, чый удзел патрабуецца для здзяйснення дзеянняў, якія выходзяць за межы звычайнага адміністравання.

§ 3. Для таго, каб адмова была дзейснай, яна павінна быць складзена пісьмова і падпісана бокам або яго прадстаўніком, які, аднак, павінен мець спецыяльнае ўпаўнаважанне; пры гэтым аб адмове павінен быць паведамлены другі бок, які павінен згадзіцца з ёю або прынамсі не аспрэчваць, а таксама яе павінен дапусціць суддзя.

Кан. 1525 – Дапушчаная суддзёй адмова выклікае ў адносінах да актаў, ад якіх адмовіліся, тыя ж наступствы, што і спыненне інстанцыі, а таксама абавязвае таго, хто адмаўляецца, да аплаты выдаткаў, звязаных з актамі, ад якіх ён адмовіўся.

Can. 1523 – Perempti iudicii expensas, quas quisque ex litigantibus fecerit, ipse ferat.

Can. 1524 – § 1. In quolibet statu et gradu iudicii potest actor instantiae renuntiare; item tum actor tum pars conventa possunt processus actis renuntiare sive omnibus sive nonnullis tantum.

§ 2. Tutores et administratores personarum iuridicarum, ut renuntiare possint instantiae, egent consilio vel consensu eorum, quorum concursus requiritur ad ponendos actus, qui ordinariae administrationis fines excedunt.

§ 3. Renuntiatio, ut valeat, peragenda est scripto, eademque a parte vel ab eius procuratore, speciali tamen mandato munito, debet subscribi, cum altera parte communicari, ab eaque acceptari vel saltem non impugnari, et a iudice admitti.

Can. 1525 – Renuntiatio a iudice admissa, pro actis quibus renuntiatum est, eosdem parit effectus ac peremptio instantiae, itemque obligat renuntiantem ad solvendas expensas actorum, quibus renuntiatum fuit.

ТЫТУЛ IV
ДОКАЗЫ

Кан. 1526 – § 1. Абавязак даказвання ўскладаецца на таго, хто што-небудзь сцвярджае.

§ 2. Не патрабуе доказу:

1° тое, аб чым мяркуецца ў самім законе;

TITULUS IV
DE PROBATIONIBUS

Can. 1526 – § 1. Onus probandi incumbit ei qui asserit.

§ 2. Non indigent probatione:

1° quae ab ipsa lege praesumuntur;

2° facta ab uno ex contendentibus asserta et ab altero admissa, nisi iure vel a iudice probatio nihilominus exigatur.

2° факты, якія сцвердзіў адзін з удзельнікаў спрэчкі і якія былі дапушчаны другім удзельнікам, калі доказ не патрабуецца правам або суддзёй.

Can. 1527 – § 1. Probationes cuiuslibet generis, quae ad causam cognoscendam utiles videantur et sint licitae, adduci possunt.

§ 2. Si pars instet ut probatio a iudice reiecta admittatur, ipse iudex rem expeditissime definiat.

Кан. 1527 – § 1. Могуць быць прадстаўлены любыя доказы, якія ўяўляюцца карыснымі для разгляду справы і з'яўляюцца дазволенымі.

§ 2. Калі бок хадайнічае аб дапушчэнні доказу, які быў адхілены суддзёй, сам суддзя павінен як мага хутчэй вырашыць гэтае пытанне.

Can. 1528 – Si pars vel testis se sistere ad respondendum coram iudice renuant, licet eos audire etiam per laicum a iudice designatum aut requirere eorum declarationem coram publico notario vel quovis alio legitimo modo.

Кан. 1528 – Калі бок або сведка адмаўляюцца прыбыць да суддзі, каб даць паказанні, іх можа выслухаць вызначаны суддзёй свецкі вернік, або можна патрабаваць, каб паказанні былі дадзены перад свецкім натарыусам ці якім-небудзь іншым легітымным чынам.

Can. 1529 – Iudex ad probationes colligendas ne procedat ante litis contestationem nisi ob gravem causam.

Кан. 1529 – Суддзя не павінен прыступаць да збірання доказаў перад пачаткам судовай спрэчкі, калі не па важкай прычыне.

Caput I
De partium declarationibus

Раздзел I
Паказанні бакоў

Can. 1530 – Iudex ad veritatem aptius eruendam partes interrogare semper potest, immo debet, ad instantiam partis vel ad probandum factum quod publice interest extra dubium poni.

Кан. 1530 – Для таго, каб больш паспяхова даведацца аб праўдзе, суддзя заўсёды можа дапытаць бакі; больш за тое, ён павінен гэта зрабіць у адказ на хадайніцтва аднаго з бакоў або з мэтай даказвання факта, у дачыненні да якога з увагі на публічную значнасць павінны быць выключаны сумненні.

Can. 1531 – § 1. Pars legitime interrogata respondere debet et veritatem integre fateri.

§ 2. Quod si respondere recusaverit, iudicis est aestimare quid ad factorum probationem exinde erui possit.

Кан. 1531 – § 1. Легітымна дапытваны бок мае абавязак адказваць і поўнасцю прадставіць праўду.

§ 2. Калі бок адмовіцца адказваць, да суддзі належыць ацэнка таго, якое значэнне гэта можа мець для даказвання фактаў.

Кан. 1532 – У выпадках, калі справа датычыць публічнага дабра і калі важкая прычына не схіліць да іншага, суддзя павінен прывесці бакі да прысягі ў тым, што яны будуць гаварыць праўду або, прынамсі, што сказанае было праўдай; у іншых выпадках суддзя можа паступіць у адпаведнасці са сваёй разважлівасцю.

Can. 1532 – In casibus, in quibus bonum publicum in causa est, iudex partibus iusiurandum de veritate dicenda aut saltem de veritate dictorum deferat, nisi gravis causa aliud suadeat; in aliis casibus, potest pro sua prudentia.

Кан. 1533 – Бакі, прамотар справядлівасці і абаронца повязі могуць прадставіць суддзі пытанні, адносна якіх бок павінен быць дапытаны.

Can. 1533 – Partes, promotor iustitiae et defensor vinculi possunt iudici exhibere articulos, super quibus pars interrogetur.

Кан. 1534 – У дачыненні да допыту бакоў павінна прапарцыянальна захоўвацца тое, што пастаноўлена адносна сведкаў у кан. 1548 § 2, 1°, 1552 і 1558–1565.

Can. 1534 – Circa partium interrogationem cum proportione serventur, quae in cann. 1548, § 2, n. 1, 1552 et 1558-1565 de testibus statuuntur.

Кан. 1535 – Пісьмовае ці вуснае сцвярджанне перад кампетэнтным суддзёй аб якім-небудзь факце, якое датычыць самой сутнасці судовага працэсу, зробленае з уласнай волі або ў адказ на пытанне суддзі і скіраванае супраць самога боку, з'яўляецца судовым прызнаннем.

Can. 1535 – Assertio de aliquo facto, scripto vel ore, coram iudice competenti, ab aliqua parte circa ipsam iudicii materiam, sive sponte sive iudice interrogante, contra se peracta, est confessio iudicialis.

Кан. 1536 – § 1. Калі гаворка ідзе пра якое-небудзь прыватнае пытанне і справа не датычыць публічнага дабра, судовае прызнанне аднаго боку вызваляе іншыя бакі ад абавязку даказвання.

Can. 1536 – § 1. Confessio iudicialis unius partis, si agatur de negotio aliquo privato et in causa non sit bonum publicum, ceteras relevat ab onere probandi.

§ 2. У сваю чаргу, у справах, якія закранаюць публічнае дабро, судовае прызнанне і сцверджанні бакоў, якія не з'яўляюцца прызнаннямі, могуць мець доказную моц, якую суддзя павінен ацаніць разам з іншымі абставінамі справы, аднак ім не можа быць нададзена моц канчатковага доказу, калі да іх не далучаны іншыя доказы, якія канчаткова іх умацоўваюць.

§ 2. In causis autem quae respiciunt bonum publicum, confessio iudicialis et partium declarationes, quae non sint confessiones, vim probandi habere possunt, a iudice aestimandam una cum ceteris causae adiunctis, at vis plenae probationis ipsis tribui nequit, nisi alia accedant elementa quae eas omnino corroborent.

Кан. 1537 – Што датычыць пазасудовага прызнання, якое прыводзіцца ў судовым працэсе, да суддзі — разгледзеўшы ўсе аб-

Can. 1537 – Quoad extraiudicialem confessionem in iudicium deductam,

iudicis est, perpensis omnibus adiunctis, aestimare quanti ea sit facienda.

Can. 1538 – Confessio vel alia quaevis partis declaratio qualibet vi caret, si constet eam ex errore facti esse prolatam, aut vi vel metu gravi extortam.

ставіны — належыць ацэнка значэння, якое яно можа мець.

Кан. 1538 – Прызнанне або любыя іншыя сцверджанні боку трацяць усякую моц, калі высветліцца, што яны зроблены з прычыны памылкі адносна факта або вымушаны прымусам ці ўздзеяннем моцнага страху.

Caput II

De probatione per documenta

Раздзел II

Даказванне на падставе дакументаў

Can. 1539 – In quolibet iudicii genere admittitur probatio per documenta tum publica tum privata.

Кан. 1539 – У кожным судовым працэсе дапускаецца даказванне на падставе дакументаў — як публічных, так і прыватных.

Art. 1. *De natura et fide documentorum*

Артыкул 1. *Прырода і верагоднасць дакументаў*

Can. 1540 – § 1. Documenta publica ecclesiastica ea sunt, quae persona publica in exercitio sui muneris in Ecclesia confecit, servatis sollemnitatibus iure praescriptis.

§ 2. Documenta publica civilia ea sunt, quae secundum uniuscuiusque loci leges talia iure censentur.

§ 3. Cetera documenta sunt privata.

Кан. 1540 – § 1. Публічнымі касцёльнымі дакументамі з'яўляюцца дакументы, складзеныя публічнай асобай з захаваннем фармальных прадпісанняў права падчас ажыццяўлення свайго задання ў Касцёле.

§ 2. Публічнымі дзяржаўнымі дакументамі з'яўляюцца дакументы, якія права прызнае ў такой якасці ў адпаведнасці з законамі кожнага асобнага месца.

§ 3. Іншыя дакументы з'яўляюцца прыватнымі.

Can. 1541 – Nisi contrariis et evidentibus argumentis aliud evincatur, documenta publica fidem faciunt de omnibus quae directe et principaliter in iis affirmantur.

Кан. 1541 – Калі што-небудзь іншае не будзе вынікаць з супраціўных і відавочных аргументаў, публічныя дакументы маюць верагоднасць ва ўсім, што ў іх непасрэдна і пераважна сцвярджаецца.

Can. 1542 – Documentum privatum, sive agnitum a parte sive recognitum a iudice, eandem probandi vim habet adversus auctorem vel subscriptorem et causam ab iis habentes, ac confessio extra iudicium facta; adversus ex-

Кан. 1542 – Прыватны дакумент, прызнаны бокам або дапушчаны суддзёй, мае такую самую моц доказу, як пазасудовае прызнанне, супраць таго, хто яго склаў або падпісаў, а таксама іх наступнікаў у справе; супраць іншых ён мае такую самую моц, як дадзе-

ныя бакамі паказанні, якія не з'яўляюцца прызнаннем, згодна з нормай кан. 1536 § 2.

Кан. 1543 – Калі будзе выяўлена, што ў дакументах маюцца падчысткі, выпраўленні, устаўкі або іншыя заганы, да суддзі належыць права ацэнкі таго, ці маюць гэтыя дакументы значэнне і якое.

traneos eandem vim habet ac partium declarationes quae non sint confessiones, ad normam can. 1536, § 2.

Can. 1543 – Si abrasa, correcta, interpolata aliove vitio documenta infecta demonstrentur, iudicis est aestimare an et quanti huiusmodi documenta sint facienda.

Артыкул 2. *Прадстаўленне дакументаў*

Кан. 1544 – Дакументы не маюць моцы доказу ў судовым працэсе, калі не ўяўляюць сабой арыгіналы ці завераныя копіі, перададзеныя на захаванне ў канцылярыю суда, каб маглі быць даследаваны суддзёй і супраціўным бокам.

Art. 2. *De productione documentorum*

Can. 1544 – Documenta vim probandi in iudicio non habent, nisi originalia sint aut in exemplari authentico exhibita et penes tribunalis cancellariam deposita, ut a iudice et ab adversario examinari possint.

Кан. 1545 – Суддзя можа распарадзіцца, каб у працэсе быў прадстаўлены дакумент, агульны для абодвух бакоў.

Can. 1545 – Iudex praecipere potest ut documentum utrique parti commune exhibeatur in processu.

Кан. 1546 – § 1. Ніхто не мае абавязку прадстаўляць дакументы, нават агульныя, якія не могуць быць прадстаўлены без небяспекі прычынення шкоды, згодна з нормай кан. 1548 § 2, 2°, або без небяспекі парушэння таямніцы, якая павінна быць захавана.

§ 2. Аднак, калі прынамсі з акрэсленай часткі дакумента можа быць зроблена выпіска і прадстаўлена без згаданых цяжкасцяў, суддзя можа распарадзіцца аб тым, каб яна была зроблена.

Can. 1546 – § 1. Nemo exhibere tenetur documenta, etsi communia, quae communicari nequeunt sine periculo damni ad normam can. 1548, § 2, n. 2 aut sine periculo violationis secreti servandi.

§ 2. Attamen si qua saltem documenti particula describi possit et in exemplari exhiberi sine memoratis incommodis, iudex decernere potest ut eadem producatur.

Раздзел III
Сведкі і паказанні

Caput III
De testibus et attestationibus

Кан. 1547 – Доказ на падставе сведкаў дапускаецца ва ўсіх справах, пад кіраваннем суддзі.

Can. 1547 – Probatio per testes in quibuslibet causis admittitur, sub iudicis moderatione.

Кан. 1548 – § 1. Сведкі павінны гаварыць праўду суддзі, які іх легітымна дапытвае.

Can. 1548 – § 1. Testes iudici legitime interroganti veritatem fateri debent.

§ 2. Salvo praescripto can. 1550, § 2, n. 2, ab obligatione respondendi eximuntur:

1° clerici, quod attinet ad ea quae ipsis manifestata sunt ratione sacri ministerii; civitatum magistratus, medici, obstetrices, advocati, notarii aliique qui ad secretum officii etiam ratione praestiti consilii tenentur, quod attinet ad negotia huic secreto obnoxia;

2° qui ex testificatione sua sibi aut coniugi aut proximis consanguineis vel affinibus infamiam, periculosas vexationes, aliave mala gravia obventura timent.

§ 2. Захоўваючы прадпісанне кан. 1550 § 2, 2°, ад абавязку адказваць вызваляюцца:

1° духоўныя асобы адносна таго, што ім стала вядома на падставе святой паслугі; дзяржаўныя служачыя, урачы, акушэры, адвакаты, натарыусы і іншыя асобы, якія павінны захоўваць службовую таямніцу — таксама на падставе ўдзялення парады — адносна спраў, на якія распаўсюджваецца гэтая таямніца;

2° тыя, хто баіцца, што праз іх сведчанне ім самім, сужэнцам, блізкім родным ці сваякам пагражае ганьба, небяспечны пераслед або іншае цяжкае зло.

Art. 1. *Qui testes esse possunt*

Can. 1549 – Omnes possunt esse testes, nisi expresse iure repellantur vel in totum vel ex parte.

Can. 1550 – § 1. Ne admittantur ad testimonium ferendum minores infra decimum quartum aetatis annum et mente debiles; audiri tamen poterunt ex decreto iudicis, quo id expedire declaretur.

§ 2. Incapaces habentur:

1° qui partes sunt in causa, aut partium nomine in iudicio consistunt, iudex eiusve assistentes, advocatus aliique qui partibus in eadem causa assistunt vel astiterunt;

2° sacerdotes, quod attinet ad ea omnia quae ipsis ex confessione sacramentali innotuerunt, etsi poenitens eorum manifestationem petierit; immo audita a quovis et quoquo modo occasione confessionis, ne ut indicium quidem veritatis recipi possunt.

Артыкул 1. *Хто можа быць сведкам*

Кан. 1549 – Сведкамі могуць быць усе, калі права выразна іх не выключае, поўнасцю або часткова.

Кан. 1550 – § 1. Да дачы паказанняў не павінны быць дапушчаны непаўналетнія, якія не дасягнулі чатырнаццацігадовага ўзросту, а таксама абмежаваныя ў карыстанні розумам; аднак яны могуць быць выслуханы на падставе выдадзенага суддзёй дэкрэта, які павінен змяшчаць абгрунтаванне.

§ 2. Няздольнымі лічацца:

1° тыя, хто з'яўляюцца бакамі ў справе або выступаюць у судовым працэсе ад імя бакоў, суддзя і яго памочнікі, адвакат, а таксама іншыя асобы, якія дапамагаюць або дапамагалі бакам у гэтай самай справе;

2° святары адносна ўсяго, аб чым яны даведаліся з сакрамэнтальнай споведзі, нават калі пэнітэнт будзе прасіць выявіць гэта; больш за тое, усё, што было кім-небудзь і любым спосабам пачута са споведзі, не можа быць прынята судом нават у якасці ўказання на праўду.

Артыкул 2. *Выклік і выключэнне сведкаў*

Кан. 1551 – Бок, які выклікаў сведку, можа адмовіцца ад яго допыту; аднак супраціўны бок можа патрабаваць, каб, нягледзячы на гэта, сведка быў дапытаны.

Кан. 1552 – § 1. Калі хто-небудзь патрабуе доказу на падставе сведкаў, ён павінен указаць суду іх імёны і месца жыхарства.

§ 2. На працягу вызначанага суддзёй тэрміну павінны быць прадстаўлены тыя пункты аргументацыі, адносна якіх была скіравана просьба аб допыце сведкаў; у іншым выпадку лічыцца, што адбылася адмова ад просьбы.

Кан. 1553 – Суддзя мае права абмежаваць занадта вялікую колькасць сведкаў.

Кан. 1554 – Перад тым, як адбудзецца допыт сведкаў, іх імёны павінны быць паведамлены бакам; а калі, у адпаведнасці з разважным рашэннем суддзі, гэта не можа быць зроблена без сур'ёзных цяжкасцяў, то гэта павінна быць зроблена прынамсі перад публікацыяй паказанняў.

Кан. 1555 – Захоўваючы прадпісанне кан. 1550, бок можа прасіць аб выключэнні сведкі, калі справядлівая прычына выключэння будзе прадстаўлена перад яго допытам.

Кан. 1556 – Выклік сведкі ў суд ажыццяўляецца дэкрэтам суддзі, легітымна паведамленым сведку.

Кан. 1557 – Сведка, выкліканы належным чынам, павінен прыбыць у суд або паведаміць суддзю аб прычыне сваёй адсутнасці.

Art. 2. *De inducendis et excludendis testibus*

Can. 1551 – Pars, quae testem induxit, potest eius examini renuntiare; sed adversa pars postulare potest ut nihilominus testis examinetur.

Can. 1552 – § 1. Cum probatio per testes postulatur, eorum nomina et domicilium tribunali indicentur.

§ 2. Exhibeantur, intra terminum a iudice praestitutum, articuli argumentorum super quibus petitur testium interrogatio; alioquin petitio censeatur deserta.

Can. 1553 – Iudicis est nimiam multitudinem testium refrenare.

Can. 1554 – Antequam testes examinentur, eorum nomina cum partibus communicentur; quod si id, prudenti iudicis existimatione, fieri sine gravi difficultate nequeat, saltem ante testimoniorum publicationem fiat.

Can. 1555 – Firmo praescripto can. 1550, pars petere potest ut testis excludatur, si iusta exclusionis causa demonstretur ante testis excussionem.

Can. 1556 – Citatio testis fit decreto iudicis testi legitime notificato.

Can. 1557 – Testis rite citatus pareat aut causam suae absentiae iudici notam faciat.

Артыкул 3. *Допыт сведкаў*

Кан. 1558 – § 1. Сведкі павінны быць дапытаны ў самой сядзібе трыбунала, калі суддзя не пастановіць іначай.

Art. 3. *De testium examine*

Can. 1558 – § 1. Testes sunt examini subiciendi in ipsa tribunalis sede, nisi aliud iudici videatur.

§ 2. Cardinales, Patriarchae, Episcopi et ii qui, suae civitatis iure, simili favore gaudent, audiantur in loco ab ipsis selecto.

§ 2. Кардыналы, патрыярхі, біскупы, а таксама тыя, хто на падставе права сваёй дзяржавы карыстаюцца такімі самымі прывілеямі, павінны быць выслуханы ў выбраным імі месцы.

§ 3. Iudex decernat ubi audiendi sint ii, quibus propter distantiam, morbum aliudve impedimentum impossibile vel difficile sit tribunalis sedem adire, firmis praescriptis cann. 1418 et 1469, § 2.

§ 3. Суддзя павінен распарадзіцца адносна таго, дзе павінны быць выслуханы тыя, каму з прычыны адлегласці, хваробы або іншай перашкоды немагчыма або цяжка прыбыць у сядзібу трыбунала, захоўваючы прадпісанні кан. 1418 і 1469 § 2.

Can. 1559 – Examini testium partes assistere nequeunt, nisi iudex, praesertim cum res est de bono privato, eas admittendas censuerit. Assistere tamen possunt earum advocati vel procuratores, nisi iudex propter rerum et personarum adiuncta censuerit secreto esse procedendum.

Кан. 1559 – Бакі не могуць прысутнічаць пры допыце сведкаў, калі суддзя — асабліва ў справах, якія датычаць прыватнага дабра, — не вырашыць іх дапусціць. Аднак могуць прысутнічаць іх адвакаты ці прадстаўнікі, калі суддзя не вырашыць, што з увагі на абставіны, звязаныя з рэчамі ці асобамі, працэсуальныя дзеянні павінны быць праведзены таемна.

Can. 1560 – § 1. Testes seorsim singuli examinandi sunt.

§ 2. Si testes inter se aut cum parte in re gravi dissentiant, iudex discrepantes inter se conferre seu comparare potest, remotis, quantum fieri poterit, dissidiis et scandalo.

Кан. 1560 – § 1. Кожны са сведкаў павінен быць дапытаны паасобку.

§ 2. Калі сведкі разыходзяцца паміж сабой або з бокам у якім-небудзь важкім пытанні, суддзя можа выклікаць на вочную стаўку, іншымі словамі — параўнаць паказанні тых, чые паказанні не супадаюць, пазбягаючы — наколькі гэта будзе магчыма — спрэчак і спакусы.

Can. 1561 – Examen testis fit a iudice, vel ab eius delegato aut auditore, cui assistat oportet notarius; quapropter partes, vel promotor iustitiae, vel defensor vinculi, vel advocati qui examini intersint, si alias interrogationes testi faciendas habeant, has non testi, sed iudici vel eius locum tenenti proponant, ut eas ipse deferat, nisi aliter lex particularis caveat.

Кан. 1561 – Допыт сведкі здзяйсняецца суддзёй, яго дэлегатам або аўдытарам, з якімі заўсёды павінен супрацоўнічаць натарыус; таму, калі тыя, хто прысутнічаюць на допыце — бакі, або прамотар справядлівасці, або абаронца повязі, або адвакаты, — маюць іншыя пытанні да сведкі, павінны задаваць іх не сведку, але прапанаваць суддзі ці асобе, якая яго замяшчае, каб яны самі іх задалі, калі партыкулярнае права не пастанаўляе іншае.

Кан. 1562 – § 1. Суддзя павінен нагадаць сведку, што ён мае важкі абавязак гаварыць усю праўду і толькі праўду.

§ 2. Суддзя павінен распарадзіцца аб тым, каб сведка склаў прысягу згодна з нормай кан. 1532; калі сведка адмовіцца, ён павінен быць выслуханы без складання прысягі.

Can. 1562 – § 1. Iudex testi in mentem revocet gravem obligationem dicendi totam et solam veritatem.

§ 2. Iudex testi deferat iuramentum iuxta can. 1532; quod si testis renuat illud emittere, iniuratus audiatur.

Кан. 1563 – Перш за ўсё суддзя павінен сцвердзіць асобу сведкі; павінен даведацца аб яго адносінах да бакоў і — калі задае пытанні, якія датычаць справы, — запытаць таксама аб крыніцах яго інфармацыі і аб тым, калі дакладна ён даведаўся аб тым, аб чым дае паказанні.

Can. 1563 – Iudex imprimis testis identitatem comprobet; exquirat quaenam sit ipsi cum partibus necessitudo et, cum ipsi interrogationes specificas circa causam defert, sciscitetur quoque fontes eius scientiae et quo definito tempore ea, quae asserit, cognoverit.

Кан. 1564 – Пытанні павінны быць кароткімі, дастасаванымі да разумовых здольнасцей таго, хто на іх адказвае, не датычыць адначасова некалькіх спраў, пытанні не павінны заблытваць, быць мудрагелістымі, падказваць адказ, павінны пазбягаць абразы і датычыць справы, пра якую ідзе гаворка.

Can. 1564 – Interrogationes breves sunto, interrogandi captui accommodatae, non plura simul complectentes, non captiosae, non subdolae, non suggerentes responsionem, remotae a cuiusvis offensione et pertinentes ad causam quae agitur.

Кан. 1565 – § 1. Пытанні нельга паведамляць сведкам зараней.

§ 2. Пры гэтым, калі тое, аб чым павінны быць дадзены паказанні, забыта настолькі, што не можа быць дакладна сцверджана без папярэдняга ўспамінання, суддзя можа нагадаць сведку аб чым-небудзь, калі палічыць, што гэта можа быць зроблена без небяспекі.

Can. 1565 – § 1. Interrogationes non sunt cum testibus antea communicandae.

§ 2. Attamen si ea quae testificanda sunt ita a memoria sint remota, ut nisi prius recolantur certo affirmari nequeant, poterit iudex nonnulla testem praemonere, si id sine periculo fieri posse censeat.

Кан. 1566 – Сведкі павінны даваць паказанні вусна, не чытаючы напісанае, калі гаворка не ідзе пра рахункі і справаздачы; у такім выпадку яны могуць выкарыстоўваць запісы, прынесеныя з сабой.

Can. 1566 – Testes ore testimonium dicant, et scriptum ne legant, nisi de calculo et rationibus agatur; hoc enim in casu, adnotationes, quas secum attulerint, consulere poterunt.

Кан. 1567 – § 1. Адказ павінен быць адразу пісьмова запісаны натарыусам і павінен

Can. 1567 – § 1. Responsio statim redigenda est scripto a notario et re-

ferre debet ipsa editi testimonii verba, saltem quod attinet ad ea quae iudicii materiam directe attingunt.

§ 2. Admitti potest usus machinae magnetophonicae, dummodo dein responsiones scripto consignentur et subscribantur, si fieri potest, a deponentibus.

Can. 1568 – Notarius in actis mentionem faciat de praestito, remisso aut recusato iureiurando, de partium aliorumque praesentia, de interrogationibus ex officio additis et generatim de omnibus memoria dignis quae forte acciderint, cum testes excutiebantur.

Can. 1569 – § 1. In fine examinis, testi legi debent quae notarius de eius depositione scripto redegit, vel ipsi audita facere quae ope magnetophonii de eius depositione incisa sunt, data eidem testi facultate addendi, supprimendi, corrigendi, variandi.

§ 2. Denique actui subscribere debent testis, iudex et notarius.

Can. 1570 – Testes, quamvis iam excussi, poterunt parte postulante aut ex officio, antequam acta seu testificationes publici iuris fiant, denuo ad examen vocari, si iudex id necessarium vel utile ducat, dummodo collusionis vel corruptelae quodvis absit periculum.

Can. 1571 – Testibus, iuxta aequam iudicis taxationem, refundi debent tum expensae, quas fecerint, tum lucrum, quod amiserint, testificationis reddendae causa.

даслоўна змяшчаць паказанні, прынамсі ў той частцы, якая непасрэдна датычыць прадмета судовага працэсу.

§ 2. Дапускаецца выкарыстоўванне абсталявання гуказапісу, калі толькі пазней адказы будуць запісаны пісьмова і — калі гэта будзе магчыма — падпісаны тымі, хто даваў паказанні.

Кан. 1568 – Натарыус павінен зрабіць у актах узгадванне аб складанні, нескладанні або адмове ад прысягі, аб прысутнасці бакоў і іншых асобаў, аб пытаннях, дададзеных на моцы пасады, і наогул аб усім, вартым узгадвання, што адбывалася падчас допыту сведкаў.

Кан. 1569 – § 1. Напрыканцы допыту павінна быць прачытана сведку тое, што натарыус пісьмова запісаў з яго паказанняў, або павінна быць дадзена праслухаць тое, што з яго паказанняў было запісана з дапамогай абсталявання гуказапісу; сведку павінна быць дадзена магчымасць што-небудзь дапоўніць, выдаліць, выправіць або змяніць.

§ 2. Складзены акт павінен быць падпісаны сведкам, суддзёй і натарыусам.

Кан. 1570 – Сведкі, нават калі ўжо былі дапытаны, па прапанове боку або на моцы пасады могуць быць яшчэ раз выкліканы на допыт перад абвяшчэннем актаў, іншымі словамі — паказанняў, калі суддзя палічыць гэта неабходным або карысным, калі толькі няма ніякай небяспекі змовы або подкупу.

Кан. 1571 – Сведкам павінны быць вернуты як выдаткі, якія яны панеслі, так і даходы, страчаныя з прычыны дачы паказанняў, у справядлівым памеры, вызначаным суддзёй.

Артыкул 4. *Верагоднасць паказанняў сведкаў*

Кан. 1572 – Пры ацэньванні паказанняў суддзя, звярнуўшыся — у выпадку неабходнасці — за пасведчаннем аб верагоднасці, павінен улічваць:

1° становішча асобы і яе сумленнасць;

2° ці з'яўляюцца паказанні заснаванымі на ўласных ведах, перадусім на тым, што асабіста бачылася і чулася, ці заснаваны на ўласным меркаванні, на чутках або на пачутым ад іншых;

3° ці праявіў сведка пастаянства і ці быў несупярэчлівы або наадварот праяўляў зменлівасць, няўпэўненасць ці хісткасць;

4° ці ёсць іншыя сведкі, якія далі такія самыя паказанні, і ці пацвярджаюцца яны іншымі сродкамі даказвання.

Кан. 1573 – Паказанні адзінага сведкі не могуць мець поўнай моцы доказу, калі гаворка не ідзе пра кваліфікаванага сведку, які дае паказанні аб справах, здзейсненых на моцы пасады, або калі абставіны, звязаныя з рэчамі ці асобамі, не схіляюць да іншага.

Art. 4. *De testimoniorum fide*

Can. 1572 – In aestimandis testimoniis iudex, requisitis, si opus sit, testimonialibus litteris, consideret:

1° quae condicio sit personae, quaeve honestas;

2° utrum de scientia propria, praesertim de visu et auditu proprio testificetur, an de sua opinione, de fama, aut de auditu ab aliis;

3° utrum testis constans sit et firmiter sibi cohaereat, an varius, incertus vel vacillans;

4° utrum testimonii contestes habeat, aliisve probationis elementis confirmetur necne.

Can. 1573 – Unius testis depositio plenam fidem facere non potest, nisi agatur de teste qualificato qui deponat de rebus ex officio gestis, aut rerum et personarum adiuncta aliud suadeant.

Раздзел IV
Спецыялісты

Кан. 1574 – Дапамога спецыялістаў павінна быць выкарыстана заўсёды, калі на падставе прадпісання права або суддзі іх даследаванне і меркаванне, заснаваныя на досведзе або ведах, патрабуюцца для пацвярджэння якога-небудзь факта або вывучэння сапраўднай сутнасці якой-небудзь рэчы.

Кан. 1575 – Суддзі належыць права на прызначэнне спецыялістаў пасля таго, як бакі

Caput IV
De peritis

Can. 1574 – Peritorum opera utendum est quoties ex iuris vel iudicis praescripto eorum examen et votum, praeceptis artis vel scientiae innixum, requiruntur ad factum aliquod comprobandum vel ad veram alicuius rei naturam dignoscendam.

Can. 1575 – Iudicis est peritos nominare, auditis vel proponentibus

partibus, aut, si casus ferat, relationes ab aliis peritis iam factas assumere.

будуць выслуханы, ці па прапанове бакоў, або, калі гэтага патрабуе выпадак, суддзя можа дапусціць заключэнне, ужо зробленае іншымі спецыялістамі.

Can. 1576 – Easdem ob causas quibus testis, etiam periti excluduntur aut recusari possunt.

Кан. 1576 – Па тых жа прычынах, што і сведкі, спецыялісты таксама могуць быць выключаны або можа быць здзейснена адмова ад іх.

Can. 1577 – § 1. Iudex, attentis iis quae a litigantibus forte deducantur, singula capita decreto suo definiat circa quae periti opera versari debeat.

Кан. 1577 – § 1. Суддзя, узяўшы пад увагу прапановы, якія могуць быць зроблены бакамі спрэчкі, павінен сваім дэкрэтам вызначыць асобныя пункты, якія павінны быць апрацаваны спецыялістамі.

§ 2. Perito remittenda sunt acta causae aliaque documenta et subsidia quibus egere potest ad suum munus rite et fideliter exsequendum.

§ 2. Спецыялісту павінны быць перададзены акты справы, а таксама іншыя дакументы і сродкі, якія могуць быць патрэбнымі для належнага і вернага выканання свайго задання.

§ 3. Iudex, ipso perito audito, tempus praefiniat intra quod examen perficiendum est et relatio proferenda.

§ 3. Суддзя, выслухаўшы меркаванне самога спецыяліста, павінен вызначыць тэрмін, на працягу якога павінна быць праведзена даследаванне і падрыхтавана заключэнне.

Can. 1578 – § 1. Periti suam quisque relationem a ceteris distinctam conficiant, nisi iudex unam a singulis subscribendam fieri iubeat: quod si fiat, sententiarum discrimina, si qua fuerint, diligenter adnotentur.

Кан. 1578 – § 1. Кожны са спецыялістаў павінен скласці ўласнае, асобнае ад іншых заключэнне, калі суддзя не распарадзіцца скласці адно заключэнне, падпісанае ўсімі спецыялістамі: у такім выпадку павінны быць дакладна запісаны адрозныя суджэнні, калі яны былі.

§ 2. Periti debent indicare perspicue quibus documentis vel aliis idoneis modis certiores facti sint de personarum vel rerum vel locorum identitate, qua via et ratione processerint in explendo munere sibi demandato et quibus potissimum argumentis suae conclusiones nitantur.

§ 2. Спецыялісты павінны дакладна ўказаць, на падставе якіх дакументаў або іншых прыдатных сродкаў яны ўпэўніліся ў тоеснасці асобаў, рэчаў або месцаў, у адпаведнасці з якім метадам і ў якім парадку яны дзейнічалі, выконваючы даручанае ім заданне, а перадусім — на якіх аргументах заснаваны іх заключэнні.

§ 3. Peritus accersiri potest a iudice ut explicationes, quae ulterius necessariae videantur, suppeditet.

§ 3. Спецыяліст можа быць выкліканы суддзёй, каб даць тлумачэнні, якія будуць палічаны неабходнымі.

Кан. 1579 – § 1. Суддзя павінен уважліва разглядзець не толькі заключэнні спецыялістаў, нават згодныя, але і іншыя абставіны справы.

§ 2. У матывіровачнай частцы рашэння суддзя павінен указаць, якія аргументы схілілі яго да прыняцця або адхілення заключэння спецыялістаў.

Кан. 1580 – Спецыялістам павінны быць вернуты панесеныя выдаткі і выплачана ўзнагароджанне, памеры якога павінны быць вызначаны суддзёй у адпаведнасці з дабром і суразмернасцю, захоўваючы партыкулярнае права.

Кан. 1581 – § 1. Бакі могуць вызначыць прыватных спецыялістаў, якія павінны быць зацверджаны суддзёй.

§ 2. Калі суддзя дапусціць, гэтыя спецыялісты могуць пры неабходнасці знаёміцца з актамі справы і прысутнічаць падчас даследавання; пры гэтым яны заўсёды могуць прадставіць сваё заключэнне.

Can. 1579 – § 1. Iudex non peritorum tantum conclusiones, etsi concordes, sed cetera quoque causae adiuncta attente perpendat.

§ 2. Cum reddit rationes decidendi, exprimere debet quibus motus argumentis peritorum conclusiones aut admiserit aut reiecerit.

Can. 1580 – Peritis solvenda sunt expensae et honoraria a iudice ex bono et aequo determinanda, servato iure particulari.

Can. 1581 – § 1. Partes possunt peritos privatos, a iudice probandos, designare.

§ 2. Hi, si iudex admittat, possunt acta causae, quatenus opus sit, inspicere, peritiae exsecutioni interesse; semper autem possunt suam relationem exhibere.

Раздзел V
Агляд
і судовае даследаванне

Caput V
De accessu
et de recognitione iudiciali

Кан. 1582 – Калі суддзя палічыць, што для высвятлення справы будзе карысным скіравацца ў якое-небудзь месца або даследаваць якую-небудзь рэч, то пастанаўляе гэта дэкрэтам, у якім, пасля таго, як будуць выслуханы бакі, у агульных рысах апісваецца тое, што павінна быць прадстаўлена падчас агляду.

Кан. 1583 – Павінен быць складзены дакумент аб здзейсненым даследаванні.

Can. 1582 – Si ad definitionem causae iudex opportunum duxerit ad aliquem locum accedere vel aliquam rem inspicere, decreto id praestituat, quo ea quae in accessu praestanda sint, auditis partibus, summatim describat.

Can. 1583 – Peractae recognitionis instrumentum conficiatur.

Caput VI

De praesumptionibus

Can. 1584 – Praesumptio est rei incertae probabilis coniectura; eaque alia est iuris, quae ab ipsa lege statuitur; alia hominis, quae a iudice conicitur.

Can. 1585 – Qui habet pro se iuris praesumptionem, liberatur ab onere probandi, quod recidit in partem adversam.

Can. 1586 – Praesumptiones, quae non statuuntur a iure, iudex ne coniciat, nisi ex facto certo et determinato, quod cum eo, de quo controversia est, directe cohaereat.

Раздзел VI

Прэзумпцыі

Кан. 1584 – Прэзумпцыя — гэта праўдападобнае меркаванне аб няпэўнай рэчы; яна можа быць юрыдычнай, калі ўстаноўлена самім законам, або судовай, калі яе сцвярджае суддзя.

Кан. 1585 – Той, на чыю карысць схіляе юрыдычная прэзумпцыя, вызваляецца ад абавязку даказвання, які пераходзіць да супраціўнага боку.

Кан. 1586 – Суддзя не павінен сцвярджаць прэзумпцыі, не ўстаноўленыя правам, калі не на падставе пэўнага і акрэсленага факта, непасрэдна звязанага з прадметам спрэчкі.

TITULUS V

DE CAUSIS INCIDENTIBUS

Can. 1587 – Causa incidens habetur, quoties, incepto per citationem iudicio, quaestio proponitur quae, tametsi libello, quo lis introducitur, non contineatur expresse, nihilominus ita ad causam pertinet ut resolvi plerumque debeat ante quaestionem principalem.

Can. 1588 – Causa incidens proponitur scripto vel ore, indicato nexu qui intercedit inter ipsam et causam principalem, coram iudice competenti ad causam principalem definiendam.

Can. 1589 – § 1. Iudex, recepta petitione et auditis partibus, expeditissime decernat utrum proposita incidens quaestio fundamentum habere videatur et nexum cum principali iudicio, an vero sit in limine reicienda; et, si eam admittat, utrum talis sit gra-

ТЫТУЛ V

ПАБОЧНЫЯ СПРАВЫ

Кан. 1587 – Пабочная справа ўзнікае тады, калі пасля таго, як судовы працэс быў пачаты выклікам у суд, уносіцца пытанне, якое, не змешчанае выразна ў пазоўнай заяве, якая пачынае спрэчку, тым не менш мае дачыненне да справы такім чынам, што пераважна павінна быць вырашана перад асноўным пытаннем.

Кан. 1588 – Пабочная справа ўносіцца пісьмова або вусна суддзі, які мае кампетэнцыю ў вырашэнні асноўнай справы, з указаннем сувязі, якая існуе паміж ёю і асноўнай справай.

Кан. 1589 – § 1. Суддзя, прыняўшы просьбу і выслухаўшы бакі, павінен як мага хутчэй вырашыць, ці можа быць палічана, што ўнесенае пабочнае пытанне мае падставу і сувязь з асноўным судовым працэсам або, наадварот, што просьба павінна быць адхілена ўжо на пачатку; а калі ён дапус-

ціць гэтую просьбу, то павінен вырашыць, ці з'яўляецца яна настолькі важкай, што павінна быць вырашана выданнем прысуду, які не вырашае асноўную справу, ці дэкрэта.

§ 2. Калі ж суддзя вырашыць, што няма неабходнасці ў вырашэнні пабочнага пытання перад вынясеннем канчатковага прысуду, ён павінен вырашыць, ці павінна яно быць узята пад увагу пры вырашэнні асноўнай справы.

Кан. 1590 – § 1. Калі пабочнае пытанне павінна быць вырашана прысудам, павінны захоўвацца нормы аб вусным спрэчным працэсе, калі суддзя, зважаючы на важкасць справы, не пастановіць іначай.

§ 2. Калі ж справа павінна быць вырашана дэкрэтам, суд можа даручыць яе аўдытару або старшыні.

Кан. 1591 – Пры наяўнасці справядлівай прычыны, да завяршэння асноўнай справы суддзя або суд можа адклікаць або змяніць дэкрэт ці прысуд, які не вырашае асноўную справу, — або ў адказ на хадайніцтва боку, або на моцы пасады, выслухаўшы бакі.

vitatis, ut solvi debeat per sententiam interlocutoriam vel per decretum.

§ 2. Si vero iudicet quaestionem incidentem non esse resolvendam ante sententiam definitivam, decernat ut eiusdem ratio habeatur, cum causa principalis definietur.

Can. 1590 – § 1. Si quaestio incidens solvi debeat per sententiam, serventur normae de processu contentioso orali, nisi, attenta rei gravitate, aliud iudici videatur.

§ 2. Si vero solvi debeat per decretum, tribunal potest rem committere auditori vel praesidi.

Can. 1591 – Antequam finiatur causa principalis, iudex vel tribunal potest decretum vel sententiam interlocutoriam, iusta intercedente ratione, revocare aut reformare, sive ad partis instantiam, sive ex officio, auditis partibus.

Раздзел I
Адсутнасць бакоў

Caput I
De partibus non comparentibus

Кан. 1592 – § 1. Калі выкліканы ў суд адказчык не з'явіцца і не прадставіць прыдатнага апраўдання сваёй адсутнасці або не адкажа згодна з нормай кан. 1507 § 1, суддзя павінен сцвердзіць яго ў якасці адсутнага ў судовым працэсе і распарадзіцца, каб справа працягвалася — захоўваючы тое, што павінна быць захавана, — да вынясення канчатковага прысуду і да яго выканання.

§ 2. Перад выданнем дэкрэта, аб якім гаворыцца ў § 1, суддзя павінен упэўніц-

Can. 1592 – § 1. Si pars conventa citata non comparuerit nec idoneam absentiae excusationem attulerit aut non responderit ad normam can. 1507, § 1, iudex eam a iudicio absentem declaret et decernat ut causa, servatis servandis, usque ad sententiam definitivam eiusque exsecutionem procedat.

§ 2. Antequam decretum, de quo in § 1, feratur, debet, etiam per novam

citationem si opus fuerit, constare citationem, legitime factam, ad partem conventam tempore utili pervenisse.

Can. 1593 – § 1. Si pars conventa dein in iudicio se sistat aut responsum dederit ante causae definitionem, conclusiones probationesque afferre potest, firmo praescripto can. 1600; caveat autem iudex, ne de industria in longiores et non necessarias moras iudicium protrahatur.

§ 2. Etsi non comparuerit aut responsum non dederit ante causae definitionem, impugnationibus uti potest adversus sententiam; quod si probet se legitimo impedimento fuisse detentam, quod sine sua culpa antea demonstrare non potuerit, querela nullitatis uti potest.

Can. 1594 – Si die et hora ad litis contestationem praestitutis actor neque comparuerit neque idoneam excusationem attulerit:

1° iudex eum citet iterum;

2° si actor novae citationi non paruerit, praesumitur instantiae renuntiasse ad normam cann. 1524-1525;

3° quod si postea in processu intervenire velit, servetur can. 1593.

Can. 1595 – § 1. Pars absens a iudicio, sive actor sive pars conventa, quae iustum impedimentum non comprobaverit, tenetur obligatione tum solvendi litis expensas, quae ob ipsius absentiam factae sunt, tum etiam, si opus sit, indemnitatem alteri parti praestandi.

§ 2. Si tum actor tum pars conventa fuerint absentes a iudicio, ipsi obligatione expensas litis solvendi tenentur in solidum.

ца, калі неабходна — таксама з дапамогай новага выкліку ў суд, што легітымна скіраваны выклік у суд дайшоў да адказчыка ў карысны час.

Кан. 1593 – § 1. Калі адказчык з'явіцца ў суд пазней або дасць адказ перад вырашэннем справы, ён можа прадставіць высновы і доказы, захоўваючы прадпісанні кан. 1600; пры гэтым, суддзя павінен паклапаціцца аб тым, каб судовы працэс не зацягваўся наўмысна і без неабходнасці.

§ 2. Нават калі адказчык не з'явіцца ў суд і не дасць адказу перад вырашэннем справы, ён можа аспрэчыць прысуд; калі ж ён дакажа, што быў стрыманы легітымнай перашкодай, якую ён, не маючы ў гэтым віны, не мог выявіць раней, можа звярнуцца са скаргай аб нядзейснасці прысуду.

Кан. 1594 – Калі ў дзень і гадзіну, вызначаныя для пачатку судовай спрэчкі, пазоўнік не з'явіцца і не прадставіць прыдатнага апраўдання, то:

1° суддзя павінен выклікаць яго паўторна;

2° калі пазоўнік не з'явіцца пасля новага выкліку, мяркуецца, што ён адмовіўся ад інстанцыі згодна з нормамі кан. 1524–1525;

3° калі пазней ён пажадае прыняць удзел у працэсе, павінен захоўвацца кан. 1593.

Кан. 1595 – § 1. Бок, пазоўнік або адказчык, які адсутнічаў у судовым працэсе і які не дакажа наяўнасці справядлівай перашкоды, мае абавязак аплаціць як судовыя выдаткі, так і — пры неабходнасці — кампенсацыю другому боку.

§ 2. Калі як пазоўнік, так і адказчык былі адсутнымі ў судовым працэсе, яны маюць салідарны абавязак аплаты судовых выдаткаў.

Раздзел II

Удзел трэціх асобаў у справе

Кан. 1596 – § 1. Асоба, якая мае зацікаўленасць, можа быць дапушчана да ўдзелу ў справе на любой стадыі спрэчкі — або ў якасці боку, які абараняе свае правы, або дадаткова, у дапамогу аднаму з бакоў.

§ 2. Пры гэтым, каб быць дапушчанай, гэтая асоба павінна перад завяршэннем разгляду сутнасці справы скіраваць суддзі пазоўную заяву, у якой павінна абгрунтаваць сваё права на ўдзел.

§ 3. Асоба, якая прымае ўдзел у справе, павінна быць дапушчана да ўдзелу ў той стадыі справы, на якой яна знаходзіцца, вызначаючы кароткі і неаднаўляльны тэрмін для прадстаўлення сваіх доказаў, калі справа знаходзіцца на стадыі збору доказаў.

Кан. 1597 – Суддзя, выслухаўшы бакі, павінен выклікаць у судовы працэс трэцюю асобу, удзел якой будзе палічаны неабходным.

Caput II

De interventu tertii in causa

Can. 1596 – § 1. Is cuius interest admitti potest ad interveniendum in causa, in qualibet litis instantia, sive ut pars quae proprium ius defendit, sive accessorie ad aliquem litigantem adiuvandum.

§ 2. Sed ut admittatur, debet ante conclusionem in causa libellum iudici exhibere, in quo breviter suum ius interveniendi demonstret.

§ 3. Qui intervenit in causa, admittendus est in eo statu in quo causa reperitur, assignato eidem brevi ac peremptorio termino ad probationes suas exhibendas, si causa ad periodum probatoriam pervenerit.

Can. 1597 – Tertium, cuius interventus videatur necessarius, iudex, auditis partibus, debet in iudicium vocare.

ТЫТУЛ VI

ПУБЛІКАЦЫЯ АКТАЎ, ЗАВЯРШЭННЕ РАЗГЛЯДУ СУТНАСЦІ СПРАВЫ І СУДОВЫЯ ДЭБАТЫ

Кан. 1598 – § 1. Сабраўшы доказы, суддзя — пад пагрозай нядзейснасці — павінен дэкрэтам дазволіць бакам і іх адвакатам знаёміцца ў канцылярыі трыбунала з яшчэ ім невядомымі актамі; больш за тое, адвакатам, якія аб гэтым папросяць, можа быць таксама выдадзена копія актаў; аднак у справах, якія датычаць публічнага дабра, суддзя, каб пазбегнуць асабліва цяжкай небяспекі, можа вырашыць, што акрэслены акт не можа быць адкрыты нікому, забяс-

TITULUS VI

DE ACTORUM PUBLICATIONE, DE CONCLUSIONE IN CAUSA ET DE CAUSAE DISCUSSIONE

Can. 1598 – § 1. Acquisitis probationibus, iudex decreto partibus et earum advocatis permittere debet, sub poena nullitatis, ut acta nondum eis nota apud tribunalis cancellariam inspiciant; quin etiam advocatis id petentibus dari potest actorum exemplar; in causis vero ad bonum publicum spectantibus iudex ad gravissima pericula evitanda aliquod actum nemini manifestandum esse decernere potest, cauto tamen ut ius

defensionis semper integrum maneat.

§ 2. Ad probationes complendas partes possunt alias iudici proponere; quibus acquisitis, si iudex necessarium duxerit, iterum est locus decreto de quo in § 1.

Can. 1599 – § 1. Expletis omnibus quae ad probationes producendas pertinent, ad conclusionem in causa devenitur.

§ 2. Haec conclusio habetur quoties aut partes declarent se nihil aliud adducendum habere, aut utile proponendis probationibus tempus a iudice praestitutum elapsum sit, aut iudex declaret se satis instructam causam habere.

§ 3. De peracta conclusione in causa, quocumque modo ea acciderit, iudex decretum ferat.

Can. 1600 – § 1. Post conclusionem in causa iudex potest adhuc eosdem testes vel alios vocare aut alias probationes, quae antea non fuerint petitae, disponere tantummodo:

1° in causis, in quibus agitur de solo privato partium bono, si omnes partes consentiant;

2° in ceteris causis, auditis partibus et dummodo gravis exstet ratio itemque quodlibet fraudis vel subornationis periculum removeatur;

3° in omnibus causis, quoties verisimile est, nisi probatio nova admittatur, sententiam iniustam futuram esse propter rationes, de quibus in can. 1645, § 2, nn. 1-3.

§ 2. Potest autem iudex iubere vel admittere ut exhibeatur documentum, quod forte antea sine culpa eius cuius interest, exhiberi non potuit.

-печваючы, каб пры гэтым заставалася поўнае права на абарону.

§ 2. Для дапаўнення доказаў бакі могуць прадставіць суддзі іншыя доказы; атрымаўшы іх, суддзя — калі палічыць неабходным — можа паўторна выдаць дэкрэт, аб якім гаворыцца ў § 1.

Кан. 1599 – § 1. Пасля выканання ўсяго, што адносіцца да збору доказаў, адбываецца завяршэнне разгляду сутнасці справы.

§ 2. Гэтае завяршэнне адбываецца тады, калі бакі заявяць, што ім больш няма чаго дадаваць, або закончыцца карысны час, устаноўлены суддзёй для прадстаўлення доказаў, або суддзя сцвердзіць, што справа з'яўляецца дастаткова даследаванай.

§ 3. Аб завяршэнні разгляду сутнасці справы, у якім бы парадку яно ні адбывалася, суддзя павінен выдаць дэкрэт.

Кан. 1600 – § 1. Пасля завяршэння разгляду сутнасці справы суддзя можа выклікаць у суд тых самых ці іншых сведкаў або прымаць іншыя доказы, аб якіх яшчэ не прасілі, толькі:

1° у справах, якія датычаць выключна прыватнага дабра бакоў, — калі ўсе бакі згодны;

2° у іншых справах — выслухаўшы бакі і калі толькі існуе важкая падстава, а ўсялякая небяспека падману або змовы ўстаронена;

3° ва ўсіх справах — кожны раз, калі існуе імавернасць, што, калі новы доказ не будзе дапушчаны, будзе выдадзены прысуд, несправядлівы на падставах, аб якіх гаворыцца ў кан. 1645 § 2, 1° – 3°.

§ 2. Пры гэтым суддзя можа загадаць або дапусціць, каб быў прадстаўлены дакумент, які без віны зацікаўленай асобы не мог быць прадстаўлены раней.

§ 3. Павінна адбыцца публікацыя новых доказаў, захоўваючы прадпісанне кан. 1598 § 1.

Кан. 1601 – Пасля завяршэння разгляду сутнасці справы суддзя павінен устанавіць адпаведны тэрмін для скіравання абарончых высноў і заўваг.

Кан. 1602 – § 1. Абарончыя высновы і заўвагі павінны быць прадстаўлены пісьмова, калі суддзя са згоды бакоў не палічыць дастатковымі вусныя дэбаты перад засядаючым трыбуналам.

§ 2. Перад тым, як абарончыя высновы разам з найбольш важнымі дакументамі змогуць быць надрукаваны, патрабуецца папярэдні дазвол суддзі, калі існуе неабходнасць — з абавязкам захоўвання таямніцы.

§ 3. Што датычыць аб'ёму абарончых высноў, колькасці асобнікаў і іншых падобных пытанняў, павінна захоўвацца прадпісанне трыбунала.

Кан. 1603 – § 1. Пасля ўзаемнай перадачы абарончых высноў і заўваг кожнаму з бакоў дазваляецца прадставіць свае адказы на працягу кароткага часу, устаноўленага суддзёй.

§ 2. Гэтае права належыць бакам толькі адзін раз, калі суддзя па важкай прычыне не палічыць, што яно павінна быць удзелена паўторна; у гэтым выпадку лічыцца, што дазвол, удзелены аднаму боку, быў удзелены таксама і другому.

§ 3. Прамотару справядлівасці і абаронцы повязі належыць права паўторнай рэплікі на адказы бакоў.

Кан. 1604 – § 1. Бакам, адвакатам і іншым асобам поўнасцю забаронена прадстаўляць суддзі якую-небудзь інфармацыю, якая знаходзіцца па-за актамі справы.

§ 3. Novae probationes publicentur, servato can. 1598, § 1.

Can. 1601 – Facta conclusione in causa, iudex congruum temporis spatium praestituat ad defensiones vel animadversiones exhibendas.

Can. 1602 – § 1. Defensiones et animadversiones scriptae sint, nisi disputationem pro tribunali sedente iudex, consentientibus partibus, satis esse censeat.

§ 2. Si defensiones cum praecipuis documentis typis imprimantur, praevia iudicis licentia requiritur, salva secreti obligatione, si qua sit.

§ 3. Quoad extensionem defensionum, numerum exemplarium, aliaque huiusmodi adiuncta, servetur ordinatio tribunalis.

Can. 1603 – § 1. Communicatis vicissim defensionibus atque animadversionibus, utrique parti responsiones exhibere licet, intra breve tempus a iudice praestitutum.

§ 2. Hoc ius partibus semel tantum esto, nisi iudici gravi ex causa iterum videatur concedendum; tunc autem concessio, uni parti facta, alteri quoque data censeatur.

§ 3. Promotor iustitiae et defensor vinculi ius habent iterum replicandi partium responsionibus.

Can. 1604 – § 1. Omnino prohibentur partium vel advocatorum vel etiam aliorum informationes iudici datae, quae maneant extra acta causae.

§ 2. Si causae discussio scripto facta sit, iudex potest statuere ut moderata disputatio fiat ore pro tribunali sedente, ad quaestiones nonnullas illustrandas.

§ 2. Калі судовыя дэбаты адбываліся пісьмова, суддзя можа пастанавіць, каб перад засядаючым трыбуналам адбыліся абмежаваныя вусныя дэбаты з мэтай высвятлення некаторых пытанняў.

Can. 1605 – Disputationi orali, de qua in cann. 1602, § 1 et 1604, § 2, assistat notarius ad hoc ut, si iudex praecipiat aut pars postulet et iudex consentiat, de disceptatis et conclusis scripto statim referre possit.

Кан. 1605 – На вусных дэбатах, аб якіх гаворыцца ў кан. 1602 § 1 і 1604 § 2, павінен прысутнічаць натарыус, каб, калі суддзя распарадзіцца аб гэтым або выразіць згоду на патрабаванне боку, мог адразу запісаць пытанні, якія сталі прадметам дэбатаў, а таксама высновы.

Can. 1606 – Si partes parare sibi tempore utili defensionem neglexerint, aut se remittant iudicis scientiae et conscientiae, iudex, si ex actis et probatis rem habeat plane perspectam, poterit statim sententiam pronuntiare, requisitis tamen animadversionibus promotoris iustitiae et defensoris vinculi, si iudicio intersint.

Кан. 1606 – Калі бакі на працягу карыснага часу занядбалі падрыхтоўку абарончых высноў або даручылі сябе ведам і сумленню суддзі, то суддзя, калі на падставе актаў і доказаў палічыць справу дастаткова высветленай, можа адразу абвясціць прысуд, запатрабаваўшы, аднак, заўвагі прамотара справядлівасці і абаронцы повязі, калі яны ўдзельнічаюць у судовым працэсе.

TITULUS VII
DE IUDICIS PRONUNTIATIONIBUS

ТЫТУЛ VII
ПАСТАНОВЫ СУДДЗІ

Can. 1607 – Causa iudiciali modo pertractata, si sit principalis, definitur a iudice per sententiam definitivam; si sit incidens, per sententiam interlocutoriam, firmo praescripto can. 1589, § 1.

Кан. 1607 – Калі справа, разгледжаная ў судовым працэсе, з'яўляецца асноўнай, суддзя вырашае яе канчатковым прысудам; калі ж справа з'яўляецца пабочнай — прысудам, які не вырашае асноўную справу, пры гэтым захоўваюцца прадпісанні кан. 1589 § 1.

Can. 1608 – § 1. Ad pronuntiationem cuiuslibet sententiae requiritur in iudicis animo moralis certitudo circa rem sententia definiendam.

Кан. 1608 – § 1. Для вынясення любога прысуду патрабуецца, каб суддзя меў унутраную маральную ўпэўненасць адносна справы, якая павінна быць вырашана прысудам.

§ 2. Hanc certitudinem iudex haurire debet ex actis et probatis.

§ 2. Гэтую ўпэўненасць суддзя павінен набыць на падставе актаў і доказаў.

§ 3. Пры гэтым суддзя павінен ацэньваць доказы ў адпаведнасці са сваім сумленнем, захоўваючы прадпісанні закона аб моцы некаторых доказаў.

§ 4. Суддзя, які не можа асягнуць такой упэўненасці, павінен пастанавіць, што права пазоўніка не даказана, а адказчыка павінен адпусціць, калі гаворка не ідзе пра справу, якая карыстаецца прыхільнасцю права; у гэтым выпадку павінна быць пастаноўлена на яе карысць.

§ 3. Probationes autem aestimare iudex debet ex sua conscientia, firmis praescriptis legis de quarundam probationum efficacia.

§ 4. Iudex qui eam certitudinem adipisci non potuit, pronuntiet non constare de iure actoris et conventum absolutum dimittat, nisi agatur de causa iuris favore fruente, quo in casu pro ipsa pronuntiandum est.

Кан. 1609 – § 1. У калегіяльным трыбунале старшыня калегіі вызначае, у які дзень і гадзіну суддзі павінны сабрацца для абмеркавання справы; калі асаблівая прычына не схіліць да іншага, пасяджэнне павінна адбывацца ў самой сядзібе трыбунала.

Can. 1609 – § 1. In tribunali collegiali, qua die et hora iudices ad deliberandum conveniant, collegii praeses statuat, et nisi peculiaris causa aliud suadeat, in ipsa tribunalis sede conventus habeatur.

§ 2. У дзень, вызначаны для пасяджэння, кожны з суддзяў павінен прынесці свае пісьмовыя высновы адносна сутнасці справы, а таксама юрыдычныя і фактычныя абгрунтаванні, на падставе якіх былі зроблены высновы; гэтыя высновы павінны быць далучаны да актаў справы і захаваны ў таямніцы.

§ 2. Assignata conventui die, singuli iudices scriptas afferant conclusiones suas in merito causae, et rationes tam in iure quam in facto, quibus ad conclusionem suam venerint; quae conclusiones actis causae adiungantur, secreto servandae.

§ 3. Пасля заклікання Божага Імя і прадстаўлення высноў кожнага з суддзяў па чарзе, паводле старшынства, пачынаючы, аднак, з дакладчыка, іншымі словамі — рэлятара, павінна адбыцца дыскусія пад кіраваннем старшыні трыбунала, галоўнай мэтай якой з'яўляецца вызначэнне таго, што павінна быць пастаноўлена ў вырашальнай частцы прысуду.

§ 3. Post divini Nominis invocationem, prolatis ex ordine singulorum conclusionibus secundum praecedentiam, ita tamen ut semper a causae ponente seu relatore initium fiat, habeatur discussio sub tribunalis praesidis ductu, praesertim ut constabiliatur quid statuendum sit in parte dispositiva sententiae.

§ 4. Падчас дыскусіі кожнаму суддзі дазваляецца адмовіцца ад сваёй першапачатковай высновы. Аднак суддзя, які не пажадае далучыцца да рашэння іншых суддзяў, можа патрабаваць, каб у выпадку апеляцыі яго высновы былі перададзены ў вышэйшы трыбунал.

§ 4. In discussione autem fas unicuique est a pristina sua conclusione recedere. Iudex vero qui ad decisionem aliorum accedere noluit, exigere potest ut, si fiat appellatio, suae conclusiones ad tribunal superius transmittantur.

§ 5. Quod si iudices in prima discussione ad sententiam devenire aut nolint aut nequeant, differri poterit decisio ad novum conventum, non tamen ultra hebdomadam, nisi ad normam can. 1600 complenda sit causae instructio.

§ 5. Калі падчас першай дыскусіі суддзі не пажадаюць або не змогуць вынесці прысуд, рашэнне можа быць адкладзена да новага пасяджэння, аднак не больш чым на тыдзень, калі даследаванне справы не павінна быць дапоўнена згодна з нормай кан. 1600.

Can. 1610 – § 1. Si iudex sit unicus, ipse sententiam exarabit.

Кан. 1610 – § 1. Калі суддзя з'яўляецца аднаасобным, ён сам складае прысуд.

§ 2. In tribunali collegiali, ponentis seu relatoris est exarare sententiam, desumendo motiva ex iis quae singuli iudices in discussione attulerunt, nisi a maiore numero iudicum praefinita fuerint motiva praeferenda; sententia dein singulorum iudicum subicienda est approbationi.

§ 2. У калегіяльным трыбунале прысуд павінен скласці дакладчык, іншымі словамі — рэлятар, выбіраючы для яго абгрунтаванне сярод тых матывацый, якія былі прадстаўлены асобнымі суддзямі падчас дыскусіі, калі большасць суддзяў не вырашыць, якой матывацыі павінна быць аддадзена перавага; пасля гэтага прысуд павінен быць перададзены кожнаму з суддзяў для зацвярджэння.

§ 3. Sententia edenda est non ultra mensem a die quo causa definita est, nisi, in tribunali collegiali, iudices gravi ex ratione longius tempus praestituerint.

§ 3. Прысуд павінен быць вынесены не пазней чым на працягу месяца ад дня, калі справа была вырашана, калі ў калегіяльным трыбунале па важкай прычыне суддзі не ўстановяць больш працяглы тэрмін.

Can. 1611 – Sententia debet:

1° definire controversiam coram tribunali agitatam, data singulis dubiis congrua responsione;

2° determinare quae sint partium obligationes ex iudicio ortae et quomodo implendae sint;

3° exponere rationes seu motiva, tam in iure quam in facto, quibus dispositiva sententiae pars innititur;

4° statuere de litis expensis.

Кан. 1611 – Прысуд павінен:

1° вырашаць спрэчку, унесеную на разгляд трыбунала, даючы адпаведныя адказы на ўсе асобныя спрэчныя пытанні;

2° вызначаць бакам абавязкі, якія вынікаюць з судовага працэсу, і тое, якім чынам яны павінны выконвацца;

3° змяшчаць абгрунтаванне, іншымі словамі — матывацыю, як юрыдычнае, так і фактычнае, на якім засноўваецца вырашальная частка прысуду;

4° акрэсліваць судовыя выдаткі.

Can. 1612 – § 1. Sententia, post divini Nominis invocationem, exprimat oportet ex ordine qui sit iudex aut

Кан. 1612 – § 1. Пасля заклікання Божага Імя ў прысудзе павінны быць пералічаны па парадку: суддзя або судовая кале-

гія, пазоўнік, адказчык, прадстаўнік, з належным указаннем іх імёнаў і пастаяннага месца жыхарства, а таксама прамотар справядлівасці і абаронца повязі, калі яны ўдзельнічалі ў судовым працэсе.

§ 2. Затым павінна быць коратка прадстаўлена апісанне фактаў разам з высновамі бакоў і формулай спрэчных пытанняў.

§ 3. Пасля гэтага павінна быць змешчана вырашальная частка прысуду, з папярэднім прадстаўленнем абгрунтавання, на якім яна засноўваецца.

§ 4. Напрыканцы прысуду ўказваюцца дата і месца яго вынясення, а таксама змяшчаецца подпіс суддзі або — калі гаворка ідзе пра калегіяльны трыбунал — подпісы ўсіх суддзяў і натарыуса.

Кан. 1613 – Змешчаныя вышэй правілы, якія датычаць канчатковага прысуду, павінны з дастасаваннямі прымяняцца таксама да прысудаў, якія не вырашаюць асноўную справу.

Кан. 1614 – Прысуд павінен быць як мага хутчэй абвешчаны, пры гэтым указваюцца спосабы аспрэчвання; перад абвяшчэннем ён не мае ніякай моцы, нават калі з дазволу суддзі вырашальная частка стала вядомай бакам.

Кан. 1615 – Абвяшчэнне прысуду, іншымі словамі — паведамленне аб прысудзе, можа быць здзейснена або праз уручэнне бакам ці іх прадстаўнікам асобніка прысуду, або перасылаючы ім гэты асобнік згодна з нормай кан. 1509.

Кан. 1616 – § 1. Калі ў тэксце прысуду або была дапушчана памылка ў разліках, або здарылася матэрыяльная памылка пры перапісванні вырашальнай часткі ці пры прадстаўленні фактаў або патрабаванняў бакоў, або было прапушчана тое, што па-

tribunal; qui sit actor, pars conventa, procurator, nominibus et domicilii rite designatis, promotor iustitiae, defensor vinculi, si partem in iudicio habuerint.

§ 2. Referre postea debet breviter facti speciem cum partium conclusionibus et formula dubiorum.

§ 3. Hisce subsequatur pars dispositiva sententiae, praemissis rationibus quibus innititur.

§ 4. Claudatur cum indicatione diei et loci in quibus prolata est et cum subscriptione iudicis vel, si de tribunali collegiali agatur, omnium iudicum et notarii.

Can. 1613 – Regulae superius positae de sententia definitiva, sententiae quoque interlocutoriae aptandae sunt.

Can. 1614 – Sententia quam primum publicetur, indicatis modis quibus impugnari potest; neque ante publicationem vim ullam habet, etiamsi dispositiva pars, iudice permittente, partibus significata sit.

Can. 1615 – Publicatio seu intimatio sententiae fieri potest vel tradendo exemplar sententiae partibus aut earum procuratoribus, vel eisdem transmittendo idem exemplar ad normam can. 1509.

Can. 1616 – § 1. Si in sententiae textu vel error irrepserit in calculis, vel error materialis acciderit in transcribenda parte dispositiva aut in factis vel partium petitionibus referendis, vel omissa sint quae can. 1612, § 4

requirit, sententia ab ipso tribunali, quod eam tulit, corrigi vel compleri debet sive ad partis instantiam sive ex officio, semper tamen auditis partibus et decreto ad calcem sententiae appositio.

трабуецца ў кан. 1612 § 4, то прысуд павінен быць выпраўлены або дапоўнены тым самым трыбуналам, які яго вынес, па хадайніцтве боку ці на моцы пасады, аднак заўсёды пасля таго, як бакі будуць выслуханы; выпраўленне або дапаўненне здзяйсняецца дэкрэтам, змешчаным у канцы прысуду.

§ 2. Si qua pars refragetur, quaestio incidens decreto definiatur.

§ 2. Калі адзін з бакоў не згаджаецца, гэтая пабочная справа павінна быць вырашана дэкрэтам.

Can. 1617 – Ceterae iudicis pronuntiationes, praeter sententiam, sunt decreta, quae si mere ordinatoria non sint, vim non habent, nisi saltem summarie motiva exprimant, vel ad motiva in alio actu expressa remittant.

Кан. 1617 – Іншыя пастановы суддзі, акрамя прысуду, з'яўляюцца дэкрэтамі; калі яны не з'яўляюцца выключна распараджэннямі, то не маюць моцы, калі прынамсі ў агульных рысах не ўказваюць матывацыю або не адсылаюць да матывацыі, змешанай у іншым акце.

Can. 1618 – Sententia interlocutoria vel decretum vim sententiae definitivae habent, si iudicium impediunt vel ipsi iudicio aut alicui ipsius gradui finem ponunt, quod attinet ad aliquam saltem partem in causa.

Кан. 1618 – Прысуд, які не вырашае асноўную справу, або дэкрэт маюць моц канчатковага прысуду, калі прынамсі для аднаго боку ў справе з'яўляюцца перашкодай у судовым працэсе ці становяцца прычынай завяршэння судовага працэсу або ўвогуле, або на акрэсленай яго ступені.

TITULUS VIII
DE IMPUGNATIONE SENTENTIAE

Caput I
De querela nullitatis contra sententiam

ТЫТУЛ VIII
АСПРЭЧВАННЕ ПРЫСУДУ

Раздзел I
Скарга аб нядзейснасці прысуду

Can. 1619 – Firmis cann. 1622 et 1623, nullitates actuum, positivo iure statutae, quae, cum essent notae parti querelam proponenti, non sint ante sententiam iudici denuntiatae, per ipsam sententiam sanantur, quoties agitur de causa ad privatorum bonum attinenti.

Кан. 1619 – Захоўваючы кан. 1622 і 1623, калі гаворка ідзе пра справу, якая датычыць прыватнага дабра, самім прысудам выпраўляецца нядзейснасць дзеянняў, устаноўленая пазітыўным правам, калі аб ёй было вядома боку, які звяртаецца са скаргай, але не было заяўлена суддзі перад вынясеннем прысуду.

Кан. 1620 – Прысуд мае выклікаючую нядзейснасць загану, якая не можа быць выпраўлена, калі:

1° быў вынесены суддзёй, у якога была абсалютная адсутнасць кампетэнцыі;

2° быў вынесены тым, хто не меў судовай улады ў трыбунале, у якім справа была вырашана;

3° суддзя вынес прысуд пад прымусам або пад уздзеяннем моцнага страху;

4° судовы працэс праводзіўся без судовай просьбы, аб якой гаворыцца ў кан. 1501, або не быў узбуджаны супраць якога-небудзь адказчыка;

5° прысуд быў вынесены адносна бакоў, з якіх прынамсі адзін не мог выступаць у судзе ў якасці боку;

6° хто-небудзь дзейнічаў ад імя іншай асобы, не маючы легітымнага ўпаўнаважання;

7° які-небудзь бок быў пазбаўлены права на абарону;

8° спрэчка не была вырашана нават часткова.

Кан. 1621 – Скарга аб нядзейснасці, аб якой гаворыцца ў кан. 1620, можа быць пададзена: у выглядзе закіду — заўсёды, а ў выглядзе позвы, скіраванай да суддзі, які вынес прысуд, — на працягу дзесяці гадоў ад дня вынясення прысуду.

Кан. 1622 – Прысуд толькі тады мае выклікаючую нядзейснасць загану, якая можа быць выпраўлена, калі:

1° быў вынесены нелегітымнай колькасцю суддзяў насуперак прадпісанню кан. 1425 § 1;

2° не змяшчае матывацыі, іншымі словамі — абгрунтавання рашэння;

3° адсутнічаюць подпісы, прадпісаныя правам;

4° не ўказаны год, месяц, дзень і месца яго вынясення;

Can. 1620 – Sententia vitio insanabilis nullitatis laborat, si:

1° lata est a iudice absolute incompetenti;

2° lata est ab eo, qui careat potestate iudicandi in tribunali in quo causa definita est;

3° iudex vi vel metu gravi coactus sententiam tulit;

4° iudicium factum est sine iudiciali petitione, de qua in can. 1501, vel non institutum fuit adversus aliquam partem conventam;

5° lata est inter partes, quarum altera saltem non habeat personam standi in iudicio;

6° nomine alterius quis egit sine legitimo mandato;

7° ius defensionis alterutri parti denegatum fuit;

8° controversia ne ex parte quidem definita est.

Can. 1621 – Querela nullitatis, de qua in can. 1620, proponi potest per modum exceptionis in perpetuum, per modum vero actionis coram iudice qui sententiam tulit intra decem annos a die publicationis sententiae.

Can. 1622 – Sententia vitio sanabilis nullitatis dumtaxat laborat, si:

1° lata est a non legitimo numero iudicum, contra praescriptum can. 1425, § 1;

2° motiva seu rationes decidendi non continet;

3° subscriptionibus caret iure praescriptis;

4° non refert indicationem anni, mensis, diei et loci in quo prolata fuit;

5° actu iudiciali nullo innititur, cuius nullitas non sit ad normam can. 1619 sanata;

6° lata est contra partem legitime absentem, iuxta can. 1593, § 2.

Can. 1623 – Querela nullitatis in casibus, de quibus in can. 1622, proponi potest intra tres menses a notitia publicationis sententiae.

Can. 1624 – De querela nullitatis videt ipse iudex qui sententiam tulit; quod si pars vereatur ne iudex, qui sententiam querela nullitatis impugnatam tulit, praeoccupatum animum habeat ideoque eum suspectum existimet, exigere potest ut alius iudex in eius locum subrogetur ad normam can. 1450.

Can. 1625 – Querela nullitatis proponi potest una cum appellatione, intra terminum ad appellationem statutum.

Can. 1626 – § 1. Querelam nullitatis interponere possunt non solum partes, quae se gravatas putant, sed etiam promotor iustitiae aut defensor vinculi, quoties ipsis ius est interveniendi.

§ 2. Ipse iudex potest ex officio sententiam nullam a se latam retractare vel emendare intra terminum ad agendum can. 1623 statutum, nisi interea appellatio una cum querela nullitatis interposita fuerit, aut nullitas sanata sit per decursum termini de quo in can. 1623.

Can. 1627 – Causae de querela nullitatis secundum normas de processu contentioso orali tractari possunt.

5° засноўваецца на нядзейсным працэсуальным дзеянні, нядзейснасць якога не была выпраўлена згодна з нормай кан. 1619.

6° быў вынесены супраць боку, які легітымна адсутнічаў у адпаведнасці з кан. 1593 § 2.

Кан. 1623 – У выпадках, аб якіх гаворыцца ў кан. 1622, скарга аб нядзейснасці можа быць пададзена на працягу трох месяцаў ад дня паведамлення аб абвяшчэнні прысуду.

Кан. 1624 – Скаргу аб нядзейснасці прысуду разглядае той самы суддзя, які вынес прысуд; аднак калі бок будзе асцерагацца, што суддзя, які вынес прысуд, аспрэчаны на падставе нядзейснасці, будзе прадузяты, і таму будзе лічыць суддзю падазроным, то можа патрабаваць, каб яго замянілі іншым суддзёй згодна з нормай кан. 1450.

Кан. 1625 – Скарга аб нядзейснасці можа быць скіравана разам з апеляцыяй на працягу тэрміну, устаноўленага для падачы апеляцыі.

Кан. 1626 – § 1. Са скаргай аб нядзейснасці могуць звярнуцца не толькі бакі, якія лічаць сябе пакрыўджанымі, але і прамотар справядлівасці або абаронца повязі, калі ў іх ёсць права на ўдзел.

§ 2. Сам суддзя можа на моцы пасады адклікаць або выправіць вынесены ім нядзейсны прысуд на працягу тэрміну, устаноўленага ў кан. 1623, калі ў той самы час не будзе пададзена апеляцыя разам са скаргай аб нядзейснасці прысуду або калі нядзейснасць не будзе выпраўлена праз тое, што міне тэрмін, аб якім гаворыцца ў кан. 1623.

Кан. 1627 – Справы па скаргах аб нядзейснасці могуць разглядацца згодна з нормамі аб вусным спрэчным працэсе.

Раздзел II

Апеляцыя

Кан. 1628 – Бок, які лічыць сябе пакрыўджаным якім-небудзь прысудам, а таксама прамотар справядлівасці і абаронца повязі ў справах, дзе патрабуецца іх прысутнасць, маюць права падаць вышэйшаму суддзі апеляцыю на прысуд, захоўваючы прадпісанне кан. 1629.

Кан. 1629 – Не падлягае апеляцыі:

1° прысуд, вынесены самім Найвышэйшым Пантыфікам або Апостальскай Сігнатурай;

2° прысуд, які мае выклікаючую нядзейснасць загану, калі да апеляцыі не будзе дададзена скарга аб нядзейснасці згодна з нормай кан. 1625;

3° прысуд, які перайшоў у стан *res iudicata*;

4° дэкрэт суддзі або прысуд, які не вырашае асноўную справу, якія не маюць моцы канчатковага прысуду, калі апеляцыя на іх не будзе дададзена да апеляцыі на канчатковы прысуд;

5° прысуд або дэкрэт у справе, адносна якой права прадугледжвае як мага больш хуткае вырашэнне.

Кан. 1630 – § 1. Апеляцыя павінна быць скіравана суддзі, які вынес канчатковы прысуд, на працягу неаднаўляльнага тэрміну пятнаццаці дзён ад дня паведамлення аб абвяшчэнні прысуду.

§ 2. Калі апеляцыя падаецца вусна, нотарыус павінен скласці яе пісьмова ў прысутнасці самой асобы, якая падае апеляцыю.

Кан. 1631 – Калі ўзнікае пытанне аб праве на апеляцыю, яно павінна быць як мага хутчэй разгледжана апеляцыйным судом у адпаведнасці з нормамі вуснага спрэчнага працэсу.

Caput II

De appellatione

Can. 1628 – Pars quae aliqua sententia se gravatam putat, itemque promotor iustitiae et defensor vinculi in causis in quibus eorum praesentia requiritur, ius habent a sententia appellandi ad iudicem superiorem, salvo praescripto can. 1629.

Can. 1629 – Non est locus appellationi:

1° a sententia ipsius Summi Pontificis vel Signaturae Apostolicae;

2° a sententia vitio nullitatis infecta, nisi cumuletur cum querela nullitatis ad normam can. 1625;

3° a sententia quae in rem iudicatam transiit;

4° a iudicis decreto vel a sententia interlocutoria, quae non habeant vim sententiae definitivae, nisi cumuletur cum appellatione a sententia definitiva;

5° a sententia vel a decreto in causa de qua ius cavet expeditissime rem esse definiendam.

Can. 1630 – § 1. Appellatio interponi debet coram iudice a quo sententia prolata sit, intra peremptorium terminum quindecim dierum utilium a notitia publicationis sententiae.

§ 2. Si ore fiat, notarius eam scripto coram ipso appellante redigat.

Can. 1631 – Si quaestio oriatur de iure appellandi, de ea videat expeditissime tribunal appellationis iuxta normas processus contentiosi oralis.

Can. 1632 – § 1. Si in appellatione non indicetur ad quod tribunal ipsa dirigatur, praesumitur facta tribunali de quo in cann. 1438 et 1439.

§ 2. Si alia pars ad aliud tribunal appellationis provocaverit, de causa videt tribunal quod superioris est gradus, salvo can. 1415.

Кан. 1632 – § 1. Калі ў апеляцыі не ўказана, у які трыбунал яна скіравана, мяркуецца, што яна пададзена ў трыбунал, аб якім гаворыцца ў кан. 1438 і 1439.

§ 2. Калі другі бок звернецца ў іншы апеляцыйны трыбунал, справу разглядае трыбунал больш высокай ступені, захоўваючы кан. 1415.

Can. 1633 – Appellatio prosequenda est coram iudice *ad quem* dirigitur intra mensem ab eius interpositione, nisi iudex *a quo* longius tempus ad eam prosequendam parti praestituerit.

Кан. 1633 – Апеляцыя павінна быць падтрымана перад тым суддзёй, якому яна была скіравана, на працягу месяца ад дня яе падачы, калі суддзя, на рашэнне якога падаецца апеляцыя, не ўстановіць боку больш працяглы тэрмін для падтрымання апеляцыі.

Can. 1634 – § 1. Ad prosequendam appellationem requiritur et sufficit ut pars ministerium invocet iudicis superioris ad impugnatae sententiae emendationem, adiuncto exemplari huius sententiae et indicatis appellationis rationibus.

§ 2. Quod si pars exemplar impugnatae sententiae intra utile tempus a tribunali *a quo* obtinere nequeat, interim termini non decurrunt, et impedimentum significandum est iudici appellationis, qui iudicem *a quo* praecepto obstringat officio suo quam primum satisfaciendi.

Кан. 1634 – § 1. Для падтрымання апеляцыі неабходна і дастаткова, каб бок звярнуўся да паслугі вышэйшага суддзі з просьбай аб выпраўленні аспрэчанага прысуду, далучаючы копію гэтага прысуду і ўказваючы падставы апеляцыі.

§ 2. Калі на працягу карыснага часу бок не можа атрымаць копію аспрэчанага прысуду ў трыбунале, які яго вынес, гэты час не мінае, а пра перашкоду павінна быць паведамлена апеляцыйнаму суддзі, які павінен сваім прадпісаннем абавязаць суддзю, на рашэнне якога падаецца апеляцыя, выканаць свой абавязак як мага хутчэй.

§ 3. Interea iudex *a quo* debet acta ad normam can. 1474 iudici appellationis transmittere.

§ 3. У гэты час суддзя, на рашэнне якога падаецца апеляцыя, павінен згодна з нормай кан. 1474 пераслаць акты апеляцыйнаму суддзі.

Can. 1635 – Inutiliter elapsis fatalibus appellatoriis sive coram iudice *a quo* sive coram iudice *ad quem*, deserta censetur appellatio.

Кан. 1635 – Пасля таго, як безвынікова мінуць неаднаўляльныя тэрміны падачы апеляцыі як перад суддзёй, на рашэнне якога падаецца апеляцыя, так і перад апеляцыйным суддзёй, лічыцца, што ад апеляцыі адмовіліся.

Кан. 1636 – § 1. Той, хто падае апеляцыю, можа адмовіцца ад яе з наступствамі, аб якіх гаворыцца ў кан. 1525.

§ 2. Калі апеляцыю падае абаронца повязі або прамотар справядлівасці, адмовіцца ад яе можа абаронца повязі або прамотар справядлівасці апеляцыйнага трыбунала, калі закон не прадугледжвае іншае.

Кан. 1637 – § 1. Апеляцыя, пададзеная пазоўнікам, дзейнічае таксама ў адносінах да адказчыка і наадварот.

§ 2. Калі выступае некалькі адказчыкаў або пазоўнікаў, а прысуд аспрэчваецца адным з іх ці супраць аднаго з іх, то лічыцца — калі гаворка ідзе пра непадзельны спрэчны прадмет або салідарны абавязак, — што аспрэчванне здзейснена ўсімі супраць усіх.

§ 3. Калі апеляцыя падаецца адным з бакоў на акрэсленую частку прысуду, супраціўны бок, нават калі мінулі неаднаўляльныя тэрміны апеляцыі, можа ў пабочным парадку падаваць апеляцыю на іншыя часткі прысуду на працягу пятнаццаці дзён ад дня, калі быў паведамлены аб асноўнай апеляцыі.

§ 4. Калі не сцверджана іншае, мяркуецца, што апеляцыя пададзена на ўсе часткі прысуду.

Кан. 1638 – Апеляцыя прыпыняе выкананне прысуду.

Кан. 1639 – § 1. Захоўваючы прадпісанне кан. 1683 [1680 § 4], на ступені апеляцыі не можа быць дапушчана новая падстава патрабавання, нават у выглядзе карыснай кумуляцыі, таму пачатак судовай спрэчкі можа датычыць толькі таго, ці будзе папярэдні прысуд пацверджаны ці зменены, поўнасцю ці часткова.

§ 2. Пры гэтым новыя доказы дапускаюцца толькі згодна з нормай кан. 1600.

Can. 1636 – § 1. Appellans potest appellationi renuntiare cum effectibus, de quibus in can. 1525.

§ 2. Si appellatio proposita sit a vinculi defensore vel a promotore iustitiae, renuntiatio fieri potest, nisi lex aliter caveat, a vinculi defensore vel promotore iustitiae tribunalis appellationis.

Can. 1637 – § 1. Appellatio facta ab actore prodest etiam convento, et vicissim.

§ 2. Si plures sunt conventi vel actores et ab uno vel contra unum tantum ex ipsis sententia impugnetur, impugnatio censetur ab omnibus et contra omnes facta, quoties res petita est individua aut obligatio solidalis.

§ 3. Si interponatur ab una parte super aliquo sententiae capite, pars adversa, etsi fatalia appellationis fuerint transacta, potest super aliis capitibus incidenter appellare intra terminum peremptorium quindecim dierum a die, quo ipsi appellatio principalis notificata est.

§ 4. Nisi aliud constet, appellatio praesumitur facta contra omnia sententiae capita.

Can. 1638 – Appellatio exsecutionem sententiae suspendit.

Can. 1639 – § 1. Salvo praescripto can. 1683 [1680 § 4], in gradu appellationis non potest admitti nova petendi causa, ne per modum quidem utilis cumulationis; ideoque litis contestatio in eo tantum versari potest, ut prior sententia vel confirmetur vel reformetur sive ex toto sive ex parte.

§ 2. Novae autem probationes admittuntur tantum ad normam can. 1600.

Can. 1640 – In gradu appellationis eodem modo, quo in prima instantia, congrua congruis referendo, procedendum est; sed, nisi forte complendae sint probationes, statim post litem ad normam can. 1513, § 1 et can. 1639, § 1 contestatam, ad causae discussionem deveniatur et ad sententiam.

Кан. 1640 – На ступені апеляцыі працэс павінен весціся ў тым самым парадку, што і ў першай інстанцыі, з адпаведнымі папраўкамі; аднак, калі не патрабуецца дапоўніць доказы, адразу пасля пачатку судовай спрэчкі, згодна з нормай кан. 1513 § 1 і 1639 § 1, павінны пачынацца судовыя дэбаты і вынясенне прысуду.

TITULUS IX
DE *RE IUDICATA* ET DE RESTITUTIONE IN INTEGRUM

Caput I
De *re iudicata*

Can. 1641 – Firmo praescripto can. 1643, res iudicata habetur:

1° si duplex intercesserit inter easdem partes sententia conformis de eodem petito et ex eadem causa petendi;

2° si appellatio adversus sententiam non fuerit intra tempus utile proposita;

3° si, in gradu appellationis, instantia perempta sit vel eidem renuntiatum fuerit;

4° si lata sit sententia definitiva, a qua non datur appellatio ad normam can. 1629.

Can. 1642 – § 1. Res iudicata firmitate iuris gaudet nec impugnari potest directe, nisi ad normam can. 1645, § 1.

§ 2. Eadem facit ius inter partes et dat actionem iudicati atque exceptionem rei iudicatae, quam iudex ex officio quoque declarare potest ad impediendam novam eiusdem causae introductionem.

ТЫТУЛ IX
СТАН *RES IUDICATA* І ВЯРТАННЕ Ў ЗЫХОДНЫ СТАН

Раздзел I
Стан *res iudicata*

Кан. 1641 – Захоўваючы прадпісанне кан. 1643, стан *res iudicata* наступае тады, калі:

1° вынесены два згодныя паміж сабой прысуды па спрэчцы паміж тымі самымі бакамі, адносна таго самага патрабавання і па той самай падставе патрабаванняў;

2° апеляцыя на прысуд не была пададзена на працягу карыснага часу;

3° на ступені апеляцыі інстанцыя была спынена або ад яе адмовіліся;

4° быў вынесены канчатковы прысуд, які не падлягае апеляцыі згодна з нормай кан. 1629.

Кан. 1642 – § 1. Стан *res iudicata* мае моц права і не можа быць непасрэдна аспрэчаны, калі не згодна з нормай кан. 1645 § 1.

§ 2. Ён утварае права паміж бакамі і дае правамоцтва на зварот з позвай аб выкананні прысуджанага, а таксама на закід, які датычаць стану *res iudicata*, гэты закід суддзя можа сцвердзіць таксама на моцы пасады, каб перашкодзіць новаму ўнясенню той самай справы.

Кан. 1643 – Стан *res iudicata* ніколі не наступае ў справах аб стане асобаў, не выключаючы спраў аб сепарацыі сужэнцаў.

Кан. 1644 – § 1. Калі ў справе аб стане асобаў былі вынесены два згодныя паміж сабой прысуды, можна ў любы час звярнуцца ў апеляцыйны трыбунал, прадставіўшы на працягу неаднаўляльнага тэрміну трыццаці дзён ад дня аспрэчання новыя і важкія доказы або аргументы. У сваю чаргу, апеляцыйны трыбунал на працягу месяца ад прадстаўлення новых доказаў і аргументаў павінен дэкрэтам вырашыць: павінна быць дапушчана новае прадстаўленне справы ці не.

§ 2. Зварот у вышэйшы трыбунал з мэтай дасягнення новага прадстаўлення справы не прыпыняе выканання прысуду, калі закон не прадугледжвае іншае або калі апеляцыйны трыбунал не загадае прыпыніць яго згодна з нормай кан. 1650 § 3.

Can. 1643 – Numquam transeunt in rem iudicatam causae de statu personarum, haud exceptis causis de coniugum separatione.

Can. 1644 – § 1. Si duplex sententia conformis in causa de statu personarum prolata sit, potest quovis tempore ad tribunal appellationis provocari, novis iisque gravibus probationibus vel argumentis intra peremptorium terminum triginta dierum a proposita impugnatione allatis. Tribunal autem appellationis intra mensem ab exhibitis novis probationibus et argumentis debet decreto statuere utrum nova causae propositio admitti debeat necne.

§ 2. Provocatio ad superius tribunal ut nova causae propositio obtineatur, exsecutionem sententiae non suspendit, nisi aut lex aliter caveat aut tribunal appellationis ad normam can. 1650, § 3 suspensionem iubeat.

Раздзел II
Вяртанне ў зыходны стан

Кан. 1645 – § 1. Калі толькі несправядлівасць прысуду, які перайшоў у стан *res iudicata*, з'яўляецца выразна відавочнай, існуе магчымасць вяртання ў зыходны стан.

§ 2. Несправядлівасць судовага рашэння не з'яўляецца выразна відавочнай, акрамя выпадкаў, калі:

1° прысуд так трывала заснаваны на доказах, якія пазней аказаліся фальшывымі, што без гэтых доказаў вырашальная частка прысуду з'яўляецца беспадстаўнай;

2° пазней былі выкрыты дакументы, якія несумненна пацвярджаюць новыя факты, якія патрабуюць супраціўнага рашэння;

Caput II
De restitutione in integrum

Can. 1645 – § 1. Adversus sententiam quae transierit in rem iudicatam, dummodo de eius iniustitia manifesto constet, datur restitutio in integrum.

§ 2. De iniustitia autem manifesto constare non censetur, nisi:

1° sententia ita probationibus innitatur, quae postea falsae deprehensae sint, ut sine illis probationibus pars sententiae dispositiva non sustineatur;

2° postea detecta fuerint documenta, quae facta nova et contrariam decisionem exigentia indubitanter probent;

3° sententia ex dolo partis prolata fuerit in damnum alterius;

4° legis non mere processualis praescriptum evidenter neglectum fuerit;

5° sententia adversetur praecedenti decisioni, quae in rem iudicatam transierit.

Can. 1646 – § 1. Restitutio in integrum propter motiva, de quibus in can. 1645, § 2, nn. 1– 3, petenda est a iudice qui sententiam tulit intra tres menses a die cognitionis eorundem motivorum computandos.

§ 2. Restitutio in integrum propter motiva, de quibus in can. 1645, § 2, nn. 4 et 5, petenda est a tribunali appellationis, intra tres menses a notitia publicationis sententiae; quod si in casu, de quo in can. 1645, § 2, n. 5, notitia praecedentis decisionis serius habeatur, terminus ab hac notitia decurrit.

§ 3. Termini de quibus supra non decurrunt, quamdiu laesus minoris sit aetatis.

Can. 1647 – § 1. Petitio restitutionis in integrum sententiae exsecutionem nondum inceptam suspendit.

§ 2. Si tamen ex probabilibus indiciis suspicio sit petitionem factam esse ad moras exsecutioni nectendas, iudex decernere potest ut sententia exsecutioni demandetur, assignata tamen restitutionem petenti idonea cautione ut, si restituatur in integrum, indemnis fiat.

3° прысуд быў вынесены з прычыненнем шкоды аднаму з бакоў у выніку падману, здзейсненага іншым бокам;

4° было відавочна занядбана прадпісанне закона, якое датычыць не аднаго толькі працэсуальнага парадку;

5° прысуд супярэчыць раней вынесенаму прысуду, які перайшоў у стан *res iudicata*.

Кан. 1646 – § 1. Просьба аб вяртанні ў зыходны стан на падставе матывацый, аб якіх гаворыцца ў кан. 1645 § 2, 1° – 3°, павінна быць звернута да суддзі, які вынес прысуд, на працягу трох месяцаў ад дня, калі стала вядома аб наяўнасці гэтых падстаў.

§ 2. Просьба аб вяртанні ў зыходны стан на падставе матывацый, аб якіх гаворыцца ў кан. 1645 § 2, 4° – 5°, павінна быць звернута да апеляцыйнага трыбунала на працягу трох месяцаў ад паведамлення аб абвяшчэнні прысуду; калі ў выпадку, аб якім гаворыцца ў кан. 1645 § 2, 5°, паведамленне аб ранейшым рашэнні было атрымана пазней, тэрмін адлічваецца ад гэтага паведамлення.

§ 3. Тэрміны, аб якіх згадвалася вышэй, не адлічваюцца, пакуль пацярпелы застаецца непаўналетнім.

Кан. 1647 – § 1. Просьба аб вяртанні ў зыходны стан прыпыняе выкананне прысуду, калі яно яшчэ не пачалося.

§ 2. Але, калі на падставе праўдападобных прыкмет існуе падазрэнне, што просьба пададзена для таго, каб зацягнуць выкананне прысуду, суддзя можа распарадзіцца, каб прысуд выконваўся, прызначаючы пры гэтым асобе, якая звярнулася з просьбай аб вяртанні, адпаведны залог з тым, каб у выпадку, калі адбудзецца вяртанне ў зыходны стан, гэтай асобе не была прычынена шкода.

Кан. 1648 – Дазваляючы вяртанне ў зыходны стан, суддзя павінен вынесці рашэнне па сутнасці справы.

Can. 1648 – Concessa restitutione in integrum, iudex pronuntiare debet de merito causae.

ТЫТУЛ X
СУДОВЫЯ ВЫДАТКІ І БЯСПЛАТНАЯ СУДОВАЯ ДАПАМОГА

Кан. 1649 – § 1. Біскуп, якому належыць кіраванне трыбуналам, павінен устанавіць нормы адносна:

1° прысуджэння бакоў да выплаты або кампенсацыі судовых выдаткаў;

2° узнагароджання прадстаўнікоў, адвакатаў, спецыялістаў і перакладчыкаў, а таксама вяртання стратаў сведкам;

3° аказання бясплатнай судовай дапамогі або памяншэння велічыні выдаткаў;

4° кампенсацыі шкоды, якую павінен выплаціць той, хто не толькі прайграў у судовым працэсе, але і легкадумна пачаў спрэчку;

5° грашовага дэпазіту або залогу, які павінен быць унесены для пакрыцця выдаткаў і кампенсацыі шкоды.

§ 2. Пастановы адносна выдаткаў, узнагароджанняў і кампенсацыі шкоды не падлягаюць асобнай апеляцыі, але бок можа на працягу пятнаццаці дзён звярнуцца з рэкурсам да таго самага суддзі, які можа змяніць устаноўленую суму.

TITULUS X
DE EXPENSIS IUDICIALIBUS ET DE GRATUITO PATROCINIO

Can. 1649 – § 1. Episcopus, cuius est tribunal moderari, statuat normas:

1° de partibus damnandis ad expensas iudiciales solvendas vel compensandas;

2° de procuratorum, advocatorum, peritorum et interpretum honorariis deque testium indemnitate;

3° de gratuito patrocinio vel expensarum deminutione concedendis;

4° de damnorum refectione quae debetur ab eo qui non solum in iudicio succubuit, sed temere litigavit;

5° de pecuniae deposito vel cautione praestanda circa expensas solvendas et damna reficienda.

§ 2. A pronuntiatione circa expensas, honoraria et damna reficienda non datur distincta appellatio, sed pars recurrere potest intra quindecim dies ad eundem iudicem, qui poterit taxationem emendare.

ТЫТУЛ XI
ВЫКАНАННЕ СУДОВАГА РАШЭННЯ

Кан. 1650 – § 1. Прысуд, які перайшоў у стан *res iudicata*, можа быць выкананы, захоўваючы прадпісанне кан. 1647.

TITULUS XI
DE EXSECUTIONE SENTENTIAE

Can. 1650 – § 1. Sententia quae transiit in rem iudicatam, exsecutioni mandari potest, salvo praescripto can. 1647.

§ 2. Iudex qui sententiam tulit et, si appellatio proposita sit, etiam iudex appellationis, sententiae, quae nondum transierit in rem iudicatam, provisoriam exsecutionem iubere possunt ex officio vel ad instantiam partis, idoneis, si casus ferat, praestitis cautionibus, si agatur de provisionibus seu praestationibus ad necessariam sustentationem ordinatis, vel alia iusta causa urgeat.

§ 3. Quod si sententia, de qua in § 2, impugnetur, iudex qui de impugnatione cognoscere debet, si videt hanc probabiliter fundatam esse et irreparabile damnum ex exsecutione oriri posse, potest vel exsecutionem ipsam suspendere vel eam cautioni subicere.

Can. 1651 – Non antea exsecutioni locus esse poterit, quam exsecutorium iudicis decretum habeatur, quo edicatur sententiam ipsam exsecutioni mandari debere; quod decretum pro diversa causarum natura vel in ipso sententiae tenore includatur vel separatim edatur.

Can. 1652 – Si sententiae exsecutio praeviam rationum redditionem exigat, quaestio incidens habetur, ab illo ipso iudice decidenda, qui tulit sententiam exsecutioni mandandam.

Can. 1653 – § 1. Nisi lex particularis aliud statuat, sententiam exsecutioni mandare debet per se vel per alium Episcopus dioecesis, in qua sententia primi gradus lata est.

§ 2. Quod si hic renuat vel neglegat, parte cuius interest instante vel etiam

§ 2. Суддзя, які вынес прысуд, а ў выпадку, калі была пададзена апеляцыя, таксама апеляцыйны суддзя могуць на моцы пасады або ў адказ на хадайніцтва боку загадаць, каб прысуд, які яшчэ не перайшоў у стан *res iudicata*, выконваўся часова, паклапаціўшыся — пры неабходнасці — аб тым, каб быў заплачаны адпаведны залог, калі гаворка ідзе пра забеспячэнне, іншымі словамі — выплату, прызначаную на неабходнае ўтрыманне, або да гэтага схіляе іншая справядлівая прычына.

§ 3. Калі прысуд, аб якім гаворыцца ў § 2, будзе аспрэчаны, суддзя, які павінен разгледзець аспрэчанне, можа або прыпыніць выкананне дадзенага прысуду, або паклапаціцца, каб быў дадзены залог, калі палічыць, што аспрэчанне мае праўдападобныя падставы і што выкананне прысуду можа прывесці да непапраўнай шкоды.

Кан. 1651 – Прысуд не можа пачаць выконвацца раней, чым будзе выдадзены выканаўчы дэкрэт суддзі, у якім будзе пастаноўлена, што дадзены прысуд павінен быць выкананы; у залежнасці ад сутнасці той ці іншай справы гэты дэкрэт павінен быць або ўключаны ў змест самога прысуду, або выдадзены асобна.

Кан. 1652 – Калі выкананне прысуду патрабуе папярэдняга разліку, гэта з'яўляецца пабочнай судовай справай, якая павінна быць вырашана суддзёй, які вынес выканальны прысуд.

Кан. 1653 – § 1. Калі партыкулярны закон не ўстанаўлівае іншае, біскуп той дыяцэзіі, дзе прысуд быў вынесены ў першай інстанцыі, павінен асабіста або праз іншую асобу распарадзіцца аб выкананні прысуду.

§ 2. Калі біскуп адмовіцца ад гэтага або занядбае, па хадайніцтве зацікаўленага

боку, а таксама на моцы пасады выкананне ўскладаецца на тую ўладу, якой, згодна з нормай кан. 1439 § 3, падначалены апеляцыйны трыбунал.

§ 3. Выкананне прысуду паміж манаскімі асобамі ўскладаецца на настаяцеля, які вынес выканальны прысуд або дэлегаваў суддзю.

Кан. 1654 – § 1. Выканаўца павінен выканаць прысуд у адпаведнасці з відавочным значэннем слоў, калі ў самім тэксце прысуду што-небудзь не было пакінута на яго вырашэнне.

§ 2. Выканаўцу дазваляецца разглядаць закіды, якія датычаць парадку і моцы выканання, але не сутнасці справы; аднак калі б ён акрэсленым чынам даведаўся аб нядзейснасці або выразнай несправядлівасці прысуду згодна з нормамі кан. 1620, 1622, 1645, то павінен устрымацца ад выканання і — паведаміўшы аб гэтым бакі — вярнуць справу ў трыбунал, які вынес прысуд.

Кан. 1655 – § 1. У выпадку рэчавых позваў, калі акрэсленая рэч прысуджаецца пазоўніку, яна павінна быць перададзена яму адразу пасля таго, як наступіць стан *res iudicata*.

§ 2. У выпадку позваў, якія датычаць асобаў, калі адказчыка прысудзілі да таго, каб ён перадаў рухомую маёмасць, або выплаціў грошы, або што-небудзь аддаў ці здзейсніў, суддзя ў самім тэксце прысуду або выканаўца па сваім вырашэнні і ў адпаведнасці са сваёй разважлівасцю павінен для выканання гэтага абавязку ўстанавіць тэрмін, які, пры гэтым, не павінен быць скарочаны да менш чым пятнаццаці дзён і не павінен быць падоўжаны да больш чым шасці месяцаў.

ex officio, exsecutio spectat ad auctoritatem cui tribunal appellationis ad normam can. 1439, § 3 subicitur.

§ 3. Inter religiosos exsecutio sententiae spectat ad Superiorem qui sententiam exsecutioni mandandam tulit aut iudicem delegavit.

Can. 1654 – § 1. Exsecutor, nisi quid eius arbitrio in ipso sententiae tenore fuerit permissum, debet sententiam ipsam, secundum obvium verborum sensum, exsecutioni mandare.

§ 2. Licet ei videre de exceptionibus circa modum et vim exsecutionis, non autem de merito causae; quod si habeat aliunde compertum sententiam esse nullam vel manifeste iniustam ad normam cann. 1620, 1622, 1645, abstineat ab exsecutione, et rem ad tribunal a quo lata est sententia remittat, partibus certioribus factis.

Can. 1655 – § 1. Quod attinet ad reales actiones, quoties adiudicata actori res aliqua est, haec actori tradenda est statim ac res iudicata habetur.

§ 2. Quod vero attinet ad actiones personales, cum reus damnatus est ad rem mobilem praestandam, vel ad solvendam pecuniam, vel ad aliud dandum aut faciendum, iudex in ipso tenore sententiae vel exsecutor pro suo arbitrio et prudentia terminum statuat ad implendam obligationem, qui tamen neque infra quindecim dies coarctetur neque sex menses excedat.

SECTIO II

DE PROCESSU
CONTENTIOSO ORALI

Can. 1656 – § 1. Processu contentioso orali, de quo in hac sectione, tractari possunt omnes causae a iure non exclusae, nisi pars processum contentiosum ordinarium petat.

§ 2. Si processus oralis adhibeatur extra casus iure permissos, actus iudiciales sunt nulli.

Can. 1657 – Processus contentiosus oralis fit in primo gradu coram iudice unico, ad normam can. 1424.

Can. 1658 – § 1. Libellus quo lis introducitur, praeter ea quae in can. 1504 recensentur, debet:

1° facta quibus actoris petitiones innitantur, breviter, integre et perspicue exponere;

2° probationes quibus actor facta demonstrare intendit, quasque simul afferre nequit, ita indicare ut statim colligi a iudice possint.

§ 2. Libello adnecti debent, saltem in exemplari authentico, documenta quibus petitio innititur.

Can. 1659 – § 1. Si conamen conciliationis ad normam can. 1446, § 2 inutile cesserit, iudex, si aestimet libellum aliquo fundamento niti, intra tres dies, decreto ad calcem ipsius libelli apposito, praecipiat ut exemplar petitionis notificetur parti conventae, facta huic facultate mittendi, intra quindecim dies, ad cancellariam tribunalis scriptam responsionem.

СЕКЦЫЯ II

ВУСНЫ СПРЭЧНЫ ПРАЦЭС

Кан. 1656 – § 1. У парадку вуснага спрэчнага працэсу, пра які ідзе гаворка ў гэтай секцыі, могуць разглядацца ўсе не выключаныя правам справы, калі бок не просіць аб звычайным спрэчным працэсе.

§ 2. Калі вусны працэс прымяняецца паза дазволенымі правам выпадкамі, судовыя дзеянні з'яўляюцца нядзейснымі.

Кан. 1657 – У першай інстанцыі вусны спрэчны працэс праходзіць перад аднаасобным суддзёй згодна з нормай кан. 1424.

Кан. 1658 – § 1. Акрамя таго, што пералічана ў кан. 1504, пазоўная заява, якой уносіцца спрэчная справа, павінна:

1° кароткa, поўна і ясна прадстаўляць факты, на якіх абапіраюцца патрабаванні пазоўніка;

2° такім чынам указваць доказы, якімі пазоўнік мае намер пацвердзіць факты, але не мае магчымасці прадставіць іх адначасова, каб яны адразу маглі быць сабраны суддзёй.

§ 2. Да пазоўнай заявы павінны быць далучаны — прынамсі ў выглядзе заверанай копіі — дакументы, на якіх абапіраецца просьба.

Кан. 1659 – § 1. Калі спроба прымірэння, у адпаведнасці з нормай кан. 1446 § 2, акажацца безвыніковай, суддзя, калі палічыць, што пазоўная заява мае якую-небудзь падставу, павінен на працягу трох дзён прадпісаць дэкрэтам, далучаным напрыканцы самой пазоўнай заявы, каб копія просьбы была прадстаўлена адказчыку ў выглядзе паведамлення, даючы яму магчымасць скіравання пісьмовага адказу ў канцылярыю трыбунала на працягу пятнаццаці дзён.

§ 2. Гэтае паведамленне выклікае такія самыя наступствы, як выклік у суд, аб якім гаворыцца ў кан. 1512.

Кан. 1660 – Калі гэтага патрабуюць пярэчанні адказчыка, суддзя павінен вызначыць пазоўніку тэрмін на адказ, каб на падставе прадстаўленых абодвума бакамі звестак ён сам мог высветліць прадмет спрэчкі.

Кан. 1661 – § 1. Пасля заканчэння тэрмінаў, аб якіх гаворыцца ў кан. 1659 і 1660, суддзя, вывучыўшы акты справы, павінен акрэсліць формулу спрэчных пытанняў; пасля гэтага ён павінен выклікаць усіх зацікаўленых асоб на разгляд, які павінен адбыцца не пазней чым праз трыццаць дзён, далучаючы да выкліку, скіраванага бакам, формулу спрэчных пытанняў.

§ 2. У выкліку, скіраваным бакам, яны павінны быць паведамлены аб тым, што могуць не пазней чым за тры дні да разгляду прадставіць трыбуналу кароткі тэкст у падтрымку сваіх сцвярджэнняў.

Кан. 1662 – На разглядзе спачатку разглядаюцца пытанні, аб якіх гаворыцца ў кан. 1459–1464.

Кан. 1663 – § 1. Доказы збіраюцца падчас разгляду з захаваннем прадпісання кан. 1418.

§ 2. Бок, а таксама яго адвакат, могуць прысутнічаць на допыце іншых бакоў, сведкаў і спецыялістаў.

Кан. 1664 – Адказы бакоў, сведкаў, спецыялістаў, патрабаванні і закіды адвакатаў павінны быць запісаны натарыусам, аднак толькі ў агульных рысах і толькі тое, што датычыць сутнасці прадмету спрэчкі, і павінны быць падпісаны асобамі, якія даюць паказанні.

§ 2. Haec notificatio effectus habet citationis iudicialis, de quibus in can. 1512.

Can. 1660 – Si exceptiones partis conventae id exigant, iudex parti actrici praefiniat terminum ad respondendum, ita ut ex allatis utriusque partis elementis ipse controversiae obiectum perspectum habeat.

Can. 1661 – § 1. Elapsis terminis, de quibus in cann. 1659 et 1660, iudex, perspectis actis, formulam dubii determinet; dein ad audientiam, non ultra triginta dies celebrandam, omnes citet qui in ea interesse debent, addita pro partibus dubii formula.

§ 2. In citatione partes certiores fiant se posse, tres saltem ante audientiam dies, aliquod breve scriptum tribunali exhibere ad sua asserta comprobanda.

Can. 1662 – In audientia primum tractantur quaestiones de quibus in cann. 1459-1464.

Can. 1663 – § 1. Probationes colliguntur in audientia, salvo praescripto can. 1418.

§ 2. Pars eiusque advocatus assistere possunt excussioni ceterarum partium, testium et peritorum.

Can. 1664 – Responsiones partium, testium, peritorum, petitiones et exceptiones advocatorum, redigendae sunt scripto a notario, sed summatim et in iis tantummodo quae pertinent ad substantiam rei controversae, et a deponentibus subsignandae.

Can. 1665 – Probationes, quae non sint in petitione vel responsione allatae aut petitae, potest iudex admittere tantum ad normam can. 1452; postquam autem vel unus testis auditus est, iudex potest tantummodo ad normam can. 1600 novas probationes decernere.

Кан. 1665 – Доказы, якія не былі ўказаны ў просьбе ці адказе або аб якіх не прасілі, суддзя можа дапусціць толькі згодна з нормай кан. 1452; аднак пасля таго, як быў выслуханы прынамсі адзін сведка, суддзя можа прыняць рашэнне аб зборы новых доказаў толькі згодна з нормай кан. 1600.

Can. 1666 – Si in audientia probationes omnes colligi non potuerint, altera statuatur audientia.

Кан. 1666 – Калі падчас разгляду не было магчымасці сабраць усе доказы, павінен быць прызначаны наступны разгляд.

Can. 1667 – Probationibus collectis, fit in eadem audientia discussio oralis.

Кан. 1667 – Пасля таго, як доказы будуць сабраны, падчас таго ж разгляду адбываюцца вусныя дэбаты.

Can. 1668 – § 1. Nisi ex discussione aliquid supplendum in causae instructione comperiatur, vel aliud exsistat quod impediat sententiam rite proferri, iudex illico, expleta audientia, causam seorsum decidat; dispositiva sententiae pars statim coram partibus praesentibus legatur.

Кан. 1668 – § 1. Калі з дэбатаў не будзе вынікаць патрэба якога-небудзь дапаўнення даследавання справы і не будзе нічога, што магло б перашкаджаць належнаму вынясенню прысуду, то адразу пасля заканчэння разгляду суддзя павінен сам-насам вырашыць справу; вырашальная частка прысуду павінна быць адразу зачытана ў прысутнасці бакоў.

§ 2. Potest autem tribunal propter rei difficultatem vel aliam iustam causam usque ad quintum utilem diem decisionem differre.

§ 2. Аднак па прычыне цяжкасці справы ці па іншай справядлівай прычыне трыбунал можа адкласці рашэнне на тэрмін да пяці карысных дзён.

§ 3. Integer sententiae textus, motivis expressis, quam primum, ordinarie non ultra quindecim dies, partibus notificetur.

§ 3. Поўны тэкст прысуду, які ўключае абгрунтаванне, павінен быць як мага хутчэй прадстаўлены бакам, звычайна ў тэрмін не большы чым пятнаццаць дзён.

Can. 1669 – Si tribunal appellationis perspiciat in inferiore iudicii gradu processum contentiosum oralem esse adhibitum in casibus a iure exclusis, nullitatem sententiae declaret et causam remittat tribunali quod sententiam tulit.

Кан. 1669 – Калі апеляцыйны трыбунал высветліць, што на ніжэйшай ступені судаводства быў прыменены вусны спрэчны працэс у выпадках, выключаных правам, ён павінен сцвердзіць нядзейснасць прысуду і вярнуць справу ў трыбунал, які вынес прысуд.

Can. 1670 – In ceteris quae ad rationem procedendi attinent, serventur praescripta canonum de iudicio con-

Кан. 1670 – У іншых пытаннях, якія адносяцца да парадку вядзення працэсу, павінны захоўвацца прадпісанні канонаў аб звы-

чайным спрэчным судовым працэсе. Аднак, каб — захоўваючы справядлівасць — паспрыяць паскарэнню працэсу, трыбунал можа сваім дэкрэтам з указаннем абгрунтавання адхіліць працэсуальныя нормы, якія не былі ўстаноўлены для дзейснасці.

tentioso ordinario. Tribunal autem potest suo decreto, motivis praedito, normis processualibus, quae non sint ad validitatem statutae, derogare, ut celeritati, salva iustitia, consulat.

ЧАСТКА III
НЕКАТОРЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ ПРАЦЭСЫ

PARS III
DE QUIBUSDAM PROCESSIBUS SPECIALIBUS

ТЫТУЛ I
СУЖЭНСКІЯ ПРАЦЭСЫ

TITULUS I
DE PROCESSIBUS MATRIMONIALIBUS

Раздзел I
Справы аб сцвярджэнні нядзейснасці сужэнства

Caput I
De causis ad matrimonii nullitatem declarandam

Артыкул 1. *Кампетэнцыя суда і трыбуналы*

Кан. 1671 – § 1. Судовыя справы ахрышчаных належаць на моцы ўласнага права касцёльнаму суддзі.

§ 2. Справы, якія датычаць чыста грамадзянскіх наступстваў сужэнства, належаць дзяржаўнай уладзе, калі партыкулярнае права не пастанаўляе, што, калі гэтыя справы лічацца пабочнымі або дадатковымі, яны могуць быць разгледжаны і вырашаны касцёльным суддзёй.

Art. 1. *De foro competenti et de tribunalibus*

Can. 1671 – § 1. Causae matrimoniales baptizatorum iure proprio ad iudicem ecclesiasticum spectant.

§ 2. Causae de effectibus matrimonii mere civilibus pertinent ad civilem magistratum, nisi ius particulare statuat easdem causas, si incidenter et accessorie agantur, posse a iudice ecclesiastico cognosci ac definiri.

Кан. 1672 – У справах аб нядзейснасці сужэнства, якія не зарэзерваваны за Апостальскай Сталіцай, кампетэнцыю маюць:

1° трыбунал месца, дзе сужэнства было заключана;

2° трыбунал месца, дзе адзін ці абодва бакі маюць пастаяннае або часовае месца жыхарства;

3° трыбунал месца, дзе фактычна будзе збірацца значная колькасць доказаў.

Can. 1672 – In causis de matrimonii nullitate, quae non sint Sedi Apostolicae reservatae, competentia sunt:

1° tribunal loci in quo matrimonium celebratum est;

2° tribunal loci in quo alterutra vel utraque pars domicilium vel quasi-domicilium habet;

3° tribunal loci in quo de facto colligendae sunt pleraeque probationes.

Can. 1673 – § 1. In unaquaque dioecesi iudex primae instantiae pro causis nullitatis matrimonii iure expresse non exceptis est Episcopus dioecesanus, qui iudicialem potestatem exercere potest per se ipse vel per alios, ad normam iuris.

§ 2. Episcopus pro sua dioecesi tribunal dioecesanum constituat pro causis nullitatis matrimonii, salva facultate ipsius Episcopi accedendi ad aliud dioecesanum vel interdioecesanum vicinius tribunal.

§ 3. Causae de matrimonii nullitate collegio trium iudicum reservantur. Eidem praeesse debet iudex clericus, reliqui iudices etiam laici esse possunt.

§ 4. Episcopus Moderator, si tribunal collegiale constitui nequeat in dioecesi vel in viciniore tribunali ad normam § 2 electo, causas unico iudici clerico committat qui, ubi fieri possit, duos assessores probatae vitae, peritos in scientiis iuridicis vel humanis, ab Episcopo ad hoc munus approbatos, sibi asciscat; eidem iudici unico, nisi aliud constet, ea competunt quae collegio, praesidi vel ponenti tribuuntur.

§ 5. Tribunal secundae instantiae ad validitatem semper collegiale esse debet, iuxta praescriptum praecedentis § 3.

§ 6. A tribunali primae instantiae appellatur ad tribunal metropolitanum secundae instantiae, salvis praescriptis cann. 1438-1439 et 1444.

Кан. 1673 – § 1. У кожнай дыяцэзіі суддзёй першай інстанцыі ў справах аб нядзейснасці сужэнства, якія не былі выразна выключаны правам, з'яўляецца дыяцэзіяльны біскуп, які можа ажыццяўляць судовую ўладу асабіста або праз іншых, згодна з нормамі права.

§ 2. Біскуп павінен устанавіць у сваёй дыяцэзіі дыяцэзіяльны трыбунал для спраў аб нядзейснасці сужэнстваў, з захаваннем паўнамоцтва гэтага біскупа на далучэнне да суседняга дыяцэзіяльнага або міждыяцэзіяльнага трыбунала.

§ 3. Справы аб нядзейснасці сужэнства зарэзерваваны для калегіі, якая складаецца з трох суддзяў. Старшынстваваць у калегіі павінен суддзя, які з'яўляецца духоўнай асобай, іншымі суддзямі могуць быць таксама свецкія асобы.

§ 4. Калі ў дыяцэзіі або ў суседніх трыбуналах, выбраных згодна з нормай § 2, няма магчымасці ўстанавіць калегіяльны трыбунал, біскуп, які кіруе трыбуналам, павінен даручыць справы аднаму суддзі — духоўнай асобе, які там, дзе гэта будзе магчыма, павінен прыцягнуць сабе на дапамогу двух асэсараў бездакорнага жыцця, спецыялістаў у юрыдычных ці грамадскіх навуках, зацверджаных біскупам для гэтага задання; калі не сцверджана іншае, гэты аднаасобны суддзя мае кампетэнцыі, якія належаць калегіі, старшыні ці дакладчыку.

§ 5. Трыбунал другой інстанцыі для дзейснасці заўсёды павінен быць калегіяльным у адпаведнасці з прадпісаннем папярэдняга § 3.

§ 6. З трыбунала першай інстанцыі апеляцыя падаецца ў мітрапалітальны трыбунал другой інстанцыі, захоўваючы прадпісанні кан. 1438–1439 і 1444.

Артыкул 2. *Права на аспрэчванне сужэнства*

Кан. 1674 – § 1. Здольнымі да аспрэчвання сужэнства з'яўляюцца:

1° сужэнцы;

2° прамотар справядлівасці, пры тым, што аб нядзейснасці сужэнства ўжо стала публічна вядома, калі сужэнства не можа быць канвалідавана або гэта недарэчна.

§ 2. Сужэнства, якое не было абскарджана пры жыцці сужэнцаў, не можа быць абскарджана пасля смерці аднаго ці абодвух сужэнцаў, калі пытанне, якое датычыць дзейснасці, не мае прэюдыцыяльнага значэння для вырашэння іншай спрэчкі ў кананічным або дзяржаўным судзе.

§ 3. Калі сужэнец памірае ў час працэсу, павінны быць захаваны прадпісанні кан. 1518.

Art. 2. *De iure impugnandi matrimonium*

Can. 1674 – § 1. Habiles sunt ad matrimonium impugnandum:

1° coniuges;

2° promotor iustitiae, cum nullitas iam divulgata est, si matrimonium convalidari nequeat aut non expediat.

§ 2. Matrimonium quod, utroque coniuge vivente, non fuit accusatum, post mortem alterutrius vel utriusque coniugis accusari non potest, nisi quaestio de validitate sit praeiudicialis ad aliam solvendam controversiam sive in foro canonico sive in foro civili.

§ 3. Si autem coniux moriatur pendente causa, servetur can. 1518.

Артыкул 3. *Унясенне і інструкцыя справы*

Кан. 1675 – Перад тым, як прыняць справу, суддзя павінен упэўніцца, што сужэнства распалася настолькі беспаваротна, што магчымасць узнаўлення сумеснага сужэнскага жыцця адсутнічае.

Кан. 1676 – § 1. Пасля атрымання пазоўнай заявы судовы вікарый — калі палічыць, што заява мае акрэсленую падставу, — павінен яе прыняць і дэкрэтам, змешчаным напрыканцы пазоўнай заявы, распарадзіцца, каб яе копія была скіравана абаронцу повязі, а таксама — калі пазоўная заява не была падпісана абодвума бакамі — адказчыку, вызначаючы яму тэрмін пятнаццаці дзён для выяўлення свайго стаўлення да патрабавання.

Art. 3. *De causae introductione et instructione*

Can. 1675 – Iudex, antequam causam acceptet, certior fieri debet matrimonium irreparabiliter pessum ivisse, ita ut coniugalis convictus restitui nequeat.

Can. 1676 – § 1. Recepto libello, Vicarius iudicialis si aestimet eum aliquo fundamento niti, eum admittat et, decreto ad calcem ipsius libelli apposito, praecipiat ut exemplar notificetur defensori vinculi et, nisi libellus ab utraque parte subscriptus fuerit, parti conventae, eidem dato termino quindecim dierum ad suam mentem de petitione aperiendam.

§ 2. Praefato termino transacto, altera parte, si et quatenus, iterum monita ad suam mentem ostendendam, audito vinculi defensore, Vicarius iudicialis suo decreto dubii formulam determinet et decernat utrum causa processu ordinario an processu breviore ad mentem cann. 1683-1687 pertractanda sit. Quod decretum partibus et vinculi defensori statim notificetur.

§ 3. Si causa ordinario processu tractanda est, Vicarius iudicialis, eodem decreto, constitutionem iudicum collegii vel iudicis unici cum duobus assessoribus iuxta can. 1673, § 4 disponat.

§ 4. Si autem processus brevior statutus est, Vicarius iudicialis agat ad normam can. 1685.

§ 5. Formula dubii determinare debet quo capite vel quibus capitibus nuptiarum validitas impugnetur.

Can. 1677 – § 1. Defensori vinculi, partium patronis et, si in iudicio sit, etiam promotori iustitiae ius est:

1° examini partium, testium et peritorum adesse, salvo praescripto can. 1559;

2° acta iudicialia, etsi nondum publicata, invisere et documenta a partibus producta recognoscere.

§ 2. Examini, de quo in § 1, n. 1, partes assistere nequeunt.

Can. 1678 – § 1. In causis de matrimonii nullitate, confessio iudicialis et partium declarationes, testibus forte de ipsarum partium credibilitate sustentae, vim plenae probationis ha-

§ 2. Пасля заканчэння ўказанага тэрміну і — калі будзе неабходна — пасля паўторнага закліку другога боку да выяўлення свайго стаўлення, выслухаўшы абаронцу повязі, судовы вікарый павінен сваім дэкрэтам акрэсліць формулу спрэчных пытанняў і вырашыць: павінна справа быць разгледжана ў парадку звычайнага працэсу ці скарочанага згодна з нормамі кан. 1683–1687. Гэты дэкрэт павінен быць адразу скіраваны бакам і абаронцу повязі.

§ 3. Калі справа павінна разглядацца ў звычайным працэсе, судовы вікарый павінен у тым жа дэкрэце распарадзіцца аб устанаўленні калегіі суддзяў або аднаасобнага суддзі з двума асэсарамі ў адпаведнасці з кан. 1673 § 4.

§ 4. Калі быў вызначаны скарочаны працэс, судовы вікарый павінен дзейнічаць згодна з нормай кан. 1685.

§ 5. Формула спрэчных пытанняў павінна акрэсліваць, на якой або на якіх падставах аспрэчваецца дзейснасць сужэнства.

Кан. 1677 – § 1. Абаронца повязі, адвакаты бакоў, а таксама — калі прымае ўдзел у судовым працэсе — прамотар справядлівасці маюць права:

1° прысутнічаць на допыце бакоў, сведкаў і спецыялістаў, захоўваючы прадпісанне кан. 1559;

2° праглядаць судовыя акты, нават калі яны яшчэ не былі апублікаваны, а таксама знаёміцца з дакументамі, прадстаўленымі бакамі.

§ 2. Бакі не могуць прысутнічаць на допытах, аб якіх гаворыцца ў § 1, 1°.

Кан. 1678 – § 1. У справах аб нядзейснасці сужэнства судовыя прызнанні і сцвярджанні бакоў, падтрыманыя паказаннямі сведкаў, якія пацвярджаюць іх верагоднасць, могуць мець моц канчатковага дока-

зу, якую павінен ацаніць суддзя, зважыўшы ўсе абставіны і прыкметы, калі не далучаны іншыя, супраціўныя ім доказы.

§ 2. У справах, аб якіх згадваецца вышэй, паказанні адзінага сведкі могуць мець поўную верагоднасць, калі гаворка ідзе пра кваліфікаванага сведку, які дае паказанні аб справах, здзейсненых у сувязі з выкананнем пасады, або калі да гэтага схіляюць акалічнасці, звязаныя з рэчамі ці асобамі.

§ 3. У справах, якія датычаць імпатэнцыі або выкліканай псіхічнай хваробай ці анамаліяй псіхічнай прыроды заганы згоды, суддзя павінен звярнуцца па дапамогу да аднаго або некалькіх спецыялістаў, калі з абставінаў не вынікае выразна, што з гэтага не будзе ніякай карысці; у іншых справах павінна быць захавана прадпісанне кан. 1574.

§ 4. Кожны раз, калі падчас інструкцыі справы ўзнікне вельмі праўдападобнае сумненне адносна таго, што сужэнства магло не быць здзейснена, трыбунал можа, выслухаўшы бакі, прыпыніць справу аб нядзейснасці і дапоўніць інструкцыю, звязаную з дыспенсацыяй *super rato*, а затым пераслаць акты Апостальскай Сталіцы разам з просьбай аднаго ці абодвух сужэнцаў аб дыспенсацыі і далучаным меркаваннем трыбунала і біскупа.

bere possunt, a iudice aestimandam perpensis omnibus indiciis et adminiculis, nisi alia accedant elementa quae eas infirment.

§ 2. In iisdem causis, depositio unius testis plenam fidem facere potest, si agatur de teste qualificato qui deponat de rebus ex officio gestis, aut rerum et personarum adiuncta id suadeant.

§ 3. In causis de impotentia vel de consensus defectu propter mentis morbum vel anomaliam naturae psychicae iudex unius periti vel plurium opera utatur, nisi ex adiunctis inutilis evidenter appareat; in ceteris causis servetur praescriptum can. 1574.

§ 4. Quoties in instructione causae dubium valde probabile emerserit de non secuta matrimonii consummatione, tribunal potest, auditis partibus, causam nullitatis suspendere, instructionem complere pro dispensatione super rato, ac tandem acta transmittere ad Sedem Apostolicam una cum petitione dispensationis ab alterutro vel utroque coniuge et cum voto tribunalis et Episcopi.

Артыкул 4. *Прысуд, яго аспрэчванне і выкананне*

Кан. 1679 – Прысуд, які першы раз сцвярджае нядзейснасць сужэнства, павінен быць выкананы пасля заканчэння тэрмінаў, устаноўленых у кан. 1630–1633.

Кан. 1680 – § 1. Бок, які лічыць сябе пакрыўджаным, а таксама прамотар справядлівасці і абаронца повязі маюць поўнае

Art. 4. *De sententia, de eiusdem impugnationibus et exsecutione*

Can. 1679 – Sententia, quae matrimonii nullitatem primum declaravit, elapsis terminis a cann. 1630-1633 ordinatis, fit exsecutiva.

Can. 1680 – § 1. Integrum manet parti, quae se gravatam putet, itemque promotori iustitiae et defensori vin-

culi querelam nullitatis sententiae vel appellationem contra eandem sententiam interponere ad mentem cann. 1619-1640.

§ 2. Terminis iure statutis ad appellationem eiusque prosecutionem elapsis atque actis iudicialibus a tribunali superioris instantiae receptis, constituatur collegium iudicum, designetur vinculi defensor et partes moneantur ut animadversiones, intra terminum praestitutum, proponant; quo termino transacto, si appellatio mere dilatoria evidenter appareat, tribunal collegiale, suo decreto, sententiam prioris instantiae confirmet.

§ 3. Si appellatio admissa est, eodem modo quo in prima instantia, congrua congruis referendo, procedendum est.

§ 4. Si in gradu appellationis novum nullitatis matrimonii caput afferatur, tribunal potest, tamquam in prima instantia, illud admittere et de eo iudicare.

Can. 1681 – Si sententia exsecutiva prolata sit, potest quovis tempore ad tribunal tertii gradus pro nova causae propositione ad normam can. 1644 provocari, novis iisque gravibus probationibus vel argumentis intra peremptorium terminum triginta dierum a proposita impugnatione allatis.

Can. 1682 – § 1. Postquam sententia, quae matrimonii nullitatem declaraverit, facta est exsecutiva, partes quarum matrimonium declaratum est nullum, possunt novas nuptias contrahere, nisi vetito ipsi sententiae apposito vel ab Ordinario loci statuto id prohibeatur.

права звярнуцца са скаргай аб нядзейснасці прысуду або з апеляцыяй ад гэтага прысуду ў адпаведнасці з кан. 1619–1640.

§ 2. Пасля заканчэння ўстаноўленых правам тэрмінаў на падачу апеляцыі і яе падтрыманне, а таксама пасля атрымання судовых актаў трыбуналам вышэйшай інстанцыі павінна быць утворана калегія суддзяў, вызначаны абаронца повязі, а бакі павінны быць закліканы да таго, каб падрыхтавалі заўвагі на працягу акрэсленага тэрміну; калі пасля заканчэння гэтага тэрміну будзе відавочна, што мэтай апеляцыі з'яўляецца толькі зацягванне працэсу, калегіяльны трыбунал павінен сваім дэкрэтам пацвердзіць прысуд папярэдняй інстанцыі.

§ 3. Калі апеляцыя была прынята, працэс павінен праходзіць як у першай інстанцыі з адпаведнымі дастасаваннямі.

§ 4. Калі на апеляцыйнай ступені будзе заяўлена новая падстава нядзейснасці сужэнства, трыбунал можа яе дапусціць і разглядзець як трыбунал першай інстанцыі.

Кан. 1681 – Калі быў вынесены прысуд, які павінен быць выкананы, заўсёды можна звярнуцца ў трыбунал трэцяй ступені з мэтай новага ўнясення справы ў адпаведнасці з кан. 1644, прадстаўляючы новыя і важкія доказы або аргументы на працягу неаднаўляльнага тэрміну трыццаці дзён ад скіравання аспрэчання.

Кан. 1682 – § 1. Пасля таго, як прысуд, які сцвярджае нядзейснасць сужэнства, становіцца выканальным, бакі, нядзейснасць сужэнства якіх была сцверджана, могуць заключыць новае сужэнства, калі на гэта не была наложана забарона ў самым прысудзе або ў пастанове ардынарыя месца.

§ 2. Адразу пасля таго, як прысуд становіцца выканальным, судовы вікарый павінен паведаміць аб гэтым ардынарыя месца, дзе было заключана сужэнства. Ён павінен паклапаціцца аб тым, каб як мага хутчэй у кнігах сужэнстваў і ахрышчаных было зроблена ўзгадванне аб дэкрэце нядзейснасці сужэнства і забаронах, якія маглі быць накладзены.

§ 2. Statim ac sententia facta est exsecutiva, Vicarius iudicialis debet eandem notificare Ordinario loci in quo matrimonium celebratum est. Is autem curare debet ut quam primum de decreta nullitate matrimonii et de vetitis forte statutis in matrimoniorum et baptizatorum libris mentio fiat.

Артыкул 5. *Скарочаны сужэнскі працэс перад біскупам*

Кан. 1683 – Толькі дыяцэзіяльны біскуп можа разглядаць справы аб нядзейснасці сужэнства ў скарочаным працэсе пры выкананні наступных умоваў:

1° просьба была скіравана абодвума бакамі або адным бокам са згоды другога;

2° прадстаўлены абставіны, якія датычаць рэчаў і асобаў, пацверджаныя паказаннямі або дакументамі, якія не патрабуюць правядзення больш дакладнага высвятлення або даследавання і відавочна ўказваюць на нядзейснасць сужэнства.

Art. 5. *De processu matrimoniali breviore coram Episcopo*

Can. 1683 – Ipsi Episcopo dioecesano competit iudicare causas de matrimonii nullitate processu breviore quoties:

1° petitio ab utroque coniuge vel ab alterutro, altero consentiente, proponatur;

2° recurrant rerum personarumque adiuncta, testimoniis vel instrumentis suffulta, quae accuratiorem disquisitionem aut investigationem non exigant, et nullitatem manifestam reddant.

Кан. 1684 – Пазоўная заява, якой уносіцца скарочаны працэс, акрамя таго, што пералічана ў кан. 1504, павінна:

1° коратка, поўнасцю і ясна прадстаўляць факты, на якіх абапіраецца просьба;

2° указваць доказы, якія маглі б быць адразу сабраны суддзёй;

3° змяшчаць прыкладзеныя дакументы, на якіх абапіраецца просьба.

Can. 1684 – Libellus quo processus brevior introducitur, praeter ea quae in can. 1504 recensentur, debet:

1° facta quibus petitio innititur breviter, integre et perspicue exponere;

2° probationes, quae statim a iudice colligi possint, indicare;

3° documenta quibus petitio innititur in adnexo exhibere.

Кан. 1685 – Судовы вікарый у тым жа дэкрэце, у якім павінен акрэсліць формулу спрэчных пытанняў, пасля прызначэння інструктара і асэсара выклікае ўсіх зацікаў-

Can. 1685 – Vicarius iudicialis, eodem decreto quo dubii formulam determinat, instructore et assessore nominatis, ad sessionem non ultra

triginta dies iuxta can. 1686 celebrandam omnes citet qui in ea interesse debent.

Can. 1686 – Instructor una sessione, quatenus fieri possit, probationes colligat et terminum quindecim dierum statuat ad animadversiones pro vinculo et defensiones pro partibus, si quae habeantur, exhibendas.

Can. 1687 – § 1. Actis receptis, Episcopus dioecesanus, collatis consiliis cum instructore et assessore, perpensisque animadversionibus defensoris vinculi et, si quae habeantur, defensionibus partium, si moralem certitudinem de matrimonii nullitate adipiscitur, sententiam ferat. Secus causam ad ordinarium tramitem remittat.

§ 2. Integer sententiae textus, motivis expressis, quam citius partibus notificetur.

§ 3. Adversus sententiam Episcopi appellatio datur ad Metropolitam vel ad Rotam Romanam; si autem sententia ab ipso Metropolita lata sit, appellatio datur ad antiquiorem suffraganeum; et adversus sententiam alius Episcopi qui auctoritatem superiorem infra Romanum Pontificem non habet, appellatio datur ad Episcopum ab eodem stabiliter selectum.

§ 4. Si appellatio mere dilatoria evidenter appareat, Metropolita vel Episcopus de quo in § 3, vel Decanus Rotae Romanae, eam a limine decreto suo reiciat; si autem admissa fuerit, causa ad ordinarium tramitem in altero gradu remittatur.

леных асобаў на пасяджэнне, якое павінна адбыцца на працягу трыццаці дзён згодна з кан. 1686.

Кан. 1686 – Інструктар справы павінен — наколькі гэта будзе магчыма — сабраць доказы на працягу аднаго пасяджэння і вызначыць тэрмін пятнаццаці дзён абаронцу повязі — для прадстаўлення заўваг, а бакам — абарончых высноў, калі яны будуць.

Кан. 1687 – § 1. Атрымаўшы акты, дыяцэзіяльны біскуп, параіўшыся з інструктарам і асэсарам, беручы пад увагу заўвагі абаронцы повязі і — калі яны ёсць — абарончыя высновы бакоў, павінен, калі асягнуў маральную ўпэўненасць адносна нядзейснасці сужэнства, вынесці прысуд. У супраціўным выпадку справа перадаецца для звычайнага разгляду.

§ 2. Поўны тэкст прысуду разам з абгрунтаваннем павінен быць як мага хутчэй абвешчаны бакам.

§ 3. Апеляцыя на прысуд біскупа падаецца мітрапаліту або ў Рымскую Роту; калі прысуд быў вынесены мітрапалітам, апеляцыя падаецца старэйшаму суфрагану; апеляцыя на прысуд якога-небудзь біскупа, які не мае над сабой іншай улады, чым Рымскі Пантыфік, падаецца біскупу, якога ён сам выбраў на пастаянна.

§ 4. Калі відавочна, што апеляцыя пададзена выключна з мэтай зацягвання працэсу, мітрапаліт або біскуп, аб якім гаворыцца ў § 3, ці дэкан Рымскай Роты павінны адразу адхіліць яе сваім дэкрэтам; але, калі апеляцыя будзе прынята, справа павінна быць перададзена для правядзення звычайнага працэсу на другой ступені.

Артыкул 6. *Дакументальны працэс*

Кан. 1688 – Пасля атрымання просьбы, прадстаўленай у адпаведнасці з нормай кан. 1676, дыяцэзіяльны біскуп, або судовы вікарый, або вызначаны суддзя, прапускаючы фармальнасці звычайнага працэсу, але выклікаўшы бакі і з удзелам абаронцы повязі, могуць сцвердзіць прысудам нядзейснасць сужэнства, калі з дакумента, адносна якога адсутнічае ўсялякі супраціў або закід, з упэўненасцю вынікае наяўнасць перашкоды, якая выклікае нядзейснасць, або заганы легітымнай формы, калі толькі з такой жа ўпэўненасцю вядома, што дыспенсацыя не была ўдзелена або што прадстаўнік не меў дзейснага ўпаўнаважання.

Кан. 1689 – § 1. Калі абаронца повязі будзе разважліва лічыць, што або заганы, аб якіх гаворыцца ў кан. 1688, або адсутнасць дыспенсацыі не з'яўляюцца пэўнымі, павінен падаць апеляцыю суддзі другой інстанцыі, якому павінны быць перададзены акты, з пісьмовай заўвагай, што гаворка ідзе пра дакументальны працэс.

§ 2. Поўнае права боку, які лічыць сябе пакрыўджаным, на апеляцыю застаецца непарушным.

Кан. 1690 – Суддзя другой інстанцыі з удзелам абаронцы повязі, выслухаўшы бакі, павінен у такім самым парадку, аб якім гаворыцца ў кан. 1688, вырашыць: прысуд павінен быць пацверджаны, ці павінен быць пачаты звычайны судовы працэс. У апошнім выпадку справа перадаецца ў трыбунал першай інстанцыі.

Артыкул 7. *Агульныя нормы*

Кан. 1691 – § 1. У прысудзе бакам павінна быць нагадана аб маральных, а таксама

Art. 6. *De processu documentali*

Can. 1688 – Recepta petitione ad normam can. 1676 proposita, Episcopus dioecesanus vel Vicarius iudicialis vel Iudex designatus potest, praetermissis sollemnitatibus ordinarii processus sed citatis partibus et cum interventu defensoris vinculi, matrimonii nullitatem sententia declarare, si ex documento, quod nulli contradictioni vel exceptioni sit obnoxium, certo constet de exsistentia impedimenti dirimentis vel de defectu legitimae formae, dummodo pari certitudine pateat dispensationem datam non esse, aut de defectu validi mandati procuratoris.

Can. 1689 – § 1. Adversus hanc declarationem defensor vinculi, si prudenter existimaverit vel vitia de quibus in can. 1688 vel dispensationis defectum non esse certa, appellare debet ad iudicem secundae instantiae, ad quem acta sunt transmittenda quique scripto monendus est agi de processu documentali.

§ 2. Integrum manet parti, quae se gravatam putet, ius appellandi.

Can. 1690 – Iudex alterius instantiae, cum interventu defensoris vinculi et auditis partibus, decernet eodem modo, de quo in can. 1688, utrum sententia sit confirmanda, an potius procedendum in causa sit iuxta ordinarium tramitem iuris; quo in casu eam remittit ad tribunal primae instantiae.

Art. 7. *Normae generales*

Can. 1691 – § 1. In sententia partes moneantur de obligationibus mora-

libus vel etiam civilibus, quibus forte teneantur, altera erga alteram et erga prolem, ad sustentationem et educationem praestandam.

§ 2. Causae ad matrimonii nullitatem declarandam, processu contentioso orali, de quo in cann. 1656-1670, tractari nequeunt.

§ 3. In ceteris quae ad rationem procedendi attinent, applicandi sunt, nisi rei natura obstet, canones de iudiciis in genere et de iudicio contentioso ordinario, servatis specialibus normis circa causas de statu personarum et causas ad bonum publicum spectantes.

грамадзянскіх абавязках, якімі бакі абцяжараны адзін адносна другога і ў адносінах да патомства, яго ўтрымання і выхавання.

§ 2. Справы аб сцвярджэнні нядзейснасці сужэнства не могуць разглядацца ў вусным спрэчным працэсе, аб якім гаворыцца ў кан. 1656–1670.

§ 3. У іншых пытаннях, якія датычаць працэсуальнага парадку, павінны прымяняцца — калі гэтаму не супрацівіцца сутнасць справы — каноны аб судовых працэсах наогул і аб звычайным спрэчным судовым працэсе з захаваннем спецыяльных нормаў, якія адносяцца да спраў аб стане асобаў і спраў, якія датычаць публічнага дабра.

Caput II
De causis separationis coniugum

Can. 1692 – § 1. Separatio personalis coniugum baptizatorum, nisi aliter pro locis particularibus legitime provisum sit, decerni potest Episcopi dioecesani decreto vel iudicis sententia ad normam canonum qui sequuntur.

§ 2. Ubi decisio ecclesiastica effectus civiles non sortitur, vel si sententia civilis praevidetur non contraria iuri divino, Episcopus dioecesis commorationis coniugum poterit, perpensis peculiaribus adiunctis, licentiam concedere adeundi forum civile.

§ 3. Si causa versetur etiam circa effectus mere civiles matrimonii, satagat iudex ut, servato praescripto § 2, causa inde ab initio ad forum civile deferatur.

Раздзел II
Справы аб сепарацыі сужэнцаў

Кан. 1692 – § 1. Асабістая сепарацыя ахрышчаных сужэнцаў, калі для некаторых месцаў іншае не прадугледжана легітымна, можа быць пастаноўлена дэкрэтам дыяцэзіяльнага біскупа або прысудам суддзі згодна з нормамі наступных канонаў.

§ 2. Калі касцёльнае рашэнне не выклікае грамадзянскіх наступстваў або калі прадбачыцца, што дзяржаўнае судовае рашэнне не будзе супярэчыць Божаму праву, дыяцэзіяльны біскуп месца прабывання сужэнцаў можа, узяўшы пад увагу асаблівыя абставіны, удзяліць дазвол на зварот у дзяржаўны суд.

§ 3. Калі справа датычыць таксама чыста грамадзянскіх наступстваў сужэнства, суддзя павінен — захоўваючы прадпісанне § 2 – паклапаціцца аб тым, каб справа з самага пачатку была скіравана ў дзяржаўны суд.

Кан. 1693 – § 1. Калі адзін з бакоў або прамотар справядлівасці не папросяць аб звычайным спрэчным працэсе, павінен быць прыменены вусны спрэчны працэс.

§ 2. Калі быў прыменены звычайны спрэчны працэс і была пададзена апеляцыя, трыбунал другой інстанцыі павінен праводзіць працэс згодна з нормай кан. 1682 § 2 [1680 § 2 і 3], захоўваючы тое, што павінна быць захавана.

Кан. 1694 – У тым, што датычыць кампетэнцыі трыбунала, павінны захоўвацца прадпісанні кан. 1673 [1672].

Кан. 1695 – Суддзя перад тым, як прыняць справу, а таксама заўсёды, калі існуе надзея на добры вынік, павінен скарыстацца з пастырскіх сродкаў з мэтай прымірэння сужэнцаў і схілення іх да ўзнаўлення сумеснага сужэнскага жыцця.

Кан. 1696 – Справы аб сепарацыі сужэнцаў таксама датычаць публічнага дабра, таму ў іх заўсёды павінен удзельнічаць прамотар справядлівасці згодна з нормай кан. 1433.

Can. 1693 – § 1. Nisi qua pars vel promotor iustitiae processum contentiosum ordinarium petant, processus contentiosus oralis adhibeatur.

§ 2. Si processus contentiosus ordinarius adhibitus sit et appellatio proponatur, tribunal secundi gradus ad normam can. 1682, § 2 [1680 §§ 2, 3] procedat, servatis servandis.

Can. 1694 – Quod attinet ad tribunalis competentiam, serventur praescripta can. 1673 [1672].

Can. 1695 – Iudex, antequam causam acceptet et quotiescumque spem boni exitus perspicit, pastoralia media adhibeat, ut coniuges concilientur et ad coniugalem convictum restaurandum inducantur.

Can. 1696 – Causae de coniugum separatione ad publicum quoque bonum spectant; ideoque iis interesse semper debet promotor iustitiae, ad normam can. 1433.

Раздзел III

Працэс аб дыспенсацыі ад заключанага, але няздзейсненага сужэнства

Кан. 1697 – Толькі сужэнцы або адзін з іх, нават насуперак другому, маюць права прасіць аб ласцы дыспенсацыі ад заключанага, але няздзейсненага сужэнства.

Кан. 1698 – § 1. Толькі Апостальская Сталіца разглядае факт няздзейсненасці сужэнства і наяўнасць справядлівай прычыны для ўдзялення дыспенсацыі.

§ 2. Дыспенсацыю ўдзяляе толькі Рымскі Пантыфік.

Caput III

De processu ad dispensationem super matrimonio rato et non consummato

Can. 1697 – Soli coniuges, vel alteruter, quamvis altero invito, ius habent petendi gratiam dispensationis super matrimonio rato et non consummato.

Can. 1698 – § 1. Una Sedes Apostolica cognoscit de facto inconsummationis matrimonii et de exsistentia iustae causae ad dispensationem concedendam.

§ 2. Dispensatio vero ab uno Romano Pontifice conceditur.

Can. 1699 – § 1. Competens ad accipiendum libellum, quo petitur dispensatio, est Episcopus dioecesanus domicilii vel quasi-domicilii oratoris, qui, si constiterit de fundamento precum, processus instructionem disponere debet.

§ 2. Si tamen casus propositus speciales habeat difficultates ordinis iuridici vel moralis, Episcopus dioecesanus consulat Sedem Apostolicam.

§ 3. Adversus decretum quo Episcopus libellum reicit, patet recursus ad Sedem Apostolicam.

Can. 1700 – § 1. Firmo praescripto can. 1681 [1678 § 4], horum processuum instructionem committat Episcopus, stabiliter vel in singulis casibus, tribunali suae vel alienae dioecesis aut idoneo sacerdoti.

§ 2. Quod si introducta sit petitio iudicialis ad declarandam nullitatem eiusdem matrimonii, instructio ad idem tribunal committatur.

Can. 1701 – § 1. In his processibus semper intervenire debet vinculi defensor.

§ 2. Patronus non admittitur, sed, propter casus difficultatem, Episcopus permittere potest ut iurisperiti opera orator vel pars conventa iuvetur.

Can. 1702 – In instructione uterque coniux audiatur et serventur, quatenus fieri possit, canones de probationibus colligendis in iudicio contentioso ordinario et in causis de matrimonii nullitate, dummodo cum horum processuum indole componi queant.

Can. 1703 – § 1. Non fit publicatio actorum; iudex tamen, si conspiciat

Кан. 1699 – § 1. Кампетэнцыю да прыняцця заявы, якая змяшчае просьбу аб дыспенсацыі, мае дыяцэзіяльны біскуп пастаяннага або часовага месца жыхарства прасіцеля; калі гэты біскуп сцвердзіць, што просьба мае падставы, павінен распарадзіцца аб правядзенні інструкцыі працэсу.

§ 2. Аднак, калі прадстаўлены выпадак звязаны з асобымі цяжкасцямі юрыдычнай або маральнай прыроды, біскуп павінен параіцца з Апостальскай Сталіцай.

§ 3. На дэкрэт, якім біскуп адхіліў заяву, можа быць пададзены рэкурс Апостальскай Сталіцы.

Кан. 1700 – § 1. Захоўваючы прадпісанне кан. 1681 [1678 § 4], біскуп павінен даручыць правядзенне інструкцыі гэтых працэсаў на пастаянна або ў асобных выпадках трыбуналу сваёй або іншай дыяцэзіі ці прыдатнаму святару.

§ 2. Калі была ўнесена судовая просьба аб сцвярджэнні нядзейснасці гэтага самага сужэнства, правядзенне інструкцыі павінна быць даручана таму самаму трыбуналу.

Кан. 1701 – § 1. У гэтых працэсах заўсёды павінен удзельнічаць абаронца повязі.

§ 2. Абаронца не дапускаецца, але ў складаным выпадку біскуп можа дазволіць, каб пазоўнік або адказчык скарысталіся з дапамогі юрыдычнага спецыяліста.

Кан. 1702 – Падчас інструкцыі павінны быць выслуханы абое сужэнцаў і — калі гэта будзе магчыма — павінны захоўвацца каноны аб збіранні доказаў у звычайным спрэчным судовым працэсе і ў справах аб нядзейснасці сужэнства, калі толькі яны могуць быць узгоднены з характарам гэтых працэсаў.

Кан. 1703 – § 1. Публікацыя актаў не адбываецца; аднак, калі суддзя заўважыць, што

сабраныя доказы ўяўляюць сабой сур'ёзную перашкоду просьбе пазоўніка або пярэчанню адказчыка, ён павінен з разважлівасцю паведаміць аб гэтым зацікаўлены бок.

§ 2. Па хадайніцтве боку суддзя можа дазволіць азнаёміцца з прадстаўленым дакументам або з дадзенымі паказаннямі і вызначыць тэрмін для таго, каб яны маглі быць растлумачаны.

Кан. 1704 – § 1. Інструктар пасля завяршэння інструкцыі павінен перадаць усе акты біскупу, далучаючы адпаведны даклад, каб той мог скласці сваё меркаванне аб сутнасці справы: як аб факце няздзейсненасці сужэнства, так і аб наяўнасці справядлівай прычыны для дыспенсацыі і дарэчнасці яе ўдзялення.

§ 2. Калі інструкцыя працэсу была даручана іншаму трыбуналу згодна з нормай кан. 1700, заўвагі на карысць повязі павінны быць зроблены ў тым жа трыбунале, аднак скласці меркаванне, аб якім гаворыцца ў § 1, павінен біскуп, які даў даручэнне; гэтаму біскупу інструктар абавязаны разам з актамі перадаць адпаведны даклад.

Кан. 1705 – § 1. Біскуп павінен перадаць усе акты разам са сваім меркаваннем і заўвагамі абаронцу повязі Апостальскай Сталіцы.

§ 2. Калі, у адпаведнасці з суджэннем Апостальскай Сталіцы, будзе патрабавацца дапаўненне інструкцыі, аб гэтым павінен быць паведамлены біскуп, пры гэтым указваюцца элементы, адносна якіх інструкцыя павінна быць дапоўнена.

§ 3. Калі Апостальская Сталіца адкажа, што на падставе прадстаўленых матэрыялаў няздзейсненасць сужэнства не сцверджана, юрыдычны спецыяліст, аб якім гаворыцца ў кан. 1701 § 2, можа ў сядзібе трыбунала

petitioni partis oratricis vel exceptioni partis conventae grave obstaculum obvenire ob adductas probationes, id parti cuius interest prudenter patefaciat.

§ 2. Parti instanti documentum allatum vel testimonium receptum iudex ostendere poterit et tempus praefinire ad deductiones exhibendas.

Can. 1704 – § 1. Instructor, peracta instructione, omnia acta cum apta relatione deferat ad Episcopum, qui votum pro rei veritate promat tum super facto inconsummationis tum super iusta causa ad dispensandum et gratiae opportunitate.

§ 2. Si instructio processus commissa sit alieno tribunali ad normam can. 1700, animadversiones pro vinculo in eodem foro conficiantur, sed votum de quo in § 1 spectat ad Episcopum committentem, cui instructor simul cum actis aptam relationem tradat.

Can. 1705 – § 1. Acta omnia Episcopus una cum suo voto et animadversionibus defensoris vinculi transmittat ad Sedem Apostolicam.

§ 2. Si, iudicio Apostolicae Sedis, requiratur supplementum instructionis, id Episcopo significabitur, indicatis elementis circa quae instructio complenda est.

§ 3. Quod si Apostolica Sedes rescripserit ex deductis non constare de inconsummatione, tunc iurisperitus de quo in can. 1701, § 2 potest acta processus, non vero votum

Episcopi, invisere in sede tribunalis ad perpendendum num quid grave adduci possit ad petitionem denuo proponendam.

Can. 1706 – Rescriptum dispensationis a Sede Apostolica transmittitur ad Episcopum; is vero rescriptum partibus notificabit et praeterea parocho tum loci contracti matrimonii tum suscepti baptismi quam primum mandabit, ut in libris matrimoniorum et baptizatorum de concessa dispensatione mentio fiat.

праглядзець акты працэсу, акрамя меркавання біскупа, каб разважыць, ці існуе магчымасць прадстаўлення важкага аргумента на карысць новай падачы просьбы.

Кан. 1706 – Апостальская Сталіца перасылае рэскрыпт аб дыспенсацыі біскупу, які паведамляе аб гэтым рэскрыпце бакі; акрамя гэтага, біскуп павінен як мага хутчэй даць распараджэнне пробашчу як таго месца, дзе сужэнства было заключана, так і таго месца, дзе быў удзелены хрост, каб у кнізе сужэнстваў і кнізе ахрышчаных было зроблена ўзгадванне аб удзеленай дыспенсацыі.

Caput IV

De processu praesumptae mortis coniugis

Can. 1707 – § 1. Quoties coniugis mors authentico documento ecclesiastico vel civili comprobari nequit, alter coniux a vinculo matrimonii solutus non habeatur, nisi post declarationem de morte praesumpta ab Episcopo dioecesano prolatam.

§ 2. Declarationem, de qua in § 1, Episcopus dioecesanus tantummodo proferre valet si, peractis opportunis investigationibus, ex testium depositionibus, ex fama aut ex indiciis moralem certitudinem de coniugis obitu obtinuerit. Sola coniugis absentia, quamvis diuturna, non sufficit.

§ 3. In casibus incertis et implexis Episcopus Sedem Apostolicam consulat.

Раздзел IV

Працэс аб меркаванай смерці сужэнца

Кан. 1707 – § 1. Заўсёды, калі смерць аднаго з сужэнцаў не можа быць пацверджана аўтэнтычным касцёльным або дзяржаўным дакументам, другі сужэнец не павінен лічыцца вызваленым ад сужэнскай повязі, калі не пасля атрымання сцверджання аб меркаванай смерці, выдадзенага дыяцэзіяльным біскупам.

§ 2. Сцверджанне, аб якім гаворыцца ў § 1, дыяцэзіяльны біскуп можа выдаць толькі ў тым выпадку, калі, правёўшы адпаведнае даследаванне, будзе мець маральную ўпэўненасць адносна смерці сужэнца, заснаваную на паказаннях сведкаў, чутках ці прыкметах. Адной толькі адсутнасці сужэнца, нават працяглай, для гэтага недастаткова.

§ 3. У сумнеўных і складаных выпадках біскуп павінен параіцца з Апостальскай Сталіцай.

ТЫТУЛ II

СПРАВЫ АБ СЦВЯРДЖЭННІ НЯДЗЕЙСНАСЦІ СВЯТОГА ПАСВЯЧЭННЯ

Кан. 1708 – Права на абскарджанне дзейснасці святога пасвячэння мае або сама духоўная асоба, або ардынарый, якому яна падпарадкавана або ў дыяцэзіі якога яна была пасвячана.

Кан. 1709 – § 1. Заява павінна быць скіравана ў кампетэнтную Кангрэгацыю, якая павінна вырашыць, хто павінен весці справу: сама Кангрэгацыя Рымскай Курыі або вызначаны ёю трыбунал.

§ 2. Пасля таго, як заява будзе скіравана, духоўнай асобе на моцы самога права забараняецца ажыццяўленне пасвячэння.

Кан. 1710 – Калі Кангрэгацыя перадасць справу ў трыбунал, павінны захоўвацца — калі гэтаму не супярэчыць сутнасць справы — каноны аб судовых працэсах наогул, а таксама аб звычайным спрэчным судовым працэсе, захоўваючы прадпісанні гэтага тытула.

Кан. 1711 – У такіх справах абаронца повязі мае такія ж правы і абавязкі, што і абаронца повязі ў сужэнскіх справах.

Кан. 1712 – Пасля другога прысуду, які пацвярджае нядзейснасць святога пасвячэння, духоўная асоба траціць усе правы, уласцівыя духоўнаму стану, і вызваляецца ад усіх абавязкаў.

TITULUS II

DE CAUSIS AD SACRAE ORDINATIONIS NULLITATEM DECLARANDAM

Can. 1708 – Validitatem sacrae ordinationis ius habent accusandi sive ipse clericus sive Ordinarius, cui clericus subest vel in cuius dioecesi ordinatus est.

Can. 1709 – § 1. Libellus mitti debet ad competentem Congregationem, quae decernet utrum causa ab ipsa Curiae Romanae Congregatione an a tribunali ab ea designato sit agenda.

§ 2. Misso libello, clericus ordines exercere ipso iure vetatur.

Can. 1710 – Si Congregatio causam ad tribunal remiserit, serventur, nisi rei natura obstet, canones de iudiciis in genere et de iudicio contentioso ordinario, salvis praescriptis huius tituli.

Can. 1711 – In his causis defensor vinculi iisdem gaudet iuribus iisdemque tenetur officiis, quibus defensor vinculi matrimonialis.

Can. 1712 – Post secundam sententiam, quae nullitatem sacrae ordinationis confirmavit, clericus omnia iura statui clericali propria amittit et ab omnibus obligationibus liberatur.

ТЫТУЛ III

Спосабы пазбегнуць судовых працэсаў

Кан. 1713 – Для таго, каб пазбегнуць судовых спрэчак, можа быць прыменена здзел-

TITULUS III

DE MODIS EVITANDI IUDICIA

Can. 1713 – Ad evitandas iudiciales contentiones transactio seu reconci-

liatio utiliter adhibetur, aut controversia iudicio unius vel plurium arbitrorum committi potest.

Can. 1714 – De transactione, de compromisso, deque iudicio arbitrali serventur normae a partibus selectae vel, si partes nullas selegerint, lex ab Episcoporum conferentia lata, si qua sit, vel lex civilis vigens in loco ubi conventio initur.

Can. 1715 – § 1. Nequit transactio aut compromissum valide fieri circa ea quae ad bonum publicum pertinent, aliaque de quibus libere disponere partes non possunt.

§ 2. Si agitur de bonis ecclesiasticis temporalibus, serventur, quoties materia id postulat, sollemnitates iure statutae pro rerum ecclesiasticarum alienatione.

Can. 1716 – § 1. Si lex civilis arbitrali sententiae vim non agnoscat, nisi a iudice confirmetur, sententia arbitralis de controversia ecclesiastica, ut vim habeat in foro canonico, confirmatione indiget iudicis ecclesiastici loci, in quo lata est.

§ 2. Si autem lex civilis admittat sententiae arbitralis coram civili iudice impugnationem, in foro canonico eadem impugnatio proponi potest coram iudice ecclesiastico, qui in primo gradu competens est ad controversiam iudicandam.

ка, іншымі словамі — міравое пагадненне, або спрэчнае пытанне можа быць перададзена на разгляд аднаго ці некалькіх арбітраў.

Кан. 1714 – Пры здзелцы, кампрамісе або арбітральным разглядзе павінны захоўвацца нормы, выбраныя бакамі, або — калі бакі не выберуць ніякіх нормаў — закон, прыняты Канферэнцыяй Біскупаў, калі такі закон існуе, або дзяржаўны закон, які дзейнічае ў тым месцы, дзе заключаецца пагадненне.

Кан. 1715 – § 1. Здзелка або кампраміс не могуць быць дзейсна заключаны ў справах, якія датычаць публічнага дабра, а таксама ў іншых справах, якімі бакі не могуць свабодна распараджацца.

§ 2. Калі гаворка ідзе пра касцёльную маёмасць, павінны — наколькі гэтага патрабуе сутнасць справы — захоўвацца фармальнасці, устаноўленыя правам адносна адчужэння касцёльнай маёмасці.

Кан. 1716 – § 1. Калі дзяржаўны закон не прызнае моцы за арбітральным прысудам, не пацверджаным суддзёй, то для таго, каб арбітральны прысуд па касцёльнай спрэчцы мог мець моц у кананічных межах, ён павінен быць пацверджаны касцёльным суддзёй месца, дзе быў вынесены.

§ 2. Калі ж дзяржаўны закон дапускае аспрэчванне арбітральнага прысуду перад дзяржаўным суддзёй, у кананічных межах такое аспрэчанне можа быць скіравана касцёльнаму суддзі, які мае кампетэнцыю ў судовым вырашэнні спрэчкі ў першай інстанцыі.

ЧАСТКА IV
КАРНЫ ПРАЦЭС

Раздзел I
Папярэдняе расследаванне

Кан. 1717 – § 1. Заўсёды, калі ардынарый атрымае прынамсі праўдападобныя звесткі аб злачынстве, ён павінен асабіста або з дапамогай іншай прыдатнай асобы, захоўваючы асцярожнасць, расследаваць факты і абставіны, а таксама наяўнасць свядомасці, калі не выглядае, што такое расследаванне поўнасцю празмерна.

§ 2. Павінен быць праяўлены клопат, каб у выніку гэтага расследавання не было пастаўлена пад пагрозу чыё-небудзь добрае імя.

§ 3. Той, хто праводзіць расследаванне, мае такія ж паўнамоцтвы і абавязкі, як аўдытар у працэсе; пры гэтым, калі пазней будзе пачаты судовы працэс, гэтая асоба не можа прымаць у ім удзел у якасці суддзі.

Кан. 1718 – § 1. Калі будзе выглядаць, што сабрана дастатковая колькасць звестак, ардынарый павінен вырашыць:

1° ці можа быць пачаты працэс для налажэння ці сцвярджэння пакарання;

2° ці гэта будзе дарэчна, беручы пад увагу кан. 1341;

3° ці павінен быць прыменены судовы працэс або — калі закон гэта не забараняе — можа быць прыменены пазасудовы дэкрэт.

§ 2. Ардынарый павінен адклікаць ці змяніць дэкрэт, аб якім гаворыцца ў § 1, калі на падставе новых звестак палічыць, што гэта павінна быць вырашана іначай.

§ 3. Пры выданні дэкрэта, аб якім гаворыцца ў § 1 і 2, ардынарый, калі разважліва

PARS IV
DE PROCESSU POENALI

Caput I
De praevia investigatione

Can. 1717 – § 1. Quoties Ordinarius notitiam, saltem veri similem, habet de delicto, caute inquirat, per se vel per aliam idoneam personam, circa facta et circumstantias et circa imputabilitatem, nisi haec inquisitio omnino superflua videatur.

§ 2. Cavendum est ne ex hac investigatione bonum cuiusquam nomen in discrimen vocetur.

§ 3. Qui investigationem agit, easdem habet, quas auditor in processu, potestates et obligationes; idemque nequit, si postea iudicialis processus promoveatur, in eo iudicem agere.

Can. 1718 – § 1. Cum satis collecta videantur elementa, decernat Ordinarius:

1° num processus ad poenam irrogandam vel declarandam promoveri possit;

2° num id, attento can. 1341, expediat;

3° utrum processus iudicialis sit adhibendus an, nisi lex vetet, sit procedendum per decretum extra iudicium.

§ 2. Ordinarius decretum, de quo in § 1, revocet vel mutet, quoties ex novis elementis aliud sibi decernendum videtur.

§ 3. In ferendis decretis, de quibus in §§ 1 et 2, audiat Ordinarius, si pru-

denter censeat, duos iudices aliosve iuris peritos.

§ 4. Antequam ad normam § 1 decernat, consideret Ordinarius num, ad vitanda inutilia iudicia, expediat ut, partibus consentientibus, vel ipse vel investigator quaestionem de damnis ex bono et aequo dirimat.

палічыць гэта дарэчным, павінен выслухаць двух суддзяў або іншых юрыдычных спецыялістаў.

§ 4. Перад тым, як ардынарый прыме рашэнне згодна з нормай § 1, ён павінен разважыць, ці для таго, каб пазбегнуць непатрэбных судовых працэсаў, не будзе мэтазгодным тое, каб са згоды бакоў ён сам або асоба, якая праводзіць расследаванне, вырашылі пытанне аб выпраўленні шкоды ў адпаведнасці з прынцыпамі дабра і суразмернасці.

Can. 1719 – Investigationis acta et Ordinarii decreta, quibus investigatio initur vel clauditur, eaque omnia quae investigationem praecedunt, si necessaria non sint ad poenalem processum, in secreto curiae archivo custodiantur.

Кан. 1719 – Акты расследавання і дэкрэты ардынарыя, якія пачынаюць і завяршаюць расследаванне, а таксама ўсё, што папярэднічала расследаванню, павінны, калі не з'яўляюцца неабходнымі для карнага працэсу, захоўвацца ў тайным архіве Курыі.

Caput II
De processus evolutione

Раздзел II
Парадак працэсу

Can. 1720 – Si Ordinarius censuerit per decretum extra iudicium esse procedendum:

1° reo accusationem atque probationes, data facultate sese defendendi, significet, nisi reus, rite vocatus, comparere neglexerit;

2° probationes et argumenta omnia cum duobus assessoribus accurate perpendat;

3° si de delicto certo constet neque actio criminalis sit extincta, decretum ferat ad normam cann. 1342-1350, expositis, breviter saltem, rationibus in iure et in facto.

Кан. 1720 – Калі ардынарый вырашыць, што павінен быць прыменены парадак пазасудовага дэкрэта:

1° павінен паведаміць абвінавачанага аб абвінавачанні і доказах, даючы яму магчымасць абараняцца, калі абвінавачаны, выкліканы належным чынам, не занядбае яўку;

2° павінен дакладна разважыць з двума асэсарамі ўсе доказы і аргументы;

3° калі існуе ўпэўненасць у здзяйсненні злачынства, а карная позва не страціла моцы, павінен выдаць дэкрэт згодна з нормамі кан. 1342–1350, указваючы, прынамсі коратка, юрыдычныя і фактычныя падставы.

Can. 1721 – § 1. Si Ordinarius decreverit processum poenalem iudicialem

Кан. 1721 – § 1. Калі ардынарый вырашыць, што павінен быць пачаты карны судовы

працэс, ён павінен перадаць акты расследавання прамотару справядлівасці, каб той прадставіў суддзі абвінаваўчую заяву згодна з нормамі кан. 1502 і 1504.

§ 2. У якасці пазоўніка перад вышэйшым трыбуналам выступае прамотар справядлівасці, які дзейнічае ў гэтым трыбунале.

esse ineundum, acta investigationis promotori iustitiae tradat, qui accusationis libellum iudici ad normam cann. 1502 et 1504 exhibeat.

§ 2. Coram tribunali superiore partes actoris gerit promotor iustitiae apud illud tribunal constitutus.

Кан. 1722 – Для таго, каб пазбегнуць спакусы, абараніць свабоду сведкаў і забяспечыць ажыццяўленне правасуддзя, ардынарый, выслухаўшы прамотара справядлівасці і выклікаўшы самога абвінавачанага, можа на любой стадыі працэсу адхіліць абвінавачанага ад святой паслугі або ад якой-небудзь пасады ці касцёльнага задання, а таксама прадпісаць або забараніць яму прабыванне ў якім-небудзь месцы ці на якой-небудзь тэрыторыі або нават забараніць яму публічна ўдзельнічаць у Найсвяцейшай Эўхарыстыі; пасля таго, як прычына перастане існаваць, усё гэта павінна быць адклікана, а таксама гэта адмяняецца на моцы самога права ў выпадку спынення карнага працэсу.

Can. 1722 – Ad scandala praevenienda, ad testium libertatem protegendam et ad iustitiae cursum tutandum, potest Ordinarius, audito promotore iustitiae et citato ipso accusato, in quolibet processus stadio accusatum a sacro ministerio vel ab aliquo officio et munere ecclesiastico arcere, ei imponere vel interdicere commorationem in aliquo loco vel territorio, vel etiam publicam sanctissimae Eucharistiae participationem prohibere; quae omnia, causa cessante, sunt revocanda, eaque ipso iure finem habent, cessante processu poenali.

Кан. 1723 – § 1. Выклікаючы злачынцу, суддзя павінен прапанаваць яму ўстанавіць сабе адваката згодна з нормай кан. 1481 § 1, на працягу тэрміну, вызначанага самім суддзёй.

§ 2. Калі ж злачынца не паклапоціцца аб гэтым, суддзя павінен перад пачаткам судовай спрэчкі сам вызначыць яму адваката, які будзе выконваць сваё заданне да таго часу, пакуль злачынца не ўстановіць сабе адваката.

Can. 1723 – § 1. Iudex reum citans debet eum invitare ad advocatum, ad normam can. 1481, § 1, intra terminum ab ipso iudice praefinitum, sibi constituendum.

§ 2. Quod si reus non providerit, iudex ante litis contestationem advocatum ipse nominet, tamdiu in munere mansurum quamdiu reus sibi advocatum non constituerit.

Кан. 1724 – § 1. На любой ступені судовага працэсу прамотар справядлівасці можа адмовіцца ад інстанцыі па даручэнні або са згоды ардынарыя, па рашэнні якога працэс быў пачаты.

Can. 1724 – § 1. In quolibet iudicii gradu renuntiatio instantiae fieri potest a promotore iustitiae, mandante vel consentiente Ordinario, ex cuius deliberatione processus promotus est.

§ 2. Renuntiatio, ut valeat, debet a reo acceptari, nisi ipse sit a iudicio absens declaratus.

Can. 1725 – In causae discussione, sive scripto haec fit sive ore, accusatus semper ius habeat ut ipse vel eius advocatus vel procurator postremus scribat vel loquatur.

Can. 1726 – In quolibet poenalis iudicii gradu et stadio, si evidenter constet delictum non esse a reo patratum, iudex debet id sententia declarare et reum absolvere, etiamsi simul constet actionem criminalem esse extinctam.

Can. 1727 – § 1. Appellationem proponere potest reus, etiam si sententia ipsum ideo tantum dimiserit, quia poena erat facultativa, vel quia iudex potestate usus est, de qua in cann. 1344 et 1345.

§ 2. Promotor iustitiae appellare potest quoties censet scandali reparationi vel iustitiae restitutioni satis provisum non esse.

Can. 1728 – § 1. Salvis praescriptis canonum huius tituli, in iudicio poenali applicandi sunt, nisi rei natura obstet, canones de iudiciis in genere et de iudicio contentioso ordinario, servatis specialibus normis de causis quae ad bonum publicum spectant.

§ 2. Accusatus ad confitendum delictum non tenetur, nec ipsi iusiurandum deferri potest.

§ 2. Для таго, каб гэтая адмова была дзейснай, яна павінна быць прынята злачынцам, калі ён не быў сцверджаны ў якасці адсутнага ў судовым працэсе.

Кан. 1725 – Падчас дэбатаў па справе, незалежна ад таго, пісьмова яны адбываюцца ці вусна, абвінавачаны заўсёды мае права на тое, каб ён або яго адвакат ці прадстаўнік пісалі або выказваліся апошнімі.

Кан. 1726 – Калі на любой ступені і стадыі судовага працэсу будзе відавочна, што злачынства не было здзейснена злачынцам, суддзя павінен сцвердзіць гэта прысудам і вызваліць злачынцу, нават калі ў той жа час будзе сцверджана, што карная позва страціла моц.

Кан. 1727 – § 1. Злачынца можа падаць апеляцыю таксама ў тым выпадку, калі прысуд вызваліў яго толькі таму, што пакаранне было факультатыўным, або таму, што суддзя скарыстаўся ўладай, аб якой гаворыцца ў кан. 1344 і 1345.

§ 2. Прамотар справядлівасці можа падаваць апеляцыю ў кожным выпадку, калі палічыць, што не быў праяўлены дастатковы клопат аб устараненні спакусы або аднаўленні справядлівасці.

Кан. 1728 – § 1. Захоўваючы прадпісанні канонаў гэтага тытула, у карным судовым працэсе — калі гэтаму не супярэчыць сутнасць справы — павінны прымяняцца каноны аб судовых працэсах наогул і аб звычайным спрэчным судовым працэсе, захоўваючы спецыяльныя нормы, якія адносяцца да спраў, якія датычаць публічнага дабра.

§ 2. Абвінавачаны не абавязаны прызнавацца ў злачынстве, ад яго таксама нельга патрабаваць складання прысягі.

Раздзел III

Позва аб выпраўленні шкоды

Кан. 1729 – § 1. Пацярпелы бок можа звяртацца са спрэчнай позвай аб выпраўленні шкоды, прычыненай яму злачынствам, у тым самым карным судовым працэсе згодна з нормай кан. 1596.

§ 2. Не дапускаецца зварот, аб якім гаворыцца ў § 1, калі пацярпелы бок не здзейсніў яго на першай ступені карнага судовага працэсу.

§ 3. Апеляцыя па справе аб шкодзе адбываецца згодна з нормамі кан. 1628–1640, нават калі ў карным судовым працэсе магчымасць апеляцыі адсутнічае; калі пададзены дзве апеляцыі, нават рознымі бакамі, павінен праходзіць адзін апеляцыйны судовы працэс, захоўваючы прадпісанне кан. 1730.

Кан. 1730 – § 1. Для таго, каб пазбегнуць празмернага зацягвання карнага судовага працэсу, суддзя можа адкласці працэс аб шкодзе да вынясення канчатковага прысуду ў карным судовым працэсе.

§ 2. Суддзя, які паступіў такім чынам, пасля вынясення прысуду ў карным судовым працэсе павінен пачаць разгляд справы аб шкодзе, нават калі карны судовы працэс яшчэ працягваецца з прычыны пададзенай апеляцыі, а таксама ў тым выпадку, калі злачынца быў вызвалены па прычыне, якая не здымае з яго абавязку выпраўлення шкоды.

Кан. 1731 – Нават калі прысуд, вынесены ў карным судовым працэсе, перайшоў у стан *res iudicata*, гэта не дае пацярпеламу боку ніякіх правамоцтваў, калі ён не звяртаўся згодна з нормай кан. 1729.

Caput III

De actione ad damna reparanda

Can. 1729 – § 1. Pars laesa potest actionem contentiosam ad damna reparanda ex delicto sibi illata in ipso poenali iudicio exercere, ad normam can. 1596.

§ 2. Interventus partis laesae, de quo in § 1, non amplius admittitur, si factus non sit in primo iudicii poenalis gradu.

§ 3. Appellatio in causa de damnis fit ad normam cann. 1628-1640, etiamsi appellatio in poenali iudicio fieri non possit; quod si utraque appellatio, licet a diversis partibus, proponatur, unicum fiat iudicium appellationis, salvo praescripto can. 1730.

Can. 1730 – § 1. Ad nimias poenalis iudicii moras vitandas potest iudex iudicium de damnis differre usque dum sententiam definitivam in iudicio poenali protulerit.

§ 2. Iudex, qui ita egerit, debet, postquam sententiam tulerit in poenali iudicio, de damnis cognoscere, etiamsi iudicium poenale propter propositam impugnationem adhuc pendeat, vel reus absolutus sit propter causam quae non auferat obligationem reparandi damna.

Can. 1731 – Sententia lata in poenali iudicio, etiamsi in rem iudicatam transierit, nullo modo ius facit erga partem laesam, nisi haec intervenerit ad normam can. 1729.

PARS V

DE RATIONE PROCEDENDI IN RECURSIBUS ADMINISTRATIVIS ATQUE IN PAROCHIS AMOVENDIS VEL TRANSFERENDIS

ЧАСТКА V

ПАРАДАК ДЗЕЯННЯЎ ПРЫ АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ РЭКУРСАХ, А ТАКСАМА ПРЫ ЗВАЛЬНЕННЯХ АБО ПЕРАМЯШЧЭННЯХ ПРОБАШЧАЎ

SECTIO I

DE RECURSU ADVERSUS DECRETA ADMINISTRATIVA

СЕКЦЫЯ I

РЭКУРС СУПРАЦЬ АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ ДЭКРЭТАЎ

Can. 1732 – Quae in canonibus huius sectionis de decretis statuuntur, eadem applicanda sunt ad omnes administrativos actus singulares, qui in foro externo extra iudicium dantur, iis exceptis, qui ab ipso Romano Pontifice vel ab ipso Concilio Oecumenico ferantur.

Кан. 1732 – Тое, што ў канонах гэтай секцыі пастанаўляецца аб дэкрэтах, павінна прымяняцца да ўсіх асобных адміністрацыйных актаў, прынятых на пазасудовым *forum externum*, за выключэннем тых, якія былі прыняты самім Рымскім Пантыфікам або Сусветным Саборам.

Can. 1733 – § 1. Valde optandum est ut, quoties quis gravatum se decreto putet, vitetur inter ipsum et decreti auctorem contentio atque inter eos de aequa solutione quaerenda communi consilio curetur, gravibus quoque personis ad mediationem et studium forte adhibitis, ita ut per idoneam viam controversia praecaveatur vel dirimatur.

Кан. 1733 – § 1. Вельмі пажадана, каб кожны раз, калі хто-небудзь лічыць сябе пакрыўджаным дэкрэтам, стараўся пазбегнуць канфлікту з тым, хто выдаў гэты дэкрэт, і каб яны супольнымі сіламі шукалі адпаведнага вырашэння, звяртаючыся — калі будзе такая патрэба — да паважаных асобаў за пасрэдніцтвам і вывучэннем справы, каб прыдатным шляхам пазбегнуць спрэчкі або яе вырашыць.

§ 2. Episcoporum conferentia statuere potest ut in unaquaque dioecesi officium quoddam vel consilium stabiliter constituatur, cui, secundum normas ab ipsa conferentia statuendas, munus sit aequas solutiones quaerere et suggerere; quod si conferentia id non iusserit, potest Episcopus eiusmodi consilium vel officium constituere.

§ 2. Канферэнцыя Біскупаў можа пастанавіць, каб у кожнай дыяцэзіі была ўстаноўлена акрэсленая пастаянна дзеючая пасада або рада, заданнем якой быў бы пошук і прапанова адпаведных вырашэнняў у адпаведнасці з нормамі, прынятымі самой Канферэнцыяй; калі Канферэнцыя гэтага не ўчыніла, устанавіць такую раду або пасаду можа біскуп.

§ 3. Officium vel consilium, de quo in § 2, tunc praecipue operam navet, cum revocatio decreti petita est

§ 3. Пасада або рада, аб якіх гаворыцца ў § 2, асабліва павінны дзейнічаць тады, калі хто-небудзь просіць аб адкліканні дэ-

крэта згодна з нормай кан. 1734 і тэрміны на зварот з рэкурсам яшчэ не мінулі; а, калі супраць дэкрэта ўжо звярнуліся з рэкурсам, сам настаяцель, які яго разглядае, павінен — калі мае надзею на добры вынік — заахвоціць асобу, якая звярнулася з рэкурсам, і таго, хто выдаў дэкрэт, да пошуку такога вырашэння.

Кан. 1734 – § 1. Перад тым, як звяртацца з рэкурсам, павінна быць скіравана пісьмовая просьба да таго, хто выдаў дэкрэт, аб адкліканні або змяненні дэкрэта; гэта азначае, што скіраванне такой просьбы з'яўляецца таксама тым самым просьбай аб прыпыненні выконвання дэкрэта.

§ 2. Просьба павінна быць скіравана на працягу неаднаўляльнага тэрміну дзесяці карысных дзён ад легітымнага ўручэння дэкрэта.

§ 3. Нормы § 1 і § 2 нядзейсныя:

1° у адносінах да рэкурсу, з якім звярнуліся да біскупа супраць дэкрэта, выдадзенага падпарадкаванымі яму ўладамі;

2° у адносінах да рэкурсу, з якім звярнуліся супраць дэкрэта, якім вырашаецца іерархічны рэкурс, калі рашэнне не было прынята біскупам;

3° у адносінах да рэкурсаў, з якімі звярнуліся згодна з нормамі кан. 57 і 1735.

Кан. 1735 – Калі той, хто выдаў дэкрэт, на працягу трыццаці дзён ад атрымання просьбы, аб якой гаворыцца ў кан. 1734, уручыць новы дэкрэт, у якім ён або змяняе папярэдні дэкрэт, або вырашае, што просьба павінна быць адхілена, тэрміны для звароту з рэкурсам пачынаюць адлічвацца ад уручэння новага дэкрэта; калі ж на працягу трыццаці дзён ён не прыняў ніякага рашэння, тэрміны пачынаюць адлічвацца ад трыццатага дня.

ad normam can. 1734, neque termini ad recurrendum sunt elapsi; quod si adversus decretum recursus propositus sit, ipse Superior, qui de recursu videt, recurrentem et decreti auctorem hortetur, quotiescumque spem boni exitus perspicit, ad eiusmodi solutiones quaerendas.

Can. 1734 – § 1. Antequam quis recursum proponat, debet decreti revocationem vel emendationem scripto ab ipsius auctore petere; qua petitione proposita, etiam suspensio exsecutionis eo ipso petita intellegitur.

§ 2. Petitio fieri debet intra peremptorium terminum decem dierum utilium a decreto legitime intimato.

§ 3. Normae §§ 1 et 2 non valent:

1° de recursu proponendo ad Episcopum adversus decreta lata ab auctoritatibus, quae ei subsunt;

2° de recursu proponendo adversus decretum, quo recursus hierarchicus deciditur, nisi decisio data sit ab Episcopo;

3° de recursibus proponendis ad normam cann. 57 et 1735.

Can. 1735 – Si intra triginta dies, ex quo petitio, de qua in can. 1734, ad auctorem decreti pervenit, is novum decretum intimet, quo vel prius emendet vel petitionem reiciendam esse decernat, termini ad recurrendum decurrunt ex novi decreti intimatione; si autem intra triginta dies nihil decernat, termini decurrunt ex tricesimo die.

Can. 1736 – § 1. In iis materiis, in quibus recursus hierarchicus suspendit decreti exsecutionem, idem efficit etiam petitio, de qua in can. 1734.

§ 2. In ceteris casibus, nisi intra decem dies, ex quo petitio de qua in can. 1734 ad ipsum auctorem decreti pervenit, is exsecutionem suspendendam decreverit, potest suspensio interim peti ab eius Superiore hierarchico, qui eam decernere potest gravibus tantum de causis et cauto semper ne quid salus animarum detrimenti capiat.

§ 3. Suspensa decreti exsecutione ad normam § 2, si postea recursus proponatur, is qui de recursu videre debet, ad normam can. 1737, § 3 decernat utrum suspensio sit confirmanda an revocanda.

§ 4. Si nullus recursus intra statutum terminum adversus decretum proponatur, suspensio exsecutionis, ad normam § 1 vel § 2 interim effecta, eo ipso cessat.

Can. 1737 – § 1. Qui se decreto gravatum esse contendit, potest ad Superiorem hierarchicum eius, qui decretum tulit, propter quodlibet iustum motivum recurrere; recursus proponi potest coram ipso decreti auctore, qui eum statim ad competentem Superiorem hierarchicum transmittere debet.

§ 2. Recursus proponendus est intra peremptorium terminum quindecim dierum utilium, qui in casibus de quibus in can. 1734, § 3 decurrunt ex die quo decretum intimatum est, in ceteris autem casibus decurrunt ad normam can. 1735.

Кан. 1736 – § 1. У справах, у якіх іерархічны рэкурс прыпыняе выконванне дэкрэта, такі ж вынік выклікае просьба, аб якой гаворыцца ў кан. 1734.

§ 2. У іншых выпадках, калі той, хто выдаў дэкрэт, на працягу дзесяці дзён ад атрымання просьбы, аб якой гаворыцца ў кан. 1734, не прыме рашэння аб прыпыненні выконвання дэкрэта, можна звяртацца да іерархічнага настаяцеля таго, хто выдаў дэкрэт, з просьбай аб часовым прыпыненні яго выконвання, такое рашэнне можа быць прынята толькі па важкіх прычынах і заўсёды з клопатам аб тым, каб пры гэтым не пацярпела збаўленне душаў.

§ 3. Калі пасля таго, як згодна з нормай § 2 выконванне дэкрэта было прыпынена, адбудзецца зварот з рэкурсам, асоба, якая павінна яго разгледзець згодна з нормай кан. 1737 § 3, павінна вырашыць: будзе прыпыненне пацверджана ці адклікана.

§ 4. Калі на працягу ўстаноўленага тэрміну ніякі зварот з рэкурсам супраць дэкрэта не адбыўся, тым самым спыняецца прыпыненне выконвання, уведзенае часова згодна з нормамі § 1 або § 2.

Кан. 1737 – § 1. Той, хто сцвярджае, што з'яўляецца пакрыўджаным дэкрэтам, можа на любой справядлівай падставе звярнуцца з рэкурсам да іерархічнага настаяцеля таго, хто выдаў гэты дэкрэт; рэкурс можа быць скіраваны самой асобе, якая выдала дэкрэт, і ён павінен быць адразу перададзены кампетэнтнаму іерархічнаму настаяцелю.

§ 2. Зварот з рэкурсам павінен быць здзейснены на працягу неаднаўляльнага тэрміну пятнаццаці карысных дзён, якія ў выпадках, аб якіх гаворыцца ў кан. 1734 § 3, пачынаюць адлічвацца ад уручэння дэкрэта; у іншых выпадках яны адлічваюцца згодна з нормай кан. 1735.

§ 3. Таксама ў выпадках, у якіх рэкурс не прыпыняе на моцы самога права выконвання дэкрэта і прыпыненне не было ўведзена згодна з нормай кан. 1736 § 2, настаяцель можа па важкай прычыне загадаць прыпыніць выконванне, праяўляючы пры гэтым клопат аб тым, каб не пацярпела збаўленне душаў.

§ 3. Etiam in casibus, in quibus recursus non suspendit ipso iure decreti exsecutionem neque suspensio ad normam can. 1736, § 2 decreta est, potest tamen gravi de causa Superior iubere ut exsecutio suspendatur, cauto tamen ne quid salus animarum detrimenti capiat.

Кан. 1738 – Той, хто звяртаецца з рэкурсам, заўсёды мае права прыцягнуць на дапамогу адваката або прадстаўніка, пазбягаючы пры гэтым непатрэбнага зацягвання; больш за тое, абаронца павінен быць устаноўлены на моцы пасады, калі той, хто звяртаецца з рэкурсам, не мае абаронцы, а настаяцель палічыць, што гэта неабходна; аднак настаяцель заўсёды можа загадаць, каб той, хто звяртаецца з рэкурсам, з'явіўся асабіста, каб быць дапытаным.

Can. 1738 – Recurrens semper ius habet advocatum vel procuratorem adhibendi, vitatis inutilibus moris; immo vero patronus ex officio constituatur, si recurrens patrono careat et Superior id necessarium censeat; semper tamen potest Superior iubere ut recurrens ipse compareat ut interrogetur.

Кан. 1739 – Настаяцель, які разглядае рэкурс, можа — калі будзе такая патрэба — не толькі пацвердзіць дэкрэт ці сцвердзіць яго нядзейснасць, але таксама зрабіць яго нядзейсным, адклікаць або — калі настаяцель палічыць гэта больш дарэчным — выправіць, замяніць іншым або часткова адмяніць.

Can. 1739 – Superiori, qui de recursu videt, licet, prout casus ferat, non solum decretum confirmare vel irritum declarare, sed etiam rescindere, revocare, vel, si id Superiori magis expedire videatur, emendare, subrogare, ei obrogare.

СЕКЦЫЯ II

ПРАЦЭДУРА ЗВАЛЬНЕННЯ АБО ПЕРАМЯШЧЭННЯ ПРОБАШЧАЎ

SECTIO II

DE PROCEDURA IN PAROCHIS AMOVENDIS VEL TRANSFERENDIS

Раздзел I

Парадак дзеянняў пры звальненнях пробашчаў

Caput I

De modo procedendi in amotione parochorum

Кан. 1740 – Калі паслуга якога-небудзь пробашча па якой-небудзь прычыне, нават без яго цяжкай віны, становіцца шкоднай або прынамсі безвыніковай, ён можа быць

Can. 1740 – Cum alicuius parochi ministerium ob aliquam causam, etiam citra gravem ipsius culpam, noxium aut saltem inefficax evadat,

potest ipse ab Episcopo dioecesano a paroecia amoveri.

Can. 1741 – Causae, ob quas parochus a sua paroecia legitime amoveri potest, hae praesertim sunt:

1° modus agendi qui ecclesiasticae communioni grave detrimentum vel perturbationem afferat;

2° imperitia aut permanens mentis vel corporis infirmitas, quae parochum suis muneribus utiliter obeundis imparem reddunt;

3° bonae existimationis amissio penes probos et graves paroecianos vel aversio in parochum, quae praevideantur non brevi cessaturae;

4° gravis neglectus vel violatio officiorum paroecialium quae post monitionem persistat;

5° mala rerum temporalium administratio cum gravi Ecclesiae damno, quoties huic malo aliud remedium afferri nequeat.

Can. 1742 – § 1. Si ex instructione peracta constiterit adesse causam de qua in can. 1740, Episcopus rem discutiat cum duobus parochis e coetu ad hoc stabiliter, a consilio presbyterali constituto, Episcopo proponente, selectis; quod si exinde censeat ad amotionem esse deveniendum, causa et argumentis ad validitatem indicatis, parocho paterne suadeat ut intra tempus quindecim dierum renuntiet.

§ 2. De parochis qui sunt sodales instituti religiosi aut societatis vitae apostolicae, servetur praescriptum can. 682, § 2.

звольнены з парафіі дыяцэзіяльным біскупам.

Кан. 1741 – Прычыны, па якіх пробашч можа быць легітымна звольнены са сваёй парафіі, пераважна наступныя:

1° спосаб дзеяння, які прычыняе касцёльнай супольнасці цяжкую шкоду або абурэнне;

2° непрацаздольнасць або трывалая псіхічная ці фізічная хвароба, якая робіць пробашча няздольным да паспяховага выконвання яго заданняў;

3° страта добрага імя сярод сумленных і паважаных парафіян або непрыязнасць да пробашча, якая, як мяркуецца, хутка не скончыцца;

4° цяжкае занядбанне або парушэнне парафіяльных абавязкаў, якое працягваецца пасля папярэджання;

5° дрэннае адміністраванне маёмасцю з цяжкай шкодай для Касцёла, у кожным выпадку, калі гэтае зло не можа быць выпраўлена іншымі сродкамі.

Кан. 1742 – § 1. Калі на падставе праведзенага даследавання будзе сцверджана наяўнасць прычыны, аб якой гаворыцца ў кан. 1740, біскуп павінен абмеркаваць гэтую справу з двума пробашчамі, выбранымі з групы, устаноўленай для гэтай мэты на пастаянна Святарскай Радай па прапанове біскупа; калі пасля гэтага біскуп вырашыць, што павінна адбыцца звальненне пробашча, ён павінен, указваючы для дзейснасці прычыны і аргументы, па-айцоўску заахвоціць пробашча, каб той адмовіўся ад пасады на працягу пятнаццаці дзён.

§ 2. У адносінах да пробашчаў, якія з'яўляюцца членамі манаскага інстытута або таварыства апостальскага жыцця, павінна быць захавана прадпісанне кан. 682 § 2.

Кан. 1743 – Адмова ад пасады можа быць пададзена пробашчам не толькі простым і безумоўным спосабам, але таксама з акрэсленай умовай, калі толькі яна можа быць легітымна прынята біскупам і сапраўды будзе прынята.

Кан. 1744 – § 1. Калі пробашч не дасць адказу на працягу вызначанага часу, біскуп павінен скіраваць паўторны заклік, працягваючы карысны час на адказ.

§ 2. Калі біскуп сцвердзіць, што пробашч атрымаў паўторны заклік і не даў адказу, не маючы пры гэтым ніякай перашкоды, або калі пробашч не жадае адмовіцца ад пасады, не прадстаўляючы ніякага абгрунтавання, біскуп павінен выдаць дэкрэт аб звальненні.

Кан. 1745 – Для таго, каб біскуп мог дзейнічаць дзейсна ў выпадку, калі пробашч не згаджаецца з указанай прычынай і яе падставамі, прадстаўляючы абгрунтаванне, якое біскупу здаецца недастатковым:

1° біскуп павінен заклікаць пробашча, каб той, прагледзеўшы акты, прадставіў у пісьмовай форме сваё аспрэчанне, а нават прывёў супраціўныя доказы, калі такімі валодае;

2° затым, дапоўніўшы — калі гэта будзе патрэбна — даследаванне, біскуп павінен разважыць справу з тымі самымі пробашчамі, аб якіх гаворыцца ў кан. 1742 § 1, калі па той прычыне, што яны не могуць выконваць сваё заданне, не павінны будуць быць вызначаны іншыя;

3° нарэшце, біскуп павінен вырашыць: павінен быць звольнены пробашч ці не і адразу выдаць дэкрэт у гэтай справе.

Can. 1743 – Renuntiatio a parocho fieri potest non solum pure et simpliciter, sed etiam sub condicione, dummodo haec ab Episcopo legitime acceptari possit et reapse acceptetur.

Can. 1744 – § 1. Si parochus intra praestitutos dies non responderit, Episcopus iteret invitationem prorogando tempus utile ad respondendum.

§ 2. Si Episcopo constiterit parochum alteram invitationem recepisse, non autem respondisse etsi nullo impedimento detentum, aut si parochus renuntiationem nullis adductis motivis recuset, Episcopus decretum amotionis ferat.

Can. 1745 – Si vero parochus causam adductam eiusque rationes oppugnet, motiva allegans quae insufficientia Episcopo videantur, hic ut valide agat:

1° invitet illum ut, inspectis actis, suas impugnationes in relatione scripta colligat, immo probationes in contrarium, si quas habeat, afferat;

2° deinde, completa, si opus sit, instructione, una cum iisdem parochis de quibus in can. 1742, § 1, nisi alii propter illorum impossibilitatem sint designandi, rem perpendat;

3° tandem statuat utrum parochus sit amovendus necne, et mox decretum de re ferat.

Can. 1746 – Amoto parocho, Episcopus consulat sive assignatione alius officii, si ad hoc idoneus sit, sive pensione, prout casus ferat et adiuncta permittant.

Кан. 1746 – Біскуп павінен паклапаціцца аб тым, каб або звольнены пробашч быў прызначаны на іншую пасаду, калі ён з'яўляецца прыдатным да гэтага, або яму было выдзелена ўтрыманне, у залежнасці ад таго, ці існуе такая патрэба і ці дазваляюць гэта абставіны.

Can. 1747 – § 1. Parochus amotus debet a parochi munere exercendo abstinere, quam primum liberam relinquere paroecialem domum, et omnia quae ad paroeciam pertinent ei tradere, cui Episcopus paroeciam commiserit.

Кан. 1747 – § 1. Звольнены пробашч павінен устрымацца ад ажыццяўлення задання пробашча, як мага хутчэй выехаць з парафіяльнага дома, а ўсё, што належыць парафіі, перадаць таму, каму біскуп даручыў парафію.

§ 2. Si autem de infirmo agatur, qui e paroeciali domo sine incommodo nequeat alio transferri, Episcopus eidem relinquat eius usum etiam exclusivum, eadem necessitate durante.

§ 2. Калі ж гаворка ідзе пра хворага, які не можа пераехаць з парафіяльнага дома ў іншае месца без цяжкасцяў, біскуп павінен пакінуць яму магчымасць карыстацца парафіяльным домам, нават выключную, пакуль такая неабходнасць існуе.

§ 3. Pendente recursu adversus amotionis decretum, Episcopus non potest novum parochum nominare, sed per administratorem paroecialem interim provideat.

§ 3. У час, калі разглядаецца рэкурс супраць дэкрэта аб звальненні, біскуп не можа прызначыць новага пробашча, але павінен часова вырашыць справу ўстанаўленнем парафіяльнага адміністратара.

Caput II
De modo procedendi in translatione parochorum

Раздзел II
Парадак дзеянняў пры перамяшчэннях пробашчаў

Can. 1748 – Si bonum animarum vel Ecclesiae necessitas aut utilitas postulet, ut parochus a sua, quam utiliter regit, ad aliam paroeciam aut ad aliud officium transferatur, Episcopus eidem translationem scripto proponat ac suadeat ut pro Dei atque animarum amore consentiat.

Кан. 1748 – Калі дабро душаў або патрэба ці карысць Касцёла патрабуюць, каб са сваёй парафіі, якой ён паспяхова кіраваў, пробашч быў перамешчаны на іншую парафію або на іншую пасаду, біскуп павінен пісьмова прапанаваць яму перамяшчэнне і заахвоціць, каб згадзіўся з гэтым дзеля любові да Бога і душаў.

Can. 1749 – Si parochus consilio ac suasionibus Episcopi obsequi non intendat, rationes in scriptis exponat.

Кан. 1749 – Калі пробашч не мае намеру прыняць параду і заахвочанне біскупа, ён павінен пісьмова прадставіць свае аргументы.

Кан. 1750 – Калі, не зважаючы на прадстаўленыя аргументы, біскуп вырашыць не адмаўляцца ад свайго намеру, ён павінен з двума пробашчамі, выбранымі згодна з нормай кан. 1742 § 1, разважыць аргументы за або супраць перамяшчэння; калі біскуп і далей будзе лічыць, што перамяшчэнне павінна быць здзейснена, ён павінен паўторна па-айцоўску звярнуцца да пробашча.

Can. 1750 – Episcopus, si, non obstantibus allatis rationibus, iudicet a proposito non esse recedendum, cum duobus parochis ad normam can. 1742, § 1 selectis, rationes perpendat quae translationi faveant vel obstent; quod si exinde translationem peragendam censeat, paternas exhortationes parocho iteret.

Кан. 1751 – § 1. Пасля гэтага, калі пробашч працягвае адмаўляцца, а біскуп лічыць, што перамяшчэнне павінна быць здзейснена, біскуп павінен выдаць дэкрэт аб перамяшчэнні, пастанаўляючы, што пасля таго, як міне вызначаны тэрмін, парафія становіцца вакантнай.

Can. 1751 – § 1. His peractis, si adhuc et parochus renuat et Episcopus putet translationem esse faciendam, hic decretum translationis ferat, statuens paroeciam, elapso praefinito tempore, esse vacaturam.

§ 2. Пасля таго, як гэты тэрмін безвынікова закончыцца, біскуп павінен сцвердзіць, што парафія з'яўляецца вакантнай.

§ 2. Hoc tempore inutiliter transacto, paroeciam vacantem declaret.

Кан. 1752 – У справах, якія датычаць перамяшчэння, павінны прымяняцца прадпісанні кан. 1747, захоўваючы кананічную адпаведнасць і маючы на ўвазе збаўленне душаў, якое ў Касцёле заўсёды павінна быць вярхоўным законам.

Can. 1752 – In causis translationis applicentur praescripta canonis 1747, servata aequitate canonica et prae oculis habita salute animarum, quae in Ecclesia suprema semper lex esse debet.

ІНДЭКС ПАНЯЦЦЯЎ

Аб’яднанне: 215, 225, 278, 298–302, 304–308, 310–315, 317–321, 322–326, 328–329, 677

Абавязак: 11–15, 29, 32, 34, 36, 49, 52, 94, 209–223, 224–231, 273–289, 381–402, 519, 527–538, 662–672, 774, 796–798, 835, 851, 855, 867, 890, 914, 920, 978–984, 989, 1134, 1136, 1151, 1247, 1282–1289, 1366, 1446–1457, 1484–1489, 1548, 1251–1252, 1557, 1261–1562

Абавязацельства: 121–123, 639, 1302–1303, 1307–1309, 1411, 1585

Абарона: 221, 695, 697–699, 1323–1324, 1598, 1620, 1720, 1723

Абаронца повязі: 1432–1436, 1448–1449, 1533, 1561, 1603, 1606, 1612, 1626, 1628, 1636, 1678, 1682, 1686–1688, 1705, 1711

Абат: 370, 381, 620, 1405, 1427, 1438

Абацтва тэрытарыяльнае: 368, 370

Абвінавачанне ў саліцытацыі: 982, 1390

Абвінавачаны: 1412, 1481, 1720, 1722–1728, 1730

Абвінавачванне: 1720–1721

Абрад літургічны: 230, 604, 918, 1034, 1119–1120

Абрад: 111–112, 214, 372, 383, 476, 479, 518, 535, 846, 923, 991, 1015, 1021, 1109, 1127

Абраз: 1188–1190

Абраза: 1143–1144, 1146, 1211, 1369

Абрэпцыя: 63

Абяцанне манаскае: 573, 590, 643, 649, 651, 653–658, 684–685, 688–689, 692, 701, 705, 1078, 1088, 1191–1198

Абяцанне хросту: 889

Агляд судовы: 1582–1583

Адарацыя: 898, 937, 942, 944

Адвакат: 1455, 1457, 1470, 1481–1482, 1483–1484, 1487–1490, 1559, 1561, 1568, 1598, 1663, 1678, 1723

Адзенне духоўнае: 284, 669, 687

Адзенне святое: 929

Адзінства: 254, 275, 386, 392, 755, 897, 1056, 1063, 1099

Адзначэнне знешняе: 506, 1336, 1338

Адказнасць матэрыяльная: 639, 1281

Адказчык: 1284, 1476, 1477, 1494, 1504, 1508, 1510, 1524, 1592–1593, 1595, 1612, 1637, 1660

Адкліканне: 4, 21, 28, 33–34, 47, 58, 73, 79, 142, 175, 182, 189, 367, 974, 982, 1019, 1023, 1105, 1107, 1591, 1734, 1739

Адміністраванне маёмасцю: 309, 319, 325, 357, 392, 494, 532, 537, 555, 562, 634–638, 668, 706, 718, 741, 1042, 1232, 1254, 1255, 1273, 1275–1277, 1279–1289, 1298, 1300, 1333, 1376, 1413, 1508, 1524, 1741

Адміністратар Апостальскі: 368, 371, 381, 1018

Адміністратар дыяцэзіяльны: 272, 312, 409, 421–425, 427, 429, 430, 461, 485, 490, 509, 525, 833, 1018

Адміністратар парафіяльны: 539–540, 1747

Адміністратура Апостальская: 368, 371

Адмова: 80, 161, 184–185, 187–189, 332, 354, 367, 401–402, 411, 416, 430, 538, 688, 1155, 1485, 1524–1525, 1551, 1594, 1641, 1724, 1742–1743

Аднаўленне сужэнскага жыцця: 1153, 1676, 1695

Аднаўленне сужэнскай згоды: 1156–1159, 1161

Адпаведнасць: 19, 122, 221, 271, 702, 1733, 1752

Адпачынак: 283, 1247

Адпуст: 306, 992–997

Адпушчэнне грахоў: 960–963, 976–977, 980, 982, 1357, 1378

Адсутнасць: 166, 395, 533, 665, 696, 1412, 1557, 1592–1595, 1622, 1707, 1720, 1724

Адсылка: 22, 98, 105, 110, 197, 668, 1268, 1290, 1299, 1414, 1672, 1692, 1716

Адчужэнне: 634, 638, 741, 1190, 1254, 1255, 1291–1294, 1296, 1298, 1376

Адыход: 686–693, 702, 704, 726, 727–728, 742–743

Акаліт: 230, 910, 943, 1035

Акалічнасць: 17, 83, 90, 1536–1537, 1559, 1573, 1579, 1717

Акт адміністрацыйны: 16, 35–47

Акт: 55, 173, 382, 404, 446, 456, 474, 1437, 1472–1474, 1522, 1598, 1600, 1634, 1681–1682, 1687, 1704–1705, 1719, 1721

Акушэр: 1548

Алей святы: 847, 880, 999, 1003

Алтар: 932, 1235–1239

Алюмн: 234, 235–237, 239–241, 243–249, 251–252, 254–259, 261, 263

Ап'яненне: 1324–1325, 1345

Апастазія: 694, 751, 1041, 1184, 1364

Апека: 105

Апеляцыя: 333, 1353, 1438–1439, 1443, 1474, 1625, 1628–1640, 1669, 1682–1684, 1693, 1727, 1729

Аплата: 1264

Апостальства: 114, 211, 216, 222, 225, 229, 258, 447, 673–675, 677–678, 680–681, 713, 731, 1254

Апякун: 98, 919, 1478–1479, 1508, 1519, 1521

Араторый: 397, 608, 733, 763, 765–766, 857–859, 934, 936, 941, 964, 1011, 1118, 1179, 1223–1229, 1266

Ардынарый: 5, 14, 65–66, 68, 84, 87–88, 132, 134, 162, 258, 295, 305, 325, 434, 586, 630, 637–638, 644–645, 686, 745, 764, 780, 804–806, 824, 826–827, 830–831, 833, 839, 860–861, 886–887, 933–934, 956–958, 968–969, 971, 974, 1047, 1064, 1071, 1078–1080, 1102, 1108–1110, 1115, 1127, 1130, 1144–1145, 1147–1148, 1172, 1196, 1203, 1207, 1211–1212, 1223–1225, 1228, 1232, 1241, 1265–1266, 1276, 1279, 1281, 1283–1284, 1287–1288, 1301–1302, 1304, 1308–1310, 1337, 1339–1340, 1348, 1350, 1355–1356, 1373, 1480, 1684–1685, 1717–1722, 1724

Архіў: 486–491, 1082, 1133, 1208, 1283–1284, 1306, 1339, 1719

Асоба духоўная: 207, 232–233, 257, 265, 271, 273–285, 287, 289–293, 298, 385, 644–645, 659, 669, 767, 784, 819, 831, 929, 1174, 1333, 1336–1337, 1370

Асоба манаская: 303, 307, 311–312, 317, 320, 607, 628, 630–631, 639, 659–675, 679, 681–707, 765, 778, 783, 784, 801, 806, 832, 967–969, 1019, 1041, 1078, 1088, 1179, 1265, 1320, 1337, 1370, 1392, 1394, 1427, 1438

Асоба трэцяя: 1521–1522

Асоба фізічная: 80, 96–112

Асоба юрыдычная: 80, 94, 113–123, 238, 264, 310, 373, 432–433, 449, 515, 520, 634, 709, 803, 1255–1258, 1263, 1267, 1270, 1279–1280, 1288, 1291–1296, 1303, 1405, 1419, 1427, 1480, 1524

Асэсар: 1424–1425, 1447–1448, 1673, 1676, 1685, 1687, 1720

Аўдытар: 1425, 1428, 1445, 1448, 1561, 1590, 1717

Ахвяра эўхарыстычная: 897–898, 904

Ахвяраванне імшальнае: 199, 945–953, 955, 958, 1383

Ахвяраванне: 510, 531, 551, 848, 945–958, 1181, 1264, 1267, 1285

Ахрышчаны: 11, 205, 869

Ацэнка: 1293, 1295

Бадзяжны: 13, 100–101, 107, 265, 1071, 1115, 1409

Бацькі: 98, 101, 111, 529, 689, 774, 776, 851, 855, 857, 867–868, 874, 877, 890, 893, 914, 1071, 1138–1139, 1366, 1478

Бацькоўства: 1138

Беднасць: 529, 848

Бінацыя: 905, 919, 951

Біскуп дапаможны: 377, 396, 400, 401, 403, 405–411, 413, 419, 443, 450, 454, 463, 473, 481

Біскуп дыяцэзіяльны: 8, 29, 65, 72, 87, 98, 134, 157, 234, 235–236, 239, 241, 243, 253, 259, 263–264, 267–271, 277, 297, 312, 320, 368–369, 376–377, 381–402, 407, 461–463, 466, 468, 470, 473, 477, 473, 492, 494, 497, 501–502, 508–510, 513, 523, 531, 533, 536–537, 539, 547, 553, 557, 579, 594, 595, 603–605, 609, 611, 612, 615, 616, 625, 628, 667, 678–679, 680–681, 683, 686, 688, 691, 693, 699, 700, 715, 727, 733, 738, 753, 755–756, 763, 770, 772, 775, 782, 790–791, 801–802, 804, 806, 810, 813, 819, 821, 822, 823, 835, 837–838, 841, 844, 847, 860, 861, 863, 880, 882–886, 899, 910, 935, 944, 961, 967, 999, 1002, 1017, 1178, 1316, 1015–1016, 1018, 1025, 1036, 1028–1030, 1038, 1002, 1012, 1015, 1013, 1015, 1017–1018, 1021, 1107, 1112, 1165, 1206, 1207, 1215, 1261, 1263, 1271, 1275, 1278, 1281, 1292, 1315, 1419–1421, 1435, 1649, 1681, 1692, 1699, 1705, 1734, 1740–1752

Біскуп Рыма (Рымскі Пантыфік): 134, 291, 330–334, 336–338, 344, 349, 399, 400–401, 590, 591, 749, 752, 756, 782, 967, 995, 1142, 1196, 1256, 1365–1366, 1370, 1404–1405, 1442, 1629, 1698

Біскуп тытулярны: 376, 443, 450, 454

Біскуп, які з'яўляецца манаскай асобай: 705–707

Біскуп: 185, 204, 224, 330, 333, 351, 375–380, 402, 443, 707, 749, 755–756, 763, 782, 823, 833, 835, 847, 861, 880, 882, 884, 886, 899, 900, 910, 965, 967, 999, 1003, 1012–1017, 1021–1022, 1052–1053, 1206, 1227–1228, 1387–1388, 1405

Біскуп–каад'ютар: 377, 396, 400–411, 443, 450, 454, 463, 473

Благаслаўленне: 530, 847, 853, 880, 941, 942, 943, 999, 1169–1171, 1205, 1207–1209, 1212, 1219, 1229, 1237, 1240

Бок працэсуальны: 1434, 1476–1477, 1481–1482, 1530–1538, 1592–1595, 1596–1597

Бэнэфіцый: 1254, 1272, 1274

Бясплоднасць: 1084

Вада: 530, 849, 853, 919, 924

Вайсковец: 569

Вакантнасць: 153–154, 165, 191, 524, 527

Валоданне: 76, 154, 357, 382, 404, 430, 527, 542, 611, 634, 668, 706, 733, 741, 1254–1255, 1381, 1500, 1515

Вартасць: 1291–1293

Вера: 194, 205, 386, 694, 747–748, 750–751, 773, 787, 833, 836, 840, 865, 879, 913, 1071

Верагоднасць: 483, 1437, 1679

Вернасць: 380, 978, 1283

Вернікі: 204, 207–223, 230, 512, 710, 774, 835, 861, 899, 910, 989, 994, 1043, 1069, 1174, 1260–1262, 1267, 1249

Вігілія Пасхальная: 856, 1248

Візіт *ad limina*: 395, 400

Візітацыя кананічная: 199, 259, 305, 396–398, 435, 535, 555, 623, 628, 683, 806, 1224, 1301

Вікарый акруговы: 463, 524, 547, 553–555

Вікарый Апостальскі: 65, 134, 368, 371, 383, 391, 400, 413, 417–418, 443, 463, 475–481, 541, 545–552, 911, 1018, 1420, 1422, 1425–1426, 1685, 1686

Вікарыят акруговы: 374, 553–555

Вікарыят Апостальскі: 368, 371, 420, 495, 502

Віна: 128, 1321

Віно: 924–925

Віятык: 530, 566, 911, 921–922

Воля: 121–123, 1299, 1303, 1310

Выбар: 119, 147, 158, 164–179, 219, 332, 346, 352, 413, 421–423, 452, 497–499, 625–626, 1375

Выгнанне: 412, 539

Выдаленне: 290, 308, 653, 694–704, 729, 742, 746, 1319, 1336, 1350, 1364, 1370, 1379, 1382, 1385–1386, 1394–1395, 1398, 1425

Выданне друкаванае— 823, 827, 831–832

Выдатак судовы: 1462, 1464, 1523, 1525, 1595, 1611, 1649

Выдатак: 398, 1284, 1571, 1580

Вызваленне ад пакаранняў: 1335, 1354–1361

Вызнанне веры: 380, 833

Выкананне: 34, 40–45, 54, 68–70, 98, 223, 278, 1310, 1496, 1498, 1638, 1644, 1647, 1650–1655, 1685, 1727, 1734, 1736

Выкладчык: 229, 239, 253–254, 261, 810, 812, 818, 820, 833

Выклік судовы: 1507–1512, 1517, 1556, 1592, 1594, 1659, 1677, 1686, 1723

Выкраданне: 1089, 1397

Вымова: 1339–1341

Выпадак: 1323

Выпрабаванне: 684–685, 690, 693, 701, 720–723, 730, 735, 1042

Выпраўленне шкоды: 128, 982, 1062, 1347, 1357, 1390, 1649, 1729–1731

Выпраўленне: 695, 959, 987, 1347

Выснова абарончая: 1601–1602, 1604, 1606

Выстаўленне Найсвяцейшай Эўхарыстыі: 941–943

Выхаванне: 226, 793–799, 804, 868, 1055, 1125, 1136, 1366, 1689

Вяртанне ў зыходны стан: 1460, 1645, 1646, 1647, 1648

Галасаванне: 167–168, 172–173

Гамілія: 386, 528, 767

Гандаль: 286, 672, 947, 1385, 1392

Ганьба: 1048, 1390, 1455, 1548, 1717

Годнасць біскупская: 332, 1015, 1169, 1370

Голас: 127, 167–168, 172, 174, 181, 240, 339, 343, 377, 443, 454, 466, 500, 1426, 1455, 1681, 1704–1705

Грэх: 865, 915–916, 959–963, 977, 982, 988, 1007, 1378, 988–989, 992, 1184, 1387, 1395, 1401

Грэшнік: 915, 1007, 1184

Дабро агульнае: 223, 795

Дабро публічнае: 116, 1430–1431, 1481, 1532, 1536, 1691, 1696, 1715, 1728

Даверанасць: 1302

Дазвол: 59, 189, 271, 283, 561, 638–639, 668, 684, 730, 744, 764, 824–830, 832, 862, 886, 930, 934, 966, 1017, 1071, 1112, 1114–1115, 1118, 1124, 1130, 1172, 1189–1190, 1215, 1223–1224, 1226, 1228, 1265, 1267, 1288, 1692

Дакумент: 40, 42, 54–55, 156, 428, 474, 484, 486–489, 490, 491, 535, 1391, 1475, 1539–1546, 1600, 1645, 1658, 1686

Дамова (пагадненне, дамоўленасць, дагавор): 5, 77, 105, 192, 271, 356, 790, 1286, 1290–1298, 1411, 1485, 1488

Дапамога судовая бясплатная: 1464, 1490, 1649

Дапамога судовая: 1418

Дапушчэнне: 147, 182–183, 240, 656, 1034, 1470, 1526, 1547, 1553, 1572, 1589, 1596

Дар: 325, 638, 1261

Дарадчык духоўны: 324

Дарослы: 776, 851, 863, 865–866

Даследаванне: 1051, 1067, 1070, 1131

Даўнасць: 82, 197, 198–199, 1268–1270, 1362, 1373, 1492, 1512, 1621, 1623

Даход страчаны: 1571

Даход: 122, 264, 281, 493–494, 506, 639, 668, 706, 1263, 1272, 1284, 1303–1305, 1308, 1331, 1333, 1515, 1571

Дзевы: 604

Дзейснасць: 10, 39, 65, 119, 124–125, 127, 146, 149–150, 171, 181, 198, 638, 643, 647–648, 656, 721, 841, 844–845, 849, 869, 961–963, 966, 976, 1003, 1024, 1108–1111

Дзень: 202–203, 388, 429, 530, 534, 791, 856, 1010, 1244, 1245, 1246, 1247, 1248, 1249, 1250

Дзеянне працэсуальнае —1406, 1433, 1466–1467, 1472, 1485, 1509, 1524–1525, 1619, 1622

Дзеянне юрыдычнае: 119, 124–128

Дзіця: 97, 99, 101, 110–111, 226, 774, 777, 795, 851, 857, 867–870, 877, 891, 913, 914, 989, 1005, 1071, 1125, 1137–1140, 1154, 1183, 1189

Добрасумленнасць: 198, 1061, 1333, 1515

Доказ: 50, 131, 694–695, 697, 699, 875–878, 894–896, 1053–1054, 1060–1061, 1066–1070, 1074, 1113, 1133, 1158, 1081–1082, 1084, 1086, 1121–1123, 1126, 1138, 1182, 1208–1209, 1469, 1526–1586, 1593, 1595–1596, 1598–1600, 1608, 1639–1640, 1644–1645, 1658, 1661, 1663–1667, 1678–1681, 1686–1687, 1702–1705, 1707, 1717, 1720, 1742, 1745

Дом: 103, 397, 533, 550, 608–613, 616, 628–630, 634, 647, 665, 667, 707, 733, 740–741, 934, 936, 960, 1742

Дух Святы: 375, 573, 605, 747, 879

Душпастырства: 150, 151, 245, 255, 258, 294, 297, 381, 383, 386, 392, 394, 403, 517, 527–530, 564, 566, 571, 678, 757, 771, 813, 851, 890, 898, 914, 962, 986, 1003, 1063, 1064

Дыкастэрыя: 64, 354, 1445

Дыспенсацыя: 14, 59, 85–92, 193, 291, 692, 1014, 1031, 1047, 1049, 1156, 1161, 1078–1082, 1086, 1091, 1121, 1127, 1194, 1196, 1202–1203, 1245, 1697–1706

Дысцыпліна: 239, 305, 326, 342, 392, 436, 445, 1317, 1446–1475

Дыяканат: 89, 207, 236, 266, 276, 281, 288, 294, 757, 767, 835, 861, 907, 910, 943, 1009, 1015–1016, 1019, 1025–1035, 1038, 1079, 1108

Дыяцэзія: 369, 368, 372, 374, 393, 431, 435, 436

Дэкалог: 977, 982, 1385, 1395, 1398

Дэкрэт: 29–33, 35, 48–49, 50–56, 58, 341, 446, 455–456, 579, 647, 699, 700, 828, 952, 1342, 1505–1508, 1513–1514, 1556, 1577, 1589–1592, 1598–1599, 1617–1618, 1651, 1677, 1682, 1684, 1692, 1717–1718, 1720, 1735

Дэлегаванне: 135, 137–138, 140–141, 462, 508, 558, 566, 1108, 1111–1114, 1196, 1207, 1442, 1512

Евангелізацыя: 225, 713, 760–761, 781–782

Евангелле: 206, 225, 747, 756–759, 762

Ерась: 694, 751, 1041, 1184, 1364

Жабрачы: 1265

Жаль: 916, 962

Жыццё прыватнае: 220, 642

Жыццё сужэнскае: 1055, 1135, 1152–1153, 1155

Жыццё супольнае: 280, 550, 602, 607, 731, 745

Забойства сужэнца: 1090

Забойства: 695, 1041, 1044, 1046, 1049, 1397

Завяршэнне разгляду сутнасці справы: 1518, 1596, 1599, 1600

Завяшчанне: 668, 1299, 1302, 1413

Загана формы: 42, 1160, 1163, 1686

Загана: 1095–1097, 1098–1099, 1101–1103, 1159, 1162, 1459, 1620, 1622

Закід працэсуальны: 1445, 1449, 1451, 1459–1460, 1462, 1491–1492, 1621, 1624, 1654, 1660, 1664

Закон: 2–3, 6–9, 11–22, 27, 31–34, 36, 38, 49, 73, 85–93, 98, 105, 110, 197, 289, 316, 799, 1062, 1071, 1284, 1286, 1290, 1313, 1315, 1714, 1716

Замена: 1194, 1197, 1202–1203, 1245, 1343

Замяшчэнне: 43, 1482

Запаведзі касцёльныя: 920, 989, 1247, 1251–1253

Запіс (узгадванне): 535, 877–878, 895, 955, 958, 1053–1054, 1081–1082, 1121–1123, 1133, 1182, 1685, 1706

Запыт: 1144–1146

Заручыны: 1062

Заснавальнікі: 121, 123, 576, 578, 588, 1310, 1284

Захоўванне Эўхарыстыі: 608, 733, 924, 936–938, 941

Зацвярджэнне: 23, 117, 147, 179, 237, 242–243, 314, 338, 341, 377, 587, 595, 700, 729, 1230–1232, 1684, 1716, 1739

Звальненне: 143, 184, 192–195, 253, 318, 430, 481, 485, 494, 552, 554, 563, 572, 624, 682, 810, 1420, 1422, 1436, 1486, 1740–1747

Звычай: 5, 19, 23–28, 38, 112, 284, 396, 423, 438, 526, 1062, 1076, 1176, 1263, 1279, 1287, 1425

Згода сужэнская: 1057, 1095–1099, 1102–1104, 1106, 1108, 1100–1101, 1107, 1157–1159, 1162–1163

Згода: 65, 127, 159, 162, 174, 216, 272, 286, 297, 300, 312, 390, 485, 488, 558, 583, 609, 611–612, 656, 667, 671, 733, 744–745, 764–765, 801, 803, 808, 831, 868, 911, 933, 1003, 1018, 1031, 1050, 1102, 1215, 1222, 1277, 1292, 1297, 1469

Здзяйсненне сужэнства: 1061

Здольнасць: 96, 98–99, 113, 124, 129, 171, 228, 634, 668, 741, 864, 889, 996, 1024, 1058, 1073, 1095, 1254–1255, 1322, 1478, 1674

Злачынства: 695, 1041, 1311, 1322, 1328–1330, 1364–1400, 1412, 1425, 1717

Злоўжыванне: 84, 436, 528, 683, 1326, 1378

Знішчэнне: 78, 489, 1212, 1391

Іерархія: 204, 330, 572

Імпатэнцыя: 1084, 1084, 1680

Імша Святая: 246, 388, 429, 534, 549, 663, 881, 897–909, 917–918, 921, 945–958, 1010, 1185, 1239, 1247, 1303, 1308–1310

Імя добрае: 220, 1361, 1390, 1717

Імя: 855, 1199, 1612

Інвентар: 486, 491, 1283

Індульт: 312, 320, 684, 686, 688, 691–693, 727–728, 745, 1015, 1019, 1021

Інкардынацыя: 265–269, 271–272, 693, 736, 967, 1016

Інстанцыя: 1517–1525, 1724

Інструктар: 1700, 1704, 1717

Інструкцыя справы: 1428, 1668, 1681, 1669, 1702, 1704–1705, 1718–1719, 1742, 1745, 1750

Інстытут кансэкраванага жыцця: 103, 266, 268, 307, 573, 574, 577–639, 654, 668, 676, 680, 684–704, 710–730, 758, 783, 801, 1019

Інтэрвал: 378, 1031, 1035

Інтэрдыкт: 915, 1109, 1332, 1357, 1370, 1373–1374, 1379–1380, 1390, 1394

Інтэрпрэтацыя: 17–19, 27, 36, 77, 92, 138, 1167, 1204, 1354

Ірэгулярнасць: 1025, 1040–1041, 1044–1049

Каардынацыя: 394, 473, 571, 680, 678

Калегія Біскупаў: 330, 336–337, 341, 749, 752, 754–756, 1372

Калегія Кансультантаў: 272, 377, 382, 404, 419, 421, 485, 494, 502, 1018, 1277

Калегія Кардыналаў: 349–352, 359

Калегія: 115–116, 119, 158, 160, 165–169, 180–183

Каментатар: 230

Кампетэнцыя суда: 1405, 1407–1416, 1440, 1444–1445, 1460, 1488, 1673, 1694, 1699, 1700, 1709

Кампраміс: 174–175, 180, 1485, 1714–1716

Камунія Святая: 230, 777, 912–913, 915–921, 925

Кананізацыя: 1403

Канвалідацыя: 1080, 1123, 1156–1160, 1676

Кангрэгацыя Веравучэння: 360, 1362

Кангрэгацыя манаская: 620, 1405, 1427, 1438

Кандыдат: 289, 641, 645, 1025, 1027–1029, 1031–1032, 1034, 1036, 1051–1052

Канкардат: 365

Канонік: 463, 506–507, 509, 613, 968

Кансісторый: 350, 353

Канстытуцыя: 587, 595–596, 598, 615, 624–625, 631, 648, 662, 667, 734, 1174

Кансэкрацыя: 332, 336, 351, 355, 375, 379, 673, 669, 710–711, 713, 783, 847, 927, 1012–1014, 1382, 1169

Кантар: 230

Канфедэрацыя: 313, 582

Канферэнцыя Біскупаў: 230, 236–237, 242, 276, 284, 294, 312, 314–315, 317–319, 320, 322–323, 325–326, 364, 372, 377, 402, 433–434, 439, 441, 443, 447–459, 496, 502, 522, 535, 538, 707–708, 753, 755, 766, 772, 775, 788, 792, 804, 809–810, 821, 823, 825, 830–831, 838, 841, 844, 851, 854, 877, 891, 895, 961, 964, 1031, 1067, 1083, 1112, 1121, 1126–1127, 1231, 1236, 1246, 1251, 1253, 1265, 1272, 1274, 1277, 1292, 1297, 1421, 1425, 1439, 1714, 1733

Канферэнцыя вышэйшых настаяцеляў: 708, 709

Канфесіянал: 964

Канфірмацыя: 144, 241, 530, 645, 777, 847, 866, 874, 879–896, 1033, 1065

Канфлікт: 1416, 1445

Канцлер: 382, 404, 482, 483, 485, 487, 488, 833

Канцэлебрацыя Эўхарыстыі: 902, 905, 945, 951

Капелан: 317, 564, 565–572, 911

Капітул катэдральны: 443, 463, 502–507, 509–510

Капітул: 596, 616, 631–633

Капліца: 934, 1226–1229

Кардынал: 349–352, 354, 356–358, 833, 967, 1242, 1405, 1558

Карыстанне розумам: 11, 97, 99, 187, 852, 889, 989, 914, 1004, 1005, 1191, 1095, 1322–1324, 1345, 1398, 1478

Касцёл абрадавы: 1, 111–112

Касцёл Каталіцкі: 113, 204–206, 209, 369, 747, 794, 800, 807, 815, 849, 1258

Касцёл катэдральны: 382, 389, 503, 1011, 1178, 1217, 1242

Касцёл партыкулярны: 157, 209, 266–272, 333, 368, 372–374, 381

Касцёл: 262, 491, 503, 530, 556–557, 563, 611, 683, 857–859, 881, 932, 934, 937, 964, 1011, 1118, 1177, 1206–1209, 1211–1212, 1214–1222, 1235, 1242, 1248

Каталіцкі: 216, 300, 790, 793, 803, 807–808

Катэдра тэалогіі: 811

Катэхеты: 776, 780, 785, 861

Катэхізіс: 775, 827

Катэхумэн: 206, 788, 1170, 1183

Катэхумэнат: 788, 851

Каштоўнасць: 638, 1189, 1220, 1270, 1292

Кіраўніцтва: 259, 285, 319, 325, 494, 532, 634–640, 718, 1042, 1232, 1273–1279, 1281, 1283, 1285, 1287, 1300

Кляўзула: 81, 1302

Кляўзура: 667

Кляштар: 609, 613–616, 625, 628, 637–638, 667, 684, 686, 688, 699–700

Кніга: 276, 535, 788, 826, 838, 850, 877, 895, 928, 955, 958, 1053–1054, 1082, 1121, 1133, 1182

Крыніца хрысцільная: 530, 858

Крэмацыя: 1176, 1184

Культ: 222, 246, 256, 301, 506, 678, 834–836, 840, 1186–1187, 1205, 1219, 1247, 1331

Курыя Рымская: 64, 354, 360, 361, 1445
Курыя: 428, 469, 470–474, 486–491, 1082, 1133, 1208

Ласка: 59, 64–65, 74
Легат: 358, 362–367, 450, 1405
Легітымізацыя: 1139–1140, 1288, 1572, 1674, 1697, 1708
Легкадумнасць: 1649
Лек: 919
Лекар: 978, 1548
Лектар: 230, 1035
Ліквідацыя: 120, 320, 326, 584–585, 616, 647, 733, 1167, 1246
Ліст дымісарыйны: 1015, 1018–1023, 1052–1053, 1388
Літургія гадзін: 246, 276, 663, 1173, 1174, 1175
Літургія: 760, 767, 826, 834–835, 837–838, 846, 1248
Любоў: 114, 222, 282, 383, 387, 529, 640, 702, 785, 839, 1253, 1254
Лямпа: 940

Магістэрый Касцёла: 218, 226–227, 252, 747–755, 760, 768–769, 809–810
Мадэратар: 239, 261, 473–474, 487–488, 517, 520, 526, 542, 543–544
Маёмасць: 121, 123, 325, 326, 319, 584, 600, 616, 634–635, 639, 668, 706, 718, 741, 1254–1289, 1291–1294, 1298–1302, 1305, 1419
Малітва: 246, 276, 528, 577, 663, 673, 719, 839, 902, 909, 937, 942, 1009, 1173, 1248–1249
Манах: 613
Манахіня: 609, 614, 616, 630, 667, 684, 686, 688, 699, 700
Манстранцыя: 941
Мастацтва: 1189, 1216, 1292
Матывацыя: 51, 63, 93, 697, 699, 830, 1611, 1617, 1742, 1750
Маўчанне ўлады: 57, 189, 1735
Межы спрэчкі: 1513–1514, 1639–1640, 1661, 1677, 1683
Меры засцярогі: 1293

Месца: 101, 397, 857, 859–860, 881, 888, 932, 934, 936–938, 954, 964, 1011, 1115, 1118, 1177–1179, 1205–1213, 1558

Месяц: 100, 202, 203

Місіянер: 256–257, 270–272, 495, 502, 784–787, 790–792

Мітрапаліт: 355, 377, 395, 413, 415, 421, 425, 432, 435–437, 442, 467, 501, 1438

Мова лацінская: 249, 928

Мова: 249, 257, 518, 825, 928, 1471

Могілкі: 1180, 1205, 1208, 1240, 1241, 1243

Моц доказная: 1536, 1538, 1541, 1544, 1572, 1573

Мучанікі: 1237

Мэта: 17, 94, 114, 298–299, 301, 304, 313, 327, 588, 598, 610–611, 1055, 1232, 1254, 1260, 1284–1285, 1311

Навучанне: 797, 804, 827, 1371

Намашчэнне хворых: 530, 844, 998, 847, 999, 1000–1004, 1006–1007

Настаўнік навіцыяў: 650–652, 985

Настаўнік: 239, 253–254, 261, 263, 796, 803–805

Настаяцель: 134, 590, 592, 596, 608, 613, 615–620, 622–631, 636, 638–639, 641–642, 644–645, 647, 649–650, 653, 656–657, 661, 665, 668, 671–672, 677–679, 684, 686–688, 690–691, 694–699, 703, 708–709, 717, 720, 726–727, 729–730, 743–746, 765, 788, 819, 911, 957, 967–969, 974, 1019, 1025, 1028–1030, 1032, 1051, 1179, 1196, 1405, 1427, 1438, 1833

Наступства сужэнства: 1059, 1132, 1134–1139, 1672, 1692

Натарыус: 55, 382, 404, 474, 482–485, 1437, 1473–1475, 1503, 1507, 1528, 1548, 1561, 1567–1569, 1605, 1612, 1630, 1664

Неафіт: 101, 789, 1042

Неахрышчаны: 383, 787, 842, 864, 869, 1086, 1143–1147, 1149, 1476

Небяспека смерці: 529–530, 883, 844, 865, 867–868, 889, 891, 913, 921, 922, 961, 962, 976–977, 986, 1004, 1068, 1079, 1116, 1335, 1352

Недзеяздольнасць: 10, 14–15, 171, 1041, 1073, 1095

Некатолік: 256, 383, 528, 787, 825, 844, 869, 874, 908, 933, 1118, 1124–1129, 1170, 1183, 1365, 1367

Непаслухмянасць: 696, 1371, 1373, 1470

Непаўналетні: 97–98, 105, 1071, 1398, 1478, 1521, 1550

Несумяшчальнасць: 152, 423, 478, 636, 1420, 1447, 1717

Няведанне: 126, 1045, 1096, 1323–1325

Нядбайнасць: 155, 436, 1279, 1321, 1389, 1452, 1457, 1606, 1645, 1741

Нядзейснасць: 10, 40, 42, 63, 66–67, 90, 125–127, 133, 149, 153, 166, 170, 173, 175, 179, 182, 188, 290, 425, 643, 649, 961–963, 977, 1061, 1073, 1077, 1083–1094, 1097–1108, 1123, 1156–1165, 1190–1191, 1199–1200, 1281, 1292, 1301, 1331, 1333, 1360, 1404, 1406, 1433, 1437, 1459, 1463, 1511, 1538, 1598, 1620, 1622, 1654, 1656, 1685, 1670, 1708–1712, 1715, 1739

Нядзеля: 386, 388, 528, 530, 534, 767, 856, 905, 1010, 1246–1248

Нязручнасць: 1323–1324

Нямы: 1104, 1471

Нянавісць: 1368, 1373

Няўважлівасць: 1323–1325

Паведамленне: 47, 54–56, 177, 179, 184, 186, 190, 193, 364, 377, 395, 413, 415, 422, 878, 895–896, 1054, 1081, 1121–1123, 1508–1511, 1554, 1556, 1603, 1615, 1659, 1668, 1677, 1684–1685, 1706, 1720, 1742, 1750

Падарожны: 13, 91, 100, 136, 566, 568

Падатак: 264, 1263

Падзел: 122, 374, 620

Падман: 63, 67, 69, 125, 128, 172, 182, 188, 643, 656, 982, 1098, 1200, 1390–1391, 1457, 1645

Падрыхтоўка катэхетычная: 256, 368, 761, 773–779

Пазбаўленне: 84, 143, 184, 196, 292, 416, 1336, 1338, 1381, 1389, 1396, 1457

Пазоўнік: 1407, 1409, 1476–1477, 1508, 1524, 1594–1595, 1637, 1674, 1708, 1721

Пазыка: 122, 639, 1284, 1497

Паказанне: 1418, 1471, 1530–1536, 1538, 1547–1548, 1552, 1558–1562, 1564–1571, 1657

Пакаранне экспіяцыйнае: 1312, 1319, 1335–1338, 1344

Пакаранне: 15, 18, 36, 221, 415, 1311–1315, 1318–1399, 1717–1728

Пакаянне: 240, 246, 276, 603, 630, 664, 673, 719, 959–991, 1244–1245, 1249–1253, 1312, 1324, 1326, 1328, 1337, 1340, 1342–1344, 1357–1358

Паклёп: 1390

Пакліканне: 215, 226, 233–234, 246, 256, 385, 387, 574, 646, 722, 791

Палій: 355, 437

Памерлы: 45, 350, 612, 901, 994, 1202, 1391, 1513–1514, 1518, 1616, 1626, 1649, 1734–1735, 1739

Памылка: 15, 45, 66, 126, 144, 188, 1097, 1099, 1323–1324, 1538, 1616

Папярэджанне: 316, 697, 1339–1341, 1347, 1371, 1394–1396, 1741

Папячыцель: 1478–1479, 1508, 1519, 1521

Парадак разгляду спраў: 1458–1464, 1662

Парады евангельскія: 207, 573–576, 598–601, 654, 723, 731

Парафія: 374, 383, 510, 515–518, 520, 524, 532, 535–537, 539–552, 555, 813, 857, 1115, 1177, 1180, 1241

Партыя палітычная: 287, 317, 672

Парушэнне: 36, 170, 220, 1211, 1321, 1323–1324, 1388, 1390, 1396, 1401, 1406, 1457, 1741

Пасада касцёльная: 131, 143, 145, 150–153, 274, 682, 968, 975, 1326, 1331–1333, 1396

Пасвячэнне: 1169, 1205–1206, 1208–1209, 1212, 1217–1219, 1237

Пасвячэнне: 129, 150, 274, 290, 659, 701, 833, 1008–1048, 1050–1054, 1078, 1087, 1338, 1708–1712

Паслуга святая: 381, 392, 1036, 1375, 1384

Паслуга слова: 386, 528, 756–761, 786

Паслухмянасць: 273, 590, 592, 601, 705, 732, 750, 752–754, 1371, 1470

Пастанова суддзі: 1607–1608, 1668

Пастаянства: 145, 522, 1420, 1422

Патомства: 1055, 1061, 1096, 1136, 1153–1154, 1689

Патрыярх: 350, 438, 1558

Паўналетні: 97–98, 656, 721, 1483

Паўнамоцтва: 132, 144, 479, 530, 543, 555, 566, 882–885, 887, 966, 967–975, 1108–1112, 1114

Паўторнасць: 845, 1004

Пахаванне: 530, 555, 1176–1180, 1182–1185, 1241

Паходжанне легітымнае: 1137–1138

Паходжанне нелегітымнае: 1139

Пачатак судовай спрэчкі: 1459, 1513–1516, 1529, 1639, 1677, 1683

Пашана: 273, 840, 944, 1171, 1186, 1188, 1190, 1470

Перавага з увагі на асобу: 524, 626

Перавод: 257, 268, 271–272, 684–685, 730, 744

Пераклад: 825–826, 838, 1471, 1474

Перакладчык: 983, 990, 1106, 1471, 1649

Перамяшчэнне: 184, 190–191, 271, 416, 418, 538, 624, 647, 1244, 1246, 1336, 1748–1752

Перарыванне цяжарнасці: 1041, 1397

Перашкода злачынства: 1078, 1090

Перашкода: 180, 274, 527, 597, 643, 1025, 1040–1049, 1066, 1069, 1073–1094

Першынство: 140, 1415, 1482

Пілігрымка: 961, 1230, 1233

Пісьмовасці прынцып: 37, 51, 59, 156, 179, 186, 190, 1429, 1471–1472, 1503, 1507, 1524, 1567, 1569, 1588, 1602–1605, 1609–1610, 1659, 1664, 1725, 1734, 1748

Повязь святая: 643, 712, 721–723

Повязь сужэнская: 1085, 1134, 1141–1150

Подпіс: 55–56, 173, 474, 483, 485, 535, 1034, 1036, 1473, 1504, 1524, 1569, 1612, 1622, 1664

Позва: 125–126, 1062, 1270, 1281, 1362–1363, 1410, 1445, 1460, 1463, 1491–1494, 1496–1500, 1502–1506, 1508, 1593, 1619–1627, 1629, 1642, 1655, 1658, 1675, 1677, 1709, 1721, 1729–1731

Пост: 767, 919, 1245, 1249–1250, 1253

Постаць эўхарыстычныя: 924–927, 1367

Прабачэнне: 1152, 1155, 1202–1203

Права: 22, 24, 98, 113, 199, 207, 231, 330–331, 365, 375, 587, 598, 624, 631–632, 668, 696, 735, 740, 764, 1075, 1163, 1165, 1249, 1265, 1290, 1299, 1304, 1315, 1327, 1399, 1479, 1491, 1504, 1692

Правікарый Апостальскі: 420, 1018

Правінцыя касцёльная: 377, 431–432, 435, 952, 1264

Правінцыя манаская: 581, 620–621, 634, 636, 1427

Правы вернікаў: 211–221, 299, 843, 912, 991, 1177, 1180

Правы духоўных асобаў: 278, 281, 283

Правы Касцёла: 232, 362, 794, 800, 805–807, 1254, 1311, 1401, 1405, 1671

Правы набытыя: 38, 121–123, 192

Правы чалавека: 747

Прадоўжванне: 72, 142, 653, 657, 686, 1445, 1465, 1467

Прадстаўленне: 147, 158–160, 163, 377, 523, 525, 557, 563, 565, 682

Прадстаўнік: 167, 310, 355, 382, 396, 404, 437, 444, 464, 1071, 1104–1105, 1482–1490, 1519, 1612, 1649, 1686, 1701

Прадстаўніцтва: 118, 238, 358, 363, 393, 532, 543, 1478, 1480

Пражыванне: 12, 100–107, 352, 967, 975, 1016, 1115, 1408–1409, 1413, 1673

Практыкаванні духоўныя: 246, 276, 663, 719, 770, 1039

Практыкаванні пабожныя: 246, 1245, 1249, 1253

Прамотар справядлівасці: 1430–1436, 1449, 1501, 1603, 1612, 1628, 1636, 1674, 1677–1678, 1693, 1696, 1721–1722, 1724, 1727

Прамульгацыя: 7, 8, 16, 31, 341, 446, 455, 466

Прапаведаванне: 386, 392, 528, 566, 761–770, 772

Прапрэфект Апостальскі : 420, 1018

Прафанацыя: 938, 1367, 1376

Працэс: 50, 95, 119, 127, 164–183, 190, 193, 196, 221, 338, 344, 352, 377, 441–442, 631–632, 682, 695, 697–700, 703, 729, 746, 830, 1158–1159, 1342, 1501–1707, 1718, 1720, 1732–1739, 1740–1752

Працэсія: 530, 944

Пробашч: 89, 107, 233, 510, 515, 519, 520–539, 555, 558, 757, 776, 833, 847, 877, 883, 911, 958, 968, 1079, 1109–1110, 1245, 1740–1752

Продаж: 1190

Просьба: 63–65, 1049, 1292, 1699

Протадыякан: 355

Прывілей веры: 1143–1147, 1149

Прывілей: 4, 59, 76–84, 199, 312, 317, 377, 396, 438, 509, 526, 1143–1147, 1149–1150, 1233, 1331

Прыдатнасць: 149, 161–162, 970, 1051–1052, 1112

Прызнанне судовае: 1535–1538, 1679, 1728

Прызначэнне на пасаду: 98, 253, 362, 377, 470, 473, 477, 482–483, 492, 494, 497, 502, 508–509, 517, 523, 525, 539, 544, 547, 553, 557, 565, 805, 810, 830, 1279, 1420–1422, 1428–1429, 1435, 1481, 1574

Прызначэнне свабоднае: 147, 157, 523

Прыкмета: 1647, 1678, 1707

Прымас: 438, 620, 1405

Прымус: 125, 219, 643, 656, 748, 1026, 1036, 1103, 1200, 1323, 1370, 1538, 1620

Прыняцце: 177–178, 183, 189, 241, 306–307, 316, 332, 402, 416, 430, 538, 590, 641–645, 690, 720–721, 735, 1505–1506, 1659, 1677, 1699, 1743

Прысуд: 16, 135, 1517, 1589–1591, 1607–1616, 1618, 1620, 1622, 1668, 1682, 1684–1685, 1689, 1692, 1716, 1726, 1731

Прысяга: 380, 876, 1068, 1199–1204, 1283, 1454, 1532, 1562

Прыхільнасць права: 1060, 1150

Прычына: 90, 187, 190, 193–194, 270, 694, 1125, 1150, 1152–1153, 1293, 1740–1741, 1748

Прэзбітэр: 89, 290, 294, 351, 443, 521, 546, 757, 764, 835, 861, 882–888, 899, 910, 1169, 1172, 1079–1080, 1206, 1357

Прэзбітэрат: 1009, 1015–1016, 1025, 1026–1032, 1033–1039, 1050–1052, 1078–1080

Прэзбітэрый: 245, 369, 495, 499, 529, 713, 757

Прэлат: 295, 368, 370, 381, 448, 450

Прэлатура: 265–266, 294–297, 368, 370, 381

Прэфект Апостальскі: 134, 368, 371, 381, 400, 495, 502, 1018

Прэфектура Апостальская: 368, 371, 420, 495, 502

Пэнітэнт: 961, 979–981, 987–989

Пэнітэнцыярый: 508, 968

Пэнітэнцыярыя: 64, 1048, 1082

Пятніца: 1250, 1251, 1251

Пячатка: 535, 1472

Пячаць сакрамэнтальная: 845, 849, 879, 1008

Рада: 360–361, 443, 451, 457, 463, 473, 492–503, 511–515, 531, 536–537, 627, 647, 656, 684, 686, 688, 690, 694, 697, 699, 743– 745, 1215, 1222, 1263, 1277, 1280–1281, 1287, 1292, 1305, 1310, 1742, 1750

Разгляд арбітральны: 1446, 1485, 1713–1716

Разгляд: 299, 446, 455–456, 838, 1120

Расследаванне: 1717–1719, 1721

Расстройства псіхічнае: 689, 1041, 1044, 1105

Роднасць: 108, 1078, 1091

Родныя: 109, 478, 492, 1092, 1298, 1448–1449

Розніца веры: 1086, 1129

Рота Рымская: 1402, 1405, 1443–1444

Ружанец: 246

Рэгіён касцёльны: 433–434

Рэзерваванне: 87, 291, 430, 449, 580, 582, 584, 591, 616, 686, 691, 709, 743–744, 995, 1047, 1132, 1142, 1165, 1167, 1169, 1206–1207, 1308, 1310, 1354, 1362, 1367, 1370, 1378, 1388, 1405, 1698

Рэзідэнцыя: 283, 356, 395, 410, 533, 550, 629, 1396

Рэктар: 238–239, 260–262, 443, 463, 556–563, 645, 764, 767, 833, 903, 958, 985, 1051, 1177, 1232, 1307

Рэкурс: 57, 166, 270, 316, 333, 698, 700, 1030, 1353, 1400, 1417, 1441, 1449, 1505, 1513, 1619–1627, 1628–1640, 1644, 1682–1684, 1699, 1732–1733, 1735–1739, 1747, 1752

Рэліквіі: 1190, 1237

Рэскрыпт: 35, 38, 59–63, 66–73, 75, 290, 293, 1139, 1264

Рэстаўрацыя: 1189

Рэч: 397, 1171, 1269–1270, 1292–1294, 1376

Сабор Сусветны: 337–341, 749, 833, 1371–1372, 1732

Сакрамэнт: 205, 256, 276, 393, 528, 777, 840–848, 1379

Сакрамэнталіі: 392, 1166–1171, 1331–1332, 1335, 1352

Саліцытацыя: 982, 1387, 1390

Самазабойства: 1041, 1044

Санацыя ад пачатку: 1123, 1161–1165

Санацыя: 45, 1619

Санктуарый: 1230–1234

Саўдзел: 977, 979, 1041, 1090, 1329

Сваяцтва: 109, 1092, 1448, 1548

Сведка: 55, 129, 207, 224–231, 275, 298, 377, 494, 512, 517, 519, 524, 697, 759, 766, 776, 784–785, 861, 874–877, 892–893, 899, 907, 910, 930, 943, 984, 1064, 1105, 1108, 1112, 1116, 1121, 1131, 1168, 1282, 1421, 1424, 1428, 1434, 1447, 1455, 1473, 1547–1573, 1600, 1663–1665, 1678, 1679

Сведчанне: 241, 535, 607, 640, 645, 703, 713, 669, 892, 1050–1051, 1053, 1572, 1673

Свята: 388, 395, 429, 530, 534, 767, 1246–1248

Святар: 150, 273, 762, 791, 900–906, 908–909, 919, 929–930, 943, 951, 965–966, 976, 978–979, 1003, 1079, 1081, 1378, 1550

Святое Пісанне: 252–253, 276, 279, 663, 719, 750, 760, 767, 825, 827

Семінарыя: 234–235, 237–239, 241, 243, 250, 253, 254, 259–264, 295

Сепарацыя: 104, 1152–1155, 1692–1693, 1696

Сігнатура Апостальская: 1402, 1416, 1445, 1629

Сімонія: 149, 188, 1380

Сімуляцыя: 1101, 1378–1379

Сінод Біскупаў: 245, 334, 342–344, 346–348, 833

Сінод дыяцэзіяльны: 460–468, 833

Сінод партыкулярны: 439–446, 753, 823, 833, 952

Складанне ахвяраванняў: 781, 1262, 1265–1266

Скліканне: 127, 166–167, 338, 344, 353, 440–443, 461–462, 500

Скрутатар: 173

Слепата: 930

Слова Божае: 213, 386, 528, 768, 1234, 1248

Служба вайсковая: 289, 672

Служыцель: 207, 222, 256, 844, 861, 869, 882, 900, 908, 910, 965–976, 978–984, 1003, 1008, 1012, 1015, 1127, 1168, 1172, 1378, 1387, 1388, 1390

Смерць: 416, 422, 555, 1005, 1090, 1141, 1177, 1184, 1299–1301, 1397–1398, 1518, 1675, 1707

Спаведнік: 240, 630, 982, 985, 991, 1079, 1357, 1387, 1390

Спадкаемца: 1299, 1518

Спакуса: 277, 695–696, 703, 746, 933, 990, 1184, 1211, 1328, 1341, 1344, 1347, 1352, 1364, 1394–1395, 1455, 1560, 1722, 1727

Спецыяліст: 1574, 1575–1581, 1649, 1663–1664, 1678, 1680, 1701, 1705

Споведзь: 144, 246, 276, 630, 664, 719, 960, 962–964, 966–981, 985–986, 988–991, 1065, 1719

Спор: 36, 1288, 1445, 1488, 1501–1506, 1513–1525, 1611, 1649, 1733

Справа: 489, 1403, 1405–1406, 1410, 1412, 1417, 1419, 1425, 1430–1432, 1452, 1587–1595, 1643–1644, 1671–1674, 1676–1685, 1689–1696, 1708–1712

Справаздача фінансавая: 319, 637, 1284, 1287, 1301, 1652

Спроба: 194, 694, 977, 1041, 1044, 1085, 1087–1088, 1090, 1328, 1330, 1378, 1394

Спыненне інстанцыі: 1520–1523

Спыненне: 13, 41, 46, 78–80, 82–83, 93, 139, 142–143, 175, 201, 292, 367, 649, 685, 692, 700–701, 745, 975, 1132, 1153, 1155, 1165, 1194-1195, 1202–1203, 1335, 1344, 1348, 1352–1363, 1512, 1518–1519, 1644, 1647, 1650, 1712, 1736–1737

Сродак карны: 697, 1312, 1339–1342, 1348

Сродкі сацыяльнай камунікацыі: 666, 747, 761, 772, 822, 823–832, 882, 1063

Сталіца Апостальская (Святая Сталіца): 4, 6, 68, 84, 87, 112–113, 137, 231, 237, 266, 290, 293, 305, 312, 317, 320, 322, 335, 340, 347, 359, 361, 395, 430, 438–439, 441, 446, 448, 451, 455–456, 579, 582–584, 589, 592–593, 605, 609, 616, 638, 679, 684, 686, 691, 700, 704, 709, 727, 730, 743–744, 775, 816, 825, 838, 995, 1014–1015, 1021, 1031, 1047, 1078, 1112, 1139, 1165, 1167, 1190, 1196, 1203, 1232, 1246, 1255, 1257, 1264, 1270–1272, 1292, 1308, 1310, 1354, 1367, 1370, 1378, 1382, 1388, 1404, 1423, 1438–1439, 1442–1443, 1698–1699, 1705, 1707

Сталіца біскупская: 412–420, 426, 428, 468, 481, 490, 501, 513, 1420

Сталіца мітрапалітальная: 435, 440, 501, 1438

Стан неабходнасці: 1323–1324

Стан: 194, 219, 285, 289–293, 574, 588, 1644, 1712

Старшыня: 338, 344, 352–353, 441–442, 452, 462, 492, 500, 502, 509, 514, 536, 625, 1426

Статут: 94, 94, 94, 115, 117–118, 120, 123, 237, 239, 295–296, 304–309, 314, 317, 319, 321–322, 324–326, 451, 496, 505–507, 709, 810, 816, 1232, 1280–1281, 1295

Стаўленне ў віну: 1321, 1323–1327, 1717

Страта: 143, 162, 165, 177, 182, 184–186, 194, 290–293, 949, 975, 1212, 1222, 1238, 1317, 1336, 1338, 1364, 1367, 1370, 1387, 1394–1395, 1397

Страх: 125, 172, 188, 643, 656, 1103, 1191, 1200, 1323–1234, 1345, 1360, 1538, 1620

Страхаванне сацыяльнае: 231, 281, 1274

Ступень: 108–109, 229, 253, 350, 378, 660, 817, 1338, 1417, 1420–1421, 1435, 1483

Субдэлегаванне: 137

Субрэпцыя: 63, 1049, 1359

Суд дзяржаўны: 1288, 1344, 1675, 1692

Суддзя: 135, 391, 978, 1419–1422, 1424–1425, 1427–1429, 1448–1457, 1459, 1461, 1469–1470, 1495, 1512, 1572, 1609–1610, 1676, 1677

Суджэнне распазнавальнае: 1095

Сужыццё: 695, 729, 746, 1093, 1395

Сужэнец: 104, 112, 1134–1135, 1151, 1055, 1548, 1674–1676, 1707

Сужэнства меркаванае: 1061, 1137, 1139

Сужэнства няздзейсненае: 1061, 1142, 1681, 1697–1706

Сужэнства: 112, 194, 226, 262, 643, 694, 721, 1055–1149, 1156, 1160–1165, 1394, 1681, 1697–1706

Сукупнасць: 94, 114–115, 120, 158, 160

Сумненне: 14, 17, 21, 67, 90, 144, 845, 869, 1005, 1052, 1060, 1084, 1086, 1091, 1681

Супольнасць: 23, 25, 29, 96, 149, 171, 194, 205, 209, 336, 375, 519, 630, 675, 753, 840, 844, 869, 874, 1021, 1055, 1096, 1098, 1135, 1676, 1695, 1741

Супрацоўніцтва: 275, 295, 311, 328, 529, 680, 708, 820, 822

Суседства: 374, 431, 459

Суспенса: 1109, 1333–1334, 1370, 1379–1380, 1385, 1388, 1390, 1392, 1394–1395

Схізма: 751, 1041, 1184, 1364

Сцвярджэнне юрыдычнае: 15, 171, 1047, 1071, 1117, 1127, 1184, 1352

Сям'я: 226, 231, 281, 529, 776, 768, 1063, 1152

Табэрнакулюм: 938, 940

Таварыства апостальскага жыцця: 103, 134, 266, 268, 443, 463, 520, 538, 731–746, 776, 778, 1019, 1174, 1742

Таямніца: 269, 377, 413, 471, 489–490, 983–984, 1047–1048, 1079–1080, 1082, 1131–1133, 1158–1159, 1339–1340, 1388, 1391, 1455, 1546, 1548, 1455, 1609, 1719

Традыцыя: 6, 252, 576, 578, 588, 619, 750, 760, 926, 1237

Трыбунал (суд) кампетэнтны: 221, 673, 1408–1415, 1673

Трыбунал (суд): 149, 1400, 1402, 1405, 1419, 1423–1429, 1438–1439, 1441–1445, 1468

Трынацыя: 905, 919, 951

Трэці ордэн: 303

Тытул: 185, 295, 350, 352, 357, 402, 438, 1218, 1677, 1683

Тэрмін: 8, 54, 57–58, 72, 76, 78, 158, 165, 166, 177, 179, 182, 184, 193, 203, 235–236, 250, 271, 283, 395, 492, 494, 501–502, 624, 648–649, 653, 655, 657, 665, 686, 717, 722–723, 745, 867, 955, 972, 1032, 1145, 1270, 1336, 1347, 1357, 1362–1363, 1422, 1453, 1465–1467, 1492, 1506–1507, 1513, 1520, 1596, 1599, 1601, 1603, 1609–1610, 1621, 1623, 1625–1626, 1630, 1635, 1637, 1646, 1655, 1659, 1660–1661, 1668, 1677, 1682, 1703, 1723, 1734–1737, 1742, 1744, 1751

Тэрытарыяльнасць: 12, 13, 372, 447, 518

Тэрыторыя: 102, 136, 370, 372, 383, 431, 442–443, 445, 479, 790, 887–888, 1109, 1336–1337, 1469, 1722

Убоства: 573, 598, 600, 635, 640, 668, 718, 732, 945

Удзел у святых цэлебрацыях: 844, 908, 933, 1381, 1183

Ужытак свецкі: 1171, 1212, 1222, 1224, 1229, 1238, 1239, 1269

Узаемасувязь спраў: 1414, 1494

Узнагароджанне: 191, 230–231, 263, 281, 418, 506, 531, 1286

Узрост: 11, 97, 184–186, 425, 478, 578, 643, 656, 658, 721, 874, 891, 893, 913–914, 989, 1031, 1072, 1083, 1252, 1323, 1420, 1550

Узурпацыя: 1375

Улада кіравання: 30–93, 129–144, 228, 274, 295, 331–333, 341, 357–358, 360–367, 381, 391, 405–406, 427, 436, 438, 446, 455–456, 466, 475–481, 596, 1008, 1319, 1417, 1419–1420

Улада пасвячэння: 129, 207, 274, 290, 292, 966, 1008, 1333, 1338

Улада: 85–93, 223, 330–333, 336–341, 362–365, 368, 377, 381, 391, 803–804, 808, 810–811, 995, 1326, 1370–1373, 1389, 1405, 1548

Уласнасць: 197–199, 668, 706, 741, 1171, 1232, 1240–1241, 1256, 1259, 1268–1270, 1284

Умова: 39, 126, 172, 869, 1102, 1125, 1131, 1163, 1194, 1202, 1361, 1743

Універсітэт: 443, 807–810, 812–813, 815–821, 833

Упартасць: 915, 1347, 1358, 1364

Упэўненасць маральная: 1608, 1707

Устрыманне: 277, 599, 1245, 1249, 1251–1253

Усходні: 350, 844, 1015, 1127

Усынаўленне: 110, 535, 877, 1094

Утаямнічанне хрысціянскае: 842, 866

Утрыманне: 195, 222, 230, 263–264, 269, 271, 281–282, 295, 384, 402, 538, 707, 1154, 1189, 1254, 1274, 1350, 1650

Факультэт касцёльны: 443, 809, 815–820

Фармацыя: 231, 234–235, 242–244, 246–252, 255–258, 261, 279, 555, 652, 659–661, 724, 735, 780, 785, 788–789, 1027, 1032

Федэрацыя: 582, 1274

Філасофія: 250–251, 1032

Фонд: 94, 115, 117, 120–121, 1303–1308

Форма кананічная : 1079, 1108–1114, 1116–1117, 1127, 1130–1133, 1148, 1158, 1160, 1163–1164, 1686

Форма сакрамэнтальная: 849, 880, 959, 1000, 1009

Хабар: 1377

Хадайніцтва: 147, 180–183

Хворы: 167, 529–530, 619, 689, 919, 930, 1741, 1747

Хлеб эўхарыстычны: 899, 924–926

Хросны: 855, 872–875, 877, 893, 895

Хрост: 11, 96, 111, 196, 204, 230, 530, 787, 849–853, 855–857, 860–878, 1367

Хрызма: 880

Цыборый: 939, 941

Цэлебрацыя: 366, 388–390, 530, 841, 851, 854, 856, 880–881, 899, 902, 924–933, 960–963, 1000–1002, 1108–1121, 1127, 1130–1133, 1177–1182, 1219, 1225, 1228

Цэлібат: 87, 247, 277, 291, 599, 677, 1037

Цэнзар: 830

Цэнзура: 508, 566, 976, 1071, 1312, 1318, 1331–1335, 1347, 1357–1358, 1361

Час: 200–203, 920, 1175, 1244, 1249

Чужалоства: 1152, 1155

Чыстасць: 277, 599, 666, 1041, 1088, 1387, 1394-1395, 1398

Шкода: 57, 87, 128, 823, 982, 1048, 1062, 1081, 1201, 1284, 1289, 1293, 1328, 1347, 1389, 1457, 1496, 1498–1499, 1548, 1645, 1649, 1729, 1741

Школа: 683, 785, 796, 799, 800–806, 827

Шпіталь: 566, 860

Штраф: 1336, 1377, 1488–1489

Эканом: 239, 423, 494, 636, 1278

Экзамен: 521, 970, 1066, 1067, 1070, 1121, 1131

Экзарцызм: 1172

Экскамуніка: 171, 316, 915, 996, 1109, 1318, 1331, 1357, 1379, 1386, 1425

Экскардынацыя: 267–268, 270, 272, 975

Эксклюўстрацыя: 686, 687

Экуменізм: 256, 364, 383, 755, 844

Эмансіпацыя: 105

Эмэрыт: 185, 402, 443, 707, 1242

Эрэміт: 603

Эўхарыстыя: 276, 369, 633, 866, 897–898, 924, 926, 1065

Кодэкс кананічнага права : Codex iuris canonici / Пераклад з лаціны кс. Д. Пухальскі, кс. А. Зноска. — 2022. — 592 с.

ISBN 978-609-96338-0-0

Кніга змяшчае афіцыйны лацінскі тэкст і першы ў гісторыі пераклад на беларускую мову дзеючага Кодэкса кананічнага права 1983 г. — асноўнага заканадаўчага акта Рыма-Каталіцкага Касцёла. Мэтай выдання з'яўляецца выкарыстанне ў правапрымяняльнай дзейнасці спецыялістамі, каталіцкімі святарамі і вернікамі, а таксама азнаямленне шырокіх колаў чытачоў з кананічным праваўладкаваннем Рыма-Каталіцкага Касцёла.

Наклад 1000 ас.

Надрукавана ў
UAB PETRO OFSETAS
Naujoji Riovonių g. 25C
Vilnius, LT-03153
Tel. +37061 111 800
www.petroofsetas.lt